# СЛОЎНІК

- СІНОНІМЫ
- АМОНІМЫ
- АНТОНІМЫ
- ПАРОНІМЫ
- АМОГРАФЫ
- АМАФОНЫ

ЭРУДЫТ




«ПАРАДОКС» выпусціў:

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

*Серыя «**ЭРУДЫТ**»*

**Тым, хто не ведае беларускай мовы, гэты слоўнік дапаможа разумець яе настолькі, каб не адчуваць сябе чужынцам на зямлі Купалы і Коласа.**

*Тым, хто прызвычаіўся да так званай «трасянкі», гэтая кніга падкажа, як правільна ўжываць і вымаўляць сапраўды беларускія словы і выразы.*

***Тым, хто дасканала валодае матчынай мовай, магчыма, калі-нікалі спатрэбіцца зазірнуць сюды па нейкую арфаграфічную даведку.***

Такім чынам, гэты найноўшы тлумачальны слоўнік беларускай мовы, выпушчаны выдавецтвам «Парадокс», спатрэбіцца усім!

«ПАРАДОКС» выпусціў:



**АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК**

*Серыя «ЭРУДЫТ»*

*Як і кожная са шматлікіх моў, на якіх размаўляе насельніцтва нашай планеты, беларуская мова не застаецца нязменнай. Яна ўзбагачаецца новай лексікай, што ўваходзіць у наш побыт разам з новымі галінамі навукі і тэхнікі, у працэсе развіцця міжнародных зносін. Асабліва шмат такіх «навасельцаў» з'явілася на працягу апошняга дзесяцігоддзя, калі многае змянілася не толькі ў мовазнаўстве...*

Новы арфаграфічны слоўнік, які змяшчае каля 30 тысяч моўных адзінак, цалкам задаволіць патрэбы не толькі школьнікаў і студэнтаў, але і настаўнікаў, журналістаў, навукоўцаў, усіх тых, хто хоча без памылак пісаць і размаўляць па-беларуску.

Эрудыт

# СЛОЎНІК ЛЕКСІЧНЫХ ФОРМАЎ

## Сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы, амографы, амафоны

PARADOX®

МІНСК
2004

УДК 811.161.3'374
ББК 81.2Бел-4
С48

Серыя «Эрудыт» заснавана ў 1998 годзе
Укладальнікі *Я. І. Хвалей, У. В. Шарпіла*

**Слоўнік лексічных формаў** (сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы, амографы, амафоны) /
С48 Уклад. Я. І. Хвалей, У. В. Шарпіла. — Мн.: Парадокс, 2004. — 416 с. (Эрудыт).

ISBN 985-451-134-0.

Упершыню пад адной вокладкай сабрана цэлая серыя слоўнікаў, якія ў свой час выходзілі паасобку. Кожны з іх разглядае не асобныя словы, а групы слоў, з'ядначаных пэўнымі суадносінамі — падабенствам ці розніцай паміж іх гучаннем і сэнсам.

Кніга спатрэбіцца і школьніку, і студэнту, і кожнаму, хто хоча дасканала валодаць беларускай мовай.

**УДК 811.161.3'374**
**ББК 81.2Бел-4**

**ISBN 985-451-134-0**

© Хвалей Я. І., Шарпіла У.В. укладанне, 2003
© Афармленне, распрацоўка серыі. «Парадокс», 2004

## АД ВЫДАВЕЦТВА

*Працягваючы серыю «Эрудыт», пад лагатыпам якой апошнім часам выйшла нямала слоўнікаў — арфаграфічных, тлумачальных, двухмоўных, — цяпер далучаем да іх, бадай, самы незвычайны. Такога яшчэ не было на айчынным кніжным рынку: пад адной вокладкай сабрана некалькі слоўнікаў, аб'яднаных паводле іх функцыянальнай прыналежнасці. Агульнае для ўсіх тое, што тут тлумачацца не асобныя словы, а групы слоў, стасаваных пэўнымі адносінамі паміж іх гучаннем і значэннем. Навукоўцы-лінгвісты называюць такія суадносіны лексічнымі ці яшчэ больш мудрагеліста — семанімічнымі. Больш зразумелымі з'яўляюцца азначэнні, знаёмыя нам яшчэ са школы ці студэнцкай лаўкі: сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы, амографы, амафоны.*

*Гэты слоўнік можна лічыць універсальным у тым сэнсе, што ён ахоплівае амаль усе магчымыя варункі лексемы — своеасаблівай моўнай цаглінкі, што ляжыць у аснове збудавання, якое мы называем мовай.*

*Гэтак жа, як будынак складаецца з мноства цаглін, кожнае слова ў сказе стасуецца з іншым і ў залежнасці ад кантэксту можа мець розны сэнс. Напрыклад, калі мы спяваем ці чуем знаёмае: «А я лягу-прылягу край гасцінца старога...» — зразумела, што маецца на ўвазе зусім не той гасцінец, якога ласае дзіця чакае ад бацькі. Гасцінцам у нас здавён называюць не толькі тое, што ядуць, але і тое, па чым едуць: тракт, бальшак, дарогу, пракладзеную некалі «гасцямі» — гандлёвым людам, у даўнейшыя часы пераважна іншаземным (адкуль і гэтакая назва — гасцінец).*

*Як бачым, адно і тое ж слова можна ўспрымаць па-рознаму. Такія выпадкі, што называюцца аманіміяй, разглядае і тлумачыць спецыяльны раздзел амонімаў — адна з некалькіх частак нашага слоўніка.*

*Памыляецца той, хто мяркуе, што гэта неабходна ведаць толькі спецыялісту-мовазнаўцу, а для звычайнага чалавека — раскоша, без якой папросту можна абысціся. Можна,*

*калі пагадзіцца з правам на існаванне сумнавядомай «трасянкі», якая псуе і ганьбіць родную мову, дае казыры тым, хто аспрэчвае яе аўтэнтычнасць, своеасаблівасць.*

*Бо адкуль жа ўзялася гэтая моўная хвароба? Бадай, менавіта ад няведання шматлікіх варункаў роднага слова і няўмення імі карыстацца. Той, хто набудзе гэты слоўнік, зверне ўвагу на сінанімічнае багацце мовы, якую часам папракаюць пераймальнасцю, падначаленасцю ў дачыненні да «великого и могучего»... Аддаючы належнае і не адмаўляючы ў бясспрэчных вартасцях мове Пушкіна і Тургенева, не палянуйцеся злічыць, колькі сінонімаў мае, напрыклад, агульнавядомае наша слова «добра». Ажно за паўсотні! І гэта далёка не адзінкавы прыклад.*

*Адсюль зразумела, якую практычную карысць мае гэтая кніга перш за ўсё для школьніка, што рыхтуецца, скажам, да пісьмовага пераказу, сачынення ці экзаменацыйнага тэста: не ўпэўнены, як пішацца патрэбнае слова,— вунь колькі варыянтаў яго замены! Слоўнік дапаможа і школьніку, і студэнту, і кожнаму, хто цікавіцца беларускай мовай, пашырыць свой лексічны дыяпазон, узбагаціць актыўны моўны запас, свабодна валодаць родным словам.*

*Магчыма, наш слоўнік не свабодны ад заганаў, якія спыняць увагу яго карыстальнікаў: некаторыя прыклады, ілюструючыя ўжыванне таго ці іншага слова, у адрыве ад кантэксту выглядаюць занадта фрагментарна; не ва ўсіх выпадках пазначана функцыянальная, ужывальная прыналежнасць слова (дыялектнае, абласное, размоўнае і да т. п.). Прэтэнзіі такога кшталту абсалютна справядлівыя, і мы гатовы іх прыняць.*

*Гэтаксама выдавецтва з удзячнасцю прыме ўсе заўвагі і прапановы, якія будуць садзейнічаць перавыданню кнігі ў пашыраным і палепшаным варыянце.*

*Аркадзь БРЖАЗОЎСКІ,*
*галоўны рэдактар.*

# СІНОНІМЫ

# СІНОНІМЫ

Яшчэ за школьнай партай мы даведваемся, што сінонімы — гэта словы з аднолькавым ці блізкім значэннем, але розныя па гучанні. Багацце сінонімаў у мове — паказчык яе развітасці, выразнасці, здольнасці перадаваць найтанчэйшыя рухі думкі, выяўляць самыя складаныя адценні моўных фарбаў пры апісанні рэчаў і прадметаў, у раскрыцці разнастайных з'яў прыроды, чалавечых перажыванняў.

Колькасна сінонімы складаюць, бадай, найбольшую групу сярод лексічных варункаў беларускай мовы (як, дарэчы, і рускай, і усіх еўрапейскіх моваў). Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова прагледзець хаця б некалькі старонак твора мастацкай літаратуры. Менавіта сінанімічнае багацце разам з метафарычнасцю, вобразнасцю робіць яе мастацкай, адрознай ад сухой дакументальнай прозы, так званай «літаратуры факта».

Амаль у кожным мастацкім творы мы сустракаем дыялогі — абмен думкамі, меркаваннямі, рэплікамі галоўных ці другарадных персанажаў. І як часта ў такіх выпадках паўтараецца адно і тое ж: «сказаў ён», «сказала яна»... А колькі родзічаў у слова «казаць»! Мяркуйце самі: гаварыць, гаманіць, размаўляць, перамаўляцца, мармытаць, балбатаць, плявузгаць, вярзці, гергетаць, балабоніць — і гэта яшчэ далёка не ўсё, у чым вы зможаце пераканацца, пагартаўшы старонкі раздзела «Сінонімы».

Разнастайныя прыклады ўжывання таго ці іншага сінанімічнага слова ілюструюцца вытрымкамі з твораў вядомых майстроў беларускай літаратуры, фальклору і г. д.

Пры карыстанні пададзенымі тут сінонімамі і блізказначнымі словамі трэба улічваць, што не ўсе з іх адпавядаюць крытэрыям літаратурнай нормы, інакш кажучы, могуць ужывацца толькі ў адпаведным кантэксце. Як правіла, нарматыўным з'яўляецца базавае (гнездавое) слова; пераважная большасць астатніх у той ці іншай ступені абавязана сваім паходжаннем народным гаворкам, мясцовым дыялектным формам і не мае паўсюднага ўжывання.

## СПІС УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

*абл.* — абласное слова
*адз.* — адзіночны лік
*БелЭН* — Беларуская энцыклапедыя
*вайск.* — вайсковы тэрмін
*выс.* — высокі стыль
*гіст.* — гістарычны тэрмін
*груб.* — грубае слова
*дзіц.* — дзіцячая лексіка
*зб.* — зборнае
*«Звязда»* — газета «Звязда»
*зняваж.* — зняважлівае слова
*іран.* — іранічны сэнс
*кніжн.* — кніжная лексіка
*мн.* — множны лік
*пагард.* — пагарджальны сэнс
*памянш.* — памяншальнае слова
*памянш.-ласк.* — памяншальна-ласкальнае слова
*паэт.* — паэтычнае слова
*перан.* — пераноснае значэнне
*разм.* — размоўная лексіка
*спец.* — спецыяльны тэрмін
*уст.* — устарэлае слова
*царк.* — царкоўнаславянізм

# А

**АБ,** ПРА, АДНОСНА, НАКОНТ, ДА, НАД, НА ТЭМУ.

*Аб красуні сінявокай сніў і марыў і ўздыхаў.* Я. Колас. *Прагна слухала ўся гэтая бедната такую гаворку, асабліва наконт зямлі.* Я. Маўр. *Адносна лесу Буткевіч напіша ў лясніцтва. Болей на гэтую тэму мы не будзем гутарыць.* А. Чарнышэвіч.

**АБАВЯЗАК,** АДКАЗНАСЦЬ, ПАВІННАСЦЬ, ЗАДАЧА; ПРЫЗНАЧЭННЕ, МІСІЯ, СПРАВА ГОНАРУ.

*Цяпер ён упэўніўся, што ніхто не адступіў адсюль, і ўсе памерлі, да канца выканаўшы свой салдацкі абавязак.* В. Быкаў. *І ён адчуваў, як вырасла пачуццё адказнасці.* М. Лынькоў.

**АБАВЯЗКОВА**, БЕЗУМОЎНА, НЕМІНУЧА, НЕПАЗБЕЖНА, НЯЎХІЛЬНА, НЯЎМОЛЬНА, НЕАДМЕННА; КАНЕЧНЕ, КОНЧА *(разм.)* ЛЮБОЙ ЦАНОЙ, ЯКОЮ Б НІ БЫЛО ЦАНОЙ, ЛЮБЫМІ СІЛАМІ, ЧАГО Б НІ КАШТАВАЛА, У ШТО Б ТАМ НІ СТАЛА, ЯК ПІЦЬ ДАЦЬ, НАПРАМІЛЫ БОГ, КРОЎ З НОСА, ДА ЗАРЭЗУ, ХОЦЬ-НЕ-ХОЦЬ.

*Калі дзе хто заўважыць гэтага бандзюка, то даць сігнал абавязкова* В. Быкаў. *Яна ў лагеры, і ёй безумоўна пагражае небяспека* Б. Мікуліч. *Восень? Яна ж непазбежна, рана ці позна, а прыйдзе...* Х. Шынклер. *Назначаны для ўцёкаў дзень поўз да яго павольна, але няўхільна.* Я. Брыль. *Быццам нейкае бяльмо гэтым людзям засланіла вочы, і яны страцілі здольнасць бачыць тое, што няўмольна набліжаецца.* М. Танк. *Заб'юць, неадменна заб'юць.* У. Караткевіч. *Пяць бочак цэменту. Трэба да зарэзу.* К. Крапіва. *Хоцьне-хоць, – прыйшлося гуляць вяселле.* А. Якімовіч.

**АБАЖУР**; КАПТУР.

*На стале гарэла лямпа пад светлым абажурам ...* Я. Колас. *У пакоі, дзе калісьці жыў Лясніцкі, гарэла прытульная – з блакітным каптуром – лямпа...* М. Зарэцкі.

**АБАПАЛ,** НААБАПАЛ, ПААБАПАЛ, ПА АБОДВА БАКІ, ПА АДЗІН І ПА ДРУГІ БОК, ПА БАКАХ, З ДВУХ БАКОЎ, З АБОДВУХ БАКОЎ.

*Абапал дарогі – канавы.* З. Бядуля. *Па абодва бакі ад шляху цягнуцца вузкія... палоскі.* П. Галавач. *Па адзін і па другі бок вёскі сталі ветракі, як страшыдлы, шырока раскінуўшы свае крыллі.* Я. Колас. *Па баках палі ляжалі, пападаліся гаі...* Я. Колас. *Каб ён [шлях] прыгожым быў, мы з двух бакоў абсаджваем яго радамі ліп.* М. Аўрамчык. *З абодвух бакоў дарогі сівы лес.* З. Бядуля.

**АБВІНАВАЧВАЦЬ**, ВІНАВАЦІЦЬ, ВІНІЦЬ, СКЛАДАЦЬ, СКЛАДАЦЬ ВІНУ, УСКЛАДАЦЬ ВІНУ, ПРЫПІСВАЦЬ ВІНУ, КІВАЦЬ, ЗАКІДАЦЬ, НАПАДАЦЬ, ВЯРНУЦЬ, ЗВАРОЧВАЦЬ, ВАЛІЦЬ, УЗВАЛЬВАЦЬ; УЗВАЛЬВАЦЬ ВІНУ, ВАЛІЦЬ ШЫШКІ, ВЕШАЦЬ САБАК.

*Васілёву сям'ю абвінавачвалі ў тым, што яна дае прытулак чужым людзям.* Р. Няхай. *Ён паехаў, кінуў мяне адну, кажа, не вінават ён. Я яго і не вінаваціла...* К. Чор-

ны. *Луцэя колькі разоў запэўняла мужа, што яна не злуе на яго і не вініць яго за ўдзел у забастоўцы.* Ц. Гартны. *Вы на мяне шышкі не валіце.* Х. Жычка. *Хопіць вешаць сабак на кожнага, хто да цябе прыткнецца!* А. Бажко.

**АБГРУНТАВАНА**; ЗАКОННА *(перан.)*
*Абгрунтавана, з веданнем справы пачаў пуцявы абходчык тлумачыць фотакарэспандэнту, чаму гэта здараецца.* Я. Васілёнак. *Уборачная непакоіла Мароза. Ну, што ж, законна, летні дзень год корміць.* М. Лобан.

**АБДЫМАЦЬ,** АБВІВАЦЬ.
*Я абдымаю Хрысціну за плечы.* А. Асіпенка. *Вось яна абвівае рукамі маю шыю, тройчы цалуе ў вусны.* Х. Жычка.

**АБЖЫТЫ;** НАСЕДЖАНЫ.
*З абжытым кутам цяжка разлучацца...* А. Астрэйка. *Уся лепшая зямля Случчыны належала памешчыкам, якія з прыходам немцаў вярнуліся ў наседжаныя месцы.* І. Гурскі.

**АБЛІЦЬ;** АПЛЮХАЦЬ *(разм.).*
*У адзін момант салдаты аблілі сцены хаты бензінам і паднеслі запалку.* І. Шамякін. *Аплюхаю вас з вядра.* З. Бядуля.

**АБЛОГА,** ЦАЛІНА, ЯЛАВІНА, НАВІНА.
*Адпачыўшы добра пасля зімы лютай, цаліну паедзем заўтра мы араць.* А. Гурло. *На вашай зямлі за вайну стала многа аблог, ці, як у нас кажуць, ялавін.* П. Пестрак. *– А ў Сымона Ашакевіча – от лянок. Бо ён на навіне сеяў.* А. Чарнышэвіч.

**АБРАЗ,** ІКОНА.
*Юрка бачыў на абразах прарока Ілью і чуў. што гэта ён пасылае дождж, гром і маланкі.* Я. Колас. *На покуці вялікая ікона нейкага святога...* К. Чорны.

**АБРУС,** НАСТОЛЬНІК, НАСТОЛЬНІЦА, СТАЛЬНІЦА, СУРВЭТА.
*Стол белым абрусам засланы, дыміцца абед на стале.* М. Калачынскі. *Маці з шафы дастае настольнік самы лепшы, сэрцу дарагі.* П. Панчанка. *На стале ляжала белая сурвэта.* Ц. Гартны.

**АБРЫВІСТЫ,** ЗРЫВІСТЫ, СТРОМЫ, СТРОМКІ, КРУТЫ.
*Унізе, пад зрывістым берагам, несупынна гнала рака празрыстыя хвалі... Гара была высокая, стромая.* Я. Колас. *Рака вузкая, бег яе вельмі хуткі, ды яшчэ берагі стромкія.* Я. Маўр. *Гара гэта досыць крутая.* К. Крапіва.

**АБРЫС,** КОНТУР, СІЛУЭТ.
*Я помніць буду скал абрысы і вашу песню, кіпарысы!* Я. Пушча. *Сціраліся контуры цьмяных прадметаў.* Ц. Гартны. *Ён бачыў воддаль у змроку цёмны паніклы сілуэт сваёй спадарожніцы.* В. Быкаў.

**АБЦАС,** КАБЛУК; ШПІЛЬКІ.
*Гучна шоргаўся аб абцасы жвірысты пясок на дарозе.* К. Чорны. *Лодачкі былі велікаватыя дый з непрывычкі цяжкавата было трымацца на высокіх каблуках.* М. Лупсякоў. *Слаўныя дзяўчаты, прыгожыя, начытаныя, сціплыя, ім бы ў туфельках на шпілечках, у капронах ды ў нейлонах там розных хадзіць...* С. Грахоўскі.

**АБШАР,** ПРАСТОР, ПРАСТОРА, ПРАСЦЯГ, ПРОСТРАНЬ, ПРЫВОЛЛЕ, РАЗДОЛЛЕ, РАЗЛЕГЛАСЦЬ, РАЗЛОГ, ДАЛЯГЛЯД, ДАЛЬ, ДАЛЕЧ, ДАЛЯЧЫНЬ, ШЫРЫНЯ, ШЫР, БЯЗМЕР, БЯЗМЕР'Е, БЯЗМЕЖЖА, БЯЗМЕЖНАСЦЬ, БЯСКОНЦАСЦЬ, БЯСКРАЙНАСЦЬ, НЕАГЛЯДНАСЦЬ, АБСЯГ.
*Дайшлі сяляне на вольныя землі, выйшлі на родны знаёмы абшар.* М. Машара. *А простор дык прастор – і канца не відаць... Люблю я прыволле шырокіх палёў, зялёнае мора ржаных каласоў.* Я. Колас. *Бліснулі шыпамі, за ваколіцу трактары паехалі ў прасцяг.* А. Бялевіч. *Сям-там плывуць над сіняй пространню белыя парусы.* М. Лынькоў. *І патанулі ў золаце разлогі пад сумнай восені авея-*

*ным крылом.* П. Трус. *Нешта вымахвае рукою бяльматы, злавесны Мікіта з гары, паказваючы абсяг зямлі* П. Пестрак.

**АБЫ-ДЗЕ,** ДЗЕ-НЕБУДЗЬ; ДЗЕ ПАПАЛА, УСЕ РОЎНА ДЗЕ.

*Сустракаюцца людзі, якія не саромеюцца абы-дзе кінуць акурак альбо паперку ад марожанага.* М. Паслядовіч. *Ён усё шукаў выпадку астацца з ёю дзе-небудзь удваіх і не ведаў, як зрабіць.* К. Чорны.

**АБЫЯКАВА,** РАЎНАДУШНА, БЕЗУВАЖНА, БЕЗУДЗЕЛЬНА, БЕСКЛАПОТНА, БЕСТУРБОТНА, БЕСЦІКАЎНА, НЕЗАЦІКАЎЛЕНА, АДЧУЖАНА, НЯЎЦЯМНА, БЯССТРАСНА, СПАКОЙНА, АПАТЫЧНА, УСЁ РОЎНА, ХОЦЬ БЫ ШТО; ХОЦЬ БЫ ХНЫ, НАПЛЯВАЦЬ; НІ ХОЛАДНА НІ ГОРАЧА, СКРОЗЬ ПАЛЬЦЫ, СПУСЦІЎШЫ РУКАВЫ.

*Міцю сустрэў абыякава, працягнуў з печы руку і адвярнуўся.* І. Навуменка. *Я люблю неспакойных людзей! Нельга жыць раўнадушна на свеце.* Э. Агняцвет. *А Бушмару было усё роўна, што і як пра яго гавораць.* К. Чорны. *– Заўтра-паслязаўтра дождж пойдзе, а ім хоць бы што... – абураецца дзядзька Даніла.* А. Асіпенка. *А яны дык хоць бы хны слінай цыркаюць праз зубы.* К. Крапіва.

**АБЯЦАННЕ,** СЛОВА, ЗАРОК, ГАРАНТЫЯ; АБЯЦАНКА, АБЯЦАНКА-ЦАЦАНКА, ПОСУЛ, БАЖБА; АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА, ЗАПЭЎНЕННЕ, ЗАПЭЎНІВАННЕ; ПРЫСЯГА, КЛЯТВА.

*Ён здзейсніць сваё абяцанне, здзейсніць помсту.* Б. Мікуліч. *Не раз успамінаў Вольгу Віктараўну і сваё слова – пабыць у яе.* Я. Колас. *Ён зламаў цвёрды зарок Наталлі Пятроўны ніколі не выходзіць замуж.* І. Шамякін. *Абяцанка-цацанка, як той казаў, а тым часам падатак аддай...* К. Крапіва. *Шэпты, прысяга, вечная згода, вечная любасць, – вось вам і ода.* Я. Купала.

**АВАДЗЕНЬ,** ЗДРОК.

*Ляныя валы паціху ідуць уперадзе сахі, бароняцца хвастамі ад аваднёў...* П. Галавач. *Пастушок вымаў з торбы кніжку і чытаў, нават забываючыся аб тым, што ўжо сонца высушыла росы і здракі пачынаюць непакоіць скаціну.* М. Хведаровіч.

**АВАНС,** ЗАДАТАК.

*А ля выдавецкае скупаватай касы аўтар з мінай скромнаю чакае авансу.* Я. Купала. *І Саўка бярэцца за работу. Не брацца нельга: барыш выпілі, задатак узяў.* Я. Колас.

**АВАРЫЯ,** КРУШЭННЕ, КАТАСТРОФА.

*Прадпрыемствы не працуюць, на транспарце – аварыі...* Б. Мікуліч. *І ён адтуль не вярнуўся – загінуў пры авіяцыйнай катастрофе.* Х. Жычка.

**АГАРОДЖА,** АГАРОЖА, ЗАГАРАД, ЗАГАРАДЗЬ, ЗАГАРАДКА, ЗАГАРОДКА, ЗАГАРОДА, ЗАГАРАДА, ЗГАРОДА, АБГАРОДКА, ПЛОТ, ПАРКАН, ТЫН, ЧАСТАКОЛ /*мураваная:* МУР /*плеценая:* ПЛЯЦЕНЬ, ПЛЕТНІК /*з жэрдак:* ЖАРДЗЯНІК /*з дошчачак:* ШТЫКЕТНІК /*з раслліннасці:* ЖЫВАПЛОТ.

*На волю з-за агароджы нікога не выпускалі.* П. Кавалёў. *Платы вакол садоў і дач, навокал паркаў, хоць ты плач!* С. Грахоўскі. *Галлё спусціўшы над парканам, расла тут грушка з тонкім станам.* Я. Колас. *Крайняя хата была абгароджана пачарнелым тынам.* А. Кулакоўскі. *Невялічкі дворык іх быў абгароджаны частаколам.* Я. Колас. *За рэдкім жываплотам, якім агароджан сад, цвіце лён.* А. Бажко.

**АГАРОДНІНА,** ГАРОДНІНА, ЗЕЛЯНІНА.

*Кожнай агародніне свой час. Свой час ягадзе і свой час баравіку.* Я. Колас. *Стаў ля латка з зелянінай і еў радыску.* Э. Самуйлёнак.

**АГОНЬ**, ПОЛЫМЯ, ПАЖАР, ЖЫЖА *(дзіц.)*.
*Агонь – найстрашнейшы злодзей.* Прыказка. *Адкуль дым, адтуль і полымя* Прыказка. *Быў пажар. На поўны голас раўлі сірэны.* Б. Мікуліч. *Унь жыжа свеціць, падзівіся!* Я. Колас.

**АГУЛАМ**, АГУЛЬНА, СКОПАМ БЕЗ РАЗБОРУ.
*Але нашто вініць агулам і гэтак жорстка нападаць?* Я. Колас. *Каралі ўсіх скопам – вінаватых і невіноўных.* В. Быкаў.

**АДВАГА**, СМЕЛАСЦЬ, МУЖНАСЦЬ, ХРАБРАСЦЬ, ХАРОБРАСЦЬ, БЯССТРАШНАСЦЬ, ГЕРАІЗМ, ГЕРОЙСТВА, РЫЦАРСТВА /*у прыняцці рашэння:* РАШУЧАСЦЬ, РЫЗЫКА.
*Адвага гарады бярэ.* Прыказка. *Тое, што блізка былі хаты з людзьмі, паддавала яму болей смеласці.* М. Гарэцкі. *І не такія перашкоды людская мужнасць браць магла.* А. Александровіч. *А медалі гэтыя дадзены мне за праяўленую ў баях выключную храбрасць.* М. Лынькоў. *І ад гэтага адчування харобрасць і гераічнасць захапілі ўсю яго маладую істоту.* Р. Мурашка. *Пры Андрэі ў яе не хапала рашучасці нават пагаварыць з Юзікам.* А. Чарнышэвіч. *А на мяне, ведаеш, з кожнай мінутаю нейкая рызыка находзіць. Здаецца, нічога на свеце цяпер не баюся.* Я. Купала.

**АДВАЛ**, ПАЛІЦА.
*Плуг падразае мяжу і адвалам паволька кладзе яе на бок.* П. Галавач. *З зямлі выскачылі і бліснулі люстрам паліц плугі, крута завярнуліся і зноў упіліся ў зямлю.* М. Лобан.

**АДВЯЧОРАК**, НАДВЯЧОРАК ШАРАЯ ГАДЗІНА.
*Стаяў ціхі надвячорак пасля спякотнага дня..* І. Грамовіч. *Заўтра па шарай гадзіне яны там будуць сустракаць нас ля Плісы.* М. Машара.

**АДГАВОРКА**, ВЫВЕРТ, ПРЫЧЫНА, АПРАЎДАННЕ.
*Памятайце, што ад гэтай справы вы не можаце ўхіліцца ніякімі адгаворкамі. Гэта абавязковая справа.* М. Лынькоў. *Адам Іванавіч, кажы... Без вывертаў, а проста...* М. Клімковіч. *А каб апраўдацца перад бацькам, што з пустымі рукамі прыходзяць, выдумляюць сыны розныя прычыны.* А. Якімовіч.

**АДГУКАЦЦА**, АДКЛІКАЦЦА, АДЗЫВАЦЦА, АБЗЫВАЦЦА, АКАЗВАЦЦА ПАДАВАЦЬ ГОЛАС.
*Пеўню адгукаецца яшчэ адзін певень, потым яшчэ і яшчэ.* Б. Сачанка. *Як клічуць, так і адклікаюцца.* Прыказка. *Пастукаў у дзверы. Доўга ніхто не адзываўся.* А. Чарнышэвіч. *І кожны, хто чуў яго тут, так ці іначай аказваўся на гэты звон.* Я. Колас.

**АДЗЕННЕ**, АДЗЕЖА, ВОПРАТКА, УБРАННЕ, УБРАНСТВА, УБОР, УБОРЫ, СТРОІ, ПЛАЦЦЕ, ШАТЫ; АДЗЕЖЫНА, АДЗЕТАК, АДЗЕВАК, АПРАТКА, НАПРАТКА, АПРАНАХА /*старое:* СТАРЫЗНА, РВАНЬ, РЫЗЗЁ, РЫЗНЯК, РЫЗМАНЫ, ЛАХМАНЫ, ЛАХІ, ТРАНТЫ, ЛАТЫ /*рабочае:* СПЯЦОЎКА, СПЕЦАДЗЕННЕ, СПЕЦАДЗЕЖА, СПЕЦВОПРАТКА /*форменнае:* ФОРМА, УНІФОРМА, АБМУНДЗІРАВАННЕ, АБМУНДЗІРОЎКА /*царкоўнае:* АБЛАЧЭННЕ.
*Адзенне на ўсіх было наўздзіў абшарпанае, заношанае.* М. Лынькоў. *Быў канец восені і былі маразы, а адзежы цёплай не было.* К. Чорны. *Пад вопраткай у яго быў нямецкі штык.* К. Чорны. *Рвань ёсць беднасці адзнака...* Я. Колас. *Рыззём трасе, а пятак на гарэлку нясе.* Прымаўка. *Зялёную форму надзелі лясы.* Э. Агняцвет.

**АДЗІНКА**, ШТУКА, ПААСОБНІК, ЭКЗЕМПЛЯР.
*Я перад тым, як ісці на клірас, выпіваю штукі тры яец.* К. Чорны.

*Прышчапілі багата, сотні паасобнікаў, а прынялося усяго васемнаццаць прышчэпаў* У. Дубоўка. *Прадаўшчыца здзівілася, навошта ў бібліятэку аж дванаццаць экземпляраў кнігі.* Р. Сабаленка.

**АДЗІН-НА-АДЗІН,** САМ-НАСАМ, З ВОКА НА ВОКА НОС У НОС.

*Усеваладу вельмі патрэбна такая хвіліна, каб астацца адзін-на-адзін з Галінаю.* Я. Скрыган. *Сам-насам яны асталіся з нябожчыцай.* Р. Сабаленка. *Ты адзін перад усёй гэтай бязмежнай, нямой глыбінёй, з вока на вока...* І. Грамовіч. *Тут ён нос у нос сутыкнуўся з самім Яўхімам Халустам.* А. Чарнышэвіч.

**АДЗІНОТА,** АДЗІНОЦТВА, САМОТА.

*Калі мы ўсе жывём у сям'і ці сярод сваіх людзей, то мы не ведаем нават, што такое можа быць адзінота.* Я. Скрыган. *Дубы, сябры мае самоты...* Я. Колас.

**АДЗНАКА,** АЦЭНКА, БАЛ.

*Ён паспяхова закончыў навучальны год, з выдатнымі і добрымі адзнакамі перайшоў у чацвёрты клас.* П. Кавалёў. *Уступныя экзамены Вера здала, але з нізкімі ацэнкамі, не вытрымала конкурсу і не была залічана ў інстытут.* І. Дуброўскі. *Пасля кожнага экзамена ёй хацелася бачыць Пецю, пахваліцца яму сваім балам.* М. Лобан.

**АДЛЕГЛАСЦЬ,** ДАЛЕЧ, АДДАЛЕННЕ, АДДАЛЕНАСЦЬ, АДГОН, ПРАМЕЖАК, ІНТЭРВАЛ, ДЫСТАНЦЫЯ.

*Праз некалькі хвілін на грэбені ўзгорка ў некаторай адлегласці ад лесу паказаліся тры чалавекі.* Я. Колас. *Бацька пад'ехаў бы на станцыю, а то на сабе несці і клунак і чамадан такую далеч...* А. Пальчэўскі. *Вялікія спадзістыя валы, падобныя на гарыстыя ўзвышшы,каціліся адзін за адным з прамежкамі амаль што ў паўкіламетра.* М. Лынькоў. *– Трымаць інтэрвал! – крыкнуў Чумак.* . А. Кулакоўскі. *Усе стралялі з блізкай дыстанцыі.* К. Чорны.

**АДЛЮСТРОЎВАЦЦА,** АДБІВАЦЦА, АДБІВАЦЬ. АДСВЕЧВАЦЬ, АДСВЕЧВАЦЦА.

*Сонца адлюстроўвалася на зіхатлівых трубах.* А. Асіпенка. *У чорнай вадзе адбіваліся зоркі.* Я. Маўр. *Гэта, мусіць, сонца ад шыб адсвечвае.* К. Чорны.

**АДНАЎЛЯЦЬ,** ПАДНАЎЛЯЦЬ, АДРАДЖАЦЬ, ПРАВІЦЬ, ПАПРАЎЛЯЦЬ, АДБУДОЎВАЦЬ, ЛЯЧЫЦЬ, РАМАНТАВАЦЬ, РЭСТАЎРЫРАВАЦЬ, РАПАРАВАЦЬ ЛЯЧЫЦЬ РАНЫ.

*І зруб новы паставяць. А каб вы не чапалі яго, то ён, напэўна, збуцвеў бы там і ніхто б яго не аднаўляў.* Я. Колас. *Стары правіў у хаце хамут.* Я. Брыль. *Міхальчук рэстаўрыруе старыя [восі], робіць новыя.* А. Карпюк. *Пільная праца: сячкарню з маёнтка прывязлі рапараваць...* Ц. Гартны. *Край ажывае, лечыць свае раны, будуе дбайна свой шчаслівы лёс.* А. Астрэйка.

**АДНАЧАСОВА,** АДНАЧАСНА, АДНЫМ ЧАСАМ, У АДЗІН ЧАС, У ТОЙ ЖА ЧАС, РАЗАМ, РАЗАМ З ТЫМ, ЗАРАЗ, АДРАЗУ, ЗА АДНО, ЗААДНЫМ; ЗА АДНЫМ ЗАХОДАМ, АДНЫМ МАХАМ, ЗА АДЗІН МАХ.

*Камандзір і камісар слухалі з вялікай цікавасцю і адначасова ў адзін голас выказалі сваё захапленне дзяўчынай.* І. Шамякін. *Нейкая дзіўная песня – і ласкавая і разам страшная.* П. Пестрак. *І разам з тым жыла надзея, адчуванне, што ўсё кончыцца добра.* І. Мележ. *Ці ж можна дзве работы рабіць зараз.* П. Пестрак. *Рэдка каторы з іх [подачнікаў] можа адзін управіцца з двума вёсламі адразу...* Я. Брыль. *Трэба там знішчыць усё іх дабро на станцыі. Заадно, канечне, і гарнізон.* Я. Скрыган. *А што, калі за адзін мах прыцісне пан і панятога?* Я. Колас.

**АДНОЛЬКАВЫ,** РОЎНЫ, ТАКІ, РАЎНАЗНАЧНЫ, РАЎНАЦЭННЫ, АДНАСТАЙНЫ, АДНАТЫПНЫ; АДНАКІ АДЗІН, АДЗІН У АДНАГО, АДНА ЦАНА, АДНОЙ ШЭРСЦІ, НА АДЗІН АРШЫН, НА АДЗІН КАПЫЛ.
*Яны ў аднолькавых паркалёвых сукенках, у валасах чырвоныя стужкі.* І. Навуменка. *Але аднойчы Наталя заўважыла, што яна ўжо не падлетак і што ёй па хараству няма роўнай.* Я. Скрыган. *Паны і чэрці адной шэрсці.* Прыказка. *Бабы, брат, яны ўсе на адзін аршын. Раўнівыя.* І. Шамякін.

**АДНОСІНЫ,** ДАЧЫНЕННЕ, СПРАВА, ПАДЫХОД.
*З Аксінняй у яго адносіны не наладжваліся.* І. Гурскі. *А шапка яго сведчыла аб тым, што ён мае нейкае дачыненне да польскай арміі.* Я. Колас. *Але якая яму справа да гэтых дзяцей.* М. Лынькоў.

**АДПАВЯДАЦЬ,** СУПАДАЦЬ, ПАДЫХОДЗІЦЬ, ВЯЗАЦЦА, СТАСАВАЦЦА, ПАСАВАЦЬ, ІСЦІ ІСЦІ ДА ТВАРУ, БЫЦЬ ДА ТВАРУ; ГАРМАНІРАВАЦЬ.
*Усе гэтыя навінкі мод адпавядаюць тонкасці будучыні.* І. Грамовіч. *А ці падыходзяць яны па характару адно аднаму – мае клопаты.* А. Пальчэўскі. *Грукат не стасаваўся з сумотнай цішынёй бальніцы...* А. Асіпенка. *Гэтае лёгкае адзенне пасавала і да яе стройнай постаці, і да вясёлай летняй раніцы.* І. Шамякін. *Светлы сарафан у кветкі быў ёй да твару і зграбна аблягаў постаць.* Р. Сабаленка. *Голас яго ціхі, роўны неяк гарманіраваў з гэтай цішынёй.* Т. Хадкевіч.

**АДПАЧЫНАК,** АДПАЧЫН, СПАЧЫН, СУПАЧЫНАК, СПАЧЫНАК, СПАЧЫВАННЕ, СПАКОЙ, СУПАКОЙ, ПЕРАДЫШКА, АДДЫШКА, АДДЫХА, ПЯРЭДЫХ, ПЕРАДЫХ, РОЗДЫХ, ПАСТОЙ, ПАПАС, ПАПАСКА, ПЕРАКУР, ВОЛЬНАЯ ЧАСІНА.
*Пасля адпачынку зусім не хацелася падымацца з месца.* А. Чарнышэвіч. *Ні спачыну няма, ні адхлання ад вяковае крыўды, пакуты...* С. Дзяргай. *Палявой дарогай я адна пайду, можа, там для сэрца супакой знайду.* А. Бачыла. *Якаў з ракамі па шляху без аддышкі смаліць.* А. Пашковіч. *Нехта працаваў упарта, без пярэдыху.* Б. Сачанка. *Ды салдаты садзяцца зрабіць перакур.* Р. Няхай.

**АДПОМСЦІЦЬ,** АДПЛАЦІЦЬ. РАЗЛІЧЫЦЦА, РАСКВІТАЦЦА ЗВЕСЦІ РАХУНАК, ЗВЕСЦІ РАХУНКІ, ВЫМЕСЦІЦЬ ЗЛОСЦЬ, УЗЯЦЬ РЭВАНШ.
*Паўшых за свабоду край наш не забудзе, і народ адпомсціць за сваіх сыноў.* М. Танк. *Чым адплаціць панам за здзекі?* Я. Колас. *Няхай жа здраднік гэты знае, што з ім разлічацца свае.* А. Бачыла. *Расквітаемся мы з гадам здружанымі сіламі...* К. Крапіва. *Мы звялі з імі рахунак – қатаў знішчылі дачыста.* К. Буйло.

**АДРЫНА,** ПУНЯ.
*Раніцай Сымон пайшоў у адрыну даць сена сваёй Пярэстай.* А. Чарнышэвіч. *Міронава сям'я спіць у пуні на свежым сене.* З. Бядуля.

**АДСТАЛЫ,** НЕАДУКАВАНЫ, АБМЕЖАВАНЫ, КАНСЕРВАТЫЎНЫ; ЦЁМНЫ, ЗАБІТЫ, НЕДАЛЁКІ, ВУЗКІ, ДЗІКІ.
*І плямён адсталых масы развівацна сталі бурна – гатэнтоты, папуасы хутка выраслі культурна.* К. Крапіва. *Дык нашто ж ты браў мяне, неадукаваную? Ці табе адукаваных мала?* Я. Колас. *Да незвычайнага кансерватыўны селянін у сваіх прывычках...* П. Галавач. *Цёмная і забітая была гэтая дзяўчына.* К. Чорны.

**АДУВАНЧЫК,** ДЗЬМУХАВЕЦ.
*Старыя знаёмыя – дробны белы рамонак і пушыстыя адуванчыкі – бялеюць у сухой стэпавай траве.* В. Вольскі. *З дзьмухаўцоў бялюткі пух чэрвень здзьмуў для сакатух.* Р. Барадулін.

**АДУМАЦЦА**, АБДУМАЦЦА, АПОМНІЦЦА, АПАМЯТАЦЦА, АБРАЗУ-

МІЦЦА, СПАХАПІЦЦА, СХАМЯНУЦЦА, АХАМЯНУЦЦА, АЧУХАЦЦА, РАСЧУХАЦЦА, АЧОМАЦЦА, АЦЯМІЦЦА САБРАЦЦА З ДУМКАМІ, УЗЯЦЦА ЗА РОЗУМ, ПРЫЙСЦІ ДА РОЗУМУ.

*Адумайся ты! Што ты робіш?* Я. Колас. *– Што вы робіце? Апомніцеся! – прагучаў чыйсьці моцны, абураны голас.* П. Пестрак. *Пакуль не спахапіліся, трэба недзе зашыцца, схавацца..* В. Быкаў. *Маракі схамянуліся скора, што згубілі дзесь юнгу свайго...* М. Аўрамчык. *Яшчэ нямаведама, што з яго выйдзе: мо, як падрасце, дык прыйдзе да розуму.* З. Бядуля.

**АДЧАЙ,** РОСПАЧ, АСУДЖАНАСЦЬ, БЕЗНАДЗЕЙНАСЦЬ, БЕЗДАПАМОЖНАСЦЬ, БЯСПОМАЧНАСЦЬ, БЕЗВЫХОДНАСЦЬ, РАЗГУБЛЕНАСЦЬ, БЕСПРАСВЕТНАСЦЬ; БЯССІЛЛЕ, ТУПІК *(перан.)* , УПАДАК ДУХУ.

*Халодная роспач і адчай сціскаюць сэрца... Няўжо ж паўстанне прыдушана адразу?* Я. Маўр. *– Можа, сынку, ужо апошні раз і бачымся. – выказаў сваю безнадзейнасць стары.* Р. Сабаленка. *– Што рабіць? – поўная бездапаможнасць чулася ў Тацяніным голасе.* Я. Колас. *Ён сядзеў насупраць і ад безвыходнасці толькі скрыгатаў зубамі.* В. Быкаў. *Але яна не крыкнула ў разгубленасці і не кінулася наўцёкі.* Т. Хадкевіч. *Сярод рабочых быў тады агульны ўпадак духу.* М. Гарэцкі.

**АДЧУВАННЕ,** ПАЧУЦЦЁ, ПАЧУВАННЕ, ЧУЦЦЁ, УРАЖАННЕ; ІНСТЫНКТ, АСАЦЫЯЦЫЯ.

*Пачуццё сораму было невядома яму. Нават нашкодзіўшы, ён мог глядзець у вочы і ўсміхацца.* В. Вітка. *Такое ўражанне, што ен некуды вечна бяжыць і спяшаецца, каб не спазніцца.* Я. Скрыган. *Алеся дзіцячым інстынктам угадвала бацькаву няласку да сябе.* . Я. Колас.

**АЕР,** ПЛЮШНІК.

*Ціха шэпчуцца чароты і калышацца аер.* А. Астрэйка. *У пажоўклым плюшніку боўтнуў шчупак, мусіць ловячы маленькіх рыбак* Р. Мурашка.

**АЖАНІЦЦА,** ЖАНІЦЦА, ЗАПІСАЦЦА, УЗЯЦЬ, АЧАЛАВЕЧЫЦЦА.

*Міхал, як толькі ажаніўся, тады ж ад бацькі аддзяліўся...* Я. Колас. *Не выкруціўся хлопец, запісаўся, ды... не з Матрунаю, а з той, з якой кахаўся.* У. Корбан. *А вазьму такую, к якой любасць чую...* Я. Купала.

**АЖЫВАЦЬ,** АДЖЫВАЦЬ, УВАСКРАСАЦЬ.

*Ніколі не бачыў, каб забітыя ажывалі.* Х. Жычка. *Ён пазнаў гэтую жанчыну. Але не верыў вачам. Хіба ўваскрасаюць мёртвыя?* І. Шамякін.

**АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ,** ЗДЗЯЙСНЯЦЬ, ВЫКОНВАЦЬ, СПРАЎДЖВАЦЬ, РЭАЛІЗАВАЦЬ ПРАВОДЗІЦЬ У ЖЫЦЦЁ.

*Шэф з усёй рашучасцю пачаў ажыццяўляць задуманы план.* Р. Няхай. *Скажы цяпер, як ты будзеш выконваць заданне?* А. Кулакоўскі. *І ён спраўджваў гэтую думку.* М. Лынькоў.

**АЗЫЗЛЫ,** АДРУЗЛЫ, АДУТЛАВАТЫ.

*Вузкія, нават крыху як бы трахомныя вочы на азызлым твары.* К. Чорны. *Яе шырокі адутлаваты твар сардэчніцы быў белы як палатно* І. Навуменка.

**АКОРАНЫ,** ГОЛЫ.

*Крыштальнымі кроплямі цёплай жывіцы слязіліся свежыя пні і акоранае яловае бярвенне.* М. Машара. *Бярвенні голыя упокат на жоўтым беразе ляглі.* А. Пысін.

**АКОРД,** СУГУЧНАСЦЬ, СУГАЛОССЕ.

*Праходзіць па бруку маё пакаленне. Акорды баяна плывуць па каменнях.* А. Александровіч. *Недзе ў сярэдзіне хутароў, на полі, чутна песня, а можа простая сугучнасць неразборлівых слоў.* В. Каваль. *Мяккія, ласкавыя гукі*

*стройным сугалоссем паліліся па пакоі.* Я. Колас.

**АКУРАК**, НЕДАКУРАК; БЫЧОК *(разм.)*
*Блукаюць цені па сцяне, ляжаць акуркі ад цыгарак.* А. Астрэйка. *Тамаш выдзьмуў спрытна з папяросніка недакурак* К. Чорны. *Лёня кінуў так і не дакураны бычок, растаптаў яго...* Я. Брыль.

**АЛАДКА**, БЛІН, БЛІНЕЦ /*тонкі:* НАЛІСНІК /*з грэцкай мукі:* ГРАЧАНІК /*з дранае бульбы:* ДРАНІК.
*З аладкі дзядзька рабіў трубку, каб лепш здаволіць сваю губку і больш зачэрпаць верашчакі.* Я. Колас. *Расце стопка бліноў на белым абрусе...* З. Бядуля. *Ай, які спакуслівы пах ад гэтых грачанікаў!* А. Якімовіч. *Чуваць, Каця трэ бульбу на дранікі.* М. Лобан.

**АЛІВА**, МАСЛІНА.
*Вакол дамоў вузлаватыя ствалы алій.* В. Вольскі. *На Апшэроне вырошчваюць шафран, масліны і розныя кветкі.* БелЭн.

**АЛФАВІТ**, АЗБУКА /*азбука Морзе:* МАРЗЯНКА.
*У шафе запаслівага Паўла Данілавіча знайшлася разразная азбука, якой вучыўся і я сам.* А. Якімовіч. *Зося ўпершыню ў жыцці пашкадавала, што не ведае марзянкі.* В. Хомчанка.

**АМЕЦІ**; АЦІРА *(абл.)*.
*Сцяпан Калачык закончыў пасад і пераграбаў амеці.* А. Чарнышэвіч. *А ля балот радасць кароўя – таўкачыкі – хапіць тое каліва ў зуб пасля трушанкі зімняй ды аціры.* М. Лынькоў.

**АНУЧА**, СЦІРКА; ШМАТА, ШМОТКА, АШМОЦІНА.
*Яго загадзя яшчэ злавілі, звязалі, заткнулі анучаю горла, каб аж енку не падаў.* К. Чорны. *Выткаўшы, бяліла, але так – на сціркі...* Я. Купала. *Ён спакойна закруціў у шмотку няшчасную фатаграфію.* М. Зарэцкі.

**АПАРАЖНІЦЬ**; СПАРАЖНІЦЬ, АСУШЫЦЬ.
*Даўно апаражнілі бутэлькі з вадой, што былі ў дзяўчат.* І. Пташнікаў. *Піялу з зялёным чаем асушы* Р. Барадулін.

**АПЛАДЫСМЕНТЫ**, ВОПЛЕСКІ *(мн.)*; АВАЦЫЯ *(адз.)*.
*Новага старшыню павіншавалі апладысментамі, на гэтым сход закончыўся.* У. Шахавец. *Гучныя воплескі не даюць прамоўцу скончыць* К. Чорны. *Яго праводзілі авацыяй. Білі ў ладкі, крычалі...* М. Зарэцкі.

**АПОРА**; АПІРЫШЧА; СТОЙКА.
*Яны чапляліся за кожную ламачыну, за леташні чаротнік, каб толькі знайсці сабе апору.* Я. Маўр. *Столь над нізкім вугальным забоем падпірае стойка не адна.* М. Аўрамчык.

**АПОШНІ**, АСТАТНІ, КАНЧАТКОВЫ, КАНЦАВЫ, ХВАСТАВЫ; **ФІНАЛЬНЫ**; РАЗВІТАЛЬНЫ.
*Апошняя ў папа жонка.* Прыказка. *А старанны будзеш, да навукі здатны – я прадам кароўку і кажух астатні.* Я. Колас. *Адно разумеў Юткевіч добра: прысуд будзе канчатковы, і жах апаноўваў яго, пот, буйны халодны пот выступіў на целе.* Б. Мікуліч. *Аб усім гэтым думаў і ўспамінаў Чыжык, стоячы канцавым у шарэнзе.* М. Лупсякоў. *Трывожныя, развітальныя гудкі давалі паравозы, адзін за адным паволі адыходзячы за мост.* Р. Няхай.

**АПРАЎДАЦЦА**, АБАРАНІЦЦА /*на словах;* АДГАВАРЫЦЦА.
*Людзі бачылі, як хлопец нёс. Чым апраўдаешся пасля?* А. Пальчэўскі. *А ці сказаў ты слова, каб абараніцца?* К. Чорны.

**АПРАЧА**, АПРОЧ, АКРАМЯ; АКРЫМ, КРОМ . ЗА ВЫКЛЮЧЭННЕМ, НЕ ЛІЧАЧЫ, КАЛІ НЕ ЛІЧЫЦЬ.
*Папрадаваў усё, апрача хаты.* М. Гарэцкі. *Апроч сілы, мне нічога бацька не пакінуў...* Я. Колас. *За сталом, акрамя іх, сядзела яшчэ жанчына год пад сорак...* У. Караткевіч. *Нікога ён, акрым сябе, не любіць.* У. Караткевіч.

**АП'ЯНЕННЕ**, СП'ЯНЕЛАСЦЬ; АЧМУРЭННЕ, ХМЕЛЬ, ДУРМАН *(разм.)*.

*Ён многа выпіў, але ап'яненне адразу прайшло* М. Лынькоў. *Куля драмаў, відаць, ці так ляжаў у п'яным ачмурэнні* . Я. Брыль. *Хмель ад першай чаркі закружыў галаву.* М. Лупсякоў. *Гідка і надзвычайна прыкра ўбіраць у грудзі мутны дурман адгону.* . М. Нікановіч.

**АП' ЯНЕЦЬ**, СП' ЯНЕЦЬ, СП'ЯНІЦЦА, ВЫПІЦЬ, ПАДВЫПІЦЬ, ПАДПІЦЬ, НАПІЦЦА, УПІЦЦА, ПЕРАПІЦЬ, ПЕРАПІЦЦА, СПІЦЦА; АХМЯЛЕЦЬ, ЗАХМЯЛЕЦЬ, НАСМАКТАЦЦА, НАЖЛУКЦІЦЦА, НАЛІЗАЦЦА, НАЛЫКАЦЦА, НАСЦЯБАЦЦА, НАСЦЕБАЦЦА, НАБРАЦЦА, ПЕРАБРАЦЬ, ЗВІЦЦА, АКАСЕЦЬ, АДУРЭЦЬ *(разм.)* НАБРАЦЦА ГАРЭЛКІ, УЗЯЦЬ ЧАРКУ, ЗАЛІЦЬ ВОЧЫ, НАСТУПІЦЬ НА КОРАК, БЫЦЬ НА ЎЗВОДЗЕ.

*Лабановіч ужо зусім ап'янеў. Праўда, цвярозых тут і не было, апрача паненак...* Я. Колас. *Ён калі вып'е – дурны робіцца* А. Савіцкі. *Закончыць працу – і ў буфет, насмокчацца, бывала, як не след...* У. Корбан. *– Ну і нажлукціўся, як свіння, – злосна сказаў, адыходзячы ад п' янага.* І. Новікаў. *Тут былі і такія, што паспелі налізацца і спявалі песні.* Я. Колас. *А той афіцэр, загадаўшы мне першаму выпіць, – мусіць, гад, баяўся, каб я атруты якой не паднёс, потым налыкаўся.* Р. Сабаленка. *А Зеўс тым часам насцябаўся, што носам чуць зямлю не рыў...* «Тарас на Парнасе». *Каменданту падлівала, пакуль той не акасеў.* А. Астрэйка.

**АРАТЫ**; АРАТАЙ, РАТАЙ, ПЛУГАР *(уст.)*.

*Сям-там відны былі аратыя, чорныя гракі хадзілі за імі, падбіраючы чарвякоў.* А. Чарнышэвіч. *Зранку ў полі за сахою аратай гукае...* Я. Колас. *Ратай, ратай, ідзі на шнур!* З. Бядуля. *Час пачынаць ільну пасеў, выходзьце, плугары!..* А. Бялевіч.

**АРКУШ**, ЛІСТ.

*На чыстым аркушы, прад вузенькім акном, прыгожа літары выводзіць ён пяром.* М. Багдановіч. *Крывыя подпісы мужыкоў занялі ўвесь ліст паперы.* Я. Колас.

**АРХІТЭКТАР**; ДОЙЛІД *(уст.)*.

*Ідзе архітэктар. задумай багаты. ён бачыць свой горад, прыгожы, крылаты!* П. Броўка. *Той смелы дойлід, што ўздымаў муры, – мастацтва бог.* М. Лужанін.

**АРЭОЛ**, НІМБ.

*Зямля ў блакітным арэоле, у тонкіх жылках сініх рэк.* С. Грахоўскі. *Фарба ад німбаў у Елісея расплылася па галаве.* У. Караткевіч.

**АРЭШНІК**, ЛЯШЧЫННІК, ЛЯШЧЭЎНІК.

*Між стогадовых тоўстых дрэў – гушчар з арэшніку, маладых бяроз, ліп.* А. Якімовіч. *А якія вялікія арэхавыя шышкі рвалі мы з ляшчынніку!* М. Паслядовіч.

**АСАБЛІВАСЦЬ**, СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ, УЛАСЦІВАСЦЬ, ЯКАСЦЬ, РЫСА, КЛЯЙМО, ЗНАК, АДЗНАКА, ПРЫКМЕТА, АДМЕТА, АДМЕТНАСЦЬ, БОК, ХАРАКТАР, СПЕЦЫФІКА, АТРЫБУТ, СІМПТОМ, ШТРЫХ.

*Жыццё ў пагранíччы мае свае асаблівасці.* Я. Колас. *Тут табе кветкі, а тут і плады! Гэта ўжо такую ўласцівасць мае дрэва.* Э. Самуйлёнак. *Самай важнай і цікавай рысай паэзіі Паўлюка Труса была яе народнасць.* К. Чорны. *Гальштук або капялюш лічыліся ганебнымі атрыбутамі старога свету.* М. Паслядовіч. *І першым сімптомам хвароб росту бывае заўсёды недахват кадраў, недахват людзей.* Х. Шынклер.

**АСАДКА**, РАМКА.

*Калі заходзіш у гэтую хату, яшчэ з парога ў вочы кідаецца невялічкі партрэт, што вісіць у зграбнай ружовай асадцы на сцяне.* Б. Сачанка. *У рамцы сумуе Купала.* М. Танк.

**АСЕЦЬ**, ВОСЕЦЬ, КЛУНЯ.

*Вячэралі ў кухні без Анупрэя. ён начаваў у асеці, дзе сушыўся лён.*

М. Машара. *Ды вы з канём? дык заязджайце, вось тут пад клуняю стаўляйце, сюды, за гэты стог саломы!* Я. Колас.

**АСЁЛ,** ІШАК.

*Аслу з напоўненай машною леў акаваны лапы ліжа...* Я. Купала. *Я ў пустыні, канешне, вярблюда шукаў, а сустрэў, як на смех, аднаго ішака.* А. Вольскі.

**АСІЛАК,** СІЛАЧ, ЗДАРАВЯК, ЗДАРАВІЛА, ЗДАРАВЕЦ, ВОЛАТ, АТЛЕТ; БУГАЙ *(перан.).*

*Ад голаду нават і ён, калісьці проста асілак, тут неўзабаве адчуў, што не можа хадзіць.* Я. Брыль. *Не вылучаецца нічым – ні сілай волата, ні ростам.* А. Астрэйка.

**АСІПНУЦЬ,** АХРЫПНУЦЬ.

*Боганчык зусім ахрып, крычучы.* І. Пташнікаў.

**АСКЕТ,** ПУСТЭЛЬНІК; МАНАХ *(перан.).*

*Каб спакусіць святых аскетаў, шатан прымаў аблічча жанчыны.* Я. Колас. *Калега – манах. Ён любіць глуш і адзіноцтва і хоча жыць пустэльнікам.* Я. Колас.

**АСЛАБЕЦЬ,** САСЛАБЕЦЬ, АСЛАБНУЦЬ, САСЛАБНУЦЬ, АБЯССІЛЕЦЬ, ЗНЯСІЛЕЦЬ, ЗНЯСІЛІЦЦА, ЗАНЯДУЖАЦЬ, АБНЯДУЖАЦЬ, ЗНЯДУЖЫЦЦА, ЗМАГЧЫСЯ, ЗАНЕМАГЧЫ, ЗНЕМАГЧЫ, АБНЕМАГЧЫ, АБНЕМАГЧЫСЯ, ЗНЕМАГЧЫСЯ, АКВОЛЕЦЬ, СТАМІЦЦА, УТАМІЦЦА, ПРЫТАМІЦЦА, ЗАТАМІЦЦА, НАТАМІЦЦА, ЗМАРЫЦЦА, ЗАМАРЫЦЦА, ЗАДЫХАЦЦА, ЗВЕРАДЗІЦЦА, УВЕРАДЗІЦЦА, ПЕРАВЕРАДЗІЦЦА, ЗМАРДАВАЦЦА, СПРАЦАВАЦЦА, НАРАБІЦЦА, ПЕРАРАБІЦЦА, ЗАПАРЫЦЦА, ПАДАРВАЦЦА, НАДАРВАЦЦА, НАДЛАМАЦЦА, ПАДКАСІЦЦА, НАЦЯГАЦЦА, ЗНЯБЫЦЦА, ЗДАРОЖЫЦЦА, ПРЫСТАЦЬ, ПРЫТУПАЦЦА, ПРЫБІЦЦА, ЗАЦЯГАЦЦА, ЗДАЦЦА, ЗДАЦЬ, ДАЦЦА, ЗНІБЫТКАВАЦЦА, СТРАЦІЦЬ СІЛЫ ВЫБІЦЦА З СІЛЫ, ВЫБІЦЦА З СІЛ, ЗБІЦЦА З НОГ, ЗВАЛІЦЦА З НОГ, НЕ ЧУЦЬ РУК.

*Не дзеля таго саслабела яна, што галодная была...* Ядвігін Ш. *Душы сільныя абяссілелі...* Я. Купала. *Начальства з дарогі. Змаглося...* А. Куляшоў. *Урэшце замарыліся і селі.* Б. Сачанка. *Уставай! Зверадзіўся вельмі!* Ц. Гартны. *Бацька дык змардаваўся за дзень, з ног зваліўся.* І. Пташнікаў. *Калі яна зваліцца з ног – каб хоць слова хто ёй сказаў добрае. Каб хто вады ёй падаў.* К. Чорны.

**АСНОВА,** ПАДСТАВА, ГЛЕБА, ГРУНТ, БАЗА, ПАДМУРАК, ФУНДАМЕНТ; УСТОІ *(мн.).*

*Зямля, брат, для мужыка – аснова...* М. Зарэцкі. *У грунце гэтай непрыязнасці ляжала пачуццё зайздрасці.* М. Зарэцкі. *Я не кажу таго, што ў большасці каровы – фундамент усяго: здохні карова – і няма чаго есці, і прападае гаспадарства.* Ц. Гартны.

**АСТАТАК,** АСТАЧА, РЭШТА.

*Прыйшоў нястатак, забраў астатак.* Прыказка. *Гэтую рэшту сала ён палажыў у кішэню з развагаю: – А гэта я занясу Марыльцы.* К. Чорны.

**АСТЫЦЬ,** ВЫСТЫЦЬ, ПРАСТЫЦЬ, АХАЛОДАЦЬ, АХАЛАДЗЕЦЬ; АДУБЕЦЬ, ЗЛЕДЗЯНЕЦЬ.

*Хата за ноч добра такі астыла.* П. Пестрак. *Слаўся змрок, у цені трава даўно ахаладзела...* К. Чорны. *Еш, бо крупнік адубее ...* Я. Колас. *Зноў з падвалаў прыйшла цішыня, кроў зледзянела ў жылах.* М. Танк.

**АСУДЖАЦЬ,** СУДЗІЦЬ, ДАКАРАЦЬ, БІЧАВАЦЬ.

*І Марыя не асуджала яе за гэтыя, магчыма, трохі і лішнія словы.* А. Кулакоўскі. *Сябе суджу і дакараю бязлітасна суровай меркай...* А. Лойка. *Ды ўсё больш хвалім сябе самі, другіх бічуем заўсягды.* Я. Купала.

**АСЦЯРОЖНА,** СПАСЦЯРОЖЛІВА, НАСЦЯРОЖАНА, ЗАСЦЯРОЖЛІВА, З АСЦЯРОГАЙ, БЕРАЖНА, АБАЧЛІВА, АПАСЛІВА З АГЛЯДКАЙ.

*Асцярожна везлі мужчыны вулей.* Я. Колас. *Мы друга ў апошні праводзілі шлях, на ложа гранітнае беражна клалі, стаіўшы дыханне, як кулі ў ствалах, якія ў патронніку хлопцы даслалі* С. Гаўрусёў. *У пакой абачліва, камечачы шапку, усунуўся бялявы хлопец у сялянскай адзежы, сезоннік.* Х. Шынклер. *Давярайць – давярай, але з аглядкай.* А. Асіпенка.

**АТРУТА,** ЯД.

*Мерлі людзі і жывёла, як з затруты мухі.* Я. Колас. *Кожны гад мае свой яд.* Прыказка.

**АЎТАРУЧКА**; САМАПІСКА ВЕЧНАЕ ПЯРО.

*Ён выняў з нутраной кішэні зашмальцаваны блакнот, аўтаручку, запісаў Юркава прозвішча, імя...* У. Карпаў. *Нічыпар угледзеў на яго каленях сшытак, а ў руках самапіску.* А. Асіпенка. *У бакавой кішэні залатое вечнае пяро.* А. Куляшоў.

**АХАЙНЫ,** ДАГЛЕДЖАНЫ, ЧЫСТЫ, АКУРАТНЫ.

*Вы разумееце, жанчына заўсёды павінна выглядаць ахайнай і свежай.* М. Паслядовіч. *Старожка Малання, у белай вышыванай кашулі, чыстая і акуратная маладзіца, увіхаецца каля печы.* Я. Колас.

**АХАЛОДЖВАЦЬ,** ХАЛАДЗІЦЬ, СТУДЗІЦЬ, АСТУДЖВАЦЬ, ЗЯБІЦЬ, СЦЮЖЫЦЬ.

*Вельмі салодкі і духмяны, мараканскі чай прыемна ахалоджвае рот і горла.* В. Вольскі. *Дзе гэта відана, каб так часта попел выносіць, толькі хату студзіць.* М. Лынькоў. *І смех твой стаў такі пусты, а словы сцюжаць, як снягі.* К. Кірэенка.

**АЦЭНКА,** ХАРАКТАРЫСТЫКА, АТЭСТАЦЫЯ; АБМАЛЁЎКА *(перан.).*

*Настаўнікі ведаюць паэта [Якуба Коласа] як вопытнага педагога і хочуць непасрэдна ад яго пачуць ацэнку сваёй работы.* М. Хведаровіч. *Яна не ведала, дзе дзецца, слухаючы атэстацыю сваёй нявесткі.* Ц. Гартны.

**АШУКАНЕЦ,** ПАДМАНШЧЫК, МАНЮКА, МАХЛЯР, КРУЦЕЛЬ, ЖУЛІК, ШЭЛЬМА, ЛОТРА, ПРАЙДЗІСВЕТ, ПРАЙДОХА, ПРАНЫРА, ПРАЛАЗА, ХІТРЭЦ, ХІТРУН, СПРЫТНЮГА, МАШЭННІК, ЧМУТ, СІМУЛЯНТ, АФЕРЫСТ, АВАНТУРЫСТ, КАМБІНАТАР, ШАРЛАТАН, ШУЛЕР.

*Дык ты вунь які абармот? Дык ты вунь хто! Ашуканец...* Р. Сабаленка. *Але гэтым вестакм не дужа вераць, бо Сцяпан добры манюка.* А. Асіпенка. *Недаважыць, недакіне, недамерае, махляр...* А. Бялевіч. *Сцяпан яшчэ доўга гаварыў, якія круцялі гэтыя мястэчковыя гандляры.* Я. Колас. *Ніякі ён не хворы, проста сімулянт, хоча, каб вызвалілі ад работы.* І. Гурскі. *І тут ва ўсёй пукатасці вымалявалася фігура агіднага машэнніка, вопытнага злачынцы, палітычнага аферыста, класавага ворага.* Х. Шынклер.

**АШУКАЦЬ,** АБМАНУЦЬ, АБМАНІЦЬ, ПАДМАНУЦЬ, АБДУРЫЦЬ, ПАДДУРЫЦЬ, ПРАВЕСЦІ, ПАДВЕСЦІ, АБВЕСЦІ, ЗВЕСЦІ, АБЫСЦІ, СХІТРАВАЦЬ, СХІТРЫЦЬ, АБХІТРЫЦЬ, ПЕРАХІТРЫЦЬ, АБЛІЧЫЦЬ, АБВАЖЫЦЬ; АБГУЛЯЦЬ, ПАДСЕДЗЕЦЬ, СКРУЦІЦЬ, АБКРУЦІЦЬ, АБЛЫТАЦЬ, АПУТАЦЬ, НАГРЭЦЬ, АБАЛВАНІЦЬ, АБЖУЛІЦЬ, ЗЖУЛЬНІЧАЦЬ, АЧМУРЫЦЬ, АЧМУЦІЦЬ *(разм.)* УВЕСЦІ У ЗМАН, АБВЕСЦІ ВАКОЛ ПАЛЬЦА, АБКРУЦІЦЬ ВАКОЛ ПАЛЬЦА, ПАДВЕСЦІ ПАД МАНАСТЫР, ПУСЦІЦЬ ПЫЛ У ВОЧЫ, ПУСЦІЦЬ ПЫЛУ Ў ВОЧЫ, АБУЦЬ У ЛАПЦІ.

*Не, матку не абдурыш, не схаваеш ад маткі нічога.* А. Чарнышэвіч. *Каетан адчуў, што наперакор ветру не падзьмеш, і парашыў схітраваць.* П. Броўка. *Жулік жуліка абжуліў.* К. Крапіва. *Таго Міканора каморнік сорак разоў абкруціць вакол пальца!* І. Мележ. *І яна цябе падвядзе пад манастыр, памянеш маё слова. Бабы, брат, яны ўсе такія – хітрыя, як*

*чэрці.* І. Шамякін. *І пароды хітрай. Ураз у лапці абуе.* М. Ткачоў.

**АШЧАДЖАЦЬ,** БЕРАГЧЫ, ЗБЕРАГАЦЬ, АДКЛАДАЦЬ, ЗБІРАЦЬ, ШАНАВАЦЬ, ЭКАНОМІЦЬ.

*Зарабляла яна не шмат, грошай на ўсё не хапала, і яны ашчаджалі кожную капейку і як-кольвечы жылі.* В. Быкаў. *Хто капейкі не беражэ, таго рубель баіцца.* Прыказка. *Юрка зберагаў кожную капейку.* А. Асіпенка.

**АШЫЙНІК;** АБРОЖАК *(абл.).*

*Мітрафан нахіліўся і ўзяў за ашыйнік сабаку, які ацірауся ля ног.* Э. Самуйлёнак. *Для Рыжыка гаспадар зрабіў будку, купіў ланцуг і пашыў моцны аброжак з гужа.* У. Дамашэвіч.

## Б

**БАГАТЫ,** ЗАМОЖНЫ, БЯЗБЕДНЫ: ГРАШАВІТЫ, ГРАШОВЫ, З ГРАШЫМА.

*Увосень і верабей багаты.* Прымаўка. *Звычайна, калі паміраў хто з заможных людзей, яго прывозілі хаваць на спецыяльным катафалку* А. Александровіч. *Вы, мабыць, думаеце, што на свеце няма людзей з грашыма?* А. Чарнышэвіч.

**БАГАЦЦЕ,** ЗАМОЖНАСЦЬ, ДАСТАТАК, СКАРБ; ЗОЛАТА, КІШЭНЯ, МАШНА *(перан.)* ЗАЛАТЫЯ ГОРЫ, МАЛОЧНЫЯ РЭКІ.

*З часам жа лапці – гаю, ой, гаю! – выпра дастатак з нашага краю.* Я. Купала. *Цяпер у нас і балота – золата.* Прымаўка. *Што мне горы залатыя? Што мне рэкі дыяментаў?* П. Панчанка.

**БАДЗЁРЫ,** ЖЫЦЦЯРАДАСНЫ, ПРЫЎЗНЯТЫ, УЗНЁСЛЫ, АПТЫМІСТЫЧНЫ; МАЖОРНЫ, СВЕЖЫ *(перан.)* ПОЎНЫ СІЛЫ.

*Дыхалася лёгка, думкі былі ясныя, а сам я – бадзёры.* А. Карпюк. *Марылька гэтакая была жыццярадасная, гэтакая вясёлая. Маладосць!* К. Чорны. *Настрой у яго ўзнёслы* І. Шамякін. *Мама – у вечнай сваёй трывозе, непадкупнай для знарок завышана аптымістычных Алесевых пісьмаў.* Я. Брыль. *Хай позні чмель гудзе мажорным басам, разбуджаны расінкаю ўначы.* А. Пысін.

**БАДЗЯГА,** ТУЛЯГА, БЛУКАЛЕЦ; ВАЛАЦУГА; ЦЫГАН *(перан.).*

*Каб не трапілі бадзягі у такі багаты дом, галасістыя дварнягі залівaліся вакол.* П. Броўка. *Няхай жа агорне ноч цёмна-нямая падступных падлюг і туляг!* Я. Колас. *Калі ты не будзеш такім, як трэба, то пойдзеш на вуліцу і будзеш начаваць з валацугамі пад баржай.* Э. Самуйлёнак.

**БАКАС,** ЧЭПІК.

*Бакас таропка ўзмахвае крыламі над галавой, – здаецца, дзеўбане.* П. Прануза. *Прыляцелі жаўрукі, і зязюлі, і шпакі, качкі, чэпікі, з імі ластаўкі.* М. Танк.

**БАКЕНБАРДЫ,** БАКІ, ПЭЙСЫ; БАКЕНЫ.

*Вось тут усюды абгаліць і пакінуць бакенбарды.* З. Бядуля. *... Бакены на твары, а твары, як пасля гулянкі.* Б. Мікуліч.

**БАЛЕЦЬ,** СМЫЛЕЦЬ, ШЧЫМЕЦЬ, САДНІЦЬ /ад холаду: ЗАХОДЗІЦЦА; НЫЦЬ, ПЯЧЫ, ГАРЭЦЬ, КАЛОЦЬ, ЛАМАЦЬ, ТУЗАЦЬ, РАЗВАЛЬВАЦЦА *(перан.).*

*На тое б'юць, каб балела.* Прыказка. *Будзе смылець скатаванае цела...* В. Таўлай. *Вельмі садніла параненая шчака.* М. Лынькоў. *Пасля валтузні з сабакамі рана на назе пачала ныць.* К. Чорны. *Учора пані скардзілася, што ў плячах коле.* К. Крапіва. *Рукі мае ныюць. Спіна ломіць...* І. Пташнікаў.

**БАЛОТА,** БАГНА, ДРЫГВА, ТВАНЬ; ДРЫГВЯНІК, АЛЁС /мохавае: ІМШАРА, ІМШАРЫНА, ІМШАРЫШЧА.

*На балоце з чаратамі лазнякі шапталі...* Я. Колас. *Бо спяваюць нават жабы ў багне.* М. Багда-

новіч. *Абы дрыгва, а чэрці будуць.* Прыказка. *На дне сінеючае твані лілеі вецер варушыў.* П. Трус. *Няма на імшарах палескіх скалістых аснежаных стром...* М. Аўрамчык.

**БАЛЬ,** БАНКЕТ, БЯСЕДА.

*У асеннія доўгія ночы пачынаюцца балі, гульні і розныя вясёлыя забавы.* З. Бядуля. *Больш гарэлка разбірае, стаў банкет іх ажываць...* Я. Колас. *На шырокую бяседу накрываюцца сталы.* М. Лужанін.

**БАЛЬНІЦА,** БОЛЬНІЦА /*спецыяльная:* ЛЯЧЭБНІЦА /*дзе вядзецца навуковая і навучальная работа:* КЛІНІКА /*вайсковая:* ШПІТАЛЬ, ЛАЗАРЭТ.

*Я захварэў на воспу, маці панесла мяне ў бальніцу.* Я. Маўр. ... *Яго паклалі ў трупярню лячэбніцы.* Л. Арабей. *Бязногіх, бязрукіх салдат развозяць двухколкі ў шпіталі.* Я. Пушча. *Два разы быў паранены, ляжаў у лазарэце і зноў вяртаўся ў акопы.* П. Галавач.

**БАРАБАН,** БУБЕН /*у афрыканцаў:* ТАМТАМ.

*Б'юць барабаны. Трубы трубяць зычна...* А. Зарыцкі. *А на ігрышчы будзе гармонік і бубен, і можна кружыць і кружыць – да папрадух, да новага золку.* Я. Скрыган.

**БАРАН** /*вытворнік:* МАРКАЧ.

*Авечку стрыгуць, а баран дрыжыць.* Прыказка. *– Авец колькі? – Трыццаць тры маткі, пяць маркачоў і васемнаццаць ягнят.* М. Лобан.

**БАРАНАВАЦЬ,** СКАРОДЗІЦЬ.

*Бацька сеяў, а я па свежых слядах баранаваў...* М. Хведаровіч. *Я і вырашыла ісці, як ты кажаш, на нізавую працу. Буду араць, сеяць, скародзіць.* М. Лупсякоў.

**БАРАЦЬБІТ,** ЗМАГАР, БАЕЦ; ЗМАГАНЕЦ, ЗМАГАННІК, ВАЯКА, ВАЯК.

*Кожны наш стрэл па ворагу павінен узнімаць новых барацьбітоў, папаўняць нашы рады.* І. Шамякін. *Мы – хлопцы гартаваныя, мы – волі змагары.* М. Машара. *Сеў вояк на каня, ў рукі ўзяў востры меч...* Я. Купала.

**БАЦЬКАЎШЧЫНА,** РАДЗІМА, АЙЧЫНА, РОДНЫ КРАЙ, СВОЙ КРАЙ, НАШ КРАЙ, РОДНАЯ КРАІНА, СВАЯ КРАІНА.

*Слава бацькаўшчыне нашай і яе народам!* Я. Купала. *Ці ёсць такая дзе яшчэ другая, як ты, мая Радзіма дарагая?!* Я. Пушча. *Паў за айчыну любую салдат...* А. Зарыцкі. *О край родны, край прыгожы, мілы кут маіх дзядоў!* Я. Колас. *Ваяваў я на вайне за сваю краіну.* Я. Купала.

**БАЯЦЦА,** ПАБОЙВАЦЦА, СТРАШЫЦЦА, ПАЛОХАЦЦА, ПУЖАЦЦА, ПУДЗІЦЦА, ЖАХАЦЦА, АПАСАЦЦА, НЕ РАШАЦЦА; ДРЭЙФІЦЬ (*разм.*): ТРУСІЦЬ (*абл.*) ДРЫЖАЦЬ, ДРЫЖЭЦЬ, КАЛАЦІЦЦА, ТРЭСЦІСЯ АД СТРАХУ – ГЛЯДЗЕЦЬ У КУСТЫ, ПАЗІРАЦЬ У КУСТЫ, ПАДТУЛЬВАЦЬ ХВОСТ, ПАДАЦЬ ДУХАМ.

*Ядвіся баялася панскіх сабак.* М. Лынькоў. *Але палохацца цяпер не было чаго: бандыта моцна трымалі.* В. Быкаў. *Не пужайся, дурны, то аўчынкі вісяць.* Я. Колас. *Бацька нёс на плячах мех мукі, а маці вяла карову, якая пудзілася папялішча.* І. Гурскі. *Перад кім трусіць? Свае ж рабочыя.* Ц. Гартны. *За сваю дрыжаў ён скуру.* А. Астрэйка. *Гэта – камендант Шчэнсновіч, перад якім дрыжэла ўсё мястэчка..* П. Пестрак. *І сходзяць іх часіны – калоцяцца паны...* Я. Колас. *Трасецца трохі дзед ад страху.* Я. Колас. *Дык мо здацца скажаш ты? Не глядзі, брат, у кусты.* А. Астрэйка. *Не трэба толькі пазіраць у кусты, трэба менш думаць пра арышты, а больш пра газету.* М. Машара. ... *Туляліся па кутках і падтульвалі хвасты...* А. Кулакоўскі. *Генерал не падаў духам, хоць правальваўся па бруха.* А. Астрэйка.

**БЕДНАСЦЬ**, БЯДНОТА, ГАЛЕЧА, ГАЛОТА, УБОГАСЦЬ, УБОСТВА, ЖАБРАЦТВА. НЯСТАЧА, БЕЗГРАШОЎЕ; НЕДАСТАЧА, НЯСТАТКІ, НЕДАСТАТКІ *(разм.)* НЭНДЗА, ГАЛЫТВА; ГОЛЬ, ГАЛАЙСТРА; ТОРБА *(перан.)*.

*У хаце была беднота, але гаспадыня, дбайная, акуратная, спадабалася Лене.* У. Калеснік. *Рабілі калісь ад цямна да цямна, а пасціла толькі галеча адна.* А. Александровіч. *А па местах і па сёлах бродзіць голад, нэндза.* Я. Колас. *А пра нас, дык проста, кажа, дурні, галайстра.* Я. Брыль.

**БЕДНЫ**, НЕБАГАТЫ, ГОЛЫ, ЗБЯДНЕЛЫ, ЗГАЛЕЛЫ, АГАЛЕЛЫ, НЕЗАМОЖНЫ, УБОГІ, ЖАБРАЦКІ; ГАЛАПУЗЫ; СЯРМЯЖНЫ *(перан.)*.

*Бедныя былі ў нас людзі, па заработках цягаліся, служылі за няшчасныя рублі, за скарынку хлеба.* Я. Колас. *Незаможныя бацькі мае, як, дарэчы, дзяды і прадзеды, працавалі на зямлі...* Е. Лось. *Убогая, старая вёска! Ты ў рызманах, ты ўся ў саломе...* Я. Колас. *Вечна не знаем суду і права, цёмны народ мы сярмяжны.* Я. Купала.

**БЕЗНАДЗЕЙНЫ**, НЕПАПРАЎНЫ; АДПЕТЫ, ПРАПАШЧЫ, АПОШНІ.

*Ён быў на два класы старэй за мяне і меў рэпутацыю безнадзейнага гультая і абібока.* Я. Скрыган. *Прапашчы я чалавек, таварыш...* М. Зарэцкі. *А вось узялі і ў турму пасадзілі, як апошняга злодзея.* М. Лынькоў.

**БЕРВЯНО**, КАЛОДА, КРУГЛЯК; БЯРНО.

*Бервяно да бервяна – хата новая.* А. Александровіч. *Уз'ехалі на твой двор з фурманкамі, кладуць на вазы дубовыя круглякі...* К. Чорны. *Падрубу лёгка замяняюць (у лесе знойдзецца бярно).* Ю. Свірка.

**БЕСКЛАПОТНЫ**, БЕСТУРБОТНЫ, ЛЕГКАДУМНЫ.

*Часта чулася бесклапотная гамонка і звонкі смех дзяўчат.* У. Шахавец. *Дні маленства мае, бестурботныя дні...* П. Глебка.

**БЕСПАДСТАЎНЫ**, НЕСПРАВЯДЛІВЫ, НЕАБГРУНТАВАНЫ. НЕГРУНТОЎНЫ, БЕСПРЫЧЫННЫ, БЯЗДОКАЗНЫ, ДАРЭМНЫ.

*Вашы абвінавачванні беспадстаўныя. Вось чаму я спытаўся ў вас аб прычынах арышту.* М. Лынькоў. *Марынка разумела добрыя намеры бацькі і ўсё ж прычыну пераходу лічыла негрунтоўнай.* Т. Хадкевіч. *І паімчаліся мы ўсцяж па рацэ, пакінулі дарэмную спрэчку.* У. Краўчанка.

**БЕСПАКАРАНА**; ТАК.

*Я не які-небудзь хлапчук, на якога можна беспакарана пакрыкваць.* М. Лынькоў. *Я сам падкажу, дзе яны хаваюцца. Думаеш, так ім і пройдзе?* М. Лобан.

**БЕСПАРАДАК**, НЕПАРАДАК, НЕРАЗБЯРЫХА, БЛЫТАНІНА, СУМБУР, ХАОС, БЕДЛАМ; БЯЗЛАДДЗЕ, РАЗЛАДДЗЕ, РЭЗРУХ, АНАРХІЯ; БАЗАР, ПАГРОМ, КАША *(перан.)*.

*Тут быў страшэнны непарадак – на тое час быў перабору. Залп у цэнтры абозу падняў яшчэ большы перапалох і хаос.* Я. Колас. *Прабач, мая каханая, прабач... За слоў сумбур...* С. Дзяргай. *Там быў ранішні рэзрух. Ляжалі непрыбраныя, расцягненыя пасцелі.* К. Чорны. *Дзяржава даўно хоча навесці парадак у землекарыстанні, знішчыць анархію і самавольства..* І. Мележ.

**БЕСПЕРАПЫННА**, БЕЗУПЫННА, НЯСПЫННА, НЕСУПЫННА, БЕЗУПЫНКУ, БЕЗ СПЫНУ, НЯСТРЫМНА, НЕЎГАМОННА, БЯСКОНЦА, БЕЗ КАНЦА, НЕСЦІХАНА, НЕЎЦІХАНА, НЕ СЦІХАЮЧЫ, НЯЗМОЎЧНА, НЯЎМОЎЧНА, БЕСПЕРАСТАНКУ, БЕСПЯРЭСТАНКУ, БЕСПЕРАСТАННЯ, БЕЗУСТАНКУ, НЕ ПЕРАСТАЮЧЫ; БЕЗ АДДУХІ, ЗАПАР, ЗАЛОЖНА *(разм)*.

*Страшна і безупынна грукатаў гром.* У. Караткевіч. *Яна гаварыла бясконца, не даючы яму ні запярэчыць, ні падзякаваць.* І. Шамякін. *Шуміць нязмоўчна змрочны акіян.* А. Зарыцкі. *За акном*

*няўмоўчна звінелі конікі, а па той бок дарогі, у імшарыне, кумкалі жабы* А. Асіпенка. *Гарматы білі бесперастанку* К. Чорны.

**БІЗУН**, ПУГА, НАГАЙКА, ГАРАПНІК, БАТОГ, ПЛЁТКА, ХЛЫСТ, КАНЧУК, КАРБАЧ, ДРАТАВАНКА, БІЧ.

*Цар указам, а пан бізуном* Прыказка. *Каня пугай хутка гані, паганяй.* Я. Купала. *Плеткамі пасечанае цела, да плячэй кашуля прыкіпела, ды жывы Данілка!* А. Бялевіч. ... *І хвастануў карбачом каня.* У. Караткевіч. *Лукаш закруціў над канём дратаванкаю...* Ц. Гартны. *Распусціўся язык, як фурманскі біч.* Прыказка.

**БІКЛАГА,** БАКЛАГА, ФЛЯГА.

*І мы, змарыўшыся, пілі, ваду ў біклагі набіралі...* М. Танк. *За Дняпро, Луару, Сену, Прыпяць – прапаную з фляг паходных выпіць.* П. Панчанка.

**БІЦЬ,** ЗБІВАЦЬ, УДАРАЦЬ, СЦЁБАЦЬ, СЦЯБАЦЬ, КАТАВАЦЬ, ЛУПЦАВАЦЬ, ПЕРЫЦЬ; ХВАСТАЦЬ, ЖАРЫЦЬ, ЛАТАШЫЦЬ, ЛУПІЦЬ, ТАЎЧЫ, ШПЫЛЯЦЬ, КУКСАЦЬ, КАЛАШМАЦІЦЬ, АКЛАДАЦЬ, БАТОЖЫЦЬ, ПІСАЖЫЦЬ, ШЛЁГАЦЬ, ШАЛЁСТАЦЬ, ГАСІЦЬ, ГАХАЦЬ, ПЯРЭСЦІЦЬ, ДУБАСІЦЬ, ДЖВАГАЦЬ, ГВАЗДАЦЬ, БАМБЕРЫЦЬ *(разм.);* ЧАСТАВАЦЬ, ХРЫСЦІЦЬ, СЯЧЫ, ПАЛАСАВАЦЬ, МАЛАЦІЦЬ, МЯСІЦЬ, ГРЭЦЬ *(перан.)* ЛІЧЫЦЬ СКАБЫ, ДАВАЦЬ КУХТАЛЁЎ.

*Б'юць і плакаць не даюць.* Прыказка. *Без жалю сцёбаем дубцамі свіней...* Б. Сачанка. *Катавалі іх бярозавымі дубцамі па голым целе.* З. Бядуля. *Мой бацька шмат разоў лупцаваў мяне за такія штукі, баюся!* К. Чорны. *І давай пярэсціць, давай дубасіць пана тою паплiскаю.* Казка. *Эх, вось дзе, мусіць, бамберыць недзе па іх спінах булава!* Я. Брыль.

**БЛАКНОТ,** НАТАТНІК, ЗАПІСНАЯ КНІЖКА; КАНДУІТ.*(перан., уст.).*

*У блакноце ён кожны дзень занатоўваў свае заўвагі.* З. Бядуля. *Пачаў нешта грымзоліць у неадлучным нататніку* М. Танк. *Яна дастала запісную кніжку і спешна пачала чытаць карандашныя нататкі.* Ц. Гартны. *Вось што ў тваім гэтым кандуіце запісана* І. Дуброўскі.

**БЛЕДНЫ;** БЛЕКЛЫ, БЕЛЫ, ЗБЯЛЕЛЫ, ПАБЯЛЕЛЫ, ВАСКОВЫ, БЯСКРОЎНЫ, ЗЯМЛІСТЫ *(перан.)* БЕЗ КРЫІВІНКІ.

*Анямелы ад страху, бледны як палатно, паплёўся Грыша з салдатамі.* Я. Колас. *Яўхім заўважыў, што твар яе блеклы, нездаровы, вочы запалі..* І. Мележ. *Пахудзелы твар быў белы, нос – вастраваты.* К. Чорны. *Прадаўгаваты васковы твар...* Ц. Гартны. *Жоўтае святло ад лямпачкі падала на яго сухі, бяскроўны твар.* А. Бажко.

**БЛІЗАРУКІ,** ПАДСЛЕПАВАТЫ.

*Вовік быў блізарукі, насіў акуляры ў рагавой аправе.* Т. Хадкевіч. *Дзед спускае на прыпек ногі і ўглядаецца сваімі падслепаватымі вачыма, што я там раблю.* Р. Сабаленка.

**БЛІЗКА,** НЕДАЛЁКА, НЕПАДАЛЁКУ, НЕПАДАЛЁК, НЕПАВОДДАЛЬ, ПАБЛІЗУ, ПОБЛІЗУ, ПОБАЧ, КАЛЯ, ПРЫ ПА СУСЕДСТВУ, У СУСЕДСТВЕ, ПАД БОКАМ, КАЛЯ БОКА, ПАД НОСАМ, ПАДАЦЬ РУКОЙ, НЕ ЗА ГАРАМІ.

*Блізка відаць, ды далёка дыбаць.* Прыказка. *Недалёка ад палаца ўздымаўся вялізны будынак дзяржаўных устаноў.* Я. Маўр. *Раптам поблізу заліўся брэхам нечы сабака...* І. Мележ. *Дзесьці, ужо зусім побач, скрыгочучы гусеніцамі і люта равучы маторамі, грукацелі танкі.* В. Быкаў. *І рэчка пад бокам, і процьма ў ёй рыбы.* Я. Колас.

**БЛІШЧАЦЬ,** БЛІШЧЭЦЬ, БЛІСКАЦЬ, БЛІСКАЦЕЦЬ, ПАБЛІСКВАЦЬ, ЗЗЯЦЬ, ЗІХАЦЕЦЬ, ЗІХАЦЕЦЦА, ЗІХЦЕЦЬ, ПАЛЫСКАЦЦА, ІЛЬСНІЦЦА, ІЛЬСНІЦЬ, ІРДЗЕЦЦА, ІРДЗЕЦЬ, ЗЫРЧЭЦЬ, ЯРКНУЦЬ, ЯСКРАВІЦ-

ЦА, ЯСКРАВЕЦЬ; ПРАМЯНІЦЦА, ЛЮСТРАНІЦЬ, ЛЮСТРАВАЦЦА, СВЯЦІЦЦА, ГАРЭЦЬ, ГРАЦЬ, ІСКРЫЦЦА, ПЕРАЛІВАЦЬ, ПЕРАЛІВАЦЦА, ШКЛІЦЦА, ЗАЛАЦІЦЦА, СЕРАБРЫЦЦА, СРАБРЫЦЦА *(перан.)*.

*Блішчаць на сонцы сталлю косы.* А. Гурло. ... *Бліскае крышталінамі соль.* С. Дзяргай. *Ззяюць хмаркі ў пазалоце.* Я. Колас. *Зіхацеў, пераліваўся і па сцёгнах абцякаў дадолу чорны шоўк.* Я. Скрыган. *Уверсе, над дваром, у цёмным небе, зырчэлі зоры.* М. Лупсякоў. *Стаяў жнівень, і ў небе ярклі вялізныя зоры.* М. Лупсякоў. *Да краёў асфальт гарыць, люстраніць, прамяніцца сонцам лак машын.* А. Русецкі. *А на замку пазалота грае ў чырвані, гарыць.* Я. Колас.

**БЛУДЗІЦЬ**, БЛУКАЦЬ.

*Хто пытае, той не блудзіць.* Прыказка. *Да сонца заходу нам трэба выйсці, каб не блукаць пасля ў пустыні ноччу.* У. Дубоўка.

**БЛЫХА**; СКОЧКА.

*Вострa пахне палыном: яго раскідваюць па падлозе наўмысна, каб не вяліся блохі.* І. Навуменка. *Не стой, Юрка, босы доўга на зямлі, а то скочкі на цябе panaлазяць, дык заснуць не дадуць.* К. Чорны.

**БЛЯВАЦЬ**, ВАНІТАВАЦЬ; РЫГАЦЬ.

*Ну і гніда ж гэты крыкун! Ці ганіць, ці хваліць, – бляваць хочацца...* І. Мележ. *Яго ванітавала, але ён перамагаў гэта і піў датуль, пакуль пляшка не апусцела.* А. Чарнышэвіч. *А потым дадавалі аб тым, як перапіліся паліцаі і валяліся на дварэ – хто спаў, а хто рыгаў на ўвесь падворак.* П. Пестрак.

**БОЙНЯ**; РАЗНІЦА.

*Ужо тры месяцы працуе Данілка на бойні ў мястэчку – падводзіць каровы пад нож.* П. Пестрак. *Прывык, як сабака да разніцы.* Прыказка.

**БОЛЬ**, БАЛЮЧАСЦЬ /*у касцях, суставах:* ЛАМАТА, ЛАМОТА; КАЛАЦЦЁ, КОЛЬКА *(разм.)*.

*Калі ж раны глыбокія будуць, боль пякучы заціснем рукой...* А. Астрэйка. *Нажыў удушша і ламоту ад тапара, сахі й касы* Я. Купала. *За дзвярыма Герман пачуў у баку страшную кольку.* Ц. Гартны.

**БОСЫ**, БАСАНОГІ, РАЗУТЫ.

*І тысячы басаногіх на той расе хлапчукоў.* П. Панчанка. *Вёску абдзёртую думкі трывожылі, блукаўся старац разуты, раздзеты.* Я. Купала.

**БОТ**; ЧОБАТ.

*Вялізныя боты, белыя ад пылу, пахнуць дзёгцем.* З. Бядуля. *Стары Мотэль, бацька Рывы, скончыўшы дзённую працу і палажыўшы апошні чобат пад свой шавецкі столік, маліўся богу.* М. Лынькоў.

**БРАЗГАЦЬ**; БРАЗГАТАЦЬ, БРАЗГАЦЕЦЬ, ЗВЯКАЦЬ.

*Дахоўшчыкі ўсё бразгалі над чацвёртым паверхам ацынкаванаю бляхаю.* К. Чорны. *Звякаюць кайданы. У гурт сышліся катаржане, від іх змардаваны.* Я. Колас.

**БРАЗГОТКА**, БРАСКОТКА, БРАШЧОТКА, ТРАШЧОТКА.

*На вуліцы ціха. Толькі са Слуцкай вуліцы чулася бразготка вартаўнікоў.* В. Сташэўскі. *Адно вартаўнікі хадзілі па вуліцы ды бесперастанна трашчалі трашчоткамі.* М. Чарот.

**БРАМА**; ВАРОТЫ, ВЕСНІЦЫ *(мн.)*.

*Але яна даганяла яго, убачыўшы за брамаю.* К. Чорны. *Выбег з варот сабака, пачаў абнюхваць сляды незнаёмых людзей.* К. Чорны. *Не падапрэш весніц, дык прыйдзе табе кожная свіння, капяне лычам і адкіне весніцы.* К. Чорны.

**БРАХАЦЬ**, ГАЎКАЦЬ, ЦЯЎКАЦЬ, ЗАЛЯГАЦЦА, ЕКАТАЦЬ, ЯХКАЦЬ ЗАЛІВАЦЦА БРЭХАМ.

*На тое і сабака, каб брахаць.* Прыказка. *Сабакі пазнавалі яго хаду, і ні адзін з іх не гаўкаў.* А. Чарнышэвіч. *Там недзе яхкаў сабака.* В. Адамчык.

**БРАЦЬ**, ЗАБІРАЦЬ, ПАДБІРАЦЬ, АДБІРАЦЬ; ГРАБАСТАЦЬ; ГРЭБЦІ,

ЗАГРАБАЦЬ, АГРАБАЦЬ, РВАЦЬ, ВЫРЫВАЦЬ, ДРАЦЬ, ЗДЗІРАЦЬ, ЛУПІЦЬ, ХАПАЦЬ, ЗАХОПЛІВАЦЬ, ПАДХОПЛІВАЦЬ, ЛАПАЦЬ, ЦЯГНУЦЬ, ГАРНУЦЬ, ВЫВУДЖВАЦЬ *(перан. разм.)*, ЧЭРПАЦЬ *(перан. выс.)*.

*Чаго не ўмееш браць – не руш!* Я. Колас. *Што ж яму – толькі грошыкі аграбаць?* Я. Брыль. *Не хапай, калі табе не кідаюць.* Прыказка. *Кожны святы да сябе горне.* Прыказка.

**БРЫДКІ,** НЕПРЫГОЖЫ, НЕПРЫСТОЙНЫ, АГІДНЫ, ГІДКІ, ВУЛЬГАРНЫ, НЕЦЭНЗУРНЫ, БРУДНЫ *(перан.)*.

*Як зірнуць, здаецца, не брыдкая з твару, і той стан, як трэба, і ў грудзях шмат жару.* Я. Купала. *Лаянка Кізгайлы мне здалася непрыстойнай.* У. Караткевіч. *Агідная гэта справа – лаяцца з чалавекам, ды яшчэ земляком.* В. Быкаў. *А пад носам у Мікалашкі рабіліся зусім брудныя справы.* А. Якімовіч.

**БУДАВАЦЬ,** СТАВІЦЬ, СТАЎЛЯЦЬ, УЗВОДЗІЦЬ, УЗНОСІЦЬ /*з бярвення:* РУБІЦЬ /*з цэглы ці з камення:* МУРАВАЦЬ.

*Дружна сёння камяніцы мы будуем для сябе.* М. Засім. *Клопат браў і пра тое, што трэба ставіць кароўнікі, свінарнікі, стайні, свірны.* Р. Сабаленка. *Узносілі муры, каб княжыці ў мурах.* Я. Купала. *Тапор грукоча – дом сасновы рубяць.* С. Гаўрусёў.

**БУДУЧЫНЯ,** БУДУЧНАСЦЬ, БУДУЧАЕ, ПРЫШЛАСЦЬ, ЗАЎТРА, ЗАЎТРАЕ, ЗАЎТРАШНЯЕ, НАСТУПНАСЦЬ, НАСТУПНАЕ, ПЕРСПЕКТЫВА *(перан.)*, ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ.

*Перад намі ў сонцы, ў зорах будучыня наша.* Я. Купала. *Пра заўтра слухаюць расказ праправўнукі Скарынавы.* Р. Барадулін. *Не ўчарашнім днём жыву на свеце – велічнай наступнасцю жыву.* А. Бялевіч.

**БУДЫНАК,** БУДЫНІНА, ПАБУДОВА, БУДОВА, ЗБУДАВАННЕ *вялікіх памераў:* ГМАХ, ХАРОМІНА, КОРПУС *(перан.)*

*Вечарам Лявон па вуліцы ішоў да будынка школы.* П. Галавач. *Гарэлі будовы як свечкі* І. Гурскі. *З малых цаглін вялікі гмах расце штодзённа, штохвілінна.* У. Дубоўка. *Там ужо і з хатамі не вельмі раскашоўваюцца: не разводзяць харомін.* М. Ракітны.

**БУКВАР;** ЛЕМАНТАР *(уст.)*.

*Але чытаць мяне, яшчэ да школы, навучыла маці, па рускім буквары.* Я. Брыль. *У школу новую прыслалі на роднай мове лемантар.* А. Вялюгін.

**БУКЕТ,** ПУК.

*На стале – букеты кветак, пляшак рад і чарак строй.* П. Панчанка. *Ты прынёс мне пук ружовы бэзу...* К. Буйло.

**БУРШТЫН,** ЯНТАР.

*Па беразе ўжо бегалі жвавыя хлапчукі, шукаючы выкінутага морам бурштыну.* Р. Сабаленка. *Каля мора спее жыта, янтарамі ў бераг б'е.* А. Пысін.

**БУСЕЛ;** БАЦЯН.

*Бусел сялібу пакінуў, к вылету ў вырай збіраецца.* Я. Купала. *Яшчэ не чакаў на буслянцы сяброўку сваю бацян.* Р. Барадулін.

**БУТЭЛЬКА;** ПЛЯШКА; ВІНАРКА.

*Гарэлку выпілі і паставілі бутэльку на акно.* К. Чорны. *На століку стаяла недапітая пляшка самагонкі.* Р. Сабаленка.

**БУЯКІ,** ДУРНІЦЫ.

*А дзе багульнік, там звычайна растуць і ягады дурніцы, ці, як называюць іх яшчэ, буякі.* М. Лынькоў.

**БЫК,** БУГАЙ /*вылегчаны:* ВОЛ.

*Як быка ні кармі, то малака не дасць.* Прыказка. *Карова – гэта, бачыш, такая добрая цётка, што дае малако. А вол – каровін муж.* Я. Брыль.

**БЫЦЦАМ,** БЫЦЦАМ БЫ, БЫ, НІБЫ, НІБЫТА, ЯК, ЯК БЫЦЦАМ, ЯК БЫ, ШТО, УСЁ РОЎНА ЯК, НАКШТАЛТ.

*Лес стаіць маўкліва, быццам задрамаў.* М. Васілёк. *Бяда прылу-*

*чылася, нібы з грому.* Я. Колас. *Эх ты, прастора якая, што стэп!.* Я. Брыль. *Ен нават меў за плячыма нешта накшталт салдацкага ранца.* К. Чорны.

**БЫЦЬ ЗНЯВОЛЕНЫМ;** СЯДЗЕЦЬ, АДСЕДЖВАЦЬ.

*Іспанскія браты, а колькі год назад была мая зняволена Радзіма.* А. Александровіч.

*Сядзіць?! Які жах!* Ц. Гартны.

**БЮРАКРАТ,** ФАРМАЛІСТ; СЛУЖБІСТ, ЗАКОННІК, ЧЫНУША, КРУЧКАТВОР, КРУЧОК; ЧЫНОЎНІК, КАНЦЫЛЯРЫСТ *(перан.)* ЧАРНІЛЬНАЯ ДУША, КАНТОРСКІ ПАЦУК.

*Паны ж і розныя чынушы і там патрапяць выбіць душы і павыцягваць з цябе жылы...* Я. Колас. *Тут пан Пшэбора і пан Глынка, вядомы гмінны кручкатвор.* Я. Колас.

**БЯГУН,** СПРЫНТЭР.

*Гэта, вядома, калі мераць яе [дарогу] шустрымі крокамі першага ў атрадзе бегуна Колі Пінчука.* А. Якімовіч. *Дый хада ў яго была спружыністая, лёгкая, як у спрынтэра, які адчувае, што ў форме.* У. Карпаў.

**БЯДА,** ГОРА, НЯШЧАСЦЕ, ЛІХА, ЛІХОЕ, НЯДОЛЯ, БЯЗДОЛЛЕ, НЯГОДА, ЗЛО, НЯДОБРАЕ, КЕПСКАЕ /*час, эпоха няшчасцяў:* ЛІХАЛЕЦЦЕ, БЯДОТА, ГОРАСЦЬ, ГАРОТА, ЛІХАСЦЬ, ЗЛЫБЕДА, ЗЛЫБЕДЗЬ, КЕПСТВА, НЕПАМЫСЛОТА, НАПАСЦЬ, НАСЛАННЕ, НАВАЛА, НАВАЛАЧ, НАВАЛЬ, БЕЗГАЛОЎЕ, НЯВЫКРУТКА, НЕПЯРЭЛІЎКІ; ПЛЯГА, УДАР, БІЧ, НАВАЛЬНІЦА, ПЕРАПЛЁТ, ПЕРАПАЛКА, БАЛОТА, КАША, ПЕКЛА, ПАСТКА, СІЛО, МУХАЛОЎКА, БАЛЯЧКА, ТРАСЦА, ЧУМА, ПРАКЛЯЦЦЕ, КАРА, ХМАРА, ТУПІК, ТРАГЕДЫЯ, ДРАМА, КАТАСТРОФА *(перан.)* ЧОРНЫ ДЗЕНЬ, ЧОРНАЯ ГАДЗІНА, ЧОРНАЯ ЧАСІНА, ЦЯЖКАЯ ЧАСІНА, ЗЛАЯ ГАДЗІНА, ЛІХАЯ ГАДЗІНА, ЛІХІ ЧАС.

*Бяда хоць мучыць, але жыць вучыць.* Прыказка. *Выганяеш гора ў дзверы – гора сунецца ў акно.* П. Броўка. *Хто паспагадае ёй у яе няшчасці?* М. Зарэцкі. *А можа міне ліха? Хутчэй бы адтуль нашыя прыйшлі...* З. Бядуля.

*Злыбедзь стаяла дзень-ноч каля брамы.* Я. Колас. *Што было б абысці навалач.* І. Гурскі. *Выхаваў дзяціну на ліхую гадзіну.* Прымаўка.

**БЯДНЯК,** БЕДНЫ, УБОГІ, ГОЛЫ, ЖАБРАК; ГАЛЯК, ГАЛЫШ, ГАЛЕТНІК, АБАДРАНЕЦ, АБАРВАНЕЦ; ГАЛАДРАНЕЦ; ЛАПЦЮЖНІК, ЛАПАТНІК, ЛАПЦЯВОЗ, СЯРМЯЖНІК, БЕСПАРТОЧНІК; ЗРЭБНІК, ШЫЛАХВОСТ.

*Хіба ж, бядняк, не збіраў ты калосся, каб дацягнуць да каляд?* Я. Васілёнак. *Прэч з дарогі, мужык, абарванец ліхі! Што? Паноў не пазнаў са двара ты сваіх?* Я. Купала. *Лапатнік корміць пана з палацу.* Я. Купала. *Во – зірні – сярмяжнік паганяе трактар...* Я. Купала. *Той шылахвост і гол і бос...* Я. Семяжон.

**БЯЗБОЖНІК,** БЯЗВЕРЦА; АТЭІСТ; ГРЭШНІК.

*Яшчэ і бязбожнікам назавуць, што ў нядзелю агарожу стаўлю.* А. Чарнышэвіч. *Я грэшнік вялікі: у пост не пасціў, не веру ні ў чорта, ні ў бога.* А. Бялевіч.

**БЯЗГЛУЗДЗІЦА,** НЕДАРЭЧНАСЦЬ, АБСУРД; НЕСУСВЕЦІЦА.

*Але ці мала якая бязглуздзіца можа сасніцца малому дзіцяці?..* Я. Маўр. *Лацінка – чужая нам, а мы – польскім панам. У выніку – абсурд: «чужаземцы» на сваёй зямлі.* В. Таўлай.

**БЯЗЛІТАСНЫ,** НЯШЧАДНЫ, ЖОРСТКІ, ЛЮТЫ, БЯЗДУШНЫ, БЕССАРДЭЧНЫ, НЕМІЛАСЭРНЫ, НЯЎМОЛЬНЫ, БЕССПАГАДЛІВЫ, БЕССПАГАДНЫ, БЕСЧАЛАВЕЧНЫ, НЕЧАЛАВЕЧЫ, НЯЛЮДСКІ, ЗВЕРСКІ; АКРУТНЫ; ДЗІКІ, ВАРВАРСКІ, КРЫВАВЫ *(перан.).*

*У жыцці панаваў бязлітасны звычай барацьбы – знішчаць да сябе падобных...* В. Быкаў. *Жорсткаю*

*рукою вайна сцірала людское дбанне аднаго пра другога.* Ц. Гартны. *Здраднік просіць літасці, але Міця няўмольны.* І. Навуменка. *У яго нейкая ненажэрная прага да здзекаў, грубых, бесчалавечных.* А. Асіпенка. *Спалілі для страху некалькі хат, наладзілі дзікую расправу над двума старымі ..* М. Лынькоў.

**БЯЛІЗНА**; СПОДНЯЕ.
*Выкраіла жонка трохі з свайго часу і памыла яму на дарогу дзве пары бялізны.* З. Бядуля. *Той [Хведар] ляжаў на палацях у споднім, курыў таўшчэзную казіную ножку і цыркаў слінаю.* М. Лобан.

**БЯНТЭЖЫЦЦА**; ГУБЛЯЦЦА *(перан.)*
*Хоць бянтэжацца трохі матросы, бо многія з іх не былі ў Беларусі...* П. Панчанка. *Нават дырэктар саўгаса, які гаварыў яму пра нейкія справы, ідучы побач, здавалася, губляўся пад яго насмешлівым, трохі паблажлівым позіркам.* І. Чыгрынаў.

**БЯРЛОГ**, БЯРЛОГА, ЛОГАВА, ЛОГАВІШЧА, КОДЛА, КОТЛА, КОТЛІШЧА; ЛОГВІШЧА, ЛАГОЎЕ; ЛАГВО, ЛАГЛО, МЯРЛО, МЯРЛОГА, ЛЕЖКА.
*Воўк і той не чапае авец бліз бярлогі сваёй.* А. Куляшоў. *Хіба ж ягня неразумнае вернецца з логава воўчага!* С. Дзяргай. *Мядзведзь злавіў яе [мужычку] і з дзіцёначкам прыцягнуў у сваю мярлогу.* М. Гарэцкі.

**БЯРОЗА**, БЯРЭЗІНА.
*Беларусу і ў Парыжы сняцца белізна бяроз і сосен медзь.* П. Панчанка. *Гоней за колькі ад чыгункі гасцінец, абсаджаны старымі бярэзінамі.* П. Галавач.

**БЯРЭМЯ**, АБЯРЭМАК, АХАПАК.
*Прэ дзядок старэнькі з лесу дроў бярэмя, як падняць...* М. Васілёк. *Толя ідзе да вогнішча з маленькай сякерай у руцэ і з ахапкам сушняку пад пахай.* Я. Брыль.

**БЯСПЕЧНА**, СПАКОЙНА – ЯК У БОГА ЗА ПАЗУХАЙ, ЯК ЗА БОГАМ.
*Вы мужны чалавек. Мне спакойна з вамі.* У. Караткевіч. *Валодзю думалася, што ён прабудзе тут гэтую вайну як у бога за пазухай.* Р. Сабаленка .

**БЯСПЛАТНА**, ДАРЭМНА, ДАРМОВА, ДАРМА, ДАРАМ; ТАК, ЗА ТАК, НА ДАРМАЎШЧЫНУ, ДАРМАГАЛАМ *(разм.)*.
*Няхай знімуць з цябе чынш, падаткі, налог, бо бясплатна для нас даў зямлю гэту бог! Доктара трэба, шпіталь нам трэба, дарма лячыліся б дзе бедакі.* Я. Купала. *На чорта той рубель, не трэба. Так павінны лячыць.* К. Чорны.

**БЯССОННІЦА**, БЯССОННЕ; БЕССАНЬ.
*Гурын зірнуў на твар Кавалёва і толькі цяпер заўважыў стомленыя яго вочы, пачырванелыя ад бяссонніцы.* А. Чарнышэвіч. *Твар у салдата быў даўно няголены, барада была злямцована, вочы чырвоныя з бессані.* К. Чорны.

## В

**ВАБНЫ**, ПРЫВАБНЫ, ПРЫНАДНЫ, ПАКВАПНЫ.
*Я па садзе іду – шмат пладоў залатых цешаць вока сузор'ямі вабнымі.* П. Панчанка. *Рот ружовы і вельмі прыемны для пацалункаў, вясёлы і прынадны.* У. Караткевіч.

**ВАВЁРКА**, БЕЛКА; ВЕКША *(абл.)*.
*І вавёрка каля сцежкі лушчыць спелыя арэшкі.* С. Грахоўскі. *Полымя вышэй паджарай белкай пачало скакаць з сука на сук.* М. Танк. *Абскрабаўся троху аб сукі, але падскочыў з зямлі, як векша, і смеху было шмат...* М. Гарэцкі.

**ВАГА** /*рычажная:* БЯЗМЕН /*з карамыслам:* ШАЛІ.
*Як вага, то спрэчкі няма.* Прыказка. *У дзвярах стаяў касір з бязменам, узважваючы плату.* В. Вітка. *Усё на свеце шалі часу важаць.* Ю. Таўбін.

**ВАГОН** /*таварны без сцен і даху* ПЛАТФОРМА /*таварны абагрэты, прыстасаваны перавозіць людзей.* ЦЯПЛУШКА, ЦЯЛЯТНІК (*разм.*)

*Новыя пасажыры лезуць у вагоны* З. Бядуля. *Рыпяць цяплушкі – хлопчыкі на маршы.* А. Вялюгін.

**ВАДАСПАД,** ПАДУН.

*Вуоксаю рэчка завецца у фінаў, Іматрай завуць вадаспад.* Я. Купала. *Маўчыць падун, не раве падун – дзе ж успененыя віры роднага вадапою?* М. Лынькоў.

**ВАЖНАСЦЬ,** ЗНАЧЭННЕ, ВАГА, СІЛА, КАШТОЎНАСЦЬ, ВАСТРЫНЯ (*перан.*).

*Рабіў ен з усведамленнем важнасці свае работы: ад гэтага і самому яму было прыемна.* Я. Колас. *Здавён, аднак, у сілу слова веру!* А. Лойка.

**ВАЙСКОВЫ,** ВАЕННЫ, ВОІНСКІ, АРМЕЙСКІ, ФРАНТАВЫ, АБАРОННЫ; РАТНЫ (*паэт.*).

*Эх ты, рота стралковая! Эх ты, служба вайсковая!..* М. Калачынскі. *З армейскаю кайстрай паходнай вяртаўся дамоў салдат.* А. Бачыла. *Татка твой сёння – на ратным полі сам здабывае сыночку волю...* К. Буйло.

**ВАКОЛІЦА,** НАВАКОЛЛЕ, НАВАКОЛЬНАСЦЬ.

*Цыпрук сеў у санкі і давай зноў апавядаць сваю прыгоду з кантрабандай, ужо вядомую ўсім у ваколіцы* З. Бядуля. *Неспакойная ў сваім пачатку рака бурліць, хвалюецца, поўніць грымотамі і гулам наваколле..* П. Галавач.

**ВАЛ,** НАСЫП.

*З аднаго боку над балотам цягнуўся вал досыць правільным паўкругам.* Я. Колас. *На краях сажалкі ўсе вышэй і вышэй падымаўся насып.* А. Кулакоўскі.

**ВАЛАСЫ,** ЧУПРЫНА, ЧУБ, ШАВЯЛЮРА, ЛОКАНЫ; КУДЗЕРКІ (*памянш.-ласк.*) КОСМЫ, СТРЫЖАКІ, КУЧАРЫ; КУДЛЫ, ПАТЛЫ, КАЎТУНЫ, ГРЫВА /*пучок.* ХАХОЛ; ВІХОР, ВІХРЫ /*коратка падстрыжаныя:* ВОЖЫК /*у хвалістых завітках.* БУКЛІ.

*Алена перад люстэркам расчэсвала свае доўгія прыгожыя валасы* А. Чарнышэвіч. *Чарнявай чупрыны скудлачаны дым на брыль узвіўся з-пад кепкі.* П. Глебка. *Шапку ен трымаў у руках, і руды яго калматы чуб стаяў дыбам.* Э. Самуйлёнак. *Брыль у руцэ з зялёнага велюру, варушыць ветрык злёгку шавялюру...* А. Зарыцкі. *Над натоўпам заматлялася яго доўгая, як у папа, грыва.* М. Лобан. *На сівых буклях узвышаўся беласнежны высокі чапец.* У. Караткевіч.

**ВАЛОШКІ,** ВАСІЛЬКІ.

*Тым часам дзве маладзенькія дзяўчынкі прынеслі невялічкі снапок жыта, перавіты валошкамі, куколямі, рамонкамі.* Р. Сабаленка. *Каласістыя палоскі красавалі васількамі...* М. Машара.

**ВАНТРОБЫ;** НУТРО; ШЛУННЕ.

*Хай з яго вантробы вырве.* Сваяк. *Дзесятая вада на кісялі, што гэта за сваяўство!* К. Чорны. *Чалавек з выгляду нібы жывы, але нутро мёртвае.* І. Навуменка.

**ВАР,** КІПЕНЬ; КІПЕЦЕНЬ (*абл.*).

*З кранта ў вялікі белы размалёваны чайнік цёк цурком вар.* П. Галавач. *Ад кіпеню Раечка ўгрэлася і непрыкметна заснула.* М. Лобан.

**ВАРТА,** АХОВА /*пры суправаджэнні:* КАНВОЙ /*для назірання:* ДАЗОР; ПАТРУЛЬ, ПОСТ, ПІКЕТ (*вайск.*).

*Падкупіць варту золата, акно адчыніць долата...* М. Лужанін. *Ліпы ля дома стаяць, як ахова.* П. Панчанка. *Далей на захад гоніць нас канвой.* А. Зарыцкі. *На павароце дарогі паказаўся галаўны дазор немцаў.* К. Крапіва. *Узмоцнены патруль ахоўваў кожны метр на чыгунцы...* Б. Мікуліч.

**ВАРТАЎНІК,** ВАРТАВЫ, АХОЎНІК, СТОРАЖ, ВАХЦЁР, КАРАВУЛЬНЫ, ПАТРУЛЬНЫ (*вайск.*) /*пры суправаджэнні:* КАНВАІР, КАНВОЙНЫ; КАНВОЕЦ, КАНВОЙНІК (*разм.*).

*Ля калгаснае аборы ходзіць пільны вартаўнік* А. Зарыцкі. *Пры школе ў дзеда ёсць свой пакойчык: ён тут сторажам працуе.* А. Якімовіч. *У будцы трымае вахцёр барадаты вінтоўку.* А. Вялюгін. *Каб не ўцяклі паны, канваіраў набралася багата...* М. Лынькоў.

**ВАРУШЫЦЬ,** ПАВАРУШВАЦЬ, ТРАПАЦЬ, ШАВЯЛІЦЬ /*губамі:* МЫЛЯЦЬ *(разм.)* /*вушамі (пра каня):* СТРЫГЧЫ *(перан.).*

*Ціхі вецер вее і траву варушыць.* А. Астрэйка. *Лёгкі вецер трэпле ягоныя валасы.* Б. Мікуліч. *Вецер гулліва шавеліць срабрыстыя густыя валасы на яго галаве.* П. Галавач. *І ён пачаў мыляць губамі, як бы шэпчучы што сабе.* К. Чорны.

**ВАРЫЦЬ,** ГАТАВАЦЬ.

*Кухарка, цётка Анэля, глуханямая ад прыроды, варыла дужа смачна.* М. Гарэцкі. *Маці гатавала абед на дварэ.* І. Мележ.

**ВАСТРЫЁ,** ЛЯЗО; ДЖАЛА *(перан.).*

*Аер прыемна хрупае на вастрыі касы.* Я. Брыль. *Некалькі разоў стукнуў сякерай па дошках, засадзіў лязо сякеры паміж іх і павярнуў, як рычагом.* К. Чорны.

**ВАСЬМІНОГ,** СПРУТ.

*Ды вынесла хваля якраз васьмінога.* У. Дубоўка. *Тут жа чарнелі карчы-вываратні з фантастычнымі карэннямі, падобныя да страшных спрутоў або да невядомых звяроў.* З. Бядуля.

**ВЕЛЬМІ,** НАДТА, ВЫКЛЮЧНА, НАДЗВЫЧАЙ, НАДЗВЫЧАЙНА, НЕЗВЫЧАЙНА, НЯЗВЫКЛА, НЕБЫВАЛА, НЕВЕРАГОДНА, НЕЙМАВЕРНА, НЕВЫКАЗНА, НЕВЫМОЎНА, МОЦНА, БЯЗМЕЖНА, БЯСКОНЦА, НЕВЫМЕРНА, НЕПАМЕРНА, НЯЗМЕРНА, БЯЗМЕРНА, ПРАЗМЕРНА, НЯЗЛІЧАНА, НЕАПІСАЛЬНА, ВОСТРА, НЯСЦЕРПНА; ДОБРА, СТРАШНА, СТРАШЭННА, ЗДОРАВА; ДУЖА, ДА СМЕРЦІ, ДА НЕЗВЫЧАЙНАГА, БЕЗ МЕРЫ, ПРАЗ МЕРУ, НЕ Ў МЕРУ, НА РЭДКАСЦЬ, ДА ДЗІЎНАГА, ДА ЧОРТА, ДА ЧОРЦІКАЎ, НЕ НА ЖАРТ, НЕ НА ЖАРТЫ.

*Накурана было вельмі, і дым выплываў праз акно.* К. Чорны. *Надта ж любіў гэты пажылы вучоны чалавек сваю невялічкую рухавенькую жонку* М. Гарэцкі. *Месца для начлегу выбралі надзвычай добрае.* М. Лынькоў. *Яму зрабілася неймаверна шкада гэтай цудоўнай жанчыны.* П. Пестрак. *Яму стала невыказна лёгка ...* М. Стральцоў.

**ВЕНІК** /*асаджаны:* МЯТЛА, МЯЦЁЛКА /*для падмятання у печы:* ПАМЯЛО /*сцёрты:* ДЗЯРКАЧ; ПАМЯЦЕННІК.

*З гнуткіх бярозавых пруцікаў стаў укладаць венік.* П. Пестрак. *Трымае мятлу ў руках большую за сябе і змятае з тратуара на вуліцы.* К. Чорны. *Аўгінка вымятала памялом печ.* А. Асіпенка. *... На працу зранку выйшлі самі і падмялі двор дзеркачамі.* Я. Колас.

**ВЕРХ,** ВЯРШЫНЯ, ВЕРХАВІНА, ВЯРШАЛІНА, СПІЧАК /*гары:* ПІК /*будынка:* ШПІЛЬ, ШПІЦ; МАКАЎКА, МАКУШ *(разм.);* ШАПКА *(перан.).*

*Вяршыню стромкую сасны, калі ўзыходзіў першы золак, як асаку каса, састрыг снарада цяжкага асколак.* А. Астрэйка. *Сонца падала за хвойныя вяршаліны ..* К. Чорны. *Ярка-бронзавае сонца тырчала на спічаку яліны.* М. Лобан. *Нізкае сонца ледзь прабілася скрозь макушы лесу.* Я. Колас.

**ВЕСНАВЫ,** ВЯСНОВЫ; ВЯСНЯНЫ, ВЕСНІ *(паэт.).*

*Рана вы завялі, кветкі веснавыя!* Я. Колас. *Да чаго прыгожая гэта вясновая раніца!* Я. Скрыган. *Пахне горкім веснім клеем лісце дробнае бярозы.* С. Дзяргай.

**ВЕСТКА,** ВЕСЦЬ, НАВІНА, ПАВЕДАМЛЕННЕ, СІГНАЛ.

*Весткі ад любай так доўга няма.* А. Астрэйка. *Да нас дайшлі аб вайне весці.* Я. Колас. *Цяпер Захар казаў аб навінах, якія чуў ён у воласці.* Я. Колас. *Трывожны сіг-*

*нал пaступіў толькі што з Жублян.* П. Кавалёў.

**ВЕЦЕР** /*парывісты, кругавы:* ВІХОР /*скразны*: СКРАЗНЯК /*сухі гарачы, у пясчаных пустынях:* СУХАВЕЙ, САМУМ /*што выварочвае дрэвы.* БУРАЛОМ /*разбуральнай сілы:* УРАГАН /*моцны і рэзкі, кароткачасовы:* ШКВАЛ /*слабы, каля мора:* БРЫЗ; ВЯТРЫСКА /*рэзкі халодны:* СІВЕР /*халаднаваты:* СВЯЖАК /*скразны:* СКАВЫШ / *дзьме знізу, каля зямлі:* НІЗАВІК; ВІСКУЦЕНЬ, ВІХУРА.

*Свішча вецер, глуха стогне, завывае ля дамоў...* М. Васілёк. *Перад крамай на скразняку стаяла чарга жанчын за бульбай.* А. Карпюк. *У прасторы – ураган сваволіць.* Ю. Лявонны. *Рэзкі сівер патыхае, да касцей праймае...* К. Крапіва.

**ВЕЧАРЭЦЬ,** ЦЯМНЕЦЬ, ЦЯМНЕЦЦА, ЗМРАЧНЕЦЬ, ЗМЯРКАЦЦА, ШАРЭЦЬ; СУТОНЕЦЬ, СУТАНЕЦЬ, СУТОНЬВАЦЦА БРАЦЦА НА ВЕЧАР, БРАЦЦА НА ЗМЯРКАННЕ.

*Ужо вечарэе: зараз не будзе як шыць, а трэба сягоння канешне кончыць.* Я. Купала. *А ўжо быў надвячорак, у лесе пачынала цямнець.* Я. Колас. *У лесе змяркаецца хутка і неяк адразу.* Б. Сачанка. *Была субота, святы вечар, пачынала шарэць.* У. Дамашэвіч. *Рэвізія зацягнулася за полудзень. Збіралася сутонець.* В. Таўлай.

**ВЕЯЛКА,** АРФА.

*З аднаго боку веялкі вылятае лёгкая, пушыстая мякіна, а з другога – чысцюткае, як золата, жоўта-мядзянага колеру зерне пшаніцы.* П. Кавалёў. *Тут Мікуць, Бабака і Ладымер пазнавалі гатовыя часткі сячкарняў, жнявярак, арфаў, малатарань...* К. Чорны.

**ВЁСКА** /*вялікая:* СЯЛО /*невялікая:* ЗАСЦЕНАК.

*Яны папрыязджалі на ўрачыстасць з навакольных вёсак, з гарадоў, нават з самых далёкіх.* К. Чорны. *Найболей, што дзед мой пабачыў, – сваё валасное сяло.* П. Броўка. *Ні засценка, ні мястэчка, – ўсё дарога і дарога.* У. Дубоўка.

**ВІДУШЧЫ,** ЗРАЧЫ.

*Адзіным відушчым вокам дзед упіваецца ў глухамань ночы.* З. Бядуля. *Хоць вочы сляпыя, але ўвесь твар здаецца зрачым.* З. Бядуля.

**ВІЛЫ** (*мн.*) /набіраць гной: САХОР (*адз.*).

*Ён прайшоў па халодным таку, намацаў рукамі каля стараны вілы і пачаў імі пароць, дастаючы нешта на высокім тарпе саломы.* М. Лобан. ... *На велізарных лапцішчах ён нёс столькі гразі, што добраму гаспадару і на сахор не выбраць.* Я. Колас.

**ВІЛЬГАЦЬ,** СЫРАСЦЬ.

*Вільгаць ішла з лясоў і туманамі асядала на голую зямлю.* К. Чорны. *Гной, гразішча па калена, сырасць, холад, цемната.* П. Трус.

**ВІНОЎНІК,** ВІНАВАТЫ, ПАРУШАЛЬНІК.

*Не плаціць багаты, а вінаваты.* Прыказка. *Дзе ты бачыў, каб я там якога парушальніка на волю пусціў!* М. Лынькоў.

**ВІР,** ВОДАВАРОТ.

*А бераг у гэтым месцы быў высокі, абрывісты, а ўнізе пад ім пеніўся глыбокі вір.* Я. Колас. *І ён паплыў, аддаўшыся на ўладу імклівай плыні і пеністым водаваротам ракі.* М. Лынькоў.

**ВІСЕЛЬНЯ,** ШЫБЕНІЦА; ВІСЕЛІЦА, ВІСЕЛЬНІЦА.

*А за забойства катарга ці вісельня.* А. Чарнышэвіч. *Нам воля, а панам шыбеніца.* Прыказка. *Да віселіцы буду ісці з паднятай галавой.* У. Шахавец.

**ВІТАЦЦА,** КЛАНЯЦЦА; ЗДАРОЎКАЦЦА; РУКАЦЦА ПАДАВАЦЬ РУКУ.

*Нарэшце ўсе сышліся, пачалі вітацца.* М. Чарот. *Людзей каля Уладыся збіраецца ўсё больш і больш. Мужчыны здароўкаюцца за руку.* Я. Скрыган. *З няпрошаным гасцём не рукаюцца.* Прыказка.

**ВІТАЦЬ;** ПРЫВЯЧАЦЬ
*З-пад сонных вод Нёмна, з-пад хвой Белавежы суседзі, суседкі, вітаю я вас!* Я. Купала. *Прывячаюць гасцей, выстаўляюць ім збаны ў шуме пеннай аздобы...* М. Калачынскі.

**ВОБМАЦКАМ,** НАВОБМАЦАК, УСЛЯПУЮ.
*Я вобмацкам знайшоў свабоднае месца і ўціснуўся на нары.* А. Карпюк. *Карты няма, і нападаць усляпую рызыкоўна.* М. Лынькоў.

**ВОГНІШЧА,** АГОНЬ, КАСЦЁР; ЦЯПЕЛЬЦА.
*Доўга пазіраў ён на вогнішча начлежнікаў, якое свяцілася з блізкай пасекі.* З. Бядуля. *Хуценька назбіраў ламачча і расклаў цяпельца, акурат гэтак, як калісьці ў маладосці на начлезе.* Р. Сабаленка.

**ВОДБЛІСК,** ВОДСВЕТ, АДЦЕННЕ, БЛІК; ЗАЙЧЫК *(перан.)*.
*Апошні водбліск дня пагас, мігцяць сузор'і роем...* П. Панчанка. *Сонечныя зайчыкі гралі на самым дне – на залатым пяску.* З. Бядуля.

**ВОДПУСК,** АДПАЧЫНАК, АДГУЛ, ПАБЫЎКА.
*Праз дні два ён дабярэцца дадому, да бацькі, і за месячны водпуск паправіцца ад лёгкай вінтовачнай раны ў назе і тупога болю ў плячах і шыі* К. Чорны. *Пастух жа бярэ адпачынак на сотню якіхнебудзь дзён.* М. Аўрамчык.

**ВОЗЧЫК,** ВАЗАК, ПАДВОДЧЫК, ЕЗДАВЫ, ФУРМАН, РАМІЗНІК, КУЧАР, ВАЗНІЦА, ВОЗНІК, ФУРМАНШЧЫК.
*Дарога па першым сняжку, працертая возчыкамі дроў, аж блішчала пад сонцам.* А. Якімовіч. *Той не фурман, што без пугі.* Прыказка. *Павольна ехаў па пустой вуліцы рамізнік без пасажыра.* З. Бядуля. *Кучара на вазку не было – відаць, схаваўся на зборні.* М. Лобан.

**ВОЙСКА,** АРМІЯ, УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ, ВАЕННЫЯ СІЛЫ *(пераважна з добраахвотнікаў, дапаможнае, у ваенны час.* АПАЛЧЭННЕ, ПОЛЧЫШЧЫ *(кніжн)*, САЛДАТЫ *(уст)*, РАЦЬ *(паэт)*, АРДА *(перан. зняваж.)*
*Правёўшы вялікі і слаўны паход, чырвонае войска вярталася ў тыл.* П. Глебка. *Нашы ваенныя сілы, што размешчаны ў вас, заўседы гатовы вас падтрымаць.* Я. Маўр. *Хто ў салдатах не быў, той і пораху не нюхаў.* Прыказка. *Кінуў Гітлер, як ваўчуга, орды дзікія з-за Буга.* М. Засім.

**ВОНКАВЫ,** ЗНАДВОРНЫ, НАДВОРНЫ, ЗНЕШНІ.
*Але акрамя вонкавага падабенства, нічога ў блізнюках не было агульнага.* У. Караткевіч. *Сваіму знешняму выгляду рэдактар надаваў немалое значэнне.* Я. Колас.

**ВОРАГ,** ПРАЦІЎНІК, НЕДРУГ, НЕПРЫЯЦЕЛЬ, ЛІХАДЗЕЙ, НЕПРЫХІЛЬНІК.
*...А ўсю радасць і рай мілавання недруг вырваў, спаганіў, стаптаў.* Я. Купала. *Праціўніка мы, на сваё шчасце, убачылі першыя і адразу адкрылі агонь.* А. Карпюк.

**ВОСІЛКА,** ДУЖКА.
*У яго жылаватых руках задрыжала восілка і загойдалася вядро.* К. Чорны. *У руцэ грэлася дужка, вядро разгойдвалася, звінела.* А. Асіпенка.

**ВОСТРАЎ**, ВЫСПА.
*Востраў Кільдзін як бы вартуе выхад з заліва ў мора* М. Стральцоў. *Калі не памыляюся, сама назва выспы «Фармоза» азначае ў перакладзе «прыгожая».* М. Лынькоў.

**ВОСТРЫ,** ГОСТРЫ, АДВОСТРАНЫ, НАВОСТРАНЫ, АДТОЧАНЫ.
*У добрага пільшчыка піла вострая* Прыказка. *...Людской расплаты ўжо над вамі [панамі] тапор адточаны завіс.* Я. Купала.

**ВОЧЫ,** БЕЛЬМЫ, БЕЛЬМАЧЫ, БУРКАЛЫ, ЗІРКАЧЫ, ЛУПЫ, ЗЕКРЫ *(разм. зняваж.)*.
*Волька працёрла кончыкам хусткі заплаканыя вочы.* Ц. Гартны. *Чалавека нашто марозіце? Ці бачаць твае п'яныя бельмы, што на ім*

*апранута?* А. Асіпенка. *Ці ад ночы не ачнуўся? Расплюшч свае лупы!* Я. Колас.

**ВУЛЕЙ** /*выдзеўбаны:* КАЛОДА /*рамачны:* РАМОВІК.

*Бацька марыць завесці пасечку – зрабіў першы вулей.* П. Пестрак. *Пчолкі выпаўзлі з калоды, пачалі збіраць мядок.* М. Чарот. *Садок пры двары, у садку дзесятак рамовікаў.* М. Гроднеў.

**ВУЛІЦА** /*невялікая, вузкая:* ЗАВУЛАК, ПРАВУЛАК /*вялікая шырокая:* ПРАСПЕКТ /*з прысадамі пасярэдзіне:* БУЛЬВАР.

*Залегла вуліца сяродкам, будынкі збоку чарадой.* Я. Купала. *Вось ён – праспект галоўны адноўленай сталіцы.* М. Аўрамчык. *Адвячоркам на бульвары яблыку няма дзе ўпасці...* В. Вітка.

**ВУЧАНЬ,** ШКОЛЬНІК; ШКАЛЯР.

*У нашым класе было нямала здольных вучняў.* М. Лупсякоў. *Але вось на пярэдніх партах школьнікі раптам весела заўхмыляліся.* А. Кулакоўскі.

**ВУЧЫЦЬ,** НАВУЧАЦЬ, РЫХТАВАЦЬ, ВЫКЛАДАЦЬ; ШКОЛІЦЬ *(разм.).*

*І мядзведзя вучаць.* Прыказка. *Гэта пан Быкоўскі навучае панну Паўлінку навамодных танцаў.* Я. Купала. *Трактарыстаў трэба было рыхтаваць на месцы, а машыны купляць за мяжой.* Р. Няхай.

**ВУШАК;** КАСЯК *(абл.).*

*Нават і сёння яшчэ на адным з вушакоў зарубіны ёсць, што калісьці мой рост адзначалі.* М. Танк. *..Бацюшка ўжо ўдарыўся капелюхом аб касяк дзвярэй.* З. Бядуля.

**ВЫБРЫК,** ВЫХАДКА, КАПРЫЗ, ШТУКА; ВЫМУДРЫ *(разм.);* АНТРАША, ФАРТЭЛЬ *(кніжн.).*

*Бацька любіў жартаваць, быў здатны на самыя нечуваныя выбрыкі.* У. Караткевіч. *Першыя дні пры новай настаўніцы Юрка спрабаваў сваімі выхадкамі рассмяшыць клас.* Х. Жычка. *Да сваёй дачкі пан Чарнецкі адносіўся вельмі пяшчотна, выконваў усе яе капрызы.* З. Бядуля.

**ВЫВАД,** ВЫСНОВА, ЗАКЛЮЧЭННЕ, РЭЗЮМЕ.

*Каб ён умеў думаць лагічна, то з усіх падзей зрабіў бы нейкі вывад.* А. Чарнышэвіч. *Ён хоча разабрацца як след, па-знатоцку, каб ягонае заключэнне было папраўдзе словам аўтарытэту.* Я. Скрыган. *Э-э, дык я от, маладыя людзі, з практыкі даю вам рэзюме: перш за ўсё – быць спрытным, не марудзіць і гарачы момант разумець.* А. Русецкі.

**ВЫГЛЯД;** ТВАР, АБЛІЧЧА, ФІЗІЯНОМІЯ *(перан.).*

*Ды і балоты маюць сёння не той выгляд, як мы іх уяўлялі раней.* Т. Хадкевіч. *Змяняўся твар зямлі, змяняўся і клімат, змяняўся і жывёльны свет.* В. Вольскі. *Але мінула менш за тры гады,– і ўсё шырокае наваколле змяніла аблічча.* Т. Хадкевіч.

**ВЫДАВАЦЬ,** ВЫПУСКАЦЬ, ДРУКАВАЦЬ.

*Асабліва мне спадабалася, што вучні выдаюць свой часопіс «Рэха».* В. Таўлай. *Тут размяшчаўся цэлы друкарскі камбінат, які выпускаў сотні тысяч экземпляраў газет, часопісаў, кніг, брашур...* Т. Хадкевіч.

**ВЫДМА,** ДЗЮНА.

*Зноў і зноў на беражок топкай выдмаю пясок вольны вецер сцеле.* А. Вялюгін. *...А мора несціханае гамоніць, на дзюны хвалі ўспененыя гоніць.* А. Вольскі.

**ВЫЗДАРАЎЛЕННЕ,** ПАПРАЎКА; **ПАПРАВА,** ПОПРАЎКА, ПАПРАВУНАК, АЧУНАК *(разм.).*

*На выздараўленне яго ўжо ніхто не меў надзеі, і ўсе чакалі, каб скарэй ён памёр і перастаў мучыцца.* К. Чорны. *Я ранены і хворы, еду дадому на папраўку.* К. Чорны.

**ВЫЗНАЧЫЦЬ,** АКРЭСЛІЦЬ.

*Той, хто з няволі рабочы люд вывеў, новыя вызначыў свету скрыжалі.* Я. Купала. *Наш старшыня ў сваёй прамове вельмі ясна акрэсліў нам дарогу.* Я. Колас.

**ВЫКРАСЛІЦЬ,** ЗАКРЭСЛІЦЬ, ВЫКАСАВАЦЬ, ЗАКАСАВАЦЬ.

*Некалькі сказаў астрожная цэнзура закрэсліла.* М. Танк. *Выкасуйце мяне з членаў праўлення.* А. Бялевіч. *Яна напісала два словы і закасавала.* М. Лобан.

**ВЫМАЎЛЕННЕ,** ВЫМОВА, АКЦЭНТ, ДЫКЦЫЯ.

*Правільнае вымаўленне – адзін з істотных бакоў не толькі культуры мовы, але і агульнай культуры чалавека.* Ф. Янкоўскі. *Пачыналася катаванне за кепскую вымову польскіх слоў.* З. Бядуля. *У грудзях прыбавілася цеплыні ад тых слоў, што так горача, з грузінскім акцэнтам былі сказаны камандзірам.* П. Кавалёў. *Страшнавата было мне выступаць пасля яго, бо я сам ведаў, што не валодаю выразнай дыкцыяй.* М. Хведаровіч.

**ВЫНІК,** ЗДАБЫТАК, ПАДРАХУНАК, РЭЗУЛЬТАТ; СКУТАК *(разм.);* СЛЕД *(перан.).*

*Сотні тры рэек узарвалі за ноч – вынік быў нядрэнны.* М. Лынькоў. *Вы працавалі... Столькі мук, а хто здабыткі пажынае?..* А. Бачыла. *Скончыўшы навучанне і пераглёдзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню.* Я. Колас.

**ВЫНОСЛІВАСЦЬ;** ГАРТ, ЗАГАРТОЎКА *(перан.).*

*Вара нават не ведала да гэтага, што ў Мішы, на выгляд яшчэ не надта ўсталелага хлопца, ёсць такая вынослівасць.* А. Кулакоўскі. *Веру, братцы, ў нашу сілу, веру ў волі нашай гарт..* Цётка. *Моцнай загартоўкі быў чалавек.* М. Машара.

**ВЫРАЗНЫ,** АКРЭСЛЕНЫ, КАЛАРЫТНЫ; ЯРКІ, ЯСКРАВЫ, ПРАЗРЫСТЫ, РЭЗКІ, СТРОГІ, РЭЛЬЕФНЫ *(перан.).*

*Гаворка была выразная, можна было разабраць кожнае слова.* М. Лобан. *Яго пэўна не вельмі-то ўражала гэтая яскравая недарэчнасць у расстаноўцы і скарыстанні грабароў.* Х. Шынклер. *Сацыяльная накіраванасць верша давволі празрыстая.* Р. Шкраба. *Малюнак чоткі, рэльефны.* В. Палтаран.

**ВЫРАТАВАННЕ,** УРАТАВАННЕ, РАТУНАК, ПАРАТУНАК, ЗБАЎЛЕННЕ, ЗБАВЕННЕ, ВЫЙСЦЕ, ВЫХАД.

*Авалодваў ім інстынкт ўратавання.* А. Кулакоўскі. *Ніякай надзеі на ратунак не было. надышла апошняя ноч жыцця яго.* Ядвігін Ш. *Гаруе краіна пад жорсткай пятой, як прагне збавення народ!* Я. Колас. *Выйсце адно – уцячы ў лес.* І. Навуменка. *Параска, як птаха ў сіле, не бачыла выхаду.* М. Лобан.

**ВЫРАШЫЦЬ,** РАШЫЦЬ; РАЗВЯЗАЦЬ *(перан.).*

*Адразу такую справу не вырашыш, таварыш дырэктар.* А. Пальчэўскі. *Як рашыць такую цяжкую задачу, што трэба зрабіць, каб тутэйшыя пяскі хоць трохі лепш радзілі?* А. Кулакоўскі. *Памажы ты нам, дубе, развязаць адно вельмі важнае пытанне.* Я. Колас.

**ВЫСАКАРОДНЫ,** ВЕЛІКАДУШНЫ; ВЫСОКІ *(кніжн.);* СВЯТЫ, НАЙСВЯЦЕЙШЫ *(выс.):* РЫЦАРСКІ *(перан.).*

*– Жадаю поспехаў на высакароднай ніве асветы, – пакланіўся ён Рыце.* А. Васілевіч. *І Пацяроб усміхнуўся з велікадушнай паблажлівасцю.* М. Зарэцкі.

**ВЫСЛОЎЕ,** АФАРЫЗМ /*павучальнае:* СЕНТЭНЦЫЯ *(кніжн.).*

*– Скажы мне, з кім ты знаёмы. І я табе скажу, хто ты, – прыводзіць ён вядомы афарызм.* Я. Колас. *Апрыкралі мне запальныя сентэнцыі Тодаравы.* Х. Шынклер.

**ВЫЦЯЦЬ,** ВЫТНУЦЬ, УДАРЫЦЬ, СТУКНУЦЬ /*чым-небудзь лёгкім:* ПЛЯСНУЦЬ, СЦЕБАНУЦЬ, СЦЕБНУЦЬ, ХВАСТАНУЦЬ, ХВАСЯНУЦЬ, ХВОСНУЦЬ, ЛЯСНУЦЬ /*нагою (пра капытных жывёл):* УБРЫКНУЦЬ; СПЛЯЖЫЦЬ, АПЛЯЖЫЦЬ, ГРУКНУЦЬ, БЭЦНУЦЬ, БАЦНУЦЬ, ТРАХНУЦЬ, ГАКНУЦЬ,

ГАХНУЦЬ, АХНУЦЬ, ТРЭСНУЦЬ, ДЗЕЎБАНУЦЬ, ЗАЕХАЦЬ, З'ЕХАЦЬ, ЗМАЗАЦЬ, УЛЯПІЦЬ, УРЭЗАЦЬ, АГРЭЦЬ, ЗАГРЭЦЬ, УГРЭЦЬ, ЖАРНУЦЬ, СМАЛЬНУЦЬ, ЗАСМАЛІЦЬ, ТУЗАНУЦЬ, УЛУПІЦЬ, ЛУПЯНУЦЬ, СВІСНУЦЬ /*чым-небудзь цяжкім:* СУНУЦЬ, САДАНУЦЬ, ГВАЗДАНУЦЬ, ГВАЗНУЦЬ, ЗВЕЗДАНУЦЬ, ДЖВУГНУЦЬ / *чым-небудзь* лёгкім: ПАЦЯГНУЦЬ, ПЕРАЦЯГНУЦЬ, ПАЛАСНУЦЬ, ШЛЁГНУЦЬ, ШЛЁПНУЦЬ, ШЛЯГАНУЦЬ, СПЕРАЗАЦЬ, АПЕРАЗАЦЬ, ШМАРГАНУЦЬ, ХЛЕСТАНУЦЬ, ХЛЫСНУЦЬ, ДЖГАНУЦЬ /*па твары* АПЛЯВУШЫЦЬ; ГРУНУЦЬ, ЗБАБОЎЧЫЦЬ, КАШКАНУЦЬ; ДАЦЬ, ПАЧАСТАВАЦЬ, СЕКАНУЦЬ, ПЕКАНУЦЬ ЗАЛЯПІЦЬ АПЛЯВУХУ.

*Я абухам выцяў па сасне.* . А. Бялевіч. *Лукашык замахнуўся на яе, але ўдарыць не асмеліўся.* У. Дамашэвіч. *Толя сцебануў свайго каня і памчаўся па дарозе.* Я. Маўр. *Трахнулі калом па галаве – і шукай ветру ў полі ..* А. Бажко. *Запрэгчы б цяпер самога ды ўрэзаць пугай па боку.* В. Быкаў. *Кінь зброю, а то кіем смальну!* К. Чорны. *Свіснуў па лбе – і канец табе!* Я. Колас. *І сук часам шлёпне цябе па нагах* З. Бядуля. *Ён хлестануў каня дубчыкам па пярэдняй лапатцы* А. Кулакоўскі.

**ВЯДОМАСЦЬ**, СЛАВА, ПАПУЛЯРНАСЦЬ; ЛАЎРЫ *(перан выс.).*

*Нікуды далей свайго засценка яшчэ ні разу не паказваліся, і таму, натуральна, не мелі яшчэ вядомасці...* А. Васілевіч. *Слава рускай пшаніцы атрымана ў спадчыну ад многіх пакаленняў...* «Звязда». *Папулярнасць у масах гэтага разумнага, энергічнага і смелага юнака няспынна расла.* У. Калеснік.

**ВЯДОМЫ**, ЗНАЁМЫ, ЗНАТНЫ, ЗНАКАМІТЫ, СЛАЎНЫ, СЛАВУТЫ, ПРАСЛАЎЛЕНЫ, ВЯЛІКІ, ВІДНЫ, ПАПУЛЯРНЫ, СЛЫННЫ, ГУЧНЫ, КРЫЛАТЫ, ЛЕГЕНДАРНЫ *(перан ).*

*Ён шукаў у натоўпе знаёмых твараў.* К. Чорны. *У мастакі Каршун палез і стаў хваліцца на ўвесь лес, што ён – спявак вялікі* К. Крапіва. *Вунь Крапіва, сатырык слынны наш* А Зарыцкі.

**ВЯЗЕНЬ**, ЗНЯВОЛЕНЫ, ЗАСУДЖАНЫ, АСТРОЖНІК /*засуджаны на катаргу* КАТАРЖНІК.

*Стрэлы турэмнай варты змешваліся з шумам і крыкамі вязняў.* Я. Маўр. *Так пачалося для Данілы жыццё астрожніка ў турме...* Я. Колас.

**ВЯЗКА**, ЗВЯЗКА, ВЯСЛА, НІЗАНКА, НІЗКА; ПЕРАВЯЗ, ПЕРАВЯСЛА, ВЯНОК, МАТОК.

*На жэрдцы над ложкамі вісіць розная адзежа, посцілкі, і тут жа над самай печчу вісіць дзве вязкі цыбулі.* П. Пестрак. *...Каля печы ляжалі вяслы цыбулі.* К. Чорны. *На печы сушацца з цыбуляй разам вянкі грыбоў...* М. Танк. *Маток цыбулі – ну, чым не каралі?* Р. Барадулін.

**ВЯЛІКІ**, ВЯЛІЗНЫ, ВЕЛІЧЭЗНЫ, ВЯЛІЗАЗНЫ, НЕМАЛЫ, БУЙНЫ, АГРОМНІСТЫ, АГРАМАДНЫ, ЗНАЧНЫ, ДОБРЫ, ГІГАНЦКІ, ГРАНДЫЁЗНЫ /*па прасторы:* НЕАБСЯЖНЫ, НЕАБДЫМНЫ, НЕАБНІМНЫ, БЯЗМЕЖНЫ, БЯСКОНЦЫ, НЯМЕРАНЫ, БЯСКРАЙНІ, ПРАСТОРНЫ, РАЗЛЕГЛЫ /*па колькасці:* НЕВЫЧАРПАЛЬНЫ, НЕВЫЧЭРПНЫ, НЕАБМЕЖАВАНЫ, БЯЗМЕРНЫ, НЯЗМЕРНЫ, НЕВЫМЕРНЫ, НЕЗЛІЧОНЫ, НЯЛІЧАНЫ; ЗДАРОВЫ, ЗДАРАВЕННЫ, ЁМКІ, ЛАДНЫ, ПРЫСТОЙНЫ, САЛІДНЫ; ВОЛАТНЫ, ВОЛАТАЎСКІ, ТЫТАНІЧНЫ *(выс.);* ШЫРОКІ, РАСКОШНЫ, КРУГЛЫ, АСТРАНАМІЧНЫ *(перан.)* У КВАДРАЦЕ, У КУБЕ, ЯК СКІНУЦЬ ВОКАМ, НЕ АКІНУЦЬ ВОКАМ, НЕ АХАПІЦЬ ВОКАМ, БЕЗ КАНЦА І КРАЮ, БЕЗ КАНЦА-КРАЮ.

*Між талерак стаяць і малыя і вялікія пляшкі.* Я. Скрыган. *Аддае нам паклон буйным коласам жыта.* А. Бачыла. *А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой гра-*

*мадзе?* Я. Купала. *Здаравенны сабака ўздымаецца з прызбы і, не спяшаючыся, ідзе насустрач нам* Я. Брыль. *Ладную частку жыцця ён правёў у турмах і высылцы.* М. Зарэцкі.

**ВЯРТАЦЦА,** ВАРОЧАЦЦА.

*З паходу вярталіся нашы палкі* . П. Глебка. *Ен выходзіў з дому пры ўсходзе сонца, а варочаўся дамоў пасля вячэры – позна ўвечары.* З. Бядуля.

**ВЯСКОВЫ,** СЕЛЬСКІ.

*Вясковыя бабулькі Камароўку расшукваюць – дзе ж яна цяпер?* Р. Няхай. *Наўрад ці заўважыце розніцу ў адзенні гарадскога жыхара і сельскага* Т. Хадкевіч.

**ВЯСНУШКІ,** РАБАЦІННЕ.

*Нарэшце, апошняе дзіцянё, хлопчык гадоў дзесяць, худзенькі, маленькі, з вяснушкамі, рыжанькі, атрымаў толькі адну кніжку аповесцей...* К. Крапіва. *Вастраносы хлапчук з буйнымі кроплямі рабаціння на твары стаяў ля самага лесу* З. Бядуля.

**ВЯЧЭРНІ,** ВЯЧОРНЫ, ВЕЧАРОВЫ.

*Шпарка насоўвалася густая вячэрняя цемра.* І. Мележ. *Пацягнула вячорным халадком.* М. Лужанін. *І добра адчуў у гэты вечаровы час Мінай, што ўлавіў ён, зразумеў душою голас жалейкі.* А. Бялевіч.

# Г

**ГАВАРЫЦЬ,** КАЗАЦЬ, ГАМАНІЦЬ /*ціха, невыразна:* МАРМЫТАЦЬ, МУРКАЦЬ, ГУГНЕЦЬ, ГУГНЯВІЦЬ /*абменьваючыся думкамі:* ГУТАРЫЦЬ, РАЗМАЎЛЯЦЬ, ПЕРАГАВОРВАЦЦА, ПЕРАМАЎЛЯЦЦА, СУБЯСЕДНІЧАЦЬ; БАІЦЬ, БАЛБАТАЦЬ, БАЛАБОНІЦЬ, БАЛАБАНІЦЬ, ПРАСТАРЭКАВАЦЬ, ЛЕПЯТАЦЬ, ЛАПАТАЦЬ, ЛЯПАЦЬ, ПЛЯСКАЦЬ, БУРЧАЦЬ, ПЛЯВУЗГАЦЬ, ВЯКАЦЬ, ЧАЎПЦІ, ВЯРЗЦІ, КРАСАМОЎНІЧАЦЬ /*абменьваючыся думкамі·* ЗЮЗЮКАЦЬ, ДУДУКАЦЬ, ТАРАБАРЫЦЬ, БАЛАКАЦЬ, САКРЭТНІЧАЦЬ /*на незразумелай мове* ГЕРГЕТАЦЬ; ГУТОРЫЦЬ, ТАЛКАВАЦЬ, ДЗЕЙКАЦЬ *(абл.),* ВЫСТУПАЦЬ, СПЯВАЦЬ, ТРАШЧАЦЬ, БАРАБАНІЦЬ, БУБНІЦЬ, ТРУБІЦЬ, ГУСЦІ, РЭЗАЦЬ, СЫПАЦЬ, ПЛЕСЦІ, НЕСЦІ, ГАРАДЗІЦЬ, МАЛОЦЬ *(перан.);* БРАХАЦЬ, ГАЎКАЦЬ *(перан. груб.)* ВЕСЦІ РАЗМОВУ, ВЕСЦІ ГУТАРКУ, МЕЦЬ ГУТАРКУ, ВЕСЦІ ГАМОНКУ, ТРЫМАЦЬ ГАВОРКУ, ПЕРАКІДВАЦЦА СЛОВАМІ, ТРУБІЦЬ У ВУШЫ, ЗВАНІЦЬ ВА ЎСЕ ЗВАНЫ, БІЦЬ У БУБЕН, РАСПУСКАЦЬ ЯЗЫК, ЧАСАЦЬ ЯЗЫК, МАЗОЛІЦЬ ЯЗЫК, МАЛОЦЬ ЯЗЫКОМ, ТРАПАЦЬ ЯЗЫКОМ, МЯНЦІЦЬ ЯЗЫКОМ, МЯНТАШЫЦЬ ЯЗЫКОМ, ПЕРАЛІВАЦЬ З ПУСТОГА У ПАРОЖНЯЕ, ТАЧЫЦЬ ЛЯСЫ, ТАЧЫЦЬ БАЛЯСЫ, РАЗВОДЗІЦЬ БАЛЯСЫ, РАЗВОДЗІЦЬ БАЛАЧКІ, РАЗВОДЗІЦЬ ТАРЫ-БАРЫ.

*Меней гавары – болей пачуеш.* Прыказка. *– Юрка, любы, родны мой, не трэба, – казала яна...* У. Караткевіч. *Вось еш, а не гамані... Пасля аб гэтым.* М. Чарот. *Платон нешта мармыча, пераварочваецца на другі бок і засынае зноў.* П. Пестрак. *Гутарыць з начальствам было яго асобным талентам.* З. Бядуля. *Маўчалі не таму, што нельга было размаўляць.* У. Шахавец. *Нешта мелеш ты, чалавеча, несуразіцу...* М. Лынькоў. *Мянташыць языком, а спраў – няма...* Э. Валасевіч. *Табе рабіць няма чаго, суседка, дык ты лясы точыш.* А. Макаёнак.

**ГАВОРКА,** ГУТАРКА, РАЗМОВА, ЗВЯГНЯ *(разм.).*

*– Чаму гэта залезці сюды? – сыпаў ён злоснаю гаворкаю і паказваў рукой на лес.* К. Чорны. *Вось зайшлі суседзі на мінутку, і павольна гутарка цячэ.* А. Астрэйка.

**ГАДАВАЦЦА**, РАСЦІ, ВЫРАСТАЦЬ.
*Чаму ж мне бацькі не ведаць? Разам жа мы гадаваліся* К. Чорны. *Яны раслі пры бацьках, часам не зусім бедна, і хаўрус вялі з такімі ж, як і самі* Р. Мурашка *У сяле за ракою вырастала дзяўчына* Я Купала.

**ГАДЗІННІК** /*вельмі дакладны*. ХРАНОМЕТР /*што звоніць у патрэбны час, з адмысловым заводам*. БУДЗІЛЬНІК /*вежавы, звычайна з музыкай*. КУРАНТЫ *(мн.)* /*насценны з гірамі*. ХОДЗІКІ *(мн.)*.
*І ўжо гадзіннікі падкручваем – спяшаецца цалінны час*. Р. Барадулін. *Тонка дзынкаў будзільнік: на працу пара!* М. Лужанін. На сцяне цікалі ходзікі. Р. Сабаленка.

**ГАЗЕТА** /*прадпрыемства ці установы, друкаваная:* ШМАТТЫРАЖКА /*насценная рукапісная ці машынапісная:* НАСЦЕНГАЗЕТА /*вячэрняя:* ВЯЧОРКА *(разм.)*.
*Газета з кожным земляком на мове роднай пагаворыць*. А. Пысін. *Рыгор купіў свежую, толькі што выйшаўшую вячорку* Ц. Гартны.

**ГАІЦЦА**, ЗАГОЙВАЦЦА, ЗАЖЫВАЦЬ, ЗАРАСТАЦЬ.
*Раны гояцца часам, а дружбаю – гора* А. Куляшоў.

**ГАЛАВА**; КУМПАЛ *(разм.)*; МАЗГАЎНЯ *(разм. груб.)*; КАЦЯЛОК, МАНЕРКА *(перан.)*; ГОЛАЎ *(абл.)*.
*Галава была павязана сіняй хусцінкай ..* Т. Хадкевіч. *Палезьце толькі! Першаму, кажа, растаўку мазгаўню*. М. Гарэцкі. *Гэты пах распаўзаецца па лесе і дурманіць голаў* І. Пташнікаў.

**ГАЛАДАЦЬ**, ГАЛАДАВАЦЬ, НЕДАЯДАЦЬ; ПАСЦІЦЬ, ПУХНУЦЬ *(перан.)* НЕ МЕЦЬ КУСКА ХЛЕБА, ДУШЫЦЦА ГОЛАДАМ, ПУХНУЦЬ З ГОЛАДУ, ПЕРАБІВАЦЦА З ХЛЕБА НА КВАС, СПЯВАЦЬ НА ХЛЕБ, СЯДЗЕЦЬ НА МЯКІНЕ, СЯДЗЕЦЬ НА НІШЧЫМНІЦЫ, КЛАСЦІ ЗУБЫ НА ПАЛІЦУ, ЛЯСКАЦЬ ЗУБАМІ, ГРЭЦЬ ЗУБЫ, СМАКТАЦЬ ПАЛЕЦ, СМАКТАЦЬ ЛАПУ.
*Кармілі надзвычай дрэнна. Прыходзілася галадаць* М. Хведаровіч. *Посціць і жывёла, калі гаспадар не мае*. Прыказка. *Мяса было б. А так – пухні вось на нішчымніцы. .* Б. Сачанка. *Ты вось хоць каняку агораў, бульбы накапаеш, а я? Кладзі зубы на паліцу.* І. Навуменка. *Некаторыя жывуць, а большасць палец смокча. Зямлі мала.* А. Чарнышэвіч.

**ГАЛІНА** /*звычайна сухая:* СУК, ЛАПА *(перан.)*.
*Глуха стогнуць дубы, хвойкі, галіны трашчаць*. Я. Купала. *Снег на яловым суку, як бліскучая вата...* А. Куляшоў. *Дубы шумелі аголенымі лапамі*. Я. Колас.

**ГАЛІЦЦА**, БРЫЦЦА.
*Мы спачатку і не заўважылі, што ён вельмі стары – відаць, ён галіўся або нізка выстрыгаў бараду і вусы*. К. Чорны. *На падбародку ў яго паадскоквалі пеньчукі чорнага валосся – відаць было, што чалавек некалькі сутак не брыўся*. М. Лобан.

**ГАЛЛЁ**, ВЕЦЦЕ.
*Бор стары завые нудна, зашуміць галлём лаза*. Я. Колас. *...Ліпы і кляны не варушылі голым яшчэ сваім веццем*. К. Чорны.

**ГАНДЛЯР**, КУПЕЦ, КАМЕРСАНТ /*гандлюе тайком, незаконна:* СПЕКУЛЯНТ, ПЕРАКУПШЧЫК, СКУПШЧЫК /*уласнік крамы:* КРАМНІК /*скупшчык ануч і гандляр рознаю драбязою:* АНУЧНІК, КАРАВАЧНІК *(уст.)*.
*Гандляры замыкалі свае магазіны і апускалі жалезныя аканіцы на вокны*. П. Пестрак. *Пан купец, якімі таварамі ты гандлюеш?* А. Якімовіч. *Перакупшчык цэлы воз па сяле ануч правёз*. А. Якімовіч. *Яек не ядуць і не чапаюць, аж пакуль не прыедзе анучнік Ёсель*. А. Васілевіч.

**ГАНЬБА**, НЯСЛАВА, БЯСЧЭСЦЕ, СОРАМ; САРАМАТА, САРАМОТА, САРАМОЦЦЕ *(разм.)*; ПЛЯГА *(перан.)*.
*Гэта ж ганьба будзе ўсёй нашай радні, калі ты яе возьмеш*. К. Кра-

піва. *Ліхая забава – вялікая няслава* Прыказка.

**ГАРМАТА** /з *доўгім ствалом* ПУШКА /з *кароткім ствалом* МАРЦІРА /*страляе навясным агнём.* ГАЎБІЦА /*зенітная* ЗЕНІТКА *(разм.) страляе на далёкую адлегласць.* ДАЛЬНЯБОЙКА *(разм.)*

*Гарматы грымелі ўжо так, што зямля дрыжала* Я. Колас. *Білі нямецкія марціры.* К. Чорны. *Нарэшце пачуўся адзіночны стрэл гаўбіцы.* А. Кулакоўскі. *Неба рвалася ад самалетнага гуду і зенітак.* А. Якімовіч.

**ГАРМОНІК**; ТРОХРАДКА, ХРОМКА *(разм.).*

*У гушчы дрэў чуліся зыкі гармонікаў і балалаек* Ц. Гартны. *Скрыпак спеў, бубнаў звон, ломіць мех свой трохрадка...* А. Бялевіч. *У нядзелю надвячоркам Васіль пачапіў на плячо хромку, выйшаў на вуліцу і як зграў-зграў...* М. Гроднеў.

**ГАРНЯК**, ШАХЦЁР /*здабывае вугаль:* ВУГЛЯКОП *(уст.)* /*здабывае руду:* РУДАКОП *(уст.).*

*Сустрэчы з гарнякамі Чыатурскіх капальняў і з металургамі Зэстафонскіх заводаў паступова развеялі цяжкі смутак.* М. Хведаровіч. *Ішлі рудакопы у цёмныя нетры.* А. Вялюгін.

**ГАРШЧОК** /з *чыгуну* ЧЫГУН, ГАРНУШАК *(разм.);* САГАН, КАЗАН *(абл.).*

*Маці выняла з печы гаршчок.* З. Бядуля. *Цётка Ярына падала нам гарнушак з нішчымнай заціркай.* А Бажко.

**ГАРЫШЧА**, ГАРА, ВЫШКІ, ПАДСТРЭШША, ПАДДАШАК.

*Як толькі хлопцы ўзлезлі на гарышча, адтуль паляцелі на сенцы фарбаваныя ў белае рамы, шалёўкі.* М. Лобан. *Свяцілася толькі адно акно – на паддашку ў Шыковіча.* І. Мележ.

**ГАРЭЦЬ** /*ярка:* ПАЛАЦЬ, ПАЛЫХАЦЬ /*вялікім полымем:* ШУГАЦЬ /*слаба:* КУРЭЦЬ.

*І ў старой печы агонь гарыць.* Прыказка. *Тою восенню палалі гнёзды панскія вакол.* П. Броўка. *Сіратліва курэў пакінуты агонь* Я. Маўр.

**ГАСЦІННАСЦЬ**, ХЛЕБАСОЛЬСТВА ХЛЕБ-СОЛЬ.

*Здавён гасціннасць беларуса, усім вядома ты, здавён* А. Вялюгін. *А хлебасольства было шчодрае – багацей, як на дзяды* І. Навуменка. *Дзякуй за прытулак, дзякуй за хлеб-соль.* З. Бядуля.

**ГВАЛТАЎНІК**, НАСІЛЬНІК, ЗВЕР *(перан.);* ТЫРАН, ДЭСПАТ *(перан. кніжн.).*

*І больш яна не магла вымавіць і слова, як рука гвалтаўніка заткнула яе рот...* М. Чарот. *Вас кінулі ў бездань знішчэння, пакут насільнікі вашы, лгуны...* Я. Колас.

**ГІСТОРЫЯ**; ЛЕТАПІС *(перан. выс.).*

*Кожны няправільна зроблены намі крок сурова асудзіць гісторыя.* К. Крапіва. *«Вяртанне ў маладосць» – яшчэ адна старонка ў летапіс грамадскага і літаратурнага жыцця нашай рэспублікі.* С. Грахоўскі.

**ГЛЫНУЦЬ**, ГЛЫТНУЦЬ, ПРАГЛЫНУЦЬ; ЛЫКНУЦЬ, КАЎТАНУЦЬ, КАЎТНУЦЬ.

*Зямля, расступіся ў пакуце сваёй і дзікія орды глыні ты...* Я. Колас. *Юрка каўтнуў сліну і адмовіўся.* К. Чорны.

**ГЛЯДЗЕЦЬ**, ПАГЛЯДАЦЬ, ПАГЛЯДВАЦЬ, ПРЫГЛЯДАЦЦА, ПРЫГЛЯДВАЦЦА, УГЛЯДАЦЦА, УГЛЯДВАЦЦА, ЗАГЛЯДАЦЦА, ЗАГЛЯДВАЦЦА, ЗАГЛЯДАЦЬ, ЗАГЛЯДВАЦЬ, РАЗГЛЯДАЦЬ, РАЗГЛЯДВАЦЬ, ПАЗІРАЦЬ, УЗІРАЦЦА /*скоса:* КАСАВУРЫЦЦА, КАСУРЫЦЦА *(разм.),* УПІВАЦЦА *(перан.)* КІДАЦЬ ПОГЛЯД, КІДАЦЬ ПОЗІРК, НЕ СПУСКАЦЬ ВАЧЭЙ, НЕ ЗВОДЗІЦЬ ВАЧЭЙ, УПІВАЦЦА ВАЧАМІ, УПІВАЦЦА ЗРОКАМ, УСКІДАЦЬ ВОЧЫ, /*скоса.* КАСІЦЬ ВАЧАМІ; ТАРАШЧЫЦЬ ВОЧЫ, КАЗЕЛІЦЬ ВОЧЫ, ЛЫПАЦЬ ВАЧАМІ, ЛЫПІЦЬ ВОЧЫ, СТРАЛЯЦЬ ВАЧАМІ, ШВОРЫЦЬ ВАЧАМІ.

*Хто мае слух – хай чуе той. хто мае вочы – хай глядзіць* Я. Купала. *Яська пазіраў на столь* М. Лынькоў. *Валя спадылба кідала позірк на Змітракоў твар* Р. Сабаленка. *Ужо некалькі разоў ускідае маці вочы на сына* Я. Колас. *Чалавек шворыць шклянымі вачыма па хаце* Я. Скрыган.

**ГНІЛЫ**, ТРУХЛЯВЫ, ТРУХЛЫ, ЗБУЦВЕЛЫ, ПАТЛЕЛЫ, ПРЭЛЫ, САПРЭЛЫ, ПЕРАПРЭЛЫ.

*Калодка гнілая, ды сук – смаляк.* Прыказка. *Трухлявую столь зніму. Упадзе зараз* К. Чорны. *Перапрэлая салома займалася неахвотна.* М. Лупсякоў.

**ГНЯВІЦЬ**, ЗЛАВАЦЬ, АБУРАЦЬ, РАЗДРАЖНЯЦЬ, ЦВЯЛІЦЬ, ЯТРЫЦЬ, НАСТЫРНЯЦЦА УВОДЗІЦЬ У ГНЕЎ, УВОДЗІЦЬ У ЗЛОСЦЬ.

*Яўхім прамаўчаў на гэту абразу, каб не гнявіць старога...* І. Мележ. *Заўседы такія чужыя размовы вельмі злавалі мяне.* М.Лупсякоў. *А дзеці бегаюць па вуліцы, сабак цвеляць.* А. Кулакоўскі. *Гэта задзірлівая ўсмешка, было прыкметна, ятрыла Яўхіма.* І. Мележ. *– Ідзі, – прашу я варажбітку. – У злосць мяне не ўводзь.* Б. Сачанка.

**ГНЯЗДО** /*буслінае*. БУСЛЯНКА, БУСЛОЎКА.

*Гнёздаў у бары было шмат, а каторае сарочае, каторае варонiна – з зямлі не вельмі ўгадаеш.* А. Якімовіч. *Глянуў неяк на бус-лянку. – Гэ! Дык тут ужо бацян?* А. Бялевіч.

**ГОДЗЕ**, ДАВОЛІ, ДОСЫЦЬ, ХОПІЦЬ; ДОСЦЬ, ДО, ДОСІ, БУДЗЕ, КВІТА, БАСТА, АМБА. ШАБАШ, ША, ЦЫЦ (*разм*) СТОЙ, ПАСТОЙ, СТОП, КАНЕЦ, КОНЧАНА, УСЁ, КРОПКА, КЛЯМКА.

*Годзе жыць у бядзе, як жылі!* М. Машара. *Заглянула сонца ў вочкі, дзень прыйшоў – даволі сну!* М. Чарот. *Досыць цягнуць беззямельнае гора, сам сваей доляй працоўнай кіруй* М. Машара. *Ну, хопіць вам! Цалуйцеся, ды паедзем.* І. Шамякін. *Баста! Годзе! Ад'ездзіўся!* М. Лынькоў. *Хлопцы, ша! Нашто крычаць?* Я. Колас. *Яшчэ смееш гаварыць. хаме! . Цыц!* П. Пестрак.

**ГОРАД**; МЕСТА (*уст.*).

*Ці помніць горад аб сястры, аб вёсцы, што жыве далёка?* М. Чарот. *Паэты вучаць месты, вёскі, як трэба жыць багатым быць* Я. Купала.

**ГОРКІ**, ПРАГОРКЛЫ /*пра тлушч* ЕЛКІ, ПАЛЫНОВЫ (*перан*) ЯК ЧЭМЕР.

*У ліхога бортніка і мед горкі* Прыказка. *...Вясельнікі пачалі, падвыпіўшы, кідацца елкім, чарвівым салам.* Я. Брыль. *Як чэмер – капуста, зацірка – без солі.* Я. Купала.

**ГРАМАДА**, НАТОЎП, ГУРТ, ЧАРАДА, КАМПАНІЯ, СКОПІШЧА, ТАЛАКА, КУПА, КУПКА, ВАТАГА. АРАВА (*разм*), БРАЦІЯ (*разм. жарт*); ШАЦЬ, ХЭЎРА (*разм. зняваж.*); ГУРМА (*абл.*); ДРУЖЫНА, КУЧА, КУЧКА, ГУРБА, КАГАЛ, КАПЭЛА, РОЙ, АРДА (*перан.*) /*рабаўнікоў, забойцаў:* БАНДА.

*Адзін ляжа, сто ідзе, а хто ж роўны грамадзе?!* Я. Купала. *Але вось на адзін момант Уладзю ўдалося спыніць раз'юшанасць натоўпу* К. Чорны. *На валасным двары стаяў гурт людзей.* М. Лобан. *За капэлай цэлая чарада дзяцей.* М. Лобан. *Ён уцёк ад вясёлай кампаніі, якая нешта шумела, галдзела і смяялася.* З. Бядуля. *На цёмнага мужыка прэ злыдняў талака.* Прыказка. *Цэлая гурма немцаў увальваецца ў школу.* І. Навуменка. *З пад'ездаў высыпае рой дзяўчат і юнакоў вясёлых у спяцоўках.* Р. Няхай.

**ГРАНІЦА**, МЯЖА, РУБЕЖ, КАРДОН.

*...І нарэшце – вось яна. граніца. бераг Буга. родны горад Брэст.* П. Глебка. *Гэтай ноччу мяжу дыверсант перайшоў...* А. Куляшоў.

**ГРОМ** /*удар.* ПЯРУН; ГРЫМОТЫ *(разм.)*
*Голасам моцы, ціха і важна гром пракаціўся ўгары.* Я. Колас. *Сівы пярун са злоснай хмары навеў сто дваццаць батарэй.* А. Вялюгін.

**ГРЭХ,** БЛЮЗНЕРСТВА, СВЯТАТАЦТВА *(кніжн. уст.)*
*Ох, божа ты наш справядлівы, за якія грахі цяжкія караеш ты нашу сямейку!* Я. Купала.

**ГРЭЦЫЯ;** ЭЛАДА *(выс.)*
*О Грэцыі героі, ўсе, як адзін, да зброі!. Ярмо турэцкіх катаў скідайце прэч, сыны!* Э. Агняцвет. *Я не магу мінуць Элады – пачатак міфаў, спрэчак, дум.* П. Панчанка.

**ГРЭЦЬ,** ПРЫГРАВАЦЬ, УГРАВАЦЬ /*моцна:* ПЯЧЫ, ПРЫПЯКАЦЬ, ПАЛІЦЬ, СМАЛІЦЬ, ПРАЖЫЦЬ.
*Ой, не грэе, хоць і свеціць, месяц над зямлёй...* Я. Купала. *Сонца моцна пякло.* К. Чорны.

**ГУБЫ,** ВУСНЫ.
*Нават старая Харціна і тая губы памачыла ў кілішку.* Р. Сабаленка. *Не памятаючы сябе, ен прынік да яе вуснаў.* І. Навуменка.

**ГУДОК,** СІРЭНА.
*Весялоўскі тады чакаў гудка на сваю змену...* К. Чорны. *Загула над прыстанню сірэна.* П. Броўка.

**ГУК,** ГОЛАС; ЗЫК *(разм.)*.
*Ноч. Цішыня. Аніводнага гуку.* П. Галавач. *Лес адразу напоўніўся новымі, зімовымі галасамі, упрыгожыўся новымі фарбамі.* М. Лынькоў.

**ГУЛЬТАЙ;** ГУЛЬТАІНА, АБІБОК, ЛЕЖАБОК, ЛЕЖАНЬ, ЛЯНІВЕЦ, НЯДБАЛЕЦ *(разм.)*; ЛАЙДАК, ЛАЙДАЧЫНА, ЛОДАР *(разм. зняваж.)*; ЗАВАЛА, ВАЛЯЧ, ЗАГАВАЙЛА *(абл.)*; ТРУЦЕНЬ, ПАРАЗІТ *(перан.)*.
*Гультаю заўсёды свята.* Прыказка. *Уцёк ад работы стары абібок!* З. Бядуля. *Мой немец кажа, што «потым» гавораць ляніўцы.* У. Караткевіч. *Так запусціць зямлю нядбала? Не гаспадар быў, а завала!* Я. Колас. *І не раздзяваўся, валяч нягодны!* Я. Колас.

**ГУЧНА,** МОЦНА, ГОЛАСНА, ГАЛАСІСТА, ГАЛАСЛІВА, ЗВОНКА, ГУЛКА, АГЛУШАЛЬНА, УГОЛАС, УСЛЫХ, УЧУТКІ /*рэзка.* ПРАРЭЗЛІВА, ПРАРАЗЛІВА, ПРАНІЗЛІВА, ПРАНОЗЛІВА; ЗЫЧНА, НЕМА, ГАРЛАСТА, ГРУКАТНА, НАЎЗРОЎ *(разм)*; ГРЫМОТНА, ГРАМАВІТА, ГРОМКА, ГАМАНЛІВА *(перан.)*, НА ЎВЕСЬ ГОЛАС, НА ПОЎНЫ ГОЛАС, НЕ СВАІМ ГОЛАСАМ, НЕМЫМ ГОЛАСАМ, НА ЎСЁ ГОРЛА, ВА ЎСЁ ГОРЛА, НА ЎСЕ ГРУДЗІ, НА ПОЎНЫЯ ГРУДЗІ, ВА ЎСЕ ГРУДЗІ.
*Гучна выклікаў зару горн вясёлы піянера.* М. Лужанін. *Слухаючы гэта, усе моцна смяяліся.* П. Пестрак. *..Звонка над Прыпяццю сіняй вольная песня гучыць.* М. Танк. *Гулка гудзелі іх там тапары, елкі, асіны стагналі.* Я. Купала. *На поўны голас раўлі сірэны.* Б. Мікуліч.

**ГЭТАК,** ТАКІМ ЧЫНАМ, ТАКІМ ПАРАДКАМ.
*А пісаць і гаварыць на сваёй мове гэтак натуральна, як дыхаць.* У. Караткевіч. *А справа ўся адбылася такім чынам.* М. Лынькоў.

# Д

**ДАБРАТА,** ЛЮДСКАСЦЬ; ДОБРАСЦЬ, ДАБРОСЦЬ, ДАБРЫНЯ *(разм.)*.
*Лішняя дабрата – дурата.* Прыказка. *Так, майго Васільку, каб не ўрачы, усе любяць за яго людскасць, самавітасць.* Ц. Гартны.

**ДАБРАЦЦА,** ДАСЯГНУЦЬ, ДАПАСЦІ, ДАПЯЦЬ, ДАЙСЦІ, ДАБРЫСЦІ, ДАПЛЕСЦІСЯ, ДАЕХАЦЬ, ДАМЧАЦЦА, ДАІМЧАЦЦА.
*За дзень спякотны добра мы прысталі, дабрацца хочам да сяла.* А. Астрэйка. *Яго [самалёт] падбілі над лініяй фронту, але ён нейкім цудам дасягнуў сюды.* І. Но-

вікаў *Андрэй усё зробіць, усюды дападзе* К. Чорны. *Хутка цягнік дамчаўся да лесу.* А. Пальчэўскі.

**ДАБРЭЦЬ,** ЛАСКАВЕЦЬ.

*Пісарава строгасць раптам сходзіць, і выраз яго твару адразу нейк дабрэе* Я. Колас. *Лаяў нас невядома за што. Але потым ізноў ласкавеў.* М. Гарэцкі.

**ДАВЕДВАЦЦА,** УВЕДВАЦЬ, ПРАВЕДВАЦЬ, РАЗВЕДВАЦЬ, ВЫВЕДВАЦЬ, ДАЗНАВАЦЦА, ВЫЗНАВАЦЬ, РАСПАЗНАВАЦЬ, РАЗГАДВАЦЬ, ВЫСВЯТЛЯЦЬ, ВЫЯСНЯЦЬ, ДАСЛЕДАВАЦЬ, ВЫЗНАЧАЦЬ, ДАЧУВАЦЦА, ПРАЧУВАЦЬ, ДАХОДЗІЦЬ *(разм.);* ШУКАЦЬ, ДАШУКВАЦЦА, ДАКОПВАЦЦА, ЗНАХОДЗІЦЬ, НЮХАЦЬ, ВЫНЮХВАЦЬ, РАЗНЮХВАЦЬ, ВІЖАВАЦЬ, ВЫВІЖОЎВАЦЬ, РАЗБЛЫТВАЦЬ, РАСКУСВАЦЬ *(перан.)* ДАХОДЗІЦЬ ПРАЎДЫ, ДАХОДЗІЦЬ ЯСНАСЦІ, АБМАЦВАЦЬ ГРУНТ.

*Пакуль яна спіць, мы ад Машы даведваемся аб ёй усе.* І. Шамякін. *І толькі па голасу, па хлюпанню ботаў вызначалі, дзе ён.* М. Ткачоў. *Шчасце з Праўдаю шукалі, а траплялі у астрог..* С. Грахоўскі. *Стаяў і вынюхваў. куды я хаджу?* М. Лобан.

**ДАВЕРЛІВЫ,** ПРАСТАДУШНЫ, НАІЎНЫ.

*Тое, што ты мне сказаў, памрэ разам са мной, а ты не будзь такі даверлівы.* А. Чарнышэвіч. *Прастадушная дзяўчына яшчэ не разумела жыцця.* А. Чарнышэвіч. *Не. мы не дзеці Не юнакі наіўныя – бацькі* В. Вітка.

**ДАГАВАРЫЦЦА,** УГАВАРЫЦЦА, ЗГАВАРЫЦЦА, ДАМОВІЦЦА, УМОВІЦЦА, ЗМОВІЦЦА, ПАРАЗУМЕЦЦА *(пра аплату.* СТАРГАВАЦЦА, ЗГАДЗІЦЦА, УГАДЗІЦЦА. СЫСЦІСЯ *(перан.)* ПРЫЙСЦІ ДА ЗГОДЫ, ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ, СЫСЦІСЯ Ў ЦАНЕ, УДАРЫЦЬ ПА РУКАХ, ЗВАРЫЦЬ ПІВА.

*Толькі з праўленнем дагаварыцеся Ад старшыні паперку прынясіце* І. Грамовіч. *Нарэшце, згадзіліся спачатку будаваць хату* Я. Маўр *Вялікія людзі, відаць, усе такія Яны з кожным знойдуць агульную мову* І. Гурскі.

**ДАГАДЖАЦЬ,** ГАДЗІЦЬ, НАРАВІЦЬ, ЛАДЗІЦЬ, ПАДЛАДЖВАЦЦА, ПАДЛАШЧВАЦЦА, ВЫСЛУЖВАЦЦА, УСЛУГОЎВАЦЬ, ВЫСЛУГОЎВАЦЦА, ПАДСЛУЖВАЦЦА, УВІХАЦЦА; ПАДЛАГОДЖВАЦЦА, ВЫДЫГАЦЬ, ВЫДЫГАЦЦА, УДЫГАЦЬ, ПАДЛАБУНЬВАЦЦА, ПАДЛІЗВАЦЦА, ВЫСТАЧАЦЬ *(разм.),* ПАД'ЯЗДЖАЦЬ, ТАНЦАВАЦЬ, КАДЗІЦЬ *(перан.)* НАСІЦЬ НА РУКАХ, ГЛАДЗІЦЬ ПА ПОЎСЦІ, ХАДЗІЦЬ НА ПАЛЬЧЫКАХ, ХАДЗІЦЬ НА ЛАПКАХ, РАССЫПАЦЦА МАКАМ, СЛАЦЦА ЛІСТАМ, ПАДАЦЬ ЛІСТАМ.

*Стараўся нават дагаджаць яе капрызам.* П. Пестрак. *Выкінь дур ты гэту, служка! Мужу трэба наравіць!* Я. Колас. *Ён мае спецыяльнасць выслужвацца ў начальства.* З. Бядуля. *Чаго ж так надта выдыгацца?* Я. Колас. *Ён так мяне любіць, так любіць! Ну проста на руках носіць.* М. Лынькоў. *Не для тых пяю. што вяселяцца, прад багатымі лістам сцелюцца.* М. Засім.

**ДАГЭТУЛЬ,** ДАСЮЛЬ, ДА ГЭТАГА, ДА ГЭТАГА ЧАСУ, ПА ГЭТЫ ЧАС, ПА ГЭТЫ ДЗЕНЬ, ПА СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ.

*Прызнацца, дагэтуль я крыху баяўся, што хто-небудзь прачытае мой дзённік.* І. Шамякін. *Дасюль мне не было як выказацца перад Хрысцінай, бо мы сустракаліся толькі на людзях.* А. Асіпенка. *Па гэты час я ў захапленні ад гулкіх летніх навальніц.* . Я. Колас.

**ДАДАВАЦЬ,** ДАБАЎЛЯЦЬ, ПРЫБАЎЛЯЦЬ, НАБАЎЛЯЦЬ, ПАДБАЎЛЯЦЬ, ДАКЛАДАЦЬ, ПАДКІДАЦЬ, ПАПАЎНЯЦЬ *Ісыпкае.* ПАДСЫПАЦЬ *вадкае.* ПАДЛІВАЦЬ.

*Не бойся работы, бо яна сілы не адбірае, а дадае.* А. Чарнышэвіч.

*Некалькі разоў бабка Параска дабаўляла закускі* Я. Колас. *У хлеб падсыпае мякіну, есць нішчымны квас і зацірку.* Я. Колас.

**ДАДАТКОВЫ,** ЛІШНІ.

*У дзяржавы без аддачы грошы пазычаем на аплату дадатковай рабочай сілы.* У. Карпаў. *Мы знайшлі ў брыгадзе лішнія граблі...* А. Якімовіч.

**ДАІЦЬ,** ЦЫРКАЦЬ *(разм.).*

*У дайніцу – цырк і цырк, то карову доіць цетка.* З. Бядуля. *Маці ў хляве цыркала ў падойнік карову ды ўсё прыгаварвала, каб тая добра стаяла на адным месцы.* В. Каваль.

**ДАКЛАДНАСЦЬ,** ПУНКТУАЛЬНАСЦЬ, ЛІТАРАЛЬНАСЦЬ.

*Хіба ж так робяць аптычныя прылады? Тут перш-наперш дакладнасць патрабуецца.* Х. Жычка. *Без пяці сем. Надзвычайная пунктуальнасць.* Я. Васілёнак. *Літаральнасць перакладу ва ўсіх прыведзеных прыкладах разбурыла рускія фразеалагізмы.* Ф. Янкоўскі.

**ДАКУЧАЦЬ,** НАДАКУЧАЦЬ, НАДАКУЧВАЦЬ, НАЗАЛЯЦЬ, НАДАЗАЛЯЦЬ, НАДАЗАЛЯЦЦА; ПРЫЯДАЦЦА, ДАЙМАЦЬ, ДАПЯКАЦЬ, *(разм.);* НАДАЯДАЦЬ *(абл.)* ДАВАЦЦА Ў ЗНАКІ, МАЗОЛІЦЬ ВОЧЫ, РЭЗАЦЬ ВОЧЫ, ЛЕЗЦІ Ў ВОЧЫ, ЛЕЗЦІ СЛЯПІЦАЙ, НАБІВАЦЬ АСКОМУ, НАБІВАЦЬ АСКОМІНУ, НЕ ДАВАЦЬ СПАКОЮ, НЕ ДАВАЦЬ ЖЫЦЦЯ, НЕ ДАВАЦЬ БЫТУ, НЕ ДАВАЦЬ ПРАХОДУ, ДУРЫЦЬ ГАЛАВУ.

*Дзеду Талашу пачынала дакучаць гэтае тулянне і бадзянне па-за межамі свайго дому.* Я. Колас. *Каб не дзеці, то, здаецца, пад мост кінуўся б, каб не мучыцца самому і людзям не назаляць.* К. Чорны. *Ну, Нінуся, пара нам дадому. Годзе галаву дурыць Галіне Фёдараўне.* І. Пташнікаў.

**ДАЛЁКА,** ВОДДАЛЬ, НАВОДШЫБЕ ЗА СВЕТАМ, ЗА ГАРАМІ, АЖ ДЗЕ.

*Гэта далёка – вёрст дваццаць адсюль будзе* Я. Скрыган. *Трохі воддаль на прыгорку вёска іх чарнее.* Я. Колас. *Зарэчча наводшыбе. Да цэнтра калгаса аж восем вёрст.* А. Асіпенка.

**ДАЛУЧЫЦЦА,** ПРЫЛУЧЫЦЦА, ПРЫМКНУЦЬ; ПРЫСТАЦЬ, ПРЫСТРОІЦЦА, ПРЫМАЗАЦЦА, ПРЫТКНУЦЦА, УЛІЦЦА, УКЛЮЧЫЦЦА, УСТУПІЦЬ *(кніжн.);* ПРЫЧАСЦІЦЦА *(кніжн. выс.).*

*Пры кавалях працаваў Андрэй. Назаўтра далучыліся яшчэ два калгаснікі.* К. Чорны. *Максім Танк прымкнуў да пратэстуючых і паплаціўся новым выключэннем з гімназіі.* У. Калеснік. *Апейка стаў угаворваць Васіля ўступіць у калгас.* І. Мележ.

**ДАМОЎ,** ДАДОМУ, ДАХАТЫ.

*Вядзі, блакітная дарога, хутчэй дадому: мне душна тут!* П. Панчанка. *Яны разам хадзілі ў школу, разам вярталіся дадому.* П. Кавалёў. *Мятным водарам жнейка аблітая са жніва паспяшае дахаты.* П. Трус.

**ДАПАМОГА,** ПОМАЧ, ПАДТРЫМКА, ПАДТРЫМАННЕ, ВЫРУЧКА, САДЗЕЯННЕ, ПАДМОГА, УСПАМОГА.

*Нам слалі сваю дапамогу сталіца Масква, Ленінград...* П. Броўка. *Але ніхто на помач не прыйшоў, струсілі ў бойку лезці сваякі* М. Танк. *Сабірацца трэба ў дарогу – да братоў паўстанцаў на ўспамогу.* М. Чарот.

**ДАРАГІ,** КАШТОЎНЫ, НЕАЦЭННЫ, БЯСЦЭННЫ У ЦАНЕ, НА ВАГУ ЗОЛАТА.

*Выгладжаны і прылізаны, важна сядзіць ён у сваім пышным кабінеце за багатым сталом, курыць дарагія цыгары* Я. Колас. *Яна трымала кветкі беражна, як трымаюць якую-небудзь вельмі каштоўную рэч.* І. Навуменка. *Хто прынёс мне яго – неацэнны той дар?* Н. Гілевіч.

**ДАРОГА,** ШЛЯХ */вялікая, для аўтамабіляў.* ШАША, ШАСЭ, ШАСЭЙНАЯ ДАРОГА, АЎТАСТРАДА,

АЎТАМАГІСТРАЛЬ /палепшаная: ТРАКТ, ГАСЦІНЕЦ, БАЛЬШАК /невялікая грунтовая ПРАСЕЛАК / невялікая, збочвае з большай. ПАВАРОТКА, ПАВАРОТАК; АРТЭРЫЯ (перан.), ПУЦЬ, ПУЦІНА, ПУЦЯВІНА (паэт.).

*Скажы мне, дарога, хто ездзіць табою?* Я. Колас. *Па балотах, па палях пралягаў шырокі шлях...* К. Крапіва. *Зялёны домік дарожнага майстра стаіць каля самай шашы.* Я. Брыль. *Палявымі праселкамі імчаць грузавікі, падвозячы насенне.* Т. Хадкевіч. *Ці ты збіўся з пуцявіны, ці саўсім не меў?..* Я. Купала.

**ДАРОСЛЫ**, СТАЛЫ, ВЯЛІКІ.

*Калі дарослы памірае, дык ён усё ж такі пажыў крыху, пабачыў свету, а дзіця...* П. Пестрак. – *Што, брат, нос цэлы? – спытаў бацька ў сына, як у сталага.* У. Дамашэвіч. *Праз паўгадзіны, пасля першай шклянкі чаю, паміж вялікімі за сталом ішла жывая і вясёлая гаворка. А дзеці завялі патэфон...* К. Чорны.

**ДАСЯГНУЦЬ**, ДАМАГЧЫСЯ, ДАБІЦЦА, АТРЫМАЦЬ, ДАСТАЦЬ; ДАПЯЦЬ, ДАСТУКАЦЦА (разм.); ДАЙСЦІ, ЗДАБЫЦЬ, ЗАВАЯВАЦЬ (перан.).

*Сіла павялічвалася жаданнем дасягнуць свайго.* П. Галавач. *Калі хочаш нечага дамагчыся, то будзь у сабе ўпэўнены.* Я. Скрыган. *Пакуль ты свайго дапнеш, што мы есці будзем?* Я. Купала.

**ДАТЫКАЦЦА**, ДАКРАНАЦЦА, КРАНАЦЦА, КРАНАЦЬ, ЗАКРАНАЦЬ, КРАТАЦЬ. ЧАПАЦЦА, ЧАПАЦЬ, БРАЦЦА; ДАТЫРКАЦЦА, ДАТЫРКАЦЬ (разм.).

*Часам Алена датыкалася рукою да локця чалавека, які поўз уперадзе, і намагалася здагадацца, хто гэта.* І. Шамякін. *І вось да твару яго дакранаецца цёплая далонь* Я. Брыль. *Нязвыкла слухаць, як плугі чапаюць каменне.* І. Пташнікаў. *Калены яго датыркаліся да самага носа* Я. Маўр.

**ДАЎГАНОГІ**, ЦЫБАТЫ, ПАДГАЛІСТЫ; ДАЎГАЛЫГІ (разм.), ДЗЫБАТЫ (абл.). *Даўганогі, як бусел.* Прымаўка. *Цыбатыя птушкі скачуць між куп'я, скачуць, крычаць.* К. Чорны.

**ДАЎЖНІК** /што не выплаціў доўгу своечасова: НЯДОІМШЧЫК; ДЭБІТОР (спец.).

*Адны плацілі акуратна, другія цягнулі бог ведае колькі, і мы не маглі пазбавіцца ад даўжнікоў ці, як у нас казалі, дэбітораў.* Я. Скрыган. *Барыла кожны дзень, як апантаны, насіўся па хатах, пытаў, хто як плаціць падаткі, памагаў секвестратару апісваць маёмасць у нядоімшчыкаў...* А. Бажко.

**ДАЎНІ**, ДАЎНІШНІ, СТАРЫ, ЗАСТАРЭЛЫ, СТАРАДАЎНІ, СТАРАЖЫТНЫ, НЕЗАПАМЯТНЫ, НЕЗАПОМНЫ, АРХАІЧНЫ.

*Даўняга бяссілля ўжо ў грудзях няма.* А. Гурло. *Застарэлую хваробу цяжка лячыць.* Прыказка. *Калісьці, у старадаўні час, жыў ганарысты пан у нас.* У. Дубоўка.

**ДАЎНО**, ДАЎНЫМ-ДАЎНО; ЦЕПЕРСЯ (абл.); КАЛІ (перан.) КАТОРЫ ЧАС, КАТОРАЯ ПАРА, НЕ СЯГОННЯ, СТО ГАДОЎ.

*Хлопчык даўным-даўно забыўся, што ёсць дзесьці на свеце хлеб і бульба.* З. Бядуля. *Цеперся гэта было.* Я. Скрыган. *Божа мой, сто гадоў не мыўся!* А. Асіпенка.

**ДАХ**, ПАКРЫЦЦЁ /саламяны, чарапяны: СТРАХА.

*У бубны дахаў вецер б'е, грыміць па ім, звініць, пяе...* М. Багдановіч. *З саламянай страхой мая хатка, гумно.* Я. Купала.

**ДАЦЬ**, ПАДАЦЬ, АДДАЦЬ, ВЫДАЦЬ, НАДЗЯЛІЦЬ, УДЗЯЛІЦЬ, АДЗЯЛІЦЬ, НАДАРЫЦЬ, УСТУПІЦЬ /двум ці многім: РАЗДАЦЬ /у рукі: УРУЧЫЦЬ; УЗЫЧЫЦЬ, УДРУЖЫЦЬ, СУНУЦЬ, ПАДСУНУЦЬ, ТКНУЦЬ, УТКНУЦЬ, АДВАЛІЦЬ (разм.) /двум ці многім: РАСТОРКАЦЬ (абл.) АХВЯРАВАЦЬ (кніжн.). *Гэтаму дай, таму дай, а дзе ўзяць?* К. Чорны. *Адной нас маці*

*надарыла мовай.* К. Кірэнка. *Тады адваліў ён мне срэбны рубель.* М. Лужанін.

**ДАЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ,** ДАЦЬ, ДАЗВОЛІЦЬ.

*Даць ім магчымасць жыць не толькі так-сяк, карміць і адзяваць дзяцей, а і вучыць іх, гэта найвялікшая дзяржаўная справа.* А. Чарнышэвіч. *Усю ноч не далі яму заснуць гэтыя новыя боты.* Я. Брыль. *Гэта вясна дазволіла ім пакінуць вескі.* К. Чорны.

**ДВАРАНІН** */у Польшчы і на Заходняй Беларусі, Украіне.* ШЛЯХЦІЦ, ШЛЯХЦІЧ; ШЛЯХТУН *(зняваж.).*

*Але там, дзе закранаюцца інтарэсы дваран, памешчыкаў, цар ніколі не стане на бок сялян.* Я. Колас. Глынскі быў *шляхціц* і хоць чым-небудзь імкнуўся адрозніваца ад простага мужыка. Я. Колас.

**ДЖАЛІЦЬ,** КУСАЦЬ.

*На кожным кроку джаляць камары.* В. Вольскі. *А восы як вылецяць ды як сталі яго кусаць.* Казка.

**ДЗЕЙНЫ,** АКТЫЎНЫ, ІНТЭНСІЎНЫ; ДЗЕЛАВЫ, НЕЎГАМОННЫ *(разм.);* ЧЫННЫ, НЕЎГАМАВАНЫ *(абл.);* НЕСПАКОЙНЫ, НЯСТОМНЫ, НЯСТРЫМНЫ, НЯЎРЫМСЛІВЫ, НЕЎТАЙМАВАНЫ, ГАРАЧЫ, КІПУЧЫ, БУРНЫ, ЖЫВЫ *(перан.).*

*Гэта быў дзейны чалавек і практычны работнік.* К. Чорны. *Паддубны – таленавіты і адважны камандзір Нястрымны, рашучы.* М. Ткачоў. *Колькі іх народ наш здолеў вырасціць, смелых і няўрымслівых людзей!* П. Панчанка. *Хоць і не вельмі гарачы да работы, але з ім нават у такую непагадзь весялей...* С. Грахоўскі.

**ДЗЕСЬЦІ,** ДЗЕСЬ, НЕДЗЕ.

*Дзесьці ёсць і твой пачатак, безупынная рака...* П. Глебка. *Палессе засталося дзесь ззаду.* Я. Колас. *Чую, як міжзорныя ракеты пралятаюць недзе нада мной.* М. Танк.

**ДЗЕЯЧ,** АКТЫВІСТ, ФУНКЦЫЯНЕР.

*Замест абразоў на сценах вісела некалькі плакатаў і партрэтаў выдатных палітычных дзеячоў* Я. Колас. *Па задуме Прахор – просты рыбак, бацька сям'і і адначасова актывіст сярод паўстанцаў...* У. Калеснік. *Скажыце, пан Крамер, ці многа ў гэтым паселішчы камуністаў, савецкіх функцыянераў і яўрэяў?* І. Навуменка.

**ДЗІВА,** ДЗІВОСЫ *(мн.),* ЦУД, ПРАЯВА, НЕЗВЫЧАЙНАСЦЬ; ДЗІВОТА *(разм.):* ПЕРШЫНА, НАЎДА *(абл.).* ДЗІВАЦТВА; ПРЫХАМАЦЬ *(абл.).*

*Ён і памацаў вяроўку рукамі, ён і панюхаў вяроўку таксама; «З попелу звіта, ну проста дзівосы!»* У. Дубоўка. *Яна ўжо не хоча верыць у нейкі цуд, які можа ашчасліваць іх сям'ю.* У. Дамашэвіч. *– Што за праява? – Тамаш правёў рукою па твары, працёр вочы.* Я. Колас. *Ніякай наўды няма: яму б сцерагчыся, а ён бярвенне пачаў цягаць.* Я. Скрыган. *Але ж чалавек ён старасвецкі. з прыхамацямі* У. Караткевіч.

**ДЗІВІЦЦА,** ЗДЗІЎЛЯЦЦА; АХАЦЬ, ОХАЦЬ *(разм.);* СЛУПЯНЕЦЬ *(разм. перан.);* ДЗІВАВАЦЦА *(абл.)* ДАВАЦЦА ДЗІВУ, НЕ ВЕРЫЦЬ СВАІМ ВАЧАМ, НЕ ВЕРЫЦЬ СВАІМ ВУШАМ, РАЗЯЎЛЯЦЬ РОТ, РАЗВОДЗІЦЬ РУКАМІ.

*Хто не бачыў вялікага, той з малога дзівіцца* Прыказка. *Ішоў амаль увесь дзень і здзіўляўся, што на дарозе зусім пуста.* М. Лупсякоў. *Сёстры, знаёмыя ахалі, казалі, што ён вельмі змяніўся з аблічча.* І. Мележ. *Усе слухалі і не верылі сваім вушам* С. Баранавых.

**ДЗІРКА,** ДЗЮРКА, АДТУЛІНА, ПРОЙМА, ПРАХОН, ЖАРАЛО, ЛЮК */прадаўгаватая.* ШЧЫЛІНА */праз якую праходзіць святло.* ПРАСВЕТ */праз якую праходзіць паветра:* ПРАДУХА, ПРАДУШЫНА, АДДУШЫНА */праз якую цячэ:*

ЦЕЧ /*у вулеі для пчол:* ЛЯТОК /*выкапаная пад чым-небудзь·* ПАДКОП /*у тканіне·* ПРАРЭХА /*у плаціне:* ПРАРАН /*праз якую можна пралезці.* ПРАЛАЗ /*праламаная·* ПРАЛОМ, ПРАЛОМІНА, ВЫЛАМ /*прабітая.* ПРАБОІНА /*прапаленая.* ПРАПАЛІНА /*прарэзаная:* ПРОРАЗЬ; АТВОР, ЗЯЎРА *(абл.)*, ПРОРВА *(перан.)*.

*Вялікая дзірка, ды малая накрыўка.* Прыказка. *Маленькая акруглая адтуліна сведчыла аб месцы раны.* Х. Шынклер. *Раптам успыхнула знічка агністая, грымнула рэха ў аконны прахон...* М. Лужанін. *Чарнелі ў сценах абгарэлых прабоіны адны.* Э. Агняцвет. *Праз чорную прорву дзвярэй ліўся холад.* К. Чорны.

**ДЗІЦЯ,** ДЗІЦЁ, ДЗІЦЯНЁ, МАЛОЕ, МАЛЫШ, МАЛЕЧА /*дашкольнага ўзросту:* ДАШКОЛЬНІК; ДЗЯЦІНА *(разм. ласк.)*; БАХУР, КАРАПУЗ *(разм. жарт.)*; НЕМАЎЛЯ; ШПУНТ, ПАЎЗУН, СМАРКАЧ *(перан.)*.

*Узяў дзіця за руку – матку за сэрца бярэш.* Прыказка. *Але глядзі, чаму не спіць малеча? Чаму з калыскі цягне ручаняткі?* С. Дзяргай. *Каля яго, задраўшы галаву, стаяў замурзаны пяцігадовы карапуз.* Я. Маўр. *З смаркача выцягнуўся я ўжо на ладнага дзецюка.* Ядвігін Ш.

**ДЗЯРЖАННЕ,** ДЗЯРЖАЛЬНА, РУЧКА /*у нажа ці відэльца.* ТРОНАК, /*у касы* КАССЕ, КАСАЎЁ, КАСАВІЛЬНА /*у грабель:* ГРАБІЛЬНА /*ў пугі* ПУГАЎЁ, ПУЖАЛЬНА /*у цэпа.* ЦАПІЛЬНА /*у вуды.* ВУДЗІЛЬНА /*у сцяга·* ДРЭЎКА /*у шаблі:* ЭФЕС, ДЗЯРЖАНКА, ДЗЯРЖАК, ДЗЕРЖАНОК, РУКАЯТКА.

*І ўхапіліся разам за нож: ён – за дзяржанне, а яна – за лязо.* М. Ракітны. *Рыдлёўка гэтая валялася тут жа – злізаная аб зямлю за доўгія гады, з выгладжаным рукамі тронкам* К. Чорны. *Вудзільна сагнулася ў спрытнай руцэ, і хвалі кругамі пайшлі па рацэ.* П. Глебка.

**ДОБРААХВОТНІК,** ДАБРАВОЛЕЦ, ВАЛАНЦЁР.

*Задача камуністаў – уступіць у рады абаронцаў Радзімы, сваім прыкладам уцягнуць бядняцкую частку вёскі ў атрады добраахвотнікаў* М. Лобан. *А ўжо заявы шлюць камсамольцы, што прагнуць пабачыць сусвет, крылатай рамантыкі дабравольцы, разведчыкі першых планет.* В. Вітка. *На ўзбярэжжы Балтыкі Зыгмунт чакаў зброі ад паўстанцаў і высадкі валанцёраў з Францыі і Англіі.* А. Якімовіч.

**ДОБРЫ,** НЯДРЭННЫ, НЕБЛАГІ, НЯКЕПСКІ, ВЫСАКАЯКАСНЫ, ЗДАТНЫ, ДАСКАНАЛЫ, УДАЛЫ, ПРЫЎДАЛЫ, ВАРТЫ, СТАНОЎЧЫ, СЛАЎНЫ, СПРАЎНЫ, АДМЫСЛОВЫ, ВЫДАТНЫ, АДБОРНЫ, АДМЕННЫ, УЗОРНЫ, ПРЫКЛАДНЫ, БЕЗДАКОРНЫ, НЯЎКОРНЫ, БЕЗЗАГАННЫ, ЗАЙЗДРОСНЫ, ЦУДОЎНЫ, ІДЭАЛЬНЫ; ПРЫСТОЙНЫ, ЛЮДСКІ, ХВАЦКІ, ЛАДНЫ, ПЕРШАКЛАСНЫ, ПЕРШАГАТУНКОВЫ, СТОПРАЦЭНТНЫ, ЗАПРАЎСКІ, ВАРТНЫ, НЕ АБЫ-ЯКІ *(разм.)*; ДЫХТОЎНЫ, ФАЙНЫ *(абл.)*; НЕПАЎТОРНЫ *(кніжн.)*: САПРАЎДНЫ, НЕПАРАЎНАЛЬНЫ, НЕЗРАЎНАНЫ, МАЙСТЭРСКІ КЛАСНЫ, ПЕРШЫ, НАЙПЕРШЫ, ЦАРСКІ, АНЕЛЬСКІ, БЛІСКУЧЫ, КРЫШТАЛЬНЫ, ЗАЛАТЫ, РЭДКІ *(перан.)* ВО, ОГО, НІШТО, НІШТО САБЕ, КЛАС, ПЕРШАГА ГАТУНКУ, ПЕРШАГА СОРТУ, ПЕРШАЙ РУКІ, ПЕРШАЙ МАРКІ, ШТО ТРЭБА, ПАШУКАЦЬ ТРЭБА, НІЧОГА НЕ СКАЖАШ, ЦАНЫ НЯМА, НА ПЯЦЬ, НА СЛАВУ, ЯК НА ПАДБОР, ЯК НА ЗАКАЗ, ХОЦЬ НА ВЫСТАЎКУ, ХОЦЬ КУДЫ, БУДЗЬ ЗДАРОЎ.

*Якая ж ты гаспадыня, калі добрага квасу не ўмееш зрабіць?* М. Лобан. *Неблагі ты, відаць, гаспадар, мазалі на далонях тваіх...* А. Зарыцкі. *Узорны парадак панаваў у гэтым пакоі.* Б. Мікуліч. *Бацька гаворыць пра тое, якая бліскучая кар'ера чакае ягонага*

*сына...* Б. Мікуліч. *Сад – пашукаць трэба!.* Я. Колас. *Дні пагодныя, як на заказ.* І. Мележ. *У мяне памяць будзь здароў!* А. Асіпенка.

**ДОЖДЖ** /моцны праліўны: ЛІВЕНЬ, ЗАЛЕВА /цеплы імжысты: ГРЫБАСЕЙ (разм.).

*І грымнуў гром, і цёплы дождж закрапаў, рассыпаўся па маладой траве.* М. Калачынскі. *Абвісла пад ліўнем жыта – колас гне* М. Калачынскі. *Хутка першая грымне маевая навальніца з дажджом-залевай.* С. Дзяргай. *Барабаніць па акне ад рання цеплы дожджык-грыбасей.* Е. Лось.

**ДОКАЗ,** ДОВАД, СВЕДЧАННЕ, ПАДСТАВА, АБГРУНТАВАННЕ, АРГУМЕНТ, МАТЫВІРОЎКА, РЭЗОН; КОЗЫР *(перан.).*

*Яўных доказаў, важкіх ды сур'ёзных, каб на іх падставе заарыштаваць Сроля, у паліцыі не было.* Ц. Гартны. *Але довадам розуму не хочацца верыць.* І. Навуменка. *Пераклад «Яўгенія Анегіна» на беларускую мову – яшчэ адно сведчанне ўсенароднай любві да вялікага рускага паэта.* Р. Шкраба. *Трашчалі адзін за адным аргументы пракурора* В. Таўлай.

**ДОКТАР,** УРАЧ; ЛЕКАР *(разм.);* ЭСКУЛАП *(зняваж.).*

*Дык вы ведайце, што вашу рану перавязаў і давёў да парадку доктар.* К. Чорны. *Калі б не той ваенны ўрач – усім бы нам капут.* В. Таўлай. *У мяне тут лекары нейкі гастрыт прызналі.* А. Бажко. *Хоць бы не было гангрэны. Гэтыя эскулапы, не задумваючыся, могуць адхапіць руку.* І. Мележ.

**ДОСЛЕД,** ВОПЫТ. ЭКСПЕРЫМЕНТ.

*Трэба назначыць аўтарытэтную камісію, якая павінна выехаць на месца, дзе ён рабіў геалагічныя доследы.* К. Крапіва. *Ні адзін вопыт без страт не абыходзіцца.* А. Пальчэўскі. *Толя дзівіўся, што Сяргей Карпавіч працуе старшым аграномам і гэта работа адрывае яго ад навуковых эксперыментаў.* Б. Мікуліч.

**ДОЎГ,** ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ, КРЭДЫТ, ЗАВІНАВАЧАНАСЦЬ *(разм.).*

*Нямала і я меў даўгоў, і мне не раз завінавачваліся.* А. Якімовіч. *Будаваць – трэба мець фонд ці залезці ў крэдыт* І. Грамовіч.

**ДОШКА** /*тоўстая*: ДЫЛЯ, ДЫЛЕЎКА /*таўшчынёю у цалю*: ЦАЛЕЎКА /*у падлозе:* МАСНІЦА, МАСНІЧЫНА /*з краю бервяна, з аднаго боку выпуклая:* АПОЛАК /*якою шалююць:* ШАЛЕЎКА.

*Вокны хаты наглуха забіты дошкамі.* Я. Колас. *З дыляў паслалі палок шырачэзны, каб хто тут, парыўшыся, не зваліўся.* М. Танк. *У суседнім пакоі парыпваюць масніцы: нехта ходзіць.* І. Навуменка.

**ДРАБНІЦЬ,** КРЫШЫЦЬ; РАСПЫЛЯЦЬ *(перан.).*

*Раней нажы-секачы ў камбайне драбнілі кукурузныя сцеблы на буйныя кавалкі...* М. Даніленка. *Лізавета крышыла гуркі ў квас. рыхтавала вячэру.* П. Пестрак. *Трэба не ўпусціць часу і не распыляць сіл.* Ц. Гартны.

**ДРАЖНІЦЦА,** ЦВЯЛІЦЦА, ПАЦВЕЛЬВАЦЦА.

*Здаецца ж, і не хуліганы якія, гэтыя хлопцы, каб з сабакамі дражніцца...* А. Якімовіч. *І ўсёроўна не купіць. Адно цвеліцца* К. Чорны. *На яе плячах трапечуць кароценькія кутасікі хусткі. Яны, як жывыя, і здаецца, быццам пацвельваюцца з маёй панурасці.* А. Асіпенка.

**ДРАМАЦЬ** КЛЯВАЦЬ НОСАМ.

*Ён заплюшчыў вочы і пачаў драмаць.* Я. Колас. *Не бойся, носам кляваць не буду. Машыны ў бровары ладзім, дык стуку і груку столькі, што нежывы прачнецца!* А. Чарнышэвіч.

**ДРАНЦВЕЦЬ,** МЛЕЦЬ, ПРУЦЯНЕЦЬ, ДЗЕРАВЯНЕЦЬ *(разм),* МЯРЦВЕЦЬ, НЯМЕЦЬ *(перан.).*

*Пад сцюжаю фінскай скалеў – дранцвее ў ватоўцы рука.* М. Калачынскі. *Ногі дрыжаць, рукі млеюць і кашаль забівае, жыць не дае.* К. Крапіва.

**ДРАПЕЖНІК,** КРЫВАЖЭРАЦ, ХІЖАК *(абл.)*

*Жаласна крыкнула нейкая птушка, можа трапіла ў зубы драпежніка* І. Шамякін. *І костачкі німоднае тыя крыважэрцы ваўкі не пакінулі* Р. Мурашка. *З клекатам зпавесным у небе кружаць хіжакі.* П. Глебка.

**ДРУЖБА,** СЯБРОЎСТВА, СЯБРАВАННЕ, ТАВАРЫСКАСЦЬ, БРАТЭРСТВА, БРАЦТВА, ПРЫЯЗНЬ, ПРЫЯЗНАСЦЬ, ЯДНАННЕ, АДЗІНСТВА, САДРУЖНАСЦЬ, САЛІДАРНАСЦЬ *(кніжн).*

*Але рэдкія выпадкі лаянкі толькі на кароткі час раскідалі іх дружбу, і хлопцы скора зноў гадзіліся.* Я. Колас. *Сяброўства іхняе пачалося яшчэ з першага школьнага дня першага школьнага года.* А. Якімовіч. *Але ж неяк трэба даказаць ім сваю прыязнасць, свае найлепшыя пачуцці?* І. Шамякін.

**ДРУЖЫЦЬ,** ДРУЖЫЦЦА, СЯБРАВАЦЬ, БРАТАЦЦА, ТАВАРЫШКАВАЦЬ, ТАВАРЫШАВАЦЬ ХАЎРУСА ВАЦЬ, ХАЎРУСНІЧАЦЬ, КАЛЕГАВАЦЬ, ВАДЗІЦЦА, ЗНАЦЦА *(разм),* КАМПАНАВАЦЬ *(абл)* ВАДЗІЦЬ ДРУЖБУ, ВАДЗІЦЬ ХАЎРУС, ВАДЗІЦЬ ЗНАЁМСТВА, ВАДЗІЦЬ КАМПАНІЮ.

*З мядзведзем дружы, а стрэльбу дзяржы.* Прыказка. *Аношка – прыяцель Яўгена. Яны сябруюць з даўніх пор.* Я. Колас. *Багаты з бедным таварышаваць не ўмее.* Прыказка. *Мы з сваім земскім начальнікам знаёмства вадзілі.* М. Лынькоў.

**ДРУК** /*перыядычны:* ПРЭСА, ПЕРЫЁДЫКА ДРУКАВАНАЕ СЛОВА.

*Трапіў слабы вершык дзесьці ў друк насценны.* М. Лужанін. *Байкі Крапівы, сатырычныя вершы Труса, грамадзянская лірыка Чарота, Александровіча часта ўпрыгожвалі старонкі легальнай і падпольнай перыёдыкі.* У. Калеснік.

**ДРЫЖАЦЬ,** ДРЫЖЭЦЬ, УЗДРЫГВАЦЬ, ПАДРЫГВАЦЬ, УЗДРЫГАЦЦА, ТРЭСЦІСЯ, ТРАСЦІСЯ, КАЛАЦІЦЦА, ТРЫМЦЕЦЬ, СКАЛАНАЦЦА ХАДЗІЦЬ ХАДУНОМ.

*На галінцы лісток баязліва дрыжыць* Я. Колас. *Трасецца, як асінавы ліст.* Прымаўка. *Трымцяць асіны ціха, спакойна спяць дубы.* П. Панчанка.

**ДРЭВА** /*у лесе:* ЛЯСІНА /*у хваёвым:* БАРАВІНА /*паваленае:* ВАЛЕЖЫНА /*вывернутае з карэннем:* ВЫВАРАЦЕНЬ, ВЫВАРАТ /*сухастойнае:* СТАРАДРЭВІНА, СУХАДРЭВІНА,СУХАСТОІНА /*прышчэпленае.* ШЧЭПА.

*Дрэвы вялізныя, у тры абхваты па камлі...* І. Навуменка. *Стаяць у вачах баравіны, стуліўшы вярхі.* Я. Колас. *Вера прысела на вывараць ля густога куста пад'ядлоўца.* А. Асіпенка.

**ДРЭННЫ,** БЛАГІ, КЕПСКІ, ПАГАНЫ, НЯДОБРЫ, НЕДАБРАЯКАСНЫ, НІЗКАЯКАСНЫ, НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ, АДМОЎНЫ, АД'ЕМНЫ, НЯВАЖНЫ, НЕСАМАВІТЫ, НЕПАХВАЛЬНЫ, НІКЧЭМНЫ, НЯСПРАЎНЫ, НЕДАСКАНАЛЫ, НЕПРЫДАТНЫ, НЯЎДАЛЫ, БРАКАВАНЫ, БРАКОЎНЫ, ЗАЛЯЖАЛЫ; ЛІХІ, ПАСКУДНЫ, ПАРШЫВЫ, ЛЯДАЧЫ, ЛЯДАЙКІ, ЛЯДАШЧЫ, ЗАДРЫПАНЫ, НЕВАЖНЕЦКІ, НЕЦІКАВЫ, НЕЗАЙЗДРОСНЫ, НЯЛЮДСКІ, НЯГОДНЫ, НЯГОЖЫ, НЕГАДЗІВЫ, НІКУДЫШНЫ, ЕРУНДОЎСКІ, МАРНЫ, ПЛЁВЫ, АХАЎСКІ, ТАНДЭТНЫ *(разм.);* ЗЛЫ *(абл.);* СЛАБЫ, БЕЗДАПАМОЖНЫ, НЯСПЕЛЫ, ПРАКЛЯТЫ, АПОШНІ, САБАЧЫ, ЧАРТОЎСКІ, Д'ЯБАЛЬСКІ *(перан.)* НА НІЗКІМ УЗРОЎНІ, НІЧОГА НЕ ВАРТЫ, НІКУДЫ НЕ ВАРТЫ, ГРОШ ЦАНА, НУЛЬ ЦАНА.

*Восень была: дарога дрэнная.* Ядвігін Ш. *У добрай жонкі і благі гаспадар добры.* Прыказка. *Зямля тут была, магчыма, самая кепская, адзін пясок...* І. Шамякін. *Касец з яе няважны, ды вось-вось я сам падскочу на дапамогу.* А. Якімовіч. *Стану баіць, гаманіці аб жыцці лядачым.* Я. Купала. *Ня-*

*людская кампанія і добрага звядзе* Прыказка. *Эх, бары былі, бары! Але й ім прыйшоў час марны.* Я. Колас. *На гэтай зямлі нават і грэчка нічога не варта* Я. Брыль.

**ДРЭНЬ**, ПОСКУДЗЬ, ПАСКУДСТВА, ПОГАНЬ, *(разм)*, ГНЮСАТА *(абл.)*. *Журавіны мы збіралі ну і розную там дрэнь.* А. Астрэйка. *Бі яго, хлопцы, каб не рабіў паскудства людзям!* П. Галавач. *Вызвалім ад погані Беларусь маю.* М. Машара.

**ДУБЕЦ**, РОЗГА, ПРУТ, ЛАЗІНА, ХВАРАСЦІНА, ХЛАБЫСЦІНА *(абл.)*. *На сытага жарабца не трэба дубца.* Прыказка. *І з кожнай бярозкі насечаны розгі для беднага люду.* М. Лужанін. *Толя прыўзняў галаву, стаіў дыханне і зацінуў у жмені арэхавы прут вудзільна.* Я. Брыль.

**ДУДКА**, ЖАЛЕЙКА, СВІСЦЁЛКА *(разм)*.
*Са свежай сакавітае вярбы скручу я дудку з лёгкімі ладамі.* В. Вітка. *Свае жалейкі люд закінуў, – чужым свісцёлкам месца даў.* Я. Купала.

**ДУЖЫ**, МОЦНЫ, МАГУТНЫ, ТРЫВАЛЫ, ВЫНОСЛІВЫ, ЦЯГАВІТЫ, ЗДАРОВЫ, ЖЫЛІСТЫ *(разм)*, МЯДЗВЕДЖЫ *(перан)* ХОЦЬ У САХУ.
*Далі яму дужага хлопца ў падмогу, што можа вала на плячах панясці.* А. Зарыцкі. *Паўстаў магутны пралетарый, чырвоны ўзняўшы сцяг ўрачыста.* Я. Купала. *Вынослівы конь. Каб не ён – не давёз бы.* У. Дамашэвіч.

**ДУМКА**, ДУМА, МЫСЛЬ *(кніжн.)*.
*Рвіся, думка маладая, туды, вышай, далей!* Я. Купала. *У кожнай хвілі і ў прыгодзе з сабой нясу дум чараду.* Я. Колас. *У стомлены мой мозг пастукалася мысль.* С. Дзяргай.

**ДУРАНЬ**, ДУРНЫ, ВАР'ЯТ; ДУРНІЦА, ДУРЫЛА, ДУРАЛЕЙ, ПРЫДУРАК, ТУПІЦА, ЁЛУП, ЁЛУПЕНЬ, ДОЎБЕНЬ, АСТАЛОП, АБЭЛТУХ, ШАЛЕНЕЦ, ІДЫЁТ, ПСІХАПАТ, КРЭЦІН *(разм.)*; АСЕЛ, БАРАН, ПЕНЬ, ПАЛЕНА, ДУБ, ДУБІНА, БОТ, ЛАПАЦЬ, ХАЛЯВА, ХАМУТ, АБУХ, БЯЗМЕН *(перан.)* ДУРНАЯ ГАЛАВА, ЯЛОВАЯ ГАЛАВА
*Дурню агню ў рукі не даюць* Прыказка. *Вар'яту не давай нажа ў рукі.* Прыказка. *Вы таленту не разумееце, тупіцы.* У. Корбан. *Ён пытае, а ты не будзь асталопам і адказвай!* А. Кулакоўскі. *Пашлі асла, за ім пасла* Прыказка. *Накрыліся грошы. Так табе і трэба, дурная галава.* М. Лобан.

**ДУРНЫ**, НЕРАЗУМНЫ, БЕЗРАЗВАЖНЫ, ВАР'ЯЦКІ; ДУРАЦКІ, ДУРАЧЫНЫ, ПРЫДУРКАВАТЫ, БЯЗМОЗГІ, БЕЗГАЛОВЫ, ТУПАГАЛОВЫ, ЦВЕРДАЛОБЫ, НЕДАПЕЧАНЫ, ІДЫЁЦКІ *(разм.)*; ТУПЫ, ПУСТЫ *(перан.)* НЕ Ў СВАІМ РОЗУМЕ, НЕ ПРЫ СВАІМ РОЗУМЕ.
*Дурнога салаўя – дурная песня.* Прыказка. *Смех без прычыны – знак дурачыны.* Прыказка. *Вялікая галава, ды пустая.* Прыказка.

## Е

**ЕДКІ**, ГОРКІ.
*Гарэлі хаты, і над вуліцамі слаўся едкі дым.* І. Мележ. *Горкі дым лез у вочы.* З. Бядуля.

**ЕПІСКАП** /*у католікаў:* БІСКУП.
*За цёмнай постаццю епіскапа выйшла з царквы некалькі чалавек.* К. Чорны. *А ўслед за панамі-дваранамі пачалі адхрышчвацца ад паўстання і ксяндзы з іх высокімі духоўнымі айцамі касцёла – біскупамі.* А. Якімовіч.

**ЕСЦІ**, З'ЯДАЦЬ, КАРМІЦЦА, ЖЫВІЦЦА, ХАРЧАВАЦЦА, СПАЖЫВАЦЬ, СТАЛАВАЦЦА, ЗАКУСВАЦЬ, ПЕРАКУСВАЦЬ /*што-небудзь смачнае:* ЛАСАВАЦЦА /*пра жывёлу:* ЖЫРАВАЦЬ, ЖЫРАВАЦЦА; СІЛКАВАЦЦА, ПАДСІЛКОЎ-

ВАЦЦА, ПАДМАЦОЎВАЦЦА *(разм.)* /*вадкую яду:* ХЛЫСТАЦЬ *(разм.);* ГАМАЦЬ *(дзіц.),* ЖЭРЦІ, ЖРАЦЬ, ЗЖЫРАЦЬ *(груб.);* УПЛЯТАЦЬ, АПЛЯТАЦЬ, УПІСВАЦЬ, УМІНАЦЬ, ЦЕРАБІЦЬ, МАЛАЦІЦЬ, ПЫТЛЯВАЦЬ *(перан.)* БРАЦЬ У РОТ.

*Есць за вала, робіць за камара.* Прыказка. *Пераходзячы з месца на месца, цацаркі кормяцца насякомымі...* В. Вольскі. *Сілкуецца дзед Арцём печанай бульбай...* З. Бядуля. *Жэрці і праўда хочацца. Аж у жываце баліць.* М. Лупсякоў. *Лёнька старанна ўмінаў батон...* В. Быкаў. *Вось у мяне як сядуць за стол, дык у шаснаццаць лыжак малоцяць...* І. Гурскі. ... *Валянцін адчуў, які ён галодны. Ды і не дзіва: з учарашняга дня чалавек нічога ў рот не браў.* Р. Сабаленка.

## Ж

**ЖАБА;** КВАКУХА *(разм.);* ЛЮГАШКА *(абл.)* /*палявая:* РАПУХА.

*Смачны жабе арэх, ды зубоў бог не даў.* Прыказка. *На выгане дружна крычалі ў канавах каля грэблі люгашкі.* П. Галавач.

**ЖАБРАК,** СТАРАЦ; ПАПРАСІМЕЦ, ПАБІРАХА, ПАДАРЭЙКА *(разм.).*

*А жабракі ўзносілі модлы і чакалі падачкі.* П. Пестрак. *Старац моўчкі заплятаў навітымі з мочанага лыка вяровочкамі пратаптаную дзірку ў лапці.* К. Чорны.

**ЖАНЧЫНА;** КАБЕТА, КАБЕЦІНА, БАБА, ЦЁТКА *(разм.)* /*маладая замужняя:* МАЛАДЗІЦА, МАЛАДУХА, МАЛОДКА /*з інтэлігенцкіх, звычайна гарадскіх колаў:* ДАМА; МАДАМ *(уст.).*

*Матрона была высокая, стройная, прыгожая жанчына.* Я. Колас. *Калі ў хаце жывуць дзве бабы, то ўжо спакою няма.* Я. Колас. *Маладзіца была шчаслівая і добрая, як усе маладыя маці.* А. Карпюк.

**ЖАРТ,** ДОСЦІП.

*Яна з хітрым жартам дражніла зіркам хлопцаў і мужчын.* К. Чорны. *Было шмат з'едзена і яшчэ больш выпіта. Твары пачырванелі, досціпы сыпаліся градам* У. Караткевіч.

**ЖМУТ,** ПУК, ПАСМА, ВЕХАЦЬ, ЖМЕНЯ, КАСМЫЛЬ, КАСМЫК *(разм.).*

*Вецер прынёс аднекуль жмут аўсянай саломы...* К. Чорны. *Пук сухой мяты ўткнуты быў у аконца.* К. Чорны. *Узяў з саней жменю саломы, абцёр боты і пайшоў на ганак...* К. Чорны.

**ЖУРАВЕЛЬ,** ЖОРАЎ.

*Далёка дзесьці ў небе плаўна нясецца крык жураўлёў.* Я. Колас. *Жоравы кажуць: «Курлы! курлык!»* Е. Лось.

**ЖУРНАЛІСТ,** КАРЭСПАНДЭНТ; ГАЗЕТЧЫК *(разм.).*

*І не адно сярод герояў імя запіша журналіст у рэпартаж.* Р. Някай. *Карэспандэнты ледзь не ўсіх газет прыехалі, бо і да іх нямала сігналаў паступала.* У. Корбан. *Пісаць артыкул яму неставала часу, і да таго ж ён не хацеў адбіраць у газетчыкаў іх законны хлеб.* М. Стральцоў.

**ЖЫВЁЛА;** ЖЫЎНАСЦЬ *(разм.);* СКАЦІНА, БЫДЛА, ГАВЯДА, ТАВАР, ХУДОБА *(абл.)* /*рабочая:* ЦЯГЛО.

*Дзівяцца людзі, як размяшчае Самабыль сваю жывёлу ў такім маленечкім хлеўушку.* Я. Колас. *Вясковая скаціна штогод травіла яго пасевы.* А. Чарнышэвіч. *Падпаскам, ганяючы быдла, я раніцы кланяўся ў пояс.* Я. Пушча.

**ЖЫВОТ,** ПУЗА, ТРЫБУХ, БРУХА, ЧЭРАВА *(разм.);* ЛАНТУХ *(абл.).*

*Рукі ў яго, як падушкі, як кісель, дрыжыць живот!* Ф. Багушэвіч. *Сам лазіў пад машынаю і на лапатках і на чэраве.* Я. Скрыган.

**ЖЫЛЛЁ,** КВАТЭРА, КУТ, КУТОК, ДАХ, ПРЫСТАНІШЧА, ПРЫСТАНАК, ПРЫСТАННЕ, ПРЫПЫНАК, ПРЫПЫНІШЧА, ПРЫТУЛАК, ПРЫ-

ТУЛІШЧА, ПРЫТОННЕ, ЖЫТЛО, СЕДАЛА, БЯРЛОГ, КОТЛА, КОТЛІШЧА *(разм перан).* АБІЦЕЛЬ, ПЕНАТЫ *(уст кніжн),* РЭЗІДЭНЦЫЯ *(афіц):* АПАРТАМЕНТЫ *(уст, мн);* ДАХ НАД ГАЛАВОЙ.

*У зямлянцы цепла і прыемна пахла чалавечым жыллём* І. Шамякін. *Перабраліся маладыя на другую кватэру, больш прасторную і выгодную.* Я. Колас. *І кут свой пакінуць шкада.* Я. Колас.

**ЖЫТНІ,** ЖЫТНЕВЫ, АРЖАНЫ; ІРЖАНЫ *(абл).*

*Агнем вясёлым ззяюць росы ў моры жытніх каласоў.* Я. Колас. *Ева адмахваецца і рагоча, закідваючы галаву на залацісты аржаны сноп.* А. Асіпенка.

**ЖЫЦЦЁ;** ЖЫЦЦЁ-БЫЦЦЁ, ВЕК *(разм.).*

*Мы жыццё аддаць гатовы за Радзіму і за мір.* М. Машара. *Пражыў век – дабра не бачыў.* К. Чорны.

**ЖЫЦЬ,** ЖЫЦЦА, ІСНАВАЦЬ; МЕЦЦА, ДЫХАЦЬ; *(разм.)* КАРАТАЦЬ ЖЫЦЦЁ.

*І не раз быў на валасок ад смерці, але застаўся жыць.* П. Галавач. *Ну, як жа братавая маецца?* К. Чорны.

**ЖЭРДКА,** ЖАРДЗІНА, ШОСТ; ШАСТОК *(памянш.);* ПРЫС *(абл.).*

*Над іх галовамі на жэрдцы віселі новыя лапці і нейкая вопратка..* П. Пестрак. *Над кожным домам – шост, антэна ..* Я. Семяжон. *Там такая бухта, што і прысам дна не дастанеш.* Я. Колас.

# З

**ЗАБАРОНА;** ЗАКАЗ *(разм.);* ВЕТА, ТАБУ *(кніжн).*

*Я не твая падданая і не нявольніца, каб слухаць твае забароны!* Я. Колас. *Атамныя бомбы спяць на складах, вета ўсёй зямлі ляжыць на іх.* П. Панчанка.

**ЗАБІЦЬ,** ЗАГУБІЦЬ, ЗНІШЧЫЦЬ; УТРУПЯНІЦЬ, ЗНІЧТОЖЫЦЬ, УЛАЖЫЦЬ, ПАЛАЖЫЦЬ, СТУКНУЦЬ, ПРЫСТУКНУЦЬ, ДАКОНЧЫЦЬ, ПРЫКОНЧЫЦЬ, ПРЫБРАЦЬ, УХОДАЦЬ, КОКНУЦЬ, УКАКОШЫЦЬ, УКАЮКАЦЬ *(разм)* АДАБРАЦЬ ЖЫЦЦЁ, АБАРВАЦЬ ЖЫЦЦЕ, РАШЫЦЬ ЖЫЦЦЯ, ПАЗБАВІЦЬ АД ЖЫЦЦЯ, ЗЖЫЦЬ СА СВЕТУ, ЗВЕСЦІ СА СВЕТУ, АДПРАВІЦЬ НА ТОЙ СВЕТ, ПУСЦІЦЬ НА ТОЙ СВЕТ, ЗАГНАЦЬ НА ТОЙ СВЕТ, ЗАГНАЦЬ У МАГІЛУ, УВАГНАЦЬ У МАГІЛУ, ЗНЕСЦІ ГАЛАВУ, СКРУЦІЦЬ ГАЛАВУ, ЗНЯЦЬ ГАЛАВУ З ПЛЕЧ, ВЫНЯЦЬ ДУШУ, ДАСТАЦЬ ДУШУ, ВЫНЯЦЬ ДУХ, ДАСТАЦЬ ДУХІ, ПРЫБРАЦЬ З ДАРОГІ, ПУСЦІЦЬ У РАСХОД, ПУСЦІЦЬ У ЦАРСТВА НЯБЕСНАЕ.

*Астаўся я, бачыш, адзін, як стаю. Загубілі небаракаў фашысты праклятыя...* Р. Няхай. *На зямлі сваёй ворага знішчу, як гадзюку, яго растапчу.* А. Астрэйка. *Стукнуць бандзюкі, і людское вока не ўбачыць.* І. Мележ. *Давай кокну яго, адным крывапіўцам менш будзе...* П. Пестрак. *Не ўдумай, барані бог, чаго паганага! Са свету зжывуць!* І. Мележ. *... Мой востры меч зніме тваю галаву з плеч.* З. Бядуля. *Ладуцька пусціў у расход вашых пасланцоў як правакатараў.* А. Кулакоўскі.

**ЗАБОЙЦА,** ЗГУБІЦЕЛЬ, МАГІЛЬШЧЫК; ДУШАГУБ, ЛЮДАБОЙЦА, ЛЮДАЕД, ЛЮДАЖЭРАЦ, ЛЮДАМОР, ЖЫВАЕД, ГАЛАВАРЭЗ *(разм. пагард.);* ІРАД, ІНКВІЗІТАР *(кніжн.).*

*Гад, згубіцель! Што ты нарабіў!..* К. Чорны. *І мерцвякоў устануць цені сваіх магільшчыкаў судзіць.* А. Бялевіч. *Салдат ударыў яе ў спіну аўтаматам. – Бі, душагуб, бі!* І. Мележ. *Сумленне, праўды ці душы дарма шукаць у людажэрца.* С. Дзяргай. *– Ох, і Ірад, ох змяіная яго душа! – абурыўся стары. – Бач чаго захацеў: людзей перабіць і ўсё багацце нашае забраць!* М. Лупсякоў.

**ЗАБРУДЗІЦЬ,** ЗАПЭЦКАЦЬ, ВЫПАЦКАЦЬ, УПЭЦКАЦЬ, ЗАПЛЯМІЦЬ, ЗАГАСІЦЬ, АБЛЯПАЦЬ, ЗАЛЯПАЦЬ, ЗАПАСКУДЗІЦЬ, УРАБІЦЬ, АБРАБІЦЬ, ВЫКВАЦАЦЬ *(разм.)*, ПЕРАВЭДЗГАЦЬ *(абл.)*
*Пасыпаліся бомбы з дзікім свістам, і дым ізноў блакіт забрудзіў чысты* П. Панчанка. *Плешча малатком, у ржу рудую выпацкаў і штаны, і нос..* І. Пташнікаў. *Вось як штаны заляпаў. Не адмыеш цяпер.* А. Савіцкі.

**ЗАБЫЦЬ;** ЗАБЫЦЦА *(разм.)*, ЗАПАМЯТАВАЦЬ *(абл.)* ВЫКІНУЦЬ З ГАЛАВЫ.
*Прысады стануць каля трактаў, і мы забудзем пра вайну...* А. Астрэйка. *Даўно з галавы выкінуў усе думкі аб ей.* І. Мележ.

**ЗАВАЁЎНІК,** ЗАВАЯВАЛЬНІК, ЗАХОПНІК, АКУПАНТ.
*Есць, брат, у горадзе людзі, якія не пакарыліся і не пакорацца нахабным заваёўнікам...* А. Якімовіч. *Нам трэба стрымаць наезд акупантаў на нашы землі* П. Пестрак.

**ЗАВУШНІЦЫ,** КЛІПСЫ.
*Дзвюх завушніц маладзікі выглядваюць з-пад хусткі.* М. Калачынскі. *Кароткія валасы на ілбе – грыўка, у вушах кліпсы, на пальцах пярсцёнак.* А. Асіпенка.

**ЗАГАД,** КАМАНДА, РАСПАРАДЖЭННЕ; ПРАДПІСАННЕ, ДЫРЭКТЫВА, ЦЫРКУЛЯР *(афіц.)*.
*Кароткі мелі мы загад: – Стаяць, каб вораг не прайшоў!* У. Дубоўка. *Афіцэры сабраліся вакол свайго начальніка і чакалі распараджэнняў.* Я. Колас. *Вы не выконваеце маіх прадпісанняў. Так, так. Сурова папярэджваю.* П. Кавалёў.

**ЗАГАДКА,** ЗАДАЧА, ГАЛАВАЛОМКА, РЭБУС.
*Начальнік гаварыў загадкамі. Не разбярэш, да чаго ён хіліць.* М. Лынькоў. *Максім не адзін раз важае, развязвае вузел задачы...* Я. Колас. *Світання туманныя рэбусы, вам поўдзень разгадку знаходзіць.* П. Макаль.

**ЗАГАІЦЦА,** ЗАЖЫЦЬ *(пра рану* ЗАРУБЦАВАЦЦА.
*Твар яго быў абгарэлы, увесь у шрамах, якія, здавалася, толькі нядаўна загаіліся, а цёмныя акуляры рабілі яго яшчэ больш страшным* У. Дамашэвіч. – *Глупства, – сказаў на гэта Рыгорка, – стрэмкі мы як бач падастаём, а драпіны цераз ноч зажывуць.* А. Якімовіч.

**ЗАДЗІРА,** СКАНДАЛІСТ; ЗАБІЯКА *(разм.)*.
*Што казаць, самі ведаеце, якія задзіры гэтыя хлопцы.* Я. Колас. – *Гэты скандаліст з Гайдачан?* З. Бядуля.

**ЗАДУМЕННЕ,** ЗАДУМЕННАСЦЬ, ЗАДУМНАСЦЬ, ЗАДУМЕРНАСЦЬ, ЗАДУМА, РОЗДУМ, ЗАСЯРОДЖАНАСЦЬ.
*Барodзіч сядзеў усё ля стала ў задуменні.* К. Чорны. *Аддаўшыся роздуму, Іван ішоў спорна, таропка і не прыкмячаў часу.* В. Быкаў.

**ЗАЙЗДРОСНЫ,** ЗАВІДУШЧЫ.
*У Васіля была і таптуха, і кломля – усё дзедавага вырабу, – снасць, чужым вачам проста такі зайздросная* І. Мележ. *Той жа завідушчы, Ахрэм, у дровы ездзіў. Дык такі воз наваліў сыр'я, а конь гарачы, то знатужыўся.* Я. Ермаловіч.

**ЗАКАЗ,** ЗАЯЎКА, ПАДРАД.
*Перад ім ляжала зводка заказаў на штучныя ўгнаенні.* К. Чорны. *Як з рабочай сілай? Брыгадзіры далі заяўкі?* І. Гурскі. *Ён узяў вялікі падрад на выраб падэшвы для арміі...* К. Чорны.

**ЗАКАХАЦЦА,** УЛЮБІЦЦА; УТРЭСКАЦЦА, УКЛЯПАЦЦА, УЛОПАЦЦА *(разм.)*.
*Цікава, у якога ж шчасліўца ты закахалася?* І. Шамякін. *Палячка тая вазьмі дый улюбіся ў нашага музыку.* М. Гарэцкі.

**ЗАКЛІК,** КЛІЧ, ВОКЛІЧ, ПОКЛІЧ, ПРЫЗЫЎ, ЛОЗУНГ.
*Кліч раздаўся: раздзеты, галодны, для змагання настала пара!* А. Гурло. *Артур перабіў іх гутарку прызывам да ўвагі.* Ц. Гартны.

**ЗАКЛІНАННЕ**, ЗАМОВА.
*Яго ўзмахі рук напаміналі знакі заклінання* П. Пестрак. *Ніякія дактары лекамі, ніякія варажбіты замовамі не адымуць у яго гэтага сораму* З. Бядуля.

**ЗАЛІЎ**, ЗАТОКА, ЗАТОН, ЗАВАДЗЬ, БУХТА, ЛІМАН, ГУБА.
*Фінская затока закута ў тоўсты ільдзяны панцыр.* З. Бядуля. *З затону ў мора выйшаў першы сейнер...* А. Звонак. *Над берагам чайка бядуе, і падае сонца ў ліман.* А. Вялюгін.

**ЗАЛЯЦАННЕ**, ЗАЛЁТЫ, ФЛІРТ; ШАШНІ *(разм.)*
*Ён ростам невялічкі, а ў заляцаннях звер, таварыш Чаравічка – раённы кавалер.* П. Броўка. *Ты шашні строіш патаёма, лайдак ты, кныр няшчасны!* Я. Колас.

**ЗАМІЛАВАННЕ**, ЗАКАХАНАСЦЬ, ЛЮБОЎ, ЛЮБАСЦЬ, ЗАХАПЛЕННЕ.
*Бацькоўская закаханасць у шолах жытнёвых ніў, сардэчная палымянасць, якое вораг не сніў* Е. Лось. *Настаўнік заўважыў вялікую любоў хлопчыка да вершаванага слова...* М. Хведаровіч.

**ЗАПАЛКА**, СЕРНІК, СЯРНІЧКА *(уст.)*.
*У мяне была адна запалка, але патухла, як я хацеў раскласці агонь.* К. Чорны. *Ён узліў на стол гарэлкі і паднёс запалены сернік.* М. Лобан. *Тады ўстаў, запаліў сярнічку.* К. Чорны.

**ЗАПАС**, ПРЫПАС, РЭЗЕРВ, ФОНД, РЭСУРСЫ *(мн.)*; БАГАЖ, АРСЕНАЛ *(перан.)*.
*Усяго і запасу, што між зубоў.* Прымаўка. *Камандзір брыгады ўзяў свой апошні рэзерв.* І. Мележ. *Падлічылі свае сілы і рэсурсы прарабы.* Х. Шынклер.

**ЗАПІСКА**, ПАПЕРКА, ПІСУЛЬКА, ЦЫДУЛКА, ЦЫДУЛЬКА *(разм.)*
*І у заходнебеларускіх палітзняволеных:* ГРЫПС.
*У прэзідыўм пасыпаліся запіскі.* Т. Хадкевіч. *Для яе было б занадта нявытрыманым прыйсці да Рыгора так хутка, пасля пакінутай яму цыдулькі.* Ц. Гартны.

**ЗАПЛАКАЦЬ**, РАСПЛАКАЦЦА, ПРАСЛЯЗІЦЦА, ХЛІПНУЦЬ, УСХЛІПНУЦЬ; ЗАГАЛАСІЦЬ, ЗАРАЎЦІ, РАЗРАЎЦІСЯ *(разм)* ЗАЛІЦЦА СЛЯЗЬМІ, ПУСЦІЦЬ СЛЯЗУ, УРАНІЦЬ СЛЯЗУ, ДАЦЬ ВОЛЮ СЛЯЗАМ, НЕ УТРЫМАЦЬ СЛЯЗЫ.
*Запелі «Надгробное рыдание...» – усе ў хаце заплакалі.* М. Гарэцкі. *Арцём усхліпнуў, і слёзы пацяклі па яго твары.* Э. Самуйлёнак. *Залілася Ясаня горкімі слязьмі, але бядзе памагчы нічым не магла.* Я. Колас.

**ЗАПЛЕСНЕЦЬ**, ЗАЦВІСЦІ.
*Там сапраўдны разгон для паэта, а тут зачарсцвееш, як тая скарынка, заплеснееш.* Р. Сабаленка. *І гэта ж азначала, наколькі думкі мае тады закарэлі, плеснявю зацвілі.* М. Гарэцкі.

**ЗАПОМНІЦЦА** УРЭЗАЦЦА Ў ПАМЯЦЬ, УРЭЗАЦЦА Ў ПАМЯЦІ, ЗАПАСЦІ Ў ПАМЯЦЬ, АСТАЦЦА Ў ПАМЯЦІ, ЗАСТАЦЦА Ў ПАМЯЦІ, ПАКІНУЦЬ СЛЕД У ПАМЯЦІ, АСЕСЦІ Ў ПАМЯЦІ, УЛЕЗЦІ Ў ПАМЯЦЬ, УПІЦЦА Ў ПАМЯЦЬ, ЗАПАСЦІ Ў ДУШУ.
*Назаўсёды запомнілася мне і наша сумесная паездка на адкрыццё Асінбуда.* М. Хведаровіч. *Урэзаліся Марцінавы словы Юзіку ў памяць.* К. Крапіва.

**ЗАПОМНІЦЬ**, НЕ ЗАБЫЦЬ · ЗАРУБІЦЬ НА НОСЕ.
*У сорак трэцім мы былі яшчэ зусім малыя, але запомнілі гэтых салдат...* І. Чыгрынаў. *Не забудзеш, пабачыўшы хоць раз, велічныя дубровы Тураўшчыны і Лельчыцкага раёна...* Т. Хадкевіч.

**ЗАПРАШАЦЬ**, ПРАСІЦЬ, КЛІКАЦЬ, ЗАКЛІКАЦЬ, ЗВАЦЬ, ЗАЗЫВАЦЬ, ГУКАЦЬ.
*– Заходзьце, заходзьце, калі ласка, – гасцінна запрашала іх маці.* Л. Арабей. *Кліча ранак і жней і сярпы на прастор свой бясконцы...* А. Куляшоў. *Так у госці звалі, аж рукавы адарвалі.* Прымаўка.

**ЗАРАЗА**, ПОШАСЦЬ, ЭПІДЭМІЯ; МОР, ПАМОРАК, ПАМОР *(уст.)*.

*Бяда ідзе па зямлі ад багацця, як злая зараза ад мерцвяка..* Э. Самуйленак. *Пошасць ішла на ўсіх ад яго хваробы* К. Чорны. *Пачаўся раптам мор на жывёлу* З. Бядуля.

**ЗАСЛАНЯЦЬ,** ЗАКРЫВАЦЬ, ЗАСТУПАЦЬ, ЗАГАРОДЖВАЦЬ, ЗАСЦІЛАЦЬ, ЗАТУЛЬВАЦЬ, ЗАТУЛЯЦЬ, ЗАХІНАЦЬ, ЗАСЦІЦЬ *(разм.).*

*Дым вайны не засланяў сонца, якое заходзіла, як звычайна ў жнівеньскі дзень.* І. Шамякін. *Хвойнік закрываў ад яго хаціну і вёску.* К. Чорны. *Усю зямлю навокал засцілаў густы дыван невысокай мяккай травы.* У. Шахавец.

**ЗАСТАЦЬ,** ЗАХАПІЦЬ, ЗЛАВІЦЬ; ЗАСПЕЦЬ, НАКРЫЦЬ, ЗАСТУКАЦЬ, ПЕРАНЯЦЬ, ЗАПАРВАЦЬ *(разм.);* СПАЙМАЦЬ *(абл.).*

*Кожны раз, як назнарок, – прыйдзеш, а цябе не застаць.* Ц. Гартны. *Хоць бы не захапіў яе неадзетаю.* Ц. Гартны. *Завея пераняла вазакоў на паўдарозе...* А. Чарнышэвіч.

**ЗАЎВАГА,** РЭПЛІКА.

*Цікаўны і надзвычайназіральны, ён умеў не толькі слухаць, але і ўстаўляць у гутарку свае заўвагі, заўсёды разумныя і трапныя.* А. Чарнышэвіч. *Былі такія, што слухалі з недавер'ем і раз-пораз устаўлялі разважныя, не вельмі бадзёрыя рэплікі...* І. Мележ.

**ЗАЎВАЖЫЦЬ,** ПРЫКМЕЦІЦЬ, ПРЫМЕЦІЦЬ, УБАЧЫЦЬ, УГЛЕДЗЕЦЬ, ЗГЛЕДЗЕЦЬ, РАЗГЛЕДЗЕЦЬ, ЗМЕЦІЦЬ, ЗАПРЫКМЕЦІЦЬ, СКМЕЦІЦЬ, УЛАВІЦЬ, ЗАСЕКЧЫ *(разм.);* ЗАКМЕЦІЦЬ *(абл.).*

*Але Андрэй не заўважыў акопчыка, ці можа і заўважыў, ды не звярнуў увагі, хто ў ім.* А. Кулакоўскі. *Грышка хацеў падняцца, але раптам прыкмеціў, што нехта паўз рэчкі паўзе.* М. Чарот. *Вунь, прымець, старуха-хвойка скочыла з карэння...* Я. Купала. *Перастала іржыць, сціхла, – не ўгледзелі калі.* І. Пташнікаў.

**ЗАЎЗЯТЫ,** ЗАЦЯТЫ, ЗАЯДЛЫ, ФАНАТЫЧНЫ.

*Яўхім і сапраўды быў заўзяты паляўнічы* А. Чарнышэвіч. *Сямён вучыўся з фанатычнай упартасцю.* М. Паслядовіч.

**ЗАЎСЁДЫ!,** ЗАЎЖДЫ, УВЕСЬ ЧАС, ВА ЎСЕ ЧАСЫ, ВЕЧНА, ВЕК, ВЕК-ВЕЧНА, ВЕКАВЕЧНА, ВЕК ВЕКАМ, У ВЯКАХ *(выс.);* УСЦЯЖ *(абл.).*
КОЖНЫ РАЗ, УСЯКІ РАЗ, КАЛІ НІ ГЛЯНЬ.

*Адным заўсёды ганаруся, што я – савецкі чалавек.* А. Астрэйка. *Не доўга панаваць над краем, дзе векавечна слёзы льюць.* М. Васілёк.

**ЗАЎЧАСНА,** ДАЧАСНА, ПРАДЧАСНА, БЯСЧАСНА, ДА ЧАСУ, БЕЗ ЧАСУ, ДА ПАРЫ, БЕЗ ПАРЫ, РАНЕЙ, РАНЕЙ ЧАСУ, РАНА.

*Пастарэла я дачасна за вайну.* А. Якімовіч. *Не лезь раней за бацьку ў пекла.* Прымаўка. *Неба зоркамі выткана. толькі спаць яшчэ рана.* Н. Гілевіч.

**ЗБАН,** ЖБАН /*без ручкі:* ГЛАДЫШ; ГАРЛАЧ *(абл.).*

*Мёд, віно ў жбанах б'е пенай, як бы мора тое.* Я. Купала. *Я малака гладыш са смакам выпіў і сеў на прызбе пад старою ліпай...* П. Панчанка.

**ЗБОЖЖА,** ЗЕРНЕ, ХЛЕБ; ДАБРО, ПАШНЯ *(абл.).*

*Збожжа ўсё забралі, у панскі свіран завезлі.* К. Крапіва. *У гэтай будыніне хаваліся галоўныя калгасныя прадукты: зерне, бульба і гародніна.* Я. Колас. *Пад год дабро родзіць.* Прыказка.

**ЗБРОЯ,** УЗБРАЕННЕ; МЕЧ *(перан. выс.).*

*З нас многа хто зброю змяніў на лапату, будуем мы, ладзім разбураны край.* А. Астрэйка. *У бой неабходна пусціць усё ўзбраенне.* М. Ткачоў.

**ЗБРУЯ,** ВУПРАЖ.

*Калі коні былі запрэжаны, ён праверыў, ці добра ляжыць збруя...* А. Якімовіч. *Занесшы ў кладовую вупраж і выходзячы з канюшні, ён*

*акурат убачыў Вольгу, што вярталася з поля* І. Мележ.

**ЗВІНЕЦЬ,** ПАЗВОНЬВАЦЬ, ДЗЫНКАЦЬ, ДЗВЭНКАЦЬ, БРЭНКАЦЬ, БРЫНЧАЦЬ, БРЫНЧЭЦЬ, БРЫНКАЦЬ, ЗУМКАЦЬ *(разм.)*

*Калі струну стальную будзяць, – яна звініць* М. Танк. *Паслухайце: ўжо ведры дзынкаюць каля чатырох суседніх хат.* І. Муравейка. *На шыі ў канякі віселі шамкі, яны аднатонна брынчэлі.* І. Гуркі.

**ЗВЫЧАЙ,** ПАРАДАК, ПРАВІЛА, ПРАКТЫКА, УМОЎНАСЦЬ, АБЫЧАЙ, ЗАВАД, ЗАВЯДЗЕНКА, РЫТУАЛ, КАНОН *(кніжн.).*

*Пчолку, работніцу боскую, любіць ен згодна са звычаем.* С. Дзяргай. *Няма такога правіла, каб палонных крыўдзіць.* М. Лынькоў. *Што край – то, кажуць, абычай.* А. Зарыцкі.

**ЗВЫЧАЙНЫ,** ЗВЫКЛЫ, ПРЫВЫЧНЫ, ЗВЫЧНЫ, АБЫКЛЫ, ЗАВЕДЗЕНЫ, ПРОСТЫ, ШЭРЫ, СЯРЭДНІ, ПАСРЭДНЫ, НЕПРЫМЕТНЫ, НЕПРЫКМЕТНЫ, РАДАВЫ, ЗЯМНЫ, БУДЗЁННЫ, БУДНІ, БУДНЫ, ШТОДЗЁННЫ, ЗАЎСЁДНЫ, ЗАЎСЁДАШНІ, АГУЛЬНАПРЫНЯТЫ, ПРАЗАІЧНЫ, НАТУРАЛЬНЫ, НАРМАЛЬНЫ, НЕ ВЕЛЬМІ ЯКІ.

*Вечар перад святочным днём заўсёды здаецца прыгажэйшым за звычайныя вечары.* А. Чарнышэвіч. *Я – непрыкметны, шэры чалавек.* М. Багдановіч. *У святыя дні сядзелі пад прызбамі, у будзённыя дні душыліся работаю...* К. Чорны.

**ЗГОДНА,** ЗЛАДЖАНА, АДНАДУШНА, АДНАГАЛОСНА У ЗГОДЗЕ.

*Мы з жонкаю жылі шчасліва і згодна.* У. Дамашэвіч. *Спявалі зладжана, прыгожа, але асабліва паланіў адзін цудоўны голас.* І. Шамякін. *Прагаласавалі аднадушна.* М. Лынькоў.

**ЗГРАБНЫ,** СТРОЙНЫ, СТАТНЫ, ГРАЦЫЁЗНЫ.

*Абедзве машыністкі былі зграбныя, маладыя, добра апранутыя.* З. Бядуля. *Затым увайшла маці разам з высокай стройнай дзяўчынай у цёмнай сукенцы* Я. Маўр. *Высокі, статны, ён трымаў галаву проста, узнята.* П. Пестрак.

**ЗГУБІЦЬ;** ПАСЕЯЦЬ *(перан., разм.).*

*Чаго не згубіў, таго не знойдзеш.* Прыказка. *З сваяком пабіўся, чуць дамоў заплёўся, ўхлёпаўся ў балота і пасеяў шапку.* Я. Купала.

**ЗДАВАЦЦА,** ВЫГЛЯДАЦЬ, УЯЎЛЯЦЦА, МРОІЦЦА, ВЫДАВАЦЦА, ВЫДАВАЦЬ, МІРСЦІЦЦА, БЛЮЗНІЦЦА, ЧАЎПЦІСЯ *(разм.)* МЕЦЬ ВЫГЛЯД.

*Яго сівая бародка здаецца шматком воўны.* З. Бядуля. *А людзі, што ішлі з ім поруч, цяпер уяўляліся яму чужымі, варожымі.* Я. Колас. *Дзядзьку блюзніцца спрасонку, што пад ім не сані – печ...* К. Крапіва.

**ЗДАГАДКА,** ДАГАДКА, ДУМКА, МЕРКАВАННЕ; ЗДОГАДКА, ЗДОГАД *(разм.).*

*– Ну, пане, будзе цяпер змена, і пойдуць новыя парадкі, – Міхал выказвае дагадкі!* Я. Колас. *Мне наогул часам думка прыходзіць, ці не вельмі мы перагружаем чалавека.* У. Карпаў.

**ЗДАНЬ,** ПРЫВІД; ЦЕНЬ *(разм.);* МАРА, СЦЕНЬ, ВІДМА *(абл.);* МІРАЖ, ФАТА-МАРГАНА *(кніжн.).*

*... А за мною заўсёды, да самай труны, будзе крочыць праклятая здань вайны.* П. Панчанка. *Нейкі час ёй нават здаецца, што ў хаце не жывы чалавек, а яго прывід.* М. Лупсякоў. *Як мары, белыя бярозы пад сінявой начной стаяць...* М. Багдановіч. *Думаў, што можа не дайсці, бо агні – міраж.* І. Пташнікаў.

**ЗДАРЭННЕ,** ВЫПАДАК, ПРЫГОДА, ПАДЗЕЯ, ДЗЕЯ, СПРАВА, ЭПІЗОД, ФАКТ, ГІСТОРЫЯ, КАЗУС; ПРЫПАДАК, БЫВАЛЬШЧЫНА *(разм.);* СЦЭНА *(перан.).*

*І ўсё ж здарэнне не да смаку: унізіць шляхціца, ды як!* Я. Колас. *Пра адзін дзіўны выпадак. мне расказваў таварыш.* У. Карпаў. *У сувязі з гэтым мне прыгадваецца невялічкі факт.* А. Звонак.

**ЗДАЎНА,** АДВЕКУ, А́ДВЕЧНА, СПРАДВЕЧНА, СПРАДВЕКУ, З ДАЎНІХ ПОР, З ДАЎНІХ ДЗЕН; ЗДАВЕН *(абл.)* СПАКОН ВЯКОЎ.
*На скрыжаванні дзвюх дарог ляжыць здаўна разбіты камень.* А. Астрэйка. *Дзе гразь мясіў адвеку ды кладкі клаў народ – трывалую гравейку насыпалі за год.* Н. Гілевіч. *Здавён, гасціннасць беларуса, усім вядома ты, здавен...* А. Вялюгін.

**ЗДЗЕК,** ГЛУМ, ПАНЯВЕРКА.
*Здзек панаваў над народам убогім, гналі ў астрогі найлепшых сыноў.* М. Машара. *Дакуль цярпець мы будзем глум?* Я. Колас. *Зноў гоніць кат на паняверку, на катаргу сясцер, братоў...* М. Засім.

**ЗДОХНУЦЬ,** ПАСЦІ, ПРАПАСЦІ; ДАЙСЦІ, КОНЧЫЦЦА, СКОНЧЫЦЦА, ВЫПРУЦІЦЦА, *(разм.)* АДКІНУЦЬ ХВОСТ, ВЫЦЯГНУЦЬ НОГІ, ВЫПРАСТАЦЬ НОГІ, ЗАДРАЦЬ НОГІ, ВЫПРУЦІЦЬ НОГІ, ЗАДРАЦЬ КАПЫТЫ.
*Здохні карова – і няма чаго есці, і прападае гаспадарства.* Ц. Гартны. *Скаціна пала, гумно згарэла..* Ф. Багушэвіч. *От і коніка купіш, бо чорная скора ногі выпрастае.* А. Чарнышэвіч.

**ЗДРАДНІК,** ПРАДАЖНІК, ПРАДАЎЦА, АДСТУПНІК, АДШЧАПЕНЕЦ, ПРАВАКАТАР; ПЕРАВЕРЦЕНЬ *(разм.)*; ЗДРАЙЦА *(абл.)*; ЮДА *(пагард.)*; ВЫХРЫСТ, ПЯРЭХРЫСТ, ХРЫСТАПРАДАВЕЦ, КЛЯТВААДСТУПНІК *(перан.)* ПРАДАЖНАЯ ДУША, ПРАДАЖНАЯ ПСІНА.
*Здраду прымаюць, а здрадніка вешаюць.* Прыказка. *Адшчапенцы нейкія. Каб гэта проці свайго цара ісці.* М. Лобан. *Сям-там чуўся шэпт. «юда», «пярэхрыст»* Р. Сабаленка. *Для прадажнай псіны кол з асіны.* Прыказка.

**ЗДРАНЦВЕЦЬ,** САМЛЕЦЬ, АНЯМЕЦЬ, ЗНЯМЕЦЬ, АДЗЕРАВЯНЕЦЬ, АПРУЦЯНЕЦЬ; ЗАМЛЕЦЬ, ЗАНЯМЕЦЬ *(разм.)*.
*Я верш пісаў, рука мая здранцвела..* С. Дзяргай. *Рукі іх ужо анямелі ад працы.* М. Ткачоў. *Здавалася, апруцянелі рукі* М. Гроднеў.

**ЗДУРНЕЦЬ,** ЗДУРЭЦЬ, АДУРЭЦЬ, АДУРНЕЦЬ, ЗВАР'ЯЦЕЦЬ, СТРАЦІЦЬ РОЗУМ *(пра старых)* ЗДЗЯЦІНЕЦЬ; АШАЛЕЦЬ, АЧМУРЭЦЬ, АЧУМЕЦЬ, РЭХНУЦЦА *(разм.)* ВЫЖЫЦЬ З РОЗУМУ, ЗВІХНУЦЦА З РОЗУМУ, З'ЕХАЦЬ З ГЛУЗДУ.
*Трапіцца і найразумнейшаму здурнець.* Прыказка. *Ашалеў ты, ці што? Людзі ж кругом* А. Асіпенка. *Мы то з вамі не зрабілі б гэтага Стары выжыў з розуму.* У. Караткевіч. *Гэты ёлап, мусіць, зусім з глузду з'ехаў* К. Крапіва.

**ЗЕЛЯНІНА,** ЗЕЛЕНЬ, МАЙ *(абл.)*
*Яны з'ехалі на ўзгорак, і позірку адкрылася ўся іх вёска ў зеляніне садоў.* І. Шамякін. *Поле пакрылася зеленню.* Я. Колас. *Гаю, гаю, гаю, схаджу да дубровы, насяку там маю ахапак здаровы.* Я. Купала.

**ЗЛАВАЦЬ,** ЗЛАВАЦЦА, ГНЕВАЦЦА, АБУРАЦЦА, НЕНАВІДЗЕЦЬ, ЛЮТАВАЦЬ, ВАР'ЯВАЦЦА, СЕРДАВАЦЬ, ШАЛЕЦЬ *(разм.)*; КІПЕЦЬ, УСПЫХВАЦЬ, ЗЕЛЯНЕЦЬ *(перан.)* МЕЦЬ ЗЛОСЦЬ, МЕЦЬ ЗУБ, МЕЦЬ ВОКА, НЕ МЕЦЬ ВОКА, ЗАПАЛЯЦЦА ГНЕВАМ, ВЫХОДЗІЦЬ З СЯБЕ, ГЛЯДЗЕЦЬ КОСА, ЗЕЛЯНЕЦЬ АД ЗЛОСЦІ, БЯЛЕЦЬ АД ЗЛОСЦІ, ЛЕЗЦІ НА СЦЯНУ, ВАСТРЫЦЬ ЗУБЫ, ТАЧЫЦЬ ЗУБЫ.
*Той прымае гэта за кпіны і пачынае злаваць.* К. Чорны. *Маленькі тварык хмурыўся, сердаваў.* М. Лынькоў. *Ты, Іван, не кіпі.* І. Пташнікаў. *На ворага ен вока мае – бо праз яго шляхі закрыты.* Я. Колас. *Стась бялее ад злосці.* А. Асіпенка. *Точыць на нас зубы злы фашыст-вампір.* Я. Колас.

**ЗЛАДЖАНА,** СУЛАДНА, ГАРМАНІЧНА.
*Нязмораныя яшчэ моцна коні ідуць зладжана і мерна, як гадзіннік.* К. Крапіва. *Калектыў будаўнікоў згуртоўваўся, працаваў дружна і суладна* Р. Няхай.

**ЗЛАМАЦЦА**, ТРЭСНУЦЬ, ХРУСНУЦЬ; ПЕРАЛЯЦЕЦЬ *(разм.)*
*У мяне зуб у граблях зламаўся.* К. Чорны. *Трэснулі рысоры, і машыне патрэбна грунтоўная налада пры кузні.* Р. Мурашка. *Каля самых Апечак пярэдняе кола, трапіўшы ў калдобіну, хруснула, брычка нахілілася набок.* А. Пальчэўскі. *Андрэй з размаху выцяў. Кіёк пераляцеў папалам...* А. Кулакоўскі.

**ЗЛАЧЫНСТВА**, ПРАВАПАРУШЭННЕ, ЗЛАЧЫН, КРЫМІНАЛ *(разм.).*
*Будзе суд над злачынствам варожым, суд суровы народаў сусвету.* М. Калачынскі. *У залежнасці ад віду правапарушэнняў адрозніваюць адказнасць адміністрацыйную, дысцыплінарную, грамадзянскую, крымінальную, міжнародна-прававую.* БелЭН. *Скарыся, грэшніца, прад богам, прызнай злачын сваёй рукі!* У. Дубоўка. *Цэлы крымінал у цябе на ўчастку зрабілі* Х. Шынклер.

**ЗЛОДЗЕЙ**, РАСКРАДАЛЬНІК; ЗЛАДЗЮГА *(разм пагард ); ТАРБАХВАТ (разм.) /што крадзе з узломам:* УЗЛОМШЧЫК */што крадзе з кішэні:* КІШЭНШЧЫК */што крадзе коней:* КАНАКРАД */што крадзе ў лесе:* ПАРУБШЧЫК.
*Не злавіў – не злодзей.* Прыказка. *А ты чаго, Юстына, расхныкалася? Шкада тарбахвата?* І. Пташнікаў. *«Будуць лавіць!» Дзікі страх ахапіў старога канакрада, і ён бег, колькі хапала сілы.* Я. Колас.

**ЗЛОСЦЬ**, ЗЛАСЛІВАСЦЬ, ГНЕЎ, ВАРОЖАСЦЬ, НЕПРЫЯЗНАСЦЬ, НЕПРЫЯЗНЬ, НЯЛАСКА, ЗАПАЛЬЧЫВАСЦЬ, НЯНАВІСЦЬ, ЛЮТАСЦЬ; ШАЛ *(разм.).*
*Ён быў чамусьці не ў настроі, і ў голасе чулася зласлівасць.* Т. Хадкевіч. *Маўчанка гнеў тушыць.* Прыказка. *Непрыязнасць між тым расла, ты прыехаў, і настаў разлад.* А. Русецкі. *І гора будзе ворагу ад народнай нянавісці!* К. Чорны.

**ЗЛУЧАЦЬ**, ЛУЧЫЦЬ, СТОЧВАЦЬ; ЗВЯЗВАЦЬ, УВЯЗВАЦЬ *(перан.)*
*Ксендз маладых спатыкае, на ўсё жыцце іх злучае.* В. Дунін-Марцінкевіч. *Дружба крэпкая навекі лучыць дзеда, ўнука.* Я. Колас. *Ён ужо і дошчачак нарэзаў, нагабляваў. Трэба было папрабіраць пазікі і сточваць іх.* Р. Сабаленка. *Непарыўная дружба звязвае тры братнія народы – рускі, беларускі і ўкраінскі.* Р. Шкраба.

**ЗЛЫ**, ЗЛОСНЫ, РАЗЗЛАВАНЫ, ГНЕЎНЫ, РАЗГНЕВАНЫ, СЯРДЗІТЫ, ЛЮТЫ, РАЗЛЮТАВАНЫ, ЛІХІ, АЗВЯРЭЛЫ, АШАЛЕЛЫ, АСАТАНЕЛЫ; ЗЛЮЧЫ *(разм.);* ВОЎЧЫ *(разм. перан.).*
*Гоніць яго злая нявестка, як сабаку, з хаты...* З. Бядуля. *Вам цяжка жывецца, і вы злосны.* А. Чарнышэвіч. *Гнеўны голас паэта кляйміць ганьбай ворагаў міру.* Р. Шкраба. *Злуюць ліхія цёткі, ды век у іх кароткі* М. Лужанін. *Біўся, як ашалелы баксёр.* М. Машара.

**ЗМАГАЦЦА**, БІЦЦА, ВАЯВАЦЬ, ВЕСЦІ ЗМАГАННЕ, ВЕСЦІ БАРАЦЬБУ, ВЕСЦІ ВАЙНУ; ДУЖАЦЦА *(разм.);* БАРУКАЦЦА *(перан.)*
БРАЦЦА ЗАГРУДКІ, ХАПАЦЦА ЗАГРУДКІ, ЛІЦЬ КРОЎ, ПРАЛІВАЦЬ КРОЎ, ЛАМАЦЬ ПІКІ.
*... Покуль сэрца наша б'ецца, будзем жыць мы і змагацца.* М. Васілёк. *І пайшоў з панамі біцца сын яе Сцяпанка.* М. Чарот. *Тата твой ваюе з панам, каб няволі больш не знаць.* М. Чарот. *Вядзе вайну сляза са смехам* Я. Купала.
*А дзеці іхнія кроў верна пралівалі за веру рускую і рускага цара.* Я. Купала.

**ЗМАРНАВАЦЬ**, ПАТРАЦІЦЬ, ПРАЖЫЦЬ, ПРАРАБІЦЬ, ПРАГУЛЯЦЬ; ЗГЛУМІЦЬ, ВЫКІНУЦЬ, РАШЫЦЬ, ПРАСАДЗІЦЬ *(разм.)* КІНУЦЬ НА ВЕЦЕР.
*Мы змарнавалі палову дня, а прайшлі ад берага ўсяго тры вярсты.* Э. Самуйлёнак. *Рабіў ён гэта паспешліва, нібы шкадаваў*

*патраціць на непатрэбную справу лішняга часу.* І. Чыгрынаў. *Трэба ж выкінуць столькі грошай!* Х. Шынклер. *На вецер не кіну, а чалавеку не пашкадую, калі таго бяда агорне* К. Чорны.

**ЗМЕНА,** ПЕРАМЕНА, ЗМЯНЕННЕ, ПЕРАТВАРЭННЕ, ПЕРАЎТВАРЭННЕ, ПЕРАЎВАСАБЛЕННЕ; АДМЕНА *(абл.);* МЕТАМАРФОЗА, ТРАНСФАРМАЦЫЯ, РЭФОРМА */рэзкая:* РЭВАЛЮЦЫЯ */паступовая.* ЭВАЛЮЦЫЯ *(кніжн.):* ПАВАРОТ, ПАВАРОТАК, ПАВАРОТКА, ПЕРАБУДОВА, ПЕРАБУДАВАННЕ, ЗРУХ */рэзкая:* ПЕРАЛОМ, ПЕРАВАРОТ *(перан.).*

*Якая перамена! Негаваркі Сяргей быў тут само красамоўства.* М. Машара. *Не прывыкаць яму да розных паваротак лёсу...* А. Кулакоўскі. *Дзякуючы табе ў маім нутру адбыўся круты пералом.* Ц. Гартны.

**ЗМЕРЗНУЦЬ,** ПЕРАМЕРЗНУЦЬ, ПРАСТЫЦЬ, УСТЫЦЬ, ПРАСТУДЗІЦЦА, АЗЯБНУЦЬ, ПРАЗЯБНУЦЬ, АКАЛЕЦЬ, СКАЛЕЦЬ; ЗАСТУДЗІЦЦА, АДУБЕЦЬ, УДУБЕЦЬ, АДУБЯНЕЦЬ, ЗДУБЯНЕЦЬ, СКАРЧАНЕЦЬ *(разм.);* ЗАСТЫГНУЦЬ, АЗГЛЕЦЬ, САСКЛЕЦЬ, СКАЛЯНЕЦЬ, СКАЧАНЕЦЬ ЗАЙСЦІСЯ АД ХОЛАДУ.

*Ты змерзла?.. Я тваю руку сваімі вуснамі сагрэю.* С. Грахоўскі. ... *Буду грэцца каля печы, бо вельмі азяб.* З. Бядуля. *Ногі празяблі.* З Бядуля. *Акалеў на гэтым віскутні* М. Лобан. *Рукі – не так, вельмі ж ногі ўдубелі.* Я. Брыль. *Рукі мае скарчанелі, без рукавіц выбраўся* К. Чорны. *Бедны хлапчук скачанеў у сцюдзёнай вадзе.* А. Чарнышэвіч.

**ЗМЯНІЦЦА,** ПЕРАМЯНІЦЦА, ПЕРАТВАРЫЦЦА ПЕРАЎТВАРЫЦЦА, ПЕРАЎВАСОБІЦЦА, ЗМЯНІЦЬ ВЫГЛЯД, ЗМЯНІЦЬ АБЛІЧЧА; ПЕРАЙНАЧЫЦЦА, З'ІНАЧЫЦЦА, ПАІНАЧАЦЬ, ПЕРАВЯРНУЦЦА, АБЯРНУЦЦА, ПЕРАКІНУЦЦА *(разм.);* ВЫРАДЗІЦЦА, ПЕРАРАДЗІЦЦА, ПЕРАРАСЦІ, ПЕРАЙСЦІ *(перан.).*

*Змянілася жонка з твару. вочы ўпалі, вытырк нос* . Я. Колас. *Колішняя пустка пераўтварылася. ажыла.* А. Асіпенка. *Здавалася, што ўсе малыя дзеці за год вельмі выраслі і з'іначыліся.* К. Чорны. *Былі рублі, ды перавярнуліся ў вераб'і.* Прымаўка. *Малады сасняк перайшоў у густы і вільготны змешаны лес.* В. Вольскі.

**ЗМЯНШАЦЦА,** ПАМЯНШАЦЦА, МЕНШАЦЬ, УБЫВАЦЬ, УБАЎЛЯЦЦА; МЕНШЫЦЦА *(разм.),* МЕНЕЦЬ *(абл.):* ЗНІЖАЦЦА, ПАНІЖАЦЦА, ПАДАЦЬ, СПАДАЦЬ, КАРАЦЕЦЬ, СКАРАЧАЦЦА, РАСТАВАЦЬ, ТАЯЦЬ *(перан.),* ІСЦІ НА СПАД.

*Але адлегласць паміж імі і коннікам змяншалася з кожным момантам.* Я. Колас. *Цана няўхільна зніжалася.* В. Вольскі. *Дні ідуць на спад.* Я. Колас.

**ЗНАЙСЦІ,** АДШУКАЦЬ, ПАДШУКАЦЬ, ДАШУКАЦЦА */нечакана:* НАТРАПІЦЬ, НАТКНУЦЦА, НАПАРОЦЦА; НАЦІКАВАЦЬ, АСАЧЫЦЬ, ВЫСАЧЫЦЬ, ВЫШНЫПАРЫЦЬ *(разм );* ВЫКАПАЦЬ, АДКАПАЦЬ, ВЫПАРАЦЬ, НАМАЦАЦЬ *(разм. перан.);* ТРАПІЦЬ *(абл.).*

*Чаго не згубіў, таго не знойдзеш.* Прыказка. *Я нават адшукаў і лаўку тую, дзе выразаў сцізорыкам імя.* В. Вітка. *Еду, еду, еду, не натраплю следу* В. Вітка. *Яшчэ летась ён высачыў і зьнішчыў цэлы воўчы вывадак.* М. Паслядовіч. ...*Мы намацалі бандыцкае гняздо.* А. Чарнышэвіч.

**ЗНАЎЦА,** МАЙСТРА, СПЕЦЫЯЛІСТ, ПРАФЕСІЯНАЛ, ЭКСПЕРТ. ЗНАТОК, СПЕЦ *(разм ),* УСЕЗНАЙКА *(разм іран.)* АЎТАРЫТЭТ, ПРАФЕСАР, СВЯЦІЛА *(перан.)* СТАРЫ ВЕРАБЕЙ. СТРЭЛЯНЫ ВЕРАБЕЙ.

*– Мусіць. зіма сапраўдная ляжа, – з выглядам знаўцы сказаў Коля, ловячы рукой пушыстыя сняжынкі.* А. Якімовіч. *Прыехаў з трэста прадстаўнік, – машыну хваліць, глядзяць эксперты і не ганяць...* У. Корбан. *Не. мяне на*

*мякіне не ашукаеш Я стрэляны верабей.* Я. Васіленак.

**ЗНАХОДЖАННЕ,** ПРЫСУТНАСЦЬ, РАЗМЯШЧЭННЕ; БЫЦЦЁ, ПОБЫТ *(разм ).* ДЫСЛАКАЦЫЯ *(кніжн. вайск )*

*Ужо адна твая прысутнасць недалёка мяне значна легчыць маё маральнае адчуванне...* Ц. Гартны. *Месца дыслакацыі нашых атрадаў – паміж Гродна і Беластокам...* А. Карпюк.

**ЗНАК,** МЕЦІНА, КЛЯЙМО *(у жывёл.* ТАЎРО; ЗАЛЫСКА *(разм.);* СІМВАЛ, ЭМБЛЕМА *(кніжн.).*

*А навокал каскі ўсё варожыя, а на касках павуковы знак.* А. Астрэйка. *Патрэбен востры фельетон, высцебаць іх па твары, пакінуць на іх сінякі, меціны.* А. Макаёнак. *Шыракагруды, з грываю рудой, буланы конь пазначаны таўром.* А. Вялюгін. *Тры станкі высокай дакладнасці з'яўляюцца ўладальнікамі ганаровай эмблемы [знака якасці].* «Звязда».

**ЗНАРОК,** НАЎМЫСНА, НАЎМЫСЛЯ, СУМЫСЛЯ, СВЯДОМА, ПРАДУЗЯТА, СПЕЦЫЯЛЬНА, ДЭМАНСТРАЦЫЙНА; НАЗНАРОК *(разм.);* НАРОЧНА *(абл.).*

*Ехалі полем – знарок аб'язджалі лес.* І. Шамякін. *Дзірка не ад шпунта, а пракручана наўмысна* С. Баранавых. *Як бы свядома нехта злы ў жыцці завязвае вузлы.* Я. Колас. *На спатканне яна пайшла назнарок са спазненнем.* У. Карпаў.

**ЗНЕВАЖАЦЬ,** АБРАЖАЦЬ, ГАНІЦЬ, БЭСЦІЦЬ, АБГАВОРВАЦЬ, КАМПРАМЕТАВАЦЬ, ПАГАНІЦЬ, ШАЛЬМАВАЦЬ *(разм.)* ЧАРНІЦЬ, ПЛЯМІЦЬ *(перан )* КІДАЦЬ ЦЕНЬ, КЛАСЦІ ЦЕНЬ, ПУСКАЦЬ ЦЕНЬ, АБЛІВАЦЬ ГРАЗЁЮ, АБЛІВАЦЬ ПАМЫЯМІ, ТАПТАЦЬ У ГРАЗЬ.

*У поўных калісьці ад шчасця святліцах чужак зневажае дачок.* Я. Купала. *І ў вас хапае яшчэ нахабства спрачацца з машыністам, абражаць яго?* Х. Шынклер. *Праца не паганіць чалавека, а корміць, і поіць, і вучыць.* Прыказка. *Ды гэтым жа ты маю старасць у гразь топчаш.* А. Пальчэўскі.

**ЗНІЗУ,** СПАДНІЗУ, СПАДЫСПАДУ *(разм.).*

*Горача стала ўсяму – знізу, ад зямлі.* І. Пташнікаў. *Халодная раса прыпякала ногі спаднізу – не ўстоіш, здаецца.* А. Асіпенка.

**ЗНІКНУЦЬ,** ЗГУБІЦЦА, ЗАПРАПАСЦІЦЦА, ЗГІНУЦЬ, ЗГУБІЦЦА, ЗВЕСЦІСЯ, ПЕРАВЕСЦІСЯ; ЗАВАЛІЦЦА, ДЗЕЦЦА, ПАДЗЕЦЦА, ЗАПАВЕТРАЦЬ *(разм.);* КАНУЦЬ *(уст.);* СЧЭЗНУЦЬ *(абл.);* ПРАЙСЦІ, СЫСЦІ, ВЫВЕТРЫЦЦА, ВЫТХНУЦЦА, РАЗВЕЯЦЦА, РАЗЛЯЦЕЦЦА, ЗМЫЦЦА, РАСТАЦЬ, РАСПЛЫСЦІСЯ, РАЗЫСЦІСЯ, ПАТАНУЦЬ, ЗГАСНУЦЬ, ПАГАСНУЦЬ, ЗАГЛУХНУЦЬ *(перан.)* ! ЯК У ВАДЗЕ РАСТАЦЬ, ЯК ПРАЗ ЗЯМЛЮ ПРАВАЛІЦЦА, ЯК У ВАДУ КАНУЦЬ, КАНУЦЬ У НЕБЫЦЦЁ.

*Прыгрэла сонейка, заззялі кропелькі дарагімі каменнямі і зніклі.* Я. Колас. *Згубіўся недзе між пракосамі нячутны, лёгкі след дзявочы...* С. Гаўрусёў. *Колькі казак не стала! Колькі песень звялося!* Н. Гілевіч. *Тут разышоўся дым, і дзед убачыў Міколку.* М. Лынькоў. *З Шурам, з Драгуном сувязі няма. Як у вадзе расталі.* І. Навуменка.

**ЗНІШЧАЦЬ,** НІШЧЫЦЬ, ВЫНІШЧАЦЬ, ГУБІЦЬ, РУЙНАВАЦЬ, ПУСТОШЫЦЬ, АПУСТАШАЦЬ, ЗНІШТАЖАЦЬ, ПЛЯЖЫЦЬ, ДРУЗГАТАЦЬ *(разм.),* МІТРЭНЖЫЦЬ *(абл );* ЛІКВІДОЎВАЦЬ *(кніжн.),* ПЕРАВОДЗІЦЬ, ЗВОДЗІЦЬ, ВЫТРАЎЛЯЦЬ, ЗГАНЯЦЬ, ЗНОСІЦЬ, З'ЯДАЦЬ. КАРЧАВАЦЬ, ВЫКАРЧОЎВАЦЬ *(перан.)* ВЫРЫВАЦЬ З КАРЭННЕМ.

*Гітлераўцы, адступаючы, падпальвалі і знішчалі ўсё.* І. Грамовіч. *Згода будуе, нязгода руйнуе.* Прыказка. *Секлі, апусташалі лес...* М. Машара. *Такі туман, кажуць, з'ядае снег.* У. Карпаў.

*З карэннем экскаватар вырывае апошні след, дзе быў фашыста бот* Г. Бураўкін.

**ЗНОЎ,** ІЗНОЎ, ЗАНАВА, НАНОВА, НАНАВА, БОЛЕЙ, БОЛЬШ, ЯШЧЭ РАЗ, ДРУГІ РАЗ, СПАЧАТКУ; ЗНОЎКУ *(разм.)* З НОВАЙ СІЛАЙ.

*Будзе час, і снег растане, прыйдзе зноў да нас вясна...* Я. Колас. *Ён расказваў і нанава ўсе гэта бачыў.* Я. Скрыган. *Цяпер трэба пачынаць усё спачатку.* К. Чорны.

**ЗОРКА,** ЗАРАНКА /*што падае і знікае:* ЗНІЧКА.

*У небе зоркі ад марозу пахаладзеўшыя дрыжаць.* М. Багдановіч. *Дагарэлі раннія заранкі, адцвілі чаромхі ў паплавах.* А. Пысін. *З неба ўпала знічка.* А. Асіпенка.

**ЗРАЗУМЕЦЬ,** УСВЯДОМІЦЬ, ПАЗНАЦЬ, ПАСЯГНУЦЬ, ПАНЯЦЬ, АСЭНСАВАЦЬ, РАЗАБРАЦЦА, РАЗАБРАЦЬ; СПАСЦІГНУЦЬ, ДАЎМЕЦЦА, СКЕМІЦЬ, УЦЯМІЦЬ, СЦЯМІЦЬ, СКМЕЦІЦЬ, ЗМІКІЦІЦЬ, РАСКУМЕКАЦЬ, РАСШАЛОПАЦЬ, УШАЛОПАЦЬ, УТАРОПІЦЬ *(разм.)*; ЗАСВОІЦЬ, УЛАВІЦЬ, ДАПЯЦЬ, СХАПІЦЬ, РАСКУСІЦЬ *(перан.)* УЗЯЦЬ У РОЗУМ, УЛАВІЦЬ СЭНС, РАСКУСІЦЬ ПРАЎДУ, УДЗЯЎБЦІ САБЕ Ў ГАЛАВУ.

*Зразумець у той час я не мог аніяк, чаму бацьку і дзеда партрэт той займае.* А. Астрэйка. *Чалавека толькі ў бядзе пазнаеш.* Прыказка. *Ён ніяк не мог апрытомнець, асэнсаваць, што здарылася.* І. Гурскі. *Тамара скеміла, што яе могуць зараз сустрэць карнікі.* Р. Сабаленка. *Крушынскі ціскаў плячыма і нічога ўцяміць не мог* З. Бядуля.

**ЗУСІМ,** ПОЎНАСЦЮ, ЦАЛКАМ, КАНЧАТКОВА, ДААСТАТКУ, СПАЎНА, УШЧЭНТ, ДАШЧЭНТУ, НАШЧЭНТ, ДАТЛА, ДАЧЫСТА. ДОЧЫСТА, ДАРЭШТЫ. ДАЗВАННЯ, УДРУЗГ, УДРЫЗГ /*пра адчыненыя дзверы, вокны.* НАСЦЕЖ; ЧЫСТА, ЧЫСТАГЛАДКА, НАЧЫСТА, ПАДЧЫСТУЮ *(разм.)*; СУЗДРОМ *(абл.)* ДАГАЛА *(перан.)* ДА КАНЦА, ДА АПОШНЯГА, ДА АПОШНЯЙ НІТКІ, ДА АДКАЗУ, РАЗ І НАЗАЎСЁДЫ, У ПРАХ, У ПУХ І ПРАХ, У ДЫМ, У РЫЗУ, У ДОШКУ, У ПАРАШОК, У КОРАНЬ, ПАД КОРАНЬ, ДА ГРУНТУ, ПАД МЯТЛУ, НА СТО ПРАЦЭНТАЎ, ПА ВУШЫ.

*Вы зусім без памяці ляжалі, трызнілі, і гэтак страшна...* П. Галавач. *Кожны з іхняга звяна план свой выканаў спаўна.* Р. Барадулін. *Згарэла вёска, можна сказаць, дашчэнту.* Я. Брыль. *Пад гарою ў селяніна конь прыстаў дарэшты.* Я. Купала. *Едзе ў міліцыю, п'яны ў дым.* У. Корбан.

## І

**ІГРОК,** ГУЛЕЦ /*у карты:* КАРЦЁЖНІК.

*Марцін сам быў заядлым іграком і мог сядзець за сталом з раніцы да поўначы, шлёпаючы патрапанымі картамі.* М Машара. *Гэта было падобна на тое, як шахматны гулец бачыць сэнс і парадак там, дзе з погляду ўсяго толькі – хаатычнае бязладдзе фігур.* М. Зарэцкі. *Сагнаўшы ахвоту ў гульні, падаліся купацца карцёжнікі.* Е. Лось.

**ІЛЬДЗІНА,** КРЫГА.

*На ільдзінах плаваюць таварышы, на хрыбтах начуюць ледніkoў.* П. Панчанка. *Паламаны застаўкі ледзянымі крыгамі.* П. Глебка.

**ІМГЛА,** ІМГА, СМУГА, ЗАСМУЖ, ТУМАН; АБЛОГА, ПОЛАГ, ПАВАЛОКА, НАВАЛОКА, МАРЫВА, МРОІВА, КАЛАМУТА, КАЛАМУЦЬ, МУЦЬ *(перан.)*.

*За плячыма яго тачула ў імгле вёска* К. Чорны. *Сіняватая смуга звісае над зарэччам.* Я. Колас. *Там, угары, за сасновымі вершалінамі віднелася блакітнае неба, пацягнутае рэдзенькай баваўнянай павалокай.* І. Пташнікаў. *Паветра дрыжыць, пераліваецца, у марыве спёкі тоне ўвесь небасхіл.* М. Лупсякоў.

**ІМГНЕННЕ,** МОМАНТ, МІГ, ХВІЛІНА, ХВІЛЯ.

*Ад думкі пра жаніхоў Андрэй пахмурнеў і хацеў ужо ехаць дамоў, але ў гэтае імгненне ўбачыў Ганну.* А. Чарнышэвіч. *Яна на момант прыпынілася, трохі жахнулася ад нечаканасці.* К. Чорны. *Праз міг на выгане сяла жывая гутарка пайшла.* П Броўка. *Шабуніха на хвіліну стала.* І Мележ. *Вось у гэтай самай хвілі хлопцы ўсе загаманілі.* У. Дубоўка.

**ІМКНУЦЦА,** МКНУЦЦА ПАМЫКАЦЦА, ХІНУЦЦА; ЦЯГНУЦЦА, ПЕРЦІСЯ, ПРЭГЧЫСЯ, ТУЖЫЦЦА; ПЯЦЦА, РВАЦЦА, ПАРЫВАЦЦА, РВАЦЬ *(перан.)* ЛЕЗЦІ СА СКУРЫ

*Імкнуўся да сытага мяшчанскага жыцця.* М Гарэцкі *Вось табе і адмычка, чаму людзі да карчмы хінуліся.* М. Лужанін. *Ведаў і прогся ў Пецярбург, як магаметанін у Мекку...* Ц. Гартны. *Ён траціць апошнія сілы, але ўсё-такі пнецца і тужыцца выцягнуць сеці.* Я. Скрыган. *Думкі ж да шчасця мае парываюцца..* А. Гурло.

**ІНЕЙ,** ІНЬ, ШЭРАНЬ, НАМАРАЗЬ; МАРОЗ, СЕРАБРО *(перан.).*

*Зіма... Ад інею вішняк перахіліўся за парканы..* М. Танк. *На гасцінцы скрогат, на прысадах інь...* Я. Купала. *Забялелі на ставах снягі, пахіліліся ў шэрані клёны.* П. Трус. *Конікі, пакрытыя белым марозам, дружна бягуць і пырхаюць.* Я. Колас. *Прыгожыя прысады ў серабры!* Х. Шынклер.

**ІСЦІ,** СТУПАЦЬ, КРОЧЫЦЬ, МАРШЫРАВАЦЬ /*павольна:* ПЛЕСЦІСЯ, ПХНУЦЦА. ЦЯГНУЦЦА; БРЫСЦІ, ТЭПАЦЬ, ТУПАЦЬ, ТРАПАЦЬ, СЫПАЦЬ, ДЫБАЦЬ *(разм.)* /*хутка:* ШЫБАВАЦЬ, ШЫБАЦЬ, ЧАСАЦЬ / *павольна.* СУНУЦЦА, ВАЛАЧЫСЯ. ЦЁПКАЦЦА, ЦЯЛЁПКАЦЦА, ЦЯЛЮХКАЦЦА, ЦЮПАЦЬ, КЛЫГАЦЬ, КЛЫПАЦЬ *(разм.)* /*вялікімі крокамі.* СІГАЦЬ; ДЖГАЦЬ *(разм.);* ЧУХАЦЬ *(перан.)* БІЦЬ НОГІ, ТРАПАЦЬ НОГІ, ПЕРАБІРАЦЬ НАГАМІ, ПЕРАСТУПАЦЬ НАГАМІ, СУНУЦЬ НОГІ, ПЕРАСОЎВАЦЬ НОГІ, ПЕРАСТАЎЛЯЦЬ НОГІ.

*Яшчэ нямала вёрст і дзён з баямі нам ісці на захад.* М. Танк *Зноўку ступаю знаёмымі сцежкамі, тымі, што крочыў на золку заўжды.* Р. Барадулін. *Хлопец вінавата тупаў на сваё месца.* М. Лынькоў. *Блізка відаць, але далёка дыбаць.* Прыказка. *Конік клыгае ступою, гразь плюскоча з-пад калёс.* Я. Колас. *Бушмар джгаў аднекуль дарогаю.* К. Чорны. *Навошта ж, сынок, ты будзеш трапаць ногі? Не звярэдзіцца конь, гуляе цяпер.* Я. Колас. *Арыштаваныя ледзь перастаўлялі ногі.* У Дамашэвіч.

## К

**КАВАДЛА** /*для кляпання касы:* БАБКА

*Некалькі чалавек грэлі з-за вуха па велічэзных кавадлах.* К. Чорны. *Сам ён узяў дзве касы, торбачку з інструментам і калодачку з бабкай, на якой кляпаў косы.* А. Пальчэўскі.

**КАВАЛАК,** КУСОК, ДРОБ, ДРАБОК, КРОШКА, КРЫХА, КРЫШАН, АБЛОМАК, АШЧЭПАК, АДШЧЭПАК, УЦІНАК, ДРУЗАЧКА /*чатырохкантовы:* БРУС, БРУСОК /*ад разбітага посуду.* ЧЭРАП /*звычайна пра хлеб:* ЛУСТА, СКІБА /*засохлы:* АСУШАК /*з краю бохана:* АКРАЕЦ, КУС, АСКАБАЛАК. СКРЫЛЬ *(разм.);* ДРУЗАЛАК, АСКАЛЁПАК /*звычайна пра сала:* АПОЛЕЦ, ПОЛАЦЬ, СКРЫГАЛЬ. ДЗЯЛЯНКА, ШТЫГЛІК /*пра хлеб:* КАРВЕГА, ГАМЁЛКА *(разм.).*

*Парэзаныя на кавалкі селядцы з цыбуляю ляжалі на талерцы* К. Чорны. *За кусок той хлеба чорны ты аддай сілу, думкі, – будзь пакорны і чакай. .* Я. Купала *А цукру ў нас не было і драбка.* Б. Сачанка. *На ўсю хату разля-*

*целіся.. друзачкі шкла.* Р. Сабаленка. *У адной руцэ ён трымаў лусту хлеба, у другой брус сала* К. Чорны. *Ці не разжыўся б там карвегу хлеба.* Я. Колас.

**КАВАЛЕРЫСТ,** КОННІК; УЛАН *(уст.)*

*Паілі жарабкоў кавалерысты, грукочучы акованым вядром.* С Гаўрусёў. *Табе народ у рукі даў клінок, трымай яго мацней, чырвоны коннік!* М. Лужанін. *Уланы з запыленымі пукамі саломы ездзілі ад хаты да хаты, падпальваючы кожную паасобку...* Т. Хадкевіч.

**КАДЫК,** ГАРЛЯК АДАМАЎ ЯБЛЫК.

*Кадык вытырк на доўгай шыі* К. Чорны. *І рагоча, аж трасецца, аж дрыжыць гарляк.* Я. Колас. *Порстка вылятае корак, набгом апаражняецца бутэлька, і адно кратаецца ў чалавека адамаў яблык.* Б.Мікуліч.

**КАЛАШЫНА,** КАЛОШЫНА, КАЛОША, ШТАНІНА.

*Я падкасаў калашыны, каб не замачыць штаноў...* М. Стральцоў. *Сідар пастаяў каля ложка, апрануў шынель, паправіў штаніну на параненай назе і пайшоў ад ложка.* П. Галавач.

**КАЛДОБІНА,** КАЛДОБА, ВЫБОІНА, УХАБА.

*Аўтобус трасе, падкідвае на калдобінах дарогі* . Р Сабаленка. *Патрасе на калдобах...* І. Пташнікаў *Натужліва гудзеў грузавік. коўзаючыся па слізкіх выбоінах* М. Лынькоў. *Для старой бабы і на печы ўхабы* Прыказка

**КАЛІСЬЦІ,** КОЛІСЬ, КАЛІСЬ, НЕКАЛІ, РАНЕЙ, ДАЎНЕЙ, ДА ГЭТАГА

*І зарастаюць муравой сляды, што дома вы пакінулі калісьці.* С. Гаўрусёў *Некалі пан быў тут.* Я. Скрыган. *Дый свет цяпер не такі, як даўней* Я. Колас.

**КАЛОДЗЕЖ,** КАЛОДЗЕЗЬ, СТУДНЯ.

*Калодзеж быў неглыбокі, і вады ў ім было мала.* Я. Колас. *Стаў чэрпаць ваду. паволі апускаў жэрдку ў калодзезь.* К Чорны. *Чуўся гоман каля студні, вёдзер стук, дзявочы смех...* Я. Колас

**КАЛУПАЦЬ,** ПОРКАЦЬ, КОРПАЦЬ *(разм.):* ДЛУБАЦЬ *(абл.).*

*Саломінаю ён калупаў зубы.* К. Чорны. *А сам палкай поркае, здзірае Міколкавы малюнкі.* М. Лынькоў.

**КАЛЫСКА,** ЗЫБКА; ЛЮЛЬКА.

*На гнуткай жэрдачцы калыска звісае к самаму палку...* Я. Колас. *Разам з бабуляй яна купала малютку, пелянала і спявала песню над яе зыбкай...* З. Бядуля. *Ніхто яго не калыхнуў ні разу... Ні люлькі яму, нічога не трэба было.* М. Гарэцкі.

**КАЛЫХАЦЬ,** ЛЮЛЯЦЬ; ГУШКАЦЬ *(разм.).*

*Калыхала маці сына у калысцы ў ліповай...* Я. Купала. *Мяне матка не люляла, казак, песень не спявала.* Я. Колас. *Ён гушкаў дзіця на руках...* М. Лынькоў.

**КАЛЮЧКА,** ІГОЛКА, ШЫП /з *колаca:* АСЦЮК, ВУС

*Жоўтае лісце шасціць пад нагамі, шчокі калючка сасновая шчыпе.* Я. Купала. *Калючыя шыпы ліян ранілі яго рукі і рвалі вопратку* Э. Самуйлёнак *Ячменныя асцюкі з пылам забіваліся яму за каўнер і ў лапці.* К Чорны

**КАМЕНЬ** /*вялікі:* ВАЛУН.

*І я гляджу на гэты ў крушні камень...* С. Шушкевіч. *Куля высекла іскру на валуне і са свістам зрыкашэціла.* І. Шамякін.

**КАНАВА,** РОЎ, ТРАНШЭЯ, КАНАЛ, КЮВЕТ, КАЛЕКТАР; РЫНШТОК *(абл.).*

*Адзін раз капалі мы. мужыкі, у пана канавы на балоце.* К. Чорны. *Дзе-нідзе ў рове стаяла вада, рос аер і чарот.* З. Бядуля. *Траншэя ўперлася ў дарогу, якая чамусьці не была перакопана.* А. Кулакоўскі.

**КАНАПА,** КУШЭТКА, САФА, ТАХТА.

*Апранутая ў квяцісты халат, ляжыць на канапе Ляля і чытае кнігу.* А. Рылько. *Маці паслала госці на маёй кушэтцы.* Я. Брыль.

**КАНЕЦ,** ЗАКАНЧЭННЕ. СКАНЧЭННЕ. ЗАВЯРШЭННЕ, КАНЦОЎКА. СХОД *(абл.).* ФІНАЛ *(кніжн.),* ЗАКРУГЛЕННЕ *(перан.)*
*Надыходзіў канец рабочага дня* П. Кавалеў. *Знайсці добрую канцоўку для камедыі – гэта вялікая справа* К. Крапіва. *Але ў гэты момант Адась Тушка дайшоў да фіналу сваей прамовы.* К. Чорны.

**КАНІКУЛЫ,** ВАКАЦЫІ *(уст.).*
*Скончыліся заняткі ў школе, прыйшлі летнія канікулы* Я. Маўр. *Нас. рабфакаўцаў, адпушчаюць на зімовыя вакацыі* З. Бядуля.

**КАНТОВЫ,** ГРАНЕНЫ.
*А твар – нерухомы. Нізкі лоб, кантовыя плечы.* К. Чорны. *Прад імі ж [наборшчыцамі] у наборных касах шрыфты граненыя ляжаць.* А. Пысін.

**КАНЬКІ,** НАЖАВІКІ *(разм.).*
*На канькі, на санкі, лыжы зваў фанфарамі каток.* А. Александровіч. *І вось яна перада мною – новыя чаравікі з прыкручанымі нажавікамі.* М. Лупсякоў.

**КАНЮШНЯ,** СТАЙНЯ.
*У былой графскай канюшні таксама, як і каліськці, вісяць хамуты, а жывыя экспанаты запаведніка хрупаюць свежае сена.* Я. Брыль. *Мы агледзелі ўсе стайні: там усяго васьмёра коней* К. Чорны.

**КАНЮШЫНА** /*дзікая:* ДЗЯЦЕЛІНА, ДЗЯЦЕЛЬНІК, ДЗЯЦЕЛЬНІЦА.
*А калі кабыла ўскочыць у Рыгораву канюшыну, дык я ж тут ні пры чым.* К. Крапіва. *Пахла медуніцай і дзяцелінай, якая пачынала ўжо цвісці.* А. Асіпенка.

**КАПЕЦ,** БУРТ.
*Кабеты ў гэтыя дні даставалі насенную бульбу з паграбоў ды капцоў.* К. Чорны. *Работнікі ссыпалі бульбу ў бурты, накрывалі саломай і засыпалі зямлёй.* А. Чарнышэвіч.

**КАП'Ё,** ПІКА, ДЗІДА *(уст.).*
*Першабытны чалавек у звярынай шкуры, узброены лукам з вострымі стрэламі і вялікім, цяжкім кап'ём.* В. Вольскі. *Салдат людзей там рэжа, коле. казак дзяцей падняў на пікі* Цётка. *Ці з-за Сожа, ці з-за Прыпяці-ракі прынясуць на дзідах волю казакі.* С. Дзяргай.

**КАПІТУЛЯЦЫЯ,** ЗДАЧА.
*Я прыйшоў з гуманным ультыматумам, а зараз прыму толькі безагаворачную капітуляцыю.* К. Губарэвіч. *Былы камбрыг і камандзір палка за здачу горада пайшлі пад суд.* П. Глебка.

**КАПЛЯ,** КРОПЛЯ; КАПКА, КРАПКА *(разм.)* /*дажджу* ДАЖДЖЫНКА / *расы:* РАСІНА, РАСІНКА /*тлушчу на вадзе.* СКАЛКА, ПАЦЕРКА, БІСЕРЫНА, ГРАДЗІНА *(перан.).*
*Быццам слёзы, дажджу каплі паліліся над зямлёй.* А. Паўловіч. *Упала кропля і другая. за імі цэлым вадаспадам буйныя каплі. як бы градам, па лісцях дуба секанулі.* Я. Колас. *Лора заўважыла на сестрыных вачах пацеркі слёз.* Р. Сабаленка.

**КАПЯЛЮШ,** БРЫЛЬ *(абл.)* /*з круглым верхам:* КАЦЯЛОК /*цыліндрычны, з вузкімі палямі.* ЦЫЛІНДР.
*Я на панскі капялюш брыль свой не змяняю.* Я. Колас. *У яго [дзядзькі Сэма] казліная бародка, на галаве – цыліндр.* І. Новікаў.

**КАР'ЕРЫСТ,** ВЫСКАЧКА *(разм.);* ПРЫСТАСАВАНЕЦ *(разм., пагард.).*
*Ён [камендант Візэнер] не быў кар'ерыстам, як многія палітыкі, і ўвесь час падкрэсліваў, што ён салдат, толькі салдат, не больш.* І. Шамякін. *А Сашка таксама добры прыстасаванец! Пішчом лезе туды, дзе выгодней.* М. Паслядовіч.

**КАРМІЦЬ,** ЖЫВІЦЬ, СІЛКАВАЦЬ *(разм.);* ДАВАЦЬ *(перан.)*
*Як цюцьку кормяць, так цюцька брэша.* Прыказка. *Дзед Талаш сілкаваў Панаса хлебам і салам...* Я. Колас.

**КАРЦІНА,** ПАЛАТНО *(перан.).*
*Люся глядзіць на карціну, якая насупроць вісіць на сцяне* Я. Брыль. *Мастак намаляваў аднойчы палатно.* У. Корбан.

**КАРЧМА,** ШЫНОК, ЗАБЯГАЙЛАЎКА, ТАВЕРНА *(уст.).*
*Бывала, прыйдзеш на кірмаш, ды з гора да карчмы.* П. Броўка. *У пустым шынку без грошай не вельмі разгуляешся, як гаворыць народ.* К. Крапіва.

**КАРЫСЦЬ,** ВЫГАДА; ВЫЙГРАНКА, РАХУБА *(разм.);* ВЫЙГРЫШ *(перан.).*
*Я хачу вучыцца, каб з мяне карысць была дзяржаве.* Я. Колас. *Атрымалі б выйгрыш у часе, але пройгрыш у сіле.* М. Гамолка.

**КАСІР,** КАЗНАЧЭЙ, СКАРБНІК *(уст.).*
*Касір выдаваў рабочым авансы і рыхтаваўся да разрахунку ў канцы месяца.* К. Чорны. *Вунь з фінаддзела скарбнік збег, пятнаццаць тысяч звалок, – лаві яго цяпер.* Я. Колас.

**КАСЦЮМ,** ГАРНІТУР.
*Прасторны касцюм, пацёрты, але акуратны, аблягаў яго хударлявую постаць.* М. Лынькоў. *Пачакай, я табе вынесу свой картовы гарнітур, не ідзі гэтак, як ёсць, у хату.* К. Чорны.

**КАСЬБА,** СЕНАКОС.
*З чэрвеня па ліпень у Грынях касьба.* І. Пташнікаў. *Для Якуба самаю вясёлаю і радаснаю парою года быў час сенакосу.* Я. Колас.

**КАТОК,** КОЎЗАНКА, КАЎЗЕЛЬ *(разм.).*
*З полюсам экватар у абнімку выйшлі распісацца на катку.* П. Макаль. *Яшчэ, здаецца, учора бегаў на коўзанку, а глядзі – кавальскаму рамяству навучыўся.* А. Рылько.

**КАЎБАСА,** КІЛБАСА /*ліверная:* ВАНТРАБЯНКА.
*Ласы як кот на каўбасы.* Прымаўка. *Яўхім спакойна жаваў кілбасу.* К. Чорны. *Калі ўжываць то ўжываць, – дай на грош вантрабянкі!* Прымаўка.

**КАХАННЕ,** ЗАКАХАНАСЦЬ, ЛЮБОЎ, ЛЮБАСЦЬ, МІЛАВАННЕ, ЛЮБОШЧЫ *(разм., мн.).*
*Няхай мяне той чапае, хто каханне ў сэрцы мае.* Прыказка. *У нас з Ванем сапраўдная любоў. мы муж і жонка назаўсёды* Я. Брыль. *А ўсю радасць і рай мілавання недруг вырваў, спаганіў, стаптаў.* Я. Купала.

**КАЧАН,** ГАЛОЎКА.
*Твар быў круглы, як качан капусты.* З. Бядуля. *Кожная капуста мае сваю галоўку.* Прымаўка.

**КАШАЛЁК,** ПАРТМАНЕТ; КАЛІТКА *(разм.);* КАЛІТА, ПУЛЯРЭС, ПАРАЛЕЗ *(уст.).*
*Бацька вытрас з кашалька пяць злотых на дарогу. і Андрэй паехаў.* П. Пестрак. *Ён спраўна дастаў з партманета трохрублёўку і кінуў у сярэдзіну рабочых.* Р. Мурашка. *Дзе ж той плацельшчык з поўнай калітой?* У. Дубоўка.

**КАШЛЯЦЬ,** КЕРХАЦЬ, ПЕРХАЦЬ, БУХАЦЬ *(разм.)* ДУШЫЦЦА КАШЛЕМ, ЗАХОДЗІЦЦА КАШЛЕМ.
*Дзед курыў люльку, сіпла кашляў.* І. Мележ. *Аж некалькі тыдняў ляжаў пан Зыгмунт... і ўсё керхаў, керхаў.* М. Лынькоў. *Жанчына душылася кашлем...* К. Чорны.

**КАЯЦЦА,** ШКАДАВАЦЬ *(перан.).*
*Ён нібы каяўся, што п'яны, і разам выхваляўся гэтым.* М. Зарэцкі. *Ён пасля момантамі шкадаваў, што паслаў гэты ліст.* К. Чорны.

**КВАКАЦЬ,** КУМКАЦЬ.
*Лясныя птушкі спяваюць, жабы квакаюць.* З. Бядуля. *Кумкалі палка і дружна жабы ў сітнягах.* У. Караткевіч.

**КВЕТКА,** КРАСКА *(разм.)* ЦВЕТ *(зб.).*
*Рана вы завялі, кветкі веснавыя!* Я. Колас. *А пчолы з кожнай краскі збіралі мёд дзень цэлы.* Я. Пушча. *Пахне ліпавым цветам.* І. Навуменка.

**КЕЛЬНЯ,** КЕЛЬМА.
*Кельня мае форму сэрца, дык таму і дом трывалы...* С. Шушкевіч. *Чуваць, як там пад хмарай звіняць аб цэглу кельмы.* М. Аўрамчык.

**КІЙ,** КІЁК, ПАЛКА /*з загнутым уверсе канцом:* КУЛЬБА, КУЛЬБАКА, КРЫВУЛЯ, ПОСАХ; КА-

ВЕНЬКА, СУКАВАНКА *(разм.)*; СТЭК *(спарт.)*.
*Ад сабак паганых ёсць кій бараніца* Я. Колас. *Свату падзяка або кульбака* Прыказка. *Ідзе сабе з кавенькаю няшпарка Кузьміч асенняй золкай раніцой.* . А. Зарыцкі.

**КІНУЦЬ**, БРАЗНУЦЬ, ШПУЛЬНУЦЬ, ШПУРНУЦЬ, ШПУРЛЯНУЦЬ, ШЫБАНУЦЬ *(разм.)*; ПУСЦІЦЬ, ПАПУСЦІЦЬ, ЗАПУСЦІЦЬ *(перан.)*
*Кінь перад сабой, знойдзеш за сабой.* Прыказка. *А яшчэ і пару гранатак шпурлянуў.* І. Навуменка. *Яна са злосцю схапіла бутэльку і з усяе сілы шыбанула ў куток.* Р. Сабаленка. *Убачыў сабаку і запусціў у яго каменем.* Я. Маўр.

**КІПЦЮР**, КІПЕЦЬ; ПАЗУР *(абл.)*.
*Каршун быў стары, вялікі, з загнутай сярпом дзюбай, з доўгімі і вострымі кіпцюрамі.* Я. Колас. *Дзярклівацму кату пазуры адцінаюць.* Прыказка.

**КІРАЎНІК**, НАЧАЛЬНІК, ГАЛАВА, ЗАГАДЧЫК, РАСПАРАДЧЫК, СТАРШЫ, КАМАНДЗІР, АДМІНІСТРАТАР; ВЕРХАВОД *(разм.)*; ШЭФ *(кніжн.)*.
*Сын, усё кажа, мой сын вялікі начальнік ці камісар.* К. Чорны. *Гаспадар – галава ў хаце.* Прыказка. *Ты – загадчык млына, ты ходзіш каля мукі.* А. Рылько. *Вы шэф дэпо і несяце ўсю адказнасць за спраўную работу ўсіх механізмаў.* М. Лынькоў.

**КІРКА**, КАЙЛО.
*Чыя кірка ў падзямеллі першай пласт вугля цярэбіць?..* Я. Купала. *Немец адукацыі не пытае. бі кайлом і ўсё.* І. Навуменка.

**КІРМАШ**, РЫНАК; ТОРГ, ТОРЖЫШЧА, ТАРЖОК *(разм.)* *Ідзе прадаюць і купляюць паношаныя рэчы:* БАРАХОЛКА, ТАЎЧОК *(разм.)*.
*Які вясною кірмаш? Што прадаваць?* М. Лобан. *І паглядзець было цікава, як дзядзька шчыра і ласкава касу на рынку выбірае!* Я. Колас. *Праўда, пачалі зацягваць выплату зарплаты, прыйшлося пазнаёміцца з барахолкаю, разгрузіцца ад лішніх рэчаў у хаце.* М. Гарэцкі.

**КІСЕТ**, КАПШУК.
*Узрушаны дзядзька Марцін выйшаў на прыгумень. кісет дастаў І стаў папяросу вярцець* Я. Колас. *Сёлета дык і градку тытуню пасадзіла, кішэнь у спадніцу ўшыла, капшук з тытунем насіць.* К. Крапіва.

**КЛАПАЦІЦЦА**, ДБАЦЬ, СТАРАЦЦА, РУПІЦЦА *(разм.)*, ХВАРЭЦЬ *(перан.)*
*Хто дбае, той і мае.* Прыказка. *На бога спадзявайся, але сам старайся.* Прыказка. *Будучы сам хворы, ён рупіўся, каб падвесяліць і абнадзеіць мяне.* В. Вітка.

**КЛАСЦІСЯ**, ЛАЖЫЦЦА /*не спяшаючыся:* УКЛАДВАЦЦА *(разм.)*; ПАДАЦЬ, ВАЛІЦЦА *(перан.)*.
*Пі чай і кладзіся ў цёплую пасцель.* А. Чарнышэвіч. *Стась лажыцца на жывот, зрывае тонкую сцяблінку, пачынае жаваць.* А. Асіпенка. *Павячэраўшы, куранёўцы адразу валіліся спаць.* І. Мележ.

**КЛІКАЦЬ**, ГУКАЦЬ, ЗВАЦЬ.
*Кліча ранак і жней і сярпы на прастор свой бясконцы...* А. Куляшоў. *І раптам чую – хтось мяне гукае.* П. Панчанка. *Лямпа ў акне чамусь падмігвае, заве сюды.* П. Галавач.

**КЛОПАТ**, ДАКУКА, ТУРБОТА; ТУРБАЦЫЯ, ТУРБАТНЯ, МАРОКА, ВАЖДАНІНА, ВАЖДАННЕ, ВАЗНЯ, МІТРЭНГА, АМБАРАС *(разм.)*, РУПЕСАК, ФАТЫГА, НЕБЫТ *(абл.)*; КАМЕНЬ *(перан.)*.
*А ўсё ж такі, Ганначка, ты нечага смутная. Ведаю добра. што ў цябе нейкі клопат на сэрцы.* Я. Колас. *За турботы шапку і боты.* Прыказка. *Без цябе тут марокі стае да паўночы..* А. Куляшоў. *Здароўе і без таго нецікавае. а тут яшчэ гэтыя мітрэнгі...* Ц. Гартны. *Ты ж мне за фатыгу дай з мільён, не меней.* Я. Колас.

**КЛУБ**, СЛУП, ХМАРА, ВОБЛАКА *(перан.)*.
*Яны гулялі на выгане і ўбачылі, як чорны клуб дыму ўзняўся над*

*зяленымі соснамі.* А. Пальчэўскі. *Усе дарогі курыліся хмарамі пылу.* М Машара.

**КЛУБОК**, ПАЧЫНАК.

*Па нітачцы і клубок знойдзеш.* Прыказка. *Спрала, насукала пачынак за тыдзень..* Я. Купала.

**КЛЯМКА**, РУЧКА.

*Яна са злосцю бразнула дзвярыма, ажно клямка заскакала.* П. Кавалёў. *Тады яна нясмела пацягнула ручку да сябе – дзверы лёгка адчыніліся.* А. Асіпенка.

**КЛЯПАЦЬ**, АДБІВАЦЬ.

*Касу часцей за ўсё клеплюць да сонца.* Я. Брыль. *Чалавек адбіваў касу.* К. Чорны.

**КНІГАЎКА**, КАНЯ; КНІГА *(абл.).*

*Жаласна крыкнула за ракой кнігаўка.* В. Вітка. *Енчыць, як каня на дождж.* Прыказка. *Над балотам стогнуць кнігі, жураўлі ўгары крычаць.* Я. Колас.

**КОЛЕР**, ФАРБА, АФАРБОЎКА; ЦВЕТ, БАРВА *(разм.) /поўсць у жывёлы:* МАСЦЬ */разнавіднасць па сіле:* АДЦЕННЕ, ТОН.

*У вадзе адбіваліся ўсе фарбы неба і лесу.* П. Пестрак. *Тонкія, лёгкія хмуркі афарбаваліся ў залаты цвет...* Я. Колас. *Залацістыя тоны восені навокал.* П. Пестрак.

**КОЛЬКАСЦЬ**, ЛІК, ЛІЧБА; КАНТЫНГЕНТ *(кніжн.) /кніг, часопісаў ці газет:* ТЫРАЖ; СУМА *(перан.).*

*Выходзіла велізарная колькасць. дзвесце сорак платформаў.* Х. Шынклер. *Лік непісьменных сярод жанчын быў яшчэ большы – каля 90 працэнтаў.* Р. Шкраба. *Дзядзька давёў тыраж гектографам да пятнаццаці тысяч.* С. Баранавых.

**КОМ**, КАМЯК; КАТЫШ *(абл.).*

*Мяккі снег качаўся ў камы, і хлопчыкі ляпілі баб.* М. Гарэцкі. *Па будцы білі цвёрдыя, як камень, мёрзлыя камякі зямлі.* І. Мележ.

**КОМІН**, ТРУБА; ДЫМАР *(абл.).*

*Вецер вые, не сціхае, дзіка ў коміне шуміць...* Я. Колас. *Заводаў адноўлена многа, і трубы над імі дымяць.* М. Машара. *Вунь прыстань, вунь заводаў дымары...* А. Зарыцкі.

**КОННІЦА**, КАВАЛЕРЫЯ.

*Валіла конніца, везлі пятнаццаць гармат...* У. Караткевіч. *Сам ён служыў у кавалерыі, прывык хадзіць за канём...* Я. Колас.

**КОРАК** */звычайна ў бочцы.* ШПУНТ; ЗАТЫЧКА, ЗАТКА, ЗАТКАЛА, ЗАТКЛА *(разм.). Антось у ход пусціў далоні і коркі спрытна выбівае – так, што здзіўленне выклікае.* Я. Колас. *У спушчаным канцы карыта была зроблена дзірка, заткнутая спецыяльным шпунтам.* Я. Колас. *З рыльца тырчала заткала з сена, абкручанае шматком анучкі.* М. Стральцоў.

**КОРПАЦЦА**, ВАЖДАЦЦА, ВАЗІЦЦА, КАПАЦЦА, КАЛУПАЦЦА *(перан.).*

*Праз акенца відаць было – гаспадыня корпаецца ля печы...* К. Чорны. А Зосі сказаў тады, што камера лопнула і ён доўга важдаўся з колам. П. Кавалёў.

**КОЎЗКІ**, СЛІЗКІ.

*Але Наталя не папускалася: абмінала коўзкія месцы, абыходзіла іх...* Ц. Гартны. *Яна сышла з мастка, коўзалася па слізкіх дошках.* К. Чорны.

**КОШТ**, ЦАНА, ВАРТАСЦЬ.

*Дзвесце пяцьдзесят тысяч долараў – такі быў кошт гадзінніка.* М. Лынькоў. *З сваёю цаною на кірмаш не прыедзеш.* Прымаўка. *Ацэначная камісія вокам прыкідвае вартасць пазвожанай маёмасці.* Я. Скрыган.

**КРАДЗЕЖ**, КРАЖА, ПАКРАЖА */сістэматычны:* РАСКРАДВАННЕ */з літаратурнага твора:* ПЛАГІЯТ *(кніжн.).*

*Гэта ж быў крадзеж са ўзломам.* З. Бядуля. *Якую ні вазьмі з цытат – свайго ні кроплі... плагіят.* А. Бачыла.

**КРАІНА**, КРАЙ, ЗЯМЛЯ; СТАРАНА, СТАРОНКА *(выс. паэт.) /цёплая, куды ляцяць на зіму птушкі:* ВЫРАЙ.

*Краіна наша неабсяжная, размах у нас шырокі, рэвалюцыйны.* А. Якімовіч. *І добра нам маўчаць і пазіраць на родны край вачыма*

*маладымі!* П. Панчанка. *Ой, багата лесам-пушчай нашая старонка* Я. Купала.

**КРАКАДЗІЛ** /*у Паўднёвай Амерыцы*: АЛІГАТАР.

*Я пабачыў кракадзіла, што сюды прывезлі з Ніла.* А. Вольскі. *Місісіпскі алігатар корміцца рыбай, часам нападае на свойскую жывелу.* БелЭн.

**КРАНУЦЬ,** ЗАЧАПІЦЬ.

*А вы пастаўце сябе так, каб ніхто не асмеліўся вас пальцам крануць.* К. Крапіва. *Зачэпіш галінку, і з шумам дажджынкі спадаюць з ігліцы малой навальніцай.* А. Лойка.

**КРАПІВА** /*пякучая*: ЖЫГУЧКА.

*То не крапіва, што не кусаецца.* Прыказка. *Колькі разоў табе казалі: ад жыгучкі далей трымай ручкі.* У. Дубоўка.

**КРАЎЧЫХА,** ШВАЧКА /*высокай кваліфікацыі*: МАДЫСТКА.

*Каб вы заўтра зайшлі ў нашу майстэрню і паказалі нашым краўчыхам, як кроіць кажухі.* А. Чарнышэвіч. *Я сама – швачка; працавала тры гады ў адной майстэрні – тут, у Рызе.* Ц. Гартны. *Мадыстка не зусім па-мойму зрабіла шлейф.* Р. Мурашка.

**КРАЯВІД,** ПЕЙЗАЖ, ЛАНДШАФТ; МАЛЮНАК (*перан.*).

*Я, малы, узлазіў на бярозу, краявід – на цэлы сельсавет.* П. Панчанка. *Як на кінаэкране, змяніліся пейзажы* М. Аўрамчык. *Незнаёмыя ландшафты з палеткамі, з сёламі, з пералескамі.* Я. Скрыган. *Малюнкі бацькаўскай зямлі! Нічым вас з памяці не сцерці.* П. Глебка.

**КРОК,** СТУПА.

*Ён прайшоў з ёю крыху, так можа крокаў якіх дзесяць, і вярнуўся.* К. Чорны. *Сказаўшы гэта, ён раптам ірвануўся наперад на ўсю сваю шырокую ступу.* А. Якімовіч.

**КРОКВА,** КЛЮЧ.

*Над новым хатнім зрубам ставілі кроквы.* П. Галавач. *Забіраліся пад самыя стрэхі, стукаючыся галовамі аб ключы.* Я. Скрыган.

**КРОСНЫ,** СТАВЫ (*абл.*)

*Кросны стаялі ў хаце. Ганна ткала.* М. Гарэцкі. *Якраз пад ставы, пад навой выкаціўся На другі ці на каторы дзень хрэсьбіны былі.* М. Гарэцкі.

**КРОЎ,** ЮХА, ЮШКА (*разм.*).

*Са свістам напаўняе кроў мае артэрыі і вены* С. Грахоўскі. *Ты ж глядзі, лайдак, калі яшчэ раз пусціш быка ў мой авёс, то я з цябе юху спушчу!* Я. Колас.

**КРУЦІЦЦА,** КРУЖЫЦЦА, ВЯРЦЕЦЦА /*пра ваду*: ВІРАВАЦЬ.

*Круціцца, як верацяно.* Прымаўка. *Ён быў як бы сонцам, а яна планетай, якая кружылася вакол сонца.* З. Бядуля.

**КРЫЎДЗІЦЦА,** КРЫЎДАВАЦЬ, АБРАЖАЦЦА, НАРАКАЦЬ; ДЗЬМУЦЦА, НАДЗІМАЦЦА (*перан.*) МЕЦЬ КРЫЎДУ, БЫЦЬ У КРЫЎДЗЕ, НАСІЦЬ КРЫЎДУ.

*Аддзякую, не будзеце крыўдзіцца.* А. Бялевіч. *Не наракай на люстэрка, калі нос крывы.* Прыказка.

**КРЫЎДНА,** ГОРКА, БАЛЮЧА (*перан.*).

*І крыўдна нам было, што на планеце – два полюсы і тыя ўжо адкрыты...* П. Панчанка. *Калі вас не зразумелі – горка гэта.* Е. Лось. *Анэлі, відаць, балюча было, што Ігнась не з ёю.* Р. Сабаленка.

**КРЫХУ,** КРЫШКУ, ТРОХІ, ЗЛЁГКУ, ЗБОЛЬШАГА.

*Гэтая няўдача крыху збянтэжыла Сцёпку.* Я. Колас. *Ігнась ішоў за Лявонам, і яму было трохі крыўдна, што Лявон гутарыў з ім, як з малым.* А. Чарнышэвіч.

**КРЫЧАЦЬ,** ГУКАЦЬ, ЕНЧЫЦЬ; ГАРЛАПАНІЦЬ, ГАРЛАНІЦЬ, ГАЛЁКАЦЬ, РАЎЦІ, ВЕРАШЧАЦЬ, ДЗЕРЦІСЯ (*разм.*) ДЗЕРЦІ ГЛОТКУ, РВАЦЬ ГЛОТКУ, ЗАХОДЗІЦЦА КРЫКАМ, ЗАХОДЗІЦЦА АД КРЫКУ.

*Не крычы, бо на лета за гуртовага пастуха згодзім.* Прыказка. *Не шумець! На губу зараз! Хто гарланіць?!* К. Чорны. *Цэлы дзень не ціхнуў гам, бегалі, га-*

*лекалі* Р. Барадулін. *Ну, чаго глотку дзярэш?* З. Бядуля. *А дзеці ўжо зусім заходзяцца крыкам* М. Лынькоў.

**КРЭПАСЦЬ,** ЦВЯРДЫНЯ, БАСТЫЕН, ЦЫТАДЭЛЬ, РЭДУТ, РАВЕЛІН, ФОРТ, АКРОПАЛЬ.

*Двое сутак крэпасць маўчала, але гітлераўцы не адважваліся зайсці ў яе.* М. Лупсякоў. *На беразе Рыена спавітыя дзікім вінаградам руіны старажытнай турэцкай цытадэлі.* Э. Самуйлёнак. *Фарты стаяць і кожнаму гавораць пра дні выпрабаванняў, дні вайны...* М. Танк.

**КРЭСЛА,** ФАТЭЛЬ /*з пакатаю спінкай:* ШЭЗЛОНҐ.

*Вінцусь падсунуў да стала крэсла і сеў.* П. Галавач. *Рыгор сеў на падстаўленым таўстухаю паношаным, калісьці раскошным фатэлі...* Ц. Гартны.

**КУБАК,** КОНАЎКА, КАРЭЦ, КВАРТА.

*Ну, што ж, – налівайце зноў кубкі ды вып'ем за здароўе маладой пары.* В. Дунін-Марцінкевіч. *П'е з конаўкі жанчына халодны хатні квас.* А. Куляшоў. *Яўхім выпіў зразу, перакуліў карэц, няхай бачаць – да дна.* І. Мележ.

**КУДАХКАННЕ,** КУДАХТАННЕ, САКАТАННЕ.

*Са снапоў проса з кудахтаннем зляталі спалоханыя куры.* І. Шамякін. *Тады ў яго свядомасць уварвалася разам: самадавольнае сакатанне курэй, клапатліва-жвавае ціўканне на страсе вераб'ёў.* М. Зарэцкі.

**КУДЫСЬЦІ,** НЕКУДЫ, НЕДЗЕ, ДЗЕСЬ.

*Кудысьці ўдаль рассцілаецца жаўтаваты пас гладкай, нібы ток, дарогі.* З. Бядуля. *Хутка настаўнік недзе выехаў. Школа апусцела.* А. Якімовіч. *Алесь дзесь пайшоў яечню пячы.* Я. Колас.

**КУКАРДА,** ЦЭШКА *(абл.).*

*На шапцы яго, як падышоў бліжэй, былі прыметны дзве дзюрачкі, дзе калісь сядзелі кукарды.* М. Чарот. *Фортка зачынілася, і форменная шапка з паліцэйскай цэшкаю схавалася зноў* Р. Мурашка.

**КУЛЬГАВЫ,** КРЫВЫ.

*Семдзесят шэсць гадоў служылі дзеду ногі, на семдзесят семым калекам стаўся, кульгавым.* Я. Колас. *Крывыя, сляпыя, хворыя пачалі прыходзіць – мо вылечацца.* П. Галавач.

**КУЛЬГАЦЬ,** ЧЫКІЛЬГАЦЬ, ЧЫКІЛЯЦЬ, ЧЫКІЛЬГІКАЦЬ, КАНДЫБАЦЬ.

*Вунь кульгае чалавек з драўлянай нагой.* А. Чарнышэвіч. *Дзед кандыбае з кульбакай, дыхаці цяжка яму...* М. Засім.

**КУЛЯ,** СВІНЕЦ *(зб.).*

*Злосная маленечкая куля яшчэ трапіць ворагу ў сэрца.* П. Панчанка. *Не змог скасіць, зваліць свінец Каліну ў дамавіну.* А. Бялевіч.

**КУРГАН,** НАСЫП.

*Як сведкі стаяць курганы абапал дарогі бясконцай.* А. Астрэйка. *У сырую зямельку зарылі, зверху насып вялікі зрабілі.* М. Багдановіч.

**КУРЭЦ,** ДЫМАКУР, ТАБАКУР *(разм.).*

*Калі ты курэц, то май сваю люльку і тытунец.* Прыказка. *Але за паперай ганяліся, асабліва табакуры.* М. Машара.

**КУХАР,** ПОВАР, КУЛІНАР /*у вайсковай часці ці ў рабочай арцелі:* КАШАВАР.

*Рыбу нам засмажыць кухар.* А. Вялюгін. *Добры повар і з карэння зварыць смачну страву.* М. Засім. *Чарга выпадала Андрэю на гэты раз быць кулінарам, але Сава не даваў яму дакранунца да гаршка.* П. Пестрак.

**КУЧА;** ГОРБА *(абл.);* ГАРА, ГРУД, БУРТ *(перан.)* /*камення:* КРУШНЯ /*ламачча:* ЛОЎЖ.

*Ля самых пуцей ляжалі роўныя кучы вугалю..* М. Лынькоў. *І я прыцягнуў нейкае ламаччо, кінуў у груд.* М. Гарэцкі. *На лесасеках дыміліся лаўжы.* М. Машара.

# Л

**ЛАВА**, ЛАЎКА, ТАПЧАН */пераносная:* УСЛОН, ЗАСЛОН, ЗЭДЛІК */школьная, злучаная з нахільнаю дошкай* ПАРТА; СТОЛАК *(абл.)*.
*Пайшоў у кухню, лёг за сталом на голай вузенькай лаве і заснуў.* К. Чорны. *У куце стол і шырокія з дошак лаўкі ад сцяны да сцяны.* П. Галавач. *Па левую руку стаяў тапчан – Валодзева пасцель.* Р. Сабаленка. *Кабета сядзела на нізенькім зэдліку і драмала.* К. Чорны.

**ЛАГЧЫНА**, НІЗІНА, КАТЛАВІНА, ДАЛІНА.
*З узгорка ў лагчынку дарожка збягае.* Я. Колас. *Калоны пехацінцаў павольна спускаліся ў нізіну...* І. Чыгрынаў. *А ў катлавіне быў зялёны змрок, пранізаны туманна-залацістым водсветам заранкі.* У. Караткевіч. *Няма гораў без далінаў.* Прыказка.

**ЛАД**, УКЛАД, ПАРАДАК, СІСТЭМА, РЭЖЫМ.
*Замест аднаго начальства з'явілася другое, а парадкі засталіся тыя самыя.* Я. Маўр. *Сістэма старая згніла.* Я. Колас.

**ЛАКАМАТЫЎ** */з паравым рухавіком:* ПАРАВОЗ, ПАРАВІК */з рухавіком унутранага згарання:* ЦЕПЛАВОЗ */з электрарухавіком:* ЭЛЕКТРАВОЗ.
*Па пуцях рушыў вялікі таварны лакаматыў, цяжка пыхаючы адпрацаванай парай.* Я. Васілёнак. *Доўгі цягнік вялі аж два паравозы.* М. Лынькоў. *Транспарт жа вунь як расце Цеплавозы, электравозы* . Х. Шынклер.

**ЛАМАЧЧА**, ЛОМ, ЛАМ'Ё, СУШНЯК.
*Месцамі пад дрэвамі навалена шмат ламачча.* З. Бядуля. *Назбіраўшы яшчэ сушняку, Міколка з дзедам расклалі невялікі агонь.* М. Лынькоў.

**ЛАПАТА**, РЫДЛЁЎКА */для перамяшчэння сыпкіх матэрыялаў:* ШУФЕЛЬ; ЖАЛЯЗНЯК *(разм.)* ЗАСТУП *(абл.)*.
*Ідзе з лапатай дзядзька з хаты і адграбае снег заўзята.* Я. Колас. *Мы прагрызлі рыдлёўкамі гліны пласты...* М. Лужанін. *Яніс моўчкі шуфелем разграб кучу вугалю.* С. Грахоўскі.

**ЛАРОК**, ПАЛАТКА, КІЁСК; ЯТКА *(уст.)*
*Каля ларка ў цяністым парку п'ём развітальны кухаль іскрыстага піва, паціскаем рукі гданьскіх таварышаў.* Я. Брыль. *Яна глядзіць у бок вітрыны для аб'яў, што стаіць побач з газетным кіёскам.* М. Лынькоў.

**ЛЕГЕНДА**, ПАДАННЕ, ПЕРАКАЗ, БЫЛІНА.
*Пра палац яшчэ і цяпер ходзяць легенды: гара, на якой ён узвышаецца, кажуць, не натуральная, а насыпаная.* П. Пестрак. *Зацвілі пераказы ў народзе.* Я. Купала. *Аб партызанскіх справах расказваюць быліны.* М. Аўрамчык.

**ЛЕДЗЬВЕ**, ЛЕДЗЬ, ТРАХА, НАСІЛУ; МАЛА *(абл.)* НА ВАЛАСКУ.
*Палітграмата – дык гэта была для яго пакута. Чытаць яго таксама ледзьве-ледзьве навучылі...* К. Чорны. *Жыццё трымалася на валаску.* М. Арочка.

**ЛЕКАВЫ**, ГАЮЧЫ.
*Гадавала мяне цётка Анюта – лесавічка, касец і варажбіт, знаўца лекавых і варажбітных траў.* А. Вялюгін. *Поўніцца пахам паветра, уліваецца ў грудзі гаючым віном.* Я. Колас.

**ЛЕС** */на вялікім абшары:* ПУШЧА */ на вялікім абшары ў Сібіры, пераважна хвойны* ТАЙГА */маладыя лісцевы:* ГАЙ */хваёвы* БОР, САСНЯК, САСОННІК, ХВОЙНІК */ яловы.* ЕЛЬНІК */дубовы* ДУБРОВА, ДУБНЯК */бярозавы.* БЯРЭЗНІК */асінавы:* АСІННІК */альховы:* АЛЕШНІК.
*Лес быў навокал – выносістыя хвоі.* К. Чорны. *Як радасна пушчы гамоняць у нас!* П. Панчанка. *Гаманіў бор сасновы ўвечары і ўранку...* Я. Купала. *Добры дзень, сенажаці, дубровы – залатое Палессе!* П. Панчанка.

**ЛЕСАПІЛЬНЯ,** ПІЛЬНЯ; ТАРТАК *(уст.).*
*Чуваць было яму тут, як непадалеку чмыхае ў лесе пільня.* . К. Чорны. *Сіпата гудкі застагналі спрасоння пад звон цыркулярак блізкіх тартакоў.* М. Танк.

**ЛЕСВІЦА;** ЛЕСКІ *(мн.)* /*прыстаўная* ДРАБІНЫ *(мн.),* ДРАБІНА.
*Па шырокай драўлянай лесвіцы ен падняўся на другі паверх...* А. Якімовіч. *Некалькі мужчын паволі апускалі ў студню прынесеныя драбіны.* Я. Колас.

**ЛЕТУЦЕННІК,** ФАНТАЗЁР, РАМАНТЫК.
*Мэта летуценніка Пакацілы – каб клубянькі перацвету бульбы мелі смак памідора іраслі такой жа велічыні, як памідор.* П. Пестрак. *Чаму – фантазёр? Я прапаную зусім рэальныя рэчы.* К. Крапіва.

**ЛЁГКІ,** НЯЦЯЖКІ; БЯЗВАЖКІ *(перан.).*
*Лёгкае пяро, а на страху не закінеш.* Прыказка. *Куфэрак быў няцяжкі...* А. Чарнышэвіч. *Бязважкі салатавы пух ахутваў дрэвы...* У. Караткевіч.

**ЛЁС,** ДОЛЯ, ЖЫЦЦЁ; НАКАНАВАНАСЦЬ, НАКАНАВАННЕ *(разм.);* ПЛАНІДА, ЗОРКА, ЛАТАРЭЯ, КОН *(перан.);* ЖЫТКА *(разм.).*
*Праца прыносіць нам славу, працай ствараем свой лёс.* М. Машара. *Прыгожых сноў ты многа сніла, жыццём заціснутая голь!* Я. Колас. *І тут ужо адразу з гэтай карціны паўстала другая, як злая наканаванасць, як смутак яго душы.* К. Чорны.

**ЛЁТАЦЬ,** ЛЯТАЦЬ, ЛУНАЦЬ, КРУЖЫЦЬ, КРЫЛЯЦЬ, КРЫЛІЦЦА, НАСІЦЦА, ВІЦЦА.
*У сінім небе лёталі птушкі.* Я. Колас. *Лунаюць птахі над панурай заакіянскаю зямлёй.* А. Вялюгін. *Галубы кружылі над дачай.* І. Шамякін. *Вунь крыляцца качкі над росным чаротам.* З. Бядуля.

**ЛЁТЧЫК,** ПІЛОТ, АВІЯТАР /*выдатны:* АС.
*Лётчыку ж люба купацца пад воблакамі.* М. Лынькоў. *Пілоты, даючы тушонку, пляваліся ў Вялікі акіян* М. Калачынскі.

**ЛІПНУЦЬ,** ПРЫЛІПАЦЬ, НАЛІПАЦЬ, ПРЫКЛЕЙВАЦЦА, ПРЫСТАВАЦЬ, БРАЦЦА *(разм.)*
*А гарачыня такая, што сарочка да спіны ліпне* А. Рылько. *Да сцяны гарох не прыстае* Прыказка.

**ЛІСТОЎКА,** ПРАКЛАМАЦЫЯ, АФІШКА *(разм.).*
*Пад вечар лістоўкі былі адасланы ў вёску, а часткова былі раздзелены для расклейкі па гораду.* П. Галавач. *Першая рэвалюцыйная пракламацыя трапіла яму ў рукі, калі быў ён у Пецярбурзе.* М. Гарэцкі.

**ЛІТАРАТУРА** [*мастацкая*], ПРЫГОЖАЕ ПІСЬМЕНСТВА.
*Веліч рускай класічнай літаратуры складаюць не толькі раманы Талстога, але і апавяданні Чэхава.* Я. Брыль. *Яна ж, не хочучы адставаць ад Сцёпкі па часці прыгожага пісьменства, прымала ўдзел у насценгазеце і ў школьных журналах...* Я. Колас.

**ЛІХТАР** /*вялікай магутнасці:* ПРАЖЭКТАР /*на аўтамабілі, лакаматыве:* ФАРА.
*Выйшаў з хлява гаспадар, патушыў самадзельны ліхтар...* П. Глебка. *Водбліскі пажару, як пражэктары, асвятлялі подступы да затокі, да зямлянкі.* У. Дубоўка.

**ЛІШНЕ,** ЗАЛІШНЕ, ПРАЗМЕРНА, ПРАЗ МЕРУ.
*Багатым лішне Вінцэнты ніколі не быў, але ганарыстым быў заўсёды.* К. Чорны. *Дамы праз меру перанаселены.* В. Вольскі.

**ЛІШТВА,** ПЛІНТУС, ПЛАНКА.
*Вераб'і забіліся пад ліштвы.* А. Чарнышэвіч. *Абмацаў Зыгмусь усе дошкі ў падлозе. Яны былі тоўстыя і шчыльна прыбіты плінтусам.* Я. Колас.

**ЛОБ;** ЛАБАЦІНА *(разм.);* ЧАЛО *(уст. паэт.).*
*Абцёр бацька вус рукою, твар і лоб свой лысы.* Я. Колас. *На чале нэ дзявочым вянок – ад скрынь золата, скарбаў мілей.* Я. Купала.

**ЛОДКА,** ЧОВЕН /*з плоскім дном:* ПЛАСКАДОНКА /*выдзеўбаная:* ДОЎБЛЕНКА /*абшываная:* АБШЫВАНКА /*пераважна на моры:* ШЛЮПКА /*спартыўная.* БАЙДАРКА, КАНОЭ /*шматвёсельная:* БАРКАС /*для перавозу грузаў.* БАРКА /*вузкая няўстойлівая.* ДУШАГУБКА *(разм.)* /*маторная:* МАТОРКА *(разм.),* ЧАЙКА *(абл.).*
*Насустрач ім з другога берага плыла лодка.* А. Якімовіч. *Стырнавы, свой човен смела ты да волі накіруй!* М. Васілёк. *Шлюпка ішла лёгка, мора было ціхае.* В. Хомчанка. *Мужчыны выпілоўвалі з тоўстага дрэва каноэ.* І. Новікаў. *Бедну чайку чалавека ты [Нёман] з сабой насіў не раз.* Я. Колас.

**ЛУГ,** СЕНАЖАЦЬ, СЕНАКОС /*заліўны:* ПОПЛАЎ.
*О, як пахнуць на лузе шаўкавістыя травы!* П. Броўка. *Сенажаць – адно карэнне, сівец ды куп'ё.* Я. Купала. *Поплаў парос ужо маладой атавай.* П. Галавач.

**ЛУЖЫНА;** КАЛЮЖЫНА, КАЛЮГА, КАЛЮЖА *(абл.)*
*Зямля была гразкая, усюды пазаставалася шмат лужын.* Я. Маўр. *А да чорных дзвярэй праз калюжу былі пакладзены дзве цагліны.* У. Караткевіч.

**ЛУПАТЫ,** ЛУПАВОКІ, ЗЯКРАТЫ, ВІРЛАВОКІ, БЯЛЬМАТЫ *(разм.).*
*Але падвечар завітала малодшая Мікалаішка – Ганка, рабаватая, з лупатымі, як у агародняй жабы, вачамі.* А. Асіпенка. *Пугач вірлавокі дрэмле.* Р. Барадулін.

**ЛЫСЫ,** АБЛЫСЕЛЫ, ПАЛЫСЕЛЫ, ГОЛЫ, ПЛЯШЫВЫ, АБЛЕЗЛЫ *(разм.).*
*Абцёр бацька вус рукою, твар і лоб свой лысы.* Я. Колас. *Дый адкуль будзе тая ўцеха. нібы на пляшывай галаве валасоў, столькі было на дзесяціне каласоў-заморкаў.* М. Нікановіч.

**ЛЫЧ,** РЫЛА, ПЫСА *(разм).*
*Кабан, учуўшы гаспадара, падняў лыч, зарохкаў і пачаў часта дыхаць.* П. Галавач. *З-пад лапушных сваіх вушэй яна і глянуць не магла вышэй свайго свінога рыла.* К. Крапіва.

**ЛЮДЗІ** *(мн.),* ЛЮД, НАРОД *(зб).*
*Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны.* Прыказка. *Ці ж я пазбаўлюся пакут, калі пакутуе мой люд?* Я. Колас. *Музыка іграе, народ весяліцца.* А. Якімовіч.

**ЛЮЛЬКА;** ПІПКА *(абл.).*
*Кастусь выняў капшук і давай напіхаць люльку.* З. Бядуля. *Выняў капшук, набіў піпку табакаю і ўзяў яе ў зубы.* М. Гарэцкі.

**ЛЯКАРСТВА,** МЕДЫКАМЕНТ, ПРЭПАРАТ /*вадкае, з некалькіх рэчываў:* МІКСТУРА /*настой з лекавых раслін:* ЗЕЛЛЕ /*вадкае ці мазь, знадворнае:* НАЦІРАННЕ; ЛЕКІ *(мн., разм.);* БАЛЬЗАМ *(перан.).*
*Пах лякарства закружыў ей галаву.* К. Чорны. *Ён носіць за ветэрынарам скрынку з медыкаментамі.* П. Пестрак. *Не кожнаму адно зелле дапаможа.* Прыказка. *Я вам прапішу націранне...* П. Пестрак.

**ЛЯМЕХ,** НАРОГ.
*Ужо абцерліся лемяхі аб жорсткую сырую зямлю і заблішчалі на сонцы.* П. Галавач. *Думай думку аб ніве шырокай – хай нарогі куюць кавалі* В. Таўлай.

**ЛЯНІВЫ,** ЛЯНЫ, НЯДБАЛЫ; ЛАЙДАЧЫ *(разм.).*
*Ляныя валы паціху ідуць уперадзе сахі...* П. Галавач. *Ганна ў печы мала паліць, бо мужык яе нядбалы прызапасіў дроўцаў мала.* К. Крапіва.

**ЛЯСНІК;** ПАЛЯСОЎШЧЫК *(абл.).*
*Я ж учора ў лес хадзіла па апенькі, там сустрэў мяне ляснік маладзенькі.* Х. Жычка. *З краю лесу стаіць адзінокая хатка палясоўшчыка.* Я. Колас.

**ЛЯЧЫЦЬ,** ВЫЛЕЧВАЦЬ, ГАІЦЬ, ЗАГОЙВАЦЬ, ПАМАГАЦЬ, АДХОДЖВАЦЬ, ПРАВІЦЬ *(перан.)* СТАВІЦЬ НА НОГІ.
*Яно [крывапусканне] вылечвае ад усіх хвароб.* М. Лынькоў. *Тут гаяць свае раны героі-партызаны...* П. Панчанка.

# М

**МАБЫЦЬ,** МУСІЦЬ, МОЖА, МОЖА БЫЦЬ, МАГЧЫМА, МАЖЛІВА, ПЭЎНА, НАПЭЎНА, НЯЙНАЧАЙ, НЯЙНАКШ, ВІДАЦЬ, ЯК ВІДАЦЬ, ВІДАВОЧНА; ЗДАЕЦЦА. БАДАЙ, МО *(разм.);* ВІДОЧНА, ЗДЭЦЦА, ЗНАЦЬ, МУСІБЫЦЬ *(абл.).* НЕ ВЫКЛЮЧАНА.

*А дзе ж вашы ўсе? Вы ж, мабыць, не адна жывяце?* Р. Сабаленка. *Такі, мусіць, жаробкі не дасць. От як упяўся.* К. Чорны. *Можа болей і не ўбачу, не пачую, дзе ты.* Я. Колас. *Мажліва, пачуў. Мажліва, разведка данесла.* І. Грамовіч. *Знаць, жывеш шчасліва, маеш хату, поле...* Я. Купала.

**МАГ,** ФАКІР, ФОКУСНІК.

*Не маг я і не вядзьмарка, каб угадаць твае думкі з другога пакоя.* Р. Мурашка. *Нарэшце факір пляснуў у далоні, і гадзюкі шпарка кінуліся да каша і схаваліся ў ім.* Б. Мікуліч. *Не веру ў фокуснікаў цуды усіх народаў і вякоў...* Я. Купала.

**МАГАЗІН,** КРАМА /*універсальны:* УНІВЕРМАГ /*кніжны:* КНІГАРНЯ /*прадуктовы:* ГАСТРАНОМ *(разм.)* /*дзе прадавалі спіртныя напіткі:* МАНАПОЛЬКА *(разм., уст.)*

*Некаторыя крамнікі ў страху замыкалі свае магазіны.* М. Лынькоў. *Тут і крамы называюцца .заяўлічана – магазінамі.* А. Чарнышэвіч. *Універмаг гандлюе рознымі прамысловымі таварамі.* «Звязда».

**МАГЧЫМАСЦЬ,** МАЖЛІВАСЦЬ, РЭАЛЬНАСЦЬ, ШАНС, ШАНЦ; ДАРОГА, ГАРЫЗОНТ, ПЕРСПЕКТЫВА *(перан.).*

*Падступіцца да гарэўшых цыстэрн не было ніякай магчымасці.* М. Лынькоў. *Мажлівасці мірнага развіцця рэвалюцыі зніклі. Астаецца ўзяць уладу сілай.* І. Гурскі. *Перспектыва застацца адзінокімі бабылямі іх не цешыла.* М. Машара.

**МАЁМАСЦЬ,** БАГАЦЦЕ, СКАРБ, НАБЫТАК, ПАЖЫТКІ, РЭЧЫ, ІНВЕНТАР; ДАБРО, ДАБЫТАК. НАЖЫТАК, БАРАХЛО, МАНАТКІ, БЭБАХІ, МЭТЛАХІ *(разм.);* МАЕТНАСЦЬ *(абл.)*

*І кожны ратаваў сваю маёмасць, як умеў...* М. Лобан. *Усё наша багацце ўмяшчалася ў студэнцкім куфэрку.* М. Хведаровіч. *Два браты дабро дзялілі. Было шуму на тры мілі.* З. Бядуля. *От бы забраў падпаху свае манаткі, пайшоў бы, куды вочы глядзяць.* Я. Колас.

**МАЁНТАК,** ДВОР.

*Уночы гарэлі маёнткі, а ўдзень жандары палілі вёскі і сёлы.* М. Чарот. *З мястэчка ў двор ішлі маладыя каштанавыя ці кляновыя прысады.* Ц. Гартны.

**МАЙ;** ТРАВЕНЬ *(уст.).*

*Мароз казаў: і ў маі тры дні маю.* Прыказка. *Хутка сонца засвеціць ясней, хутка травень прыйдзе на паляны..* А. Куляшоў.

**МАЙСТЭРНЯ,** АТЭЛЬЕ.

*У гэтым жа будынку былі шавецкая і кравецкая майстэрні. а таксама і сталовая.* Я. Маўр. *Па пляжах хадзілі другія дзяўчаты – фатографы з гарадскога атэлье* В. Хомчанка.

**МАЛА,** НЯМНОГА, НЯШМАТ, НЕБАГАТА, НЕДАСТАТКОВА, КРЫХУ, КРЫШКУ, ТРОХІ, ТРОШКІ; ВОБМАЛЬ *(разм.);* СКУПА, НЯГУСТА, ЖМЕНЯ *(перан.).* У АБРЭЗ, ПАД АБРЭЗ, КАПЛЯ У МОРЫ, КОТ НАПЛАКАЎ, ЯК КОТ НАПЛАКАЎ, КАЦІНЫЯ СЛЁЗЫ, ЯК ПАНЮХАЦЬ, НА ПАНЮХ ТАБАКІ, НА МАКАВА ЗЕРНЕ, ХОЦЬ НА ЗУБ, ХОЦЬ ЗАПАЛІ, ПАД ЯЗЫКОМ, З КАМАРОЎ НОС, ЯК У КАМАРА, НЕ БОГ ВЕДАЕ КОЛЬКІ, ЯК БАБЕ СЕСЦІ.

*Слухай многа, а гавары мала.* Прыказка. *Так... хоць зямлі сваёй нямнога, але ўсё ж лепей, як нічога.* Я. Колас. *Каруська кіслага малака дала крышку...* Ф. Багушэвіч. *Салдату трошкі трэба: солі драбок ды хлеба шматок.* Прыказка.

*Нарабіў, як кот наплакаў* Прыказка. Дый колькі тае зямлі – *як бабе сесці.* М Лужанін.

**МАЛАВЕР**, СКЕПТЫК, ПЕСІМІСТ; НЫЦІК *(разм )*

*Міхаіл Баўдзей па натуры быў скептык, да ўсяго новага ставіўся недаверліва* Я. Колас. *Нешта, брат, ты песімістам робішся. Народ радуецца, а ты...* І. Шамякін.

**МАЛАДЗЕЙШЫ**, МАЛОДШЫ, МЕНШЫ.

*Мані было ўжо гадоў шаснаццаць, а Насця гады на два малодшая.* Я. Колас. *Лясніцкі атрымаў з вёскі ліст, напісаны нязграбнай рукой меншага брата.* М. Зарэцкі.

**МАЛАДОСЦЬ**, ЮНАЦТВА; ВЯСНА *(перан.).*

*Сваты пачалі абмінаць яе, і маладосць завяла без пары.* Я. Брыль. *Я ўсё, што мела, з поўным аддала: юнацтва – мужу, мацярынства – дзецям...* Е. Лось.

**МАЛАКО** /*толькі што выдаенае:* СЫРАДОЙ /*кіслае*· СЫРАКВАША.

*Малака такі удой, маслапром будуй хоць свой* М. Засім. *З кароўніка даярка рупна йдзе, нясе вядро з пахучым сырадоем.* П. Панчанка. *На стале яго чакала міска гуркоў, бохан хлеба і гладыш сыраквашы* Б. Сачанка.

**МАЛАНКА,** БЛІСКАВІЦА, ЗАРНІЦА; БЛІСКАЎКА *(абл ).*

*Пярун ляцеў за перуном, штоміг – маланка за маланкай.* Я. Купала. *Дождж пайшоў з громам, з шалёным посвістам ветру і з бліскавіцаю.* Я. Скрыган. *Над цёмным паркам трапяталі недзе далёкія зарніцы.* У. Караткевіч.

**МАЛІТВА;** ПАЦЕРЫ *(мн.);* МОДЛЫ *(абл., мн.).*

*Малітва скончылася, і людзі заварушыліся, устаючы з каленяў.* Л. Арабей. *Хто, як ляжаш спаці навекі ў зямлю, пацеры згавора за душу тваю?* Я. Купала.

**МАЛІТОЎНІК,** ТРЭБНІК /*у каталікоў:* КАНТЫЧКА.

*Пачыналі вучобу з малітоўніка, а потым ужо вучылі хорам: аз, букі, ведзі, глаголь. дабро і г. д* М. Хведаровіч. *З кантычкамі ў руках маліліся на касцёльным каменным ганку некалькі жанчын.* К. Чорны.

**МАЛЫ,** НЕВЯЛІКІ, НЕБАГАТЫ, ДРОБНЫ, НЯЗНАЧНЫ, МІЗЭРНЫ, АБМЕЖАВАНЫ, ЦЕСНЫ; МІНІЯЦЮРНЫ *(разм.),* НІЗКІ, СЦІПЛЫ, СКУПЫ, МІКРАСКАПІЧНЫ, ЦАЦАЧНЫ, ПАРТАТЫЎНЫ *(перан.)* ЯК КОТ НАПЛАКАЎ.

*Наша вёска была не такая ўжо малая – двароў больш за сотню было ў ёй.* Я. Маўр. *Гаспадарку мелі невялікую: асла і быка.* Ядвігін Ш. *Дымок цягнуўся спачатку скупымі струменямі.* І. Мележ. *Заработак – як кот наплакаў.* Ц. Гартны.

**МАНАСТЫР** /*каталіцкі:* КЛЯШТАР /*вялікі, прывілеяваны:* ЛАЎРА; АБІЦЕЛЬ *(уст. царк.).*

*Я – манах. Як пайшоў з Кіеўскага манастыра, дык так па людзях і валакуся.* З. Бядуля. *Як манахі ў кляштары, за шклом томяцца някранутыя томікі.* П. Макаль.

**МАРА,** МРОЯ, ЛЕТУЦЕННЕ; ЛЯТУНАК, КРОЗА *(паэт.):* СОН, КАЗКА *(перан.).*

*Мы гонімся часта за мараю блуднай. якая ў нас шчасцем завецца.* Я. Купала. *Паўставаў наяве, а не ў мроях з друзу вечны горад над ракой.* А. Русецкі. *Явай сталі ўсе лятункі.* У. Дубоўка. *І што казкай лічылі дзяды, мы зрабілі ў наш век малады.* А. Пысін.

**МАРНА,** ДАРЭМНА, ДАРМА, БЕСКАРЫСНА, БЕЗНАДЗЕЙНА, НАПУСТА, ПОПУСТУ, НАНІШТО, НІЗАВОШТА, БЕЗ КАРЫСЦІ; ТУННА *(уст.);* ПРАХАМ, ПЫЛАМ-ДЫМАМ *(перан.)* НІ ЗА ШТО НІ ПРА ШТО, НІ ДА ЧАГО, НА ВЕЦЕР, НА ЎЗВІВЕЦЕР, ЗА БЫВАЙ ЗДАРОЎ, НІ ЗА НЮХ ТАБАКІ, НІ ЗА ПАНЮХ ТАБАКІ, НІ ЗА ГРОШ, ШТО КІЕМ ПА ВАДЗЕ, ДЗЕ ТАМ.

*Нічога, дзядзька, не выхадзіла я, толькі дарэмна час патраціла.* М. Лынькоў. *Васіль адвярнуўся: га-*

*варыць было бескарысна.* А. Шашкоў. *Дзеўка плача, траціць сілы без карысці, без пары.* З. Бядуля. *Усё пайшло пылам-дымам.* М. Лынькоў. *Прападзе ваша зямелька ні за нюх табакі* А. Чарнышэвіч.

**МАРУДЗІЦЬ**, КЕШКАЦЦА, БАВІЦЦА, ВАЛАВОДЗІЦЬ *(разм.)*; ДЛУБАЦЦА *(абл.)*; ЦЯГНУЦЬ, СПАЦЬ, ЧУХАЦЦА *(перан.)* ЦЯГНУЦЬ ВАЛЫНКУ, ЦЯГНУЦЬ КАТА ЗА ХВОСТ, КРУЦІЦЬ ВАЛА ЗА ХВОСТ, СПАЦЬ У ШАПКУ.

*Ідзі і не марудзь. Варочайся адразу.* З. Бядуля. *Яны гэтулькі валаводзілі з адкрыццём другога фронту.* І. Гурскі. *Годзе круціць вала за хвост. Пайшлі!* К. Крапіва.

**МАРЫЦЬ**, МРОІЦЬ, ЛЕТУЦЕЦЬ, ЛЕТУЦЕНІЦЬ; ТРЫЗНІЦЬ, СНІЦЬ *(перан.)* НАСІЦЬ МАРУ, СНІЦЬ СНЫ, БУДАВАЦЬ ПАВЕТРАНЫЯ ЗАМКІ.

*Сэрца мроіць аб прыгожым, што ідзе да нас здалёк.* М. Машара. *Пра што, сплючы, ён можа летуценіць?* У. Дубоўка. *Жыві і сні сны аб вясне.* Я. Купала.

**МАТОР**, РУХАВІК.

*Танкісты паілі маторы бензінам.* А. Вялюгін. *Ад рокату магутных рухавікоў, здаецца, дрыжыць паветра ў наваколлі.* Т. Хадкевіч

**МАТРОС**, МАРАК.

*Гулка загудзеў параход, забегалі матросы...* М. Багдановіч. *Маракі і з Канстанцы, і з Варны стануць разам у строй адзін.* С. Ліхадзіеўскі.

**МАЎКЛІВЫ**, НЕГАВАРКІ, БЯЗМОЎНЫ *(перан.)*.

*У людзей раскруціліся языкі. Нават самыя маўклівыя загаварылі.* З. Бядуля. *Міхась, якога Леанід ведаў як негаваркога хлопца, на гэты раз расказваў пра сябе ахвотна.* У. Шахавец. *Алесь замёр, здзіўлення поўны, глядзіць у луг, стаіць бязмоўны...* Я. Колас.

**МАХАЦЬ**, РАЗМАХВАЦЬ, МАТАЦЬ, МАГЛЯЦЬ, МАТЛЯХАЦЬ *(абл.)*

*Махай дружна касой, пакуль згіне раса* Я. Купала. *Сонца стаяла высока і моцна пякло, конь стомлена матляў галавой і не хацеў бегчы.* І. Шамякін.

**МАЦНЕЦЬ**, УЗМАЦНЯЦЦА, УМАЦОЎВАЦЦА, КРАПЧЭЦЬ *(абл.)*; РАЗГАРАЦЦА (перан.).

*Страляніна з нямецкага боку ўсё мацнела.* М. Лынькоў. *А вецер усё крапчэў.* Я. Колас.

**МАШКАРА**, ЗАЕДЗЬ, МАШКА *(абл.)*.

*Рыба плюскоча, ганяючыся за машкарою па паверхні бягучых хваляў.* М. Чарот. *Улетку заедзь жыцця не дае ні чалавеку, ні скаціне.* А. Чарнышэвіч. *На шчокі і на рукі сыпанула дробная, што блохі, машка.* І. Пташнікаў.

**МЕЛКІ**, НЕГЛЫБОКІ /*пра раку, возера:* МЕЛКАВОДНЫ; ПЛЫТКІ *(абл.)*.

*Цераз рэчку мелкім бродам дзед каня свайго пагнаў.* А. Астрэйка. *Па абодва бакі гасцінца неглыбокія заснежаныя канавы.* П. Галавач. *Конь доўга піў з плыткага броду.* К. Чорны.

**МЕЛОДЫЯ**, МАТЫЎ, МУЗЫКА, НАПЕЎ, ТОН.

*Ён... нават мармытаў сабе пад нос нейкую песню без слоў і мелодыі.* К. Чорны. *Іду я, насвістваючы матывы любімых песень.* А. Якімовіч. *У кожнай песні свае гоны...* Я. Колас.

**МЕЛЬНІК**, МЛЫНАР, МУКАМОЛ.

*Мельнік увайшоў у млын і яшчэ паслухаў, як гудуць камені.* К. Чорны. *Млынар меле і шатруе...* А. Куляшоў. *Панасюк Мікола па загаду пана быў там мукамолам.* А. Бажко.

**МЕНА**, МЕНКА, АБМЕН.

*Усе гандлёвыя справы засноўваліся на мене.* Я. Колас. *Абмен рэчавы, натуральны: метр мітkалю – пуд бульбы.* І. Навуменка.

**МЕРАПРЫЕМСТВА**, КАМПАНІЯ.

*Паступова гэтыя нашы сустрэчы ператварыліся ў цікавае культурнае мерапрыемства.* П. Кавалёў. *І па ўсіх кампаніях гэты раён не на першым месцы.* І. Шамякін.

**МЕРЗНУЦЬ,** СТЫЦЬ, ЗАСТЫВАЦЬ, ЗЯБНУЦЬ, КАЛЕЦЬ. ДУБЕЦЬ, ДУБЯНЕЦЬ, ЗАХОДЗІЦЦА; ХАЛАДАЦЬ, КАРЧАНЕЦЬ, КРЭПНУЦЬ *(разм.),* СКЛЕЦЬ *(абл.)*
*Маладому сорамна мерзнуць. Яшчэ ж не зіма* П. Галавач. *З халаду зябнуць рукі і ногі, – жалю не мае зіма.* М. Чарот. *Гэткая маразіна, а яны калеюць ня вуліцы...* М. Лынькоў. *Яму было ўжо халадна. Босыя ногі карчанелі.* К. Чорны.

**МЕРНА,** РАЎНАМЕРНА, РОЎНА, РЫТМІЧНА, МЕТАДЫЧНА.
*На сцяне мерна цікаюць ходзікі.* І. Навуменка. *Раўнамерна стукае матор.* В. Вольскі. *Вакол была такая цішыня, што Генадзь чуў не толькі свой крок, а, здавалася, чутно было, як рытмічна тахкала сэрца.* Р. Сабаленка.

**МЕСЦА,** МЯСЦОВАСЦЬ, РАЁН, ТЭРЫТОРЫЯ; КУТ, КУТОК, ЗАКУТАК *(перан.).*
*Ён доўга не жыве ў адным месцы.* З. Бядуля. *Мясцовасць займаў атрад польскай кавалерыі.* К. Чорны. *І кут свой пакінуць шкада.* Я. Колас.

**МЁРТВЫ,** ПАМЕРЛЫ, НЕЖЫВЫ, ПАЛЕГЛЫ, ЗАБІТЫ; ДОХЛЫ, АПРУЦЯНЕЛЫ *(разм. зняваж.);* БЕЗДЫХАННЫ *(кніжн.)* БЕЗ ДУХУ, БЕЗ ДУШЫ.
*Гэта для тых памерлых душачак, якія ў вялікіх пакутах вандруюць з пекла ў рай.* П. Пестрак. *Бо не падняць палеглых таварышаў.* А. Клышка.

**МІЛЬГАЦЬ,** МІЛЬГАЦЦА, МІЛЬГАЦЕЦЬ, МІГЦЕЦЬ. МІГАЦЬ, МІГАЦЦА, МІГАЦЕЦЦА, МІТУСІЦЦА, ТРЫМЦЕЦЬ; ДРЫЖАЦЬ, ДРЫГАЦЕЦЬ *(перан.).*
*Па другі бок дарогі ў лагчынцы пры лесе мільгае ў лесе агеньчык.* Я. Колас. *Конь бег шпарка. Будынкі мітусіліся ў вачах.* З. Бядуля. *Марс жоўтым полымем трымціць на небасхіле.* М. Лупсякоў. *... У небе зоркі ад марозу пахаладзеўшыя дрыжаць.* М. Багдановіч.

**МІНУЛАЕ,** МІНУЎШЧЫНА, МІНУЛАСЦЬ, ПРОШЛАСЦЬ, ПРОШЛАЕ, ПРАЙШОЎШАЕ, БЫЛОЕ, БЫЛЬ, ДАЎНЯЕ, ДАЎНЕЙШАЕ, ДАЎНАСЦЬ, СТАРОЕ, СТАРАСВЕТЧЫНА, СТАРАЖЫТНАСЦЬ, ГІСТОРЫЯ, СТАРЫЯ ЧАСЫ; БЫВАЛІШНЯЕ. ДАЎНІНА, ДАЎНЕЙШЧЫНА, СТАРЫНА *(разм.);* ПРОЙДЗЕНАЕ, ПЕРАЖЫТАЕ, ПЕРАЖЫТАСЦЬ, ДАЛЁКАЕ, ЗАБЫЦЦЁ, НЕБЫЦЦЁ, НЯБЫТ, УЧАРАШНЯЕ, УЧАРАШНІ ДЗЕНЬ *(перан.).*
*Не вельмі зручна ганарыцца толькі мінулым – заслугі трэба апраўдваць заўсёды.* Я. Скрыган. *Мінуўшчына – бывай!* В. Таўлай. *Даўняе ўсё больш і больш успаміналася мне.* М. Лупсякоў. *Груз старога важкі, ён цягне назад.* Х. Шынклер. *Цяпер – не тое, што ў старыя часы!..* І. Мележ. *Учарашняга дня не вернеш.* Прыказка.

**МІТУСІЦЦА,** КРУЦІЦЦА, ТАЎЧЫСЯ; ТАЎПЕХАЦЦА *(разм.);* БІЦЦА, КІДАЦЦА *(перан.).*
*Сама яна мітусілася па пакоі, перастаўляла з месца на месца крэслы, не ведаючы, дзе і пасадзіць гасцей.* У. Шахавец. *Круціцца, як верацяно.* Прыказка. *Думкі біліся ў пошуках.* І. Мележ.

**МІТУСНЯ,** МІТУСЯНІНА, МІТУСЕННЕ, СУМЯТНЯ, ТАЎКАТНЯ, ТАЎКАНІНА, ШТУРХАТНЯ, ШТУРХАНІНА, ВАЛТУЗНЯ, ТЛУМ; БЕГАНІНА, ТАЎХАНІНА, ТАЎПЕХАННЕ, КРУТАВЕРЦЬ, МІТУЛЬГА, КУЛАМЕСА, КАТАВАСІЯ, САДОМ *(разм.);* ГАЛДА, ГАМ, ТАРМАСА *(абл.);* ПЕКЛА, ГВАЛТ *(перан.)*
*І не спынілася машына, а ўжо пайшла мітусяніна...* Я. Колас. *Штурхатня, крыкі, лаянка. Дужэйшы адпіхвае слабейшага.* Я. Маўр. *Пасля гарадскога тлуму тут, на ўскраіне, было неяк незвычайна ціха і глуха.* В. Быкаў. *Такая катавасія, аж пыл курыць і дым!* Я. Колас.

**МНОГА,** ШМАТ, БАГАТА, НЯМАЛА, НЕЗЛІЧОНА, НЯЗЛІЧАНА, БЕЗЛІЧ, НЕ ЗЛІЧЫЦЬ, ЛІЧЫЦЬ НЕ ЗЛІЧЫЦЬ,

ПРОЦЬМА, МАСА, ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ, НЕЗЛІЧОНАЯ КОЛЬКАСЦЬ. ПАРАДКАМ, НІШТАВАТА, БАЧАНА-НЯБАЧАНА НАВАЛАМ, ГІБЕЛЬ, ГІБЛОТА *(разм.);* СІЛА, МОЦ, ХМАРА, ЛАВІНА, БЕЗДАНЬ, ЛЕС, МОРА, АКІЯН, СТО, МІЛЬЁН, МІЛЬЯРД, ПОЎНА, ГОРЫ, РОЙ, ЦЬМА *(перан.)* БЕЗ ЛІКУ, НЕ АБАБРАЦЦА, НЕ ПРАБІЦЦА, НЕ ПЕРАРАБІЦЬ, АЖ ЦЁМНА, ЦЬМА ЦЬМУШЧАЯ, ЦЬМА-ЦЬМОЙ, НЕПАЧАТЫ КРАЙ, НІ КАНЦА НІ КРАЮ, КУРЫ НЕ КЛЮЮЦЬ, ПА ВУШЫ, ПА ГОРЛА, ДАЙ БОЖА, ДА ЧОРТА, ДА ХАЛЕРЫ, ЯК БОБУ, ЯК ГРЫБОЎ, ЯК САБАК, ЦЭЛЫ ВОЗ, ВАЗАМІ ВАЗІ, ЦЭЛЫ МЕХ, ХОЦЬ АДБАЎЛЯЙ, ХОЦЬ ЗАВАЛІСЯ, ХОЦЬ ЗАЛІСЯ, ХОЦЬ ЗАСЫПСЯ, ХОЦЬ КАЎШОМ БЯРЫ, ХОЦЬ КАСУ ЗАКЛАДАЙ, ХОЦЬ ГАЦЬ ГАЦІ, ХОЦЬ РЭКІ ПРУДЗІ, ХОЦЬ РАВЫ МАСЦІ, КІШМЯ КІШЫЦЬ, ДА ГІБЕЛІ.

*Хто многа гаворыць, той мала робіць.* Прыказка. *Калі маеш шмат чаго, дык яшчэ табе прыбавяць...* М. Багдановіч. *...За дзень тут перабывае безліч народу: і з аддзелаў, і з цэхаў, і па асабістых справах.* Я. Скрыган. *Сабралася к яму бачана-нябачана гасцей.* Казка. *Падняўся лес рук.* І. Гурскі. *Аднекуль наляцела мільярд матылёў...* М. Лобан. *На ўзмор'і народу – калі ні прыйдзеш – процьма, кішмя кішыць.* Ц. Гартны.

**МОГІЛКІ,** МАГІЛКІ, ПАГОСТ /*каля царквы:* ЦВІНТАР; МОГІЛЬНІК, МАГІЛЬНІК *(разм.);* КЛАДЗІШЧА *(абл.);* КЛАДЫ *(абл. мн.).*

*Зайдзі на магілкі з крыжамі і насып забыты крані.* Я. Купала. *А хто прыйдзе на магілку, што на тым пагосце?* Я. Колас. *Бабуля была пахавана на новым могільніку, што на Віленскім тракце.* М. Гарэцкі. *Пахавалі на старым кладзішчы.* М. Гарэцкі.

**МОЖНА,** МАГЧЫМА, ЛЬГА _ ПАД СІЛУ.

*Усё можна, толькі асцярожна.* Прыказка. *Я кінуўся выручаць хлопцаў, каго было магчыма.* А. Карпюк. *Рабіўшы, стараючыся, дык і на дзвюх дзесяцінах льга жыць.* К. Чорны. *Надзвычай цяжка ашчаслівіць свет, – пад сілу гэта генію, магчыма.* Е. Лось.

**МОКРЫ,** ЗМАКРЭЛЫ, ЗМОКЛЫ, ЗМОЧАНЫ, ЗАМОЧАНЫ, НАМОКЛЫ, НАМОЧАНЫ, ПАМОЧАНЫ, ПРАМОКЛЫ, АБМОКЛЫ /*ад расы:* РОСНЫ, РАСЯНЫ, АБРОШАНЫ, ЗАРОШАНЫ, АБРАСЕЛЫ ¯ ХОЦЬ КРУЦІ, ХОЦЬ ВЫКРУЧВАЙ.

*Мокрыя ад расталага інею стрэхі блішчалі...* М. Лобан. *Вярнуўся я неяк позна з раёна – абмоклы, адубелы.* М. Ракітны. *Дождж зорак з неба падаў на росны шоўк травы.* П. Панчанка. *Смоллю пот лез у вочы, хоць круці – кашуліна.* Я. Купала.

**МОРГ,** ТРУПЯРНЯ; МЯРЦВЕЦКАЯ *(разм.);* ПАКОЙНІЦКАЯ *(абл.).*

*Трупы забралі ў морг пры шпіталі.* М. Гарэцкі. *У трупярні яны ўбачылі бацьку. Ірынка аж анямела.* К. Чорны. *Раніцою з бальнічнага барака яшчэ двух вынеслі ў мярцвецкую.* П. Галавач. *Ваську нават не ўносілі ў хату, адвезлі ў бальнічную пакойніцкую...* Б. Мікуліч.

**МОРДА,** МЫСА, МЫЗА; ПЫСА *(разм.).*

*Некалькі дзесяткаў коней прагна ўткнуліся мордамі ў росную траву.* З. Бядуля. *Гняды заіржаў, пачуўшы гаспадара, і пацягнуўся мызай да канюшыны.* А. Чарнышэвіч. *Юрка стаяў перад каровай і то правай, то левай ручкай гладзіў яе па пысе.* М. Танк.

**МОСТ** /*цераз дарогу, вуліцу:* ВІЯДУК /*часовы плывучы:* ПАНТОН.

*Есць рэчка Пціч, на Пцічы – мост.* А. Астрэйка. *Упершыся ў будынак педінстытута, плошча разгаліноўвалася: злева імкнула на віядук, які праносіў праспект над чыгункай...* У. Карпаў. *Над Эльбай волжскія пантоны, як воблакі зялёныя, ляглі.* А. Пысін.

**МОЦНЫ,** ТРЫВАЛЫ, НЯЗНОСНЫ, МАГУТНЫ, ВОЛАТАЎСКІ *(паэт)*; ВЕЧНЫ, ЖАЛЕЗНЫ, СТАЛЁВЫ *(перан)*. *Моцны, як дуб.* Прыказка. *І такія трывалыя выходзілі граблі – гады па тры служылі.* М. Лынькоў. *Вечныя сані я табе зрабіў, а аглабель аж тры пары.* А Чарнышэвіч.

**МОШКА,** КАЗЮРКА, КУЗУРКА, КАЗЮЛЬКА, КАЗЮЛЯ.
*Незлічоныя мільёны мошак аж кішаць у скошанай траве.* П. Глебка. *На сухой сцяблінцы побач узбіралася нейкая казюрка, тапырыла крылы, каб узляцець.* М. Лынькоў.

**МУЖ;** МУЖЫК, ЧАЛАВЕК *(разм.)*; ГАСПАДАР *(перан.)*.
*Навошта мне той мужык, калі хлопцаў даволі.* М. Зарэцкі. *Мікіціха плакала-галасіла на ўсю вёску аб чалавеку сваім, праклінаючы долю ўдовіну.* З. Бядуля. *Я ж такі-та жонка. Хіба ж на свайго гаспадара каму скажу?* М. Лобан.

**МУЗЫКАНТ** /*у аркестры:* АРКЕСТРАНТ; МУЗЫКА *(разм.)*.
*Музыканты,* «Лявоніху» грайце... М. Васілёк. *Галоўнае – перад трыма радамі аркестрантаў..., горда ўзброеных зіхатлівымі шчытамі акардэонаў, з'яўляецца дырыжор, пажылы, нават сівы марак.* Я. Брыль. *Жыў на свеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы.* М. Багдановіч.

**МУКА,** МЛІВА /*вышэйшы гатунак пшанічнай* КРУПЧАТКА /*дробна змолатая, прасеяная.* ПЫТЛЁЎКА.
*Той важдаўся ля свіронка, перасыпаючы з меха ў кадушку муку.* К. Чорны. *Не сеялі на сіта мліва – мірыліся і з асцюком* Р. Барадулін. *Вы нам – пірог з пытлёўкі, мы вам – састаў машын.* А. Бялевіч.

**МУЛКА,** ЦВЁРДА.
*Мулка ляжаць на печы.* М. Гарэцкі. *Цвёрда было сядзець на нейкім старым скаце.* А. Кулакоўскі.

**МУСКУЛ,** ЦЯГЛІЦА, БІЦЭПС.
*Мускулы напружваліся пад гімнасцёркай.* М. Лупсякоў. *У класе Ігнася стрэлі як рэдкага заморскага звера: прабавалі сукно на світцы, смяяліся з вялізных бацькавых ботаў, а адзін нават памацаў, ці здаровыя цягліцы.* А. Чарнышэвіч. *Скінуў фрэнч і застаўся ў адной плеценай з воўны рубашцы, якая шчыльна аблягала яго мускулістыя грудзі і шырокія плечы, гатова была трэснуць на біцэпсах рук.* У. Дамашэвіч.

**МЯКІНА,** ПАЛОВА.
*Хлеб наш людзі ядуць, мы ж мякіну жуём!..* Я. Купала. *Я зерне спелае адбіла ад паловы і цьмяным золатам напоўніла далоні.* К. Буйло.

**МЯККІ,** ПУХКІ, ПУШЫСТЫ, ПУЛЬХНЫ ЯК ПУХ.
*Праз ноч зямля адтала, зрабілася мяккай.* А. Якімовіч. *Падаў пухкі лапцяваты снег.* З. Бядуля. *Зярняты свабодны сявец з сяўкі сее ў пульхны загон.* Я. Купала.

**МЯРЦВЯК,** НЯБОЖЧЫК, ТРУП, НЕЖЫВЫ /*высахлы:* МУМІЯ; ПРАХ *(выс.)*.
*І мерцвякоў устануць цені сваіх магільшчыкаў судзіць.* А. Бялевіч. *Труна нябожчыка стаяла на высокім памосце, упрыгожаным яловымі лапкамі.* М. Лынькоў.

**МЯЦЕЛІЦА,** ЗАМЕЦЬ, ЗАВЕЯ, ЗАВІРУХА, ПУРГА; ВЕЯ, ЗАМЯТУХА, СНЯЖНІЦА, СНЕГАВЕЙ, ДУЙКА, КУДАСА *(абл.)*.
*Страшную людзі цярпелі зіму: дзіка мяцеліцы вылі...* Я. Купала. *Бывала, сядзеш ля камінка пад шумы снежныя завей.* П. Трус. *Лютавала ранняя суровая зіма: трашчалі марозы, вылі снежныя завірухі.* І. Шамякін.

**МЯШОК,** МЕХ; ВОРАК *(абл.)*.
*Нарэшце і мяшок з жытам пакладзены на воз.* І. Шамякін. *Б'юцца за мех, а ў мяху смех.* Прыказка. *Рэчаў у мяне мала, ворак за плячыма.* М. Хведаровіч.

# Н

**НАБАЖЭНСТВА,** МАЛЕБЕН, МАЛЕБСТВА, БАГАМОЛЛЕ, БОГАСЛУЖЭННЕ, СЛУЖБА, АДПРАВА /*раніцай ці ў першай палавіне дня*: АБЕДНЯ, ІМША, МЕСА /*увечары*: ВЯЧЭРНЯ /*з нагоды хрысцін, шлюбу, па нябожчыку*: ТРЭБА /*па нябожчыку*: ПАНІХІДА.

*Пакуль ішло набажэнства, гаспадары сядзелі ля вазоў, заходзячы раз-пораз у бажніцу.* К. Чорны. *Папы ды малебны нам больш не патрэбны.* Прыказка. *А розныя абедні ды вячэрні – каму яны патрэбны? Богу?* А. Якімовіч. *Біскуп сам служыць прыехаў месу.* М. Танк.

**НАБІВАЦЦА,** НАДАРАЖАЦЦА – ВЕШАЦЦА НА ШЫЮ.

*Не яна набівалася яму ў жонкі, ён прасіў.* І. Шамякін. *Я ведаю такіх старэнькіх, якім дзяўчаты на шыю вешаюцца.* К. Крапіва.

**НАБІЦЬ,** ПАБІЦЬ; АДДУБАСІЦЬ, АДХАДЗІЦЬ *(разм.)* – НАМАЦАЦЬ БАКІ, ПАЛІЧЫЦЬ РЭБРЫ, ДАЦЬ ЛУПЦОЎКІ.

*Хто каго нагне, той таго наб'е.* Прыказка. *Аддубасілі яго панскія служкі ў лесе, куды ён пайшоў збіраць галлё, каб напаліць у лазні.* П. Кавалёў. *Мо б хто рэбры палічыў, тады б ведаў, якое смачнае гэта сена.* К. Крапіва.

**НАБОЖНЫ,** ПРАВАВЕРНЫ, БАГАМОЛЬНЫ, БОГАМАЛЕННЫ, БОГАБАЯЗНЫ.

*Стары Апанас Гарбуз хаця і лічыў сябе набожным, але ў цэркаў хадзіў рэдка.* М. Чарот. *Васіль быў багамольным хлопцам і ніводнага свята, ніводнае нядзелі не прапускаў, каб не наведаць цэркаў.* Ц. Гартны.

**НАБЫЦЬ,** НАЖЫЦЬ, ДАСТАЦЬ, УЗЯЦЬ, ПРЫДБАЦЬ, ЗАЙМЕЦЬ, ЗДАБЫЦЬ, РАЗДАБЫЦЬ, РАССТАРАЦЦА, ВЫСТАРАЦЦА, ПРЫСТАРАЦЦА, РАЗЖЫЦЦА, ЗАВЕСЦІ /*з цяжкасцю*: АГОРАЦЬ; СПРАВІЦЬ, ПАЖЫВІЦЦА, АБАБІЦЬ, УЗБІЦЦА, АРГАНІЗАВАЦЬ *(разм.)*; ДАБЫЦЬ, ПАПАСЦІ, ЗГАРУСЦІЦЬ *(абл.)*

*Можа хто скажа, што ён сваім мазалём гэта багацце набыў?* М. Лобан. *Ты сягоння карову, каня нажывеш, заўтра ўсё прададуць за падаткі.* П. Глебка. *Гуляючы, розуму не прыдбаеш.* Прыказка. *Жонцы справіў чаравікі, сам жа ў лапцях ходзе болей...* Я. Купала. *Той усё дабудзе, у каго розум будзе.* Прыказка.

**НАВАСЕЛЛЕ,** УВАХОДЗІНЫ *(мн.)*, УХОДЗІНЫ *(мн.)*; УЛАЗІНЫ *(разм., мн.)*.

*За ўсіх прысутных п'ю на наваселлі, за нашу дружбу даўнюю, сябры!* А. Куляшоў. *Не справіць вам уходзінаў на новае паселішча...* Я. Купала. *Хату нам паставіў, дык ты прыйдзі ўжо на ўлазіны.* А. Макаёнак.

**НАВЕДАННЕ,** ВІЗІТ, АДВЕДКІ *(мн.)*, АДВЕДЗІНЫ *(мн.)*, ВОДВЕДКІ *(мн.)*.

*На развітанне яна ўсім падала руку і падзякавала за наведанне.* І. Новікаў. *Візіт незнаёмай настаўніцы ды яшчэ ў позні час яго моцна дзівіць.* Я. Колас. *Я сяджу пад уражаннем дзедавых адведзін і ўсміхаюся.* П. Пестрак.

**НАВЕДНІК,** ГОСЦЬ; БЫВАЛЕЦ, ПРЫХАДЗЕНЬ, ВІЗІТАНТ *(разм.)*.

*Чым госць радзейшы, тым мілейшы.* Прыказка. *У ёй [карчме] Анупрэй быў стары бывалец, субяседнік.* П. Пестрак. *– А я тут, Паша, у камандзіроўцы, – сказаў прыхадзень.* Я. Васілёнак.

**НАВОКАЛ,** НАВАКОЛ, ВАКОЛ, ВАКОЛА. ВОКАЛА. УКОЛА, НАЎКОЛ, КРУГОМ, УКРУГ, НАЎКРУГ, НАЎКРУГА.

*Комін відаць на многа кіламетраў навокал.* З. Бядуля. *Вакола было пуста і ціха.* Ц. Гартны. *Наўкол стаяў дрымучы лес.* А. Чарнышэвіч. *Усюды так ціхусенька, спакой такі наўкруг!* Я. Колас.

**НАВОШТА** – ЯКОЙ ХВАРОБЫ *(груб.)*.

*І наогул, навошта чалавек жыве на свеце?* А Асіпенка *Якой хваробы хадзіць яшчэ, няхай сам ідзе, калі яму трэба!* П Галавач

**НАВУЧАННЕ,** ВУЧЭННЕ, НАВУКА, ВУЧОБА АСВЕТА, АДУКАЦЫЯ, ВЫКЛАДАННЕ, ПАДРЫХТОЎКА, МУШТРА, МУШТРОЎКА, МУШТРАВАННЕ, ЗАНЯТКІ *(мн.):* ВЫШКАЛЕННЕ *(разм ).*

*Там вучацца толькі дзеці багатых бацькоў, хто можа плаціць за навучанне...* А. Якімовіч. *І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.* З Бядуля. *Зараз доктар Розенталь прачытае лекцыю аб санітарнай асвеце.* Я. Колас. *Заняткі ў школе пачаліся ў сярэдзіне верасня ..* А. Асіпенка.

**НАГА** *І у жывёл, з кіпцюрамі:* ЛАПА.

*Спушчаны з ланцуга сабака кінуўся пярэднімі нагамі на браму.* М. Лобан. *Сабака радасна завішчаў, падбег, абняў гаспадара пярэднімі лапамі, лізнуў у твар.* К. Чорны.

**НАГОДА,** ВЫПАДАК, ПРЫЧЫНА, ЗДАРЭННЕ.

*Яму рупіла запытаць, па якой нагодзе сам госпад бог прыслаў на ягоны панадворак такіх паважаных гасцей.* Р Сабаленка. *І калі бацька каго стрэне, не прапускае ўжо здарэння спытаць, праведаць аб зямельцы.* Я. Колас.

**НАД,** ПА-НАД

*Недзе высока над галавою каркалі вароны.* А Якімовіч *Па-над борам густым дзень падняў ліхтары, разганяе хмурын валаконцы.* А Александровіч.

**НАДВОР'Е,** ПАГОДА *Ібез ветру:* БЯЗВЕТРАНІЦА.

*Памятаю, надвор'е ў той дзень стаяла добрае: у небе не было ні хмурынкі, моцна пякло сонца.* А. Карпюк *Праясняецца пагода, бо вярнулася вясна.* М. Багдановіч. *Хвоі і ў ціхую бязветраніцу роўна і спакойна шумяць.* К Чорны.

**НАДЗЕЯ,** СПАДЗЯВАННЕ, ВЕРА, ЧАКАННЕ; СПАДЗЯВАНКА, СПАДЗЯВАНАК, СПАДЗЕЎКА *(разм ),* СПАДЗЕЎКІ *(разм , мн.),* СТАЎКА, ІЛЮЗІЯ *(перан )*

*Пакуль душа жывая ў целе, датуль надзея ў ей жыве.* С Дзяргай. *Ці ж пагасла ў вашых сэрцах вера ў лепшае жыццё?* М Васілёк. *Насуперак яе чаканню, кніжка аказалася нецікавай.* У. Шахавец. *Вядома, спадзеўкі не спраўдзіліся.* Х. Шынклер.

**НАЕЗДЖАНЫ,** УЕЗДЖАНЫ, ЯЗДЖАЛЫ, ЕЗДЖЫ, ТОРНЫ, БІТЫ.

*Курыцца пылам шэрым наезджаны бальшак.* М. Калачынскі.

**НАЗАЎСЁДЫ,** НАЗАЎЖДЫ, НАВЕЧНА, НАВЕКІ, НАВЕК, ПАВЕК; ЗУСІМ, НАЗУСІМ *(разм.),* НАЎСЯГДЫ ◻ НАВЕК ВЕЧНЫ, НАВЕКІ ВЕЧНЫЯ, ДА ВЕКУ-ВЯКОЎ, НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ.

*Маленства наша мінула даўно, назаўсёды.* Я. Брыль *Каб слава дружыла з табой праз гады, ты з працай зрадніся, мой сын, назаўжды.* А. Бялевіч. *Пакідалі магнаты навечна харомы* А. Вялюгін. *Там і атруцілі яму грудзі на век вечны. Газ ядавіты пускалі.* К Чорны.

**НАЗВА,** НАЙМЕННЕ, ПРАЗВАННЕ, ІМЯ, ПРОЗВІШЧА, ПСЕЎДАНІМ, ЗВАННЕ, ГОДНАСЦЬ, ЗАГАЛОВАК, ШЫЛЬДА. ТЭРМІН, ТЫТУЛ; ПРОЗВА, МЯНУШКА, МЯНЮШКА *(разм.).*

*Над Нёманам горад стаіць з прыгожаю назваю Гродна.* М. Машара. *Раней жах быў звыклым станам маёй душы, зараз ён ператвараецца ў штосьці такое, чаму няма наймення.* У. Караткевіч *Ты барацьбою заслужыў сабе героя імя.* М. Засім. *Побач з ім каля воза стаяў Раман Чачотка, па мянушцы Свісток.* Я. Брыль.

**НАЗОЛА;** СМАЛА, СЛАТА *(перан.).*

*Адчапіся, назола, едзь куды хочаш!* М. Лынькоў. *Але ж гэты чорны прыстаў... Смала, а не чалавек...* І. Чыгрынаў *Адчапіся, слата, у горле перасохла.* Я Брыль.

**НАЙМАЦЬ,** ГАДЗІЦЬ, НАБІРАЦЬ, ВЕРБАВАЦЬ.

*Наймалі пастуха для калгасніцкіх кароў* Я. Брыль. *Агенты заморскіх кампаній. вярбуючы, рай абяцалі...* А Вялюгін.

**НАКІД**, ЭСКІЗ, ЧАРНАВІК

*Пад грукат колаў добра думаецца і запісваецца. Накід навелы* М. Лужанін *Тым часам Галя ў сваім сшытку дала эскіз першага малюнка будучай экспедыцыі...* У. Дубоўка. *З майго чарнавіка яны перапісвалі пісьмы рукой.* З. Бядуля.

**НАКРЫЎКА,** ПОКРЫЎКА, ВЕКА; НАКРЫВАТКА *(абл.).*

*Хутка шчарбаты чайнік пачынае выказваць адзнакі непакою, і падскаквае накрыўка...* М. Лынькоў. *Бяруць века, каб зачыніць труну.* К. Крапіва.

**НАЛІЎКА,** НАСТОЙКА.

*Запрасіў бы да сябе паабедаць, пачаставаў бы наліўкай, якая развяжа язык любому.* Х. Жычка. *Тут госці, а ты за газету ўхапіўся. Нясі настойку.* М. Ткачоў.

**НАМАГАННЕ,** НАПРУЖАННЕ, ВЫСІЛЕННЕ, ВЫСІЛАК; НАТУГА, НАТУЖАННЕ *(разм.).*

*Чалавек працы здабывае сабе шчасце, часам волатаўскімі намаганнямі перасільвае прыроду.* У. Юрэвіч. *Дзеці, не вытрымаўшы напружання, заварушыліся, пачуўся шумок.* У. Шахавец. *А робіць ён сваю работу без ніякага высілку.* П. Пестрак.

**НАМЕР,** ЗАМЕР, ДУМКА, ЗАДУМА, ЗАДУМАНАЕ, ЗАМЫСЕЛ, НАМЫСЕЛ, РАШЭННЕ, ПЛАН, МЭТА; ПРЫЦЭЛ, РАЗЛІК, ЗАМАХ *(перан.).*

*Калі ён даведаўся, што Аленка збіраецца далей вучыцца, то адобрыў яе намер.* Я. Колас. *Задуманае ўдалося.* Х. Шынклер. *Вайна парушыла жыццё, зблытала ўсе планы.* М. Лынькоў. *Прыцэл быў узят на замужжа толькі сапраўднае* Я. Брыль.

**НАМЕРВАЦЦА**, МЕРЫЦЦА, ДУМАЦЬ, МЕРКАВАЦЬ, МЕЦЦА, МЕЦІЦЦА, МЕЦІЦЬ, ЦЭЛІЦЦА, НАЦЭЛЬВАЦЦА, ПАРЫВАЦЦА, ПАМЫКАЦЦА, ЗБІРАЦЦА, РАШАЦЬ, ПЛАНАВАЦЬ, ПРАЕКТАВАЦЬ, ЗАМАХВАЦЦА *(перан.)* ⌶ МЕЦЬ НАМЕР, СТРОІЦЬ ПЛАНЫ, МЕЦЬ НА МЭЦЕ, СТАВІЦЬ МЭТУ, СТАВІЦЬ ЗА МЭТУ

*Некалькі разоў падыходзіў да дзвярэй, намерваўся ўвайсці і – стаяў нясмела.* І. Мележ *Хвастом віляе, а ўкусіць меціць.* Прыказка. *Міхал аб помсце строіць планы.* Я. Колас. *Тут пакінуць меў на мэце – але нехта апярэдзіў.* С. Дзяргай.

**НАМЯКАЦЬ,** ХІЛІЦЬ, ЗАІКАЦЦА, КІВАЦЬ *(перан.).*

*Бацька Мікітаў сам добра разумеў розніцу між сваім жыццём і жыццём сына і ў гутарцы так ці сяк намякаў на гэта.* П. Галавач. *– Ці не твае гэта словы? – Ну, мае... Але да чаго ты гэта хіліш?* М. Лынькоў. *І не заікайся нават бабцы, што хочаш у партызаны...* А. Васілевіч.

**НАПАВЕР** ⌶ У ДОЎГ, У КРЭДЫТ.

*Не маеш залатоўкі на чарку, карчмар напавер дасць.* М. Лужанін. *Знаёмыя віншуюць, жонка робіць набыткі – у растэрміноўку і ў доўг.* В. Быкаў. *І так, дзякуй дзяржаве, усю вёску ў крэдыт адбудавалі.* І. Шамякін.

**НАПАД,** НАБЕГ, НАСКОК, НАЛЁТ, НАСТУПЛЕННЕ, АТАКА.

*Словам, калі прыходзіць набег у аул – пуста там.* У. Караткевіч. *З тае суровае атакі к нам не вярнуўся музыкант.* М. Калачынскі.

**НАПЕРАКОР,** СУПРОЦЬ, НАСУПРАЦЬ, НАЗЛО; НАСУПЕРАК, НАСУПОР *(разм.).*

*Не падабаецца людзям, што ты наперакор робіш.* А. Асіпенка. *І я пайшоў насупраць плыні, каб дакапацца, дзе клубок.* М. Лужанін.

**НАПЕРАРЭЗ,** НАПЯРЭЙМЫ *(разм.).*

*Наперарэз яму, як з-пад зямлі, выскачылі партызаны пад камандаю Мартына Рыля і штыкамі перагарадзілі дарогу.* Я. Колас. *Напярэймы забягаеш з дошкай, курыцца з-пад пятаў пыл і дым.* П Панчанка.

**НАПІТАК**, ПІТВО /*спіртны* МАЦУНАК, ТРУНАК *(разм.)*
*Пры гэтым ён быў вельмі шчодры, частаваў сваіх бліжніх сытнай ядою і хмельным пітвом.* З. Бядуля. *Гаспадар маргнуў Мар'і, каб тая пашукала ў шафе якога мацунку.* Р. Сабаленка. *Вось прыносяць пачастункі – рознай ежы, розных трункаў.* З. Бядуля.

**НАПРАМАК**, КІРУНАК, БОК, КУРС, ЛІНІЯ.
*Лодка хоць і суцішыла ход, але плыла ў адным напрамку.* П. Пестрак. *Хоць сцежка цяжкая надзіва – кірунку да мэты не зменім...* П. Глебка. *Трэці бамбавоз, не мяняючы курсу, ляцеў на ўсход.* У. Дамашэвіч.

**НАПЭЎНА**, БЯССПРЭЧНА, НЕСУМНЕННА.
*Улетку, калі фронт усё набліжаўся, у Вільні чакалі немцаў напэўна.* М. Гарэцкі. *Яны [маладыя будаўнікі] бясспрэчна заваююць права называцца калектывам камуністычнай працы.* А. Кулакоўскі. *Адно несумненна, што сама ідэя аб'яднання насілася ў паветры.* Н. Гілевіч.

**НАРАДЗІЦЬ**, РАДЗІЦЬ, СПАРАДЗІЦЬ; ПРЫВЕСЦІ, ВЫВЕСЦІ, ПРЫНЕСЦІ *(разм.)* /*нейкую колькасць:* НАВЕСЦІ ПРЫНЕСЦІ НА СВЕТ, ПУСЦІЦЬ НА СВЕТ.
*Нарадзіла яна за свой не такі ўжо вялікі век сямёра дзяцей.* М. Лобан. *Вывела жаба вырадка звярынай пароды.* Казка. *Пад сэрцам у яе жыла істота, якую яна рыхтавалася пусціць на свет.* К. Чорны.

**НАРЭШЦЕ**, УРЭШЦЕ, У КАНЦЫ, НАПАСЛЕДАК.
*Нарэшце выразна выявілася, чаго ён хацеў.* К. Чорны. *Яна правяла яго да частакола, і яны развіталіся, яшчэ раз дамовіўшыся напаследак – пабачыцца ўдзень.* М. Лупсякоў.

**НАСАТЫ**, ДАЎГАНОСЫ.
*Хоць кульгавы, хоць насаты, але хітры і багаты.* Прыказка. *– Знайсці жалеза я бяруся, – сказаў кавалю даўганосы бусел.* В. Вітка.

**НАСЕЛЬНІЦТВА**, ЖЫХАРСТВА.
*Насельніцтву найбольш уеўся ў косці гарнізон у мястэчку Турцы.* Я. Брыль. *Тутэйшае жыхарства лічыла яго палякам, сам жа пан падлоўчы з гэтым не згаджаўся.* Я. Колас.

**НАСКРОЗЬ**, НАВЫЛЕТ, НАВЫЛЁТ.
*Сцены яе [хаты] пратрухлявелі ўшчэнт, парні дручком – і пройдзе ён наскрозь.* А. Чарнышэвіч. *Памойму, ён яшчэ жывы. Прастрэлены ў грудзі навылет...* А. Чарнышэвіч.

**НАСТАЎНІК**, ВЫКЛАДЧЫК, ПЕДАГОГ; ВУЧЫЦЕЛЬ *(уст.)* /*хатні:* ДАРЭКТАР *(уст.)*.
*У інстытут спяшаецца вучоны, настаўнік – у прасторны светлы клас.* А. Астрэйка. *Зазвінеў званок, а выкладчык паведамляе...* Ф. Янкоўскі. *Цяпер ужо я педагог – паеду выкладаць літаратуру на бібліятэчных курсах.* П. Пестрак.

**НАСТОЙЛІВЫ**, НАПОРЫСТЫ, УПАРТЫ, ВАЛЯВЫ, НЯЎМОЛЬНЫ; НАСТЫРНЫ *(разм.)*; НЯЗЛОМНЫ, НЯЎЛОМНЫ *(перан.)*.
*Але Петрык па натуры быў хлопчык настойлівы...* А. Якімовіч. *Пачалася праца, упартая, гарачая.* Я. Маўр. *Але стары Несцер быў няўмольны.* П. Пестрак. *Дух у яго нязломны: ён савецкі чалавек, камандзір.* Б. Мікуліч.

**НАСТРОЙ**, САМААДЧУВАННЕ, САМАПАЧУЦЦЁ, ДУХ, ГУМОР; САМАПАЧУВАННЕ *(разм.)*.
*Пасля снедання настрой іх яшчэ больш палепшыўся.* Я. Маўр. *Тропік паабедаў па-панску, і бакі яго выраўняліся і пакруглелі. Самапачуванне ў яго было найлепшае.* Я. Колас.

**НАСТУПНЫ**, ДАЛЕЙШЫ, ЧАРГОВЫ.
*Для наступных пакаленняў пад сяўбу раллю падымем...* М. Васілёк. *Ён прынясе літаратуру і ўказанні аб далейшай рабоце.* А. Чар-

нышэвіч. *Праз некалькі дзён пасля гэтага ішоў на чарговае заданне...* А. Кулакоўскі.

**НАСЦЯРОЖЫЦЦА**; НАСТРУНІЦЦА *(разм.)* НАВАСТРЫЦЬ ВУШЫ.

*Пачуўшы словы на незнаёмай ім мове, дзяўчаты адразу насцярожыліся.* М. Лынькоў. *Наструнілася, убачыўшы Сцепаніду, пачырванела. «Чуе кошка, што ў шкоду залезла», – мільганула ў Сцепаніды думка.* А. Асіпенка. *Буланчык навастрыў вушы, чуючы блізкае суседства драпежніка.* А. Якімовіч.

**НАХАБНІК**, ГРУБІЯН; ХАМ, ХАМУЛА *(разм. зняваж.)*.

*Валя нават не звярнула ўвагі на тое, што ёй не раз наступалі на нагу нейкія нахабнікі.* Р. Сабаленка. *Спыніце аўтобус, таварыш кандуктар. Мы высадзім гэтага грубіяна!* А. Савіцкі. *Ты далікатны чалавек і хамаў не любіш...* К. Чорны.

**НАЦЯГВАЦЬ**, НАПІНАЦЬ.

*Паўлёнак з захапленнем нацягваў лейцы і вёў гнядога размашыстай, але раўнамернай рыссю, не дапускаючы да галопу.* П. Пестрак. *Косцік напінаў лейцы ў сваіх малых руках...* К. Крапіва.

**НАЧЛЕГ**, НАЧОЎКА.

*Але варта было падумаць пра начлег, бо параход на Гомель, як сказалі яму, будзе толькі раніцой.* І. Шамякін. *Міхасю ўжо не хацелася есці, не хацелася наогул сядзець ля кастра, дзяліць з Сухарэўскім начоўку.* А. Асіпенка.

**НАЧОЎКІ**, НОЧВЫ.

*Я нагрэю вады, памыйся ў начоўках.* П. Пестрак. *Мужчыны ўхадзіліся і цяпер мыліся ў ночвах.* Я. Колас.

**НАШЧАДАК**, ПАТОМАК, НАСЛЕДНІК.

*Я – сын зямлі, нашчадак хлебаробаў.* Р. Барадулін. *З жабрацкай торбай твой патомак не пойдзе па сібірным шляху...* Я. Купала. *Нашы наследнікі – люд не лагодны.* П. Панчанка.

**НЕАДНОЙЧЫ**, НЕАДНАРАЗОВА; СТАКРОТ, СТАКРОЦЬ *(абл.)* НЕ РАЗ, НЕ РАЗ І НЕ ДВА, НЕКАЛЬКІ РАЗОЎ.

*І нанава ўзнікала перад Васілём перабранае ў памяці, передуманае неаднойчы.* М. Стральцоў. *Тыя, што варты стакрот кахання, – тыя не маюць яго на зямлі.* У. Караткевіч. *Не раз і не два з-за птушак маці біла мяне трапкачом.* М. Капыловіч. *Ён некалькі разоў азіраўся ідучы.* К. Чорны.

**НЕБЯСПЕЧНЫ**, СТРАШНЫ, СУР'ЁЗНЫ; КРУТЫ, НАПРУЖАНЫ, КРЫТЫЧНЫ, СЛІЗКІ, КОЎЗКІ *(перан.)*.

*Заданне было надта небяспечнае, бо гарнізон быў добра ўмацаваны.* А. Карпюк. *Самы страшны вораг кожнай арміі – гэта паніка.* М. Лынькоў. *У самую крутую хвіліну вадзіцель не губляў развагі.* І. Мележ.

**НЕВІНАВАТЫ**, НЯВІННЫ, БЯЗВІННЫ; ПРАВЕДНЫ *(уст.)*; СВЯТЫ, ЧЫСТЫ, СУХІ *(перан.)*.

*Сорам і ганьба не мне, а паліцыі, якая арыштоўвае невінаватых людзей.* А. Макаёнак. *Нажы салдаты спаласкалі ў дзіцячай праведнай крыві!* Я. Колас.

**НЕВЯДОМЫ**, НЯЗВЕДАНЫ, НЕРАЗГАДАНЫ, НЕРАЗГАДНЫ, БЕЗЫМЕННЫ, НЕЙКІ /*пра прыналежнасць:* НЕЧЫ /*пра пісьмо, літаратурны твор.* АНАНІМНЫ: НЯВЕДАМЫ *(разм.)*; ЗАГАДКАВЫ, ЦЁМНЫ *(перан.)*.

*Збеглі хмары грамавыя ў невядомы край.* Я. Колас. *Нязведаны свет адкрываўся перад Станіславам..* Т. Хадкевіч. *Па лясах бадзяюцца цёмныя людзі, змаўляюцца, да чагось рыхтуюцца і на нешта наважваюцца.* Я. Колас.

**НЕГАСЦІННА**; ХОЛАДНА *(перан.)*.

*Свая ж хата пазірала на Пракопа няветліва і негасцінна, як бы ён тут быў чужы і лішні.* Я. Колас. *Прынялі мяне сёння ў пана холадна, што я пачынаю думаць, ці няма на мяне нагавораў перад ім?* В. Дунін-Марцінкевіч.

**НЕДАВЕРЛІВА,** КРЫТЫЧНА, СКЕПТЫЧНА.

*Але да новых вестак шмат хто ставіўся недаверліва завельмі ж ужо грандыёзнае будаўніцтва.* Х. Шынклер. *З першай сваркай Ніна, хоць нясмела, на яго крытычна паглядзела* А. Русецкі. *Люда пэўна лічыла, што я іграю горш за яе, бо скептычна крывілася.* І. Шамякін.

**НЕДАГАРАК,** ГАЛАВЕШКА, АБГАРАК, АГАРАК, АСМАЛАК.

*Недагарак свечкі ў ліхтарыку на сцяне асвечваў яго маладзецкія вусы.* К. Чорны. *Ужо адно галавешкі тлелі.* К. Чорны. *У будане яны запалілі агарак свечкі...* А. Кулакоўскі. *Чорныя асмалкі яго дома курыліся яшчэ і тлелі.* К. Чорны.

**НЕДАСТАЧА,** НЯСТАЧА, НЕДАХОП, НЕДАБОР; НЕДАХВАТ, БРАК *(разм.).*

*Я ўчотчыца фермы. У мяне вунь недастача, судзіць збіраюцца.* І. Навуменка. *Мне, па маёй галаве, наркомам быць няйначай. От толькі граматнасці недахват.* А. Асіпенка.

**НЕДАХОП,** ХІБА, БРАК, НЯСПРАЎНАСЦЬ, НЕДАРОБКА, ДЭФЕКТ /прыроджаны: ГАНЬБА; ЗАГАНА, ВАДА, ЗАВАДА, АГРЭХ, ПАХІБА, ПАХІБКА *(разм.);* НЕПАЛАДКІ *(разм., мн.);* СКАЗА *(абл.);* ГРЭХ, ПРАРЭХА, СЛАБАСЦЬ, СЛАБІНКА, ПЛЯМА, ПАМАРКА, ХВАРОБА, БАЛЯЧКА, ВЫВІХ, МІНУС *(перан.)* СЛАБЫ БОК, СЛАБАЕ МЕСЦА, СЛАБАЯ МЯСЦІНА, ЦЁМНЫ БОК, ЦЕНЯВЫ БОК, АХІЛЕСАВА ПЯТА.

*А недахопаў у нас досыць, каб іх высмейваць. Хібаў многа яшчэ ў нас...* К. Крапіва. *Праверылі плыт на вадзе – заганы ніякай нідзе.* Я. Колас. *Вядома, глядзелі, каб агрэхаў не было, каб глыбіня была патрэбная...* К. Крапіва. *Ён, як кожны жывы чалавек, меў свае слабасці.* М. Зарэцкі. *Слабае месца ўсіх трох аповесцей – дыялог.* Р. Шкраба. *Усе цёмныя бакі іх сумеснага жыцця забыліся.* А. Васілевіч.

**НЕЗАЧЭПА,** НЯДОКРАТКА, ЛАМАКА *(разм.).*

*– Адкуль вы ўзяліся такая? Гм... – ён яўна падбіраў патрэбнае слова. – Ну, як бы сказаць? Суровая... незачэпа такая?* М. Лынькоў. *А ты не бараніся так, нядократка!* Я. Брыль. *Не гаруй, хлопец, дзеўкі ўсе ламакі.* А. Асіпенка.

**НЕЗВЫЧАЙНЫ,** НАДЗВЫЧАЙНЫ, НЯЗВЫКЛЫ, НЯЗВЫЧНЫ, НЕПРЫВЫЧНЫ, НЕБЫВАЛЫ, НЕЧУВАНЫ, НЯБАЧАНЫ, НЕВЕРАГОДНЫ, НЕЙМАВЕРНЫ, НЕВЕРАЕМНЫ, НЕМАГЧЫМЫ, НЕВЫКАЗНЫ, НЕВЫМОЎНЫ, ВЫКЛЮЧНЫ, ДЗІЎНЫ, НЕНАРМАЛЬНЫ, НЕНАТУРАЛЬНЫ, НЕЧАЛАВЕЧЫ, ФЕНАМЕНАЛЬНЫ, УНІКАЛЬНЫ, СЕНСАЦЫЙНЫ, ЭКСТРАВАГАНТНЫ; НЕСУСВЕТНЫ, НЕ АБЫ-ЯКІ *(разм.).*

*Дзякуючы незвычайнай памяці, усё прачытанае аставалася ў яго галаве.* А. Чарнышэвіч. *Буры я вытрымаў неверагодныя...* А. Зарыцкі. *Уладзя сеў, і невыказная радасць ахапіла яго.* А. Пальчэўскі. *Нейкая дзіўная песня – і ласкавая і разам страшная.* П. Пестрак. *Чырвань на бледных шчоках плямамі, ненатуральны бляск вачэй...* А. Рылько. *Выпадак рэдкі... Як кажуць вучоныя, экстравагантны.* І. Грамовіч.

**НЕ ЗВЯРТАЦЬ УВАГІ,** НЕ ЗВАЖАЦЬ, НЕ ЗАЎВАЖАЦЬ, НЕ ЛІЧЫЦЦА, НЕ БРАЦЬ У РАЗЛІК, СКІДАЦЬ З РАХУНКУ; НЕ ШМАНАЦЬ *(разм.);* ПЛЯВАЦЬ, ЧХАЦЬ *(перан.)* ПРАПУСКАЦЬ МІМА ВУШЭЙ, ПРАПУСКАЦЬ МІМА ЎВАГІ, ПРАХОДЗІЦЬ МІМА, НЕ ВЕСЦІ І ВУХАМ, НЕ БРАЦЬ ДА ГАЛАВЫ, ЗАПЛЮШЧВАЦЬ ВОЧЫ, ЗАКРЫВАЦЬ ВОЧЫ, НЕ ГЛЯДЗЕЦЬ, ГЛЯДЗЕЦЬ ПРАЗ ПАЛЬЦЫ.

*Але кожны быў заняты сваім, і на Севу не звярталі ўвагі.* У. Карпаў. *А вы не зважайце, цётка, на старасць.* М. Лынькоў. *Плюй на ўсё, урэшце, ты да мяне ходзіш, а не да яе...* Ц. Гартны. *Казна на слёзы не глядзіць.* Прымаўка.

**НЕЗДАРМА,** НЕДАРЭМНА, НЯДАРАМ, НЕ БЕЗ ПРЫЧЫНЫ, НЕ ТАК САБЕ.
*Не ведаю чаму, але я быў упэўнены, што сустрэўся з ею нездарма.* Я. Скрыган. *Не без прычыны страшна зрабілася Міхасю...* Я. Колас. *Валодзька ездзіў з дзедам не так сабе, не з пустой ахвоты* І. Мележ.

**НЕКАЛЬКІ,** КОЛЬКІ; ПАРА *(разм.).*
*Абодва некалькі хвілін маўчалі.* Ц. Гартны. *Маладая жанчына колькі разоў выходзіла і ўваходзіла – пачыналася дзённая гаспадарская таўкатня* К. Чорны. *Праз пару тыдняў я заехаў да Дубіка.* Я. Скрыган.

**НЕЛЬГА,** НЯМОЖНА, НЕМАГЧЫМА, НЕ ТРЭБА НЯМА ЯК, НЯМА ЧАГО, ЯК БЕЗ РУК.
*Няпраўда, што нельга быць сёння паэтам...* М. Машара. *А ўцячы знутры палонніку было немагчыма.* Я. Маўр. *Жанчына ўсё стаіць на парозе, і ветліваму старому няма як ісці далей.* К. Чорны. *Без качаргі на кухні як без рук.* У. Корбан.

**НЕЛЮДЗІМЫ,** ДЗІКАВАТЫ, ЗВЕРАВАТЫ, ВАЎКАВАТЫ.
*Мікіта – чалавек нелюдзімы, удзень яго бадай што і не спаткаеш на людзях..* Я. Колас. *Абодва яны былі гэтакія ж ваўкаватыя, як і дзядзька Мікодым.* Р. Сабаленка.

**НЕНАВІСНІК,** НЯДОБРАЗЫЧЛІВЕЦ, ЛІХАМЫСНІК.
*Сілы чорныя на свеце, ненавіснікі жывога, сотні катаў і кацюг ладзяць базы для знішчэння...* П. Броўка. *Прыяцелі Рыгора яе суцяшалі гэтак, як Загоны, а ліхамыснікі смяяліся, цешылІся, пацвільваліся.* Ц. Гартны.

**НЕНАЕДНЫ,** ПРАЖОРЛІВЫ; НЕНАЖЭРНЫ *(разм.);* ЖАРЛІВЫ *(абл.).*
*Ах ты, абжора ненаедны, сам з клапа, а бач колькі рыбы маёй з'еў!* А. Якімовіч. *Пражорлівую свінню век не накорміш.* Прыказка.

**НЕПАГАДЗЬ,** НЕПАГОДА, НЯГОДА; СЛАТА, ХЛЮПОТА, ХЛЮПА, ХЛІПАТА, МАКРЭДЗЬ *(разм.);* ЗАЛА *(абл.).*
*Сход шуміць, гамоніць, як лес у непагоду.* А. Асіпенка. *Восень ранняя, халодная – слата* С. Дзяргай. *Пойдуць дажджы, хліпата. Дабро загіне...* І. Навуменка.

**НЕПАКОІЦЦА,** ТРЫВОЖЫЦЦА, ТУРБАВАЦЦА, ХВАЛЯВАЦЦА. ПЕРАЖЫВАЦЬ, БЕДАВАЦЬ, НЕРВАВАЦЦА; БАЯЦЦА, ДРЫЖАЦЬ *(перан.).*
*У мяне тут ёсць нехта такі, каго мне вельмі цяжка пакінуць і аб кім вельмі непакоіцца маё сэрца.* Я. Колас. *Вядома, чалавек уцёк з лагера, хвалюецца за свой лёс.* Р. Няхай. *Дзякую, Аляксейка, а за сына не бядуйце: я за ім пагляджу.* Я Скрыган. *Яна так дрыжала над ім, так старалася ўсцерагчы яго.* Я. Колас.

**НЕПРАХОДНЫ,** НЕПРАЛАЗНЫ.
*Атрад спыніўся на стаянку ў густым непраходным лесе.* М. Лынькоў. *Лес непралазны, некрануты, якому, здавалася, і канца няма, прыгнятаў Андрэя.* П. Пестрак.

**НЕПРЫКМЕТНА,** НЕЗАЎВАЖНА, НЯЎЗНАКІ; НЕЎЗАМЕТКУ *(разм.);* НЯВІДНА, НЕЎШМАНКІ *(абл.);* НЯЎЛОЎНА *(перан.).*
*Так у гутарцы непрыкметна прайшла дарога.* А. Чарнышэвіч. *У размовах неяк незаўважна праходзіў час.* А. Кулакоўскі. *Вусны яе няўлоўна ўсміхаліся, а мора шыпела і білася ля ног.* У. Караткевіч.

**НЕПРЫТОМНАСЦЬ,** БЕСПРЫТОМНАСЦЬ, ЗАБЫЦЦЁ; БЯСПАМЯЦТВА, БЯСПАМЯЦЦЕ *(разм.).*
*Явіч зноў пакутаваў у гарачцы і непрытомнасці.* К. Чорны. *Ён маўчыць. Спіць ці ў бяспамяцтве?* К. Чорны.

**НЕРУХОМА;** НЯЗРУШНА, НЕЗВАРУШНА *(разм.)* НА МЕСЦЫ, НА АДНЫМ МЕСЦЫ, ЯК УКОПАНЫ.
*Сядзеў нерухома, як на шчырым маленні.* І. Чыгрынаў. *Чалавек застыў на месцы.* З. Бядуля. *Я стаў як укопаны.* Р. Сабаленка.

**НЕСПАДЗЯВАНА,** НЕСПАДЗЕЎНА, НЕЎСПАДЗЕЎКІ, НЕСПАДЗЕЎКУ, НЕЧАКАНА, РАПТАМ, РАПТОЎНА, СПАТАЙКА, СПАТАЙКОЎ; ЗНЯЧЭЎКУ, ЗНЯНАЦКУ, НЯГАДАНА *(разм.)* НІ СТУЛЬ НІ ССЮЛЬ, НІ З ТАГО НІ З СЯГО, НІ СЕЛА НІ ПАЛА, АДКУЛЬ НІ ВАЗЬМІСЯ, ЯК ГРОМ З ЯСНАГА НЕБА, НІБЫ З ГРОМУ, ЯК СНЕГ НА ГАЛАВУ, ЯК ПІЛІП З КАНАПЕЛЬ.

*Клава ўвайшла неспадзявана, без стуку.* К. Чорны. *Раптам бухнуў гарматны стрэл.* І. Шамякін. *Маўклівы сабака спатайка кусае.* Прыказка. *Гэта было знячэўку. Вінцэнты здрыгануўся.* К. Чорны. *Выскачыў як Піліп з канапель.* Прымаўка.

**НЕСПРАКТЫКАВАНЫ,** НЯВОПЫТНЫ; ЗЯЛЁНЫ, ЖАЎТАРОТЫ, ЖАЎТАДЗЮБЫ *(перан.).*

*У яго заўсёды хапала часу, каб прыйсці на дапамогу свайму яшчэ неспрактыкаванаму таварышу.* М. Машара. *Жаўтароты ты яшчэ, Сяргуша. Не ведаеш жыцця.* І. Навуменка.

**НЕЎЗАБАВЕ,** ХУТКА, СКОРА, ЗАРАЗ, БЛІЗКА; ВОСЬ-ВОСЬ, ВО-ВО, РАЗ-ДВА, ТУТ ЖА *(разм.);* СЕЙМІГА *(абл.)* У ХУТКІМ ЧАСЕ, У НЕДАЛЁКІМ ЧАСЕ, НЕ Ў ДАЛЁКІМ ЧАСЕ, БЛІЗКІМ ЧАСАМ, НЕ СЁННЯ-ЗАЎТРА, НЕ ЗА ГАРОЙ, НА ПАРОЗЕ, НА НОСЕ, НЕ АГЛЕДЗІШСЯ.

*Дык чаго сумаваць, дык журыцца чаго? Неўзабаве вярнуся дахаты.* П. Глебка. *Праўда, хутка выявілася, што зрабіць скрынку не такая лёгкая справа* А. Якімовіч. *Блізка ўжо халады.* А. Куляшоў. *У хуткім часе адкрыецца рэспубліканская выстаўка «Творчасць маладых».* «Звязда». *На парозе лета* . Ц. Гартны.

**НЕЎРАДЖАЙ,** НЕДАРОД, НЯЎРОД.

*У мужыка неўраджай, а тут яшчэ пану дай.* Прыказка. *У добрых хлебаробаў не бывае недародаў.* Прыказка.

**НЕЎРАДЛІВЫ,** НЯПЛОДНЫ, БЯСПЛОДНЫ; БЕДНЫ, ПУСТЫ *(перан.).*

*Зямля тут неўрадлівая, пясок, нічога расці не хоча.* К. Крапіва. *Зямля пустая, хоць і многа яе.* Я. Колас.

**НЕ ХАПАЦЬ,** НЕСТАВАЦЬ, БРАКАВАЦЬ.

*Раствору няма, цэглы не хапае!* А. Кулакоўскі. *Не дай божа, калі дзецям чаго-небудзь нестае.* У. Караткевіч. *Юрка дзень за днём гас, як тая куравая газоўка, якой бракуе газы.* Я. Колас.

**НЕХТА,** ХТОСЬЦІ, ХТОСЬ.

*Нехта прыйшоў у сені, наткнуўся на вядро, прабурчэў нешта і доўга намацваў засаўку.* Э. Самуйлёнак. *Ля самага выхаду хтосьці ўзяў яе за руку.* К. Чорны. *У вагон хтось зайшоў.* П. Галавач.

**НЕЦЯРПЛІВАСЦЬ,** НЯСТРЫМАНАСЦЬ; НЯСЦЕРП *(разм.).*

*Гэтак ён з нецярплівасцю прычакаў канца работы.* К. Чорны.

**НЕШЧАСЛІВЕЦ,** НЯЎДАЧНІК, НЯЎДАТНІК; БЯЗДОЛЬНІК, БЯДАК, БЕДАЛАГА, БЕДАЛАКА, НЕБАРАКА, ГАРОТНІК, МАРНІК *(разм.).*

*Ён нелюдзім – самотны, ссыльны нешчаслівец.* С. Дзяргай. *Тут былі адны бедалагі – зусім аслабелыя і дужа параненыя.* В. Быкаў. *Жыве кот, жыве сабака, жыве і гэты небарака.* Прымаўка.

**НЕШЧАСЛІВЫ,** НЯШЧАСНЫ, БЕДНЫ, ГОКІ, ГОРНЫ, ГАРОТНЫ, АБЯЗДОЛЕНЫ, БЕСПРАГЛЯДНЫ, ТРАГІЧНЫ· БЯДАЧЫ, ГАРЭТНЫ, ГАРАТЛІВЫ, ГАРАВІТЫ, ГАРАЦЕШНЫ, БЯЗДОЛЬНЫ, ЗНЯДОЛЕНЫ, НЯДОЛЬНЫ, БЕСПАТОЛЬНЫ *(разм.):* ЧОРНЫ, НЕСАЛОДКІ *(перан.).*

*Я аддаю сваю душу свайму няшчаснаму народу!* Я. Купала. *Ох, дачушка, хлеб твой горкі, горка твая доля!* Я. Колас. *Ад родных ніў, ад роднай хаты у панскі двор дзеля красы яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы.* М. Багдановіч. *Ды ці думалася пра нейкае там хараство, калі жытка была чорная.* А. Чарнышэвіч.

**НІТКА** /*тоўстая прасмоленая*. ДРАТВА.

*Тоўстую шэрую нітку шморгае кавалачкам воску, каб даўжэй быў нітачны век* М. Лынькоў. *Жонка дратву прадзе, вучань суча яе.* Я. Купала.

**НІШЧЫМНЫ**, ПОСНЫ (*разм.*).

*Душыўся нішчымнаю бульбаю і заціркаю, абы толькі выгадаць лішні рубель і прыхаваць яго.* Я. Колас. *І воды ім, бачыш, не тыя, і посныя нашы харчы...* М. Лужанін.

**НОЖ** /*маленькі, кішанёвы складаны:* СЦІЗОРЫК /*з тоўстым клінком, які носяць у похве:* ФІНКА /*складны:* СКЛАДАНЧЫК (*разм.*).

*Я нават адшукаў і лаўку тую, дзе выразаў сцізорыкам імя.* В. Вітка. *За поясам – фінка, мяшок на плячах.* П. Глебка. *Добра, што не згубіў складанчык – ёсць чым заняць рукі.* І. Навуменка.

**НОЗДРА**; ХРАПА (*разм.*).

*Гнеды навастрыў вушы, зафыркаў, прачышчаючы ноздры.* А. Якімовіч. *Дабыў з табакай рагавень і храпы напіхаў цяртухай, – бо не ўжываў я цэлы дзень!* «Тарас на Парнасе».

**НОС**; НЮХАЎКА (*разм.*); ТАБАКЕРКА (*перан.*).

*Нос яго быў заўсёды чырвоны, як бурак, і выдаваў яго шчырую дружбу з манапалькаю.* Я. Колас. *Уцякай, кажу, а то яшчэ і нюхаўку паб'ю!* Я. Колас.

**НЯВАЖНЫ**, ДРУГАРАДНЫ.

*Усё стала няважным, другарадным.* К. Чорны.

**НЯВОЛЬНІК**, РАБ, ПАЛОННІК, ЗАЛОЖНІК.

*Паглядзі, як сусед пачаў жыць, што нядаўна нявольнікам быў.* М. Чарот. *Тут Булякін здаў свайго палонніка дзяжурнаму салдату.* Я. Колас.

**НЯВОЛЯ**, ПАДНЯВОЛЛЕ, ПРЫГНЁТ, ПРЫГНЕЧАННЕ, ПРЫГНЕЧАНАСЦЬ, УЦІСК, ЦІСК, ПРЫГОН, РАБСТВА, ПАЛОН, КАБАЛА; ЯРМО, ЛАНЦУГ, КЛЕТКА, ПЯТЛЯ (*перан.*); КАЙДАНЫ, ПУТЫ, ВЯРЫГІ (*перан., мн.*).

*Дні няволі навучылі весці з ворагам змаганне.* М. Чарот. *Але прыгнёт, у якім жыве народ, кліча да змагання* П. Пестрак. *Адным цярпеннем і пакорай не скінеш ты з сябе ярма.* Я. Колас. *Шчасце ў путах...* Я. Купала.

**НЯГОДНІК**, ВЫЛЮДАК, АДЛЮДАК, ВЫРАДАК, ЛІХАДЗЕЙ; НЕДАВЯРАК, ПАРШЫВЕЦ, ПАСКУДНІК, ПАСКУДА, ПОСКУДЗЬ, БРЫДА, БРЫДОТА, ПАГАНЕЦ, ПАДЛА, ПАДЛЮГА, ПАДЛЮКА, ШЭЛЬМА, ГІЦАЛЬ, АКАЯНЕЦ, АБАРМОТ, ПЛЮГАВЕЦ, ПРАХВОСТ, ГАД, ГАДАСЦЬ, НЕЛЮДЗЬ, ЛАТРЫГА, ДЗЯРЖЫМОРДА, СВОЛАЧ, СВАЛАТА, ЗЛЫДЗЕНЬ, ЖЫВАГЛОТ, ПСЯЮХА, ПСЯЛЫЖНІК, ПАДКАЛОДНІК (*разм.*); ЗАРАЗА, ЦАЦА, ЗЛОДЗЕЙ, РАЗБОЙНІК, ПАЧВАРА, ХАЛЕРА, ЧОРТ, ЗВЕР, САБАКА, СУКА, ПСІНА, ГНІДА, ЗМЕЙ, СКУЛА, ДЭГЕНЕРАТ, АЗІЯТ, ЕЗУІТ (*перан.*) ЛЫСЫ, ЧОРТ, СУКІН СЫН.

*Хто той нягоднік, што пакінуў яе, адцураўшыся нават сына?* Я. Скрыган. *Забіць яго, вылюдка!* М. Лынькоў. *На каго ж ты руку паднімаеш, паршывец?* Я. Брыль. *Паганцы гэткія, рвуць нашыя яблыкі.* М. Чарот. *Дзе ж кат?.. Гэй, шэльма, вешай лоўка ..* Я. Купала. *Важна, каб ні адна сволач жывой не выйшла.* І. Навуменка. *Выгнаў жываглот з кватэры.* Р. Няхай. *Не заплаціў, халера.* К. Чорны. *Гэта проста езуіт, а не чалавек.* Прымаўка.

**НЯДАЎНА**, НЕ ТАК ДАЎНО: КАГАДЗЕ (*абл.*) ТОЛЬКІ ШТО, ТОЛЬКІ-ТОЛЬКІ.

*Нядаўна ён ажаніўся, я яшчэ не бачыў яго жонкі.* У. Караткевіч. *Я толькі што, не болей чвэрткі гадзіны, пакінула вас спаўшы...* Ц. Гартны.

**НЯДАЎНІ**, СВЕЖЫ.

*Сярод усёй масы рабочых мы тут знойдзем таксама масу тых жа самых нядаўніх сялян.* К. Чорны. *Але што газеты! Яны тады цікавыя, калі свежыя.* А. Чарнышэвіч.

**НЯЁМКА,** НЯЗРУЧНА, НЕСАМАВІТА; НІЯКАВАТА, НІЯКАВА *(разм.)* НЕ ПА САБЕ.
*Неяк нязручна гаварыць, калі не бачыш субяседніка.* А. Асіпенка. *Я паціскаю руку без асаблівай радасці Адчуваю сябе несамавіта* А. Асіпенка.

**НЯЗГОДА,** ПРАТЭСТ.
*Адменяць, калі большасць падпіша нязгоду, там прыслухаюцца да голасу большасці.* П. Галавач. *Выскрыпваў пратэз вайне пратэст, той, што жыццё надламала.* С. Шушкевіч.

**НЯМА,** НЕ ІСНУЕ ЧОРТ МАЕ.
*Рады ўсе, што сонца грэе, што няма больш халадоў.* Я. Колас. *Людзей зусім аднолькавых на свеце не існуе.* У. Юрэвіч. *Чалавек як чалавек, а галавы на плячах чорт мае...* А. Чарнышэвіч.

**НЯСЦЕРПНЫ,** НЯЗНОСНЫ, НЕВЫНОСНЫ, НЯСТРЫМНЫ, НЕСТРЫВАЛЫ; СТРАШНЫ *(перан.).*
*Але ж і спякота стаіць нясцерпная.* М. Лупсякоў. *Гарачыня стаіць нязносная.* Я. Купала. *Страшную людзі цярпелі зіму...* Я. Купала.

**НЯЎДАЧА,** ЗРЫЎ; ПШЫК *(разм.);* ФІЯСКА *(кніжн.);*ПРАВАЛ.КРАХ, ПРОЙГРЫШ, АСЕЧКА *(перан.).*
*Хто хоча звязаць свой лёс з літаратурай – няхай не адчайваецца ад першых няўдач.* Я. Скрыган. *Каб у рабоце зрываў не было, не супакойвайся на дасягненні.* У. Корбан. *Як жа мне было горка крах надзей тых спазнаць.* А. Бачыла.

**НЯЎМЕКА,** НЯЎДАКА, ПАРТАЧ *(разм.);* РАМЕСНІК *(перан зняваж.).*
*У няўмекі рукі калекі.* Прыказка. *– Партачы! – крычаў Халуста. – Не ўмееце!* А. Чарнышэвіч.

**НЯЎПЭЎНЕНЫ,** НЯПЭЎНЫ; НЯЦВЕРДЫ *(перан.).*
*Яму было сорамна глядзець на Лёдзю – ссутуленую, няўпэўненую ў рухах.* У. Карпаў. *Засунуўшы ў кішэнь сваю здабычу, выходзіць Шпунт няцвёрдаю хадой.* А. Зарыцкі.

# П

**ПАВАГА,** ПАШАНА, ГОНАР, ЧЭСЦЬ, АЎТАРЫТЭТ, РЭПУТАЦЫЯ; ПАШАНОТА, ПАШАНОЎЛЯ *(разм.).*
*У нашай краіне павага старым, няхай адпачнуць у хаце.* П. Панчанка. *Якая заслуга, такая і пашана.* Прыказка. *Вы – людзі мясцовыя, вас усе ведаюць, у вас аўтарытэт* А. Кулакоўскі.

**ПАВЕДАМІЦЬ,** ПЕРАДАЦЬ, ДАНЕСЦІ, НАКАЗАЦЬ, АБ'ЯВІЦЬ, АПАВЯСЦІЦЬ, ІНФАРМАВАЦЬ, АПУБЛІКАВАЦЬ, АДРАПАРТАВАЦЬ /*у пісьмовай форме:* НАПІСАЦЬ; ПАДКАЗАЦЬ, ПАДЦЮКНУЦЬ *(разм.);* РАЗЗВАНІЦЬ *(перан.)* ДАВЕСЦІ ДА ВЕДАМА, ДАЦЬ ВЕДАЦЬ, ДАЦЬ ЗНАЦЬ, ПАДАЦЬ ЗНАЦЬ, УВЕСЦІ Ў ВУШЫ, ДАЦЬ ВЕСТКУ, ДАЦЬ СІГНАЛ.
*Мы просім вас даведацца аб прычынах арышту і паведаміць іх нам.* П. Галавач. *Чаму Часовы ўрад не апублікуе тайных царскіх дагавораў?* І. Гурскі. *Ты як-небудзь заўтра ці паслязаўтра дай мне ведаць, як табе.* К. Чорны. *Заварушыцца трывога – Броніcь дасць сігнал.* С. Баранавых.

**ПАВЕСТКА,** ПОЗВА.
*Ты ішла ваяваць, хоць ніхто не прыносіў павесткі...* Е. Лось. *Ён кінуўся дадому – ці не было ўжо там позвы з райваенкамата.* У. Шахавец.

**ПАВОДКА,** ПАВАДЗЬ, РАЗВОДДЗЕ.
*Вуліца праходзіла такою лагчынаю, што вясной у час паводкі рабілася як рака.* А. Чарнышэвіч. *Бедная, ходзіць і ў мароз і ў разводдзе блізкі свет.* М. Лобан.

**ПАВОЗКА,** ВОЗ, ПАДВОДА, ФУРМАНКА, КАЛЁСЫ, ДРАБІНЫ, ПАРАКОНКА; ДРЫНДА, КАЛЫМАГА *(разм.);* КАЛЯСНІЦА *(уст.)* /*для перавозкі людзей:* КАЛЯСКА, ПРАЛЁТКА, БРЫЧКА, КАЛАМАЖКА, ДВУКОЛКА, КАРЭТА. ЭКІПАЖ, ДЫЛІЖАНС, КАБРЫЯЛЕТ, ФАЭ-

ТОН, ЛАНДО, ШАРАБАН, РЫДВАН, ДРОЖКІ, ТАРАТАЙКА *(разм.)*; ЛІНЕЙКА *(уст.)* /*для перавозкі грузаў*: ФУРГОН, АРБА, МАЖАРА, КАРЫ, МАРЫ; ФУРА *(уст.)*.

*На вазах крычаць куры ў клетках, верашчаць парасяты.* З. Бядуля. *Дзе праязджаюць сялянскія фурманні, вясковы пах запаўняе вуліцу.* З. Бядуля. *Трухкоча брычка па дарозе...* Я. Купала. *Скажыце, дыліжанс па смаленскай лініі рушыў ужо?* У. Караткевіч. *Параконны фургон з усёй сялянскай сям'ёю: нядзеля, едуць у касцёл.* Я. Брыль.

**ПАВОЛЬНА,** ПАВОЛІ, СПАВОЛЬНА, НЯСКОРА, НЯСПЕШНА, НЕПАСПЕШЛІВА, НЕ СПЯШАЮЧЫСЯ, НЯШПАРКА, НЕТАРОПКА, ПАМАЛУ, ЦІХА, ПАЦІХУ, ЦІШКОМ, МАРУДНА, ЛЯНІВА; СПАКВАЛЯ *(разм.)* АБЫ-АБЫ, ЦІХІМ ХОДАМ, НАГА ЗА НАГУ, ЯК НЕ СВАІМІ НАГАМІ, ЯК НА СМЕРЦЬ, НА ВАЛАХ, АБЫ ДЗЕНЬ ДА ВЕЧАРА.

*Разведчыкі ішлі павольна, стараючыся не спускаць з вачэй адзін аднаго.* Я. Колас. *Не спяшаючыся, шукаў сярод кучы адзежы сваё паліто..* Б. Мікуліч. *Толькі час ідзе марудна, хоць ты стрэлкі падгані.* А. Астрэйка. *Пляцецца нага за нагу.* Прымаўка. *Працаваў, – хоць падгані, абы дзень да вечара.* С. Дзяргай.

**ПАВУЧАЦЬ,** ВУЧЫЦЬ ., ЧЫТАЦЬ МАРАЛЬ, ЧЫТАЦЬ НАТАЦЫЮ.

*Каторы ўжо раз настаўніца павучае: – Ты толькі не хвалюйся.* Х. Жычка. *Я паклікаў цябе не для таго, каб ты мне натацыі чытала.* М. Пянкрат.

**ПАВЯЛІЧЫЦЬ,** ПАБОЛЬШЫЦЬ, ПАДВЫСІЦЬ, ПАДБОЛЬШЫЦЬ, ПАДВОІЦЬ, ПАТРОІЦЬ... *(перан.)*.

*Аднак ты павялічыў плату за дзень выбіральшчыцам бульбы...* А. Чарнышэвіч. *Марыць Дарота пабольшыць удой...* П. Броўка.

**ПАГАНЯЦЬ,** ГНАЦЬ; НОКАЦЬ, НУКАЦЬ, ПАНУКАЦЬ, ПАНУКВАЦЬ, ТУРЫЦЬ *(разм.)*.

*Каб паганялі каня, то прыехалі б яшчэ хутчэй* Ц. Гартны. *На карк табе сеў, панукае і гоніць у пекла, у вір* Я. Колас.

**ПАДАБАЦЦА,** ІМПАНАВАЦЬ БЫЦЬ ПА ДУШЫ, БЫЦЬ ПА СЭРЦЫ, БЫЦЬ ДА ГУСТУ, БЫЦЬ ПА ГУСТУ, БЫЦЬ ПАД ГУСТ.

*Але і мая праца мне таксама падабаецца, асабліва на машынах.* Я. Маўр. *Ёй па сэрцы я быў, як яна для мяне.* Я. Купала.

**ПАДАБЕНСТВА,** ПАДОБНАСЦЬ; ПАРАЛЕЛЬ, ПАРАЛЕЛІЗМ, АСАЦЫЯЦЫЯ *(перан.)*.

*Абедзвюх іх і чалавека ў ватніку звязвала падобнасць сваяцтва...* М. Лужанін. *Пачалося з агіднага здарэння, якому нават паралель цяжкавата было знайсці за апошнія пяцьдзесят год* У. Караткевіч.

**ПАДАРОЖЖА,** ДАРОГА, ВАНДРОЎКА, ВАНДРАВАННЕ, ВАНДРОЎНІЦТВА, ПАЛОМНІЦТВА, ПАЕЗДКА, ПЛАВАННЕ, РЭЙС.

*Вельмі люблю падарожжа. Ездзіць, лятаць, хадзіць пехатою.* Я. Брыль. *Хто вандровак не прагне, пабачыць зямлі не ахвоч?* А. Куляшоў. *Многа свету пабачыў паэт у час плаванняў..* М. Хведаровіч.

**ПАДАРОЖНІК,** ПАДАРОЖНЫ, ВАНДРОЎНІК, ВАНДРОВЕЦ, ВАНДРОЎЦА, ТУРЫСТ /*падарожнічае па «святых» мясцінах*: ПАЛОМНІК, ПІЛІГРЫМ.

*– Хто там? – пытае нехта з хаты. – Падарожны.* Я. Колас. *Снуюць турысты з фотаапаратамі.* С. Александровіч. *Няхай паслужыць мне здароўе, як пілігрыму кій дарожны...* С. Гаўрусёў.

**ПАДАРУНАК,** ДАРУНАК, ДАР, ГАСЦІНЕЦ; ПРЭЗЕНТ *(разм. уст.)*; ДАНІНА, ПАМЯЦЬ *(перан.)*.

*Я ўжо нагледзеў табе падарунак, куплю тады, калі прыедзеш.* К. Чорны. *І гасцінца мне прышлеш, не забудзеш маткі.* Я. Колас. *Дзялілі людзі каравай – даніну шчырых ніў.* А. Куляшоў.

**ПАДАТАК**, ПАСТАЎКА, ПОШЛІНА; ПАБОРЫ *(мн.)* /*не заплачаны своечасова:* НЯДОІМКА ДАНІНА, АБРОК, РАЗВЁРСТКА *(гіст.)*.
*Ссыпны пункт, дзе сяляне здавалі падатак, быў за горадам, пры чыгуначнай станцыі* К. Чорны. *Хлеба па развёрстцы не здалі, усю худобу ў лес сагналі*. М. Лобан.

**ПАДАЦЬ**, АПАДАЦЬ, СПАДАЦЬ, ВАЛІЦЦА /*у вялікай колькасці:* ВАЛІЦЬ, СЫПАЦЦА, АСЫПАЦЦА / *пра нешта дробнае.* ЦЕРУСІЦЬ, ЦЕРУШЫЦЬ, ЦЕРУШЫЦЦА; ЛЯЦЕЦЬ, ЗЛЯТАЦЬ *(перан.)*.
*Калі падаць, то з добрага каня.* Прыказка. *І валіў жа белы снег!* Я. Колас. *Снег ціха сыплецца на лес.* Я. Брыль. *Пачынаў церусіць дробны дождж*ык. Ц. Гартны.

**ПАДБАДЗЁРВАЦЬ**, БАДЗЁРЫЦЬ, НАТХНЯЦЬ: ПАДВЯСЕЛЬВАЦЬ *(разм.)* ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ДУХ, ПАДЫМАЦЬ ДУХ, ПАДДАВАЦЬ АХВОТЫ, ПАДДАВАЦЬ ДУХУ.
*Працавалася ахвотна: падбадзёрвалі здаровая раніца і вясёлыя думкі.* А. Чарнышэвіч. *Такія гутаркі падымалі дух у баязлівых.* Я. Колас. *Мужчыны доўга гаварылі і паддавалі адзін другому ахвоты.* Я. Колас.

**ПАДВОЙНЫ**, ДВАЙНЫ, ДУБАЛЬТОВЫ.
*У іх [куфэрках] падвойнае дно, і там схаваны пракламацыі.* К. Чорны. *Маці ставіла на зіму дубальтовыя рамы.* Я. Хвалей.

**ПАДГАВОРВАЦЬ**, ПАДМАЎЛЯЦЬ, ПАДВУЧВАЦЬ, ПАДВУЧАЦЬ, ЗВОДЗІЦЬ; ПАДБУХТОРВАЦЬ, БУХТОРЫЦЬ, ПАДБІВАЦЬ, ПАД'ЮДЖВАЦЬ, БАЛАМУЦІЦЬ *(разм.)*; ЦКАВАЦЬ, НАЦКОЎВАЦЬ. ПАДАГРАВАЦЬ *(перан.)* ПАДЛІВАЦЬ МАСЛА Ў АГОНЬ, ПАДСЫПАЦЬ ЖАРУ.
*Пасля ён пачаў падгаворваць парабкаў запатрабаваць, каб пан падбольшыў ардынарыі.* К. Чорны. *Ён усіх падбухторвае кідаць работу.* Х. Шынклер. *А рэплікі сыплюцца з месц і жару ўсё больш падсыпаюць.* Я. Колас.

**ПАДДАЦЦА**, ЗДАЦЦА, ПАДАЦЦА, ПАПУСЦІЦЦА, САСТУПІЦЬ, ПАСЦІ, КАПІТУЛЯВАЦЬ, СКАРЫЦЦА *(разм.)*; СХІЛІЦЦА, АБЛАМАЦЦА, СПАСАВАЦЬ *(перан.)* СКЛАСЦІ ЗБРОЮ, СХІЛІЦЬ ГАЛАВУ, ЗДАЦЬ ПАЗІЦЫІ.
*Не можам мы паддацца Нямеччыне, бо мы тады эканамічна загінем...* М. Зарэцкі. *Там вольніца Хмяльніцкага Багдана прад панам не схіліла галавы.* Р. Няхай.

**ПАДЗЯМЕЛЛЕ**, СУТАРЭННЕ, ЛЁХ.
*Чыя кірка ў падзямеллі першай пласт вугля цярэбіць?..* Я. Купала. *Калі вы любіце моцныя ўражанні, спусціцеся ў сутарэнне.* К. Крапіва. *А пад палацам лёх глыбокі – на страх нявольнікам-рабам.* М. Машара.

**ПАДЛЕТАК**; ПАДШПАРАК, ПАДШЫВАЛЕЦ, ПАДШЫВАНЕЦ *(разм.)*.
*Падлетка не пашлеш у мястэчка, бо там яго кругом ашукаюць: і налічаць больш чым трэба, і на вазе скруцяць...* А. Чарнышэвіч. *Другому падшыванцу Трахім і сапраўды накруціў бы вушы...* К. Крапіва.

**ПАДЛОГА**, ПАРКЕТ.
*Пайшлі ў царкву маліцца богу, таўкуцца лбамі аб падлогу.* К. Крапіва. *Болей за ўсіх пацяшаліся дзеці: коўзаліся па бліскучым паркеце.* П. Панчанка.

**ПАДМУРАК**, ПАДМУРА, ФУНДАМЕНТ.
*Тады ж і пачалі закладку падмуркаў для новых заводскіх цэхаў.* П. Галавач. *Будынак трашчыць, колецца і рухае пад ім няўстойны фундамент.* Ц. Гартны.

**ПАДНОС**; ТАЦА *(уст.)*.
*На шырокім фанерным падносе няня Луша разносіла хлеб.* М. Лобан. *На тацы – булачка, сыр з маслам, каўбаса і хлеб.* З. Бядуля.

**ПАДНЯВОЛЬНЫ**, НЯВОЛЬНЫ, ПАД'ЯРЭМНЫ, ЯРЭМНЫ.
*Гэты гром разбудзіў усіх нявольных людзей, асвяціў бліскавіцай іх шлях...* М. Чарот. *Чырвоная зорка – маяк пад'ярэмных...* П. Броўка.

**ПАДРАБЯЗНАСЦЬ,** ДЭТАЛЬ, ДРАБНІЦА *(перан.).*

*Ва ўсякім разе, Якаў наважыў уведаць ад Паўла ўсе падрабязнасці сённяшняй яго сустрэчы з Эльзай.* А. Чарнышэвіч. *Андрэй ішоў упэўнена, успамінаючы ўсе дэталі нядаўняй разведкі* А. Кулакоўскі.

**ПАДРЫЎНІК,** ДЫВЕРСАНТ.

*Звычайна падрыўнікі выходзілі на чыгунку невялічкімі групамі, чалавек пяць-шэсць.* А. Кулакоўскі. *Злавілі двух дыверсантаў, якія прабіраліся да моста са скрынкай толу.* М. Лынькоў.

**ПАДХАЛІМ;** ПАДЛІЗА, ПАДЛІЗНІК, УГОДНІК *(разм.);* ПАДПЯВАЛА *(перан.).*

*Хамаў, падхалімаў і падліз мы выведзем на чыстую ваду...* П. Панчанка. *Нямецкія падлізнікі возяць не толькі бургамістру.* І. Навуменка.

**ПАЖАРЫШЧА,** ПАПЯЛІШЧА.

*Дым з пажарышча слаўся нізка над зямлёю – датлявалі мужычыя хаты.* К. Чорны. *У 1944 годзе людзі вярнуліся сюды на папялішча.* К. Крапіва.

**ПАЗЫКА,** КРЭДЫТ; ПАЗЫЧКА *(разм.).*

*Пазыкі завялі ў лыкі.* Прыказка. *Калгасам і калгаснікам дзяржава адпусціла вялікія грашовыя крэдыты, шмат будаўнічых матэрыялаў.* Т. Хадкевіч.

**ПАКОЙ,** ХАТА /*у службовым памяшканні:* КАБІНЕТ /*у бальніцы, доме адпачынку, санаторыі:* ПАЛАТА /*у манастыры:* КЕЛЛЯ /*бакавы* БАКОЎКА, БАКАВІЦА *(разм.)* / *у турме для аднаго вязня:* АДЗІНОЧКА *(разм.);* СВЯТЛІЦА, СВЯЦЁЛКА *(уст.).*

*Кватэра наша складалася з аднаго нізкага пакоя, цёмнага і сырога, як склеп.* А. Александровіч. *Бушмар адчыніў дзверы ў чыстую хату.* К. Чорны. *Свяцёлка ветлая на тры акенцы...* А. Зарыцкі.

**ПАКУТА,** МУКА; КРЫЖ *(перан.).*

*Ей страшна бачыць смерць, страшна бачыць людскія пакуты.* М. Лынькоў *Без мукі няма навукі.* Прыказка. *Толькі ж выпаў не па сіле крыж табе, дзяўчына ..* Я. Колас.

**ПАЛАВІНА,** ПАЛОВА.

*Была ў сяле хата на дзве палавіны. .* Я. Колас. *Шафа падзяляла дзедаў пакой на дзве паловы.* З. Бядуля.

**ПАЛАЦ;** ХОРАМ, ХАРОМ *(уст.).*

*Вось гуляе багач, аж палац той дрыжыць...* Я. Купала. *Хорам выстраіў ты, твайму веку так міл, адшліфованы цэгла і камень ...* Я. Купала.

**ПАЛЕЦ** /*малы:* МЕЗЕНЕЦ; ПЕРСТ *(уст.).*

*І пальцы на руцэ няроўныя.* Прыказка. *А фашыст адрэзаў мезенец, садраў пярсцёнак, а палец кінуў у траву.* Р. Сабаленка. *Як тыкаў важна перст у карту!* Я. Колас.

**ПАЛЁГКА,** УСТУПКА, ПАБЛАЖКА, ІЛЬГОТА, ПРЫВІЛЕЯ; ПАТАЧКА, ПАПУСКА, СКІДКА *(разм.).*

*Што ні кажы, не ўсё плаціць адразу, якая ні ёсць, а палёгка.* І. Мележ. *А ці магу я рабіць патачку гэтай чалавечай слабасці?* Я. Скрыган.

**ПАЛІВА,** АПАЛ.

*Паехаў ён аднойчы назбіраць галля на паліва.* А. Пальчэўскі. *Летам – багацце травы на лясных лядах, зімой пра апал можна не думаць. Выходзь з двара, валі сухастоіну, валачы ў печ.* І. Навуменка.

**ПАЛІТО** /*шырокае жаночае, звычайна футравае:* МАНТО; ДЭМІСЕЗОН *(разм.).*

*Нашто яму паліто, калі яму і ў шынялі добра?* Я. Колас. *Дашывай, мая іголачка, навамоднае манто.* А. Александровіч.

**ПАЛІЦА,** СТЭЛАЖ.

*Кніга ў кнігарні ўжо сядзіць на паліцы.* Я. Купала. *Янка хадзіў між стэлажоў, часам браў якую-небудзь кнігу і падоўгу разглядаў яе.* А. Асіпенка.

**ПАЛОННЫ;** ЯЗЫК *(разм. перан.).*

*Явіч быў у змове: палонныя рыхтаваліся ўцякаць.* К. Чорны. *Па-*

*чынала ўжо днець. калі Палазок з захопленым «языком» і дзяўчынай вярнуўся ў сваё падраздзяленне.* Я. Колас.

**ПАЛОХАЦЬ,** СТРАШЫЦЬ. ПУЖАЦЬ, СПУДЖВАЦЬ, ПАГРАЖАЦЬ, ГРАЗІЦЬ, ГРАЗІЦЦА; ПАСТРАШАЦЬ, АДСТРАШВАЦЬ *(разм.)* НАВОДЗІЦЬ СТРАХ, НАВОДЗІЦЬ СПОЛАХ, НАВОДЗІЦЬ ЖУДАСЦЬ, НАВОДЗІЦЬ ЖАХ, НАВОДЗІЦЬ ПАНІКУ, НАГАНЯЦЬ СТРАХ, КІДАЦЬ У ЖАХ, НАГАНЯЦЬ ЖАХ, ПАДДАВАЦЬ ПУДУ, РАЗМАХВАЦЬ РУКАМІ.

*Пакой палохаў пустэчай і маўклівасцю.* П. Галавач. *Ваўка страшыць, а сам у кусты хаваецца.* Прыказка. *Ну, не пужай, не дужа такіх баімся.* П. Галавач. *Ты вельмі не размахвай рукамі: языком шалахчы, а рукам не давай волі.* С. Баранавых.

**ПАЛЯВАННЕ;** ЛОВЫ *(уст.).*

*Паляванне на баброў забаронена.* В. Вольскі. *Князь забіў на ловах пару вялікіх прыгожых ласёў.* М. Гарэцкі.

**ПАЛЯПШАЦЬ,** ПРАВІЦЬ, ПАПРАЎЛЯЦЬ, ВЫПРАЎЛЯЦЬ, УДАСКАНАЛЬВАЦЬ, РАЦЫЯНАЛІЗАВАЦЬ; ШЛІФАВАЦЬ *(перан.).*

*Але час ужо наступіў, каб рашуча ўзяцца паляпшаць лугі.* Б. Сачанка. *Зразумела, талент можна ўдасканальваць.* Р. Шкраба. *Час робіць сваё, час шліфуе ўсё, шліфуе і думку чалавека.* Х. Шынклер.

**ПАЛЯЎНІЧЫ** (*ловіць звяроў) ці птушак*· ЗВЕРАЛОЎ, ПТУШКАЛОЎ; ПАЛЯЎНІК (*разм.); ЛАВЕЦ (уст.).*

*З іх Ісаў быў звераловам, гэта значыць – паляўнічы. .* К. Крапіва.

*У маладосці ён быў заўзятым птушкаловам.* А. Якімовіч. *Наскочыў звер на лаўца.* Прымаўка.

**ПАМАГЧЫ,** ПАДТРЫМАЦЬ; ПАДМАГЧЫ, ПАДСАБІЦЬ, ПАДСОБІЦЬ, ПАСОБІЦЬ *(разм.)* ПАДАЦЬ РУКУ, ПАДАЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ, ПАЙСЦІ НАСУСТРАЧ, УЗЯЦЬ НА БУКСІР.

*Не дзівіся, панок, як жыву. – мне ніхто не памог будаваць* Ф. Багушэвіч. – *Дай падсоблю – Сама данясу.* М. Лобан. *Твае сыны ў журботны час трывогі братэрскую руку мне падалі ..* Р. Няхай.

**ПАМЕР,** РАЗМЕР, РОСТ, МАШТАБ, МАШТАБНАСЦЬ, ГАБАРЫТ /*дыяметр рулі, ствала.* КАЛІБР.

*Стол сваім памерам не даваў месца для пяці крэсел, каб і былі яны ў пакоі.* Ц. Гартны. *У нашых меншы калібр, куля меншая.* У. Дамашэвіч.

**ПАМЕРЦІ,** СКАНАЦЬ, ЗГІНУЦЬ; ЗАГНУЦЦА, ЗАЙСЦІСЯ, АКАЛЕЦЬ, АПРУЦЯНЕЦЬ, СПРУЦЯНЕЦЬ, ВЫПРУЦІЦЦА, АПРЭГЧЫСЯ, СКАПЫЦІЦЦА, ЗДЫРДЗІЦЦА *(разм.):* ЛЕГЧЫ, ЗЛЕГЧЫ, ПАЛЕГЧЫ, ДАЙСЦІ, ДАЦЦА *(перан.);* ПАСЦІ, ЗАСНУЦЬ, СПАЧЫЦЬ, АДЫСЦІ *(перан. выс.);* ЗДОХНУЦЬ, ПАДОХНУЦЬ *(перан. зняваж.)* НЕ СТАЦЬ, РАССТАЦЦА СА СВЕТАМ, ПАКІНУЦЬ ГЭТЫ СВЕТ, ПАЙСЦІ НА ТОЙ СВЕТ, ПАДАЦЦА НА ТОЙ СВЕТ, ПРЫНЯЦЬ СМЕРЦЬ, АДДАЦЬ ЖЫЦЦЁ, РАЗВІТАЦЦА З ЖЫЦЦЁМ, ПАПЛАЦІЦЦА ЖЫЦЦЁМ, ЗАПЛАЦІЦЬ ЖЫЦЦЁМ, РАЗЛУЧЫЦЦА З ДУШОЙ, АДДАЦЬ БОГУ ДУШУ, ЗАГАВЕЦЬ ДУШОЙ, НЕ УКАЗАЦЬ ДУХУ, СПУСЦІЦЬ ДУХ, АДДАЦЬ ГАЛАВУ, ПАЛАЖЫЦЬ ГАЛАВУ, ПАКЛАСЦІ ГАЛАВУ, ЗЛАЖЫЦЬ ГАЛАВУ, СКЛАСЦІ ГАЛАВУ, НАЛАЖЫЦЬ ГАЛАВОЙ, НАВЯРНУЦЬ ГАЛАВОЙ, ЗВЯРНУЦЬ ГАЛАВУ, СКРУЦІЦЬ ГАЛАВУ, ЗЛАМАЦЬ ГАЛАВУ, СТРАЦІЦЬ ГАЛАВУ, НЕ ЗНАСІЦЬ ГАЛАВЫ, НЕ ВЫНЕСЦІ ГАЛАВЫ, АДКАЗАЦЬ ГАЛАВОЙ, ЗГАРНУЦЬ РУКІ, САШЧАПІЦЬ РУКІ, НАЛАЖЫЦЬ НА СЯБЕ РУКІ, ВЫЦЯГНУЦЬ НОГІ, ПРАЦЯГНУЦЬ НОГІ, СЫСЦІ НА ВЕЧНЫ СПАКОЙ, СЫСЦІ Ў ЗЯМЛЮ, ЛЕГЧЫ МЕРТВЫМ, ЛЕГЧЫ Ў ЗЯМЛЮ, ЛЕГЧЫ Ў ЗЯМЛІ, ЛЕГЧЫ Ў ТРУНУ, ЛЕГЧЫ Ў ДАМАВІНУ, ЛЕГЧЫ ТРУПАМ, ЛЕГЧЫ КАСЦЬМІ, ПАЛЕГЧЫ КАСЦЬМІ,

ПАЙСЦІ Ў МАГІЛУ, УЗЯЦЬ ШЛЮБ З ЗЯМЛЕЙ, СЫСЦІ З ЗЯМЛІ, ЗАРУЧЫЦЦА З БОГАМ, ДАЦЬ ДУБА, ПАЕХАЦЬ ДА АБРАМА НА ПІВА.
*Памёр паэт, а песня будзе жыць.* С. Грахоўскі. *Сканаў ціха, заснуўшы на печы* В. Вітка. *Хутчэй яны выпруцяцца, чым нас на калені паставяць.* М. Лынькоў. *Аж бацьку гора з ног зваліла, – пайшоў на той свет без пары.* Я. Купала. *Скора едзеш – галаву звернеш.* Прыказка. *На дочак матка батрачка, пакуль рукі сашчэпіць.* Прыказка. *Па вашай помашчы даўно б ногі працягнуў.* І. Шамякін. *Шмат фашыстаў лягло трупамі.* К. Крапіва. *Няхай яму калом зямля будзе, калі ён ужо дуба даў.* К. Чорны.

**ПАМЕШЧЫК,** АБШАРНІК, ПАН.
*Лепшай зямлёй валодалі памешчыкі і кулакі.* Т. Хадкевіч. *Цара скінулі, а князі ды абшарнікі засталіся.* П. Галавач.

**ПАМОЧНІК,** ПАМАГАТЫ, ПАДРУЧНЫ; ПАМАГАЧ, ПАМАГАТАР, ПАДСОБНІК *(разм.)* ПРАВАЯ РУКА.
*Патрэбен быў памочнік, шчыры і пісьменны чалавек, каб яму можна было даверыць любую справу.* А. Чарнышэвіч. *На гатовае памагачы будуць.* Прыказка.

**ПАМЫЛІЦЦА,** АШУКАЦЦА, ПРАГАДАЦЬ, ПРАЛІЧЫЦЦА; СХІБІЦЬ, УКЛЯПАЦЦА, ЗДУРАВАЦЬ *(разм.)*; СПАТЫКНУЦЦА, СКАПЫЦІЦЦА, ПАКАЎЗНУЦЦА, ЗБІЦЦА *(перан.)* ДАЦЬ МАХУ.
*Умеў памыліцца, умей і паправіцца.* Прыказка. *А я падумаў, што тады не ашукаўся: два мяхі былі лішнія на машыне.* А. Асіпенка. *Эх, як здуравала яна, што прадала хатку!* Я. Колас. *Скапыціўся трошкі – прыпарка: а як жа? Звычайная рэч.* А. Бялевіч.

**ПАМЯТНЫ,** ПОМНЫ, НЕЗАБЫЎНЫ; НЕЎМІРУЧЫ *(перан.)*.
*Асабліва памятнымі засталіся сустрэчы з чыгуначнікамі Тбіліскага дэпо.* М. Хведаровіч. *Ды ніколі ў бойцы не кідала песня неўміручага Купалы.* П: Броўка.

**ПАПАДДЗЯ,** МАТУШКА *(разм.)*
*Сама пападдзя з папом потым зайшлі ў хату к беднаму на памінкі.* Казка. *Матушка Агрыпіна паставіла на стол страву і пачала яго [бацюшку] клікаць.* М. Чарот.

**ПАПРАКАЦЬ,** ДАКАРАЦЬ, УПІКАЦЬ, ПАПІКАЦЬ ПАРОЦЬ У ВОЧЫ.
*Папракалі сына хлебам пры абедзе за сталом.* Я. Колас. *Яна ў думках пачала сябе дакараць, што дагэтуль не расказала Ларывончыку пра тую сустрэчу.* Р. Сабаленка. *Часамі драматурга ўпікаюць у тым, што ў цэнтры яго сатырычнай камедыі стаіць адмоўны персанаж.* К. Крапіва.

**ПАПЯРОСА,** ЦЫГАРКА; САМАКРУТКА *(разм.)*; СУСЛА *(перан.)*.
*Папяросы бацька круціць тоненькія – махоркі ў кааператыве вобмаль...* К. Чорны. *Цыгаркі скруцім, пусцім дым і аб мінулым пагамонім.* А. Астрэйка. *Ён бязлітасна пацягваў самакрутку.* П. Пестрак.

**ПАРАДА,** РАДА, ПАВУЧАННЕ, НАКАЗ, УКАЗАННЕ, НАСТАЎЛЕННЕ, КАНСУЛЬТАЦЫЯ, ІНСТРУКЦЫЯ; ДАРАДА *(разм.)*; ЛЕКЦЫЯ, РЭЦЭПТ *(перан.)*
*Падзякавалі мы тады ў думках партызанам, што далі нам параду ў лес перабірацца.* Я. Колас. *Ён прынясе літаратуру і ўказанні аб далейшай рабоце.* А. Чарнышэвіч. *Я не чытаў інструкцыі, як нам паводзіць сябе, трапіўшы ў такія абставіны.* М. Лынькоў.

**ПАРАЖЭННЕ,** РАЗГРОМ.
*Трэба думаць, што гітлераўскі штаб захоча ўзяць рэванш за сваё зімовае паражэнне пад Масквой.* І. Шамякін. *Ворагі ўцякаюць з нашай зямлі. Яны ўжо асуджаны на разгром.* М. Лынькоў.

**ПАРАЎНАЛЬНА,** ПАРАЎНАЎЧА, АДНОСНА.
*Далей усё ідзе параўнальна гладка, пакуль не застопарыць.* М. Ракітны. *Адносна позна ўзнікла адзен-*

*не, якое падкрэслівала полаўзроставую розніцу, сямейнае становішча ..* БелЭн.

**ПАРАФІЯ,** ПРЫХОД.

*А хто яшчэ хоча маліцца, дык няхай едзе ў суседнюю парафію.* М. Чарот. *Усе іншыя прыходы маюць папоў, а чаму іхні не мае?* Я. Колас.

**ПАРОДА**; ЗАВОД *(разм.)*

*Чырвоная парода кароў прыстасавалася да ўмоў Беларусі і дае вельмі тлустае малако.* П. Пестрак. *Сапраўды, конь у іх быў добры: гладкі, малады, не простага заводу.* Р. Сабаленка.

**ПАРТАБАК,** ПАРТСІГАР, ТАБАКЕРКА; ПАРТАБАЧНІЦА, ТАБАЧНІЦА *(разм.).*

*Дастаў партабак і ў тоўстых пальцах згарнуў тонкую, як запалка, цыгарку, прыпаліў яе і зацягнуўся.* А. Чарнышэвіч. *Бо ты ж надта цёмны, браце, як тытун у табакерцы..* Я. Купала.

**ПАРТЫЗАН,** НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ, ЛЯСНЫ САЛДАТ.

*Не пройдзе вораг там, дзе партызан!* У. Дубоўка. *Перамогам Чырвонай Арміі дапамагалі загартаваныя ў баях атрады народных мсціўцаў.* Я. Колас.

**ПАСАГ,** ПРЫДАНАЕ.

*Адна дачушка – пасаг не абы-які трэба!* А. Рылько. *Не з прыданым жыць, а з чалавекам.* Прыказка.

**ПАСАЖЫР** /*без білета:* БЕЗБІЛЕТНІК, ЗАЯЦ *(разм.).*

*У напоўнены вагон шугнула новая грамада пасажыраў.* Ц. Гартны. *Зайцоў ловяць кантралёры і штрафуюць...* Б. Сачанка.

**ПАСВАРЫЦЦА;** СЧАПІЦЦА *(разм.)* НЕ ПАЛАДЗІЦЬ.

*Пасварыліся за мех, а ў мяху смех.* Прыказка. *– А чаго гэта Ларыса з'ехала адсюль? – Не паладзілі.* М. Лобан.

**ПАСВЕДЧАННЕ,** СВЕДЧАННЕ, ДАВЕДКА /*пра сканчэнне навучальнай установы, праходжанне службы:* АТЭСТАТ /*пераважна пра нараджэнне:* МЕТРЫКА /*сведчыць асобу:* ПАШПАРТ /*пра пэўныя паўнамоцтвы:* МАНДАТ /*на права займацца якой-небудзь дзейнасцю:* ПАТЭНТ.

*Чалавек падышоў да касы, паказаў пасведчанне і без чаргі купіў білет.* І. Гурскі. *З выдатным атэстатам закончыў я школу.* І. Мележ. *Маю пашпарт, прапісан як след.* А. Куляшоў.

**ПАСКОРЫЦЬ,** ПРЫСПЕШЫЦЬ, ПРЫСПЯШЫЦЬ, ПАДАГНАЦЬ.

*Эх, давай паскорым ход, конь мой быстраногі.* А. Александровіч. *І яны прыспешылі крок.* Р. Сабаленка.

**ПАСКУПІЦЦА,** ПАШКАДАВАЦЬ.

*І бульбы Марына не паскупілася.* І. Шамякін. *Скажы яму, што я і на гарнітур не пашкадую, калі будзе такая згода.* А. Кулакоўскі.

**ПАСЛАНЕЦ,** ПАСЫЛЬНЫ, ГАНЕЦ, НАРАЧНЫ, ХАДОК, ВЕСТАВЫ; ПАСОЛ *(разм.).*

*Такую пісульку Язэп Крушынскі атрымаў ад агранома праз спецыяльнага пасланца.* З. Бядуля. *У гэты час веставы прынёс Саколічу радыёграму.* М. Лынькоў. *Пашлі асла, за ім – пасла.* Прыказка.

**ПАСЛУХМЯНЫ,** СЛУХМЯНЫ, ПАСЛУЖЛІВЫ, ПАКОРЛІВЫ, ПАКОРНЫ, ПАДАТЛІВЫ, ПАДАТКІ, ПАКЛАДЗІСТЫ *(разм.):* ШАЎКОВЫ *(перан.).*

*Даводзілася далікатна супакойваць яго, але не заўсёды ён быў паслухмяны.* М. Хведаровіч. Жыву з суседзьмі па-суседску, – *пакорны* згоды я слуга. Я. Купала. *А я з вас выб'ю дух! Вы ў мяне шаўковыя будзеце!* Р. Няхай.

**ПАСПЕЦЬ,** ПРЫСПЕЦЬ, УПРАВІЦЦА.

*Была і поўная скрыня жыта. Хацелі яе закапаць – не паспелі.* П. Пестрак. *Бачыць баба, што да дажджу не управіцца ёй з ячменем.* Я. Колас.

**ПАСТАВА,** ВЫПРАЎКА, ПОЗА.

*Ён сядзеў усё ў той жа паставе, закінуўшы рукі за галаву, заплю-*

*шчыўшы вочы.* І. Шамякін. *Яны з першага зірку зразумелі і маўклівую жорсткасць гэтых тут людзей і іх позу...* К. Чорны.

**ПАСТАНОВА**, РАШЭННЕ, УКАЗ, РЭЗАЛЮЦЫЯ.

*З'езд ухваліў пастановы пра пабудаванне новых фабрык і заводаў.* К. Чорны. *Цар указам, а пан бізуном.* Прыказка.

**ПАСТУПОВА**, МАЛА-ПАМАЛУ.

*Паступова яго голас мацнеў, ажываў твар, белыя рукі нервова захадзілі над амбонам.* М. Лынькоў. *Гутарка людзей мала-памалу перайшла ў ціхі гул...* П. Пестрак.

**ПАСТУХ** /памочнік пастуха: ПАДПАСАК /пасе коней: КАНАПАС /пасе коней на начлезе: НАЧЛЕЖНІК /пасе авечак: ЧАБАН /пасе свіней: СВІНАПАС; ПАСТЫР *(паэт.)*.

*Пастухі гналі кароў з пашы дадому.* П. Галавач. *Падпаскам, ганяючы быдла, я раніцы кланяўся ў пояс.* Я. Пушча. *Сваіх цялятак і ягнятак чабан на полі вольным пас.* П. Броўка.

**ПАСЦЕЛЬ**, ПОЛАГ; ЛОЖА *(кніжн. паэт.)*.

*Пасцель пуховую пасцелем мы з табою, каб мякка спаць было нам абаім* Я. Купала. *Полаг гатовы белы, пуховы; ляж, не глядзі, не ўслухайся!* Я. Купала.

**ПАТРАБАВАННЕ**, ДАМАГАННЕ, НАСТАЯННЕ, ПРЭТЭНЗІЯ; УЛЬТЫМАТУМ *(афіц.)*; ВЫМОГА *(разм.)*; РАХУНАК *(перан.)*.

*Апрача сцягаў маніфестанты неслі плакаты з рознымі патрабаваннямі...* М. Гарэцкі. *Стараўся як мага лагодзіць, дагаджаць яе вымогам...* П. Пестрак.

**ПАТРЫЁТ** СЫН РАДЗІМЫ.

*Абодва добрыя патрыёты. Любяць радзіму.* У. Караткевіч. *Сваёй Радзімы быў я сынам, яе прастораў чуў я пах.* Р. Няхай.

**ПАТУШЫЦЬ**, ПАГАСІЦЬ, ЗАГАСІЦЬ, ЗАДЗЬМУЦЬ /*вадкасцю:* ЗАЛІЦЬ.

*Потым яна патушыла лямпу і лягла.* А. Чарнышэвіч. *Загасіце свечку.* Б. Мікуліч. *А агонь? Заліць жа трэба.* Г. Шыловіч.

**ПАХ**, ДУХ, ДУХМЕНЬ, ДУХМЯНАСЦЬ, АРАМАТ; ВОДАР *(абл.)*.

*Бялее грэчка з пахам мёду..* А. Гурло. *Палыновая духмянасць была прыемная, але ж і горкая, як удовіны слёзы.* В. Вітка. *Мятным водарам жнейка аблітая са жніва пасляшае дахаты.* П. Трус.

**ПАЦЭЛІЦЬ**, УЦЭЛІЦЬ, ТРАПІЦЬ, ПАПАСЦІ; УГАДЗІЦЬ *(разм.)*: НАКРЫЦЬ *(перан.)*.

*Кінуў камень, але не уцэліў.* Ц. Гартны. *Адна бомба папала ў бліндаж.* Р. Няхай. *Над іх галовамі праляцеў з завываннем снарад, які накрыў праціўніка.* І. Гуркі.

**ПАЧЫНАЛЬНІК**, ЗАСТРЭЛЬШЧЫК, ІНІЦЫЯТАР.

*Але праз некалькі дзён пачалі забіраць пачынальнікаў забастоўкі.* К. Чорны. *Вінгар даўно быў застрэльшчыкам арганізацыі ўдарных брыгад.* К. Чорны.

**ПАША**, ВЫПАС, ВЫГАН, ПОЛЕ.

*Чараду прыгналі з пашы...* В. Вітка. *Вупраж, калёсы кідаю на вуліцы, а сам вяду каня на выпас.* А. Асіпенка. *Раз гнаў пастух свіней у поле.* К. Крапіва.

**ПАШТАЛЬЁН**, ЛІСТАНОСЕЦ; ПАШТАВІК *(разм.)*.

*Вось табе, Зоська, ліст прынёс паштальён, яшчэ з самага ранку.* Ц. Гартны. *Лістаносец ідзе. Мусіць, ліст нам.* К. Крапіва.

**ПАШЧАСЛІВІЦЬ**, ПАШЧАСЦІЦЬ, ПАШАНЦАВАЦЬ.

*Неяк дзядзьку асабліва пашчасьлівіла на паляванні: ён прынёс некалькі птушак.* М. Лужанін. *Адным актывістам пашанцавала ўцячы на ўсход.* Я. Брыль.

**ПАЭТ**, ВЕРШАПІСЕЦ; ПЯСНЯР, ПЕСНЯТВОРЦА *(паэт.)*.

*І для таго я стаў паэтам, каб веру ў сэрцах распаліць.* М. Васілёк. *Гэй, пясняр малады, не вучыся спяваць новай песні на сумны той лад.* М. Чарот.

**ПЕВЕНЬ,** ПЯВУН *(абл.)*
*Певень паказвае людзям, калі на работу ўставаць.* З. Бядуля. *Сход зацягнуўся да трэціх певуноў.* М.Чарот.

**ПЕКЛА,** АПРАМЕТНАЯ.
*Поп не раз страшыў дзеда пеклам.* А. Якімовіч. *Нябожчыкі-грэшнікі вечна пакутуюць у апраметнай.* З. Бядуля.

**ПЕРАВЯЗАЦЬ,** ЗАБІНТАВАЦЬ.
*Перавяжу вашу рану, тады ўстанеце.* А. Кулакоўскі. *Лейтэнанта палажылі на спіну, забінтавалі прабітыя грудзі* М. Лынькоў.

**ПЕРАКАНАЎЧА,** ДОКАЗНА, ВАЖКА, АЎТАРЫТЭТНА.
*Ты, Максім, так пераканаўча гаворыш, што нават я паверыў, што адолею ўсю сваю бяду.* М. Машара. *Я гэта вам аўтарытэтна прадракаю.* У. Корбан.

**ПЕРАПЫНАК,** ПЕРАМЕЖАК, ПАЎЗА, АНТРАКТ; ПЕРАМЕНКА *(разм.).*
*У перапынку паміж танцамі на сцэне выступалі нашы артысты..* А. Рылько. *Нарэшце прывітанні скончыліся, абвясцілі антракт.* Э. Самуйлёнак.

**ПЕРАХРЫСЦІЦЬ,** ПЕРАЖАГНАЦЬ *(абл.)* ПАЛАЖЫЦЬ КРЫЖ.
*Стары перахрысціў яго тры разы, абняў за шыю і пацалаваў.* А. Чарнышэвіч. *Развітваючыся, маці, як заўсёды, перажагнала нас.* М. Танк.

**ПЕРАШКАДЖАЦЬ,** ЗАМІНАЦЬ СТАВІЦЬ ПАЛКІ Ў КОЛЫ, СТАЯЦЬ НА ДАРОЗЕ, СТАНАВІЦЦА ЎПОПЕРАК ДАРОГІ, ПАДСТАЎЛЯЦЬ НОЖКУ, БЛЫТАЦЦА ПАД НАГАМІ, КРУЦІЦЦА ПАД НАГАМІ, ЗАМІНАЦЬ ПАД НАГАМІ, ЗВЯЗВАЦЬ ПА РУКАХ І НАГАХ.
*Гучныя гудкі паравоза перашкаджаюць Бірулю гаварыць.* Х. Шынклер. *Яно пэўна, што трэба прыбраць з дарогі сяго-таго, каб не міналі.* М. Зарэцкі. *Лепей не станавіся ўпоперак дарогі – змыем, каб і знаку не было.* С. Грахоўскі. *Звязвала па руках і нагах адсутнасць радыёперадатчыка...* М. Лынькоў.

**ПЕРАШКОДА,** ЗАМІНКА, ЗАВАДА: ЗАГАРОДКА. БАР'ЕР, КАРДОН, ШЛАГБАЎМ, РАГАТКІ, ЗАТОР, ГАРА, ТОРМАЗ *(перан )* КОСТКА У ГОРЛЕ, СКУЛА ПАД БОКАМ.
*Шмат пераходжана намі дарог, і перашкод мы не мала змаглі...* К. Буйло. *А вы, калі ласка, не ўчыняйце асаблівых кардонаў тым, хто хоча сюды зайсці.* А. Кулакоўскі. *Маленькі Банадзюк становіцца косткаю ў горле...* П. Пестрак.

**ПЕРСАНАЖ,** ГЕРОЙ, ВОБРАЗ.
*А персанаж з старога фарса – ён рэдак, як улетку снег...* С. Дзяргай. *Героем большасці апавяданняў з'яўляецца вясковы чалавек, сціплы і просты будаўнік жыцця.* Я. Брыль.

**ПЕСНЯ** /*урачыстая:* ГІМН /*абрадная веснавая:* ВЯСНЯНКА /*спяваюць, калышучы дзіця:* КАЛЫХАНКА.
*Ты не можаш быць, песня, скаванаю.* Я. Купала. *Чуваць было, як яна заспявала калыханку* К. Чорны.

**ПЕЧ** /*пакаёвая:* ГРУБКА /*часовая жалезная:* БУРЖУЙКА *(разм.)*
*У печы палаюць дровы.* П. Пестрак. *У гэты вечар яна не паліла ў грубцы і не засвяціла лямпы.* В. Быкаў.

**ПЕША,** ПЕХАТОЙ, ПЕШКІ; ПЕШАКОМ, ПЕХАМ, ПЕШКАМ, ПЕШАДРАЛАМ, ПЕХАДРАЛАМ *(разм.)* СВАЁЙ ПАРАЙ.
*Усе і выехалі, а ў каго не было на чым – пеша выйшлі* К. Чорны. *Дзе там у чорта прыехала! Пехадралам пру.* Я. Колас.

**ПІЛА** /*вузкая ручная, невялікая*· НАЖОЎКА.
*Ён даставаў з саломы пілу, сякеру, лом.* К. Чорны. *Панты зразаюць нажоўкай.* Р. Барадулін.

**ПІСЬМЕННІК,** ЛІТАРАТАР, АЎТАР, МАСТАК СЛОВА, МАЙСТАР СЛОВА.
*Я тады яшчэ мала каго ведаў з пісьменнікаў, хоць ужо надрукаваў з дзесятак сваіх вершаў.* М. Хведаровіч. *Мастак слова мысліць вобразамі.* У. Юрэвіч.

**ПІСЬМО,** ЛІСТ.
*А ў руках пісьмо трымае і канверцік сіні.* Я. Колас. *Часцей лісты пішыце з войска!* М. Танк.

**ПІЦЬ,** ЖЛУКЦІЦЬ *(разм.)*; ЦЯГНУЦЬ, ГЛУШЫЦЬ, КУЛЯЦЬ *(перан.)*.
*Конь доўга піў з плыткага броду.* К. Чорны. *Гарэлку жлукціць нарыхтоўшчык дзень у дзень* . У. Корбан. *Дык што мне, гуляй ды гарэлку куляй.* Р. Сабаленка.

**ПЛАКАЦЬ,** РЫДАЦЬ, ПРЫЧЫТАЦЬ, ПРЫЧЫТВАЦЬ; ГАЛАСІЦЬ, РУМЗАЦЬ, ХЛІПАЦЬ, ХЛІПАТАЦЬ, ХЛІМКАЦЬ, УСХЛІПВАЦЬ *(разм.)*; КРЫЧАЦЬ, РАЎЦІ, ВЫЦЬ, СКАВЫТАЦЬ *(перан.)* ЗАХОДЗІЦЦА ПЛАЧАМ, ЗАХОДЗІЦЦА АД ПЛАЧУ, ЛІЦЬ СЛЁЗЫ, АБЛІВАЦЦА СЛЯЗАМІ, ЗАЛІВАЦЦА СЛЯЗАМІ, ДУШЫЦЦА СЛЯЗАМІ, ДУШЫЦЦА АД СЛЁЗ, ДУШЫЦЦА ПЛАЧАМ, РАЗВОДЗІЦЬ СЫРАСЦЬ.
*Плача ўдава сярод ночак, вочкі выцірае* Ф. Багушэвіч. *Бабы прычытвалі, як па нябожчыках.* Я. Колас. *Ліпачка румзала ў кулачок.* Р. Сабаленка. *Цыц, дзіцятка! утры нос і перастань хліпаць.* Цётка. *Яна душылася ад слёз, гледзячы на галодных дзяцей.* А. Якімовіч.

**ПЛАКСА,** ПІСКУН, РУМЗА, НЮНЯ *(разм.)*.
*Не пазнаць у дзяўчыне той плаксы малое, што мурзатая поўзала ўслед за сястрою...* М. Лужанін. *Нашто плакаць? Усё мінула. Ну, супакойся. У-у, румза.* У. Караткевіч.

**ПЛАЦІНА,** ГРЭБЛЯ, ГАЦЬ, ЗАГАТА.
*Цераз раку будаўнікі плаціну шпарка будавалі...* У. Корбан. *Чорная грэбля лягла праз балота.* Я. Колас. *Расшумелася паводка, і прарвала рэчка гаць.* А. Астрэйка.

**ПЛАШЧ,** НАКІДКА, ПЫЛЬНІК, ДАЖДЖАВІК.
*Плашч – на плечы брызентовы, капялюш – на галаву...* А. Бялевіч. *На ім быў шэры дажджавік, простыя керзавыя боты і шапка-вушанка.* М. Лупсякоў.

**ПЛОШЧА,** МАЙДАН *(абл.)*, ПЛЯЦ *(уст.)*.
*Пасярэдзіне мяст...чка, з боку рыначнай плошчы, узвышаецца белы касцёл.* Я. Брыль. *Пасярэдзіне горада – пляц.* М. Багдановіч.

**ПЛЫНЬ,** ЦЯЧЭННЕ.
*Насупраць плыні ісці цяжка, і Марцін скіроўвае лодку пад самы бераг.* М. Лупсякоў. *Проці цячэння вады зможа толькі жывое паплыць...* М. Багдановіч.

**ПОБАЧ,** ПОПЛЕЧ, ПОРУЧ.
*Селі мы з дзедам побач у палукашку на мяккім сене.* А. Якімовіч. *На драбінах поплеч з Аміляю сядзеў Андрэй...* К. Чорны. *Дарога ў вуліцы няроўная, вузкая, нельга ісці поруч двaім.* П. Галавач.

**ПОДЛЫ,** НІЗКІ.
*І бачыў я ваякаў сільных, і бачыў подлых я трусоў...* Я. Купала. *Падхалім – гэта самы нізкі і самы страшны чалавек.* І. Гурскі.

**ПОДПІС,** АЎТОГРАФ.
*Крывыя подпісы мужыкоў занялі ўвесь ліст паперы!* Я. Колас. *Колькі ў яе розных аўтографаў! Проста хвароба нейкая.* М. Ракітны.

**ПОЗІРК,** ПОГЛЯД; ЗІРК *(разм.)*.
*Позірк яго нерашуча спыняецца на дзіцячым тварыку.* М. Лынькоў. *А як кіне погляд смелы, так і згоніць з сэрца цень.* Я. Колас.

**ПОЛЕ,** ПАЛЕТАК; ЛАН *(абл.)*: НІВА *(паэт.)*: ГОНІ *(паэт., мн.)*.
*Калгаснае поле, як мора, у хвалях зялёных усё.* М. Машара. *Каласіцца на палетку жыта ды пшаніца...* К. Крапіва. *На мужычай ніве каласы пустыя...* Я. Колас.

**ПОМНІК,** МАНУМЕНТ */у выглядзе чатырохграннага слупа, звужанага кверху:* АБЕЛІСК.
*Не паспелі помніка з граніту ім сябры паставіць – клікаў бой.* А. Бялевіч. *На пастаменце з шэрага граніту стаіць на Круглай плошчы абеліск.* Е. Лось.

**ПОМСТА,** АДПОМСТА, АДПЛАТА, РАСПЛАТА СУДНЫ ЧАС, СУДНЫ ДЗЕНЬ.

*Хай помста точыць нож крывавы на крыўду вечную сваю!* Я. Купала. *Ужо ўзнімаецца народ, і блізкі час адплаты!* Э Самуйленак. *Хай судны час настане, – спакойна Музе ен і проста ў вочы гляне...* М. Багдановіч.

**ПОРТ**, ПРЫСТАНЬ, ГАВАНЬ.

*Успомні, таварыш, Адэсу, шумлівае мора, і порт.* А. Зарыцкі. *– Гэй, гэй! На бераг хутчэй! – з прыстані нехта крычыць.* М. Танк. *У гавані стаяла шмат караблёў з розных канцоў свету.* Я. Маўр.

**ПОСТАЦЬ,** ФІГУРА.

*Раптам ад гуменнай сцяны аддзялілася высокая постаць.* К. Чорны. *Нібы з зямлі выраслі непадалёку тры чалавечыя фігуры.* М. Чарот.

**ПОСЦІЛКА,** КАПА.

*Стары, паедзены шашалем ложак быў засланы зрэбнай саматканай посцілкай.* А. Чарнышэвіч. *Алена радавалася: напрадзе за зіму ды натчэ вясной ручнікоў, абрусаў ды кап.* А. Чарнышэвіч.

**ПОТНЫ,** СПАЦЕЛЫ, УСПАЦЕЛЫ, СПАТНЕЛЫ, ЗАПАЦЕЛЫ, МОКРЫ, УЗМАКРЭЛЫ /*пра каня:* УЗМЫЛЕНЫ.

*Косця быў увесь потны, твар, заўсёды бледна-матавы, хударлявы, пачырванеў.* А. Кулакоўскі. *Узмакрэлыя коні асцярожна пераступалі кутымі капытамі...* М. Лынькоў.

**ПОТЫРЧ,** ПОТАРЧ, СТЫРЧМА, СТАРЧМАКА.

*Я размахнуўся і гэтак даў хулігану ў грудзі, што ён потырч паляцеў на брук...* Р. Сабаленка. *Кладуцца дрэвы старчмака на ўвесь сасновы рост.* П. Броўка.

**ПОЎНЫ**, НАПОЎНЕНЫ, НАБІТЫ, ЗАБІТЫ ЯК ЗАВЯЗАЦЬ, АЖ ТРАШЧЫЦЬ.

*У напоўнены вагон шугнула новая грамада пасажыраў.* Ц. Гартны. *Год быў гэтакі ўраджайны на жыта (гумно аж трашчыць).* А. Васіленка.

**ПОЯС**, ПАС, ПАСАК, ПАПРУГА, ДЗЯГА, РЭМЕНЬ.

*На ёй было белае плацце, туга перацягнутае ў таліі шырокім поясам.* А. Асіпенка. *Бацька сына выбіў пасам, а сын бацьку ў лоб абцасам* В.Вольскі. *А ён сарваў з мяне ўсю вопратку і пачаў біць дзягай.* З. Бядуля.

**ПРАБАЧЫЦЬ**, ВЫБАЧЫЦЬ, ДАРАВАЦЬ, ПАДАРАВАЦЬ.

*Аўгіння Цітаўна! Прашу прабачыць за турботы.* М. Ткачоў. *Вы не гневайцеся на мяне і даруйце.* К. Чорны.

**ПРАВА,** ПАЎНАМОЦТВА, МАНАПОЛІЯ.

*Хто дужы, таго і права, таго і слухай.* М. Чарот.

**ПРАВАДНІК,** ПАВАДЫР, ГІД, ЭКСКУРСАВОД.

*Я люблю знаёміцца без гідаў, без ніякіх там праваднікоў з новым горадам ці краявідам, плошчай, гмахам, засенню садоў.* М. Танк.

**ПРАВАДНІЦА** /*у самалёце:* СЦЮАРДЭСА.

*Ад праваднікы строгай чую: – Стаіць наш поезд сем мінут!* А. Пысін. *Мне сцюардэса падала цукеркі, тваёю мятай веялі яны.* А. Пысін.

**ПРАВЕРКА,** ПАВЕРКА, ПРОБА, ВЫПРАБАВАННЕ, ІНСПЕКЦЫЯ, ЭКЗАМЕН, КАНТРОЛЬ, РЭВІЗІЯ; ХРЫШЧЭННЕ *(перан.).*

*Калісь вытрэсваў на паверцы паходны рэчавы мяшок.* А. Пысін. *Тут адбывалася выпрабаванне новых тыпаў самалётаў.* Р. Няхай. *Рэвізія касы дала поўны парадак.* Я. Скрыган.

**ПРАВІНАВАЦІЦЦА,** ПРАВІНІЦЦА; ПРАШТРАФІЦЦА *(разм.);* САГРАШЫЦЬ *(перан.).*

*Заслужыў – пахваліць, правінаваціўся, саграшыў – пратрэ і з пясочкам, і з перчыкам.* М. Пянкрат.

**ПРАГУЛКА,** ПРАХОДКА, ШПАЦЫР; ПАГУЛЯНКА *(разм.);* ПРАМЕНАД *(уст.).*

*А па нядзелях мы ездзілі на прагулку на раку...* М. Лынькоў. *Як*

*жа добра было вам на шпацыры і ў лодцы на ціхай рацэ.* П. Панчанка.

**ПРАДБАЧАННЕ,** ПРАДКАЗАННЕ, ПРАДГАДАННЕ, ПРАРОЦТВА, ПРАГНОЗ.

*Але баюся, што могуць спраўдзіцца ўсе мае найгоршыя прадбачанні.* М. Танк. *І яшчэ не спраўдзілася прароцтва папа.* З. Бядуля. *Часта жыццё не ўкладалася ў яго прагноз.* Ц. Гартны.

**ПРАДМЕТ,** ДЫСЦЫПЛІНА.

*У школе даваліся мне ўсе прадметы, але найбольш любіў літаратуру.* І. Навуменка. *І нейкія дысцыпліны ходзіць слухаць на медфак.* К. Чорны.

**ПРАДЧУВАННЕ,** ІНТУІЦЫЯ.

*Было прадчуванне бяды.* А. Вярцінскі. *Інтуіцыя падвяла – толькі чайнік і піяла.* Р. Барадулін.

**ПРАЖЫЦЬ,** ПРАВЕСЦІ, ЗВЕКАВАЦЬ; ПРАЦЯГНУЦЬ, ПРАКІДАЦЦА *(разм.). Тут кукуе зязюля, ці шмат пражыву.* Я. Купала. *Так у дзеўках і звекавала.* М. Гарэцкі.

**ПРАЛЕСКА,** ПАДСНЕЖНІК.

*Я пралесак блакітных сягоння нарву і вянкамі цябе прыбяру...* П. Панчанка. *Прабівае рыхлы снег падснежнік...* А. Бялевіч.

**ПРАМАХНУЦЦА,** ПРАМАЗАЦЬ *(разм.).*

*Я вельмі старанна цэлюся, цяпер я не магу прамахнуцца.* В. Быкаў. *Бяры, мілы, трохлінейку, два падсумкі, патранташ, цэлься ворагу у сэрца, не прамаж.* К. Крапіва.

**ПРАМЕНЬ,** ПРОМЕНЬ; КАСА, ПУК, ПАСМА. ПАС, СТРАЛА *(перан.).*
*Раптам яна ўбачыла на белай сталі прамень – маленькую ружовенькую палоску ў самым куце.* І. Шамякін. *Пас мёртвага святла ляжыць на канапе, на стале, ручніком спадае на падлогу.* І. Мележ.

**ПРАМОВА,** ВЫСТУПЛЕННЕ /*рэлігійнага характару:* ПРОПАВЕДЗЬ, КАЗАНЬ, КАЗАННЕ.

*Яго прамова мела бясспрэчны ўплыў на выступленні іншых прамоўцаў...* Я. Колас. І доўга яшчэ казаў *казанні* свае ксёндз у касцёле. М. Лынькоў.

**ПРАМОЎЦА,** АРАТАР, КРАСАМОЎЦА.

*Гучныя воплескі не даюць прамоўцы скончыць.* К. Чорны. *Людзі слухалі і ўважліва сачылі за кожным жэстам аратара, прыглядваліся да яго аблічча.* М. Лынькоў.

**ПРАНІЗАЦЬ,** ПРАЦЯЦЬ, ПРАНЯЦЬ, ПРАШЫЦЬ; ПРАСТРОМІЦЬ *(разм.). Сцюжа пранізала яго да самых касцей.* З. Бядуля. *Няваду быццам праняло электрычным токам.* К. Чорны.

**ПРАПАНОВА,** ДУМКА, МЕРКАВАННЕ, ІДЭЯ, ПРАПАЗІЦЫЯ.

*На рабочых сходах ён галасаваў за добрыя прапановы...* К. Чорны. *Паўстала думка ў нас усіх – скруціць пяскі зялёным пасам.* У. Дубоўка.

**ПРАРОК,** ВЯСТУН, ВЯШЧУН, АРАКУЛ.

*Ішоў [Кастусь Каліноўскі] па землях беларускіх і, як прарок, прарочыў людзям – сваім братам, – што шчасце будзе...* А. Гурло. *З-за недалёкага лесу веерам ужо шыбалі праменна-мутныя стрэлы – вешчуны сонца.* П. Пестрак.

**ПРАСАВАЦЬ,** ГЛАДЗІЦЬ.

*Маці прасавала бялізну.* Я. Маўр. *Уключай прас у разетку і гладзь.* А. Пальчэўскі.

**ПРАСІЦЬ,** ПРАСІЦЦА, ВЫПРОШВАЦЬ, УПРОШВАЦЬ, МАЛІЦЬ, МАЛІЦЦА, ВЫМОЛЬВАЦЬ, УМОЛЬВАЦЬ, КЛАНЯЦЦА, ХАДАЙНІЧАЦЬ; КЛЕНЧЫЦЬ, КЛЯНЧЫЦЬ, ШАПКАВАЦЬ *(разм.);* БЛАГАЦЬ *(абл.)* ЗВЯРТАЦЦА З ПРОСЬБАЙ, КЛАНЯЦЦА Ў НОГІ, ЦАЛАВАЦЬ РУКІ І НОГІ, АБІВАЦЬ ПАРОГІ, БІЦЬ ЧАЛОМ.

*А ў пiліпаўку, гаротны, з торбай хлеба просіць!* П. Глебка. *Ён здрадай вымольваў сабе жыццё.* І. Мележ. *Ён мне рукі і ногі цалаваў, абы я пусціў яго жывога.* А. Чарнышэвіч.

**ПРАСЛАВІЦЬ,** УСЛАВІЦЬ, УВЕКАВЕЧЫЦЬ, АБЯССМЕРЦІЦЬ, ЗРАБІЦЬ ВЯДОМЫМ.

*І дзень перамогі праславім!* М. Машара. *Андэрсен абяссмерціў сваё імя казкамі* Р. Шкраба.

**ПРАСЛЕДАВАННЕ,** ГАНЕННЕ.

*На праследаванні Грамада адказала масавай дэманстрацыяй пратэсту* У. Калеснік. *Лёс жа амаль усіх адкрывацеляў і вынаходнікаў, пра якіх я чытаў у кнігах, даволі незайздросны: яны, як правіла, падвяргаліся ганенням.* Х. Жычка.

**ПРАЦА,** РАБОТА; МАЗОЛЬ, ПОТ *(перан.).*

*Мы працаю ўзнімем за горадам горад, зялёнаю рунню засцелем палі.* П. Броўка. *А хлеба кавалак я і сваім мазалём прыдбаю.* М. Лобан.

**ПРОВАД,** КАБЕЛЬ, ДРОТ.

*Пяюць правады па высокіх слупах...* П. Глебка. *Ціхі кабель нашых тэлефонаў ляжыць па разорах і ў траве.* К. Чорны. *Над кожным дахам дроту медзь заводзіць перазвон.* А. Астрэйка.

**ПРОДКІ,** ПРАШЧУРЫ, ПАПЯРЭДНІКІ, БАЦЬКІ, ДЗЯДЫ, ПРАДЗЕДЫ *(перан.).*

*Тут, гавораць, нашы продкі крыжакам давалі бой.* А. Астрэйка. *Дзяды нашы білі драпежнікаў прускіх...* П. Броўка.

**ПРЫБЛІЗНА,** ПРЫКЛАДНА, НЕШТА, НЕДЗЕ, ТАК, БОЛЬШ-МЕНШ, НА ВОКА, З, СА.

*Усе такія, як мы, ці прыблізна адных з намі гадоў.* М. Лупсякоў. *Мяне паклікалі ў школу раней, недзе ў канцы ліпеня.* І. Шамякін. *Манг набегаўся, пакуль знайшоў больш-менш роўных жэрдак.* Я. Маўр.

**ПРЫВІТАЦЦА,** ПАВІТАЦЦА; ПАЗДАРОЎКАЦЦА, ПАРУКАЦЦА *(разм.).*

*Яна хораша прывіталася з гасцямі, рассыпаючы самыя прыязныя ўсмешкі.* Я. Колас. *Старыя парукаліся і адразу ж завялі размову.* М. Ткачоў.

**ПРЫВЫКНУЦЬ,** ЗВЫКНУЦЦА, ЗВЫКНУЦЬ, АБВЫКНУЦЬ, ПРЫЗВЫЧАІЦЦА, АСВОІЦЦА, АСВОЙТАЦЦА, АГЛЕДЗЕЦЦА, ЗЖЫЦЦА, ПРЫЖЫЦЦА, АБЖЫЦЦА, УЦЯГНУЦЦА, ПРЫЛАЖЫЦЦА, АТУКАЦЦА, АГОЙТАЦЦА, АГОЎТАРЫЦЦА, АБАБІЦЦА, ПААБІЦЦА, АТАЎЧЫСЯ, АБЦЯРПЕЦЦА, АЦЯРПЕЦЦА, АБЦЕРЦІСЯ, ПААБЦЕРЦІСЯ, ПРЫЦЕРЦІСЯ, АБЫРАЦЦА *(разм:);* АБЛАМАЦЦА, ПРЫЛАМАЦЦА, УЛАМАЦЦА, АБМЯЦЦА, АКЛІМАТЫЗАВАЦЦА *(перан.).*

*Прывыклі да розных пагроз мы.* П. Панчанка. *Нямала прайшло часу, пакуль я асвойтаўся з вучылішчам і яго жыццем.* Я. Маўр. *Так і прыжыўся Кастусь сярод мясцовых людзей...* П. Пестрак. *Але дарма, абамнецца хлопец, не такі гарачы будзе...* Х. Шынклер.

**ПРЫГАВОР,** ПРЫСУД, СУД; ВЫРАК *(абл.).*

*А суддзі крыху пагадалі, і іх прыгавор выйшаў скуп.* Я. Колас. *А суд гісторыі цяжкі!..* Я. Купала. *Тры гады сядзіць – трэба болей: цяжкі вырак далі па справе.* Р. Барадулін.

**ПРЫГАЖУНЯ,** КРАСУНЯ; КРАЛЯ *(разм.);* ЧАРАЎНІЦА, ЦАРЭЎНА *(перан.).*

*Сама Таня, стройная прыгажуня, сядзела за сваім сталом...* М. Лупсякоў. *Ты лепш пакліч мяне, красуня, хоць на хвіліну да сябе...* М. Танк. *А між град ідзе дзяўчына чараўніца Кацярына.* І. Муравейка.

**ПРЫГАЖЭЦЬ,** ХАРАШЭЦЬ.

*Хай пад сонечнаю ласкай прыгажэе белы свет!* К. Кірэенка. *Горад харашэе па меры набліжэння да ўскраін.* П. Пестрак.

**ПРЫГАРАД,** ПРАДМЕСЦЕ, ПРЫМЕСЦЕ, УСКРАІНА.

*У горадзе налічваецца пяцьсот пяцьдзесят тысяч жыхароў, а разам з прыгарадамі – семсот тысяч.* В. Вольскі.

**ПРЫЕМНА,** ДОБРА, ХОРАША, ЛЮБА, МІЛА, ЦУДОЎНА; СЛАЎНА *(разм.);* СОЛАДКА, САЛОДКА, СМАЧНА *(перан.).*

*Прыемна ў дом зайсці з дарогі, дзе рады вам гаспадары* . Я. Колас *Ля школы – вятрак, доўгі калгасны двор, Лысая гара – з яе так хараша з'язджаць узімку на лыжах* . Б. Сачанка. *Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы!* Я. Колас. *Смачна спіцца на пахкім сене* П. Панчанка.

**ПРЫЗНАВАЦЦА,** АДКРЫВАЦЦА, РАСКРЫВАЦЦА; СПАВЯДАЦЦА, РАСПРАНАЦЦА *(перан.)* ВЫВАРОЧВАЦЬ ДУШУ.

*Валя не хацела прызнавацца ў сваім няшчасці.* П. Пестрак. *Не хацелася Зосі ва ўсім спавядацца свёкру.* К. Крапіва.

**ПРЫЗНАЧЫЦЬ,** НАЗНАЧЫЦЬ; ПАСТАВІЦЬ, ПРЫСТАВІЦЬ *(разм.).*

*Яшчэ праз дзень немцы прызначылі Асцюка старастам.* А. Марціновіч. *Я пастаўлю вашага брата старшым механікам!* А. Чарнышэвіч.

**ПРЫЗЫЎНІК,** НАВАБРАНЕЦ, РЭКРУТ *(уст.).*

*Бо якраз у клубе камсамольцы рыхтавалі прызыўнікам развітальны вечар.* М. Гроднеў. *Яшчэ нядаўна – рэкруты, цяпер мы ўжо салдаты.* Я. Брыль.

**ПРЫКІДВАЦЦА,** ПРЫТВАРАЦЦА, ПАДРАБЛЯЦЦА, РЫСАВАЦЦА, СІМУЛЯВАЦЬ; УДАВАЦЬ, РАЗЫГРЫВАЦЬ *(разм.),* МАСКІРАВАЦЦА *(перан.)* РАБІЦЬ ВЫГЛЯД, ВЫДАВАЦЬ СЯБЕ, ВЫСТАЎЛЯЦЬ СЯБЕ, УДАВАЦЬ З СЯБЕ, СТРОІЦЬ З СЯБЕ, СТРОІЦЬ БЛАЗНА.

*Іншы ў вочы прыкідваецца добрым, а сам думае прадаць цябе за ломаны асьмак.* Ц. Гартны. *Заплюшчваю вочы і прытвараюся спячым* З. Бядуля. *Толькі хіцёр ён, як д'ябал, умее маскіравацца* А. Кулакоўскі. *Ен толькі чырванеў і удаваў з сябе пакрыўджанага ды гордага чалавека.* У. Шахавец.

**ПРЫКУРЫЦЬ,** ПРЫПАЛІЦЬ *(разм.).*

*Гарыць яшчэ? Дай прыкуру.* Я. Брыль. *Прыпаліў папяросу, зацягнуўся, апусціў вочы ўніз і падумаў.* Я. Колас.

**ПРЫЛАДА,** ПРЫЛАДДЗЕ *(зб ),* ПРЫБОР *(спец ).* ПРЫСТАСАВАННЕ, СНАСЦЬ, СНАСЦІНА, НАЧЫННЕ *(зб ).* ІНСТРУМЕНТ, СТРУМАНТ; ПРЫЧЫНДАЛЫ *(разм , мн ),* ПРЫЧЫНДАЛЛЕ *(разм.., зб.).*

*Пры агарку свечкі адзін, разлажыўшы шавецкія прылады на куфэрачку, выстукваў малатком – падбіваў боты.* П. Пестрак. *Без начыння лапця не спляцеш.* Прыказка. *Данілаў струмант прыхавалі – дасць бог, ён вернецца назад...* Я. Колас.

**ПРЫМУШАЦЬ,** ВЫМУШАЦЬ, ЗМУШАЦЬ, НЯВОЛІЦЬ. ПРЫНЯВОЛЬВАЦЬ, ПРЫНУКАЦЬ, АБАВЯЗВАЦЬ; СІЛАВАЦЬ, ПРЫСІЛЬВАЦЬ *(абл.);* ГНАЦЬ, ПРЫГАНЯЦЬ, ПРЫЦІСКАЦЬ, ПРЫПІРАЦЬ *(перан.)* ЦЯГНУЦЬ НА ВЯРОЎЦЫ, ЗАПРАГАЦЬ У АГЛОБЛІ, БРАЦЬ ЗА ГОРЛА.

*Іх прымушае страх да паслушэнства... Дж. Байран, перакл.* У. Дубоўкі. *Няволіць не трэба! Кожны сам знае, колькі каму выпіць!* І. Мележ. *Яны не любяць, што я іх да работы прыганяю.* М. Лобан. *У калгас іх на вяроўцы трэба цягнуць...* П. Галавач.

**ПРЫНАМСІ** САМАЕ МЕНШАЕ, ПА МЕНШАЙ МЕРЫ.

*Мне зрабілася шкада, чаму нельга вярнуць мінулага, прынамсі да наступнага навучальнага года.* А. Карпюк. *Гэтае бюро трэба выбраць на доўгі тэрмін, самае меншае на адзін год...* Я. Колас.

**ПРЫНЦЫПОВЫ,** ІДЭЙНЫ, БЕСКАМПРАМІСНЫ, НЕПРЫМІРЫМЫ.

*Іменна ў такіх неспакойных, адкрытых, прынцыповых – сіла народа.* І. Мележ. *З прагульшчыкамі і зладзеямі, калі судзіць, ён бескампрамісны...* М. Ракітны.

**ПРЫПЕК,** ЗАГНЕТ, ЗАГНЕТКА.

*Люблю я больш, як звон царкоўны, скаварады аб прыпек звон!* Я. Колас. *А бабка гатуе ежу, хвастом лісіным змятае загнет.* Р. Барадулін.

**ПРЫПЕЎКА,** ЧАСТУШКА, ДРЫНДУШКА *(разм.).*

*У такі вечар далёка чуваць гукі гармоніка, песні, вясёлыя прыпеўкі* А. Бялевіч. *Другі – Кравец Юзік – спяваў пад гармонік частушкі* З. Бядуля.

**ПРЫПОЛ,** ПАДОЛ.

*Восенню тут багата жалудоў. Цэлы прыпол набярэ іх Ядвіся і гуляе сама з сабой у каменьчыкі.* М. Лынькоў. *І Дануся, прытрымліваючы рукамі падол просценькай сукенкі, зляцела з гары да мяне.* А. Карпюк.

**ПРЫСАДЗІСТЫ,** ПРЫЗЕМІСТЫ; КАМЛЮКАВАТЫ, КАРЖАКАВАТЫ *(разм.).*

*Быў ён сярэдняга росту, шырокі ў плячах, прысадзісты.* М. Лынькоў. *Камлюкаватая акадэмікава постаць не па гадах была рухавая.* Р. Сабаленка.

**ПРЫСЛУГА,** ЧЭЛЯДЗЬ, ДВОРНЯ *(зб.).*

*У генерала было некалькі чалавек прыслугі.* А. Карпюк. *Вярнуліся паны з сваёю чэляддзю, пачалі заводзіць свае парадкі, ды яшчэ горш за царскія.* Я. Колас.

**ПРЫСМАКТАЦЦА,** УПІЦЦА.

*Прысмактаўся, як п'яўка.* Прымаўка. *Упіўся, як клешч.* Прымаўка.

**ПРЫСТОЙНА,** ДАЛІКАТНА, ГАЛАНТНА, ТАКТОЎНА, КАРЭКТНА, ЦЫРЫМОННА.

*Ён стаяў побач з Маро, прыстойна трымаючы ў руцэ свой капялюш.* Э. Самуйлёнак. *Гаспадыня прасіла гасцей вельмі далікатна.* Я. Колас. *Лектар цырымонна кланяецца, ідзе да трыбуны, разгортвае паперы.* А. Петрашкевіч.

**ПРЫТОМНАСЦЬ,** СВЯДОМАСЦЬ.

*У гарачцы ён парнуў афіцэра штыком, захістаўся і ўпаў, страціўшы прытомнасць.* Я. Колас. *Свядомасць вярталася да яго марудна. Ён неяк здолеў разабрацца, дзе і што з ім.* М. Лупсякоў.

**ПРЫТОН,** ШАЛМАН.

*Досыць! Не штука іграць на кларнеце, медныя жменяй сыпаць акорды, блудзіць па прытонах, цешыць тлустыя морды.* М. Танк. *Дзе ты сягоння будзеш начаваць? Пойдзеш у які-небудзь шалман да дзевак?* А. Бажко.

**ПРЫТУЛІЦЦА,** ПРЫХІНУЦЦА, ПРЫХІЛІЦЦА, ПРЫПЕРЦІСЯ, ПРЫГАРНУЦЦА, ПРЫЛЬНУЦЬ, ПРЫЦІСНУЦЦА.

*Грудзьмі прытуліцца не маю к каму.* Я. Купала. *Дзяўчынцы зрабілася страшна, яна бліжэй прыхінулася да маці.* Р. Сабаленка. *Гаспадыня прыціснулася да сцяны, даючы ім дарогу.* Л. Арабей.

**ПРЫХАДЖАНІН,** ПАРАФІЯНІН, ПАСТВА *(зб.).*

*– Я, дарагія прыхаджане, яшчэ раз пытаю, – пачаў густым басам бацюшка сваю прамову, – трэба вам дзяцей хрысціць?* М. Чарот. *Бацюшка, вітаючыся са сваімі парафіянамі, ківаў галавою...* М. Чарот. *Ён [ксёндз] вялікі мастак на тое, каб стварыць адпаведны настрой у свае паствы...* Я. Колас.

**ПРЫХВАТКАМ,** УРЫЎКАМІ.

*Ён і вячэраць сеў гэтак, як быў, не распранаючыся, у сваёй раскудзеленай вопратцы, як прыхваткам усё гэта рабіў.* К. Чорны. *Усё ўрыўкамі даводзіцца вясці работу.* Ц. Гартны.

**ПРЫЧАЛІЦЬ,** ПРЫСТАЦЬ, ПРЫШВАРТАВАЦЦА.

*У гэты час да левага берага Дзвіны прычаліла лодка.* С. Грахоўскі. *Паром прыстаў да берага.* М. Зарэцкі. *Акіянскі лайнер прышвартаваўся раніцаю ў порце...* М. Лынькоў.

**ПТУШКА,** ПТАШКА, ПТАХА, ПТАХ *(разм.).*

*Колькі птушак галасістых у зялёным гушчары!* П. Броўка. *Паляцела пташка ў вырай, птушка вернецца назад.* Я. Колас. *Птаха вольная не сее, а зярнятачкі дзяўбе.* А. Бялевіч.

**ПУСТЫ,** ПАРОЖНІ.

*Дык падстаўляй хутчэй пустыя вёдры, – табе з сваіх ваду я пералью.* С. Гаўрусёў.

**ПУХЛІНА,** АПУХЛАСЦЬ, АЦЕК.
*Пухліна пайшла ад капытоў скрозь па нагах.* К. Чорны. *Яраш адгарнуў коўдру і агледзеў ногі хворай, памацаў іх Ацек знік* І. Шамякін.

**ПЧАЛЯР,** ПАСЕЧНІК, БОРТНІК *(уст.)*
*Дзякаваў пчаляру доўга, шчыра, ды, мабыць, не за мед, а за нешта іншае* А. Кулакоўскі. *Людвік прыняў падарунак ад старога пасечніка Духмяная рамка. залітая медам, была ў яго руках.* А. Кулакоўскі. *У ліхога бортніка горкі мед.* Прыказка.

**ПЫРХАЦЬ,** ФЫРКАЦЬ, ЧМЫХАЦЬ.
*Конік весела згрызаў маладую пахучую траўку і громка пырхаў.* Я. Колас. *У сані конь запрэжаны, б'е капытом ён, фыркае.* А. Астрэйка. *Ён змёрз і ўсё чмыхаў сваім малым пачырванелым носам.* К. Чорны.

**ПЫТАЦЬ,** ПЫТАЦЦА, РАСПЫТВАЦЬ, ЦІКАВІЦЦА СТАВІЦЬ ПЫТАННЕ.
*Дзе ты, мая доля, дзе ты, я пытаю?* Я. Колас. *Цікавілася, дзе ты зараз...* Ц. Гартны.

**ПЫШНА,** РАСКОШНА, БАГАТА, ШЫКОЎНА, ШЫКОЗНА, ШЫКАРНА З ШЫКАМ.
*Феерверкі электра пышна рассыпаліся ў паветры.* Б. Мікуліч. *Пакойчык быў абсталяваны раскошна: мяккая канапа ля сцяны, вышэй яе вялікае люстэрка ў прыгожай раме.* А. Чарнышэвіч. *Махаць касою аказалася шмат цяжэй, чым пугаю, з шыкам везучы пана.* Я. Колас.

**П'ЯНІЦА,** АЛКАГОЛІК; П'ЯНЮГА, П'ЯНЧУГА, ПРАПОЙЦА, ПІТОК, ПІТУХ, ПІТУН, ВЫПІВАКА, ЖЛУКТА, ЖЛУКТАЧ, ЛАЙДАК *(разм.)* РЫЦАР БУТЭЛЬКІ.
*Шынкар п'яніцу любіць, ды дачкі за яго не аддасць.* Прыказка. *На ліха было падбіраць гэтага п'янчугу? Няхай бы ляжаў пад плотам.* А. Асіпенка. *Той жлукта не прачынаўся б цяпер без гарэлкі* А. Пальчэўскі. *Рыцар бутэлькі з азартам цягне сівуху...* У. Каляснік.

**ПЯРО,** СТЫЛО *(перан.)*.
*Мы ж за пяро сталёвае ўзяліся – жыццё ўслаўляць і ваяваць за мір* М. Лужанін. *«Нябачанае, непараўнальнае» – эластычна паскрыпвала стыло ў карэспандэнцкіх блакнотах.* Б. Мікуліч.

**ПЯРЫНА,** ПУХАВІК.
*Аўгінка ўзбівае пярыны на двух высокіх кляновых ложках.* А. Асіпенка. *Як яна ўзбівала падушкі, пухавікі, каб Сашу было мякка спаць.* І. Навуменка.

**ПЯРЭСТЫ,** РАБЫ, ПЛЯМІСТЫ, КРОПЛЯСТЫ; ПЕРАПЯЛЕСЫ, ПЕРАПЯЛЯСЫ *(абл.)*.
*Хлапчук гоніць карову і пярэстае цяля.* Я. Брыль. *Улезла ў гразь рабая свіння, пачала качацца з боку на бок, смачна рохкае.* З. Бядуля.

**ПЯРЭЧЫЦЬ,** ПРАТЭСТАВАЦЬ; АГРЫЗАЦЦА, АСКІРЗАЦЦА *(разм.)*; ФЫРКАЦЬ (перан.) НЕ ЗГАДЖАЦЦА.
*А Сыч адчувае сябе камандзірам, ён камандуе і не можа цярпець, калі яму хто-небудзь пярэчыць.* Я. Брыль. *Бацька казаў ёй, што ды як рабіць, а яна фыркала.* М. Сергіевіч.

**ПЯСОК** /буйны: ЖАРСТВА, ЖВІР, ГРАВІЙ.
*Пясок на пляжы быў як прысак, аж падэшвы ног пёк.* Р. Сабаленка. *Гняды ўжо не бяжыць, а паўзе; калёсы скрыгацяць аб жарству.* А. Чарнышэвіч. *На досвітку камякі сырога жвіру глуха ўпалі на сасновае века труны.* К. Крапіва. *Якаў даў поўны газ, збіў на хаду шлагбаўм і па кучках мёрзлага гравію выскачыў наперад.* А. Кулакоўскі.

**ПЯТЛЯЦЬ,** ВІЦЦА, ЗВІВАЦЦА; ВІЛЯЦЬ, ВІХЛЯЦЬ, КРЫВУЛЯЦЬ *(разм.)*.
*Сцежка ў веску бяжыць, пятляе паміж надрэчных кустоў.* Я. Брыль. *І палямі і лясамі рэчка ўецца паясамі.* З. Бядуля. *Лінія фронту віхляе, пятляе.* І. Навуменка.

**ПЯЧОРА,** ГРОТ, НІША.
*На сценах і столі пячоры прыроднымі фарбамі намаляваны зубры, коні, кабаны* БелЭн. *Першы нырнуў у земную нішу Паўлюк.* І. Шамякін.

## Р

**РАБАВАЦЬ,** ГРАБІЦЬ.
*Разбойнікі хаваліся ў дуброве і рабавалі людзей.* А. Чарнышэвіч. *Уперадзе фронту ляцела чутка: легіянеры грабяць.* М. Лобан.

**РАБОТНІК,** ПРАЦАЎНІК, СУПРАЦОЎНІК.
*Даклад зрабіў сакратар рэдакцыі, затым выступілі многія работнікі рэдакцыі.* М. Хведаровіч. *Утым жа пісьме супрацоўнік Акадэміі навук раіў Міхасю, як іх [зярняткі] трэба пасеяць і даглядаць.* А. Якімовіч.

**РАБРО,** РАБРЫНА; ДРАБЫ *(мн.)*; ПАРЭБРЫНА *(разм.)*: СКАБА *(абл.)*.
*Пад голай жоўтай скурай рэбры хадыром хадзілі* З. Бядуля. *Наляжаліся – аж скабы забалелі...* В. Таўлай.

**РАГАЧ,** ГАРШЭЧНІК, ВІЛАЧНІК; ВІЛКІ *(мн.)*.
*Выбрала патрэбны рагач, пачала перастаўляць у печы чыгуны.* М. Лупсякоў. *Варушыць Аўгіння вілачнікам гаршчкі...* З. Бядуля.

**РАД,** ШЭРАГ, ШАРЭНГА, СТРОЙ, ЛАНЦУГ.
*На стале – букеты кветак, пляшак рад і чарак строй.* П. Панчанка. *Млечны шлях выплывае з імглы, азараючы шэраг зямлянак.* М. Танк. *Батальён, у дзве шарэнгі стройся!* П. Галавач.

**РАДАВАЦЬ,** ВЕСЯЛІЦЬ, ЦЕШЫЦЬ; САГРАВАЦЬ *(перан.)*.
*І на парошы след заечы заўсёды радуе мяне.* А. Бялевіч. *Цешыць сэрца селяніна збожжа новага ўраджай.* П. Трус.

**РАДАСНЫ,** ЖЫЦЦЯРАДАСНЫ, ВЯСЕЛЫ, УЦЕШНЫ; ЯСНЫ, РУЖОВЫ *(перан.)*
*Марылька гэтакая была жыццярадасная, гэтакая вясёлая Маладосць'* К. Чорны. *Вера пыхнула раптам ясным гарачым захапленнем* М. Зарэцкі.

**РАДЗІЦЦА,** РАІЦЦА, МЕРКАВАЦЦА, САЙМАВАЦЦА *(разм.)*; КАНСУЛЬТАВАЦЦА *(кніжн.)*.
*Бровы хмурыць камісар, з камандзірам радзіцца.* С. Дзяргай. *Згоднікі ж саймуюцца, як уладу выкрасці.* П. Глебка.

**РАЗАМ,** СУМЕСНА, СУПОЛЬНА, ЗААДНО, НЕРАЗЛУЧНА, КАЛЕКТЫЎНА; АГУЛАМ, ГУРБОЙ, ТАЛАКОЙ, ХОРАМ *(разм.)* *Ідвaix:* НА ПАРУ, У ПАРЫ РУКА Ў РУКУ, ПЛЯЧО Ў ПЛЯЧО, ПЛЯЧОМ У ПЛЯЧО, ПЛЯЧО ДА ПЛЯЧА, ПЛЯЧО К ПЛЯЧУ, ЗА КАМПАНІЮ, У КАМПАНІІ.
*Дык пачакай, разам пойдзем.* А. Якімовіч. *Трэба ж супольна вясці змаганне з гаспадарскім уціскам.* Ц. Гартны. *Збіраемся талакой па чарзе ў кожнай хаце шаткаваць капусту.* К. Чорны. *А людзі – гэта ж мудрацы. Cтануць плячо да пляча – вунь якая сіла.* А. Асіпенка.

**РАЗБАГАЦЕЦЬ,** ЗАБАГАЦЕЦЬ, ПАБАГАЦЕЦЬ, УЗБАГАЦЕЦЬ, АБАГАЦІЦЦА; НАЖЫЦЦА, АБЖЫЦЦА, РАЗЖЫЦЦА, ЗАЖЫЦЦА, ПАДНАЖЫЦЦА, АЗАЛАЦІЦЦА, АБРАСЦІ *(разм.)* НАБІЦЬ КІШЭНІ, ПАГРЭЦЬ РУКІ, СТАЦЬ НА НОГІ, ВЫБІЦЦА Ў ЛЮДЗІ.
*Тут, братка, можна разбагацець.* А. Чарнышэвіч. *Бедзен быў, хацеў разжыцца.* М. Гарэцкі. *Слухай гаспадара, сынок... Можа калі і выб'ешся ў людзі.* А. Асіпенка.

**РАЗБОЙ,** ПАГРОМ.
*Ці разбоем вы даставалі хлеб, што караюць вас горш за злодзеяў?* Я. Колас. *Гарады, мястэчкі танулі ў пагромах – не было збавення малому, старому.* Я. Купала.

**РАЗБОЙНІК,** РАБАЎНІК, ГРАБЕЖНІК, ПАГРОМШЧЫК, ГРАМІЛА, ДРАПЕЖНІК, БАНДЫТ, МАРАДЗЁР ПІРАТ, БАНДЗЮК *(разм.)*
*Ведаю. што не акрадзе мяне злодзей, не аграбіць разбойнік* Я. Купала. *А вораг есць вораг грабежнік і кат, не вер яму. гаду* Я. Колас. *Палескія лясы вялікія, есць дзе схавацца бандытам.* Я. Колас. *Хто будзе браць без дазволу камендата, той марадзёр.* А. Асіпенка.

**РАЗВАЛ,** РАСПАД, РАЗЛАД, ДЭЗАРГАНІЗАЦЫЯ.
*Думка яго гэтакая, што гэта Мікалай прычыніўся да развалу яго сям'і.* К. Чорны. *47 працэнтаў за лістапад – пагроза дэзарганізацыі работы дэпо.* Х. Шынклер.

**РАЗВАРЫСТЫ,** СОПКІ.
*Я стаяў ля печы, глядзеў на белую разварыстую бульбу, якая нават праз суткі не пачарнела...* Б. Сачанка. *Жонка наварыць вячэры – сопкай бульбы, да якой падасць кубак малака* П. Пестрак.

**РАЗВІДНЕЦЦА**, РАЗВІДНЕЦЬ; ВЫВІДНЕЦЬ, РАЗДНЕЦЬ, УДНЕЦЬ *(разм.).*
*Ужо добра развіднела, і ў вокны самалёта глянула радаснае сонца.* П. Кавалёў. *Была раніца, толькі што разднела.* Я. Колас.

**РАЗВІЦЦЁ,** РОСТ; РОСКВІТ, РАСЦВІТАННЕ *(выс.):* ПОСТУП, РАЗГОРТВАННЕ, СТАНАЎЛЕННЕ, ПРАГРЭС *(кніжы.)*
*Краіны росквіт просіць моцных рук, мінулае пахавана сучасным* У. Дубоўка. *Вы б во пажылі ў вёсцы адразу пасля вайны ды пасачылі за яе станаўленнем* М. Лупсякоў.

**РАЗВЯВАЦЦА,** ЛУНАЦЬ *(паэт.).*
*А сцяг развяваецца, віхрыцца над светам...* П. Пестрак. *Навекі зноў над ім лунае непераможны горды сцяг.* В. Вітка.

**РАЗГАЛІСТЫ,** РАЗГАТЫ, РАЗЛАПІСТЫ, РАЗЛОЖЫСТЫ, РАЗЛОГІ, РАСКІДЗІСТЫ, РАЗВІСЛЫ, РАСАХАТЫ *(абл.).*
*Высокія разгалістыя каштаны засланялі вокны першых і другіх паверхаў* Х. Жычка. *А ліпы тоўстыя. разложыстыя* Я. Скрыган. *З вярбой самотнай, расахатай абняўся месяц ля затокі...* М. Танк.

**РАЗДАРОЖЖА,** СКРЫЖАВАННЕ, РАЗВІЛІНА, РАЗВІЛАК, РАЗВІЛКА, РОСТАНЬ; ПЕРАСЕК, РАЗБЕЖАК *(разм.)* КРЫЖАВЫЯ ДАРОГІ, КРЫЖАВЫЯ ПУЦІНЫ.
*Там, на раздарожжы, я злезу – пайду напрамкі. бо там ужо недалёка* М. Лупсякоў. *На крыжавых пуцінах з ёю я сустрэўся – куды ісці, не ведала яна.* Я. Купала.

**РАЗМАХ,** РАЗГОН, РАЗБЕГ, РАЗБЕЖНАСЦЬ, УЗЛЕТ, ІМПЭТ *(перан.).*
*Гэй, хто стрымае наш творчы размах?* В. Таўлай. *Паравоз бег, набіраючы імклівы разгон.* М. Лынькоў. *Імчыцца наперад аўтобус, імпэт яго расце.* З. Бядуля.

**РАЗМОЎЦА,** СУРАЗМОЎНІК, СУБЯСЕДНІК.
*– Помніце гэта? – Помню, – адказаў я, ужо захапляючыся сваім размоўцам.* П. Пестрак. *Нейк нязручна гаварыць, калі не бачыш субяседніка* А. Асіпенка.

**РАЗУМНІК,** РАЗУМНЫ, МУДРЭЦ.
*Кажуць, што ў разумных – вялікі лоб.* Я. Брыль. *Цяпер ён стаіць як бы збоку ад усяго і са спакоем мудраца аглядае жыцце.* Я. Колас.

**РАЗЯВАКА,** РАЗЯВА, РАЗМАЗНЯ, РАСЦЯПА, ЦЮХЦЯЙ, ЦЕЛЯПЕНЬ, ЦЕЛЯПЕЙ; ЦЯЦЕРА, ВАРОНА *(перан.).*
*Няхай не будзе разявакам і кладзе грошы так. каб не губляць...* А. Пальчэўскі. *Вы расцяпа За харошае змагацца трэба.* К. Крапіва. *Ніхто там не пільнуе; гэтыя целяпні не сцемяць.* Я. Маўр.

**РАЙ,** НЕБА, ЭДЭМ *(перан.)* ЦАРСТВА НЯБЕСНАЕ.
*Рад бы ў рай, ды грахі не пускаюць.* Прыказка. *За гэта ксяндзы*

*ахвотна знімалі з іх грахі і абяцалі царства нябеснае.* А. Якімовіч.

**РАНЕЙШЫ,** БЫЛЫ, МІНУЛЫ, КОЛІШНІ, ДАЎНІ, ДАЎНЕЙШЫ, ТАГАЧАСНЫ, СТАРЫ, УЧАРАШНІ *(перан.).*

*Ранейшыя думкі аб смерці зноў лрыйшлі яму ў галаву* Я. Колас. *Даўняга бяссілля ўжо ў грудзях няма!* А. Гурло. *Яму цяпер здавалася, што мужыкі вазілі б бульбу і па старой цане.* А. Чарнышэвіч.

**РАСКЛАД,** РАСПАРАДАК, ГРАФІК, РЭГЛАМЕНТ.

*Іхні поезд – строга па раскладу – паімчыць да іншых гарадоў!..* К. Кірэенка. *Бабы не ўмеюць прасіць слова, не прывыклі гаварыць па рэгламенту.* М. Зарэцкі.

**РАСОЛ** /рыбны. ЛЁК.

*Гэта я нёс збанок гуркоў ад ястры. З расолам.* К. Чорны. *І смагне селядзец у лёку, ў лютай пары млее кроп.* Р. Барадулін.

**РАСПАЎСЮДЖВАЦЬ,** ШЫРЫЦЬ, ПАШЫРАЦЬ, ПУСКАЦЬ, РАСПУСКАЦЬ, СЕЯЦЬ, РАЗВОДЗІЦЬ, РАЗНОСІЦЬ; ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ, ПРАПАГАНДАВАЦЬ *(кніжн.)*

*Дома яны з Любай перапісвалі гэтыя зводкі ў некалькіх экземплярах і потым распаўсюджвалі па вёсцы.* І. Шамякін. *Гэта цесць, халера на яго, такую хлусню распускае.* І. Шамякін. *Дасягненні нашых хлопцаў варта папулярызаваць.* . Х. Шынклер.

**РАСПУСНІК,** БЛУДНІК, ЮРЛІВЕЦ, ДОНЖУАН, ЛАВЕЛАС, БАБНІК, ХАХАЛЬ, ЖАРАБЕЦ, БУГАЙ, КНЫР *(разм., груб.-праст )* КОТ МАРЦОВЫ.

*– Вон адсюль, мярзотнік! Распуснік!.. – крычала, як сама не свая, Валя.* Р. Сабаленка. *Гэта ж першы бабнік быў на ўсю губерню. Ніводная служанка з яго рук не выйшла.* К. Крапіва. *Чаго ж у вокны лез, смярдзюх?.. О, кот марцовы, гад плюгавы!* Я. Колас.

**РАСПУСТА,** РАЗБЭШЧАНАСЦЬ, РАЗЛАЖЭННЕ; ГРЭХ *(разм.);* БЛУД *(уст.).*

*Хто распусце раз аддаўся. кепскім будзе чалавекам.* Я. Купала. *Лепей далей ад граха – шалапута-жаніха.* . А. Бачыла.

**РАССТАННЕ,** РАЗЛУКА, РАЗВІТАННЕ. АДВІТАННЕ, АДЫХОД, АД'ЕЗД; РОСТАНЬ, РОЗВІТ, АДЫХОДАК, АДЫХОДЗІНЫ *(разм ).*

*Ёсць любоў на свеце, здрада і расстанне.* М. Багдановіч. *Сустрэліся ў апошнім развітанні рукі...* М. Танк. *– Абавязкова заеду, – паўтараю я сам сабе ўголас сказанае на розвіт...* Я. Скрыган.

**РАСЦІ,** ВЫРАСТАЦЬ, ВЫРОСТАЦЬ /бурна: БУЯЦЬ, ШУГАЦЬ; ШАЛЕЦЬ, ЦЯГНУЦЦА *(перан.).*

*Расці дубкам, расці, мужнець, над родным краем ім шумець...* П. Броўка. *На палянцы каля хаты ўлетку буяла крапіва ў рост чалавека.* З. Бядуля. *Як збажына шугаць пайшла...* П. Панчанка.

**РАСЦЭНКА,** ТАКСА.

*Рабочыя патрабавалі зняць вайсковы заказ з завода і павысіць расцэнкі.* Э. Самуйлёнак. *Яно такі і праўда дарагавата, Макар Піліпавіч Мы ж гэту таксу ўстанавілі яшчэ ў сорак пятым годзе.* К. Крапіва.

**РАСЧАРАВАЦЦА,** РАЗУВЕРЫЦЦА, ЗНЯВЕРЫЦЦА, СТРАЦІЦЬ ВЕРУ; АПЯЧЫСЯ *(перан.)* АПУСЦІЦЬ РУКІ.

*А што як яна спалохаецца яго – такога – ды расчаруецца?* М. Лупсякоў. *Я ні ў жыцці. ні ў людзях не зняверыўся, людскую ласку дбайна берагу.* П. Панчанка. *Я ўжо сёетое ведаю, апёкся раз на ўсё жыццё.* А. Чарнышэвіч.

**РАШУЧА,** КАТЭГАРЫЧНА.

*Стась прытрымаў яе і пачаў рашуча ўгаворваць ісці за яго замуж.* К. Чорны. *Рая катэгарычна адмовілася ўдзельнічаць у школьным хоры.* І. Шамякін.

**РВАЦЬ,** РАЗРЫВАЦЬ, ДРАЦЬ, ПАРОЦЬ; ШМАТАЦЬ, ШМАТАВАЦЬ, ШКУМАТАЦЬ, КАЛАШМАЦІЦЬ.

*Мільёны путы рабства рвуць.* А. Александровіч. *Спяць, ажно*

*храпуць. як бы суконкі драпі* Я. Купала. *Шматае вецер парусы..* А. Вольскі. *Тодар нервова калашмаціў газетны аркуш...* Х. Шынклер.

**РОДНЫ,** РАДЗІМЫ.

*Чуў родную песню – сам мерыўся пець, і скора пазнаў я сябе беларусам.* А. Гурло. *Васільковы брала колер на сваім радзімым полі...* У. Дубоўка.

**РОТ,** ЛЯПА, ЗЯПА, ПАШЧА *(разм.).*

*Шырока адкрыўшы рот, ён часта дыхаў, стараючыся стрымаць, заспакоіць гэта дыханне.* М. Лынькоў. *Воўк ад смагі шчэрыць зяпу...* С. Грахоўскі.

**РОЎНЯДЗЬ,** ГЛАДЗЬ; РАЎНІНА *(абл.).*

*Я ўглядаўся ў гэтую снежную роўнядзь, белую-белую, ажно балюча вачам.* І. Шамякін. *Лодка разганяецца, птушкай бяжыць па гладзі Дняпра.* М. Зарэцкі.

**РУКАПІС** /*старажытны:* МАНУСКРЫПТ *(кніжн.).*

*Рэдактар сядзіць нахілены над рукапісам з алоўкам у руцэ.* З. Бядуля. *Займаўся я, зразумела, не толькі татарскімі манускрыптамі.* В. Вольскі.

**РУЛЬ,** ШТУРВАЛ; АБАРАНАК *(разм.);* СТЫРНО *(уст.).*

*За рулём сядзеў трактарыст, ля плугоў – прычэпшчык.* А. Якімовіч. *І вернае трымаеш ты стырно!* А. Александровіч.

**РУЛЯ,** ДУЛА, СТВОЛ.

*Хто правярае аўтамат, хто рулю прачышчае.* М. Лужанін. *З сінянатага дула рэвальвера курыўся шызы дымок.* М. Лынькоў.

**РУЛЯВЫ,** СТЫРНАВЫ, СТЫРНІК *(уст.).*

*Рулявыя! Цвёрдымі рукамі сцісніце мацней штурвала медзь!* Х. Жычка. *Стырнавы, свой човен смела ты да волі накіруй!* М. Васілёк.

**РУХАЦЦА,** ІСЦІ, ПАДАВАЦЦА, ПРАБІРАЦЦА. БРАЦЦА, ПРАСОЎВАЦЦА, ПАСОЎВАЦЦА, СУНУЦЦА, КІРАВАЦЦА, НАКІРОЎВАЦЦА /*з вялікай хуткасцю:* ІМЧАЦЦА, МЧАЦЦА, МЧАЦЬ, ШЫБАВАЦЬ, НЕСЦІСЯ, МКНУЦЬ, ІМКНУЦЬ, КАЦІЦЦА, ПЕРЦІСЯ *(разм.)* /*рэгулярна у пэўным кірунку:* КУРСІРАВАЦЬ ПАДАВАЦЦА Ў ХОД, ТРЫМАЦЬ КІРУНАК, ТРЫМАЦЬ КУРС.

*Вуж рухаецца па зямлі даволі шпарка.* В. Вольскі. *Прабірацца па глыбокім снезе было цяжка.* М. Ткачоў. *Фронт з кожным днем пасоўваецца на захад...* Т. Хадкевіч. *З таго боку Прыпяці шыбуе човен.* Я. Колас. *Тры бамбавозы трымалі курс на паўднёвы ўсход.* У. Дамашэвіч.

**РУЧНІК,** УЦІРАЛЬНІК, ВЫЦІРАЛЬНІК *(абл.)* /*з доўгімі махрамі:* СКАРАЧ, ТРАЙКАЧ.

*Паліла яму на рукі, пасля паднесла ручнік.* П. Пестрак. *Бярэ дзед скарач, канцы ў вадзе мочыць, выкручвае, прылаўчаецца ямчэй па мухах сekануць.* Я. Колас.

**РЫБАК,** РЫБАЛОЎ /*хто ловіць вудаю:* ВУДЗІЛЬШЧЫК, ВУДАР *(абл.).*

*Сівая хваля ад калыскі калыша долю рыбакоў.* А. Вялюгін. *Сярод вудароў нямала дзяўчат. Такое рыбацкае захапленне мяне нават трошкі здзівіла...* Б. Сачанка.

**РЫЖЫ,** РУДЫ, ПАДЖАРЫ; АГНІСТЫ *(перан.).*

*Рыжы ліс за кустом водзіць рыжым хвастом.* З. Бядуля. *З аіру выскачыла. . рудая лісіца.* З. Бядуля.

**РЫСА,** ЛІНІЯ.

*Чорнымі рысамі вызначаліся канавы сярод пасеваў.* І. Дуброўскі. *Сонца агністым краем кранулася лініі гарызонту і пачало павольна тануць.* А. Чарнышэвіч.

**РЫСАВАЦЬ,** МАЛЯВАЦЬ.

*Толькі шкода – фарб замала, трудна будзе рысаваць* Цётка. *На акне сібірскія лівны хтось малюе смелаю рукой ..* А. Пысін.

**РЫХТАВАЦЦА,** ЗБІРАЦЦА, ВЫБІРАЦЦА, ГАТАВАЦЦА; ЛАДЗІЦЦА, ЛАДКАВАЦЦА, СТРОІЦЦА, МЕЦІЦЦА, ШЫКАВАЦЦА, ШЫХАВАЦЦА *(разм.).*

*На дварэ чырвонаармейцы рыхтаваліся ў паход.* К. Чорны. *Ен пачынаў збірацца на работу.* К. Чорны. *Гатавалася Аленка ехаць у дарогу* Я. Колас. *Француз, англічанін путы ўскласці меціўся* Я. Купала.

**РЫЧАГ**, ВАГАР, ВАГАВІК *(разм.).* *Роўна ходзіць рычаг меха, і паветраны струменьчык раздзьмухае хутка жар.* Х. Жычка. *І кіруюць рухам цэлым чалавек мо пяць у белым, на пляцоўках угары націскаюць вагары.* К. Крапіва.

**РЭВЕРАНС,** ПРЫСЯДАННЕ. *Дзяўчына ў чырвонай хустачцы няўмела прысядала, стараючыся зрабіць рэверанс* К. Чорны. *Такімі ж борздымі крокамі падышла яна і да госця, працягнула яму сваю дзіцячую руку, зрабіўшы прысяданне...* Я. Колас.

**РЭЗКА,** ВОСТРА, КРУТА, ПАРЫВІСТА, РЫЎКОМ. *Машыніст рэзка затармазіў. Заскрыгаталі колы.* І. Гурскі. *Раны востра забалелі.* М. Танк. *Казыча пальцамі ступні. Булыга парывіста прымае нагу.* Я..Колас.

**РЭПРАДУКТАР,** ГУЧНАГАВАРЫЦЕЛЬ, ДЫНАМІК, РУПАР. *З рэпрадуктара лілася прыемная мелодыя.* Л. Арабей. *На слупе рупар маршам загучаў...* А. Русецкі.

**РЭХА,** ВОДГУК, АДГУК, ВОДГУЛЛЕ, ВОДГАЛАС, ВОДГАЛАСАК, АДГАЛОСАК, АДГАЛОССЕ. РОЗГАЛАС, АДПЕЎ, ПОНЧАК, РЭЗАНАНС; ВОДЗЫЎКІ *(абл )* *Рэха паўтарала гром выбухаў, і яны здаваліся яшчэ страшнейшымі.* Р. Сабаленка. *Люблю я велічныя скалы. што водгук акіяну шлюць.* Е. Лось. *Ідзе Берлінам беларус. ад крокаў – адгалоскі* М. Лужанін. *Да таго ж ляскала, што аж пошчак разносіўся па двары.* М. Лобан.

**РЭЧАІСНАСЦЬ,** ЯВА, САПРАЎДНАСЦЬ, РЭАЛЬНАСЦЬ, ШТОДЗЕННАСЦЬ, ЗЯМНОЕ, ЖЫЦЦЁ, БЫЦЦЕ, БЫЛЬ, ПРАЎДА АБ'ЕКТЫЎНЫ СВЕТ, БЕЛЫ СВЕТ. *Адразу ж успрыняў ён гэту ўсю жахлівую рэчаіснасць. У камеру ўвайшлі трое турэмшчыкаў.* Я. Колас. *Прыемны сон цікавей непрыемнай явы* З. Бядуля. *Іншы раз Міканору здавалася, што ў жанчыны нейкае гора, што ёй белы свет не мілы.* А. Кулакоўскі.

**РЭЧЫШЧА**, ЛОЖА: РУЧВО *(разм ).* *І Прыпяць нават час пераадолеў: ад рэчышча старога ўбок адвёў...* У. Дубоўка. *Вось як цяпер, перада мною ўстае куточак той прыгожа. Крынічкі вузенькае ложа...* Я. Колас.

**РЭШАТА** /*з дробнаю сеткай.* СІТА, ПАДСІТАК. *Рэшатам вады не наносіш.* Прыказка. *Пшаніцу пытлявала цэлы дзень, мукі праз сіта насявала гурбы.* М. Аўрамчык.

# С

**САБАКА**, ПЁС /*вартавы:* АЎЧАРКА /паляўнічы: ГАНЧАК, ВАЎКАДАЎ; ЦЮЛІК, БАРБОС (разм.) /дваровы: ДВАРНЯК (разм.) /з кароткім ці ўрэзаным хвастом: КУРТА (разм.); ВАЎКАРЭЗ (абл.); ЦЮЦЯ, ЦЮЦЬКА *(дзіц.).* *На тое і сабака. каб брахаць.* Прыказка. *Толькі сівы кудлаты пёс не спускаўся з ланцуга...* П. Пестрак. *Барбоса пасадзілі на ланцуг.* У. Корбан. *Як цюцьку кормяць, так цюцька брэша.* Прыказка.

**САБРАЦЦА,** НАЗБІРАЦЦА, СКУЧЫЦЦА, СТОЎПІЦЦА /*пеша:* СЫСЦІСЯ, НАСЫХОДЗІЦЦА, ПАСЫХОДЗІЦЦА /*бягом* ЗБЕГЧЫСЯ, ПАНАБЕГЧЫ; СКУПЧЫЦЦА, ЗГРУДЗІЦЦА *(разм.),* ЗГРАМАДЗІЦЦА *(абл.);* ЗБІЦЦА, ЗЛЯЦЕЦЦА *(перан.).* *Пачынай, Лявон, сход, усе ўжо сабраліся.* П. Галавач. *Сышліся людзі і з навакольных весак.* К. Чорны. *Ля яго ўмомант згрудзіліся астатнія копнікі.* У. Дамашэвіч.

**САДАВІНА,** ПЛАДЫ, ФРУКТЫ *(мн.).*
*Восень развесіла барвы на дрэвах, спустошыла палеткі, абкалаціла садавіну.* Р. Сабаленка. *Красуе сад даспелымі пладамі...* Р. Няхай.

**САЖАЛКА** /*выкапаная:* КОПАНЬ, КОПАНКА, КАПАНІЦА, САДОК; СТАЎ, СТАВОК *(абл.).*
*Сажалка так і асталася нявыкапанай, і карысці ад яе нікому няма.* Я. Колас. *Копанкі былі такія глыбокія, што рэдка калі высыхалі.* В. Вітка. *Стаў дастаткова глыбокі...* А. Чарнышэвіч.

**САКАВІК,** МАРАЦ *(уст.).*
*Ужо канчаўся сакавік.На агародах добра падтаў снег...* М. Лобан. *Марац канчаецца, а снег яшчэ з поля не сагнала.* А. Макаёнак.

**САЛДАТ,** РАДАВЫ, БАЕЦ /*у польскім войску:* ЖАЎНЕР.
*Салдаты па двое ішлі за сяржантам.* Э. Самуйлёнак. *Вырас з радавога да капітана, камандзіра роты.* І. Шамякін. *Генерал быў бацькам сваіх байцоў.* К. Чорны. *Блішчыць сцюдзёна штык жаўнера...* М. Машара.

**САЛОМА** /*у снапах пасля ручнога абмалоту:* АКАЛОТ.
*– Тут салома ў застаронку, – ціха сказаў Васіль.* І. Мележ. *Увачавідкі расла гара акалоту і буйнага, як пацеркі, зерня.* А. Асіпенка.

**САМАБЫТНЫ,** СВОЕАСАБЛІВЫ, АРЫГІНАЛЬНЫ.
*Самабытныя таленты пазнаеш па той моўнай стыхіі, якую прынеслі яны ў свае творы з родных мясцін.* *У кожнай мове роля націску своеасаблівая.* У. Юрэвіч.

**САМАЛЁТ,** АЭРАПЛАН, ПАВЕТРАНЫ КАРАБЕЛЬ, ПАВЕТРАНЫ ЛАЙНЕР /*лёгкі:* АВІЕТКА /*бамбардзіровачны·* БАМБАРДЗІРОЎШЧЫК, БАМБАВОЗ /*для знішчэння варожай авіяцыі:* ЗНІШЧАЛЬНІК / *той, што пікіруе.* ПІКІРОЎШЧЫК /*знішчальны:* ЯСТРАБОК *(разм.)* /*варожы.* СЦЯРВЯТНІК *(перан. зняваж.)*
*Арлы-самалёты свідруюць прастор...* Я. Купала. *Тут дзеці заспрачаліся, што лепей – паравоз ці аэраплан.* Я. Колас. *На чарговым заходзе зноў раўлі пікіроўшчыкі.* В. Быкаў. *Гудуць, як восы, тонка ў небе ястрабкі.* А. Вялюгін.

**САМАЛЮБСТВА,** САМАЎПЭЎНЕНАСЦЬ, ГОНАР, ПЫХА, ЭГАІЗМ; ФАНАБЭРЫЯ *(разм.);* АПЛОМБ, АМБІЦЫЯ *(кніжн.).*
*Яе жаночае самалюбства было моцна абражана гэтым грубым адказам і балюча ўшчымлена.* Я. Колас. *Была ў постаці Макара цвёрдая самаўпэўненасць...* К.Чорны. *А можа фанабэрыі набралася, што ўжо не хоча і глянуць на яго?* Я. Колас. *У гэтай апошняй катэгорыі было вельмі многа тупога апломбу: я рэвізор, і ты перада мною дрыжы!* Я. Скрыган.

**САМАРОБНЫ,** УЛАСНАЙ РАБОТЫ /*пра тканіну:* САМАТКАНЫ, ДАМАТКАНЫ; САМАДЗЯЛКОВЫ, САМАДЗЕЛКАВЫ *(абл.).*
*У маленькім пакойчыку, на самаробным століку, было ў яго радыё.* К. Чорны. *На адной была звычайная брызентавая куртка, штаны з саматканага сялянскага сукна, відаць, такой жа свае ўласнае работы шапка...* М. Лынькоў.

**САМАЎПРАЎНА,** САМАПРАЎНА, САМАВОЛЬНА.
*Самаўпраўна ўсё, ні з кім не раішся?* А. Кулакоўскі. *У Хадулях сяляне самавольна падзялілі панскую зямлю і спалілі панскія свірны...* М. Зарэцкі.

**САМАЦЁКАМ,** СТЫХІЙНА *(перан.)* САМО ПА САБЕ, САМО САБОЮ.
*Было б наіўнасцю думаць. што далейшая дзейнасць гэтага калектыву можа ісці самацёкам.* У. Калеснік. *А на плошчы перад вакзалам стыхійна ўзнік мітынг.* І. Гурскі. *І нам няма чаго лезці на ражон. Усё прыйдзе само сабою.* М. Лобан.

**САНІ** /нізкія шырокія без спінкі: РАЗВАЛКІ /са спінкаю: ВАЗОК.

*Сані слізгаліся па роўным снезе, як лёгкі човен на возеры* З. Бядуля. *Далі каня, запрэжанага ў разваліі, кажух ..* І. Пташнікаў. *Паскрыпваў снег пад палазамі вазка.* М. Лынькоў.

**САНЛІВАСЦЬ,** ДРЫМОТА, МЛЯВАСЦЬ.

*А я яшчэ не мыюся, тата, гэта я толькі твар палашчу, каб санлівасць прагнаць.* А. Чарнышэвіч. *Ад маруднай язды на Грышку нападае дрымота.* З. Бядуля. *Ён яшчэ не скінуў з сябе соннай млявасці і дрыжаў ад студзёнасці...* К. Чорны.

**САНЦАПЁК,** ПРЫПЕК; СОНЦА *(перан.).*

*Днём на санцапёку ўжо дзвынкалі мухі, зрэдку залятапі аднекуль з палёў белыя матылі...* М. Лынькоў. *На сонцы было горача, хоць к вечару спёка змяншалася.* К. Чорны.

**САПЕРНІЧАЦЬ,** СПАБОРНІЧАЦЬ, ЗМАГАЦЦА, ЦЯГАЦЦА.

*Сабраныя ў гармонік халявы саперн*і*чаюць з сонцам. .* С. Гаўрусёў. *Яны доўга стаялі нерухома і глядзелі, як зямныя агні спаборнічалі з нябеснымі.* У. Шахавец. *Цяпер Афанасенка змагаецца за яшчэ большы ўраджай...* А. Куплакоўскі.

**САПРАЎДНЫ,** ПРАЎДЗІВЫ, БЯССПРЭЧНЫ, НЕПАДРОБНЫ, НЕПАДРОБЛЕНЫ, НЕПРЫТВОРНЫ, НЕАБВЕРЖНЫ, ДАКУМЕНТАЛЬНЫ: НАПРАЎДАШНІ *(абл.);* ЧЫСТЫ *(перан.).*

*Тут сапраўдным лесам вее, – страшна ў цёмным гушчары.* Я. Колас. *Бацька глядзіць на маці, на Ларыску, і ў вачах яго непадробны сум.* Л. Арабей.

**САПРАЎДЫ,** ПАПРАЎДЗЕ, НАПРАЎДУ, ДАПРАЎДЫ *(разм.),* НА СПРАВЕ, ПА СУТНАСЦІ *(кніжн.).*

*Бачыць пан: беднякова дачка сапраўды надта разумная.* А. Якімовіч. *За што яна яго любіць, калі, пасутнасці, яна павінна ненавідзець яго...* А. Васілевіч.

**САПСАВАЦЬ,** САПСУЦЬ, ПАПСАВАЦЬ, ПАГОРШЫЦЬ, СКЕПСЦІЦЬ, ЗГЛУМІЦЬ, ЗБУЗАВАЦЬ *(разм.).*

*Кашу маслам не сапсуеш.* Прыказка. *Мы можам зглуміць матэрыял. У нас няма майстроў-кажушнікаў.* А. Чарнышэвіч.

**САРАМЛІВЫ,** САРАМЯЖЫ, САРАМЯЖЛІВЫ, САРАМЯЖНЫ, ЦНАТЛІВЫ, КАНФУЗЛІВЫ; ЦІХМАНЫ *(абл.);* БАЯЗЛІВЫ, НЯСМЕЛЫ, НЕРАШУЧЫ *(перан.).*

*Сарамяжная дзяўчына стужкі ў косах русых мне...* А. Астрэйка. *Дый шчасце цнатлівае да палахлівасці, як дзяўчынка-пятнастоўка...* Б. Сачанка. *Яна нясмелая, усё маўчыць, ціхманая...* К. Чорны.

**САРОМЕЦЦА,** БЯНТЭЖЫЦЦА, КАНФУЗІЦЦА; СТЫДАЦЦА *(абл.);* ЧЫРВАНЕЦЬ *(перан.)* ; СВЯЦІЦЬ ВАЧАМІ.

*Кінь саромецца мовы сваёй, зваць сябе беларусам пачні...* М. Чарот. *І калі ён называў яе не «Волька», а «Волечка», яна чырванела і бянтэжылася.* К. Чорны. *Дзяўчына слухала яго, чамусьці сама канфузілася і старалася хутчэй пайсці ад Казіка.* М. Даніленка.

**САСТАРЭЦЬ,** САСТАРЫЦЦА; АГРЫБЕЦЬ *(абл.);* ССІВЕЦЬ, ПАСІВЕЦЬ *(перан.).*

*Каб па добрасці, то бацька састарэў – лепшы пінжак ідзе сыну.* К. Чорны. *Жаніўся – хлеб горкі прымацкі, ссівеў. а свайго і не еў.* Х. Жычка.

**САЧЫЦЬ,** НАГЛЯДАЦЬ, НАЗІРАЦЬ, ЦІКАВАЦЬ, ВЫЦІКОЎВАЦЬ, ПІЛЬНАВАЦЬ, СЦЕРАГЧЫ; ПАЛЯВАЦЬ *(перан.)* НЕ СПУСКАЦЬ ВОКА, НЕ СПУСКАЦЬ ВАЧЭЙ, ІСЦІ НАЗІРКАМ, ХАДЗІЦЬ ПА ПЯТАХ.

*Маленькай была – усюды лазіла, так і сачы за ёй.* П. Галавач. *Міколка назіраў за пераездам цераз чыгунку.* М. Лынькоў. *Выцікоўваеш, як шпіён?* А. Чарнышэвіч. *Вачэй не спускала паліцыя.* І. Навуменка.

**СВАБОДА,** НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, САМАСТОЙНАСЦЬ, ВОЛЯ, ВОЛЬНАСЦЬ, ВОЛЬНІЦА, РАЗГАРНЕННЕ, РАЗДОЛЛЕ, РАЗВАРОТАК *(разм.),* РАЗГОН *(перан.)*

*Цяжка жыць было народу, путы, здзек вакол, і змагацца за свабоду бацька твой пайшоў.* Я. Купала. *Дык умейце свята бараніць чэсць і незалежнасць свайго краю.* К. Буйло. *І тут навокал твае поле, – раздолле тут табе і воля!* Я. Колас.

**СВАВОЛІЦЬ,** СВАВОЛЬНІЧАЦЬ, ГАРЭЗАВАЦЬ, БЛАЗНАВАЦЬ; ДУРЭЦЬ *(разм.);* БЯЗУЛІЦЬ, БАЙБУСАВАЦЬ *(абл.)* ВЫТВАРАЦЬ ШТУКІ, ВЫКІДВАЦЬ ШТУКІ, ХАДЗІЦЬ НА ГАЛАВЕ, ЗАЙМАЦЦА ДУРЫКАМІ.

*Хацелася яшчэ больш бегаць і сваволіць, але прыходзілася стрымлівацца: цяпер ён у класе.* Я. Колас. *Менш блазнаваў. Сяргей стараўся трымацца па-даросламу.* М. Гроднеў. *Кінь ты дурыкамі займацца – узняўся ні свет ні зара.* М. Лынькоў.

**СВАВОЛЬНІК,** ГАРЭЗА, ГАРЭЗНІК, ШЫБЕНІК, ШЫБЕЛЬНІК, РАСПУСНІК, БУЯН; ДУРАСЛІВЕЦ, ДУРОНІК, БАЛАЎНІК, ПРАКУДА, БУЗУН, ЖЭЎЖЫК, ВІСУС, НЯЎРЫМСТА *(разм.),* РЭСПУСТ, НАКОЛЬНІК, УЗРЭЗ, АТОРВА *(абл.),* РАЗБОЙНІК *(перан.).*

*Знянацку віскнула дзяўчына, якую ўшчыкнуў ці паказытаў гарэзахлопец.* І. Мележ. *Чаго табе за бацькам? Я табе пакажу, распуснік.* Ц. Гартны. *Ціхі, ветлівы. Не бузун.* М. Лупсякоў. *Ах вы, разбойнікі! Ну чаго ж вы стаялі там? А як павырасталі...* Я. Брыль.

**СВАРКА,** ЗВАДКА, ГРЫЗНЯ; КАЛАТНЯ, КАЛАТНЕЧА, БУРКАТНЯ *(разм.),* НЕЛАДЫ *(разм., мн.);* БУЧА *(абл.);* БАТАЛІЯ, ПЕРАПАЛКА *(перан.).*

*Пакінем сварку гэтую нарэшце: павінны мы прыйсці да нейкай згоды.* П. Глебка. *Няма тае хаткі, каб не было звадкі.* Прыказка. *Буркатня адна, пагрозы, вокам ласкі не зірне.* Я. Колас.

**СВАРЫЦЦА,** ЛАЯЦЦА, СПРАЧАЦЦА; КАЛАЦІЦЦА, ГЫРКАЦЦА, ЦАПАЦЦА *(разм.);* ГРЫЗЦІСЯ *(перан.)* РАЗЫГРЫВАЦЬ СЦЭНЫ.

*Няхай князі спрачаюцца паміж сабой, ім патрэбна ўлада і багацце...* Б. Мікуліч. *Не лаяўся, не грызся з дзеўкамі, не бузаваў.* М. Лынькоў.

**СВАЯК,** СВОЙ, РОДНЫ; РАДНЯ *(зб.);* РОДЗІЧ *(разм.),* РАДНЯК, КРЭЎНЫ *(абл.).*

*Мы з табою сваякі, швагры...* К. Чорны. *А хлопчыка ўзяла радня, каб абярнуць і яго ў служку.* Я. Колас.

**СВЕДКА,** ВІДАВОЧЦА, ПАНЯТЫ /*на дуэлі:* СЕКУНДАНТ *(уст.).*

*– Маеш, цыган, сведкі? – А як жа! Жонка і дзеткі.* Прымаўка. *Госць і абодва панятыя затрыманы для падпісання пратакола.* А. Асіпенка.

**СВІТАННЕ,** РАССВІТАННЕ, ДОСВІТАК, ДАСВЕЦЦЕ, ЗОЛАК, ЗАРА, ЗАРАНІЦА; СВІТАНАК *(разм.);* ДЗЯННІЦА *(паэт.).*

*Вецярок, гэты разведчык летняга світання, нёс з сабою водар хвойніку, палявых траў і кветак.* А. Кулакоўскі. *Вецер улёгся – набліжаўся досвітак.* Т. Хадкевіч. *А там надыдзе касавіца – ўставай, чуць гляне зараніца...* Я. Колас.

**СВІТАЦЬ,** РАССВІТАЦЬ, СВЯТЛЕЦЬ, ДНЕЦЬ, ВІДНЕЦЬ, РАЗВІДНЯЦЦА, РАЗВІДНЯЦЬ, РАЗВІДНІВАЦЬ, РАЗВІДНІВАЦЦА, ЗАРЭЦЬ, ШАРЭЦЬ БРАЦЦА НА СВІТАННЕ, БРАЦЦА НА СВІТАНАК, БРАЦЦА НА РАННЕ, БРАЦЦА НА ДЗЕНЬ, ЗАЙМАЦЦА НА ДЗЕНЬ, БРАЦЦА НА ВІДНО, ЗАЙМАЦЦА НА СВЕТ, БРАЦЦА НА ЗОЛАК, ЗАЙМАЦЦА НА ЗОЛАК.

*Рассвітае.. З пасцелі-бярлогу падымаюцца сонныя дзеці.* П. Трус. *А цяпер хадзем. Хутка пачне развідняць.* П. Галавач. Бярэцца на дзень. Святлее. З. Бядуля. *Толькі на золак пачало брацца, а ён ужо быў у дарозе.* Я. Скрыган.

**СВЯТЫ**, СВЯШЧЭННЫ, БОСКІ.
*Сведкаю будзе хай бог нам святы, што мы з вамі па духу браты* К. Крапіва. *Ужо не чакае сямейка дабра, аж тут, як воляю боскай, доктар адзін па дарозе з двара ехаў, заехаў і ў вёску.* Я. Купала.

**СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ**, ЗЯМЕЛЬНЫ, АГРАРНЫ.
*Аржанец пачаў расказваць пра новы закон аб сельскагаспадарчым падатку.* Я. Брыль.

**СЁМУХА**, ТРОЙЦА *(абл.).*
*Сёння тройца. У нашым баку яе завуць сёмухай.* І. Пташнікаў.

**СІВЫ**, ПАСІВЕЛЫ, ССІВЕЛЫ, БЕЛЫ, СЕРАБРЫСТЫ, СРАБРЫСТЫ *(перан.).*
*Перад натоўпам застаўся стаяць сівы стары.* Э. Самуйлёнак. *Ён трохі згорбіўся, аброс густой серабрыстай шчацінай...* М. Нікановіч.

**СІЛА**, МОЦ, ДУЖАСЦЬ, МАГУТНАСЦЬ.
*Ці ж мы, хлопцы, рук не маем? Ці ж нам сілы бог не даў?* Я. Колас. *Пачуў столькі ў сабе моцы, што дубы вярнуў бы!* М. Чарот.

**СІНІ**, БЛАКІТНЫ, ВАСІЛЬКОВЫ, ВАЛОШКАВЫ.
*Неба – высокае, сіняе вісіць над полем...* К. Чорны. *Васільковыя вочы пазіраюць спагадліва.* І. Навуменка.

**СІНЬ**, СІНЯВА, ПРОСІНЬ, БЛАКІТ, БЛАКІТНАСЦЬ; ЛАЗУРАК *(перан.).*
*У такую пору нягорача свеціць сонца і далёка відаць спакойная сінь далёкіх нябёс.* Я. Скрыган. *Хоць бы маленькая прыкмета – усміхнулася неба сінім лазуркам, выпусціла праменьчык сонца!* Ц. Гартны.

**СІНЯК**, ПАДЦЁК, КРЫВАПАДЦЁК; ЛІХТАР, ФАРА *(перан.).*
*Угледзеў сінія крывападцёкі на твары, нахмурыўся.* М. Лынькоў. *Не для ўсіх скончылася шчасліва: хто сіняк зарабіў, хто ліхтар на ілбе, а хто дык і рэбер не далічыўся.* Я. Колас.

**СКАВАРАДА**, ПАТЭЛЬНЯ.
*Запішчалі ў печы скваркі, аж звініць скаварада.* Я. Колас. *Гарачая, пахучая патэльня з салам стала на стол.* П. Пестрак.

**СКАЗ**, ВЫРАЗ, ФРАЗА.
*Вясковы, беларускі акцэнт не псаваў, а як бы скрашваў высечаныя з граніту сказы.* Ц. Гартны. *Ён борздзенька перапраўляў тэкст, мяняў словы, выразы, касаваў цэлыя строфы.* Я. Колас.

**СКАКАЦЬ**; ВЫБРЫКВАЦЬ, ГОЦАЦЬ, ГАЦАЦЬ *(разм.).*
*Скача, як каза.* Прымаўка. *Ногі лёгкія, галава таксама, чаму ім не выбрыкваць!* К. Крапіва. *Часамі ад куста да куста ляніва гоцаў растлусцелы заяц.* А. Карпюк.

**СКАРДЗІЦЦА**, ЖАЛІЦЦА, БЕДАВАЦЬ, ПЛАКАЦЬ, ПЛАКАЦЦА; ЖУРЫЦЦА, НЫЦЬ, БУРЧАЦЬ, ХНЫКАЦЬ *(разм.)* _ ПУСКАЦЬ СЛЯЗУ.
*Часамі прыходзілі сяляне і скардзіліся, што іх толькі-толькі абрабавалі немцы.* М. Лынькоў. *Сірата сіраце жаліцца.* Прыказка. *Тупай, тупай, весяліся, прапіў грошы – не журыся...* Я. Колас. *Адны бурчаць на маруднасць трамвая...* Р. Барадулін.

**СКВАПНЫ**, КВАПНЫ, ХЦІВЫ, ЛАСЫ, ЛАКОМЫ, ПАДКІ; АХВОЧЫ, ПАНАДЛІВЫ, ПАМАЎЗЛІВЫ *(разм.);* НЯЎТОЛЬНЫ, НЕНАЕДНЫ, НЕНАЖЭРЛІВЫ *(перан.).*
*На наш прастор ніколі не ступіць вораг сквапны.* П. Глебка. *Хцівы бацьку прадаў бы.* Прыказка. *Не будзь ласы на чужыя каўбасы.* Прыказка. *Але от ненажэрлівымі людзі пасталі. Вечна ім мала.* Я. Скрыган.

**СКІВІЦА**, ПАШЧЭНКА *(абл.).*
*Сківіца заядла хадзіла, як у сячкарні нажы.* К. Чорны. *Цяжкія пашчэнкі пад прамым вуглом да шыі варушыліся.* У. Дамашэвіч.

**СКЛАД**, СХОВІШЧА, СХОВА, БАЗА, ПАКГАУЗ /*для збожжа.* ЭЛЕВАТАР /*для зброі:* АРСЕНАЛ.

*Чарговы нарад грузчыкаў займаўся ў гэты час упарадкаваннем складаў.* М. Лынькоў. *Набіты ўсялякім дабром былі таксама пакгаузы і прыстанцыйныя баракі.* У. Мехаў. *Вінтовак і аўтаматаў у нас – цэлы арсенал.* У. Калеснік.

**СКЛАДКА,** ЗБОРКА, ФАЛДА, ФАЛЬБОНА.

*І на Ларысе белая блузка і сіняя спаднічка ў складачку.* Л. Арабей. *Гімнасцёрка пад папругай у роўных зборках.* І. Грамовіч. *А Міхаська ўжо стаіць ля спадніцы. Збірае ў пальчыкі фальбоны.* Я. Скрыган.

**СКЛЕП,** ПОГРАБ, ПАДВАЛ, ЯМА, ПАДМОСЦЕ *(абл.).*

*Бульба яшчэ з свайго пограба вялася, а хлеба патрошкі ў камбедзе давалі.* М. Лобан. *Там ямы, там хаваюць на зіму бульбу.* І. Пташнікаў.

**СКРУТАК,** СУВОЙ, РУЛОН.

*Ён выцягнуў з кутка скрутак у газетнай паперы і сабраўся.* К. Чорны. *Уецца дарога ў дальні раён, нібы разматаў хто бясконцы рулон.* А. Пысін.

**СКРЫНКА** /*невялікая для дробных рэчаў:* ШКАТУЛКА /*у стале, шафе:* ШУФЛЯДА.

*Не даходзячы двух кварталаў, абмацаў пісьмо ў кішэні і вярнуўся адшукаць паштовую скрынку.* Ц. Гартны. *Пасля адным махам рукі схавала паперы ў шуфляду і ўстала.* К. Чорны.

**СКРЭБЦІ,** ШКРАБАЦЬ, ШКРЭБАЦЬ *(разм.);* ДРАІЦЬ *(спец.). Галлём па шыбіне скрабе вішняк.* М. Машара. *Каму свярбіць, той драпае.* Прыказка.

**СКУБЦІ,** ГРЫЗЦІ, ШЧЫПАЦЬ.

*Скубуць траву на выгане каровы...* А. Астрэйка. *Грызуць мурог папутаныя коні, дзе-недзе звон сарвецца з капытоў.* М. Танк. *Шчыпле траву калгасны табун...* З. Бядуля.

**СКУПЕЦ,** ХЦІВЕЦ; ЗАЦІСКАЙЛА *(разм.);* СКУПЯРДЗЯЙ, СКУПЯРДЗЕЙ, СКУПЯНДЗЯ, СКАРЭДА, СКНАРА, СКВАПЕНЬ, СКВАЛЫГА, ЖМІНДА, ЖМОТ *(разм, зняваж.);* ЖЫЛА, ПЛЮШКІН *(перан.).*

*Валін бацька не быў скупец і жмінда. Ён проста ведаў цану капейцы.* Р. Сабаленка. *Мужык яе сквапны быў, як апошні скупярдзей* А. Асіпенка. *Жыла ён, індывідуаліст, сукін сын!* І. Шамякін.

**СЛАБАСЦЬ,** АСЛАБЕЛАСЦЬ, НЯДУЖАСЦЬ, БЯССІЛЛЕ, БЯССІЛЬНАСЦЬ, ЗНЯСІЛЕНАСЦЬ, ЗНЯСІЛЕННЕ, ЗНЯМОГА, ЗНЕМАЖЭННЕ, ЗНЯМОГЛАСЦЬ, ЗНЯМОЖАНАСЦЬ, ЗМОГА, НЯМОГА, ЗМОРАНАСЦЬ, НЕДАМАГАННЕ, КВОЛАСЦЬ, СТОМА, СТОМЛЕНАСЦЬ, СТАМЛЕННЕ, ПЕРАТАМЛЕННЕ, ЗМОРА, ЗДАРОЖАНАСЦЬ, УПАДАК СІЛ, ЗАНЯПАД СІЛ; НЕМАЧ, НЕМАГАТА *(разм.);* ГНІЛАСЦЬ *(перан.).*

*У Алеся балела ў баку, балела левая нага, і слабасць знясільвала цела.* В. Быкаў. *Гэтак старасць прыйшла, назаляе нядужасць...* М. Лужанін. *Я падаў ад знясілення.* М. Лужанін. *Балелі рукі, млелі ногі, старыя падалі ад змогі...* П. Глебка. *У вачах туман, немач у нагах.* Я. Купала.

**СЛЕД,** ЗНАК, ТРОП.

*Снег зверху зараз жа замятае сляды.* З. Бядуля. *І скрозь цямраную затопу не возьмуць следу яго, тропу, і тут глядзець на ўсё зручней.* Я. Колас.

**СЛЕДСТВА,** ДАЗНАННЕ, ДОПЫТ.

*Акрамя гэтага, ёсць яшчэ камеры для тых, каго дапытваюць, і для тых, чый лёс ужо вырашаны, пасля сканчэння следства.* І. Мележ. *Часта арыштаваных выклікаюць на допыт.* А. Якімовіч.

**СЛІНА;** АСЦА *(абл.).*

*Запаліў запалку, знайшоў мех, плюнуў у руку, загасіў у сліне запалку...* З. Бядуля. *Шмігельскі ледзь яблыкам не ўдавіўся. Асцы поўны рот набегла, і ён цвыркнуў на ток.* М. Лобан.

**СЛУГА,** СЛУЖКА, ПРЫСЛУЖНІК, ПРЫСЛУГА, РАБОТНІК, НАЙМІТ, ПАДРУЧНЫ /*на сельскагаспадар-*

*чых работах:* ПАРАБАК, БАТРАК; СЛУЖАКА, СЛУЖБАК, СЛУЖЭБНІК, ПАПІХАЧ, ПАПІХАЙЛА, ПАСЛУГАЧ, ХАЛУЙ *(разм.);* ЛЁКАЙ *(уст.),* ВАСАЛ *(перан.).*
*Памятай, што я твой гаспадар, а ты мой слуга!* Э. Самуйлёнак. *Бацька парабкам у пана – на рабоце цэлы дзень.* П. Броўка. *Лепш мецць справу з гаспадаром, чым з яго халуем.* І. Навуменка.

**СЛУП** */у будынку, варотах ці агароджы.* ШУЛА, ПАЛЯ *(спец.).*
*Без слупоў верставых, не пытаўшы дарогі, мае сэрца заўсёды трапляе дамоў.* М. Лужанін. *Паламаліся вароты, трэба папраўляць шулы – хіба гэта ёй пад сілу?* Я. Скрыган.

**СЛЯПІЦЬ,** АСЛЯПЛЯЦЬ РЭЗАЦЬ ВОЧЫ, ЗАСЦІЛАЦЬ ВОЧЫ.
*Бліскучы і крохкі снег сляпіў вочы.* З. Бядуля. *Крыўда засцілае вочы і перашкаджае бачыць рэчы ў іх сапраўдным святле.* К. Крапіва.

**СМАЛА,** СМОЛКА, ЖЫВІЦА.
*Мацней запахла хваёваю смалой і гнілой карою.* К. Чорны. *На вішнях смолка сочыцца з кары.* А. Вялюгін. *Смачна пахне жывіцай, што ліпне да рук цесляроў.* Я. Брыль.

**СМАЧНА,** СА СМАКАМ, У СМАК, АПЕТЫТНА НЕ АД'ЯСІСЯ.
*Смачна было, ды блізка дно.* Прыказка. *Са смакам елі і багата – на тое ж даў бог людзям свята.* Я. Колас. *Апетытна пахла селядцамі.* П. Пестрак.

**СМЕРЦЬ,** ГІБЕЛЬ, ПАГІБЕЛЬ, ЗГУБА, ЗАГУБА, СТРАТА, СКОН, СКАНАННЕ, КАНАННЕ, ЗГІНЕННЕ, ЗВОД; ХАЛЭМУС, КАЮК, КАПУТ *(разм.);* ЗДЫХАТА *(разм. зневаж.);* ЗАГІБЕЛЬ, ЗАГІН, ГАМОН, КАДУК *(абл.),* УПАДКІ *(абл., мн.).* МАГІЛА, КАНЕЦ, КАНЦЫ, КАПЕЦ, КАПЦЫ, ПЛАХА, ПЯТЛЯ, ТРУБА *(перан.)* ВЕЧНЫ СОН, РАССТАННЕ СА СВЕТАМ.
*Дзяўчыне вяселле, а карове смерць.* Прыказка. *Здрада хітрая моўчкі нам гібель віла.* П. Панчанка. *Не праціўся лепш Ахрэму: дасць па карку і халэмус!* Я. Колас. *І сям'я загіне, і самому капут.* К. Крапіва. *Жыццё маё залежыць ад кахання канец кахання дасць мне вечны сон.* У. Шэкспір, перакл. У Дубоўкі.

**СМЕТНІК,** ЗВАЛКА.
*На сваім сметніку і певень смелы.* Прыказка. *Частку гэтага вугалю ён браў з тэндэра, а частку дабіраў на звалцы, дзе паравозы выграбалі дзындру* М. Лобан.

**СМЕШНЫ,** СМЕХАТЛІВЫ, ВЯСЁЛЫ, ЖАРТОЎНЫ, ЗАБАЎНЫ, ПАЦЕШНЫ; ФАЦЭТНЫ *(абл.);* АНЕКДАТЫЧНЫ *(кніжн.).*
*Ён складваў смехатлівыя вершы аб панах і шляхце.* З. Бядуля. *Ну і пацешныя ж былі гэтыя машыны! У кожнай – шыя і дзюба.* Я. Маўр.

**СМОЎЖ,** СЛІМАК.
*Ускарабкаўся ён на каняку, нібы смоўж да апенькі прыліп.* З. Бядуля. *Сустрэўся жук аднойчы з рагатым слімаком.* М. Танк.

**СМУРОД,** ТХЛІНА.
*Ад ануч яго несла страшэнным смуродам.* А. Чарнышэвіч. *За змену целагрэйкі прамакалі навылёт і пачыналі пахнуць нейкаю балотнаю тхлінай.* С. Грахоўскі.

**СМУТАК,** ЗАСМУЧЭННЕ, НЕВЯСЁЛАСЦЬ, СУМ, СУМОТА, ПАНУРАСЦЬ, ПАНЫЛАСЦЬ, СКРУХА, ЖАЛЬ, ЖАЛЬБА, ЖАЛОБА, МАРКОТА, МАРКАТА, ГОРЫЧ, ГОРНАСЦЬ, ТУГА, НУДА, НУДОТА, ЖУРБА, ЖУРБОТА, ЖУРБОТНАСЦЬ, ТУСКНОТА *(абл.);* ЧАРНАТА, ГАРКАТА, ЦЕНЬ, ХМАРА *(перан.).*
*Дык іграй весялей, гані смутак з грудзей...* М. Чарот. *Апусцелыя палі і лугі навявалі сум.* А. Чарнышэвіч. *Жальбы не сцішыш плачам.* П. Броўка. *І агорне журба нейка, няміла нічога .* Я. Колас. *На чало маладое хмара чорная пала...* П. Броўка.

**СМЯЛЬЧАК,** АДВАЖНЫ, ХРАБРЭЦ, ГЕРОЙ; СМЯЛЯКА, ЗУХ, ХВАТ, РЫЗЫКАНТ *(разм.).*

*А тут яшчэ нейкі смяльчак у форме нямецкага афіцэра зайшоў у камендатуру і сярод белага дня застрэліў каменданта.* Б. Сачанка. *За маўклівай чорнаю гарою з ворагам змагаюцца героі.* П. Панчанка. *Зух супраць мух.* Прымаўка.

**СНЕГ** /*свежы:* ПАРОША.

*У гародчыках каля хат за пасівелымі частаколамі намецены гурбы снегу.* Я. Колас. *Дзень пачынаўся марозны, хоць пакуль што ціхі, толькі зверху сыпалася сухая дробная пароша.* А. Кулакоўскі.

**СОК** /*з бярозы:* БЯРОЗАВІК.

*Да бярозы белай прыхінуся, – буду прагна піць салодкі сок.* П. Панчанка. *Калі закапае ў збаны бярозавік з бярозы?* А. Бялевіч.

**СОННЫ,** САНЛІВЫ, САНЛЯВЫ, ЗАСПАНЫ, ДРЫМОТНЫ; ВЯЛЫ *(перан.).*

*Надзя асцярожна распранула яго, напаіла ўжо соннага малаком, занесла на ложак.* М. Лынькоў. *«Пасажыр» яшчэ сядзеў дрымотны на каламажцы.* З. Бядуля.

**СОРАМНА,** СОРАМ, БРЫДКА, НЕПРЫСТОЙНА.

*Як вам не сорам спаць дасюль.* Р. Мурашка. *Ісці да моладзі, піць з імі гарэлку і хадзіць п'янаму па вуліцах было брыдка.* А. Чарнышэвіч.

**СОСКА,** ПУСТЫШКА.

*Плача ў калысцы з соскай пустой дзіця...* М. Танк. *Не, не яму, як дзіцяняці, бясконца ўсё пустышку ссаць...* С. Дзяргай.

**СПАГНАЦЬ,** СЫСКАЦЬ; САРВАЦЬ *(разм.).*

*Хтосьці прыехаў з раёна спагнаць з яго штраф.* К. Чорны.

*– Адрабіў ты яму, аджала яму твая жонка ці не?.. – Цяпер трасцы, не сышча.* К. Чорны.

**СПАДЗЯВАЦЦА,** ЧАКАЦЬ, ПАКЛАДАЦЦА, РАЗЛІЧВАЦЬ, ЗДАВАЦЦА УСКЛАДВАЦЬ НАДЗЕЮ, ПАКЛАДАЦЬ НАДЗЕЮ, МЕЦЬ НАДЗЕЮ, ЖЫЦЬ НАДЗЕЯЙ, НАСІЦЬ НАДЗЕЮ, РАСЦІЦЬ НАДЗЕЮ, НЕ ТРАЦІЦЬ НАДЗЕІ, НЕ КІДАЦЬ НАДЗЕІ, ЦЕШЫЦЬ СЯБЕ ІЛЮЗІЯЙ, ЖЫЦЬ ДУМКАЙ, ПЕСЦІЦЬ ДУМКУ, ГАДАВАЦЬ ДУМКУ, РАБІЦЬ СТАЎКУ.

*Без бацькі жыве, спадзявацца няма на каго.* М. Лупсякоў. *Разлічвайце на свае сілы.* У. Шахавец. *Вайтовіч шчыра верыў і не траціў надзеі.* А. Пальчэўскі. *Яна даўно ўжо думку песціла, што Ігнась яе выйдзе ў людзі.* Р. Мурашка.

**СПАДЧЫНА** /*бацькоўская:* БАЦЬКАЎШЧЫНА; СПАДАК *(разм.);* СПАДКІ *(разм., мн.).*

*Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына; паміж сваіх і чужакоў яна мне ласкай матчынай.* Я. Купала. *Што той вінават, што лепш жыве за яго. Здаецца ж, бацькаўшчыну без крыўды падзялілі...* К. Чорны.

**СПАЗНІЦЦА,** АПАЗНІЦЦА, ЗАПАЗНІЦЦА, ЗАТРЫМАЦЦА, ЗАБАВІЦЦА.

*О, хоць бы не спазніцца мне, паспецьтуды, дзе вучаць сябраваць і пець!* Е. Лось. *Забавіўся недзе, я яго таксама чакаю.* Я. Скрыган.

**СПАЛІЦЬ;** СПАПЯЛІЦЬ; СПЕЙКАЦЬ *(абл.);* СПЯЧЫ, ВЫСМАЛІЦЬ, ВЫКАЦІЦЬ *(перан.)* ПУСЦІЦЬ АГНЁМ, ПУСЦІЦЬ ДЫМАМ, ПУСЦІЦЬ З ДЫМАМ.

*З будынкаў, што немцы спалілі, астаўся адзін катушок...* Я. Колас. *Усе сёлы агнём высмалілі.* Р. Няхай. *А як памагчы пусціць дымам фашысцкія склады?* А. Рылько.

**СПАЛОХАЦЦА,** НАПАЛОХАЦЦА, ПЕРАПАЛОХАЦЦА, СПУЖАЦЦА, НАПУЖАЦЦА, ПЕРАПУЖАЦЦА, СПУДЗІЦЦА, УПУДЗІЦЦА, ЗБАЯЦЦА, ЖАХНУЦЦА, ЗЖАХНУЦЦА; УТРУПЕЦЬ, УТРУПЯНЕЦЬ, ЗДРЭЙФІЦЬ *(разм.);* АСТРАШЫЦЦА, ЗЛЯКАЦЦА, СТРУСІЦЬ *(абл.);* АБАМЛЕЦЬ, УМЛЕЦЬ, ЗНЯМЕЦЬ, АНЯМЕЦЬ, АСЛУПЯНЕЦЬ *(перан.)* ЗНЯМЕЦЬ АД СТРАХУ, АКАМЯНЕЦЬ АД СТРАХУ, СКАМЯНЕЦЬ

АД ЖАХУ, НАБРАЦЦА СТРАХУ, ХАПІЦЬ СТРАХУ.

*З немцамі страшней было.. Але мы не спалохаліся..* А. Бажко. *Дзеці спужаліся, сталі хавацца, туляцца ціха ў куток.* М. Чарот. *Спудзіўся конь, скочыў убок ..* І. Пташнікаў. *Грышка струсіў І нагул заўседы ён усяго баяўся* А. Якімовіч. *Эльза скамянела ад жаху.* А. Чарнышэвіч.

**СПАСВІЦЬ,** СТРАВІЦЬ, ПАТРАВІЦЬ.

*Збуяў сівец, яго не спасвілі і скацінай: улетку травы хапае.* І. Пташнікаў. *Яшчэ як хлопцам быў, дык на папа заеўся быў за нешта – дзялянку канюшыны коньмі стравіў яму...* К. Чорны.

**СПАТКНУЦЦА,** СПАТЫКНУЦЦА /*пра каня:* СКАПЫЦІЦЦА; АСТУПІЦЦА *(разм.).*

*Конь спаткнуўся палахлівы.* М. Чарот. *Не аступіся – вось мая рука!..* С. Гаўрусёў.

**СПАТРЭБІЦЦА,** ЗГАДЗІЦЦА, ПРЫГАДЗІЦЦА, ПРЫДАЦЦА, ЗДАЦЦА; ПРЫСПІЧЫЦЬ *(разм.);* ЗНАДОБІЦЦА *(абл.);* ПАЙСЦІ *(перан.)* ПАЙСЦІ НА КАРЫСЦЬ.

*Ісці нам з табой яшчэ далёка, бацька, сілы спатрэбяцца.* Т. Хадкевіч. *Ды прыспічыла яму па нейкай патрэбе пайсці ў нядзелю на рынак.* І. Чыгрынаў. *І тое, што мы яго моцна крытыкавалі, павінна пайсці яму на карысць.* П. Кавалёў.

**СПАЧАТКУ,** УПАЧАТКУ, НАПАЧАТКУ, НАПАЧАТАК, ПЕРШ, НАЙПЕРШ, НАПЕРШ, НАСАМПЕРШ, РАНЕЙ, НАПЕРАД, УПЕРАД, АДРАЗУ, ЗРАЗУ, СПЯРША *(разм );* НАЎПЕРАД *(абл.)* ПЕРШ-НАПЕРШ, ПЕРШ ЗА УСЁ, ПЕРШЫМ ЧЫНАМ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ, НА ПЕРШЫ ЧАС, НА ПЕРШЫМ ЧАСЕ, НА ПЕРШЫ РАЗ, ПЕРШАЙ СПРАВАЙ, З ПЕРШАГА ПОГЛЯДУ, З ПЕРШАГА ПОЗІРКУ, НА ПЕРШЫ ПОГЛЯД, ПЕРАД ГЭТЫМ, ПЕРАД УСІМ.

*Гэтая сустрэча, радасная ўпачатку, пад канец зусім сапсавала яго настрой.* В. Быкаў. *Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю* Ф. Багушэвіч. *Хлапец адразу не спадабаўся Мажэйку* У. Шахавец. *Першым чынам трэба накарміць карову, якая ў гэту ноч ацялілася...* З. Бядуля. *Але гэта толькі здавалася з першага погляду* А. Якімовіч. *На першы погляд нецікава Парэчча тое выглядала...* Я. Колас. *Перадусім скажу я вам пра студню і ваду жывую.* У. Дубоўка.

**СПАЧУВАННЕ,** СПАГАДА. СПАГАДЛІВАСЦЬ, СПАГАДНАСЦЬ, СПОГАДЗЬ, ПРЫХІЛЬНАСЦЬ, ЧУЛАСЦЬ, ЛІТАСЦЬ, ШКАДАВАННЕ, ПАШКАДАВАННЕ, ЖАЛАСЦЬ, ПАТОЛЯ.

*Гутарка так і ліласся, так і сакатала, і гутарка самая прыязная, поўная спачування.* Я. Колас. *З'явілася ў Івана Мацвеевіча нейкая спагаднасць да гэтага аматара мастацтва.* З. Бядуля. *У катаў літасці няма...* Дж. Г. Байран, *перакл.* У. Дубоўкі.

**СПЕШНЫ,** ПАСПЕШНЫ, ПАСПЕШЛІВЫ, ПРЫСПЕШАНЫ, ПАСКОРАНЫ, НЕАДКЛАДНЫ, УДАРНЫ, РУПНЫ, ТЭРМІНОВЫ, ЭКСТРАННЫ.

*Спешнымі крокамі ён пайшоў дахаты.* З. Бядуля. *І ў наш дом больш не трэба заходзіць. Калі што рупнае, то да шаўца.* Р. Няхай. *Чакаю экстранай дапамогі.* М. Лынькоў.

**СПІНА,** ХРЫБЕТ, ГОРБ *(перан ).*

*У дзеда ўжо аж спіна апруцянела і рука анямела...* К. Крапіва. *А кажух ужо згніў на маім гарбу.* З. Бядуля.

**СПІС,** СПІСАК, ПЕРАЛІК, ПЕРАЛІЧЭННЕ, РЭЕСТР, КАТАЛОГ.

*На дошках павывешаны былі спісы тых, што пасылаюцца на работу.* К. Чорны. *Трэба дакументы сістэматызаваць, парабіць ім рэестры, каб было добра відаць, што, адкуль і куды і дзе.* Я. Скрыган.

**СПОСАБ,** СРОДАК, ПРЫЁМ, ПРАВІЛА, ДАРОГА, ШЛЯХ, МЕРА, МЕ-

ТАД, МАНЕРА, СІСТЭМА, ХОД, КЛЮЧ, АДМЫЧКА, СТЫЛЬ, ФОРМА, МАНЕЎР *(перан.)*
*Дзе сілаю не зробіш, то спосабам.* Прыказка. *Мы павінны пераправабаваць усе меры, каб ратавацца.* Я. Колас. *Травапольная сістэма з поля выгнала гарох і боб.* А. Бялевіч. *Дарэмна здрада падбірала ключы і адмычкі.* С. Дзяргай.

**СПОЎНІЦЦА,** МІНУЦЬ; СТУКНУЦЬ *(разм.).*
*І як толькі споўнілася Міхаську восем гадоў, бацька паслаў яго ў школу.* А. Якімовіч. *Не паспелі агледзецца палачане, а Полацку стукнула тысячу сто.* П. Панчанка.

**СПРАКТЫКАВАНЫ,** НАПРАКТЫКАВАНЫ, ВОПЫТНЫ, ДАСВЕДЧАНЫ, НАТРЭНІРАВАНЫ; ПРАКТЫКОЎНЫ, БЫВАЛЫ, ПРАБЕГЛЫ, НАСАБАЧАНЫ *(разм.);* БІТЫ, НАБІТЫ, АБСТРАЛЯНЫ, СТРАЛЯНЫ, СТРЭЛЯНЫ *(перан.).*
*Сякера ў яго руках ужо хадзіла не горш, чым у спрактыкаванага цесляра.* Т. Хадкевіч. *Парада вопытных людзей здалася нам слушнай.* В. Вольскі. *Я ведаю, што я раблю, я чалавек бывалы.* К. Чорны. *Відаць, набітая рука была у рыбака старога..* М. Калачынскі.

**СПРАСОНКУ,** СПРАСОННЯ *(разм.)* СА СНУ.
*У лесе спрасонку пракрычала нейкая птушка і сціхла.* І. Мележ. *То можа са сну табе што прыплялося...* Б. Сачанка.

**СПРАЧАЦЦА;** ПАЛЕМІЗАВАЦЬ, ДЫСКУТАВАЦЬ, ДЫСКУСІРАВАЦЬ *(кніжн.).*
*Няхай князі спрачаюцца паміж сабой, ім патрэбна ўлада і багацце...* Б. Мікуліч. *Я папярэджваю: пытанне ўзгаднялася ў абласных інстанцыях... І дыскусіраваць, думаю, няма чаго.* І. Шамякін.

**СПРЫТНЫ,** СПРАЎНЫ, УВІШНЫ.
*Каб на што добрае, а на гэта ты спрытны.* К. Чорны. *Ён практык, увішны ў рабоце...* К. Чорны.

**СПРЫЯЦЬ** БЫЦЬ НА РУКУ.
*А тут яшчэ людзі ёсць, што спрыяюць бандытам, хаваюць іх ды кормяць.* А. Чарнышэвіч. *Гэта было Мішу на руку* А. Пальчэўскі.

**СПЫНІЦЬ,** СУПЫНІЦЬ, ПРЫПЫНІЦЬ, СТРЫМАЦЬ, ЗАТРЫМАЦЬ, СУНЯЦЬ, АСАДЗІЦЬ.
*Вось тут машыну супыні, шафёр.* А. Астрэйка. *Хто, скажыце, сёння нас стрымае, калі мы – і сіла, і закон?!* А. Куляшоў.

**СПЯВАЦЬ,** ПЕЦЬ, ПЯЯЦЬ /*ціха, сам сабе:* НАПЯВАЦЬ /*уторачы:* ПАДПЯВАЦЬ, ПАДЦЯГВАЦЬ; ВЕСЦІ *(перан.).*
*Дзяўчаты пелі жніўныя песні* Ц. Гартны. *Кандрат сарамліва падцягваў, вымаўляючы толькі паасобныя фразы* М. Лобан.

**СПЯШАЦЦА,** СПЯШАЦЬ, ПАСПЯШАЦЬ, ГАРАЧЫЦЦА; ЗАВІХАЦЦА, УВІХАЦЦА, ВАРУШЫЦЦА *(разм.);* ЗАВІНАЦЦА *(абл.)* ПАРОЦЬ ГАРАЧКУ.
*Ну, не марудзіць, айда на работу! Ды варушыцеся, лайдакі! Будзем спяшацца, бо нас могуць дагнаць.* Я. Маўр. *Ён вельмі завіхаўся. Яму рупіла хутчэй скончыць.* К. Чорны. *Але покі што гарачкі не пароў: дайсці да міліцыі ён паспее.* Я. Колас.

**ССАЦЬ,** СМАКТАЦЬ.
*Ласкавае цялятка дзве маткі ссе.* Прыказка. *А на яе тугіх грудзях ляжыць чырвоны, цёпленькі і неяк смешна смокча.* М. Багдановіч.

**СТАГНАЦЬ,** КРАХТАЦЬ, КРАКТАЦЬ; ВОЙКАЦЬ, ВОХКАЦЬ, ВОХАЦЬ *(разм.).*
*Раненыя стагналі.* К. Чорны. *Ляжы, нібы ў агні, ды войкай...* Я. Колас. *Вохаў селянін і з гарцам ішоў у пуставаты свіран, каб даць Бораху ў лік даўгоў мерку збожжа..* З. Бядуля.

**СТАГОДДЗЕ,** ВЕК.
*Стагоддзі, тысячагоддзі кідаецца акіян на скалы.* Я. Маўр.

**СТАЛЬМАХ**, КАЛЕСНІК, КАРЭТНІК *(уст.)*

*Стальмах – умей абоддзе гнуць!* А Бялевіч *Бацька мой некалі ў паноў Гарэцкіх карэтнікам працаваў* А Асіпенка

**СТАНОВІШЧА**, СТАН, АБСТАВІНЫ *(мн.)*, УМОВЫ *(мн.)*, АКАЛІЧНАСЦІ *(мн.)*, СІТУАЦЫЯ, АТМАСФЕРА *(перан.)*

*Мы ўсе добра ведалі, у якім становішчы знаходзімся кругом беспапольскія раз'езды.* А Якімовіч *І ва ўмовах невяселых мы не вешаем галоў* . А Астрэйка *Палітычная атмасфера прадвяшчала вайну.* У Калеснік

**СТАНОК**; ВАРШТАТ *(уст.)*

*Ткачыха ходзіць ля станкоў, гудуць маторамі машыны.* К Буйло *Пяюць варштаты ткацкія, складаюць працы гімн.* А Астрэйка.

**СТАНЦЫЯ** *[чыгуначная]* /*малая:* ПАЎСТАНАК.

*На станцыях ён выскокваў з вагона узяць бутэльку піва.* М Ракітны. *Явіч спыніўся на тым паўстанку, – таварны цягнік стаяў на пераездзе.* К Чорны

**СТАРАННА**, РУПЛІВА, РУПНА, ДБАЛА, ШЧЫРА, НЕАСЛАБНА, ЦЯГАВІТА, СКРУПУЛЁЗНА, ЗАЛОЖНА *(разм.)*, ПІЛЬНА *(абл.)*; ГАРЛІВА *(уст.)* □ НЕ ПАКЛАДАЮЧЫ РУК, ЗАКАСАЎШЫ РУКАВЫ, ДА СЁМАГА ПОТУ, ДА ТРЭЦЯГА ПОТУ

*Працаваў старанна, з упартай заўзятасцю.* Ц. Гартны. *Каля яго на каленях, рупліва аглядваючы рану, стаяла Ніна.* І Мележ *Будзем працаваць не пакладаючы рук...* Х. Шынклер *Я працую заўсёды да трэцяга поту.* Р. Няхай .

**СТАРЭЦЬ**, СТАРЫЦЦА, СІВЕЦЬ.

*Твар яе даўно пачаў блекнуць і старэць.* К. Чорны *І маці без сына сівее ў чаканні.* А. Зарыцкі.

**СТАТАК**, ЧАРАДА, ГУРТ /*коней:* ТАБУН /*авечак:* АТАРА /*рыб ці птушак:* КАСЯК.

*Пастухі даўно пагналі ўжо статкі дадому...* Я. Колас. *Адбілася цяле ад чарады, а пыса пахне цёплым сырадоем* Р. Барадулін *У табуне твая кабыла, Андрэй.* А Чарнышэвіч

**СТВАРАЛЬНІК**, ТВОРЦА, ТВАРЭЦ, КАВАЛЬ *(перан.)*.

*Народ – стваральнік і носьбіт мовы.* У. Юрэвіч. *Ці ж не можам быць мы з вамі свайго шчасця кавалямі?* М. Васілёк.

**СТВОЛ** /*ніжняя частка:* КАМЕЛЬ

*На адхоне стаяла Дануся і трымалася за ствол клёна!* А. Карпюк *Абапал шашы з падгушчанай змрокам імглы ледзь выступаюць камлі прысадаў і жалезныя краты мастоў.* Я Брыль.

**СТОГ**, СЦІРТА, КАПА, ТАРПА, ТОРП.

*Як помнік лету, за ракою стаялі стройныя стагі.* Р. Барадулін. *На прыгуменнях мы аглядалі сцірты саломы.* Я. Скрыган. *Гаспадарскім вокам агледзела торп сена...* Р. Няхай.

**СТОС**, СТУС, ГОРКА, СЦІРТА, КІПА, ШТАБЕЛЬ /*картаў:* КАЛОДА; СТОПКА *(абл.)*.

*Процілу печы на высокім тапчане ляжаў вялікі стос бліноў...* З. Бядуля. *На прасторах балота стаіць штабелямі здабыты торф.* П. Галавач. *Яшчэ ў нярушанай калодзе і казыры ляжалі ўсе.* В. Вітка

**СТРАЛОК** /*трапны:* СНАЙПЕР; СТРАЛЕЦ *(разм.)*.

*– Рукі ўверх! – і на курок палец свой паклаў стралок.* А. Александровіч. *Што ты, дзеду, ды я ж снайпер, маху не даю.* Я. Колас.

**СТРАЛЯНІНА**, СТРАЛЬБА, АГОНЬ /*па цэлі:* АБСТРЭЛ /*з двух бакоў:* ПЕРАСТРЭЛКА /*з гармат:* КАНАНАДА; ПАЛЬБА *(разм.)*.

*Хоць яшчэ стралянiна была, але ўжо лес быў як мае быць ахоплен кругом намі..* К. Чорны. *Перастрэлка ўстрывожыла палякаў у вёсцы.* Я. Колас *Артылерыйская кананада даходзіла сюды прыглушаным громам.* К. Чорны.

**СТРАЛЯЦЬ**, БІЦЬ /*з аўтаматычнай зброі:* СТРАЧЫЦЬ /*залпамі ці час-*

*та* ПАЛІЦЬ, СМАЛІЦЬ, ТАТАКАЦЬ *(разм)* - ВЕСЦІ АГОНЬ

*Я разумею вайну так бачыш ворага – страляй* І Навуменка *Па вераб'ях з гармат не паляць* Прыказка *Праклятьі немец поўз, як гад, а мы вялі агонь* М Танк

**СТРАХ,** ПОСТРАХ, БОЯЗЬ, БОЯЗНАСЦЬ, СПАЛОХ, СПОЛАХ, ПЕРАПАЛОХ, ПЯРЭПАЛАХ, НАПАЛОХАНАСЦЬ, ЖАХ, ЖУДА, ЖУДАСЦЬ, ЖУДЗЬ, ЖУД /*масавы:* ПАНІКА, СТРАХОЦЦЕ, СТРАХАТА, ПУД, ПЕРАПУД *(разм.);* ПЕРАЛЯК *(абл).*

*Ціха ў хаце. Сэрца ные, страх душу апанаваў.* Я Колас. *Ад спалоху ён ні слова не мог вымавіць.* П Кавалёў. *Стаяла такая цішыня, што аж жудасць брала.* К Чорны. *Загрымелі ў вёсцы стрэлы, у фашыстаў перапуд.* А. Астрэйка.

**СТРАШНЫ,** ГРОЗНЫ, ПАГРОЗЛІВЫ, ЖАХЛІВЫ, ЖУДАСНЫ, ЖУДКІ, ЗЛАВЕСНЫ; СТРАХОТНЫ *(разм.);* ЖУТКІ *(абл.);* ПАЧВАРНЫ *(перан.).*

*Самы страшны вораг кожнай арміі – гэта паніка.* М. Лынькоў. *Пасля той жахлівай навалы ляжала ўсё ў ранах кругом.* П. Броўка. *Танкі, прыземістыя, злавесныя, упарта набліжаліся.* І. Мележ.

**СТРОГІ,** СУРОВЫ, СУР'ЁЗНЫ /*пра характар:* КРУТЫ *(перан.).*

*Марозам марозіць строгая зіма.* Я. Купала. *Суровы час. Мая радзіма гарыць у полымі вайны.* П. Глебка.

**СТРЭЛ,** ВЫСТРАЛ /*з некалькіх стрэльбаў, гармат:* ЗАЛП.

*Грукне стрэл – і ў яго бліскавічным агні перамогі абрысы ты ўбачыш на міг.* П. Панчанка. *З абодвух бакоў затрашчалі выстралы з вінтовак.* К. Чорны.

**СТРЭЛЬБА,** РУЖЖО /*з вінтавою нарэзкаю.* ВІНТОЎКА /*вінтоўка з пакарочанаю руляю.* КАРАБІН /*вінтоўка з абрэзаным канцом рулі.* АБРЭЗ /*паляўнічая з дзвюма рулямі:* ДВУХСТВОЛКА, ДУБАЛЬТОЎКА, КАРАБІНКА /*зараджаецца аўтаматычна* САМАЗАРАДКА /*з калібрам 7.6 мм* ТРОХЛІНЕЙКА /*паляўнічая, зараджаецца шротам.* ДРАБАВІК *(разм)* /*пістонная* ПІСТАНОЎКА /*з прамалінейнаю нарэзкай* ШТУЦЭР /*аднazарадная вінтоўка* БЯРДАНКА /*цяжкая буйнога калібру.* МУШКЕТ /*крамянёвая.* ФУЗІЯ *(гіст.)*

*Кожны стралец сваю стрэльбу хваліць.* Прыказка *Дружылі мы з сяброўкаю, пяхотнаю вінтоўкаю..* М Лужанін *Яшчэ дыміцца курок яго дубальтоўкі.* З Бядуля. *Эх, верны ды грозны схапіць бы мушкет!..* А. Вялюгін.

**СТУЖКА,** БАНТ /*заплеценая ў касу:* КАСНІК, ЖЫЧКА *(абл.).*

*Яны ў аднолькавых паркалёвых сукенках, у валасах чырвоныя стужкі.* І. Навуменка. *Маці косы заплятала новым крамным каснікам!* П. Броўка.

**СТУКАЦЬ,** СТУКАЦЦА, ПАСТУКВАЦЬ, ЛЯСКАЦЬ, БІЦЬ, БІЦЦА, ЦОКАЦЬ; СТУКАЦЕЦЬ, СТУКАТАЦЬ, ГРУКАЦЬ, ГРУКАТАЦЬ, ГРУКАЦЕЦЬ, ТАРАХЦЕЦЬ, ЛАСКАТАЦЬ, ТУКАЦЬ, ТУКАТАЦЬ, ТУХКАЦЬ, ТАХКАЦЬ, ЦЮКАЦЬ, БУХАЦЬ, ГОПАЦЬ, ГУПАЦЬ, ЦУПАЦЬ, ЛОПАЦЬ, ЛЯПАЦЬ, ЛЕСКАТАЦЬ, ЛАПАЦЕЦЬ, ЛЯЗГАЦЬ *(разм.);* БАРАБАНІЦЬ, БУБНІЦЬ, БУБНЕЦЬ, МАЛАЦІЦЬ *(перан.)*

*Толькі дзятлы стукалі па дрэвах.* В. Вольскі. *У бубны дахаў вецер б'е...* М. Багдановіч. *Грукаюць колы – едуць балаголы.* С. Шушкевіч. *Тахкаў на сцяне вялікі, падобны на шафу, гадзіннік.* А. Чарнышэвіч. *Дзе-нідзе цупалі ўжо цапы.* І. Мележ. *Роўна барабаніў дождж, напярэймы лапацеў па Ігнасю..* Р Мурашка.

**СТУПЕНЬ,** УЗРОВЕНЬ, СТАДЫЯ, ЭТАП, ФАЗА

*Твар цёткі Алены выражаў апошнюю ступень здзіўлення і трывогі.* Э Самуйлёнак *Этап падрыхтоўкі пяройдзены.* Х Шынклер.

**СУВЯЗЬ,** ДАЧЫНЕННЕ, ЗНОСІНЫ *(мн.)*, КАНТАКТ.

*Сувязь з вясковымі паўстанцкімі тройкамі ўстаноўлена?* М. Чарот. *Трымай сталы кантакт са мной і глядзі, пільна сачы за ўсім...* П. Пестрак

**СУД;** ТРЫБУНАЛ *(вайск.)*

*У суда ёсць свае меркаванні, і ён часта больш кіруецца палітыкаю, чым законам.* Я. Колас. *Зброю здай і – ў трыбунал!* М. Калачынскі.

**СУКЕНКА,** СУКНЯ, ПЛАЦЦЕ /*для верхавой язды.* АМАЗОНКА.

*Асцярожна надзену сукенку шаўковую.* Э. Агняцвет. *Падышлі дзяўчаты ў новых плаццях, і прыплыў аднекуль гарманіст.* А. Астрэйка.

**СУМЕСНЫ,** СУПОЛЬНЫ, КАЛЕКТЫЎНЫ.

*Сумеснае жыццё Макара і Алены ніколі не вызначалася згодай.* П. Пестрак. *Калектыўны паход аўтазаводцы арганізавалі.* У. Карпаў.

**СУМНЫ,** НЕВЯСЁЛЫ, НЯРАДАСНЫ, БЯЗРАДАСНЫ, СУМОТНЫ, СМУТНЫ, ЗАСМУЧАНЫ, МАРКОТНЫ, ЗАМАРКОЧАНЫ, ЖУРБОТНЫ, НУДНЫ, ТУЖЛІВЫ, ГОРАСНЫ, ЖАЛОБНЫ, ЖАЛАСНЫ, ЖАЛАСЛІВЫ, НЯЎЦЕШНЫ, ПАНЫЛЫ, ПАНУРЫ; ХАЎТУРНЫ *(разм.)*; ЖАЛОСНЫ *(абл.)*; ЧОРНЫ, ЦЁМНЫ, ЗМРОЧНЫ, ХМУРНЫ, ПАХМУРНЫ, ХМУРЫ, ПАХМУРЫ, СПАХМУРНЕЛЫ, СХМУРНЕЛЫ, НАХМУРАНЫ, МЕЛАНХАЛІЧНЫ, МІНОРНЫ *(перан.)* ЯК ХМАРА, ЯК ПАД ЗЯМЛЁЙ, НЕ Ў ГУМОРЫ.

*Годзе пець песні нам сумныя, нудныя, даволі ўжо слёз!..* М. Чарот. *Жонка кладзе кампрэсы, ходзіць замаркочаная, сумная, як цень.* І. Навуменка. *Пеў я песні калісь у журботным тоне...* Я. Колас. *А пан усё сядзіць хмурны, як восень...* Я. Колас. *Меланхалічная задуменнасць зышла раптам з твару, усмешка азарыла яго.* З. Бядуля. *І гаршчок той падала, і стаіць, як хмара.* А. Бялевіч.

**СУП,** БУЛЕН, ПОЛІЎКА, ЗАЦІРКА / *крупяны.* КРУПНІК /*рыбны* ЮШКА, ВАРЫВА, БАЎТУХА, СЁРБАНКА, СЁРБАВА *(разм.)*

*– Ты дома еў такі суп? – А што ты думаеш, я дома булёну заскваранага не еў?* Я. Брыль. *Дык хай жывуць і юшка з перцам, баравікі на сале!* П. Панчанка. *Хочаш якой-небудзь сёрбанкі наварыць?* А. Бажко.

**СУПРАЦІЎЛЯЦЦА,** АДБІВАЦЦА; АГРЫЗАЦЦА *(перан.)*.

*Налёт быў такі нечаканы для немцаў у гэтым месцы, што яны не маглі ні супраціўляцца, ні ўцячы.* М. Лынькоў. *Хоць вораг і асуджаны на пагібель, але ён яшчэ агрызаецца.* М. Ткачоў.

**СУСТРЭЦЦА,** СТРЭЦЦА, СПАТКАЦЦА, НАПАТКАЦЦА, УБАЧЫЦЦА, ПАБАЧЫЦЦА, УГЛЕДЗЕЦЦА, ТРАПІЦЦА; СУТЫКНУЦЦА, НАТКНУЦЦА *(перан.)* – ТРАПІЦЬ НА ВОЧЫ.

*Мы сустрэліся з ім раніцай.* М. Лынькоў. *Мне было прыемна адчуваць, што напаткаўся вельмі блізкі чалавек...* А. Асіпенка. *Бо калі мы ўжо ўгледзімся – хто можа сказаць...* Ц. Гартны. *А каб не трапіць на вочы фашыстам, яны выйшлі да сяла глухою сцежкаю з другога боку.* А. Якімовіч.

**СУТНАСЦЬ,** ІСНАСЦЬ, СПРАВА, ЗМЕСТ, СЭНС, ПРЫРОДА, КВІНТЭСЕНЦЫЯ; СОЛЬ, ЦЫМУС *(разм.)*; ДУХ, ДУША, КОРАНЬ, ГВОЗД, ЗАГВАЗДКА, СЯРЭДЗІНА *(перан.)*.

*Не ў гэтым справа, Ганна.* Ц. Гартны. *Я коратка перакажу, таварышы, сэнс гэтага артыкула...* Я. Колас. *Важна тут сама карціна, у ёй увесь цымус.* В. Каваль. *Што ж будзе далей? Вось дзе гвозд!..* Я. Колас.

**СУХІ,** НАСОХЛЫ, ССОХЛЫ, ПЕРАСОХЛЫ, ЗАСМЯГЛЫ.

*Чутно толькі было, як трашчала пад нагамі сухое галлё.* Я. Маўр. *Засмяглая зямля, здаецца, аж чаўрэла і ледзь не прасіла: дажджу, дажджу!* Р. Сабаленка.

**СУЧАСНАСЦЬ,** СУЧАССЕ, ЦЯПЕРАШНЯЕ, СЯГОННЯ, СЁННЯ *(перан)* СЕННЯШНІ ДЗЕНЬ.
*Закончыўшы працу над кнігай, я адчуваю сябе так, як быццам пераступіў парог з мінуўшчыны ў сучаснасць.* В. Таўлай. *А мінулае і цяперашняе моцна злучаны паміж сабою* Я. Колас. *Бо што не возьмеце сягоння, таго і заўтра вам не ўзяць* Я. Купала.

**СХАВАЦЦА;** ЗАБІЦЦА, ЗАШЫЦЦА *(разм.).*
*Ён [дзік] бачыць толькі на блізкай адлегласці, а мы схаваліся добра* В. Вольскі. *Забіўся ў такі гушчарнік, што нельга было ісці.* А. Чарнышэвіч. *Паны разбегліся, як мышы, каб зноў зашыцца дзе пад шчыт..* Я. Колас.

**СХІЛ,** НАХІЛ, СПАД, СПУСК, СКАТ, АДХОН, СХОН, АДКОС /*абрывісты* АБРЫЎ, СТРОМА, КРУЧА, КРУЦІЗНА, КАСАГОР.
*Берагі і схілы канала выкладзены каменем.* П. Галавач. *Мы ўзлятаем на ўзгорак. За ім спуск, там нас ужо не дастаць.* В. Быкаў. *Недзе блізка паравоза стогн... Эшалон кульнуўся пад адхон.* А. Астрэйка. *Вось высокі касагор над самым Нёманам.* Я. Колас.

**СХОВІШЧА,** СХОЎ, СХОВАНЬ, СХОВАНКА, СХАВАНКА, СХОЎКА, СХОВА, СХОЎНЯ, СХОВЫ *(мн.),* СПРАТ, УКРЫЦЦЕ, ПРЫКРЫЦЦЁ, ЗАСАДА, ТАЙНІК, ПАТАЙНІК, ПАТАЕМНІК, ЯЎКА; НАРА *(перан).*
*Гэта было надзейнае месца для сховішча, непрыкметнае для вока ліхадзея.* М. Ткачоў. *Жывы не буду, калі не прасачу, дзе ты знайшоў спрат свайму золату.* М. Лобан. *Станавіцеся, глядзіце. Няма ў нас патаемнікаў другіх.* С. Шушкевіч.

**СХУДНЕЦЬ,** ЗБЛАЖЭЦЬ, ПАБЛАЖЭЦЬ, ЗМАРНЕЦЬ, ЗМІЗАРНЕЦЬ, ПАМІЗАРНЕЦЬ, ЗАЧАЎРАЦЬ; АСУНУЦЦА, ПАДАЦЦА, З'ЕХАЦЬ, АБ'ЕХАЦЬ *(разм.);* ВЫСАХНУЦЬ *(перан.)* УПАСЦІ Ў ЦЕЛЕ, СПАСЦІ З ТВАРУ, ЗВАСТРЭЦЬ ТВАРАМ.
*За гэтыя дні ён страшна схуднеў, вочы яго ад бессані сталі чырвоныя...* К. Чорны. *Змарнеў, як націна.* Прымаўка. *Зусім зачаўраў чалавек, аб'ехаў – што шкілет .* І. Пташнікаў. *Я вельмі аслабеў, упаў у целе.* Я. Колас.

**СЦЯБЛО,** СЦЯБЛІНА, БАДЫЛЬ, БАДЫЛІНА, БАДЫЛЛЕ *(зб ),* БАДЫЛЛЕ *(зб.),* БЫЛІНА, ЦЯВІНА, ЦЫБУР, ЦЫРБУН, ЦЫРБУННЕ *(зб.),* СТРЫМБУЛЬ.
*Страказа сцябло прыгнула...* С. Шушкевіч. *Бадылле бульбы тонкае, як ніцінкі.* П. Пестрак. *Стан танюткі, як былінка, ну і Кася, ну дзяўчынка!* Цётка. *Абмацаўшы ў жолабе, Юрка заўважыў: – Адны цырбуны.* К. Чорны.

**СЦЯГ,** ФЛАГ, ПАЛОТНІШЧА; ШТАНДАР *(уст.).*
*Гарачы, як сонца, крылаты, як вецер, наш сцяг.* П. Глебка. *На хатах віселі большыя і меншыя, шырокія і вузкія чырвоныя палотнішчы.* С. Грахоўскі.

**СЦЯНА** /*лёгкая:* ПЕРАГАРОДКА, АДГАРОДКА, ПЕРАБОРКА.
*На сцяне вісеў яго партрэт.* І. Гурскі. *Ён жыве ў другім пакоі, за пераборкаю.* Я. Скрыган.

**СЫТЫ,** ТЛУСТЫ, УКОРМЛЕНЫ, АДКОРМЛЕНЫ, РАСКОРМЛЕНЫ; ПОЎНЫ, РАСПАЎНЕЛЫ, ПАЎНАЦЕЛЫ, ПУХЛЫ, ГЛАДКІ, КРУГЛЫ *(разм.)* У ЦЕЛЕ, АЖ БЛІШЧЫЦЬ.
*Чаму сыты ён, як лін?* Я. Колас. *Другія немцы былі поўныя, нязграбныя.* Р. Няхай. *Гладкія коні хрупаюць тлустую сечку...* Я. Брыль. *У добрай арцелі ўсе коні ў целе.* Прыказка.

**СЯБАР,** ТАВАРЫШ, ДРУГ, ПРЫЯЦЕЛЬ, БРАТ /*па рабоце, прафесіі:* КАЛЕГА; СЯБРУК, ДРУЖБАК, ДРУЖАКА, КАМРАД *(разм );* САЮЗНІК, ПАБРАЦІМ *(перан.)* СВОЙ ЧАЛАВЕК, НАШ ЧАЛАВЕК.
*Рады я: сяброў у нас не меней, чым у сонца залатых праменняў...* П. Панчанка. *Стары друг лепей за новых двух.* Прыказка. *Вось Савось і Антось сталіся*

*дружакі.* Я. Колас. *Свой чалавек Падпольны камітэт памог яму каня набыць* І. Гуркі.

**СЯДЗІБА,** СЯЛІБА, СЕЛІШЧА, ПАСЕЛІШЧА, СЕЛЬБІШЧА, ДВОР, ЗАБУДОВА, КОТЛІШЧА *(разм.),* АСЕЛІШЧА, ПАСАДА, ГАСПОДА *(абл.).*

*Мужчыны падыходзілі да дарогі, што вяла да лесніковай сядзібы.* А. Якімовіч. *Пустое паселішча страшней за ноч над пустыняй.* К. Чорны. *Яго забудова была ў лесе на паляне.* К. Чорны.

**СЯКЕРА,** ТАПОР.

*Цюкалі ўранні сякеры, недзе на дрывотні брынчала піла.* І. Пташнікаў. *Хай зазвоняць смела косы, грукне ў лесе хай тапор* Я. Купала.

**СЯМ'Я,** ДОМ, ФАМІЛІЯ; ДВОР *(перан.).*

*А была ж такая вялікая сям'я. Трох сыноў і дзве дачкі.* К. Чорны. *Жыла пад гэту пару ў Сіўцы адна досыць цікавая фамілія. Складалася яна з двух асоб: брата і сястры Шыбянковых.* М. Зарэцкі.

**СЯРОД,** ПАСЯРОД, ПАМІЖ, МІЖ.

*Яна трымалася не горш за хлопцаў, і мы часта забываліся, што сярод нас дзяўчына.* А. Карпюк. *Між лісця віднеліся няспелыя зеленаватыя яблыкі* І. Мележ.

**СЯЎБА,** ПАСЯЎНАЯ.

*Міхась захоўваў зярняткі, як найкаштоўнейшы скарб, і ўсе баяўся прапусціць час сяўбы.* А. Якімовіч. *Пасяўная на носе, а трактар стаў на роўнай дарозе.* Я. Брыль.

## Т

**ТАВАРЫСТВА,** САЮЗ, АБ'ЯДНАННЕ, КАРПАРАЦЫЯ.

*Гандлёвае таварыства ці, як у статут было ўпісана, «кааператыў», шырылася вельмі ўдала* К. Чорны. *Лічуся членам карпарацыі пераконаных халасцякоў.* Я. Васілёнак.

**ТАЙНА,** ТАЕМНА, ТАЙКОМ, УПОТАЙ, УПОТАЙКІ, ПОТАЙ, ПОТАЙКІ, ПОТАЙКАМ, ПАТАЙКОМ, ПАТАЕМНА, ПАТАЙНА, ПАТАЁМА, УПОТАЙКУ, СТОЕНА, ЦІХА, ЦІШКОМ, СКРЫТА, СКРЫТНА, КРАДКОМ, УКРАДКАМ, УКРАДКАЙ, ПАДПОЛЬНА, САКРЭТНА, НЕЛЕГАЛЬНА, КАНСПІРАЦЫЙНА, КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНА; ЦІХАЧОМ, ЦІХОМ, УКРАДКІ, УКРАДНЕ, ШЫТА-КРЫТА, ПА-ЗЛАДЗЕЙСКУ *(разм.);* СЦІХА, ПАКРЫЁМА *(абл.)* ПАД САКРЭТАМ, МІЖ НАМІ, ПАМІЖ НАМІ, У ДУШЫ, У ДУМКАХ, З ВОКА НА ВОКА, ЗА ВОЧЫ, НА ВУХА, ЦІХАЙ САПАЙ.

*Сустракаліся тайна, не па закону, не па закону цалаваліся, хоць чужыя.* І. Мележ. *Плакала потай: «Каб бацька жыў, ці было б так...»* А. Чарнышэвіч. *Ляснымі дарогамі скрыта к чыгунцы ідуць партызаны.* Я. Колас. *Сакрэтна і патаемна рушыў у паход пан Крулеўскі...* Я. Колас. *Гэта работа праводзілася канспірацыйна. Таму ні змест, ні формы яе не маглі быць раскрыты...* У. Калеснік. *Не, я хачу пагаварыць з вамі вока на вока.* Т. Хадкевіч.

**ТАННЫ,** НЕДАРАГІ, ДАСТУПНЫ; КАПЕЕЧНЫ, ГРАШОВЫ, СХОДНЫ *(разм.)*

*Таннае мяса сабакі цягаюць* Прыказка. *І балбочуць, гаваркія, аб капеечнай красе..* А. Зарыцкі.

**ТАНУЦЬ,** ТАПІЦЦА ІСЦІ НА ДНО.

*Ён толькі вырваў нос лайбы, і яна пачала тануць.* М. Лынькоў. *Варта згубіць упэўненасць, і цела пачынае ісці на дно.* П. Галавач.

**ТАНЦАВАЦЬ,** СКАКАЦЬ, КРУЖЫЦЬ *(пра вальс)* ВАЛЬСАВАЦЬ; ГОЦАЦЬ, ВЫКАБЛУЧВАЦЬ *(разм.);* ГУЛЯЦЬ *(абл.)* КРУЖЫЦЦА У ТАНЦЫ.

*Пад гармоню танцавалі.* К. Чорны. *Жэняцца – скачуць, разводзяцца – плачуць.* Прыказка. *А хлопцы з дзяўчатамі полечку гоцалі, аж падлога стагнала.* Р. Сабаленка.

**ТАЯМНІЦА,** ТАЙНА, ТАЕМНАСЦЬ, САКРЭТ, ТАЙНІЦА *(разм.);* ЗАГАДКА, НОЧ, ПАЦЕМКІ *(перан.)*
*Чаго тады жыць, калі родны мужык мае ад жонкі нейкія таямніцы?* У. Дамашэвіч. *Тады яна даверыла мне апошнія свае сакрэты* А. Карпюк. *Дзе яна была, што рабіла, – пацёмкі.* А. Асіпенка.

**ТВАР,** АБЛІЧЧА, ФІЗІЯНОМІЯ; МОРДА, МАРДАСІНА, АБРАЗІНА, ХРАПА, ХАРА, ЛЫЧ, РЫЛА, ПЫСА, МУРЛО, ЧМЫС *(разм. зняваж.);* ЛІК *(уст.);* МАСКА, ПАРТРЭТ *(перан.).*
*Сляза з вачэй скацілася на твар.* Я. Пушча. *А свежы вецер на трыбуне тваё аблічча цалаваў.* П. Трус. *Не наракай на люстра, калі морда крывая.* Прыказка. *От я дык пацэліў яму ў самую зладзейскую храпу.* А. Чарнышэвіч. *Адвярнуў бы ўбок рыла, дык ён, шэльма, зубы скаліць!* К. Крапіва.

**ТКАНІНА,** МАТЭРЫЯЛ, МАТЭРЫЯ /*льняная:* ПАЛАТНО, ПОРТ /*канапляная:* ЗРАБНІНА *(разм.)* /*фабрычнай вытворчасці:* КРАМНІНА, КРАМ *(разм.);* МАНУФАКТУРА *(уст.).*
*Свае шырокія тканіны на лад персідскі ткуць яны.* М. Багдановіч. *Кашуля шырокая з порту, лапці з пяньковых абор...* М. Танк. *А пасля стала ўгаворваць яго набраць і сабе новай крамніны – грошы яшчэ былі.* К. Чорны.

**ТЛУМАЧЫЦЬ,** РАСТЛУМАЧВАЦЬ, ПАЯСНЯЦЬ; ІНТЭРПРЭТАВАЦЬ *(кніжн.);* АСВЯТЛЯЦЬ, РАЗЖОЎВАЦЬ *(перан.)*
*Цётка тлумачыла, наколькі дазваляў ёй розум, розныя з'явы навакольнага свету...* Я. Колас. *І яшчэ ёсць меркаванні, але ж мы не дзеці, каб усё разжоўваць і ў рот класці...* І. Гурскі.

**ТЛУШЧ,** ТУК /*свіны:* САЛА /*авечы:* ЛОЙ /*раслінны:* АЛЕЙ /*што ўтварыўся ў вадкай ядзе пры варцы:* НАВАР.
*Тлушч рыжы з дымных кумпякоў.* П. Панчанка. *Сама ж любіш, нябось, мяска і аладкі мазаць тукам?* Я. Колас. *Мы дзень з алеем, а тыдзень – так галеем.* Я. Брыль.

**ТОРБА,** МЯШЭЧАК, КАЙСТРА, СУМА, КАТОМКА, ХАТУЛЬ /*звычайна скураная:* САКВА /*цвёрдая, носяць за спінаю:* РАНЕЦ /*паляўнічая на дзічыну:* ЯГДТАШ.
*Цераз плячо вісела торба з мноствам рознакаляровых зашывак...* А. Асіпенка. *Настаўнік стаяў на двары з мяшэчкам за плячыма.* І. Мележ. *Але мой ягдташ быў пусты.* М. Ракітны.

**ТРАВА,** МУРОГ /*што вырасла ў тым жа годзе пасля скошанай:* АТАВА.
*Звонка падае ў траву сакавіты яблык спелы.* Э. Агняцвет. *Мяккасцю сакавітай пахне густы мурог.* П. Галавач.

**ТРАПНА,** МЕТКА, ПА-СНАЙПЕРСКУ БЕЗ ПРОМАХУ, НЕ ПРАМАХНУЎШЫСЯ, НЕ Ў БРЫВО, А Ў ВОКА, У СУК.
*Як з пісталета па мішэні, па ворагах ён трапна біў.* С. Дзяргай. *Хоць рэдка, ды метка.* Прыказка. *Значыць – у сук. Мае меркаванні правільныя.* І. Гурскі.

**ТРАШЧАЦЬ,** ПАТРЭСКВАЦЬ, ХРУСЦЕЦЬ, ХРАБУСЦЕЦЬ, ХРУПАЦЬ, ХРУПАСЦЕЦЬ.
*Чутно толькі было, як трашчала пад нагамі сухое галлё.* Я. Маўр. *Бітае шкло звонка храбусціць пад нагамі.* М. Лынькоў.

**ТРУБАЧ,** СУРМАЧ, ГАРНІСТ, ФАНФАРЫСТ.
*Трубачы палкавыя дня вітаюць прыход.* М. Калачынскі. *Здаецца, чую, як падвечар у рог турыны дзьме сурмач.* А. Вольскі. *Грай, гарніст, баявую трывогу!* А. Гурло.

**ТРУНА** /*аздобленая, каменная ці драўляная:* САРКАФАГ; ДАМАВІНА, ДАМОЎКА *(разм.).*
*На досвітку камякі сырога жвіру глуха ўпалі на сасновае века труны.* К. Крапіва. *Не часалі дамоўкі яму стапяры, не заплакалі бліжнія вочы.* Я. Купала.

**ТРЭСКА,** ШЧЭПКА; ЦЕСКА *(абл.).*
*Дзе дровы сякуць, там трэскі лятуць* Прыказка. *І за шчэпку пан знойдзе прычэпку* Прыказка.

**ТУБЕРКУЛЁЗ** /лёгкіх/ СУХОТЫ.
*Настоем з карэння і лісця агавы ў народнай медыцыне лечаць туберкулёз.* БелЭн. *Бацькі не помніў зусім, ледзь памятаў маці, якая памерла ад сухотаў, калі яму споўнілася якіх шэсць год.* І. Мележ.

**ТУЗАЦЬ,** ТОРГАЦЬ, РВАЦЬ, ЦЯГАЦЬ, ТАРМАСІЦЬ, ТАРМАШЫЦЬ; ШКУМАТАЦЬ *(разм.).*
*Тузае, тузае за канец марлі і рады не дасць.* К. Чорны. *Сёстры сердавалі і залаб Юзіка цягалі.* Я. Колас. *Сярдзіты вецер шкуматаў страху...* С. Гаўрусёў.

**ТУЛІЦЦА,** ГАРНУЦЦА, ПРЫПАДАЦЬ, ЛЬНУЦЬ, ІЛЬНУЦЬ.
*Дзяўчына к хлопцу туліцца курчавай галавой.* А. Астрэйка. *З трывогай друг к дружцы маладыя льнуць...* Я. Купала.

**ТУРМА;** КАТАЛАЖКА *(разм.);* АСТРОГ, КРЭПАСЦЬ, ВЯЗНІЦА, ЦЯМНІЦА *(уст.);* БАСТЫЛІЯ *(перан.).*
*Прыбылі ў турму новыя арыштаваныя.* П. Пестрак. *А ў астрозе ж няма волі, ні ў чым няма і ніколі.* Ф. Багушэвіч. *Дрогнуць сковы цямніц, бліснуць іскры зарніц...* Я. Купала.

**ТУХНУЦЬ,** ПАТУХАЦЬ, СТУХАЦЬ, ЗАТУХАЦЬ, ГАСНУЦЬ, ЗГАСАЦЬ.
*У вёсцы тухнуць агні Позна...* М. Лупсякоў. *Гаснуць агні па хатах, і ў вёсцы наступае цемень і цішыня* Я. Колас.

**ТЫФ** /сыпны/ СЫПНЯК *(разм ),* ТЫФУС *(уст )*
*Але пасля перанесенага тыфу ён яшчэ слабы.* П. Пестрак. *Валяўся па шпіталях, хварэючы сыпняком.* А. Чарнышэвіч.

**ТЭЛЕГРАМА** /тэрміновая; МАЛАНКА; ДЭПЕША *(уст.).*
*Тэлеграм Кузьміч чакае ад сыноў пад Новы год.* А. Бялевіч. *Ліст кароткі, як дэпеша.* З. Бядуля.

**ТЭРМОМЕТР;** ГРАДУСНІК *(разм.).*
*Ртуць у тэрмометры падала ніжэй і ніжэй.* Б. Мікуліч. *Ён меў градуснік, купляў у аптэцы парашкі ад галавы, жывата, розныя кроплі, збіраў травы і рабіў настойкі.* А. Чарнышэвіч.

## У

**У ГЭТЫМ ГОДЗЕ,** СЯГОЛЕТА, СЁЛЕТА.
*Хоць і позняя, але дружная была у гэтым годзе вясна.* Б. Мікуліч. *Ранняя сяголета вясна.* П. Пестрак.

**УВАЖЛІВА,** УВАЖНА, ПІЛЬНА, ЧУЙНА, ТАРОПКА, НЯЗВОДНА, НЕАДРЫЎНА, НЕ АДРЫВАЮЧЫСЯ, УНІКЛІВА; НЕЗМІГУТНА, БАЧЛІВА *(абл );* НАПРУЖАНА, САБРАНА, ЗАСЯРОДЖАНА *(перан.)*
ЗАТАІЎШЫ ДЫХАННЕ, СТАІЎШЫ ДЫХАННЕ, НАСТАВІЎШЫ ВУШЫ, РАЗВЕСІЎШЫ ВУШЫ, ВА ЎСЕ ВУШЫ, НА ЎСЕ ВОЧЫ, У АБОДВА ВОКІ, РАЗЯВІЎШЫ РОТ.
*Хлопец гаварыў з запалам, і слухалі яго ўважліва.* Я. Навуменка. *І ён унікліва стаў прыслухоўвацца.* Я. Колас. *Стаіўшы дыханне, людзі слухалі.* М. Ткачоў. *Я слухаў з цікавасцю, як той казаў, наставіўшы вушы ..* П. Пестрак. *Алесь на ўсе вочы глядзеў на жанчыну.* У. Караткевіч.

**УВОЛЮ,** АДВОЛІ, УДОСТАЛЬ, ДАСТАТКОВА У ДАСТАТКУ, КОЛЬКІ ХОЧАШ, КОЛЬКІ ЎЛЕЗЕ, ПА ЗАВЯЗКУ, АД ЖЫВАТА, АД ПУЗА.
*Уволю пахадзіўшы па лесе, Макар заходзіць у калгасную кантору.* А. Асіпенка. *І хлеб і сала – усяго маюць у дастатку.* П. Пестрак. *Заскочым у Альхоў. Наядзімся ад пуза.* І. Навуменка.

**УГАВАРЫЦЬ,** УПРАСІЦЬ, УЛАМАЦЬ *(разм.);* УМАЛЕГАЦЬ *(абл.).*
*Але Аўгіню ніяк не ўгаворыш. Уперлася кабета на сваім і ні з*

*месца.* Я. Колас. *Я ўпрасіла бацьку ўзяць мяне з сабою на Украіну.* Э. Агняцвет.

**УГНЯВІЦЬ,** УГНЕВАЦЬ, РАЗГНЯВІЦЬ, РАЗЗЛАВАЦЬ, УЗЛАВАЦЬ, УЗАРВАЦЬ *(перан.)* УВЕСЦІ Ў ГНЕЎ, ВЫВЕСЦІ З СЯБЕ, ВЫВЕСЦІ З ЦЯРПЛІВАСЦІ.

*Што ж, каб гаспадыню не ўгнявіць, трэба аладкі пахваліць.* А. Махнач. *І, можа, так і не пайшла б, каб аднойчы яе ўпартасць не вывела з сябе дзядзьку Макара.* Х. Жычка.

**УДАР,** ШТУРШОК /*адрывісты пальцам:* ПСТРЫЧКА; ШТУРХАН, ШТУРХАНЕЦ, ШТУРХЕЛЬ, ТАЎХЕЛЬ, ПАПІХАНКА, ВЫСПЯТАК, АПЛЯВУХА, АПЛЯВУШЫНА, ПОЎХА, КУХТАЛЬ, ГРЫМАК *(разм.).*

*Паваліўся ён ад першага ўдару ў вісок...* М. Зарэцкі. *Барометру пстрычку са злосці даю...* Я. Колас. *Яна пешчаную шчаку яго пакрыла гучнаю аплявухаю.* К. Крапіва.

**УДВАЯ,** УДВАЙНЕ, У ДВА РАЗЫ; УДУБАЛЬТ *(разм.).*

*На марозе карова ўдвая павінна сена з'есці.* А. Асіпенка. *У вачах па два семафоры, па два слупкі – усё ўдубальт!* Х. Шынклер.

**УДЗЕЛЬНІК,** САЎДЗЕЛЬНІК, СУПОЛЬНІК, ЧЛЕН, ПАРТНЁР.

*Арыштавалі бацькоў і родных, таксама ўдзельнікаў арганізацыі, якія ў той дзень былі дома* Р. Няхай. *А твары партнёраў, рэзка змененыя прагавітасцю да грошай, яшчэ больш павялічвалі непрыемнае адчуванне.* Я. Колас.

**УДЗІРВАНЕЦЬ,** УТРАВЕЦЬ.

*Многа зямлі ўдзірванела за гады вайны.* Я. Брыль. *Зямля ўтравела – не бярэ лямеш.* Р. Барадулін.

**УЗАРВАЦЬ,** ПАДАРВАЦЬ ПУСЦІЦЬ У ПАВЕТРА, ПАДНЯЦЬ У ПАВЕТРА.

*Колькі ўжо ен падарваў тут, у лясах, сасновых пнёў на карчы.* І. Чыгрынаў. *І дзоты чужыя ў паветра гранаты мае паднялі.* А. Астрэйка.

**УЗБЯРЭЖЖА,** ПРЫБЯРЭЖЖА /*мора:* УЗМОР'Е.

*Хутка яны ачуліся на ўзбярэжжы Рыжскай затокі.* Ц. Гартны. *Песні латышскае добрае свята... Расклалі на ўзмор'і кастры.* А. Бялевіч.

**УЗГОРАК,** ПАГОРАК, ПРЫГОРАК, УЗГОР'Е, ГОРКА, ГАРА, УЗВЫШША, УЗВЫШАК, ГРУД, ГРУДОК, КУРГАН /*на Далёкім Усходзе:* СОПКА; ГОРБ *(перан.).*

*Адсюль, з палявога ўзгорка, вельмі добра відаць быў наш гарадок.* М. Лупсякоў. *Па другі бок дарогі цягнуліся пясчаныя груды.* Я. Колас. *Курганы апранаюцца ў зялёніну.* Р. Няхай.

**УЗДОЎЖ,** ПАЎЗ; УСЦЯЖ *(абл.).*

*Уздоўж сцен на лаўках сядзелі пажылыя, што прыйшлі пацікавіцца, успомніць маладосць.* А. Чарнышэвіч.

**УЗНАГАРОДА,** ПРЭМІЯ, ПРЫЗ.

*Вярнуліся з партызанства ўсе жывыя, некаторыя з узнагародамі.* П. Пестрак. *Кацярыне за работу першай прэмію далі.* П. Броўка.

**УЗОР,** ПРЫКЛАД, МЕРКА, ЎЛАД, МАНЕР, МАДЭЛЬ, ФОРМА, НОРМА, СТАНДАРТ, ТЫП; КАПЫЛ, ФАСОН, ІШАБЛОН, ШТАМП, ТРАФАРЭТ, СХЕМА, АРШЫН, МЕТР *(перан.).*

*Сваёй пісьменніцкай практыкай ён [Якуб Колас] паказваў узор творчага падыходу да скарыстання гэтага запасу.* У. Юрэвіч. *Бяда, непакой у Слабодках – жыві на нямецкі манер!* Я.Колас. *Усе вартасці ісціны меру я мужыцкім аршынам – працай.* М. Танк.

**УЗРОСТ,** ВЕК; ГАДЫ *(мн.),* ЛЕТЫ *(паэт , мн ).*

*Былі тут і людзі сярэдняга ўзросту. страчаліся і зусім маладыя...* У. Калеснік. *Кажуць, што доўгія гады лес дае звычайна дурням. каб яны папоўнілі разумовы недахоп багатым вопытам.* У. Караткевіч.

**УЗЯЦЦА** /*моцна.* УХАПІЦЦА, УЧАПІЦЦА, УЛЯПІЦЦА.

*Старшыня ўзяўся за лейцы, зычна прыцмокнуў.* А. Якімовіч. *Калі*

*топіцца, то і за брытву ўхопіцца.* Прыказка. *Тады падбегла Аляксеева жонка і ўляпілася Ганне ў валасы.* К. Чорны.

**УЗЯЦЬ**, АТРЫМАЦЬ, ПРЫНЯЦЬ, ЗАБРАЦЬ /*прымусова:* АДНЯЦЬ, ЗАХАПІЦЬ /*прымусова на карысць дзяржавы:* РЭКВІЗАВАЦЬ; ХАПНУЦЬ, УХАПІЦЬ, АДХАПІЦЬ, СХАПІЦЬ, ЦАПНУЦЬ, УВАРВАЦЬ, УРВАЦЬ, ВЫРВАЦЬ, ЗАПАРВАЦЬ, УПАРВАЦЬ, ЗАГРАБАСТАЦЬ, ПАЛАТАЦЦА *(разм.)*, ПРЫГАРНУЦЬ, САДРАЦЬ, ЗДЗЕРЦІ, СКУБЯНУЦЬ, ЗЛУПІЦЬ, ЗАГРАБЦІ, УГРАБЦІ, ГРАБЯНУЦЬ *(перан.)* ПРЫБРАЦЬ ДА РУК, ВЫРВАЦЬ З РУК, ВЫРВАЦЬ З ГОРЛА, ВЫРВАЦЬ З ЗУБОЎ.

*Любіш узяць, любі і аддаць.* Прыказка. *Шмат вайна адняла і ў мяне...* А. Куляшоў. *Тут урваў, там аддаў.* Прыказка. *Што ў лапу заграбеш – і валачэш дамоў.* У. Корбан. *Усё, ліха іх матары, прыбралі да сваіх рук.* С. Баранавых.

**УЛАДКАВАЦЬ**, УЛАДЗІЦЬ, ПРЫЛАДЗІЦЬ; ПРЫСТРОІЦЬ, УСТРОІЦЬ, УМАСЦІЦЬ, ПРЫМАСЦІЦЬ, УМЯСЦІЦЬ *(перан.)*.

*Дзядзька пасля школы уладкаваў яго ў саўгас.* І. Навуменка. *Мне думаецца, што цябе ўдасца ўстроіць на нашым заводзе.* Ц. Гартны.

**УЛАСНЫ**, СВОЙ.

*Выкуем долю ўласнай рукою – ласкі нам панскай не трэба...* Я. Колас. *Свая зямля, свая пасада!.. Ці ёсць мацнейшая прынада?* Я. Колас.

**УЛУКАТКІ**, УКОСІКІ.

*Іду ўлукаткі, як п'яны.* . Б. Сачанка. *Пасля адразу палягчэла, і ён, нават добра не спляваўшы, усхапіўся і, хістаючыся, пайшоў укосікі.* М. Лобан.

**УМЕННЕ**, МАЙСТЭРСТВА; УМЕЛЬСТВА *(разм.)*; НАВУКА, СПРЫТ ХВАТКА *(перан.)*.

*Многа патрабавалася ўмення на тое, каб кожная група была занята і не сядзела без работы.* Я. Колас. *Умельствам кухара ганарыўся сам князь...* М. Гарэцкі. *Невялікая ж навука кароў даіць.* А. Бялевіч.

**УМЕШВАЦЦА**, МЯШАЦЦА, УСТУПАЦЬ; УВЯЗВАЦЦА, ВЯЗАЦЦА, УТЫКАЦЦА, ЛЕЗЦІ, СУНУЦЦА, УЛІПАЦЬ *(разм.)*; УРАЗАЦЦА, ТАЧЫЦЦА *(перан.)* УТЫКАЦЬ НОС, ТКНУЦЬ НОС, ТОРКАЦЬ НОС, СОВАЦЬ НОС, СУНУЦЬ НОС, ПХАЦЬ НОС, ЛЕЗЦІ З НОСАМ, СУНУЦЦА З НОСАМ.

*Не ўмешвайцеся вы ў мае справы. Я лепей за вас ведаю, што мне рабіць, а чаго не трэба.* А. Макаёнак. *У гаворку ўвязвацца няма чаго: падвыпіла, думкі ўзвінчаны.* А. Кулакоўскі. *Не ўтыкай нос, куды не просяць!* І. Мележ.

**УМЯШЧАЛЬНЫ**, ПАКОЎНЫ.

*Толькі за адзін апошні год ён пабудаваў новы свіран, умяшчальны, з двайной столлю.* М. Ткачоў. *За плячамі ў яго быў досыць пакоўны мяшок з хлебам і скорамам, прыладжаны на ручніку.* Я. Колас.

**УНІЗ**, ДАДОЛУ, ДОЛУ; ДОЛКІ, ДАЛОЎ *(разм.)*.

*Пад зорамі сокал завіс, глядзіць па-арлінаму ўніз.* Я. Купала. *Долу гнецца густая трава ля ракі, серабрыцца расяным налівам* А. Александровіч.

**УПАРТЫ**, НЕПАСЛУХМЯНЫ, НЕСЛУХМЯНЫ, КАПРЫЗНЫ; НАРАВІСТЫ, НАТУРЫСТЫ, НАТУРЛІВЫ, УБОІСТЫ, ЗАЦІНЛІВЫ *(разм.)*.

*Упарты, як казёл.* Прыказка. *Наравістаму каню пуга не паможа.* Прыказка. *І ўпартасць, як у таго натурыстага каня.* І. Мележ.

**УПАРЦІЦЦА**, СУПРАЦІЎЛЯЦЦА, ПРАЦІВІЦЦА, УПІНАЦЦА, НАРАВІЦЦА, НАТУРЫЦЦА, КАЗЫРЫЦЦА, МУЛІЦЦА, КАПЫРСЦІЦЦА *(разм.)*: УПІРАЦЦА, БРЫКАЦЦА, ЛАМАЦЦА, ГНУЦЦА *(перан.)* СТАНАВІЦЦА НА ДЫБЫ, КАПЫЛІЦЬ НОС.

*Загурскі засабіраўся дамоў, але маці затрымала яго, ды ён не*

*вельмі ўпарціўся.* А. Асіпенка. *Яна не працівілася, сама тулілася да яго.* І. Мележ. *Мікола ўсё нешта станавіўся на дыбы, гарачыўся, а потым здаўся...* М. Нікановіч.

**УПАСЦІ,** АПАСЦІ, ВЫПАСЦІ, ПАВАЛІЦЦА, ЗВАЛІЦЦА, АБВАЛІЦЦА, ВЫВАЛІЦЦА, СКІНУЦЦА /*коцячыся* СКАЦІЦЦА; РЫНУЦЬ, РУХНУЦЬ, БУХНУЦЬ, БУХНУЦЦА, ГОПНУЦЦА, ГЭПНУЦЦА, ГАКНУЦЦА, ГРУКНУЦЦА, БРАЗНУЦЦА, ГРЫМНУЦЬ, ГРЫМНУЦЦА, ГРОХНУЦЦА, ШЛЁПНУЦЦА, ЛЯПНУЦЦА, ПЛЯСНУЦЦА, ЧМЯКНУЦЦА, ШУХНУЦЬ (*разм.*); ПАЛЯЦЕЦЬ, ЗЛЯЦЕЦЬ (*перан.*) ЗЛЯЦЕЦЬ З НОГ, ЗАРЫЦЬ НОСАМ.

*Нешта так моцна і з такога вялікага размаху выцяла яго па плячы, што ён упаў.* А. Кулакоўскі. *Падгарэлы дах абваліўся.* Т. Хадкевіч. *Свечка скацілася на лаву і пагасла.* П. Броўка. *Вярблюд і бухнуў у раку з размаху...* У. Дубоўка. *Калі хто шлёпнецца, за ім услед гон рогат, жарты.* З. Бядуля. *Той прабег, не ўтрымаўся і зарыў носам.* М. Лобан.

**УПЛЫЎ,** УЗДЗЕЯННЕ, УРАЖАННЕ; ЗАКВАСКА, ЗАРАЗА (*перан.*).

*Так пад уплывам і свядомым уздзеяннем чалавека змяняецца жывёльны свет краіны.* В. Вольскі.

**УПРЫГОЖВАЦЬ,** АЗДАБЛЯЦЬ, УБІРАЦЬ, ПРЫБІРАЦЬ, ПРЫХАРОШВАЦЬ /*малюнкамі:* РАСПІСВАЦЬ /*асвятленнем:* ІЛЮМІНАВАЦЬ; ХАРАШЫЦЬ, УХАРАШАЦЬ, КРАСІЦЬ, АКВЕЧВАЦЬ (*разм.*).

*Я ўпрыгожваў з дзеўчынай сваёй перад святам арку дзеразою.* А. Куляшоў. *Плешчацца па краях вада, жвірынкі маленькія вылізвае, гладзіць, прыхарошвае пясок.* Я. Скрыган. *Не меса красіць чалавека, а чалавек месца.* Прыказка.

**УПЭЎНЕНАСЦЬ,** ПЭЎНАСЦЬ, ВЕРА, ПЕРАКОНАНАСЦЬ, ПЕРАКАНАННЕ.

*Хацеў ісці ўслед ворагу аж да яго гнязда, уліць упэўненасць у душы людзей* П. Пестрак. *У яго было цвёрдае перакананне ў тым, што ўсё ліха пайшло ад таго, што скінулі цара.* Я. Колас.

**УРАДЖАЙНЫ,** УРАДЛІВЫ, ПЛЁННЫ, ПЛАДАНОСНЫ, УМАЛОТНЫ, ХЛЕБАРОДНЫ, ХЛЕБАДАЙНЫ (*паэт.*): ПЛОДНЫ (*перан*).

*Ураджайны грунт засыпаўся пяском.* Я. Колас. *Поле ўрадлівае, глею, камення – ані звання.* К. Чорны. *Умалотны, багаты быў год.* А. Бялевіч. *Дзе мой дом, дзе ты, хата мая, дзе загон хлебадайнай зямлі?* Я. Купала.

**УРАЧЫСТА,** ВЕЛІЧНА, СВЯТОЧНА, ПА-СВЯТОЧНАМУ.

*Урачыста адгрымеў развітальны салют* М. Лынькоў.

**УСМЕШКА;** УСМЕХ, УХМЫЛКА (*разм.*).

*Глядзіш ты на мяне з усмешкай, я ж ад усмешкі растаю.* А. Астрэйка. *Па зморшчаным твары Цыпрука раптам праплыла хітрая ўхмылка.* З. Бядуля.

**УСПОМНІЦЦА,** ПРЫПОМНІЦЦА, УСПАМЯНУЦЦА, ПРЫГАДАЦЦА, ЗГАДАЦЦА; АЖЫЦЬ, УВАСКРЭСНУЦЬ (*перан.*) ПРЫЙСЦІ НА ПАМЯЦЬ, УЗБЕГЧЫ НА ПАМЯЦЬ, АЖЫЦЬ У ПАМЯЦІ, ПАЎСТАЦЬ У ПАМЯЦІ, ПРАЙСЦІ У ПАМЯЦІ, УСПЛЫСЦІ У ПАМЯЦІ, УСПЛЫСЦІ НА ПАМЯЦЬ, ВЫПЛЫСЦІ З ПАМЯЦІ, УСПЛЫСЦІ НА ДУМКУ.

*Неяк яно тады самае лепшае ўспомніцца, уся тая ласка, якая была.* Я. Брыль. *Прыгадаўся адзін даўні выпадак.* А. Асіпенка. *І ў памяці паўстаў вобраз гэтай энергічнай жанчыны і паэтэсы.* Б. Мікуліч. *Вось і муж усплыў на думку...* Я. Колас.

**УСТАВАЦЬ,** ПАДНІМАЦЦА /*хутка*· ПАДХОПЛІВАЦЦА, УСХОПЛІВАЦЦА.

*Ён ужо не такі малы· сам спрабуе ўставаць.* Р. Сабаленка. *Некаторыя салдаты ўсхопліваюцца, некаторыя ляжаць нерухліва...* Я. Колас.

**УСТАЛЯВАЦЦА,** СТАЦЬ, ЗАПАНАВАЦЬ, УСТАЯЦЦА СТАЦЬ НА АБЕДЗВЕ НАГІ.

*У хаце ўсталявалася цішыня* М. Лынькоў. *Пагода якраз устаялася і абяцала працягнуцца надалей* Ц. Гартны.

**УСХОДЫ** *(мн.).* ПРОРАСЦЬ *Іазімі-ны* РУНЬ.

*Я люблю ўсходы нашых палеткаў і спавітыя ў зелень лугі..* Я. Купала. *Густая рунь так разраслася, што не відаць было зямлі.* А. Чарнышэвіч.

**УСЮДЫ,** СКРОЗЬ, ПАЎСЮДЫ, ПАЎСЮЛЬ *(разм.)* ДЗЕ ХОЧАШ, НА КОЖНЫМ КРОКУ, ШТО НІ КРОК, КУДЫ НІ ГЛЯНЬ, ДЗЕ НІ ГЛЯНЬ, КУДЫ НІ ПАДАЙСЯ, КУДЫ НІ СТУПІ, ЯК КІНУЦЬ ВОКАМ, ЯК СКІНУЦЬ ВОКАМ, ЯК АКІНУЦЬ ВОКАМ, АД КРАЮ ДА КРАЮ, ТУТ І ТАМ.

*У вёсцы цемна, усюды спяць.* З. Бядуля. *Скрозь чужыя людзі..* П. Глебка. *Куды ні глянь – адны руіны, попел.* В. Вітка. *Куды ні ступі – вада і вада.* Б. Сачанка. *Як скінуць вокам, цягнулася роўнае рыжавата-зялёнае поле.* У. Дамашэвіч.

**УСЯЛЯКІ,** УСЯКІ, РОЗНЫ, РАЗНАСТАЙНЫ, НЕАДНАСТАЙНЫ, НЕАДНОЛЬКАВЫ, НЕАДНАРОДНЫ, НЯРОЎНЫ; РАЗМАІТЫ *(абл.).*

*Стол повен гарэлкі і усялякай яды.* Я. Купала. *Хоць з адной печы, ды неаднолькавыя пернікі.* Прыказка. *Аднаго бацькі і адной маткі няроўныя бываюць дзіцяткі.* Прыказка.

**УТАПІЦЦА,** УТАНУЦЬ, ПАТАНУЦЬ, ЗАХЛЫНУЦЦА.

*Зганьбаваная дзяўчына хацела ўтапіцца. але Ігнат Бубылька выратаваў яе* А. Асіпенка. *Каму суджана быць на шыбеніцы, той не патоне.* Прыказка.

**УТОЙВАЦЬ,** ЗАТОЙВАЦЬ, ПРЫТОЙВАЦЬ, ТАІЦЬ, ХАВАЦЬ, СКРЫВАЦЬ, МАЎЧАЦЬ; ПАКРЫВАЦЬ, ПРЫКРЫВАЦЬ *(перан.)* ТРЫМАЦЬ У САКРЭЦЕ, ТРЫМАЦЬ ЯЗЫК ЗА ЗУБАМІ. ХАВАЦЬ У ДУШЫ, ЗАМЯТАЦЬ СЛЯДЫ.

*Кулакі ды хутаранцы ўтойваюць зямлю.* А. Чарнышэвіч. *Я ніколі нічога не таіла ад цябе.* Я. Скрыган. *Гультая не трымай у сакрэце, а крытыкуй яго ў газеце.* Прыказка. *Ён умее трымаць язык за зубамі.* І. Гурскі.

**УЦЯЧЫ,** ЗБЕГЧЫ, УЛІЗНУЦЬ, ШМЫГАНУЦЬ, ШМАРГАНУЦЬ *(разм.);* ЗМЫЦЦА, МАХНУЦЬ, МАТАНУЦЬ *(перан.)* ПУСЦІЦЦА НАЎЦЕКІ, ПАДМАЗАЦЬ ПЯТЫ, ВІЛЬНУЦЬ У КУСТЫ, ДАЦЬ ЛАТАТЫ, ЗАДАЦЬ ЛАТАТЫ, ДАЦЬ СТРАКАЧА, ЗАДАЦЬ СТРАКАЧА, ДАЦЬ ДРАЛА, ЗАДАЦЬ ДРАЛА, ДАЦЬ ДРАПАКА, ЗАДАЦЬ ДРАПАКА, ДАЦЬ ХОДУ, ПАКАЗАЦЬ ХВОСТ.

*Ад пагоні не проста Сцяпану ўцячы.* А. Куляшоў. *Пусціліся наўцёкі з лесу – далі лататы.* З. Бядуля. *Сам пан ледзьве паспеў пяты падмазаць..* К. Чорны. *Паляўнічаму вавёрка паказала толькі хвост.* М. Калачынскі .

**УШЧЫКНУЦЬ,** УШЧЫПНУЦЬ.

*Потым я, ведаеш, яшчэ Маньку Жагулаву лішні раз ушчыкнуў, дык яна мне цішком кілбасу сухенькую...* К. Крапіва. *Лёкай ушчыпнуў моцна пакаёўку за руку вышэй локця.* З. Бядуля.

## Ф

**ФАКЕЛ,** СВЕТАЧ *(кніжн.);* ПАХОДНЯ *(уст.).*

*Кожны ў руках трымаў факел – кужэльны, абмочаны ў газу вузел на кійку.* М. Лобан. *Бяры светач, ідзі за судзьбінай, ідзі з словам святым: Беларусь!* Я. Купала.

**ФАРТУХ,** ПЯРЭДНІК.

*Мама і стол заслала настольнікам, і хату разы два перамяла, і фартух новы падвязала.* Я. Брыль. *Лена – у светлым пярэдніку, з вялікай лямпай у руцэ – ідзе да стала.* Я. Брыль.

**ФАТАГРАФАВАЦЬ,** ЗДЫМАЦЬ.
*Адзін быў з фотаапаратам. усё пстрыкаў ім. фатаграфуючы розныя пейзажы.* М. Лынькоў. *Мюлер дастае фотаапарат і здымае* К. Крапіва.

**ФІГА;** ХВІГА, ДУЛЯ, КУКІШ, ШЫШ *(разм ).*
*Я ёй тады другую, трэцюю, аж і яна мне тыц пад нос фігу...* Ядвігін Ш. *Любіў Ганулю, а атрымаў дулю.* Прыказка.

**ФІЛОСАФ,** МЫСЛІЦЕЛЬ, МУДРЭЦ.
*Шпунт задуменны сёння, як мысліцель...* А. Зарыцкі. *Цытаты сыпаў ен з Лайолы і з мудрацоў, наколькі мог.* Я. Колас.

**ФІРАНКА,** ШТОРА, ЗАНАВЕСКА.
*Настуля завешвае фіранкамі вокны, запальвае газоўку і накрывае стол.* К. Крапіва. *Адно акно было прыадчынена, а занавеска трохі адсунута.* І. Мележ.

**ФРАНТ;** ФАРСУН, МОДНІК *(разм.).*
*Франт: боты ў рант, галава стручком, нос кручком.* Прымаўка. *Фарсун, што і носа крукам не дастаць.* Прымаўка.

**ФУТАРАЛ,** ФУТЛЯР, ЧАХОЛ.
*Прыгожа вісеў цераз плячо скураны футарал з дробнымі каморніцкімі рэчамі.* К. Чорны. *Потым павесіў бінокль у скураным чахле і надзеў шапку.* П. Пестрак.

## Х

**ХАБАР,** ПОДКУП; ПАДАЧКА, ПРЫНОС, ПАДМАЗКА, ПАДГОДА, ЛАПАНКА *(разм.)*
*Майстар гэты шмат з каго браў хабары або вымагаў розныя гасцінцы.* А. Якімовіч. *Пускайце ў ход і подкуп і намовы...* Я. Колас. *За праўдаю суд не ідзе, а за падмазкаю.* Прыказка.

**ХАДА,** ХАДЗЬБА, ХОД, ПАХОДКА, СТУПА, ПОСТУП.
*Нягледзячы на стомленасць, ён паскорыў хаду.* А. Чарнышэвіч. *Ой, пайду я лугам, вольнаю ступою на спатканне светлай будучыні дзён ..* П. Трус.

**ХАЛАДЗЕЦ,** КВАШАНІНА.
*А на стале стаяла вялікая міска халадцу. у талерках – халоднае сала, каўбаса, яечня* П. Пестрак. *Твар хадыром хадзіў, як цёплая квашаніна.* З. Бядуля.

**ХАЛАСЦЯК,** НЕЖАНАТЫ, БАБЫЛЬ; КАВАЛЕР *(уст.).*
*У пакоі ўсюды было акуратна прыбрана, дарма што тут жыў халасцяк.* А. Кулакоўскі. *Жаніцьба яго не надта вабіць, чалавек ён ужо сталы, прывык бабылём жыць.* Я. Колас.

**ХАРАКТАР,** НАТУРА, НОРАЎ, ДУША, ПСІХАЛОГІЯ.
*І Міхал ведаў усіх сялян: хто багацейшы, хто бяднейшы, які ў каго характар і сямейнае становішча.* П. Пестрак. *Ён смяяўся, радаваўся, што ў яго дачушак хлапцоўскі нораў.* З. Бядуля.

**ХАЦЕЦЦА,** ЖАДАЦЦА, ПРАГНУЦЦА, ПАМЫКАЦЬ, НЕЦЯРПЛІВІЦЦА, НЕЦЯРПЕЦЦА; КАРЦЕЦЬ, РУПІЦЬ, ПАДМЫВАЦЬ *(разм.);* СВЯРБЕЦЬ *(перан.).*
*Яму даўно хацелася ў школу, толькі баяўся ён настаўніка, баяўся за свае вушы.* Я. Колас. *Ёй нецярпелася хутчэй ускрыць пасылку.* К. Крапіва. *Падмывала ўзяць у рукі камень, грымнуць па вітрыне пышнай той...* П. Панчанка.

**ХВАЛІЦЦА,** АФІШЫРАВАЦЦА; ВЫХВАЛЯЦЦА, ПАХВАЛЯЦЦА *(разм.);* КАЗЫРАЦЬ *(перан.).*
*Хвалілася, што будзе хадзіць у форме, што скора пачне зарабляць грошы.* П. Арабей. *Чалавек пахваляўся, што ўзяў у палон немца...* М. Лужанін.

**ХВАРОБА,** ХВОРАСЦЬ, НЕЗДАРОЎЕ; НЕМАЧ *(разм.).*
*Ён лячыў ад усіх хвароб зёлкамі і нашэптанай вадою.* З. Бядуля. *Напэўна, з навукі і хворасць сталася.* Я. Колас.

**ХВОЯ,** ХВОЙКА, ХВАІНА, САСНА.
*Люблю я лес, адвечны бор, дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі* Я Колас. *Зазвінела піла, застагнала сасна* А. Александровіч

**ХІСТАЦЦА,** ВАГАЦЦА, ГАЙДАЦЦА, ГОЙДАЦЦА, ПАГОЙДВАЦЦА, КІВАЦЦА, КАЧАЦЦА, КАЛЫХАЦЦА, ПАКАЛЫХВАЦЦА, КАЛЫВАЦЦА, ЗЫБАЦЦА, ВАХТАЦЦА *(абл.)*.
*Конь аж хістаўся, небарака, у бакі, гэтак ен быў здарожаны* К. Чорны. *Голле гойдалася і шумела пад ветрам...* К. Чорны. *На дрэве калыхаўся жоўты ліст...* П. Глебка.

**ХЛОПЕЦ,** ДЗЯЦЮК, ЮНАК.
*У нашай жа весцы жыў хлопец Максім, дзяцюк – пашукаць такіх трэба...* П. Глебка. *Юнак у каханні прызнаўся дзяўчыне.* А. Александровіч.

**ХЛЮПАЦЬ,** ХЛЮПАТАЦЬ, ЧВЯКАЦЬ, ЧМЯКАЦЬ.
*Людзі набліжаліся, пад нагамі ў іх ужо моцна хлюпала і чвякала балота.* А. Кулакоўскі.

**ХМАРА,** ВОБЛАКА; ХМУРЫНА, ХМУРЫНКА, АБЛАЧЫНА, АБЛАЧЫНКА *(разм.)*.
*Паўнеба заслалі калматыя хмары.* А. Бачыла. *Па небе плылі воблакі.* Я. Скрыган.

**ХОЛАД,** ХАЛАДЭЧА, ХАЛАДЗЕЧА, ЗЯБКАСЦЬ, СВЕЖАСЦЬ, СТЫЛАСЦЬ, СТЫНЬ /*моцны:* МАРОЗ /*з вільгаццю:* ЗОЛКАСЦЬ; СЦЮЖА, СЦЮДЗЁНАСЦЬ *(абл.)*
*Праз чорную прорву дзвярэй ліўся холад.* К. Чорны. Не лета ўжо, з ваколіцы цягне *зябкасцю.* І. Навуменка. *Мерзнуць ад сцюжы апухлыя пальцы, баляць.* М. Танк.

**ХОЛАДНА,** ЗЯБКА; СЦЮДЗЕНА, ЗНОБКА *(абл.)*; ДРОГКА *(перан.)* ХОЦЬ САБАК ГАНЯЙ, ХОЦЬ ВАЎКОЎ ГАНЯЙ, ЯК У ЛЯДОЎНІ.
*Стала холадна ў кашулі – апрануў ватоўку дзед.* А. Астрэйка. *А покуль нагрэецца паветра, раніцай сцюдзёна...* Б. Мікуліч. *У нашых пакоях хоць ваўкоў ганяй.* С. Шушкевіч.

**ХОП,** ХАП, ЦАП.
*Што ўлетку ножкаю коп, тое ўзімку ручкаю хоп.* Прыказка. *Засунеш руку ў нару, а рак цап за пальцы кляшнёй* М. Лынькоў.

**ХРЫСЦІЦЦА**; ЖАГНАЦЦА *(абл.)* КЛАСЦІ КРЫЖЫ.
*У царкву заходзілі жанчыны і хрысціліся* П. Галавач. *Як зазванілі, ён зняў шапку і пачаў жагнацца.* К. Чорны.

**ХУЛІГАНІЦЬ**, ГРУБІЯНІЦЬ, БУЯНІЦЬ, БУЗАВАЦЬ, БУШАВАЦЬ *(разм.)*,
*Значыць, толькі ў школе трэба быць культурным, а дома і хуліганіць можна?* А. Макаёнак. *Прадзед быў чалавек упарты, грубіяніць не кідаў.* М. Гарэцкі. *Звяжам, калі будзеш буяніць...* М Лобан.

**ХУТАЦЬ,** ЗАХІНАЦЬ.
*Яна прыціскала да сябе дзіця, хутала яго ў старую коўдрачку, саграваła сваім дыханнем...* М. Лынькоў. *Ён захінаў Лёдзю крысом пінжака, частаваў ледзянцамі і нашэптваў ласкавыя словы.* У. Карпаў.

**ХУТКА,** СКОРА, ШПАРКА, БЫСТРА, СПЕШНА, ПАСПЕШНА, ПАСПЕШЛІВА, СПЕХАМ, СПЯШАЮЧЫСЯ, ТОРАПКА, ТАРОПКА, ТАРАПЛІВА, ЖВАВА, МІГАМ, УМІГ, ІМКЛІВА, ІМПЭТНА, ІМГНЕННА, ВОКАМГНЕННА, УВАЧАВІДКІ, УРАЗ, УМОМАНТ, БЕГЛА, МАЛАНКАВА, КУЛЁМ, СТРЫМГАЛОЎ, НАЎСКАЧ, БЯГОМ, БЕГМА, ЛЁЦЬМА, УЛЁТ; НАСКОРА, ДУХАМ *(разм.)*; ШЫБКА, МОЦНА, БОРЗДА, БОРЗДКА, ХАПАТЛІВА,ХАПЛІВА, УПОХАПКІ, ХАПАЮЧЫСЯ, ВОБМЕЛЬГАМ, ВОМЕГАМ, ВОБЦАС, КУМІЛЬГОМ, КУМІЛЬГНА, НАЎСКАПЫТА, УЧВАЛАМ, УГРУНЬ, СУГРУНЕМ *(абл.)*; ЛІХАМАНКАВА, ШАЛЁНА, АШАЛЕЛА, ПТУШКАЙ, КАМЕНЕМ, КУЛЯЙ, СТРАЛОЙ, ВЕТРАМ, ВІХРАМ, АГНЁМ, ПЕРУНОМ, МАЛАНКАЙ, БЕЗАГЛЯДНА *(перан.)* У ХУТКІМ ТЭМПЕ, НА СКОРУЮ РУКУ, СПЕШНЫМ ПАРАДКАМ, НАСПЕХ,

У ТОЙ ЖА ЧАС, У АДЗІН МОМАНТ, ЯК АДЗІН МОМАНТ, У ХВІЛІНУ, ЗА АДНУ ХВІЛІНУ, У МІНУТУ, У ІМГНЕННЕ, У АДНО ІМГНЕННЕ, У ІМГНЕННЕ ВОКА, У МІГ ВОКА, У ДВА МІГІ, У ВАЧАХ, НА ВАЧАХ, ЯК БАЧЫШ, ЯК ВІДЗІШ, ЯК НА ДРАЖДЖАХ, НЕ ПА ДНЯХ, А ПА ГАДЗІНАХ, НА ЎВЕСЬ ДУХ, ВА ЎВЕСЬ ДУХ, У АДЗІН ДУХ, АДНЫМ ДУХАМ, ШТО ЁСЦЬ ДУХУ, АДНЫМ ДЫХАМ, КОЛЬКІ СІЛЫ, ШТО СІЛЫ, НА ЎСЮ СІЛУ, ЯК ДУЖ, ЯК МАГА, НА ЎСЕ ЖЫЛЫ, АДНЫМ МАХАМ, У АБГОНКІ, НА ХАДУ, НА ЎВЕСЬ ХОД, НА ПОЎНЫ ХОД, НА ЎВЕСЬ СКАЧ, НА АДНОЙ НАЗЕ, ВА ЎСЕ НОГІ, З УСІХ НОГ, З УСІХ ЧАТЫРОХ НОГ, НЕ ЧУЮЧЫ НОГ, У ДВА СКОКІ, ВА УСЕ ЛАПАТКІ, НА ЗЛОМ ГАЛАВЫ, НА ЗЛОМ ШЫІ, З УСІХ КАПЫТОЎ, БЕЗ АГЛЯДКІ, ЯК НА ПАЖАР, ВЫСАЛАПІЎШЫ ЯЗЫК, ЯК КУЛЯ, ЯК КОРАК З БУТЭЛЬКІ, ЯК ПТУШКА, НА КРЫЛАХ, НА КРЫЛЛЯХ, ЯК МАЛАНКА, ЯК СТРАЛА, ЯК ВЕЦЕР, ЯК ВІХОР, НА ЛЯТУ, РАЗ-РАЗ, РАЗ-ДВА.

*Трамвай хутка нёсся вуліцаю.* Ц. Гартны. *Вельмі шпарка пранёсся аўтамабіль.* З. Бядуля. *Апрануўшы спехам паліто, выйшаў, трапіў у людскі паток.* А. Русецкі. *Па тратуары ішла таропка жанчына з кошыкам.* П. Галавач. *Мігам лета прайшло, ночы сталі свяжэй...* Я. Купала. *Рукі бандытаў вокамгненна ўзляцелі ўгору.* А. Чарнышэвіч. *Бегма дастаўляю тэлеграму на стол сартыроўкі.* Х. Шынклер. *Тут вельмі борзда вечарэе, давай, зямляк, паскорым крок.* П. Глебка. *Упохапкі апрануўся, сунуў у кішэню пісталет і памкнуўся праз акно выскачыць на вуліцу...* М. Лужанін. *Костусь кумільгом скаціўся з палка да дзвярэй.* М. Лужанін. *Толя куляй ускочыў у хату, нібы за ім гналіся чатыры сабакі.* Я. Маўр. *Час бег безаглядна.* Ц. Гартны. *Андрэй з Захарам у адно імгненне пераглянуліся* П. Пестрак. *Туды-сюды мкне што ёсць духу...* Я. Колас. *На поўны ход ішоў па Сожы параход.* К. Кірэенка. *Конь прэ ва ўсе ногі...* Я. Купала. *Час ляцеў, як віхор...* А. Куляшоў.

## Ц

**ЦАЛАВАЦЦА;** ЛІЗАЦЦА *(разм. неадабр.) Із нагоды вялікадня:* ХРЫСТОСАВАЦЦА *(разм.).*

*Пад чырвонай нізкаю рабінай з хлопцам цалавалася дзяўчына.* А. Русецкі. *– Я маю за стральбу гадзіннік, я маю падарунак ад самога цара, калі хрыстосаваўся з ім у вялікдзень.* У. Галубок.

**ЦАЛІК,** ЦАЛІНА.

*Агата з Ліпачкай выйшлі з цаліка на Навагранскую шашу.* Р. Сабаленка. *Ішла цалінай, снегу па грудзі...* П. Кавалёў.

**ЦАЛЯЦЬ,** НАЦЭЛЬВАЦЬ, НАЦЭЛЬВАЦЦА, ПРЫЦЭЛЬВАЦЦА, МЕЦІЦЬ, ЛУЧЫЦЬ НАВОДЗІЦЬ НА ЦЭЛЬ.

*Падумаеш – хітрасць у рыфмы цаляць у садзе, ружовым ад сораму.* П. Панчанка. *Дужа бамбяць, усё па цэнтру гарадка мецяць.* М. Ткачоў. *Лучыў у варону, а папаў у карову.* Прыказка.

**ЦАНІЦЬ,** ДАРАЖЫЦЬ, СТАВІЦЬ.

*Байцы трошкі крыўдавалі за яго залішнюю строгасць, але ў баях цанілі крыклівага старшыну.* В. Быкаў. *Нават сам пан ляснічы Канстанты Сянкевіч ставіць яго высока як паляўнічага і рыбака.* С. Александровіч.

**ЦАЦКА,** ЗАБАЎКА.

*Не меў я ў маленстве ніводнае цацкі...* М. Лужанін. *Уся яе ўвага на гэтых дзіцячых забаўках. Нешта цягне забраць іх ды занесці дзяўчынкам.* А. Кулакоўскі.

**ЦВЁРДЫ**, ЗАЦВЯРДЗЕЛЫ, СКАМЯНЕЛЫ, УКАМЯНЕЛЫ.
*Ноччу іней лёг на стрэхі і на платы, і зямля стала цвердай і звонкай* П. Галавач *Мы прыкрылі яго шынялямі і саломай, а самі дзяўблі скамянелую зямлю, каб замаскавацца, каб не адступіць адсюль...* Р. Няхай.

**ЦВІК**, ГВОЗД /*прыбіваць падкову*: ВУХНАЛЬ.
*Сяргей, распрануўшыся, скінуў шапку і павесіў разам з шынелем на цвік, убіты ў вушак дзвярэй* Р. Сабаленка. *Ён калі ў кузню прыйдзе, то толькі тое і рабі, што глядзі, каб не набраў у кішэню вухналёў.* А. Чарнышэвіч.

**ЦВІЛЬ**, ПЛЕСНЯ /*на вадкасці*: БРОСНЯ.
*Яна ідзе паўз разваленую пуню; пахне з яе прэлая салома і веснавая цвіль.* К. Чорны. *Цемна ў хатцы тваей, плесня з мохам на ёй.* М. Багдановіч. *Бросняй зарасталі ціхія рачныя затокі.* Т. Хадкевіч.

**ЦВІСЦІ**, КВІТНЕЦЬ, КРАСАВАЦЬ, КРАСАВАЦЦА.
*Будзеш ты вясною зноў цвісці, мой сад.* М. Машара. *Красавацца будзе садам наша праца, наша радасць.* А. Александровіч.

**ЦЕМРА**, ЦЕМНАТА, ЦЯМНОТА, ЦЕМЕНЬ, ЦЕМ, ЦЕМРАДЗЬ, ЦЬМА, МОРАК, ЗМРОК, ЗМРОЧНАСЦЬ; ПОЦЕМКІ, ПРЫЦЕМКІ, СУЦЕМКІ (*мн.*); ЦЕМРЫВА, ЦЕМРАНЬ, ЦЕМРЫНЯ, ЦЯМРЫЦА, ЦЯМРЭЧА (*разм.*); МРОК, ПАМРОКА, СУТОННЕ, СУЦЕННЕ, СУТОНЬ (*абл.*); ЧАРНАТА (*перан.*).
*Цемра была такая, што за два крокі нічога не было відаць* Я. Маўр. *Вячэрні змрок ахутваў гарадскія вуліцы.* Э. Самуйлёнак. *Надыходзіў вечар. Лёгкія прыцемкі ахутвалі горад.* П. Кавалёў. *У цямрэчы гэткай не адразу і пазнаеш.* А. Савіцкі. *У сутонні снежнае ночы там відаць былі сілуэты аўтамабіляў...* В. Быкаў.

**ЦЕНЬ**, ЗАСЕНЬ.
*Тут можна было і пагуляць і пасядзець на лаўках-канапках пад ценем маладых каштанаў* Я. Колас. *Прыемна ў засені старога парку* Я. Брыль.

**ЦЕПЛЫНЯ**, ЦЯПЛО, ЦЯПЛЫНЬ, ЦЕПЛАТА, ЖАР, ГАРАЧЫНЯ, СПЁКА, СПЯКОТА, ДУХАТА, ПРЫПАР; ДУХ (*разм.*); СКВАР (*абл.*).
*Сціхлі песні зімняй буры, вее цеплынёю...* Я. Колас. *Жар* нястрывалы: трудна ўстаяць за тры сажні ад агню. Я. Колас. *Ціхі вечар; знікнула спякота...* М. Багдановіч. *Іскрыцца сонейка. Прыпар.* А. Бялевіч.

**ЦЕРАЗ**, ПРАЗ, СКРОЗЬ.
*Мы пройдзем, кулямётчыкі, цераз вайны пажар.* П. Броўка. *Праз марознае аконка я гляджу на белы свет.* З. Бядуля. *Скрозь галіны лесу свяціцца шэрае, агорнутае воблакамі неба.* Я. Колас.

**ЦЕРНІЦА**, МЯЛКА; МЯЛІЦА (*абл.*).
*Недзе блізка, у пуні, чуў ён, шастала церніца. .* К. Чорны. *Хоць дзяўчына працавіта, цяжка ёй стаяць на мялцы, залятаць кастрою, пылам ..* П. Броўка.

**ЦЕРЦІ**, НАЦІРАЦЬ, МУЛЯЦЬ, ШАРАВАЦЬ.
*Малы кашляў, цёр кулакамі па твары слёзы* К. Чорны. *Басаножкі націралі ногі.* І. Шамякін. *Човен дном пясок шаруе...* Я. Колас.

**ЦЕСНЫ**, ВУЗКІ.
*Пасля шумнай універсітэцкай залы маленькі пакой здаўся незвычайна цесным.* П. Галавач. *Што ж? Няхай мой вузкі круг. няхай я ў няволі .* Я. Колас.

**ЦЕСТА**, РОШЧЫНА, РАШЧЫНА.
*І лісіца бліны пячэ, калі цеста на патэльню цячэ.* Прыказка. *Параска Карпаўна прынесла з каморы дзяжу, замяшала рошчыну.* А. Бялевіч.

**ЦЁТКА** /*дзядзькава жонка*. ДЗЯДЗІНА.
*– Не плач, галубка, змірыся, – шаптала ёй цётка, маміна сястра...* Я. Брыль. *Ну, і дзядзіна ў мяне была, а багатая, дык багатая!* Ф. Багушэвіч.

**ЦІКАЎНЫ,** ЦІКАВЫ, ДАПЫТЛІВЫ.
*Нічыпар памаўчаў. перш чым адказаць цікаўнай жанчыне* А. Асіпенка. *Петрачкоў даваў чытаць дапытліваму юнаку кніжкі і нават параіў рыхтавацца да паступлення ў семінарыю.* М. Хведаровіч.

**ЦІСК,** НАЦІСК, НАПОР.
*Ен тарганууся з усіх сіл, і на момант аслабеў ціск дужых пальцаў.* Э. Самуйлёнак. *Стройна апрацаваныя планы ламаліся пад націскам жывое сапраўднасці.* Ц. Гартны.

**ЦІСНУЦЬ,** СЦІСКАЦЬ, НАЦІСКАЦЬ, ПАЦІСКАЦЬ, ПРЫЦІСКАЦЬ, ГНЕСЦІ, ШЧАМІЦЬ, НАВАЛЬВАЦЦА, НАПІРАЦЬ *(разм.);* РЭЗАЦЬ, ПРАСАВАЦЬ *(перан.).*
*Каўнер цісн*уў *горла, замінаў гаварыць.* І. Мележ. *Перавясла рукі шчэміць...* Цётка. *Каго не забіла, задушылі гусеніцамі – танкі прасавалі акопы.* І. Навуменка.

**ЦІШЫНЯ,** ЦІША, ЦІШ, СПАКОЙ, СУПАКОЙ, СПАКОЙЛІВАСЦЬ, БЯЗГУЧНАСЦЬ: ЦІХАТА, СЦІХОТА, СЦІШАНАСЦЬ, СЦІШАК *(разм.);* ГЛУХАТА, ГЛУШ, ГЛУХМЕНЬ, ГЛУШЫНЯ, ЗНЯМЕННЕ, АНЯМЕННЕ, ЗНЯМЕЛАСЦЬ, НЕМАСЦЬ, НЕ-МАТА, НЯМОТА, СОН, ДРЫМОТА, ДРЭМА, МАЎКЛІВАСЦЬ, БЯЗМОЎЕ *(перан.).*
*Ні гуку навокал – цішыня.* П. Пестрак. *У вячыстым спакоі шумелі і сосны і хвоі...* А. Куляшоў. *Рыпіць пад нагамі снег, навокал вячэрняя сцішанасць.* І. Навуменка. *У лесе глухмень. Ціха ў бары.* Я. Колас. *І ў надышоўшым анямені гуд, здавалася, павялічыўся.* Б. Мікуліч. *Ноч паступова дрымотай ахутала шлях.* А. Куляшоў.

**ЦНАТЛІВАСЦЬ,** ЦНОТА.
*Пані Даміцэля не вытрымлівае і сыпле цэлы мех праклёнаў і розных не зусім прыемных для жаночай цнатлівасці слоў.* Я. Колас. *Праўду з няпраўдай, цноту з гарэзіяй вымешай спрытам, – будзе паэзія.* Я. Купала.

**ЦЫВІЛЬНЫ,** ГРАМАДЗЯНСКІ, ШТАЦКІ, ВОЛЬНЫ *(уст ).*
*Адзін з палонных быў у цывільнай вопратцы.* А. Кулакоўскі. *Вагон шчыльна набіты вайскоўцамі і штацкімі* П. Галавач.

**ЦЬМЯНЫ,** БЛЯКЛЫ, МАТАВЫ; ПАДСЛЕПАВАТЫ *(перан.).*
*Юрка ўвайшоў у хату і запаліў газоўку Цьмянае святло заліло сцены і згусціла цені ў кутках.* К. Чорны. *Падслепаваты ліхтар асвятляе рэйкі.* Х. Жычка.

**ЦЭНТР,** АСЯРОДАК; СЭРЦА *(перан.).*
*Аўмень – цэнтр, асяродак увагі. Вочы ўсіх падняты на яго.* Я. Колас. *Мінаем індустрыі сэрца – магутны асілак Урал.* М. Хведаровіч.

**ЦЯГНІК,** ПОЕЗД, САСТАЎ /*спецыяльнага прызначэння:* ЭШАЛОН *скоры:* ЭКСПРЭС /*без грузу:* ПАРАЖНЯК /*таварны:* ТАВАРНЯК *(разм.)* /*на электрацязе:* ЭЛЕКТРЫЧКА *(раэм.);* МАШЫНА *(уст.).*
*Паравік даў гудок Страпянуўся цягнік.* П. Глебка. *Эшалон мінаў перагон за перагонам.* П. Галавач. *Экспрэс імчыцца ў далі сіняй, аж іскры сыплюцца з-пад шпал.* Н. Тарас. *Таварняком дабралася да Масквы.* Г. Шыловіч.

**ЦЯЖАР,** ЦЯЖКАСЦЬ, ВАГА, ГРУЗ, ПАКЛАЖА /*нясуць на сабе:* НОША.
*Хоць гэты вал і тоўсты, дубовы, але ж ён трымае такі цяжар.* А. Чарнышэвіч. *Такой моцнай апоры вымагала вялікая вага масіўнага тулава.* К. Крапіва. *Ношка за плячыма, кіёк у руках...* Я. Купала.

**ЦЯЖАРНАЯ;** ТОЎСТАЯ, ЧАРАВАТАЯ *(разм.).*
*Ці ж вы не бачыце, што я цяжарная... У мяне праз два месяцы будзе дзіця...* М. Зарэцкі. *Усё роўна ты – лішні рот у хаце. Маці зноў тоўстая ходзіць.* А. Асіпенка.

**ЦЯЖКІ,** НЯЛЁГКІ, ВАЖКІ, ГРУЗНЫ, МАСІЎНЫ; ПУДОВЫ *(перан.)* ЯК ПАДНЯЦЬ.
*Сноп цяжкі, салома – ў сажань...* К. Буйло. *Грузны немец у гумовых ботах, мабыць, вельмі час-*

*та правальваўся ў балоце .* А. Кулакоўскі. *Прэ дзядок старэнькі з лесу дроў бярэмя. як падняць..* М. Васілек.

**ЦЯПЕР,** ЗАРАЗ, СЯГОННЯ, СЁННЯ *(перан )* У СУЧАСНЫ МОМАНТ, У НАШ ЧАС, ГЭТЫМ РАЗАМ, У ГЭТЫ РАЗ, НА ГЭТЫ РАЗ.

*Жыве цяпер бабка і паміраць не хоча* А. Якімовіч. *Што яшчэ ўчора здавалася марамі, сення – здабытак жыцця...* А. Гурло. *Стрэльбу яму пан купіў новую – на гэты раз двухстволку.* А. Якімовіч.

**ЦЯРПЕЦЬ,** ПАКУТАВАЦЬ, ТРЫВАЦЬ, ЗНОСІЦЬ, ПЕРАНОСІЦЬ, ЗАЗНАВАЦЬ, ВЫТРЫМЛІВАЦЬ, ТРЫМАЦЦА.

*Страшную людзі цярпелі зіму...* Я. Купала. *Адно ведаю: пакутаваў, перажываў, зазнаваў у бяссонныя ночы.* Я. Колас. *Трымайся, казача: далёка начлег.* А. Вялюгін.

**ЦЯСЛЯР,** ЦЕСЛЯ.

*Цесляры* не знаходзілі работы – ніхто нідзе не будаваўся. К. Чорны. *Цеслі дошкі з дубоў пілавалі...* М. Багдановіч.

**ЦЯЧЫ,** СЦЯКАЦЬ, ПРАЦЯКАЦЬ, ВЫЦЯКАЦЬ, ПЛЫСЦІ, СПЛЫВАЦЬ, КАЦІЦЦА, БУРЛІЦЬ, БРУІЦЦА, БРУІЦЬ, ЦУРЧАЦЬ, ЖУРЧАЦЬ *у вялікай колькасці·* ЛІЦЦА, ЛІЦЬ *імкліва:* БІЦЬ, БІЦЦА, СТРУМЕНІЦЦА, СТРУМЕНІЦЬ, СВІСТАЦЬ, ФАНТАНІРАВАЦЬ /*павольна:* САЧЫЦЦА, ПРАСОЧВАЦЦА, ЦАДЗІЦЦА, ТАЧЫЦЦА; ДЗЮРЧАЦЬ, ЦУРЫЦЦА *(разм.);* БЕГЧЫ, ЗБЯГАЦЬ *(перан.).*

*Цячы ў збанок, шыпучы грог!* Р. Бёрнс, *перакл.* Я. Семяжона. *Сплывае з дрыгвы спаконвечнай вада...* А. Зарыцкі. *Вясна. Цурчыць вада пад снегам...* К. Буйло. *Струменіць плыткая, але імклівая горная рэчка...* В. Вольскі. *Бачыў: кроў змагароў, як жывая, сачылася з ранаў.* П. Панчанка.

*Як прыемна было слухаць, што ў даёнку дзюрчыць сырадой...* Я. Брыль.

# Ч

**ЧАЙ;** ГАРБАТА *(уст.).*

*Сядзім моўчкі мы за сталом. Гаспадыня частуе нас чаем.* А. Куляшоў. *Дык дзе ж тая гарбата, калі самавар яшчэ зусім халодны?* П. Галавач.

**ЧАЛАВЕЧЫ,** ЛЮДСКІ.

*За акном варушылася нязграбная чалавечая постаць.* А. Шашкоў. *Я не хацеў бы больш нічога, каб толькі шчасцейка людскога.* М. Васілёк.

**ЧАМУСЬЦІ,** ЧАМУСЬ, ЧАГОСЬ, НЕШТА, ШТОСЬЦІ.

*У мяне чамусьці мільганула нядобрая думка пра гэтага чалавека.* А. Якімовіч. *Нешта Зося ўсё капырсціцца.* Ц. Гартны.

**ЧАПЯЛА;** ЁМКА, ЁМАЧНІК *(абл.).*

*Сегенецкая сама ўзялася рыхтаваць вячэру, бразнула вобземлю чапялу.* К. Чорны. *Ты мне пажартуй болей, дык ёмачніка заробіш!* М. Лынькоў.

**ЧАРАЎНІК,** ЧАРАДЗЕЙ, ЧАРАДЗЕЙНІК, ВЯДЗЬМАК, ВЯДЗЬМАР, ШАМАН; МАГ *(кніжн.)* ЧАРНАКНІЖНІК *(кніжн. уст.).*

*Вось такі-та быў Музыка чараўнік, чарадзейнік, што захоча, то ён з сэрцам зробіць.* Казка. *Надзея Раманаўна, не хвалюйцеся, але нашы продкі верылі, між іншым, і ў ведзьмакоў таксама.* У. Караткевіч.

**ЧАРГА** /*пасвіць жывёлу:* РАДОЎКА *(абл.).* ХВОСТ *(разм ).*

*Бушмар разам з усімі слухаў справу, чакаючы сваёй чаргі...* К. Чорны. *Двое сыноў і маці пасвілі ў полі вясковы статак – адбывалі радоўку.* М. Ткачоў. *На другі дзень раніцою ля ўсіх хлебных крам сталі вялікія хвасты.* П. Галавач.

**ЧАРКА,** КІЛІШАК, СТОПКА.

*З чаркай, з Марусяй вясёл чалавек.* Я. Купала. *Хіба вып'ем па кілішку – лягчэй будзе гараваць.* Я. Колас. *Наліта па стопцы, накроен адсвежаны хлеб.* М. Лужанін.

**ЧАРНІЛА**; АТРАМАНТ *(уст.)*
*Адчыніўшы шуфляду, дастаў ручку з пяром і бутэлечку з чарнілам* К. Крапіва. *Атрамант і папера ў цябе ёсць?* К. Чорны.

**ЧАС,** ЧАСІНА, ПАРА /*з абмежаваннем*· ТЭРМІН /*прамежак часу, які паўтараецца:* ПЕРЫЯД /*найбольш зручны для чаго-небудзь:* СЕЗОН /*працяглы прамежак:* ЭПОХА, ЭРА; ДЗЕНЬ *(кніжн.).*
*Гультаю ды няўмеку ўсё часу не хапае.* Прыказка. *Вечар быў надзіва цёплы ў такую позную пару.* А. Чарнышэвіч. *Нам самы прыпар падыходзіць, сезон, як кажуць.* Ц. Гартны. *Нас абавязвае эпоха суняць шаленцаў лютых...* П. Панчанка.

**ЧАСАМ,** ЧАСАМІ, ПАДЧАС, ПАРОЙ, МОМАНТАМІ, НЯЧАСТА, РЭДКА, ЗРЭДКУ, ВЫПАДКАМ, СЯДЫ-ТАДЫ, КАЛІ-НІКАЛІ; ЗРЭДЧАС, ЗРЭДЗЬ *(абл.)* _ ЧАС АД ЧАСУ, МАЛА КАЛІ, ІНШЫ РАЗ, ІНШЫМ РАЗАМ, ДРУГІ РАЗ, ІНШЫ ДЗЕНЬ, ГАДЫ Ў РАДЫ.
*Праўда, часам нядзеляй чарку выпіць не шкодзіць.* Я. Купала. *І нейкае хваляванне находзіла на яго момантамі.* К. Чорны. *Сяды-тады даносіліся адтуль глухія выбухі снарадаў.* А. Якімовіч. *Зрэдчас праз шчыліну ўскочыць сонечны зайчык шустры...* Р. Барадулін. *Другі раз карканне вароны цэніцца вышэй за песню салаўя.* Б. Сачанка.

**ЧАСОВА,** СЕЗОННА, ПАКУЛЬ НА ЧАС, ДА ПАРЫ, ДА ПАРЫ ДА ЧАСУ.
*Працую я тут часова, ну – два месяцы, тры – і толькі.* Х. Шынклер. *Танкі пакуль маўкліва сталі ў ярах, запраўляліся гаручым.* І. Мележ. *І гаршчок да пары ваду носіць.* Ц. Гартны.

**ЧАСТАВАЦЬ,** ПРЫМАЦЬ; ФУНДАВАЦЬ, ТРАКТАВАЦЬ *(разм.)* СТАВІЦЬ ЧАРКУ.
*Хлопцы прынеслі гарэлкі, пачалі частаваць дзяўчат.* К. Чорны. *Што маю, тым прымаю.* Прыказка. *У Рыся заўсёды былі папяросы і грошы, ён фундаваў і ліманад, і марожанае* Я. Брыль.

**ЧАСТКА,** ЧАСЦЬ, ДОЛЯ, ДОЗА /*састаўная:* КАМПАНЕНТ, ЭЛЕМЕНТ, СЕКЦЫЯ /*звычайна яды.* ПОРЦЫЯ /*укладзеных у якое-небудзь таварыства сродкаў:* ПАЙ; ЧАСЦІНА *(разм )* /*частка аплаты:* РАТА *(уст.):* КАНЕЦ, ЗВЯНО, *(перан.).*
*Атрад разбіўся на тры часткі і разышоўся ахоўваць вёскі.* К. Чорны. *Большая доза будзе для мяне атрутай.* А. Чарнышэвіч. *Пейзаж – істотны кампазіцыйны элемент твораў.* Р. Шкраба. *Вулачка была і па той бок вуліцы, пад раку: дзяліла вёску на два канцы...* І. Пташнікаў.

**ЧАСЦЬ,** ПАДРАЗДЗЯЛЕННЕ /*невялікая:* КАМАНДА БАЯВАЯ АДЗІНКА.
*Урэшце праціўнік вымусіў адысці нашу часць на зыходныя пазіцыі.* К. Крапіва. *Мы адыходзілі ў тыл і чакалі, пакуль прамаршыруюць паўз нас дагэтуль тылавыя каманды.* К. Чорны.

**ЧОРТ,** Д'ЯБАЛ, НЯЧЫСТЫ, САТАНА, ШАТАН, ШАЙТАН, ДЭМАН, ЛЮЦЫПАР; НЯЧЫСЦІК *(разм.);* НЯЧЫСТАЯ СІЛА, ЗЛАЯ СІЛА.
*Тым часам у пекле дык чэрці і хаму, і пану прызначылі кут.* Ф. Багушэвіч. *Сатана* змусціць і ясна сокала. Прыказка. *Нячысцік з ведзьмамі гуляе ў пустцы гэтай.* Я. Купала.

**ЧУЖЫНЕЦ,** ЧУЖАЗЕМЕЦ, ІНШАЗЕМЕЦ, ЧУЖАНІЦА, ЧУЖАК, ПРЫШЭЛЕЦ, ПРЫШЛЕЦ, ПРЫБЛУДА, ПРЫБЛУДНІК.
*Чужынцам помсціў дзед Арцём за любы кут, за родны дом.* П. Броўка. *І кожны прышлец стараўся скарыць цябе.* Я. Скрыган. *Працай жывяцца нашай прыблуднікі, а мы толькі ўздыхаем і плачам...* Я. Купала.

**ЧУТКА**; ЧУЙНА *(абл.).*
*На ніве чутка дрэмле колас, і ліст на дрэве не дрыжыць.* Я Ко-

лас. *Яшчэ маці разбудзіць, бо чуйна спіць старэнькая.* А. Чарнышэвіч.

**ЧУХАЦЬ,** ДРАПАЦЬ.

*Свіння рабая вельмі любіла, калі яе чухаеш, – ажно вочы заплюшчыць.* Я. Брыль. *Каму свярбіць, той драпае* Прыказка.

**ЧУЦЦА,** ГУЧАЦЬ, РАЗЛЯГАЦЦА, РАЗДАВАЦЦА /*з рэхам:* АДДАВАЦЦА, ЗЫЧЭЦЬ *(разм.);* ІСЦІ, БЕГЧЫ, НЕСЦІСЯ, РАЗНОСІЦЦА, ДАНОСІЦЦА, ДАХОДЗІЦЬ, ДАЛЯТАЦЬ *(перан.).*

*Яе звонкі голас і смех чуліся заўсёды, – ці то ў калідоры, ці то на дварэ.* К. Чорны. *Разлягаецца па вёсцы баявы лёскат.* К. Крапіва. *Крыкі несліся з хаты непадалёк.* І. Мележ. *Адтуль далятаў меладычны звон жалеза пад кавальскім молатам.* Я. Маўр.

**ЧЫГУНКА,** ЧЫГУНАЧНАЯ МАГІСТРАЛЬ, СТАЛЁВАЯ МАГІСТРАЛЬ; ЖАЛЕЗКА *(разм,).*

*Чыгунка выструніла рэйкі, як лейцы пругкія свае* М. Калачынскі. *Трэба было зацямна перайсці яшчэ жалезку, а там патрулі.* А. Карпюк.

**ЧЫРВАНЬ,** БАГРА, ІРДЗЕНЬ; ЧЫРВАНАТА *(разм.);* АГОНЬ, КАРМІН *(перан.).*

*Зелянюк неўзаметку пацісну яе халодную руку, і яна расцвіла сарамліваю чырванню.* М. Зарэцкі. *І са шчок ірдзень спадае, вяне ўсмешка на губах.* П. Глебка. *Дзенідзе бакі і разяўленая пашча былі крануты густым кармінам.* У. Караткевіч.

**ЧЫСТЫ;** КРЫШТАЛЬНЫ, БЕЛЫ *(перан.).*

*А сынок мой – чысты, мыты, маладзічок ясны.* Я. Колас. *Мне ногі змываюць крыштальныя росы.* Я. Колас. *Хоць рукі чорныя, але работа белая.* Прыказка.

## Ш

**ШАБЛЯ** /*менш выгнутая:* ШАШКА /*простая і доўгая, з шырокім лязом.* ПАЛАШ *(уст ).*

*Афіцэр на рыжым жарабку махаў шабляй, склікаючы сваё войска.* Э. Самуйлёнак. *Казак без шашкі не казак.* М. Лобан.

**ШАЛУПІННЕ,** ШАЛУПІНЫ, ЛУШПАЙКІ, ЛУПІНЫ.

*Яны лузгалі семкі і выплёўвалі шалупінне проста на падлогу.* П. Кавалёў. *Воддаль ад гамакоў лупіны ад яек, косткі ад курэй, газеты, акуркі ад папярос...* З. Бядуля.

**ШАМАЦЕЦЬ,** ШУРШЭЦЬ, ШАСЦЕЦЬ, ШАСТАЦЬ, ШАЛЯСЦЕЦЬ.

*У класе стала ціха, толькі шамацела папера ў падручніках.* А. Чарнышэвіч. *Не шасцяць каласы...* Я. Купала.

**ШАПТАЦЦА,** ШУШУКАЦЦА.

*Каля сцен на лаўках сядзелі парамі дзеўкі і хлопцы, пазіралі на тых, што скакалі, і пра нешта шапталіся.* П. Галавач. *Пазіралі дзеткі з-пад цёмнага тапчана на вясёлы аганёк у печы і шушукаліся.* З. Бядуля.

**ШАРПАК;** ШАРОН *(абл.).*

*Сані шарпацелі па ўезджаным шарпаку...* М. Лынькоў. *Цяпер ужо не адзін Алесь шнураваў па снезе, ломячы шчыльную корку шарону.* Х. Шынклер.

**ШАЎКОВЫ;** ЯДВАБНЫ.

*Яна ў шаўковым белым плацці, на галаве вянок, што сплялі на лузе.* І. Мележ. *Вашы скарбы не ў ядвабнай магнацкай саеце...* Я. Купала.

**ШАФА** /*незгаральная:* СЕЙФ.

*Маці з шафы дастае настольнік самы лепшы, сэрцу дарагі.* П. Панчанка. *Якаў Раманавіч адамкнуў сейф і дастаў з яго тоўстую папку.* М. Паслядовіч.

**ШАФЁР,** ВАДЗІЦЕЛЬ.

*Вось тут машыну супыні, шафёр.* А. Астрэйка. *Вадзіцель ускочыў у кабіну і ўключыў матор.* М. Ткачоў.

**ШВО,** СТРОЧКА.

*Лата на лаце, шва не знаці.* Прымаўка. *Марыя шыла-вяла дробненькую строчку на рубчыку, Платон глядзеў на яе прыгожыя рукі.* П. Пестрак.

**ШКАДЛІВЫ,** УНАДЛІВЫ, ЗБРОДЛІВЫ *(разм.).*

*Як кот шкадлівы, як заяц баязлівы.* Прымаўка. *Збродлівай кошцы хвост уцінаюць.* Прыказка. *Унадлівую жывелу б'юць.* Прыказка.

**ШЛЕМ;** ШАЛОМ *(уст.).*

*Шкляное вечка кабінкі адсоўваецца, адтуль выглядае галава ў шлеме.* Х. Жычка. *На гэтыя берагі выходзілі калісь легіёны паўдзённых воінаў у медных шаломах.* У. Караткевіч.

**ШМАТГАЛОСЫ;** СТОГАЛОСЫ, СТОЗЫКІ, СТОЗЫЧНЫ, СТОЯЗЫКІ *(разм.).*

*У натоўпа шматгалосы гул.* Г. Бураўкін. *Стозычныя, высокія барыны загулі.* З. Бядуля.

**ШПАЛЕРЫ,** АБОІ.

*Пад нізкай столлю шпалеры віселі закуранымі шматамі.* З. Бядуля. *За сценкай з пашматанымі абоямі пачуўся старэчы кашаль.* Я. Брыль.

**ШПУЛЯ,** ШПУЛЬКА, ЦЭЎКА.

*Худыя, парэпаныя пальцы наўздагад вядуць тонкую кужэльную нітку, пускаючы яе на шпаркую шпулю калаўротка.* Я. Брыль. *Кужаль Маланка снавала, цэўкі сукала і ткала.* Я. Купала.

**ШРАМ,** РАССЕЧЫНА, РУБЕЦ, ПІСАГА, ПІСЯГ, ДРАПІНА.

*Пазнаюць сябры сяброў па шрамах – агнявых аўтографах вайны.* П. Панчанка. *Ён прыгнуўся, і я ўбачыў на яго шыі чырвоны рубец ад нагайкі.* К. Чорны. *На шчасце Мацея – сечаны пісяг.* С. Дзяргай.

**ШТАНЫ** /*шырокія, засоўваюцца ў боты:* ШАРАВАРЫ /*вузкія да кален, шырокія ўверсе:* ГАЛІФЭ, ПОРТКІ *(разм.)* /*вузкія:* ДУДАЧКІ *(разм.);* НАГАВІЦЫ *(абл.).*

*З салдацкага мяшка дастае штаны і пачынае старанна прышываць адарваны гузік.* М. Лынькоў. *Справіў боты, а да іх галіфэ.* Я. Скрыган. *Шырокія шэрыя порткі, з латкамі на каленях, віселі на тонкіх нагах, як на калках.* А. Чарнышэвіч.

**ШТОДЗЁННА,** ШТОДЗЕНЬ, ШТОДНЯ КОЖНЫ ДЗЕНЬ, КОЖНАГА ДНЯ, ДЗЕНЬ У ДЗЕНЬ, З ДНЯ НА ДЗЕНЬ, ДЗЕНЬ ПРЫ ДНІ, ДЗЕНЬ АДА ДНЯ.

*Пасылаю дамоў тэлеграмы штодзённа: як у спёку жыты каласяцца над Нёманам?* М. Танк. *Кожны дзень, пасля работы, наведваў ён таварыства...* Ц. Гартны.

**ШТРЫФЕЛЬ,** КЛЯПА, ЛАЦКАН.

*Схапіў Сашу за штрыфель старой даматканай світкі, трасянуў.* І. Шамякін. *На лацкане стракатага пінжака сіні эмалевы ромбік.* В. Быкаў.

**ШТЫК,** ШТЫХ; БАГНЕТ *(абл.).*

*І паўдзённае сонца іграе на гвардзейскім салдацкім штыку.* А. Астрэйка.

**ШУГАЦЬ,** ШЫБАЦЬ.

*Ля палатак шугае вясёлы касцёр...* К. Буйло. *У неба шыбае агонь.* Я. Пушча

**ШУКАННЕ,** ПОШУК, ПОШУКІ /*органамі ўлады:* РОСШУК, ВОБЫСК.

*Якраз з куфра і пачалося шуканне ў хаце.* З. Бядуля. *Пачаліся вобыскі на кватэрах і арышты.* М. Хведаровіч.

**ШУМ,** ПОШУМ, ШОЛАМ; ГАМАНА *(разм.);* ГАЛАС *(абл.);* ГОМАН *(перан.).*

*Толькі вецер даносіць шум недалёкага хвойніку.* І. Шамякін. *За акном не змаўкаў роўны, прыглушаны гоман горада.* П. Галавач.

**ШУМАВІННЕ,** ПЕНА; ШУМ, ШУМА *(разм.).*

*То надзея нікне, кане, як на хвалях шумавінне..* С. Дзяргай. *Сама стала ў дзвярах і адпіла [малака]: цёплага, няцэджанага, з шумаю.* М. Лужанін.

**ШЧАБЯТАЦЬ,** СВЕРГАТАЦЬ, ЦІЎКАЦЬ, ЦІЛІКАЦЬ, ЦІЛІЎКАЦЬ, ЦВЫРКАЦЬ, СПЯВАЦЬ; ПЯЯЦЬ *(разм.)*

*Шчабяталі птушкі, была вясна.* Я. Скрыган. *Птушачкі цілікаюць!* І. Мележ. *Над полем, у недасяжным блакіце нябёсаў жаўранкі спявалі свае чароўныя вясновыя песні.* А. Чарнышэвіч.

**ШЧАСЛІВЕЦ,** УДАЧНІК.

*Яны лічылі сябе шчасліўцамі, што пазбавіліся фашысцкага палону.* І. Гурскі. *Сярод іх былі і ўдачнікі, якія сталі багатымі людзьмі.* М. Лынькоў.

**ШЧАСЛІВЫ,** ШЧАСНЫ, АШЧАСЛІЎЛЕНЫ, ПАМЫСНЫ, СВЕТЛЫ, БЯЗВОБЛАЧНЫ *(перан.).*

*Зычылі маладым доўгага і шчаснага жыцця.* Ц. Гартны. *Ну, вып'ем за памыснае заўтра...* П. Пестрак.

**ШЧАСЦЕ,** ДОЛЯ, ДАБРО, ДОБРАЕ, ПАМЫСНАСЦЬ, ФАРТУНА.

*Хіба ж ёсць у свеце шчасце лепшае, як пад небам бацькаўшчыны жыць?* В. Вітка. *О, дзе ты, добрая фартуна?..* А. Бачыла.

**ШЧЫЛІНА,** ПАЗ, РЭЗ, ПРОРАЗЬ, РАСКОЛІНА, ТРЭШЧЫНА; ШПАРА *(абл.);* ЗАЗОР *(спец.).*

*Я падпоўз да варот і паглядзеў праз шчыліну.* К. Крапіва. *У пазах, замест моху, пляцёнкі стружак.* Я. Брыль. *Піла заставалася ў цеснай проразі..* А. Кулакоўскі. *На атынкованых сценах доўгія трэшчыны.* Я. Брыль.

**ШЧЫЛЬНА,** УШЧЫЛЬНУЮ, ШЧЫТНА, УСУТЫЧ, УПРЫТЫК, УПРЫЦІРКУ, НАГЛУХА, ГЕРМЕТЫЧНА; ШЧЫГУЛЬНА *(абл.).*

*Зачыняйце шчыльна хату, каб не дзьмулі халады...* Я. Колас. *Глеба ўзрыхлена ўсюды аднолькава, усутыч да тэлеграфных слупоў...* М. Лужанін. *Ён скіраваў машыну ўбок і ўпрыцірку праехаў каля падводы.* І. Гурскі.

**ШЧЫРА,** ДУШЭЎНА, ЗАДУШЭЎНА, САРДЭЧНА, ЧЫСТАСАРДЭЧНА, АДКРЫТА, НАЧЫСТАТУ, НАЧЫСТУЮ, НАПРАМКІ ПА ШЧЫРАСЦІ, АД ДУШЫ, З ДУШОЙ, УСЁЙ ДУШОЙ, ЯК НА ДУХУ, АД СЭРЦА, УСІМ СЭРЦАМ, У ВОЧЫ, БЕЗ УТОЙВАННЯ, ПАЛАЖЫЎШЫ РУКУ НА СЭРЦА.

*Мы шчыра размаўлялі пра жыццё, пра справы ў іх Зарэччы, як самыя найлепшыя сябры.* А. Асіпенка. *А ўвогуле, лепш было б набрацца смеласці і расказаць пра ўсё ёй начыстую.* Р. Няхай. *Мы вас вітаем, слаўны юбіляр, і новых поспехаў ад сэрца зычым.* А. Зарыцкі.

**ШЫНА,** ПАКРЫШКА.

*Падышоў, памераў па сваім росце вышыню кола, на шыне якога выступалі моцныя касыя рубцы.* І. Мележ. *Акінуў вокам груз і дзелавіта кашкануў ботам правую заднюю пакрышку.* Я. Брыль.

**ШЫНКАР,** КАРЧМАР *(уст.).*

*А гарэлка рэчкай льецца, бегае шынкар...* Я. Купала. *Карчмар паспяваў толькі запісваць, хто колькі бярэ напавер.* Я. Брыль.

**ШЫЦЦЁ,** ШЫТВО.

*Мама, схіліўшыся над шыццём, не заўважыла, як Косцік злез з канапы і далучыўся да гульні.* П. Пестрак. *Найчасцей шпулькі траплялі да мяне пасля нядзелі, калі маці бралася за шытво...* М. Лужанін.

**ШЭРСЦЬ,** ПОЎСЦЬ, ПІЛЬСЦЬ; *цвёрдая:* ШЧАЦІННЕ, ШЧАНІНА; *авечая:* ВОЎНА / *цвёрдая:* ШЧЭЦЬ *(разм.)* / *авечая:* РУНО *(кніжн. паэт.).*

*Масці ён [звер] быў шэрай, шэрсць меў кудлатую і доўгую.* Я. Колас. *Мірон учапіўся за поўсць нейкага звера.* Я. Маўр. *На лаве стаяць тры праснiцы. Дзве з кудзеляю, а адна з воўнаю.* К. Чорны.

## Э

**ЭГАІСТ,** СЯБЕЛЮБ, САМАЛЮБ, САМАЛЮБЕЦ, ШКУРНІК *(разм.).*

*Так маці стала нявольніцай свайго дзіцяці, так гэтае дзіця расло тыповым эгаістам.* А. Карпюк. *Гэта я шкурнік? Ты думаеш, сваю шкуру ратую?* В. Быкаў.

**ЭКСПЛУАТАТАР;** ДАРМАЕД, АБДЗІРАЛА, ЗДЗІРЦА, ШКУРАДЗЁР, ЖЫВАДЗЁР, ЖЫВАЕД, ЖЫВАГЛОТ, КРЫВАПІВЕЦ, КРЫВАПІЎЦА, КРЫВАСМОК *(разм.);* ПАВУК, ПАРАЗІТ *(перан.).*

*І павязлі труну суседзі, каб пасароміць шкурадзёра.* М. Машара. *Павук ты! Ты думаеш, Амелю надоўга ўгібаў? Трасцу ён табе рабіць будзе!* М. Лобан.

**ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ,** ТОК; ЭЛЕКТРЫКА *(разм.).*

*Электрычнасць ззяе – рай! Хоць іголачкі збірай.* М. Засім. *Яе так трасянула токам, што ледзь не самлела.* Р. Сабаленка.

**ЭПІЛЕПСІЯ;** ПАДУЧКА *(разм.).*

*Знішчыўшы дакументы на Дымара, ён сімуляваў прыступ эпілепсіі.* І. Шамякін. *Падучкаю курчыўся вецер...* П. Глебка.

## Ю

**ЮБІЛЕЙ,** ГАДАВІНА /*чалавека:* ІМЯНІНЫ; УГОДКІ *(уст.)* ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ.

*Некаторыя са студэнтаў былі аднагодкамі універсітэта, і іх юбілей быў падвойным.* У. Шахавец. *У мяне сення дзень нараджэння.* Я. Брыль.

## Я

**ЯДА,** ЕЖА, ХАРЧ, ХАРЧАВАННЕ, СТРАВА, СПАЖЫВА, СПАЖЫТАК, ПРАДУКТЫ, ПРАВ'ЗІЯ /*жывёле:* КОРМ, ФУРАЖ, АБРОК /*вытанчаная:* ДАЛІКАТЭС, ЛАСУНАК, ПРЫСМАКІ /*спяшаючыся або перад асноўнаю ядою:* ЗАКУСКА, ЗАКУСЬ /*не посная:* СКОРАМ /*недаедзеная:* АБ'ЕДКІ, НЕДАЕДКІ, АГРЫЗКІ /*садавіна ці салодкае ў канцы абеда:* ДЭСЕРТ; НАЕДАК, ПРАХАРЧУНАК, СПОЖЫЦЬ, ЖЫЎНАСЦЬ *(разм.)* /*посная:* НІШЧЫМНІЦА *(разм.);* /*недаедзеная:* НЕДАЕЖА *(разм.);* ПАТРАВА *(абл.)* /*жывёле:* ПОШАР *(абл.);* ХЛЕБ, ПАЖЫВА, ПАЖЫТАК, ПАДМАЦАВАННЕ, ПАДМАЦУНАК *(перан.);* ПРАВІЯНТ *(уст.).*

*Села уся за стол сямейка, пара валіць ад яды...* А. Гурло. *Аня развязала клуначак з ежай, дастала хлеб, яйкі, соль...* І. Шамякін. *На сталах на гэтых страва дражніць нос прынадным пахам.* К. Крапіва. *Трохі голад трывожыць. Мала правізіі.* З. Бядуля. *Галодны прысмакаў не пытае.* Прыказка. *Кармілі аб'едкамі і нічога не плацілі.* Р. Няхай. *Сям'ю трымаў на нішчымніцы, хоць выкормліваў па два-тры вепрукі на год.* А. Чарнышэвіч. *А можа, таварышы, і сапраўды гэтую курыцу на правіянт пусціць?* М. Лынькоў.

**ЯДЛОВЕЦ;** ЯЛОВЕЦ, ЯЛАВЕЦ, ПАД'ЯЛОВЕЦ *(абл.).*

*Зарасла ядлоўцам лесасека, ельнічкам густым.* З. Бядуля. *Ой, калючы ялавец!* Ф. Багушэвіч.

**ЯЕЧНЯ,** ЯЕШНЯ.

*Старая зараз жа пачала раскладаць агонь на прыпечку, каб спячы яечню.* З. Бядуля. *А ў тых хатах святочных – дзе бліны, дзе скварачкі, а дзе яешня на снеданне...* М. Гарэцкі.

**ЯЙЦО,** ЯЙКА /*пад квахтухаю:* ПОКЛАД /*няплоднае:* БАЎТУН /*маленькае курынае:* ЗНОСАК.

*Спачатку даваў толькі малако, а потым аднойчы разбіў яму на сподачак яйцо.* Я. Брыль. *З-пад Васілісінай рабенькай нават поклад узяў.* І. Гурскі. *Трэба ж, каб заморышаў ці баўтуноў не атрымалася.* А. Рылько.

**ЯКРАЗ,** МЕНАВІТА, АКУРАТ *(разм.)* У САМЫ РАЗ.

*Якраз у гэтую хвіліну яго жонка, Барбара, усунулася з сенцаў у хату.* З. Бядуля. *З таго менавіта часу расло ў мяне вялікае замілаванне да прыроды.* У. Дубоўка. *Мы аб гэтым акурат стараемся.* І. Мележ.

**ЯМА,** ДОЛ, УПАДЗІНА, ЗАПАДЗІНА, ПАГЛЫБЛЕННЕ /*ад выбуху бомбы, снарада:* ВАРОНКА /*пад будаўніцтва:* КАТЛАВАН, КАР'ЕР /*дзе капалі гліну:* ГЛІНІШЧА.

*Адзін з канвойных падаў мне ў рукі рыдлёўку і загадаў капаць яму.* Б. Сачанка. *А навокал варонка на варонцы, колькі тых бомб адных налажылі!* М. Лынькоў. *Міця адбегся і лёг у кар'еры, дзе местачкоўцы капалі гліну.* І. Навуменка.

**ЯСЛІ,** ЖОЛАБ, КАРМУШКА.

*Не ходзяць яслі да валоў.* Прыказка. *Глянуў у жолаб, загарнуў там рукою конскія за ноч недаедкі...* К. Чорны.

**ЯСНЫ,** СВЕТЛЫ, ЯРКІ, ЗЫРКІ, ВІДНЫ, БЯСХМАРНЫ, БЯЗВОБЛАЧНЫ; ПРАМЯНІСТЫ, ПРАМЕННЫ, АСЛЯПЛЯЛЬНЫ, СЛЕПКІ, СЛЯПУЧЫ, СОНЕЧНЫ, МЕСЯЧНЫ *(перан.).*

*Ясным летнім ранкам Іван сядзеў на беразе ракі і вудзіў акунёў.* А. Рыбак. *Быў дзянёк вясёлы, светлы, грэла сонца шчыра, ветла...* З. Бядуля. *Як маланкі, пад яркім сонцам паблісквалі косы.* К. Крапіва. *За акном разгараецца дзень прамяністы.* П. Панчанка. *Дзень быў сонечны, трохі з ветрам.* З. Бядуля.

# АМОНІМЫ

# АМОНІМЫ

У кожнай мове ёсць словы, якія гучаць і пішуцца аднолькава, але маюць розны сэнс. Нямала такіх слоў-блізнят і ў беларускай мове. Называюцца яны амонімамі. Гэтае слова грэчаскага паходжання і перакладаецца як «аднайменнасць».

Амонімы трапляюць у мову рознымі шляхамі. Найчасцей гэта адбываецца ў выніку распаду мнагазначнага слова. Такія амонімы называюцца семантычнымі. Яны бываюць назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі *(кулак, лаўка, ліст, мех, рваць, уцякаць, негатыўны і інш.)*.

Яшчэ адна група амонімаў — этымалагічная. Яна ўзнікла ў выніку выпадковага супадзення па гучанні двух ці некалькіх слоў *(рог, роў, каса, слой, галка, салянка, ячмень і інш.)*. Утварэнне такіх амонімаў часта адбываецца ў выніку «сутыкнення» беларускага слова з іншамоўным, запазычаным *(байка, вол, клуб, ложа, рубка, такса і інш.)*.

Значную групу складаюць амонімы, якія належаць да розных часцін мовы (лексіка-граматычныя амонімы). У такіх выпадках могуць спалучацца, складаючы аманімічную пару, назоўнікі і прыслоўі, назоўнікі і дзеясловы, назоўнікі і прыметнікі, прыназоўнікі і злучнікі *(ажур, буры, варта, вусны, звонкі, край, люты, хіба, шкода і г. д.)*.

І, нарэшце, ёсць яшчэ так званыя словаўтваральныя амонімы, якія ўтварыліся ад якога-небудзь аднаго ці зусім розных слоў пры дапамозе прыстаўкі або суфікса, напрыклад: *бачок* (ад *бак* і *бок*), *кармавы* (ад *карма* і *корм*), *кулявы* (ад *куля* і *куль*) і да т. п.

Амонімы не існуюць паасобку — іх, як і ўсякіх блізнят, сама менш павінна быць два (але бывае тры і болей). У апошнім выпадку ўсе дадатковыя значэнні, як правіла, маюць размоўнае ці дыялектнае паходжанне.

# А

**АБОРКА**

1. Невялікая вяроўка, шнур. *Цягнуць за аборку.*

2. Від друкарскага набору. *Аборка набіраецца ўкарочанымі радкамі вакол малюнка.*

**АГЕНТ**

1. Прадстаўнік пэўнай арганізацыі, установы. *Страхавы агент.*

2. Прычына, што выклікае тыя або іншыя з'явы (у прыродзе, арганізме чалавека). *Боль – страўнікавы агент.*

**АДКОС**

1. Нахільная паверхня. *Па адкосах расце падарожнік.*

2. Вяртанне доўгу шляхам адработкі касьбой. *Адкос за пазыку.*

**АКЦЫЯ**

1. Дзеянне, скіраванае на дасягненне якой-небудзь мэты. *Міралюбівая акцыя.*

2. Каштоўная папера. *Скупляць акцыі.*

**АПАЛ**

1. Апальванне. *Апал керамічных вырабаў.*

2. Празрысты мінерал рознага колеру. *Блакітнаваты апал.*

**АПАЛОНІК**

1. Хвастатая лічынка жабы. *Апалонікаў многа вясной у балоце.*

2. Разліўная лыжка. *Драўляны апалонік.*

**АПОКА**

1. Прыстасаванне для вырабу ліцейнай формы. *Апока без дна і крышкі.*

2. Асадкавая горная парода. *Апока багатая на крэменязём.*

**АРФА**

1. Музычны інструмент. *Іграць на арфе.*

2. Веялка. *Арфай ачышчаюць зерне ад мякіны і смецця.*

**АСАДА**

1. Акружэнне войскамі ўмацаванай крэпасці, горада. *Асада крэпасці.*

2. Рамка, дзяржанне ў некаторых прыладах; аснова акна, воза, сельскагаспадарчых прылад. *Асада нажа.*

3. Асадак. *Вада брудная, з асадай.*

**АСВЯЦІЦЬ**

1. Зрабіць светлым, бліснуць. *Маланка асвяціла лес.*

2. Выканаць царкоўны абрад надання святасці. *Асвяціць ваду.*

**АЎДОТКА**

1. Начная птушка. *Аўдотка сустракаецца на поўдні Беларусі.*

2. Дробная азёрная рыбка. *Аўдотка добра ловіцца на матыля.*

**АЎСЯНКА**

1. Аўсяная каша. *Аўсянка з маслам.*

2. Пеўчая птушка. *Аўсянка падобная да вераб'я.*

3. Рыбка. *Невялічкая аўсянка.*

# Б

**БАБА**

1. Матчына або бацькава маці; старая жанчына. *Старая баба.*

2. Прылада для забівання паляў у зямлю. *Бабамі забівалі сваі.*

**БАБІНА**

1. Адно зерне бобу. *Сухая бабіна.*

2. Шпуля з ніткамі; касета. *Бабіна пражы, ніткак.*

**БАБКА**

1. Бабуля, старая жанчына. *У маладосці бабка была актрысай.*
2. Надкапытны сустаў у жывёл. *У каня былі моцныя ногі і такія ж моцныя бабкі.*
3. Страва з дранай бульбы. *Смачная бабка.*
4. Кавадлачка (для кляпання касы). *На бабцы кляпаюць касу.*
5. Укладка з некалькіх снапоў (для прасушвання).
6. Грыб. *У бабкі бурая шапка і высокая ножка.*
7. Трыпутнік. *Бабка расце абапал дарог, на лугах.*
8. Страказа; мятлік. *Сіняя бабка сядзіць на гарлачыку.*
9. Прылада, з дапамогай якой гнуць дугі ці палазы. *На бабцы гнуць палазы для саней.*
10. Чыгунная балванка для забівання паляў. *Гучна грымелі бабкі, ударaючыся аб сваі.*

**БАГАЧ**

1. Вельмі багаты чалавек. *Сусед наш проста багач.*
2. Агонь, вогнішча. *Разлажыў багач пагрэцца.*

**БАДЗЯГА**

1. Вадзяная расліна. *Бадзяга выкарыстоўваецца для лячэння рэўматызму.*
2. Валацуга. *Ходзіць з хаты ў хату, як той бадзяга.*
3. Карыта. *Вялікая бадзяга.*

**БАЙ**

1. Багач (у Сярэдняй Азіі). *У бая было многа зямлі.*
2. Міфічная істота, баечнік. *Бай бае дзецям байкі і наганяе на іх сон.*

**БАЙКА**

1. Небыліца, казка; літаратурны твор. *Расказваць байкі.*
2. Від тканіны з прыгладжаным ворсам. *Коўдра з байкі.*

**БАК**

1. Закрытая пасудзіна. *Наліць вады ў бак.*
2. Насавая частка верхняй палубы. *Бак карабля.*

**БАКАРА**

1. Найлепшы гатунак крыштальных вырабаў. *Самы каштоўны крыштальны выраб — бакара.*
2. Разнавіднасць гульні ў карты. *Гуляць у бакару.*

**БАЛАНС**

1.Ураўнаважанне. *Гадавы баланс.*
2. Бярвенні, якія ідуць на выраб цэлюлозы. *Якасны баланс.*

**БАЛОНКА**

1. Шкло ў раме, шыба. *Моцны вецер разбіў балонку.*
2. Парода сабак. *Гуляць з балонкай.*

**БАЛЬНЫ**

1. Які суадносіцца з балем. *Бальныя танцы.*
2. Ацэньваемы ці вымяраемы ў балах. *Бальная сістэма адзнак.*

**БАНКА**

1. Разнавіднасць пасудзіны. *Шкляная банка.*
2. Лаўка на судне. *Банка для весляроў і пасажыраў.*
3. Падводная водмель. *Банка — узвышэнне на марскім дне.*

**БАНКЕТ**

1. Урачысты абед ці вячэра. *Афіцыйны банкет.*
2. Засцерагальны насып з грунту або камення. *Банкет для засцярогі збудаванняў.*

**БАНЬКА**

1. Кальцо ў касе. *Банькай каса прымацоўваецца да кассся.*
2. Медыцынская пасудзіна, слоік. *Паставіць банькі.*
3. Невялікая баня. *Парыцца ў баньцы.*
4. Лупцоўка. *За свавольства чакае хлопцаў добрая банька.*
5. Гарлачык жоўты. *Зацвілі банькі.*
6. Бэлька. *Банькі ў доме па столі ідуць ад аднаго канца дома да другога.*

**БАР**

1. Разнавіднасць буфета, рэстарана. *Піўны* бар.
2. Адзінка вымярэння ціску. *Атмасферны ціск вымяраецца ў барах.*

3. Падводная пясчаная мель. *Бар бывае звычайна перад вусцем ракі.*
4. Асноўная частка ўрубавай машыны і горнага камбайна. *Бар ўгрызаецца ў горную пароду.*

**БАРАН**
1. Жывёліна, самец авечкі. *Упёрся, як баран.*
2. Птушка бакас. *Баран з доўгай дзюбай.*
3. Рубанак з дзвюма ручкамі. *Дошкі стругаюць бараном.*
4. Грыб ваўнянка. *Бараноў цэлае вядро набралі. .*
5. Вялікая лодка. *Катацца на баране.*

**БАРКА**
1. Драўлянае рачное судна. *Баркі стаялі за мастом.*
2. Ворчык. *Барка мацавалася да плуга .*

**БАРЭЦ**
1. Спартсмен па вольнай ці класічнай барацьбе. *Моцны барэц.*
2. Расліна (баршчэўнік сібірскі). *Барэц цвіце.*

**БАЦ**
1. Рэзкі адрывісты гук. *«Бац», — раптам пачулася дзесьці побач.*
2. Пацук. *Вялікі бац.*

**БАЧОК**
1. Невялікая закрытая пасудзіна. *Наліць вады ў бачок,.*
2. Частка тулава ад пляча да таза. *Дзіцятка лягло на бачок і заснула.*

**БАШМАК**
1. Разнавіднасць тормаза. *Тармазны башмак.*
2. Чаравік. *Вялікія башмакі.*

**БЕРАСЦЯНКА**
1. Каробка з бяросты. *Сплесці берасцянку.*
2. Зяблік. *Берасцянка падобная да вераб'я.*

**БЛОК**
1. Прыстасаванне для падняцця грузаў. *Падымаць грузы пры дапамозе блока.*
2. Аб'яднанне, групоўка. *Ваенны і палітычны блок.*

**БОЙКА**
1. Пасудзіна для збівання масла, маслабойка. *Збіраць у бойцы масла.*
2. Сварка, бітва. *Пабілі суседа ў бойцы.*
3. Хутка, смела, жвава. *Бойка адказваць на пытанні.*

**БОКС**
1. Мужчынская прычоска. *Падстрыгацца пад бокс.*
2. Частка памяшкання ў лячэбных установах для ізалявання. *Хворага палажылі ў бокс.*
3. Від спорту. *Чэмпіянат краіны па боксе.*

**БОМА**
1. Доўгая жэрдка ці кол (у лесарубаў, плытагонаў). *У бомы плоскі зачэсаны канец.*
2. Званочак, што прымацоўваецца да хамута і дугі. *Бомы звіняць, як воз едзе.*

**БОНЫ**
1. Крэдытныя дакументы; розныя грашовыя знакі. *Купіць на боны рэчы.*
2. Плывучая загарода (выкарыстоўваецца пры лесасплаве і для перашкоджання праходу варожым караблям у гавань). *Боны складаюцца з розных паплаўкоў, бярвёнаў, сетак.*

**БОР**
1. Хваёвы лес. *Векавы бор.*
2. Хімічны элемент. *Бор з'яўляецца трохвалентным элементам.*
3. Стальны свердзел (звычайна ўжываецца ў зубалячэбнай справе). *Свідраваць зуб борам.*

**БОРТ**
1. Бок марскога або рачнога судна, самалёта; край адзення. *Борт самалёта; борт карабля;борт пінжака.*
2. Разнавіднасць зярністых утварэнняў алмаза. *Борт — зярністы алмаз.*

**БОТ**
1. Від абутку. *Гумавыя боты.*
2. Невялікае судна. *Маторны бот.*

**БРАДЗІЦЬ**

1. Хадзіць без мэты, блукаць. *Брадзіць па вуліцы.*

2. Знаходзіцца ў стане браджэння. *Варэнне пачало брадзіць.*

**БРАС**

1. Снасць на марскім судне. *Брас прывязваецца да рэяў*

2. Стыль плавання. *Плаваць брасам.*

**БРОД**

1. Неглыбокае месца ў рацэ, возеры. *Пераходзіць брод.*

2. Трызненне. *Хворы знаходзіўся ў цяжкім стане, штосьці гаварыў у гарачным бродзе.*

**БРУКАВАЦЬ**

1. Укладваць каменем вуліцу, плошчу. *Брукаваць дарогу.*

2. Буркаваць (пра галубоў). *Галубы брукуюць.*

**БРЫТЫ**

1. Паголены. *Брыты дзядзька.*

2. Кельцкае племя, якое калісьці насяляла Англію. *Брыты — продкі сучасных англічан.*

**БРЫЧКА**

1. Выязная павозка. *Катацца на брычцы.*

2. Бручка. *Брычка вырасла вялікая.*

**БУБЕН**

1. Музычны інструмент. *Біць у бубен; танцаваць пад бубен.*

2. Высокае месца, беднае травастоем. *На бубне коні не хочуць пасвіцца.*

**БУЗА**

1. Рэшткі чаго-небудзь, асадак. *Выліць бузу.*

2. Скандал, шум. *Падняць бузу.*

**БУЙ**

1. Адкрытае з усіх бакоў месца. *Буй — высокае месца, дзе дзьмуць вятры.*

2. Сігнальны паплавок на вадзе для абазначэння небяспечных месцаў. *Буй абазначае на рацэ мель.*

**БУК**

1. Дрэва. *Бук мае цвёрдую драўніну.*

2. Вір; глыбокае месца ў рацэ; круты паварот ракі. *Бук — самае глыбокае месца ў рацэ.*

**БУКСА**

1. Металічная ўстаўка ў коле, утулка. *Сцерлася букса ў коле.*

2. Бязрогая жывёліна. *Буксу загнаў у хлеў.*

**БУМ**

1. Глухі гук вялікага звана, бубна. *«Бум-бум!» — даносілася са званіцы.*

2. Штучна ўзнятая шуміха вакол якой-небудзь падзеі. *Паднялі бум, а на самай справе нічога там не здарылася.*

3. Від спартыўнага снарада. *На буме практыкуюцца ў раўнавазе.*

**БУНТ**

1. Мяцеж, стыхійнае паўстанне. *Падняўся бунт.*

2. Вязка, стос. *Бунт паперы.*

**БУР**

1. Свідравальны інструмент. *Нафтавы бур; адрамантаваць бур.*

2. Нашчадак галандскіх каланістаў у Афрыцы. *Вайна з бурамі.*

**БУРКА**

1. Верхняя футравая мужчынская адзежына без рукавоў. *Каўказская бурка.*

2. Адна штука абутку з фетру ці сукна. *Цёплыя буркі.*

**БУРЫ**

1. Шаравата-карычневы. *Буры мядзведзь.*

2. Нашчадкі каланістаў (на поўдні Афрыкі). *Буры — пераважна галандскія каланісты.*

**БУХНУЦЬ**

1. Утварыць глухі і адрывісты гук; ударыць, стукнуць. *Бухнуў гарматны стрэл.*

2. Разбухаць, павялічвацца ў аб'ёме. *Бухнуць ад вільгаці.*

**БУХТА**

1. Невялікі заліў. *У бухце было ціха і спакойна.*

2. Скрутак (канату, дроту). *Канаты былі ўкладзены ў бухты.*

3. Сварлівы чалавек, буркун. *З бухтай ладу не будзе, толькі сварка.*

**БЫК**

1. Самец буйной рагатай жывёлы. *Раней на быках аралі.*

2. Апора маста. *Мост трымаецца на быках.*

**БЫЛІНА**

1. Сцябло, каліва расліны. *Сухая быліна; адна быліна на градзе тырчыць.*

2. Народная эпічная песня пра гераічныя ўчынкі. *Руская быліна.*

**БЮРО**

1. Кіруючыя органы некаторых арганізацый і ўстаноў; некаторыя ўстановы. *Канструктарскае бюро.*

2. Пісьмовы стол з шуфлядамі. *Бюро з чырвонага дрэва.*

**БЯГУН**

1. Спартсмен. *Новы рэкорд бегуна.*

2. Завеса; слупок, на якім круцяцца вароты. *Бягун зламаўся.*

**БЯДА**

1. Гора, няшчасце. *Нялёгка справіцца з такой бядой.*

2. Лёгкі вазок, двухколка. *Запрэгчы каня ў бяду.*

## В

**ВАЛ**

1. Высокі і доўгі штучны земляны насып. *Земляны вал.*

2. Дэталь у механізме, вал. *Каленчаты вал.*

3. Адходы пры трапанні льну. *Вал — грубае валакно.*

**ВАЛАСЯНКА**

1. Невялікая пеўчая птушка, пліска. *У валасянкі тонкая дзюба.*

2. Травяністая расліна, ціпчак. *Валасянка — кармавая расліна.*

3. Ядавіты грыб. *Валасянкі і мухаморы не збіраюць, гэта ядавітыя грыбы.*

**ВАЛІЦЬ**

1. Куляць, прымушаць упасці; кідаць. *Валіць лес; валіць з ног на зямлю; валіць усё ў кучу.*

2. Вырабляць, збіваць шэрсць, сукно. *Валіць сукно.*

**ВАЛОКА**

1. Былая мера зямлі. *Валока раўнялася 21 гектару.*

2. Вяроўка, шнур, абора. *Валока ў лапцях, у невадзе.*

3. Барана. *Валокай рыхлілі зямлю.*

**ВАЛЫНКА**

1. Народны музычны інструмент. *Іграць на валынцы.*

2. Валакіта. *Цягнуць еалынку з вырашэннем пытання.*

**ВАЛЮТА**

1. Грошы, якімі карыстаюцца ў міжнародных разліках; тып грашовай сістэмы. *Валюта многіх краін свету.*

2. Скульптурнае ўпрыгожанне ў выглядзе завітка з кружком. *Валютай аздабляюць многія дамы.*

**ВАРОНКА**

1. Яма, утвораная ад разрыву снарада, міны. *Глыбокая варонка.*

2. Маладая варона. *Чорная варонка.*

**ВАРТА**

1. Ахова, каравул. *Ганаровая варта; узмоцненая варта; паставіць на варту.*

2. Неабходна. *Варта пачытаць гэтую кнігу.*

**ВАЎЧОК**

1. Воўк. *Ваўчок бяжыць.*

2. Дзіцячая цацка. *Гуляць з ваўчком.*

3. Дробная рыбка, насар. *Ваўчок падобны да акуня.*

4. Верх страхі, вільчык. *Залезці на ваўчок дома.*

**ВЕНГЕРКА**

1. Прадстаўніца венгерскай народнасці. *Маладая венгерка.*

2. Бальны танец. *Танцаваць венгерку.*

3. Куртка. *Апрануць венгерку.*

**ВЕРХАВОДКА**

1. Заправіла, важак. *Верхаводка кіруе ўсімі, вядзе за сабой.*

2. Вада, якая залягае недалёка ад зямной паверхні. *Яма, запоўненая верхаводкай.*

3. Дробная рыба, яльцы, сілявы.

**ВЕСЯЛУХА**

1. Жанчына, якая любіць павесяліцца. *Весялуха гэтая жанчына, ніколі не сумуе.*

2. Вясёлка. *Пасля навальніцы на небе з'явілася весялуха.*

3. Грыб. *Поўны кош весялух.*

**ВЕТКА**

1. Чыгунка. *Ветка адыходзіць убок ад асноўнай магістралі.*

2. Галінка. *Ветка бярозы, дуба.*

**ВЕЯ**

1. Завея, завіруха. *Разгулялася вея на вуліцы.*

2. Павека. *Апусціць веі.*

**ВЕЯЛКА**

1. Сельскагаспадарчая машына для ачысткі збожжа ад мякіны пасля малацьбы. *Веялкай ачышчаюць збожжа.*

2. Павека. *Прыпухлыя веялкі.*

**ВІД**

1. Від, які адкрываецца перад вачамі. *Від на горад.*

2. Разнавіднасць, тып. *Від літаратуры.*

**ВІЗІР**

1. Відашукальнік (у фота-, кінаапаратах). *Візірам вызначаюць межы кадра, які здымаецца фотаапаратам.*

2. Высокі саноўнік у старажытных краінах Блізкага Усходу. *Візір шаха.*

**ВІННЫ**

1. Які мае дачыненне да віна. *Вінны спірт.*

2. Вінаваты. *Не вінны перад сябрамі.*

**ВІНТ**

1. Стрыжань са спіральнай нарэзкай, шруба. *Замацаваць вінт.*

2. Карцёжная гульня. *Гуляць у вінт.*

**ВІРА**

1. Грашовы штраф за забітага чалавека ў Старажытнай Русі. *Раней за забітага чалавека плацілі вялікую віру.*

2. «Падымай, падымай! *Віра!»— крычаць будаўнікі знізу кранаўшчыку.*

3. Частаванне, якое наладжвае хлопец пры дасягненні сталага ўзросту. *Гуляць на віры.*

**ВІРАЖ**

1. Паварот самалёта, карабля з крэнам, па крывой. *Круты віраж.*

2. Хімічны раствор, які выкарыстоўваецца пры вырабе фотаздымкаў. *Прамыць фатаграфіі ў віражы.*

**ВІРОК**

1. Крынічка, малы вір. *Ля рэчкі б'е вірок.*

2. Прылада для звівання нітак. *Вірком звіваюць ніткі ў клубок.*

**ВІС**

1. Вісячае становішча цела гімнаста (пры гімнастычных практыкаваннях). *Зрабіць віс.*

2. Трава. *Накасіць вісу.*

**ВІХОР**

1. Кругавая і моцная плынь ветру. *Наляцеў моцны віхор.*

2. Узнятыя ўверх валасы, завіток валасоў. *Віхор на галаве.*

**ВІЦІНА**

1. Дубец, кій. *Ударыць віцінай.*

2. Лодка ці барка для перавозкі збожжа. *Віцінай можна было перавезці зерне па рацэ.*

**ВОКА**

1. Орган зроку. *Заплюшчыць вока.*

2. Бездань, прорва. *Чортава вока.*

**ВОЛЬНЫ**

1. Свабодны, нікому не падпарадкаваны. Во*льнае жыццё.*

2. Халодны, ачахлы. *Вольнае паветра.*

**ВОЛЬТ**

1. (Ад *імя італьянскага фізіка А. Вольта).* Адзінка вымярэння напружання электрычнага току. *Электрычная лямпачка ў 100 вольт.*

2. Ухіленне ад удару праціўніка пры фехтаванні; круты паварот каня пры верхавой яздзе на манежы. *Манежныя вольты.*

**ВОЛЯ**

1. Свабода. *Па сваёй волі.*

2. Валлё, валляк (рус.*зоб*). *Воля ў курыцы.*

**ВОСЬ**

1. Вось у коле. *Пярэдняя вось.*

2. Узмацняльная ці ўказальная часціца. *Вось і даехалі, вось і горад.*

**ВУГОР**

1. Падобная да змяі рыба. *Налавіць вугроў.*

2. Прышч. *Вугор ускочыў на твары.*

**ВУДА**

1. Рыбалоўная снасць. *Лавіць вудай*

2. Нага (доўгая). *Высунуў вуды.*

**ВУЖ**

1. Неядавітая змяя. *Вуж звіваецца.*

2. Раменная пятля ў хамуце, гуж. *Завязаць вуж.*

**ВУЗЕЛ**

1. Вузел. *Завязаць гальштук на вузел; моцны вузел.*

2. Мера скорасці руху суднаў, роўная 1,852 км у гадзіну. *Хуткасць судна пятнаццаць вузлоў.*

**ВУСНЫ**

1. Губы, рот. *Тонкія вусны.*

2. Які вымаўляецца. *Вусны адказ.*

**ВУТКА**

1. Выдумка. *Пусціць вутку.*

2. Медыцынская пасудзіна. *Разбіць вутку.*

3. Качка. *Вуткі пасуцца ля рэчкі.*

**ВЫЖАЦЬ**

1. Зжаць на пэўнай плошчы. *Выжаць увесь участак.*

2. Падняць штангу, гіру ўверх. *Выжаць штангу ў 120 кілаграмаў.*

**ВЫЖЫЦЬ**

1. Застацца жывым. *Выжыў пасля ранення.*

2. Выгнаць, прымусіць пакінуць. *Выжыць з дому.*

**ВЫЛІВАК**

1. Яйка без цвёрдай лупіны. *У курыным гняздзе знайшла гаспадыня і два выліўкі.*

2. Галалёдзіца. *На вуліцы вылівак, вельмі коўзка.*

**ВЫРАЗ**

1. Пройма, выемка. *Выраз на грудзях.*

2. Характэрны знешні выгляд; моўны зварот. *Выраз твару, вачэй.*

**ВЯДОМЫ**

1. Пра каго ўсе ведаюць, хто папулярны. *Вядомы артыст, тэатр; вядомыя людзі.*

2. Якога вядуць, які ідзе за кіруючым.(пераважна ў авіяцыі). *Вядомы ў вопытнага лётчыка быў малады пілот.*

**ВЯЗКА**

1. Вязанне; нізка аднародных прадметаў. *Вязка шкарпэтак*

2. Гразка. *На вуліцы вязка ад дажджу.*

# Г

**ГАЗЕЛЬ**

1. Тып вершаскладання (ва ўсходняй паэзіі). *Пісаць газелямі.*

2. Горная каза з пароды антылоп. *Хутканогая газель.*

**ГАЛКА**

1. Птушка. *Галка звіла гняздо ў дымаходзе.*

2. Шарык, скачаны з якога-небудзь мяккага рэчыва. *Суп з галкамі.*

**ГАЛУН**

1. Сернакіслая соль, галын. *Галун спыняе цячэнне крыві.*

2. Тасьма, нашыўка з такой тасьмы. *Нашыць галуны.*

**ГАЛЬКА**

1. Дробныя каменьчыкі, адшліфаваныя вадой. *Бераг усыпаны галькай.*

2. Спадніца. *Доўгая галька.*

**ГАМ**

1. Гоман, шум, крык. *Гам стаіць у памяшканні.*

2. Выклічнік са значэннем «есці». *Гам-гам гэтую кашу.*

**ГАМА**

1. Музычная гама. *Мажорная гама; выконваць гамы на раялі.*

2. Трэцяя літара грэчаскага алфавіта. *Альфа, бэта і гама паэзіі — вобразнасць.*

**ГАРАДОК**

1. Невялікі горад. *Правінцыяльны гарадок.*

2. Гульня ў гарадкі; драўляная цурка для такой гульні. *Гуляць у гарадкі.*

**ГАРЧАК**

1. Рыба. *Гарчак падобны да карпа.*

2. Травяністая расліна. *Гарчак ядавіты.*

**ГАРЭЛКА**

**1.** Прыбор для спальвання гаручай вадкасці або газу. *Газавая гарэлка.*

**2.** Моцны спіртны напітак. *Хлебная гарэлка*

**ГАСПАДАР**

**1.** Уладальнік, уласнік. *Стары гаспадар*

**2.** Першы сноп жыта ў дзень зажынак. *Паставіць гаспадара на полі.*

**ГАСЦІНЕЦ**

**1.** Падарунак. *Гасцінец бацькі.*

**2.** Бальшак, тракт. *Ехаць па гасцінцы.*

**ГВАЗДЗІКА**

**1.** Прыправа. *Пакласці гваздзіку ў грыбы.*

**2.** Садовая кветка, гваздзік. *Белая, ружовая гваздзіка.*

**ГІЛЬ**

**1.** Птушка снягір. *Гіль зімой прылятае.*

**2.** Конскі авадзень. *Гіль не дае пасвіцца коням.*

**ГЛАДЗЬ**

**1.** Гладкая паверхня. *Гладзь возера, заліва.*

**2.** Спосаб вышывання. *Абрус вышыты гладдзю.*

**ГОЛУБ**

**1.** Птушка. *Шэры голуб; паштовыя галубы.*

**2.** Варэнік з мясам або грыбамі. *Смачныя галубы.*

**ГОРКА**

**1.** Гаркотна, цяжка. *Горка на душы.*

**2.** Невялікая гара. *Катацца на лыжах з горкі.*

**ГОРНЫ**

**1.** (ад гара). Гарысты, пакрыты гарамі. *Горны схіл.*

**2.** (ад гора). Гаротны. *Горны лёс.*

**ГОСЦЬ**

**1.** Запрошаны ў госці чалавек. *Рэдкі госць.*

**2.** Першы сноп жыта ў дзень зажына. *Жытнёвы госць звязваецца перавяслам.*

**ГРАДКА**

**1.** Палоска зямлі. *Градка бульбы, агуркоў, цыбулі.*

**2.** Верхняя жэрдка ў драбінах воза ці саней. *Градка ў драбіне.*

**ГРАНАТ**

**1.** Фруктовае дрэва і яго плод. *Сок робяць з граната.*

**2.** Каштоўны камень. *Цёмна-чырвоны гранат.*

**ГРАФІК**

**1.** Дакладная схема; план з пэўнымі паказчыкамі і тэрмінам выканання. *Графік руху цягнікоў.*

**2.** Мастак-графік. *Здольны графік.*

**ГРАЧАНІК**

**1.** Хлебны жук. *Грачанік з'яўляецца шкоднікам зерневых культур.*

**2.** Блін з грэцкай мукі. *Смачныя грачанікі.*

**ГРОТ**

**1.** Пячора. *Стары грот.*

**2.** Ніжні парус на грот-мачце. *Замацаваць грот.*

**ГРЫФ**

**1.** Крылатае страшыдла. *Грыф з галавой арла і тулавам льва.*

**2.** Драўляная пласцінка ў музычных інструментах. *Струны прыціскаюцца да грыфа.*

**3.** Штэмпель з узорам афіцыйнага подпісу; надпіс на дакуменце, выданні. *З сакрэтным грыфам.*

**ГУБА**

**1.** Частка твару чалавека. *Верхняя губа.*

**2.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльная акруга (XVI-XVII ст.). *Усходняя губа.*

**3.** Заліў ці бухта ў паўночных морах. *Обская губа.*

**4.** Гаўптвахта. *Сесці на губу.*

**5.** Мера даўжыні палатна. *Кусок у тры губы.*

**ГУМА**

**1.** Рызіна. *Гума на шынах.*

**2.** Пухлінападобнае разрастанне тканак, якое ўзнікае ў выніку цяжкай хваробы. *Гума тканак.*

# Д

**ДАКЛАД**

1. Вуснае ці пісьмовае паведамленне. *Справаздачны даклад.*
2. Дадатковы матэрыял (для шыцця адзення, абутку). *Купіць даклад.*

**ДАМІНО**

1. Разнавіднасць гульні. *Гуляць у даміно.*
2. Маскарадны касцюм. *Апрануцца ў даміно.*

**ДАРЫЦЬ**

1. Рабіць падарунак. *Дарыць кветкі, паштовыя маркі.*
2. Вырыць да якога-небудзь месца. *Дарыць да паловы праходу.*

**ДАСЛАЦЬ**

1. Паслаць па пошце тое, што раней не было выслана. *Даслаць новыя кнігі.*
2. Скончыць слаць, рассцілаць. *Даслаць на лузе лён.*

**ДАСПЯВАЦЬ**

1. Скончыць спяваць. *Даспяваць песню.*
2. (адспець). Станавіцца спелым. *Даспяваюць маліны, парэчкі.*

**ДАСЫПАЦЬ**

1. (ад сыпаць). Сыпаць дадаткова. *Дасыпаць мех зернем.*
2. (ад спаць). Спаць да якога-небудзь часу. *Дасыпаць на свежым паветры ў садзе.*

**ДАЧА**

1. Даванне. *Дача звестак; дача жывёліне кармоў.*
2. Загарадны дом. *Купіць дачу, зімняя дача; адпачываць на дачы.*

**ДВОР**

1. Дварышча, панадворак. *Выйсці з двара.*
2. Манарх і яго акружэнне. *Царскі двор.*

**ДЖУТ**

1. Трапічная расліна. *Вяроўка з джуту.*
2. Масавая гібель жывёлы на зімовых пашах ад бяскорміцы. *Джут назіраецца ў мясцовасцях з круглагадовай пашай.*

**ДЗЕД**

1. Бацька маці ці бацькі; стары чалавек. *Паехаць у госці да дзеда і бабы.*
2. Прылада для асвятлення хаты лучынай. *Лучыну ўтыкалі ў дзеда.*
3. Пустазелле (бадзяк, лопух). *Кусты дзядоў і крапівы.*

**ДЗЯДЫ**

1. Продкі. *Дзяды – асенняе свята памінання памерлых.*
2. Пустазелле. *Дзяды растуць ля гарода.*

**ДЗЯРКАЧ**

1. Невялікая птушка, драч. *Дзяркач жыве на балоце.*
2. Стары венік. *Дзяркач для мыцця падлогі.*

**ДЗЯРУГА**

1. Грубае тоўстае палатно. *Посцілкі шылі з дзяругі.*
2. Дзераза. *Дзяруга расце ў лесе.*

**ДЗЯЦІНЕЦ**

1. Крэмль горада (у старажытнай Русі). *Дзяцінец быў абнесены высокімі сценамі.*
2. Хвароба маленькіх дзяцей. *Хворыя на дзяцінец страчваюць прытомнасць.*

**ДРАБІНКА**

1. Драўляная прыстаўная лесвіца. *Па драбінцы палез на страху.*
2. Маленькі кавалачак, драбок. *Драбінка солі.*

**ДРАКА**

1. Цяслярская металічная прылада, драчка. *Драка — інструмент цесляроў.*
2. (рус. *драка*). Бойка. *Удзельнічаць у драцы.*

**ДРАПАЦЬ**

1. Дзерці, скрэбці. *Драпаць па вядры.*
1. Уцякаць, бегчы. *Драпаць у кусты, у лес.*

**ДРАЧ**

1. Лугавая птушка. *Драч гучна крычыць.*
2. Блін, спечаны з дранай бульбы, дранік. *Смачныя драчы.*
3. Цяслярская прылада, якой выразаюць пазы. *Востры драч.*

**ДРОБ**

1. Кавалачак, драбок. *Дроб сыру, хлеба.*

2. (рус. *дробь*). Лік, які складаецца з некалькіх частак адзінкі. *Няправільны дроб.*

**ДРОЦІК**

1. Невялікі кавалак дроту. *Перарэзаць дроцік.*

2. Від зброі ў выглядзе невялікага кап'я. *Металічны дроцік.*

**ДРУК**

1. Друкаванне. *Падрыхтаваць да друку рукапісы.*

2. Палка, дубіна, кій. *Сукаваты друк.*

**ДУБАЛЬТОЎКА**

1. Паляўнічая стрэльба, двухстволка. *Страляць з дубальтоўкі.*

2. Вялікая хустка з сукна. *Дубальтоўка звычайна бывае ў клетку.*

3. Падвойнае акно. *Дубальтоўка на зіму ставіцца.*

**ДУМА**

1. Думка, разважанне, роздум. *Дума пра свой край.*

2. Выбарны орган кіравання ў Расіі. *Гарадская дума.*

**ДУР**

1. Дурасць, капрызы. *У дачкі было яшчэ многа дуру у галаве.*

2. Блёкат (расліна). *Дур мае моцны пах.*

**ДЫБА**

1. Прылада для катавання (у сярэдні вякі). *Падняць на дыбу.*

2. Дыбам. *Конь устаў дыба.*

**ДЫВАН**

1. Пакрывала на ложак, для ўпрыгожання сцен, высцілання падлогі. *Падлогу ўсцілалі дыванамі.*

2. Дзяржаўная рада ў некаторых старажытных мусульманскіх краінах. *Пасяджэнне дывана.*

**ДЫСЦЫПЛІНА**

1. Цвёрда ўстаноўлены парадак, які з'яўляецца абавязковым для ўсяго калектыву. *Працоўная дысцыпліна.*

2. Асобная галіна якой-небудзь навукі.

**ДЫЯГАНАЛЬ**

1. Баваўняная ці шарсцяная тканіна ў рубчык. *Сукенка з дыяганалю.*

2. Прамая лінія, што злучае два несумежныя вуглы многавугольніка ці дзве вяршыні шматгранніка. *Правесці дыяганаль.*

**ДЭЛЬТА**

1. Вусце ракі. *Дэльта Дняпра, Волгі.*

2. Чацвёртая літара грэчаскага алфавіта. *Дэльта ў алфавіце ідзе пасля гамы.*

## Ё

**ЁМКА**

1. Добра, зручна, ёміста. *Ёмка працаваць.*

2. Чапяла. *Дастаць ёмкай скавараду.*

**ЁРШ**

1. Дробная рыба. *Злавіць ярша.*

2. Сумесь гарэлкі з півам. *Ёрш моцна ап'яняе.*

## Ж

**ЖАБА**

1. Земнаводная жывёліна; рапуха. *Старая жаба. Жабы крычаць на дождж.*

2. Хвароба сэрца. *Хварэць на жабу.*

**ЖАБНІК**

1. Пасудзіна для захоўвання жаб. *Жабнік бывае ў лабараторыях і навуковых кабінетах.*

2. Азёрная расліна. *Жабнік расце ў азёрах, сажалках.*

**ЖАЛЯЗНЯК**

1. Жалезная руда. *Буры жалязняк.*

2. Рыдлёўка. *Капаць яму жалязняком.*

**ЖАХ**

1. Моцны страх. *Знямець ад жаху. Ахапіў жах.*

2. Гукапераймальны выклічнік, якім абазначаюць шорханне. *«Жах!» — пачулася за сцяной.*

**ЖАЦЬ**

1. Убіраць расліны, зразаючы сцябліны сярпом ці машынай. *Жаць жыта. авёс; раней жыта жалі сярпамі.*

2. Ціснуць. *Жаць руку, алей; моцна жаць.*

**ЖЛУКТА**

1. Чалавек, які многа п'е. *Тоўсты жлукта.*

2. Драўляная пасудзіна, кадушка. *Раней бялізну запарвалі ў жлукце.*

**ЖЛУКЦІЦЬ**

1. Прагна і ў вялікай колькасці піць. *Жлукціць ваду, малако.*

2. Запарваць бялізну ў кадушцы. *Жлукціць бялізну зручна ў кадцы.*

**ЖМУТ**

1. Скрутак. *Жмут паперак, сшыткаў.*

2. Скнара. *І не прасі, не дасць. Гэта ж такі жмут!*

**ЖУЖАЛЬ**

1. Начны жук. *Жужаль драпежны.*

2. Шлак. *Шпалы падпальвалі жужалем.*

**ЖУРАВЕЛЬ**

1. Пералётная птушка. *Журавель жыве на балотах.*

2. Прыстасаванне, пры дапамозе якога з калодзежа дастаюць ваду. *Калодзежны журавель.*

**ЖЫВЕЦ**

1. Жывая рыбка, якая насаджваецца на кручок пры лоўлі рыбы. *Лавіць на жыўца.*

2. Падоўжаны край бёрда, у які ўстаўляецца трысцё. *Да жыўца прывязваюць ніты.*

3. Пустая зямля; топкае месца, багна. *Бульба не ўрадзіла на жыўцу; агразнуць у жыўцу.*

4. Дрэнна выробленая скура. *Авечы жывец.*

5. Прырослая частка пазногця. *Жывец у пазногця.*

**ЖЫВОТ**

1.Частка цела. *Вялікі жывот; баліць жывот.*

2. Жыццё. *Змагацца не на жывот, а на смерць.*

**ЖЫЖА**

1. Жыжка. *Жыжа ад снегу, дажджу, гнаявая жыжа.*

2. Агонь. *Жыжа гарыць.*

**ЖЫРОЎКА**

1. Жыраванне. кармленне (пра птушак, звяроў, рыбу). *Жыроўка баброў, птушак.*

2. Распараджэнне ўкладчыка аб правядзенні разліку з крэдыторам. *Падпісаць жыроўку.*

**ЖЫТКА**

1. Умовы жыцця. *Добрая жытка настала.*

2. Хутка, шпарка. *Жытка бегаць, ісці.*

# З

**ЗАБІЦЬ**

1. Пазбавіць жыцця; прыбіць, увагнаць; закрыць наглуха. *Дзядулю забілі ў вайну; забіць цвік.*

2. Выцечы струменем, з сілай. *Забіў фантан з-пад зямлі.*

**ЗАБОЙ**

1. Канец штольні, дзе працуюць гарнякі. *Працаваць у забоі.*

2. Забіванне жывёлы. *Асенні забой свіней.*

**ЗАБУРЫЦЦА**

1. Абрушыцца, разваліцца. *Хата забурылася; стары хлеў забурыўся.*

2. Захварэць. *Забурыцца грыпам; забурыцца пасля дажджу і холаду.*

**ЗАВОД**

1. Прамысловае прадпрыемства. *Трактарны завод.*

2. Пуск у ход якога-небудзь механізма; прыстасаванне, якое прыводзіць механізм у дзеянне. *Завод трактара, аўтамабіля.*

**ЗАГАВОР**

1. Тайнае пагадненне. *Загавор супраць царскай улады.*

2. Замова. варажба. *Загавор ад хваробы.*

**ЗАГАДАЦЬ**

1. Распарадзіцца, аддаць загад. *Загадаць пачаць заняткі у дзевяць гадзін.*

**2.** Прапанаваць загадку ці пытанне. *Загадаць лёгка, цяжэй адгадаць.*

**ЗАГАНЯЦЬ**

**1.** Убіваць, забіваць з сілай. *Заганяць цвік*

**2.** Змарыць, стаміць працай, беганінай. *Зусім заганялі хлапчука.*

**ЗАГОН**

**1.** Невялікі ўчастак ворнай зямлі. *Апрацаваць загон зямлі.*

**2.** (ад *ганяць, заганяць*). Працэс, калі заганяюць каго-небудзь куды-небудзь. *Загон ваўкоў на адстрэл.*

**ЗАДАВАННЕ**

**1.** Дзеянне, калі патрабуюць штонебудзь выканаць. *Задаванне пытанняў.*

**2.** Ганарлівасць, зазнайства. *Задаванне яе ўжо надакучыла сяброўкам.*

**ЗАКУРЫЦЬ**

**1.** Задыміць, пакрыць сажай. *Закурыць усю столь у хаце.*

**2.** Пачаць курыць. *Закурыць цыгару.*

**ЗАКУСІЦЬ**

**1.** Заціснуць зубамі. *Закусіць губу.*

**2.** Заесці; крыху перакусіць. *Закусіць рыбай.*

**ЗАЛАТНІК**

**1.** Старая мера масы (каля 4,26 г). *Пяць залатнікоў.*

**2.** Прыстасаванне для аўтаматычнага кіравання патокам пары (газу, вадкасці) у машынах. *Залатнік з рамай.*

**ЗАЛЁТНЫ**

**1.** Які выпадкова ці ненадоўга заляцеў у пэўнае месца. *Залётныя птушкі, гусі.*

**2.** Які заляцаецца, аказвае ўвагу. *Залётны хлопец.*

**ЗАЛОЖНІК**

**1.** Асоба, гвалтоўна затрыманая ў якасці залогу. *Узяць у палон заложнікаў.*

**2.** Палічка для посуду. *Заложнік для лыжак.*

**ЗАЛОМ**

**1.** Заломванне. *Зрабіць залом на дрэве.*

**2.** Каспійскі селядзец. *Тлусты і буйны залом.*

**ЗАМЕШКА**

**1.** Замешванне чаго-небудзь. *Замешка раствору, бетону.*

**2.** Затрымка. *Замешка ў гасцях.*

**ЗАМКОВЫ**

**1.** (ад *замок*). Замочны. *Замковая шчыліна.*

**2.** Ваеннаслужачы пры артгармаце. *Замковы быў не навічок у ваеннай справе.*

**ЗАПАЛ**

**1.** Механізм для запальвання выбуховага рэчыва. *Запал у гармаце, бомбе.*

**2.** Пашкоджанне зерня ў коласе ад засухі. *Запал пшаніцы.*

**ЗАПОР**

**1.** Тое, чым запіраюць дзверы, вароты. *Дзвярны запор.*

**2.** Няпоўнае апаражненне кішэчніка, затрымка стулу. *Лячыцца ад запору.*

**ЗАПУСЦІЦЬ**

**1.** Кінуць з размаху. *Запусціць бумеранг.*

**2.** Без догляду, увагі прывесці ў стан заняпаду. *Запусціць сад і агарод.*

**ЗАРАДЗІЦЦА**

**1.** Узнікнуць, пачацца. *Зарадзіліся сумненні.*

**2.** Стаць зараджаным. *Акумулятар зарадзіўся, трэба яго адключыць.*

**ЗАРАНКА**

**1.** Зорка. *Ранішняя заранка; вячэрняя заранка.*

**2.** Невялікая птушка, малінаўка. *Заранка — пеўчая птушка.*

**ЗАРАЎНАВАЦЬ**

**1.** Пачаць раўнаваць. *Жонку зараўнаваць да суседа.*

**2.** Зрабіць роўным. *Зараўнаваць яму, роў.*

**ЗАРНІЦА**

**1.** Водбліск далёкай навальніцы. *Зарніца без грому.*

**2.** Травяністая расліна. *Зарніца цвіце жоўтымі ці фіялетавымі*

*кветкамі.*

**ЗАРУБІЦЬ**

1. Падшыць край чаго-небудзь, загнуўшы. *Зарубіць ручнік.*

2. Зрабіць зарубку на чым-небудзь. *Зарубіць метку на дрэве, сасне.*

**ЗАРУЧЫЦЦА**

1. Загадзя забяспечыць сабе падтрымку. *Заручыцца падтрымкай усей школы.*

2. Дамовіцца аб шлюбе. *Маладыя заручыліся, назваліся жаніхом і нявестай.*

**ЗАСЛОН**

1. Атрад для аховы галоўнай часткі войска. *Заслон для прыкрыцця войска.*

2. Лаўка. *Сесці на заслон; пераносны заслон.*

**ЗАСМАЛІЦЬ**

1. Апрацаваць смалою. *Засмаліць лодку.*

2. Закурыць. *Засмаліць папяросу.*

3. Моцна ўдарыць. *Засмаліць у вуха, у бок.*

4. Хутка пабегчы. *Заяц засмаліў у лес.*

**ЗАСЦЕНАК**

1. Месца зняволення, турма. *Зняволеных фашысты катавалі ў засценку.*

2. Землі, што не ўваходзілі ў сялянскія надзелы пры валочнай сістэме землекарыстання. *Засценкі былі ў Рэчы Паспалітай.*

**ЗАТОР**

1. Сукупнасць людзей, транспарту, якая перашкаджае руху. *Затор машын; на дарозе ўтварыўся затор.*

2. Сумесь, якая выкарыстоўваецца для браджэння піва і інш. *Затор для піва.*

**ЗАЧАСАЦЬ**

1. Прычасаць. *Зачасаць грэбенем валасы.*

2. Завастрыць, пагабляваць драўніну. *Зачасаць палку, бервяно.*

**ЗБОРКА**

1. Збіранне, злучэнне частак. *Зборка механізмаў, канструкцый.*

2. Складка. *Зборка на вопратцы: спадніца ў зборкі.*

**ЗВЕРАБОЙ**

1. Паляўнічы на маржоў, цюленяў. *Вопытны зверабой.*

2. Лекавая расліна, святаяннік. *Насушыць зверабою.*

**ЗВОД**

1. Знікненне чаго-небудзь. *Звод курэй; яблыня пайшла на звод.*

2. Скляпенне. *Звод печы, тунеля, дома.*

3. Збор тэкстаў, дакументаў. *Звод законаў, летапісаў.*

4. Рэдакцыя рукапіснага тэксту, якая перадае асаблівасці мовы гэтага тэксту. *Помнік рускага зводу.*

**ЗВОНКІ**

1. Гучны, высокі. *Звонкі голас.*

2. Картачная масць. *Звонкі абазначаюцца чырвонымі ромбікамі.*

**ЗЕНІТНЫ**

1. Які належыць да зеніту. *Зенітная адлегласць.*

2. Прызначаны для стральбы па паветраных цэлях. *Зенітная артылерыя.*

**ЗЗЯЦЬ**

1. Ярка свяціць, блішчаць, зіхацець. *Зоркі ззяюць.*

2. Быць адкрытым (пра адтуліну, рану). *У сцяне ззяе вялікая дзірка ад снарада.*

**ЗНАЦЬ**

1. Ведаць. *Знаць усю праўду; трэба добра знаць родную мову.*

2. Вышэйшы слой пануючага класа. *Баярская знаць, духоўная знаць.*

**ЗНАЧЫЦЬ**

1. Ставіць знак, метку. *Значыць дарогу ў лесе.*

2. Азначаць. *Кожнае слова штосьці значыць.*

**ЗНЕСЦІ**

1. Прынесці, сабраць у адно месца. *Знесці ўсе пакункі ў адзін пакой.*

2. Разбурыць, знішчыць. *Знесці старыя хутары.*

3. Пакласці яйкі (пра птушак). *Курыца знесла некалькі яек у стозе.*

4. Сцярпець. *Знесці гэту абразу.*

**ЗНОС**

1. Дзеянне паводле дзеяслова знесці. *Знос будынка.*

2. Псаванне. *Знос абсталявання.*

**ЗОРКА**

1. Нябеснае цела. *Зоркі ззяюць на небе; вячэрняя зорка.*

2. Пільна, уважліва. *Вочы зорка глядзяць.*

**ЗЫБКА**

1. Калыска. *Драўляная зыбка; у зыбцы спіць малое дзіця.*

2. Хваліста, хістка. *Хадзіць па дрыгве зыбка.*

**ЗЯЗЮЛЯ**

1. Птушка. *Зязюля кукавала ў лесе.*

2. Травяністая расліна, ятрышнік. *З зязюлі робяць лекі.*

**ЗЯЛЁНКА**

1. Грыб. *Зялёнкі восенню збіраюць.*

2. Вадкасць, якая выкарыстоўваецца для змазвання пашкоджаных участкаў скуры. *Змазаць зялёнкай рану.*

**ЗЯМЛЯ**

1. Планета; суша, глеба. *Зямля рухаецца вакол Сонца; чорная зямля.*

2. Старая назва літары «з». *Літара «зямля» ў стараславянскім алфавіце.*

## І

**ІНДЫЯНКА**

1. (параўн. *індзеец*). Прадстаўніца насельніцтва карэнных плямён, якія раней насялялі амерыканскі мацярык. *Індыянка з племені наваха.*

2. (параўн. *індыец*). Жанчына з Індыі. *Прыгожая індыянка.*

**ІСПАНКА**

1. Прадстаўніца насельніцтва Іспаніі. *Іспанка з Мадрыда.*

2. Адна з цяжкіх форм грыпу. *Захварэць на іспанку.*

## К

**КАБАН**

1. Кныр, дзік. *Вялізны кабан.*

2. Цаглянае скляпенне ў печы. *Пячны кабан.*

**КАБЫЛА**

1. Самка каня. *Запрэгчы кабылу.*

2. Дошка з выразамі для галавы і рук, якой раней карысталіся пры пакаранні. *Пакаранне кабылай.*

3. Грыб. *Збіраць кабылы ў лесе.*

**КАБЫЛКА**

1. Падстаўка пад струны ў некаторых музычных інструментах. *Кабылка ў скрыпцы, балалайцы..*

2. Пласцінка ў кроснах. *Да кабылкі падвешваюцца ніты.*

3. Казяўка-траскун, конік. *Кабылка гучна траскоча.*

**КАДЗІЛА**

1. Металічны сасуд на ланцужках, які выкарыстоўваецца ў час набажэнства. *Махаць кадзілам; поп з кадзілам.*

2. Лекавая расліна. *Настой з кадзілу.*

**КАДРЫ**

1. Асобныя здымкі. *Кадры з папулярнага кінафільма.*

2. Пастаянны састаў работнікаў. *Тэхнічныя кадры.*

**КАДЭТ**

1. Выхаванец кадэцкага корпуса. *Сустрэча кадэтаў.*

2. (ад першых складоў словазлучэння «канстытуцыйны дэмакрат»). Член канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі ў дарэвалюцыйнай Расіі. *Кадэты выступілі супраць спынення вайны.*

**КАЗА**

1. Жывёліна, самка казла. *Свойская каза.*

2. Драўляная мерка, сажань. *Мераць поле казой.*

3. Насілкі для пераносу цэглы на будаўніцтве. *Казой насілі цэглу і смецце.*

**КАЗАК**

1. Вольны чалавек з прыгонных сялян, халопаў, гарадской бедноты. *Запарожскі казак.*

2. Грыб. *Насушыць казакоў.*
3. Лён-даўгунец. *Цэлае поле казаку.*
4. Верхняе адзенне, казакін. *Доўгі казак.*

**КАЗАЧОК**
1. Народны танец. *Танцавальная група выканала танец «Казачок».*
2. Мера дроў. *Прывёз два казачкі дроў.*

**КАЗЁЛ**
1. Самец казы. *Барадаты казёл.*
2. Гімнастычны снарад. *Скакаць праз казла.*
3. Шлак, што застаўся пры плаўленні металу. *Казёл застывае пры плаўленні металу і прыстае да сценак каўша.*
4. Грыб-казляк. *Назбіраць казлоў.*
5. Гульня ў даміно.*Гуляць у «казла».*
6. Некалькі снапоў збажыны, пэўным чынам састаўленых для прасушкі. *Скласці снапы ў казла.*
7. Легкавы аўтамабіль. *Новенькі «казёл».*
8. Козлы для распілоўкі дроў; разгалістае бервяно, сук; прылада для вымярэння плошчы; мера даўжыні. *Пілíць дровы на «казле».*
9. Дошчачка з выемкай для здымання ботаў. *«Казёл» звычайна стаіць у сенцах.*

**КАЗЫРАЦЬ**
1. (ад *козыр*). Хадзіць з казырнай карты. *Умела казыраць.*
2. Вітаць, прыкладваючы руку да казырка. *Салдат казырнуў лейтэнанту.*

**КАЙСТРА**
1. Дарожная торба. *Закінуць кайстру за плечы.*
2. Кастрыца, адходы. *Кайстра з ільну, канапель; на вышках пахла кайстрай.*

**КАЛАЧ**
1. Круглая булка. *Смачны калач.*
2. Круг, кольца. *Калачом прымацоўваецца аглобля да палазоў.*
3. Расліна. *Калач прыгожа цвіце.*

**КАЛДУН**
1. Клёцка з мясным ці іншым фаршам. *Смачныя калдуны.*
2. Зблытаны, скудлачаны пук валасоў, поўсці; каўтун. *Калдуны валасоў.*
3. Вядзьмар, чараўнік. *Калдун займаецца чорнай магіяй.*
4. Страўнік. *Баліць калдун.*

**КАЛОДА**
1. Кароткае тоўстае бервяно. *Трухлявая калода.*
2. Камплект ігральных карт. *Калода трапіла-да махляра.*

**КАЛОША**
1. Частка штаноў, калашына. *Падкасаць калошу.*
2. Колькасць матэрыялаў, якая за адзін раз засыпаецца ў доменную печ. *Коксавая калоша.*
3. Галёш. *Гумавыя калошы.*

**КАНЁК**
1. Конь; любімы занятак. *Сесці на свайго канька.*
2. Прыстасаванне для катання на лёдзе. *Стальны канёк.*

**КАНТ**
1. Востры бераг, край, рабро чаго-небудзь. *Кант стала.*
2. Пахвальнае песнапенне. *Пець канты; царкоўны кант.*

**КАНЯ**
1. Драпежная птушка, канюк. *Каня крычыць, як быццам хтосьці просіць піць.*
2. Глухая сцяна ў хаце; дрэва. *Зрабіць дзірку ў кані.*

**КАПА**
1. Куча сена, саломы; невялікі стажок. *Копы яшчэ не звезлі з поля.*
2. Шэсцьдзесят штук чаго-небудзь. *Капа арэхаў, яблыкаў.*
3. Сход сялян, які займаўся разглядам судовых зямельных спраў. *Сялянскі сход — капа.*

**КАПЛУН**
1. Пакладаны певень. *Каплуна адкормліваюць на мяса.*
2. Разнавіднасць стравы. *Каплун з цыбуляй.*

**КАРАСЬ**
1. Рыба. *Лавіць карасёў.*
2. Падосак. *Карась прымацоўваўся да восі ў калясе.*

**КАРДОН**
1. Цвёрдая тоўстая папера. *Ліст кардону.*
2. Дзяржаўная граніца, мяжа. *Паехаць за кардон.*

**КАР'ЕР**

1. Самы хуткі бег каня. *Пусціць каня ў кар'ер.*

2. Месца, дзе здабываюцца карысныя выкапні адкрытым спосабам. *Пясчаны, тарфяны кар'ер.*

**КАРМАВЫ**

1. Які мае дачыненне да корму. *Кармавыя буракі.*

2. (ад *карма*). Які мае дачыненне да кармы (часткі судна). *Кармавая частка судна.*

**КАРНЕТ**

1. Афіцэрскі чын у кавалерыі і пагранічным войску рускай арміі. *Рускі карнет.*

2. Духавы музычны інструмент. *Карнет мае выгляд ражка.*

**КАРОЛЬ**

1. Манарх, правіцель. *Кароль Францыі.*

2. Рэшткі кумпяка, рулька. *З каралём варылі капусту.*

**КАРЫ**

1. Карычневы (пра колер вачэй). *Карыя вочы.*

2. Сані, прызначаныя для перавозкі бярвенняў, грузаў; вялікія калёсы. *Запрог каня ў кары.*

**КАРЫЦА**

1. Кара, паверхневая частка дрэў. *З ліпы дзяруць карыцу.*

2. Духмяная прыправа, зробленая з кары і галінак карычных дрэў. *Карыцу дабаўляюць у пірагі.*

**КАРЭЛЫ**

1. Жыхары Карэліі. *Карэлы належаць да угра-фінскай групы.*

2. Каравы, брудны. *Карэлы капялюш. Карэлае адзенне.*

**КАСА**

1. Від прычоскі. *Заплесці валасы ў касу; русая каса.*

2. Сельскагаспадарчая прылада для зразання травы, збожжа і інш. *Вострая каса.*

3. Мыс, доўгая вузкая мель. *Пясчаная каса.*

4. Селязёнка. *Баліць каса.*

**КАСАТКА**

1. Вясковая ластаўка. *Касаткі прылятаюць у красавіку.*

2. Буйная драпежная млекакормячая жывёліна. *Касатка падобная да кіта, але гэта родзіч дэльфінаў.*

**КАСАЧ**

1. Травяністая расліна. *Касач расце з доўгімі мечападобнымі лістамі.*

2. Цецярук-самец. *Паляванне на касачоў.*

**КАСЯК**

1. Вушак. *Дзвярны касяк.*

2. Гурт, чарада. *Жураўліны касяк, касяк рыбы.*

**КАТОК**

1. (ад *каціць, катаць*). Пляцоўка, пакрытая лёдам, для катання на каньках. *Катацца на катку.*

2. Невялікі кот. *Каток ласкавы быў.*

3. Каташок, суквецце (на вярбе, бярозе, лазе). *Каткі на вярбе.*

**КАЎЧЭГ**

1. Судна, на якім, згодна з біблейскім паданнем, выратаваўся Ной ад сусветнага патопу. *Вялізны каўчэг.*

2. Скрынка, скарбонка. *Каштоўнасці захоўваліся ў каўчэгу.*

**КАЦІЦЦА**

1. Верцячыся, рухацца ў адным напрамку. *Клубок каціўся па падлозе.*

2. Нараджаць дзіцянят (пра некаторых жывёл). *Вясной будзе каціцца авечка, каза.*

**КАЧАЛКА**

1. Разнавіднасць крэсла. *Качацца ў качалцы.*

2. Прылада для качання бялізны ці раскачвання цеста. *Качалкай разгладжвалі бялізну.*

**КАШТАВАЦЬ**

1. Мець пэўную цану. *Сукенка каштуе даволі танна.*

2. Спрабаваць ежу. *Каштаваць суп, булён.*

**КАЮК**

1. Пагібель, смерць. *Каюк надышоў суседу.*

2. Лёгкая спартыўная лодка; таксама невялікае прамысловае судна ў народаў Крайняй Поўначы. *Веславы, парусны каюк.*

**КВАТЭРКА**

1. Невялікая кватэра. *Утульная кватэрка.*

2. Мера вадкіх або сыпучых рэчываў. *Кватэрка раўнялася чацвёртай частцы кварты.*

3. Фортачка; адтуліна ў коміне. *Адкрыць кватэрку.*

**КВЕТАЧНІЦА**

1. Хто вырабляе, вырошчвае і прадае кветкі. *Маладая кветачніца.*

2. Разнавіднасць мухі. *Кветачніца наносіць шкоду сельскагаспадарчым раслінам.*

**КІТ**

1. Марская млекакормячая жывёліна. *Кіт падобны да гіганцкай рыбіны.*

2. Вязкае рэчыва, падобнае да пластыліну. *Кітам замазваюць шчыліны паміж шыбай і рамай.*

**КЛЁК**

1. Розум, развага; жыццёвая сіла. *Хлопец хоць і малады, а клёку мае многа.*

2. Цурка. *Выразаць клёк для гульні.*

**КЛУБ**

1. Арганізацыя пэўнай сацыяльнай групы людзей; культурна-асветная ўстанова. *Сельскі клуб.*

2. Лятучая маса пылу, дыму, пары. *Клуб туману, пылу.*

3. Тазасцегнавы сустаў, частка бядра. *Баліць клуб.*

**КЛЮЧ**

1. Прылада для замыкання і адмыкання замка. *Зачыніць дзверы на ключ.*

2. Крыніца. *Ключ б'е з-пад зямлі.*

**КНІГА**

1. Друкаванае выданне. *Змест кнігі; прачытаць кнігу.*

2. Кнігаўка. *Кніга жыве на балотах і вільготных лугах.*

**КОКА**

1. Яйка. *З'есці кока.*

2. Трапічная расліна, какаінавы куст. *З кокі дабываюць какаін.*

**КОМА**

1. Цяжкі хваравіты стан. *Пры коме парушаюцца кровазварот і дыханне.*

2. Інтэрвал паміж двума гукамі. *Кома меншая за адну восьмую тона.*

**КОНІК**

1. Невялікі конь. *Запрэгчы коніка; ехаць на коніку.*

2. Насякомае. *Конік скача і стракоча крыламі.*

3. Птушка. *Конік падобны да сітаўкі.*

**КОРКАВЫ**

1. (параўн. корак). Які мае дачыненне да корка. *Коркавая пракладка, падэшва.*

2. (параўн. кара). Які мае дачыненне да кары галаўнога мозга. *Коркавае рэчыва; коркавы слой.*

**КОРТ**

1. Разнавіднасць тканіны. *Корт цёмнага колеру.*

2. Спартыўная тэнісная пляцоўка. *Спартыўныя корты.*

**КОСКА**

1. Каса, якой касяць траву. *Вострая коска.*

2. Невялікая каса. *Заплятаць валасы ў коскі.*

3. Знак прыпынку. *Коска ставіцца пры аднародных членах сказу.*

**КОСНЫ**

1. Адсталы, неўспрымальны да новага. *Косны розум.*

2. Касцявы. *Косны клей; косная хвароба.*

**КОЦІК**

1. Кот; марская жывёліна з каштоўным футрам. *Каўнер з коціка.*

2. Суквецце. *На вербах зацвілі коцікі.*

**КРАЙ**

1. Канечная лінія; вобласць, мясцовасць. *Край стала, ложка; бацькоўскі край.*

2. Каля, ускрай. *Край лесу цякла рака.*

**КРАН**

1. Прыстасаванне для выпускання вадкасцей або газу. *Водаправодны кран.*

2. Механізм для захопу, пад'ёму і перамяшчэння цяжкіх грузаў. *Пад'ёмны кран.*

**КРОНА**

1. Грашовая адзінка. *Шведская крона*

2. Верхняя галінастая частка дрэва. *Вялікія дубы з разгалістай кронай.*

**КРУК**

1. Вялікі цвік з загнутым тупым канцом, кароткі металічны прут, гак. *Убіць у сцяну крук.*

2. Крумкач, груган. *Крукі жывяцца пераважна падлай.*

**КРУПНІК**

1. Крупяны суп, крупеня. *Гарачы крупнік.*

2. Хмельны напітак з мёду, які раней ужываўся на Беларусі. *Мядовы крупнік.*

**КРУЧА**

1. Абрыў, круты бераг. *Дом стаяў над самай кручай.*

2. Вір. *На кручу заплываць небяспечна.*

**КРУЧОК**

1. Невялікі крук; рыбалоўны кручок. *Вязальны кручок.*

2. Мера гарэлкі. *Кручок раўняўся 250 грамам.*

3. Разнавіднасць авадня ці сляпня. *Кручкі кусаюць коней.*

**КРЫВАСМОК**

1. Разнавіднасць кажана. *Крывасмок жывіцца кроўю жывёл.*

2. Лекавая расліна. *Крывасмок належыць да сямейства ружакветных.*

**КРЫГА**

1. Ільдзіна. *Крыга плыве па рацэ.*

2. Рыбалоўная прылада. *Крыга мае выгляд двух палазоў з сеткамі.*

**КРЫЖАНКА**

1. Вадаплаўная птушка. *Крыжанка мае цёмна-бурае апярэнне.*

2. Астра. *Крыжанкі — познія кветкі.*

3. Пасцілка. *У крыжанцы носяць салому, траву.*

**КУКОЛЬ**

1. Травяністая расліна. *Куколь мае ядавітае насенне.*

2. Манаскі галаўны ўбор. *Куколь мае выгляд капюшона.*

**КУЛАК**

1. Кісць рукі са сціснутымі пальцамі. *Сціснуць кулакі.*

2. Багаты селянін-уласнік. *Заможны кулак.*

**КУЛІК**

1. Балотная птушка. *Кулік жыве на балотах.*

2. Сноп трасты льну, саломы. *Каноплі вязалі ў кулікі.*

3. Каробачка з кары для ягад. *Збіраць грыбы і ягады ў кулік.*

**КУЛОН**

1. Адзінка вымярэння колькасці электрычнасці. *Электрычны зарад вымяраецца ў кулонах.*

2. Жаночае упрыгожанне. *Залаты кулон*

**КУЛЬ**

1. Сноп выбранай няцёртай саломы. *Скласці салому ў кулі:*

2. Невялікі мяшок, пакунак. *Куль цукерак*

3. Задняя частка рыбалоўнай прылады. *У куль трапляе рыба.*

4. Мужчынская верхняя вопратка. *Куль прамога пакрою.*

**КУЛЯ**

1. Снарад. *Зарадзіць пісталет кулямі.*

2. Кавяла. *Выграбаць жар куляй.*

**КУПАЛЬНІК**

1. Высокая травяністая расліна. *Купальнік скарыстоўваецца ў медыцыне.*

2. Жаночы касцюм для купання. *Прыгожы купальнік.*

**КУПЮРА**

1. Скарачэнне ў тэксце. *Купюра ў музычным творы.*

2. Назва грошай, аблігацый і іншых каштоўных папер па іх намінальнай вартасці. *Сторублёвыя купюры.*

**КУРАЧКА**

1. Курыца. *Рабая курачка.*

2. Грыб. *Поўны кош курачак.*

3. Гарлачык. *Жоўтая курачка.*

**КУРС**

1. Напрамак руху, шлях. *Курс карабля, самалёта.*

2. Сістэматычнае выкладанне якой-небудзь дысцыпліны; навучальны год у пэўных установах; цыкл лячэбных працэдур; вартасць каштоўных папер. *Курс беларускай мовы, закончыць першы курс інстытута; курс лячэння; курс акцый павысіўся.*

## Л

**ЛАВА**

1. Лава для сядзення. *Шырокая лава; лавы вакол стала.*
2. Расплаўленая мінеральная маса, што вывяргаецца вулканам. *Патокі лавы.*
3. Баявы парадак конніцы. *Лава казакоў; атакаваць лавай.*
4. Падземная горная выпрацоўка. *У лаве здабываюцца карысныя выкапні.*
5. Вялікі аднастайны масіў чаго-небудзь. *Лава руні, жыта; лава ячменю, аўса, шырокая лава.*

**ЛАД**

1. Дзяржаўная (грамадская) сістэма; уклад жыцця; парадак, зладжанасць. *Лад жыцця.*
2. Катэгорыя дзеяслова, якой выражаюцца адносіны дзеяння да рэчаіснасці. *Абвесны; загадны лад.*

**ЛАДДЗЯ**

1. Вялікая лодка ў старажытных славян. *Парусная ладдзя; веславая ладдзя.*
2. Фігура ў шахматах, тура. *Ход ладдзёй.*

**ЛАЙКА**

1. Парода сабак. *Паляўнічая лайка.*
2. Разнавіднасць мяккай скуры. *Пальчаткі з лайкі.*

**ЛАПАЦЬ**

1. Плецены з лыка ці вяровак абутак. *Лыкавыя лапці; плесці лапці.*
2. Хапаць, мацаць. *Лапаць рукамі.*

**ЛАСКА**

1. Праяўленне любві і пяшчоты; спагада, міласць. *Матчына ласка.*
2. Невялікая жывёліна сямейства куніцавых. *Ласка — вёрткі звярок.*

**ЛАСТ**

1. Падобная да плаўніка канечнасць некаторых водных жывёл. *Ласты ў маржоў, марскіх чарапах, цюленяў.*
2. Мера вагі карабельнага грузу. *Карабельны груз у сто ластаў.*

**ЛАСЦІК**

1. Баваўняная бліскучая тканіна. *Ласцік ужываецца на падкладку.*
2. Гума, каўчук. *Сціраць напісанае ласцікам.*

**ЛАТА**

1. Латка. *Латы на штанах; паставіць лату.*
2. Дошка ці жэрдка для пакрыцця страхі. *Латы кладуцца ўпоперак.*

**ЛАЎКА**

1. Прыстасаванне для сядзення. *Шырокая лаўка; лаўка ў хаце, парку.*
2. Невялікі магазін. *Кніжная лаўка.*

**ЛЕГЕНДА**

1. Народнае паэтычнае паданне. *Старая легенда; сярэдневякоеыя легенды.*
2. Тлумачальны тэкст, а таксама ўмоўныя знакі да карты, плана. *Скласці легенду да карты.*

**ЛЕЗГІНКА**

1. Прадстаўніца народа, які жыве на Каўказе. *Прыгожая лезгінка.*
2. Народны танец лезгін. *Лезгінка — каўказскі танец.*

**ЛЕЙКА**

1. Сасуд у выглядзе вядра з вузкай трубкай. *Паліваць кветкі лейкай; садовая лейка.*
2. Разнавіднасць фотаапарата. *Лейка — вузкаплёначны фотаапарат.*

**ЛЕЎ**

1. Буйны драпежнік. *Рык льва; магутны леў.*
2. Грашовая адзінка ў Балгарыі. *Купіць кнігу за два левы.*

**ЛЁС**

1. Збег падзей, абставін, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека. *Лёс брата.*

2. Рыхлая парода, жаўтазём *Лёс мае светла-жоўты колер*

**ЛІВЕР**

1. Прадукт харчавання з вантробаў. *Пірог з ліверам.*

2. Прыбор для набірання вадкасці, сіфон. *Лівер мае выгляд трубкі з расшырэннем пасярэдзіне.*

**ЛІГА**

1. Аб'яднанне (арганізацый, дзяржаў) *Ліга нацый.*

2. Музычны знак. *Ліга — дуга над нотамі.*

3. Кваліфікацыйная катэгорыя ў ігравых відах спорту. *Вышэйшая ліга.*

**ЛІК**

1. Колькасць, велічыня; лічэнне; граматычная катэгорыя, што выражае адзінкавасць и множнасць. *Складаны лік.*

2. Твар, знешні абрыс. *Прыгожы лік; лік іконы.*

**ЛІНЕЙКА**

1. Прамая лінія; планка для вычэрчвання такой лініі. *Сшытак у лінейку.*

2. Мнагамесны экіпаж. *Рысорная лінейка.*

**ЛІНЬ**

1. Прэснаводная рыба. *Ліня тут зловіш рэдка.*

2. Тонкі моцны канат *Завязаць на лінь.*

**ЛІПА**

1. Дрэва *Высокая ліпа.*

2. Фальш, падман. *Падсунуць ліпу замест сапраўднага дакумента.*

**ЛІРА**

1. Старажытны музычны інструмент. *Ліра падобна да скрыпкі, але з клавішамі і корбай.*

2. Грашовая адзінка ў Італіі, Турцыі. *Сто лір.*

**ЛІСІЦА**

1. Ліса. *Рыжая лісіца.*

2. Грыб. *Збіраць лісіцы; жоўтыя лісіцы.*

3. Палена ў санях, якое выкарыстоўваецца для перавозкі бярвення. *На лісіцу кладуць бервяно.*

**ЛІСТ**

1. Ліст дрэва, расліны *Дубовы ліст, асенні, жоўты ліст.*

2. Тонкі пласт якога-небудзь матэрыялу, пісьмо; пэўны дакумент. *Ліст паперы; вырваць ліст са сшытка; атрымаць ліст.*

**ЛІХІ**

1. Нядобры, дрэнны. *Ліхі сабака; ліхі сусед; ліхі лёс.*

2. Смелы, храбры. *Ліхі камандзір; ліхі эскадрон.*

**ЛОЖА**

1. Месца каля сцяны ў глядзельнай зале. *Ложа другога яруса; заняць месца ў ложы.*

2. Драўляная частка аўтамата (ружжа). *Узяцца за ложу.*

3. Рэчышча. *Ложа ракі; ложа ручая.*

**ЛОМ**

1. Завостраны металічны прут. *Разбіваць лёд ломам.*

2. Ломаныя металічныя прадметы, ламачча. *Жалезны лом; згрузіць у кучу лом.*

**ЛОХ**

1. Дзікая масліна. *Лох з серабрыстымі лістамі і духмянымі кветкамі.*

2. Самец сёмгі (у перыяд нерасту). *Вялізны лох.*

**ЛУГ**

1. Сенажаць. *Заліўны луг; каровы пасуцца на лузе.*

2. Едкі раствор, шчолак. *Лугам мылі бялізну.*

**ЛЮКС**

1. Адзінка вымярэння асветленасці. *Асветленасць 50 люксаў.*

2. Штосьці асабліва раскошнае, дарагое. *Каюта-люкс; купэ-люкс.*

**ЛЮЛЬКА**

1. Калыска. *Калыхаць дзіця ў люльцы.*

2. Трубка для курэння. *Курыць люльку; насыпаць тытуню ў люльку.*

**ЛЮСТРА**

1. Падвесны асвятляльны прыбор. *Купіць новую люстру.*

2. Люстэрка. *Разбіць люстра.*

**ЛЮТЫ**

1. Злы, жорсткі *Люты звер; люты чалавек.*

2. Другі месяц года. *У лютым пачынаюцца студэнцкія канікулы.*

**ЛЯБЁДКА**

1. Самка лебедзя. *Па возеры плывуць лебедзь і лябёдка.*

2. Механічная прылада, з дапамогаю якой падымаюць і перамяшчаюць грузы. *Лябёдка служыць для падымання грузаў.*

## М

**МАКРЭЦ**

1. Мокры лішай на нагах у жывёлы. *Макрэц у каня, у каровы.*

2. Пустазелле, макрыца. *Макрэц уецца ўюном па зямлі; макрэц расце ў гародзе.*

**МАЛІНАЎКА**

1. Невялікая пеўчая птушка. *Малінаўка падобна да дразда.*

2. Яблыня і яе плод. *Смачныя малінаўкі.*

**МАЛОЧНІК**

1. Збанок для малака. *Малочнік без ручкі.*

2. Малачай. *Малочнік жоўтым цветам цвіце, малочнік горкі расце на гародах і на полі.*

**МАЛЯЎКА**

1. Маленькая рыба, малёк. *Рыбу ловяць на маляўку.*

2. (ад *малявацъ*). Каляровы аловак *Малявацъ маляўкамі.*

**МАНДАРЫН**

1. Цытрусавае дрэва і яго плод. *Маленькае дрэва мандарына; спелыя мандарыны.*

2. Дзяржаўны чыноўнік у феадальным Кітаі *Загад мандарына; стары мандарын,*

**МАРКА**

1. Знак аплаты паштовых і іншых збораў; кляймо, знак фірмы; гатунак вырабу. *Альбом з маркамі.*

2. Грашовая адзінка ў некаторых краінах *Фінская марка.*

**МАРШ**

1. Спосаб рытмічнай хадзьбы ў страі; музычны твор; частка лесвіцы паміж лесвічнымі пляцоўкамі. *Урачысты марш; выконваць марш, лесвічны марш.*

2. Каманда для пачатку руху ў страі. *Каманда — шагам марш; марш дадому!*

**МАРЭНА**

1. Скапленне абломкаў пры перамяшчэнні ледніка *Марэна ад ледніка.*

2. Травяністая расліна. *З кораня марэны атрымліваюць чырвоную фарбу.*

**МАСЛЕНІЦА**

1. Пасудзіна для масла. *Масленіца з накрыўкай.*

2. Свята провадаў зімы. *Святкаваць масленіцу.*

**МАТ**

1. Пройгрышнае становішча ў шахматнай гульні. *Мат у пяць хадоў; аб'явіць мат.*

2. Брыдкая лаянка. *Сварыцца матам.*

**МАХАВІК**

1. Махавое кола. *Махавік забяспечвае раўнамерны рух механізма; махавік з вобадам.*

2. Грыб. *Махавікі растуць там, дзе мох.*

**МАХАВЫ**

1. (ад *мах*). Які мае дачыненне да махання. *Махавы рухавік; махавое кола.*

2. (ад *мох*). Мохавы. *Махавая паляна, купіна.*

**МАЧАЛЬНЫ**

1. (ад *мачала*). Зроблены з мачалы. *Мачальная вяроўка, рагожа.*

2. (ад *мачаць*). Які выраблены шляхам мачання ці служыць для выпуску такіх вырабаў. *Мачальная машына.*

**МЕДЫУМ**

1. Пасрэднік паміж людзьмі і духамі (па ўяўленні спірытаў). *Медыум — пасрэднік паміж памёршымі і жывымі.*

2. Сярэдні рэгістр пеўчага голасу спявачкі. *Медыум — рэгістр жаночага голасу.*

**МЕМАРЫЯЛ**

1. Кніга для запісаў. *Запісы ў мемарыяле*
2. Скульптурнае мемарыяльнае збудаванне-помнік. *Мемарыял «Брэсцкая крэпасць-герой»*

**МЕСЯЧНІК**

1. Адрэзак часу, роўны аднаму месяцу і прызначаны для правядзення пэўных грамадскіх мерапрыемстваў. *Месячнік беларуска-індыйскай дружбы, месячнік дзіцячай кнігі.*
2. Прыгонны селянін, што атрымаў месячыну. *Месячнікаў было нямнога.*

**МЕТАДЫСТ**

1. Спецыяліст па методыцы выкладання. *Метадыст па матэматыцы.*
2. Прыхільнік метадызму. *Метадыст амерыканскай царквы; метадыст секты.*

**МЕТР**

1. Адзінка даўжыні; лінейка такой даўжыні. *Даўжыня сто метраў; металічны метр; два метры тканіны.*
2. Памер у вершаскладанні. *Метр — паўтарэнне ўнутры вершаванага радка націскных і ненаціскных складоў.*

**МЕТРЫКА**

1. Вучэнне аб вершаваных памерах. *Вывучаць метрыку; метрыка купалаўскага верша.*
2. Пасведчанне аб нараджэнні. *Выпісаць метрыку.*

**МЕХ**

1. Мяшок. *Палатняны мех; пашыць мех; мех на два пуды.*
2. Прыстасаванне для нагнятання паветра. *Кавальскі мех; мех гармоніка, баяна.*

**МІНА**

1. Снарад з выбуховым рэчывам. *Супрацьтанкавыя міны.*
2. Выраз твару. *Насмешлівая міна; сур'ёзная міна.*

**МІНЬЁН**

1. Дробны друкарскі шрыфт. *Міньён роўны сямі пунктам.*
2. Бальны танец. *Танцаваць міньён; міньён падобны да вальса.*

**МІР**

1. Спакой, цішыня; згода; адсутнасць вайны і варожасці. *Барацьба за мір.*
2. Сельская грамада. *Важныя пытанні вырашалі ўсім мірам.*

**МОЛЬ**

1. Маленькі матылёк. *Пакаёвая моль.*
2. Сплаўны лес. *Моль — рассыпны лес, не звязаны ў плыт.*
3. Колькасць грамаў хімічнага рэчыва. *Моль роўны малекулярнай масе рэчыва.*

**МОРГ**

1. Трупярня. *Адвезці забітага ў морг.*
2. Адзінкавае кароткае марганне. *Маці хлопцу морг, і ўсміхнулася немаўлятка.*
3. Зямельная мера, што існавала раней. *Пасеялі грэчкі са два маргі.*

**МУЛ**

1. Свойская жывёліна. *Мул — помесь кабылы і асла.*
2. Іл. *Многа мулу ў рацэ; мул змешаны з глінай.*

**МУЛЬТАН**

1. Баваўняная тканіна. *Купіць мультану на сукенку.*
2. Гатунак тытуню. *Курыць мультан.*

**МУМІЯ**

1. Забальзаміраваны труп. *Егіпецкія мумія.*
2. Мінеральная фарба. *Чырвоная мумія.*

**МУШКА**

1. Муха. *Мушка села на стол.*
2. Выступ на ствале ў агнястрэльнай зброі, які служыць для прыцэльваяня. *Мушка пісталета, ружжа.*

**МЫЗА**

1. Сядзіба, хутар (пераважна ў Прыбалтыцы). *Жыць на мызе.*
2. Морда, пыса. *Мыза ў каровы.*

**МЫТНІК**

1. Служачы таможні (мытніцы). *Мытнікі працавалі на таможні.*
2. Расліна ўвярэднік. *Мытнік — аднагадовая расліна.*

**МЯТЛІК**

1. Расліна метлюжок. *Мятлік належыць да сямейства злакавых*
2. Матылёк. *Прыгожы мятлік, злавіць мятліка.*
3. Палатно. *Спадніца з мятліку.*

# Н

**НАВЕЛА**

1. Невялікая аповесць. *Чытаць навелы.*
2. Дадатак да закону. *Навела дапаўняе дзеючыя кодэксы.*

**НАГАЙКА**

1. Прадстаўніца цюркскага народа, які пражывае ў Стаўрапальскім краі і Дагестанскай АССР. *Маладая нагайка.*
2. Кароткі бізун. *Ударыць нагайкай.*

**НАДТАЧЫЦЬ**

1. Крыху стачыць (на станку, тачыле). *Надтачыць сякеру, пілу.*
2. Крыху праесці. *Шашаль надтачыў бярвенне.*
3. Зрабіць даўжэйшым. *Надтачыць мяшок.*

**НАДУШЫЦЬ**

1. Расціснуць (аб пэўнай колькасці чаго-небудзь). *Надушыць сліў, яблыкаў.*
2. Апырскаць духамі. *Надушыць насоўку.*

**НАМЁТКА**

1. Папярэдне намечаны план. *Намётка яго не ажыццявілася.*
2. Фастрыга. *Намётка блузкі, рубашкі; зрабіць намёткі.*
3. Галаўны ўбор жанчыны. *Жанчына ў намётцы.*

**НАРЫВАЦЬ**

1. Рваць пэўную колькасць. *Нарываць многа яблыкаў, паперы.*
2. Апухаць і нагнойвацца. *Палец нарывае.*
3. (ад *рыць*). Рыць зямлю (у пэўнай колькасці). *Свінні нарываюць ямы.*

**НАСАДЗІЦЬ**

1. Пасадзіць (у вялікай колькасці). *Насадзіць дрэў, саджанцаў.*
2. Надзець, шчыльна ўзбіць. *Насадзіць касу на кассе, насадзіць сякеру.*

**НАСТУПАЦЬ**

1. Станавіцца на што-небудзь ці каго-небудзь; весці наступленне. *Наступаць на нагу; наступаць на ворага.*
2. Надыходзіць. *Наступае вясна, восень.*

**НАТАЦЫЯ**

1. Настаўленне, павучанне. *Чытаць натацыю*
2. Сістэма ўмоўных пісьмовых абазначэнняў, памет. *Музычная, шахматная натацыя.*

**НЕГАТЫЎНЫ**

1. Які мае дачыненне да негатыва. *Негатыўная плёнка.*
2. Адмоўны. *Негатыўны адказ.*

**НЕКАЛІ**

1. Няма калі. *Некалі займацца спортам.*
2. Калісьці, даўно. *Некалі і бацька быў маладым.*

**НЕМЕЦ**

1. Прадстаўнік насельніцтва Германіі. *Дэлегацыя немцаў.*
2. (ад *нямы*). Нямы чалавек. *Сусед наш немец.*

**НЕФРЫТ**

1. Запаленне нырак. *Захварэць на нефрыт.*
2. Мінерал, які выкарыстоўваецца для вырабу ўпрыгожанняў. *Зялёны нефрыт.*

**НІЗКА**

1. Аднародныя прадметы, нанізаныя на дрот, нітку. *Нізка грыбоў, пацерак.*
2. Невысока; подла, ганебна. *Птушаня ўзляцела нізка, сябар паступіў вельмі нізка.*

**НІТ**

1. Металічны стрыжань. *Ніт мае разьбу, на якую накручваецца гайка.*
2. Злучэнне ніцяных петляў у ткацкім станку. *Ніт служыць для падымання нітак асновы.*

**НІЧОГА**

1. Нішто. *Нічога не купіла ў магазіне.*
2. Нядрэнна. *Выступленне было нічога, заслугоўвае увагі.*

**НОЖНЫ**

1. Футарал *Ножны для шаблі, кінжала.*

2. Вялікія нажніцы. *Рэзаць галіны ножнамі.*

**НОРКА**

1. Невялікая нара. *Норка лісы; тхарыная норка.*

2. Пушны звярок сямейства куніцавых. *У норкі каштоўнае футра*

**НОТА**

1. Графічны знак для запісу гукаў музыкі. *Басовая нота; нота «фа».*

2. Афіцыяльны дыпламатычны зварот урада адной дзяржавы да другой. *Нота пратэсту*

## О

**ОРДЭН**

1. Знак узнагароды. *Ветэран узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».*

2. Манаскае таварыства каталіцкай царквы. *Кожны ордэн мае свой статут; ордэн рыцараў-крыжаносцаў.*

3. Парадак спалучэння архітэктурных канструкцый. *Класічны грэчаскі ордэн пабудовы.*

**ОРДЭР**

1. Дакумент-распараджэнне на атрыманне ці выдачу чаго-небудзь. *Атрымаць ордэр на кватэру.*

2. Парадак размяшчэння частак архітэктурных канструкцый. *Класічны ордэр.*

## П

**ПАВЕРХ**

1. Частка будынка. *Дом у пяць паверхаў.*

2. Зверху. *Кашулю выпусціць паверх.*

3. Выражае прасторавыя адносіны. *Паверх коўдры ляжалі цацкі.*

**ПАВІТУХА**

1. Жанчына, звычайна вясковая, якая дапамагае прыняць дзіця пры родах у хатніх умовах. *Бабка-павітуха.*

2. Пустазелле. *Сцябло павітухі абвіваецца вакол іншых раслін і высмоктвае з іх сокі.*

**ПАВОЙНІК**

1. Расліна сямейства казяльцовых. *Каля плота разросся павойнік*

2. Жгут з тонкіх галін. *Павойнікам змацоўваюць бярвёны плыта.*

3. Намітка. *Павойнік — галаўны ўбор жанчыны.*

**ПАГАНЯЦЬ**

1. Прымушаць рухацца хутчэй. *Паганяць каня.*

2. Акучыць прапашныя культуры. *Паганяць бульбу.*

**ПАГОН**

1. Дарога для прагону жывёлы на папас. *Гнаць кароў па пагоне.*

2. Наплечны знак адрознення. *Афіцэрскія пагоны.*

**ПАДАРОЖНІК**

1. Вандроўнік; хто знаходзіцца ў дарозе. *У хату зайшоў падарожнік.*

2. Трыпутнік. *Двор зарос падарожнікам.*

3. Грыб, апенька. *Назбіраць многа падарожнікаў.*

**ПАДВЕЙ**

1. Балотная расліна. *Насенне падвею мае белыя валаскі.*

2. Злы дух; хвароба. *Падвей прыносіць разбурэнні і хваробы.*

**ПАДВОДКА**

1. Падключэнне, падвядзенне. *Падводка электрычнага току.*

2. Падгалосак. *Спеў хору суправаджае падводка.*

**ПАДВОДНЫ**

1. (ад вада). Які мае дачыненне да вады. *Падводнае плаванне, паляванне; падводная лодка.*

2. (ад падвода). Які мае дачыненне да падводы (воза). *Падводная аглобля.*

**ПАДРАД**

1. Абавязацельства пэўнага характару; работа. *Падрад гарантуе плату за выкананую работу.*

2. Запар. *Падрад прачытаць тры лекцыі*

**ПАДРУЧНІК**

1. Кніга для навучання. *Падручнік па беларускай мове.*

2. Прылада на станку. *Падручнік для апоры такарнага інструмента*

**ПАДРЭЗ**

1. Жалезная палоска ў полазе *Падрэз у санях.*

2. Падрэзванне. *Зрабіць падрэз дрэва.*

**ПАДСАЧЫЦЬ**

1. Высочваючы, штосьці даведацца, убачыць *Падсачыць за старшынёй.*

2. Зрабіць надрэз на дрэве з мэтай атрымання соку, смалы. *Падсачыць сасну.*

**ПАДСТАВА**

1. Прычына, абставіны, якія робяць зразумелымі ўчынкі, паводзіны каго-небудзь. *Ён мае падставу застацца на гэтай пасадзе.*

2. Зменныя коні ў дарозе. *Запрэгчы падставу.*

**ПАЗІТЫЎНЫ**

1. Дадатны; акрэслены. *Пазітыўная праграма; пазітыўная думка.*

2. Які мае адносіны да пазітыва. *Пазітыўныя фотаматэрыялы.*

**ПАЙКА**

1. (ад паяць). Паянне. *Пайка вядра, электрычная пайка.*

2. Пэўная доля ежы. *Хлебная пайка, пайка цукру,*

3. Шчасце, удача. *Пайка сама не прыходзіць.*

**ПАК**

1. Стос (вязка) пэўных прадметаў. *Пак часопісаў, кніг.*

2. Шматгадовы дрэйфуючы лёд. *Пак сустракаецца ў палярных водах.*

**ПАКОЙ**

1. Памяшканне ў кватэры, доме. *Невялічкі пакой.*

2. Спакой. *На вуліцы пакой і цішыня*

**ПАКОЎКА**

1. (параўн. *пакаваць, пак*) Упакоўка. *Пакоўка рэчаў у чамаданы.*

2. *тэхн.* (параўн. *каваць*). Кавалак металу, апрацаваны кованнем ці штампоўкай. *Стальная пакоўка.*

**ПАЛАВЫ**

1. Які мае дачыненне да полу. *Палавое выхаванне.*

2. Бледна-жоўты, бляклы *Палавы колер жыта.*

**ПАЛАЦЬ**

1. Ярка гарэць, свяціцца. *Палае вялізны агонь.*

2. Ачышчаць зерне ад мякіны і пылу. *Палаюць зерне пры дапамозе маленькіх начовачак.*

**ПАЛЕВЫ**

1. Бледна-жоўты (з ружовым адценнем). *Палевая спадніца.*

2. Які мае адносіны да палі. *Палевая перакладзіна, апора.*

**ПАЛЕННЕ**

1. (ад *паліць*). Спальванне; распальванне. *Паленне непатрэбных папер; паленне печы.*

2. (ад *палена*). Палены (дроў). *Прынесці бярэма палення.*

**ПАЛОВА**

1. Палавіна чаго-небудзь. *Прайсці палову дарогі.*

2. Мякіна. *Палова застаецца пры абмалоце збожжа.*

**ПАЛОЙКА**

1. Жменя ачэсанага ці атрапанага льну. *Палойка льну.*

2. Невялікая рэчка, якая цячэ праз балота. *Палойка цячэ адразу за вёскай.*

**ПАНАМА**

1. Шыракаполы капялюш. *Надзець панаму; жанчына ў белай панаме.*

2. Махлярства з подкупам вышэйшых службовых асоб. *Выкрыта буйная панама.*

**ПАПЛАВОК**

1. Частка вуды. *Назіраць за паплаўком.*

2. Невялікі поплаў. *Рэчка заліла паплавок.*

**ПАРА**

1. Два якія-небудзь аднолькавыя прадметы. *Пара рукавіц; пара ботаў; дзве пары штаноў.*

2. Газ, што ўтвараецца пры выпарэнні вады. *З чайніка клубіцца пара; пара ідзе ад зваранай бульбы*

**ПАРКА**

1. (ад парыць). Паранне. *Парка малака, парка бочкі*

2. Парна. *На вуліцы парка*

3. Пара. *Дзве паркі коней*

**ПАРЭЗ**

1. Парэзанае месца, рана. *Парэз на руцэ; парэз ад нажа*

2. Частковы параліч. *Пры парэзе аслабляецца актыўная здольнасць мышцаў.*

3. Крываўнік. *Парэз — лекавая трава.*

**ПАС**

1. Перадача мяча, шайбы аднаму з ігракоў сваей каманды. *Недакладны пас.*

2. Пасак. *Шырокі пас; скураны пас.*

3. Вокліч аб адмове ўдзельнічаць у розыгрышы (пры гульні ў карты). *«Пас», — ціха прагаварыў ігрок.*

**ПАСАЖ**

1. Крытая галерэя з гандлёвымі памяшканнямі. *Пасаж з моднымі магазінамі; працаваць у пасажы.*

2. Частка музычнага твора з хуткім чаргаваннем высокіх і нізкіх нот. *Іграць пасаж; цяжкі пасаж.*

**ПАСПЯВАЦЬ**

1. Своечасова рабіць што-небудзь, не спазняцца. *Паспяваць на цягнік.*

2. Рабіцца спелым. *У верасні паспяваюць і позднія яблыкі.*

3. Спяваць пэўны час. *Паспяваць песні.*

**ПАСТА**

1. Цестападобная маса. *Зубная паста.*

2. Пасьба. *Паста кароў.*

**ПАСТАЎ**

1. Пара млынавых камянёў. *У паставе адзін камень нерухомы, а другі круціцца на ім.*

2. Сувой. *Пастаў — кавалак палатна, скручаны ў трубку.*

**ПАСТВА**

1. Парафіяне. *Паства — гэта веруючыя адной царквы.*

2. Пасьба. *Паства кароў.*

**ПАСЦЕЛЬ**

1. Месца, дзе спяць, спальныя рэчы. *Устаць з пасцелі*

2. Рад снапоў, пакладзеных для абмалоту. *Пасцель малоцяць цэпам.*

3. Паслед. *Пасцель у парадзіхі выходзіць услед за плодам*

**ПАСЧЭСВАЦЬ**

1. Счасаць грэбнем (усё, многае). *Пасчэсваць пух з труса.*

2. Зняць слой дрэва ці каменя. *Пасчэсваць бярвенні.*

**ПАТ**

1. Становішча ў шахматнай гульні. *Пры паце нельга зрабіць чарговы ход, не падставіўшы пад удар свайго караля.*

2. Гатунак пасцілы. *Смачны пат.*

**ПАТРОН**

1. Гільза з капсулем, зарадам і куляй (шротам); трубка ці цыліндр для ўстаўлення чаго-небудзь. *Баявы патрон; уставіць лямпачку ў патрон.*

2. Асоба, якая брала пад сваю апеку бедных або нераўнапраўных грамадзян; гаспадар якой-небудзь фірмы, прадпрыемства; кіруючая асоба, шэф. *Патрон браў пад апеку збяднелых людзей.*

**ПАЎКАПЫ**

1. Палавіна капы. *Паўкапы сена, саломы.*

2. Палавіна даўнейшай адзінкі лічэння, капы. *Прадаць паўкапы агуркоў.*

**ПАЎНОЧНІК**

1. Жыхар Поўначы. *Паўночнікі прыехалі адпачываць на сонечны поўдзень.*

2. Хто не спіць да позняй ночы. *Паўночнік не кладзецца спаць да позняй ночы.*

**ПАХАВАЦЬ**

1. Схаваць (пра ўсіх, многіх). *Пахаваць запалкі ад дзяцей.*

2. Закапаць нябожчыка ў зямлю. *Пахавалі Якуба Коласа на Ваенных могілках у Мінску.*

**ПАЧАТАК**

1. Месца, момант, адкуль што-небудзь пачынаецца *Пачатак восені; пачатак лесу.*

2. Суквецце, катах. *Пачатак кукурузы*

3. Верацяно з пражай. *Два пачаткі пражы.*

**ПЕНКА**

1. Невялікая пена. *Малако з пенкай.*

2. Порысты вогнетрывалы матэрыял. *Пенка — лёгкі матэрыял.*

**ПЕРАГОН**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *пераганяць*. *Перагон авечак, кароў; доўгі перагон*

2. Абястлушчанае малако. *Перагон — малако без смятанкі*

**ПЕРАД**

1. Пярэдняя частка. *На сёмуху перад дома ўпрыгожваецца зяленінай*

2. Спераду; напярэдадні. *Стаяць перад акном, перад святам.*

**ПЕРАЛЁТ**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *пералятаць*. *Пералёт птушак.*

2. Кармавая і лекавая расліна. *Пералёт цвіце жоўтымі кветкамі.*

**ПЕРХАЦЬ**

1. Дробныя лусачкі рагавых клетак на скуры галавы. *Ад перхаці добра дапамагае настой крапівы.*

2. Кашляць ад перасыхання ў горле. *Лектар зрэдку перхаў і піў ваду са шклянкі.*

**ПЁРКА**

1. Разнавіднасць свердзела. *Пёрка прымяняецца ў сталярскай справе.*

2. Пяро; ліст расліны. *Пёрка страуса; перка цыбулі, часнаку.*

**ПІКА**

1. Разнавіднасць зброі. *Піка з вострым металічным наканечнікам; пракалоць пікай.*

2. Картачная масць. *На гэты раз іграку трапляліся адны пікі.*

**ПІКЕ**

1. Разнавіднасць тканіны. *Спадніца з піке.*

2. Пікіраванне. *Самалёт перайшоў у піке.*

**ПІКЕТ**

1. Застава. *Пікет на ўскрайку міннага поля.*

2. Пункт мясцовасці, што знаходзіцца на адпаведнай адлегласці ад другога пункта і пэўным чынам адзначаны пры нівеліраванні. *Пікет у сто метраў, прайсці трэці пікет.*

**ПІСТОЛЬ**

1. Старадаўняя іспанская манета. *Пістоль была распаўсюджана ў XVII стагоддзі на тэрыторыі многіх краін Еўропы*

2. Пісталет. *Зарадзіць пістоль*

**ПЛАКСА**

1. Той, хто часта плача. *Плакса плача без прычыны*

1. Плакун-трава. *Плакса выкарыстоўваецца ў медыцыне.*

**ПЛАМБІР**

1. Прыстасаванне для накладвання пломбы. *Паставіць пламбірам пломбу на дзверы.*

2. Разнавіднасць марожанага. *Пламбір — марожанае з арэхамі, ягадамі, шакаладам.*

**ПЛАСТЫК**

1. Пластычная маса. *Пластык — трывалы матэрыял.*

2. Мастак-скульптар. *Пластык стварае мастацкія вобразы ў форме фігур.*

**ПЛАЎКІ**

1. Цвёрды матэрыял, які плавіцца. *Плаўкія металы.*

2. Разнавіднасць мужчынскіх трусоў. *Плаўкі выкарыстоўваюцца, як правіла, пры плаванні.*

3. Расліна, жоўты плывунец. *Зацвілі плаўкі.*

**ПЛЁТКА**

1. Кароткі бізун. *Раменная, вяровачная плетка.*

2. Ілжывая чутка. *Пусціць плёткі.*

**ПЛІСКА**

1. Невялікая птушка. У *пліскі доўгі хвост.*

2. Істужка. *Шаўковая пліска.*

3. Лёстка ў драбіне воза. *Пліскі павыломваліся ў драбіне.*

**ПЛЮС**

1. Матэматычны знак у выглядзе крыжыка. *Тры плюс чатыры будзе сем.*

2. Кумач. *Плюс — тканіна ярка-чырвонага колеру.*

**ПЛЮШЧЫЦЬ**

**1.** Заплюшчваць. *Плюшчыць вочы ад яркага святла.*

**2.** Рабіць што-небудзь пляскатым, тонкім. *Плюшчыць метал*

**ПОВАД**

**1.** Вяроўка ці рамень аброці. *Весці за повад каня.*

**2.** Абставіны, якія могуць паслужыць асновай для чаго-небудзь. *Повад для сваркі.*

**ПОЛ**

**1.** Сукупнасць прыкмет, што адрозніваюць мужчынскую і жаночую асобіны. *Мужчынскі пол; жаночы пол.*

**2.** Палаткі, нары, падлога. *Пол прызначаўся для спання; вымыць пол.*

**ПОЛАЗ**

**1.** Частка саней. *Санны полаз.*

**2.** Неядавітая змяя. *Пятністы полаз; каўказскі полаз.*

**ПОЛІС**

**1.** Дакумент аб страхаванні. *Поліс аб страхаванні жыцця, маёмасці.*

**2.** Горад-дзяржава з асобай формай сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця. *Поліс — старажытны горад-дзяржава ў Грэцыі, Рыме.*

**ПОЛКА**

**1.** Кавалак тканіны. *Полка палатна; кашуля ў дзве полкі.*

**2.** Лаўка ў вагоне, лазні. *Спаць на полцы.*

**ПОЛЬКА**

**1.** Прадстаўніца асноўнага насельніцтва Польшчы. *Наша новая знаёмая — полька была вясёлая і прыгожая дзяўчына.*

**2.** Хуткі танец і музыка да яго. *«Полька» прыйшла з Польшчы, але палюбілася і прыжылася на Беларусі.*

**3.** Мужчынская стрыжка. *Пры польцы валасы падстрыгаюцца на скронях і злёгку на патыліцы.*

**ПОМПА**

**1.** Разнавіднасць насоса. *Сапсаваўся матор помпы.*

**2.** Паказная, хлуслівая пышнасць. *Пасяджэнні праходзілі з вялікай помпай.*

**ПОРТ**

**1.** Месца для стаянкі (пагрузкі, разгрузкі, рамонту) суднаў. *Марскі, рачны порт.*

**2.** Разнавіднасць тканіны. *Льняны, бавоўняны порт.*

**ПОСТ**

**1.** Месца для назірання; асоба ці атрад, пастаўленыя для аховы чаго-небудзь ці назірання *Праверка пастоў; баявы, узброены пост.*

**2.** Устрыманне ад скаромнай ежы. *Пост вызначаўся царкоўным календаром.*

**ПОСТАЦЬ**

**1.** Фігура. *Постаць яго знікла ў натоўпе.*

**2.** Палоска жыта, якую займае жняя. *Шырокая постаць; дзве доўгія постаці.*

**ПОЎДЗЕНЬ**

**1.** Адзін з чатырох напрамкаў свету; мясцовасць, размешчаная ў зоне з цёплым, гарачым кліматам. *Стрэлка компаса паказвае на поўдзень.*

**2.** Сярэдзіна дня. *Сонца летам моцна грэе ў поўдзень.*

**ПОЎНАЧ**

**1.** Адзін з чатырох напрамкаў свету, супрацьлеглы поўдню; мясцовасць, краіна з халодным кліматам. *Рухацца ў напрамку поўначы; жыць на поўначы.*

**1.** Сярэдзіна ночы. *Поўнач — гэта 12 гадзін ночы.*

**ПРАВАДНІК**

**1.** Хто паказвае дарогу ў незнаёмай мясцовасці; чыгуначны служачы. *Праваднік вагона.*

**2.** Рэчыва, якое добра прапускае праз сябе электрычны ток, гук, цяпло. *Жалеза — добры праваднік электрычнасці.*

**ПРАВЫ**

**1.** Размешчаны справа. *Правая рука; правы бераг ракі.*

**2.** Справядлівы, правільны. *Правы бой; правы чалавек.*

**ПРАКАТ**

**1.** Гарачая апрацоўка металу. *Пракат металу.*

2. Выдача чаго-небудзь у часовае карыстанне за пэўную плату. *Пракат музычных інструментаў; пункт пракату.*

**ПРАКАТАЦЬ**

1. Падвергнуць пракатцы. *Пракатаць жалеза.*

2. Пракаціць. *Пракатаць дзяцей на арэлях.*

**ПРАЛЁТ**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *пралятаць. Пралёт птушак; невысокі пралет самалёта.*

2. Праём; прагон; участак паміж якімі-небудзь двума пунктамі. *Аконны пралёт; мост на пяць пралётаў.*

**ПРАМАКАЦЬ**

1. Рабіцца наскрозь мокрым. *Ад дажджу прамок наскрозь.*

2. Асушваць тым, што ўбірае ў сябе вільгаць. *Прамакаць прамакальнай паперай, марляй.*

**ПРАМОВА**

1. Публічнае выступленне. *Узнёслая прамова дэпутата.*

2. Рэканструяваная, не засведчаная пісьмовымі помнікамі мова. *Індаеўрапейская прамова.*

**ПРАСАВАЦЬ**

1. (ад *прас*). Гладзіць прасам. *Прасаваць адзенне.*

2. (ад *прэс*). Апрацоўваць прэсам. *Прасаваць дэталі для станка.*

**ПРАСМАЛІЦЬ**

1. Пакрыць смалой. *Прасмаліць лодку, човен.*

2. Прапаліць чым-небудзь наскрозь. *Прасмаліць дзірку ў адзенні папяросай.*

**ПРАСПЕКТ**

1. Шырокая вуліца ў горадзе. *Праспект Скарыны ў Мінску.*

2. Падрабязны план, змест. *Праспект навукоеай кнігі, часопіса; турысцкі праспект.*

**ПРОЙМА**

1. Адтуліна, праход; выраз. *Пройма дзвярэй, пройма для рукава.*

2. Скразняк. *Проймай пацягнула ад акна да дзвярэй.*

**ПРУСАК**

1. Той, хто нарадзіўся або жыве ў Прусіі. *Прусакі жылі ля Балтыйскага мора.*

2. Рыжы таракан. *Патравілі ўсіх прусакоў*

**ПРЫВОД**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *прыводзіць. Прывод абвінавачанага, сведкі; прывод у міліцыю.*

2. Прылада, якой прыводзяць у рух механізмы, машыны. *Пнеўматычны прывод; ручны, электрычны прывод.*

**ПРЫГОН**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *прыганяць. Прыгон кароў у вёску вечарам.*

2. Грамадскі лад, заснаваны на прыгонным праве. *Пры прыгоне сяляне працавалі на памешчыка.*

**ПРЫЗ**

1. Узнагарода пераможцу. *Ганаровы прыз.*

2. Захопленыя ў марской вайне судны, маёмасць. *Ваенны прыз.*

**ПРЫПЁК**

1. Прыбаўка ў вазе хлеба пасля яго выпечкі. *Атрымаць трыста грамаў прыпёку на два кілаграмы мукі.*

2. Гарачыня, спякота. *Сядзеў на прыпёку, аж галава забалела.*

**ПРЫХОД**

1. Дзеянне паводле дзеяслова *прыходзіць. Прыход гасцей; прыход цягніка.*

2. Паступленне грошай, каштоўнасцей, адзначанае ў бухгалтарскіх кнігах. *Улічваць прыход і расход.*

3. Царкоўная арганізацыя. *Багаты прыход; царкоўны прыход.*

**ПУГА**

1. Тое, чым паганяюць жывёлу. *Доўгая пуга; раменная пуга.*

2. Маланка. *Бліснула на небе пуга.*

**ПУГАЧ**

1. Філін. *Пугач падобны да савы.*

2. Цацачны пісталет. *Пугач страляе пістонамі або коркам.*

**ПУД**

1. Руская мера вагі. *Пуд роўны сарака фунтам; два пуды жыта*
2. Спалох, перапуд. *Ад пуду хлопец панёсся дамоў.*

**ПУК**

1. Звязка, скрутак якіх-небудзь аднародных прадметаў, сцябло цыбулі з суквеццем. *Пук ільну, саломы. пук лазы; цыбуля пайшла ў пукі.*
2. Самая высокая, аддаленая частка. *Збегчы з самага пука гары.*

**ПУПОК**

1. Пуп. *Пупок у дзіцяці.*
2. Шматгадовая пахучая расліна. *Пупок мае галінастае сцябло і жоўтыя ці белыя кветкі.*

**ПУХ**

1. Вельмі тонкія мяккія валаскі на целе птушак. *Гусіны пух.*
2. Тупы канец яйка. *У яйка ёсць нос і пух.*

**ПУХОЎКА**

1. Пучок пушыстых валокнаў, што выкарыстоўваецца для пудрання. *Пудрыцца пухоўкай.*
2. Рагоз. *Пухоўка расце ля вады.*

**ПУШКА**

1. Гармата. *Стрэл з пушкі; грымяць пушкі.*
2. Каробка. *Пушка для гузікаў; у пушку складваліся пісьмы.*

**ПУШНЫ**

1. З каштоўным футрам. *Пушны звер.*
2. З прымессю мякіны. *Раней быў пушны хлеб.*

**ПЫЛЬНІК**

1. Верхняя частка тычынкі кветкі. *У пыльніку ўтвараецца пылок.*
2. Плашч ад пылу. *Апрануць пыльнік; дарожны пыльнік.*

**ПЫРХАЦЬ**

1. Лёгка пералятаць (з месца на месца). *Пырхаюць матылькі.*
2. Фыркаць. *Конь пырхае, пырхае вожык.*

**ПЯРЭСЦІЦЬ**

1. Рабіць пярэстым. *Яркія фарбы пярэсцяць у вачах.*
2. Моцна біць. *Цівун пярэсціў мужыка.*

**ПЯЧАТАЦЬ**

1. Рабіць фотаздымкі. *Учора пячатаў фатаграфіі.*
2. Клеймаваць. *Пячатаць новыя вырабы.*
3. Запаўняць (соты мёдам). *Пячатаць вулей.*

**ПЯЧКУР**

1. Невялікая рыбка. *Не ловіцца вялікая рыба, адны печкуры.*
2. Пячнік. *Новы пячкур быў удалым майстрам, умеў добра класці печы.*

**ПЯЧОНКА**

1. Печань. *Баліць пячонка.*
2. Печаная бульба. *Пячонка дужа смачная.*

## Р

**РАБАК**

1. Гліст. *Ад рабакоў піжма дапамагае.*
2. Спадніца. *Рабак — даматканая спадніца з порту.*

**РАБІННІК**

1. Зараснікі рабіны. *Малады рабіннік.*
2. Пеўчая птушка. *Рабіннік належыць да атрада драздоў.*

**РАГАВІК**

1. Шчыльная зярністая парода. *Рагавік бывае бурага і шэрага колеру.*
2. Палічка; вільчык. *Рагавік мае трохвугольную форму; пакласці на рагавік кніжку.*
3. Зуб мудрасці. *Рагавік вырастае ў сталым узросце.*

**РАГАВЫ**

1. Які належыць да рога. *Рагавыя адросткі.*
2. Вуглавы. *Пакойчык яго знаходзіцца ў рагавой частцы дома.*

**РАД**

1. Прадметы ці асобы, размешчаныя адзін за адным. *Рад дамоў; першы рад.*
2. Рады, задаволены. *Вельмі рад гэтаму спатканню.*

**РАДАВЫ**

1. Звычайны, просты; які не з'яўляецца камандзірам (пра ваеннаслужачых). *Радавы выпадак; радавыя байцы.*

2. (ад *рад, радок*). Звязаны з пасевам (пасадкай) радкамі. *Радавыя пасевы бульбы.*

**РАДОЎКА**

1. Чарга. *Радоўка пасвіць кароў.*

2. Грыб. *У лесе зараз адны радоўкі, іншых грыбоў амаль няма.*

**РАЗАК**

1. Прылада для рэзання (сякач, сякера, нажоўка). *Разаком рэзалі сечку.*

2. Вадзяная расліна. *Разак — рачная трава, падобная да альясу.*

**РАЗРАД**

1. Асобы, прадметы ці з'явы, якія адрозніваюцца ад іншых якімі-небудзь агульнымі прыкметамі; ступень кваліфікацыі. *Слесар другога разраду; спартыўны разрад.*

2. Дзеянне паводле дзеяслова *разраджаць*; страта электрычнасці якім-небудзь целам. *Разрад гарматы, пушкі; электрычны разрад.*

**РАК**

1. Прэснаводная жывёліна, пакрытая панцырам. *Лавіць ракаў; у рэчцы водзіцца многа ракаў.*

2. Злаякасная пухліна; хвароба раслін. *Рак страўніка; рак бульбы.*

3. Шпянек у млыне. *Жалезны ці драўляны рак у жорнах.*

**РАМОНТ**

1. Ліквідацыя пашкоджанняў, паломак. *Капітальны рамонт; рамонт абутку.*

2. Папаўненне табуна (статка) маладняком. *Рамонт часцей за ўсё рабілі ў кавалерыі.*

**РАНА**

1. Пашкоджанне тканак жывога арганізма. *Цяжкая рана.*

2. Раніцай; раней устаноўленага часу. *Уставаць рана.*

**РАНДО**

1. Вершаваная форма з паўтарэннем у страфе адных і тых жа радкоў. *Рандо звычайна складаецца з трынаццаці строф.*

2. Асобы, закруглены шрыфт. *Рукапіснае і друкаванае рандо.*

**РАСА**

1. Гістарычная група людзей, якая жыве на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца некаторымі спадчыннымі асаблівасцямі. *Расы адрозніваюцца пэўнай будовай цела, формай валасоў, пігментацыяй скуры.*

2. Доўгае адзенне з шырокімі рукавамі, якое носіць праваслаўнае духавенства. *Шаўковая раса.*

**РАСПАСОЎКА**

1. Некалькі перадач мяча паміж членамі спартыўнай каманды. *Дрэнная распасоўка.*

2. Адмаўленне ад гульні ў карты і аб'яўленне паса. *Трэцяя распасоўка за вечар.*

**РАЦЫЯ**

1. Радыёстанцыя (перастаўная, пераносная). *Настройваць рацыю.*

2. Падстава, аснова. *Ён мае рацыю.*

**РОГ**

1. Касцёвы нарост на галаве некаторых жывёл; музычны (сігнальны) інструмент. *Ласіны рог; падаць сігнал рогам.*

2. Вугал чаго-небудзь, месца перакрыжавання дарог. *Рог стала, крэсла, ложка; рог вуліцы.*

**РОДАВЫ**

1. Які мае дачыненне да роду, перадаецца з пакалення ў пакаленне. *Родавы лад.*

2. Які мае адносіны да граматычнай катэгорыі роду. *Канчатак з'яўляецца асноўнай родавай прыкметай.*

3. Які бывае пры родах. *Родавыя схваткі.*

**РОЗНІЦА**

1. Адрозненне ў чым-небудзь. *Паміж братамі амаль няма ніякай розніцы.*

2. Продаж невялікімі колькасцямі. *Тавары прадаюцца оптам і ў розніцу.*

**РОСТАНЬ**

1. Расставанне. *Ростань была кароткай.*

2. Месца перакрыжавання дарог. *Ростань дарог.*

**РОЎ**

**1.** Доўгае паглыбленне ў зямлі, канава. *Глыбокі роў.*

**2.** Моцны крык некаторых жывёл. *Роў мядзведзя, быка*

**РУБЕЛЬ**

**1.** Грашовая адзінка. *Царскі рубель забяспечваўся золатам.*

**2.** Жэрдка для ўвязвання, прыціскання сена, саломы на возе. *Рублём уціскаецца на возе сена.*

**РУБЕЦ**

**1.** (ад *рубіць*). Паглыбленне на паверхні; шрам; след на целе; шво. *Рубец на дрэве; яшчэ не зажыў рубец на далоні; рубец у кашулі.*

**2.** Частка страўніка жвачных жывёл. *Купіць рубец.*

**РУБІЦЬ**

**1.** Падшываць адзенне. *Рубіць сукенку, хустку.*

**2.** Будаваць з бярвення. *Рубіць хату, зруб.*

**РУБКА**

**1.** (ад *рубіць*). Дзеянне паводле дзеяслова *рубіць*. *Рубка дроў; рубка зруба.*

**2.** Надбудова на палубе судна для кіравання ім. *Баявая рубка; рубка штурмана.*

**РЫСЬ**

**1.** Драпежная жывёліна. *Рысь падобна да кошкі.*

**2.** Хуткі алюр. *Перавесці каня на рысь; рысь — сярэдні рух паміж галопам і шагам.*

**РЫФ**

**1.** Узвышэнне марскога дна. *Рыфы небяспечныя для суднаходства; падводны рыф.*

**2.** Вяроўка з вузламі і кольцамі, пры дапамозе якой можна паменшыць плошчу паруса. *Браць рыф,*

**РЭАКЦЫЯ**

**1.** Дзеянне, якое з'яўляецца адказам на якое-небудзь уздзеянне; фізіка-хімічнае ўзаемадзеянне паміж двума або некалькімі рэчывамі. *Рэакцыя на словы настаўніка; імгненная рэакцыя; хімічная рэакцыя.*

**2.** Палітыка жорсткага падаўлення рэвалюцыйнага і грамадскага руху. *Барацьба супраць сіл рэакцыі.*

**РЭАЛ**

**1.** Іспанская сярэбраная манета, якая ўжывалася ў XIII—XIX ст. *Далі рэшту тры рэалы.*

**2.** Стол-шафа з нахіленай верхняй дошкай. *Друкарня мела пяць рэалаў з шрыфтам.*

**РЭЗКА**

**1.** Дзеянне паводле дзеяслова *рэзаць*; дробна парэзаная салома. *Рэзка дроў.*

**2.** Востра, пранізліва; раптоўна. *Рэзка выступіць; рэзка пахаладала.*

**РЭЗЬ**

**1.** Рэзкі боль. *Рэзь у жываце, вачах.*

**2.** Сечка. *Рэзь запарвалі і давалі карове.*

**3.** Рыбалоўная сетка з рэдкага палатна. *Рэзь мае вялікія вочкі.*

**РЭЙД**

**1.** Набег ці налёт войск у глыб варожай тэрыторыі; нечаканая рэвізія, праводзімая групай грамадскіх актывістаў. *Пачаўся рэйд партызан у тыл ворага.*

**2.** Месца якарнай стаянкі суднаў ля берага. *На рэйдзе стаяла тры караблі.*

**РЭПКА**

**1.** Рэпа. *Пасадзіць рэпку.*

**2.** Надкаленная косць. *Нага пад рэпкай баліць.*

**3.** Макаўка (у жывёл). *Рэпка ў каня.*

## С

**САБАЧКА**

**1.** Сабака, шчаня. *Купіць сабачку.*

**2.** Спускавы механізм у агнястрэльнай зброі; частка машын, механізмаў. *Сабачка ў пісталеце; сабачка перашкаджае руху назад зубчастага кола.*

**САГА**

**1.** Скандынаўскае ці ірландскае сказанне. *Сага — старажытная легенда.*

**2.** Крупы з сагавай пальмы. *Пірог з сага.*

**САК**

1. Разнавіднасць жаночай вопраткі. *Сак нагадвае кароткае паліто*

2. Рыбалоўная снасць. *Сак — сетка, нацягнутая на абруч.*

**САКОЛКА**

1. Сакаліха. *Саколка ўзмахнула крыламі і паляцела.*

2. Майка (звычайна трыкатажная). *Хадзіць у адной саколцы.*

**САКРЭТ**

1. Тайна. *Трымаць у сакрэце.*

2. Рэчыва, якое выдзяляецца залозамі і неабходна для жыццёвых функцый арганізма. *Сакрэт выдзяляецца залозамі.*

**САЛОДКА**

1. Расліна сямейства бабовых. *Салодку называюць яшчэ і лакрыцай.*

2. Соладка. *Салодка ў роце пасля цукерак.*

**САЛЯНКА**

1. Пасудзіна для солі, сальніца. *Сыпаць соль з салянкі.*

2. Род травяністых раслін сямейства лебядовых. *Салянка расце ў засушлівых месцах.*

3. Густы суп з вострымі прыправамі. *Салянка — суп з дробна парэзанымі кавалкамі мяса ці рыбы.*

**САМАСТРЭЛ**

1. Разнавіднасць старажытнай зброі. *Самастрэл служыў для кідання стрэл і камення*

2. Наўмыснае раненне самога сябе. *Самастрэл робіцца з мэтай ухілення ад ваеннай службы.*

**САНДАЛ**

1. Вечназялёнае трапічнае дрэва. *З драўніны сандала здабываюць розныя фарбавальнікі.*

2. Невялікае судна ў цюркскіх народаў Прычарнамор'я. *Невялікі, але ўстойлівы сандал.*

3. Прыстасаванне для абагравання жылля ў народаў Усходу. *Дзеці сабраліся вакол сандала.*

**САРАЧЫНЫ**

1. (ад *сарока*). Сарочы. *Сарачынае гняздо*

2. (ад *сорак*). Тэрмін у сорак дзён пасля чыёй-небудзь смерці; абрад памінання памёршага ў гэты дзень. *Справіць сарачыны па бацьку.*

**САРДЭЧНІК**

1. Чалавек, у якога хворае сэрца. *Мой дзядзька — сардэчнік.*

2. Унутраная частка розных апаратаў, прылад. *Сардэчнік генератара; жалезны сардэчнік.*

3. Лекавая трава, буйміна. *Сардэчнік расце па балотах, цвіце белым колерам.*

**САЧОК**

1. Конусападобная сетка на абручы з ручкай, якой ловяць рыбу, насякомых. *Лавіць матылькоў сачком.*

2. Лодар, гультай. *«Ну і сачок жа ты!» — з дакорам сказаў бацька.*

**СВЕТ**

1. Зямля, сусвет; планета; чалавечае грамадства. *Падарожжа вакол свету.*

2. Сонечнае святло; асвятленне. *Сонечны свет.*

**СВЕТЛАСЦЬ**

1. Стан, уласцівасць светлага. *Светласць валасоў, бяроз.*

2. Тытулаванне некаторых князёў і ўладарных асоб. *Ваша светласць.*

**СВІНАРКА**

1. Жанчына, якая працуе на свінаферме. *Перадавая свінарка.*

2. Грыб свінуха. *Маці назбірала баравікоў, лісічак і свінарак.*

3. Сівец. *Свінарка — грубая трава.*

**СВІНКА**

1. Свіння. *Купіць кабанчыка і свінку.*

2. Дзіцячае інфекцыйнае захворванне. *Захварэць на свінку.*

3. Грыб. *Назбіраць поўны кош свінак.*

**СВІТА**

1. Суправаджаючыя асобы. *Генерал прыехаў са сваёй світай.*

2. Сукупнасць пластоў горных парод. *Світа пясчанікаў; вапнавая світа.*

3. Верхняе адзенне. *Світу шылі з даматканага сукна.*

**СЕЗАМ**

**1.** Маслічная паўднёвая культура, кунжут. *З сезаму здабываюць алей.*

**2.** Тайная скарбніца, таямніца. *Гэты сезам так і не адкрыўся мне.*

**СЕКЦЫЯ**

**1.** Аддзел пэўнай установы, арганізацыі; частка збудавання. *Секцыя жаночай вопраткі ў магазіне, шахматная секцыя; спартыўная секцыя.*

**2.** Анатаміраванне, рассячэнне. *Секцыя трупа, вены*

**СЕЛЕНІТ**

**1.** Разнавіднасць гіпсу. *Селеніт звычайна залаціста-жоўтага ці белага колеру.*

**2.** Уяўны жыхар Месяца (у фантастычнай літаратуры). *Прылёт на Зямлю селенітаў.*

**СЕМІНАРСКІ**

**1.** Які мае дачыненне да семінара. *Семінарскія заняткі.*

**2.** Які мае дачыненне да семінарыі. *Семінарская адукацыя; семінарскія сябры*

**СІМПАТЫЧНЫ**

**1.** Прывабны, мілы. *Сімпатычная дзяўчына.*

**2.** Які мае адносіны да аддзела вегетатыўнай нервовай сістэмы; які аддаецца на блізкіх ці сіметрычна размешчаных участках. *Сімпатычная нервовая сістэма.*

**СІП**

**1.** Сіпенне, асіпласць. *Сіп у голасе.*

**2.** Буйная драпежная птушка. *У сіпа бурае апярэнне.*

**СКАБКА**

**1.** Стрэмка; шчэпка. *Загнаў у палец скабку; падняць скабку.*

**2.** Скаба. *Скабкай сашчэплены драўляныя блокі.*

**СКАПЕЦ**

**1.** Чалавек, які падвергся кастрацыі. *Незнаёмы быў падобны да скапца ці члена рэлігійнай секты.*

**2.** Капец, бурт. *Скапец бульбы, буракоў.*

**СКАТ**

**1.** Камплект колаў для воза, аўтамабіля. *Паравозныя скаты; скат для аўтамабіля.*

**2.** Нахільная паверхня, пакаты спуск. *Скат узгорка.*

**3.** Марская драпежная рыба. *Скат належыць да класа акулападобных.*

**СКІФ**

**1.** Прадстаўнік качавых плямён. *Скіфы насялялі Паўночнае Прычарнамор'е.*

**2.** Вузкая гоначная лодка. *У скіфа рухомае сядзенне і гладкая абшыўка.*

**СКЛАД**

**1.** Памяшканне для захоўвання тавараў, матэрыялаў. *Склады знаходзіліся побач з вакзалам.*

**2.** Састаў, сукупнасць частак цэлага; постаць, фізічны выгляд, будова чалавека, жывёліны. *Склад прэзідыума; акцерскі склад тэатра; склад фігуры, цела.*

**3.** Гук, які вымаўляецца адным штуршком паветра. *Слова з трох складоў.*

**СКЛАДКА**

**1.** Загнутая палоска на тканіне, паперы. *Складкі на спадніцы; складка на штаніне.*

**2.** Складчына; чарга пасвіць кароў. *Купіць у складку дом; падышла складка пасвіць кароў.*

**СКУЛА**

**1.** Косць чэрапа над верхняй сківіцай. *Шырокія скулы.*

**2.** Нарыў, фурункул. *Выціснуць скулу; скула на шыі.*

**СЛАНЕЦ**

**1.** Горная слаістая парода. *Глiністыя сланцы.*

**2.** Пасланы лён (каноплі); хмызняковае дрэва. *Сланец раней малацілі цапамі; хваёвы сланец.*

**СЛАЦЬ**

**1.** Пасылаць, адпраўляць; накіроўваць. *Слаць людзей на дапамогу; слаць пасылкі, лісты.*

**2.** Рассцілаць. *Слаць пасцель, ложак; слаць лён.*

**СЛОЙ**

**1.** Пласт, аб'яднаная пэўнымі прыкметамі група людзей. *Слой лёду, тлушчу; тоўсты слой; людзі розных слаёў.*

**2.** Слоік. *Гліняны слой; вялікі слой.*

**СЛОН**

1. Буйная млекакормячая жывёліна з хобатам, шахматная фігура *Сланы жывуць у трапічнай Афрыцы і Азіі, хадзіць сланом.*

2. Услон. *Сесці на слон.*

3. Сланечнік. *Паспеў слон; слон цвіце жоўтым колерам.*

**СМАЛЯНКА**

1. Гатунак груш. *Смачныя смалянкі.*

2. Травяністая расліна. *Смалянка цвіце ружовымі, белымі і чырвонымі кветкамі.*

3. Паганы грыб. *Адны смалянкі у лесе, добрых грыбоў няма.*

4. Вялікоднае яйка. *На вялікдзень елі смалянкі і пірагі.*

**СМІРНА**

1. Навыцяжку. *Стаяць смірна.*

2. Пахучая смала. *У пакоях стаяў пах смірны.*

**СМОЛКА**

1. (ад смаліць). Смаленне. *Смолка парсюка, курыцы.*

2. Смала. *Смолка сочыцца на слівах.*

3. Лугавая расліна. *Смолка цвіце ружовымі кветкамі.*

**СОЛЬ**

1. Белае крышталічнае рэчыва. *Сталовая соль.*

2. Пяты гук музычнай гамы. *Гукі паніжаліся да ніжняга соль.*

3. Марская плоская рыба. *Соль прыдатная да яды.*

4. Грашовая адзінка ў Перу. *Соль роўная ста сентава.*

**СОН**

1. Фізіялагічны стан спакою. *Хіліць да сну.*

2. Сон-трава. *Сон расцвітае ў красавіку вялікімі кветкамі-званамі.*

**СОС**

1. Міжнародны сігнал няшчасця. *Падаць сігнал «сос».*

2. Нікацінавая смала. *Сос застаецца пасля курэння ў цыбуку люлькі.*

**СОТЫ**

1. Ячэйкі з воску. *Мядовыя соты.*

2. Які мае дачыненне да ста. *Соты наведвальнік.*

**СПАРЫШ**

1. Два спараныя прадметы. *Слівовы спарыш.*

2. Аднагадовая расліна. *Спарыш расце каля дарог.*

**СПРАВА**

1. Занятак, работа. *Добрая справа; рыбацкая справа.*

2. З правага боку. *Бацька сядзеў справа ад мяне, маці — злева.*

**СТАН**

1. Постаць, фігура. *Дзявочы стан.*

2. Месца стаянкі. *Палявы стан; партызанскі стан.*

3. Машына для апрацоўкі металу ціскам. *Пракатны стан.*

4. Становішча. *Маральны і фізічны стан чалавека.*

5. Катэгорыя дзеяслова. *Стан выражае розныя адносіны паміж суб'ектам і аб'ектам дзеяння.*

**СТАПА**

1. Рытмічная адзінка ў вершы. *Стапа заканамерна паўтараецца ў вершаваным радку.*

2. Адзінка падліку пісчай паперы. *Стапа — тысяча лістоў паперы.*

**СТАРОНКА**

1. Адзін бок ліста паперы. *Старонка кніжкі, сшытка.*

2. Старана, мясцовасць. *Родная старонка.*

**СТАЎ**

1. Запруда; *тэхн.* спецыяльныя прыстасаванні для ўмацавання, замацавання чаго-небудзь. *Стаў на рацэ; стаў у шахце.*

2. Кросны. *Ткалі раней на ставе.*

**СТАЎБУР**

1. Вірусная хвароба раслін. *Стаўбур бульбы, тытуню.*

2. Стаўбун, кветканоснае сцябло; слуп (дыму, пылу). *Стаўбур цыбулі; стаўбуры на каштанах; стаўбур дыму.*

**СТАЎКА**

1. Сума грошай, якую ігрок ставіць на карту; размер заработнай платы, аклад. *Высокая стаўка; тарыфная стаўка.*

2. Месца, дзе знаходзіцца военачальнік ці яго штаб. *Стаўка камандавання.*

**СТОЙКА**

1. Пастава цела чалавека. *Стойка на руках*

2. Вертыкальны брус у збудаваннях, прылавак у сталовых, рэстаранах. *Стойка ў хаце. стойка такарнага станка буфетная стойка.*

3. Мужна. *Стойка пераносіць хваробу.*

**СТОПКА**

1. Невялікая шклянка для віна. *Гранёная стопка.*

2. Варыўня. *Кадушка з капустай стаіць у стопцы.*

**СТОЎП**

1. Вежа, калона, слуп. *Александрыйскі стоўп*

2. Сцірта, торп. *Жытні стоўп.*

**СТРАТА**

1. Згуба, прапажа. *Вялікая страта; страта фотаапарата.*

2. Групоўка людзей. *Страты аб'ядноўваюцца агульнымі рысамі — адукацыяй, прафесіяй і інш.*

**СТРОМА**

1. Круты схіл. *На строме расла адзінокая бярозка.*

2. Прама ўверх. *Дарога ішла строма ўгару; паставіць лесвіцу строма.*

**СТРОП**

1. Канат, трос для ўтрымання чалавека або груза на парашуце, для падвешвання гандолы да дырыжабля ці аэрастата. *Стропы парашута, аэрастата.*

2. Стык бакоў страхі. *Сена клалі пад самы строп.*

**СТРУГ**

1. Інструмент для апрацоўкі драўніны струганнем. *Падчасаць дзежку стругам; струг з дзвюма ручкамі.*

2. Старажытнае рачное судна. *Славянскія стругі дасягалі Візантыі.*

**СТУДЗЕНЬ**

1. Першы месяц года. *Нарадзіўся брат у студзені.*

2. Студзіна. *Талерка са студзенем.*

**СТУПІЦЬ**

1. Зрабіць крок; наступіць *Ступіць некалькі крокаў; ступіць на дошку.*

2. Зрабіць тупым. *Ступіць нож.*

**СТЫЛЬ**

1. Сукупнасць прыкмет ці сродкаў, якія служаць для характарыстыкі твора, метада работы, манеры і інш. *Стыль Купалы, рамантычны стыль, газетны стыль, стыль кіраўніцтва; модны стыль.*

2. Спосаб летазлічэння. *Новы, стары стыль.*

**СТЭЛАЖ**

1. Прыстасаванне з паліцамі для захоўвання чаго-небудзь. *Кніжны стэлаж; старадаўні стэлаж.*

2. Біржавая здзелка. *Стэлаж дае аднаму з дагаварных бакоў права выбару — купіць ці прадаць біржавыя каштоўнасці.*

**СУДАНКА**

1. Жыхарка Судана. *Пазнаёміцца з суданкай.*

2. Травяністая расліна. *Суданка належыць да сямейства злакавых.*

**СУЛТАН**

1. Спадчынны тытул манархаў; асоба, якая мае гэты тытул. *Воля султана; землі султана.*

2. Упрыгожанне на галаўным уборы. *Шапкі з султанамі; белыя султаны.*

**СУМАХ**

1. Паўднёвае дрэва, куст. *З сумаху атрымліваюць дубільныя рэчывы.*

2. Бязворсавы кілім з буйным узорам. *Вялікі сумах; чырвоны сумах.*

**СУРМА**

1. Хімічны элемент. *Сплавы сурмы.*

2. Старажытны ўкраінскі музычны інструмент. *Сурма мела выгляд доўгай трубы.*

**СУСЛА**

1. Адвар пэўных рэчываў у стане браджэння. *Сусла ідзе на выраб піва і квасу.*

2. Самаробная соска. *Суслу рабілі з хлеба і цукру; даць дзіцяці суслу.*

**СУЧКА**

1. Сука, самка сабакі. *Маленькая чорная сучка.*

2. Малыя санкі. *Сучкі выкарыстоўваюцца пры перавозцы бярвення.*

3. Дошчачка з дзіркамі для накручвання навоя ў кроснах, понаж у калаўроце. *Сучка у кроснах.*

**СЦЕНКА**

1. Сцяна, бок прадмета. *На сценцы віселі партрэты дзяцей; сценкі кузава машыны.*

2. Дарога за агародамі. *Ісці па сценцы ў лес.*

**СЫРОК**

1. Сыр. *Плаўлены сырок: тварожны сырок.*

2. Разнавіднасць рыбы. *Сырок — азёрна-рачная рыба, належыць да сямейства ласасёвых.*

**СЯВЕЦ**

1. Невялікая птушка. *Сяўцы належаць да атрада сеўцападобных.*

2. Сейбіт. *Малады сявец.*

**СЯКАЧ**

1. Інструмент для сячэння чагонебудзь. *Пасячы мяса секачом.*

2. Дарослы самец кабана, марскога коціка. *Цэлае стада секачоў; раз'юшаны сякач.*

**СЯРЭБРАНІК**

1. Старажытная сярэбраная манета. *Пяць сярэбранікаў.*

2. Спецыяліст па серабрэнню рэчаў. *Здольны сярэбранік; майстэрства сярэбранікаў XIX стагоддзя.*

3. Дуброўка. *Сярэбранік цвіце дробнымі жоўтымі кветкамі.*

# Т

**ТАВАР**

1. Прадукт працы, гандлю. *Шырокі продаж тавараў; тавары масавага ўжытку.*

2. Свойская рагатая жывёла. *Гнаць тавар з поля.*

**ТАЗ**

1. Неглыбокая круглая пасудзіна. *Эмаліраваны таз.*

2. Частка шкілета чалавека і жывёлін. *Шырокі, вузкі таз; пашкоджанне* таза.

**ТАКАВІШЧА**

1. Месца, дзе такуюць птушкі. *Такавішча цецерукоў.*

2. Месца для малацьбы і прасушкі збожжа, гумно. *На такавішчы абмалочвалі збожжа.*

**ТАКСА**

1. Дакладна ўстаноўленая расцэнка тавараў, размер аплаты. *Плаціць па таксе; паштовая такса.*

2. Невялікі гладкашэрсны сабака. *Крываногая такса; трымаць дома таксу.*

**ТАКТ**

1. Музычны такт; рытм. *Адбіваць такт; ісці у такт.*

2. Пачуццё меры, далікатнасць. *Педагагічны такт; чалавек з вялікім тактам.*

**ТАЛЕР**

1. Старажытная манета. *Сярэбраны талер; пяць талераў.*

2. Металічная пліта ў друкарскай машыне. *На талер устанаўліваюць друкарскую форму.*

**ТАЛІЯ**

1. Найбольш вузкая частка тулава. *Тонкая талія.*

2. Камплект ігральных карт з дзвюх калод. *Талія карт.*

**ТАНК**

1. Баявая бронемашына. *Наступленне танкаў.*

2. Бак, цыстэрна для транспарціроўкі вадкасцей без тары. *Танк для гаручага; малочны танк.*

**ТАНКЕТКА**

1. Малы быстраходны танк. *Грымнуў стрэл, і танкетка спынілася, ахопленая полымем.*

2. Суцэльная падэшва; лёгкі жаночы абутак. *Туфлі-танкеткі.*

**ТАРАН**

1. Прамысловая рыба. *Вялены, сушаны таран.*

2. Старажытная прылада, якой разбівалі крапасныя сцены; нанясенне ўдару носам карабля, вінтом самалёта. *Сценабітны таран; біць у вароты таранам; пайсці на таран.*

**ТОК**

1. Электрычная энергія. *Пастаянны ток; сіла току.*

2. Гумно. *Збожжа ляжала на таку.*

3. Такаванне. *Ранняй вясной у цецерукоў пачынаецца ток.*

**ТОР**

1. Дарога; след за калёсамі. *Тор ад воза.*

2. Геаметрычнае цела круглай формы. *Тор утвараецца вярчэннем круга вакол восі, што ляжыць у яго плоскасці.*

3. Адзінка ціску. *Торамі вымяраецца ціск у вакууме.*

**ТРАВЕРС**

1. Папярочны насып у акопах, траншэях. *Траверс засцерагае ад агню з тылу, флангаў.*

2. Пераход альпіністаў па маршруце, які злучае некалькі горных хрыбтоў. *Цяжкі траверс застаўся ззаду.*

**ТРАП**

1. Разнавіднасць лесвіцы *Падняцца па трапе.*

2. Адтуліна ў падлозе для сцёку вады. *Лазневыя трапы.*

**ТРОМБ**

1. Крывяны згустак. *Тромбы утвараюцца ў крывяносных сасудах.*

2. Смерч. *Тромб — смерч з моцным ветрам і навальніцай.*

**ТРУС**

1. Роднасны зайцу грызун, якога адкормліваюць у хатняй гаспадарцы дзеля атрымання смачнага і пажыўнага мяса, мяккай поўсці і шматлікага прыплоду. *Развядзенне трусоў — прыбытковая справа.*

2. Землетрасенне. *Вялікі трус адбыўся ноччу.*

3. Палахлівы чалавек. *З трусам я не сябрую.*

**ТРЫБА**

1. Шасцярня малатарні. *Трыба ў малатарні.*

2. Кожная з трох груп родаў, якія складалі патрыцыянскую абшчыну. *Трыба — адна з груп родаў.*

3. Лінія, якая падзяляе ўчасткі лесу. *Трыба прарублена ў лесе*

**ТРЭБА**

1. Неабходна, абавязкова; патрэбна, пажадана. *Трэба ехаць у горад; трэба снедаць.*

2. Ахвярапрынашэнне. *Трэба выконвалася вечарам і ноччу.*

**ТРЭЛЬ**

1. Пералівістае гучанне. *Трэлі салаўя.*

2. Спецыяльная дарога для тралёўкі драўніны. *Па трэлі цягнулі бярвёны.*

**ТУЗ**

1. Ігральная карта. *Піковы туз.*

2. Невялікі човен. *Туз — двухвёславая шлюпка.*

**ТУМАН**

1. Імжа. *Густы туман.*

2. Іранская залатая манета. *Туманы былі ў абароце да 1932 года.*

**ТУР**

1. Рух вакол чаго-небудзь; асобны этап гульні, конкурсу. *Тур вальса; тур шахматнага чэмпіянату.*

2. Першабытны дзікі бык. *Тур з'яўляецца адным з продкаў буйной рагатай жывёлы.*

3. Плеценая карзіна без дна, якая служыла (напоўненая зямлёй) як укрыццё ад куль і снарадаў. *Абаронцы крэпасцей укрываліся на сценах за турамі.*

**ТУХНУЦЬ**

1. Гаснуць. *Тухне агонь, свечка.*

2. Загніваць, пратухаць. *Тухне мяса.*

**ТУШ**

1. Музычнае ганаровае прывітанне. *Урачысты туш; іграць туш.*

2. Фарба для чарчэння, малявання. *Чорная, каляровая туш.*

3. Выпадковы дотык да шара пры гульні на більярдзе. *Ігрок зрабіў туш.*

**ТУШЫЦЬ**

1. Гасіць. *Тушыць святло, папяросу.*

2. Доўга варыць на малым агні (у закрытай пасудзіне). *Тушыць мяса, гародніну.*

**ТЫРАЖ**

1. Розыгрыш выйгрышаў. *Тыраж латарэі.*

2. Колькасць экземпляраў выдання аднаго выпуску. *Малы тыраж; тыраж кнігі.*

**ТЫТАН**

1. Міфалагічны волат. *Барацьба багоў і тытанаў.*

2. Хімічны элемент. *Тытан — цвёрды матэрыял серабрыста-белага колеру.*

3. Вялікі электрычны кіпяцільнік. *Закіпеў тытан*

**ТЭРМІН**

1. Пэўны прамежак часу; пэўная дата, вызначаны час. *Здаць экзамены ў тэрмін, прыйсці раней тэрміну*

2. Слова (злучэнне слоў), што дакладна абазначае пэўнае паняцце ў навуцы, тэхніцы, мастацтве. *Лінгвістычны тэрмін; слоўнік філасофскіх тэрмінаў.*

**ТЭРМІТ**

1. Парашкападобная сумесь алюмінію з вокісламі некаторых металаў. *Тэрміты пры гарэнні даюць высокую тэмпературу.*

2. Насякомае, якое жыве згуртаваннямі ў вялікіх гнёздах. *Тэрміты шкодзяць дрэвам, збудаванням.*

# У

**УДАРНІК**

1. Перадавы работнік. *Брыгада ўдарнікаў.*

2. Частка затвора агнястрэльнай зброі. *Ударнік ударае па капсулі патрона.*

3. Музыкант, які іграе на ўдарных інструментах. *Ударнік выдзяляўся у аркестры.*

**УДЗЕЛ**

1. Сумесная дзейнасць, супрацоўніцтва. *Удзел у рабоце.*

2. Частка вялікага княства. *Раней на Русі ўдзелам кіравалі члены вялікакняжацкай сям'і.*

**УЗВОД**

1. Вайсковае падраздзяленне. *Камандзір узвода, кулямётны ўзвод.*

2. Узвядзенне; частка затвора агнястрэльнай зброі. *Узвод новага дома; пісталет на ўзводзе.*

**УЗРЫВАЦЬ**

1. (ад *рыць*). Разрываць, рыць зямлю *Свіней трэба выгнаць з гарода, а то ўзрываюць глебу.*

2. (ад *рваць*) Разбураць, знішчаць выбухам *Узрываць мост, дом.*

**УКЛАД**

1. Устаноўлены парадак, спосаб жыцця, побыту; тып гаспадаркі *Сельскі ўклад жыцця*

2. Грашовая сума, пакладзеная ў ашчадны банк. *Тэрміновы ўклад; вялікі ўклад.*

**УКЛАДЧЫК**

1. Хто робіць уклад (грашовую суму). *Багаты ўкладчык.*

2. Хто займаецца ўкладваннем чаго-небудзь. *Укладчык рэек; брыгада ўкладчыкаў.*

**УКРАІНКА**

1. Прадстаўніца ўкраінскага народа. *Мы з захапленнем слухалі песню ўкраінкі.*

2. Гатунак пшаніцы. *«Украінка» дае багатыя ўраджаі.*

**УПІЦЦА**

1. Прысмактацца; уваткнуцца вастрыём. *Упілася п'яўка ў нагу.*

2. Напіцца дап'яна. *Ён зусім упіўся на вяселлі.*

**УПРАВА**

1. У правы бок. *Сцежка збочыла ўправа.*

2. Установа, упаўнаважаная займацца грамадскімі і адміністрацыйнымі справамі. *Земская, гарадская ўправа.*

**УРАЗ**

1. У той жа момант, адразу. *Адказу доўга чакаць не прыйшлося, чалавек ураз загаварыў.*

2. Хвароба жывата. *Ураз узнікае ад цяжкай работы, натугі.*

**УРОК**

1. Вучэбны час; вучнёўскае заданне. *Урокі беларускай мовы; выканаць усе ўрокі.*

2. Хвароба ці няшчасце, выкліканыя па забабонных уяўленнях благім вокам ці дрэнным словам *Даўней урокі замаўлялі.*

**УСТУП**

1. Частка, што адступае ад асноўнай лініі і ўтварае выемку. *Уступ берага, катлавана.*

2. Пачатковая частка, уводзіны. *Уступ кнігі, артыкула.*

**УСТУПІЦЬ**

**1.** Стаць членам пэўнай арганізацыі, пачаць якое-небудзь дзеянне; увайсці, уехаць куды-небудзь. *Уступіць у кааператыў*

**2.** Добраахвотна адмовіцца на карысць іншай асобы; згадзіцца. *Сястра ўступіла цацку малодшаму брату.*

**УСХОД**

**1.** З'яўленне сонца ці іншых свяцiл, адзін з чатырох напрамкаў свету. *Усход сонца; на ўсходзе пачало святлець неба*

**2.** Пад'ём ступні. *Новыя туфлі цісnуць на ўсходзе.*

**УСХОДЫ**

**1.** Парасткі насення. *Усходы толькі што паказаліся з зямлі.*

**2.** Прыступкі лесвіцы. *Спускацца па ўсходах.*

**УТОРА**

**1.** Паз, нарэзка. *Разцом рабілі ўторы і ўстаўлялі дно ў бочцы*

**2.** Другі голас у музычнай партыі. *Добра былі чутны ўторы.*

**УЦЯКАЦЬ**

**1.** Упадаць (пра раку, ручай). *Рака ўцякае ў мора.*

**2.** Паспешліва ісці, збягаць; хавацца. *Уцякаць у лес.*

**УШЫЦЦА**

**1.** Укараціцца пасля шыцця. *Сукенка ўшылася.*

**2.** Пранікнуць, уціснуцца куды-небудзь. *Ушыцца ў натоўп; ушыцца ў перапоўнены клуб.*

## Ф

**ФАЛАНГА**

**1.** Баявы парадак пяхоты і конніцы ў старажытных арміях. *Фалангі рушылі ў бой.*

**2.** Кожная з трох костачак пальца. *Пералом пазногцевай фалангі.*

**3.** Ядавітая істота. *Фаланга належыць да класа павукападобных.*

**ФЕРМА**

**1.** Гаспадарчае прадпрыемства. *Працаваць на ферме.*

**2.** Канструкцыя са злучаных паміж сабой брусоў. *Металічная, драўляная ферма.*

**ФІБРА**

**1.** Валакно раслiннай ці жывёльнай тканкі. *Вяроўка была сплецена з фібры.*

**2.** Спрасаваная папяровая маса, апрацаваная хімічным спосабам. *Сумка з фібры.*

**ФІГА**

**1.** Кукіш. *Паказаць фігу.*

**2.** Субтрапічнае дрэва, смакоўніца. *Фіга належыць да сямейства тутавых.*

**ФІЛЕ**

**1.** Мяса ці рыба без касцей; ежа з яго. *Катлеты з філе.*

**2.** Вышыўка, ажурная вязка. *Вязаць, вышываць філе.*

**ФІНКА**

**1.** Прадстаўніца насельніцтва Фінляндыі. *Маладая фінка.*

**2.** Фінскі нож. *Купіць фінку.*

**3.** Круглая шапка. *Фінка шылася з адкладным аколышкам.*

**4.** Невялікі конь паўднёвай пароды. *Вынослівая фінка.*

**5.** Разнавіднасць лёгкай шлюпкі. *Фінка мае вострую форму носа і кармы.*

**ФЛЮС**

**1.** Нарыў над (пад) хворым зубам. *Шчака распухла ад флюса.*

**2.** Рэчыва, якое дабаўляецца да руды пры плаўцы. *Флюс садзейнічае моцнаму сплаўленню фарфоравых вырабаў.*

**ФОКУС**

**1.** Пункт перасячэння адбітых або пераломленых прамянёў. *Фокус лінзы; наводка на фокус.*

**2.** Лоўкі прыём, заснаваны на малавядомых фізічных ці хімічных з'явах або на лоўкасці рук, выдумцы. *Паказваць фокус.*

**ФОН**

**1.** Асноўны колер, тон. *Партрэт пішацца на зялёным фоне.*

**2.** Шум, трэск. *Фоны ў тэлефоне, радыёпрыёмніку.*

3. Часціца перад нямецкімі прозвішчамі *«Фон» перад прозвішчам — адзнака дваранскага паходжання*

**ФРАКЦЫЯ**

1. Арганізаваная група людзей з агульнымі інтарэсамі і дзейнасцю *Парламенцкая фракцыя.*

2. Рэчыва, выдзеленае дробнай перагонкай з чаго-небудзь. *Фракцыя нафты.*

**ФРАНК**

1. Прадстаўнік групы германскіх плямён франкаў. *Франкі жылі на тэрыторыі каля ніжняга і сярэдняга цячэння Рэйна*

2. Грашовая адзінка, якой карысталіся ў Францыі, Бельгіі, Швейцарыі да ўвядзення новай агульнаеўрапейскай валюты еўра.

**ФРЫЗ**

1. Верхняя частка збудавання ў выглядзе паласы паміж галоўнай бэлькай і карнізам. *Фрыз звычайна ўпрыгожваўся малюнкам.*

2. Грубая варсістая шарсцяная тканіна. *Фрыз падобны да байкі.*

3. Прадстаўнік народа, які жыве ў Нідэрландах, Даніі і Германіі. *Нідэрландскія фрызы.*

**ФУКНУЦЬ**

1. Дзьмухнуць. *Фукнуць на лямпу.*

2. Зняць шашку з дошкі ў праціўніка пры яго якім-небудзь недаглядзе, памылцы. *Ён фукнуў шашку на першай мінуце гульні.*

**ФУНТ**

1. Руская мера вагі. *Фунт раўняўся 409,5 грама.*

2. Грашовая адзінка. *Англійскі фунт; атрымаць дзве тысячы фунтаў.*

## Х

**ХАВАЦЬ**

1. Размяшчаць, каб іншыя не змаглі знайсці (убачыць); таіць. *Хаваць стрэльбу; хаваць грошы, дакументы.*

2. Закопваць у зямлю памёршага. *Хавалі нябожчыка пад вечар*

**ХАНЖА**

1. Прытворны чалавек, крывадушнік. *Муж яе быў скнара і ханжа*

2. Кітайская гарэлка. *Ханжа — рысавая гарэлка*

**ХАРЭЙ**

1. Двухскладовая вершаваная стапа з націскам на першым складзе *Верш напісан харэем.*

2. Доўгі шост, пры дапамозе якога кіруюць запрэжкай аленяў, сабак. *Наладзіць харэй у запрэжцы.*

**ХВОЙКА**

1. Маладая хвоя. *Пры дарозе раслі хвойкі.*

2. Жук чорнага ці бурага колеру. *Хвойкі шкодзяць хваёвым дрэвам.*

**ХЕДАР**

1. Частка збожжаўборачнага камбайна. *Трэба адрамантаваць хедар.*

2. Пачатковая яўрэйская рэлігійная школа. *У хедары вучыліся толькі хлопчыкі.*

**ХЛЫСТ**

1. Ствол спілаванага дрэва з надсечанай верхавінай і ачышчаны ад сукоў. *Хлысты грузяць на лесавозы.*

2. Сектант, паслядоўнік хлыстоўства. *Гэты чалавек хлыст, член рэлігійнай секты.*

3. Хлюст, прайдзісвет. *Гэта ж такі нахабнік, такі хлыст!*

**ХРАНОГРАФ**

1. Прыбор для вымярэння кароткіх інтэрвалаў часу. *Фатаграфічны хронограф.*

2. Помнік старажытнага пісьменства з аглядам усеагульнай гісторыі. *У хранографе змяшчаецца хроніка на аснове біблейскіх легенд.*

**ХРАП**

1. Хрыплыя гукі спячага чалавека. *Храп разносіўся на ўвесь пакой.*

2. Упор для рэгулявання частак механізмаў, якія рухаюцца. *Храпам можна спыніць дзеянне механізма.*

**ХРАПА**

1. Мыса *Конская храпа.*

2. Замёрзлая грудамі зямля. *Па храпе цяжка ісці.*

3. Зелле. *Назбіраць храпы свінням.*

**ХУДЫ**

**1.** Пра таго, у каго сухое, тонкае цела. *Худыя рукі; худое дзіця*

**2.** Дрэнны, дзіҁавы. *Худая зямля, худое вядро*

# Ц

**ЦІК**

**1.** Стан, пры якім назіраецца міжвольнае перасмыканне мышцаў. *Нервовы цік; цік мышцаў твару.*

**2.** Шчыльная ільняная ці баваўняная тканіна. *Цікам абіваецца мэбля.*

**3.** Дзікарослае дрэва. *Цік расце ў лясной паласе Індыі, Індакітая.*

**ЦІР**

**1.** Памяшканне для вучэбнай і трэніровачнай стральбы. *Страляць з вінтоўкі ў ціры.*

**2.** Састаў з рэдкай смалы, які ўжываецца для змазвання стаячага такелажу і рангоўта на караблях. *У цір дабаўляюць каніфоль.*

**ЦМОК**

**1.** Пачвара ў вобразе змея, дракона. *Бабуля расказала ўнуку казку пра тое, як асілак перамог страшнага цмока.*

**2.** Ужываецца паводле значэння дзеяслова *цмокаць. А бабуля з радасці цмок мяне ў шчаку.*

**ЦЫТРА**

**1.** Струнны шчыпковы музычны інструмент. *Цытра нагадвае гітару.*

**2.** Расфуфыраная, звышмодная жанчына. *Не жанчына, а цытра нейкая.*

**ЦЭНТ**

**1.** Дробная манета ў ЗША і некаторых іншых краінах. *Адзін цэнт раўняецца сотай частцы долара.*

**2.** Адзінка частотнага інтэрвалу. *Цэнт роўны 1/1200 актавы.*

**ЦЮК**

**1.** Вязка, скрутак чаго-небудзь. *Класці цюкі на воз.*

**2.** Ужываецца гукапераймальна для абазначэння стуку. *«Цюк-цюк»,— чуўся стук дзятла.*

**ЦЯГ**

**1.** Бег, беганіна. *У цягу праносяцца дні і гады.*

**2.** Вяроўка, рэмень, трос. *Зачапіць за цяг, перарэзаць цягі.*

# Ч

**ЧАЙКА**

**1.** Вадаплаваючая птушка. *Чайкі лятаюць над морам*

**2.** Лодка, човен. *Чайку аднесла далёка ад берага.*

**ЧАКАН**

**1.** Штэмпель для выбівання відарысаў; чаканка. *Чакан манет, медалёў.*

**2.** Птушка сямейства драздовых. *Чорнагаловы чакан.*

**ЧАЛО**

**1.** Лоб. *Выцерці пот з чала.*

**2.** Буйное адборнае зерне. *Чало — самае лепшае зерне.*

**3.** Пячныя чалеснікі. *Чыгун дужа вялікі, не праходзіць у чало.*

**ЧАРАПОК**

**1.** Абломак, асколак пасудзіны. *Толькі чарапкі засталіся ад талеркі.*

**2.** Чэрап. *Ударыць па чарапку.*

**ЧАРОТНІЦА**

**1.** Травяністая кармавая расліна. *У чаротніцы шырокае лісце.*

**2.** Птушка атрада жураўлепадобных. *У чароце на вадаёмах водзяцца чаротніцы.*

**ЧАЧОТКА**

**1.** Невялікая птушка. *Шчабеча ў кустах чачотка.*

**2.** Хуткі рытмічны танец. *Танцаваць чачотку.*

**3.** Від бярозы. *Чачотка расце на межах і ў нізкіх месцах па берагах рэк.*

**ЧУТКА**

**1.** Вестка, паведамленне. *Чутак ад сястры не было цэлы месяц; добрая чутка.*

**2.** Чуйна. *Чутка спаць.*

**ЧУШКА**

**1.** Свіння. *Адкормленая чушка.*

**2.** Злітак металу ў форме бруска. *Чыгун у чушках.*

**ЧЫН**

1. Званне, чын. *Ніякага чыну не заслужыў*

2. Папарнае перакрыжаванне нітак асновы. *Чыны — перакрыжаванне нітак у кроснах.*

**ЧЫСЦІК**

1. Травяністая расліна сямейства губакветных. *Кветкі чысціку сабраны ў мяцёлкі*

2. Паўночная марская птушка. *Чысцікі жывуць на скалах па берагах паўночных мораў*

**ЧЭК**

1. Грашовы дакумент; квітанцыя ў касу, талон з касы. *Падпісаць чэкі; аплаціць чэк; выдаць чэкі*

2. Участак поля з пасевамі рысу. *Рысавыя чэкі*

**ЧЭРНЬ**

1. Тэхніка мастацкай апрацоўкі металічных вырабаў; вугальная фарба. *Залаты пярсцёнак з чэрню; тарфяная чэрнь.*

2. Людзі, якія належалі да ніжэйшых слаёў грамадства. *Шляхта і чэрнь.*

## Ш

**ШАБЕЛЬНІК**

1. Спецыяліст па вырабу шабляў. *Выдатны шабельнік.*

2. Шматгадовая расліна. *Шабельнік належыць да сямейства ружакветных.*

**ШАЙКА**

1. Банда, група злачынцаў. *Шайка хавалася ў лесе.*

2. Ражка. *Наліць поўную шайку вады.*

**ШАЛЁЎКА**

1. Асада, ліштва; матэрыял для абшыўкі драўляных пабудоў. *Шалёўкі да дзвярэй, акна.*

2. Квяцістая вялікая хустка, шаль. *Накінуць на плечы шалёўку.*

**ШАРОШ**

1. Дробны крохкі лёд на рацэ ў выглядзе кашападобнай масы. *Шарош ідзе перад ледаставам і ў час крыгаходу.*

2. Сплаўны лес. *Шарош — бярвенне, якое сплаўляецца па рацэ.*

**ШАРХОТКІ**

1. Тое, што ўтварае шорхат, шуміць. *Шархоткае лісце*

2. Бомы, шамкі. *Шархоткі бразгочуць, як коні бягуць*

**ШАХ**

1. Тытул манарха ў Іране і некаторых іншых краінах Усходу. *Загад шаха; персідскі шах.*

2. Пагроза каралю праціўніка ў шахматнай гульні. *Аб'явіць шах.*

3. Ужываецца гукапераймальна для абазначэння шумных адрывістых гукаў. *«Шах-шах»,— чуліся гукі касы.*

**ШАШКА**

1. Кругляш для гульні ў шашкі; разнавіднасць гульні. *Збіць шашку; гуляць у шашкі.*

2. Халодная зброя з доўгім, злегку сагнутым клінком. *Выхапіць шашку; ударыць шашкай.*

**ШВЕЙЦАРСКІ**

1. Тое, што мае дачыненне да Швейцарыі, швейцарцаў. *Швейцарская культура, швейцарскі гадзіннік.*

2. Які мае адносіны да швейцара. *Швейцарская служба.*

**ШКОДА**

1. Пашкоджанне, урон, страта. *Партызаны нарабілі шмат шкоды ворагам.*

2. Шкада. *Шкода мне маці і бацьку.*

**ШЛІХТА**

1. Ліпучы раствор. *Шліхтай праклейваюць аснову тканіны, каб надаць ёй трываласць і гладкасць.*

2. Штабель. *Шліхта будаўнічых матэрыялаў.*

**ШМАТ**

1. Многа, у вялікай колькасці. *Шмат людзей прыйшло на свята горада.*

2. Кавалак, абрывак. *Разарваць посцілку ў шматы.*

**ШПАТ**

1. Мінерал, які пры ўдары расколваецца на кавалкі правільнай геаметрычнай формы. *Палявы шпат.*

2. Хранічнае запаленне скакальнага сустава ў некаторых жывёл. *Конь захварэў на шпат.*

**ШПІК**

**1.** Касцявы мозг. *Есць косць сітавая і шпік.*

**2.** Шпег, сышчык. *Шпік — тайны агент.*

**ШПІЦ**

**1.** Шпіль. *Шпіц Петрапаўлаўскай крэпасці.*

**2.** Пакаёвы сабачка. *Шпіц мае доўгую густую поўсць.*

**ШТАТ**

**1.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў некаторых дзяржавах. *Штат Каліфорнія.*

**2.** Пастаянны склад супрацоўнікаў якой-небудзь установы. *Скарачэнне штатаў.*

**ШТОФ**

**1.** Старая мера вадкасцей. *Штоф раўняўся 1/10 вядра.*

**2.** Тканіна з буйным тканым узорам. *Штоф ідзе на абіўку мэблі, на парцьеры.*

**ШТУЧНЫ**

**1.** Ненатуральны. *Штучны мёд; штучнае валакно.*

**2.** Які ўяўляе сабой асобную рэч, прадмет. *Штучныя тавары.*

**ШТЫК**

**1.** Халодная колючая зброя. *Біць ворага штыкамі.*

**2.** Пласт зямлі на глыбіню палатна рыдлёўкі. *Вырыць яму на тры штыкі.*

**3.** Асобы марскі вузел. *На штык звязваюцца тоўстыя вяроўкі, канаты.*

**ШТЫЛЬ**

**1.** Адсутнасць ветру на моры, акіяне. *Поўны штыль.*

**2.** Востры стрыжань, шып. *Штыль на вяршыні дрэва.*

**ШУМ**

**1.** Гукі ад якога-небудзь дзеяння, руху, галасоў, якія зліваюцца ў аднастайнае гучанне; мітусня. *Шум дажджу; шум за дзвярыма; шум машын за вокнамі.*

**2.** Накіп. *Шум на малацэ.*

**ШЧУР**

**1.** Невялікая птушка. *Шчур належыць да сямейства ўюрковых.*

**2.** Далёкі продак, роданачальнік. *Нашы шчуры і прашчуры жылі на гэтай зямлі.*

**3.** Пацук. *Кот ловіць шчуроў.*

**ШЫБЕР**

**1.** Засаўка ў дымаходзе, газаправодзе. *Шыберам рэгулюецца цяга.*

**2.** Буйны гандляр у капіталістычных краінах. *Багаты і ўплывовы шыбер*

**ШЫБКА**

**1.** Шыба ў акне. *Уставіць шыбку.*

**2.** Хутка, шпарка. *Хадзіць шыбка.*

**ШЫКАВАЦЬ**

**1.** Жыць з шыкам; фарсіць. *Шыкаваў бацька амаль пяць дзён.*

**2.** Падрыхтоўваць. *Шыкаваць стол для гасцей.*

**ШЫП**

**1.** Нарасць на целе ў некаторых жывёл; выступ на падэшве спартыўнага абутку, колах, гусеніцах аўтамашын, трактароў. *Шыпы марскіх рыб; кеды з шыпамі; колы з шыпамі; востры шып.*

**2.** Прамысловая рыба сямейства асятровых. *Шыпы ловяцца ў Чорным, Азоўскім, Аральскім і Каспійскім морах.*

**3.** Шыпенне. *Змяіны шып.*

**ШЫПУН**

**1.** Від лебедзя з чырвона-чорнай дзюбай. *Шыпуны жывуць на лесастэпавых азёрах.*

**2.** Густы накіп пры плаўцы чыгуну. *Шыпун утвараецца пры вялікай тэмпературы* плаўлення.

**ШЫШАК**

**1.** Гронка. *Шышак вінаграду, шышакі арэхаў.*

**2.** Старажытнарускі воінскі шлем, які заканчваўся вастрыем. *Раней воіны апраналі шышакі, кальчугі.*

## Э

**ЭКІПАЖ**

**1.** Лёгкая пасажырская павозка. *Ехаць у экіпажы.*

**2.** Каманда, асабовы састаў карабля, самалёта, танка. *Члены экіпажа; экіпаж карабля.*

**ЭКСЦЭНТРЫК**

1. Артыст, які выконвае эксцэнтрычныя нумары. *Трук эксцэнтрыка.*
2. Дыск, што круціцца вакол восі, размешчанай не ў цэнтры, а збоку. *Дыск-эксцэнтрык.*

**ЭЛЕКТРОН**

1. Элементарная часціца рэчыва з адмоўным электрычным зарадам. *Свабодны электрон.*
2. Сплаў алюмінію з магніем, сплаў серабра з золатам. *Электрон вельмі трывалы і пластычны.*

**ЭМІСІЯ**

1. Выпуск каштоўных папер, банкнотаў, папяровых грошай. *Эмісія пазыкі.*
2. Выпраменьванне. *Эмісія — выдзяленне целам электронаў, іонаў, пазітронаў.*

**ЭСТАКАДА**

1. Збудаванне маставога тыпу. *Пабудаваць эстакаду.*
2. Прамы перпендыкулярны ўдар у фехтаванні. *Эстакада рапірай, шпагай.*

**ЭТЫКЕТНЫ**

1. Які адпавядае этыкету. *Этыкетны прыём.*
2. Абазначаны на этыкетцы. *Этыкетны малюнак, надпіс.*

## Ю

**ЮЗ**

1. Літарадрукавальны тэлеграфны апарат. *Перадаць пісьмо па юзу.*
2. Закліньванне колаў пры руху транспартных сродкаў. *Юз колаў аўтамабіля, трамвая.*

**ЮРОК**

1. Птушка атрада вераб'іных. *Юрок жыве ў хваёвых лясах.*
2. Вірок, прыстасаванне для намотвання нітак на клубок. *Юрком матаюць ніткі.*

**ЮШКА**

1. Металічны кружок, якім закладаюць адтуліну ў коміне. *Юшкай закладаюць комін, каб не выходзіла цёплае паветра.*
2. Від стравы. поліўка. *Юшку варыць з рыбы.*

## Я

**ЯЛАВІНА**

1. Абложная зямля. *Ялавіна не арэцца некалькі гадоў.*
2. Ялавічына. *Утушыць ялавіну.*

**ЯР**

1. Роў, лагчына. *Круты яр; кладка праз яр.*
2. Ярына. *Зялёны яр; густа ўзышоў яр.*

**ЯРКА**

1. Маладая авечка. *Ярка — авечка, што не ягнілася.*
2. Яравая пшаніца. *Ярка рана ўзышла.*
3. Асляпляльна, зырка. *Сонца свеціць ярка.*

**ЯСНАСЦЬ**

1. Ясната. *Яснасць неба, вачэй.*
2. Светласць. *«Ваша яснасць»,— звярнуўся слуга да пана.*

**ЯСТРАБОК**

1. Ястраб. *Злавіць ястрабка.*
2. Травяністая расліна. *Лугавы ястрабок.*

**ЯХІДНА**

1. Млекакормячая жывёліна. *Яхідна пакрыта іголкамі.*
2. Ядавітая змяя. *Яхідна належыць да сямейства аспідаў.*
3. З'едліва, каварна. *Яхідна усміхнуцца.*

**ЯЧМЕНЬ**

1. Збожжавая культура. *Пасеяць ячмень; зжаць ячмень.*
2. Гнойнае запаленне павека. *Ячмень на воку.*

PARADOX ®

**ПРИГЛАШАЕМ К СОТРУДНИЧЕСТВУ**

***Уважаемые авторы!***

**Если вы имеете рукописи, которые могут быть изданы в серии «Эрудит», предложите их нам.**

**В этой серии «Парадокс» выпустил:**

- *Толковый словарь русского языка*
- *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*
- *Словарь белорусско-русский и русско-белорусский*
- *Физика от «А» до «Я»*
- *Сочинение без шпаргалки*
- *Техника быстрого чтения*
- *Тесты по русскому языку*
- *Тесты по английскому языку*
- *Орфографический словарь русского языка*
- *Английский с улыбкой*
- *Тесты-диктанты по русскому языку*
- *Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы*
- *Чудеса вокруг нас*
- *Пришельцы из космоса?*
- *Пішам без памылак*
- *300 изложений по русскому языку*
- *Словарь англо-русский, русско-английский*

**Ждём ваших предложений по книгам учебного, образовательного, познавательного характера.**

**Пишите: 220050 Минск, ул.К.Маркса, 21 оф. 25.**
**Тел/ факс (017) 227-36-57, 227-67-73.**

# АНТОНІМЫ

# АНТОНІМЫ

Так называюцца словы з процілеглым значэннем. Іх у мове вялікае мноства, бо прынцып процілегласці наогул пануе ў прыродзе. Амаль усё, што вакол нас (а многае і ў нас саміх) падначалена гэтаму закону. Прыкладаў больш чым дастаткова: *мякка — цвёрда, белае — чорнае, многа — мала, высока — нізка, добра — дрэнна, шырока — вузка, дзень — ноч...*

Нават будова зямнога шара адпавядае гэтаму сапраўды ўсеагульнаму, а не толькі граматычнаму прынцыпу: антонімамі і геаграфічнымі, і граматычнымі з'яўляюцца *Арктыка* і *Антарктыка*, *Поўнач* і *Поўдзень*, *Захад* і *Усход* (пералік можна працягваць).

Няцяжка заўважыць, што выступаць у ролі антонімаў могуць розныя часціны мовы: назоўнікі і прыметнікі, дзеясловы і прыслоўі, дзеепрыслоўі і дзеепрыметнікі. Нават лічыльнікі ў некаторых выпадках можна залічыць у антонімы (*нуль — бясконцасць* як матэматычная катэгорыя, лічба, пададзеная ў форме дроба, дзе назоўнік і лічнік заўсёды займаюць процілеглыя пазіцыі). Хоць і рэдка, але бываюць антонімамі і займеннікі (*я — ты, мы — яны*). Абдзелены ў гэтым сэнсе, бадай, толькі выклічнік, які не мае ні роду, ні ліку, ні іншых граматычных прыкмет ці сувязей і з гэтай прычыны не можа знайсці сабе пару.

Хоць антонімы і з'яўляюцца фармальна супярэчлівымі, у сваім лінгвістычным жыцці гэтыя антаганісты мірна суіснуюць і нават лічацца сямейнай парай. Скасаваўшы «шлюб», яны адразу ж страцілі б права на сваю назву.

## СПІС УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

*абл.* — абласное слова
*адз. няма* — адзіночнага ліку няма
*зак.* — закончанае трыванне
*зал.* — залежны стан
*кніжн.* — кніжнае слова
*ЛіМ* — «Літаратура і мастацтва»
*незак.* — незакончанае трыванне
*пад.* — падобнае
*разм.* — размоўна-гутарковая лексіка
*рэліг.* — рэлігійнае слова
*у знач. наз.* — у значэнні назоўніка
*у мн.* — у множным ліку

# А

**АБВІНАВАЦІЦЬ — АПРАЎДАЦЬ**

*незак.* абвінавачваць — апраўдваць

**Абвінаваціць.** Ускласці віну на каго-небудзь.

**Апраўдаць.** Даказаць невінаватасць абвінавачанага.

*Абвінаваціць (апраўдаць) вайскоўца, жанчыну, інжынера, мужчыну, навукоўца, педагога, рабочага, селяніна, урача; асабіста, афіцыйна.*

*Ён паехаў, кінуў мяне адну, кажа, не вінаваты ён. Я яго не абвінавачваю, але і не апраўдваю.* К. Чорны.

**АБВІНАВАЦІЦЬ — АБАРАНІЦЬ**

*незак.* абвінавачваць — абараняць

**Абараніць.** Заступіцца за абвінавачанага.

*І не трэба крычаць на чалавека, калі ён хоча даказаць, што ён не вінаваты!..— Губы яго па-дзіцячаму смыкнуліся.— Абараняць от цяжка, а абвінавачваць — лёгка!..* І. Мележ.

**АБУДЖЭННЕ — ЗАВЯДАННЕ**

**Абуджэнне.** Працэс, якім пачынаецца чарговы цыкл развіцця чаго-небудзь.

**Завяданне.** Працэс, якім завяршаецца чарговы цыкл развіцця чаго-небудзь.

*Абуджэнне (завяданне) прыроды.*

*Пара абуджэння — пара завядання, два станы прыроды — мае дзве журбы ў вечным святла супярэчлівым ззянні: то ў соладка шчодрым, то ў горка скупым..* С. Шах.

**АБУЦЦА — РАЗУЦЦА**

*незак* абувацца — разувацца

**Абуцца.** Надзець абутак.

**Разуцца.** Зняць абутак.

*Пасля ён сядзеў на траве — абуўся і курыў.* К. Чорны. *Дзе ты, сынку, начаваў, што не разуваўся?.* Я. Купала.

**АБ'ЯДНАЦЦА — РАЗ'ЯДНАЦЦА (РАЗДЗЯЛІЦЦА)**

*незак.* аб'ядноўвацца — раз'ядноўвацца — раздзельвацца

**Аб'яднацца.** Злучыцца, утварыўшы адзінае цэлае.

**Раз'яднацца.** Разлучыцца, адасобіцца адзін ад аднаго, разбурыўшы адзінае цэлае.

*Аб'яднацца (раз'яднацца) аднадумцам, партызанам, рабочым, сялянам, шахцёрам; афіцыйна, добраахвотна, навечна, прымусова, часова.*

*Тыдні два назад партызаны аб'ядналіся, а цяпер зноў раз'ядналіся.* В. Жураўскі. *«Толькі аб'ядналіся і ужо раздзельваемся...» — замахала рукамі Восілене.* П. Броўка.

**АДЗЕЦЬ — СКІНУЦЬ**

*незак.* адзяваць — скідаць

**Адзець.** Надзець, нацягнуць на сябе або на каго-небудзь адзенне.

**Скінуць.** Здзець, сцягнуць з сябе ці з каго-небудзь адзенне.

*Адзець (скінуць) блузу, гімнасцёрку, кашулю, куртку, паліто, плашч, рукавіцы, шапку, штаны.*

*Мішурын, нічога не бачачы, вобмацкам зняў з яго пляча рэшткі павязак, скінуў з сябе кашулю, а гімнасцёрку адзеў на голае цела і кашуляй нанава ўбінтаваў Вялічку плячо.* К. Чорны.

**АДЗЯВАННЕ — РАЗДЗЯВАННЕ**

**Адзяванне.** Надзяванне, нацягванне вопраткі на сябе або на каго-небудзь іншага.

**Раздзяванне.** Здзяванне, сцягванне вопраткі з сябе або з каго-небудзь іншага.

*Адзяванне (раздзяванне) вучня, гаспадара, госця, кліента, наведвальніка, хворага*

*Непазбежныя працэдуры, раздзяванне і адзяванне займаюць нямала часу.* Я. Купала.

**АДОЗВА — КОНТРАДОЗВА**

**Адозва.** Пісьмовы або вусны зварот да каго-небудзь з заклікам, просьбай.

**Контрадозва.** Пісьмовы або вусны зварот, скіраваны супраць іншага пісьмовага ці вуснага звароту.

*Адозва (контрадозва) бальшавіцкая, бандыцкая, белагвардзейская, варожая, контррэвалюцыйная, партызанская, рэвалюцыйная, фашысцкая.*

*Яна папрасіла, каб усе памаўчалі, а сама ўзяла аловак і напісала тэкст адозвы: контрадозву на адозву бандыцкую* К. Чорны.

**АДПРАЎЛЕННЕ — ПРЫБЫЦЦЁ**

**Адпраўленне.** Ад'езд з якога-небудзь месца.

**Прыбыццё.** Прыезд у якое-небудзь месца.

*Адпраўленне (прыбыццё) аўтобуса, карабля, кацера, парахода, поезда.*

*Накіроўваючыся ў прыбалтыйскія рэспублікі ... кожны ведае — стрэлкі пераводзіць не трэба. У раскладзе руху пасажырскага транспарту адпраўленне і прыбыццё неабходна пазначыць згодна з часам пунктаў адпраўлення і назначэння.* ЛіМ.

**АДЧАЛІЦЬ — ПРЫЧАЛІЦЬ**

*незак.* адчальваць — прычальваць

**Адчаліць.** Аддаліцца ад берага, прыстані.

**Прычаліць.** Прыстаць да берага, прыстані.

*Адчаліць (прычаліць) баржы, боту, караблю, кацеру, лайнеру, лінкору, лодцы, чоўну, эсмінцу.*

*Як вусцішна ў лодцы на вадзе. Не цягне ні адчаліць, ні прычаліць.* А. Грачанікаў.

**АКТЫЎНЫ — ПАСІЎНЫ**

**Актыўны.** Дзейны, ініцыятыўны.

**Пасіўны.** Бяздзейны, безыніцыятыўны

*Актыўны, -ая, -ае (пасіўны, -ая, -ае) брыгадзір, дырэктар, дэпутат, кіраўнік, культмасавік, навучэнец, прафорг, старшыня, фізорг*

*Пасіўнага дырэктара заўсёды можна замяніць актыўным* А. Мальдзіс.

**АПОЎНАЧЫ — АПОЎДНІ**

**Апоўначы.** У сярэдзіне ночы (у 12 гадзін ночы).

**Апоўдні.** У сярэдзіне дня (у 12 гадзін дня).

*Апоўначы (апоўдні) ад'ехаць, адысці, закончыць, заснуць, пачаць, прыехаць.*

*Ён клаўся апоўначы.* К. Чорны. *Прыімчаўся ў горад апоўдні салдат.* К. Чорны.

**АПРАНУЦЦА — РАСПРАНУЦЦА**

*незак* апранацца — распранацца

**Апрануцца.** Адзець на сябе вопратку.

**Распрануцца.** Зняць з сябе вопратку.

*Апрануцца (распрануцца) павольна, самастойна, хутка.*

*Данік хуценька апрануўся і пабег да Куталевічаў.* Я. Брыль. *Толькі я распрануўся, бачу па дарозе едзе каламажка, панская, на рысорах.* Я. Маўр.

**АПТЫМІСТ — ПЕСІМІСТ**

**Аптыміст.** Той, якому ўласціва жыццярадаснае светаадчуванне, прасякнутае верай у лепшае будучае.

**Песіміст.** Той, якому ўласціва прыгнечанае светаадчуванне, прасякнутае нявер'ем у лепшае будучае.

*Аптыміст (песіміст) вядомы, вялікі, даўні, пастаянны.*

*Вы знаеце, я ніяк не магу вырашыць, да каго належу — да песімістаў ці да аптымістаў.* І. Шамякін.

**АПЯРЭДЗІЦЬ — АДСТАЦЬ**

*незак.* апярэджваць — адставаць

**Апярэдзіць.** Апынуцца спераду, абагнаць другіх у выкананні чаго-небудзь, у дасягненні пастаўленай мэты і пад.

**Адстаць.** Апынуцца ззаду, не паспеўшы за другімі ў выкананні чаго-небудзь, у дасягненні пастаўленай мэты і пад.

*Апярэдзіць (адстаць) перабудоўваючыся, рухаючыся, самазабяспечваючыся, спаборнічаючы, практычна, тэарэтычна.*

*«Рускія ўжо занялі Барысаў. Яны каля Мінска, абыходзяць Мінск, а нашы салдаты — асноўныя сілы — яшчэ па той бок Бярэзіны. Яны адсталі! Рускія апярэдзілі іх!» — Шульцэ застагнаў ад ярасці.* І. Мележ. *Бакуновіч і Міра адсталі ад салдат, якія апярэдзілі іх былі.* І. Шамякін.

**АРАШЭННЕ — АСУШЭННЕ**

**Арашэнне.** Штучнае абвадненне глебы, увільгатненне.

**Асушэнне.** Штучнае змяншэнне вады ў глебе, адвод лішку вады.

*Арашэнне (асушэнне) закончыць, запланаваць, пачаць, правесці, прадоўжыць; бязладнае, прадуманае.*

*На хатцы сельгасупраўленне, сельгастэхніка, сельгасхімія... Божа, даруй грахі мае! Затым БМУ асушэння, за ім БМУ арашэння... Будыніна хлебароба стала вышэй небаскроба.* М. Янчанка.

**АСАБІСТЫ (ПРЫВАТНЫ) — АГУЛЬНЫ (ГРАМАДСКІ)**

**Асабісты.** Які з'яўляецца ўласнасцю асобы, грамадства, яе спараджэннем.

**Агульны.** Які з'яўляецца ўласнасцю калектыву, яго спараджэннем.

*Асабісты, -ая, -ае (агульны, -ая, -ае) бібліятэка, вопыт, гаспадарка, думка, інтарэс, маёмасць, меркаванне, недахоп, пакой, поспех, скарб, уласнасць.*

*Мне на памяць прыйшлі словы вядомага філосафа Мантэня: «Спачатку асабістая памылковая думка становіцца агульнай, а потым ужо агульная памылковая думка становіцца асабістай.» Грамадскае ў вас стаіць вышэй асабістага.* А. Асіпенка. *Усяго ў сваёй картатэцы я налічыў больш за 20 буйных прыватных і грамадскіх калекцый, вывезеных з Беларусі ў пакуль што невядомым напрамку.* А. Мальдзіс.

**АСАЛОДА — ПАКУТА**

**Асалода.** Душэўнае задавальненне, якое выклікаецца ўдачаю, шанцаваннем.

**Пакута.** Душэўнае незадавальненне, якое выклікаецца няўдачаю, нешанцаваннем.

*Асалода (пакута) людская, чалавечая.*

*І тым не менш уся гэта сідня за сталом была для мяне пакутаю і ніяк не асалодаю.* У. Рубанаў.

**АСЦЯРОЖНЫ — АДЧАЙНЫ**

**Асцярожны.** Які дзейнічае з аглядкай, з асцярогай, з імкненнем прадбачыць магчымую небяспеку, непрыемнасць.

**Адчайны.** Які дзейнічае рызыкоўна, дзёрзка, безразважліва.

*Асцярожны, -ая, -ае (адчайны, -ая, -ае) афіцэр, дрэсіроўшчык, дыверсант, камандзір, падпольшчык, партызан, разведчык, салдат, утаймавальнік.*

*Страявы афіцэр, капітан, гэты чалавек дзіўным чынам спалучаў у сабе многія якасці, самыя супрацьлеглыя, напрыклад, адчайнага дыверсанта і надзвычай асцярожнага....* І. Шамякін.

**АТАКА — АБАРОНА**

**Атака. 1.** Імклівы напад на пазіцыі тых, хто абараняецца, з мэтай захопу гэтых пазіцый. **2.** Дзеянні спартсмена ці каманды ў гульнявых відах спорту, скіраваныя на дасягненне перамогі над сапернікам.

**Абарона. 1.** Адбіццё нападу тых, хто наступае, з мэтай утрымання занятых пазіцый. **2.** Дзеянні спартсмена ці каманды ў гульнявых відах спорту, скіраваныя на адбіццё нападу саперніка.

*Атака (абарона) аддзялення, арміі, батальёна, корпуса, палка, роты, узвода, фронту, часці; арганізаваная, масіраваная, прадуманая, сумбурная.*

*Атака (абарона) баскетбаліста, валейбаліста, тэнісіста, шахматыста, шашыста, футбаліста; арганізаваная, бязладная, прадуманая, сумбурная, хаатычная Атака атакай, але не грэх дбаць і пра абарону.* В. Быкаў. *Тбіліскае «Дынама» ў матчы са «Спартаком», настойваючы на атацы, грэбавала абаронай.* «Звязда».

**АЧАРНІЦЬ — АБЯЛІЦЬ**

*незак* ачарняць — абяляць

**Ачарніць.** Узвесці паклеп.

**Абяліць.** Абвергнуць паклеп.

*Ачарніць (абяліць) знарок, свядома, увачавідкі.*

*Есць шмат спосабаў ачарніць — зняславіць, зганьбіць, асарамаціць, запляміць, ашальмаваць, выставіць на пасмешышча, кінуць цень. І толькі адзін спосаб абяліць.* ЛіМ.

## Б

**БАГАТЫ — БЕДНЫ**

**Багаты.** Які жыве ў поўным дастатку, валодае значнай маёмасцю, вялікімі грашовымі сродкамі.

**Бедны.** Які жыве ў галечы, валодае нязначнай маёмасцю, мізэрнымі грашовымі сродкамі.

*Багаты, -ая, -ае (бедны, -ая, -ае) гандляр, гаспадар, жаніх, князь, люд, нявеста, пан, шляхціц.*

*З расказаў Герасіма я толькі ведаў, што бундаўцы абараняюць правы ўсіх гандляроў — бедных і багатых — на ўласнасць.* А. Якімовіч.

**БАГАТЫ (ЗАМОЖНЫ)** *(у знач. наз.)* — **БЕДНЫ** *(у знач. наз.)*

**Багаты.** Той, які жыве ў поўным дастатку, валодае значнай маёмасцю, вялікімі грашовымі сродкамі.

**Бедны.** Той, які жыве ў галечы, валодае нязначнай уласнай маёмасцю, мізэрнымі грашовымі сродкамі.

*Багаты (бедны) весяліцца, нараджаецца, паміраае, творыць, ушаноўваецца.*

*Не цураліся палешукі і пярсцёнкаў, бусаў, завушніц — іх рабілі самі. Багатыя — з золата, срэбра, бурштыну Бедныя — з дрэва, каменя, гліны .* Б. Сачанка. *А яшчэ пра наркаманію скажу Наркаманія — гэта хвароба, на якую бедныя зусім не хварэюць, а толькі заможныя Гэта агульнавядомая цяпер праўда.* «Ніва».

**БАГАЦЦЕ (БАГАЦТВА) — БЕДНАСЦЬ (ЖАБРАЦТВА)**

**Багацце. 1.** Значныя матэрыяльныя сродкі, грашовыя накапленні і пад. **2.** Пампезнасць, пышнасць.

**Беднасць. 1.** Нязначныя матэрыяльныя сродкі, грашовыя накапленні і пад. або адсутнасць іх. **2.** Убоства, мізэрнасць.

*Багацце (беднасць) людское (-ая), нечуванае (-ая), нябачанае (-ая), чалавечае (-ая).*

*Лепш у беднасці, ды з мілым, чым у багацці, ды з нямілым.* Прыказка. *Багацце (беднасць) афармлення, думкі, дызайна. Беднасць думак не схавала і багацце афармлення.* ЛіМ. *Снілася дзяўчыне воля і багацтва, а на яве выйшла — няволя, жабрацтва* Я. Купала.

**БАГАЧ (БА́ГАТЫР) — БЯДНЯК**

**Багач.** Чалавек, які з'яўляецца ўладальнікам значнага багацця.

**Бядняк.** Чалавек, які мае мала багацця або зусім яго не мае.

*Багач (бядняк) былы, вядомы, тутэйшы, цяперашні.*

*Багач ззяе ў пазалоце.* Я. Купала. *А ён — бядняк — жыве сабе, і ніхто яго не чапае.* К. Чорны. *Тут таксама кулакі былі, багатыры, аж страх.* К. Чорны. *Былі бednякі, у якіх мала што, а то і зусім нічога не было.* Б. Сачанка.

**БАЛБАТЛІВЫ — НЕМНАГАСЛОЎНЫ**

**Балбатлівы.** Схільны гаварыць празмерна, шматслоўна.

**Немнагаслоўны.** Схільны гаварыць лаканічна, нешматслоўна.

*Балбатлівы, -ая, -ае (немнагаслоўны, -ая, -ае) асоба, ваеннаслужачы, пасажыр, супрацоўнік, сусед.*

*Славік, сам балбатлівы, паважаў людзей немнагаслоўных і рашучых сказаў — зрабіў.* І. Шамякін.

**БЕЗБАРОДЫ** *(у знач. наз.)* — **БАРАДАТЫ** *(у знач. наз)*

**Безбароды.** Той, хто не мае бароды.

**Барадаты.** Той, хто мае бараду.

*Барадаты (безбароды) афіцэр, жаніх, рабочы, салдат, селянін.*

*Барадатыя і безбародыя, маладыя і старыя сядзяць і стаяць, дзе толькі можна, плячо ў плячо.* Я. Колас.

**БЕЛЫ— ЧОРНЫ**

**Белы.** Які мае колер снегу, малака.

**Чорны.** Які мае колер вугалю, сажы.

*Белы, -ая, -ае (чорны, -ая, -ае) бяроза, волас, вопратка, дым, зуб, кафля, маса, нітка, папера, птушка, рэдзька, фарба, хлеб.*

*Прырода не змагла — або не паспела — сумясціць у адным коласе якасці белага і чорнага хлеба.* «Звязда».

**БЕЛЫЯ** *(у мн., у знач. наз.)* — **ЧЫРВОНЫЯ** *(у мн., у знач. наз.)*

**Белыя.** Неафіцыйная назва расійскай арміі, якая супрацьстаяла Чырвонай Арміі ў грамадзянскую вайну.

**Чырвоныя.** Неафіцыйная назва Чырвонай Арміі.

*Белыя (чырвоныя) адступілі, загадалі, занялі, з'явіліся, наступілі, уварваліся.*

*Ну, скажы, баец, папраўдзе скажы: хто для вас лепш — белыя ці чырвоныя? Чырвоных ужо не было, а белыя яшчэ не паказваліся.* Я. Колас.

**БЛАНДЗІН — БРУНЕТ**

**Бландзін.** Мужчына са светлымі валасамі.

**Брунет.** Мужчына з цемнымі валасамі.

*Бландзін (брунет) высокі, малады, нізкі, стары, тыповы.*

*Тым часам праз горад ужо рупна тупалі нізенькі, вяртлявы брунет і даўгалыгі бландзін.* В. Быкаў.

**БЛІЗАРУКАСЦЬ — ДАЛЬНАЗОРКАСЦЬ**

**Блізкарукасць.** Недахоп зроку, пры якім вочы не бачаць далёка.

**Дальназоркасць.** Недахоп зроку, пры якім вочы не бачаць блізка.

*Блізарукасць (дальназоркасць) набытая, нязначная, прыродная, устойлівая.*

*Блізарукасць вачэй. Дальназоркасць вачэй.*

**БЛІЗКА (ЗБЛІЗКУ) — ДАЛЁКА (УДАЛЯЧЫНЬ, ЗДАЛЁКУ)**

**Блізка.** На малой адлегласці.

**Далёка.** На вялікай адлегласці.

*Блізка (далёка) адаць, ехаць, ісці, пабудавацца, размяшчацца, пражываць, служыць, чуваць.*

*Людзі з вёскі былі раскіданы па свеце: і далёка, куды пайшоў фронт, і блізка — за Дзвіной ці ў партызанскіх лагерах.* І. Пташнікаў. *«Без акуляраў не бачыш ужо?» — «Блізка бачу, удалячынь — не». — «Гэта горш,— нібы з пэўным падтэкстам, як мне здаецца, кажа маці.— А я ўдалячынь — за вярсту, а пад носам — як кацяня».* А. Петрашкевіч. *Ці здалёку ты прыбыў, ці зблізку, не спалохай гэту цішыню. Пакланіся, дружа, абеліску,— вечнаму нязгаснаму агню.* П. Пранузa. *Быў у яго нават гонар за сябе: от колькі знаёмых зблізку і здалёку — па ўсёй, можна сказаць, беларускай зямлі.* І. Мележ.

**БЛІСНУЦЬ — ЗНІКНУЦЬ**

*незак.* бліскаць — знікаць

**Бліснуць.** Раптоўна ярка заззяць, заблішчаць.

**Знікнуць.** Схавацца з віду, з поля зроку.

*Бліснуць (знікнуць) агню, дзянніцы, заранцы, зорцы, маладзіку, месяцу, сонцу, фары.*

*У паставога трывога, трывога: выкраў у сонца святло маладзік, бліснуў, ды, убачыўшы паставога, як за гарою, за хмараю знік.* П. Макаль.

**БЛЯДНЕЦЬ — ЧЫРВАНЕЦЬ**

*зак.* пабляднець — пачырванець

**Бляднець.** Рабіцца бледным, страчваючы натуральны колер твару.

**Чырванець.** Рабіцца чырвоным, страчваючы натуральны колер твару.

*Бляднець (чырванець) твару, шчакам*

*.Пан Богут тросся, бы ў хваробе; ён то бляднеў, то чырванеў*. Я. Колас.

**БОГ — ЧОРТ (Д'ЯБАЛ, САТАНА)**

**Бог.** Вярхоўная істота, якая нібыта стварыла свет і кіруе ім *(рэліг.)*.

**Чорт.** Міфічны злы дух, які супрацьстаіць Богу і мае выгляд істоты, пакрытай чорнай поўсцю, з рагамі, капытамі і хвастом.

*Ставіце свечку богу і моліцеся чорту.* Я. Колас. *А вось калі б вы прачыталі Дастаеўскага, дык бы ведалі, што калі ў душу не пусціць бога, дык у ёй абавязкова пасяляецца д'ябал.* В. Быкаў. *Судзі, Зямля, што здрадзілі табе, заткнулі вушы на твой плач, нябога. Навыдумлялі сатану і бога, каб апраўдаць хоць чым было сябе.* З. Дудзюк.

**БОЛЬШАСЦЬ — МЕНШАСЦЬ**

**Большасць.** Большая частка, большая колькасць каго-, чаго-небудзь.

**Меншасць.** Меншая частка, меншая колькасць каго-, чаго-небудзь.

*Большасць (меншасць) аднакласнікаў, аднакурснікаў, дэлегатаў, дэпутатаў, жыхароў, курсантаў, супрацоўнікаў, удзельнікаў.*

*Састаў цяперашняга парламента, працягваў дэпутат, не адэкватны сацыяльнаму саставу грамадства. Большасць у ім складаюць наменклатурныя работнікі, у той час як дэмакратычныя сілы знаходзяцца пакуль у меншасці.* «Звязда».

**БРАЦЬ — АДДАВАЦЬ (ВЯРТАЦЬ)**

*зак.* узяць — аддаць

**Браць.** Забіраць што-небудзь чужое, не сваё.

**Аддаваць.** Вяртаць што-небудзь узятае.

*Браць (аддаваць) боекамплект, веласіпед, зброю, інструмент, кнігу, прадукт, рэч, рукапіс*

*І рэдка калі мярцвяк прыходзіць з добрымі намерамі, часцей за ўсё з прэтэнзіямі, чагосьці патрабуе. То каб ты аддаў тое, што ў яго, калі яшчэ жывы — чалавекам быў, браў, ды не паспеў ці забыўся аддаць, то каб ты зрабіў, што абяцаў, ды не зрабіў, то яшчэ штось выдумае.* Б. Сачанка. *У яго, бачыш, нехта на некалькі дзён ля пад'езда бярэ веласіпед, крыху псуе яго і, як ні ў чым не бывала, вяртае гаспадару.* ЛіМ.

**БРУДНЫ — ЧЫСТЫ**

**Брудны. 1.** Які са слядамі бруду, гразі; запэцканы. **2.** Які выклікае маральную агіду.

**Чысты. 1.** Які без бруду, гразі; не запэцканы. **2.** Які выклікае маральную асалоду.

*Брудны, -ая, -ае (чысты, -ая, -ае) акно, вопратка, вядро, двор, памяшканне, пасуда, салон. Брудны, -ая, -ае (чысты, -ая, -ае) думка, душа, намер, работа, сумленне.*

*Коннік злез з каня і павёў яго паўз зароспую зеллем канаўку, з якой тхнула ўсім тым, што выліваецца гаспадынямі з брудных вёдраў.* К. Чорны. *Міхалка чуў, што Скуратовіч, узяўшы чыстыя вёдры, вышаў у сенцы, адсунуў засоўку ў дзвярах.* К. Чорны. *Урэшце, няма бруднай работы, ёсць брудная душа.* І. Новікаў.

**БУДЗЕНЬ — СВЯТА**

**Будзень.** Будзённы, не святочны дзень.

**Свята.** Святочны, не будзённы дзень.

*Будзень (свята) пачаўся (пачалося), скончыўся (скончылася); звычайны (-ае).*

*Які сёння дзень і якая дата? Для каго — будзень, для каго — свята?* А. Грачанікаў.

**БУЙНЫ — ДРОБНЫ**

**Буйны. 1.** Які складаецца з вялікіх аднародных адзінак. **2.** Значны па свайму маштабу, вартасці.

**Дробны. 1.** Які складаецца з малых аднародных адзінак. **2.** Нязначны па свайму маштабу, вартасці.

*Буйны, -ая, -ое ( дробны, -ая, -ае ) град, дождж, зерне, пясок, шрот, шчэбень, ягада*

*Град на дварэ ўсё большаў. Восілене заўважыла, што паміж дробных, з гарошыну, градзін трапляліся ўжо больш буйныя. Некаторыя былі падобны на галубінае яйка.* П. Броўка.

**БЫЛОЕ** *(у знач. наз.)* — **БУДУЧАЕ (НАСТУПНАЕ)** *(у знач. наз.)*

**Былое.** Тое, што функцыяніравала, існавала ў мінулым.

**Будучае.** Тое, што будзе функцыяніраваць, існаваць у будучым.

*Былое (будучае) сваё, слаўнае, чужое.*

*Нейкі дзесятак хвілін увабраў у сябе і былое і будучае, раздушваючы апошнюю макавінку, перакрэсліваючы жыцці.* «Маладосць». *Памяць, рэха твае — гэта песня, прапетая ўчора,— пераэжытага попел і жар неастылай крыві. З перабітым крылом я адольваў твае крутагоры, каб узняцца вышэй над былым і наступным сваім.* А. Звонак.

**БЫЛЬ — НЕБЫЛІЦА (ЛЕГЕНДА)**

**Быль.** Тое, што існавала, адбывалася.

**Небыліца.** Тое, што не існавала, не адбывалася, выдумка.

*Быль (небыліца) даўняя, тутэйшая; расказваецца, успамінаецца.*

*А яшчэ хтосьці байкі бае, расказвае розныя былі і небыліцы, ды так, што заслухаешся.* Б. Сачанка. *Буйніцкага любім усе — і акцёры і гледачы. Аб гэтым сведчыць ужо і тое, што на радзіме І. Буйніцкага на працягу многіх год пасля яго смерці світка выдатнага акцёра, у якой ён звычайна выступаў, перадавалася лепшаму выканаўцу роляў з рэпертуару. І. Буйніцкага. Цяпер ужо цяжка ўстанавіць — быль гэта ці легенда.* ЛіМ.

**БЫЦЦЁ — НЕБЫЦЦЁ**

**Быццё.** Наяўнасць жыцця, існавання.

**Небыццё.** Адсутнасць жыцця, існавання.

*Быццё (небыццё) людское, чалавечае*

*Суткі знаходзілася малое ў аддзяленні рэанімацыі на страшнай мяжы паміж быццём і небыццём, і суткі, змучаная чаканнем самага страшнага, Лідзія Пятроўна не-не ды ўсхоплівалася: ці прыйшла нявестка.* «Звязда».

**БЯЛЕЦЬ — ЧЫРВАНЕЦЬ**

*зак.* пабялець — пачырванець

**Бялець.** Станавіцца белым ад адліву крыві.

**Чырванець.** Пакрывацца румянцам, станавіцца чырвоным ад прыліву крыві.

*Бялець (чырванець) твару, шыі, адразу, імгненна, паступова, умомант.*

*Нікіфаровіч паглядаў на Кузьму і заўважыў, што той часта мяняецца ў твары — то бялее, то чырванее.* П. Броўка.

**БЯЛЮТКІ — ЧАРНЮТКІ**

**Бялюткі.** Які вельмі белы.

**Чарнюткі.** Які вельмі чорны.

*Бялюткі, -ая, -ае (чарнюткі, -ая, -ае) парасё, птушанё, трусянё; конь, лебедзь, трус.*

*Раптам на дарожцы саду зацюкалі конскія капыты і паказаліся два кані — адзін чарнюткі, другі бялюткі.* Я. Маўр.

**БЯЛЯВЫ — ЧАРНЯВЫ**

**Бялявы.** Які не зусім белы.

**Чарнявы.** Які не зусім чорны.

*Бялявы, -ая, -ае (чарнявы, -ая, -ае) волас, галава, лапа, покрыў, скура, спіна, хвост.*

*У Савосева суседа быў пярэсценькі каток... Нос чарнявы, хвост бялявы, задзірасценькі.* Я. Колас.

**БЯЛЯВЫ** (у знач. *наз.*) — **ЧАРНЯВЫ** (у знач. *наз.*)

**Бялявы.** Той, які не зусім белы.

**Чарнявы.** Той, які не зусім чорны.

*Бялявы, бялявая (чарнявы, чарнявая) выступае, гаворыць, перапыняе, працуе, пытаецца.*

*«Што гэта за ён такі?» — буркнуў чарнявы, сурова і падазрона гледзячы на пісьменніка.— «От... хлопец пабачым.. » — улагодліва заўважыў бялявы.* Я. Колас. *Бялявы піша вершы — Чорны стукае ў грудзі сабе, а чарнявы — прозу — палец пераносіцца на Труса.* М. Лужанін.

**БЯСПЕЧНЫ — НЕБЯСПЕЧНЫ**

**Бяспечны.** Які не пагражае небяспекай. **Небяспечны.** Які пагражае небяспекай.

*Бяспечны, -ая, -ае (небяспечны, -ая, -ае) аперацыя, пасада, работа, скорасць, служба.*

*З такімі паперамі яму далі б самую бяспечную пасаду, але ён сам папрасіў самую небяспечную — камандзіра разведкі дывізіі.* І. Шамякін.

## В

**ВАЖНА — НЯВАЖНА**

**Важна.** Істотна ў якіх-небудзь адносінах.

**Няважна.** Неістотна ў якіх-небудзь адносінах.

*Важна (няважна) заўсёды, часам.*

*Цікавіўся сам Піліпоўскі гэтаю справаю... Гэта няважна. Важна тое, што Хурс, слухаючы Піліпоўскага, лішні раз падумаў пра той план.* К. Чорны.

**ВАРТАСЦЬ — ЗАГАНА (НЕДАХОП)**

**Вартасць.** Станоўчая якасць, якая з'яўляецца паказчыкам або добрага фізічнага стану, або высокага маральнага аблічча, або дасканалага прафесіянальнага майстэрства каго-небудзь.

**Загана.** Адмоўная якасць, якая з'яўляецца паказчыкам або дрэннага фізічнага стану, або нізкага маральнага аблічча, або недасканалага прафесіянальнага майстэрства каго-небудзь.

*Вартасць (загана) артыста, вучонага, госця, кіраўніка, палітыка, скульптара, спартсмена, спецыяліста.*

*Адчуваючы прыемную стомленасць, яны вялі лянівую размову аб вартасцях і заганах гасцей.* ЛіМ. *Пра яго вартасці трэба яшчэ дапытацца, а недахопы найперш у кожнага па палічках раскладзены.* В. Быкаў.

**ВЕРА — НЯВЕР'Е**

**Вера.** Упэўненасць у здзяйсненні, ажыццяўленні чаго-небудзь.

**Нявер'е.** Няўпэўненасць у здзяйсненні, ажыццяўленні чаго-небудзь.

*Вера (нявер'е) дарослага, дзіцяці; людская (-ое); знікае, з'яўляецца.*

*У ягоных расказах дзіўным чынам перапляталіся выдумка і праўда, фантастыка і сапраўднасць, вера ў цуды і цудоўнае з наіўным нявер'ем малога, якое ўсё пабачыла і нічаму ўжо не здзіўляецца.* А. Асіпенка.

**ВЕРАГОДНЫ — НЕВЕРАГОДНЫ**

**Верагодны.** Які адпавядае рэчаіснасці.

**Неверагодны.** Які не адпавядае рэчаіснасці.

*Верагодны, -ая, -ае (неверагодны, -ая, -ае) гісторыя, легенда, прыгода, чутка.*

*У мястэчку бытуюць самыя разнастайныя легенды, верагодныя і неверагодныя.* Р. Семашкевіч.

**ВЕРНАСЦЬ — ЗДРАДА**

**Вернасць.** Стойкасць і непахіснасць у сваіх пачуццях, у выкананні абавязкаў, у абяцаннях, запэўніваннях і пад.

**Здрада.** Парушэнне вернасці ранейшым сваім пачуццям, абавязкам, абяцанням, запэўніванням і пад.

*Вернасць (здрада) абавязку, доўгу, ідэалам, прысязе, радзіме.*

*Няўжо мы ніколі не вернемся ў той неазмрочаны час. калі ані здрады, ні вернасці не існавала для нас?.* А. Грачанікаў.

**ВЕРНЫ — НЯВЕРНЫ**

**Верны.** Надзейны, адданы.

**Няверны.** Ненадзейны, здрадлівы.

*Верны, -ая, -ае (няверны, -ая, -ае) ахова, вайсковец, сябра, часць.*

*Колькасць няверных ураду воінскіх часцей інтэнсіўна павялічвалася.* І. Шамякін.

**ВЕРУЮЧЫ** *(у знач. наз.)* — **НЯВЕРУЮЧЫ** *(у знач наз.)*

**Веруючы.** Той, хто верыць у існаванне Бога.

**Няверуючы.** Той, хто не верыць у існаванне Бога.

*Веруючы, -ая, -ае (няверуючы, -ая, -ае) асоба, грамадзянін, публіка.*

*Мы гаворым пра аб'яднанне намаганняў веруючых і няверуючых пры ўмове палітычнай лаяльнасці царквы.* ЛіМ.

**ВЕРХ — НІЗ**

**Верх.** Верхняя частка чаго-небудзь.

**Ніз.** Ніжняя частка чаго-небудзь.

*Верх (ніз) абутку, бочкі, будынка, вагона, вопраткі, дрэва, палаткі, прадмета, рэчы, скрынкі, шара.*

*Аператыўнікі агледзелі скрынку з усіх бакоў: ніз, верх і бакі цэлыя, пячаць на месцы.* С. Грахоўскі.

**ВЕРХНІ — НІЖНІ**

**Верхні. 1.** Які знаходзіцца зверху, размешчаны наверсе. **2.** Які надзяваюць паверх бялізны. **3.** Які належыць да вышэйшых звенняў улады.

**Ніжні. 1.** Які знаходзіцца знізу, размешчаны ў нізе. **2.** Які надзяваюць непасрэдна на цела. **3.** Які належыць да ніжэйшых звенняў улады.

*Верхні, -яя, -яе (ніжні, -яя, -яе) акно, губа, канечнасць, край, паверх, паліца, палуба, сківіца, частка.*

*Не ззялі толькі аніякімі бляскамі верхнія і ніжнія паліцы — там стаялі кнігі па мовазнаўстве.* Р. Семашкевіч.

*Верхні, -яя, -яе (ніжні, -яя, -яе) адзежа, адзенне, вопратка.*

*«Я толькі застаюся хрысціянінам,— адказаў Мікалай.— Яшчэ хто хоча судзіцца з табою і ўзяць ад цябе верхнюю адзежу, аддай яму і ніжнюю».* Я. Колас.

*Верхні, -яя, -яе (ніжні, -яя, -яе) рада, палата, управа.*

*Выхад на пенсію Арцёма Гаўрылавіча, змены, што адбыліся ў верхніх і ніжніх эшалонах улады, ды і нечаканы начны сон усхвалявалі яго, пасеялі нейкую як бы няўпэўненасць, трывогу.* Б. Сачанка.

**ВЕРЫЦЬ — СУМНЯВАЦЦА**

*зак.* паверыць — усумніцца

**Верыць.** Быць перакананым, упэўненым у чым-небудзь.

**Сумнявацца.** Быць непераканаdebным, няўпэўненым у чым-небудзь.

*Верыць (сумнявацца) пастаянна, поўнасцю, часткова.*

*Сёй-той яму верыць. А сёй-той сумняваецца.* Б. Сачанка.

**ВЕСЕЛА — СУМНА**

**Весела.** Радасна, бадзёра.

**Сумна.** Маркотна, прыгнечана.

*Весела (сумна) заўсёды, часам, штовечар, штодня; апавядаць, апяваць.*

*Мне сумна, але разам з тым і весела.* К. Чорны.

**ВЕТЛІВАСЦЬ — ГРУБАСЦЬ**

**Ветлівасць.** Пачцівасць, прыветнасць у адносінах з людзьмі.

**Грубасць.** Непачцівасць, непрыветлівасць у адносінах з людзьмі.

*Ветлівасць (грубасць) уласціва, характэрна; людская, спадчынная.*

*Грубасць адных ураўнаважваецца ветлівасцю другіх.* «Чырвоная змена».

**ВЕШАЦЬ — ЗНІМАЦЬ**

*зак.* павесіць — зняць

**Вешаць.** Надаваць чаму-небудзь вісячае становішча.

**Знімаць.** Вызваляць што-небудзь з вісячага становішча.

*Вешаць (знімаць) абраз, адозву, ікону, карціну, партрэт, плакат.*

*«Ну, кажы, шыла ж у мяшку не ўтаіш!» — «А што казаць, калі яно і так відно: вунь Жэнік Рэпка зняў абраз і на покуці партрэт Сталіна павесіў».* В. Адамчык.

**ВІДНО — ЦЁМНА**

**Відно.** Пра наяўнасць святла або дастатковасць асвятлення дзе-небудзь.

**Цёмна.** Пра адсутнасць святла або недастатковасць асвятлення дзе-небудзь.

*Відно (цёмна) кругом, навокал; было, стала*
*«Відно яшчэ як, а ў лесе ўжо зусім цёмна».— гаварыў ён сам. спыняючыся, каб перадыхнуць.* К. Чорны.

**ВІДУШЧЫ** (*у знач. наз.*) — **СЛЯПЫ** (*у знач. наз.*)
**Відушчы.** Той, які мае зрок, бачыць.
**Сляпы.** Той, які пазбаўлены зроку, не бачыць.
*Відушчы (сляпы) адчувае.*
*Сляпы, той, вядома, не бачыць хараства. Ладна, гэта ягоная бяда. А відушчы чаму не хоча бачыць?* А. Асіпенка.

**ВІТАЦЦА — РАЗВІТВАЦЦА**
*зак.* павітацца — развітацца
**Вітацца.** Абменьвацца прывітальнымі словамі, узаемным поціскам рук і пры сустрэчы.
**Развітвацца.** Абменьвацца развітальнымі словамі, узаемным поціскам рук і пры расставанні.
*Вітацца (развітвацца) па-брацку, па-сяброўску, сардэчна, холадна, цёпла.*
*Нават пазней ужо, калі стаў падлеткам, мне заўсёды было лягчэй зайсці да каго-небудзь, кудынебудзь і павітацца, чым развітацца і выйсці, здавалася, што раблю я гэта не так, не ў час, не па правілах.* І. Шамякін.

**ВОЛЬНЫ** (*у знач. наз.*) — **ЗНЯВОЛЕНЫ (АРЫШТАНТ)** (*у знач. наз.*)
**Вольны.** Той, які знаходзіцца на волі, на свабодзе і нікому не падпарадкоўваецца.
**Зняволенны.** Той, які пазбаўлены волі, свабоды.
*Вольны (зняволены) пражывае, працуе.*
*Адзінага доктара адправіць на павал ён не мог. Хто б тады лячыў зняволеных і вольных.* С. Грахоўскі. *І вызваленых на камендацкі лагпункт вялі пад канвоем. Павёў стралок і выратавальніцу многіх арыштантаў, вольных..* С. Грахоўскі.

**ВОЛЯ — НЯВОЛЯ**
**Воля.** Свабода, незалежнасць.
**Няволя.** Адсутнасць незалежнасці.
*Воля (няволя) рэальная, сапраўдная.*
*Выхаваныя ў шматгадовай няволі, мы ненавідзім тых, хто памкнуўся да волі.* В. Быкаў.

**ВОСТРЫ — ТУПЫ**
**Востры.** Добра адвостраны, з вельмі звужаным канцом ці краем.
**Тупы.** Слаба завостраны, са тупленым канцом ці краем.
*Востры, -ая, -ае (тупы, -ая, -ое) брытва, канец, каса, лязо, меч, нож, нажніцы, серп, сякера, тапор, шабля, шыла.*
*Або ці адныя толькі вострыя і тупыя шылья, іголкі, нажніцы былі ў іх дварышчы, у чыстай палове іх хаты?.* А. Лойка.

**ВЫГЛЯНУЦЬ (ВЫПЛЫСЦІ) — СХАВАЦЦА**
*незак.* выглядваць — хавацца
**Выглянуць.** Паказацца, стаць відным (пра нябесныя свяцілы).
**Схавацца.** Знікнуць, перастаць быць відным (пра нябесныя свяцілы).
*Выглянуць (схавацца) ветаху, зорцы, маладзіку, месяцу, поўні, сонцу.*
*З-за хмар выглянула сонца, потым зноў схавалася.* М. Гіль. *Над ельнікам выплываў і хаваўся маладзічок.* М. Лужанін.

**ВЫЙГРАЦЬ — ПРАЙГРАЦЬ**
*незак.* выйграваць — прайграваць
**Выйграць. 1.** Набыць што-небудзь у азартнай гульні, розыгрышы латарэі і пад. **2.** Атрымаць перамогу ў спартыўных спаборніцтвах.
**Прайграць. 1.** Страціць што-небудзь у азартнай гульні, розыгрышы латарэі і пад. **2.** Пацярпець паражэнне ў спартыўных спаборніцтвах.
*Выйграць (прайграць) грошы, зямлю, маёмасць, маёнтак.*
*Я сядзеў позна і таксама назіраў за гульнёй. Сумаваў, калі бацька прайграваў, радаваўся, калі выйграваў.* З. Бядуля.

*Выйграць (прайграць) забег, заплыў, матч. тайм. раунд, турнір.*
*Міхаіл Вяргеенка зазначыў: маглі выйграць матч, а маглі і прайграць, аднак для перамогі не хапіла думкі.* «Звязда».

**ВЫСАКАРОДНАСЦЬ — ПОДЛАСЦЬ**

**Высакароднасць.** Маральнасць, спалучаная з крыштальнай чысцінёю, велікадушшам.

**Подласць.** Амаральнасць, спалучаная з эгаістычнасцю і несумленнасцю.

*Высакароднасць (подласць) людская, чалавечая.*
*У барацьбе ўсенароднай непрымірымыя бакі: там — подласць, тут — высакароднасць, тут людзі, там — хлусы, дзялкі, там — нізасць, тут — людская годнасць.* В. Жуковіч.

**ВЫСОКІ — НІЗКІ (НЕВЫСОКІ)**

**Высокі. 1.** Які мае вялікую працягласць знізу ўверх. **2.** Значнага. росту, доўгі. **3.** Высакародны па свайму характару.

**Нізкі. 1.** Які мае малую працягласць знізу ўверх. **2.** Нязначнага росту, кароткі. **3.** Ганебны па свайму зместу і характару.

*Высокі, -ая. -ае (нізкі, -ая, -ае) будынак, дрэва, корпус, крыж, куст, лес. плот, слуп.*
*«Бачыце. дом высокі, але так здаецца. Гэта стыль такі».— «Чаму ж, каб ён здаваўся нізкім, калі сапраўды ён высокі?».* К. Чорны.
*Высокі, -ая, -ае (нізкі, -ая, -ае) ваенны, дзяўчына, жанчына, мужчына, юнак.*
*Камандзір слухаў уважліва. Потым паставіў цэлы рад кароткіх пытанняў: як выглядае незнаёмы чалавек, малады ён ці стары, нізкі ці высокі і як ён адзеты.* Я. Колас.
*Высокі, -ая, -ае (нізкі, -ая, -ае) намер, пачуццё, учынак.*
*А ўсе мы людзі... чалавекі... і ўсё чалавечае, высокае і нізкае, сядзіць у нас... моцна сядзіць... Прыватнік сядзіць....* І. Шамякін. *Дошчачка быў высокі, плячысты, асілак дый годзе. гаспадыня была да пары яму — невысокая. але таўстатая. ружавашчокая.* Г. Далідовіч.

**ВЫСУНУЦЦА — СХАВАЦЦА**

*незак.* высоўвацца — хавацца

**Высунуцца.** Перамясціўшыся, перарастаць быць бачным.

**Схавацца.** Часткова паказацца адкуль-небудзь, выставіцца.

*Высунуцца (схавацца) вужу, змяі. крату; галаве, калену, лапе, локцю, назе.*
*Міця змеціў, як каля пабеленага жаўтлявага вугла над раз'еханым яловым частаколам высунулася і схавалася зноў нейчая галава.* В. Адамчык.

**ВЫТОК — ВУСЦЕ**

**Выток.** Месца, адкуль выцякае рака ці ручай.

**Вусце.** Месца ўпадзення ракі ці ручая ў вадаём.

*Выток (вусце) ракі, ручая.*
*Ад вытоку да вусця Ліелупе не перавышае 160 км* («Чырвоная змена»).

**ВЫЦЯГВАЮЧЫ — ПАДГІНАЮЧЫ**

*зак.* выцягнуўшы — падагнуўшы

**Выцягваючы.** Робячы што-небудзь выпрастаным.

**Падгінаючы.** Робячы што-небудзь сагнутым.

*Выцягваючы (падгінаючы) ногі.*
*Пасля таго, як сук абламаўся, чалавек, відаць, сеў на зямлю і сядзеў так, бо было відно, як ён раскоўзаў абцасамі імшыстую зямлю і пассоўваў хвойныя іголкі, то выцягваючы, то падгінаючы ногі, — так робіць вельмі стомлены, намучаны працай або змаганнем чалавек.* К. Чорны.

**ВЯДОМЫ — НЕВЯДОМЫ**

**Вядомы.** Такі, пра якога ведаюць.

**Невядомы.** Такі, пра якога не ведаюць.

*Вядомы, -ая, -ае (невядомы, -ая, -ае) вуліца, горад, герой, дарога, імя, кніга, мастак, мелодыя.*
*Колькі іх, вядомых і невядомых герояў, аддалі жыццё ў першы ж дзень вайны.* «Звязда».

**ВЯЗАЦЬ — РАСПУСКАЦЬ**

*зак.* звязаць — распусціць

**Вязаць.** Плетучы кручком ці пруткамі, рабіць з нітак вопратку, карункі, сетку і пад.

**Распускаць.** Спускаючы з петляў, раскідваць звязаныя з нітак вопратку, карункі, сетку і пад.

*Вязаць (распускаць) панчоху, рукавіцу, світэр, сурвэтку, шалік, шкарпэтку.*

*У другім вузкім бараку жыло каля дваццаці мамак з розных лагпунктаў. Усе нешта шылі, латалі, распускалі, вязалі і чакалі сігналу на кармленне дзяцей.* С. Грахоўскі.

**ВЯЛІКІ — МАЛЫ**

**Вялікі. 1.** Значны па сваіх памерах, велічыні, колькасці. **2.** Значны па свайму маштабу, вартасці, якасцях. **3.** Значны па сваёй службовай пасадзе ці грамадскай актыўнасці. **4.** Працяглы ў часе.

**Малы. 1.** Нязначны па сваіх памерах, велічыні, колькасці. **2.** Нязначны па свайму маштабу, вартасці, якасцях. **3.** Малазначны па сваёй службовай пасадзе ці грамадскай актыўнасці. **4.** Непрацяглы ў часе.

*Вялікі, -ая, -ае (малы, -ая, -ое) будынак, вадаём, гарнізон, двор, дзяржава, дрэва, зала, каменне, карціна, крыж, купіна, муха, мядзведзь, павук, птушка, пчала, рыба, сабака, чарвяк, яшчарка.*

*Мяне асабліва здзівіла, калі я трапіў на Далёкі Усход, што ва ўсіх вадаёмах, вялікіх і малых, была рыба.* У. Дубоўка.

*Вялікі, -ая, -ае (малы, -ая, -ое) клопат, падзея, просьба, сакрэт.*

*Вот у вас у кожнага свае клопаты. І вялікія і малыя.* Г. Далідовіч.

*Вялікі, -ая, -ае (малы, -ая, -ое) арганізатар, кіраўнік, начальнік, функцыянер.*

*Лепш бы ён ніякім начальнікам не быў — ні вялікім, ні малым, і лепш бы пешкі хадзіў ды здаровы быў.* А. Петрашкевіч.

*Вялікі, -ая, -ае (малы, -ая, -ое) водпуск, перапынак, рэйс.*

*І на малых і на вялікіх перапынках вучні ўсе, як адзін, выбягалі з класа, бо на дварэ ўжо каторы дзень было не па-асенняму цёплае надвор'е.* «Чырвоная змена».

**ВЯРХІ** *(у мн.)* **— НІЗЫ** *(у мн.).*

**Вярхі.** Вышэйшыя, кіруючыя колы.

**Нізы.** Ніжэйшыя, кіруемыя колы.

*Вярхі (нізы) грамадства.*

*Не можаш свой узняць збалелы голас, ды так — каб ён устрос нізы, вярхі.* М. Арочка.

**ВЯСЁЛЫ — СУМНЫ (МАРКОТНЫ, ПАНУРЫ, ХМУРНЫ)**

**Вясёлы.** Прасякнуты радасцю, весялосцю.

**Сумны.** Прасякнуты душэўнай горыччу, сумам, журбою, непрыветлівы, маўклівы, суровы.

*Вясёлы, -ая, -ае (сумны, -ая, -ае) аблічча, выгляд, люд, мелодыя, музыка, настрой, спектакль, твар, успамін.*

*Прыбраныя прыгожа і не дужа прыгожа людзі, здаецца,— вясёлыя, а то і сумныя, а найбольш раўнаважныя; людзі беглі-спяшаліся, быццам на далёкі, чужы пажар.* М. Гарэцкі. *Верын настрой у апошні час не падабаўся — няроўны зрабіўся: то залішне вясёлая, то неўласціва маркотная.* І. Шамякін. *Нешта праз паўгода пасля жончынай смерці ён сцураўся карчмы, узяў сабе праз сельсавет кавалак зямлі і асеў на ёй. У тыя часы ён стаў пануры і маўклівы. Нават цяжка было паверыць, што яшчэ нядаўна ён быў такі вясёлы і жартаўлівы.* К. Чорны.

*Твары людзей, і хмурныя і вясёлыя, і са спачуваннем, і са смехам глядзелі на Мацвея.* К. Чорны.

**ВЯСНА — ВОСЕНЬ**

**Вясна. 1.** Пара года паміж зімою і летам. **2.** Пра маладосць.

**Восень. 1.** Пара года паміж летам і зімою. **2.** Пра старасць.

*Вясна (восень) будучая, дажджлівая, мінулая, пагодлівая, позняя, ранняя, сонечная, сухая, цёплая, халодная; набліжаецца, мінае, праходзіць.*

*Лукашова хата славілася вечарынамі Здавён, з восені да вясны, нязменна, дзень у дзень, па няпісаным сялянскім законе збіралі яны амаль усю вёску.* Я. Пархута.
*Вясна (восень) чалавечая.*
*Не заўважыў — выраслі сыны. Шапкі аднаго памеру носім. У гарэзаў — светлы час вясны Да мяне ж крадзецца ціха восень.* І. Калеснік.

# Г

**ГАВАРКІ — МАЎКЛІВЫ**

**Гаваркі.** Схільны да размоў.

**Маўклівы.** Схільны да маўчання.

*Гаваркі, -ая, -ое (маўклівы, -ая, -ае) дзіця, госць, жанчына, мужчына, пасажыр, родзіч, салдат, сваяк.*

*Наколькі гаваркі быў Сташэўскі, настолькі маўклівы каваль.* ЛіМ.

**ГАНАРОВЫ — ГАНЕБНЫ**

**Ганаровы.** Варты пашаны, павагі.

**Ганебны.** Варты асуджэння, ганьбавання.

*Ганаровы, -ая, -ае (ганебны, -ая, -ае) дагавор, пагадненне, смерць, учынак.*

*Сталін, не спасылаючыся, вядома, на Троцкага, гаварыў фактычна тое ж самае: наперадзе смерць ганаровая, а ззаду — ганебная.* «Звязда».

**ГАНАРЫЦЦА — САРОМЕЦЦА**

*зак.* заганарыцца — засаромецца

**Ганарыцца.** Адчуваць гонар, задавальненне за свае паводзіны, учынкі і пад.

**Саромецца.** Адчуваць сорам, нёмкасць за свае паводзіны, учынкі і пад.

*Ганарыцца (саромецца) кожнаму, самому, варта, неабходна, трэба.*

*«Мы гімназій не канчалі»,— адказаў Марк. «Гэтага трэба саромецца, а ты ганарышся»,— маці разрэзала шпагат, на яго былі нанізаны сушкі, высыпала іх у сухарніцу.* А. Асіпенка.

**ГАРАЧЫ — ХАЛОДНЫ (АСТЫЛЫ)**

**Гарачы.** Які мае высокую тэмпературу.

**Халодны.** Які мае нізкую тэмпературу.

*Гарачы, -ая, -ае (халодны, -ая, -ае) вадкасць, вецер, печ, пот, пясок, страва, цела.*

*А там зноў краны з гарачай і халоднай вадой — пускай яе сабе, колькі твая душа пажадае.* Я. Купала. *Неяк Марыля напарыла буракоў з градкі, і яны елі іх два дні — спярша гарачыя, а пасля астылыя.* В. Быкаў.

**ГАРАЧЫНЯ — ХОЛАД**

**Гарачыня.** Адчуванне цеплыні ў целе (ад хваробы, страху і пад.).

**Холад.** Адчуванне дрыжыкаў (ад хваробы, страху і пад.).

*Гарачыня (холад) знікла (знік), з'явілася (з'явіўся).*

*Хрысця ўчула, як ліпучы пот спярша холадам, а потым гарачынёю абліў спіну, выступіў на лобе, замакрэўся нейкай гідкасцю на далонях.* В. Адамчык.

**ГАРКАВАТЫ — САЛАДКАВАТЫ**

**Гаркаваты.** Які трохі горкі.

**Саладкаваты.** Які трохі салодкі.

*Гаркаваты, -ая, -ае (саладкаваты, -ая, -ае) водар, гародніна, напітак, настойка, прадукт, садавіна, сок.*

*Ягоныя рукі зжыліся з металам, вочы з машынамі, з велізарнымі скляпеннямі цэхаў, а лёгкія — з паветрам, у якім саладкаваты пах дрэў і траў аздоблены гаркаватым пахам дымку.* П. Броўка.

**ГАРМОНІЯ — ДЫСГАРМОНІЯ**

**Гармонія.** Зладжанасць, узаемная адпаведнасць асобных якасцей, прыкмет, з'яў і пад.

**Дысгармонія.** Разладжанасць, неадпаведнасць асобных якасцей, прыкмет, з'яў і пад.

*Гармонія (дысгармонія) гукаў, пачуццяў, танальнасцей, фарбаў, эмоцый.*

*Жыццё не можа спрыяць гармоніі чалавека, але гэта не азначае, што сам чалавек і само жыццё толь-*

*кі дысгарманічныя Сэнс жыцця ў яго гармоніі і дысгармоніі.* М. Крыванос.

**ГЛУХА — ЗВОНКА (РЭЗКА)**

**Глуха.** Невыразна, ціха, бясшумна.

**Звонка.** Гучна, гулка.

**Рэзка.** Востра, пранізліва.

*Глуха (звонка) гучаць, званіць, звінець.*

*Быццам я ля мінулага блізка. Сэрца поўнае светлай тугі. Зноў званы зазванілі над Мінскам, першы — глуха і звонка — другі.* Ю. Свірка. *Рэха рэзка гучыць на добрае надвор'е, а глуха на дрэннае.*

**ГЛУХІ — ШУМНЫ**

**Глухі.** Які знаходзіцца ў глушы, далёка ад населеных месц, без людскога шуму, малалюдны ці бязлюдны.

**Шумны.** Які поўны людскога шуму, мнагалюдны.

*Глухі, -ая, -ое (шумны, -ая, -ае) вёска, вуліца, двор, квартал, куток, парк, плошча, раён, сквер.*

*З гадзіну сноўдаўся ён па вуліцах шумных і глухіх.* Я. Колас.

**ГЛЫБІНЯ — МЕЛЬ**

**Глыбіня.** Месца ў вадаёме са значнай адлегласцю ад паверхні вады да дна.

**Мель.** Месца ў вадаёме з нязначнай адлегласцю ад паверхні вады да дна.

*Глыбіня (мель) азярыны, возера, затокі, копанкі, рэчкі,сажалкі.*

*То глыбіня, то раптам мель, то сівер люты, то агонь.* П. Броўка.

**ГЛЫБОКА — МЕЛКА (ПЛЫТКА)**

**Глыбока.** Пра значную глыбіню.

**Мелка.** Пра нязначную глыбіню.

*Глыбока (мелка) араць, закопваць, саджаць.*

*Араў ён не глыбока і не мелка.* К. Чорны. *Малю, каб роўна рэзаў плуг барозны-струны, каб не глыбока і не плытка браў.* Л. Геніюш.

**ГНУЦЬ — ВЫПРОСТВАЦЬ**

*зак.* сагнуць — выпрастаць

**Гнуць. 1.** Надаваць чаму-небудзь выгнутую форму. **2.** Тым ці іншым спосабам адмоўна ўздзейнічаць на псіхіку чалавека.

**Выпроствацъ. 1.** Рабіць прамым што-небудзь выгнутае. **2.** Тым ці іншым спосабам станоўча ўздзейнічаць на псіхіку чалавека.

*Гнуць (выпроствацъ) дрот, дрэва, прут, прэнт, цвік.*

*«Яно і так бывае, што адзін дрэва гне, другі выпроствае...» — рашуча заявіў стары і, поўны перакanання, сеў на лаву.* П. Броўка.

*Гнуць (выпроствацъ) заўсёды, пастаянна.*

*Гне трывога мяне, яна ж і выпроствае, і шчыміць маё сэрца ад болю.* С. Паходня.

**ГОРАЧА — ХОЛАДНА**

**Горача. 1.** Пра высокую тэмпературу паветра. **2.** Палымяна, эмацыянальна.

**Холадна. 1.** Пра нізкую тэмпературу паветра. **2.** Раўнадушна, абыякава.

*Горача (холадна) пастаянна, часам.*

*Зімою холадна, а во цяпер, улетку, дык і горача.* Г. Далідовіч. *Можаш называць мяне, як заўгодна, ды мне ад гэтага ні горача, ні холадна, гэта ўсяго толькі словы, словы.* М. Гіль.

**ГОРКІ — САЛОДКІ**

**Горкі. 1.** Які мае смак, уласцівы палыну ці гарчыцы. **2.** Тое, што напоўнена жыццёвай горыччу.

**Салодкі. 1.** Які мае смак, уласцівы цукру ці мёду. **2.** Тое, што напоўнена жыццёвай асалодаю.

*Горкі, -ая, -ае (салодкі, -ая, -ае) водар, гародніна, напітак, настойка, мёд, садавіна, сок.*

*Ведаеш, як пра той мёд кажуць: будзь, мядок, ні горкі, ні салодкі: салодкі будзеш — пражруць, а горкі — праплююць.* І. Чыгрынаў.

*Горкае (салодкае) напаткаць, паспытаць.*

*Ён болей за ўсіх пабачыў свету, паспытаў і салодкага і горкага, а калі па праўдзе казаць, дык болей горкага.* М. Лынькоў.

**ГУМАННЫ — АНТЫГУМАННЫ**

**Гуманны.** Чалавечны, прасякнуты любоўю да людзей.

**Антыгуманны.** Бесчалавечны, прасякнуты нянавісцю да людзей.

*Гуманны, -ая, -ае (антыгуманны, -ая, -ае) дзейнасць, закон, мэта, палітыка, учынак.*

*Праўда, можна запярэчыць: кампрачыкосы, маўляў, ставілі антыгуманныя мэты. Мы ж ставілі перад сабою самую высакародную, самую гуманную. І не віна наша, што вынік аказаўся зусім не такі, якога мы чакалі.* В. Акулаў.

**ГУСТЫ — РЭДКІ**

**Густы.** Які складаецца з многіх аднародных частак, адзінак, блізка размешчаных адна каля адной.

**Рэдкі.** Які складаецца з шматлікіх аднародных частак, адзінак, размешчаных далёка адна ад адной.

*Густы, -ая, -ое (рэдкі, -ая, -ае) барада, бровы, валасы, дождж, ёлка, збожжа, лес, лісце, маліннік, трава, хмызняк.*

*Неслі ёлку, вялікую і рэдкую — Славікаву, і маленькую, густую — Машыну.* І. Шамякін.

**ГУСЦЕЦЬ — РАДЗЕЦЬ**

*зак.* пагусцець — парадзець

**Гусцець.** Станавіцца больш шчыльным, малапранікальным для зроку, святла.

**Радзець.** Станавіцца менш шчыльным, больш пранікальным для зроку, святла.

*Гусцець (радзець) змроку, туману. За акном гусцеў змрок цёплага летняга вечара.* І. Мележ.

## Д

**ДАБРАДЗЕЙ — ЛІХАДЗЕЙ (ЗЛЫДЗЕНЬ)**

**Дабрадзей.** Той, хто чыніць дабро, дапамагае каму-небудзь.

**Ліхадзей.** Той, хто чыніць ліха, зло, шкодзіць каму-небудзь.

*Дабрадзей (ліхадзей) дзейнічае, зычыць, раіць.*

*Калі бывае мне маркотна,— а я маркочуся часцей, як гэта думае ахвотна мой дабрадзей ці ліхадзей.* Я. Купала. *Прыходзьце, даражэнькія мае, часцей: вы толькі і засталіся нашымі сябрамі-дабрадзеямі.* Ц. Гартны.

**ДАБРАЧЫННАСЦЬ — ЗЛАЧЫННАСЦЬ**

**Дабрачыннасць.** Дабрадзейнасць.

**Злачыннасць.** Ліхадзейства.

*Дабрачыннасць (злачыннасць) актывізуецца, заціхае, творыцца.*

*Такім чынам, як гэта і патрабавала класіцысцкая эстэтыка, дабрачыннасць у трагедыі ўзвялічана, а злачыннасць абняслаўлена.* А. Мальдзіс.

**ДАБРО — ГОРА**

**Дабро.** Жыццёвыя ўдачы, радасці.

**Гора.** Жыццёвыя нягоды, пакуты.

*Дабро (гора) зазнаць, паспытаць.*

*А я дагэтуль веру ў казкі, хоць казкі розныя былі, то з ласкаю, а то без ласкі, з дабром і з горам на зямлі.* С. Грахоўскі.

**ДАБРО (ДАБРАТА) — ЗЛО (ЛІХА, ЗЛОСЦЬ)**

**Дабро. 1.** Спагадлівасць, сардэчнасць. **2.** Стваральная, пазітыўная сіла.

**Зло. 1.** Зласлівасць, варожасць, бяздушнасць, жорсткасць.. **2.** Разбуральная, негатыўная сіла.

**Дабрата.** Спагадлівасць, прыхільнасць.

**Злосць.** Варожасць, нядобразычлівасць.

*Дабро (зло) людское, чалавечае; далёка, побач.*

*Дабро і зло спрадвеку ходзяць побач, страчаюць разам сонца і зару. Ды людзі,— калі правілі жалобу, дык толькі і заўсёды па дабру. Павек дабро люд шчырым сэрцам помніў... Але і зло вычэквала пару...* К. Кірэенка.

*Дабро (зло) перамагае, прайграе. Нараджаўся паядынак зноўку між дабром і злом.* А. Грачанікаў. *Ворагі — дабро і зло — вядуць спрадвечны паядынак.* С. Законнікаў. *Але няма ліха без дабра.* Я. Маўр. *Алеся азірнулася і ўжо, убачыўшы Імполя, ціха, з дабра-*

*тою і без злосці, нібы нічога не было, папрасіла· «Ідзі. хоць глянь, які сын вырас».* В. Адамчык.

**ДАВАЕННЫ — ПАСЛЯВАЕННЫ**

**Даваенны.** Які існаваў або з'явіўся да вайны.

**Пасляваенны.** Які існаваў або з'явіўся пасля вайны.

*Даваенны, -ая, -ае (пасляваенны, -ая, -ае) будаўніцтва, вёска, год, горад, дагавор, жыццё, перыяд, пяцігодка, творчасць, час.*

*Успомні, якія былі, скажам, некалькі даваенных, пасляваенных гадоў? Лета было як лета. Нармальна свяціла сонца. У час ішлі дажджы.* І. Навуменка.

**ДАВЕР (ДАВЕР'Е) — НЕДАВЕР (НЯВЕР'Е)**

**Давер.** Пераконанасць у чыёй-небудзь шчырасці, чэснасці і заснаваная на гэтым упэўненасць.

**Недавер.** Сумненне ў чыёй-небудзь шчырасці,чэснасці і заснаваная на гэтым няўпэўненасць.

*Давер (недавер) аказаць, выказаць, выразіць; выбаршчыка, дзіцяці; людскі, чалавечы.*

*Недавер — што хіжы звер, след яго ў душы крывавіць... Недаверу — свой давер, як заслон магу паставіць.* М. Чарняўскі. *Ад давер'я да нявер'я шлях кароткі, як іскра.* А. Грачанікаў.

**ДАЗВОЛЕНАЕ** *(у знач. наз.)* **— НЕДАЗВОЛЕНАЕ** *(у знач. наз.)*

**Дазволенае.** Тое, што дазволена.

**Недазволенае.** Тое, што недазволена.

*Дазволенае (недазволенае) робіцца, чыніцца.*

*Можа так атрымалася таму, што сама яна своечасова знайшла тую грань дазволенага і недазволенага, на якую цвёрда паказала яму і якую ён прызнаў законам у іх адносінах.* І. Новікаў.

**ДАЗВОЛІЦЬ — ЗАБАРАНІЦЬ**

*незак.* дазваляць — забараняць

**Дазволіць.** Даць дазвол, згадзіцца на што-небудзь.

**Забараніць.** Не даць дазволу, не згадзіцца на што-небудзь.

*Дазволіць (забараніць) вываз, выезд, мітынг, надрукаванне, пералёт, перапіску, прыватызацыю, увоз, уезд.*

*Я больш строгі за цэнзуру. Яна дазваляе, а я забараняю.* З. Бядуля.

**ДАКЛАДНЫ — НЕДАКЛАДНЫ**

**Дакладны.** Пунктуальны, акуратны.

**Недакладны.** Непунктуальны, неакуратны.

*Дакладны, -ая, -ае (недакладны, -ая, -ае) разведчык, штабіст, чалавек.*

*З выгляду заліхвацкі хлопец, здольны выкінуць якую-небудзь штуку, а на самай справе, калі датычыла задання, быў самы дысцыплінаваны і дакладны ва ўсім да дробязей.* І. Новікаў. *Славік паважаў людзей, верных свайму слову, хаця сам недакладны ў сваіх абяцаннях.* І. Шамякін.

**ДАПАМАГЧЫ — ПЕРАШКОДЗІЦЬ**

*незак.* дапамагаць — перашкаджаць

**Дапамагчы.** Аказаць дапамогу, паспрыяць каму-небудзь ці чаму-небудзь.

**Перашкодзіць.** Стварыць перашкоду, замінаць каму-небудзь ці чаму-небудзь.

*Дапамагчы (перашкодзіць) будаўнікам, дыпламатам, кааператарам, краіне, медыкам, навучанню, настаўнікам, палітыкам, прыватызацыі; выехаць, выйсці, выступіць, надрукавацца, пабудавацца.*

*Ён баіцца, не хоча нікога чапаць, нікому ні дапамагаць, ні перашкаджаць.* К. Чорны

**ДАЎГАНОСЫ — КІРПАТЫ**

**Даўганосы.** З доўгім незадзёртым носам.

**Кірпаты.** З кароткім задзёртым носам.

*Даўганосы, -ая, -ае (кірпаты, -ая, -ае) дзіця, госць, жаніх, нявеста, маладзіца, сусед, юнак.*

*От жа Ярмалінскіх распладзілася, сказаць добры час. І чарнявыя і бялявыя, і даўганосыя і кірпатыя.* К. Чорны. *Гэтае ўхажор-*

*ства не ўпусціла са свайго пільнага і трохі злога вока даўганосая, схуднелая, з паднятымі шырокімі плячамі сама Царычыха.* В. Адамчык.

**ДАЎЖЭЦЬ — КАРАЦЕЦЬ**

*зак.* падаўжэць — пакарацець

**Даўжэць.** Станавіцца даўжэйшым, больш працяглым у часе.

**Карацець.** Станавіцца карацейшым, менш працяглым у часе.

*Даўжэць (карацець) дню, ночы.*

*...Дні даўжэюць, а ночы карацеюць..* «Вячэрні Мінск».

**ДАЎНО — НЯДАЎНА**

**Даўно.** Раней, задоўга да цяперашняга часу.

**Нядаўна.** Не так даўно.

*Даўно (нядаўна) будавацца, ваяваць, вучыцца, жаць, жыць, касіць, напісаць, нарадзіцца, памерці, прыехаць, прыйсці, сеяць, тварыць.*

*Даўно і нядаўна пісалі людзі і расказвалі, успаміналі пра Мінск.* Ф. Янкоўскі.

**ДАЎНЯЕ** *(у знач. наз.)* — **НОВАЕ** *(у знач. наз.)*

**Даўняе**. Тое, што адбылося раней, даўно.

**Новае.** Тое, што прыйшло на змену ранейшаму, даўняму.

*Даўняе (новае) непрыемнае, прыемнае, радаснае, сумнае.*

*Даўняе і новае, дробнае і вялікае — усе было ў гэтым жыцці разам, зліваласся, перамешвалася, лілося адной вірлівай, шырокай, няспыннай ракою.* І. Мележ.

**ДАХОД — РАСХОД**

**Даход.** Сума набытых грошай дзяржавай, гандлёва-прамысловай ці гаспадарчай установай або прыватнай асобай.

**Расход.** Сума зрасходаваных грошай дзяржавай, гандлёва-прамысловай ці гаспадарчай установай або прыватнай асобай.

*Даход (расход) вялікі, значны, мізэрны; памяншаецца, расце; непрадбачаны, планавы, прадбачаны.*

*Асаблівую увагу выклікае тое, што расходы дзяржавы працягваюць расці хутчэй, чым яе даходы.* «Звязда».

**ДАЦЬ — УЗЯЦЬ (ЗАБРАЦЬ)**

*незак.* даваць — браць

**Даць.** Перадаць што-небудзь іншаму.

**Узяць.** Авалодаць чым-небудзь.

*Даць (узяць) авечку, веласіпед, інструмент, каляску, каня, карову, кнігу, рукапіс, рэч.*

*Не! досыць, досыць! трудна далей цярпець, ліхія слёзы ліць! Нічога мне, ой не, не далі, а ўзялі ўсё, чым мог бы жыць.* Я. Купала.

*Етых коні ў нас даюць і забіраюць, забіраюць і даюць. Як кажуць, салдат даў — салдат ўзяў.* І. Чыгрынаў.

**ДЗЕЙНЫ — БЯЗДЗЕЙНЫ**

**Дзейны.** Ініцыятыўны, актыўны.

**Бяздзейны.** Безыніцыятыўны, пасіўны.

*Дзейны, -ая, -ае (бяздзейны, -ая, -ае) дэпутат, дырэктар, загадчык, кіраўнік, спецыяліст.*

*Ніколі Алесь не бачыў свайго настаўніка бяздзейным. Наадварот, ён, відаць, быў самым дзейным на сяле, бо ведаў усіх, усе ведалі яго, і жыццё людзей было ягоным жыццём, іх думы і клопаты — яго думамі і клопатамі.* П. Броўка.

**ДЗЕНЬ — НОЧ**

**Дзень.** Частка сутак ад ранку да вечара.

**Ноч.** Частка сутак ад вечара да ранку.

*Дзень (ноч) наканаваны (-ая), суджаны (-ая), фатальны (-ая); канчаецца, наступае, пачынаецца, мінае.*

*Вядзе вайну сляза са смехам, дзярэцца той, а той дрыжыць, з грахамі важыцца пакута, у пары ноч і дзень бяжыць.* Я. Купала.

**ДЗІЦЯ — СТАРАЦ**

**Дзіця.** Той, хто ў малалетнім узросце.

**Старац.** Той, хто дасягнуў старасці.

*Дзіця (старац) адчувае, здзіўляецца, перажывае, сочыць.*

*Мы ўсе тут госці — старац і дзіця, і нават лес, і жар брусніц спакусны.* Г. Пашкоў.

**ДОБРААХВОТНЫ — ПРЫМУСОВЫ**

**Добраахвотна.** Які выконвае штонебудзь па сваей волі, без прымусу.

**Прымусова.** Які выконвае штонебудзь згодна з чужою воляю, па прымусу.

*Добраахвотны, -ая, -ае (прымусовы, -ая, -ае) інфарматар.*

*Добраахвотныя і прымусовыя інфарматары разлічвалі на паблажлівасць адміністрацыі.* С. Грахоўскі.

**ДОБРЫ — ЗЛЫ (ЗЛОСНЫ, ЛІХІ ШКОДНЫ, СУРОВЫ, ПАГАНЫ)**

**Добры.** Спагадлівы, сардэчны.

**Злы.** Злаславы, жорсткі, поўны варожасці.

**Шкодны.** Шкадлівы, які прыносіць шкоду, страту.

**Суровы.** Неспагадлівы, непаблажлівы да сябе і іншых.

**Паганы.** Мярзотны, подлы.

*Добры, -ая, -ае (злы, -ая, -ое) айчым, душа, мачаха, памешчык, свёкар, свякроў, пан, сусед, цесць, цёшча.*

*Добрыя душы тлумачылі, што Ярашу проста няма куды дзяваць сілу і энергію, злыя — што такім чынам ён хоча павялічыць сваю папулярнасць.* І. Шамякін. *Можа быць гэты выпадак упершыню, а пасля і многія да яго падобныя вымусілі мяне зразумець, што на аднаго добрага ў жыцці трапляецца дзесяць злосных.* В. Быкаў. *«Не бойся, дзядзька Мікіта. добрага чалавека мы не зачэпім». — «Зачапляйце, браткі, ліхога чалавека, а свайго падтрымайце».* Я. Колас. *Усялякія былі паны — і добрыя і ліхія.* Я. Колас. *Хлопчык пазнае жыццё, вучыцца любіць працу, шанаваць добрых і ненавідзець шкодных людзей, захопленымі вачыма чытаць чароўную кнігу роднай прыроды.* Я. Брыль. *Дарма, што ён такі суровы, на самай справе — добры і справядлівы, без прычыны не пакрыўдзіць, а калі і пакрыўдзіць, то пасля папросіць прабачэння.* І. Новікаў. *Здохнеш, а літасці ад добрых людзей мець не будзеш.* К. Чорны. *І крыху было ніякавата, што скажуць: такі паганы чалавек жыў у іх сям'і.* П. Броўка.

**ДОБРАЕ** *(у знач. наз.)* **— ЗЛОЕ (ЛІХОЕ)** *(у знач. наз.)*

**Добрае.** Спагадлівасць, сардэчнасць.

**Злое.** Зласлівасць, варожасць.

*Добрае (злое) выяўляецца, перамагае.*

*Яно ж век так: за добрае злым плаціць.* В. Адамчык. *«Але хто-хто, а вы можаце зрабіць для яго больш, чым хто. І добрага і ліхога, — загарачыўся. я.— А зрабіць добрае трэба нават дзеля апраўдання перад Чыгіром».* Г. Далідовіч.

**ДОБРЫ — КЕПСКІ (ДРЭННЫ, БЛАГІ)**

**Добры.** Які з дадатнымі якасцямі, уласцівасцямі.

**Кепскі.** Які з адмоўнымі якасцямі, уласцівасцямі.

*Добры, -ая, -ае (кепскі, -ая, -ае) выпадак, дзень, доля, год, зрок, зямля, лес, мода, мясцовасць, пагода, пачуццё, паэзія, проза, прыкмета, прынцып, рэч, слова, слых, справа, тавар, твор, учынак, хвіліна, час, чутка.*

*Ёсць паняцце прозы кепскай і добрай, але ёсць яшчэ паняцце прозы кніжнай і прозы часопіснай.* ЛіМ. *Добрую моду і без крыку заўважаюць, а на крык дрэннай ніхто не звяртае ўвагі.* «Звязда». *Сям-там цвісці прабуе вішня, і тым ясней нам, што парой мы паспыталі, аж залішне, і добрай долі і благой.* П. Глебка.

**ДОНАР — РЭЦЫПІЕНТ**

**Донар.** Чалавек, які дае сваю кроў для пералівання хворым або ў якога бярэцца які-небудзь орган ці тканка для перасадкі (трансплантацыі) іншаму.

**Рэцыпіент.** Чалавек, якому пераліваюць кроў або перасаджваюць (трансплантуюць) орган ці тканку іншага чалавека.

*Донар (рэцыпіент) малады, сталы.*
*Касцявы мозг донара павінен генетычна дапасоўвацца да касцявога мозгу рэцыпіента.* «Звязда»

**ДОСВІТАК — АДВЯЧОРАК**

**Досвітак.** Перадсвітальны час.

**Адвячорак.** Перадвячэрні час.

*Досвітак (адвячорак) кароткі, ціхі.*
*Выкарыстоўваючы Шыковічаву машыну, ён выязджаў у лес двойчы на дзень· на досвітку, да работы, і адвячоркам, пасля работы.* І. Шамякін.

**ДОЎГА — КОРАТКА**

**Доўга.** На працягу значнага часу.

**Коратка.** На працягу нязначнага часу.

*Доўга (коратка) гаварыць, думаць, парабкаваць, служыць, чакаць.*
*Хведар не ведаў, як адказаць: коратка адказаць ён не ўмеў, а доўга тлумачыць не было як.* В. Быкаў.

**ДОЎГІ (ПРАЦЯГЛЫ) — КАРОТКІ**

**Доўгі. 1.** Вялікі, значны па даўжыні. **2.** Высокі ростам. **3.** Вялікі, значны па памеру, аб'ёму. **4.** Працяглы ў часе.

**Кароткі. 1.** Невялікі, нязначны па даўжыні. **2.** Нізкі ростам. **3.** Невялікі, нязначны па памеру, аб'ёму. **4.** Непрацяглы ў часе.

*Доўгі, -ая, -ае (кароткі, -ая, -ае) адзенне, вяроўка, дошка, кій, лінія, нага, нітка, нос, паласа, палец, прут, прэнт, рука, тулава, шнур, эшалон.*
*На таку ён убачыў некалькі тонкіх дошак, доўгіх і кароткіх.* К. Чорны.
*Доўгі, -ая, -ае (кароткі, -ая, -ае) вайсковец, госць, наведвальнік, пасажыр, сваяк, сусед.*
*Прамёрзшы, акалеўшы, колькі дзён зусім не еўшы, Курт даўгі і Ганс кароткі ўваліліся да цёткі: «Ну, старая, без утайкі падавай курэй і яйкі».* П. Глебка.
*Доўгі, -ая, -ае (кароткі, -ая, -ае) апавяданне, аповесць, байка, паэма, п'еса, раман, твор.*
*Потым аўтар чытае свае творы. Розныя. Сумныя і вясёлыя. Доўгія і кароткія.* «Ніва».
*Доўгі, -ая, -ае (кароткі, -ая, -ае) век, год, гудок, дзёнь, думка, жыццё, ноч, позірк, размова, свіст, следства, сон, тэрмін.*
*Такім парадкам наперадзе была цэлая доўгая зімняя ноч і цэлы кароткі зімні дзень.* Я. Колас.
*Помню, як пад свіст разбойны твой, то працяглы, то, як міг, кароткі, з чыстай, нібы мора, сінявой шызыя зліваліся чародкі.* А. Вольскі.

**ДРУГ (СЯБРА, ПРЫЯЦЕЛЬ) — ВОРАГ (НЕПРЫЯЦЕЛЬ)**

**Друг.** Той, хто дружалюбна ставіцца да каго-небудзь, бескарысліва дапамагае яму.

**Вораг.** Той, хто варожа ставіцца да каго-небудзь, шкодзіць яму.

*Друг (вораг) агульны, былы, вечны; даўні, спрадвечны, цяперашні.*
*Ты, Зорах, на гнілых падпорках згарыш, як порах. Ты мне не друг, а вораг.* З. Бядуля. *Чаму вы лічыце, што непрыяцель, пішучы пра мяне, будзе больш аб'ектыўны, чым друг.* Я. Брыль. *Ідучы разам, яны ўжо сталі па розныя бакі той рысы, якая раздзяляе людзей на сяброў і ворагаў.* В. Быкаў. *Нешта сваё думае гэты чорны чалавек, ніколі ён не раскажа табе сваіх думак, і не пазнаеш ты — прыяцель ён табе ці вораг.* К. Чорны.

**ДУЖЫ — СЛАБЫ**

**Дужы.** Які мае вялікую фізічную сілу.

**Слабы.** Які мае невялікую фізічную сілу.

*Дужы, -ая, -ае (слабы, -ая, ае) госць, жонка, муж, парабак, сваяк, сусед, юнак.*
*Ці слабы хто, ці дужы, як волат, — груган яго косці збірае, — бо Голад я, Голад.* Я. Купала.

**ДУЖЫ (МОЦНЫ, МАГУТНЫ)** *(у знач. наз.)* — **СЛАБЫ** *(у знач. наз.)*

**Дужы.** Той, які дасягнуў пэўных вышынь у грамадстве.

**Слабы.** Той, які ніякіх вышынь у грамадстве не дасягнуў.

*Дужы (слабы) напаткаецца, прэтэндуе, ратуецца, сустрэнецца.*

*Той, хто папіхаў слабага, дагаджаў дужаму, той сам сабе праграміраваў няўхільную карту — ганьбу і ўніжэнне пад канец жыцця.* А. Макаенак. *І быць заўсёды самім сабой — не насміхацца з слабага, не баяцца моцнага.* Г. Далідовіч. *Слабому ў бітве з магутным нягрэшна ўжыць падман.* В. Каваленка.

**ДУША — ЦЕЛА**

**Душа.** Сукупнасць уласцівых чалавеку перажыванняў, пачуццяў, магчымасцей і пад.

**Цела.** Сукупнасць знешніх, фізічных форм чалавека.

*Душа (цела) маладзее, саграваецца, старэе, радуецца.*

*Хрысціна не наракала на лёс. Ён не абдзяліў яе жаночым шчасцем. Не тым жаночым шчасцем, што саграваe цела, а тым, што саграваe душу.* А. Асіпенка.

**ДЭ-ФАКТА — ДЭ-ЮРЭ**

**Дэ-факта**. Фактычна.

**Дэ-юрэ.** Фармальна.

*Дэ-факта (дэ-юрэ) адмовіць, ацаніць, кваліфікаваць, падтрымаць, прызнаць.*

*З жывымі прасцей. Іншая справа — мёртвыя. Дэ-юрэ — іх апраўдалі даўно. Дэ-факта — магілы свае вечнамёрзлыя яны не пакінулі ўсё адно. Дэ-юрэ — кончыліся даўно іх церні, гучаць іх радасныя галасы. Дэ-факта — іх зняволення тэр мін зацягнуўся на вечныя час*: А. Вярцінскі.

## Ж

**ЖАНАТЫ** *(у знач. наз.)* **— ХАЛАСТЫ (НЕЖАНАТЫ)** *(у знач. наз.)*

**Жанаты.** Той, хто ўступіў у шлюб, мае жонку.

**Халасты.** Той, хто не ўступіў у шлюб, не мае жонкі.

*Жанаты (халасты) напаткаўся, сустрэўся.*

*Жанатыя ўздыхаюць заўсёды глыбей, чым халастыя.* «Ніва». *Пасля гэткае прамовы ідуць весела дахаты, усе давольны з пастановы — нежанаты і жанаты.* Я. Купала.

**ЖАНІЦЦА — РАЗВОДЗІЦЦА (РАЗЫХОДЗІЦЦА)**

*зак.* ажаніцца — развесціся

**Жаніцца.** Уступаць у шлюб.

**Разводзіцца.** Скасоўваць шлюб.

*Жаніцца (разводзіцца) афіцыйна, своечасова, фіктыўна; асмеліцца, вырашыць, наважыцца.*

*Хлопец ведае па прозвішчы і ў твар амаль усіх эстраднікаў і кінаартыстаў, можа расказаць біяграфію кожнага з іх, асабліва колькі разоў хто жаніўся ці разводзіўся.* А. Кулакоўскі. *Маці працягвае расказваць, хто з кім ажаніўся, хто разышоўся, хто добра жыве і хто блага.* І. Навуменка.

**ЖАНОЧЫ (БАБСКІ** *(разм.)*) **— МУЖЧЫНСКІ**

**Жаночы.** Тое, што мае дачыненне да жанчыны.

**Мужчынскі.** Тое, што мае дачыненне да мужчыны.

*Жаночы, -ая, -ае (мужчынскі, -ая, -ае) доля, занятак, лёс, праца, розум.*

*Іван і Мар'я адпачывалі зрэдку, увесь час працавалі і ніколі дома не падзялялі работу на жаночую і мужчынскую.* І. Навуменка. *Не, бабская доля нялёгкая, але і мужчынская, мала, ой як мала ў ёй радасці.* Б. Сачанка.

**ЖАНЧЫНА — МУЖЧЫНА**

**Жанчына.** Асоба, процілеглая мужчыне па полу.

**Мужчына.** Асоба, процілеглая жанчыне па полу.

*Жанчына (мужчына) брыдкая (-і), верная (-ы), здрадлівая (-ы), любімая (-ы), лянівая (-ы), працавітая (-ы), прыгожая (-ы), старанная (-ы), статная (-ы), стройная (-ы), тутэйшая (-ы).*

*У кабінетах працавалі жанчыны-бухгалтары, планавікі, лабаранты. А ў зале пасяджэнняў сядзелі мужчыны.* І. Шамякін.

**ЖАР** *(разм.)*(**ЖАРА** *(разм.)*) — **ХОЛАД** (**СЦЮЖА** *(разм.)*, **ДРЫЖЫКІ** *(у мн.)*)

**Жар.** 1. Вельмі цёплае, гарачае надвор'е. 2. Павышаная тэмпература цела, выкліканая хваробай, хваляваннем, страхам.

**Холад.** 1. Вельмі халоднае надвор'е. 2. Паніжаная тэмпература цела, выкліканая хваробай, хваляваннем, страхам.

**Дрыжыкі.** Частае сутаргавае ўздрыгванне цела ад холаду, нервовага ўзбуджэння і пад.

*Жар (холад) невыносны, нясцерпны.*

*Жар улетку нас даймае, цісне холадам зіма.* Я. Колас.

*Жар (холад) ахоплівае, праймае, пранізвае.*

*Тут жара, там сцюжа, а ўсё чорт аднакі: тут і там б'юць дужа, што мы за ваякі.* Я. Колас.

*Не есць, не п'е, не дасыпае, і свет яму няміл ані: то жар, то дрыжыкі праймаюць яго па сорак раз на дні.* «Вожык».

**ЖАРТАМ — СУР'ЁЗНА**

**Жартам.** Смехам, забаўна.

**Сур'ёзна.** Грунтоўна, удумліва.

*Жартам (сур'ёзна) адказваць, гаварыць, пачынаць, пытацца.*

*Ён ужо зусім адпусціўся, але гаворыць то жартам, то зноў сур'ёзна.* М. Лужанін.

**ЖВАВАСЦЬ — МАРУДЛІВАСЦЬ**

**Жвавасць.** Рухавасць, жыццярадаснасць, ажыўленасць.

**Марудлівасць.** Затарможанасць, маркота, змардаванасць.

*Жвавасць (марудлівасць) натуральная, прыроджаная, сапраўдная, штучная.*

*Які ж зменлівы, як у думках, быў Васіль у гаспадарчым клопаце. Хвіліны весялосці, жвавасці ўсё часцей змяняліся хмурнай марудлівасцю, нават абыякавасцю.* І. Мележ.

**ЖЫВЫ — МЁРТВЫ, ЗАГІНУЎШЫ, ЗАБІТЫ, НЯБОЖЧЫК)**

**Жывы.** Які жыве.

**Мёртвы.** Які не жыве.

**Нябожчык.** Мёртвы чалавек.

*Жывы, -ая, -ое (мёртвы, -ая, -ае) жывёла, звер, істота, птушка, чалавек.*

*Але чаму ты жывы, а ён мёртвы? Чаму ты глядзіш і гаворыш, а ён згас, згас, як свечка?!* Г. Каржанеўская. *Бяжыць ён за каровамі ні жывы ні мёртвы.* В. Адамчык.

*О, неабдымныя трывогі, канца ў жыцці вам не відно: суддзёй усходзіць сонца строгім на мёртвых і жывых адно.* А. Лойка. *І яшчэ ён патрабуе: калі аб віноўніках іх трагедыі маўчаць жывыя, дык каб пра гэта не маўчалі загінуўшыя.* М. Танк. *Тады ён адказваў толькі за сябе: жывы — дык жывы, забіты — дык забіты.* П. Броўка. *Мы ж, жывыя, шануем нябожчыкаў.* Г. Далідовіч.

**ЖЫЦЦЁ — СМЕРЦЬ (НЯБЫТ, ЗГУБА** *(разм.)*)

**Жыццё.** Існаванне чалавека ці іншага арганізма.

**Смерць.** Спыненне існавання чалавека ці іншага арганізма.

**Нябыт.** Адсутнасць жыцця, існавання.

*Жыццё (смерць) лёгкае (-я), цяжкае (-я).*

*Людзям прыходзілася напамінаць пра смерць, каб больш шанавалі жыццё* З. Бядуля.

*На грані жыцця і нябыту гадзіннік прыцішыў разгон.* С. Законнікаў. *Прыйдзі ў сябе, о мудры чалавек! Інакш няма табе ніякіх лек... Расціў ты веру. Вырасціў неўроз. Расціў жыццё, а згуба — тут як тут. Пазбаў планету-маці ад пакут.* Г. Баравік.

**ЖЫЦЬ — ПАМІРАЦЬ (КАНАЦЬ)**

*зак.* пражыць — памерці, сканаць

**Жыць.** Быць жывым, існаваць.

**Паміраць.** Пераставаць жыць, існаваць.

*Жыць (паміраць) лёгка, непрыкметна, цяжка; здароваму, параненаму, хвораму.*

*Лепей жыць без страху і трывогі, а паміраць усё роўна калі-небудзь ды трэба.* Я. Колас. *Смерць, жыццё... Дзіўна ўсё гэта! І нашто жыць? Каб сканаць.* Я. Колас.

# З

**ЗАБРАЦЬ — АДДАЦЬ**
*незак.* забіраць — аддаваць
**Забраць. 1.** Узяць сабе. **2.** Захапіць, заваяваць.
**Аддаць. 1.** Вярнуць узятае. **2.** Вярнуць захопленае, заваяванае.
*Забраць (аддаць) вопратку, грошы, зброю, інструмент, кнігу, посуд, рукапіс.*
*Патроны яшчэ былі ў вінтоўцы, забраў іх Каровін сабе ў кішэню, вінтоўку на плячо павесіў, не аддаў ужо.* І. Пташнікаў.
*Забраць (аддаць) горад, раён, сталіцу, тэрыторыю.*
*«Дык я хачу спытаць. Нашы яшчэ вернуцца? — дзядок абвёў позіркам аднавяскоўцаў.— Забраў жа вон колькі...» — «Што забраў, тое і аддасць», — сказаў важна Чубар.* І. Чыгрынаў.

**ЗАБЫТАЕ** *(у знач. наз.)* — **УСПОМНЕНАЕ** *(у знач. наз.)*
**Забытае.** Тое, што не захавана ў памяці.
**Успомненае.** Тое, што ўзноўлена памяццю.
*Забытае (успомненае) істотнае, неістотнае.*
*Арганічная сувязь чалавека з навакольным асяроддзем знайшла непасрэднае адбіццё ў творчасці Пятра, Змітрака, Саўкі і Даміцэлі, дзе ў непарушным адзінстве жывуць вялікае і малое, успомненае і забытае.* Г. Юрчанка.

**ЗАВІШЧАЦЬ — ЗМОЎКНУЦЬ**
*незак.* вішчаць — змаўкаць
**Завішчаць.** Пачаць вішчаць.
**Змоўкнуць.** Сцішыцца, знямець.
*Завішчаць (змоўкнуць) кабану, парасяці, падсвінку, парсюку, свінні.*
*У суседзяў завішчаў і змоўк падсвінак — закалолі.* І. Шамякін.

**ЗАВЫСІЦЬ — ЗАНІЗІЦЬ**
*незак.* завышаць — заніжаць
**Завысіць.** Беспадстаўна павысіць, паказаць у большых памерах у параўнанні з рэальнасцю.
**Занізіць.** Беспадстаўна панізіць, паказаць у меншых памерах у параўнанні з рэальнасцю.
*Завысіць (занізіць) адзнаку, дасягненне, лічбу, норму, расцэнку.*
*Міністр нават хітрымі акружнымі пытаннямі не мог сцяміць, што мясцоваму начальству выгадна — завысіць іх, гэтыя незвычайныя лічбы, ці занізіць.* І. Шамякін.

**ЗАГАДКА — АДГАДКА (РАЗГАДКА)**
**Загадка. 1.** Іншасказальнае апісанне якога-небудзь прадмета ці з'явы з мэтай выяўлення або развіцця кемлівасці ў адгадваючага. **2.** Тайна ці праблема, якая патрабуе свайго вырашэння.
**Адгадка. 1.** Сапраўдны сэнс, які скрыты ў іншасказальным апісанні якога-небудзь прадмета ці з'явы. **2.** Рашэнне, якое раскрывае пэўную таямніцу ці праблему.
*Загадка (адгадка) вядомая, невядомая. Не на ўсякую загадку можна мець адгадку.* Прыказка.
*Загадка (адгадка) лёгкая, простая, складаная, цяжкая.*
*«Вось і я шукаю адгадку на вашу загадку, — Любімаў трымаў у руках медыцынскую карту хворай, папрасіў: — Раскажыце, Любоў Андрэеўна, пра сваё жыццё».* У. Ліпскі. *А дзе разгадка яго шматгадовай загадкі?.* В. Быкаў.

**ЗАГАМАНІЦЬ — ЗМОЎКНУЦЬ (ЗАЦІХНУЦЬ)**
*незак.* загамоньваць — змаўкаць
**Загаманіць.** Пачаць гаварыць.
**Змоўкнуць.** Перастаць гаварыць.
*Загаманіць (змоўкнуць) адначасова, баязліва, спалохана.*
*Раптам сабраліся ў натоўп, раптам сціхла музыка, раптам хтосьці адзін моцна загаманіў, а ўсе змоўклі, як сцяна.* К. Чорны. *«Дзень добры! Дзень добры!..» — загаманілі дзеці, а потым зусім спалохана заціхлі.* В. Быкаў.

**ЗАГАРЭЦЦА — ПАТУХНУЦЬ (ЗГАСНУЦЬ)**
*незак.* загарацца — тухнуць
**Загарэцца.** Пачаць свяціцца.
**Патухнуць.** Перастаць свяціцца.
*Загарэцца (патухнуць) агню, іскры, ліхтару, лямпачцы, ракеце, фары, экрану.*

*Тэлевізар задрыжаў, нешта ў яго сярэдзіне загуло, экран то тухне, то зноў загараецца.* «Звязда».

**ЗАГАРЭЦЦА — ЗГАСНУЦЬ**

*незак* загарацца — гаснуць

**Згаснуць.** Тое, што і патухнуць.

*У цемені другога берага, куды не даходзіла месячнае святло, загараўся і гас зялёны агеньчык.* Я. Маўр.

*Вось чаму ідзе да помніка герой, вось чаму ў яго руках ліхтар запальваецца, гасне і зноў запальваецца.* М. Лужанін.

**ЗАГУЧАЦЬ — ЗМОЎКНУЦЬ**

*незак.* гучаць — змаўкаць

**Загучаць.** Пачаць гучаць.

**Змоўкнуць.** Перастаць гучаць.

*Загучаць (змоўкнуць) голасу, гудку, сігналу, сірэне.*

*У трубцы змоўкла, пасля зноў загучала, але ўжо ў новым, болей пагрозлівым тоне.* В. Быкаў.

**ЗАДРАМАЦЬ — ПРАБУДЗІЦЦА**

*незак.* задрэмваць — прабуджацца

**Задрамаць.** Заснуць лёгкім сном.

**Прабудзіцца.** Перастаць спаць.

*Задрамаць (прабудзіцца) адвячоркам, дарогай, днём, досвіткам, ноччу.*

*Ён задрамаў... А калі прабудзіўся, душа хоць і не ачысцілася ад нядаўніх пачуццяў, але думалася ўжо неяк спакайней і думкі пацяклі ў іншым напрамку.* М. Філіповіч.

**ЗАЕХАЦЬ — ВЫЕХАЦЬ**

*незак.* заязджаць — выязджаць

**Заехаць.** Прыехаць куды-небудзь ненадоўга.

**Выехаць.** Ад'ехаць адкуль-небудзь.

*Заехаць (выехаць) аўтобусу, матацыклу, машыне, подводзе, фурманцы.*

*Зноў жа па дабраце сваёй я дазволіў ахоўнікам не правяраць і не рэгістраваць машыны, якія заязджаюць і выязджаюць з тэрыторыі камбіната.* «Вожык».

**ЗАЖЫНКІ** *(адз. няма)* **— ДАЖЫНКІ** *(адз. няма)*

**Зажынкі.** Святкаванне пачатку жніва.

**Дажынкі.** Святкаванне заканчэння жніва.

*Зажынкі (дажынкі) гуляць, святкаваць, спраўляць.*

*Пад яблынямі ў садзе стаялі збітыя з дошак сталы і лавы — на ўсю брыгаду. Гэтак некалі пасля вайны спраўляліся зажынкі і дажынкі — разам.* А. Жук.

**ЗАКАПАЦЬ — АДКАПАЦЬ**

*незак.* закопваць — адкопваць

**Закапаць.** Паклаўшы што-небудзь у паглыбленне, засыпаць, закідаць зямлёю.

**Адкапаць.** Капаючы, дастаць што-небудзь засыпанае, закіданае зямлёю.

*Закапаць (адкапаць) дакумент, зброю, золата, скарб, труп.*

*Карабіны закапаў пад карчом. Адкапаць загадаеце?.* А. Куляшоў.

**ЗАКОН — БЕЗЗАКОННЕ**

**Закон.** Абавязковае для ўсіх правіла, устаноўленае вышэйшым органам дзяржаўнай улады, якое мае найвышэйшую юрыдычную сілу.

**Беззаконне.** Адсутнасць ці парушэнне законнасці.

*Закон (беззаконне) асуджаць, крытыкаваць, падтрымліваць, ухваляць.*

*Там, дзе законаў вельмі шмат, найбольш бывае беззаконня.* С. Грахоўскі.

**ЗАКРЫЦЬ (ЗАЧЫНІЦЬ) — АДКРЫЦЬ (РАСЧЫНІЦЬ)**

*незак.* закрываць — адкрываць

**Закрыць. 1.** Перакрыць уваход, злучыўшы дзверы, раму, века і пад. з іх мацаваннем. **2.** Зрабіць што-небудзь недаступным зроку, нябачным. **3.** Спыніць дзейнасць чаго-небудзь і абвясціць пра канец яго функцыяніравання.

**Адкрыць. 1.** Адчыніць уваход, разлучыўшы дзверы, раму, века і пад. з іх мацаваннем. **2.** Зрабіць што-небудзь даступным зроку, бачным. **3.** Арганізаваць, стварыць што-небудзь і абвясціць пра пачатак яго функцыяніравання.

*Закрыць (адкрыць) аканіцу, акно, браму, века, веснічкі, дзверы, куфар, люк, саквояж, сумку, фортку, чамадан.*

*Пятрок нясмела адкрывае дзверы. затым, гэтак жа баючыся, закрывае іх.* В. Быкаў.

*Альбіна закрывае твар далонямі, а калі адкрыла — мы бачым усмешку заместа слёз.* Г. Каржанеўская.

*Хто закрываў беларускія школы, той цяпер няхай і адкрывае.* «Звязда». *Я ўскочыла з канапы, расчыніла насцеж дзверы ў суседні пакой. Мама і сястра, заплаканыя і ўсхваляваныя, стаялі пасярод кабінета. Глебаў ускочыў ад стала, падбег да дзвярэй і зачыніў іх.* Я. Бяганская.

**ЗАМКНУЦЬ — АДАМКНУЦЬ**

*незак.* замыкаць — адмыкаць

**Замкнуць.** Зачыніць што-небудзь на замок.

**Адамкнуць.** Адчыніць што-небудзь замкнёнае.

*Замкнуць (адамкнуць) гараж, гумно, дзверы, дом, кладоўку, клуню, куфар, свіран, склад, хату, шафу.*

*Яна была напалоханая, хату замыкала, пасля адмыкала.* В. Супрунчук.

**ЗАПАЛІЦЦА — ПАТУХНУЦЬ**

*незак.* запальвацца — тухнуць

**Запаліцца.** Аказацца ахопленым моцным пачуццём.

**Патухнуць.** Пазбавіцца ад моцнага пачуцця.

*Запаліцца (патухнуць) госцю, знаёмаму, субяседніку, сябру.*

*Ён лёгка запальваецца, але і лёгка патухае.* І. Шамякін.

**ЗАПЛЮШЧЫЦЬ — РАСПЛЮШЧЫЦЬ**

*незак.* заплюшчваць — расплюшчваць

**Заплюшчыць.** Прыкрыць павекамі вочы.

**Расплюшчыць.** Раскрыць, адкрыць вочы.

*Заплюшчыць (расплюшчыць) даверліва, імгненна, мігам, паступова.*

*Пасля ён пацёр рукою лоб, шчокі, бараду, заплюшчыў на хвілю і расплюшчыў вочы, пад якімі пабольшалі сіняватыя ўпадзіны.* Г. Далідовіч.

**ЗАПЛЯТАННЕ — РАСПЛЯТАННЕ**

**Заплятанне.** Працэс пляцення чаго-небудзь.

**Расплятанне.** Працэс разбурэння чаго-небудзь сплеценага.

*Заплятанне (расплятанне) бізуна, касы.*

*Верш — згартанне хараства ў пракосы, хвалі траў пахучых і зялёных, расплятанне, заплятанне косаў.* А. Барскі.

**ЗАПРЭГЧЫ — РАСПРЭГЧЫ**

*незак.* запрагаць — распрагаць

**Запрэгчы.** Вупражжу злучыць запражную жывёлу з калёсамі, санямі і пад.

**Распрэгчы.** Разлучыць запрэжаную жывёлу з калёсамі, санямі і пад.

*Запрэгчы (распрэгчы), вала, жарабца, ішака, кабылу, каня.*

*Пасля гэтага або ты запражэш добрага каня, або я цябе арыштую.* К. Чорны. *Рукі сувязной адубелі, і таму яна доўга распрагала каня.* І. Новікаў.

**ЗАРАБІЦЬ — ПРАРАБІЦЬ**

*незак.* зарабляць — прарабляць

**Зарабіць.** Атрымаць заслужаную ўзнагароду за работу.

**Прарабіць.** Патраціць больш за атрыманую ўзнагароду.

*Зарабіць (прарабіць) жнучы, косячы, малоцячы, працуючы, робячы.*

*У такі час не зарабіць, прарабіць можна.* П. Галавач.

**ЗАСНУЦЬ — ПРАЧНУЦЦА**

*незак.* засынаць — прачынацца

**Заснуць.** Пагрузіцца ў сон.

**Прачнуцца.** Перастаць спаць, прабудзіцца.

*Заснуць (прачнуцца) адразу, зноў, імгненна, паступова, уміг.*

*Валодзя зноў заснуў. Калі ж ён прачнуўся, Наталлі дома ўжо не было.* К. Чорны.

**ЗАСУШЫЦЬ — ВЫМАЧЫЦЬ**

*незак* засушваць — вымочваць

**Засушыць.** Зрабіць сухім, высушыць.

**Вымачыць.** Зрабіць мокрым, абмачыць.

*Засушыць (вымачыць) азіміну, бульбу, агародніну, пасевы, яравое*

*Былі яшчэ і скупыя на хлеб гады, калі то вымочвала, то засушвала, а то бракавала насення, гною, скаціны.* В. Быкаў.

**ЗАХОПНІК — ВЫЗВАЛІЦЕЛЬ**

**Захопнік.** Той, хто імкнецца да авалодання чым-небудзь або кім-небудзь; заваёўнік.

**Вызваліцель.** Той, хто вызваліў ці вызваляе што-небудзь ці каго-небудзь.

*Захопнік (вызваліцель) вёскі, горада, зямлі, краіны, народа, племені.*

*Захопніка сустракала горшая доля, чым тая, што ён рыхтаваў захопленаму.* М. Лужанін. *Сяржант Амялян Кручын у марах бачыў ужо сябе вызваліцелем родных мясцін, па якіх сумаваў усю вайну.* Т. Хадкевіч.

**ЗАЦВІСЦІ — АДЦВІСЦІ**

*незак.* зацвітаць — адцвітаць

**Зацвісці.** Пачаць цвісці.

**Адцвісці.** Перастаць цвісці.

*Зацвісці (адцвісці) акацыі, вішні, грушы, маліне, півоні, пустазеллю, сліве, чаромсе, яблыні, язміну.*

*Ружы, піжмы і палыны зацвіталі і адцвіталі.* К. Чорны.

**ЗАЧЫНЕНЫ — АДЧЫНЕНЫ (РАСЧЫНЕНЫ)**

**Зачынены.** Стан аб'екта з перакрытым уваходам ва ўнутраную прастору.

**Адчынены.** Стан аб'екта са свабодным уваходам ва ўнутраную прастору.

*Зачынены, -ая, -ае (адчынены, -ая, -ае) аканіца, акно, брама, века, веснічкі, дзверы, куфар, люк, саквояж. скрыня, сумка, фортка, футляр, чамадан.*

*Цішыня гэтая стаяла па кутках, стаяла каля адчыненых і зачыненых дзвярэй, ляжала па сценах, была ў чырвоным святле малой лямпы.* К. Чорны. *Многія аканіцы былі цяпер зачынены. веснічкі — наадварот — расчынены ці паламаны.* В. Быкаў.

**ЗАШПІЛІЦЬ — РАСШПІЛІЦЬ**

*незак.* зашпільваць — расшпільваць

**Зашпіліць.** Злучыць краі адзення пры дапамозе гузікаў, кнопак, аплікоў ці шпілек.

**Расшпіліць.** Разлучыць краі адзення, злучаныя пры дапамозе гузікаў, кнопак, аплікоў ці шпілек.

*Зашпіліць (расшпіліць) марудліва, механічна, паспешліва, старанна; гімнасцёрку, кажух, каўнер, паліто, пінжак, рубашку, рукаў, халат, целагрэйку.*

*Алёша бачыў, як маці, стоячы ля ложка на рог акна, то расшпіліць на грудзях нажутку на ўсе гузікі, то зноў зашпіліць.* І. Пташнікаў.

**ЗБЛІЗІЦЬ — АДДАЛІЦЬ**

*незак.* збліжаць — аддаляць

**Зблізіць.** Наладзіць сяброўскія адносіны паміж кім-небудзь.

**Аддаліць.** Разладзіць сяброўскія адносіны паміж кім-небудзь.

*Зблізіць (аддаліць) аднавяскоўцаў, перасяленцаў, сваякоў, хутаран.*

*Ён прызнаў правамернасць множнага ліку — грамадзяне, што ж датычыць звароту, то яму здавалася, што слова гэтае не яднае, не збліжае людзей, а раздзяляе іх, аддаляе адзін ад аднаго.* І. Шамякін.

**ЗБОРКА — РАЗБОРКА**

**Зборка.** Злучэнне частак чаго-небудзь ў адзінае цэлае.

**Разборка.** Разлучэнне чаго-небудзь на часткі.

*Зборка (разборка) акумулятара, гадзінніка, затвора, зброі,матора, машыны, прыбора, радыёпрыёмніка, тэлевізара.*

*Ён калі не ехаў, то займаўся разборкаю і зборкаю аўтобуснага механізма.* К. Чорны.

**ЗВІДНА — ДАЦЯМНА**

**Звідна.** З досвітку.

**Дацямна.** Да змяркання.

*Звідна (дацямна) араць, жаць, працаваць, сеяць, убіраць*
*Звідна дацямна ляскаталі пасы, і пілы звінелі на ўсе галасы* А Звонак.

**ЗВОНКУ (ЗВЕРХУ) — ЗНУТРЫ (СЫСПОДУ** *(разм.)*)

**Звонку.** Пра паверхню чаго-небудзь

**Знутры.** Пра сярэдзіну чаго-небудзь.

*Звонку (знутры) ахалоджаны, прагрэты, сагрэты, усмажаны.*
*СаграваЛа звонку — печ была добра натоплена, саграваЛа і знутры — гарэлка і смачная страва рабілі сваё.* І. Новікаў. *О, гэны зверху і сысподу наскрозь усмажаны каўбух! За чатырох змалоў-уходаў! Хоць сам ты лічаш, што за двух.* Н. Гілевіч.

**ЗВЫЧАЙНЫ — НЕЗВЫЧАЙНЫ**

**Звычайны.** Заўседашні, прывычны.

**Незвычайны.** Асаблівы, непрывычны.

*Звычайны, -ая, -ае (незвычайны, -ая, -ае) вупраж, выгляд, дзень, мэта, рэйс, справа, сход, учынак.*
*Давялося толькі гадзіну-другую павазіцца, каб прыстасаваць хоць збольшага для незвычайных мэт звычайную сялянскую вупраж, зусім далёкую ад свайго вайсковага ўжытку.* І. Чыгрынаў.

**ЗГАДЗІЦЦА — АДМОВІЦЦА**

*незак.* згаджацца — адмаўляцца

**Згадзіцца.** Даць згоду на што-небудзь.

**Адмовіцца.** Не даць згоды на што-небудзь.

*Згадзіцца (адмовіцца) афіцыйна, добраахвотна, прымусова.*
*Гэта што ўжо запрэглася ў лямку, прывыкла, але калі б на сённяшні розум прапанавалі ёй узначаліць калгас, ніколі не згадзілася б. Хоць, можа, і не адмовілася б.* В. Супрунчук.

**ЗГОДА — СВАРКА (ЗВАДКА, АДМОВА)**

**Згода. 1.** Мірныя, дружалюбныя адносіны **2** Станоўчы адказ

**Сварка.** Лаянка.

**Адмова.** Адмоўны адказ.

*Згода (сварка) людская, непрадбачаная, пастаянная; перапыняецца, працягваецца.*
*Згода змянялася сваркаю, гневаннем, разлукаю, новым спатканнем.* Я. Колас. *Бывалі паміж імі звадкі, непаразуменні, бывалі і прыемныя хвіліны згоды.* Я. Колас
*З няўтойнай трывогай у вачах Агееў зірнуў у заклапочана-рашучы твар начальніка паліцыі, які, сказаўшы гэта цвёрда тонам загаду, аднак жа чакаў ад яго адказу — згоды або адмовы.* В. Быкаў.

**ЗДАРОВЫ (ДУЖЫ)— ХВОРЫ (НЯДОШЛЫ** *(разм.)*, **НЯМОГЛЫ** *(разм.)*)

**Здаровы. 1.** Які мае добрае здароўе, не хварэе. **2.** Не пашкоджаны хваробаю (пра органы і часткі цела).

**Хворы. 1.** Які хварэе. **2.** Пашкоджаны хваробаю (пра органы і часткі цела).

**Нямоглы.** Слабы, хваравіты.

*Здаровы, -ая, -ае (хворы, -ая, -ае) вучань, дзіця, жанчына, жонка, лакей, мужчына, настаўнік, парабак, старшыня, студэнт, сусед, чалавек, юнак.*
*Лабараторыя, якую ўзначальвае Віктар Міхайлавіч, працуе над праблемай, як з хворага чалавёка зрабіць здаровага. Мы ж даследуем праблему: чаму здаровы чалавек становіцца хворым і як не дапусціць гэтага.* «Звязда».
*Здаровы, -ая, -ае (хворы, -ая, ае) арганізм, бок, вока, вуха, калена, лёгкае, нага, нырка, печань, плячо, рука, спіна, сэрца, шыя.*
*Беражыце здаровае сэрца, бо калі яно стане хворым, адразу ж узнікне мноства звязаных са здароўем праблем.* «Вячэрні Мінск». *«Ці дзед хвор? — пытаў хлапчына,— што хапаешся за бок?» — «Дый не дуж такі, браток», — крэкча хітры старычына.* Я Колас. *Глядзіць Міхал ... што за хвароба? Ён не адзін — іх дзве асобы: адзін Міхал — нядошлы, млявы, другі — здаровы і рухавы.* Я. Колас.

*Гэта быў зусім малады хлопец, рослы, здаровы. К Чорны Каго ні вазьмі, дык калі не гультай, дык нямоглы, а то скваплы праз меру.* В Быкаў

**ЗДАЦЬ — ПРЫНЯЦЬ**

*незак* здаваць — прымаць

**Здаць.** Перадаць іншаму каго-небудзь ці што-небудзь пад яго асабістую адказнасць.

**Прыняць.** Узяць ад іншага каго-небудзь ці што-небудзь пад сваю асабістую адказнасць.

*Здаць (прыняць) варту, дзяжурства, змену, зняволенага, камандаванне, касу.*

*Зменшчыкам у Белянова быў той самы Петухоў. Гаварыць ім не прыходзілася: адзін здаў, другі прыняў змену і разышліся.* С. Грахоўскі.

**ЗІМА — ЛЕТА**

**Зіма.** Самая халодная пара года паміж восенню і вясной.

**Лета.** Самая цёплая пара года паміж вясной і восенню.

*Зіма (лета) адышла (-ло), наступіла; будучая (-е), мінулагодняя (-е), сёлетняя (-е).*

*Сонца — на лета, зіма — на мароз.* Прыказка.

**ЗІМОЙ (ЗІМОЮ) — ЛЕТАМ**

**Зімой.** Пра зімовы час.

**Летам.** Пра летні час.

*Зімой (летам) адпачываць, зелянець, красавацца, працаваць, цвісці.*

*Рыхтуй сані летам, а калёсы зімой .* Прыказка.

**ЗЛЕВА — СПРАВА**

**Злева.** З левага боку.

**Справа.** З правага боку.

*Злева (справа) апынуцца, размясціцца, садзіцца, станавіцца.*

*Першай зайшла ў хату сваццця, стала справа, за ёю сват, стаў злева, потым паявіўся жаніх, стаў пасярэдзіне* А Асіпенка.

**ЗМАРЫЦЦА — АДПАЧЫЦЬ**

*незак.* зморвацца — адпачываць

**Змарыцца.** Адчуць знямогу, стомленасць у выніку якой-небудзь дзейнасці, работы.

**Адпачыць.** Аднавіць сілы, зрабіўшы перапынак у якой-небудзь дзейнасці, рабоце

*Змарыцца (адпачыць) выкладчыку, госцю, грузчыку, жняі, касцу, малацьбіту, настаўніку, чалавеку, шафёру, нагам, рукам, спіне, целу.*

*Ігнась узлез па прыступках на ганак. Іх толькі пяць, а як змарыўся. На ганку ён адпачыў і зайшоў у хату.* А. Чарнышэвіч.

**ЗНАЁМЫ — НЕЗНАЁМЫ**

**Знаёмы.** Раней зведаны, спазнаны, прывычны

**Незнаёмы.** Невядомы, неспазнаны, непрывычны

*Знаёмы, -ая, -ае (незнаёмы, -ая, -ае) вуліца, голас, горад, дарога, занятак, люд, мелодыя, почырк, работа, рамяство, сядзіба, чалавек.*

*Усё там — і хата з трохскатнай страхой з залобкам, і вароты, аздобленыя адмысловай ліштвай,— здаліся ёй адным часам знаёмымі і незнаёмымі.* І. Чыгрынаў.

**Знаёмы** *(у знач. наз.).* Той, хто знаходзіцца ў знаёмстве з кім-небудзь.

**Незнаёмы** *(у знач наз.).* Той, каго не ведаюць, хто не належыць да ліку знаёмых; чужы.

*Знаёмы (незнаёмы) гаваркі, маўклівы, непадатлівы, памяркоўны.*

*А як выйдзе зборнік, буду насіцца я з ім і паказваць усім знаёмым, а пры жаданні і незнаёмым.* Р. Семашкевіч. *Тут і месца сустрэч са знаёмымі і з тымі незнаёмымі, якія становяцца таксама знаёмымі.* Ф. Янкоўскі.

**ЗНАРОЧЫСТАСЦЬ — ВЫПАДКОВАСЦЬ**

**Знарочыстасць.** Тое, што з'яўляецца загадзя прадуманым, спланаваным.

**Выпадковасць.** Тое, што з'яўляецца нечаканым, неспланаваным.

*Знарочыстасць (выпадковасць) выбару, дзеяння, рэпертуару.*

*Выбар мовы фельетона — гэта выпадковасць ці знарочыстасць, свядомы крок?.* ЛіМ.

**ЗНАЧНАЕ** *(у знач. наз )* — **НЯЗНАЧНАЕ** *(у знач наз )*

**Значнае.** Тое, што з'яўляецца істотным, першарадным.

**Нязначнае.** Тое, што з'яўляецца неістотным, другарадным.

*Значнае (нязначнае) зведанае, зазнанае, перажытае, сумеснае.*

*Магдалена, лежачы пры Ганне, успамінала і шаптала Праз гэты шэпт прайшла і маладосць самой Магдалены, і маленства Ганны, і ўсё вялікае і значнае, і малое і нязначнае, але што жыло ў чулай душы маці, якая выгадавала сваю дачку.* К. Чорны.

**ЗНЕШНІ — УНУТРАНЫ**

**Знешні. 1.** Які знаходзіцца звонку. **2.** Які праяўляецца са знешняга боку.

**Унутраны. 1.** Які знаходзіцца унутры. **2.** Які праяўляецца з унутранага боку.

*Знешні, -яя, -яе (унутраны, -ая, -ае) замок, рама, фортка, шыба.*

*Знешнія рамы ніколі не вымаліся з акон, унутраныя ж вымаліся кожную вясну і ўстаўляліся наноў восенню з наступленнем халадоў. Я. Брыль.*

*Знешні, -яя, -яе (унутраны, -ая, -ае) рытм, сіла.*

*Так што, як ні банальна гэта гучыць, чалавек без сну жыць не можа. Яго арганізм цалкам знаходзіцца пад уздзеяннем унутраных і знешніх рытмаў. І сон чаргуецца з няспаннем гэтак жа, як дзень з ноччу, зіма з летам, прыліў з адлівам.* «Звязда».

**ЗНЯВОЛЕННЕ — ВЫЗВАЛЕННЕ**

**Зняволенне.** Пазбаўленне волі шляхам узяцца пад арышт.

**Вызваленне.** Выпуск на волю з-пад арышту.

*Зняволенне (вызваленне) ваеннага, дыверсанта, падазронага, падпольшчыка, путчыста, разведчыка, рэвалюцыянера, цывільнага.*

*Сніўся Масею сельскагаспадарчы лагер у Сібіры, за Марыінскам, прафесар Дзягель. Бадай, гэта быў першы такі сон з часу зняволення, а пасля і вызвалення.* І. Чыгрынаў.

**ЗНЯЦЬ — АДНАВІЦЬ**

*незак.* знімаць — аднаўляць

**Зняць.** Вызваліць ад работы, звольніць з пасады.

**Аднавіць.** Прыняць зноў на работу, узнавіць на пасадзе.

*Зняць (аднавіць) афіцыйна, законна, самавольна, самаўпраўна, самачынна.*

*Вельмі проста ў вас атрымліваецца, Ціхан Парфіравіч: захацелі — знялі дзяўчыну з работы, захацелі — аднавілі.* В. Супрунчук.

**З'ЯВІЦЦА (ВЫБЛІСНУЦЬ, ПАЯВІЦЦА)— ЗНІКНУЦЬ (ПРАПАСЦІ)**

*незак.* з'яўляцца — знікаць

**З'явіцца. 1.** Стаць бачным, трапіўшы ў поле зроку каго-небудзь. **2.** Узнікнуць пачуццю, перажыванню, прадчуванню і пад. **3.** Прыйсці, прыбыць куды-небудзь.

**Знікнуць. 1.** Стаць нябачным, выпаўшы з поля зроку каго-небудзь. **2.** Прапасці пачуццю, перажыванню, прадчуванню і пад. **3.** Адысці, адбыць куды-небудзь.

**Выбліснуць.** Заззяўшы, трапіць ў поле зроку каго-небудзь.

*З'явіцца (знікнуць) здані, зорцы, лодцы, месяцу, постаці, прывіду, самалёту, сонцу.*

*Ды і фашысты на шашы ачуліся крыху, бо самалёты так жа маланкава зніклі, як і з'явіліся.* М. Лынькоў.

*З'явіцца (знікнуць) бядзе, захапленню, прытомленасці, радасці, спахмурнеласці, трывозе, тузе.*

*У вачах Алеся з'явілася трывога. І адразу ж знікла, саступіўшы месца рашучасці.* У. Караткевіч.

*З'явіцца (знікнуць) блізкаму, госцю, роднаму, праезджаму, прахожаму, служачаму, суседу.*

*Стома гэтак жа ціха, як з'явіўся ў кабінеце, знік.* В. Супрунчук. *Быў пачатак верасня, усхадзіўся сіберны вецер, звіслі нізкія хмары, часам паміж імі выблісне і знікне сонца.* С. Грахоўскі.

**Прапасці.** Тое, што і знікнуць. *Краем вока я бачу, як імчыць да нас вогненнае джала — то прападае, то паяўляецца.* А. Адамовіч.

**Вынікнуць.** Паўстаць, папаўшы ў поле зроку каго-небудзь.

**Схавацца.** Аказаўшыся заслоненым чым-небудзь, выпасці з поля зроку каго-небудзь.

*На некаторы час вёсачка хаваецца за гарбом зямлі, а потым адразу вынікае ўся.* Я. Колас. *На яе далікатнам твары паявіўся і прапаў выраз шчырага захаплення.* В. Быкаў.

**ЗЯМЛЯ — НЕБА**

**Зямля.** Наша планета або яе паверхня.

**Неба.** Прастора, якая ў форме купала бачна над зямлёй.

*Зямля (неба) апісваецца, вывучаецца, даследуецца, праслаўляецца.*

*Каб між зямлёй і небам згода заўсёды ў любасці жыла і каб цярплівая прырода нам маці роднаю была.* І. Панчанка.

**ЗЯМНЫ — НЯБЕСНЫ (КАСМІЧНЫ)**

**Зямны.** Які мае адносіны да зямлі.

**Нябесны.** Які мае адносіны да неба.

**Касмічны.** Які мае адносіны да космасу.

*Зямны, -ая, -ое (нябесны, -ая, -ае) жыццё, каханне, пакаранне, пыл, радасць.*

*Гарыць і мой агонь — агонь любві маёй, не ведаю — нябеснай ці зямной.* А. Вярцінскі. *На мае плечы падае снег, на мае плечы падае пух, на мае плечы падае пыл, зямны і касмічны.* А. Вярцінскі.

## І

**ІСНУЮЧЫ — НЕІСНУЮЧЫ**

**Існуючы.** Які існуе.

**Неіснуючы.** Які не існуе.

*Існуючы, -ая, -ае (неіснуючы, -ая, -ае) з'ява, істота, прадмет, рэч.*

*Мера ўсіх рэчаў — чалавек, існуючых, што яны існуюць, а неіснуючых, што яны не існуюць.* Пратагор.

**ІСТОТНЫ — ДРОБЯЗНЫ**

**Істотны.** Значны ў якіх-небудзь адносінах.

**Дробязны.** Нязначны ў якіх-небудзь адносінах.

*Істотны, -ая, -ае (дробязны, -ая, -ае) заўвага, недахоп, папраўка, сродак, уклад.*

*Усё трымае ў галаве: аналізы глебы па кожнай гаспадарцы, колькасць мікраэлементаў у кожнай культуры, план развіцця, фінансы, гандлёвы абарот... сотні іншых лічбаў, істотных і дробязных, патрэбных і непатрэбных.* І. Шамякін.

## К

**КАЛЕКТЫЎНА — ПААСОБКУ**

**Калектыўна.** Сумесна, гуртам.

**Паасобку.** Асабіста, індывідуальна.

*Калектыўна (паасобку) азнаямляцца, змагацца, працаваць, рыхтавацца.*

*У кнізе скаргаў з'явілася нарэшце падзяка. Усе чыталі яе ўголас, калектыўна і паасобку.* «Вожык».

**КАНСАЛІДАЦЫЯ — КАНФРАНТАЦЫЯ**

**Кансалідацыя.** Згуртаванне, аб'яднанне.

**Канфрантацыя.** Проціпастаўленне, сутыкненне.

*Кансалідацыя (канфрантацыя) грамадства, насельніцтва, плыняў, рухаў, сіл, франтоў.*

*Сёння, як ніколі, патрэбна не канфрантацыя, а кансалідацыя ўсіх прагрэсіўных сіл.* «Звязда».

**КАРАЦЬ — МІЛАВАЦЬ**

*зак.* пакараць — памілаваць

**Караць.** Падвяргаць каго-небудзь пакаранню за віну, правіннасць.

**Мілаваць.** Дараваць каму-небудзь віну, правіннасць.

*Караць (мілаваць) гвалтаўніка, грабежніка, забойцу, здрадніка, злачынцу, злодзея, канакрада, рабаўніка, хабарніка.*

*Лагпункт ледзь чутна абураўся, але быў бяссільны перад уладаю азвярэлага самадура. Ён мог караць і мілаваць, паставіць на «блатную» работу і растаптаць кожнага бяспраўнага нявольніка.* С. Грахоўскі.

**КАРЫСНЫ — ШКОДНЫ**

**Карысць.** Які прыносіць ці зможа прынесці карысць.

**Шкодны.** Які прыносіць ці зможа прынесці шкоду.

*Карысны, -ая, -ае (шкодны, -ая, -ае) прадукт, расліна, рэчыва, справа, традыцыя, учынак, эксперымент.*

*Ён хадзіў па пакоі ад бар'ера да дзвярэй і гаварыў пра традыцыі, шкодныя і карысныя.* І. Шамякін.

**КРУТЫ — ПАКАТЫ**

**Круты.** Стромкі, абрывісты.

**Пакаты.** Спадзісты, нахілены.

*Круты, -ая,-ое (пакаты, -ая, -ае) бераг, дах, лесвіца, пад'ём, спуск.*

*Хвілін праз дваццаць мы былі ўжо ў кар'еры, адзін бераг якога — той, што ў бок вёскі,— высокі, круты, а другі — пакаты і парослы сасонкамі.* Н. Гілевіч.

**КУЛАК — БАТРАК**

**Кулак.** Багаты селянін.

**Батрак.** Парабак.

*Кулак (батрак) вядомы, мясцовы, тутэйшы.*

*Несцяровіч пісаў і гаварыў: «Дадзена гэта лепшаму ўдарніку пабудовы».— «Ну, гавары, што далей пісаць?» — «Былому батраку. Добра. Былому кулаку...» — «Як гэта кулаку?» — «А адкуль я ведаю, што ты батрак! Я ж ніякіх фактаў пра гэта не маю».* К. Чорны.

**КУРЧАВЫ** *(разм.)* **— ПРАМЫ**

**Курчавы.** Завіты, пакручасты.

**Прамы.** Гладкі, непакручасты.

*Курчавы, -ая, -ае (прамы, -ая, -ое) волас, віхор, поўсць.*

*Колер, таўшчыню валасоў, як і колер вачэй, мы бяром у спадчыну ад маці ці бацькі: чорныя або русыя, курчавыя ці прамыя.* «Звязда».

## Л

**ЛАСКА — ГНЕЎ**

**Ласка.** Пачуццё любві, пяшчоты.

**Гнеў.** Пачуццё моцнага абурэння.

*Ласка (гнеў) боская (-і), людская (-і), панская (-і).*

*Вось табе на ростань даланя! Падаю не згодна абавязку. У ёй — хіба не чуеш? — дабрыня, гневу холад з цеплынёю ласкі.* В. Макарэвіч.

**ЛЕВАРУЧ — ПРАВАРУЧ**

**Леваруч.** Злева, па левую руку.

**Праваруч.** Справа, па правую руку.

*Леваруч (праваруч) крочыць, паўставаць, размяшчацца, сядзець.*

*Побач са мной, леваруч, ступае драпежны звер, праваруч — непахісны робат, наперадзе ззяе сонца, ззаду чарнее цень.* А. Разанаў.

**ЛЕВЫ — ПРАВЫ**

**Левы. 1.** Размешчаны на тым баку, які з'яўляецца процілеглым праваму. **2.** Размешчаны на пэўнай плошчы, тэрыторыі з боку той рукі, якая бліжэй да сэрца.

**Правы. 1.** Размешчаны на тым баку, які з'яўляецца процілеглым леваму. **2.** Размешчаны на пэўнай плошчы, тэрыторыі з боку той рукі, якая далей ад сэрца.

*Левы, -ая, -ае (правы, -ая, -ае) вока,вуха, крыло, нага, плячо, плячук, рука.*

*Ужо ў тралейбусе агледзеў, што на правай назе шэрая шкарпэтка, а на левай зялёная.* «Вожык».

*Цяпер левы бок вёскі, ад лесу, быў ужо зацемнены, а правы — светлы, з ружовым водблескам у вокнах. ад сонца, што павісла над самым лесам.* Г. Далідовіч.

*Левы, -ая, -ае (правы, -ая, -ае) група́ўка, дэпутат, партыя, плынь, тэорыя.*

*Яго ж, Троцкага, формула дае прастор для любых, самых левых і самых правых, тэорый.* І. Шамякін.

**ЛЕГАЛЬНЫ — НЕЛЕГАЛЬНЫ**

**Легальны.** Дазволены законам.

**Нелегальны.** Забаронены законам.

*Легальны, -ая, -ае (нелегальны, -ая, -ае) гурток, дзейнасць, друк, з'езд, партыя, спосаб, становішча, сход.*

*Якім бы то ні было спосабам — легальным ці нелегальным — тварыць беларускае друкаванае слова.* І. Шамякін.

**ЛЕГЧЫ (ПАКЛАСЦІСЯ) — УСТАЦЬ (ПАДНЯЦЦА)**

*незак.* лажыцца — уставаць

**Легчы.** Прыняць ляжачае, гарызантальнае становішча.

**Устаць.** Падняцца з ляжачага, гарызантальнага становішча.

*Легчы (устаць) апоўначы, досвіткам, позна, рана, удодні; жывёле, чалавеку.*

*Мужык з гарам ляжа, устане, пляце байкі дзеткам, жонцы, толькі чутны ўздыханні, ці ты ўзойдзеш. Ён уставаў яшчэ ўдодні, клаўся апоўначы.* К. Чорны. *Вось хоць бы свінабой Вадап'ян ... Апошні кладзецца спаць і першы падымаецца.* Я. Колас.

**ЛЁГКІ — ЦЯЖКІ**

**Лёгкі. 1.** Які мае невялікую вагу. **2.** Які напоўнены удачамі, поспехамі.

**Цяжкі. 1.** Які мае вялікую вагу. **2.** Які абцяжараны няўдачамі, нягодамі.

*Легкі, -ая, -ае (цяжкі, -ая, -ае) груз, куфар, мех, партфель, рэч, скрынка, торба*

*Мноства цяжкіх і лёгкіх скрынак, выгружаных з рэфрыжэратара, размясцілі тут жа, на пероне.* «Звязда».

*Лёгкі, -ая, -ае (цяжкі, -ая, -ае) доля, жыццё, лёс, час.*

*А там, у Альхоўцы, было ў яе жыццё і лёгкае, добрае, радаснае, было і гораснае, цяжкае, крыўднае.* М. Гіль.

**ЛІТАСЦІВЫ — БЯЗЛІТАСНЫ**

**Літасцівы.** Спачувальны, спагадлівы.

**Бязлітасны.** Суровы, неміласэрны.

*Літасцівы, -ая, -ае (бязлітасны, -ая, -ае) брыгадзір, гаспадар, дырэктар, кіраўнік, чалавек, шэф.*

*Дык ад гаротніка не адварочвайся ўбок. Будзь літасцівы, чалавечны і гуманны.* Э. Валасевіч. *Патаповіч закрываў рукою шыю і стараўся цішэй ступаць, каб не ўвесці ў злосць гэтых бязлітасных пастаяльцаў.* А. Кулакоўскі.

**ЛІШАК — НЯСТАЧА**

**Лішак.** Тое, што перавышае якую-небудзь норму, меру.

**Нястача.** Тое, чаго не хапае да якой-небудзь нормы, меры.

*Лішак (нястача) будматэрыялу, жылплошчы, зямлі, металу, паліва, прадуктаў.*

*На калгас зямлі нястача, а ў кулачкі нават лішкі, толькі ён таго не ўбачыў праз яечню ды кілішкі.* К. Крапіва.

**ЛЬГА (МОЖНА)— НЕЛЬГА**

**Льга.** Можна, магчыма.

**Нельга.** Няможна, немагчыма.

*Льга (нельга) адпачываць, арганізоўваць, баставаць, будавацца, весяліцца. ехаць, ісці, размаўляць, распачынаць.*

*Сам антыхрыст не пойме, што нельга, што льга.* Я. Купала.

*Ён зусім не ведаў, пра што можна гаварыць, а пра што нельга.* А. Асіпенка.

**ЛЮБІМЫ — НЯЛЮБЫ**

**Любімы. 1.** Які выклікае пачуццё сардэчнай прыхільнасці да сябе. **2.** Які адпавядае чыім-небудзь схільнасцям, густам.

**Нялюбы.** **1.** Якога не любяць. **2.** Які не адпавядае чыім-небудзь схільнасцям, густам.

*Любімы, -ая, -ае (нялюбы, -ая, -ае) дзяўчына, жонка, жанчына, кабета, муж, мужчына, хлопец.*

*Любімыя жанчыны натхняюць лірыкаў, нялюбыя — сатырыкаў.* ЛіМ.

*Любімы, -ая, -ае (нялюбы, -ая, -ае) вальс, занятак, кніга, марш, мелодыя, работа, твор.*

*Кнігі, як і шмат якія рэчы, падзяляюцца на любімыя і нялюбыя.* Б. Сачанка.

**ЛЮБІЦЬ (КАХАЦЬ) — НЕНАВІДЗЕЦЬ**

*зак.* палюбіць — зненавідзець

**Любіць.** **1.** Адчуваць сардэчную прыхільнасць да асобы другога полу, кахаць. **2.** Адчуваць глыбокую прыязнасць да каго-, чаго-небудзь.

**Ненавідзець.** **1.** Адчуваць нянавісць да асобы другога полу. **2.** Адчуваць варожасць, непрыхільнасць да каго-, чаго-небудзь.

*Любіць (ненавідзець) дзяўчыну, жанчыну, жонку, маладзіцу, мужа, мужчыну, хлопца.*

*А ён, цётачка, зненавідзеў мяне, палюбіў яе.* Г. Далідовіч.

*Любіць (ненавідзець) дзяцей, жыццё, лад, людзей, народ, падхалімства, перабудову; моцна, па-сапраўднаму.*

*У хуткім, чорным беспрасвеццi бушуе выпасвены кат... Любіць... Каго, за што любіць? І ненавідзець сіл няхват.* Я. Купала. *Любімаў ведаў, што вочы могуць усё: прасіць і патрабаваць, кахаць і ненавідзець, узвышаць і знішчаць.* У. Ліпскі.

**ЛЮБОЎ — НЯНАВІСЦЬ**

**Любоў.** **1.** Пачуццё сардэчнай прыхільнасці да якога-небудзь чалавека. **2.** Пачуццё глыбокай прыхільнасці да каго-, чаго-небудзь.

**Нянавісць.** **1.** Пачуццё непрыязнасці, агіды да якога-небудзь чалавека. **2.** Пачуццё лютай варожасці да каго-, чаго-небудзь.

*Любоў (нянавісць) вечная, душэўная, плоцевая, павялічваецца, памяншаецца, узнікае.*

*Тады нас праклялі нянавісць і любоў, каб мы ўжо не змаглі сысціся зноў з табой.* А. Бадак. *Але калі б мне давялося зноў пачаць свой шлях ад роднага парога, адзінае ўзяў бы я ў дарогу — сваю нянавісць і сваю любоў. Нянавісцю — салдата надзяліць, каб ліхадзеі не палілі хаты. Любоў — аддаць бяскрыўдным немаўлятам, што робяць крок свой першы на зямлі.* Я. Пархута.

**ЛЮДЗІ** *(у мн.)* **— НЕЛЮДЗІ** *(разм.)*

**Людзі.** Грамадскія істоты, якія маюць высокаарганізаваны мозг, валодаюць мысленнем, маўленнем і пад.

**Нелюдзі.** Вылюдкі, звяры ў чалавечым абліччы.

*Людзі (нелюдзі) прышлыя, сённяшнія, тутэйшыя.*

*Не, даравацъ немагчыма такога, што засталося ад вёскі? Нічога! Нелюдзі з захаду сэрца не мелі — людзі, і хаты, і дрэвы згарэлі.* П. Броўка.

**ЛЮДСКАСЦЬ — НЯЛЮДСКАСЦЬ**

**Людскасць.** Чалавечнасць, спагадлівасць.

**Нялюдскасць.** Бесчалавечнасць, бессардэчнасць.

*Людскасць (нялюдскасць) сапраўдная, штучная.*

*Зоркі і тыя ад страху трасуцца: што пераможа — людскасць? нялюдскасць?.* Г. Каржанеўская.

## М

**МАБІЛІЗАЦЫЯ — ДЭМАБІЛІЗАЦЫЯ**

**Мабілізацыя.** **1.** Прызыў ваеннаабавязаных запасу, дапрызыўнікаў на абавязковую вайсковую службу.

**Дэмабілізацыя.** **1.** Звальненне з вайсковай службы асабовага саставу.

*Мабілізацыя (дэмабілізацыя) афіцэраў, ваеннаабавязаных, ваен-*

*наслужачых, радавых, сяржантаў; аб'яўлена, закончана, праведзена, спынена*

*Вераломны напад фашыстаў не дазволіў правесці як след мабілізацыю ў шмат якіх заходніх рэгіёнах краіны.* «Звязда». *Паэтапнае правядзенне дэмабілізацыіі зацягнулася на няпэўны час.* «Звязда».

**МАГЧЫМЫ — НЕМАГЧЫМЫ**

**Магчымы.** Ажыццявімы, дапушчальны.

**Немагчымы.** Неажыццявімы, недапушчальны.

*Магчымы, -ая, -ае (немагчымы, -ая, -ае) варыянт, выйсце, згода, змена, падзея, сварка, справа, сустрэча.*

*Ён не сумняваўся — Гутман быў майстра на ўсе магчымыя і немагчымыя справы — усё ў яго выходзіла надзіва лёгка і адмыслова.* В. Быкаў.

**МАКСІМАЛЬНЫ — МІНІМАЛЬНЫ**

**Максімальны.** Самы большы сярод усіх.

**Мінімальны.** Самы меншы сярод усіх.

*Максімальны, -ая, -ае (мінімальны, -ая, -ае) асвятленне, вага, вышыня, глыбіня, доза, колькасць, напружанне, нарматыў, норма, праграма, тэмпература, хуткасць, ціск.*

*Трэба даваць кулакам зямлі не максімальную норму, а мінімальную.* І. Мележ.

**МАЛАДОСЦЬ — СТАРАСЦЬ**

**Маладосць.** Жыццё ў маладым узросце.

**Старасць.** Жыццё ў старым узросце.

*Маладосць (старасць) бацькава, матчына, уласная.*

*Эй, маладосць – радасць мінула ўдалая! А старасць – няўдаласць ніяк не мінае.* Я. Купала.

**МАЛАДЫ — СТАРЫ (СТАЛЫ, ПАЖЫЛЫ)**

**Малады.** 1. Які не дасягнуў сталага ўзросту. 2. Які нарадзіўся нядаўна (пра жывёл, птушак). 3. Які нядаўна пачаў расці. 4. Які без дастатковай практыкі ў адпаведнай галіне вытворчасці, культуры, навукі, тэхнікі.

**Стары.** 1. Які пражыў шмат год, дасягнуў старасці. 2. Які нарадзіўся даўно (пра жывёл, птушак). 3. Які вырас даўно. 4. Які мае дастатковую практыку у адпаведнай галіне вытворчасці, культуры, навукі, тэхнікі.

**Сталы.** Які стаў дарослым, дасягнуў поўнага развіцця.

*Малады, -ая, -ое (стары, -ая, -ое) вясковец, гараджанін, госць, пасажыр, селянін, сусед, чалавек, чыноўнік.*

*Камандзір слухаў уважна. Потым паставіў цэлы рад кароткіх пытанняў: як выглядае незнаёмы чалавек, малады ён ці стары, нізкі ці высокі і як ён адзеты.* Я. Колас.

*Малады, -ая, -ое (стары, -ая, -ое) авечка, баран, бусел, бык, варона, верабей, гусь, жyравель, індык, каза, качка, курыца, ластаўка, лебедзь, певень.*

*Маладыя жураўлі не ведалі, не памяталі тых палёў і тае свае жураўлінае радзімы, дзе засталася душа старых жураўлёў.* А. Жук.

*Малады, -ая, -ое (стары, -ая, -ое) асіна, бук, бэз, бяроза, вольха, вяз, граб, дуб, ёлка, ельнік, канюшына, клён, крушыннік, лес, маліннік, сасна, ягаднік, ясень.*

*Пры сцяне старога лесу ішла града маладога ельніку.* К. Чорны.

*Малады, -ая, -ое (стары, -ая, -ое) аграном, вучоны, даследчык, дойлід, журналіст, кулінар, садоўнік, селекцыянер, спецыяліст.*

*Малады аграном падышоў да старога садоўніка.* «Ніва». *І не толькі маладыя, але і сталыя людзі з прыемнасцю слухалі яго.* П. Броўка. *Абодва паліцаі з-за агароджы — адзін белабрысы, пажылы, у картузе, і другі, малады, плячысты, у нямецкай пілотцы — прыкметна настрылі вушы, і начальнік паліцыі кінуў у іх бок строгі позірк.* В. Быкаў.

**Малады** *(у знач наз).* Той, хто, працягваючы развівацца, прабывае ў маладым узросце.

**Стары** *(у знач. наз.).* Той, хто пражыў шмат год, дасягнуў старасці.

*Малады (стары) брыдкі, здаровы, нерашучы, прыгожы, рашучы, сімпатычны, слабахарактарны, слабы, стройны, упарты, хворы.*

*Старыя раяць шлюб адкласці, а маладыя прагнуць шчасця — вось тут, як кажуць, і кукуй.* К. Крапіва.

**МАЛІЦЦА — ПРАКЛІНАЦЬ**

*зак.* памаліцца — праклясці

**Маліцца.** Багатварыць, абагаўляць.

**Праклінаць.** Падвергнуць праклёну.

*Маліцца (праклінаць) адкрыта, употай, штодзённа.*

*На каго спярша маліўся, праклінаў таго пасля, хто людской крывёй апіўся, хто сілком наверх прабіўся, праглынула тых зямля.* С. Грахоўскі.

**МАТЭРЫЯЛЬНЫ — ДУХОЎНЫ**

**Матэрыяльны.** Звязаны з валоданнем маёмасцю, сродкамі для існавання, даходамі, грашамі.

**Духоўны.** Які звязаны з унутраным, псіхічным жыццём чалавека.

*Матэрыяльны, -ая, -ае (духоўны, -ая, -ае) багацце, каштоўнасць, культура, набытак, спадчына, страта.*

*Дзесяткі гадоў наша грамадства пазбаўлялі традыцыйнай маралі, вынішчалася рэлігія, нішчыліся набыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры.* ЛіМ.

**МІЛАСЦЬ — ГНЕЎ**

**Міласць.** Велікадушнасць, добразычлівасць.

**Гнеў.** Злосць, раздражненне.

*Міласць (гнеў) бацькава (бацькаў), боская (боскі), людская (людскі), матчына (матчын), панская (панскі).*

*Бацькоўскі гнеў можа змяніцца на міласць. А калі і не так, дык нічога страшнага. Ідзі на будоўлю.* П. Броўка.

**МІЛАСЭРНЫ — БЕССАРДЭЧНЫ**

**Міласэрны.** Спагадлівы, літасцівы, надзелены сардэчнай чуласцю.

**Бессардэчны.** Бяздушны, жорсткі, пазбаўлены сардэчнай чуласці.

*Міласэрны, -ая, -ае (бессардэчны, -ая, -ае) асоба, кантралёр, наглядчык, партнёр, рэвізор, следчы, цівун.*

*Сам Серышаў з беднай сям'і, зведаў голад, нягоды, несправядлівасць, рос без маці і, здавалася б, павінен быць міласэрным, спагадлівым да чалавечай слабасці. Але ж не! Ён стаў жорсткім, бессардэчным..* А. Сульянаў.

**МІНУЛЫ — БУДУЧЫ (ЦЯПЕРАШНІ)**

**Мінулы.** Які ўжо прайшоў, мінуў.

**Будучы.** Які мае наступіць, адбыцца.

**Цяперашні.** Які існуе, адбываецца цяпер.

*Мінулы, -ая, -ае (будучы, -ая, -ае) бяда, вайна, гаворка, год, гора, дзень, месяц, падзея, радасць, стагоддзе, час, эпоха.*

*На гранях мінулых і будучых дзён паўстанем змагацца, паўстанем.* П. Глебка. *Вялічка ўспомніў, што ён, калі быў яшчэ ў забыцці, чуў гэты шэпт, але не мог уявіць яго як сапраўднасць. Ён стаяў у вушах і цяперашні і мінулы.* К. Чорны.

**МІНУЛАЕ** *(у знач. наз.)* **(ПРОШЛАСЦЬ) — БУДУЧАЕ** *(у знач. наз.)* **(ПРЫШЛАСЦЬ, НАСТУПНАЕ, ЗАЎТРАШНЯЕ, ЦЯПЕРАШНЯЕ, СУЧАСНАЕ** *(у знач. наз.)***)**

**Мінулае.** Тое, што прайшло, адышло.

**Будучае.** Тое, што наступіць, прыйдзе.

**Наступнае.** Тое, што наступіць.

**Заўтрашняе.** Тое, якое наступіць у хуткім часе.

*Мінулае (будучае) грамадства, Зямлі, народа, сусвету, чалавека; блізкае, далёкае.*

*Праблемы духоўнай спадчыны, адказнасці перад мінулым і бу-*

*дучым хвалююць герояў гэтай аповесці* В. Блакіт. *Мы скіраваны не ў прошласць, а ў прышласць.* Я. Скрыган. *Купала — не толькі мінулае, Купала — наступнае наша.* П. Макаль. *Нашто ім мінулае. у іх ёсць заўтрашняе.* «Маладосць». *А мінулае і цяперашняе моцна злучаны паміж сабою.* Я. Колас. *Наогул цікаўлюся ўсім, што датычыць мінулага і сучаснага роднага краю.* В. Шуткевіч.

**МІР — ВАЙНА**

**Мір. 1.** Суіснаванне дзяржаў, народаў, плямёнаў або грамадскіх класаў. **2.** Дружалюбнасць, пераходзячая ва ўзаемную павагу.

**Вайна. 1.** Узброеная барацьба паміж дзяржавамі, народамі, плямёнамі або грамадскімі класамі. **2.** Непрыязнасць, пераходзячая ў нянавісць.

*Мір (вайна) наступае, пачынаецца, перапыняецца, перарываецца, працягваецца.*

*Вайна пачнецца гэтымі днямі, бо прайшоў тэрмін міру, падпісанага паміж Расіяй і Японіяй.* К. Чорны.

*Мір (вайна) адкрыты (-ая), скрыты (-ая).*

*Да ўсеагульнага задавальнення ў кухні ўсталяваўся мір і парадак.* М. Лынькоў. *Доўга працягнулася іх скрытая вайна, і нямала горкіх слоў сказалі яны адно аднаму ў вочы і за вочы.* П. Броўка.

**МІРЫЦЬ — СВАРЫЦЬ**

*зак.* памірыць — пасварыць

**Мірыць.** Наладжваць дружалюбныя, добразычлівыя адносіны паміж кім-небудзь.

**Сварыць.** Садзейнічаць узнікненню варожасці, лаянкі паміж кімнебудзь.

*Мірыць (сварыць) маладажонаў, сваякоў, суседзяў, сямейнікаў.*

*Гэта толькі ёй ніхто надта не паможа, як не памагаў і дасюль — ні сварыў з кім, ні мірыў.* Г. Далідовіч.

**МНОГА (ШМАТ) — МАЛА (ТРОХІ)**

**Многа. 1.** Пра вялікую колькасць чаго-небудзь. **2.** Пра значную працягласць у часе. **3.** Пра значную плату за работу.

**Мала. 1.** Пра невялікую колькасць чаго-небудзь. **2.** Пра нязначную працягласць у часе. **3.** Пра мізэрную плату за работу.

*Многа (мала) вугалю, гною, гора, добразычлівасці, карысці, ласкі, металу, нафты, радасці, хлеба.*

*«Я прыляцеў з Беларусі».— «Гэта адтуль, дзе хлеба многа?» — «Не, хлеба ў нас мала».— «Мала? — спытала дзяўчынка.— А я чула, што ў вас хлеба многа».* Я. Колас.

*Многа (мала) гаварыць, жыць, пець, працаваць, спаць, чытаць.*

*Драмаў ці спаў, а многа, мала, ён сам не ведае.* Я. Колас.

*Многа (мала) атрымліваць, зарабляць, плаціць.*

*Калі маеш шмат чаго, дык яшчэ табе прыбавяць; а як трохі — усё возьмуць, ні скарынкі не аставяць.* А. Гейнэ. *«Ты, пяюшка,— так ён скажа,— сорам мей і ўвагу: шмат не пей, не пей і мала, не дай з клеткі цягу!».* Я. Купала.

**МОЦНЫ — СЛАБЫ**

**Моцны.** Які дасягнуў значных поспехаў у чым-небудзь, дастаткова ўмелы.

**Слабы.** Які не дасягнуў прыкметных поспехаў у чым-небудзь, недастаткова ўмелы.

*Моцны, -ая, -ае (слабы, -ая, -ае) вучань, група, клас, курсант, навучэнец, спецыяліст, студэнт.*

*А самае дзіўнае, што людзі, якія былі моцнымі ў рабоце, у бядзе паказваюць сябе слабымі.* І. Шамякін. *Жыццё... Слабага духам ломіць, а моцнага духам гартуе.* Г. Далідовіч.

**МЯККІ — ЦВЁРДЫ**

**Мяккі. 1.** Які ўгінаецца пры націсканні, не робіць уражання цвёрдасці пры датыканні. **2.** Які лёгка паддаецца ўплыву, уздзеянню.

**Цвёрды. 1.** Які не ўгінаецца пры націсканні, робіць уражанне цвёрдасці пры датыканні. **2.** Які стойкі, непахісны ў сваіх перакананнях, намерах.

*Мяккі, -ая, -ае (цвёрды, -ая, -ае) грунт, груша, падушка, пасцель, сядзенне, сядло, хамут.*

*Не сцялі мне мяккую пасцель — доўга буду беспрабудна спаць. пасцялі мне цвёрдую пасцель так. каб з неахвотай клаўся спаць* Л Галубовіч.

*Мяккі, -ая, -ае (цверды, -ая, -ае) воля, душа, натура, характар; заўседы. штокольвечы, часам.*

*У адным — у сваім імкненні ваяваць з немцамі — яго мяккая душа вельмі цвёрдая.* І. Шамякін.

## Н

**НАБЫТАК (ЗДАБЫТАК, ЗНАХОДКА) — СТРАТА**

**Набытак.** Тое, што набыта, прыдбана.

**Здабытак.** Тое, што здабыта, прыдбана.

**Знаходка.** Тое, што знойдзена, прыдбана.

**Страта.** Тое, што страчана, згублена.

*Набытак (страта) вялікі (-ая), малы (-ая), мяркуемы (-ая), нечаканы (-ая), плануемы (-ая).*

*Родная мова яшчэ гучыць на ўроках беларускай мовы і літаратуры, але і на гэтых уроках набыткаў менш, чым страт.* ЛіМ. *Мабыць, добра цяпер і самому відно: маладыя цябе перагналі даўно. Нават будні ў іх — урачыстыя святы, а здабыткі твае больш падобны на страты.* С. Грахоўскі. *Ісціна, адвечная як свет: за святлом знаходкі — горыч страты.* Н. Гілевіч.

**НАДЗЕЯ — РАСЧАРАВАННЕ (БЕЗНАДЗЕЙНАСЦЬ, АДЧАЙ, РОСПАЧ)**

**Надзея.** Чаканне чаго-небудзь добрага, якое спалучаецца з упэўненасцю ў тым, што яно збудзецца.

**Расчараванне.** Незадаволенасць, якая выклікаецца няздзейсненымі спадзяваннямі, планамі, марамі.

**Безнадзейнасць.** Безвыходнасць, якая не пакідае шансу на добры зыход чаго-небудзь.

**Адчай.** Крайняя безнадзейнасць з прычыны гора, непрыемнасці

*Надзея (расчараванне) людская (-ое), чалавечая (-ае), уласная (-ае), чужая (-ое)*

*Тры месяцы, месяцы надзей і расчараванняў, былі доўгімі, як тры гады.* В. Блакіт. *Чым растлумачыць, мой беластоцкі краю, што ў безнадзейнасці тваёй мая надзея.* А. Барскі. *Між надзеямі і роспаччу вагаўся Якім.* Я. Колас.

**НАДЗЬМУЦЦА — ЗАПАСЦІ**

*незак.* надзімацца — западаць

**Надзьмуцца.** Уздуцца, напоўніўшыся паветрам.

**Запасці.** Спасці пасля выхаду паветра.

*Надзьмуцца (запасці) шчакам.*

*Але Сцепаніда ведала, што муж не спіць. Бо шчокі яго то надзімаліся, калі ён сціскаў зубы ад болю, то глыбока западалі, калі боль сціхаў.* В. Давыдзенка.

**НАЗНАЧЫЦЬ — ЗНЯЦЬ**

*незак.* назначаць — знімаць

**Назначыць.** Прызначыць на работу, пасаду.

**Зняць.** Звольніць з работы, пасады.

*Назначыць (зняць) бухгалтара, дырэктара, дыспетчара, загадчыка, інжынера, ляснічага, настаўніка, супрацоўніка.*

*«Школа ўтрымліваецца на сродкі кааператыва,— адказаў Хрулевіч,— і толькі праўленне мае права назначаць і знімаць настаўніка».* Г. Мядзёлка.

**НАЛЕВА — НАПРАВА**

**Налева.** У левы бок.

**Направа.** У правы бок.

*Налева (направа) глянуць, крутануць, пабегчы, павярнуць, пайсці, паказаць, памкнуцца.*

*Ішла спакваля, пазірала то направа, то налева, гаманіла сама с сабой.* Н. Гілевіч.

**НАМАКАЦЬ — ПРАСЫХАЦЬ**

*зак.* намокнуць — прасохнуць

**Намакаць.** Рабіцца мокрым.

**Прасыхаць.** Рабіцца сухім.

*Намакаць (прасыхаць) абутку, вопратцы, зямлі, мяху, рукзаку.*

*Апошняя нітка на мне намокла і ўжо не прасохне.* К. Камейша.

**НАПАСЦІ — АБАРАНІЦЦА**

*незак.* нападаць — абараняцца

**Напасці.** Зрабіць напад на каго-небудзь з мэтай захопу яго тэрыторыі, грабяжу, забойства і пад.

**Абараніцца.** Адбіць напад праціўніка, ворага.

*Напасці (абараніцца) арганізавана, няўдала, удала, удачліва, умела.*

*На нас напалі, мы абараняемся. Абараняем сваю зямлю, сваю свабоду.* І. Стаднюк.

**НАПЕРАД (УПЕРАД)— НАЗАД (УЗАД)**

**Наперад.** У напрамку ад пераду чаго-, каго-небудзь.

**Назад.** У напрамку ад заду чаго-, каго-небудзь.

*Наперад (назад) ехаць, ісці, несціся, падавацца, перціся, плыць, прасоўвацца, рухацца, шыбаваць.*

*Лабановіч, здавалася, не чуў запытання сябра і ўсё тупаў, то падаючыся наперад, то адступаючы назад.* Я. Колас. *І пачулі гусі, што сілы бракуе ім і што не ўперад плывуць, а назад.* Я. Колас. *Ён прайшоў узад і ўперад паўз смольныя ствалы хвояў.* К. Чорны.

**НАРАДЖЭННЕ — СМЕРЦЬ (СКОН)**

**Нараджэнне.** З'яўленне на свет; пачатак жыцця.

**Смерць.** Адыход са свету; канец жыцця.

*Нараджэнне (смерць) жывёлы, істоты, чалавека.*

*Я гляджу на той лёт, на зближэнне з полем, дрэвамі, слотай зямной Быў аднойчы днём смерці маёй дзень вясны — дзень майго нараджэння.* А. Пысін. *Прайдзі цярпліва з нараджэння да скону цярністы шлях, бо ўсё жыццё — адно цярпенне — утопія, хлусня і страх.* С. Грахоўскі.

**НАРАДЗІЦЦА (РАДЗІЦЦА) — ПАМЕРЦІ (ЗАГІНУЦЬ)**

*незак.* нараджацца — паміраць

**Нарадзіцца. 1.** З'явіцца на свет, пачаць жыць. **2.** Пачаць існаваць, быць у наяўнасці.

**Памерці. 1.** Сысці са свету, перастаць жыць. **2.** Перастаць існаваць, быць у наяўнасці.

*Нарадзіцца (памерці) дзіцяці, людзям, чалавеку.*

*Хто не нарадзіўся, той не памрэ.* В. Адамчык.

*Нарадзіцца (памерці) думцы, ідэі, легендзе, падзеі.*

*Але ж з Каліноўскім памірала адна эпоха і нараджалася другая.* ЛіМ. *Твая матка, яна памёрла, як ты радзіўся.* М. Гарэцкі. *Усё расце, плыве, варушыцца, гіне і нараджаецца.* К. Чорны.

**НАСТУПЛЕННЕ — АБАРОНА**

**Наступленне.** Баявыя дзеянні войска супраць праціўніка з мэтай руху наперад.

**Абарона.** Баявыя дзеянні войска з мэтай утрымлівання занятай пазіцыі.

*Наступленне (абарона) арміі, войска, роты, узвода, флатыліі, часці; арганізаванае (-ая), бязладнае (-ая), варожае (-ая), уласнае (-ая), запланаванае (-ая).*

*Абараняюцца па-рознаму, таварышы. Безумоўна, наступленне — лепшая абарона.* І. Шамякін.

**НАСТУПЛЕННЕ — АДСТУПЛЕННЕ**

**Наступленне.** Баявыя дзеянні войск супраць праціўніка з мэтай перамяшчэння наперад.

**Адступленне.** Адыход войск з занятых пазіцый назад у тыл.

*Наступленне (адступленне) начное, нечаканае, падрыхтаванае, прадуманае, раптоўнае, своечасовае.*

*«Вайна,— разважліва згадзіўся бацька.— Таму я і гавару, што за адступленнем будзе наступленне».* І. Чыгрынаў.

**НАТУРАЛЬНЫ — ШТУЧНЫ**

**Натуральны.** Які ўласцівы прыродзе, створаны прыродай.

**Штучны.** Які зроблены накшталт сапраўднага, прыроднага.

*Натуральны, -ая, -ае (штучны, -ая, -ае) вадаём, валакно, крышталь, прадукт, ураджайнасць, шкло.*

*А ці можна параўнаць штучную ўраджайнасць з натуральнай?.* «Звязда».

**НАЯЎНА — БЕЗНАЯЎНА**

**Наяўна.** Пра наяўны разлік.

**Безнаяўна.** Пра безнаяўны разлік.

*Наяўна (безнаяўна) аплочваць, разлічвацца.*

*Магу прадбачыць, што наведвальнікі ўрадавага канцэрта не плацяць неканверціруемым рублём за білет. Ні наяўна, ні безнаяўна.* ЛіМ.

**НЕВІНАВАТАСЦЬ — ВІНА**

**Невінаватасць.** Непрычыннасць да злачынства.

**Віна.** Прычыннасць да злачынства.

*Невінаватасць (віна) выяўлена, даказана.*

*Недаказанасць віны азначае, як вядома, даказанасць невінаватасці.* «Звязда».

**НЕДАЛЁТ — ПЕРАЛЁТ**

**Недалёт.** Падзенне чагосьці ляцеўшага бліжэй намечанай цэлі.

**Пералёт.** Падзенне чагосьці ляцеўшага далей намечанай цэлі.

*Недалёт (пералёт) кулі, міны, снарада.*

*Міны грымнулі яшчэ раз. Цяжка было пазнаць — з пералётам гэтага месца ці з недалётам.* А. Кулакоўскі.

**НОВЫ — СТАРЫ (БЫЛЫ, ДАЎНІ, РАНЕЙШЫ)**

**Новы. 1.** Пабудаваны, створаны нядаўна. **2.** Які прыходзіць на змену каму-, чаму-небудзь існаваўшаму ці існуючаму. **3.** Не ношаны, свежы ці выкарыстоўваемы ўпершыню. **4.** Вырашчаны, выраблены нядаўна.

**Стары. 1.** Пабудаваны, створаны даўно. **2.** Які сышоў ці сыходзіць, уступаючы месца каму -, чаму-небудзь надыходзячаму. **3.** Паношаны, нясвежы ці выкарыстоўваемы даўно. **4.** Вырашчаны, выраблены даўно.

**Ранейшы.** Папярэдні.

*Новы, -ая, -ае (стары, -ая, -ое) будынак, вёска, воз, горад, кола, пагост, палац, парк, сквер, тэатр.*

*У Ластку стаяла дзве хаты: новая і старая У новай жыла наша сям'я, а ў старой мясціліся рабочыя, яны нарыхтоўвалі гонт.* М. Лужанін.

*Новы, -ая, -ае (стары, -ая, -ое) армія, дырэктар, кіраўнік, лад, пакаленне, парадак, свет, сістэма, урад, флот.*

*Устае рой новых пакаленняў; старыя адыходзяць на той свет.* Я. Купала.

*Новы, -ая, -ае (стары, -ая, -ое) абутак, бялізна, вопратка, падручнік, цацка.*

*Праз хвіліну-другую шмат старых і новых цацак ляжала на крэсле.* І. Дуброўскі.

*Новы, -ая, -ае (стары, -ая, -ое) бульба, збожжа, сала, семя, хлеб.*

*Пыталіся, колькі магу даць старога збожжа і колькі нажаў новага.* К. Чорны. *І яны абодва, былы начальнік цэха і новы, заспяшаліся адзін аднаму насустрач.* В. Гроднікаў. *Люба ведала вельмі многа песень — і даўніх, даваенных, і зусім новых.* В. Жураўскі. *«Каб ты згарэў, аднак, сваячок гэты», — зацята думаў пра сябе Пятрок, адчуваючы, што новая паваротка ў гаворцы не лепшая за ранейшую.* В. Быкаў.

**НЫРАЦЬ — ВЫНЫРВАЦЬ (ВЫПЛЫВАЦЬ)**

*зак.* нырнуць — вынырнуць

**Ныраць. 1.** Поўнасцю апускацца ў ваду. **2.** Хутка знікаць з вачэй, хаваючыся куды-небудзь.

**Вынырваць. 1.** Усплываць на паверхню вады. **2.** Хутка з'яўляцца перад вачамі, вынікаючы адкуль-небудзь.

**Выплываць.** Усплываць на паверхню вады воддаль ад месца ныранне.

*Ныраць (вынырваць) лоўка, няўмела, рашуча, умела, хвацка.*

*Маша нырнула, вынырнула, павярнулася на спіну і засмяялася ад задавальнення.* І. Шамякін.

*Ныраць (вынырваць) імгненна, нечакана, хутка*
*Зазыбу відаць было, як нечакана ажно нырау у натоўп і тут жа вынырваў адтуль, быццам сапраўды даставаў дна.* Мікіта Драніца I. Чыгрынаў. *Саша ўзяў разбег і нырнуў надоўга пад ваду. Выплыў каля дзесяці крокаў ад памосця.* Я. Маўр.

**НЯВЕСТА — ЖАНІХ**

**Нявеста.** Дзяўчына або жанчына, якая збіраецца замуж.

**Жаніх.** Хлопец або мужчына, які збіраецца жаніцца.

*Нявеста (жаніх) брыдкая (-і), прыгожая (-ы), радасная (-ы), самотная (-ы), сумная (-ы), шчаслівая (-ы).*

*І сватанне пераходзіла ў змовіны, запоіны — ставілася на стол гарэлка, закуска, клікалася радня і з боку нявесты і з боку жаніха.* Б. Сачанка.

# П

**ПАБОЛЕЙ (ПАБОЛЬШ) — ПАМЕНЕЙ (ПАМЕНШ)**

**Паболей.** Больш па колькасці, працягласці.

**Паменей.** Менш па колькасці, працягласці.

*Паболей (паменей) адпачываць, азадачваць, бываць, працаваць, хадзіць; абяцанняў, заклікаў, спраў.* *Не ўбачыць нам удачы, калі пярстом ківаць. Паменей — азадачваць, паболей—працаваць.* М. Янчанка. *Такі ў падполля быў закон: паболей спраў, паменш імён.* М. Лужанін. *Даўно пара настала работы, а не слоў. Паменей — заклікаў, пабольш працаўнікоў.* М. Янчанка.

**ПАВАГА — ЗНЯВАГА**

**Павага.** Шанаванне, пачцівасць.

**Знявага.** Абраза, ганьбаванне.

*Павага (знявага) заслужаная, людская, незаслужаная.*

*Знявага і павага заўсёды побач крочаць, знявага і павага зрабіць паслугу хочуць.* А. Пысін.

**ПАВЫШЭННЕ — ПАНІЖЭННЕ**

**Павышэнне. 1.** Паляпшэнне якаснага стану чаго-небудзь. **2.** Перавод на вышэйшую пасаду, на больш адказную работу і пад.

**Паніжэнне. 1.** Пагаршэнне якаснага стану чаго-небудзь. **2.** Перавод на ніжэйшую пасаду, на менш адказную работу і пад.

*Павышэнне (паніжэнне) адукаванасці, дабрабыту, забруджанасці, культуры, пасяховасці, прадукцыйнасці, радыеактыўнасці.*

*Не павышэнне культуры, а паніжэнне яе прынёс гэты сярэдні інтэлігент, што страціў народную глебу пад сабою.* ЛіМ.

*Павышэнне (паніжэнне) вымушанае, выпадковае, заканамернае, часовае.*

*Яго перавялі ў брыгадную разведку, і радавыя партызаны пакуль нават і не ведалі, павышэнне гэта для яго ці паніжэнне.* В. Жураўскі.

**ПАВЯЛІЧЫЦЦА — ЗМЕНШЫЦЦА**

*незак.* павялічвацца — змяншацца

**Павялічыцца.** Станавіцца большым па велічыні, колькасці, працягласці і пад.

**Зменшыцца.** Станавіцца меншым па велічыні, колькасці, працягласці і пад.

*Павялічыцца (зменшыцца) гору, дню, надою, насельніцтву, ночы, радасці, скрусе, ураджаю.*

*Калі б не вайна, насельніцтва СССР за 1941—1945 гады не зменшылася б да 168,6 млн., а павялічылася б да 210 — 212 млн. чалавек.* «Звязда».

**ПАГОДА — НЕПАГОДА (НЕПАГАДЗЬ)**

**Пагода.** Сонечнае без дажджу ці снегу надвор'е.

**Непагода.** Хмарнае з дажджом ці снегам надвор'е.

*Пагода (непагода) настае, мінае, стаіць.*

*І пагодай, непагодай не магу драмаць, чакаць; так і хочацца заўсёды песню вечную спяваць.* Я. Купала. *Слова пагода процістаў-*

*ляецца слову непагадзь і. калі яно ўжываецца без прыметніка, азначае сонечную пагоду.* К. Крапіва.

**ПАДАЦЬ — УЗЛЯТАЦЬ**

*зак.* упасці — узляцець

**Падаць.** Валіцца, ляцець уніз пад дзеяннем сілы цяжару.

**Узлятаць.** Паднімацца ў паветра, уверх.

*Падаць (узлятаць) птушцы, самалёту.*

*Першыя нямецкія самалеты пры ляцелі аднекуль з усходу і бамбяць падаюць зверху на лес, а пасля адразу ўзлятаюць угару, што ўсё роўна калышуцца на вяроўцы.* І. Пташнікаў.

**ПАДАЦЬ — УСТАВАЦЬ (УСКОКВАЦЬ)**

*зак.* упасці — устаць

**Падаць.** Валіцца на зямлю, трацячы апору, раўнавагу.

**Уставаць.** Паднімацца з зямлі пасля падзення.

**Ускокваць.** Імкліва паднімацца з зямлі пасля падзення.

*Падаць (уставаць) байцу, дзіцяці, жанчыне, мужчыне, пасажыру, чалавеку.*

*Побач, бачыў, ішла Хімка, як сляпая, спатыкалася аб трупы і падала, зноў уставала.* Я. Пархута. *Баец то ўскокваў на калені, заціскаючы рукамі жывот, то падаў, нешта намагаючыся сказаць.* В. Быкаў.

**ПАДВОЗКА — АДВОЗКА**

**Падвозка.** Прывоз чаго-небудзь адкуль-небудзь.

**Адвозка.** Адвоз чаго-небудзь куды-небудзь.

*Падвозка (адвозка) груза, корму, прадукту, тары.*

*Меўся пастаянны конь пры ферме — для падвозкі і адвозкі дробных грузаў* І. Шамякін.

**ПАД'ЁМ — АДБОЙ**

**Пад'ём.** Сігнал да ўставання.

**Адбой.** Сігнал для пераходу да сну.

*Пад'ём (адбой) празваніць, прайграць, скамандаваць; запознены, імгненны, хуткі.*

*Вайна адкочвалася на Захад, і ў бараках ад пад'ёму да адбою не выключаліся чорныя талеркі рэпрадуктараў.* С. Грахоўскі.

**ПАД'ЁМ — СПУСК**

**Пад'ём.** Перамяшчэнне знізу ўверх на гару, перавал, вежу і пад.

**Спуск.** Перамяшчэнне зверху ўніз з гары, перавалу, вежы і пад.

*Пад'ем (спуск) марудны, небяспечны; пачаўся, скончыўся.*

*Спускацца няпроста. З хворай нагой. Спуск цяжэй, чым пад'ём, больш небяспечны.* І. Шамякін.

**ПАДЗЯКА — СПАГНАННЕ**

**Падзяка.** Афіцыйная станоўчая ацэнка дзейнасці каго-небудзь.

**Спагнанне.** Афіцыйная адмоўная ацэнка дзейнасці каго-небудзь.

*Падзяка (спагнанне) аб'яўляецца, атрымліваецца, заносіцца.*

*Па крайняй меры, у яго асабовай справе, якая некалі была ў страявой часці палка, значылася восем падзяк і ніводнага спагнання, хаця сутычкі з начальствам не былі для яго рэдкасцю, здараліся і заслужаныя ім нaганяі.* В. Быкаў.

**ПАДКЛЮЧЫЦЬ — АДКЛЮЧЫЦЬ**

*незак.* падключаць — адключаць

**Падключыць.** Далучыць што-небудзь да агульнай сістэмы.

**Адключыць.** Адлучыць што-небудзь ад агульнай сістэмы.

*Падключыць (адключыць) тэлефон, электрападстанцыю, электрасетку.*

*Яшчэ ў жніўні далі каманду адключыць іх пасёлак ад энергасістэмы. Прыйшлося яму тайна дамаўляцца з электрыкамі. каб падключыць яго да лініі, інакш жыццё тут вельмі б ускладнілася.* І. Шамякін.

**ПАДКУРЧЫЦЬ — ВЫПРАСТАЦЬ**

*незак.* падкурчваць — выпроствацъ

**Падкурчыць.** Сагнуўшы або падагнуўшы, прыцісНуць да сябе (пра часткі цела).

**Выпрастаць.** Разагнуць, выпраміць (пра часткі цела).

*Падкурчыць (выпрастаць) ногі.*
*Ён скрыгатаў зубамі, каб стрымаць стагнанне, падкурчваў і выпроствагў ногі. варушыўся і пакутваў, як пасолены мянёк.* Я. Колас.

**ПАДНЯЦЦА — СПУСЦІЦЦА**

*незак* падымацца — спускацца

**Падняцца.** Перамясціцца самому знізу ўверх.

**Спусціцца.** Перамясціцца самому зверху ўніз.

*Падняцца (спусціцца) альпіністу, бабулі, верхалазу, дзядулі, інжынеру, мантажніку, наведвальніку, настаўніку, скалалазу, супрацоўніку, урачу: павольна, хутка.*

*Бабуля з пад'езда; усё цяжэй ей спускацца па лесвіцы, усё цяжэй падымацца, усё цяжэй заставацца дома.* А. Разанаў.

**ПАДНЯЦЬ (УЗНЯЦЬ, УСКІНУЦЬ) — АПУСЦІЦЬ**

*незак.* падымаць — апускаць

**Падняць. 1.** Перамясціць у больш высокае становішча. **2.** Зрабіць каго-небудзь больш значным або вельмі значным у чыіх-небудзь вачах.

**Ускінуць.** Рэзка ўзняць што-небудзь уверх.

**Апусціць. 1.** Перамясціць у больш нізкае становішча. **2.** Зрабіць каго-небудзь менш значным або зусім нязначным у чыіх-небудзь вачах.

*Падняць (апусціць) валун, вопратку, вуду, галаву, камень, мех, руку, скрынку, сцяг.*

*Хрысця ўгнула голаў, рукі то падымалі, то апускалі белы, абшыты карункамі фартушок.* В. Адамчык. *Ён падняў галаву і зноў апусціў.* В. Супрунчук.

*Гэтая ўлада высока падымае чалавека, у Царыка раптам павільгатнелі. з хмелю заіскрыліся вочы Але калі і апусціць, бывае, то аж зубы забрашчаць.* В. Адамчык. *Веска паступова абуджалася. узнімалі і апускалі драўляныя вёдры на доўгіх почапах жураўлі — у Верамейках было тры калодзежы.* І. Чыгрынаў. *Данік узняў вочы і зноў апусціў іх — не вытрымаў.* Я. Брыль. *Ганна вочкі ўскідае на Сымонку ды ізноў іх сарамліва апускае і ніяк не знойдзе слоў.* Я. Колас.

**ПАДОБНЫ — РОЗНЫ (НЕПАДОБНЫ)**

**Падобны.** Які амаль аднолькавы па знешнасці, афармленню, унутранаму зместу ці структуры з кім-, чым-небудзь.

**Розны.** Які адрозны па знешнасці, афармленню, унутранаму зместу ці структуры ад каго-, чаго-небудзь.

*Падобны, -ая, -ае (розны, -ая, -ае) будынак, машына, мова, помнік, прыбор, рэч. сюжэт, учынак, чалавек.*

*Дзіўнае пачуццё ахапіла ўсіх гэтых, такіх розных і нечым падобных людзей: ніхто з іх не мог лічыць, што зрабіў для будаўніцтва самае галоўнае, і кожны быў задаволены так, як быццам стварыў гэта ўласнымі рукамі.* П. Броўка. *Тады ў гэты векавы будынак з паўкруглымі скляпеннямі праз адчыненыя вокны ўрывалася сакавітая ўкраінская гамонка, такая падобная і непадобная да нашай.* А. Мальдзіс.

**ПАДЫХОД — АДЫХОД**

**Падыход.** Набліжэнне да каго-, чаго-небудзь, чалавека, справы.

**Адыход.** Аддаленне ад каго-, чаго-небудзь, чалавека, справы.

*Падыход (адыход) імклівы, непрыкметны, павольны.*

*Званіць паўторна сэнсу не мела, але перад вечарам, зрабіўшы не менш за дзесяць падыходаў і адыходаў ад апарата, ён набіраў завучаны на памяць нумар і зноў пачынаў допыт дзяжурнага па бюро прагнозаў.* М. Лужанін.

**ПАЗІТЫЎНЫ — НЕГАТЫЎНЫ**

**Пазітыўны.** Які з добрымі якасцямі, уласцівасцямі.

**Негатыўны.** Які з дрэннымі якасцямі, уласцівасцямі.

*Пазітыўны, -ая, -ае (негатыўны, -ая, -ае) вопыт, вынік, працэс, роля, факт.*

*У выніку сацыяльныя змены і ў сучасным капіталізме звязваліся намі з абавязковым нарастанием рэвалюцыйнай сітуацыі ў выглядзе эканамічных і сацыяльных катаклізмаў Адсюль зразумела, чаму мы. бачылі толькі негатыўныя з'явы капіталістычнай эканомікі і не звярталі ўвагі на пазітыўныя, на вопыт сусветнай цывілізацыі.* ЛіМ.

**ПАЗЫЧЫЦЬ — АДДАЦЬ**

*незак* пазычаць — аддаваць

**Пазычыць**. Даць што-небудзь у доўг.

**Аддаць.** Вярнуць пазычанае.

*Пазычыць (аддаць) грошы, інструмент, прыбор, рэч.*

*Я прычапіўся да яго: «Ды пазыч ты тры капейкі. Хутка прыйдзе маці, і я табе зараз жа аддам».* Я. Маўр.

**ПАКАЗВАЮЧЫСЯ — ХАВАЮЧЫСЯ**

*зак.* паказаўшыся — схаваўшыся

**Паказваючыся.** Трапляючы ў поле зроку.

**Хаваючыся.** Знікаючы з поля зроку.

*Паказваючыся (хаваючыся) перамяшчацца, рухацца.*

*У хмарках кацілася, то паказваючыся, то хаваючыся зноў, нізкае белаватае сонца.* В. Адамчык.

**ПАКОРА — НЕПАКОРА**

**Пакора.** Безагаворачнае прынятце ўгатаванага лёсу.

**Непакора.** Рашучае непрынятце ўгатаванага лёсу.

*Пакора (непакора) асобы. чалавека; людская, свядомая.*

*І хоць была ў пакоры непакора, хоць трэба было ліха перажыць, ператрываць бясчассе глуму, гора, і з краем не распяцца на крыжы.* М. Арочка.

**ПАЛЕПШЫЦЬ — ПАГОРШЫЦЬ**

*незак.* паляпшаць — пагаршаць

**Палепшыць.** Зрабіць лепшым па якасці, уласцівасцям.

**Пагоршыць.** Зрабіць горшым па якасці, уласцівасцям.

*Палепшыць (пагоршыць) гатунак, здароўе, настрой, сітуацыю, становішча, экалогію.*

*Ён не пярэчыў і не спрачаўся, ён быццам разумеў Агеева, але па тым. як ён адразу абвяў у размове, Агееў зразумеў, што гэтая іх сустрэча не палепшыць яго становішча Як бы не пагоршыла.* В. Быкаў.

**ПАЛІЦЬ (ПЯЧЫ) — СТУДЗІЦЬ**

*зак* спаліць — астудзіць

**Паліць.** Моцна пячы, прыпякаць.

**Студзіць.** Моцна ахалоджваць, застуджваць.

*Паліць (студзіць) бязлітасна, невыносна, нясцерпна.*

*Плача ў няволі край наш радзімы, самі ж не знаем спакою: паляць нас леты, студзяць нас зімы, мучыць нас голад вясною.* Я. Купала. *Пякло лета спёкай, ты ўся зацяганая залівалася потам крывавым. А восень студзіла слатою бязлітасна, трос вецер адзеткам дзіравым.* Я. Купала.

**ПА-МАЛАДОМУ — ПА-СТАРЭЧЫ**

**Па-маладому**. Энергічна, імкліва, бадзёра.

**Па-старэчы**. Няспешна, павольна, спакойна.

*Па-маладому (па-старэчы) дзейнічаць, паступаць, пачувацца, танцаваць.*

*Вада была халодная і смачная — такая ж, як і калісь; яна адразу прыгадала гэты смак, здзівілася і зноў прыпала да вядра, і піла прагна, доўга, зусім не па-старэчы, а па-маладому.* Н. Гілевіч.

**ПАМЕРЦІ — УВАСКРЭСНУЦЬ**

*незак.* паміраць — уваскрасаць

**Памерці.** Перастаць жыць.

**Уваскрэснуць.** Вярнуцца да жыцця пасля смерці (рэліг.).

*Памерці (уваскрэснуць) вечарам, днём, непрыкметна, ноччу, паступова, ранкам.*

*Братка, празнай аб маёй жонцы і напішы мне. Я ад яе дастаў ліст за 20/Х. За гэты час можна сем разоў памерці і столькі ж разоў... ну, можа, менш уваскрэснуць.* Ц. Гартны.

**ПАН — СЛУГА (ЛЁКАЙ)**

**Пан.** Асоба, якая карыстаецца ўладай у адносінах да залежных ад яе людзей.

**Слуга.** Асоба, якая з'яўляецца безуладнай і выкарыстоўваецца гаспадаром для асабістых паслуг.

**Лекай.** Асоба, якая з'яўляецца безуладнай і выкарыстоўваецца яе гаспадаром для дамашніх паслуг.

*Пан (слуга) былы, малады, стары, учарашні, цяперашні.*

*Воч не зводзіць ён з сцяны: калі так жывуць тут слугі, то ўжо як жывуць паны?.* Я. Колас. *Хоць чуўся гурт правамі роўны — ніхто не лекай і не пан,— але як рэдкі госць шаноўны ў цэнтры ўвагі быў Сцяпан.* Н. Гілевіч.

**ПАНУЮЧЫ — ПРЫГНЕЧАНЫ**

**Пануючы.** Які ўладарыць, прыгнятае, эксплуатуе.

**Прыгнечаны.** Які прыгнятаецца, эксплуатуецца.

*Пануючы (прыгнечаны) клас, народ.*

*Зусім невыпадкова, што ў кульмінацыйныя моманты гістарычнай драмы аб'ядноўваюцца інтэлектуальныя сілы пануючага і прыгнечанага народу.* ЛіМ.

**ПАРАДАК — БЕСПАРАДАК (НЕПАРАДАК, АНАРХІЯ)**

**Парадак.** Правільная, наладжаная сістэма размяшчэння чаго-небудзь; належны стан чаго-небудзь.

**Беспарадак.** Адсутнасць або парушэнне парадку.

**Анархія.** Такі стан грамадства, калі няма арганізаванай улады, законаў, абавязковых нормаў паводзін.

*Парадак (беспарадак) заўсёдашні, пастаянны, часовы; захоўваецца, ліквідуецца, пануе.*

*У пакойчыку беспарадак: ложак непрыбраны, на спінцы крэсла навалам сукенкі, панчохі, стол закіданы грабянцамі, прыколкамі.* І. Навуменка. *Я тут часта выступаў аб нашай рабоце, аб сяўбе, аб уборцы, аб аўтатрактарным парку, аб парадках і непарадках.* І. Шамякін. *Дзяржава даўно хоча навесці парадак у землекарыстанні, знішчыць анархію і самавольства.* І. Мележ.

**ПАСЯЛІЦЬ — ВЫСЕЛІЦЬ**

*незак.* пасяляць — высяляць

**Пасяліць.** Аформіць афіцыйнае ўсяленне каго-небудзь у жылое памяшканне.

**Выселіць.** Аформіць афіцыйнае высяленне каго-небудзь з жылога памяшкання.

*Пасяліць (выселіць) вандроўніка, камандзіраванага, падарожніка, турыста*

*Хуткія прылівы і адлівы ў гасцініцы — хранічная бяда Яўгена Перапечкі і яго шматлікага персаналу: мноства людзей трэба штодзённа запісаць, выпісаць, забраць і аддаць назад пашпарты, пасяліць кожнага і праз ноч выселіць, у кожным пакоі зрабіць уборку, сабраць пустыя пляшкі.* А. Кулакоўскі.

**ПАЎНОЧНЫ — ПАЎДНЁВЫ**

**Паўночны.** Які мае дачыненне да поўначы, размешчаны на поўнач ад чаго-небудзь.

**Паўднёвы.** Які мае дачыненне да поўдня, размешчаны на поўдзень ад чаго-небудзь.

*Паўночны, -ая, -ае (паўднёвы, -ая, -ае) бераг, бок, вакзал, вобласць, напрамак, раён, ускраіна.*

*На рынак не пускаюць з паўночных раёнаў. Толькі з паўднёвых.* І. Шамякін.

**ПАХ — СМУРОД**

**Пах.** Уласцівасць рэчываў, прадметаў дзейнічаць на органы нюху.

**Смурод.** Непрыемнае адчуванне ад уздзеяння на орган нюху прадметамі, рэчамі, якія надзелены адпаведнымі якасцямі.

*Пах (смурод) істоты, зямлі, паветра, расліны, рэчы.*

*Бацькоўскі ганак пакінуць — можна. Пах ліпаў змяніць на смурод асфальту — можна.* С. Яновіч.

**ПАХВАЛА — АСУДЖЭННЕ (ГАНЬБА)**

**Пахвала.** Станоўчы водзыў, адабрэнне.

**Асуджэнне.** Адмоўны водзыў, неадабрэнне.

**Ганьба.** Знеслаўленне, неадабрэнне.

*Пахвала (асуджэнне) выказаная (-ае), заслужаная (-ае), людская (-ое).*

*Колас ведаў вагу свайго слова і дарэмна не кідаў ні пахвалы, ні асуджэння.* М. Лужанін. *Пан Богут скончыў Міг адказны — чакай ці ганьбы, ці пахвал.* Я. Колас.

**ПАЦВЯРДЖЭННЕ — АДМАЎЛЕННЕ**

**Пацвярджэнне.** Прызнанне сапраўднасці чагосьці раней выказанага, узгодненага ці вырашанага.

**Адмаўленне.** Абвяржэнне сапраўднасці чагосьці раней выказанага, узгодненага ці вырашанага.

*Пацвярджэнне (адмаўленне) высновы, заключэння, заявы, пагаднення, рашэння.*

*Ніхто яму не даручаў рабіць такія заявы, ніхто за язык не цягнуў. Гэта тое адмаўленне, якое для ворага з'яўляецца найлепшым пацвярджэннем.* І. Шамякін.

**ПАЦЯПЛЕННЕ — ПАХАЛАДАННЕ**

**Пацяпленне.** Паступовае выцясненне холаду цяплом.

**Пахаладанне.** Паступовае выцясненне цяпла холадам.

*Пацяпленне (пахаладанне) непажаданае, пажаданае, своечасовае, ранняе, раптоўнае, чаканае.*

*Такім чынам, пацяпленне непажадана, таксама як і пахаладанне.* «Звязда».

**ПАЧАТАК (ЗАЧЫН) — КАНЕЦ (ЗАКАНЧЭННЕ)**

**Пачатак. 1.** Першы момант чаго-небудзь, што мае працягласць у часе. **2.** Месца, пункт, з якога пачынаецца што-небудзь працяглае ў прасторы. **3.** Прычына, крыніца ўзнікнення чаго-небудзь.

**Канец.** Апошні момант чаго-небудзь, што мае працягласць у часе. **2.** Мяжа, край, якім заканчваецца што-небудзь працяглае ў прасторы. **3.** Прычына знікнення чаго-небудзь.

**Заканчэнне.** Давядзенне да канца чаго-небудзь, што мае працягласць у часе.

*Пачатак (канец) боя, будаўніцтва, бяседы, вайны, водпуску, восені, вясны, года, жніва, зімы. касавіцы, лета, месяца, пошуку, працы, свету, сеанса, сходу, тыдня, экскурсіі.*

*А потым мы ўсе спявалі, як часта рабілі ў тыя гады: перад пачаткам сходаў і абавязкова ў канцы, а здаралася і ў сярэдзіне.* М. Лужанін.

*Пачатак (канец) вёскі, вуліцы, вяроўкі, дарогі, канавы, лініі.*

*І дарога ўпіралася ў дом не пачаткам сваім, а канцом.* А. Бадак.

*Пачатак (канец) адшукаць, вызначыць, выявіць.*

*Жылі ў суседстве два Іваны. Адзін — мудрэц — шукаў ва ўсім пачатак і канец, другі — прастак — жыў проста так.* К. Крапіва.

*Ён думае аб заканчэнні працы яшчэ да яе пачатку.* Кавалёў.

*Але кажу вайне канец не тут, ён там, дзе быў зачын, дзе быў пачатак. Яшчэ наперадзе вялікі суд за кроў нявінную дзяцей і матак.* А. Зарыцкі.

**ПЕРАД — ЗАД**

**Перад.** Пярэдняя частка чаго-небудзь.

**Зад.** Задняя частка чаго-небудзь.

*Перад (зад) будынка, воза, калёс, тулава, салона.*

*Толькі адна распатлатая кабета з прыпухлымі павекамі ўзвілася ў апошнім адчаі: «Гаспадара ні за што забралі, з яго і спаганяйце, а ў мяне няма чым ні зад, ні перад затуліць».* С. Грахоўскі.

**ПЕРАДАВЫ — АДСТАЛЫ**

**Перадавы.** Які знаходзіцца на высокім узроўні развіцця ў параўнанні з іншымі.

**Адсталы.** Які знаходзіцца на нізкім узроўні развіцця ў параўнанні з іншымі.

*Перадавы, -ая, -ое (адсталы, -ая, -ае) гаспадарка, грамадства, калгас, навука, саўгас. тэхналогія, тэхніка.*

*Першы засмяяўся. Старшынь адсталых калгасаў ён не крыты-*

*лавау так. як перадавога Пустахода куркуль, аднаасобнік. З раена стараецца выврваць больш, а як раену памагчы — сіратой прыкідваецца, беднячком.* І. Шамякін.

**ПЕРАДОК — ЗАДНІК**

**Перадок.** Пярэдняя частка абутку, якая ахоплівае зверху пальцы нагі.

**Заднік.** Задняя частка абутку, якая ахоплівае пяту.

*Перадок (заднік) бота, галоша, сандаля, тапачка, туфля, чаравіка.*

*Ад мыска аж па абцас, наўскасяка, паклаўшы на калоду, ён сек па задніках, па перадках, а пападаў і па руках тым, хто абутак шыў навек, — маім сябрам-умельцам сек.* М. Лужанін.

**ПЕРАДОК — ЗАДОК**

**Перадок.** Пярэдняя палавіна гужавога транспартнага сродку.

**Задок.** Задняя палавіна гужавога транспартната сродку.

*Перадок (задок) брычкі, воза, каламажкі, калёс, саней.*

*У задку воза сядзеў семінарыст Піліпоўскі, у перадку, звесіўшы набок ногі, — стары Піліпоўскі.* К. Чорны.

**ПЕРАКАНАННЕ — СУМНЕННЕ**

**Перакананне.** Упэўненасць у чымнебудзь.

**Сумненне.** Няўпэўненасць у чымнебудзь.

*Перакананне (сумненне) даследчыка, інжынера, канструктара, кардыёлага, навукоўца, урача, фізіелага, асабістае, уласнае.*

*Неаднойчы здаралася, што ўжо на другі дзень ён смяяўся са сваіх учарашніх захапленняў, страхаў, перакананняў ці сумненняў, раптоўных сімпатый ці антыпатый.* І. Шамякін.

**ПЕРАМОГА — ПАРАЖЭННЕ**

**Перамога. 1.** Поспех у ваенным змаганні, у вайне. **2.** Поспех у спартыўных спаборніцтвах. **3.** Поспех у палітычнай барацьбе.

**Паражэнне. 1.** Няўдача ў ваенным змаганні, у вайне. **2.** Няўдача ў спартыўных спаборніцтвах. **3.** Няўдача ў палітычнай барацьбе.

*Перамога (паражэнне) арміі, дзяржавы, народа, падполля, партызан, фронту.*

*У добрай згодзе спее злосць, у красаванні — тленне. У перамозе нават ёсць часцінка паражэння.* Л. Дайнека.

*Перамога (паражэнне) акрабата, гімнаста, каманды, лёгкаатлета, лыжніка, плыўца, шахматыста, штангіста; баскетбалістаў, гандбалістаў, рэгбістаў, футбалістаў.*

*Так, у прыватнасці, некаторыя спецыялісты сцвярджаюць, што камандзе пасля некалькіх перамог над адным і тым жа сапернікам цяжка настроіцца на чарговую сустрэчу, з паражэнняў лягчэй атрымліваць урокі, чым з перамог.* «Звязда».

*Перамога (паражэнне) дэмакратыі, контррэвалюцыі, паўстання, рэакцыі, рэвалюцыі.*

*Тое, што адбылося на сесіі, мы схільны расцэньваць не як паражэнне — як перамогу дэмакратычных сіл.* «Звязда».

**ПЕРАМОЖЦА — ПЕРАМОЖАНЫ** (у знач. *наз.*)

**Пераможца.** Той, хто перамог.

**Пераможаны.** Той, каго перамаглі.

*Біліся хто чым мог: у каго бацькі больш заможныя — партфелямі, бедныя — торбачкамі з падручнікамі. І не было пераможаных і не было пераможцаў.* В. Казько.

**ПЕРШЫ — АПОШНІ**

**Першы.** Які знаходзіцца на самым пачатку шэрагу падобных прадметаў, з'яў, працэсаў.

**Апошні.** Які знаходзіцца на самым канцы шэрагу падобных прадметаў, з'яў, працэсаў.

*Першы, -ая, -ае (апошні, -яя, -яе) бой, дзень, жыхар, курс, раз, салдат, слабасць, старонка, частка, экзамен.*

*Духмяніў пах сасны, ламаўся бэз пад ногі ў апошні дзень вайны і першы — Перамогі.* А. Лойка.

**ПЛЮС — МІНУС**

**Плюс.** Вартасць

**Мінус.** Загана

*Плюс (мінус) значны, мізэрны, свой, чужы.*

*Я сам лепей за іх ведаю свае плюсы і мінусы* М. Танк

**ПОСНЫ — СКАРОМНЫ**

**Посны.** Які не ўтрымлівае ў сваім саставе мяса, малака.

**Скаромны.** Які ўтрымлівае ў сваім саставе мяса, малако

*Посны, -ая, -ае (скаромны, -ая, -ае) ежа, капуста, кісель, суп, страва.*

*Маці частавала сына поснай ежай, бо скаромнай яна не мела.* А. Чарнышэвіч.

**ПОСПЕХ (УДАЧА) — НЯЎДАЧА (ПРАВАЛ)**

**Поспех.** Удача ў дасягненні чагонебудзь, шанцаванне.

**Няўдача.** Адсутнасць удачы, поспеху, нешанцаванне.

**Правал.** Поўная няўдача ў якойнебудзь справе.

*Поспех (няўдача) агульны (-ая), асабісты (-ая), заканамерны (-ая), нечаканы (-ая), уласны (-ая), чужы (-ая).*

*Яго ніколі не радавалі толькі свае поспехі ці нейкія чужыя няўдачы, бо хацелася, каб усе дзеці бралі для сябе ўсё, што можна ўзяць у школе.* Г. Далідовіч *Хай там узлёт ці падзенне, удача ці няўдача,— толькі ні дня без падзеі, без радасці і плача.* А Вярцінскі *Шчыруе месяц люты на снегавы завал. І што там, за мінутай,— удача ці правал?.* Я. Янішчыц.

**ПОЎНАЧ — ПОЎДЗЕНЬ**

**Поўнач. 1.** Адзін з чатырох напрамкаў свету, супрацьлеглы поўдню **2.** Мясцовасць, частка краіны, мацерыка, размешчаная ў напрамку поўначы. **3.** Сярэдзіна ночы, 12 гадзін ночы.

**Поўдзень. 1.** Адзін з чатырох напрамкаў свету, супрацьлеглы поўначы. **2.** Мясцовасць, частка краіны, мацерыка, размешчаная ў напрамку поўдня **3.** Сярэдзіна дня, 12 гадзін дня

*Поўнач (поўдзень) вызначыць, выявіць.*

*На поўнач ішлі лясы, а на поўдзень мясцовасць была чыстая, зусім адкрытая.* К Чорны

*Поўнач (поўдзень) вобласці, краіны, рэгіёна, рэспублікі.*

*Ведаю сам, даражэйшай зямлі век не знайду, хоць колькі б ні ездзіў — ёсць на поўдні эўкаліптавы ліст, стрэнеш на поўначы белых мядзведзяў.* М. Лужанін.

*Поўнач (поўдзень) наступіла (наступіў).*

*Надвечар усхадзіўся вецер і пад поўнач захаладзела А мне з поўдня горш стала.* К. Чорны.

**ПОЎНЫ — ПУСТЫ (ПАРОЖНІ)**

**Поўны. 1.** Напоўнены чым-небудзь да самага верху. **2.** Які змясціў у сябе найбольш магчымую колькасць людзей.

**Пусты. 1.** Нічым не напоўнены. **2.** Які не заняты, свабодны.

*Поўны, -ая, -ае (пусты, -ая, -ое) бочка, бутэлька, вядро, гумно, засек, кубак, куфар, сіфон, тара, чарка.*

*Дзве пустыя і дзве поўныя бутэлькі сведчылі аб тым, што выпіўка была толькі ў самым пачатку.* Я. Колас.

*Поўны, -ая, -ае (пусты, -ая, -ое) аўдыторыя, аўтобус, вагон, зала, салон, тралейбус, трамвай.*

*Адышлі поўныя аўтобусы, на іх месца падалі пустыя — і натоўп высыпаў на вуліцу.* І Шамякін. *Свае дыфірамбы Сыраватка прысвячае звычайнай чарцы-выручалцы. Аднак, дададзім, не парожняй, а поўнай.* «Звязда»

**ПРАВЫ (НЯВІННЫ, БЯЗВІННЫ) — ВІНАВАТЫ**

**Правы.** Які дзейнічае паводле агульнапрынятых норм людскіх узаемаадносін.

**Вінаваты.** Які дзейнічае насуперак агульнапрынятым нормам людскіх узаемаадносін

*Правы, -ая, -ае (вінаваты, -ая, -ае) напалавіну, цалкам, часткова.*

*Зрэшты цяпер пара задумвацца над тым, хто тут правы, а хто*

*вінаваты* І Новікаў *Калі раней ей спачувалі, лічылі яе нявіннай ахвярай гада Хурса, дык цяпер, наадварот,— яна была ва ўсім вінавата, а Хурс зрабіўся раптам нявінны анелак.* К Чорны. *«Супакойся, Возерчык,— спыніў Лапацін бурны імпэт старшага сяржанта.— Мы тут самі разбяромся, хто вінаваты, а хто бязвінны»* «Звязда».

**ПРАЗРЫСТЫ — КАЛАМУТНЫ**

**Празрысты.** Які добра прапускае святло, прасвечваецца.

**Каламутны.** Які дрэнна прапускае святло, не прасвечваецца.

*Празрысты, -ая, -ае (каламутны, -ая, -ае) вада, вадкасць.*

*Сіняя і празрыстая восеньская вада.* П. Броўка. *Пасярэдзіне ўзняўся высокі фантан каламутнай вады, а як толькі разышліся кругі, па рэчцы паплылі белымі чэравамі дагары вялікія рыбіны.* С. Грахоўскі.

**ПРАЎДА — ХЛУСНЯ (МАНА, ВЫДУМКА, ФАНТАЗІЯ, КАЗКА, ФАЛЬШ, МІРАЖ, НЯПРАЎДА)**

**Праўда.** Тое, што адпавядае сапраўднасці

**Хлусня.** Тое, што з'яўляецца наўмысным скажэннем сапраўднасці

**Выдумка.** Тое, што з'яўляецца вынікам выдумлівання.

**Фантазія.** Тое, што з'яўляецца вынікам фантазіравання.

**Казка.** Тое, што не з'яўляецца рэальным фактам.

**Фальш.** Тое, што з'яўляецца вынікам прытворства або няшчырасці.

**Міраж.** Тое, што з'яўляецца скажоным адлюстраваннем рэчаіснасці

*Праўда (хлусня) абсалютная, відавочная, чыстая, яўная; выяўляецца, раскрываецца.*

*«Паміж хлуснёй і праўдай такая самая розніца, як паміж святлом і цемрай»,— лагодна і цярпліва тлумачыў ен свайму вучню.* П. Кавалеў *Гаворка йшла. Яе цяпло іх саграваламі, як вясна. І тое з імі, што было,— святая праўда, не мана.* П. Броўка *Усе выйшлі з-за стала, і ніхто не ведаў, ці гэта праўду расказваў Себастыян Рамашка, ці выдумляў. У яго праўда выходзіла, як выдумка, а выдумка, як чыстая праўда* К. Чорны. *Папраўлюся, гэта ніякая не фантазія, а чыстая праўда пра вёску Плыты.* Р Семашкевіч. *А нашага Тупчыка [вожыка] тата злавіў у лесе і прынёс у кішэні дахаты. І гэта не казка, а праўда.* Я. Брыль. *Маленькі чытач непадкупна патрабавальны, чулы на праўду і фальш, дапускае ў свет сваёй чыстай паэтычнай душы толькі таго, хто таксама шчыры і закаханы ў прыгожае.* Я. Брыль. *У выдумках яго — бяды ніякай: за праўду ён не выдае міраж.* Н. Гілевіч. *Не магла падумаць, што бацька сказаў няпраўду, бацька заўсёды гаварыў праўду.* І. Шамякін.

**ПРАЎДЗІВЫ** (у знач. *наз.*) — **КРЫВАДУШНЫ** (у знач. *наз.*)

**Праўдзівы.** Той, хто шчыры, непрытворны.

**Крывадушны.** Той, хто двудушны, прытворны.

*Праўдзівы (крывадушны) напаткаецца, сустрэнецца.*

*Ты вучышся ў праўдзівых, мужных, і прад табой яснее даль. Але нямала й крывадушных мне сустракалася, на жаль.* П. Броўка.

**ПРОДАК (ПРАШЧУР) — НАШЧАДАК (НАСТУПНІК** *(разм.)***)**

**Продак.** Папярэднік па бацькоўскай або мацярынскай лініі ў адносінах да свайго пераемніка.

**Прашчур.** Даўні продак па бацькоўскай або мацярынскай лініі ў адносінах да свайго пераемніка

**Нашчадак.** Пераемнік па бацькоўскай або мацярынскай лініі ў адносінах да свайго папярэдніка.

*Продак (нашчадак) блізкі, далёкі.*

*У сённяшняй жа Германіі ён, нашчадак сваіх продкаў, знайшоў для сябе тое, па што цяпер у Царград, асаджаны туркамі-асмана-*

*мі, хадзіць не падумаеш.* А. Асіпенка. *Адгукніся, далёкі прашчур, я — нашчадак твой, чалавек.* Д. Марозаў. *І продкі, глытаючы сліну, не елі з чужога стала. А чым жа наступнікі вінны, каб існасць іх горшай была?* С. Законнікаў.

**ПРОСТЫ — СКЛАДАНЫ**

**Просты.** Не цяжкі для разумення, выканання, рашэння.

**Складаны.** Цяжкі для разумення, выканання, рашэння.

*Просты, -ая, -ае (складаны, -ая, -ае) аперацыя, задача, праблема, прыклад, пытанне, сітуацыя, справа.*

*Такія простыя разуменні. Простыя, калі мір і хлеб ёсць, але якія складаныя, калі іх няма.* І. Шамякін.

**ПРЫВІТАННЕ — АДВІТАННЕ**

**Прывітанне.** Абмен прывітальнымі словамі, поціскамі рук, пацалункамі пры сустрэчы.

**Адвітанне.** Абмен адвітальнымі словамі, поціскамі рук, пацалункамі пры развітанні.

*Прывітанне (адвітанне) афіцыйнае, сардэчнае, скорае, фармальнае, халоднае, цеплае.*

*Тым часам, сястрыца мая, давай абнімемся, пацалуемся — гэта будзе і прывітанне і адвітанне.* У. Дубоўка.

**ПРЫВЫКНУЦЬ — АДВЫКНУЦЬ**

*незак.* прывыкаць — адвыкаць

**Прывыкнуць.** Набыць прывычку да чаго-небудзь.

**Адвыкнуць.** Страціць прывычку да чаго-небудзь.

*Прывыкнуць (адвыкнуць) купацца, курыць, піць, працаваць, спрачацца.*

*Сёлета яшчэ ёй трэба не толькі адвыкнуць ад роднай вёскі і прывыкнуць тут працаваць, а трэба перажыць і яшчэ адно — сустрэчу з Паўлам.* Г. Далідовіч.

**ПРЫГОЖЫ — БРЫДКІ (НЕПРЫГОЖЫ)**

**Прыгожы.** Які прыносіць асалоду знешнім выглядам, гармоніяй фарбаў, формаў і пад.

**Брыдкі.** Які выклікае агіду знешнім выглядам, дысгармоніяй фарбаў, формаў і пад.

*Прыгожы, -ая, -ае (брыдкі, -ая, -ае) дзіця, дзяўчына, дзяцюк, жаніх, жанчына, жонка, знешнасць, маладзіца, муж, мужчына, нявеста, удава, удавец.*

*Яна яшчэ хацела сказаць, што калі да яе не прыходзяць вартыя хлопцы, абмінаюць яе, брыдкую, шукаюць маладых і прыгожых, то ёй абы-хто не трэба.* Г. Далідовіч.

**ПРЫГОЖАЕ** (*у знач. наз.*) **— БРЫДКАЕ** (*у знач. наз.*)

**Прыгожае.** Тое, якое адпавядае агульнапрынятым уяўленням пра прыгажосць, хараство.

**Брыдкае.** Тое, якое адпавядае агульнапрынятым уяўленням пра брыдкасць, пачварнасць.

*Прыгожае (брыдкае) выяўляецца, раскрываецца.*

*Узнікае думка, што прызначэнне мастацтва шырэй толькі аднаго выяўлення прыгожага, якое ёсць у жыцці, бо ў жыцці ёсць і брыдкае, і смешнае, і трагічнае.* І. Навуменка.

**ПРЫЕМНЫ — ПРЫКРЫ**

**Прыемны.** Які выклікае пачуццё задавальнення, радасці.

**Прыкры.** Які выклікае пачуццё незадавальнення, агіды.

*Прыемны, -ая, -ае (прыкры, -ая, -ае) выпадак, думка, занятак, навіна, слова, успамін.*

*Калі разабрацца па справядлівасці, то яна сказала болей яму прыемных слоў, чым прыкрых.* Я. Колас.

**ПРЫЕХАЦЬ (ПАД'ЕХАЦЬ) — АД'ЕХАЦЬ (З'ЕХАЦЬ)**

*незак.* прыязджаць — ад'язджаць

**Прыехаць.** Перамяшчаючыся на чым-небудзь, апынуцца ў якім-небудзь месцы.

**Пад'ехаць.** Едучы, наблізіцца да якога-небудзь месца.

**Ад'ехаць.** Пачаўшы ехаць на чым-небудзь, пакінуць якое-небудзь месца.

*Прыехаць (ад'ехаць) аўтобусам, веласіпедам, караблём, падводаю, тралейбусам, трамваем.*

*Ен раніцай ад'язджае, вечарам прыязджае.* І. Навуменка. *З'язджалі ўсе ад нас яны, на іх месца прыязджалі новыя, маладыя, а тут заставаліся толькі трое-чацвёра, мы, тутэйшыя.* Г. Далідовіч. *Калі немцы нарэшце выйшлі і машына ад'ехала хутчэй, чым пад'ехала, з большым грукатам па прамёрзлай зямлі, Вольга і Алесь доўга маўчалі.* І. Шамякін.

**ПРЫЗНАЦЬ — АБВЕРГНУЦЬ (АДМОВІЦЬ)**

*незак.* прызнаваць — абвяргаць

**Прызнаць.** Пацвердзіць думку, факт, сітуацыю і пад.

**Абвергнуць.** Раскрыць ілжывасць, беспадстаўнасць якой-небудзь думкі, факта, сітуацыі і пад.

**Адмовіць.** Выказаць нязгоду з якой-небудзь думкай, фактам, сітуацыяй і пад.

*Прызнаць (абвергнуць) асабіста, афіцыйна, вусна, неафіцыйна, пісьмова.*

*Я не бяруся зараз ні абвяргаць, ні прызнаваць слушнасці абодвух выказванняў, лічу адназначную ацэнку прынцыпова немажлівай у сувязі з існуючай у нас яшчэ заблытанасцю паняццяў.* У. Казбярук *Кароль прызнаваў свой удзел у тайных таварыствах масонаў, але сваю сувязь з дзекабрыстамі адмаўляў.* А. Асіпенка.

**ПРЫЗНАЧЭННЕ — ЗВАЛЬНЕННЕ**

**Прызначэнне.** Рашэнне аб залічэнні на работу, пасаду.

**Звальненне.** Рашэнне аб вызваленні з работы, пасады.

*Прызначэнне (звальненне) абвяшчалася, адбылося; запозненае своечасовае.*

*Мае прызначэнне ў школу абнадзеіла ўсіх ссыльных, а звальненне прыгняло безнадзейнасцю і беспрасвеццем нашага становішча.* С. Грахоўскі.

**ПРЫЛІПАЦЬ — АДРЫВАЦЦА**

*зак.* прыліпнуць — адарвацца

**Прыліпаць.** Прылепліватца, прыставаць.

**Адрывацца.** Аддзяляцца, адпадаць.

*Прыліпаць (адрывацца) вусеню, кляшчу, лісту, пластыру.*

*Костусь амаль упэўнены, што калі клешч прыліп да скуры, дык ужо не адарвецца.* М. Лужанін.

**ПРЫЛІЎ — АДЛІЎ**

**Прыліў.** Перыядычны прыток марской вады на бераг у выніку пад'ёму ўзроўню вады.

**Адліў.** Перыядычны адток марской вады з берага ў выніку спаду ўзроўню вады.

*Прыліў (адліў) ціхі, шумны; пачаўся, скончыўся.*

*Мяняліся прылівы і адлівы.* А. Грачанікаў.

**ПРЫПУСЦІЦЬ — ПЕРАСТАЦЬ**

*незак.* прыпускаць — пераставаць

**Прыпусціць.** Пачацца.

**Перастаць.** Спыніцца.

*Прыпусціць (перастаць) дажджу.*

*Дожджык, дожджык, прыпусці, Юльцы трэба падрасці. Дожджык, дожджык, перастань, Янка вучыцца лятаць.* Н. Тулупава.

**ПРЫСЕЎШЫ — ПАДНЯЎШЫСЯ**

*незак.* прысядаючы — падымаючыся

**Прысеўшы.** Сагнуўшы ногі ў каленях і апусціўшыся пры гэтым.

**Падняўшыся.** Узняўшыся на ногі.

*Прысеўшы (падняўшыся) воддаль, збоку, побач, умомант.*

*Падсвіснуў і, трымаючы абедзвюма рукамі за полы цёмна-карычневага бурноса, пачаў раскідваць ногі, то прысядаючы, то падымаючыся, мажны, з ганарыста падкручанымі вусамі мужчына.* В. Адамчык.

**ПРЫСУТНЫ — АДСУТНЫ**

**Прысутны.** Які прысутнічае, знаходзіцца ў пэўным месцы.

**Адсутны.** Які адсутнічае, не знаходзіцца ў пэўным месцы.

*Прысутны, -ая, -ае (адсутны, -ая, -ае) вучань, дэлегат, дэпутат, ісцец, навучэнец, сведка, студэнт, чалавек, юбіляр.*

*Я голасу не падаю, я ляжу ў зялёнай траве і ўпершыню разумею,*

*што я адначасна ёсць і не ёсць, што я адначасна прысутны і адсутны, усюды і тут.* А. Разанаў.

**ПРЫТУЛІЦЦА — АДШТУРХНУЦЦА**

*незак.* прытуляцца — адштурхацца

**Прытуліцца.** Прыгарнуцца, прыхіліцца да каго-небудзь.

**Адштурхнуцца.** Штуршком адсунуцца ад каго-небудзь.

*Прытуліцца (адштурхнуцца) злёгку, наўмысна, неспадзявана, раптам*

*Жонка яшчэ мацней прытулілася да Сцяпуры, потым раптам адштурхнулася ад яго.* М. Парахневіч.

**ПРЫХІЛЬНІК — ПРАЦІЎНІК**

**Прыхільнік.** Чалавек, які прыхільна ставіцца да пэўных з'яў, працэсаў, традыцый.

**Праціўнік.** Чалавек, які непрыхільна ставіцца да пэўных з'яў, працэсаў, традыцый.

*Прыхільнік (праціўнік) аэробікі, галадання, калектывізацыі, перабудовы, раззбраення, рэформы, узбраення, урбанізацыі.*

*Барацьба паміж прыхільнікамі і праціўнікамі рэформ дасягнула свайго апагею.* ЛіМ.

**ПРЫХОД — АДЫХОД**

**Прыход. 1.** Прыбыццё кагосьці. **2.** Пачатак чагосьці працяглага ў часе.

**Адыход. 1.** Адбыццё кагосьці. **2.** Канец чагосьці працяглага ў часе.

*Прыход (адыход) госця, інспектара, калегі, міліцыянера, равесніка, суседа, сябра, таварыша, урача.*

*Разам з тым падсвядомая цьмяная радасць, што з'явілася з яго прыходам, рабілася выразнай — ён, мусіць, і праўда хоча зрабіць прапанову.* В. Блакіт. *«Добра,— кажа дзяўчынка,— але мне хочацца на адыход цябе пачаставаць».* А. Якімовіч.

*Прыход (адыход) года, дня, сезона, тыдня*

*Ты, як усе, спаткай году прыход, беларусаў сямейка худая.* Я. Купала. *Здавалася б, адыход дня павінен засмуціць чалавека, бо ўсё, што адыходзіць, выклікае сум і трывогу.* У. Ліпскі.

**ПРЫЦЯГНУЦЬ — АДШТУРХНУЦЬ**

*незак.* прыцягваць — адштурхоўваць

**Прыцягнуць.** Выклікаць да сябе сімпатыю, прыхільнасць, любоў якімі-небудзь рысамі характару.

**Адштурхнуць.** Выклікаць да сябе антыпатыю, непрыязнасць, нянавісць якімі-небудзь рысамі характару.

*Прыцягнуць (адштурхнуць) непрыкметна, несвядома, скрыта, употай.*

*Серафім не ведаў, на чый бок яму стаць. Марк то адштурхоўваў Серафіма, то прыцягваў да сябе незразумелай сілай.* А. Асіпенка.

**ПЫТАННЕ — АДКАЗ**

**Пытанне. 1.** Вусны ці пісьмовы зварот, які патрабуе адказу. **2.** Праблема, якая патрабуе вырашэння.

**Адказ. 1.** Вуснае ці пісьмовае рэагаванне, якое выклікана зместам пытання. **2.** Шлях, метад вырашэння праблемы.

*Пытанне (адказ) дакладнае (-ы), заблытанае (-ы), зразумелае (-ы), нечаканае (-ы), прадуманае (-ы); аўтару, дэпутату, лектару, міністру, пісьменніку.*

*Старшыня камісіі з цікавасцю сачыў і за пытаннямі Лабановіча, і за адказамі вучняў.* Я. Колас.

*Пытанне (адказ) простае (-ы), складанае (-ы).*

*Каторы ўжо раз Агееў ставіў перад сабою гэтае пытанне і не знаходзіў на яго адказу.* В. Быкаў.

**ПЭЎНА — НЯПЭЎНА**

**Пэўна.** Дакладна, канкрэтна.

**Няпэўна.** Недакладна, прыблізна.

*Пэўна (няпэўна) выказвацца, разважаць, тлумачыць.*

*Там, дзе няпэўна, ён гаварыў вусна, дзе пэўна, заўсёды пісаў, каб пакінуць дакуменцік, відаць.* І. Шамякін.

**ПЯРЭДНІ — ЗАДНІ**

**Пярэдні. 1.** Які знаходзіцца, размяшчаецца наперадзе такіх жа або падобных аб'ектаў. **2.** Які знаходзіцца ў той частцы тулава, што з'яўляецца перадам.

**Задні. 1.** Які знаходзіцца, размяшчаецца ззаду такіх жа або падобных аб'ектаў. **2.** Які знаходзіцца ў той частцы тулава, што з'яўляецца задам.

*Пярэдні, -яя, -яе (задні, -яя, -яе) брычка, кола, конь, машына, падвода, салон, фара, фурманка, шарэнга.*

*Ехалі ўсю ноч, уключыўшы пярэднія і заднія фары.* «Звязда».

*Пярэдні, -яя, -яе (задні, -яя, -яе) канечнасць, лапа.*

*І раптам на гэтым доле ў ельніку з'явіўся аднекуль заяц, сюды-туды пакруціў вушастаю галавою, прысеў на заднія лапы і пярэднімі пачаў дбайна ацiраць вусатую пыску.* В. Быкаў.

**ПЯРЭДНІ** *(у знач. наз.)* **— ЗАДНІ** *(у знач. наз.)*

**Пярэдні.** Той, які знаходзіцца спераду.

**Задні.** Той, які знаходзіцца ззаду.

*Пярэдні (задні) падае, падымаецца, паказваецца, спыняецца, тармозіць.*

*А тут яшчэ заднія на пярэдніх напіраюць: хутчэй, хутчэй!* «Вожык».

**ПЯЧЫСЯ — МЕРЗНУЦЬ**

*зак.* спячыся — змерзнуць

**Пячыся.** Доўга грэцца на сонцы, быць пад яго гарачымі праменямі.

**Мерзнуць.** Рабіцца халодным, акалелым.

*Пячыся (мерзнуць) даросламу, дзіцяці, селяніну, старому.*

*Ці гнуўся з вас хто над сахою ў полі? Ці вёз з вас каторы да места дроў воз, на фунт які крупаў, ці фунт які солі? Ці пёкся на сонцы, ці мёрз у мароз?* Я. Купала.

## Р

**РАГАТЫ — БЯЗРОГІ**

**Рагаты.** Які мае рогі.

**Бязрогі.** Які не мае рагоў.

*Рагаты, -ая, -ае (бязрогі, -ая, -ае) алень, баран, д'ябал, жывёла, каза, карова, касуля, чорт.*

*Чарцей было шмат: малыя, вялікія, рагатыя, бязрогія, маладыя і старыя, якія рабілі сваю чарціную справу з яўнай асалодай.* А. Асіпенка.

**РАДАВАЦЦА — СМУТКАВАЦЬ (СУМАВАЦЬ, ГАРАВАЦЬ, ЗАСМУЧАЦЦА)**

*зак.* абрадавацца — засмуткаваць

**Радавацца.** Адчуваць радасць.

**Смуткаваць.** Перажываць смутак.

*Радавацца (смуткаваць) бацьку, даросламу, малому, мацеры, пажылому, старому; штодня, штокольвечы.*

*Калі ён прыехаў у вёску, каб забраць жонку і дачку да сябе, Іра абрадавалася, але, заўважыўшы, як спахмурнела маці, разгубілася, не ведаючы: радавацца ці смуткаваць.* В. Блакіт. *Ён ведаў яе з маленства, пасля ж раз неяк нечакана адрозніў яе ад усіх іншых дзяўчат і тады пачаў гарэць ёю, радавацца і сумаваць.* К.Чорны.

**РАДАВАЦЬ — ЗАСМУЧАЦЬ**

*зак.* узрадаваць — засмуціць

**Радаваць.** Выклікаць у каго-небудзь пачуццё радасці.

**Засмучаць.** Выклікаць у каго-небудзь пачуццё душэўнай горычы.

*Радаваць (засмучаць) бацьку, дарослага, малога, маці, пажылога, старога.*

*Яны засмуцілі ўласную маці, але вельмі ўзрадавалі Вольгу Андрэеўну: нявестка едзе ў іх дом, назаўсёды.* І. Шамякін.

**РАДАСНЫ — СУМНЫ**

**Радасны. 1.** Які перажывае радасць, душэўны ўздым. **2.** Напоўнены радасцю.

**Сумны. 1.** Які перажывае сум, душэўны прыгнёт. **2.** Напоўнены сумам.

*Радасны, -ая, -ае (сумны, -ая, -ае) асоба, жанчына, мужчына, юнак.*

*Сцяпанаў Андрэй — радасны ў радасці, нешчаслівы ў няшчасці, сумны ў адзіноцтве, бяссільны на лёс.* С. Яновіч.

*Радасны, -ая, -ае (сумны, -ая, -ае) аповяд, думка, матыў, мелодыя, настрой, пачуццё, сустрэча, час.*

*Вяртаючыся да радасных дзен нашых сустрэч, нашай дружбы і да сумных часін заўчаснай смерці майго незабыўнага, дарагога сябра, зноў не веру, што яго* [С. Блатуна] няма. Р. Барадулін.

**РАДАСЦЬ — СМУТАК (СУМ, ЗАСМУЧЭННЕ, СКРУХА, НУДА, ЖУРБА, ТУГА, ГОРЫЧ, ГОРА, БЯДА, ЖАЛЬ)**

**Радасць.** Пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці.

**Смутак.** Пачуццё глыбокага душэўнага болю.

**Сум.** Пачуццё шкадавання каго ці чаго-небудзь страчанага.

**Засмучэнне.** Пачуццё душэўнай горычы.

**Скруха.** Туга, маркота.

**Нуда.** Сум, туга.

**Журба.** Пачуццё душэўнай прыгнечанасці.

**Жаль.** Пачуццё, выкліканае перажываннем расстання з кім-небудзь, страты.

*Радасць (смутак) вялікая (-і), імгненная (-ы), кароткачасовая (-ы), невымерная (-ы); бацькі, дарослага, малога, мацеры, пажылога, старога.*

*«Шкада, што размінуліся...» — наколькі мог абыякава сказаў Міхась, а сам ці то з радасцю, ці то з нейкім шчымлівым смуткам стаў разумець, што не, не зарасло быллём-палыном былое.* В. Блакіт. *«Да радасці ўплятаецца сум — за самога сябе...» — «Пра што я, кажаце, думаў тады?» — «Думаў, што дома ў мяне, у нашай станіцы, засталася толькі сястра».* Я. Брыль. *Пад вечар таго ж дня, на радасць Ганне і на засмучэнне Марыне, Шышка вярнуўся.* І. Шамякін. *Амаль дзіцячая, бязмежная радасць вясне, красаванню, якой быў поўны верш, адгукалася ў Апейку скрухаю, непакоем.* І. Мележ. *Мо' і радасць тут — госць, больш нуды праклятай; вось бярыце, што есць, чым хата багата.* Я. Купала. *Але ёсць і слова «Трэба!» — як паветра на зямлі, як дыханне; яго ў радасці, у журбе з пакалення ў пакаленне чалавек нясе ў сабе.* В. Жуковіч. *Жыццё і смерць — як вольтава дуга, век працінае навальнічным токам. Перагараюць радасць і туга, каб засвяціцца полымем высокім.* С. Гаўрусёў. *Аж да горычы прымешвалася і радасць: значыцца тут, наверсе, яго не забылі, ведаюць, на што ён здольны.* В. Супрунчук. *Згаданая ўжо, крыху старамодная галантнасць і ветлівасць ніколі не пакідалі Канстанціна Міхайлавіча абыякавым і да жаночага гора, і да жаночай усмешкі. Іменна яны — гора і радасць — заўсёды моцна ўваходзілі ў душу Канстанціна Міхайлавіча.* М. Лужанін. *Жанчыны былі больш шчодрыя на словы, на выказванне і сваіх радасцей, і сваіх бед.* І. Шамякін. *З радасцю і ў той жа час з жалем развітаўся Андрэй з Сымонам Тургаем.* Я. Колас.

**РАДЗІМА — ЧУЖЫНА**

**Радзіма.** Родная, свая зямля, краіна.

**Чужына.** Няродная, чужая зямля, краіна.

*Радзіма (чужына) бачыцца, сніцца, успамінаецца.*

*У цяжкія хвіліны жыцця ён сумысля выклікаў у памяці сваёй гэтую сваю радзіму: на чужыне цяжка жыць.* К. Чорны.

**РАДЗІНЫ** *(адз. няма)* — **ХАЎТУРЫ** *(адз. няма)*

**Радзіны.** Абрад святкавання нараджэння дзіцяці.

**Хаўтуры.** Абрад пахавання нябожчыка.

*Радзіны (хаўтуры) спраўляць*

*Прывычная зімовых святаў рыска — марозны пах падсіненых гардзін. Хаўтур нямала бачыў і радзін бацькоўскі дом — дзіцячых мар калыска.* С. Басуматрава.

**РАДЫКАЛЬНА — КАНСЕРВАТЫЎНА**

**Радыкальна.** Пра прыхільнасць да ўсякага новага, прагрэсіўнага і варожасць да старога, аджыўшага.

**Кансерватыўна.** Пра прыхільнасць да ўсякага старога, аджыўшага і варожасць да новага, прагрэсіўнага.

*Радыкальна (кансерватыўна) вытрыманы, выхаваны, настроены; дзейнічаць.*

*Ці адбылося за гэтыя пяць дзён размежаванне дэпутацкага корпуса на «правых» і «левых», на радыкальна і кансерватыўна настроеных?* «Звязда».

**РАЗВЕДКА — КОНТРРАЗВЕДКА**

**Разведка.** Спецыяльна падрыхтаванае фарміраванне па здабыванню сакрэтных звестак.

**Контрразведка.** Спецыяльна падрыхтаванае фарміраванне па барацьбе з варожай разведкай.

*Разведка (контрразведка) адладжаная, бездапаможная, вопытная, спрактыкаваная, умелая.*

*Надзвычай адладжаная, спрактыкаваная разведка служб СС, СД, гестапа ведала «ахілесаву пяту» нашых органаў, у тым ліку контрразведкі і разведкі, і вельмі хітра выкарыстоўвала падазронасць галоўных інфарматараў — тых, хто перадаваў звесткі аб становішчы на акупіраванай зямлі, у гарадах і сёлах, у Маскву* І. Шамякін.

**РАЗУМНАЕ** *(у знач. наз.)* **— ДУРНОЕ** (у знач. наз.)

**Разумнае.** Тое, што лагічнае, аргументаванае.

**Дурное.** Тое, што алагічнае, неаргументаванае.

*Разумнае (дурное) тварыць, учыняць.*

*Але мары ап'янялі, а ап'янелы чалавек хто ведае, на што здольны. І на разумнае і на дурное — гэта ўжо гледзячы па абставінах.* В. Быкаў.

**РАЗУМНЫ** *(у знач наз)* **— ДУРАНЬ**

**Разумны.** Той, хто надзелены розумам.

**Дурань.** Той, хто разумова абмежаваны, тупы.

*Разумны (дурань) ацэньвае, вінаваціць, патрабуе.*

*Дурань спытае — разумны не адкажа, дурань зварыць кашу — разумны не з'есць.* Прыказка.

**РАЙ — ПЕКЛА**

**Рай. 1.** Месца, дзе знаходзяць шчаслівае існаванне душы праведнікаў пасля іх смерці *(рэліг.)*. **2.** Добрыя жыццёвыя ўмовы.

**Пекла. 1.** Месца, дзе церпяць вечныя пакуты душы грэшнікаў *(рэліг.)*. **2.** Дужа дрэнныя, цяжкія жыццёвыя ўмовы.

*Рай (пекла) наканаваны (-ае), суджаны (-ае).*

*Быў яшчэ недзе нейкі рай, але аб ім чамусьці было вельмі мала звестак. Відаць, таму, што да нашага брата бліжэй былі чэрці ды пекла, а рай быў вельмі далёка.* Я. Маўр.

*Рай (пекла) тамашні (-яе), тутэйшы (-ае).*

*Хоць ззянне золата не змеркла, але чыё яно, чыё? Каму тут рай, каму ж і пекла, тут, кажуць, кожнаму сваё.* П. Броўка.

**РАНА — ПОЗНА**

**Рана.** Да ўстаноўленага, патрэбнага тэрміну, часу.

**Позна.** Пасля ўстаноўленага, патрэбнага тэрміну, часу.

*Рана (позна) ганіць, закончыць, з'явіцца, легчы, пачаць, усвядоміць, устаць, хваліць.*

*Безгалоўе поўнае, даказваю я ў заметцы, бо нават бляшанку з-пад кансерваў рана ці позна з'есць іржа.* І. Навуменка.

**РАНІЦА (РАНАК, РАННЕ) — ВЕЧАР**

**Раніца. 1.** Час, якім пачынаецца дзень. **2.** Пачатак існавання чаго-небудзь.

**Вечар. 1.** Час, якім завяршаецца дзень. **2.** Канец існавання чаго-небудзь.

*Раніца (вечар) мінулася (-ў), наступіла (-ў). зябкая (-і), сцюдзёная (-ы), халодная (-ы), цёплая (-ы), ціхая (-і)*

*Не з раніцы да вечара жывём — жывём ад чалавека к чалавеку.* Л. Галубовіч.

*Раніца (вечар) жыцця, жыццядзейнасці.*

*Хай раніца жыцця майго ўваскрэсне, хай вечар мне жыцця ноч дапяе.* Я. Купала. *Ад ранку да вечара сонца глядзела, каб жыта бурштынавым зернем паўнела.* П. Макаль. *Не трэба клясціся ў любові ад вечара да рання.* Л. Дайнека.

**РАСКОША — ГАЛЕЧА**

**Раскоша.** Празмерны дастатак.

**Галеча.** Крайняя беднасць.

*Раскоша (галеча) побач, поруч.*

*Там побач з раскошай галеча, лахмоцце і бездані цемнай імгла.* Я. Колас.

**РАССУНУЦЦА — САМКНУЦЦА**

*незак.* рассоўвацца — змыкацца

**Рассунуцца.** Расхіліцца ў бакі.

**Самкнуцца.** Вярнуцца ў статычнае становішча.

*Рассунуцца (самкнуцца) быльнёгу, ельніку, крушыннніку, лазняку, маліннніку.*

*Быльнёг як нечакана рассунуўся, гэтак жа нечакана самкнуўся сцянoю.* А. Асіпенка.

**РАСХВАЛЯВАЦЬ — СУПАКОІЦЬ**

*незак.* расхвалеўваць — супакойваць

**Расхвалявацъ.** Прывесці каго-небудзь у стан хвалявання.

**Супакоіць.** Прывесці каго-небудзь у стан спакою.

*Расхваляваць (супакоіць) бацьку, госця, калегу, маці, наведвальніка, пакупніка, субяседніка, суседа, сябра, хворага.*

*Мы тады з ім выпілі пляшку добрага віна, шчыра пагаварылі. Дзіўна, але віно яго не ўзрушыла, не расхвалявала, а, наадварот, супакоіла, ён як бы праясніўся, стаў усмешлівым. сабраным, жартаваў, анекдоты расказваў.* В. Хомчанка.

**РОДНЫ — ЧУЖЫ**

**Родны. 1.** Звязаны роднаснымі адносінамі. **2.** Звязаны з месцам нараджэння.

**Чужы. 1.** Не звязаны роднаснымі адносінамі. **2.** Не звязаны з месцам нараджэння.

*Родны, -ая, -ае (чужы, -ая, -ое) дзіця, дзяўчына, хлапчанё.*

*Роднае дзіця сустрэў, як чужое.* Г. Далідовіч.

*Родны, -ая, -ае (чужы, -ая, -ое) горад, зямля, край, кут, старана, тэрыторыя.*

*Во дзіва, падумаў Хведар, выходзіць, што ў чужой старане лепш, чым у роднай* В. Быкаў.

**РОЗУМ — ДУРАСЦЬ**

**Розум.** Здальнасць мысліць, разумець.

**Дурасць.** Разумовая абмежаванасць, тупасць.

*Розум (дурасць) вялікі (-ая); павялічваецца, памяншаецца, прыбаўляецца*

*Разумнаму навука прыбаўляе розуму, а дурню — дурасці.* Прыказка.

**РОСКВІТ (УЗДЫМ) — ЗАНЯПАД**

**Росквіт. 1.** Найвышэйшы стан развіцця фізічных сіл і духоўных магчымасцей каго-небудзь. **2.** Пад'ём у сферах грамадскага жыцця або прыватнай дзейнасці.

**Заняпад. 1.** Упадак фізічных сіл і духоўных магчымасцей каго-небудзь. **2.** Упадак у сферах грамадскага жыцця або прыватнай дзейнасці.

*Росквіт (заняпад) асобы; духоўны, фізічны.*

*Я вось бачу, што вы безнадзейны ідэаліст, хоць вы будзеце з усёй сілы даводзіць, што вы мужчына ў росквіце гадоў. Але што, уласна, ёсць росквіт, як не заняпад?* А. Асташонак.

*Росквіт (заняпад) гаспадаркі, культуры, літаратуры, навукі, прамысловасці, таленту, эканомікі*

*Цяжкі і цярністы шлях прайшлі нашы рэспублікі — ад кароткага росквіту нацыянальных культур да заняпаду, да страты роднай мовы і іншых сацыяльных і культурных каштоўнасцей.* Г. Далідовіч.

*Пасля ўздыму культуры часоў Ф Скарыны і С Буднага пачаўся яе заняпад.* А. Мальдзіс.

**РЭАЛІСТ — ФАНТАСТ (ІДЭАЛІСТ, РАМАНТЫК)**

**Рэаліст.** Той, хто цвяроза ацэньвае рэальную рэчаіснасць.

**Фантаст.** Той, хто адыходзіць ад рэальнай рэчаіснасці ў свет фантастыкі.

**Ідэаліст.** Тон, хто вызначаецца прыхарошваннем рэчаіснасці.

**Рамантык.** Той, хто вызначаецца летуценнасцю, эмацыянальнасцю.

*Рэаліст (фантаст) літаратурны, навуковы, палітычны, тутэйшы.*

*Мы не фантасты — рэалісты, таму за мірны дыялог* М. Федзюковіч. *Мне лягчэй жылося б, каб я хоць трошкі быў ідэалістам Але я рэаліст І не хлопчык Мне шосты дзесятак. Залішне цвярозы рэаліст і ў той жа час рамантык.* І. Шамякін.

**РЭАЛЬНАСЦЬ — ФАНТАЗІЯ (УТОПІЯ, ФАНТАСТЫКА)**

**Рэальнасць.** Тое, што існуе аб'ектыўна, сапраўды.

**Фантазія.** Тое, што створана ўяўленнем, марай.

**Утопія.** Неажыццявімае, немагчымае.

**Фантастыка.** Неверагоднае, немагчымае.

*Рэальнасць (фантазія) даследчыка, калегі, мастака, навукоўца, службоўца.*

*Аднак, прыбыўшы на месца здарэння, ахоўнікі парадку змаглі ўважлівей пераканацца, што бегемот — не вынік фантазіі, а рэальнасць Ён спакойна разгульваў па шашы.* «Звязда». *Агульначалавечыя каштоўнасці — гэта не выдумкі «абстрактных гуманістаў», не добрыя пажаданні «пацыфістаў», не утопія, а рэальнасць.* А. Вярцінскі. *А вопыт — вунь ён, побач, у Старых Дарогах, у Пухавічах, у Талочыне... Гэта не фантастыка, а рэальнасць — жэньшэнь на градках.* «Звязда».

**РЭВАЛЮЦЫЯ — КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯ**

**Рэвалюцыя.** Карэнны паварот у жыцці грамадства, які заключаецца ў насільным звяржэнні старога грамадскага ладу і ўстанаўленні новага грамадскага ладу.

**Контррэвалюцыя.** Рэакцыйная барацьба звергнутых класаў супраць рэвалюцыйнага народа і створанага рэвалюцыяй новага грамадскага ладу.

*Рэвалюцыя (контррэвалюцыя) адступае, наступае, перамагае. Прайшоў год часу, год напружанага змагання рэвалюцыі з контррэвалюцыяй.* Я. Колас.

## С

**САГНУЦЦА — РАЗАГНУЦЦА (ВЫПРАСТАЦЦА)**

*незак.* згінацца — разгінацца

**Сагнуцца.** Надаць тулаву сагнутае становішча.

**Разагнуцца.** Надаць тулаву разагнутае становішча.

**Выпрастацца.** Тое, што і разагнуцца.

*Сагнуцца (разагнуцца) корпусу, постаці, чалавеку.*

*У вёсцы людзі не робяць гімнастык, як у горадзе, бо тут найлепшая гімнастыка — не пустымі рукамі махаць, згінацца ды разгінацца, а дровы калоць, сена вазіць.* Г. Далідовіч. *Зазыба ступіў на травяністы копчык і абочынай, уздоўж заплылай разоры-*

*ны, ад якой пачынаўся засеў, падаўся да жанчыны, што, не зважаючы на галасы, то згіналася, то выпроствалася ў жыцe.* І. Чыгрынаў.

**САГНУЦЬ — РАЗАГНУЦЬ**

*незак.* згінаць — разгінаць

**Сагнуць.** Зрабіць што-небудзь гнутым, надаць яму выгляд дугі, вугла.

**Разагнуць.** Зрабіць што-небудзь сагнутае выпрастаным, прамым.

*Сагнуць (разагнуць) дрот, крук, падкову, прут, прэнт.*

*Ракосы двухметровыя ен гнаў, пруты згінаў і разгінаў падковы, і гіры двухпудовыя гушкаў.* Ю. Свірка.

**САПРАЎДНАСЦЬ (РЭАЛЬНАСЦЬ) — СОН**

**Сапраўднасць.** Тое, што існуе сапраўды, рэальна.

**Сон.** Тое, што сніцца.

*Сапраўднасць (сон) звычайная (-ы), здзіўляючая (-ы), страшная (-ы).*

*І тут у перапоўненай Валодзевай хаце, і ў ярэміцкім клубе, які нядаўна адкрыты — звінеў песняй і музыкай, Паўлу хацелася ўшчыкнуць самога сябе і прачнуцца... Ды гэта быў не сон, а радасная, вынашаная ў марах сапраўднасць.* Я. Брыль. *О, каб усё гэта магло быць проста сном! Але вяселле было рэальнасцю.* В. Блакіт.

**САПРАЎДНЫ — УЯЎНЫ**

**Сапраўдны.** Адчуваемы, перажываемы.

**Уяўны.** Дапускаемы, магчымы.

*Сапраўдны, -ая, -ае (уяўны, -ая, -ае) боль, грэх, крыўда, небяспека.*

*Снежань чысты, мой снежань слаўны, кволых парасткаў не марозь. Боль сапраўдны і боль уяўны працінаюць мяне наскрозь.* В. Гардзей.

**САПРАЎДНЫ — ФАЛЬШЫВЫ (ПРЫДУМАНЫ, ПАДСТАЎНЫ)**

**Сапраўдны.** Праўдзівы, натуральны.

**Фальшывы.** Падроблены, штучны.

**Падстаўны.** Рэкамендуемы свядома замест сапраўднага.

*Сапраўдны, -ая, -ае (фальшывы, -ая, -ае) валюта, дакумент, звестка, інфармацыя, каштоўнасць, подпіс, поспех, фатаграфія.*

*Агледзелі дыпламат. У ім аказалася буйная сума грошай: сапраўдных і фальшывых долараў.* «Звязда».

*Сапраўдныя і прыдуманыя поспехі зеленадубцаў суправаджаліся пастаянна шумнымі папойкамі, сваркамі.* «Звязда». *Яшчэ і цяпер захаваўся ў літоўскіх сёлах звычай, што, пакуль сапраўдныя маладыя рэгіструюцца, іх месца займаюць падстаўныя, звычайна пажылыя людзі.* П. Броўка.

**САШЧАМІЦЬ — РАСШЧАМІЦЬ**

*незак.* сашчамляць — расшчамляць

**Сашчаміць.** Шчыльна злучыць, самкнуць якія-небудзь органы, канечнасці, іх часткі.

**Расшчаміць.** Разлучыць, разамкнуць якія-небудзь органы, канечнасці, іх часткі.

*Сашчаміць (расшчаміць) зубы, кіпцюры, пальцы, рукі, сківіцы.*

*А ён то расшчэмліваў, то сашчэмліваў сваю руку, то зноў лавіў яе халодныя, з калючымі пазногцямі пальчыкі.* В. Адамчык.

**СВАЁ (УЛАСНАЕ)** *(у знач. наз.)* **— ЧУЖОЕ (ЧЫЁСЬЦІ)***(у знач. наз.)*

**Сваё.** Тое, што належыць сабе, уласціва самому.

**Чужое.** Тое, якое належыць іншаму, уласціва іншаму.

*Сваё (чужое) берагчы, вывучаць, любіць, ненавідзець, шанаваць.*

*Любіць сваё — зусім не значыць чужое ганіць, адмаўляць. Ён не то што баяцца пачынаў яе, а чуў у Галене штосьці яе ўласнае, што ніколі не страціцца ў яе, ніколі не падначаліцца пад чужое.* К. Чорны. *Вось за чужым свайго не бачыць, не вывучаць, не шанаваць — злачынствам будзе без сумнення, бо ёсць такі закон жыцця: шануй чужое аж да пакланення, сваё любі да самазабыцця.* П. Бітэль. *Падвойная работа думкі: чытаеш, засвойваеш чыёсьці, а думаеш пра сваё.* Я. Брыль.

**СВЕЖЫ — ПРАКІСЛЫ**

**Свежы.** Які не страціў сваіх натуральных якасцей.

**Пракіслы.** Які страціў свае натуральныя якасці ў выніку браджэння.

*Свежы, -ая, -ае (пракіслы, -ая, -ае) квас, морс, напітак, піва*

*Навошта квас гэтак ашчаджаць, дабро гэтакае Хопіць і свежага, не канечне пракіслы ўчарашні піць.* К. Чорны.

**СВЕТЛЫ — ЗМРОЧНЫ**

**Светлы.** Нічым не азмрочаны, радасны.

**Змрочны.** Чым-небудзь азмрочаны,сумны

*Светлы, -ая, -ае (змрочны, -ая, -ае) будучыня, доля, думка, лёс, успамін, уяўленне.*

*Гэта яе ратавала праз усё жыццё — што ў душы яе жыла паэзія, і ёй, нярэдка з пакутамі, з трудом, удавалася змрочныя думкі, уяўленні адціснуць светлымі, радаснымі, прадчуванне бяды — прадчуваннем шчасця.* І. Шамякін.

**СВЕТЛЫ — ЦЁМНЫ**

**Светлы.** Які па колеру бліжэй да белага.

**Цёмны.** Які па колеру бліжэй да чорнага.

*Светлы, -ая, -ае (цёмны, -ая, -ае) воблака, вока, волас, маса, ноч, пляма, фон.*

*Там вецер нагнаў цэлыя шэрагі хмар, збіў іх у адну густую цёмную масу і закрыў ёю светлую лапіну ад сонца.* К. Чорны.

**СВІТАННЕ (ЗАРА) — ЗМЯРКАННЕ (ПРЫЦЕМАК)**

**Світанне.** Час перад усходам сонца, калі пачынае віднець.

**Змярканне.** Час пасля заходу сонца, калі пачынае цямнець.

*Зямля мая... Світанні і змярканні, і дзень клапотны, звонкі нібы медзь... Што б ні было, а наша існаванне ўсё-ткі сэнс навечна будзе мець.* С. Законнікаў. *Начальнік участка не даваў нікому дыхнуць, і брыгады рабілі ў лесе ад зары да змяркання.* В. Быкаў. *Барыс ад світання да прыцемку цюкаў малаточкам па зубіле да самых дажынкаў.* С. Грахоўскі.

**СВІТАЦЬ — ЗМЯРКАЦЦА (ЦЯМНЕЦЬ)**

*зак* рассвітаць — змеркнуцца

**Світаць.** Пачынаць развідняцца.

**Змяркацца.** Пачынаць цямнець.

*Світаць (змяркацца) позна, рана.*

*Позна світала і рана змяркалася. Можа таму і настрой у некаторых быў пахмурны, як гэтыя шэрыя снежаньскія дні.* С.Грахоўскі. *Дзіва што, цямнее а чацвертай гадзіне пасля поўдня, світае пасля дзевяці раніцы.* А. Асіпенка.

**СВОЙ (УЛАСНЫ) — ЧУЖЫ**

**Свой.** Які належыць сабе, уласцівы сабе, які мае адносіны да сябе.

**Чужы.** Які належыць іншаму, уласцівы іншаму, мае адносіны да іншага.

*Свой, -ая, -аё (чужы, -ая, -ое) боль, бяда, вопыт, грэх, дзіця, думка, жывёла, кроў, маёмасць, недахоп, памылка, пасёлак, свет, старана.*

*Чужое гора, якому не можаш памагчы, кладзецца на сэрца цяжкім каменем, як і сваё.* І. Новікаў. *Я ўсё роўна як зваr'яцеў ад чужога і ўласнага болю.* В. Казько.

**СВОЙ** (*у знач. наз.*) **— ЧУЖЫ** (*у знач. наз.*) **(ЧУЖЫНЕЦ, ЧУЖАК)**

**Свой.** Той, каго ведаюць па сумеснаму месцу жыхарства, па агульнай барацьбе, працы і пад.

**Чужы.** Той, хто не з'яўляецца сваім.

*Свой (чужы) дапамагае, дзейнічае, спрыяе, шкодзіць.*

*Твая справа сустрэць сваіх і не пусціць чужых.* І. Новікаў. *Тры дні і тры ночы бадзяўся Цімох, спакою, прытулку знайсці ён не мог... Баяўся чужынцаў, баяўся сваіх — адсечаны сцежкі, дарогі да іх.* Я. Колас. *Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына, паміж сваіх і чужакоў яна мне ласкай матчынай.* Я. Купала.

**СВЯДОМА — НЕСВЯДОМА (ПАДСВЯДОМА)**

**Свядома.** З якой-небудзь мэтай, з пэўнымі намерамі.

**Несвядома.** Без якой-небудзь мэты, без пэўных намераў.

**Падсвядома.** Інстынктыўна, неўсвядомлена.

*Свядома (несвядома) аслабляць, дапамагаць, крыўдзіць садзейнічаць, умацоўваць, уплываць.*

*Адамс ні на каго не крыўдаваў за калючыя і нават балючыя пытанні. Памяркоўны, ціхі, ён усім даравау, хто яго свядома ці несвядома крыўдзіў.* П. Праднікаў. *Бадай, ні адна літаратура ў працэсе свайго саматварэння не думае тут жа аб сваей уласнай смерці. А наша — тайна ці яўна, свядома ці падсвядома, разумеючы ці здагадваючыся, уголас ці маўчком — змушана гэта рабіць.* В. Зуёнак.

**СВЯДОМЫ — НЕСВЯДОМЫ**

**Свядомы. 1.** Які свядома дзейнічае, дапамагае, шкодзіць і пад. **2.** Які адбываецца, выражаецца з пэўнай мэтай, намерам.

**Несвядомы. 1.** Які несвядома дзейнічае, дапамагае, шкодзіць і пад. **2.** Які адбываецца, выражаецца без пэўнай мэты, намеру.

*Свядомы, -ая, -ае (несвядомы, -ая, -ае) памагаты, пацыфіст, шкоднік, эгаіст*

*Свядомы эгаіст больш літасцівы за несвядомага. Несвядомы лічыць сябе альтруістам і патрабуе ад бліжніх непамернага.* ЛіМ.

*Свядомы, -ая, -ае (несвядомы, -ая, -ае) антыпатыя, асуджэнне, непрыязь, падтрымка, пратэст, рэўнасць, сімпатыя.*

*І ў дваццацівасьмігадовага капітана, як у дзесяцікласніка, да несвядомай чалавечай непрыязі далучылася свядомая злая рэўнасць.* І. Шамякін.

**СВЯТЛО — ЦЕМРА (ЗМРОК)**

**Святло. 1.** Свячэнне, промні, дзякуючы якім успрымаюцца органамі зроку прадметы і з'явы рэчаіснасці. **2.** Увасабленне вучонасці, дабра.

**Цемра. 1.** Адсутнасць святла, цемната. **2.** Увасабленне беспрасвецця, зла.

*Святло (цемра) абышло (-ла), наступіла, усталявалася.*

*«Паміж хлуснёй і праўдай такая самая розніца, як паміж святлом і цемрай», — лагодна і цярпліва тлумачыў ён свайму вучню .* «Полымя».

*Святло (цемра) людское (-ая), народнае (-ая), чалавечае (-ая).*

*А яшчэ мы хочам пабудаваць школы для беларусаў, каб людзі не былі такімі цёмнымі. Хіба гэта дрэнна? Хіба гэта дрэнна — вывесці народ з цемры да святла?* М. Андрэеў.

*Мне было непрытульна тут, у змрочным лесе, далёка ад сям'і, і думаць, што жыццё ў сваім цячэнні няспыннае і ў логіцы сваёй непарушнае і што са змроку чалавек заўсёды выходзіць да святла.* У. Рубанаў.

**СЕСЦІ — УЗЛЯЦЕЦЬ**

*незак.* садзіцца — узлятаць

**Сесці.** Спусціцца зверху, з паветра.

**Узляцець.** Узняцца ўверх, у паветра,

*Сесці (узляцець) арлу, буслу, вароне, вераб'ю, глушцу, голубу, кажану, коршуну, сароцы, цецеруку.*

*Над белым бярозавым плотам лёталі нізка кажаны, шапочучы крыллем; садзіліся на вуліцу ля студні — ля Платона — на белы пясок, пасля ўзляталі і насіліся над пажарышчам.* І. Пташнікаў.

**СЕСЦІ (ПРЫСЕСЦІ) — УСТАЦЬ (ПАДНЯЦЦА)**

*незак.* садзіцца — уставаць

**Сесці.** Прыняць сядзячае становішча.

**Прысесці.** Прыняць сядзячае становішча на непрацяглы час.

**Устаць.** Падняцца з сядзячага становішча.

*Сесці (устаць) жвава, імкліва, моўчкі.*

*Яна села на парозе з ясянец на двор і пачала вычэсваць галаву.*

*Чамусьці маці ўстала і падалася глянуць у хату.* К. Чорны. *Я ўжо некалькі разоў садзіўся адпачываць і з цяжкасцю падымаўся зноў.* В. Жураўскі. *«Ды прысядзь ты»,— ен падняўся, чакаючы, пакуль яна сядзе.* Л. Гаўрылкін.

**СІЛА — СЛАБАСЦЬ (БЯССІЛЛЕ)**

**Сіла. 1.** Фізічная моц. **2.** Станоўчы бок, станоўчая якасць.

**Слабасць. 1.** Фізічнае бяссілле. **2.** Адмоўны бок, адмоўная якасць.

*Сіла (слабасць) відавочная, людская. Сіла (слабасць) апазіцыі, апанента, грамадства, камандзіра, падпольшчыка, падрыўніка, разведчыка.*

*Але ен баяўся яе сілы і сваёй слабасці, а таму хваляваўся і бянтэжыўся больш, чым тады, калі ляжаў хворы.* І. Шамякін. *Сцяпану трэба ведаць, што новая разведчыца ўмее, на што яна здатная, у чым яе сіла, а ў чым і слабасць.* І. Шамякін. *Вось раз у стэпу паляўнічы на зайца выпусціў арла. Арол той з крыкам ваяўнічым імкне на зайца як страла. І чуе заяц за сабою смяртэльны холад страшных крыл: на спіну ўпаў, гатовы к бою, і — шах арла ён з усіх сіл! Згарнуў арол бяссільна крыллі — вантробы выпалі з яго. Хто спадзявацца мог таго? Дык вось, ёсць сіла ў бяссіллі.* Я. Колас.

**СІМПАТЫЯ — АНТЫПАТЫЯ**

**Сімпатыя.** Пачуццё ласкі, прыязнасці ў адносінах да каго-небудзь.

**Антыпатыя.** Пачуццё гідлівасці, непрыязнасці ў адносінах да каго-небудзь.

*Сімпатыя (антыпатыя) асабістая, відавочная, пастаянная, усеагульная; выказана, выражана, праяўлена.*

*Мы вельмі хутка, за нейкія лічаныя дні, сышліся ў поглядах на жыццё, у сваіх сімпатыях і антыпатыях. Мы любім адны і тыя ж кнігі, адных і тых жа пісьменнікаў.* І. Навуменка.

**СКЛАСЦІСЯ — РАСПАСЦІСЯ**

*незак.* складвацца — распадацца

**Скласціся.** Сфарміравацца, арганізавацца чаму-небудзь.

**Распасціся.** Разваліцца, разбурыцца чаму-небудзь.

*Скласціся (распасціся) блоку, саюзу, сям'і, таварыству.*

*Для таго, каб склалася харошая сям'я, трэба многа супадаючых данных. А каб яна распалася, дастаткова мець нейкую адну данную, якая не супадае.* В. Быкаў.

**СКРУЦІЦЦА — ВЫПРАСТАЦЦА**

*незак.* скручвацца — выпроствацца.

**Скруціцца.** Прыдаць целу выгляд кальца.

**Выпрастацца.** Прыняць целу выпрастаны выгляд.

*Скруціцца (выпрастацца) вужу, гюрзе, удаву.*

*Людзі кажуць, што адна такая раз'юшаная змяя гналася нават за конным чалавекам. Скруціцца, як спружына, а потым адразу выпрастаецца ды як скокне! Ледзьледзь конь уцёк.* Я. Маўр.

**СКРУЦІЦЦА — РАСКРУЦІЦЦА**

*незак.* скручвацца — раскручвацца

**Скруціцца.** Злучыцца ў выніку скручвання.

**Раскруціцца.** Разлучыцца ў выніку раскручвання.

*Рукі дрыжэлі. Пальцы без толку скручваліся і раскручваліся.* З.Бядуля.

**СКРЫТНА (УПОТАЙ) — АДКРЫТА**

**Скрытна.** Непрыкметна для іншых.

**Адкрыта.** Прыкметна для іншых.

*Скрытна (адкрыта) выпіваць, дзейнічаць, наведвацца, паступаць, фарміравацца.*

*Кожны курсант браў у свае сэрца трывогу і надзею. Толькі кожны па-свойму насіў іх у сабе, адзін скрытна, другі — адкрыта, у залежнасці ад характару.* І. Новікаў. *Мінулы раз яшчэ і гэта ўстрывожыла — што абыякавы раней да спіртнога Барыс пачаў выпіваць і адкрыта, і — што яшчэ горай — употай.* І. Шамякін.

**СКРЫТЫ — АДКРЫТЫ**

**Скрыты.** Непрыкметны для іншых.

**Адкрыты.** Прыкметны для іншых.

*Скрыты, -ая, -ае (адкрыты, -ая, -ае) апазіцыя, асуджэнне, вораг, падтрымка, плынь, сіла, супраціўленне.*

*Лаяльных трэба пільна выкрываць, бо з адкрытым ворагам лягчэй ваяваць, чым са скрытым.* І. Мележ.

**СЛАВА — ГАНЬБА (БЯССЛАЎЕ, НЯСЛАВА)**

**Слава.** Усеагульная павага, пашана, вядомасць

**Ганьба.** Усеагульная знявага, асуджэнне, пагарда.

*Слава (ганьба) людская, вечная.*

*Твае сыны з пагардай к смерці сустрэлі ворага свінцом, бо лепш са славаю памерці, як жыць у ганьбе пад ярмом* П. Глебка. *К яснаму сонцу з цьмы, з беспрасвецця, к славе з бясслаўя ўсім нашым людзям — гэткай шукаю сцежкі на свеце, гэткаму богу і душу аддам.* Я. Купала. *Каб збавіцца мне ад душэўных ран, забыць мне трэба пра Афганістан, пра славу і няславу ў той вайне, пра маладосць у цынкавай труне* Н Мацяш.

**СМЕЛАСЦЬ (АДВАГА) — БАЯЗЛІВАСЦЬ (БОЯЗЬ, СКАВАНАСЦЬ, НЯСМЕЛАСЦЬ)**

**Смеласць.** Бясстрашша, рашучасць.

**Баязлівасць.** Страх, нерашучасць.

**Скаванасць.** Нерашучасць, ненатуральнасць.

*Смеласць (баязлівасць) дзіцяці, людзей, салдата, хірурга, чалавека; уласціва, характэрна.*

*Не хопіць у яе сілы перашкодзіць бацькавай волі, смеласці не хопіць* Ц. Гартны *Будучы ў гэтай справе нявінны, як ягнё, ён, аднак, з баязлівасцю думаў, паддаючы ходу: «Заявіць ці не?»* К Чорны. *«Ужо, мусіць, за поўнач», — пачаў ён словамі надаваць сабе смеласці* К. Чорны. *Сорам і боязь падняць вочы — вось што выпадзе на долю ўнуку за брыдкія справы свайго продка* А. Макаёнак. *У цішыні па-доктарску чыстага меннікавага пакойчыка яны [вобразы] пачыналі сваё жыццё і пераходзілі з ўяўлення на паперу, надзеленыя шчодрасцю або сквапнасцю, адвагай ці баязлівасцю.* М. Лужанін. *Застоллі на блізкай дачы працягваліся, але перамяніўся іх характар: знікла смеласць у гаворках, прыкметна ўзмацнялася скаванасць — нібыта ўсе нечага чакалі.* А. Сульянаў.. *На Зосіным твары былі яшчэ рэшткі наіўнай нясмеласці, з якой яна выказвала думкі інжынеру.* К. Чорны.

**СМЕЛЫ — БАЯЗЛІВЫ**

**Смелы.** Які не паддаецца страху; храбры, адважны.

**Баязлівы.** Які ўсяго баіцца; нясмелы, палахлівы.

*Смелы, -ая, -ае (баязлівы, -ая, -ае) афіцэр, вайсковец, дзіця, жанчына, мужчына, салдат.*

*Смелы і храбры, ён уцякае з аўстрыяцкага палону, куды папаў паранены.* Я. Колас. *З якога часу ты стаў гэтакі баязлівы, што свайму парабку слова сказаць баішся.* М. Лобан.

**СМЕЛЫ (ХРАБРЫ, ХРАБРЭЦ)** *(у знач. наз.)* — **БАЯЗЛІВЫ (БАЯЗЛІВЕЦ)** *(у знач наз.)*

**Смелы.** Той, хто надзелены смеласцю, адвагаю

**Баязлівы.** Той, хто надзелены страхам, спалохам

*Смелы (баязлівы) надарыўся, напаткаўся, сустрэўся.*

*Шмат я бачыў розных дзяцей. Хлопчыкаў і дзяўчынак, паслухмяных і неслухаў, смелых, палахліўцаў і баязлівых.* Г. Юрчанка. *Храбры не пабяжыць, таму што ён храбры, а баязлівы — бо ён баязлівец і ведае, што лёс ягоны вырашаць будзе Касач.* А. Адамовіч. *Успомніліся словы*

*Крука пра Дзергача ..дзе не трэба — рэдкі храбрэц, дзе трэба — апошні баязлівец.* «Звязда»

**СМЕХ — ПЛАЧ**

**Смех.** Праяўленне весялосці ці радасці шляхам стварэння перарывістых гукаў кароткімі выдыхальнымі рухамі.

**Плач.** Праяўленне гора ці болю шляхам пралівання слез, рыдання

*Смех (плач) дзіцяці, дзяўчыны, жанчыны, мужчыны, хлопца, чалавека.*

*Як трапіць гора нам спаткаць, мы ўсе ў настроі і ў цяжкім, а ў дзіцяня — і смех і плач — адно змяняецца другім.* П. Броўка. *I нясецца рэха гулка, бы дзяцінь смех і плач.* Я. Колас. *Што за жыццё, што за доля? Проста плач бярэ і смех!* Я. Колас.

**СМЯЯЦЦА — ПЛАКАЦЬ**

*зак* засмяяцца — заплакаць

**Смяяцца.** Радавацца, утвараючы гукі смеху.

**Плакаць.** Гараваць, праліваючы слёзы.

*Смяяцца (плакаць) гучна, трэба, ціха; дзіцяці, артысту, гледачу; умець, хацець.*

*Ім хацелася гаварыць, крычаць, смяяцца, плакаць, але яны вымушаны былі маўчаць, і гэтае маўчанне даводзіла да роспачы.* А Асіпенка.

**СПАГАДА (СПАГАДЛІВАСЦЬ ) — ЖОРСТКАСЦЬ**

**Спагада.** Літасць да каго-небудзь.

**Жорсткасць.** Бязлітаснасць, неміласэрнасць да каго-небудзь.

*Спагада (жорсткасць) відавочная, людская, чалавечая.*

*Што Антон ведае пра тую вайну? А, бачыш, гаворыць пра яе ўпэўнена, быццам сам перажыў тыя жахі, пабачыў на свае вочы і чалавечую жорсткасць і спагаду* А Асіпенка. *З чуллівых смяяліся, з іх здзекаваліся: у асяродку такіх, як ен, зладзеяў цанілася жорсткаць, а не спагадлівасць* А. Асіпенка.

**СПАКОЙ — ТРЫВОГА**

**Спакой.** Душэўнае супакаенне, унутраная раўнавага

**Трывога.** Душэўнае хваляванне, выкліканае страхам, невядомасцю, дрэнным прадчуваннем. *Спакой (трывога) абманлівы (-ая), людскі (-ая), сапраўдны (-ая), знікае, наступае, пануе*

*Але трывога, вялікая, незразумелая, змагалася ў ім са спакоем. I ён тапіў яе ў працы.* К. Чорны. *Нуда скончылася, уперадзе зусім блізка была доўгачаканая мэта — канец усіх трывог і час прыемнага спакою.* І. Мележ.

**СПАКОЙНЫ —УСТРЫВОЖАНЫ (УЗБУДЖАНЫ, НЕРВОВЫ)**

**Спакойны.** Які знаходзіцца ў стане спакою.

**Устрывожаны.** Які знаходзіцца ў стане трывогі.

**Нервовы.** Якога лёгка расхваляваць, хваравіта раздражнёны.

*Спакойны, -ая, -ае (устрывожаны, -ая, -ае) бацька, вадзіцель, маці, паддопытны, суюрдэса; голас, інтанацыя.*

*Тарасаў употай сачыў за ім і здзіўляўся: даўно ўжо ён не бачыў спакойнага Гукана такім устрывожаным.* І. Шамякін. *Маша не здавалася такой спакойнай, яна была ўзбуджаная.* І. Шамякін. *Ён добра ведаў, што яна зусім не такая спакойная, што яна ў дзесяць разоў больш нервовая, чым яго жонка.* І. Шамякін.

**СПАЧУВАЦЬ — АСУДЖАЦЬ**

*зак.* паспачуваць — асудзіць

**Спачуваць.** Адносіцца са спагадай, спачуваннем

**Асуджаць.** Адносіцца з ганьбаваннем, асуджэннем.

*Спачуваць (асуджаць) адкрыта, скрыта, уголас, яўна.*

*Першыя дні пасля выключэння з партыі я саромеўся выходзіць на вуліцу. Здавалася, кожны глядзіць на мяне з дакорам і знявагай. Але паступова пачаў разумець, што многія не толькі не асуджаюць, але спачуваюць мне.* В. Вольскі

**СПЕРАДУ (НАПЕРАДЗЕ, ПАПЕРАДЗЕ, УПЕРАДЗЕ) — ЗЗАДУ**

**Спераду.** **1.** З пярэдняга боку **2.** На нейкай адлегласці перад кім-, чым-небудзь

**Ззаду.** **1.** З тыльнага боку. **2.** На нейкай адлегласці за кім-, чым-небудзь

*Спераду (ззаду) выпучвацца, вытыркацца, зашпільвацца, прымацоўвацца, размяшчацца*

*Агейчык пачынае — каб пра што, думаеце? — пра лысіны. Як лысіна, кажа, на галаве спераду, на цемю — адно, як ззаду — другое.* Ф Янкоўскі

*Спераду (ззаду) азвацца, гучаць, лямантаваць, раздавацца, рухацца, страляць.*

*Той аддаў Бураву повад яго кабылкі, і яны хуткім крокам пайшлі сцежкай да лазні — Войцік спераду, Бураў ззаду. Між імі ішоў з рыдлёўкай у руцэ Сушчэня.* В. Быкаў. *І калі ззаду ля Венеры захлябастаў нямецкі кулямёт, яму здалося, што ляскочуць калёсы па калдобінах, тут, ля Гарбатага Маста; і ззаду і наперадзе.* І. Пташнікаў. *Пасля гэтага кожную брыгаду вадзілі не адзін, а два стралкі — адзін папарадзе, другі — ззаду.* С. Грахоўскі. *Яна ўперадзе, я крокаў на дзесяць ззаду — ідзём між старых, грузных штабялёў.* А. Адамовіч

**СПЁКА (СПЯКОТА** *(разм.)*)**— ХОЛАД (МАРОЗ, СЦЮЖА** (*разм.*))

**Спёка.** Высокая тэмпература навакольнага асяроддзя.

**Холад.** Нізкая тэмпература навакольнага асяроддзя.

*Спёка (холад) адыходзіць, знікае, наступае, трымаецца.*

*Але што спёка ці холад — галоўнае, яны адкараскаліся ад немцаў, зашыліся ў лесавую гушчэчу, дзе не было нікога — ні партызан, ні немцаў, на вогнішчы ў казанку даварвалася свежая бульбачка, абяцаючы згаладнелым які-ніякі наедак.* В Быкаў. *Каса і сякера, і цэп малацьбітны магутную волатаў сілу далі, марозы і спёкі далі гарт нязбытны — мне песню, як звон, як пярун, адлілі.* Я. Купала. *Гэта былі людзі-асілкі, абветраныя сцюжай і абпаленыя спёкай.* З. Бядуля. *Мурашнік робіцца так, што дае прытулак і схаванку мурашкам і ад холаду, і ад спякоты, і ад дажджу.* Я. Колас.

**СПРАЎНЫ — НЯСПРАЎНЫ**

**Спраўны.** Які не мае пашкоджанняў, прыдатны для выкарыстання.

**Няспраўны.** Які мае пашкоджанні, не прыдатны для выкарыстання.

*Спраўны, -ая, -ае (няспраўны, -ая, -ае) аўтамат, зброя, камп'ютэр, машына, механізм, прыбор, пуцЬ.*

*Уладальнік тэлевізара звярнуўся ў магазін, дзе яго купляў, каб няспраўную рэч абмянялі на спраўную.* «Вожык».

**СПРЫЯЦЬ (ПАМАГАЦЬ) — ШКОДЗІЦЬ**

*зак.* паспрыяць — пашкодзіць

**Спрыяць.** Аказваць садзеянне, дапамогу, падтрымку

**Шкодзіць.** Наносіць урон, прычыняць шкоду.

*Я не п'ю. Я за татава здароўе — шклянку кампоту. Дарэчы, здароўю ён сапраўды не шкодзіць, а спрыяе.* М. Гіль. *Умяшанне камандзіраў, асабліва маладых, у часе пагрузкі ці разгрузкі часцей шкодзіць, чым памагае, бо разладжвае сувязі паміж людзьмі* І. Шамякін.

**СПЯКОТНЫ — МАРОЗНЫ**

**Спякотны.** Вельмі гарачы.

**Марозны.** Вельмі халодны

*Спякотны, -ая, -ае (марозны, -ая, -ае) дзень, месяц, перыяд, сезон, тыдзень, час.*

*Не дазволь мне стаць чэрствым і слёзным, снежань чысты — мой ціхі боль. Днём спякотным і днём марозным хай пячэ на далоні мазоль.* В. Гардзей.

**СТАВІЦЬ — ВЫМАЦЬ**

*зак* паставіць — выняць

**Ставіць.** Змяшчаць што-небудзь у пэўнае прыстасаванне.

**Вымаць.** Удаляць што-небудзь з пэўнага прыстасавання

*Ставіць (вымаць) гаршчок, саган, скавараду, чыгун*

*Марына гатавала вячэру, паліла ў печы, такой нізкай, што для таго, каб паставіць ці выняць віламі чыгунок, станавілася на ўколенкі* І Шамякін

**СТАВІЦЬ — ЗНІМАЦЬ**

*зак* паставіць — зняць

**Ставіць.** Размяшчаць, умацоўваць што-небудзь вертыкальна.

**Знімаць.** Ліквідаваць, зносіць што-небудзь вертыкальна размешчанае, умацаванае

*Ставіць (знімаць) апалубку, указальнік, помнік, рыштаванне, стэлу.*

*Прахарэня ўсё збіраўся зняць гэтага старога надзьмутага Казімежа, а на яго месцы паставіць помнік каму-небудзь больш годнаму.* А. Якімовіч.

**СТАМІЦЦА — АДПАЧЫЦЬ**

*незак* стамляцца — адпачываць

**Стаміцца.** Адчуць стомленасць, змораннасць.

**Адпачыць.** Аднавіць сілы, зрабіўшы перапынак у рабоце ці якім-небудзь занятку.

*Стаміцца (адпачыць) выкладчыку, інжынеру, навучэнцу, рабочаму, селяніну, урачу.*

*«Дзень добры, дзеці. Жонка, як ты сябе адчуваеш? Стамілася тут з імі?» — «Ды што ты, Стась Я не стамілася, я адпачыла»* Я Брыль.

**СТАНОЎЧЫ (ПАЗІТЫЎНЫ, ДАДАТНЫ) — АДМОЎНЫ (НЕГАТЫЎНЫ)**

**Станоўчы. 1.** Які з добрымі, пазітыўнымі якасцямі, уласцівасцямі **2.** Які выражае згоду

**Адмоўны. 1.** Які з дрэннымі, негатыўнымі якасцямі, уласцівасцямі **2.** Які выражае нязгоду

*Станоўчы, -ая, -ае (адмоўны, -ая, -ае) бок, вобраз, з'ява, персанаж, праблема, роля, учынак, факт, характарыстыка.*

*Людскі смех, вядома, мае свае адмоўныя і станоўчыя бакі, але Мяшкова праз той недарэчны выпадак неўзабаве забралі ў Кругагор'е.* І Чыгрынаў.

*Станоўчы, -ая, -ае (адмоўны, -ая, -ае) адказ, вывад, рашэнне.*

*Ні ў адным з шасці рэспубліканскіх міністэрстваў, куды мы пазванілі, не атрымалі ні станоўчага, ні адмоўнага адказу: канкрэтных інструкцый з Масквы не паступала* «Звязда». *Некаторыя людзі, як і я ў свой час, не верыць публікацыям савецкага друку, лічаць, што, параўноўваючы два лады жыцця, журналісты тэндэнцыйна падбіраюць факты: з амерыканскай рэчаіснасці — толькі негатыўныя, з савецкай — толькі станоўчыя.* «Звязда». *Адным словам, узнікалі і ўзнікаюць новыя сур'ёзныя праблемы, і пазітыўныя, і негатыўныя, міма якіх, безумоўна, не можа прайсці ніводзін сур'ёзны мастак.* І. Шамякін. *«Я магу напісаць на Юргялевіча толькі дадатную характарыстыку».— «Кіньце спрачацца. Не раю! — перапыніў мяне Рыскін.— Калі вы не пазней як праз тры дні не пакладзяце мне на стол характарыстыку на Юргялевіча, будзе вам кепска. І ўлічыце, характарыстыка патрэбна толькі адмоўная!».* В Вольскі

**СТАРАЯ** *(у знач. наз.)* — **СТАРЫ** *(у знач. наз.)*

**Старая.** Жанчына ў старым веку.

**Стары.** Мужчына ў старым веку

*Старая (стары) даглядае, раіць, распараджаецца, мудрая (мудры), паважаная (паважаны), шаноўная (шаноўны).*

*У штодзённым жыцці старая хоць і пакрыквала на старога, але яго ўлада была большая, бо ішла ад спакою, разважлівага слова, перад якім яна змаўкала.* В. Карамазаў

**СТАРТ — ФІНІШ**

**Старт.** Момант пачатку спартыўнага спаборніцтва.

**Фініш.** Момант канца спартыўнага спаборніцтва.

*Старт (фініш) імклівы, няўдалы, удалы.*

*Удалы старт, удалы фініш*. «Чырвоная змена».

**СТВАРЫЦЦА — РАЗВАЛІЦЦА**

*незак.* стварацца — развальвацца

**Стварыцца.** Арганізавацца, пачаць існаваць.

**Разваліцца.** Разбурыцца, перастаць існаваць.

*Стварыцца (разваліцца) аб'яднанню, блоку, пакту, саюзу.*

*Маючы хісткі тэарэтычны падмурак, адарваныя ад рускай глебы, ад партыйных арганізацый у Расіі, ад барацьбы пралетарыяту, блокі Троцкага гэтак жа хутка развальваліся, як і ствараліся.* І. Шамякін.

**СТВАРЫЦЬ — РАЗБУРЫЦЬ**

*незак.* ствараць — разбураць

**Стварыць.** Спарадзіць.

**Разбурыць.** Згубіць, знішчыць, расстроіць.

*Стварыць (разбурыць) легенду, міф.*

*Не кожны мае ўладу, як халіф, не кожны грошы таксама мае, ды кожны носіць пры сабе свой міф, спярша стварае, потым разбурае.* С. Басуматрава.

**СУМЕСНЫ — РАЗДЗЕЛЬНЫ**

**Сумесны.** Які ажыццяўляецца супольна.

**Раздзельны.** Які ажыццяўляецца адасоблена.

*Сумесны, -ая, -ае (раздзельны, -ая, -ае) вучоба, жыццё, навучанне, пасяджэнне, паход, праца.*

*Хто толькі і як не эксперыментаваў над школаю! Былі дальтон-план і брыгадны метад, дзевяцігодкі і дзесяцігодкі, сумеснае і раздзельнае навучанне, уводзіліся і адмяняліся прадметы...* С.Грахоўскі.

**СУМЛЕННАСЦЬ — ПОДЛАСЦЬ**

**Сумленне.** Дзеянні, учынкі, намеры, якія адпавядаюць агульнапрынятым уяўленням пра чэснасць, вернасць доўгу, абавязку і пад.

**Подласць.** Дзеянні, учынкі, намеры, якія адпавядаюць агульнапрынятым уяўленням пра нячэснасць, здраду доўгу, абавязку і пад.

*Сумленнасць (подласць) вайскоўца, калегі, партнёра, суседа, сябра.*

*Але гэта было жыццё, дзе праяўляліся розныя характары, розныя паняцці пра дабро і зло, пра сумленнасць і подласць.* І. Новікаў.

**СУР'ЁЗНЫ — НЕСУР'ЁЗНЫ**

**Сур'ёзны.** Які вызначаецца грунтоўнасцю ў сваіх дзеяннях, учынках, адносінах да жыцця.

**Несур'ёзны.** Які вызначаецца лёгкадумнасцю ў сваіх дзеяннях, учынках, адносінах да жыцця.

*Сур'ёзны, -ая, -ае (несур'ёзны, -ая, -ае) жанчына, кансультант, мужчына, спецыяліст, чытач.*

*Ты ведаеш, мяне лічаць сур'ёзнай, а я зусім несур'ёзная.* І. Шамякін.

**СУСТРЭЧА (СПАТКАННЕ) — РАССТАВАННЕ (РОСТАНЬ, РАССТАННЕ, РАЗЛУКА, РАЗВІТАННЕ)**

**Сустрэча.** Спатканне з кім-небудзь.

**Расставанне.** Разлука з кім-небудзь.

*Сустрэча (расставанне) братэрская (-ае), непажаданая (-ае), нечаканая (-ае), своечасовая (-ае); аднакласнікаў, аднапалчан, ветэранаў, сяброў.*

*Школьныя гады... Можна забыць многае ў жыцці — сустрэчы і расставанні, гора і радасць. Але ніколі не забудзеш свайго першага і апошняга — школьных гадоў.* І. Навуменка.

*У блакнот свой заношу пачатак вандроўнага дзённіка, дзень учарашні, вечар, ноч і сённяшні досвітак шэры, усё ростані і сустрэчы пішу на паперы.* А. Куляшоў.

*Так уранку і ўночы, у дзень і пад*

*вечар* *Усё расстанні, сустрэчы, расстанні, сустрэчы Вось прыпынак і зноўку мільгаюць адкосы Лёсы ўсіх паяздоў — чалавечыя лесы.* І Ждановіч.

*Не зразумець было, ад чаго сцялася сэрца' ад радасці раптоўнай сустрэчы з дачкой, ад горкага прызнання міжвольнай разлукі, ад гонару, што і яе ўключылі ў групу па вывучэнні падполля.* І. Новікаў.

*Вы чуеце музыку любых вачэй, нібыта сатканую з зорных начэй, з празрыстых крыніц і чароўных світанняў, з вялікага шчасця сустрэч, развітанняў.* Л. Радоўскі.

*Згода змянялася сваркаю, гневаннем, разлукаю, новым спатканнем* Я. Колас.

**СУХІ — МОКРЫ**

**Сухі. 1.** Які не насычаны вільгаццю, вадою. **2.** Які без ападкаў, не сыры.

**Мокры. 1.** Які насычаны вільгаццю, вадою. **2.** Які з ападкамі, сыры.

*Сухі, -ая, -ое (мокры, -ая, -ае) абутак, вопратка, зямля, лес, паліва, пясок, рэч, снег.*

*Чамусьці верылася, што пойдзе сухі марозны снег, а не стане хлюпаць мокры, з дажджом.* А. Жук.

*Сухі, -ая, -ое (мокры, -ая, -ае) восень, вясна, год, дзень, зіма, лета, надвор'е, ноч, сезон.*

*Па тым, колькі зімою падала снегу, меркавалі, якое — мокрае ці сухое — будзе лета і што ўродзіць, што трэба сеяць, а што не сеяць.* Б. Сачанка.

**СЦВЕРДЖАННЕ — АДМАЎЛЕННЕ**

**Сцверджанне.** Прыняцце, замацаванне чаго-небудзь.

**Адмаўленне.** Непрыняцце, адхіленне чаго-небудзь.

*Сцверджанне (адмаўленне) ідэалаў, маралі.*

*Ва ўсей нашай далейшай рабоце будзем помніць галоўнае, а імення сацыяльныя і маральныя ідэалы нашага грамадства... Перабудова — не адмаўленне іх, а, наадварот, самае рашучае сцверджанне.* Н. Гілевіч.

**СШЫЦЬ — РАСПАРОЦЬ**

*незак.* сшываць — пароць

**Сшыць.** Злучыць шыццём краі тканіны ці скуры.

**Распароць.** Поручы, разлучыць краі тканіны ці скуры.

*Сшыць (распароць) кавалкі, калошу, рукаў, халяву.*

*«Спачатку прымусілі мяне пароць,— сказаў ён.— Пасля сшываць».* «Вожык».

**СЫСЦІСЯ — РАЗЫСЦІСЯ**

*незак.* сходзіцца — разыходзіцца

**Сысціся. 1.** Ідучы з розных бакоў, сустрэцца, сутыкнуцца. **2.** Уступіць у блізкія, сяброўскія адносіны.

**Разысціся. 1.** Пакінуць месца свайго прабывання, пайшоўшы ў розныя бакі. **2.** Парваць, перапыніць блізкія, сяброўскія адносіны.

*Сысціся (разысціся) выпадкова, знарок, позна, рана, спецыяльна.*

*Ішлі яны, Захар'я і Лецечка, адной сцежкай, але з розных канцоў саду, сышліся і ўжо разышліся, здаецца.* В. Казько.

*Сысціся (разысціся) аднадумцам, дарослым, падлеткам, равеснікам, юнакам.*

*Андрэй успомніў, што яны з Максімам калісьці сябравалі, разам гадаваліся, разам былі на прызыве, у адзін год жаніліся, і потым ужо разышліся не з-за якога ліха, а так проста разлучыліся, а сходзіліся — кожны з іх мог смела паказаць вочы адзін аднаму.* Я. Колас.

**СЫТЫ — ГАЛОДНЫ**

**Сыты.** Які не адчувае голаду, не хоча есці.

**Галодны.** Які адчувае голад, хоча есці.

*Сыты, -ая, -ае (галодны, -ая, -ае) госць, дзіця, жанчына, кліент, мужчына, наведвальнік, пасажыр, студэнт*

*Галодная мама заўсёды казала: «Я сытая, дзеткі. Ешце на здароўе!» — і аддавала сваім дзецям апошнюю скарынку.* С. Грахоўскі.

**СЫТЫ** *(у знач. наз.)* — **ГАЛОДНЫ** *(у знач наз)*

**Сыты.** Той, хто добра жыве і таму есць колькі хоча, не галадае.

**Галодны.** Той, хто з-за беднасці недаядае, галадае.

*Сыты (галодны) надарыўся, сустрэўся*

*«Апёкся ты, братка,— падумаў Бацюта,— не тыя песенькі пяеш, галодных і сытых хочаш зрабіць радней».* Л. Дайнека.

**СЯГОННЯ (СЁННЯ) — ЗАЎТРА**

**Сягоння.** У сягоняшні дзень.

**Заўтра.** У наступны пасля сягоняшняга дзень.

*Сягоння (заўтра) адбываецца, заканчваецца, пачнецца.*

*Вось так яно і пройдзе — і сягоння і заўтра.* К. Чорны. *Або сення, або заўтра на рацэ прачнецца лед.* М. Гіль.

# Т

**ТАЛЕНТ — БЯЗДАРНАСЦЬ**

**Талент.** Надзвычайная прыродная здольнасць.

**Бяздарнасць.** Адсутнасць здольнасці, таленту.

*Талент (бяздарнасць) архітэктара, вынаходніка, даследчыка, навукоўца, паэта, пісьменніка; відавочны (-ая), яўны (-ая).*

*Канстанцін Міхайлавіч беспамылкова адлучаў «авец ад козлішч», як ён гаварыў, талент ад бяздарнасці ці пасрэднасці, ведаў, чаго можна чакаць ад таго ці іншага літаратара* М. Лужанін.

**ТАНУЦЬ — УСПЛЫВАЦЬ**

*зак.* патануць — усплысці

**Тануць.** Гінуць, ідучы на дно.

**Усплываць.** Узнімацца з глыбіні вады на яе паверхню.

*Тануць (усплываць) апоўдні, вечарам, днём, ноччу, ранкам.*

*Тапелец тоне, але потым усплывае.* І. Шамякін.

**ТОНКІ — ТОЎСТЫ**

**Тонкі. 1.** Нязначны ў папярочным сячэнні. **2.** Які гучыць высока.

**Тоўсты. 1.** Значны ў папярочным сячэнні. **2.** Які гучыць нізка.

*Тонкі, -ая, -ае (тоўсты, -ая, -ае) вяроўка, дошка, дрэва, каўбаса, лед, нітка.*

*Урэшце загадчык устаў, нетаропка закурыў і з вялікаю неахвотаю пасунуўся на задворкі, дзе былі складзены дошкі. Тут іх, прысыпаных снегам, ляжала багата штабялёў — тоўстых і тонкіх, дваццатак і саракоvак. іншага пілавання таксама* В Быкаў.

*Тонкі (тоўсты) голас, гук.*

*Затым ёсць такі народ, які ўвесь час толькі гудзе. Ці тонкім галасам, ці тоўстым, а ўсе гудзе, гудзе, гудзе.* Я. Маўр.

**ТУТ — ТАМ**

**Тут. 1.** У гэтым месцы. **2.** На гэтым свеце, з жывымі.

**Там. 1.** У тым месцы, не тут. **2.** На тым свеце, з памершымі.

*Тут (там) брудна, вільготна, добра, дрэнна, мокра, суха, хараша, чыста.*

*Ці мала блытаецца цяпер нашага брата? Там дрэнна, тут дрэнна. Цьфу!* Я. Колас.

*Тут (там) прабываць.*

*Міхаіл Фёдаравіч, Вы ўжо там, а мы пакуль тут. У нас яшчэ засталіся якія-такія дробныя клопаты.* Л. Дранько-Майсюк.

**ТУТЭЙШЫ — ЧУЖЫ (НЕТУТЭЙШЫ)**

**Тутэйшы.** Які пражывае тут, у гэтай мясцовасці.

**Чужы.** Які пражывае не тут, у іншай мясцовасці.

*Тутэйшы, -ая, -ае (чужы, -ая, -ое) бацюшка, грамадзянін, знахар, люд, насельніцтва, пан, племя, публіка, селянін, фельчар.*

*У другой ад канца хаце ўжо ведалі, што ў вёску ідзе нехта чужы — пільная сучачка ніколі не брахала на тутэйшага чалавека.* В. Адамчык. *Нешта я не разбяруся — тутэйшы ці нетутэйшы, ваенны ці неваенны гэты чалавек.* І. Чыгрынаў.

**ТЭАРЭТЫК — ПРАКТЫК**

**Тэарэтык.** Той, хто распрацоўвае тэарэтычныя пытанні ў якой-небудзь галіне ведаў, мастацтва.

**Практык.** Той, хто рэалізуе практычна тэарэтычныя пытанні, хто асвоіў сваю справу на практыцы.

*Тэарэтык (практык) аграрны, ваенны, гооадабудаўнічы, горны, спартыўны, экалагічны.*

*У тым, што мы патроху спаўзаем да бесканфліктнасці, на гэты раз не можам абвінаваціць тэарэтыкаў, тут віна цалкам лажыцца на нас, практыкаў, майстроў празаічнага цэха, ды і паэтычнага таксама.* І. Шамякін.

## У

**УВАЙСЦІ (ЗАЙСЦІ) — ВЫЙСЦІ**

*незак.* уваходзіць — выходзіць

**Увайці.** Зайсці ў сярэдзіну чаго-небудзь.

**Выйсці.** Пакінуць межы чаго-небудзь.

*Увайсці (выйсці) льга, мажліва, нельга, немажліва, непрыкметна, своечасова; дзяжурнаму, знахару, медсястры, настаўніку, пісару, сакратару, урачу.*

*Чалавек ціха, як увайшоў у пакой, гэтак ціха і выйшаў.* В. Адамчык. *Хрысціна ўжо не звяртала ўвагі на тых, хто заходзіў у кабінет, і тых, хто выходзіў.* А. Асіпенка.

**УВАХОД — ВЫХАД**

**Уваход.** Месца, праз якое ўваходзяць.

**Выхад.** Месца, праз якое выходзяць.

*Уваход (выхад) адкрываецца, закрываецца, перакрываецца: адкрыты, закрыты.*

*Абветраныя дрэвы, пабеленыя і непабеленыя сцены, уваходы ў будынкі і выхады з іх — усё гэта, не змываемае напорам веснавое вады, таксама здавалася гатовым рушыць і паплысці.* К. Чорны.

**УВЕРХ (УГОРУ) — УНІЗ**

**Уверх.** У напрамку да верху.

**Уніз.** У напрамку да нізу.

*Уверх (уніз) бегчы, ляцець, пазіраць, рухацца, цягнуць*

*Шпачок разгубіўся, шныраў то ўверх, то ўніз, мітусіўся, а ястраб, склаўшы крылле і каменем падаючы долу, усё болей яго абманваў, прыціскаў да хаты, адразаў дарогу да шпакоўні.* Г. Далідовіч. *На зялёным грудку, дзе рос шорсткі сівец, стаяла хвоя. Хіба толькі той не любаваўся ёю, хто пазіраў больш уніз, як угору.* Я. Колас.

**УВЕСЦІ — АДМЯНІЦЬ**

*незак.* уводзіць — адмяняць

**Увесці.** Пакласці пачатак чаму-небудзь.

**Адмяніць.** Спыніць існаванне чаго-небудзь.

*Увесці (адмяніць) вахту, дзяжурства, самаабслугоўванне, самаахову, севазварот, яравізацыю.*

*Для таго яму давялося б званіць камандзіру дывізіі, дабівацца, каб той нешта перайначыў, даў новыя каманды, нешта адмяніў і нешта ўвёў новае.* В. Быкаў.

**УВОЗ — ВЫВАЗ**

**Увоз.** Імпарт чаго-небудзь.

**Вываз.** Экспарт чаго-небудзь.

*Увоз (вываз) абутку, адзення, збожжа, лекаў, машын, тэхнікі, фруктаў.*

*Наконт увозу і вывазу тавараў мы звярнуліся да начальніка Беларускай тэрытарыяльнай таможні.* «Звязда».

**УГАРЫ — УНІЗЕ**

**Угары.** У верхняй частцы чаго-небудзь.

**Унізе.** У ніжняй частцы чаго-небудзь.

*Угары (унізе) жаўцець, зелянець, расплятацца, сплятацца.*

*Як памятаюць ліпнёўцы, на курганах заўсёды раслі кусты здзічэлых калючых сліў. Угары яны спляталіся так густа, што прашыцца праз іх маглі толькі хлапчукі, і то ўнізе, па зямлі.* А. Кудравец.

**УДАЧА — НЯЎДАЧА**

**Удача.** Шчаслівае завяршэнне якой-небудзь справы.

**Няўдача.** Адсутнасць удачы.

*Удача (няўдача) жыццёвая, мастакоўская, пісьменніцкая, творчая.*

*І лічыш, і лічыш павол і ўдачы свае і няўдачы — чаго меў на свеце найболей, чым сцежку жыцця абазначыў* Я. Купала.

**УДЗЕНЬ — УНОЧЫ (УНАЧЫ)**

**Удзень.** У дзённы час, днем.

**Уночы.** У начны час, ноччу.

*Удзень (уночы) адпачываць, ахоўваць, вартаваць, дзейнічаць, дзяжурыць.*

*З маці яе, Веты, Карнач дваццаць гадоў гаварыў, удзень і ўночы, і не перавыхаваў.* І. Шамякін. *Прымакову следчыя не давалі спакою ні ўдзень, ні ўначы, пазбаўлялі сну, білі, падмяняючы адзін аднаго.* А. Сульянаў.

**УДОЎЖ (УЗДОЎЖ, УДОЎЖКІ) — УПОПЕРАК (УШЫРКІ)**

**Удоўж.** У даўжыню, па даўжыні чаго-небудзь.

**Упоперак.** У шырыню, па шырыні чаго-небудзь.

*Удоўж (упоперак) блукаць, перасякацца, прамерваць, размяшчацца, хадзіць.*

*Дамы стаялі, як віціны, то ўдоўж, то ўпоперак радамі, то закрываліся садамі.* Я. Колас. *Хоаджана ж, стоптана ж, памерана ж нагамі там уздоўж і ўпоперак усё-усё і не раз, не два, а па сотні, тысячы разоў.* Б. Сачанка. *Вада яшчэ гойдалася ў вядры, і Чубараў твар калыхаўся ў ёй таксама, то расплываючыся ўшыркі, як у няправільным люстры, то выцягваючыся ўдоўжкі.* І. Чыгрынаў.

**УДЫХ — ВЫДЫХ**

**Удых.** Разавы ўпуск паветра ў лёгкія пры дыханні.

**Выдых.** Разавае выштурхоўванне паветра з легкіх пры дыханні.

*Удых (выдых) глыбокі, неглыбокі.*

*Даўно зацвярдзелі іх рукі, і былі яны цяпер як працяг караючай сталі, перарвалася дыханне, таму што на ўдых і выдых не хапала сілы, усё, што было ў іх, яны трацілі толькі на тое, каб падняць і ўзмахнуць клінком, і на мат.* В. Казько.

**УЕЗД — ВЫЕЗД**

**Уезд. 1.** Месца, праз якое ўязджаюць. **2.** Прыбыццё ў якую-небудзь краіну, дзяржаву.

**Выезд. 1.** Месца, праз якое выязджаюць. **2.** Адбыццё з якой-небудзь краіны, дзяржавы.

*Уезд (выезд) адкрыты, закрыты, перакрыты.*

*Справа ў тым, што ўезд у вёску і выезд з яе таксама былі па лесе.* І. Чыгрынаў.

*Уезд (выезд) афармляецца, дазваляецца, практыкуецца; абмежаваны, вольны, рэгламентаваны.*

*Я таму і сказаў, што агульнымі павінны быць нейкія правілы ўезду і выезду. Якія канкрэтна — трэба яшчэ абгаварыць.* «Звязда».

**УЕХАЦЬ — ВЫЕХАЦЬ**

*незак.* уязджаць — выязджаць

**Уехаць.** Заехаць унутр, у сярэдзіну чаго-небудзь.

**Выехаць.** Паехаць, адправіцца куды-небудзь, за межы чаго-небудзь.

*Уехаць (выехаць) льга, магчыва, нельга, немагчыва, непрыкметна, своечасова.*

*У такую пару з сяла ні выехаць ні ўехаць у яго, у веснавую бездараж і Пушыкаў нас не турбуе сваімі клопатамі.* С. Грахоўскі.

**УЗЛЁТ — ПАДЗЕННЕ**

**Узлёт.** Найвышэйшы ўздым папулярнасці, славы, вядомасці.

**Падзенне.** Рэзкі спад папулярнасці, славы, вядомасці.

*Узлёт (падзенне) ансамбля, асобы, калектыву, каманды, лідэра, палітыка.*

*Лідэрам у гэтым тандэме заўсёды быў Зіноўеў, які доўга займаў салідная становішча ў партыі. У яго бурнай палітычнай кар'еры былі высокія ўзлёты і аглушальныя падзенні.* «Звязда».

**УЗНІКНУЦЬ — ЗНІКНУЦЬ**

*незак* узнікаць — знікаць

**Узнікнуць.** Пачацца зарадзіцца.

**Знікнуць.** Скончыцца, спыніцца.

*Узнікнуць (знікнуць) грукату. гулу, завірусе. енку. крыку стогну, страху. стукату, тупату. шоргату.*

*Спачатку. адразу пасля таго, як уехаў Кастусь Прыбыткоўскі і як пакрысе заціхаў і знік грымучы шоргат і грукат бою, пакуль раставаў у прасторы і зусім разышоўся дым, тады неадтуль-неадсюль чуўся часамі стогн і енк; не адзін, але як бы і адзін, узнікаў дзесьці з прасторы і зноў знікаў.* К. Чорны.

**УЗРУШЭННЕ — ЗАСПАКАЕННЕ**

**Узрушэнне.** Душэўны ўздым, хваляванне.

**Заспакаенне.** Душэўны спакой, душэўная раўнавага.

*Узрушэнне (заспакаенне) знікае, наступае.*

*У тыя дні ў Забяседдзі папраўдзе жылі вялікай надзеяй — коннікі Гарадавікова неслі з сабой адным часам і ўзрушэнне і заспакаенне: не верылася, што вораг здолее паставіць што-небудзь супраць гэткай сілы.* І. Чыгрынаў.

**УЗЫСЦІ — ЗАЙСЦІ**

*незак* усходзіць — заходзіць

**Узысці.** З'явіцца, узняцца над гарызонтам.

**Зайсці.** Апусціцца за гарызонт.

*Узысці (зайсці) ветаху, зорцы, месяцу, поўні, сонцу.*

*Узыходзіць і заходзіць поўня кожны раз, нібыта навіна.* С. Грахоўскі.

**УЗЫСЦІ — СЫСЦІ**

*незак* узыходзіць — сыходзіць

**Узысці.** Ідучы, падняцца ўверх.

**Сысці.** Ідучы, спусціцца ўніз.

*Узысці (сысці) групай, паасобку, разам, сумесна, энергічна.*

*З ганка пастарунка сышоў паліцыянт і ўжо ідзе сюды, абыходзячы лужыны.. Пані Марыя ўзышла на прыгорачак перад школай, азірнулася, памахала рукой і пайшла.* Я. Брыль.

**УКЛЮЧЫЦЬ — ВЫКЛЮЧЫЦЬ**

*незак.* уключаць — выключаць

**Уключыць.** Далучыўшы да крыніцы энергіі, прывесці што-небудзь у дзеянне. у рух.

**Выключыць.** Адключыўшы ад крыніцы энергіі, спыніць дзеянне, рух чаго-небудзь.

*Уключыць (выключыць) вентылятар, магнітафон, радыёпрыёмнік, тэлевізар.*

*Тыдзень я нічога не ведала, але ўвесь гэты час не знаходзіла сабе месца. Уключаю тэлевізар — выключаю.* С. Алексіевіч.

**УЛЕЗЦІ — ВЫЛЕЗЦІ**

*незак.* улазіць — вылазіць

**Улезці.** Пранікнуць, забрацца куды-небудзь.

**Вылезці.** Выбрацца адкуль-небудзь.

*Улезці (вылезці) вандроўніку. жанчыне, мужчыне, турысту.*

*Яна не заўважыла, як улезла ў балота. Улезла! Ды не знае, як вылезці.* І. Мележ.

**УЛЕТКУ — УЗІМКУ**

**Улетку.** Летам, у летні час.

**Узімку.** Зімой, у зімні час.

*Улетку (узімку) адпачываць, зелянець, красавацца, працаваць, струменіць, цвісці.*

*Што ўлетку ножкаю коп, то ўзімку ручкаю хоп.* Прыказка.

**УНЕСЦІ — ВЫНЕСЦІ**

*незак.* уносіць — выносіць

**Унесці.** Занесці каго-, што-небудзь унутр памяшкання, транспартнага сродку і пад.

**Вынесці.** Несучы, удаліць каго-, што-небудзь з памяшкання, транспартнага сродку і пад.

*Унесці (вынесці) груз, мэблю, нябожчыка, рэчы, сумку, хворага, чамадан.*

*Лясэр, высокі, рыжы, з тоўстымі губамі аўстрыец, санітар у санчасці, ускормлены на «недаедках» хворых. Яму трэба сіла ўносіць і выносіць з палат і ў палаты жывых і мёртвых.* С. Грахоўскі.

**УПЭЎНЕНАСЦЬ — НЯЎПЭЎНЕНАСЦЬ**

**Упэўненасць.** Перакананасць у чым-небудзь.

**Няўпэўненасць.** Сумненне ў чым-небудзь.

*Упэўненасць (няўпэўненасць) знікае, з'яўляецца, даследчыка, кардыелага, касманаўта, навукоўца, фізіелага.*

*Я дасюль не магу зразумець, што мяне падбіла выбраць другі варыянт Можа, няўпэўненасць у тым, што намысліў? А можа, наадварот,— упэўненасць?* У. Рубанаў.

**УСЕМАГУТНЫ — БЕЗДАПАМОЖНЫ**

**Усемагутны.** Які здольны вырашыць любую праблему або задачу.

**Бездапаможны.** Які не здольны вырашыць якую-небудзь праблему або задачу.

*Усемагутны, -ая, -ае (бездапаможны, -ая, -ае) дзеяч, кіраўнік, лідэр, палітык, партнер, функцыянер.*

*Ён наогул не ведаў, што такое страх, таму што сам быў для іншых страхам Каго яму баяцца, калі ён сам бадай усемагутны Але гэтая ўсемагутнасць адначасова сведчыла і аб тым што ён недзе і бездапаможны.* В. Казько.

**УСКОЧЫЦЬ — САСКОЧЫЦЬ**

*незак.* ускакваць — саскакваць

**Ускочыць.** Скачком падняцца на што-небудзь.

**Саскочыць.** Скачком спусціцца з чаго-небудзь.

*Ускочыць (саскочыць) адразу, лоўка, няўдала, спрытна, удала.*

*Ён пасядзіць на возе бокам, паматляе нагамі, а потым саскочыць на зямлю і ідзе побач; потым зноў спрытна ўскочыць на воз і зноў саскочыць.* Я. Маўр.

**УСПЫХВАЮЧЫ — ТУХНУЧЫ**

*зак.* успыхнуўшы — патухшы

**Успыхваючы.** Запальваючыся.

**Тухнучы.** Гаснучы.

*Успыхваючы (тухнучы) ляцець, пралятаць, рытмічна, сістэматычна*

*Яны абедзве зірнулі ўверх, паглядзелі, як там, успыхваючы і тухнучы, ляцелі рознакаляровыя агеньчыкі. ціша ў і аддаляўся гул.* Г. Далідовіч.

**УСПЫХНУЦЬ — ЗГАСНУЦЬ (ПАТУХНУЦЬ)**

*незак.* успыхваць — згасаць

**Успыхнуць. 1.** Засвяціцца. **2.** Раптоўна раскрыцца чыйму-небудзь таленту. **3.** Раптоўна расхвалявацца, раззлавацца.

**Згаснуць. 1.** Патухнуць. **2.** Раптоўна загінуць чыйму-небудзь таленту. **3.** Раптоўна супакоіцца.

*Успыхнуць (згаснуць) агню, бензіну, запалцы, полымю, пораху, святлу*

*Уперадзе, недзе на шашы, успыхнулі агні фар і, нібы спалохаўшыся цемнаты, адразу згаслі.* І. Пташнікаў. *У цемрадзі сенцаў успыхнула і патухла запалка.* Р. Сабаленка.

*Успыхнуць (згаснуць) зорцы (тэатральнай, эстраднай), кіназорцы. Колькі за гэтыя васемнаццаць гадоў успыхла і згасла эстрадных зорак, колькі мы бачылі ўзлётаў і заходаў, колькі «новых» і «звышновых» павеваў прыйшло і адышло, а «Песняры» ўпэўнена і ўпарта крочаць сваёй адметнай дарогай, кожнай работай раскрываючы ўсё новыя, часта нечаканыя свае магчымасці.* ЛіМ.

*Успыхнуць (згаснуць) гневу, злосці. Гнеў, які ўспыхнуў быў, згас.* І. Навікаў.

**УСХОД — ЗАХАД**

**Усход. 1.** З'яўленне над гарызонтам нябеснага свяціла. **2.** Адзін з чатырох напрамкаў свету, процілеглы захаду. **3.** Краіны, размешчаныя на ўсход ад пэўнай канкрэтнай дзяржавы.

**Захад. 1.** Знікненне за гарызонтам нябеснага свяціла. **2.** Адзін з чатырох напрамкаў свету, процілеглы ўсходу. **3.** Краіны, размешчаныя на захад ад пэўнай канкрэтнай дзяржавы.

*Усход (захад) сонца*

*Ці яно там у плямах было, ці без іх, толькі радаваўся ён сонейку і пры ўсходзе, і пры захадзе.* А. Петрашкевіч.

*Усход (захад) блізкі, далекі; адштурхоўвае, вабіць, прыцягвае.*

*Як далека — усход ад захаду, як далека поўнач ад поўдня, так далека ты ад мяне.* В. Зуёнак.

*Усход (Захад) адабрае, пагражае, падтрымлівае, прапануе, супрацьстаіць.*

*Ты, дыпламат, за барометр больш тонка надвор'е мусіш адчуваць — што йдзе з Усходу і Захаду, а што на поўначы гудзіць, каб перадаць свайму народу, адкуль пагрозы навальніц.* П. Броўка.

**УХВАЛЕННЕ — СКАСАВАННЕ**

**Ухваленне.** Афіцыйнае зацвярджэнне або адабрэнне чаго-небудзь.

**Скасаванне.** Афіцыйная ліквідацыя або адмена чаго-небудзь.

*Ухваленне (скасаванне) дагавора, дэкрэта, закона, пагаднення, плана, указа.*

*Рэспубліканская Рада Таварыства ў якасці заканадаўчай ініцыятывы падае ў Вярхоўны Савет прапановы дзеля ўхвалення новых ці скасавання і змянення дзейных заканадаўчых актаў, якія закранаюць моўныя пытанні.* ЛіМ.

**УЧОРА — ЗАЎТРА**

**Учора.** У дзень, які папярэднічае сягоншняму.

**Заўтра.** У наступны дзень пасля сягоншняга.

*Учора (заўтра) апоўдні, апоўначы, вечарам, днём, ноччу, раніцай.*

*Сёння працаваць лепш, чым учора, заўтра — лепш, чым сёння.* «Звязда».

**УШАНАВАЦЬ -- ЗБЭСЦІЦЬ** (*разм.*) *незак.* ушаноўваць — збэшчваць

**Ушанаваць.** Аднесціся з пашанай, павагай да каго-небудзь.

**Збэсціць.** Аднесціся са зняважаю, ганьбаваннем да каго-небудзь.

*Ушанаваць (збэсціць) інваліда, палітыка, сірату, спецыяліста, старца, суседа*

*«Гэта ваша справа, Таццяна Арцемаўна.— спакойна адказаў я — Як і любіць ці не любіць перабудову».— «Я ненавіджу яе! — разышлася яна.— Жадаю ёй краху! І веру: прыйдзе той, хто завяжа распушчаныя языкі, зноў навядзе лад, ушануе тых, каго цяпер бэсцяць».* Г. Далідовіч.

## Ф

**ФАРМАЛЬНЫ — ФАКТЫЧНЫ**

**Фармальны.** Які фармальна адпавядае агульнапрынятым крытэрыям, прад'яўляемым да каго-, чаго-небудзь.

**Фактычны.** Які фактычна адпавядае агульнапрынятым крытэрыям, прад'яўляемым да каго-, чаго-небудзь.

*Фармальны, -ая, -ае (фактычны, -ая, -ае) кіраўнік, лідэр, незалежнасць, самастойнасць, улада.*

*Зараз ніхто, здаецца, не аспрэчвае, што ў ёй [партыйнай арганізацыі] лідэрам не толькі фармальным, але і фактычным з'яўляўся В. Ляонаў.* «Звязда».

**ФІЗІЧНА — ДУХОЎНА (МАРАЛЬНА)**

**Фізічна.** Пра матэрыяльную існасць чалавека — яго арганізм, знешняе аблічча і пад.

**Духоўна.** Пра нематэрыяльную існасць чалавека — яго душэўныя перажыванні, сілы, пачуцці і пад.

*Фізічна (духоўна) зламаны, знясілены, нікчэмны, прыгожы, развіты.*

*Тут мала тое рабіць, што асабіста табе хочацца (не хочацца) цяпер, тут трэба найвышэйшы роздум, найразумнейшы падыход да ўсяго, што забяспечыць шчаслівую будучыню. Канечне, фізічна*

*мы там не будзем жыць, але духоўна застанемся, як, скажам, сёння з намі Скарына, Каліноўскі, Купала.* Г. Далідовіч. *«Вы бачылі на допытах, што арыштаваныя па «справе вайскоўцаў» намеснік камандуючага войск акругі камкор Прымакоў і камкор Путна пасля бесперапынных катаванняў былі фізічна і маральна зламаны, знясілены, змардаваны?» — «Бачыў»,— ледзь чутна прамовіў Яжоў.* А. Сульянаў.

**ФРОНТ — ТЫЛ**

**Фронт.** Тэрыторыя ваенных дзеянняў і размяшчэння ваюючых войск.

**Тыл.** Тэрыторыя, размешчаная ззаду лініі фронту.

*Фронт (тыл) варожы, моцны, слабы, трывалы, уласны.*

*Мы рваліся ім на дапамогу, але не меней былі патрэбны і тут; без моцнага тылу не абысціся фронту.* С. Грахоўскі.

## Х

**ХАВАЦЬ — УВАСКРАШАЦЬ**

*зак.* лахаваць — уваскрэсіць

**Хаваць.** Закопваць у зямлю нябожчыка.

**Уваскрашаць.** Вяртаць да жыцця таго, хто памёр.

*Хаваць (уваскрашаць) днём, вечарам, ноччу, ранкам.*

*Жанчыны паехалі, і ён ведаў: нарэшце, маці, браты, айчым даведаюцца: жывы Андрэй. Маці, якая ўжо сотні разоў аплакала і пахавала і зноў уваскрэсіла яго, салдата, прапаўшага без весткі, прыехала.* «Звязда».

**ХАРОШЫ — БЛАГІ**

**Харошы.** Добры, высакаякасны.

**Благі.** Дрэнны, нізкаякасны.

*Харошы, -ая, -ае (благі -ая, -ое) зямля, поле, сенажаць, твор, харч.*

*Што мог я адказаць яму? Кажу: «Калега дарагі, надрукаваў ты твор благі ..» — «А што табе? Благі! Харошы! Не ты за творы плаціш грошы».* В. Тарас.

**ХВАЛІЦЬ — ГАНІЦЬ (КРЫТЫКАВАЦЬ, АСУДЖАЦЬ)**

*зак* пахваліць — зганіць

**Хваліць.** Даваць высокую ацэнку, выказваць пахвалу каму-, чаму-небудзь.

**Ганіць.** Даваць нізкую ацэнку, асуджаць каго-, што-небудзь, выяўляючы недахопы.

**Асуджаць.** Прызнаваць заганным, ганебным каго-, што-небудзь.

*Хваліць (ганіць) гаспадара, гаспадарку, дысертацыю, кнігу, мастака, сваяка, твор, установу.*

*Хрысціна назірала за нявесткай з хаты. «Строгая»,— думала яна словамі прыбіральшчыцы і не магла зразумець, ганіць гэтым Ніну ці хваліць.* А. Асіпенка. *Справы ішлі, за сёе-тое ўстанову хвалілі, за тое-сёе крытыкавалі.* Б. Сачанка. *Вы памыляецеся, калі хваліце ці асуджаеце яго, бо сапраўдны паэт адкрывае новыя ісціны, а яны ніколі не нараджаюцца бясспрэчнымі.* М. Танк.

**ХВАРЭЦЬ — АЧУНЬВАЦЬ**

*зак.* захварэць — ачуняць

**Хварэць.** Быць хворым на якую-небудзь хваробу.

**Ачуньваць.** Папраўляцца пасля якой-небудзь хваробы.

*Хварэць (ачуньваць) жывёле, звеpу, чалавеку.*

*Не думай гэтак ты нябож! Ці мала людзі так хварэлі? Хварэлі годы — не нядзелі, такіх здарэнняў вельмі многа, але ачуньвалі й нічога І ты, дасць бог, на ногі станеш, пяройдзе ліха, ачуняеш.* Я. Колас.

**ХІТРЫ — НЯХІТРЫ**

**Хітры.** Няпросты, мудрагелісты.

**Няхітры.** Просты, немудрагелісты.

*Хітры, -ая, -ае (няхітры. -ая, -ае) замок, рэч, цацка.*

*Памыліцца той, хто падумае, што зляпіць з гліны яйка — справа няхітрая. Ого, і якая яшчэ хітрая! Асабліва цяжка высушыць, каб яно не трэскалася.* Я. Маўр.

**ХРЭСЬБІНЫ** *(адз. няма)* — **ХАЎТУРЫ** *(адз. няма)*

**Хрэсьбіны.** Абрад хрышчэння.

**Хаўтуры.** Абрад провадаў для пахавання.

*Хрэсьбіны (хаўтуры) гарадскія, панскія, сціплыя, сялянскія, тутэйшыя*

*І смерць яго ўзняла на ногі, узбулгачыла звыклую ўжо да гэтага, заўсёды гатовую да хаўтур, як раней да хрэсьбін, вуліцу.* В. Казько.

**ХУДЫ (ШЧУПЛЫ, ТОНКІ) — МАЖНЫ (ТОЎСТЫ)**

**Худы.** Нягеглы, кволага целаскладу.

**Мажны.** Моцны, паўнацелы.

*Худы (мажны) вайсковец, госць, дзіцянё, кабета, кліент, начлежнік, пасажыр, сусед, юнак.*

*Ліза ляжала на ўсходцах ганка, раскінуўшы рукі на ўсю яго шырыню, і як расплылася на ім: мажная жанчына здалася худой і плоскай.* І. Шамякін. *Побач са шчуплым увішным Юрасём Ляшуком угнездзілася ці не ў тры разы мажнейшая ягоная палавіна.* І. Аношкін. *Пакуль ён запомніў, што адзін з іх, ніжэйшы і тоўсты, каторы адразу ж заняў ложак ля акна, быў з Палтавы, а другі, тонкі і вышэйшы, які самахоць прагаласаваў за ложак «далей ад акна і бліжэй да дзвярэй», прыехаў у Кіславодск з Чарнігава....* М. Гіль.

**ХУТКА — МАРУДНА (ПАВОЛЬНА)**

**Хутка.** Скора, паспешліва.

**Марудна.** Павольна, няспешна.

*Хутка (марудна) гаварыць, плесці, прасці, працаваць, ткаць, цягнуць, шыць*

*На попрадках дзяўчаты маглі паказаць, як хто ўмее прасці — тонка ці тоўста, хутка ці марудна.* Б. Сачанка. *Галоўнае — гэта, хто дровы пілаваць будзе! Я з маёй старою як вазьмуся за гэтую справу, дык адразу лаянка: то я хутка цягну, то павольна, то занадта націскаю, то поверху пускаю.* П. Броўка.

# Ц

**ЦАЛКАМ — УРАЗДРОБ** *(разм.)*

**Цалкам.** У поўным аб'еме.

**Ураздроб.** Па частках, штуках.

*Цалкам (ураздроб) купляць, прадаваць.*

*Я ўраздроб не прадаю, а ўсё цалкам.* К. Чорны.

**ЦВІСЦІ — ВЯНУЦЬ**

**Цвісці.** Паступова раскрывацца пялёсткам бутона.

**Вянуць.** Паступова высыхаць і ападаць пялёсткам бутона.

*Цвісці (вянуць) кветцы.*

*Спарыш і дзяцельнік гусціліся ля дарог, цвілі і вялі жоўтыя кветкі на высокіх сцёблах.* К. Чорны.

**ЦВЯРОЗЫ — П'ЯНЫ**

**Цвярозы.** Які, не ўжываўшы спіртнога, знаходзіцца ў звычайным, нармальным стане.

**П'яны.** Які, ужыўшы спіртное, знаходзіцца у стане ап'янення.

*Цвярозы, -ая (п'яны, -ая) госць, наведвальнік, пасажыр, сусед.*

*«Навошта вы яго п'янага ў ЗАГС прывялі?» — «Дык яго ж цвярозага не зацягнеш».* «Вожык».

**ЦВЯРОЗЫ** *(у знач. наз.)* — **П'ЯНЫ** *(у знач. наз.)*

**Цвярозы.** Той, хто, не ўжываўшы спіртнога, знаходзіцца ў звычайным, нармальным стане.

**П'яны.** Той, хто, ужыўшы спіртное, знаходзіцца ў стане ап'янення.

*Цвярозы (п'яны) гаруе, радуецца, цешыцца.*

*Таму я і складаю гімн цвярозым: няхай жыве давеку ясны розум! Калі ж не можа свет зусім без п'яных, дык лепш ужо хмялець ад губ каханых.* П. Макаль.

**ЦЕШЫЦЦА — СМУЦІЦЦА**

*зак.* нацешыцца — засмуціцца

**Цешыцца.** Мець душэўную асалоду, радавацца.

**Смуціцца.** Бедаваць, журыцца.

*Цешыцца (смуціцца) адкрыта, самнасам, яўна.*

*Я хацеў бы знаць, як селянін-рольнік повен дум якіх? Ці ён смуціц-*

*ца, пазіраючы, што труды яго так марнуюцца? Ці ён цешыцца, у полі ходзячы?* Я. Колас.

**ЦЁПЛЫ — ХАЛОДНЫ (СЦЮДЗЁНЫ** *(разм.)***)**

**Цёплы.** Які мае адносна высокую тэмпературу.

**Халодны.** Які мае адносна нізкую тэмпературу.

*Цёплы, -ая, -ае (халодны, -ая, ае) вадкасць, вецер, нага, надвор'е, печ, пот, пясок, рука, страва, цела.*

*Я хуценька падняў яго апушчаную руку, прыклаў вялікі палец да запясця — рука не была цёплая, але і не халодная, а праз колькі хвілін я адчуў і кволы пульс.* Г. Далідовіч. *Як пацерку да пацеркі, за годам год на шнур жыцця ўсё ніжа, ніжа, адна з тых пацерак сцюдзёная, як лёд, другая цёплая, як сонца летні ўсход.* Я. Купала.

**ЦІКАВА — НЕЦІКАВА**

**Цікава.** Пра захапляльнасць якога-небудзь працэсу, дзеяння.

**Нецікава.** Пра адсутнасць захапляльнасці ў якім-небудзь працэсе, дзеянні.

*Цікава (нецікава) апавядаць, гаварыць, пісаць.*

*Уключыць, што цікава, паслухае, а калі і нецікава, дык усё ж чуецца нечы голас у хаце.* П. Броўка.

**ЦІХА — ШУМНА**

**Ціха.** Пра наяўнасць цішыні, спакою.

**Шумна.** Пра наяўнасць шуму, ажыўлення.

*Ціха (шумна) заўсёды, навокал, пастаянна, цяпер, часам.*

*Раней не хацелася быць у хаце, калі і ў ёй, як і ў школе, было шумна, цяпер цягнула выйсці з яе, бо было вельмі ціха.* Г. Далідовіч.

**ЦІХІ — БУЙНЫ**

**Ціхі.** Які, будучы псіхічна хворым, адносна спакойны.

**Буйны.** Які, будучы псіхічна хворым, нястрыманы, шумлівы.

*Ціхі, -ая (буйны, -ая), вар'ят, вар'ятка.*

*З абодвух бакоў камеры — справа і злева — памяшчаліся вар'яты. Справа жыў ціхі вар'ят, злева — буйны. Той, хто быў ціхім, і дні, і ночы без перапынку маліўся. Буйны — круглыя суткі не даваў спакою сваім суседзям. Ён і маліўся, і лаяўся...* П. Пруднікаў.

**ЦІХОНЯ — САРВІГАЛАВА**

**Ціхоня.** Лагодны, ціхмяны чалавек.

**Сарвігалава.** Той, хто нічога не баіцца, ні перад чым не спыняецца.

*Ціхоня (сарвігалава) вырастае.*

*Адразу відаць, што ў сям'і растуць хлопцы, ды не ціхоні — сарвігаловы.* І. Новікаў.

**ЦІША (ЦІШЫНЯ, ЗАЦІШША) — БУРА**

**Ціша.** Бязветранае, спакойнае надвор'е.

**Бура.** Вецер вялікай, разбуральнай сілы, звычайна з дажджом.

*Ціша (бура) кароткатэрміновая, працяглая.*

*Снег, здаецца, варушыцца, дыша, наздраваты, прабіты цяплом. У бары, як прад бураю ціша, нават вецер не шасне крылом.* П. Панчанка. *Перад вялікай бурай заўсёды бывае вялікая цішыня.* Р. Семашкевіч. *Аказваецца, тое зацішша было перад бурай.* В. Гроднікаў.

**ЦІША (ЦІШ** *(разм.)***, ЦІШЫНЯ) — ГУЛ (ШУМ)**

**Ціша.** Спакой у акаляючай прасторы, бязгучнасць.

**Гул.** Працяжнае гучанне галасоў ці ўспрымаемых слыхам дзеянняў.

*Ціша (гул) наваколля; усталёўваецца.*

*Мне далі магчымасць выбраць кватэру, і я знарок выбраў гэтую. Бо не змог бы пісаць у цішы. Гул горада натхняе мяне. Тут я адчуваю, што жыву, што я — часцінка працоўнага горада.* У. Карпаў. *Адзін — ціш любіць, паважае, другі — гул, нібы набат.* П. Броўка. *Але натоўп з таго боку быў ужо тут. Страшны гул трос цішыню.* К. Чорны. *Навакольную цішыню ўраўнаважваў роўны шум. Ён быў да таго аднатонны, што зліваўся з цішынёю.* К. Чорны.

**ЦІШКОМ — АДКРЫТА**

**Цішком.** Непрыкметна, употай.

**Адкрыта.** Не скрытна, не тайна.

*Цішком (адкрыта) дзейнічаць.*
*Там цішком а там — адкрыта, прагна (з візамі, без віз) нехта пхнецца да карыта, «дайце» — вось яго дэвіз.* В. Жуковіч.

**ЦІШЭЦЬ — МАЦНЕЦЬ**

**Цішэць.** Рабіцца цішэйшым.

**Мацнець.** Рабіцца мацнейшым.

*Цішэць (мацнець) грукату, гулу, ліўню, страляніне, шуму.*
*Над лесам і, здавалася, над усім светам шумеў лівень. Ён шумеў бязветрана, роўна, раскатна. То цішэў, то мацнеў.* П. Пестрак.

**ЦЫВІЛЬНЫ (ГРАМАДЗЯНСКІ) — ВАЙСКОВЫ (ВАЕННЫ)**

**Цывільны.** Які звязаны з цывільным жыццём, з цывільнай дзейнасцю.

**Вайсковы.** Які звязаны з вайсковым жыццём, з вайсковай дзейнасцю.

*Цывільны, -ая, -ае (вайсковы, -ая, -ае) абутак, асоба, будынак, вопратка, люд, тэхніка, чалавек.*
*Вайсковы люд і люд цывільны вакзалы поўнілі сабой.* Я. Колас. *Можна ехаць толькі на Маскву, ды і то з ведама ваеннага каменданта станцыі Алесь жа цывільны чалавек.* І. Новікаў. *Але і тады ні гаварыць, ні тым больш пісаць пра яе вы не павінны нікому — ні ваенным, ні грамадзянскім асобам.* І. Новікаў.

**ЦЬМЯНЫ — ВЫРАЗНЫ**

**Цьмяны.** Тое, што без яснага, дакладнага сэнсу.

**Выразны.** Тое, што з ясным, дакладным сэнсам.

*Цьмяны, -ая, -ае (выразны, -ая, -ае) думка, пачуццё, фармуліроўка, чутка.*
*Разам з тым падсвядомая, цьмяная радасць, што з'явілася з яго прыходам, рабілася выразнай — ён, мусіць, і праўда хоча зрабіць прапанову?* В. Блакіт.

**ЦЯПЛО (ЦЕПЛЫНЯ ) — ХОЛАД**

**Цяпло.** Высокая тэмпература навакольнага асяроддзя.

**Холад.** Нізкая тэмпература навакольнага асяроддзя.

*Цяпло (холад) змяншаецца, павялічваецца*
*Пасля парнага цяпла кухні бралі дрыжыкі, пад кароткі кажух поўз холад, студзіў калені.* В. Адамчык. *Уладзімір Ільіч адчуў гэтую прыемную цеплыню, якая пасля холаду бадзёрыць, задаволена пацёр рукі, пераступаючы з абцасаў на насочкі — размінка ног.* І. Шамякін.

## Ч

**ЧАЛАВЕК — ВЫЛЮДАК**

**Чалавек.** Істота, якой уласцівы людскія якасці.

**Вылюдак.** Істота, якой уласцівы антылюдскія якасці.

*Чалавек (вылюдак) дзейнічае, учыняе.*
*Думала, ей будзе манна нябесная, калі прадасць Галіну немцам, дык Апанас вернецца да яе. На такое здольны толькі вылюдак, вядзьмарка, а не чалавек. На жаль, нічым і ніяк гэтага не дакажаш.* В. Супрунчук.

**ЧАСТА — РЭДКА**

**Часта.** Праз кароткія прамежкі часу.

**Рэдка.** Праз працяглыя прамежкі часу.

*Часта (рэдка) аб'яўляцца, весяліцца, купацца, наведвацца, сустракацца.*
*Тое, што выюць ваўкі ў лесе... такое — бывае часта; а тое, якому гарматы сведкай, такое — бывае рэдка.* А. Куляшоў.

**ЧУЛАСЦЬ — БЯЗЛІТАСНАСЦЬ**

**Чуласць.** Спагадлівасць, спачувальнасць.

**Бязлітаснасць.** Неміласэрнасць, жорсткасць.

*Чуласць (бязлітаснасць) выражаць, праяўляць.*
*У шалмане я назіраў мноства зламаных лёсаў, маральнае падзенне, жорсткасць і сентыментальнасць у адной асобе, бязлітаснасць і чуласць ад «душещипательных романов».* С. Грахоўскі.

## Ш

**ШЛЮБ (ЖАНІЦЬБА) — РАЗВОД (РАЗЖАНІЦЬБА** *(разм.)***)**

**Шлюб.** Сямейны саюз мужчыны і жанчыны.

**Развод.** Афіцыйнае скасаванне шлюбу.

*Шлюб (развод) афіцыйны, фіктыўны.*

*Быў і шлюб, і быў развод — і праз месяц і праз год*. М. Вяршынін. *Жаніцьба — адзін з самых сур'ёзных крокаў у жыцці чалавека. Асабліва ў ранейшыя часы, калі разводаў не было*. Б. Сачанка. *Жаніцьба ёсць, а разжаніцьбы няма.* Б. Сачанка.

**ШТОРАНІЦЫ — ШТОВЕЧАР**

**Штораніцы.** Кожнай раніцай.

**Штовечар.** Кожным вечарам.

*Штораніцы (штовечар) аглядаць, наведваць, правяраць, прагульваць, праходзіць.*

*Але гэта была яго, Іванава, сцежка, ён штораніцы ішоў па ёй на працу, штовечар вяртаўся.* І. Шамякін.

**ШТЫЛЬ — ШТОРМ**

**Штыль.** Бязветранае надвор'е на моры, у акіяне ці на вялікім возеры.

**Шторм.** Бура на моры, у акіяне ці на вялікім возеры.

*Штыль (шторм) акіянічны, марскі.*

*У сэрцы нашым шмат прастору, яго не змераць сотняй міль, людское сэрца быццам мора, у ім бывае шторм і штыль.* П. Броўка.

**ШЧАСЛІВЕЦ — НЕШЧАСЛІВЕЦ (ГАРОТНІК** *(разм.)***)**

**Шчаслівец.** Той, каму шанцуе, каму спадарожнічае шчасце.

**Нешчаслівец.** Той, каму не шанцуе, каму спадарожнічае гора.

*Шчаслівец (нешчаслівец) мясцовы, пастаянны, прыезджы, тутэйшы.*

*Ведаеш, у мяне пастаянна такое ўражанне ад усяго майго бязладнага жыцця, што я нейкі ці то шчаслівы нешчаслівец, ці то нешчаслівы шчаслівец.* А. Асташонак. *Хто ён — шчаслівец альбо гаротнік, што па волі лёсу пажыццёва прысуджаны толькі да пахвалы?* Г. Далідовіч.

**ШЧАСЛІВЫ (ШЧАСНЫ** *(разм.)***) — НЕШЧАСЛІВЫ (САМОТНЫ, НЯШЧАСНЫ, ЖУРБОТНЫ)**

**Шчаслівы. 1.** Поўны задавальнення жыццём, выкліканага поспехамі ці ўдачамі. **2.** Які прыносіць радасць, шчасце, дабрабыт і пад.

**Нешчаслівы. 1.** Поўны глыбокага смутку, душэўнага болю, выкліканага жыццёвымі нягодамі ці няўдачамі. **2.** Які прыносіць гора, няшчасце, нястачу і пад.

*Шчаслівы, -ая, -ае (нешчаслівы, -ая, -ае) вандроўнік, ігрок, навукоўца, падарожнік, прыезджы, сусед, турыст.*

*Шчаслівы ты ці нешчаслівы, будзі сыноў сваёй зямлі.* Я. Купала.

*Шчаслівы, -ая, -ае (нешчаслівы, -ая, -ае) выпадак, дзень, доля, лёс, час, шлюб.*

*І не ведаў таксама Ясь Луцэвіч, што ўжо ёсць на свеце людзі, з якімі яго сутыкне лёс шчаслівы і нешчаслівы.* А. Лойка. *На радзіме васількуюць нівы, вочы з васількоў у землякоў. Не самотны, кажаш, ты шчаслівы з той сямейкай вольнаю радкоў.* К. Камейша. *Вы — шчаслівы, з доляй яснай — і то рады пагуляці, а я ж, я — жабрак няшчасны... Эх, не крыўдуй насмешкай, браце.* Я. Купала. *Адчыняйце заслону, купалаўцы! У дні шчасныя і журботныя.* П. Броўка.

**ШЧАСЦЕ — ГОРА (БЯДА, ЗЛЫБЕДА** *(разм.)*, **ЛІХА, НЯШЧАСЦЕ)**

**Шчасце.** Жыццёвыя поспехі, удачы.

**Гора.** Жыццёвыя нягоды, няўдачы, страты.

*Шчасце (гора) былое, вялікае, зямное, малое, сваё, чужое.*

*Я за свой век нагаладалася, намёрзлася, нацярпелася гора, таму і сохла сэрцам па дзецях і па іхнім шчасці.* А. Асіпенка. *Я з чыгуначным білетам да Слуцка выправіўся шукаць сваё шчасце, а можа... і новую бяду.* С. Грахоўскі. *Нягле-*

*дзячы на ўсе ўніжэнні і здарэнні, я не падаю духам. і добрае і кепскае. і шчасце і злыбеду — усё сустракаю, як заўсёды. з усмешкаю і спакоем. я створаны для турмы, для гора.* А. Александровіч. *Знаць, ужо спрадвеку доля нам такая· ліха знойдзе ўсюды, шчасце ж уцякае.* Я. Колас. *З прозвішчам новым далі і імя ёй другое, каб не азмрочвала шчасця няшчасце былое.* А. Куляшоў.

**ШЧОДРАСЦЬ — СКВАПНАСЦЬ**

**Шчодрасць.** Схільнасць да задавальнення чужых патрэб і пажаданняў за кошт уласных магчымасцей.

**Сквапнасць.** Прага да багацця, спараджаючая скупасць, хцівасць.

*Шчодрасць (сквапнасць) людская, прыроджаная.*

*У цішыні па-доктарску чыстага пісьменнікавага пакойчыка яны [вобразы] пачыналі сваё жыццё: пераходзілі з уяўлення на паперу, надзеленыя шчодрасцю або сквапнасцю, адвагай ці баязлівасцю.* М. Лужанін.

**ШЧОДРЫ — СКВАПНЫ**

**Шчодры.** Які схільны да задавальнення чужых патрэб і пажаданняў за кошт уласных магчымасцей.

**Сквапны.** Які, прагнучы багацця, робіцца скупым, хцівым.

*Шчодры, -ая, -ае (сквапны, -ая, -ае) гаспадар, сваяк, сусед.*

*У такія хвіліны яна можа быць шчадрэй самай шчодрай і смялей самай смелай.* А. Кудравец. *Сквапная яна! Няма каб сказала, што не трэба мне, значыцца, гэткае хусткі, дык не — каб самой глынуць.* К. Чорны.

**ШЧЫРАСЦЬ — НЯШЧЫРАСЦЬ**

**Шчырасць.** Адпаведнасць чыіх-небудзь слоў і ўчынкаў яго сапраўдным пачуццям, намерам ці планам.

**Няшчырасць.** Неадпаведнасць чыіх-небудзь слоў і ўчынкаў яго сапраўдным пачуццям намерам ці планам.

*Шчырасць (няшчырасць) адчуваецца, праяўляецца; ідавочная.*

*Я чую шмат слоў. Бачу мноства людзей. Усе яны кажуць, што трэба адрозніваць няшчырасць ад шчырасці, уяўнасць ад праўды.* А. Разанаў.

**ШЫКОЎНАСЦЬ — НЕПАГЛЯДНАСЦЬ**

**Шыкоўнасць.** Пышнасць, велічнае хараство.

**Непагляднасць.** Убоства, непрыгляднасць.

*Шыкоўнасць (непагляднасць) будынка, вёскі, вуліцы, горада, хаты.*

*Для Хрысціны даражэй Старых Барсукоў нічога на свеце не было. Нават іхняя непагляднасць мела свае перавагі перад шыкоўнасцю Новых Барсукоў.* А. Асіпенка.

**ШЫРОКІ — ВУЗКІ**

**Шырокі.** Які мае вялікія памеры ў папярочніку.

**Вузкі.** Які мае невялікія памеры ў папярочніку.

*Шырокі, -ая, -ае (вузкі, -ая, -ае) акно, дарога, паласа, паліца, поле, рэчка, тратуар.*

*Каля самога Нізка цячэ пятляначчка Вуса — не шырокая і не вузкая, усё яшчэ рыбная цяпер, у век меліярацыі.* «Полымя».

## Я

**ЯВА — СОН (МАРА, ДУМА, КАЗКА, ТРЫЗНЕННЕ)**

**Ява.** Тое, што ў рэальнасці можна бачыць, успрымаць, адчуваць і пад.

**Сон.** Тое, што сніцца.

**Мара.** Тое, што ствараецца ўяўленнем, фантазіяй.

**Дума.** Мысль, разважанне, роздум.

**Трызненне.** Тое, што ствараецца ўяўленнем у выпадку расстройства дзейнасці мозга.

*Ява (сон) жаданая (-ы), радасная (-ы), страшная (-ы), фантастычная (-ы).*

*Ен паверыў, што не сон гэта і ніякае не насланнё, а ява ўсё, ява.* В. Казько. *Калі не спалучана ісціна ўзнёслых мар і праўда штодзённай явы — як ні намагайся, нічога гераічнага для душы не здабудзеш.* М. Лужанін. *Што ж, не прыйшлося маім думам быць явай радаснай, жаданай.* Я. Купала. *То ў казках ажыве яскрава ўсё, што цешыла раней, але бывае часам ява за казку страшную страшней.* С. Грахоўскі. *Ява і трызненне, як два люстэркі, кожнае адбівае глыбіню другога, забірае яе сабе і зноў вяртае, ужо як сваё.* А. Адамовіч.

**ЯДНАННЕ — РАЗ'ЯДНАННЕ**

**Яднанне.** Згрупаванне, злучэнне людзей.

**Раз'яднанне.** Разгрупаванне, разлучэнне людзей.

*Яднанне (раз'яднанне) наўмыснае, міжвольнае, свядомае.*

*Тыя, хто рассейвае не яднанне, а раз'яднанне, не дружбу, а варожасць, не любоў, а нянавісць, тыя не ўсведамляюць ніякай адказнасці не толькі перад кім-небудзь, але, я ўпэўнены, і самі перад сабой.* І. Шамякін.

**ЯРКІ — БЛЯКЛЫ**

**Яркі.** Тое, што мае сакавіты, выразны колер.

**Бляклы.** Тое, што мае выцвілы, невыразны колер.

*Яркі, -ая, -ае (бляклы, -ая, -ае) кветка, ліст, скура, тканіна.*

*Дзе ні знаходжуся, дзе ні бываю — усё тыя кветкі, яркія, бляклыя, успамінаю.* Г. Каржанеўская.

**ЯСНАСЦЬ — СМУГА**

**Яснасць.** Празрыстасць атмасферы (калі няма дымкі, аблокаў).

**Смуга.** Лёгкая, падобная на дым атмасферная павалока, дымка.

*Яснасць (смуга) неба.*

*Паднімаючыся ад зямлі, сіняя густая смуга тушыла на небе ліловую яснасць.* А. Асіпенка.

**ЯЎНЫ — ТАЙНЫ (ПАТАЙНЫ)**

**Яўны.** Відавочны, не скрыты ад іншых.

**Тайны.** Сакрэтны, скрыты ад іншых.

*Яўны, -ая, -ае (тайны, -ая, -ае) нагляд, намер, небяспека, супрацiўленне, трывога.*

*Як яшчэ доўга гэта будзе працягвацца — яўныя і тайныя трывогі, што сушаць сэрца страшней за хваробу.* І. Шамякін. *Адседка ў крэпасці вяла за сабой паліцэйскі нагляд, яўны або патайны. Вольна дыхнуць не спадзявайся.* М. Лужанін.

# ПАРОНІМЫ

# ПАРОНІМЫ

Паронімамі называюцца словы, блізкія па гучанню, але розныя па значэнню. Знешняе падабенства іншы раз уводзіць чалавека ў зман, і ён памылкова ўжывае адно слова замест ягонага ўяўнага «двайніка». Гэта можа паставіць нас у непрыемнае становішча, асабліва калі такая памылка зроблена ў публічным выступленні ці пісьмовай рабоце.

Найбольш часта даводзіцца чуць, што ў некага *«выразалі апендыцыт»* (замест *апендыкса*), некаму аказалі *«бескарысную дапамогу»* (замест *бескарыслівай*), а нехта бачыў, як *«упаў метэор»*, а не *метэарыт*, як гэта і адбываецца ў сапраўднасці (хоць і даволі рэдка). Калі вы хочаце выглядаць культурным чалавекам, лепей пазбягаць гэтакіх казусаў, што не сведчаць аб культуры мовы.

Як правіла, паронімамі лічацца толькі аднакарэнныя словы, прыналежныя да адной часціны мовы, з адным і тым жа месцам націску і аднолькавымі граматычнымі прыкметамі: *адрасант/адрасат, генеральны/генеральскі, факт/фактар, чалавечы/чалавечны і г. д.* Але ёсць і прыхільнікі пашыранага разумення паранімііі, якія адносяць да яе ўсе блізкія па гучанню словы, незалежна ад прыналежнасці да адной ці розных часцін мовы, месца націску і каранёвай еднасці. Такі прынцып пакладзен у аснову гэтага слоўніка, куды ўвайшлі блізкія па гучанню, але розныя па значэнню словы, узаемазамена якіх магчыма ў моўнай практыцы.

Застаецца дадаць, што часта гэта робіцца наўмысна (пераважна ў гумарыстычным ці сатырычным кантэксце), каб падкрэсліць недарэчнасць таго ці іншага персанажа, паставіць яго ў смешнае становішча. Сапраўды, ці не смешна, калі чалавек блытае маляра з муляром, ларнет з кларнетам, а фарс — з фаршам?

# А

**АБАНЕМЕНТ — АБАНЕНТ**

**Абанемент.** Дакумент на права часовага карыстання чым-н. *Абанемент: тэатральны, бібліятэчны. Тэрмін яго абанемента канчаўся, трэба было набываць новы.*

**Абанент.** Асоба, якая мае абанемент. *Абанент: новы, акуратны; абанент: бібліятэкі, філармоніі і г д. Прозвішчы герояў яшчэ толькі названы. Яны гавораць вам не больш, чым прозвішчы абанентаў у тэлефоннай кнізе.* Р. Шкраба.

**АБВЕСТКА — ПАВЕСТКА**

**Абвестка.** Паведамленне, якое даводзіцца да ўсеагульнага ведама. Сінонім: аб'ява. *У канцы таго ж дня сяляне, што працавалі на гравійцы, прынеслі канваіраву абвестку ў сваю вёску, і праз некаторы час яе ўжо ведалі ў кожнай хаце.* М. Аўрамчык.

**Павестка. 1.** Афіцыйнае пісьмовае паведамленне з выклікам куды-н. Сінонімы: позва, выклік. *— Я сягоння на акопах не быў. За пасыльнага трымалі ў камендатуры. З раніцы ездзіў у вёску з павесткамі, пасля суправаджаў абоз.* В. Карамазаў. **2.** Кола пытанняў, якія павінны быць абмеркаваны на сходзе, пасяджэнні; павестка (парадак) дня. *Даклад пачаўся пасля таго, калі была прынята павестка.* А. Васілевіч.

**АБГАВАРЫЦЬ — АГАВАРЫЦЬ**

**Абгаварыць. 1.** што. Усебакова разгледзець, абмеркаваць штонебудзь, з кім-н. *Хутчэй бы вярнуўся Іван, каб сказаць яму нечаканую навіну, падзяліцца радасцю і абгаварыць, што трэба да вяселля.* І. Шамякін. **2.** *каго.* Узвесці на каго-н. паклёп, ілжывае абвінавачанне; зганіць, абылгаць. *Ён саромеўся, што іх могуць убачыць і абгаварыць.* В. Вітка.

**Агаварыць.** *што.* Зрабіць агаворку, даць дадатковыя заўвагі,тлумачэнні да раней сказанага ці напісанага. *Пан Юры нявесела ўсміхаўся і падтакваў сыну: — Але. Вядома. Не збяднеем. Затое агаворым, каб вярнуліся сюды.* У. Караткевіч.

**АБРАЗ — ВОБРАЗ**

**Абраз.** Малюнак Бога ці святога як прадмет рэлігійнага пакланення. Сінонім: ікона. *Павуцінаю заткана столь і кут над абразом.* Я. Колас.

**Вобраз. 1.** Знешні выгляд, аблічча каго-чаго-н., што ўзнікае ў памяці. *Ігнатка ў памяці ўсплывае і тая ноч, той рад бяроз, і вобраз брата ажывае.* Я. Колас. **2.** Жывое, нагляднае ўяўленне пра што-н. *Вобраз роднай Беларусі, напрыклад, неразлучны з лірычным героем верша «Павей, вецер».* К. Хромчанка. **3.** Абагульнены характар, тып, створаны пісьменнікам, мастаком. *Многія з апавяданняў Чорнага 1926—1927 гадоў вылучаюцца навізною ідэй і вобразаў, уменнем пранікнуць у псіхалогію чалавека новай эпохі.* М. Луфераў.

**АБРЭЗ — АБРЭЗАК**

**Абрэз. 1.** Вінтоўка з укарочаным (абрэзаным) ствалом. *З лесу пачалі выходзіць цэлыя групы людзей з карабінамі, з вінтоўкамі,*

*з абрэзамі, з бярданкамі.* Я. Колас. **2.** Абрэзаны край чаго-н., беражок. *Кніга з зялёным абрэзам.*

**Абрэзак.** Непрыдатны кавалак, які застаўся пасля разразання чаго-н. *Ля рашоткі дзеці раяцца і, захапіўшы з сабой абрэзкі аполкаў, зноў залазяць у падвал.* В. Гарбук.

**АБЫХОДЛІВЫ — АДЫХОДЛІВЫ — АДЫХОДНЫ**

**Абыходлівы.** Ветлівы, далікатны ў абыходжанні. *Рэдактар — хлапчына свойскі, абыходлівы. Ён, здаецца, з тых ураўнаважаных людзей, якія ніколі не хвалююцца, не выходзяць з сябе і на ўсё — добрае і дрэннае ў жыцці — глядзяць паблажліва.* І. Навуменка.

**Адыходлівы.** Здольны хутка забываць крыўду, супакойвацца пасля гневу, злосці. *Душа ў Андрэя была адыходлівая, і ён ужо не злаваў на брата.* В. Карамазаў.

**Адыходны.** Які звязаны з адыходам адкуль-н. *Пачаўся славуты адыходны рэйд атрада далёка на поўнач.* Я. Брыль.

**АБЫЯКАВЫ — АБЫ-ЯКІ**

**Абыякавы.** Які не выяўляе ніякай цікавасці, увагі да каго-, чаго-н. С і н о н і м: раўнадушны. *Спрадвеку было так: той, хто думаў жыць, вучыўся сам і вучыў дзяцей працаваць. А хто быў абыякавы да сваёй будучыні — вучыў дзяцей адпачываць.* Я. Сіпакоў.

**Абы-які.** Які-небудзь, усякі; хоць які. С і н о н і м ы: благі, нядобры. *Так у Малінаўцы з'явіўся новы гаспадар і прытым не абы-які.* А. Чарнышэвіч.

**АБ'ЯДНАЛЬНЫ — АБ'ЯДНАНЫ**

**Аб'яднальны.** Які служыць аб'яднанню, вядзе да аб'яднання. С і н о н і м: аб'яднаўчы. *Аб'яднальны з'езд партыі.*

**Аб'яднаны.** Утвораны з асобных частак, адзінак; сумесны; згуртаваны. С і н о н і м ы: злучаны, з'яднаны. *Праваліўся нашчэнт аб'яднаны паход верных служак цара і французскіх банкіраў.* П. Глебка.

**АБЯЦАНКА — АБЯЦАННЕ**

**Абяцанка.** Няпэўнае, несур'езнае абяцанне, выкананне якога малаверагодна. *Мужык ведаў свайго пана як аблупленага і не верыў яму і яго абяцанкам.* А. Якімовіч.

**Абяцанне.** Дабравольнае абавязацельства выканаць што-н. *Сам Тапурыя даў урачыстае абяцанне больш ніколі не ісці ў мора.* Э. Самуйлёнак.

**АДБІЎНЫ — АДБОЙНЫ**

**Адбіўны. 1.** Якім адбіваюць штонебудзь. *Адбіўны молат.* **2.** Прыгатаваны шляхам адбівання, размякчэння ўдарамі. *У цэлафанавым пакеце была твая вячэра, а магчыма, і сняданак: некалькі адбіўных з хлебам, радыска і салодкія арэшкі.* Г. Ланеўская.

**Адбойны.** Які служыць для адбівання чаго-н. *Лепшая брыгада ламавікоў была знята з шасейкі і кінута на прарыў. Дзесяць чалавек з адбойнымі малаткамі даставіла мясцовая перасовачная калона.* В. Дубінка.

**АДБОРАЧНЫ — АДБОРНЫ**

**Адборачны.** Створаны, прызначаны для адбору каго-н. *Адборачная камісія. Адборачныя сустрэчы баксёраў.*

**Адборны. 1.** Адабраны з ліку іншых як лепшы; выдатны па якасці. С і н о н і м: першагатунковы. *Адборнае жыта ў сеялкі просіцца з цёмных амбараў.* П. Панчанка. **2.** Крайне грубы, непрыстойны (звычайна пра словы, выразы). *Адборная лаянка пракацілася па змрочным вагоне.* М. Лынькоў.

**АДЗЕЦЬ — НАДЗЕЦЬ**

**Адзець. 1.** Пакрыць адзеннем, апрануць каго-н. *Я памятаю: на самым змроку маці мая сказала мне памыць ногі, адзела мне чыстую сарочку, і мы пайшлі на хутар Зялёны Камень.* К. Чорны. **2.** Забяспечыць каго-н. адзеннем. *Ён думаў пра вайну, з якой толькі што вярнуўся, думаў пра дзяцей, якіх трэба было карміць і адзяваць,*

*дый наогул ці мала розных дум і клопатаў у чалавечым жыцці?* В. Гардзей.

**Надзець.** Пакрыць сябе (ці што-н.) адзеннем, нацягнуць на сябе (ці на што-н.) адзенне, абутак, чахол і г. д. *Букрэй зняў шынель, аддаў яе дзеду Талашу, а сам надзеў яго кажушок.* Я. Колас.

**АДЗІНАРНЫ — АРДЫНАРНЫ**

**Адзінарны. 1.** Зроблены з адной часткі, не падвойны. *Цяпер і тут дзверы, адзінарныя, з доўгімі надворнымі завесамі.* А. Кулакоўскі. **2.** Прызначаны для аднаго, разлічаны на аднаго. *На вузкім адзінарным ложку, што стаіць ля самага акна, ляжыць падрыўнік Кузняцоў — хлопца параніла асколкам міны.* Д. Цябут.

**Ардынарны. 1.** Які нічым не вызначаецца; звычайны, нават пасрэдны. *Кватэра была чысценькая, акуратна прыбрана, абстаўлена ардынарнаю шырпатрэбаўскаю мэбляй.* А. Жук. **2.** У абазначэнні вучоных пасад: ардынарны — штатны, патрэбны па штату; п р о ц і л. экстраардынарны — звышштатны. *У 1901 годзе Карскі быў выбраны членам-карэспандэнтам, а ў 1916 годзе — ардынарным (сапраўдным) членам Расійскай Акадэміі.* М. Булахаў.

**АДМЕННЫ — АДМЕТНЫ**

**Адменны.** Выдатны па сваіх якасцях, самы лепшы; надзвычайны. *Навакол былі выдатныя грыбныя мясціны, дзе раслі адменныя баравікі.* М. Лынькоў.

**Адметны.** Не падобны да іншых; своеасаблівы, непаўторны, характэрны. *На вуглянскіх палетках заўжды нешта адметнае. такое, чаго няма ў іншых.* А. Савіцкі.

**АДРАСАНТ — АДРАСАТ**

**Адрасант.** Той, хто пасылае паштовае адпраўленне. С і н о н і м: адпраўнік. *Прыносіць пісьмы паштальён ад незнаёмых адрасантаў.* Х. Жычка.

**Адрасат.** Той, каму адрасавана паштовае адпраўленне. С і н о н і м: атрымальнік. *Адзін мой ліст вярнуўся назад з прыпіскай, што адрасат выбыў.* С. Шушкевіч.

**АДСТАЛЫ — АДСТАЮЧЫ**

**Адсталы.** Які стаіць на больш нізкім узроўні развіцця, чым іншыя. *Васілёва жаданне пайсці старшынёй такога адсталага калгаса спадабалася райкому.* І. Шамякін.

**Адстаючы.** Які адстае ад каго-чаго-н. *Нягледзячы на тое, што давялося несці на плячах тол і боепрыпасы, адстаючых не было.* І. Мележ.

**АДУКАВАНЫ — АДУКАЦЫЙНЫ**

**Адукаваны.** Які атрымаў шырокую адукацыю, мае рознабаковыя веды; інтэлігентны, культурны, выхаваны. *Ігнат упершыню пачуў з вуснаў адукаванага чалавека пра тое, пра што марылі бедныя аднавяскоўцы яго.* І. Шамякін.

**Адукацыйны.** Звязаны з адукацыяй, асветай, навучаннем. *Кожны настаўнік абавязаны правесці экскурсіі, указаныя ў праграме, улічваючы іх вялікае адукацыйнае і выхаваўчае значэнне. М. Скаткін.*

**АКРАВАК — АКРАЕК — АКРАЕЦ**

**Акравак.** Абрэзак, шматок чаго-н. (скуры, тканіны і г. д.). *Вулічнае акно было заткнута кажушным акраўкам.* В. Вітка.

**Акраек.** Край чаго-н. *У небе з-за гор выплыў ускудлачаны акраек хмары — хутка насоўваўся дождж.* В. Быкаў.

**Акраец.** Кавалак хлеба (пірага, булкі), адрэзаны ад непачатага краю. *На адным канцы століка ляжаў загорнуты ў даматканы абрус акраец хлеба.* Я. Колас.

**АКРУГОВЫ — АКРУЖНЫ**

**Акруговы.** Які мае дачыненне да акругі. *Шукаючы праўды, даўгінаўцы трапілі ажно ў акруговы суд.* А. Бажко.

**Акружны. 1.** Які размешчаны вакол чаго-н. або дзейнічае па акружнасці. *Акружная скорасць кола роўная паступальнай скорасці трактара ДТ-54 на другой перадачы.* М. Аляксейчык. **2.** Кружны,

абходны. *[Міканор] устаў і пайшоў далей акружнай сцежкай.* А. Кулакоўскі.

**АЛЬЯНС — АЛЬЯС**

**Альянс.** Саюз, аб'яднанне на аснове дагаворных абавязацельстваў. *Як сапраўдны бізнесмен, ён здолеў належным чынам ацаніць станоўчыя якасці найсвяцейшага партнёра і выгады, што выплывалі з гэтага альянсу. Я. Галан.*

**Альяс.** Трапічная расліна з тоўстымі прадаўгаватымі калючымі лістамі. С і н о н і м: алоэ. *На падаконніках у гаршчэчках, вялікіх і малых, цэлых і вышчарбленых, вазоны: там раслі бягонія, кактус, герань і альяс.* І. Гурскі.

**АМОНІМ — АНАНІМ**

**Амонім.** Слова, аднолькавае па гучанню з іншым словам, але рознае з ім па значэнню. *Беларуская мова часта з дапамогай тых ці іншых сродкаў пазбаўляецца непажаданых амонімаў.* П. Юргелевіч.

**Ананім.** Аўтар твора (пісьма), які ўтаіў сваё імя; твор без подпісу, невядома кім напісаны. *Вось і ў даным выпадку: ананім правільна піша аб недахопах у рабоце вашага прадпрыемства.* М. Пянкрат.

**АМПЛУА — АМПУЛА**

**Амплуа.** Пэўнае характэрнае кола роляў, якія выконваюцца акцёрам. *«Гэта будзе больш, чым Тальёні, больш, чым Істоміна... і ўсё ж гэта не яе амплуа».* У. Караткевіч.

**Ампула.** Герметычна запаяная шкляная пасудзіна невялікіх памераў, у якой захоўваецца ў стэрыльным выглядзе невялікая доза лякарстваў. *Ампула з глюкозай.*

**АНТАРКТЫЧНЫ — АРКТЫЧНЫ**

**Антарктычны.** Звязаны з паўднёвай палярнай вобласцю зямнога шара. *Колішні раён кітабойнага промыслу — антарктычныя воды.* Цяпер гэты промысел забаронены.

**Арктычны.** Звязаны з паўночнай палярнай вобласцю зямнога шара. *На атамным ледаколе можна лёгка зрабіць запасы паліва для аднаго-, двух- і нават трохгадовага рэйса ў арктычных морах.* «Беларусь».

**АПЕНДЫКС — АПЕНДЫЦЫТ**

**Апендыкс.** Чэрвепадобны адростак сляпой кішкі. *Рэгістратарка пачала супакойваць, гаворачы, што аперацыя лёгкая і вельмі ўжо трывожыцца не трэба. У Амерыцы вунь як народзіцца дзіця, дык яму адразу і апендыкс выразаюць, для прафілактыкі.* В. Хомчанка.

**Апендыцыт.** Запаленне апендыкса. *У бальніцы Сашку агледзеў спачатку адзін доктар, потым другі, параіліся між сабой і сказалі, што хлопчыка трэба класці на аперацыю: у малога апендыцыт.* В. Хомчанка.

**АПЕРАТЫЎНЫ — АПЕРАЦЫЙНЫ**

**Аператыўны.** Здольны хутка і правільна выконваць практычныя задачы; дзейсны. *Нашаму ж часопісу сапраўды патрэбна была аўтамашына для аператыўных выездаў у раёны, для больш непасрэднай сувязі з моладдзю калгасаў і саўгасаў.* А. Кулакоўскі.

**Аперацыйны. 1.** Прызначаны для аперацыі, звязаны з аперацыяй. С і н о н і м: хірургічны. *Калі іх, бацькоў, упусцілі ў аперацыйны пакой,— маці з плачам кінулася да стала.* Я. Брыль. **2.** Прызначаны для непасрэднага, практычнага ажыццяўлення чаго-н.; звязаны з баявымі дзеяннямі. *Чуліся галасы, што наспеў ужо час аб'яднаць усе атрады адзіным аперацыйным цэнтрам, падпарадкаваць баявую дзейнасць усіх атрадаў адзінаму аперацыйнаму плану.* М. Лынькоў.

**АПТЫМАЛЬНЫ — АПТЫМІСТЫЧНЫ**

**Аптымальны.** Найбольш спрыяльны для чаго-н., найбольш адпаведны чаму-н., найлепшы. *Чым бліжэй будуць умовы ўтрымання і кармлення жывёлы да аптымальных, тым больш верагодна на-*

*блізіцца да высокіх паказчыкаў прадукцыйнасці* «Полымя».

**Аптымістычны.** Поўны аптымізму, жыццярадасны. *Развязка «Раскіданага гнязда» глыбока аптымістычная* М. Ярош.

**АРДЫНАРАЦ — АРДЫНАТАР**

**Ардынарац.** Ваеннаслужачы пры камандзіру або пры штабе для сувязі, выканання асобных даручэнняў і асабістых паслуг. *Адным словам, хлопец быў таварыскі, як цяпер кажуць, камунікабельны. Такіх любяць камандзіры і бяруць іх ардынарцамі, пісарамі.* В. Хомчанка.

**Ардынатар.** Доктар бальніцы, клінікі, які лечыць пад кіраўніцтвам загадчыка аддзялення. *Пасля заканчэння медінстытута ён першы год працаваў у паліклініцы ардынатарам.*

**АРЭАЛ — АРЭОЛ**

**Арэал.** *Спец.* Вобласць натуральнага распаўсюджання якога-н. віду, сямейства жывёл, раслін і інш. *Арэал сумчатых з часоў асваення еўрапейцамі Аўстраліі і Амерыкі вельмі зменшыўся.* БелЭн.

**Арэол. 1.** Светлы круг вакол чаго-н., падобны на ззянне. *Высокі слуп святла, што маячыў недзе ўперадзе, пачаў набліжацца, ярчэць, і праз некалькі імгненняў у мігатлівым туманным арэоле весела заблішчала рознакаляровымі агнямі навагодняя ёлка.* В. Палтаран. **2.** *перан* Атмасфера славы, бляску, пашаны, якая акружае каго-што-н. *У першыя хвіліны пакупка дае яму сапраўднае задавальненне, акружае арэолам перавагі над зняслаўленым сапернікам.* Д. Гальмакоў

**АСВЕТЛЕНЫ / АСВЕЧАНЫ — АСВЯТЛЯЛЬНЫ**

**Асветлены.** Які асвятлілі, зрабілі светлым, бачным. *А лес, асветлены і абагрэты сонцам, пазіраў зусім-такі весела.* Я. Колас.

**Асвечаны.** Тое, што і асветлены. *Асвечаныя зарой ствалы сосен чырванеюць, як золата.* В. Хомчанка.

**Асвятляльны.** Прызначаны для штучнага асвятлення. *Белая асвятляльная ракета ўзвілася ўгору.* У. Шахавец.

**АСВЕТНІЦКІ — АСВЕТНЫ — АСВЕЧАНЫ**

**Асветніцкі.** Які мае адносіны да асветніцтва, асветніка. *Ахвярнаю асветніцкаю працай першадрукар [Скарына] узорваў культурную глебу Беларусі пад засеў гуманістычных ідэй, а Гусоўскі вырашыў увесці жыццё Беларусі і гісторыю ў пантэон гуманістычнай культуры Еўропы.* У. Калеснік.

**Асветны.** Які служыць асвеце, адукацыі. *Царскі ўрад прыгнятаў, а часам ліквідаваў мясцовыя школы, тэатры, розныя асветныя ўстановы.* К. Пракошына.

**Асвечаны.** Адукаваны, культурны. *Ну, вядома, на тое паслы пісьменныя, асвечаныя людзі, каб гаварыць усё больш па-кніжнаму.* П. Пестрак.

**АСВОІЦЬ — ЗАСВОІЦЬ**

**Асвоіць. 1.** Навучыцца карыстацца чым-н.; навучыцца выраблядь што-н. *На кожным участку патрэбны былі тапографы, і я даволі скора асвоіў гэту спецыяльнасць.* Ю. Гаўрук. **2.** Уключыць у круг сваёй гаспадарчай дзейнасці; абжыць. *Асвоіць цаліну. Асвоіць фонды.*

**Засвоіць. 1.** Успрыняўшы што-н. новае або чужое, зрабіць прывычным для сябе. *Вучні малодшых класаў павінны добра засвоіць правілы вулічнага руху.* **2.** Добра зразумеўшы што-н., запомніць, вывучыць. *Старанны вучань добра засвоіць курс сярэдняй школы.* **3.** Перапрацаваўшы, увабраць у сябе, спажыць (пра пажыўныя рэчывы). *Расліна засвойвае пажыўныя рэчывы з глебы.*

**АСОБНЫ — АСОБЫ**

**Асобны. 1.** Які вылучаны з шэрагу іншых, існуе асобна побач з іншымі. *Спачатку ў паветры, быццам шэрыя матылі, закружыліся асобныя сняжынкі.* Г. Шчарбатаў.

**2.** Які з'яўляецца самастойнай тактычнай адзінкай, не ўваходзіць у склад больш буйнога вайсковага злучэння. *Асобны танкавы батальён. Асобная брыгада*

**Асобы. 1.** Адметны, не падобны да іншых; асаблівы, свой, толькі яму ўласцівы; індывідуальны. *У Куранях, мабыць, не было такой хаты, якая не мела б рыбалоўнай прылады Прылады гэтыя былі асобыя* І. Мележ. **2.** Які мае спецыяльныя функцыі, спецыяльнае прызначэнне. *Некалькі хлопцаў і Шэўка, выдатны начальнік асобага аддзела, забіты.* Я. Брыль.

**АСТАНКІ — АСТАТКІ**

**Астанкі,** *адз. няма.* Цела нябожчыка; прах. *Радзіма — гэта і той курганок зямлі, дзе ляжаць астанкі бацькоў, дзядоў і прадзедаў.* Б. Сачанка.

**Астаткі. 1.** *адз.* астатак. Нявыкарыстаныя, незрасходаваныя часткі чаго-н., якія засталіся як лішак. *Тады мы падыходзілі да кухні са сваім посудам — хто з бляшанкай, хто з чыгунком ці махоткай,— і повар раздаваў астатак ежы.* І. Чыгрынаў. **2.** *звычайна мн.* Тое, што захавалася, уцалела (ад разбурэння, гібелі і г. д.). *Мільгаюць бярозы — астаткі даўнейшых прысад.* Н. Гілевіч. **3.** *толькі мн.* Адходы якога-н. вытворчага працэсу. С і н о н і м: адкіды. *Хімічная прамысловасць выкарыстоўвае цяпер амаль усе астаткі нафтавай перапрацоўкі.* «Звязда».

**АТАВІЗМ — АТЭІЗМ**

**Атавізм.** Праяўленне ў чалавека, жывёл або раслін такіх прымет, якія былі ўласцівы іх далёкім продкам. *Валасатасць і з'яўленне хваста ў людзей тлумачыцца проста. У навуцы гэта называецца атавізмам, гэта значыць «зваротам да продкаў».* У. Мезенцаў.

**Атэізм.** Адмаўленне існавання Бога, адмаўленне рэлігіі.

**АТЭЛЬ — АТЭЛЬЕ**

**Атэль.** Гасцініца. *Асабліва расчуліла нас дэлегацыя вучняўдзяцей, якія наведаліся да нас проста ў атэль, каб перадаць свае падарункі для нашых дзяцей.* М. Лынькоў.

**Атэлье.** *нескл.* Майстэрня для пашыву адзення, абутку, для рамонту бытавой тэхнікі. *Ёсць у Дуброве некалькі магазінаў, пашывачная майстэрня, атэлье па рамонту прыёмнікаў і тэлевізараў, сталовая, гасцініца.* І. Навуменка.

**АТЭСТАТ — АТЭСТАЦЫЯ**

**Атэстат.** Афіцыйны дакумент аб заканчэнні навучальнай установы, аб прысваенні вучонага звання. *Атрымаўшы атэстат за вучылішча, Захар ясней бачыў дарогу ў інстытут...* В. Карамазаў. **У выразе:** атэстат сталасці — пасведчанне аб заканчэнні сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. *Выпускнікі разам з атэстатам сталасці атрымліваюць пасведчанне шафёра трэцяга класа.* М. Арочка.

**Атэстацыя.** Ацэнка, характарыстыка, якая даецца каму-чаму-н.; прысваенне звання каму-н. *Калі ўсё будзе ў парадку і капітан дасць яму, як некалі абяцаў, добрую атэстацыю, восенню Васіль паступіць на курсы рулявых і з наступнай вясны стане за штурвал.* У. Краўчанка.

**АЎСЮК — АЎСЯНІК — АЎСЯНКА**

**Аўсюк.** Пустазелле, падобнае на авёс. *На вузкай, метры ў тры, палосцы аж да самага лесу, дзе канчалася поле, зелянелі толькі свірэпка, лебяда ды аўсюк.* І. Сіўцоў.

**Аўсянік.** Крылатае насякомае, якое жыве ўсяго некалькі дзён. С і н о н і м: падзёнка. *Рыба цяпер лепш бярэцца на аўсянікаў.* Я. Колас.

**Аўсянка.** Невялічкая пеўчая птушка з атрада вераб'іных, якая корміцца пераважна насеннем раслін. *Такавалі на золку чырванабровыя цецерукі, весела распявалі ў за-*

*раснiках жаўтагрудыя аўсянкі. звонка звінелі ў небе жаваранкі.* Р. Ігнаценка.

**АЎТАБІЯГРАФІЯ — БІЯГРАФІЯ**

**Аўтабіяграфія.** Апісанне свайго жыцця. *Успамінаючы сваё маленства, К. Чорны гаворыць у аўтабіяграфіі «Гэта быў жудасны час»* М. Луферaў. Н я п р а в і л ь н а *Янка Купала ў сваёй аўтабіяграфіі (трэба. у аўтабіяграфіі) у 1928 годзе адзначаў, што ён з захапленнем чытаў творы М. Горкага* М. Ларчанка.

**Біяграфія.** Апісанне жыцця і дзейнасці каго-н. *Відаць, трэба пісаць перш за ўсё аб тым, што асабліва дарагое душы, што яе хвалявала і хвалюе,— што стала дарагой часткай тваёй асабістай біяграфіі.* І. Мележ.

**АЎТАРЫТАРНЫ — АЎТАРЫТЭТНЫ**

**Аўтарытарны.** *Кніжн.* Заснаваны на безагаворачным падпарадкаванні ўладзе, аўтарытэту. *Аўтарытарны рэжым.*

**Аўтарытэтны.** Які карыстаецца аўтарытэтам; які заслугоўвае аўтарытэт. *Калі ў перакладчыкаў на беларускую мову ўзнікалі цяжкасці, парада П. Глебкі была для іх самай аўтарытэтнай.* Р. Шкраба.

**АЎЧАРКА — АЎЧАРНЯ**

**Аўчарка.** Парода дужых вартавых сабак, якія звычайна выкарыстоўваюцца для аховы статкаў, для каравульнай службы. *Чакаючы і баючыся новай пагоні, Іван ускочыў быў у ручай, каб схаваць ад аўчарак след.* В. Быкаў.

**Аўчарня.** Хлеў для авечак. *Сцяну калгаснай аўчарні абвіў хмель: тут яго многа садзілі каля хат і платоў.* К. Чорны.

**АФЕКТЫЎНЫ — ЭФЕКТЫЎНЫ**

**Афектыўны.** Павышанаэмацыянальны, празмерна ўсхваляваны. *У пачатку афектыўнага стану чалавек не можа не думаць аб прадмеце свайго пачуцця і аб тым, што звязана з ім, міжвольна адхіляючыся ад усяго пабочнага. нават практычна важнага.* Псіхалогія.

**Эфектыўны.** Які прыводзіць да пажаданых, патрэбных вынікаў, дзейсны. *Індывідуальныя заданні з улікам ролі чытання і ролі літаратуразнаўчага аналізу могуць быць эфектыўнымі толькі на падставе добрага ведання канкрэтнай абстаноўкі.* «Народная асвета».

**АШЫЕК — АШЫЙНІК**

**Ашыек.** Частка мясной тушы, сумежная з шыяй. *Курыца млява трапянула крылом, асела назад, і з кароткага ашыйка ў яе выціснулася палахлівай кропляй, а пасля цурком пацякла цёплая кроў* Я. Скрыган.

**Ашыйнік.** Раменьчык з засцежкай, які надзяваецца жывёле на шыю. С і н о н і м ы: нашыйнік, аброжак. *Іван у апошняе імгненне паспеў схапіць ваўкадава за ашыйнік і ў амаль нечалавечым напружанні рук не даў сашчапіцца на сабе ягоным зубам.* В. Быкаў.

## Б

**БАЕЧНЫ — БАЙКАВЫ**

**БАЕЧНЫ.** Які мае адносіны да байкі — кароткага твору алегарычнага характару. *У беларускай літаратуры ўжо склалася пэўная баечная традыцыя.* Я. Казека.

**Байкавы.** Які мае адносіны да байкі — мяккай варсістай тканіны; зроблены з такой тканіны. *На двух'ярусных нарах узвышаліся туга набітыя сеннікі, засланыя байкавымі коўдрамі.* М. Даніленка.

**БАРЭЛЬЕФ — ГАРЭЛЬЕФ**

**Барэльеф.** Від скульптуры, у якой фігура выступае з плоскасці менш чым на палавіну свайго аб'ёму. *На мінскіх Вайсковых могілках, сярод кучаравых шумлівых сосен, дзе пахаваны паэт, на шэрым магільным камені — скульптурны барэльеф Паўлюка Труса.* М. Хведаровіч.

**Гарэльеф.** Від скульптуры, у якой фігура выступае з плоскасці больш чым на палавіну свайго аб'ёму. *Асабліва спадабалася хлопчыку на плошчы Перамогі. Ён не мог адарваць позірку ад помніка. на гарэльефе якога група партызан на чале са сваім камандзірам разбірае чыгуначнае палатно.* «Звязда».

**БАЦЬКАЎСКІ — БАЦЬКОЎСКІ**

**Бацькаўскі.** Які належыць, уласцівы бацьку. *Асвянцімскі пайшоў шукаць месца, дзе калісьці стаяла бацькаўская хата.* К. Чорны.

**Бацькоўскі. 1.** Які мае адносіны да бацькоў — бацькі і маці. *Даклад зацікавіў людзей, памог устанавіць шчыры і дзелавы кантакт з бацькоўскім калектывам.* І. Шамякін. **2.** *перан.* Клапатлівы; ласкавы. *Незнаёмы паглядзеў на мяне цёплымі, бацькоўскімі вачамі.* З. Бядуля.

**БЕЛІЗНА / БЕЛЬ — БЯЛІЗНА**

**Белізна.** Яркі, белы чысты колер чаго-н. *Беларусу і ў Парыжы сняцца белізна бяроз і сосен медзь.* П. Панчанка.

**Бель.** Тое, што і белізна. *Снежная пустэча. Бель у вочы коле... І адна бяроза — вартаўніца поля.* Д. Бічэль-Загнетава.

**Бялізна.** Нацельнае адзенне, а таксама вырабы са светлай тканіны для бытавых патрэб (ручнікі, прасціны, абрусы і г. д.). *Маці хадзіла таксама на падзённую работу· то мыла чужую бялізну, то падлогі, то прыбірала двары ў багатых дамах.* М. Лынькоў.

**БЕСКАРЫСЛІВЫ — БЕСКАРЫСНЫ**

**Бескарыслівы.** Які не імкнецца да асабістай карысці, выгады. *У гісторыі славянскіх літаратур цяжка знайсці прыклад больш трывалай, высакароднай і бескарыслівай дружбы, чым дружба Міцкевіча і Чачота.* А. Мальдзіс.

**Бескарысны.** Які не прыносіць карысці. С і н о н і м ы: дарэмны, марны. *Даўно ўжо кінуў Сымон пісаць заявы ў розныя інстанцыі — гэта была бескарысная работа.* Э. Самуйлёнак. Н я п р а в і л ь н а: *Бліжэй за ўсіх у гэтую пару яму стаў Іваноў з яго бескарыснай (трэба: бескарыслівай) самаадданай душой, з яго фанатычнай прыхільнасцю да мудрасці і праўды.* В. Быкаў.

**БЕСПЯРЭЧНЫ — БЯССПРЭЧНЫ**

**Беспярэчны.** Які выконваецца без пярэчанняў. С і н о н і м: безагаворачны. *Беспярэчнае выкананне загада.*

**Бясспрэчны.** Які не выклікае пярэчанняў, спрэчак. С і н о н і м ы: несумненны, відавочны. *Бясспрэчная ісціна.*

**БІБЛІЯТЭКАРСКІ — БІБЛІЯТЭЧНЫ**

**Бібліятэкарскі.** Які мае адносіны да бібліятэкара. *Бібліятэкарская вучоба. Бібліятэкарскі столік.*

**Бібліятэчны.** Які мае адносіны да бібліятэкі; які належыць бібліятэцы. *Бібліятэчны факультэт. Бібліятэчны абанемент.*

**БОЙЛЕР — БРОЙЛЕР**

**Бойлер.** Апарат для падагрэву вады. *Пашыраныя водападагравальнікі паверхневага тыпу (бойлеры), у якіх цяпло перадаецца праз паверхню нагрэву трубчастых ці іншых элементаў.* БелЭн.

**Бройлер. 1.** Кураня, якое вырошчваецца на мяса. *У апошні час пачала развівацца вытворчасць мясных куранят-бройлераў.* «Звязда». **2.** Памяшканне, у якім вырошчваюць такіх куранят. *Адразу з інкубатара куранят пераводзяць у бройлер.* «Звязда».

**БОЦМАН — ЛОЦМАН**

**Боцман.** Малодшы камандзір (старшына), якому падначалена каманда карабля па гаспадарчых работах, утрыманню судна ў чысціні і парадку. *Падабраў мне боцман гарнітур па росту — крэпкую марскую робу з палатна.* Х. Жычка.

**Лоцман.** Праваднік суднаў, дасканала знаёмы з воднымі шляхамі. *Самуіл і яго сябры здолелі правесці карабель там, дзе не пра-*

*веў бы яго самы спрактыкаваны лоцман* «Полымя».

**БРАНЯ — БРОНЬ**

**Браня. 1.** У старадаўнасці ахоўнае металічнае адзенне воіна — панцыр, латы, кальчуга. *Будзе на гравюрах Скарыны ўсё: будуць стаяць у яго на гравюрах ваякі з мячамі ў руках, будуць яны маршыраваць у яго з алебардамі, пікамі і сцягамі ў руках, будуць скакаць, закутыя ў панцыры на абцяжараных бранёй конях*.. А. Лойка. **2.** Стальная абшыўка танка, баявога карабля, бронецягніка. *У машыне было душна. Браня, напаленая сонцам, пякла, гарачынёй дыхаў матор, што напружана гуў за баявым аддзяленнем.* І. Мележ.

**Бронь.** Замацаванне за кім-н. якіх-н. прадметаў або асобых правоў і льгот; дакумент на такое замацаванне. *У армію Цярэшку не мабілізавалі, — як чыгуначніку далі бронь.* А. Капусцін.

**БРЫДЖЫ — БРЫЖЫ**

**Брыджы.** *адз. няма.* Штаны асобага крою, звужаныя ўніз ад калена. *Шарсцяная армейская гімнасцёрка і брыджы, пашытыя па яго заказу, як заўсёды, добра аблягалі ладную постаць.* І. Мележ.

**Брыжы.** *адз. няма.* Вузкія палоскі тканіны, сабраныя ў зборачкі і нашытыя на адзенне. *Я хадзіў у шынялі, а для Алі справілі паўкажушок і зваляплі зграбныя чорныя «пімікі», з абцасамі і тоўстымі насамі, каб не мерзлі пальцы, купілі гаматную з брыжамі клятчастую хустку і прывыкалі да лютай сібірскай зімы.* С. Грахоўскі.

**БУЛЬБОЎНІК / БУЛЬБЯНІК — БУЛЬБЯНІШЧА**

**Бульбоўнік.** Лісце і сцябло бульбы. Сінонім: націна. *А ў полі пастухі палілі бульбоўнік і пырнік і, калі асядала магутнае, шыпучае полымя, пяклі ў прыску салодкую духавітую бульбу.* Я. Брыль. Няправільна: *Выбраліся з лесу, пайшлі па бульбоўніку (трэба: па бульбянішчы) да хутара.* В. Хомчанка.

**Бульбянік. 1.** Тое, што і бульбоўнік. *Выраслы бульбянік закрываў малога амаль да плеч* І. Мележ. **2.** Аладка з дранай бульбы. *Перабіваліся яны бедныя з бульбяніка на квас.* І. Шамякін.

**Бульбянішча.** Месца, на якім расла бульба. *Ночы былі свежыя, з пахам сухога бульбоўніку, зляжалага сена з хлявоў і позна пераранага бульбянішча.* І. Пташнікаў.

**БУРАН — БУРУН**

**Буран.** Моцны вецер, які паднімае хмары сухога снегу ці пяску; снежная бура, завея, завіруха. *Пераскочыць зверху пясчаны буран не ўдасца: самалёт не падымаецца на такую вышыню.* У. Шыцік.

**Бурун.** Пеністыя хвалі, якія з вялікім шумам разбіваюцца аб прыбярэжныя і падводныя скалы, вобмелі. *Па рацэ, напінаючы тросы, паўзуць рудавозы і баржы, гружаныя набраклымі кругляками, з трэскам імчацца вёрткія маторкі ў бурунах вясёлкавых пырскаў.* С. Грахоўскі.

**БЭЖ — БЭЗ**

**Бэж.** Светла-карычневы колер з жаўтавата-ружовым адценнем; бэжавы. *Светлым лічыцца абутак бэж і светла-шэрага колеру.* Таваразнаўства.

**Бэз.** Дэкаратыўны кустарнік з ліловымі ці белымі духмянымі кветкамі. *Домік стаяў за агародчыкам, сярод кустоў бэзу і кветак.* Я. Скрыган.

**БЯДАК — БЯДНЯК**

**Бядак.** *Разм.* Той, хто пастаянна гаруе, бяздольны; няшчасны, варты спачування і жалю. *Не было другога чалавека ва ўсім Ліпаўцы, так бедна адзетага і наогул такога горкага бедака, як гэты стаяр Пятро.* Я. Колас.

**Бядняк.** Бедны чалавек; небагаты. *Ураднік, старшыня, стражнік, поп, нават дзесяцкія — усе агулам глумяцца з бедняка.* Ц. Гартны.

**БЯЛУГА — БЯЛУХА**

**Бялуга.** Каштоўная прамысловая рыба, самая буйная з сямейства асятровых. *Цяжка пра гэта*

*успамінаць, можа, каму яшчэ цяжэй паверыць, але ў 1909 годзе ў Дняпры каля Магілёва можна было злавіць асятра і бялугу.* В. Лапцік.

**Бялуха.** Палярны дэльфін, які ў дарослым стане мае белую афарбоўку. *Бялуха таму і названа так, што яна белая.*

# В

**ВАВЁРКАВЫ — ВАВЁРЧЫН**

**Вавёркавы.** Зроблены са шкурак вавёркі. *Вавёркавая шапка. Вавёркавае футра.*

**Вавёрчын.** Які мае адносіны да вавёркі, належыць вавёрцы. *Ад вострых вавёрчыных зубак чулася шкрабаценне, быццам дзесьці ў запечку гаспадарылі мышы. Вавёрчына мызка пацешна варушылася.* І. Грамовіч.

**ВАДКАСНЫ — ВАДКІ**

**Вадкасны.** Які мае адносіны да вадкасцей. *Вадкасныя манометры.*

**Вадкі.** Які знаходзіцца ў стане вадкасці, здольны цячы. *Вадкі метал. Вадкае паліва.*

**ВАЖАК — ВАЖАТЫ**

**Важак. 1.** *Высок.* Кіраўнік, арганізатар. *Юнакі і дзяўчаты аднадушна прызналі .. [Сашу] сваім важаком.* І. Новікаў. **2.** Павадыр статка, чарады. *Здавалася, буслы свецяцца ў цемры. Вось адзін з іх, пэўна, важак. узляцеў, шырока махаючы крыламі. За ім узняліся ў вечаровае неба іншыя.* Л. Дайнека.

**Важаты.** Кіраўнік піянерскага атрада, дружыны. *Па камандзе старшай важатай сцяганосцы вынеслі сцяг дружыны.* А. Якімовіч.

**ВАКАЛІЗ — ВАКАЛІЗМ**

**Вакаліз.** *Муз.* Практыкаванне для голасу без слоў, якое выконваецца на адных галосных гуках. *Калі спектакль сышоў са сцэны, п'еса пастарэла, многія спрабавалі выконваць вакаліз у канцэртах. Але ён не гучаў. Ён быў напісаны для адзінага голасу.* Г. Ланеўская.

**Вакалізм.** *Лінгв.* Сістэма галосных гукаў. *Вакалізм беларускай мовы.*

**ВАКСАВАЦЬ — ВАСКАВАЦЬ**

**Ваксаваць.** *што.* Чысціць абутак, змазаўшы ваксай. *Сёмка старанна ваксаваў свае хромавыя боты.* П. Кавалёў.

**Васкаваць.** *што.* Націраць, насычаць што-н. воскам. *Васкаваць паркет. Васкаваць ніткі.*

**ВАЛАВЫ — ВАЛОВЫ**

**Валавы.** Агульны, узяты цалкам (без уліку расходаў). *Валавы збор збожжа. Валавы даход.*

**Валовы.** Які мае адносіны да вала; такі, як у вала. *Валовая галава. Валовая шыя.*

**ВАНДАЛ — ВАРВАР**

**Вандал. 1.** *толькі мн.* Старажытнагерманскае племя, якое заваявала частку Рымскай імперыі і бязлітасна разграбіла Рым. *Многа бачылі стромы ракі на вяку — стругі ворагаў грозных, шаломы вандалаў.* В. *Лукша.* **2.** Той, хто разбурае культурныя каштоўнасці; варвар; некультурны, грубы чалавек. *Мы бясконца ўдзячны сваім бацькам, старэйшым братам, сёстрам, жывым і мёртвым, што ў тое векапомнае лета 1944 года вызвалілі ад фашысцкіх вандалаў нашу любімую сінявокую старонку.* М. Вышынскі.

**Варвар. 1.** *Гіст. пагард.* Так старажытныя грэкі і рымляне называлі суседнія з імі народы, якія стаялі на ніжэйшай ступені развіцця. *Але не надта слухаў тое чытанне Алекса, хаця і гаварылі ў святліцы, што напісаў кнігу вучоны грэк, Георгій Амартол; невыразна, суха чытаў лектар, і на твары ягоным была напісана нудота, нібы рабіў ён вялікую ласку тым, што ўвогуле згаджаўся нешта тлумачыць навакольным варварам.* В. Іпатава. **2.** Некультурны, неадукаваны чалавек; жорсткі, бязлітасны чалавек. *Фашысцкія*

*варвары нанеслі беларускаму народу агульную матэрыяльную страту на суму 75 мільярдаў рублеў* А. Жаўнерчык.

**ВАНДРОЎНІЦКІ — ВАНДРОЎНЫ**

**Вандроўніцкі.** Уласцівы вандроўніку, звязаны з вандроўніцтвам. *Вандроўніцкае жыццё. Вандроўніцкі характар.*

**Вандроўны. 1.** Які часта пераходзіць, пераязджае з месца на месца, які працуе не на пастаянным месцы. *Вандроўны тэатр. Вандроўны кравец.* **2.** Тое, што і вандроўніцкі. *Вандроўная натура. Вандроўнае жыццё.* **3.** Які не мае аселасці, вандруе з месца на месца; качэўны. *Тут яшчэ вялікі кіеўскі князь Уладзімір на ўсіх стэпавых рачулках будаваў крэпасці, каб стрымаць пастаянны бязлітасны напор вандроўных орд.* Л. Дайнека.

**ВЕНТЫЛЬ — ВЕНТЫЛЯТАР**

**Вентыль.** Клапан для рэгулявання патоку вадкасцей, пары, газу (паветра ў духавых музычных інструментах). *Чалавек трымаў на вентылі шланг, а я зноў пачаў напампоўваць.* А. Кулакоўскі.

**Вентылятар.** Прыстасаванне для праветрывання памяшкання. *Маўчала настарожаная зала. Было чуваць узрушанае дыханне людзей ды ціха гудзеў у сцяне вентылятар.* М. Лынькоў.

**ВЕРАСНЁВЫ — ВЕРАСОВЫ**

**Вераснёвы.** Які мае адносіны да месяца верасня. С і н о н і м: вераснёўскі. *Дзед Пранук, усеўшыся дзе-небудзь у зацішным кутку, флегматычна пакурваў сваю люльку ды ямчэй падстаўляў пад скупое верасневае сонца свой сухарлявы твар.* М. Лынькоў.

**Верасовы.** Які мае адносіны да расліны верасу. С і н о н і м: верасавы. *Сядзе пчолка на верасовую галінку, гайдаецца, пасля нахіне яе аж да самай зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крыльцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, як памерла — п'е* І. Пташнікаў.

**ВЕЧАРЭЦЬ — ВЯЧЭРАЦЬ**

**Вечарэць.** *безас* Блізіцца к вечару. *Я доўга не бачыў цябе і, як толькі пачало вечарэць, заспяшаўся да тае альтанкі.* Я. Скрыган.

**Вячэраць.** Есці ежу вечарам. *У хатах не запальвалі святла. Моўчкі вячэралі, моўчкі рабілі хатнія справы і клаліся спаць* Л. Дайнека.

**ВІРАЖ[1] / ВІРАЖ[2] — ВІТРАЖ**

**Віраж[1]. 1.** Паварот з крэнам самалёта, карабля або паварот па крывой аўтамабіля, веласіпеда і г. д. *Гэтак жа, як і яна, умеў захапляцца: мог гадзінамі расказваць пра самалёты, віражы, мёртвыя петлі.* І. Навуменка. **2.** Паварот спартыўнай дарожкі з нахілам унутр. *Бывае, што ў часіну адпачынку канькі і пада мною зазвіняць, і хочацца цыбатую дзяўчынку на віражы дагнаць і перагнаць.* С. Грахоўскі.

**Віраж[2].** Раствор для апрацоўкі фотаадбіткаў. *Віражы служаць для таніравання фотаздымкаў у розныя колеры.* Таваразнаўства.

**Вітраж.** Узор у вокнах, дзвярах са шкла featured рознага колеру. *Аддзелка кінатэатра яшчэ не зусім закончана. У хуткім часе тут з'явяцца каляровыя вітражы, арнаментальныя ўпрыгожанні, светлавая рэклама.* «Звязда».

**ВОКЛІК — ВОКЛІЧ — ВОКРЫК**

**Воклік.** Слова, якім аклікаюць, выгук. *Пасля яшчэ аднаго вокліку чалавек на дрэве абазваўся і сказаў, што ён як ёсць свой.* А. Кулакоўскі.

**Вокліч.** Гучны выкрык; гучнае ўсхваляванае аклiканне. *Вокліч прагучаў ледзь не каля самага майго вуха і вывеў мяне з задумення.* М. Ткачоў.

**Вокрык.** Рэзкі гучны вокліч з загадам, папярэджаннем, пагрозай каму-н.; слова-загад, пагроза. *Неўзабаве разгублена заякатаў сабака, пачуўся строгі гаспадарскі вокрык, нейкая нягучная кароткая фраза, і ен зразумеў, што сабакі згубілі след.* В. Быкаў.

**ВУЖ — ВУЖАКА**

**Вуж.** Адна з неядавітых змей сямейства паўзуноў. *Старыя вужы, скруціўшыся ў клубок, ляжалі, блішчалі на цёплых пнях, як срэбныя талеркі.* Л. Дайнека.

**Вужака.** *Разм.* Змяя, гадзюка. *Мяне апанаваў не проста страх, а страх, змешаны з невымоўнаю гідлівасцю; кшталт таго страху я перажыў нядаўна ў лесе, убачыўшы на альховай галіне над галавою клубок вужакаў.* У. Арлоў.

**ВУЧАНЫ — ВУЧОНЫ**

**Вучаны.** Такі, якога навучылі чаму-н.; абучаны, навучаны. *А раніцай прыляцеў у балотны гарадок голуб. Усе адразу здагадаліся, што птушка ручная, вучаная чалавекам.* Л. Дайнека.

**Вучоны. 1.** Які набыў спецыяльную падрыхтоўку ў галіне якіх-н. ведаў; спецыяліст у якой-н. галіне навукі; даследчык. *Партызан з першага ж дня падабаўся Маеўскаму сваёй эрудыцыяй вучонага і дапытлівасцю разведчыка.* І. Шамякін. ІІ *Разм. Дрэсіраваны (пра жывёл). Вучоны мядзведзь.* **2.** Які мае адносіны да навукі, звязаны з навукай. *Вучоны савет. Вучоная ступень.*

**ВЫВАДАК — ВЫВАДКА**

**Вывадак.** Чародка звяроў або птушак адной маткі. *У густой лістоце дрэў аж заходзіліся ад шчабятання маладыя вераб'іныя вывадкі.* І. Дуброўскі.

**Вывадка.** Вывад коней для агляду ці размінкі. *Ранішняя вывадка стаенніка.*

**ВЫГАДА — ВЫГОДА**

**Выгада.** Карысць, прыбытак; разлік. *Да людзей у хаты ён [брыгадзір] ніколі не заходзіў, каб не сказалі, што п'е ці мае нейкую выгаду.* У. Дамашэвіч.

**Выгода.** Усё, што задавальняе максімальныя запатрабаванні, чым зручна карыстацца; прыволле. *Кювет зарос густой травою. На выгодзе яна пабуяла. Цяпер яе не выкошваў чалавек, не скубла і не клычыла жывёла.* М. Аўрамчык.

**ВЫПАД — ВЫПАДАК**

**Выпад. 1.** *Спарт.* Рэзкі рух уперад з апорай на выстаўленую нагу. *Чаратун усхапіўся на калені і зрабіў выпад рукою, нібы хацеў прапароць мяне шпагаю.* П. Місько. **2.** Варожае выступленне, нядобразычлівая выхадка. *Сярод гэтых «перамешчаных», мы ведалі, ёсць злачынцы, ворагі, гатовыя на ўсякі выпад.* І. Мележ.

**Выпадак. 1.** Тое, што здарылася; здарэнне; факт, з'ява. *Усе ёю цікавіліся, а яна не хацела бясконца расказваць пра той няшчасны выпадак.* І. Грамовіч. **2.** Пэўныя абставіны, стан рэчаў. *І от здарыўся выпадак, які парушыў нечакана спакой і ў нашым службовым жыцці і ў жыцці Марыны.* Я. Скрыган. **3.** Зручны момант. *Дзед любіў пры зручным выпадку ўжыць навуковае слова.* М. Лынькоў.

**ВЫСЕЎ — ВЫСЕЎКІ**

**Высеў.** Тое, што высяваюць, колькасць высеянага. *Норма высеву на гектар.*

**Высеўкі,** *адз. няма.* Адсеянае пры прасейванні. *Высеўкі высыпалі на зямлю курам.*

**ВЫТВОРНЫ — ВЫТВОРЧЫ**

**Вытворны.** Утвораны ад іншай формы, велічыні і г. д. *Асновы, якія складаюцца толькі з адной карэннай марфемы, называюцца невытворнымі, асновы ж, у склад якіх уваходзіць больш за адну марфему, называюцца вытворнымі.* Граматыка беларускай мовы.

**Вытворчы. 1.** Які мае адносіны да вытворчасці. *Вытворчыя планы пачалі перавыконвацца.* К. Чорны. **2.** Які займаецца вытворчасцю, вырабам чаго-н. *Вытворчыя майстэрні вучылішча размяшчаюцца ў дрэваапрацоўчым цэху завода.* М. Даніленка.

**ВЯНЕЦ — ВЯНОК**

**Вянец. 1.** Карона, якую трымаюць над галовамі маладых у час вянчання ў царкве. *Яблыні яшчэ не распусціліся, а вішні, слівы і грушы стаялі белыя, як дзяўчаты*

*пад вянцом* У. Дамашэвіч. **2.** *Уст.* Каштоўны галаўны ўбор — сімвал царскай улады; карона. *Халоднае золата старога вянца лягло на лоб.* У. Караткевіч. **3.** *перан.* Апошняя, вышэйшая ступень, верх чаго-н. *Думка застаецца думкай. Вянцом яе заўсёды з'яўляецца справа.* М. Гамолка. **4.** Кожны рад бярвен у зрубе, вянок *(у 2 знач.). Цяпер і самому не верыцца, што за лета паставіў хату. Сцены, пакуль мог дацягнуцца, складаў сам, апошнія вянцы памог сусед па забудове...* С. Грахоўскі.

**Вянок. 1.** Упрыгожанне з кветак або галінак, сплеценае ў выглядзе круга. *Зажурыліся дзяўчаты з дзеразовымі вянкамі на руках.* М. Лынькоў. **2.** Кожны рад бярвён у зрубе; вянец *(у 4 знач.). Неўзабаве агонь ужо абгрызаў аголеныя краты крокваў і латаў, што з трэскам абвальваліся ў сярэдзіну зруба пасля таго, як* полымя *салодка лізнула верхнія вянкі бярвення.* М. Аўрамчык.

# Г

## ГАЗ — ГАЗА

**Газ.** Агульная назва гаручых газападобных ці парападобных рэчываў, якія скарыстоўваюцца для ацяплення, асвятлення і інш. *Газ — цудоўнае паліва. Ён з поспехам можа замяніць вугаль, дровы, нафту* «Беларусь».

**Газа.** Гаручая вадкасць, якая атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты. Сінонім: карасіна. *Газа была не чыстая, святла давала мала, капцела многа.* І. Новікаў.

## ГАЙДАМАК — ГАЙДУК

**Гайдамак. 1.** Удзельнік народнавызваленчай барацьбы на Правабярэжнай Украіне і поўдні Беларусі супраць польска-шляхецкага прыгнёту ў 18 ст. *Сяляне і казакі, якія ўдзельнічалі ў гэтых паўстаннях, атрымалі назву гайдамакаў.* Гісторыя Беларусі. **2.** Салдат контррэвалюцыйных атрадаў на Украіне ў часы грамадзянскай вайны. *І вось разбіты гайдамакі, Пятлюра ледзь уцёк.* П. Броўка.

**Гайдук.** Слуга, выязны лакей багатага памешчыка ў часы прыгону. *Апоўдні пачуліся свіст бізуноў, грукат конскіх капытоў — імчаліся па вуліцы панскія гайдукі. М. Лупсякоў.*

## ГАЛАВЕШКА — ГАЛАЎНЯ

**Галавешка.** Абгарэлы кусок дрэва. *Печ ярка палала, дагаралі апошнія галавешкі — аж пякло ёй у плечы. а цеста на руках яе засыхала і лушчылася.* У. Дамашэвіч.

**Галаўня.** Хвароба збожжавых злакаў, пры якой зерне ператвараецца ў пыл або ў цвёрдую чорную нарасць. *Жытні колас з галаўнёй.*

## ГАЛАНТАРЭЙНЫ — ГАЛАНТНЫ

**Галантарэйны.** Які мае адносіны да галантарэі — дробных прыналежнасцей туалету (пальчатак, гальштукаў, гузікаў, нітак і г. д.). *Дзяўчына несла ў кошыку пісталет, патроны або гранаты, прыкрытыя зверху няхітрым галантарэйным наборам.* Я. Брыль.

**Галантны.** Вытанчана ветлівы, ласкавы, далікатны ў абыходжанні. *Ён прыціснуў левую руку да грудзей, схіліў галаву ў галантным паклоне.* Я. Васілёнак.

## ГАЛАЎНЫ — ГАЛОЎНЫ

**Галаўны. 1.** Які мае адносіны да галавы. *Дадому ён прыйшоў разбіты, з галаўным болем. Хацелася легчы ў ложак, выклікаць урача.* І. Шамякін. **2.** Які ідзе ўперадзе чаго-н.; перадавы. *Наперадзе, крокаў за трыста ад яго, ехалі тры коннікі — галаўныя дазорныя.* М. Ткачоў.

**Галоўны. 1.** Самы важны, асноўны, найбольш істотны. *Ужо вечарэла, калі галоўныя часці паказаліся на дарозе.* М. Лынькоў. **2.** Старшы па службоваму становішчу. *Алёна Зайчук была галоўным урачом партызанскага атрада.* І. Шамякін.

**ГАЛЕРА — ГАЛЕТА**

**Галера.** Вялікае драўлянае мнагавесельнае ваеннае судна (да пачатку 19 ст.). *Вясной 1696 г., на здзіўленне турак, пад Азовам паявіўся рускі флот з трыццаці галер і вялікай колькасці транспартных суднаў і лодак.* Гісторыя Расіі.

**Галета.** Плоскі тонкі сушаны праснак для паходных умоў. *Ён дастае з шафкі і стаўляе на стол масла, галеты, вараную рыбу.* Я. Бяганская.

**ГАНТАЛЬ — ГАНТЭЛЬ**

**Ганталь.** Цвік, якім прыбіваюць гонту. — *На выбар, браток Іван Іванавіч, можна і ганталёў выбраць.* І. Грамовіч.

**Гантэль.** Гімнастычная гіра ў выглядзе двух чыгунных шароў, злучаных круглым кароткім дзяржаннем. *Да глыбокай восені Рыгор займаўся гімнастыкай на турніку, гантэлямі і абліваўся халоднай вадой.* Я. Рамановіч.

**ГАРБАР — ГРАБАР**

**Гарбар.** Работнік, які займаецца апрацоўкай і вырабам скур. *Бацька Вользін быў гарбар, з сям'і патомных мінскіх гарбароў, якія ў далёкія часы выраблялі скуры саматужна...* І. Шамякін.

**Грабар.** Рабочы на земляных работах. С і н о н і м: землякоп. *Доўга ці коратка жыў так грабар, але нарэшце абрыдла яму штодня капаць дол.* Р. Шкраба.

**ГАРЫСТЫ — ГОРНЫ — ГОРСКІ**

**Гарысты.** Пакрыты гарамі, узвышшамі. *Па ручаі між зарасніку мы выйшлі ў гарысты лес.* Р. Няхай.

**Горны. 1.** Які мае адносіны да гор. *Стала так ціха, што здавалася — ручай грыміць, як горны вадапад.* Э. Самуйлёнак. **2.** Які мае адносіны да распрацоўкі зямных нетраў. *Некалькі год назад прывезлі на шахту першы горны камбайн.* А. Кулакоўскі.

**Горскі.** Які мае адносіны да горцаў — жыхароў гор. *Горскія плямёны.*

**ГЛУШАК — ГЛУШЭЦ**

**Глушак.** *Абл.* Глухі чалавек; глушэц *(у 2 знач.). Размаўляючы, глушак заўсёды крычыць, бо сам не ўсё чуе.*

**Глушэц. 1.** Вялікая лясная птушка сямейства цецерукоў. *Глушэц такуе на досвітку. Ён, такуючы, нічога не заўважае вакол і не чуе, акрамя свайго спеву. Нездарма ў народзе яго назвалі глушцом.* А. Курскоў. **2.** *Разм.* Глухі чалавек; глушак. *Стары крыўдзіўся, калі яго называлі глушцом.*

**ГОНАЧНЫ — ГОНЧЫ**

**Гоначны.** Прызначаны для гонак. *Гоначная лодка. Гоначны аўтамабіль.*

**Гончы.** Шпаркі ў бегу, прывучаны гнаць звера (пра пароду паляўнічых сабак). С і н о н і м: ганчак. *І пайшлі аднойчы мы на высокі груд з выжламі і гончымі — паглядзець на цуд.* П. Глебка.

**ГОРАН — ГОРН**

**Горан.** Спецыяльная печ з мяхамі і паддувалам для награвання металу ў кузні; печ для абпальвання керамічных вырабаў. *У кузні пры майстэрні гулка стукаў механічны молат і гудзеў горан.* І. Шамякін.

**Горн.** Духавы медны музычны інструмент для падачы сігналаў. *Прагучаў горн. Ён клікаў нас на першую ў гэтым годзе лінейку.* Я. Бяганская.

**ГРАМ — ГРАН**

**Грам.** Адзінка вагі ў метрычнай сістэме мер, роўная вазе аднаго кубічнага сантыметра вады; тысячная доля кілаграма. *Дзед Вячэра ўжо аж надта прывык да гэтай куплі на вока: ён памыляўся толькі на грамы.* Я. Брыль.

**Гран.** Адзінка аптэкарскай вагі, роўная 0,062 грама (звычайна ў выразе: ні грана — ніколькі, зусім нічога). *Купалаўскае асэнсаванне былога не мела ў сабе ні грана музейнага рэстаўратарства.* Р. Бярозкін.

**ГРОГ — ГРОТ¹ / ГРОТ²**

**Грог.** Моцны напітак з каньяку або рому, разбаўленых салодкай гарачай вадой. *Здзіўлены перашэпт ззаду — столік, вядома, шчыльна абкружаны — асалода штабс-капітану. Як келіх гарачага грогу пасля цяжкага зімовага пераходу.* У. Мехаў.

**Грот¹.** Штучная або натуральная пячора. *Пятрусь пражыў у Артэку многа дзён. Ён мог бы з завязанымі вачыма знайсці цудоўны грот Пушкіна.* М. Даніленка.

**Грот².** Ніжні вялікі парус на грот-мачце — самай высокай мачце на парусных суднах. *Я загадаў ставіць грот, і парус пачаў падымацца.* Б. Жыткоў.

**ГРОШ — ГРОШЫ**

**Грош.** Даўнейшая медная манета ў Расіі з 1657 да 1917 г. (да 1838 г. двухкапеечная, а пасля паўкапеечная). *Спачатку ён [бацька] расклаў па слупочках медную драбязу — грашы, капейкі, двушкі, тройкі, пятачкі, потым сярэбраную, а ўжо затым пералічыў папяровыя грошы.* А. Асіпенка.

**Грошы,** *адз. няма.* Металічныя ці папяровыя знакі, якія служаць мерай вартасці пры куплі-продажы; сродкі, капітал. *Грошы лік любяць.* Прымаўка.

**ГУМАНІСТЫЧНЫ — ГУМАННЫ**

**Гуманістычны.** Які мае адносіны да гуманізму, гуманіста. *Гуманістычныя ідэі.*

**Гуманны.** Прасякнуты павагай да людзей, чалавечны, чулы, спагадлівы. *Высакароднасць працы лесаводаў, што стараюцца для людзей будучага, робіць нашу прафесію вельмі гуманнай, чалавечнай.* У. Мяжэвіч.

**ГУШЧАР — ГУШЧАРНІК / ГУШЧАРНЯ / ГУШЧЫНЯ**

**Гушчар.** Густы ўчастак лесу; густы зараснік чаго-н. *Глухі шолах у лесе прымусіў дзеда прыслухацца і разглядзецца. І бачыць дзед Талаш — вялізны дзікі кабан павольна выходзіць зляснога гушчару і брыдзе па чэрава ў снезе, не зважаючы на дзеда.* Я. Колас.

**Гушчарнік.** *Разм.* Тое, што і гушчар. *У гушчарніку спявалі птушкі, свісталі рабчыкі, шапацелі лісцем асіны і бярозы.* А. Чарнышэвіч.

**Гушчарня.** *Разм.* Тое, што і гушчар. *Закаўкалі каўкі на ўзвышшы. Затрэслася лісце ў гушчарні.* Я. Купала.

**Гушчыня. 1.** Уласцівасць і стан густога. *Усюды прабіваюцца кусты арэшніку і каліны, павялічваючы яшчэ больш гушчыню і непраходнасць лесу.* В. Вольскі. **2.** Тое, што і гушчар. *Узыходзіла сонца, і яго зыркія промні пранікалі ў гушчыню дрэў і кустоў, высвечвалі кару на камлях, мох, пні.* Б. Сачанка.

## Д

**ДАЛІКАТНЫ — ДАЛІКАТЭСНЫ**

**Далікатны. 1.** Ветлівы, ласкавы ў абыходжанні з людзьмі; уважлівы. *Рашчэня, па характару чалавек далікатны, упершыню гаварыў галоўнаму ў вочы такую суровую праўду.* І. Шамякін. **2.** *Разм.* Які патрабуе асцярожных, тактоўных адносін. *Актывісты адмоўчваліся. Відаць, ім таксама не хацелася брацца за гэтую далікатную справу.* А. Асіпенка. **3.** Кволы, тонкі; выпеставаны. *Ваенрук узяў адразу два яйкі, стукнуў адно аб адно, тонкімі далікатнымі пальцамі спрытна абабраў іх, але есці не стаў, паклаў у шапку.* А. Асіпенка.

**Далікатэсны.** Які мае адносіны да далікатэсаў — рэдкай, прыемнай на смак ежы. *Шырока развіваць вытворчасць паштэтных, языковых, фаршавых, курыных, вяндлінных і іншых далікатэсных мясных кансерваў.* «Звязда».

**ДАМАВІНА — ДАМІНА**

**Дамавіна.** Спецыяльная скрыня, у якую кладуць нябожчыка для пахавання; труна. *Калі спускалі да-*

*мавіну ў зямлю, не верылася, што Іны больш няма, што вот закідаюць яе сырой зямлёй — і ўсё...* І. Капыловіч.

**Даміна.** *Разм.* Вялізны дом. *Шкада, канечне, хаты. Што тыя пятнаццаць тысяч? Разыдуцца туды-сюды — агледзецца не паспееш, а стаяла б даміна, то не-не ды і адскочылі б калі ўсім сямейным гамузам...* І. Капыловіч.

**ДАРАВАЦЬ — ДАРЫЦЬ**

**Даравацъ. 1.** *што.* Прабачыць каму-н., апраўдаць каго-н.; не палічыць за віну чаго-н. *З гартаванаю зброяй паўстануць сыны. Не даруюць за матчыны слёзы яны.* У. Дубоўка. **2. Даруй(це).** Ужываецца пры звароце да каго-н. для папярэджання аб чым-н. ці для выражэння просьбы прабачыць у чым-н. *Я ў людзей не папрашу: даруйце! Бо ў песнях не хлусіў. Не мог хлусіць.* П. Панчанка.

**Дарыць.** Рабіць падарунак. *Табе, Каўказ, паэты спеў дарылі, сягоння й я акорды падару.* П. Трус.

**ДАРЭКТАР — ДЫРЭКТАР**

**Дарэктар.** *Уст.* Дамашні настаўнік. *Трахім шкадаваў свайго адзінага сына і вучыў яго спачатку ў вандроўных настаўнікаў, так званых «дарэктараў», потым павёз у Строчын і аддаў у двухкласнае вучылішча.* А. Чарнышэвіч.

**Дырэктар.** Кіраўнік прадпрыемства, установы. *Галаўбух Варанецкі падпіша ўсё гэта, занясе на подпіс дырэктару.* Я. Скрыган.

**ДАХОДЛІВЫ — ДАХОДНЫ**

**Даходлівы.** Які лёгка ўспрымаецца, даходзіць да свядомасці; зразумелы. С і н о н і м: даступны. *Манера пісьма Хв. Шынклера вельмі простая, даходлівая.* Л. Арабей.

**Даходны.** Які дае прыбытак, даход. С і н о н і м: прыбытковы. *А дзядзька і гаворыць: «Надумаў я цябе, Ляксей, на парыкмахера вывучыць. Даходнае месца. Кліентуру сваю будзеш мець».* І. Чыгрынаў.

**ДЗЕДАЎСКІ — ДЗЯДОЎСКІ**

**Дзедаўскі.** Які мае адносіны да дзеда; атрыманы ў спадчыну ад продкаў. *Ваяводам на Палессе трэба паслаць пана Даўнаровіча. Ён мясцовы, мае там дзедаўскія маёнткі.* П. Пестрак.

**Дзядоўскі.** Характэрны для дзядоў; такі, як у дзядоў; старэчы. *Тодар лажыцца на бок і пачынае набіваць тытунём сваю дзядоўскую прасмаленую піпку.* М. Лупсякоў.

**ДЗЕЙНЫ — ДЗЕЙСНЫ**

**Дзейны.** Надзвычай энергічны, актыўны. *Цётка — з выгляду камлюкаватая, някідкая, з нявідным, нібы высечаным са звычайнага кавалка дрэва тварам — вельмі дзейная і працавітая.* І. Навуменка.

**Дзейсны.** Здольны актыўна ўздзейнічаць на што-н. С і н о н і м: эфектыўны. *Мы вядзём сваю работу так, каб ніводзін выпадак браку не застаўся па-за ўвагай калектыву, каб яго рэакцыя на любое парушэнне была найбольш актыўная і дзейсная.* «Полымя». Н я п р а в і л ь н а: *Яго погляд, манера гаварыць выдавалі ў ім чалавека энергічнага, дзейснага (трэба: дзейнага).* Л. Арабей.

**ДОМБРА — ДОМРА**

**Домбра.** Казахскі народны струнны музычны інструмент (на дзве струны) з корпусам акруглай формы. *Домбра акына і яго песні славяць працу казахскага народа на сваёй зямлі.*

**Домра.** Рускі народны струнны музычны інструмент (на тры-чатыры струны), падобны на мандаліну. *Ён [І. Любан) даў мне домру і, праверыўшы маё ўмельства ў валоданні ёю, дазволіў наведваць заняткі аркестра.* А. Астрэйка.

**ДРЭЙФАВАЦЬ — ДРЭЙФІЦЬ**

**Дрэйфаваць.** Адхіляцца ад узятага курсу (або рухацца) пад уздзеяннем ветру, цячэння вады. *Карабель застаўся без кіравання і, ахоплены полымем, пачаў дрэйфаваць да берага.* Зб. «Эстафета пакаленняў».

**Дрэйфіць.** *Разм.* Адступаць перад цяжкасцямі, небяспекай; баяцца. — *І страшнавата робіцца, як успомню Але ў баі не дрэйфіў, трымаўся.. Потым паспакайнеў, паступова абвыкся.* І. Мележ.

**ДРЭЎКА — ДРЭЎЦА**

**Дрэўка.** Доўгая круглая палка, да якой прымацоўваецца сцяг. *Крочылі сцяганосцы, высока ўзняўшы на дрэўках палотнішчы сцягоў з надпісамі рабочых арганізацый горада.* П. Пестрак.

**Дрэўца.** Невялічкае (звычайна маладое) дрэва. *Стаялі яны [будынкі] не ўпрытык, а аддзеленыя адзін ад аднаго прагаламі, засаджанымі маладымі дрэўцамі* Т. Хадкевіч.

**ДУБАЛЬТ — ДУБЛЕТ — ДУПЛЕТ — ДУБЛІКАТ — ДУБЛЬ**

**Дубальт.** *Абл.* Зроблены з дзвюх аднародных ці падобных частак; падвойны. *Каб, не дай божа, з крамай што не здарылася, гаспадар закрываў дзверы жалезнымі дубальтамі, а вокны — жалезнымі аканіцамі.* М. Лобан.

**Дублет. 1.** Адзін з двух аднолькавых прадметаў; другі экземпляр якой-н. рэчы ў калекцыі, бібліятэцы і г. д. *У помніках трапляюцца некаторыя польскія словы, якія з'яўляюцца лексічнымі дублетамі адпаведных беларускіх слоў і на першых парах ужываліся паралельна з імі.* А. Жураўскі. **2.** Адначасовы выстрал па адной цэлі з двух ствалоў паляўнічай стрэльбы; дуплет (у 2 знач.). *Стрэл з двухстволкі дублетам.*

**Дуплет. 1.** У більярднай гульні: удар шаром у другі шар, які, стукнуўшыся аб борт і адскочыўшы ад яго, трапляе ў лузу. *З усіх бакоў падыходзіў ён да гэтага шара, прыглядаўся, прымерваўся кіем і нарэшце прыгожым дуплетам паслаў яго ў лузу.* «ЛіМ». **2.** Адначасовы выстрал па адной цэлі з двух ствалоў паляўнічай стрэльбы; дублет (у 2 знач.). *Недзе пекануў стрэл. Глуха, далекавата. І яшчэ два — дуплетам. У тым жа месцы.* В. Карамазаў.

**Дублікат.** Другі экземпляр якога-н. дакумента, які мае аднолькавую юрыдычную сілу з арыгіналам. *Я прыйшла прасіць вас, каб выдалі дублікат ці новую даведку на атрыманне пашпарта.* І. Грамовіч.

**Дубль.** *Разм.* **1.** Другая, дубліруючая каманда спартыўнага калектыву, якая служыць рэзервам для асноўнай каманды. *Дубль футбалістаў лепшай каманды ўкамплектаваны няблага.* **2.** Адзін з дублетных кадраў пры кіназдымках. *Пры здымцы найбольш адказных кадраў фільма амаль заўсёды рабілі і дубль.* «ЛіМ».

**ДУХАТА І ДУХМЕНЬ — ДУХМЯНАСЦЬ**

**Духата.** Гарачае, душнае надвор'е; душнае паветра. *Духата і пыл гарадскіх вуліц гналі людзей у поле, да мора, на чыстае паветра.* Ц. Гартны.

**Духмень.** *Разм.* Тое, што і духата. *Ад сонечнага ўгрэву ў палатках густая духмень.* М. Лынькоў.

**Духмянасць.** Прыемны пах, водар. *Паветра цякло шырокімі струменямі: то цёплае, напоенае пахам смалы і духмянасцю траў, то вільготнае.* І. Шамякін.

**ДУХАВІТЫ — ДУХАВЫ — ДУХМЯНЫ — ДУХОЎНЫ — ДУШЭЎНЫ — ДУШАВЫ — ДУШНЫ**

**Духавіты.** *Разм.* Тое, што і духмяны. *У мяне за плячыма рэчавы салдацкі мяшок, а ў ім для бабулі два брусочкі духавітага мыла, якія былі выдадзены мне для ўмывання.* І. Сяркоў.

**Духавы.** Які дзейнічае праз удзіманне паветра (пра музычныя інструменты); які складаецца з духавых інструментаў. *З парку далятаалі гукі духавога аркестра, а над возерам разлягалася чароўная песня.* М. Ваданосаў.

**Духмяны.** З прыемным моцным пахам; пахучы. *І дуб-крапак і куст малы стаяць у мудрым задуменні. А сосны сочаць і струменяць густы, духмяны пах смалы.* Я. Колас.

**Духоўны. 1.** Звязаны з унутраным станам, псіхічнымі здольнасцямі чалавека, яго свядомасцю, душэўны *(у 1 знач.)* *Сапраўды-такі здараюцца духоўныя перавароты ў маладых людзей, здаецца часам, што перайначваецца ў чалавека натура.* К. Чорны. **2.** Звязаны з рэлігіяй, царквой. *Няхай злуе айцец духоўны. няхай суліць мне пекла ен,— люблю я больш, як звон царкоўны, скаварады аб прыпек звон.* Я. Колас.

**Душэўны. 1.** Звязаны з унутраным, псіхічным станам чалавека; духоўны *(у 1 знач.)*. *Ядвіся, добра разумеючы сумленнасць і душэўную чысціню Лабановіча, як бы баіцца раскрыць перад ім сваю душу.* Р. Шкраба. **2.** Шчыры, адкрыты, сардэчны; чулы, спагадлівы. *Адразу завязалася душэўная размова, у якой усё было адкрыта і зразумела* М. Ваданосаў.

**Душавы.** Які мае адносіны да душа. *У кватэрах прадугледжаны і газавыя пліты, і прасторныя балконы, і душавыя пакоі, і зручныя сцянныя шафы.* С. Грахоўскі.

**Душны.** Гарачы, насычаны выпарэннямі; з цяжкім паветрам. *І калоссі мнагазначна хіляць, гнуць галовы, нібы іх чым устрывожыў душны дзень ліпнёвы.* Я. Колас.

**ДЫВІЗІЁН — ДЫВІЗІЯ**

**Дывізіён.** Вайсковае падраздзяленне ракетных войск і артылерыі; атрад ваенных караблёў аднаго класа. *На паўночным схіле вялікага пагорка, добра замаскіраваныя на ўскрайку невялічкага і негустога лесу, схаваліся батарэі дывізіёна.* У. Дамашэвіч.

**Дывізія.** Буйная вайсковая часць з некалькіх палкоў. *Ён прыехаў у дывізію са штаба арміі, калі палкі ўжо ледзь стрымлівалі націск танкавай групы праціўніка.* І. Чыгрынаў.

**ДЫПЛАМАТ — ДЫПЛАМАНТ — ДЫПЛОМНІК**

**Дыпламат. 1.** Службовая асоба, упаўнаважаная ўрадам для зносін з замежнымі краінамі. *Нашым дыпламатам трэба было прыкласці нямала сіл. энергіі і вытрымкі, каб паказаць міжнародныя падзеі ў іх сапраўдным святле* І. Новікаў. **2.** Чалавек, які тонка і ўмела дзейнічае ў адносінах з іншымі. *Пракоп, як і кожны селянін, крыху дыпламат* Я. Колас.

**Дыпламант.** Пераможца конкурсу, узнагароджаны дыпломам. *Хор створаны васемнаццаць гадоў назад. Ён не аднойчы з'яўляўся дыпламантам абласных конкурсаў харавых калектываў.* «ЛіМ».

**Дыпломнік.** Студэнт, які працуе над дыпломнай работай. *Ты ўжо не Павел, не дыпломнік, а Павел Мікалаевіч, настаўнік, будзь крыху болей салідны.* Г. Далідовіч.

**ДЫСКАНТ — ДЫСКОНТ**

**Дыскант.** Высокі хлапечы голас. *Пераклікаюцца гудкі паравозаў, нібы жывыя людзі, то басам, то тэнарам. то дыскантам...* П. Броўка.

**Дысконт.** Купля банкам вэксаля або іншага пазыковага абавязацельства да заканчэння іх тэрміну; працэнт, які ўтрымліваецца пры гэтым. *Вучыцца на курсах было нялёгка. Асабліва мучылі нас шматлікія дэбеты, крэдыты, сальда, дысконты і іншыя бухгалтарскія прамудрасці.* «ЛіМ».

**ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ — ДЫСКРЭДЫТАЦЫЯ**

**Дыскрымінацыя.** Абмежаванне ў правах, нераўнапраўнае становішча. *У нас не могуць развівацца актыўныя эканамічныя адносіны з тымі дзяржавамі, кіруючыя колы якіх праводзяць агрэсіўную палітыку, палітыку дыктату і дыскрымінацыі.* К. Мазураў.

**Дыскрэдытацыя.** Падрыў даверу да каго-чаго-н., прыніжэнне чыйго-н. аўтарытэту, значэння. *Дыскрэдытацыя ідэі. Дыскрэдытацыя асобы.*

**ДЫЯЛЕКТ — ДЫЯЛЕКТЫЗМ**

**Дыялект.** Гаворка, пашыраная на пэўнай тэрыторыі; мясцовая разнавіднасць мовы. *А старая гава-*

*рыла. усплёскваючы рукамі, і гучаў, пераліваўся, звінеў у яе вуснах пявучы палескі дыялект.* У. Караткевіч. Няправільна. *Сакавітыя літаратурныя словы мяжуюцца з гутарковымі, народнымі Многа дыялектаў (трэба: дыялектызмаў), бытавой лексікі.* «ЛіМ».

**Дыялектызм.** Слова або моўны зварот якога-н. дыялекту ў літаратурным творы. *К. Чорны перасцерагаў пісьменнікаў ад празмернага захаплення дыялектызмамі і жаргоннымі словамі, якія засмечваюць мову твора.* І. Кудраўцаў.

**ДЭБЕТ — ДЭБІТ — ДЭБЮТ**

**Дэбет.** Левая старонка прыходна-расходных кніг, куды заносяцца ўсе паступленні, а таксама даўгі і расходы па дадзенаму рахунку; проціл. крэдыт. *Тое, што Дудка паспеў запісаць за паўгода баявой дзейнасці, заняло дзве тоўстыя бухгалтарскія кнігі, разграфленыя па старонках на крэдыт і дэбет.* І. Навуменка.

**Дэбіт.** Колькасць вадкасці (нафты, вады і пад.) або газу, якая даецца свідравінай за адзінку часу. *Штучную інтэнсіфікацыю здабычы трэба весці вельмі асцярожна, бо празмерна высокая закачка вады можа спачатку даць вялікі дэбіт паліва, а потым яго рэзка знізіць і сапсаваць.* Р. Гарэцкі.

**Дэбют. 1.** Першае выступленне артыста на сцэне. *Для дэбюту мне далі ролю прынца ў інсцэніраванай казцы Андэрсена «Прынц і жабрак»* Я. Рамановіч. || Першае публічнае выступленне ў якой-н. галіне дзейнасці. *Хоць мае літаратурныя дэбюты на рускай мове былі досыць удалыя, я ўсё ж перайшоў на беларускую мову.* З. Бядуля. **2.** Пачатак шахматнай ці шашачнай партыі, першыя хады. *З самага пачатку гульні, яшчэ ў дэбюце, грасмайстар захапіў ініцыятыву і захаваў яе да канца партыі.* «Звязда».

# Е, Ё

**ЕДКІ — ЯДКІ**

**Едкі. 1.** Які раз'ядае, разбурае што-н. хімічна; які выклікае моцнае фізічнае раздражненне. *Абапал дарогі дагаралі хаты, і ўдушлівы едкі смурод пажарышчаў раздзіраў грудзі.* В. Быкаў. **2.** *перан.* З'едлівы, калючы. *І смех там быў, былі і жарты, і кпіны едкія, і злосць.* Я. Колас.

**Ядкі.** *Разм.* Які са смакам есца, ахвотна паядаецца; смачны, пажыўны. *Атава там ужо адрастаць пачала, а трава ядкая, спажыўная.* Я. Колас.

**ЕДНАСЦЬ — ЯДНАННЕ**

**Еднасць.** Адзінства; агульнасць, супольнасць; суцэльнасць, непадзельнасць. *Вялічка — ціхі, ураўнаважаны, засяроджаны ў самім сабе, моцны разуменнем сваёй праваты, сваёй еднасцю з роднай зямлёй.* «Полымя».

**Яднанне.** Цесная сувязь; адзінства; згуртаванасць. *Вялікая Айчынная вайна, узнятая нямецкімі фашыстамі, навочна паказала нам, што ў нашай дружбе, у яднанні славянскіх народаў — наша непераможная сіла.* Я. Колас.

**ЕЛКА — ЁЛКА — ЯЛІНА**

**Елка.** Вечназялёнае хваёвае дрэва з конусападобнай кронай. *Тут верх асіны круглалісты сплятаўся з хвоямі, з дубамі, а елкі хмурымі крыжамі высока ў небе выдзяляліся, таемна з хвоямі шапталісь.* Я. Колас.

**Ёлка. 1.** тое, што і елка. *Башлыкі адзелі ёлкі з снегу і стаяць сплючы.* П. Панчанка. **2.** Елка, ссечаная і ўпрыгожаная к Новаму году. *Весяліцца каля ёлкі дзетвара шчаслівая.* Н. Гілевіч.

**Яліна.** Высокая елка. *Старыя хвоі і яліны, высока кінуўшы галіны, глядзелі хораша, любоўна.* Я. Колас.

**ЁЛАЧНЫ — ЯЛОВЫ — ЯДЛОЎЦАВЫ**

**Ёлачны.** Які мае адносіны да навагодняй ёлкі. *Колькі гоману, ра-*

*дасці, вясёлай мітусні! І ў кожнага ў вачах гарэць, пераліваюцца ёлачныя агні* М. Лынькоў.

**Яловы.** 1. Які мае адносіны да елкі (яліны). *І такая цішыня стаяла ў лесе, што, здавалася, чуваць было, як шарахцяць на яловых лапках сняжынкі* М. Лынькоў. 2. Зроблены з елкі (яліны). *На даху толькі што паставілі сухія яловыя кроквы.* С. Грахоўскі.

**Ядлоўцавы.** Які мае адносіны да ядлоўцу. *Мінку і Янку я знайшоў на тым самым умоўленым месцы. Толькі добра ведаючы, можна было папасці на яго паміж густых ядлоўцавых кустоў.* П. Броўка.

**ЁМІСТЫ — ЁМКІ**

**Ёмісты.** Здольны змясціць у сабе вялікую колькасць чаго-н. С і н о н і м: умяшчальны. *У вялікай, ёмістай карзіне ён носіць цётцы соль, газу, брускі зеленаватага мыла.* І. Навуменка.

**Ёмкі.** 1. Якім добра і прыемна карыстацца. С і н о н і м: зручны. *Адзін з валуноў нагадвае шыракагрудага скакуна, які праваліўся нагамі ў зямлю, і я саджуся на яго, нібыта ў ёмкае сядло.* В. Карамазаў. 2. Зграбны, спрытны. С і н о н і м: лоўкі. *А пуга дужа ж ужо ёмкая была...* Я. Сіпакоў.

## Ж

**ЖАЛАСЛІВЫ — ЖАЛАСНЫ / ЖАЛЛІВЫ — ЖАЛОБНЫ**

**Жаласлівы.** Схільны да жаласці, спачування; жаласны *(у 2 знач.)*. С і н о н і м ы: спагадлівы, чуллівы. *На іх тварах была напісана жаласлівая спагада.* І. Навуменка.

**Жаласны.** 1. Які выклікае жаласць, спачуванне. С і н о н і м ы: журботны, сумны. *Ветру не было, а дрот бесперапынку гуў прыемным звонам, ціхім, аднатонным і жаласным.* Я. Колас. 2. Схільны да жаласці, спачування; жаласлівы. С і н о н і м ы: спагадлівы, чуллівы. *Вочы старой пацяплелі, і ўсе рысы яе твару расплыліся ў жаласную ўсмешку* М. Лынькоў.

**Жаллівы.** *Разм.* Тое, што і жаласлівы, жаласны *(у 2 знач.)*. *Пачынаў Алёша часцей за ўсё з песень, і песні любіў найбольш сумныя, жаллівыя.* І. Мележ.

**Жалобны.** 1. Які мае адносіны да жалобы, смутку. *Сцяг схіліўся чырвоны з жалобнай каймой.* А. Куляшоў. 2. Сумны, тужлівы, журботны. *Стаю я маўкліва і чую, як бура жалобную песню заводзіць.* М. Чарот.

**ЖАЛОБА — ЖАЛЬБА**

**Жалоба.** 1. Смутак па памершым або ў сувязі з народным горам, бедствам. *Жалоба па бацьку яшчэ не адышла, а з Зоськай такое няшчасце прылучылася...* Я. Купала. 2. Чорнае адзенне, павязка як сімвал смутку. *Чырвоны і чорны колеры — колер рэвалюцыі і колер жалобы ў гонар яе ахвяр.* Л. Арабей.

**Жальба.** Смутак, туга, бедаванне. *Смутак жнеек тых апране, разагнуцца і стаяць, як Сымон на дудцы стане жальбу сэрца выяўляць.* Я. Колас.

**ЖАНОЦКІ — ЖАНОЧЫ**

**Жаноцкі.** Характэрны для жанчыны; пяшчотны, ласкавы, прывабны. *Жанчына з твару не была прыгожая, але ва ўсёй ёй была тая жаноцкая дужасць, якая робіць жанчыну прывабнай.* І. Чыгрынаў.

**Жаночы.** Які мае адносіны да жанчыны; які належыць жанчыне; прызначаны для жанчын; *проціл.* мужчынскі. *Нічога няма прыгажэй за жаночы твар у прыцемку.* У. Караткевіч.

**ЖНІВЕНЬСКІ — ЖНІЎНЫ**

**Жнівеньскі.** Які бывае ў жніўні. *Ціхая, млявая, плыве месячная жнівеньская ноч над зямлёю, асветленай ззяннем Млечнага Шляху.* С. Кухараў.

**Жніўны.** Які мае адносіны да жніва, звязаны з ім. *Асабліва ў часе жніва захаплялі мяне мелодыі жніўных песень, якія, здавалася, коцяцца і*

*коцяцца з шумам спелых жытніх каласоў у чыстыя блакітныя далі.* Я. Пушча.

**ЖУРАВІНАВЫ / ЖУРАВІННЫ — ЖУРАЎЛІНЫ**

**Журавінавы.** Які мае адносіны да журавін, багаты журавінамі, прыгатаваны з журавін. *Пакуль мы былі ў школе, даглядаў і забаўляў яе дзед, Ганна Якаўлеўна прыносіла журавінавы і чаромушны кісялі, чытала і расказвала казкі, мерала тэмпературу і давала лекі.* С. Грахоўскі.

**Журавінны.** Тое, што і журавінавы. *Поле ахутваў змрок. Толькі вузкая палоска журавіннай чырвані распаўзалася па небасхіле.* С. Грахоўскі.

**Жураўліны.** Які мае адносіны да жураўля — вялікай балотнай птушкі. *У туманным полі трывожна крычалі гусі. Можа чулі ў высокім небе шэлест крылаў сваіх вольных родзічаў, трубную тугу жураўліных ключоў, што адплывалі ў вырай з таежных балацін і прырэчных плёсаў.* С. Грахоўскі.

**ЖУРНАЛІСЦКІ — ЖУРНАЛЬНЫ**

**Журналісцкі.** Які мае адносіны да журналіста, журналістыкі. *Гістарычнае развіццё жанраў абумоўлена практычнымі задачамі, якія сталі на розных этапах перад журналістыкай, і самім характарам журналісцкай дзейнасці* Б. Стральцоў.

**Журнальны.** Які мае адносіны да журнала. *Журнальныя запісы.*

**ЖЫВІНКА — ЖЫВІЦА**

**Жывінка.** Тое, што надае каму-чаму-н. жывасць, прывабнасць, своеасаблівасць. *Чалавек з жывінкай. Працаваць з жывінкай.*

**Жывіца.** Празрыстая смала, што выцякае з хвойных дрэў пры іх пашкоджанні. *На смалістых суках свяціліся застылыя кроплі жывіцы.* П. Кавалёў.

**ЖЫЛЛЁВЫ — ЖЫЛЫ**

**Жыллёвы.** Які мае адносіны да жылля, звязаны з яго выкарыстаннем. *Жыллёвы: фонд, аддзел; жыллёвая камісія, праблема; жыллёвыя: умовы, нормы і г. д. Істотнай умовай уздыму народнага дабрабыту з'яўляецца паляпшэнне жыллёвых умоў працоўных.* «Звязда».

**Жылы.** Прызначаны, прыстасаваны для жылля людзей; населены. *Жылы: дом, будынак, масіў, раён; жылое памяшканне і г. д. Відны былі з лесу і бліжэйшыя жылыя будынкі.* А. Кулакоўскі.

**ЖЫТНІК — ЖЫТНІЦА — ЖЫТНЯК**

**Жытнік.** *Абл.* Хлеб з жытняй мукі. *Наўрад ці ёсць што на свеце смачнейшае за свежы жытнік!* А. Савіцкі.

**Жытніца. 1.** *Разм.* Жытняя салома. *Волька па-мужчынску падхоплівала ... [віламі] жытніцу і кідала яе ў тарпу.* А. Васілевіч. **2.** *перан.* Хлебаробная вобласць краіны, якая забяспечвае хлебам іншыя мясцовасці. *Паўднёвыя вобласці заўсёды былі жытніцай усёй краіны.*

**Жытняк.** Стэпавая кармавая расліна. *Зялёны жытняк. Малады жытняк.*

# З

**ЗААХВОЧАНЫ—ЗААХВОЧВАЛЬНЫ**

**Заахвочаны.** Такі, якому прывілі ахвоту, цягу да чаго-н.; прыахвочаны да чаго-н.; адзначаны, ухвалены. *А ён, заахвочаны ўвагаю, усё больш запальваўся.* Л. Арабей.

**Заахвочвальны.** Прызначаны для заахвочвання. *Дзевяць кніг і альбомаў выдавецтва «Беларусь» адзначаны заахвочвальнымі дыпломамі конкурсу.* «ЛіМ».

**ЗАБАРАНАВАЦЬ — ЗАБАРАНІЦЬ**

**Забаранаваць.** *што.* Апрацаваць глебу бараной. С і н о н і м: заскародзіць. *Пасля таго як дзед забаранаваў загончык пад грэчку, Яша павёў пасвіць буланага.* І. Навуменка.

**Забараніць.** *што і з інф.* Не дазволіць што-н. рабіць. *Трэба заба-*

*раніць вываз дэфіцытных тавараў на экспарт да таго часу, пакуль імі не будзе насычаны ўнутраны рынак.* «Звязда».

**ЗАБУРЫЦЬ — ЗАБУРЭЦЬ**

**Забурыць.** *што. Разм.* Пабурыць, паламаць, абваліць. С і н о н і м. абрушыць. *Забурыць плот. Забурыць будан.*

**Забурэць.** *Разм.* Пачаць бурэць, стаць бурым; паказацца, вылучыцца сваім бурым колерам. С і н о н і м: забурэцца. *Твар забурэў ад загару. Жыта забурэла.*

**ЗАВІРУХА — ЗАВІРУШКА**

**Завіруха. 1.** Моцны вецер розных напрамкаў з сухім снегам. С і н о н і м: завея. *Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень. Здавалася, не будзе канца яе лютай сіле, яе злоснаму завыванню.* Я. Колас. **2.** *перан. Разм.* Неспакой, сумятня, бязладдзіца. *Ваенная завіруха падхапіла і Ганну, закінула яе ў далёкі ўральскі горад.* А. Марціновіч.

**Завірушка.** Невялічкая пералётная птушка з шараватым апярэннем. *Месца для гнязда завірушка выбірае звычайна ў зарасніках, невысока над зямлёй.* БелЭн.

**ЗАВУСЕНІЦА — ЗАВУШНІЦА**

**Завусеніца.** Востры выступ, шурпатасць, няроўнасць на паверхні чаго-н. *Разец нібы ступіўся і рабіў на дрэве завусеніцы. Так працаваць нельга. Так можна ўсё сапсаваць.* І. Шамякін.

**Завушніца.** Упрыгожанне, звычайна ў выглядзе кальца, якое прымацоўваецца да мочкі вуха. *Андрушка паблісквае вачыма то на пярсцёнак з бліскучым сінім каменьчыкам у Раісы на руцэ, то на завушніцу ў правым вуху.* М. Лобан.

**ЗАДНЕЦЬ — ЗАДНІЦЬ**

**Заднець,** *безас.* Пра надыход світання; заднецца. *Калі ж заднела, заўважыў Калістрат суседа Янука.* У. Корбан.

**Задніць,** *што. Абл.* Уставіць дно. *Астаецца толькі задніць, і дзежка гатова для адпраўкі.* Р. Мурашка.

**ЗАДОРАНЫ — ЗАДОРЛІВЫ — ЗАДОРНЫ**

**Задораны.** Адораны мноствам падарункаў. *Задораныя маладажоны. Задораны імяніннік.*

**Задорлівы.** Тое, што і задорны. *Усё радавала, бадзёрыла і стомленасць, што ўчэпіста трымалася, і задорлівы смех моладзі.* І. Сіўцоў.

**Задорны.** Поўны задору; палкі, бадзёры. *Вясёлыя, задорныя прыпеўкі рэхам адгукаліся ў бары.* М. Ваданосаў.

**ЗАЕЗДЖАНЫ — ЗАЕЗДЖЫ — ЗАЕЗНЫ**

**Заезджаны.** Знясілены частай і працяглай яздой, работай без адпачынку. *Заезджаны конь.* || *перан.* Даўно ўсім вядомы; збіты, зацяганы. *Заезджаны анекдот. Заезджаны жарт.*

**Заезджы.** Які заехаў куды-н. мімаходам, на кароткі час. С і н о н і м: прыезджы. *Рэгіну запрасіў на танец нейкі заезджы хлопец, але Міцька на гэта і ўвагі не звярнуў.* М. Лупсякоў.

**Заезны.** У выразе: заезны двор (дом) *(уст.)* — памяшканне для начлегу з дваром для коней і фурманак, а таксама карчмой. *Аднойчы прыехаў у заезны дом, што побач з нашай вёскаю, багаты купец.* Л. Дайнека.

**ЗАЗНАЦЦА — ЗАЗНАЦЬ**

**Зазнацца.** Заганарыцца, заважнічаць. *Зазнаўся, ой, мароз, зазнаўся! Ды дзень яшчэ не пачынаўся: пастой. мароз, пастой хваліцца — мо і цябе хто не збаіцца!* Я. Колас.

**Зазнаць.** Зведаць на ўласным вопыце; перажыць, адчуць. *Нямала ўсякіх бед зазнаў стары за сваё доўгае жыццё.*

**ЗАМУРАВАЦЬ — ЗАМУРАВЕЦЬ**

**Замураваць,** *каго-што.* Закласці наглуха муроўкай. *Апавядаў ён, як дзяўчыну замуравалі ў склеп каменны.* У. Дубоўка

**Замуравець.** Зарасці муравой — зялёнай травой. *Замуравелі партызанскія сцежкі.* «Маладосць».

**ЗАПАВЕДНЫ — ЗАПАВЕТНЫ**

**Запаведны.** Які знаходзіцца пад аховай, непарушны, недатыкальны *Створана аўтарытэтная камісія, якая абавязана распрацаваць навукова абгрунтаваныя прапановы аб раздзяленні [Белавежскай] пушчы на запаведную і паляўнічую зоны.* В. Ждановіч

**Запаветны. 1.** Які асабліва цэніцца, старанна аберагаецца; самы дарагі. *Кожнаму чалавеку рады ў гады хочацца расказаць пра самае запаветнае.* С. Грахоўскі. **2.** Атрыманы ў спадчыну ад мінулых пакаленняў; старадаўні *Серадзібор можа нават пахваліцца, што там ніхто не замыкае дзвярэй нанач... Так гэты запаветны звычай пачаў вяртацца і пасля вайны.* П. Пестрак.

**ЗАРАНІЦА / ЗАРАНКА[1] — ЗАРАНКА[2] — ЗАРНІЦА**

**Заранiца.** *Паэт.* Тое, што і заранка *Зара-заранiца гарыць у паднябессі, залоціць красою разлогі.* Я. Пушча

**Заранка[1].** Яркая афарбоўка гарызонта пры захадзе і ўсходзе сонца *Далёка наперадзе над дарогай успыхвалі густыя чырвоныя заранкі.* І. Пташнікаў.

**Заранка[2].** Невялікая светла-шэрая пеўчая птушка; малінаўка. *Івалгі аспрэчвалі першынство па мастацкаму свісту ў чырванагрудых заранак, жаваранкі не ўступалі па спевах чарнапёрым драздам.* Л. Вірня.

**Зарніца.** Светлавая ўспышка на небе, без грому — водбліск далёкай навальніцы. *Бывае часам, калі пасля доўгіх тыдняў духаты і спёкі загараюцца на далёкім вячэрнім небасхіле палахліва-мітуслівыя зарніцы* М Паслядовіч.

**ЗАСЕК — ЗАСЕКА — ЗАСЕЧКА**

**Засек.** Адгароджанае месца ў свірне, клеці для захавання збожжа, мукі. *Тады яны ... панасыпалі насенне ў мяшкі і развезлі па кустах — абы ў засеках не ляжала.* Я. Сіпакоў.

**Засека.** Штучнае ўмацаванне са ссечаных дрэў, звернутых верхавінамі ў бок непрыяцеля. *На ўсім стэпавым парубежжы Русь насыпала земляныя валы. рабіла засекі з дрэў, ставіла сігнальныя вышкі.* Л. Дайнека.

**Засечка.** Знак, метка на чым-н , зробленая сякерай, нажом і г. д. *Сталовым нажом бацька ўрачыста робіць на вушаку засечку.* І. Хадановіч.

**ЗАЦЯМНІЦЬ — ЗАЦЯНІЦЬ**

**Зацямніць.** *каго-што.* **1.** Зрабіць цёмным, засланіўшы святло. *Вячэрнія змрокі, што шпарчэй, чым звычайна, згушчаліся ў непагадзь, зацямнілі далягляд.* І. Шамякін. **2.** *перан.* Зацьміць, адсунуць каго-што-н. на задні план; зрабіць незразумелым, заблытаць. *Аўтар высунуў на першы план няўдалае каханне юнакоў да Тані, якое зацямніла ўсё астатняе.* «ЛіМ».

**Зацяніць,** *каго-што.* Засланіць святло, пакрыўшы ценем; схаваць у цені. *Павалокаю белай туман не зацяніць дзявочай красы.* П. Глебка.

**ЗБРОДЛІВЫ — ЗБРОДНЫ**

**Збродлівы.** *Разм.* Шкадлівы, пamaўзлівы. *Збродлівы кот. Збродлівая карова.*

**Збродны.** *Разм.* Выпадкова сабраны; разнародны, разнамасны. *Збродная кампанія. Збродная шайка.*

**ЗВАНАР — ЗВАНЕЦ**

**Званар.** Царкоўны служыцель, які звоніць у званы. *Званару ж было строга загадана не спяшыць і не спазняцца, а біць у звон дакладна тады, калі будзе гаварыць навагародскі князь-хрысціянін.* Л. Дайнека

**Званец.** Травяністая расліна з жоўтымі кветкамі і плодам-каробачкай. *Цвіла вятроўніца, цвілі ключыкі, грамкі, смактушкі, цвіў званец, нівяннік, чысцік, цвілі герань лугавая і лісахвост..* Я Сіпакоў.

**ЗВАНІЦЬ — ЗВІНЕЦЬ**

**Званіць. 1.** Ствараць звон; падаваць сігнал званком. *Зазвінеў званок. Гэта званіў наш маўклівы вар-*

*таўнік.* В. Адамчык. **2.** *перан.* Разносіць чуткі, плеткі, пагалоску. *Па ўсёй вёсцы званіла Раманава цётка: — Гэта ж радачкі дайце, людзі добрыя! Якое малое — і такое ўпраўнае* І. Кірэйчык. **3.** Выклікаць званком да тэлефона; гаварыць па тэлефоне. *Дадому Алесь ехаў адзін: Кібрык пайшоў некаму званіць па тэлефоне* У. Шыцік.

**Звінець.** Утвараць тонкі металічны гук; звонка гучаць. *Хаім біў малатком па агністай падкове, і малаток гучаў то глуха, то звінеў, ападаючы на пустое кавадла жывым, дрыготкім перазвонам.* Я. Брыль. || *перан* Поўніцца чым-н. звінючым *К вечару пакідае звінець неабдымная шырыня летняга дня, і кладзецца цішыня на зямлю.* К. Чорны.

**ЗВЫКЛЫ — ЗВЫЧАЁВЫ — ЗВЫЧАЙНЫ — ЗВЫЧНЫ**

**Звыклы.** Які ўвайшоў у прывычку, стаў прывычкай; добра знаёмы. *Звыклым рухам хуценька зашчоўкнуў замок прывязных рамянёў.* А. Алешка.

**Звычаёвы.** Які мае адносіны да звычаю, звязаны са звычаямі. *Паводле норм звычаёвага права, у адведкі нельга было ісці з пустымі рукамі, таму жанчыны неслі з сабой яешню, хлеб, кашу, сыр, мёд, масла. . Т. Кухаронак.*

**Звычайны.** Які не вылучаецца сярод іншых, нічым не знамянальны. *Звычайная вёска стаяла, а ў вёсцы — звычайная хата, якіх і на свеце нямала, і на Беларусі багата.* У. Дубоўка.

**Звычны.** Які прывык да чаго-н., звыкся з чым-н.; прывычны. *Да баявой прыгоды звычны, без меркаванняў і разваг, шынель скідае пагранічнік, бяжыць з вінтоўкай па слядах.* П. Глебка.

**ЗГУБЛЕНЫ — ЗГУБНЫ**

**Згублены.** Страчаны; забыты па няўважлівасці; знішчаны. *Згублены марна час. Згубленыя ключы.*

**Згубны.** Які вядзе да згубы, пагражае згубай; пагібельны. *Згубны ўплыў. Згубны намер.*

**ЗДЫМАЧНЫ — ЗДЫМНЫ**

**Здымачны.** Які мае адносіны да здымкі; прызначаны для здымкі. *Ён павінен своечасова забяспечыць здымачную групу тэхнікаю, машынамі, стужкамі, своечасова зрабіць апрацоўку знятага матэрыялу* В. Гігевіч.

**Здымны.** Такі, які можна зняць, не замацаваны наглуха. *Здымная рама. Здымная сетка.*

**ЗІМНІ / ЗІМОВЫ — ЗІМНЫ**

**Зімні.** Тое, што і зімовы. *Ні звер, ні чалавек, ні птушка не парушалі яго [лесу] ранішняга зімняга спакою.* Я. Колас.

**Зімовы.** Звязаны з зімою; які бывае зімой, зімні. *Слупы дыму выцягваліся роўна, стромка, нібы падпіраючы невысокае зімовае неба.* М. Лынькоў.

**Зімны.** *Разм.* Халодны, сцюдзёны. *Зімны вецер. Зімны дзень.*

**ЗЛУЧНІК — ЗЛУЧОК**

**Злучнік.** Службовае слова, якое служыць для сувязі слоў і сказаў. *Калі аднародныя члены сказа звязаны злучнікам і парамі, то кожная пара аднародных членаў аддзяляецца адна ад другой коскай.* «Граматыка беларускай мовы».

**Злучок.** Кароткая рыска, якая злучае два словы ў адно. С і н о н і м: дэфіс. *Калі аднаслоўны прыдатак і азначаемы ім назоўнік з'яўляюцца назоўнікамі агульнымі, то яны пішуцца праз злучок.* «Граматыка беларускай мовы».

**ЗМАРДАВАНЫ — ЗМАРНАВАНЫ**

**Змардаваны.** *Разм.* Вельмі змучаны, знясілены; крайне стомлены. *Змардаваныя, знясіленыя, яны [палонныя] марылі толькі аб тым, каб як вырвацца на волю.* І. Новікаў.

**Змарнаваны.** Марна страчаны, загублены. *А найгоршы хіба — змарнаваны без працы, дзень, які ў адзіноце, у безнадзейнасці страчан.* М. Танк.

**ЗНАКАМІТЫ — ЗНАМЯНАЛЬНЫ**

**Знакаміты.** Шырока вядомы; знатны, славуты. *Лапацінскі, вядома,*

*рад быў займець такога знакамітага зяця* А. Якімовіч.

**Знамянальны. 1.** Важны па свайму значэнню, выдатны. *Самыя ранныя навелы Чорнага былі непасрэдным водгукам на знамянальныя падзеі ў жыцці краіны.* М. Луфераў. **2.** Які мае асаблівы сэнс, асаблівае значэнне. *Усе глядзелі на сцягі як на нейкую знамянальную з'яву.* І. Шамякін. **3.** Які мае самастойнае значэнне (у граматыцы). *Да разраду назоўнікаў належаць знамянальныя словы, якія маюць прадметнае значэнне.* «Граматыка беларускай мовы».

**ЗЯМЛЯК — ЗЯМЛЯНІН**

**Зямляк.** Ураджэнец адной з кім-н. мясцовасці. — *Дык вядома, землякі! — ледзь не ўскрыкнуў баец.— З адной рэспублікі, значыць, і землякі.* А. Кулакоўскі.

**Зямлянін.** Насельнік, жыхар планеты Зямля. *Той час ужо нам бачыцца, калі вялікае яднанне явай стане, і будуць звацца людзі на Зямлі, усе на ўсёй, па-мірнаму — зямляне.* А. Зарыцкі.

## І

**ІМІГРАНТ — ЭМІГРАНТ**

**Іміграит.** Перасяленец з якой-н. краіны. *Ёсць у Канадзе шмат імігрантаў. у тым ліку славян.* Я. Брыль.

**Эмігрант.** Чалавек, які перасяліўся са сваёй радзімы ў іншую краіну. *Частка эмігрантаў зрабіла свае вывады з урокаў гісторыі. зразумела свае памылкі, жыве добрымі патрыятычнымі настроямі* І. Мележ.

**ІМШЫЦЬ — ІМШЭЦЬ**

**Імшыць.** *што* Класці мох між бярвення ў новым зрубе, канапаціць мохам. *Вось і хата: дзед яшчэ імшыў зруб яе смалісты, сукаваты.* М. Танк.

**Імшэць.** Зарастаць мохам. *Дзе імшэла гнілое балота — сцяной стаяла густая, высокая пшаніца.* А. Якімовіч.

**ІМЯНІННЫ — ІМЯННЫ**

**Імянінны.** Які прызначаецца, робіцца ў гонар імянін. *У 1843 годзе быў надрукаваны артыкул Цітовіча, дзе прыводзіўся імянінны верш.* «Полымя».

**Імянны.** Памечаны імем уладальніка; выдадзены на чыё-н. імя. *На родны завод ён вярнуўся з падзякамі ад камандавання і імянным гадзіннікам.* А. Асіпенка.

**ІНДЗЕЙЦЫ — ІНДУСЫ / ІНДЫЙЦЫ**

**Індзейцы.** Агульная назва карэнных плямён і народнасцей, якія да паяўлення еўрапейцаў насялялі амерыканскі мацярык. *З пачатку 20 ст. [у Бразіліі] вымерла 87 плямёнаў індзейцаў, асталося 143, з іх 33 ізалявана жывуць у глыбіні лясоў.* БелЭн.

**Індусы.** Устарэлая назва ўсяго карэннага насельніцтва Індыі; індыйцы. *Уяўляю, як гэты «міністр калоній» адносіцца да якога-небудзь негра ці індуса, калі нават сваю суайчынніцу ён не супроць праглынуць.* І. Шамякін.

**Індыйцы.** Агульная назва ўсяго карэннага насельніцтва Індыі незалежна ад нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці. *Захавалася таксама назва «індзейцы» (хоць яны не маюць нічога агульнага з жыхарамі Індыі — індыйцамі).* Геаграфія частак свету.

**ІТАЛІЙСКІ — ІТАЛЬЯНСКІ**

**Італійскі.** Які мае адносіны да італікаў, італійцаў — старажытных плямёнаў Апенінскага паўвострава. *Італійскія плямёны. Італійская культура.*

**Італьянскі.** Які мае адносіны да італьянцаў, Італіі. *Італьянская мова. Італьянская літаратура.*

# К

**КАВАДЛА — КУВАЛДА**

**Кавадла.** Жалезная падстаўка асобай формы для ручной коўкі металу. *У кузнях глуха гухкаў аб кавадла молат і цяжка соп кавальскі мех.* Б. Сачанка.

**Кувалда.** Цяжкі кавальскі молат. *Не чуў я, як ля чорных катлаванаў узвывалі, глушачы крыкі будаўнікоў, бульдозеры і як бухалі кувалды ў майстэрнях, наспех збітых з дошак.* М. Вышынскі. Няправільна *Бацька ў гэты момант вынес ад горна распалены да чырвані прут, палажыў яго на кувалду (трэба: кавадла)* В. Хомчанка.

**КАЛЕДЖ — КАЛЕЖ**

**Каледж.** Вышэйшая або сярэдняя навучальная ўстанова ў Англіі, ЗША і інш.; з 1992 г. і ў нашай рэспубліцы. *На працягу дня мы сустракаліся яшчэ са студэнтамі каледжа, заснаванага Гандзі, былі на спецыяльнай сустрэчы са студэнтамі універсітэта.* М. Лынькоў. II *Савет Міністраў рэспублікі зацвердзіў палажэнне аб навучальных установах новага тыпу: ліцэях, гімназіях, каледжах, вышэйшых прафесіянальных вучылішчах.* «Звязда». Няправільна: *Нацыянальная адукацыя ў Францыі знаходзіцца ў стане крызісу. Не хапае памяшканняў Не хапае іх і для пачатковых класаў, і для ліцэяў, і для каледжаў (трэба: калежаў), і для універсітэтаў.* «Звязда».

**Калеж.** Сярэдняя навучальная ўстанова ў Францыі, Бельгіі, Швейцарыі і інш. *[У Францыі] дзейнічаюць: 9-гадовая пачатковая школа, 4-гадовая сярэдняя школа (агульнаадукацыйны калеж і калеж сярэдняй адукацыі) на базе 5 класаў пачатковай школы, поўная сярэдняя агульнаадукацыйная школа (7-гадовы ліцэй) на базе 5 класаў пачатковай школы.* БелЭн.

**КАМЕДЫЙНЫ — КАМІЧНЫ**

**Камедыйны.** Які мае адносіны да камедыі, характэрны для гэтага літаратурнага жанру. *Цыбулька аказваецца не проста камедыйным персанажам, нейкім дзедам-балагурам «наогул», а жывым чалавекам з індывідуальным лёсам, шчодра надзеленым не толькі гумарам, практычнай кемнасцю, але і шырынёй мыслення.* «ЛіМ».

**Камічны.** 1. Які выклікае смех; забаўны. — *Вельмі арыгінальны чалавек і столькі розных камічных гісторый ведае.* Я. Рамановіч. 2. Характэрны для камедыі; камедыйны. *Сумесь урачыстай біблейскай мовы з бытавымі вобразамі надае ўроку дзяка цікавы камічны эфект.* Р. Шкраба.

**КАМПАЗІТАРСКІ — КАМПАЗІЦЫЙНЫ**

**Кампазітарскі.** Які мае адносіны да кампазітара, належыць яму. *Кампазітарская дзейнасць.*

**Кампазіцыйны.** Які мае адносіны да кампазіцыі, звязаны з ёю. *Любімы коласаўскі вобраз дарогі ў творы — не толькі дэталь пейзажу. Дарога нясе, апроч усяго іншага, кампазіцыйную ролю, злучаючы між сабой не толькі населеныя пункты, але і часткі трылогіі.* Р. Шкраба.

**КАМПЛЕМЕНТ — КАМПЛІМЕНТ**

**Камплемент.** Бялковае рэчыва ў сываратцы крыві чалавека і жывёл. *Камплемент — спецыяльны тэрмін, у мове сустракаецца рэдка.*

**Камплімент.** Прыемная заўвага, пахвала каму-н. — *Я рады, што пасля мяне школа пераходзіць у моцныя, умелыя рукі, залатыя рукі,— зусім несвядома і шчыра зрабіў камплімент настаўніцы Іван Паўлавіч.* А. Васілевіч.

**КАМПОСТ — КАМПОСЦЕР**

**Кампост.** Угнаенне, атрыманае шляхам змешвання розных адкідаў расліннага і жывёльнага паходжання з зямлёй або торфам. *Пад нагамі ў жывёлы — тарфяная, упярэмешку з саломай, под-*

*сцілка — рыхтуюцца торфагноевыя кампосты.* У. Дамашэвіч.

**Кампосцер.** Прыстасаванне для прабівання ўмоўных знакаў кантролю на пасажырскіх білетах і іншых дакументах. *У руках у кантралера кампосцер заўсёды напагатове*

**КАНАПЕЛЬКА — КАНАПЛЯНКА**

**Канапелька.** Народная назва некаторых відаў лугавых траў. *Жаўцее луг ад канапелькі ў цвеце.*

**Канаплянка. 1.** Невялічкая пеўчая птушка *Якіх толькі птушак не было ў Васевай клетцы! І маленькія канаплянкі, і шчабятлівыя сінічкі і асцярожныя снегіры* А. Пальчэўскі. **2.** Цёплая шарсцяная хустка фабрычнага вырабу. *Жанчына паспешліва паднялася, папраўіла на галаве рабую канаплянку, завязаную пад падбародкам.* А. Васілевіч

**КАНВЕКЦЫЙНЫ — КАНВЕНЦЫЙНЫ**

**Канвекцыйны.** Які мае адносіны да канвекцыі — пераносу цяпла або электрычных зарадаў у выніку перамяшчэння навакольнага асяроддзя. *Канвекцыйныя працэсы ў атмасферы.*

**Канвенцыйны.** Устаноўлены канвенцыяй — міжнародным дагаворам. *Канвенцыйны тарыф. Канвенцыйныя правілы.*

**КАНВЕРТАРНЫ — КАНВЕРТНЫ**

**Канвертарны.** Які мае адносіны да канвертара — апарата для атрымання сталі. *Канвертарная вытворчасць сталі.*

**Канвертны.** Прызначаны для вырабу канвертаў *Канвертная папера. Канвертны цэх.*

**КАНЕЧНЫ — КАНЦАВЫ — КАНЧАТКОВЫ**

**Канечны.** Які з'яўляецца канцом чаго-н *Мы мелі намер хутчэй прыбыць на канечны пункт нашага падарожжа.* «Маладосць».

**Канцавы.** Які знаходзіцца на канцы чаго-н ; крайні. *Вёска — за ўзгоркам; адсюль, з чыгуначнага палатна, відаць нават стрэхі канцавых хат.* М. Лупсякоў.

**Канчатковы.** Які не падлягае змяненню, перагляду або адмене; беспаваротны. *Я хачу пачуць сёння тваё канчатковае слова.* А. Васілевіч.

**КАНТРАЛЁР — КАНТРОЛЕР**

**Кантралёр.** Службовая асоба, якая робіць кантроль, праверку каго-чаго-н. *Мяне турбуе толькі адно· раптам увойдзе кантралёр?* А. Асіпенка.

**Кантролер.** Прыбор для рэгулявання работы электрарухавіка (у трамваях, тралейбусах, электравозах і г. д.). *Ніколі яшчэ рычагі кантролера не былі такія паслухмяныя Таніным рукам.* В. Гарбук.

**КАНТЫНГЕНТ — КАНТЫНЕНТ**

**Кантынгент. 1.** Сукупнасць людзей, якія складаюць аднародную ў якіх-н. адносінах групу, катэгорыю. *Сёлета ў нас павялічыўся кантынгент вучняў на два класы.* І. Грамовіч. **2.** Устаноўленая для пэўных мэт найбольшая, гранічная колькасць (норма) чаго-н. *Па ўсёй Расіі ішла мабілізацыя новых і новых кантынгентаў.* М. Лобан.

**Кантынент.** Адна з асноўных вялікіх частак сушы, акружаная акіянам. С і н о н і м: мацярык. *Буйныя ўчасткі сухазем'я называюцца мацерыкамі, або кантынентамі, а больш дробныя — астравамі.* Фізічная геаграфія.

**КАПАТЛІВЫ — КАРПАТЛІВЫ**

**Капатлівы.** *Разм.* Марудлівы, непаваротлівы. *Нейкі ж вельмі капатлівы ён чалавек: здаецца, і не сядзіць склаўшы рукі — робіць увесь час, але і да палавіны яшчэ не дайшоў, хоць час было б і канчаць гэту работу.* «ЛіМ».

**Карпатлівы.** Які патрабуе шмат увагі, цярплівасці; старанны, руплівы. *Цяжкія гэта былі пошукі — патрабавалася карпатлівая даследчая праца.* «ЛіМ».

**КАРОНІСТЫ — КАРОННЫ**

**Кароністы.** З вялікай кронай — каронай дрэва. С і н о н і м: купчасты. *Каронiстае дрэва. Каронiстая ліпа.*

**Каронны. 1.** Які мае адносіны да кароны — царскага галаўнога ўбора. *Кароннае войска стаяла кругом, мястэчкі і селы карала агнём.* А. Вялюгін. **2.** Лепшы, найбольш удалы. *Каронны нумар праграмы. Каронная роля артыста.*

**КАРУНДАВЫ — КАРУНКАВЫ**

**Карундавы.** Які мае адносіны да цвёрдага мінералу — карунду. *Карундавыя іголкі для стэрэафанічных пласцінак.*

**Карункавы.** Які мае адносіны да карункаў — ажурных вырабаў для аздобы бялізны, адзення; зроблены з карункаў; падобны на карункі. *Яна была ў доўгай сукенцы з карункавым каўняром і такімі ж манжэтамі, у капелюшы з букецікам прыколатых да яго штучных пралесак.* Л. Арабей.

**КАРЭЙКА — КАРЭЯНКА**

**Карэйка.** Свіная або цялячая грудзінка спецыяльнага прыгатавання. *Хоць ён і не любіў свініны, але карэйка халоднага капчэння яму падабалася, і ён часта браў яе сабе на снеданне.* «ЛіМ».

**Карэянка.** Прадстаўніца народа, які складае асноўнае насельніцтва Карэі. *Як і многія жанчыны Усходу, карэянкі прызвычаены пераносіць на галаве значны цяжар.* «Звязда».

**КАСМЕТЫЧНЫ — КАСМІЧНЫ**

**Касметычны.** Які мае адносіны да касметыкі — сродкаў для надання свежасці і прыгажосці твару, целу. *Па тэлефоне Фінця Паўлаўна дазналася, што ў Маскве ёсць Інстытут касметычнай медыцыны* І. Грамовіч.

**Касмічны.** Які мае адносіны да космасу, звязаны з яго асваеннем. *І спадарожнік каля зор, у той касмічнай далечы, звініць, шуміць на ўвесь прастор, Зямлі сваёй сігналячы.* Г. Кляўко.

**КВАДРА — КВАРТА**

**Квадра.** Адна з чатырох фаз Месяца (маладзік, сход, поўня, ветах). *У Верамейках сонца гэтае бачылі адны лічаныя хвіліны, але надзея на перамену надвор'я была ўжо — як і заўсёды, з надыходам новай квадры* І. Чыгрынаў.

**Кварта.** Даўнейшая мера вадкіх і сыпкіх рэчываў (крыху меншая за літр). *Гаспадыня ўвайшла ў хату спакойная і ласкавая, наліла яму вялікую кварту малака, накроіла сала, і ён, памятае, адчуў нешта вельмі ўдзячнае да яе.* В. Быкаў.

**КВАДРАНТ — КВАДРАТ**

**Квадрант. 1.** Чацвёртая частка круга. *Возьмем цяпер поўны круг і правядзём у ім гарызантальны і вертыкальны дыяметры. Гэтыя дыяметры падзеляць круг на чатыры чвэрці (квадранты).* Геаметрыя. **2.** Прыстасаванне для наводкі артылерыйскіх гармат; старажытны астранамічны інструмент. *Квадрант — прылада для вертыкальнай наводкі гарматы паводле зададзенага вугла ўзвышэння.* БелЭн.

**Квадрат. 1.** Роўнабаковы прамавугольнік; усё, што мае такую форму. *З гарышча праз аконца віднеўся сіні квадрат неба.* В. Хомчанка. **2.** Здабытак ад памнажэння пэўнага ліку на самога сябе. *Квадрат адмоўнага ліку ёсць лік дадатны.* Алгебра.

**КВАКВА — КВАКТУХА / КВАХТУХА — КВАКША**

**Квоква.** Птушка сямейства чаплевых з кароткімі нагамі і чубком на галаве. *Чорнагаловая квоква.*

**Квактуха.** Курыца, якая выседжвае або водзіць куранят. *Чутна — дзесьці куранят кліча позняя квактуха.* М. Калачынскі.

**Квахтуха.** Тое, што квактуха. *Чуўся ўстрывожаны голас квахтухі — яна збірала куранят.*

**Квакша.** Лягушка, якая жыве пераважна на дрэвах. *З паўзуноў неабходна назваць вераценніцу, балотную чарапаху, а з амфібій — квакшу, трытона грабенчатага і некаторых іншых.* В. Дзяменцьеў.

**КЛАВІР — КЛАВІШ / КЛАВІША — КЛАВІЯТУРА**

**Клавір.** 1. Агульная назва ўсіх струнных клавішных інструментаў клавікордаў, клавесіна, раяля, піяніна і інш. 2. Пералажэнне опернага ці сімфанічнага твора для спявання ў суправаджэнні фартэпіяна або для зыканання на фартэпіяна. — *Гэта толькі клавір, а як мая сімфонія будзе выконвацца аркестрам, тады і дзіцё зразумее.* З. Бядуля.

**Клавіш.** Пласцінка ў музычным інструменце (фартэпіяна, баяне і інш.), якую націскаюць для атрымання гуку. *Рука які ўжо раз цягнецца да клавіша магнітафона.* Т. Бондар.

**Клавіша,** тое, што і клавіш. *Твае легкія пальцы не кранаюць клавішаў. Яны лунаюць над імі.* Г. Ланеўская.

**Клавіятура.** Сукупнасць усіх клавішаў. *Праз хвіліну дзяўчына-тэлеграфістка спрытнымі пальцамі шпарка пачала стукаць па клавіятуры апарата.* «Беларусь».

**КЛАСАВЫ — КЛАСІЧНЫ — КЛАСНЫ**

**Класавы.** Які мае адносіны да грамадскіх класаў. *Класавыя інтарэсы. Класавыя супярэчнасці.*

**Класічны.** 1. Створаны класікам; узорны, дасканалы. *Аваладанне класічнай спадчынай мела важнае значэнне для развіцця самабытнага таленту Коласа.* Л. Фіглоўская. 2. Які мае адносіны да старажытных грэкаў і рымлян. С і н о н і м антычны. *Інтэрнацыянальныя словы з'яўляюцца, як правіла, запазычаннямі з класічных моў — грэчаскай і лацінскай.* «Полымя».

**Класны.** 1. Які мае адносіны да вучнёўскага класа. *Дзеці вельмі любілі сваю класную настаўніцу — чулую, добрую жанчыну.* Р. Няхай. 2. Які паказвае клас, мае высокую ступень чаго-н. *Класны спартсмен. Класная гульня.* У выразе: класны вагон *(уст.)* — пасажырскі вагон у адрозненне ад таварнага. *Даўно пад пагрузкай даўгі эшалон платформы, цяплушкі і класны вагон.* М. Калачынскі.

**КЛЮЧНІЦА — КЛЮЧЫЦА**

**Ключніца.** *Уст.* Служанка ў панскім маёнтку, у распараджэнні якой былі прадукты харчавання і ключы ад месц іх захоўвання. *Старая ўспамінала пра тое, як яе маці служыла ў пані ключніцай, і вельмі ж ганарылася гэтым.*

**Ключыца.** Парная косць плечавога пояса, якая злучае лапатку з грудзінай. *Куля трапіла* яму ў шыю ля самай ключыцы. У. Дамашэвіч.

**КЛЮШКА — КЛЮШНЯ**

**Клюшка.** Лёгкая палка з загнутым канцом для гульні ў хакей. *Не простая гэта рэч — хакейная клюшка. Ды і сам хакей, скажу я вам, гульня не абы-якая.* Р. Няхай.

**Клюшня.** Канечная частка ножкі рака і ракападобных, якая нагадвае клешчы і служыць для хапання. *Маленькі краб, выкінуты хваляю на бераг, затаіўся пад каменем, дзе засталося крыху вільгаці, і пагражальна варушыць чорнымі клюшнямі.* Я. Бяганская.

**КНЯГІНЯ — КНЯЖНА / КНЯЗЁЎНА**

**Княгіня.** Жонка князя. *Даўно пра княгіню забыла Княгініна, Халопенічы — пра халопаў даўно.* П. Панчанка. Н я п р а в і л ь н а: *Падарожнік, што сядзіць у вазку, едзе да будучай нявесты — маладой княгіні (трэба: князёўны) Друцкай.* М. Лупсякоў.

**Княжна.** Тое, што і князёўна. *Раз бяседа вялікая ў князя была: на пасад дачку-княжну садзілі.* Я. Купала.

**Князёўна.** Незамужняя дачка князя; княжна. *У цэнтры ўвагі была князёўна з роду даўнейшых грузінскіх цароў.* Э. Самуйленак.

**КОБРА — КОРБА**

**Кобра.** Вельмі ядавітая змяя вялікіх памераў з плямамі на скуры; жыве ў Азіі і Афрыцы. *Быў у нашым горадзе такі чалавек, які свае летнія адпачынкі траціў на тое, каб недзе ў пясках Сярэдняй Азіі*

*ці на Каўказе лавіць ядавітых кобраў і гюрзаў* Л. Дайнека

**Корба.** Ручка, якой прыводзяць у рух што-н ; дзяржанне *Вера бярэцца за корбу, але спачатку круціць не ў той бок, мякіна струменьчыкам вылятае з каша.* С Грахоўскі

**КОРАК — КОРКА**

**Корак. 1.** Затычка для бутэлек і іншай пасуды. *На стале і пад сталом валяліся крошкі, агрызкі селядцоў, скарынкі хлеба і коркі ад бутэлек.* Я Колас **2.** *Уст.* Цвёрдая набойка на падэшве абутку пад пяткай С і н о н і м ы: абцас, каблук. *Яна прыехала, апранутая з іголачкі, у чорных пальчатках да локцяў, размаляваная, на высокіх корках, у чорных акулярах.* У. Дамашэвіч.

**Корка.** Верхні зацвярдзелы слой чаго-н. *Усё — зямля, дрэвы. стрэхі — пакрылася звонкай ледзяной коркай.* І. Шамякін.

**КОРД — КОРДА**

**Корд. 1.** Вельмі моцныя кручаныя ніткі, якія ідуць на спецыяльныя вырабы (напрыклад, аўтапакрышак). *Новы завод выпускае трывалы корд з віскозы для шыннай прамысловасці.* В. Вольскі. **2.** Разнавіднасць шарсцяной тканіны ў рубчык. *Касцюм з корду.*

**Корда.** Доўгая вяроўка, на якой ганяюць коней па кругу пры выездцы, абучэнні *На манежнай пляцоўцы ганялі на кордзе коней.* У. Караткевіч.

**КРАЙНІ — КРАЯВЫ**

**Крайні. 1.** Які знаходзіцца з краю. на краі чаго-н. *Дом яго быў крайні з другога канца вуліцы.* А. Кулакоўскі. **2.** Надзвычайны. выключны *Крайняя неабходнасць. Крайнія меры.* **3.** Найбольш радыкальны, рашучы, непрымірымы (пра погляды, напрамкі, палітычныя групоўкі і г д.) *Мікола, які заўсёды выказваў самыя крайнія погляды, насупліваўся і змаўкаў.* І. Навуменка.

**Краявы.** Які мае адносіны да краю як да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі *Там гаварылася пра рэшткі прыгонніцтва, прапагандавалася ідэя краявой палітычнай аўтаноміі ў рамках Расіі.* М. Смолкін

**КРУШНЯ — КРУШЫНА**

**Крушня.** Вялікая куча камення. *Лясок, а за ляском — узгоркі, ля крушні крушня, нібы горкі.* А. Лойка

**Крушына.** Невялікае лісцёвае дрэва з чорнымі неядомымі ягадамі *Кусты крушыны маладой карэннем дол прышылі.* Г Кляўко.

**КРЫШТАЛЬ — ХРУСТАЛЬ**

**Крышталь.** Цвердае цела, якое мае натуральную форму мнагагранніка. *Крышталі кварцу. Крышталі солі.*

**Хрусталь. 1.** Шкло высокай якасці, якое мае асобы бляск і здольнасць моцна праламляць святло. *Бакалы, вазы і кілішкі са штучнага хрусталю пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі.* І. Шамякін. **2.** Вырабы з такога шкла. *Сервант з фарфорам, хрусталём.*

**КРЭМЕНЬ — КРЭМНІЙ**

**Крэмень. 1.** Вельмі цвёрды мінерал (раней выкарыстоўваўся для высякання агню). С і н о н і м: скалка. *Крэмень высякаў іскру за іскрай, але вогнішча не хацела распальвацца...* В. Іпатава. **2.** *перан.* Пра чалавека з цвердым, стойкім характарам. — *Вы ў гэтага хлапчука ні аб чым не пытайцеся. Не скажа. Гэта не хлопец, а крэмень.* М. Лынькоў.

**Крэмній.** Хімічны элемент, які ўваходзіць у састаў большасці горных парод. *[Крэмній] займае другое месца паводле распаўсюджанасці ў прыродзе пасля кіслароду.* БелЭн.

**КУПАЛЬНЫ — КУПАЛЬСКІ**

**Купальны.** Які мае адносіны да купання, прызначаны для купання. *Купальны сезон. Купальны касцюм.*

**Купальскі.** Які мае адносіны да Купалля, да абрадаў, звязаных з гэтым старажытным святам *На Купалле моладзь звычайна выпраўлялася з купальскімі песнямі, заклікала ўсіх ісці на гулянне* А Ліс.

## Л

**ЛАЗУРАК — ЛАЗУРЫТ**

**Лазурак.** 1. Светла-сіні колер, колер яснага неба. Сінонім: блакіт *На хмарным небе вызначылася мясцінка сіняга лазурку.* Ц. Гартны 2. Фарба светла-сіняга, блакітнага колеру *Сінія фарбы — ультрамарын і малярны лазурак.* Таваразнаўства.

**Лазурыт.** Мінерал цёмна-сіняга колеру, выкарыстоўваецца для дробных вырабаў, упрыгожанняў, прыгатавання фарбаў (ультрамарыну). *Трапляецца лазурыт у суцэльных шчыльных масах, часам у крышталях кубічнай сістэмы. Колер лазурна-сіні, блакітны, фіялетавы. Бляск шкляны.* БелЭн.

**ЛАКАЛІЗАВАНЫ — ЛАКАЛЬНЫ**

**Лакалізаваны.** Абмежаваны пэўным месцам. *Праўда, прастора гэта не лакалізавана, але яна заўсёды рэальная і канкрэтная ў сваіх дэталях.* У. Дубоўка.

**Лакальны.** Уласцівы толькі пэўнаму месцу, мясцовасці. Сінонім мясцовы *Лакальны характар вы-вадаў і абагульненняў, заснаваны на мясцовых фактах, не засланяе сабой сутнасці справы.* Б. Стральцоў.

**ЛАКАМАБІЛЬ — ЛАКАМАТЫЎ**

**Лакамабіль.** Паравая ўстаноўка, якая прыводзіць у рух розныя машыны; паравік. *Электрастанцыю будуць пачынаць. Пакуль што прывезлі толькі лакамабіль Во, чуеш, і цыркулярка заспявала.* Я. Брыль

**Лакаматыў.** Машына (паравоз, цеплавоз, электравоз) для перамяшчэння па рэйках чыгуначных вагонаў *Заўседы, калі лакаматыву выпадала патрэба развярнуцца, ен бег сюды, спыняўся на крузе, круг круціўся і скіроўваў лакаматыў лупатым вокам наперад* В Казько.

**ЛАРОК — ЛАТАК — ЛАТОК**

**Ларок.** Гандлевая палатка *Прадавалі ў палатках арцельны тавар ганчары, а ў ларках садаводы — калгаснага лета дары.* А Куляшоў

**Латак.** Адкрыты жолаб для сцёку, ссыпання чаго-н., латок (у 2 знач.). *Тут вясной уся вёска спускае сок з бяроз. І сцякае ён у гладышы і дзежачкі па тонкіх латаках.* А Васілевіч.

**Латок.** 1. Адкрыты прылавак (або пераносная скрынка, столік) для гандлю на вуліцы. *Гандлявалі з латкоў, з крам, з будак, а старызнікі раскладвалі свой тавар проста на зямлі.* Я. Скрыган. 2. Адкрыты жолаб для сцёку, ссыпання чаго-н.; латак. *Алёша прыпыняе камбайн і любуецца, як цераз латок ільецца з бункера ў скрыні жывы вясёлы струмень збожжа.* І. Шамякін.

**ЛАЎР — ЛАЎРА**

**Лаўр.** 1. Паўднёвае вечназялёнае дрэва з пахучым лісцем, якое ўжываецца як прыправа. *Прыгожы лаўр, услаўлены паэтамі ўсяго свету, але ён расце не на ўсякай глебе.* Р. Шкраба. 2. *звычайна мн.* Вянок з лісця гэтага дрэва ці га-лінка як сімвал перамогі, узнагароды. *Веру, што лаўры вам не патрэбны.* У. Шыцік.

**Лаўра.** Назва буйных і важных па свайму становішчу мужчынскіх манастыроў. *З захапленнем разглядалі турысты залатыя, бліскучыя на сонцы купалы Кіева-Пячэрскай лаўры і старажытных цэркваў.* «ЛіМ».

**ЛАФЕТ — ЛАФІТ**

**Лафет.** Станок, на якім замацоўваецца ствол артылерыйскай гарматы. *Выводзіў з бою свае батарэі і маёр. Раненыя ляжалі на лафетах Услед за батарэяй пайшлі і мы.* Р Няхай

**Лафіт.** Гатунак чырвонага вінаграднага віна. *Бутэлька лафіту.*

**ЛЕЙКЕМІЯ — ЛЕЙКОМА**

**Лейкемія.** Захворванне крыві, пры якім рэзка павялічваецца колькасць лейкацытаў. Сінонімы. лейкоз, белакроўе *Любое павышэнне абпраменьвання звязана з*

*павышэннем колькасці ракавых захворванняў, у прыватнасці лейкеміі* «ЛіМ»

**Лейкома.** Пляма на рагавой абалонцы вока. С і н о н і м: бяльмо. *Доктар, відаць па звычцы, спачатку так і казаў — лейкома, але стары не зразумеў і перапытаў яго Тады ён проста сказаў — бяльмо ў вас, трэба ехаць у Мінск на аперацыю* «ЛіМ».

**ЛЁСКА — ЛЁСТКА — ЛЁСТКІ**

**Лёска.** Прымацаваная да вудзільна нітка (капронавая жылка і пад.) з рыбалоўным кручком на канцы. *Лёска з'яўляецца адной з самых важных, самых адказных частак вуды.* А. Матрунёнак.

**Лёстка.** Кожная з папярочных планак у калёсных драбінах. *Сымон прывязаў лейцы да лёсткі, саскочыў з воза і пайшоў поруч.* А. Чарнышэвіч.

**Лёсткі.** *звычайна мн. Разм.* Ліслівыя словы, усхваленні. *П'юць за здароўе, па парадку, усіх прысутных за сталом, а графу лесткі сцелюць гладка і славяць чуць не каралём.* М. Машара.

**ЛІЛЕЯ / ЛІЛІЯ — ЛІЯНА**

**Лілея.** *Паэт., уст.* Тое, што і лілія. *У ціхай затоцы распусціліся лілеі. Здавалася, быццам не кветкі, а расцвіла сама рака, бо ўся вада была ўкрыта бела-жоўтымі гарлачыкамі* І. Капыловіч.

**Лілія.** Цыбульная расліна сямейства лілейных з прамым сцяблом і буйнымі кветкамі ў выглядзе званка. *Але, як я чуў, вельмі прыгожа паляць у Гішпаніі: перад кастром нават засмоленую да чорнага бочку з вадой ставяць, а ў яе спускаюць плаваць лілію — сімвал чысціні духу чалавечага.* А. Лойка.

**Ліяна.** Агульная назва павойных раслін, пашыраных у трапічных лясах. *Там бразільскі лес, ліяны, тут дыван зялёны прэрый, іх ад сіні акіяна аддзяляюць Кардыльеры.* К. Крапіва.

**ЛІМАННЫ — ЛІМОННЫ**

**Ліманны.** Які мае адносіны да лімана — заліва ў нізоўях ракі або саленага возера паблізу мора. *Месяц нам спадабалася, і мы рашылі адпачыць на беразе. Гэта быў ліманны бераг, як пазней даведаліся ад мясцовых жыхароў.* «ЛіМ».

**Лімонны. 1.** Які мае адносіны да лімона, характэрны для яго. *Пан Мусатаў сядзеў за сталом і папіваў ледзяную ваду з лімонным сокам.* У. Караткевіч. **2.** Светла-жоўты, колеру спелага лімона. *Вось лімонны, з тонкімі зялёнымі пражылкамі лісток бярозы.* Р. Ігнаценка.

**ЛІНЕЕНЫ — ЛІНЕЙНЫ**

**Лінееены.** Такі, на якім праведзены лініі для пісьма. *Лінееная папера. Лінеены лісток.*

**Лінейны. 1.** Які мае адносіны да лініі; які мае выгляд лініі, складаецца з ліній. *Лінейная геаметрыя. Лінейны арнамент.* **2.** Прызначаны для абслугоўвання лініі сувязі або шляхоў зносін. *Лінейны манцёр. Лінейны дыспетчар.*

**ЛІТАРАЛЬНЫ — ЛІТАРНЫ**

**Літаральны. 1.** Які дакладна адпавядае чаму-н. С і н о н і м: даслоўны. *У практыцы беларуска-ўкраінскага паэтычнага ўзаемаперакладу мы часта сустракаемся з цэлымі радкамі, часам страфамі літаральнага перакладу.* Э. Мартынава. **2.** Дакладны, прамы, не пераносны. *Літаральны сэнс слова.*

**Літарны.** Які мае адносіны да літары, літар. *У час навучання грамаце павінна шырока прымяняцца разразная азбука і літарная каса.* М. Марчанка.

**ЛІХТАР — ЛІХТЭР**

**Ліхтар.** Асвятляльны прыбор з крыніцай святла ў шкляным шары або ў футляры, скрынцы са шклянымі сценкамі. *Недалёка на сценцы мігае закапцелы чыгуначны ліхтар.* М. Лынькоў.

**Ліхтэр.** Невялікае грузавое, звычайна несамаходнае судна, прызначанае для пагрузкі і разгрузкі вялікіх суднаў або для мясцовых перавозак. *У навігацыю гэтага года першыя чатыры рабочыя колы турбін перавязе караван ліхтэраў* «Звязда»

**ЛОТАС — ЛОТАЦЬ**

**Лотас.** Паўднёвая шматгадовая травяністая водная расліна з прыгожымі буйнымі кветкамі. *[Лотас] — харчовая, лекавая і дэкаратыўная расліна.* БелЭн.

**Лотаць.** Шматгадовая травяністая расліна з жоўтымі кветкамі, якая расце звычайна на нізінных лугах, на балотах. *На балоце разгарнула галоўкі лотаць — усё, вясна... І так далей — лета, восень. Прырода завяла парадак — прырода яго блюдзе.* А. Кудравец.

**ЛЯМЕШ — ЛЯМЕШКА**

**Лямеш.** Частка плуга, якая падразае зямлю знізу. С і н о н і м: нарог. *Баразна вылузвалася з-пад лемяша, бегла за плугам, цьмяна паблісквaючы на сонцы.* М. Капыловіч.

**Лямешка.** *Абл* Страва з запаранага цеста, разведзенага вадой (з маслам ці салам). *Кармілі звычайна лямешкай, што складалася толькі з вады і мукі, без усялякай прыправы.* Р. Няхай.

**ЛЯСНІК — ЛЯСНІЧЫ — ЛЯСУН**

**Ляснік.** Даглядчык, вартаўнік лесу. *Сялянства ад веку адносіцца да леснікоў з пашанай і бояззю, бо ад іх залежыць многае.* П. Пестрак.

**Ляснічы.** Загадчык лясніцтва, спецыяліст па лясной гаспадарцы. *Ляснічы, стары чалавек, адступіў са сваімі, каб не трапіць у рукі фашыстаў* І. Шамякін.

**Лясун.** У славянскай міфалогіі: казачны жыхар лесу, лясны дух. *Стаяў каліс тут бор стары, і жыў лясун у тым бары.* М. Багдановіч.

# М

**МАГІСТР — МАГІСТРАНТ — МАГІСТРАТ**

**Магістр. 1.** Першая вучоная ступень у некаторых зарубежных краінах і дарэвалюцыйнай Расіі; з 1992 г. і ў нашай рэспубліцы; асоба, якая мае гэту ступень. *Дык яны ўсе маюць вышэйшую адукацыю. Кожны з іх магістр, а то і доктар.* М. Машара. || *Ужо з новага навучальнага года [1992] па некаторых спецыяльнасцях у БДУ ўводзяцца дзве акадэмічныя ступені — бакалаўра і магістра.* «Звязда». **2.** У сярэднія вякі: тытул кіраўніка каталіцкага духоўнарыцарскага ордэна; асоба, якая мела такі тытул. *У бітве загінуў вялікі магістр (глава ордэна) і большасць рыцараў. Грунвальдскі бой зламаў сілы ордэна і паклаў канец захопам нямецкіх рыцараў у Прыбалтыцы.* Гісторыя сярэдніх вякоў.

**Магістрант.** Асоба, якая рыхтуецца да абароны дысертацыі на ступень магістра. *Дысертацыя магістранта. Выступленне магістранта.*

**Магістрат.** Гарадское ўпраўленне ў некаторых краінах; будынак, у якім яно размяшчаецца. *Суседзі ж былі як суседзі, усе службовы народ — адны працавалі ў магістраце, другія ў іншых гарадскіх і нямецкіх установах.* М. Лынькоў.

**МАДОННА — ПРЫМАДОННА**

**Мадонна.** У католікаў: божая маці, багародзіца. *Да смерці прыеліся храмы, касцёлы, і нават краса чарнавокіх мадонн.* П. Панчанка.

**Прымадонна.** Оперная спявачка, якая выконвае першыя ролі. *Комік Дар'ялаў, аперэтачная прымадонна Чарская завалодалі нашымі пачуццямі і назаўседы выклікалі захапленне сваім майстэрствам.* Я. Рамановіч.

**МАДУЛЯТАРНЫ — МАДУЛЯЦЫЙНЫ**

**Мадулятарны.** У радыётэхніцы: які мае адносіны да мадуляцыі — змянення характару ваганняў высокай частаты пад уплывам ваганняў больш нізкай частаты. *Мадулятарная лямпа.*

**Мадуляцыйны.** У музыцы: які мае адносіны да мадуляцыі — пераходу з адной танальнасці ў другую. *Мадуляцыйны пераход у гучанні*

**МАЙСТРАВЫ — МАЙСТРОЎСКІ — МАЙСТЭРСКІ**

**Майстравы.** *Уст* Рабочы, рамеснік. *З усіх вагонаў пайшлі мужчыны з чамаданамі, партфелямі, дзеці, сяляне ў лапцях, армяках, майстравыя з інструментамі.* П. Галавач.

**Майстроўскі.** Які належыць майстру. *Майстроўскі метр. Майстроўскі цыркуль.*

**Майстэрскі.** Уласцівы сапраўднаму майстру; вельмі добра, дасканала выкананы. *Майстэрская работа. Майстэрскае выкананне.*

**МАКАРАНІЧНЫ — МАКАРОННЫ**

**Макаранічны.** *Кніжн.* Багаты макаранізмамі — замежнымі словамі або выразамі, якія праніклі ў родную мову ў нязменным выглядзе. *Аб уласцівасцях і якасцях характару, аб абстаноўцы, у якой ён складаўся, апавядае Я. Колас, калі гаворыць пра макаранічную мову шляхціца Бусыгі.* «Полымя».

**Макаронны.** Які мае адносіны да макароны; прыгатаваны з макароны. *Я хадзіў ля педінстытута, макароннай фабрыкі, глядзеў на дамы, на іх доўгія вадасцёкавыя трубы, на балконы, невялічкія, наіўна адкрытыя староннyму воку.* Л. Дайнека.

**МАКРАСКАПІЧНЫ — МІКРАСКАПІЧНЫ**

**Макраскапічны.** Бачны простым, няўзброеным вокам. *Макраскапічная анатомія вывучае будову арганізма, што можна бачыць няўзброеным вокам.* Птушкагадоўля.

**Мікраскапічны. 1.** Зроблены, даследаваны пры дапамозе мікраскопа. *Мікраскапічныя назіранні.* **2.** Вельмі малы, які можна ўбачыць толькі пад мікраскопам. *У мікраскапічных арганізмах мы бачым прасцейшыя праяўленні жыцця* К. Цімiразеў. **3.** *перан* Вельмі маленькі, нязначны па велічыні, памерах. *У Веркі з'яўлялася на сукенцы мікраскапічная плямка — сукенку мянялі.* А. Карпюк.

**МАЛАДЖАВЫ — МАЛАДЗЕЙШЫ — МАЛОДШЫ**

**Маладжавы.** Які выглядае маладзейшым за свае гады. *Адчуваючы няемкасць, Казік нахмурыўся, і яго тонкі маладжавы твар стаў ненатуральна строгім, сур'ёзным.* У. Краўчанка. Н я п р а в і л ь н а: *Яны [ахоўнікі] былі маладжавыя (трэба: маладыя) па ўзросту і бялявыя з выгляду.* М. Аўрамчык.

**Маладзейшы.** *Выш ст. да прым.* малады; больш малады. *Аблуплены на санцапёку нос і шчокі Алёшы былі густа абсыпаны вяснушкамі, і ад гэтага ён выглядаў маладзейшым за свае семнаццаць год — здаваўся хлапчуком.* І. Шамякін.

**Малодшы. 1.** Якому менш год у параўнанні з кім-н.; самы малады сярод іншых. *Следам за гэтым пачуліся лёгкія і частыя крокі, і ў пакой увайшла малодшая дачка пана падлоўчага.* Я. Колас. **2.** Ніжэйшы чынам, званнем; ніжэйшы па службоваму становішчу. *Яфрэйтарскі чын быў адзін, ні малодшых, ні старшых яфрэйтараў не было.* К. Чорны.

**МАЛАДЗІЦА — МАЛАДУХА**

**Маладзіца.** Маладая замужняя жанчына. *Дзяўчаты і маладзіцы вадзілі ля яго [кастра] карагоды, мужчыны і хлопцы спявалі і танцавалі.* У. Дубоўка.

**Маладуха.** *Разм.* **1.** Маладая, нявеста. *Сват Рыгорка стрыг вачамі, стараючыся непрыкметна кінуць позірк на маладуху, улавіць яе настрой.* І. Дуброўскі. **2.** Тое,

што і маладзіца. *Ля варот на вуліцы бразнулі пустыя вёдры, і на плот узлокцілася Каця Сідоркава, бойкая маладуха, суседка Тодаравых — Што гэта за вайна ў вас тутака!* М. Ракітны.

МАЛЯР — МУЛЯР

**Маляр. 1.** Рабочы, які беліць, фарбуе дамы, памяшканні і г. д. *Удзень тут працавалі маляры, і ў клубе моцна пахла фарбамі.* І. Шамякін. **2.** *перан.* Пра дрэннага мастака, жывапісца. *Бажкам не веру маляваным, што мажуць фарбай маляры.* Я. Купала.

**Муляр. 1.** Рабочы, які будуе што-н. з каменю, цэглы. *Муляр з цэглы дом складае, сценка ў сценку роўныя, вы не знойдзеце нідзе працы больш шаноўнае.* А. Астрэйка. **2.** Майстар па кладцы і рамонту печаў. С і н о н і м: пячнік. *Цяпер у нашай вёсцы, калі трэба скласці печ,— цэлая праблема: муляра не знойдзеш.* «Звязда».

МАНАРХ — МАНАХ

**Манарх.** Асоба, якая стаіць на чале манархіі (цар, кароль, імператар і г. д.). *У часы бурных народных выступленняў зляталі галовы не толькі паноў, але і саміх манархаў.* А. Якімовіч.

**Манах.** Член царкоўнай абшчыны, які жыве ў манастыры, даўшы абяцанне весці аскетычны лад жыцця. *Маці і тая плюецца, калі хто часам скажа пра манаха.* М. Лынькоў.

МАНТЫЛЬЯ — МАНТЫЯ

**Мантылья.** *Уст.* Кароткая жаночая накідка без рукавоў. *Дзяўчынка стрымалася і знешне спакойна папраравіла на плячах карункавую мантылью.* У. Караткевіч.

**Мантыя. 1.** Доўгая шырокая адзежына ў выглядзе плашча. *За сталом — трое суддзяў у чорных мантыях.* М. Машара. **2.** Дзве складкі скуры, якія звешваюцца са спіны некаторых беспазваночных жывёл. *Мантыя ўяўляе з сябе дзве складкі скуры, якія звешваюцца справа і злева ўніз са спіны малюска Яны, нібы плашч, пакрываюць мяккае цела малюска Адсюль і назва мантыя.* «Заалогія».

МАНУМЕНТ — ПАСТАМЕНТ

**Манумент.** Велічнае збудаванне ў гонар якой-н. выдатнай падзеі або асобы. С і н о н і м: помнік. *Нашчадкамі героі не забыты: на плошчах манументы ім стаяць.* Х. Жычка.

**Пастамент.** Аснова, фундамент помніка, статуі, калоны і г. д. С і н о н і м: п'едэстал. *Афіцэр, скамандаваўшы «на плячо», кінуўся да помніка, узлез на пастамент і пачаў зрываць сцяг, але паслізнуўся і пляснуўся на зямлю.* І. Гурскі.

МАРОКА — МАРОШКА

**Марока.** *Разм.* Аб чым-н. заблытаным, валакітным, клопатным. — *Павязём [яблыкі] у Гомель — збудзем дзешавей. Затое ніякай марокі з гэтай паездкай не будзе.* М. Даніленка.

**Марошка.** Балотная расліна з белымі кветачкамі і аранжавымі ягадамі; ягады гэтай расліны. *Спелай марошкай ірдзее скрозь і лагчына і яр.* А. Александровіч.

МАРЭНАВЫ — МАРЭННЫ

**Марэнавы.** Які мае адносіны да травяністай расліны марэны, з карэнняў якой атрымліваюць чырвоную фарбу; ярка-чырвоны, колеру марэны. *Астроўскі важна сеў у крэсла з высокай спінкай і вычварнай разьбою, за стол марэнавай афарбоўкі.* І. Гурскі.

**Марэнны.** Які мае адносіны да марэны — вялікай колькасці абломкаў горных парод ледніковага паходжання. *Марэнныя ўзгоркі і ўзвышшы ў Палессі даволі рэдкія.* «Прырода Беларусі».

МАСЦІСТЫ — МАСЦІТЫ

**Масцісты.** Чыстай, добрай масці (пра каня). *Масцістая кабыліца. Масцісты стаеннік.*

**Масціты.** Які заслужыў сваёй шматгадовай плённай дзейнасцю павагу і прызнанне. *Як ні вярці, як ні круці — ёсць нявесткі, ёсць зяці! Зразумела, што сумесна жыць масцітым з імі цесна.* Р. Барадулін.

**МАТЧАВЫ — МАЧТАВЫ**

**Матчавы.** Які мае адносіны да матча. *Форма спаборніцтва па традыцыі засталася матчавай* «Маладосць».

**Мачтавы.** Які мае адносіны да мачты, з якога робяць мачты. *На ўзлессі вынесліся пад неба мачтавыя сосны, побач з імі раскінуліся цёмна-зяленыя шатры елак, а па схілах яроў разросся малiннік* З. Бандарына.

**МЕДАЛЬЕР — МЕДАЛЬЁН**

**Медальер.** Спецыяліст па вырабу форм для адліўкі і чаканкі манет і медалеў. *Філіграннае майстэрства айчынных медальераў атрымала заслужанае прызнанне.* «ЛіМ».

**Медальён.** Ювелірны выраб авальнай або круглай формы, у які звычайна ўстаўляецца партрэт; носіцца на ланцужку, шнурку на шыі. *Апусціўшы галаву, яна церабіла кароткімі пальчыкамі шаўковы шнурок медальена.* Б. Стральцоў.

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ — МЕМУАРНЫ**

**Мемарыяльны.** Які служыць для ўвекавечання памяці якой-н. асобы ці падзеі. *У дваццатыя і трыццатыя гады Вітольд Каятанавіч [Біруля] актыўна працуе ў жанры мемарыяльнага пейзажа. Пэўна, можна лічыць, што ён якраз і пачаў ствараць айчынны мемарыяльны пейзаж.* В. Карамазаў.

**Мемуарны.** Які мае адносіны да мемуараў — літаратурнага твора ў форме ўспамінаў аўтара пра падзеі мінулага. *Большасць фактаў, што прыводзяцца ў «Летапісе», выверaны намі па першакрыніцах (архіўных дакументах і мемуарнай літаратуры).* Г. Кісялёў.

**МЕНЗУЛА — МЕНЗУРКА**

**Мензула.** *Спец.* Інструмент для тапаграфічных здымак. — *Гэта ж мая любімая работа — мензула, нівелір, libplanшэт, калька і прасторы зямлі, запісаныя на паперу лініямі і матэматычнымі знакамі.* Я. Скрыган.

**Мензурка.** Пасудзіна з дзяленнямі для дакладнага адмервання вадкасцей. *Дзецюкі і дзяўчаты ля кніжак сядзяць, ля прабірак, мензурак, мадэляў і карт.* У. Дубоўка.

**МЕТРАПОЛІЯ — МІТРАПОЛІЯ**

**Метраполія. 1.** У Старажытнай Грэцыі: горад-дзяржава (поліс) у адносінах да заснаваных ім пасяленняў-калоній на тэрыторыі іншых краін. *Парадкі калоній у асноўным узнаўлялі лад сваіх метраполій, але родавыя сувязі ў калоніях былі значна слабейшымі, чым у метраполіях.* В. Сяргееў. **2.** Капіталістычная краіна ў адносінах да сваіх калоній. *Метраполія эксплуатавала калоніі, якія з'яўляліся для яе прамысловасці пастаўшчыкамі сыравіны і спажыўцамі гатовых вырабаў.* «Эканамічная геаграфія замежных краін».

**Мітраполія.** Царкоўна-адміністрацыйная акруга, якая знаходзіцца пад кіраўніцтвам мітрапаліта; галоўны горад гэтай акругі. *Стараючыся забыцца на сваё паганскае мінулае, Кіеў паспешліва будуе цэрквы. Лепшая з лепшых між іх Сафія, мітраполія Русі.* Л. Дайнека.

**МЕТЭАРЫТ — МЕТЭОР**

**Метэарыт.** Цвёрдае цела касмічнага паходжання, якое ўпала на Зямлю з міжпланетнай прасторы. *Тады я паверыў, што ўчора сапраўды недзе ўпаў метэарыт, і мне пашчасціла якраз у той момант загадаць цудоўнае жаданне, і гэта жаданне здзейснілася.* Я. Радкевіч.

**Метэор.** Распаленае цела касмічнага паходжання, якое ярка свеціцца і хутка рухаецца ў зямной атмасферы. С і н о н і м ы: знічка, падаючая зорка. *Усё яго [М. Багдановіча] жыццё — гэта подзвіг. Напорлівае і роўнае гарэнне адной страсці. І кароткатэрміновае. Вось чаму яго жыццё нагадвае нам успышку метэора.* М. Стральцоў. Н я п р а в і л ь н а: — *А зараз даводзяць, што яны [кратэры] ад*

*падзення метэораў'. (трэба· метэарытаў).* А. Карпюк.

**МІС — МІСІС**

**Міс.** Форма звароту да незамужняй жанчыны ў англамоўных краінах, незамужняя жанчына; дзяўчына. *Міс — ветлівы зварот да дзяўчыны ў Англіі і Амерыцы (звычайна перад імем, прозвішчам).* «Тлумачальны слоўнік для сярэдняй школы».

**Місіс.** Форма звароту да замужняй жанчыны ў Англіі і Амерыцы; замужняя жанчына. *Грукоча машына Маўчы, качагар, і пылам вугольным давіся! Хай з топкі тваей не праб'ецца ўгар да містэраў хмельных і місіс.* А. Дудар.

**МІСТЫКА — МІСТЫЧНАСЦЬ**

**Містыка. 1.** Рэлігійна-ідэалістычны погляд, які прызнае існаванне надпрыродных, таямнічых сіл і магчымасць зносін з імі чалавека. *Па сумяшчальніцтву з містыкай гэты чалавек займаўся яшчэ выхаваннем юнацтва ў духу адданасці радзіме і прастолу, таму што займаў пасаду начальніка штаба ваенна-навучальных устаноў* У. Караткевіч. **2.** *перан. Разм.* Штосьці загадкавае, незразумелае. *Над горам яго маленства яна плакала. Сама будучы ўжо спрацаваная і хворая, яна да містыкі ўжо тады даводзіла сваё замілаванне да яго.* К. Чорны.

**Містычнасць.** Таямнічая загадкавасць, незразумеласць. *Жах раптам апанаваў чалавека, набыўшы адценні містычнасці.* К. Чорны.

**МІСТЫФІКАЦЫЯ — МІСТЫЦЫЗМ**

**Містыфікацыя.** Наўмыснае ўвядзенне каго-н. у зман. *Няўжо гэта так і будзе? Гэта ж проста нейкая недарэчная містыфікацыя.* М. Зарэцкі.

**Містыцызм.** Рэлігійна-ідэалістычны светапогляд, заснаваны на містыцы; схільнасць да містыкі. *Працэс пераадолення рэштак семінарскай «навукі» ў Лабановіча — чалавека з выразным нахілам да містыцызму — адбываўся амаль пакутліва.* «Полымя»

**МІФАЛАГІЧНЫ — МІФІЧНЫ**

**Міфалагічны.** Які мае адносіны да міфалогіі — сукупнасці міфаў якога-н. народа. *У пошуках гераічнага паэт [М. Багдановіч] часта звяртаецца да міфалагічных вобразаў.* С. Майхровіч.

**Міфічны. 1.** Які мае адносіны да старажытных міфаў. *Фігура міфічнага героя Праметэя, намаляваная на шкатулцы, сімвалізуе сабой беларускага селяніна, які разрывае ланцугі панскай няволі.* «Беларусь». **2.** *перан* Авеяны паданнямі; легендарны, казачны. *На Піншчыне старыя людзі любяць расказваць пра здарэнне з недарэчным прыставам. Ён ужо даўно зрабіўся міфічнай фігурай.* В. Вольскі. **3.** *перан. Разм.* Які не існуе ў сапраўднасці; прыдуманы, неверагодны.

**МІЯКАРД — МІЯКАРДЫТ**

**Міякард.** Мышачная сценка сэрца. *Інфаркт міякарда — цяжкая хвароба. Але медыцынскай навукай даўно даказана· асобы, што перанеслі яго, павінны вярнуцца да актыўнай працы.* «Звязда».

**Міякардыт.** Захворванне сардэчнай мышцы — міякарда. *Прыкметы міякардыту залежаць ад парушэння сардэчнага рытму і недастатковай скарачальнай функцыі міякарда (агульная слабасць, задышка ў спакоі, хуткая стамляльнасць, сэрцабіцце, боль у вобласці сэрца).* БелЭн.

**МУЗЫКАЛЬНЫ — МУЗЫКАНЦКІ — МУЗЫЧНЫ**

**Музыкальны. 1.** Здольны да музыкі; які тонка разумее. адчувае музыку. *— Вы ж самі хваліліся, што ў вас музыкальныя здольнасці.* І. Шамякін. **2.** Прыемны для слыху; меладычны. *Купала як паэт вельмі даражыць музыкальным бокам паэзіі.* І. Навуменка.

**Музыканцкі.** Які мае адносіны да музыканта; з музыкантаў. *Музыканцкі ўзвод.*

**Музычны.** Які мае адносіны да музыкі, характэрны для яе. *Пашырэнне музычнай культуры сярод шырокіх мас працоўных патрабавала і павелічэння музычнай літаратуры.* А. Воўк.

**МУШКЕТНЫ — МУШКЕЦЁРСКІ**

**Мушкетны.** Які мае адносіны да мушкета — старажытнага ружжа. *Мушкетны выстрал. Мушкетны ствол.*

**Мушкецёрскі.** Які мае адносіны да мушкецёра — салдата, узброенага мушкетам. *Мушкецерскі полк. Мушкецерская форма.*

**МЯДЗВЕДЗІЦА — МЯДЗВЕДКА**

**Мядзведзіца.** Самка мядзведзя. *Бегала мядзведзіца па лясах наўкола, пытала, дзе гнездзяцца меданосы-пчолы* М. Калачынскі.

**Мядзведка.** Земляное насякомае з тоўстым целам, пакрытым кароткімі мяккімі валаскамі, шкоднік сельскагаспадарчых культур. *У рацыене бусла пераважаюць шкодныя насякомыя (напрыклад, мядзведкі, якія знішчаюць пасевы гароднінных культур).* «Звязда».

**МЯЗГА — МЯЗДРА**

**Мязга. 1.** Мяккая частка дрэва між карой і драўнінай. *І пні [я] памагаў капаць, і драў тую ж бярозту. Асабліва ўлетку, на канікулах Тады акурат пачынала адставаць ад мязгі свежая бяроста.* Б. Сачанка. **2.** Маса, якая ўтвараецца пасля таўчэння, расцірання чаго-н. *Эол сядзеў тады ля печкі,— мязгу скабліў на перапечкі ды лапці лыкам падплятаў.* «Энеіда навыварат».

**Мяздра.** Падскурная клятчатка ў жывёл; сподні бок выраблены скуры. *Падскурную клятчатку называюць мяздрой.* «Таваразнаўства».

**МЯТЛІСТЫ — МЯТЛІЧНЫ — МЯЦЁЛЧАТЫ**

**Мятлісты.** Такі, як мяцёлка, пышны. *Зусім не відаць Агаткі: вусаты ячмень з аднаго боку, а з другога — мятлісты авёс.* Я. Колас.

**Мятлічны.** Які мае адносіны да пустазелля мятліцы. *Руневіч выплюнуў мятлічную саломінку, якую ўсё жаваў, паглядзеў на Крушыну* Я. Брыль.

**Мяцёлчаты.** Які мае суквецце ў выглядзе мяцёлкі. *Мяцелчатае суквецце.*

## Н

**НАБАЖЭНСТВА — НАБОЖНАСЦЬ**

**Набажэнства.** Царкоўная служба. С і н о н і м: богаслужэнне. *Назаўтра зранку таксама ішла споведзь, а потым ужо служылася абедніца, набажэнства, спецыяльна створанае для палешукоў, бо звычайна іх доўга ў царкве не затрымлівалі.* Я. Колас.

**Набожнасць.** Шчырая вера ў Бога. С і н о н і м: багамольнасць. *Цельшынцы не вызначаліся асаблівай набожнасцю і рэлігійнасцю, але царкоўныя абрады спраўлялі* Ю. Пшыркоў.

**НАБОЙ — НАБОЙКА**

**Набой.** Зарад пораху са шротам, карцеччу або куляй для паляўнічай стрэльбы; патрон з такім зарадам. *Дзед Піліп узяў сваю двухстволку, праверыў набоі і павесіў над самым ложкам.* М. Ваданосаў.

**Набойка.** Ніжні слой абцаса; металічная пласцінка, якая набіваецца на абцас і насок абутку. *Бадай на ўвесь тэрмін навучання хопіць вопраткі і абутку Калі што парвецца, можна зашыць, а на абцасы чаравікаў набіць набойкі* І. Навуменка.

**НАГОДА — НЯГОДА**

**Нагода.** Прычына, выпадак, зручны момант. *Разбор архіва быў напярэдні, мне яшчэ трэба будзе, хочацца заглянуць у тую папку, як толькі прыйдзе нагода.* Я. Брыль.

**Нягода,** *звычайна мн.* Няшчасце; цяжкасці, непрыемнасці. *Няглядзячы на свае шэсцьдзесят год,*

*Раман Дзянісавіч быў чалавек моцнага складу, рослы і не сагнуты нягодамі, што сустрэў у жыцці* Т. Хадкевіч.

**НАДВЯЧОРАК — ПАДВЯЧОРАК**

**Надвячорак.** Пара перад самым вечарам. *Насустрач дыхнула вільгаццю, мокрым пахам травы, алешніку і ракітніку — гэтак, як заўседы пахне надвячоркам ад ракі.* А. Жук.

**Падвячорак.** Лёгкая ежа для спажывання між абедам і вячэрай. *Юзя вынесла ей падвячорак — зацукраваныя чарэшні і кавалак пірага.* А. Бажко.

**НАДЗВЫЧАЙНЫ — НЕЗВЫЧАЙНЫ**

**Надзвычайны.** 1. Спецыяльна прызначаны, прыняты, скліканы і г. д. *Становішча для рэспублікі ствралася небяспечнае, прыходзілася прымаць надзвычайныя меры.* Я. Колас. 2. Вельмі вялікі, моцны па сваёй сіле, праяўленню; які мае вялікае значэнне. *Поспех «Балад і рамансаў» Міцкевіча ў чытача быў надзвычайны* А. Лойка.

**Незвычайны.** 1. Які вылучаецца сярод іншых; выключны. *Пакою гэтаму надаваў незвычайную, шматвугольную форму дах, яго адмысловыя выступы.* І. Шамякін. 2. Не такі, як звычайна, як заўсёды, непрывычны. *Вера адчула раптам незвычайную лёгкасць.* А. Асіпенка.

**НАДРЫЎ — НАРЫЎ**

**Надрыў.** 1. Надарванае месца. *Кніга сапсавана: на шэрагу старонак выяўлены надрывы, некалькіх старонак зусім няма. «Настаўніцкая газета».* 2. *перан.* Узбуджанасць, хваравітасць у праяўленні сваіх пачуццяў; фізічнае напружанне. *Ілья Рыгоравіч прыгорбіўся, апусціў галаву, схапіўся рукою за горла і ўжо не стрымліваў кашлю, а бухаў і бухаў з нейкім надрывам.* Я. Герцовіч.

**Нарыў.** Гнойныя пухліны ў тканцы арганізма. С і н о н і м: абсцэс. *Каравая ануча на яго назе разматалася, і на чорнай пяце быў бачны жоўты, выспелены нарыў* М. Капыловіч.

**НАМАРАЗЬ — НАМАРЗЕНЬ**

**Намаразь.** Асадак снегу, падобны на шэрань, які ўтвараецца ў сырое надвор'е на галінах, дроце і г. д., слой лёду на чым-н. *Заглянуць з вуліцы ў хату ніхто не мог: шыбы пакрыліся тоўстым пластам намаразі.* І. Шамякін.

**Намарзень.** Падоўжны брусок, які набіваецца на капылы ў санях. *Трашчаць намарзні, сціснутыя з бакоў .. вязамі.* І. Пташнікаў.

**НАТАРЫУС — НАТАРЫЯТ**

**Натарыус.** Службовая асоба, упаўнаважаная сведчыць, афармляць розныя юрыдычныя акты, дакументы. *З дакументаў я здыму ў натарыуса копіі і вярну табе.* Х. Жычка.

**Натарыят.** Дзяржаўны орган, у абавязак якога ўваходзіць сведчанне, афармленне розных юрыдычных актаў, дакументаў. С і н о н і м: натарыяльная кантора. *Натарыят забяспечвае лепшую ахову набываемых грамадзянамі і арганізацыямі правоў, замацоўвае іх ва ўстаноўленай юрыдычнай форме* «Звязда».

**НАТАТКА — НАТАЦЫЯ**

**Нататка.** Кароткі запіс для памяці. *Спадзеючыся на сваю памяць, Міхась ніякіх нататак не рабіў — ліст паперы, што ляжаў перад ім, застаўся чысты.* У. Шахавец.

**Натацыя.** Настаўленне, павучанне. *Давялося яму выслухаць суровую натацыю камандзіра батарэі.* І. Грамовіч.

**НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫ — НАЦЫЯНАЛЬНЫ**

**Нацыяналістычны.** Які мае адносіны да нацыяналізму — ідэалогіі і палітыкі, якая прапаведуе нацыянальную выключнасць адной нацыі і пагарду да іншых. *Непрымірымы вораг самаўладства, Алесь Гарун, вярнуўшыся з ссылкі, не разабраўся ў складанай абстаноўцы, паддаўся нацыяналістычнаму ўплыву.* М. Ярош.

**Нацыянальны.** **1.** Які мае адносіны да нацыі, нацыянальнасці, звязаны з іх грамадскім жыццем. *Мы за той нацыянальны рух, які з'ядноўвае сілы пралетарыяту, а не разбівае іх* Л. Арабей. **2.** Які ўласцівы нацыі, выражае яе характар. *Верашчака — гэта страва такая нацыянальная беларуская страва.* Я. Васіленак. **3.** Які належыць пэўнай краіне, дзяржаўны. *Нашы лясы з яўляюцца адным з буйнейшых нацыянальных багаццяў* «Прырода Беларусі».

**НАЧЫНКА — НАЧЫННЕ**

**Начынка.** Тое, чым начынена, напоўнена што-н. *Дзеці будуць ласавацца цукеркамі з барбарысавай начынкай.* В. Хомчанка.

**Начынне.** *зб* **1.** Набор прадметаў, інструментаў для выканання якой-н. работы. *Улетку цесляры вандравалі са сваім начыннем — пілкаю і сякерамі — па ўсёй ваколіцы* С. Александровіч. **2.** Сукупнасць прадметаў хатняга, гаспадарчага ўжытку і г. д. *Цётка Арына бразгала на кухні начыннем, нешта гаварыла напаўголас, відаць, толькі для сябе.* А. Асіпенка.

**НЕБЫЛЬ — НЕБЫТ — НЕБЫЦЦЁ / НЯБЫТ**

**Небыль.** Тое, чаго не было, не бывае; небыліца. — *Няўжо, калі часам узвядуць на мяне якую небыль, ты не закінеш слова, Сямён Іванавіч?* Т. Хадкевіч.

**Небыт.** *Разм.* Клопат, цяжар; абуза. *Душу грызла пакута ад таго, што занемагла [Зіна] у такі суровы час, што робіць многа небыту хлопцам у гэтакім складаным паходзе.* А. Кулакоўскі.

**Небыццё.** Адсутнасць існавання, жыццядзейнасці; нябыт. *Гора, качэўная доля ў небыццё адышлі.* А. Александроеіч.

**Нябыт**. Адсутнасць быцця, існавання, жыцця; небыццё. *Мяне кудысьці імчыць, як лісцінку. У жыццё? У нябыт?* З. Бядуля.

**НЕРАСТ — НЕРАТ**

**Нераст.** Адкладанне рыбамі ікры і апладненне яе. *Толькі ў час нерасту збіраюцца самы сутак на трое ці каля гэтага ў невялікія чароды.* В. Вольскі.

**Нерат.** Рыбалоўная снасць з лазы ў выглядзе доўгага конуса. *Вунь за тым алешнікам пачынаецца балота, дзе ў глыбокіх ямах, невялічкіх аеравых азёрах хлапчукі кошыкамі і нератамі лавілі ўюноў і карасёў.* А. Бялевіч.

**НОСЧЫК — НОСЬБІТ**

**Носчык.** Рабочы па пераносцы чаго-н. С і н о н і м насільшчык. *Бацька ўсю зіму працаваў у горадзе грузчыкам, носчыкам дроў, дворнікам, але заробленых грошай зноў не хапіла* «ЛіМ».

**Носьбіт.** Той, хто валодае, надзелены чым-н., можа быць выразнікам, прадстаўніком чаго-н. *Носьбітам думак і пачуццяў аўтара выступае ў апавяданні электраправодчык Базыль.* Л. Арабей.

**НЯВЕСТА — НЯВЕСТКА**

**Нявеста.** Дзяўчына (або жанчына), якая выходзіць замуж. С і н о н і м ы: маладая, маладуха. *Нявеста была як нявеста: у беласнежным вэлюме, з вянком, з букецікам красак на грудзях.* М. Лынькоў.

**Нявестка.** Жонка сына. *Рабілі яны ў хаце ўсё звычайна ўдзвюх, і свякроў паказвала нявестцы многае, чаго не паспела навучыць маці.* Я. Брыль.

# П

**ПАБЛАЖЛІВЫ — ПАБЛАЖЭЛЫ**

**Паблажлівы.** Нястрогі, непатрабавальны; які робіць паблажкі. *Яна лічыла, што мела права на такі насмешлівы і паблажлівы тон.* А. Васілевіч.

**Паблажэлы.** Які прыкметна пахудзеў, страціў прываблівасць, прыгажосць. *Паблажэлы выгляд. Паблажэлы чалавек.*

**ПАВАДЫР — ПРАВАДНІК — ПРАВАДЫР**

**Павадыр.** Той, хто водзіць каго-н. *Лірнік іграў-спяваў пра нялёгкую долю людскую, а павадыр прымаў*

*міласціну — капейчыну. хлеба кавалак* Я. Пархута.

**Праваднік. 1.** Той, хто паказвае дарогу ў незнаемай мясцовасці. *Праваднік павінен ведаць не менш за разведчыка, дзе падпільноўвае вораг Праваднік павінен ведаць больш за разведчыка, як абысці ворага* А. Кулакоўскі. **2.** Чыгуначны работнік, які наглядае за парадкам у вагоне. *Праваднік быў рады, што ў душным вагоне знайшлася жывая душа, з якой можна было бавіць час* А. Кудравец.

**Правадыр.** Узвышанае ці іранічнае найменне кіраўніка дзяржавы ў краіне з аўтарытарным рэжымам. *Пасля адыходу ў «лепшы свет» правадыра і бацькі народаў нішто не парушылася і не развалілася.* С. Грахоўскі.

**ПАВЕР'Е — ПАВЕРКА**

**Павер'е.** Паданне. якое заснавана на забабонах. *Паводле павер'я, у жытнёвым полі жылі зерневыя духі, якія нібыта давалі жыццё сцяблінам, напаўнялі каласы зернем* М. Піліпенка.

**Паверка.** Пераклічка, якая робіцца для праверкі наяўнасці людзей. *Сосны, як салдаты на паверцы. пераклічку між сабой вядуць* П. Прыходзька.

**ПАДАРОЖНІЦКІ — ПАДАРОЖНЫ — СПАДАРОЖНЫ**

**Падарожніцкі.** Які мае адносіны да падарожніка, вандроўніка. *Падарожніцкае адзенне. Падарожніцкі рыштунак.*

**Падарожны.** Які мае адносіны да падарожжа, які знаходзіцца ў дарозе. *Між гэтых дрэў асабліва кідалася ў вочы падарожнага старадрэвіна-хвоя. што стаяла зусім адна на высокім грудзе непадалёку ад Немана.* Я. Колас.

**Спадарожны. 1.** Які рухаецца ў адным кірунку з кім-чым-н. *Пастаяў яшчэ трошкі і рашыў: спадарожнай машыны яму не дачакацца.* Я Пархута. **2.** Які існуе побач, разам з чым-н., спадарожнічае чаму-н. асноўнаму. *Спадарожныя газы.*

**ПАДБАРОДАК / ПАДБАРОДДЗЕ — ПАДБАРОДНІК**

**Падбародак.** Акруглая пярэдняя частка твару, якая ўтворана ніжняй сківіцай. С і н о н і м ы падбароддзе. *Злажыўшы на каленях рукі і ўспёршыся на іх дзіцячым вострым падбародкам, дзяўчынка глядзіць на нас, не зводзячы вачэй.* Я. Брыль.

**Падбароддзе.** *Разм.* Тое, што і падбародак. *Канстанцін Міхайлавіч хавае хворыя рукі пад кажух і нацягвае яго амаль да падбароддзя.* М. Лужанін.

**Падбароднік.** Раменьчык аброці пад пысай у каня. — *Не, ты пачакай, Віця! — Дзяўчына ўчапілася за падбароднік аброці.— Прыязджае з райкома нейкі прадстаўнік.* А. Кулакоўскі.

**ПАДВОРАК — ПАДВОР'Е**

**Падворак.** *Разм.* Двор каля хаты, дома. С і н о н і м: надворак. *Даверлівыя да людзей, яны [буслы] кружылі зусім нізка над хатай, а часам спускаліся і на падворак.* В. Вітка.

**Падвор'е. 1.** Тое, што і падворак. *Кузня ўжо была замкнёная. вакол на падвор'і валяліся старыя колы, бароны, кавалкі ржавага жалеза.* А. Марціновіч. **2.** *Уст.* Дом, які належыць загараднаму манастыру ці архірэю. — *Я не магу, я хачу на Дняпро... у Ліпецк, у Кіеў, на манастырскае падвор'е, дзе заўсёды спыняецца маці і дзе грэцкія арэхі падаюць з дрэў!..* У. Караткевіч.

**ПАДЗЁНКА — ПАДЗЁННІК — ПАДЗЁНШЧЫК**

**Падзёнка.** Крылатае насякомае, якое жыве ўсяго некалькі дзён. С і н о н і м: аўсянік. *Падзёнкі — прывабная здабыча для рыбы.* В. Вольскі.

**Падзённік.** Тое, што і падзеншчык. *Кінуў Арцём парабкоўства, падзённікам зрабіўся.* З. Бядуля.

**Падзёншчык.** Рабочы, які выконвае падзённую работу. *Праца падзёншчыка. Заробак падзёншчыка.*

**ПАДЗЁНШЧЫНА — ПАДЗЁНШЧЫЦА**

**Падзёншчына.** Падзенная работа. *Жывучы ў Сілцах Рыгор заўсёды хадзіў чорны і брудны, цяжка і многа працаваў і на падзёншчыне, і за батрака.* Ц. Гартны.

**Падзёншчыца.** Жанчына, якая выконвае падзённую работу. *Маці яго працавала некаторы час падзёншчыцай.*

**ПАДЛЕТАК — ПАДЛЁТАК / ПОДЛЕТАК**

**Падлетак.** Хлопчык ці дзяўчынка ў пераходным ад дзяцінства да юнацтва ўзросце (ад 12 да 16 гадоў). *З таго канца вуліцы, адкуль ішоў дзед Талаш, бяжыць ва ўвесь дух падлетак гадоў шаснаццаці.* Я. Колас.

**Падлётак.** Маладая птушка, якая толькі пачала вылятаць з гнязда. С і н о н і м: подлетак. *Старыя качкі ўзляталі, а сыты, цяжкі падлётак застываў, прытаіўшыся ў асацэ ці між куп'я, пакуль не трапляўся на нюх Цюліку.* Я. Брыль.

**Подлетак.** Тое ж, што і падлётак. С і н о н і м: падлётак. *Подлеткі — лёгкая здабыча ганчакоў.*

**ПАДНАРАД — ПАНАРАД**

**Паднарад.** *Спец.* Падкладка ў абутку ад пад'ёму да наска. *Шавец падшыў паднарад пад перады ботаў.*

**Панарад. 1.** Каркас, аснова калёс. *Скрыпяць калёсы, панарад іх дрыжыць, ляскае.* В. Каваль. **2.** Калёсы без драбін. *А пад паветкаю прылады: вазок, калёсы, панарады, старыя сані, восі, колы і вулляў некалькі на пчолы.* Я. Колас.

**ПАДНОС — ПАДНОСАК — ПАДОСАК**

**Паднос.** Спецыяльны металічны ці пластмасавы ліст для падачы ежы на стол, для пераноскі посуду. *Ды спяшаецца не надта дзеўчына з падносам; толькі рыжая цырата ў дзядзькі перад носам.* Н. Гілевіч.

**Падносак.** Частка другой падэшвы ў абутку ад наска да палавіны ступні. *Асцерагаючыся, каб не пакінуць у гэтым месіве падноскаў, Віця нарэшце перабраўся цераз плошчу і ступіў на тратуар* У. Нядзведскі.

**Падосак.** Вузкая жалезная паласа, якой падбіваецца ніз драўлянай восі ў калёсах. *Ён падосак бярэ ў рукі, каб з тым справіцца замком; ідзе ціха, ані гуку, бы кот крадзецца цішком.* Я. Колас.

**ПАДПЯТАК — ПАДПЯТНІК**

**Падпятак.** Падсцілка ў абутку для засцярогі пяткі ад цвікоў, якімі прыбіты каблук. *Выручаў ён, трэба сказаць, многіх, усякае ж здараецца з абуткам: то падпятак у каго нечакана адляціць, то падмётка адстане, а блізка шавецкай майстэрні не было.* В. Хомчанка.

**Падпятнік.** Прыстасаванне для апоры ног весляра. *У лодцы быў зручны, надзейны падпятнік.*

**ПАДРАХУНАК — ПАРАХУНАК**

**Падрахунак.** Агульная сума; вынік чаго-н. *Скончыўшы навучанне і пераглядзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахунак дня.* Я. Колас.

**Парахунак.** *Разм.* Асабістыя прэтэнзіі, узаемная незадаволенасць; помста, расправа. — *Мяркуем нават, што гэта правакацыя ідзе ад славутай глыбоцкай дэфензівы, у якой ёсць асабістыя парахункі з гэтымі хлопцамі.* М. Машара.

**ПАДРУБА — ПАДРУБКА**

**Падруба.** Ніжняе бервяно ў зрубе. *Сваёй старэнькай хаты я не пазнаў. Новая падруба выпрастала яе, прыўзняла над зямлёй.* А. Асіпенка.

**Падрубка.** Падшыўка краю якой-н. адзежыны. *Падрубка хусцінкі.*

**ПАЛІВАЛЬНЫ — ПАЛІВАНЫ — ПАЛІВАЧНЫ — ПАЛІЎНЫ**

**Палівальны.** Тое, што і палівачны. *Яны [крокі] гучалі мякка па чыстым, памытым палівальнай машынай тратуары.* А. Капусцін.

**ПАЛІСМЕН — ПАЛІЦАЙ — ПАЛІЦЫЯНТ — ПАЛІЦЭЙСКІ — ПАЛІЦМАЙСТАР**

**Палісмен.** Паліцэйскі ў Англіі і ЗША. *І, быццам палісмены, небаскробы за статуяй стаяць і ноч і дзень.* П. Панчанка.

**Паліцай.** *Разм* У час Вялікай Айчыннай вайны ў акупіраваных раёнах паліцэйскі, завербаваны немцамі з мясцовага насельніцтва. *Па глухіх лясных дарогах, што вядуць у глыб лесу, радзей можна сустрэць паліцаяў і немцаў, асабліва ўвечары і ўночы.* Б. Сачанка.

**Паліцыянт.** *Разм.* Асоба, якая служыць у паліцыі; паліцэйскі. *Бачу: ідуць два паліцыянты, нехта ў цывільнай вопратцы і дворнічыха.* М. Танк.

**Паліцэйскі. 1.** Які мае адносіны да паліцыі, належыць да яе або ажыццяўляецца ёю. *Джыавані праз сілу мог ячшэ ступаць на нагах, і яго адвялі да паліцэйскай машыны, каб везці ў паліцэйскі ўчастак.* М. Лынькоў. **2.** *у знач. наз.* Чалавек, які служыць у паліцыі, ніжні чын паліцыі. *Калона дэманстрантаў, поўных гневу, усё ішла і ішла. Раптам з дамоў ударылі па дэманстрантах з кулямётаў, гэта стралялі паліцэйскія.* І. Гурскі.

**Паліцмайстар.** У дарэвалюцыйнай Расіі і некаторых замежных краінах: начальнік паліцыі ў буйных гарадах. *Віленскі паліцмайстар палкоўнік М. А. Саранчоў асабіста праглядае дамавую кнігу, але з прычыны спешкі не знаходзіць у ёй імя Вітажэнца.* Г. Кісялёў.

**ПАЛІТРА — ПАЛІТУРА**

**Палітра. 1.** Дошчачка, на якой мастак расцірае і змешвае фарбы. *Маладыя хлопцы з палітрамі і пэндзлямі ў руках працавалі за мальбертамі.* М. Машара. **2.** *перан.* Сукупнасць фарбаў, іх спалучэнне ў асобнай карціне, у творчасці мастака; сукупнасць вобразна-выяўленчых сродкаў у творчасці пісьменніка, кампазітара і г. д. *Сучасная мода прапануе шырокую палітру фарбаў — ад насычаных сакавітых жыццярадасных колераў да пяшчотных пастэльных «Беларусь».*

**Палітура.** Спіртавы лак для паліроўкі вырабаў з дрэва. *Валянцін унюхаў густы букет пахаў — смалістага дрэва, сталярнага клею, палітуры і яшчэ нечага няўлоўнага, чым заўсёды патыхае там, дзе працуюць з дрэвам.* Б. Стральцоў.

**ПАНСІЁН — ПАНСІЯНАТ**

**Пансіён. 1.** У дарэвалюцыйнай Расіі і некаторых зарубежных краінах, закрытая навучальная ўстанова, выхаванцы якой жывуць на поўным утрыманні. *Выхаванцы пансіёна адразу гуртам высыпалі на прасторны двор і пачалі гуляць у лапту.* Б. Розен. **2.** Утрыманне на поўным забеспячэнні. *Некалькі месяцаў жанчыны жылі на поўным пансіёне непадалёку ад Стакгольма.* «Звязда»

**Пансіянат.** Тып гасцініцы з поўным утрыманнем тых, хто ў іх жыве. *Прадугледжаны прасторныя набярэжныя і лодачныя станцыі ў прыдняпроўскім Рагачове, сучасныя пансіянаты і дамы адпачынку ў курортным Браславе.* «Звязда».

**ПАПАДДЗЯ — ПАПАДЗЯНКА**

**Пападдзя.** *Разм.* Жонка папа. С і н о н і м: матушка. *Пападдзя павінна быць з папоўскага роду, бо на тое яна матушка, ёй часам і ў руку прыйдзецца пацалаваць.* Я. Колас.

**Пападзянка.** *Разм* Дачка папа. *Прыйдзе пападзянка ці не — так і не ведалі, але да яе прыходу падрыхтаваліся.* М. Лобан.

**ПАПРАЎНЫ — ПАПРАЎЧЫ**

**Папраўны.** Які можна паправіць. *Звычайная памылка, і лёгка папраўная.* Х. Шынклер.

**Папраўчы.** Прызначаны для папраўлення, перавыхоўвання каго-н. *Байсака судзіў ваенны трыбунал, які пазбавіў яго годнасці маёра і перавёў у радавыя папраўчага батальёна.* М. Лынькоў.

**ПАРАМЕТР — ПЕРЫМЕТР**

**Параметр.** *Спец.* **1.** У матэматыцы: велічыня якая ўваходзіць у матэматычную формулу і захоўвае сваё пастаяннае значэнне толькі для пэўнага выпадку. *Задачу можна рашыць толькі тады, калі вядомы ўсе параметры, ад якіх залежыць яе рашэнне.* «Настаўніцкая газета». **2.** Велічыня або велічыні, што характарызуюць асноўныя ўласцівасці якога-н. прадмета ці з'явы. *Цяпер работа ў яе лёгкая: раз на тыдзень ёй прыносяць прыборчыкі з цэха, якія называюцца індыкатарамі. Яна робіць замер параметраў, запісвае лічбы ў сшытак роўненькай, прыгожай таблічкай і аддае начальніку.* «Маладосць».

**Перыметр.** Сума даўжынь усіх старон многавугольніка. — *Сам ведаеш, гэтая работа на выключную дакладнасць. Яе перыметры — мікроны. Словам, работа складаная, а галоўнае — творчая.* М. Гроднеў.

**ПАРАФІНАВАНЫ — ПАРАФІНАВЫ — ПАРАФІНІСТЫ — ПАРАФІРАВАНЫ**

**Парафінаваны.** Пакрыты ці насычаны парафінам. *У папяровых кандэнсатарах лісточкі фальгі перакладзены парафінаванай (кандэнсатарнай) паперай.* «Таваразнаўства».

**Парафінавы.** Які мае адносіны да парафіну, з парафіну. *Ен ухапіў новую гільзу, вырваў парафінавае донца.* В Быкаў.

**Парафіністы.** Які змяшчае ў сабе парафін. *Парафіністая нафта.*

**Парафіраваны.** *Спец.* Папярэдне падпісаны (да афіцыйнага падпісання) ініцыяламі ўпаўнаважаных асоб кожнага з дагаворных бакоў у знак згоды з тэкстам (пра міжнародныя дагаворы. пагадненні) *У Александрыі Егіптам і Ізраілем парафіравана пагадненне аб другім этапе раз'яднання егіпецкіх і ізраільскіх войск на Сінайскім паўвостраве.* «Звязда».

**ПАРЛАМЕНТАРЫЙ — ПАРЛАМЕНЦЁР**

**Парламентарый.** Член парламента. *Народных дэпутатаў нярэдка называюць цяпер парламентарыямі, як і ў некаторых заходніх краінах.*

**Парламенцёр.** Асоба, упаўнаважаная адным з ваюючых бакоў для перагавораў з праціўнікам. *Праз нейкі час з-за дома выйшаў, размахваючы белым сцягам, парламенцёр.* В. Хомчанка.

**ПАРТАЛ — ПОРТ — ПОРЦІК**

**Партал.** Архітэктурна аформлены галоўны ўваход вялікага будынка. *На левым баку вуліцы, трохі воддаль — загадкавая кірха баптыстаў з нямецкім надпісам над парталам.* «Полымя».

**Порт.** Спецыяльна прыстасаванае месца для стаянкі, пагрузкі, разгрузкі і рамонту суднаў. *Я бачыў не раз, як буруны ўставалі і з мора спяшаліся ў порт караблі.* М. Лужанін.

**Порцік.** Крытая галерэя з калонамі, якая звычайна бывае часткай асноўнага будынка. *Новы гмах з каланадай і порцікам пры ўваходзе сапраўды можна было назваць палацам.* М. Хведаровіч

**ПАРУСІНАВЫ — ПАРУСНЫ**

**Парусінавы.** Зроблены з парусіны — грубай моцнай ільняной тканіны. *Я моўчкі збіваў парусінавымі туфлямі халодную расу і ўсё спяшаўся.* І. Чыгрынаў

**Парусны.** Які мае адносіны да паруса; з парусамі *Дзеці плывуць усё далей на лёгкай парусная лодцы.* «Полымя»

**ПАРЦЬЕ — ПАРЦЬЕРА**

**Парцье.** Швейцар у гасцініцы. *Строгі парцье. Знаемы парцье.*

**Парцьера.** Занавеска з цяжкай тканіны на дзвярах ці вокнах. *Пачуўшы такое жаданне, следчы адкінуўся на спінку крэсла. Потым моўчкі адхінуў чорную парцьеру на акне.* А. Алешка.

**ПАСПЕШЛІВЫ / ПАСПЕШНЫ — ПАСПЯХОВЫ**

**Паспешлівы. 1.** Які прывык спяшацца, які спяшаецца. С і н о н і м: таропкі. *Дзімін паспакайнеў, стаў не такім паспешлівым, пачаў больш думаць.* У. Карпаў. **2.** Неабдуманы, заўчасны. *А можа трэба было не згадзіцца на гэта паспешлівае вяселле?* І. Шамякін.

**Паспешны.** Тое, што і паспешлівы. *Лабановіч дагадваўся аб прычыне такога паспешнага ад'езду яго прыяцеля і госця, але маўчаў пра гэта.* Я. Колас.

**Пасняховы.** Які вызначаецца поспехам, заключае ў сабе поспех.

**ПАСРЭДНАСЦЬ — ПАСРЭДНІЦТВА**

**Пасрэднасць.** Штосьці бясталентнае, нічым не выдатнае. *Байка стала прыстанішчам шаблону і штампаў, шэрасці і пасрэднасці.* Я. Казека.

**Пасрэдніцтва.** Садзейнічанне ў наладжванні сувязей, адносін паміж кім-н. ці ў прымірэнні двух бакоў, якія варагуюць, спрачаюцца. *Трэба меркаваць, што калі б Змітрок Бядуля быў раней знаёмы з рэдакцыяй, ён наўрад ці меў бы патрэбу ў пасрэдніцтве В. А. Сасенскага.* В. Каваленка.

**ПАСТАР — ПАСТЫР**

**Пастар.** Пратэстанцкі святар. *Пратэстанцкіх навучальных устаноў дагэтуль няма на тэрыторыі Беларусі, і пастары прыязджаюць сюды на службу сваім аднаверцам пераважна з Прыбалтыкі і Заходняй Еўропы.*

**Пастыр. 1.** *Уст. паэт.* Пастух. *Пастыр статка ў поле гоніць і пяе. Дзе ж кароўкі, валы, коні, дзе мае?* Я. Купала. **2.** Святар, кіраўнік паствы — веруючых адной царквы. *Паслухала якую хвілінку, але нічога не зразумела — гаварылася пра нейкіх пастыраў, авечак, рабоў божых, святых праведнікаў.* Л. Гаўрылкін.

**ПАТЭТЫЧНЫ — ПАЭТЫЧНЫ**

**Патэтычны.** Поўны пафасу; усхваляваны, страсны. *Кафедру зноў займае ксёндз Пацейкоўскі. Яго папярэднія казанні толькі ўступ, падрыхтоўка да трэцяга, самага асноўнага і патэтычнага.* Я. Колас.

**Паэтычны. 1.** Які звязаны з паэзіяй; здольны да паэзіі. *Безумоўна, нельга не адзначыць, што паэтычнаму перакладу «Слова» папярэднічала работа па празаічнаму перакладу яго.* Д. Палітыка. **2.** Павышана эмацыянальны, вельмі ўражлівы, чуллівы; узвышаны, лірычны. *Дзядзька любіць і моцна адчувае сваёй паэтычнай душой усё прыгожае на зямлі.* С. Майхровіч.

**ПАЎСТАНАК — ПАЎСТАНЕЦ**

**Паўстанак.** Невялікая чыгуначная станцыя. *Яны чакалі на паўстанку больш за суткі, бо не было яшчэ тут ні сталага графіка, ні цвёрдага раскладу.* А. Кулакоўскі.

**Паўстанец.** Удзельнік паўстання. *З паўстанцамі жорстка расправуляліся карныя атрады, якія пасылаў у вёску царскі ўрад.* М. Ларчанка.

**ПАХА — ПАХВІНА**

**Паха.** Унутраная частка плечавога выгібу. *Хлапчук падняў вопратку, моўчкі надзеў шапку, узяў пад паху халацік і знік за дзвярыма.* А. Пальчэўскі.

**Пахвіна.** Месца паміж бядром і ніжняй часткай жывата. *Ззаду каля ласіхі мітусілася цыбатае ласянё і мордай тоўхала яе ў пахвіну.* У. Федасеенка.

**ПАХОДКА — ПАХОДНЯ**

**Паходка.** Манера хадзіць; хада, поступ. *Ішоў чалавек паволі, стомленай паходкай.* К. Чорны.

**Паходня** Пераносная свяцільня ў выглядзе наматанага на канец доўгай палкі прасмоленага пакулля. С і н о н і м: факел. *Не вельмі далёка, над зіхатлівай волжскай гладдзю ён убачыў россып гарадскіх агнёў і дзве ўзнятыя ў неба паходні.* У. Карпаў.

**ПАЦЕРКІ — ПАЦЕРЫ**

**Пацеркі.** Упрыгожанне на шыю ў выглядзе нанізаных шарыкаў ці іншых дробных прадметаў. С і н о н і м. каралі. *Дзяўчаты былі апрануты таксама па-выхадному. Плечы і стан Аліны шчыльна аблягаў клятчасты жакецік, на шыі зіхацелі рознакаляровыя пацеркі* Т. Хадкевіч.

**Пацеры,** *адз. няма.* Малітва. *Нічога не разумелі сінія вочы Ядвісі, але яна стаяла маўклівая і прыслухоўвалася, як голасна шэпча цётка Зося божыя пацеры.* М. Лынькоў.

**ПАШТАМТ — ПОШТА**

**Паштамт.** Галоўная паштовая ўстанова горада. *[Іна] не прыкмеціла, як апынулася каля будынка паштамта.* М. Ваданосаў.

**Пошта. 1.** Установа для перасылкі пісем, грошай, пасылак. *На пошце было чалавек з дзесяць наведвальнікаў.* А. Якімовіч. **2.** Тое, што дастаўляецца гэтай установай; карэспандэнцыя. *Захар штодзённа ездзіў на фурманцы ў раён, прывозіў пошту.* І. Дуброўскі.

**ПЕРАПОНА — ПЕРАПОНКА**

**Перапона.** Тое, што стрымлівае доступ куды-н. *І вось земснарад зварухнуў перапону, што воды трымала ў апошнія дні.* М. Калачынскі.

**Перапонка.** Тонкая пругкая плёнка, якая служыць перагародкай ці абалонкай у жывым арганізме. *Хоць і няма на лапках у вадзяной курачкі перапонак, але плавае і ныpae яна не горш за качку* В. Вольскі.

**ПЕРГАМЕН / ПЕРГАМЕНТ — ПЕРМАНЕНТ**

**Пергамен.** Тое ж, што і пергамент. *Самы тонкі пергамен даюць шкуркі трусоў і вавёрак Але спыніліся на шкурках абяскроўленых цялят, бо з іх атрымліваецца надзіва беласнежны, прыемны воку пергамен.* Л. Дайнека.

**Пергамент. 1.** Спецыяльна апрацаваная цялячая скура, на якой пісалі да вынаходства паперы. *Матэрыял для пісьма — пергамент — каштаваў вельмі дорага.* **2.** Старажытны рукапіс, напісаны на такой скуры. *Замест адказу Раўбіч хрумснуў вялікім пергаментам, раскручваючы яго на стале.* У. Караткевіч.

**Перманент.** Доўгатэрміновая завіўка валасоў. *Да нас далучаецца Валя, прыгожая, досыць маладая жанчына з вялікімі сінімі вачыма і бялявымі завіткамі перманенту.* І. Навуменка.

**ПІЛЯСТР / ПІЛЯСТРА — ПІЯСТР**

**Пілястр.** Тое, што і пілястра. *Паўднёвы і паўночны фасады [Спаскай царквы ў Полацку] расчляняюцца пілястрамі з паўкалонамі.* У. Арлоў.

**Пілястра.** *Спец.* Чатырохгранная калона, уробленая адной гранню ў сцяну.

**Піястр.** Назва манеты ў Турцыі, Егіпце, Сірыі і некаторых іншых краінах. *Мільён піястраў былога марыянетачнага рэжыму складаў прыкладна паўтары тысячы амерыканскіх долараў.* «Звязда».

**ПІСЬМЕННАСЦЬ — ПІСЬМЕ́ННАСЦЬ / ПІСЬМЕНСТВА**

**Пісьменнасць. 1.** Сістэма графічных знакаў, якія выкарыстоўваюцца для пісання. *Гісторыя чалавецтва да ўзнікнення СССР не ведала такіх прыкладаў, каб за кароткі час каля пяцідзесяці народнасцей, якія былі неадукаванымі, стварылі сваю пісьменнасць, літаратуру.* «Звязда». **2.** Сукупнасць пісьмовых помнікаў якой-н. гістарычнай эпохі пэўнага народа. *Раннія дысертацыі лексікалагічнага напрамку прысвечаны аналізу лексічнага саставу паасобных помнікаў старабеларускай пісьменнасці.* А. Жураўскі.

**Пісьме́ннасць.** Уменне чытаць і пісаць; граматнасць, наяўнасць ведаў у якой-н. галіне. *Аксён ужо нават можа і распісацца, што яго вельмі цешыць, але гэта яшчэ не сведчыць аб яго пісьменнасці.* Я. Колас.

**Пісьменства.** Тое, што і пісьменнасць. *Цераз пераклады ўваходзіць нацыянальнае пісьменства ў скарбніцу сусветнай літаратуры.* У. Календік.

**ПІСЬМЕННІЦКІ — ПІСЬМЕННЫ — ПІСЬМОВЫ**

**Пісьменніцкі.** Які мае адносіны да пісьменніка, характэрны для яго. *Пры гэтых умовах пісьменніцкая праца не магла быць колькінебудзь напружанай, што і адбілася на малым ліку твораў Неслухоўскага.* М. Багдановіч.

**Пісьменны.** Які ўмее чытаць і пісаць. С і н о н і м: граматны. *Сам ён [Міхал] не надта пісьменны, але дзяцей да навукі заахвочвае, выяўляючы гэтым самым пэўнае разуменне новых павеваў у жыцці.* І. Навуменка. || Які мае неабходныя веды ў якой-н. галіне. *Лукаш ведаў, што з цягам часу загадчыкам фермы паставяць чалавека з дыпломам, пісьменнага.* Я. Ермаловіч.

**Пісьмовы. 1.** Выяўлены сродкамі пісьма. С і н о н і м: напісаны. *[Лідзія Пятроўна] пасля праверкі пісьмовых прац паказала яго сшытак усяму класу.* Я. Колас. **2.** Які прызначаны, служыць для пісання, пісьма. *У невялікім пакоі, насупраць дзвярэй, стаяў пісьмовы стол, два крэслы і ў куце — тумбачка з графінам вады.* М. Ваданосаў.

**ПІТКІ — ПІТНЫ — ПІЎНЫ**

**Піткі.** *Разм.* Які добра, прыемна піць. *Піткая вада з нашай крыніцы, асабліва ў летнюю спёку.*

**Пітны.** Прыдатны для піцця; які п'юць. *У асобных паілках заўсёды павінна знаходзіцца чыстая пітная вада* «Птушкагадоўля».

**Піўны.** Які мае адносіны да піва, прызначаны для піва. *Каля піўнога ларка ўжо сабралася чарга мужчын.* В. Адамчык.

**ПІЯЛА — ПІЯНА**

**Піяла.** У Сярэдняй Азіі: неглыбокі, шырэйшы ўверсе кубак без ручкі. *Баласпай трымаў у растапыраңай пяцярні піялу і час ад часу паглядваў на госця.* П. Беразняк.

**Піяна.** *Спец.* Ціха, не гучна (пра выкананне музычнага твора). *Няхай дзеці праспяваюць 3 - 4 разы гэтае слова павольна, лёгка і піяна.* «Выкладанне спеваў у школе».

**ПЛАНАВАЦЬ — ПЛАНІРАВАЦЬ**

**Планаваць. 1.** Складаць план чаго-н. *— Трэба нам планаваць разумна, правільна планаваць, але не хавацца за гэтыя планы, не планамі перад людзьмі адчытвацца, а тым, што зроблена.* А. Жук. **2.** Мець намер, разлічваць зрабіць што-н., меркаваць. *Гітлераўскія генералы планавалі новыя аблавы на партызан і падпольшчыкаў.* Р. Няхай.

**Планіраваць.** Плаўна зніжацца на лятальным апараце. *Скала недалёка, і цяпер можна спакойна планіраваць.* М. Гамолка. // Спакойна, не махаючы крыламі, доўга плаваць у паднябессі (пра птушак). *Плаўна планіруе каршун у сінім небе, карыстаючыся нябачнымі струменямі паветра.* В. Вольскі.

**ПЛАСТЫЛІН — ПЛАСТЫР**

**Пластылін.** Незасыхаючая маса для лепкі, прыгатаваная з гліны, воску з дабаўленнем тлушчаў і іншых рэчываў. *У руках ён мяў пластылін і нешта ляпіў на фанернай дошчачцы, што ляжала ў яго на каленях.* Я. Скрыган.

**Пластыр.** Ліпкі лекавы састаў, нанесены на паверхню тканіны, які прыкладваецца да нарываў, ран і г. д. *У Любецкага была падвязана чорнай хусцінкай рука, галава забінтавана і заклеены пластырам твар* А. Карпюк.

**ПЛАЎКІ — ПЛАЎНЫ**

**Плаўкі.** Здольны плавіцца. *Галоўнай часткай плаўкага засцерагальніка з'яўляецца праваднік, які мае сячэнне значна меншае, чым сячэнне правадоў лініі.* «Фізіка».

**Плаўны.** Роўны, без рэзкіх пераходаў; непаспешлівы, мерны. *Яна адразу злавіла лёгкі і плаўны рытм танца.* А. Савіцкі.

**ПЛЫВЕЦ — ПЛЫВУН — ПЛЫВУНЕЦ**

**Плывец.** Той, хто плавае, хто ўмее плаваць. *Яны кінуліся ў адзежы ў глыбокія воды ракі Каляда быў добрым плыўцом* І. Гурскі.

**Плывун.** Насычаны вадою дробны пясок, супесак ці суглінак. *Каб суняць плывуны і зрабіць іх падатлівымі людзям, непадалеку .. была пабудавана магутная станцыя замарожвання глебы.* А. Кулакоўскі.

**Плывунец.** Жук, які звычайна жыве ў стаячай вадзе. *Плывунец — жук-драпежнік.* БелЭн.

**ПЛЫТКІ — ПЛЫЎКІ**

**Плыткі.** Неглыбокі, мелкі. *Скрозь плыткую ваду было відаць пазелянелае, загнанае тванню дно.* А. Жук.

**Плыўкі.** Які лёгка размываецца, расплываецца; плывучы (пра грунт). *Усе ішлі напрасткі, пакідаючы сляды на мяккай, плыўкай зямлі.* А. Кудравец.

**ПНЕЎМАНІЯ — ПНЕЎМАТЫКА**

**Пнеўманія.** Запаленне лёгкіх. *— Рэдкі па цяжкасці выпадак двухбаковай пнеўманіі... Чакаем крызісу...* І. Шамякін.

**Пнеўматыка.** Прыстасаванне для сціскання і разрэджвання паветра; раздзел фізікі. *Многія станкі на заводзе працуюць зараз на пнеўматыцы, з дапамогай сціснутага паветра.* П. Рунец.

**ПРАДВЕСНЕ — ПРАДВЕСЦЕ**

**Прадвесне.** Час, які папярэднічае вясне; перадвясенняя пара. *Дарогі пачарнелі. На дварэ прадвесне.* А. Алешка.

**Прадвесце.** З'ява, прымета, якая прадвяшчае надыход, наступленне чаго-н. *Кожны раз ёй здавалася, што гэта прадвесце новай крывавай падзеі.* І. Шамякін.

**ПРАДУКТЫЎНЫ — ПРАДУКЦЫЙНЫ**

**Прадуктыўны.** У граматыцы: здольны ўтвараць новыя словы ці формы; які дзейнічае ў сучасны перыяд. *У адпаведнасці з гэтым [актыўнасцю розных марфем] вылучаюцца марфемы прадуктыўныя, малапрадуктыўныя і непрадуктыўныя* «Граматыка беларускай мовы».

**Прадукцыйны. 1.** Пленны. *Прадукцыйныя заняткі* **2.** Здольны даваць прадукцыю, такі, ад якога атрымліваюць прадукты жывелагадоўлі (пра сельскагаспадарчую жывёлу, птушку). *Прадукцыйная жывёла.*

**ПРАЖЭКТАР — ПРАЖЭКЦЁР**

**Пражэктар.** Асвятляльны прыбор, які дае яркі пук святла ў патрэбным напрамку. *Прамень пражэктара здаваўся бясконцай, моцнай і злавеснай рукой нейкага страшыдла.* Л. Дайнека.

**Пражэкцёр.** *Іран.* Той, хто захапляецца несур'ёзнымі і непатрэбнымі, неажыццявімымі праектамі. *Я запісаў на выдатак гісторыі варожых пражэкцёраў.* Х. Шынклер.

**ПРАКУРАТ — ПРАКУРАТАР**

**Пракурат.** *Абл.* Прайдзісвет. *— Не чапай ты яго, пракурата. Я ж кажу, няхай яго сарочка так не чапае.* Р. Сабаленка.

**Пракуратар.** У Старажытным Рыме: асоба, якая кіравала чыёй-н. маёмасцю, гаспадаркай, маёнткам і пад.; чыноўнік, які займаўся фінансамі, зборам налогаў, харчаваннем і г. д. *Строгі пракуратар. Непадкупны пракуратар.*

**ПРАЛАЗ — ПРАЛАЗА**

**Пралаз.** Вузкі, цесны праход, праз які можна пралезці, прайсці. *[Васіль] пачаў яшчэ больш упарта і настойліва другой рукой разграбаць пралаз.* Б. Сачанка.

**Пралаза.** *Разм.* Пранырлівы чалавек, прайдзісвет, спрытнюга. *Памятаюць былыя работнікі рэдакцыі Ілья Гурскі, Алесь Звонак, Міхась Модэль, Анатоль Астрэйка, як няшчадна высмейваў Самуйлёнак усякіх пралаз і прайдзісветаў.* М. Хведаровіч.

**ПРАПІСКА — ПРЫПІСКА**

**Прапіска.** Афіцыйная рэгістрацыя пражывання каго-н. па пэўнаму адрасу; паметка ў пашпарце аб

гэтай рэгістрацыі. *Я хаце абавязаны прапіскаю — калыскаю, падвешанай пад столь.* А. Куляшоў.

**Прыпіска.** Дапаўненне, дадатак да раней напісанага. *У канцы ліста сябар зрабіў прыпіску.* Я. Колас.

**ПРАТЭКТАР — ПРАТЭКТАРАТ**

**Пратэктар. 1.** Дзяржава, якая ажыццяўляе пратэктарат. *Пратэктарат — форма міжнароднай залежнасці дзяржаў, пры якой дзяржава-пратэктар вызначае знешнюю палітыку дзяржавы, якая пратэжыруецца.* БелЭн. **2.** Патоўшчаная, больш трывалая частка знешняй паверхні ў пакрышцы. *На сухой зямлі следу ад пратэктара не асталося.* А. Жук. Н я п р а в і л ь н а: *З гэтага моманту Туніс страціў незалежнасць і стаў французскім пратэктарам (трэба: пратэктаратам).* В. Вольскі.

**Пратэктарат.** Форма каланіяльнай залежнасці, пры якой больш слабая краіна, фармальна захоўваючы свой дзяржаўны лад, фактычна залежыць ад больш моцнай; сама краіна, што знаходзіцца ў такой залежнасці. *Англія, якая дабівалася панавання над Суэцкім каналам і мела патрэбу ў егіпецкай баваўне, з 1883 года ўстанавіла фактычны пратэктарат над Егіптам (які ўваходзіў тады ў састаў Турцыі).* «Эканамічная геаграфія зарубежных краін».

**ПРАХАДНЫ / ПРАХОДНЫ — ПРАХОДЧЫ — ПРАХОЖЫ**

**Прахадны. 1.** Які мае скразны праход, служыць для праходу. *Хто б ні стаяў вартавым ля прахадной будкі, усякі прапускаў Святлану ў вайсковы двор.* А. Кулакоўскі. **2.** Які дае права ці магчымасць прайсці па конкурсу куды-н. — *Семнаццаць з дваццаці набраў. Прахадны бал . А Леня Хазанскі праваліў.* В. Мыслівец.

**Праходны.** Тое, што і прахадны (*у 1 знач.*). *У зацямнелым кутку каля праходнай будкі Антон прыпыніўся і не зводзіў вачэй з дзвярэй.* П. Кавалёў.

**Праходчы.** *Спец* Які мае адносіны да праходкі — распрацоўкі горных выпрацовак у пэўным напрамку. *Праходчы камбайн.*

**Прахожы.** Які ідзе куды-н. *Бралася на мароз. Асфальт падсох. Крокі рэдкіх прахожых ляскалі, як стралялі, асабліва абцасікі жанчын.* І. Шамякін.

**ПРЭТЭНДЭНТ — ПРЭЦЭДЭНТ**

**Прэтэндэнт.** Той, хто прэтэндуе на што-н., мае падставы на атрыманне чаго-н. *Разумеў хлапец — час падумаць, як будзе жыцца далей. Яшчэ пад ім двое меншых братоў — прэтэндэнтаў на бацькаву гаспадарку.* А. Пальчэўскі.

**Прэцэдэнт.** *Кніжн.* Выпадак у мінулым, які служыць прыкладам ці апраўданнем для падобных выпадкаў у будучым. *Мяне заўважылі праз акно, і ўсе выйшлі насустрач. Важны быў прэцэдэнт — ссыльнаму дазволілі працаваць у школе, і ўжо з'яўляліся надзеі, строіліся меркаванні на «пацяпленне», на палёгкі ў рэжыме.* С. Грахоўскі.

**ПУНКТУАЛЬНЫ — ПУНКТУАЦЫЙНЫ**

**Пунктуальны.** Вельмі акуратны, дакладны. Хоць *звычайна старшы лейтэнант і не любіў «пісаніны», тут стараўся быць пунктуальным* І. Мележ.

**Пунктуацыйны.** Які мае адносіны да пунктуацыі — правіл аб пастаноўцы знакаў прыпынку. *Пунктуацыйны разбор павінен заўсёды суправаджацца сінтаксічным разборам.* М. Марчанка.

**ПЯКОТКА — ПЯКУЧКА**

**Пякотка.** Адчуванне пякучага болю ў страваводзе. — *Нешта хваробу, брат. Пякотка, на яе ліха, не дае спакою...* М. Хведаровіч.

**Пякучка.** Пякучая крапіва. С і н о н і м: жыгучка. *Хто сустрэўся быў са мною, дакрануўся раз ці два, дык той ведае ўжо хто я: я — пякучка-крапіва.* К. Крапіва.

# Р

**РАБАК — РЫБАК**

**Рабак.** *Разм* Гліст. — *Ды замоўкніце вы са сваімі літаннямі Яны тут зусім не патрэбны У яго рабакі Дайце яму бярозавага дзёгцю Ад сэрца і адыдзе.* У. Дубоўка.

**РАДЫЯЛЬНЫ — РАДЫЯННЫ**

**Радыяльны.** Размешчаны па радыусе. *Радыяльныя магістралі горада*

**Радыянны.** Які мае адносіны да радыяна — вугла, што адпавядае дузе, даўжыня якой роўна яе радыусу. *Радыяннае вымярэнне вуглоў.*

**РАЗБІТНЫ — РАЗБІТЫ**

**Разбітны.** *Разм.* Лоўкі, праворны, бойкі. *Чыгунок бянтэжыцца зноў. Як ні кажы, які б ен ні быў разбітны, а ўсе ж урачысты, хвалюючы момант у хлопца!..* Я. Брыль.

**Разбіты. 1.** Расколаты на кускі ці з адбітым краем, разбураны. *Праз два разбітыя акны і адкрытыя насцеж дзверы гуляў вецер.* М. Лынькоў. **2.** Пашкоджаны ўдарам. *Трымаючыся за разбітую шчаку і распухлы нос, бокам высунуўся Слімак.* М. Лынькоў. **3.** Які пацярпеў паражэнне; пераможаны. *У гэты час рэшткі разбітых часцей ворага сапраўды каціліся назад па шляху, што ляжаў кіламетраў за тры ад вёскі* А. Якімовіч.

**РАЗВОДДЗЕ — РАЗВОДКА**

**Разводдзе.** Вясенняя паводка, вясенні разліў. *Васіль бачыў рэкі там, каля свайго дома, але ж такой шырокай не наглядаў нават у самае бурлівае разводдзе.* А. Кулакоўскі.

**Разводка.** Інструмент для развядзення зубоў пілы. *Прынёс напілак, разводку, прысеўшы на козлах, пачаў вастрыць пілу* М. Гроднеў.

**РАСЧЫНІЦЬ — РАШЧЫНІЦЬ**

**Расчыніць,** *што.* Адчыніць што-н. зачыненае. *На першых двух уроках мы павінны былі пісаць сачыненне. Я прыйшоў у клас першы, расчыніў вокны. Раніца, а сонца ўжо высока ў небе.* «Маладосць».

**Рашчыніць,** *што* Прыгатаваць цеста (рошчыну), развёўшы муку вадою ці малаком. *Вярнуўшыся з поля, маці рашчыніла хлеб у дзежцы — першы хлеб з маладога жыта!* М. Парахневіч.

**РАУНД — РАУТ**

**Раунд.** У боксе: прамежак часу (звычайна тры мінуты), на працягу якога адбываецца адна частка бою. *Трэці раунд, здаецца, больш нагадваў вольную барацьбу, а не бокс. Мы абодва проста павісалі адзін на адным.* «Маладосць».

**Раут.** *Уст.* Урачысты, званы вечар, прыём. *На балях, раутах, прыемах паміж гасцей, сяброў, знаёмых ішло спаборніцтва — хто лепш для памяці напіша верш.* В. Вітка.

**РУЛЬ — РУЛЯ**

**Руль. 1.** Прыстасаванне для кіравання рухам судна, самалёта, аўтамабіля і інш. у патрэбным кірунку. *Ён больш звыклы быў за рулём трактара, нават не цяперашняга «Беларуса», а таго, першых выпускаў, яшчэ без кабіны* А. Жук. **2.** *перан. Кніжн.* Пра органы кіравання, кіраўніцтва чаго-н. *Руль дзяржаўнай улады.*

**Руля.** Ствол агнястрэльнай зброі. С і н о н і м: дула. *Далей адбылося ўсё — як у адно імгненне. Адчуў: руля аўтамата ўперлася ў яго плячо, пачулася кароткае: «Шнэль!», і ён нават подбегам пайшоў да канавы.* Я. Пархута.

**РУНО — РУНЫ — РУНЬ — РУМ**

**Руно.** Воўна, знятая пры стрыжцы суцэльным пластом, наогул воўна, поўсць авечкі. *Асобныя шарсцінкі (валасы) склееены ліпкім тлушчапотам, які выдзяляецца сальнымі і потавымі залозамі. Утвараецца руно — густая футравіна, якая не змочваецца ад дажджу і не распадаецца нават пры стрыжцы.* «Заалогія».

**Руны,** *адз.* руна. **1.** Старажытныя пісьмены, якімі карысталіся пераважна скандынавы і якія захаваліся ў надпісах на камянях і іншых прадметах. *Шмат якія руны віда-*

*вочна маюць сляды апрацоўкі, але зроблена яна тонка* М. Лужанін. **2.** Старадаўнія народныя песні ў карэлаў. фінаў і эстонцаў. *Цётка Улы і цётка Мары адмовіліся спяваць мне руны. пакуль я не абыду, не аб'еду лясы, камяні, азёры Карэліі* В. Карамазаў.

**Рунь.** Зялёныя ўсходы азімых пасеваў *Свежая рунь дрыжала пад ветрам, і ў нізінах стаяла чыстая, як сляза. вада.* К. Чорны.

**Рум.** *Разм* Месца, на якое ўзімку вывозіцца лес для сплаву і дзе вяжуць з бярвення плыты. *Вакол Каранькоў лес валілі няшчадна, на рум вазіць не паспявалі, а вясна выдалася гнілая, зацяжная, з неба ліло і ліло, як з рэшата.* В. Карамазаў.

**РУСІНСКІ — РУСІСЦКІ**

**Русінскі.** Які мае адносіны да русінаў — украінцаў заходнеўкраінскіх зямель (так называлі іх у час знаходжання ў складзе Аўстра-Венгрыі). *Русінская мова.*

**Русісцкі.** Які мае адносіны да русіста — вучонага, спецыяліста ў галіне рускай філалогіі. *Русісцкая тэматыка філалагічнага зборніка.*

**РЫБАЦКІ — РЫБАЧЫ — РЫБНЫ**

**Рыбацкі.** Які мае адносіны да рыбацтва. *Пагаслі агеньчыкі ў вокнах рыбацкага пасёлка.* Т. Хадкевіч.

**Рыбачы.** Які мае адносіны да рыбака, належыць яму. *Рыбачая лодка. Рыбачая вопратка.*

**Рыбны. 1.** Які мае адносіны да рыбы. *Рыбныя запасы. Рыбны рынак.* **2.** Багаты рыбай. *Рыбная рэчка Рыбнае месца.*

**РЭВЕРАНС — РЭВЕРС**

**Рэверанс.** Пачцівы паклон з лёгкім прысяданнем на правую нагу. *Дзяўчынка ў чырвонай хустачцы няўмела прысядала, стараючыся зрабіць рэверанс.* К. Чорны.

**Рэверс.** *Спец.* Прыстасаванне, якое дае магчымасць мяняць напрамак руху машыны ў процілеглы бок. *Многія з яго вучняў ужо самі стаяць за рэверсам паравоза, умела водзяць цяжкавагавыя саставы.* «Звязда».

**РЭГРЭС — РЭГРЭСІЯ**

**Рэгрэс.** Упадак у развіцці, рух назад, дэградацыя. *Пэўная група старой тэхнічнай інтэлігенцыі з усёй катастрафічнасцю адчула аднойчы, што іх клас гіне, што лінія іхняга класа — не прагрэс, а рэгрэс.* Б. Мікуліч.

**Рэгрэсія.** *Спец* Адступленне мора з занятай ім раней тэрыторыі, за кошт чаго павялічваецца суша. *У кнігах па геалогіі часта сустракаюцца выразы: «наступленне мора», «адступленне мора» або, па-вучонаму, «трансгрэсія» і «рэгрэсія мора», што азначае тое ж самае.* А. Чаркасаў.

**РЭЙД[1] / РЭЙД[2] — РЭЙС**

**Рэйд[1].** Месца стаянкі суднаў на якары каля берага. *Водгаласкі вайны чуліся на рэйдзе, дзе стаяў абпалены крэйсер ці браняносец.* М. Лынькоў.

**Рэйд[2]. 1.** Пранікненне, налёт войск у тыл праціўніка з якой-н. баявой мэтай. *Наслухаўся я пра баі з белапалякамі, пра паходы, налёты, рэйды па тылах і — бывай, астраномія.* А. Асіпенка. **2.** Нечаканая, раптоўная рэвізія, праверка каго-чаго-н. групай актывістаў па заданню грамадскіх арганізацый. *Кожную суботу праводзім рэйды праверкі.* «Звязда».

**Рэйс.** Шлях якога-н. транспарту па пэўнаму маршруту. *Шаферу не было як затрымлівацца. Ён спяшаўся ў рэйс.* М. Гроднеў.

**РЭЛІКВІЯ — РЭЛІКТ**

**Рэліквія.** Рэч, якая беражліва захоўваецца і шануецца як памяць пра мінулае. *З маленькаю латкай і локцем працёртым вісіць у кутку на цвіку гімнасцёрка — мая франтавая рэліквія.* П. Панчанка.

**Рэлікт.** Рэч або арганізм, якія засталіся як перажыткі ад старажытных эпох. *Некаторыя віды рыб у нас цяпер такія рэдкія, што аб іх можна гаварыць толькі як аб рэліктах.* «Полымя».

**РЭМЕЗ — РАМІЗ**

**Рэмез.** Маленькая птушка з атрада вераб'іных. *Сінічка-рэмез, якая*

*жыве на поўдні, будуе з пушынак насення вярбы і таполі гняздо, закрытае з усіх бакоў, толькі з адной адтулінай для ўваходу (рэдка з дзвюма)* «Заалогія».

**Раміз. 1.** У некаторых картачных гульнях недабор пэўнай колькасці бітак, а таксама штраф за такі недабор — *Першы раміз — золата!* — *сказаў Ілья і стукнуў кулаком па сваіх картах, што паклаў перад ім Мікіта* Я Васілёнак **2.** Паўторны папераджальны ўдар (укол) у фехтаванні *Апошні раміз.*

**РЭПАРАЦЫЯ — РЭПАТРЫЯЦЫЯ**

**Рэпарацыя,** *звычайна мн.* Плацяжы пераможанай краіны, якая развязала вайну, краіне-пераможцы на пакрыццё страт ад вайны. *Савецкі ўрад лічыць магчымым, каб, пачынаючы з 1 студзеня 1954 года, Германія была поўнасцю вызвалена ад уплаты рэпарацый.* «Звязда».

**Рэпатрыяцыя.** Зварот на радзіму ваеннапалонных, бежанцаў, перасяленцаў, якія аказаліся за межамі сваёй краіны ў выніку вайны. *Ёй паабяцалі перадаць справу пошукаў яе дзяцей у камісію па рэпатрыяцыі, якая пачала працаваць.* Я Шарахоўскі.

**РЭФЕРАТ — РЭФЕРЭНТ**

**Рэферат. 1.** Кароткі пераказ зместу навуковай працы, кнігі, артыкула і г. д *Усё, аб чым... [Рыгор] пісаў у дысертацыі, трэба было выкласці ў рэфераце.* Л. Арабей **2.** Даклад, заснаваны на крытычным аглядзе кніг, артыкулаў і г. д. *Максім Танк тады прачытаў рэферат аб беларускай літаратуры і вершы.* Д Бугаёў.

**Рэферэнт.** Службовая асоба, якая з'яўляецца дакладчыкам ці кансультантам па пэўных пытаннях. — *Кацар быў спецыяліст, светлая галава, найлепшы рэферэнт па эканоміцы.* І Шамякін.

**РЭЦЭ́ПТАР — РЭЦЭПТА́Р**

**Рэцэ́птар.** Канцавое ўтварэнне адчувальных нервовых валокнаў, якое ўспрымае раздражненні, орган пачуццяў *Канцы нервовых валокнаў, якія ўспрымаюць раздражненне, называюць рэцэптарамі.* «Анатомія і фізіялогія чалавека»

**Рэцэпта́р.** Работнік аптэкі, які прымае заказы на прыгатаванне лякарства па рэцэпту ўрача С і н о н і м фармацэўт *Асабліва прывязалася да дзяўчынкі рэцэптар Софія Уласаўна Латышава — тая, што нядаўна кожны дзень падавала ёй гаючае зелле для маці* «Звязда».

# С

**САБАЛЁВЫ — САБАЛІНЫ**

**Сабалёвы.** Зроблены з футра собаля. *Сабалёвая шапка.*

**Сабаліны.** Які мае адносіны да собаля. *Сабаліны запаведнік.*

**САЛІТЭР — САЛІЦЁР**

**Салітэр.** Буйны брыльянт *Прыгожы салітэр. Дарагі салітэр.*

**Саліцёр.** Доўгі плоскі чарвяк, які паразітуе ў кішэчніку чалавека і жывёлы. *Калі такая лічынка (фінка) у нядобра правараным або прасмажаным мясе трапляе ў кішэчнік чалавека, то ў кішэчніку яна вырастае ў стужачнага чарвяка — саліцёра.* В. Іванова.

**САЛЬДА — САЛЬТА**

**Сальда.** Астатак, розніца па рахунку паміж прыходам і расходам (дэбітам і крэдытам). — *Ніякай катастрофы не відаць... Хоць бы раз Дзямід Мікалаевіч прапіў паўсотню грамадскіх грошай. А так — усё сальда ў нас дэбітовае.* М Паслядовіч

**Сальта.** Пераварот у паветры цераз галаву (уперад ці назад). *Раптам з вады ракетай уверх вы-скачыў вялізны шчупак. Ён зрабіў у паветры адмысловае сальта і плюхнуўся назад у ваду.* Р Ігнаценка.

**САНАЦЫЯ — САНКЦЫЯ**

**Санацыя.** Папераджальныя меры па аздараўленню, палепшанню

стану здароўя (звычайна пра поласць рота) *Вельмі пажадана, каб санацыя поласці рота праводзілася рэгулярна ў зубаўрачэбным кабінеце* «Звязда»

**Санкцыя. 1.** Зацвярджэнне вышэйшай інстанцыяй якога-н акта, што надае яму прававую сілу, прызнанне законнасці якой-н. з'явы *Увечары, маючы санкцыю на высяленне, ен прыйшоў разам з міліцыянерам* Я Скрыган. **2.** Меры ўздзеяння за парушэнне закона *Не паблажлівы смяшок, не хіхіканне ў жменьку, а жалезная непрымірымасць і суровыя санкцыі да ўсяго і кожнага, хто робіць зло і хто патурае злу, у чым бы яно ні выяўлялася.* А Петрашкевіч **3.** У міжнародным праве. мера ўздзеяння ў адносінах да дзяржавы, якая парушае свае абавязацельствы, дагаворы *Эканамічныя санкцыі. Ваенныя санкцыі.*

**САП[1] — САП[2] — САПА**

**Сап[1].** Заразная хвароба коней і іншых няпарнакапытных, якая небяспечна і для людзей. — *Уявіце самі, у шасцярых коней выяўлены сап. Іх трэба неадкладна знішчыць.* І Гурскі.

**Сап[2]** *Разм.* Гукі сапення, цяжкага дыхання. *Вялізны, з падпалінамі на баках ваўкадаў, шырока выкідваючы лапы, з дыхавічным сапам імчаў угору* В. Быкаў.

**Сапа.** *Спец.* Акоп, траншэя, падкоп, які робіцца ў напрамку да пазіцыі праціўніка для паступовага і скрытага набліжэння да яго. Часцей у выразе: *ціхай сапай* — непрыкметна, цішком. — *Ён усё робіць ціхай сапай.* І. Грамовіч.

**САТЫР — САТЫРЫК**

**Сатыр.** У грэчаскай міфалогіі: істота з казлінымі нагамі, барадой і рагамі — спадарожнік бога віна і весялосці Дыяніса. *Яны такім чынам прадстаўлялі казларогіх сатыраў — спадарожнікаў Дыяніса.* «Гісторыя сярэдніх вякоў».

**Сатырык.** Аўтар сатырычных твораў *Майстэрства сатырыка выявілася перш за ўсё ў глыбокім разуменні народнага жыцця.* Я. Казека.

**САЦІНАВЫ — САЦІНЕТАВЫ**

**Сацінавы.** Які мае адносіны да саціну, зроблены з гэтай тканіны. *Сацінавая касаваротка*

**Сацінетавы.** Які мае адносіны да сацінету — тонкага саціну; зроблены з сацінету *Ён быў у новай са-цінетавай кашулі.* С Грахоўскі

**СВЯТЛАФОР — СЕМАФОР**

**Святлафор.** Сігнальны электрычны ліхтар з чырвоным, жоўтым і зялёным шкельцамі для рэгулявання руху на вуліцах, дарогах і г. д *Віктар Іванавіч, падышоўшы да акна, адсунуўшы штору, глядзіць на пустую вуліцу, дзе на рагу раўнамерна мігае жоўты ліхтар святлафора.* В. Гігевіч.

**Семафор.** Сігнальнае прыстасаванне на чыгуначных пуцях для перадачы сігналаў па руху паяздоў. *І калі замігцяць семафоры за станцыяй і абалье месяц рэйкі сярэбраным святлом — тады адпачынак.* М Лынькоў.

**СЕКТА — СЕКЦЫЯ**

**Секта. 1.** Рэлігійная абшчына, якая адасобілася ад царквы. *Рэлігійнымі сектамі называюцца арганізацыі і групы веруючых, якія адкалоліся ад галоўнай, пануючай царквы.* «Пытанні рэлігіі і атэізму». **2.** *перан.* Наогул усякая адасобленая група людзей. *Усе заклінальнікі змей у Марока — берберы, якія належаць да асобнай секты ці брацтва заклінальнікаў.* В. Вольскі.

**Секцыя. 1.** Аддзел установы, арганізацыі з пэўнай спецыялізацыяй. *Адбыліся справаздачна-перавыбарчыя сходы творчых секцый Саюза пісьменнікаў.* «Полымя». **2.** Адна з частак, якія складаюць штосьці цэлае. *У сіласнай вежы занялі толькі адну секцыю, і кукурузы болей не было.* Я. Ермаловіч.

**СЕКСТАН / СЕКСТАНТ — СЕКТАНТ**

**Секстан.** Тое, што і секстант. *Паказчыкі секстана надзейныя і беспамылковыя.*

**Секстант.** Вугламерны інструмент, які выкарыстоўваецца ў мараходстве і авіяцыі *Усе выступаючыя часткі самалёта: антэны, купал астранамічнага секстанта, абцякальнікі крылаў, паветразборнікі — ззялі блакітным халодным агнем.* «Звязда».

**Сектант.** Паслядоўнік якой-н рэлігійнай секты; прадстаўнік якой-н групы, секты *Сектантаў Валуеў ненавідзеў. Таксама ён цярпець не мог раскольнікаў.* У Караткевіч

**СЕЛЕКТАР — СЕЛЕКЦЫЯНЕР**

**Селектар.** Апарат для адначасовага тэлефоннага выкліку некалькіх або ўсіх абанентаў пэўнай лініі. *[У пакоі] стаяць селектары і тэлефонныя апараты, звязаныя дзесяткамі правадоў з усімі ўчасткамі і службамі будоўлі.* С. Грахоўскі.

**Селекцыянер.** Спецыяліст па селекцыі — паляпшэнню гатункаў раслін ці парод жывёл, вывядзенню новых гатункаў і парод шляхам штучнага адбору *Красан даведаўся аб цудоўных выніках селекцыянераў [доследнай] станцыі Лошыца* А. Стаховіч

**СЕПСІС — СКЕПСІС**

**Сепсіс.** Цяжкае інфекцыйнае захворванне· агульнае заражэнне арганізма хваробатворнымі мікробамі, якія трапілі ў кроў. *Праз два дні мяне даставілі ў клініку. Пачалося запаленне касцей, а неўзабаве і сепсіс — агульнае заражэнне крыві.* А Асіпенка.

**Скепсіс.** Крытычна-недаверлівыя, скептычныя адносіны да чаго-н , крайняе сумненне ў чым-н. *Здарылася так, што перад Іванавымі вачыма прамільгнуў вельмі яскравы выпадак з жыцця, які надоўга засмуціў яго нявер'ам і скепсісам.* В Быкаў.

**СЕРВІЗ — СЕРВІС**

**Сервіз.** Поўны набор сталовай ці чайнай пасуды на пэўную колькасць асоб *Вось толькі кафейнага сервіза не было, і давялося піць каму з кубкаў, каму са шклянак.* У. Шыцік

**Сервіс.** Абслугоўванне бытавых патрэб насельніцтва. *Сучаснае прадпрыемства, сучасныя формы сервісу — вось што такое Мінскі цэнтр па рамонту і абслугоўванню аўтамабіляў «Жыгулі».* «Звязда».

**СЕРПАНЦІН — СЕРПЕНЦІН**

**Серпанцін. 1.** Доўгая вузкая лента з каляровай паперы, якой упрыгожваюць святочную залу на балях, карнавалах і пад *Настаўнікі весяліліся ў гэты вечар. Са столі звісалі рамонкі, і серпанцін, і цацачныя зялёныя шарыкі.* Е Лось **2.** *перан.* Участак звілістай горнай дарогі. *Адхон, зарослы векавымі дрэвамі, цягнуўся з левага боку. У адным месцы на яго ўзбягалі звілістым серпанцінам мармуровыя сходы з шырокімі прыступкамі.* У. Караткевіч.

**Серпенцін.** Паласаты мінерал белага, зялёнага і іншых колераў з разнастайнымі адценнямі *Правая рука з каменным бранзалетам з серпенціну адкінута.* У. Караткевіч.

**СІБЕРНЫ — СІБІРСКІ — СІВЕРНЫ**

**Сіберны.** *Разм.* **1.** Крайне суровы; бязлітасны, жорсткі. *І на гэты раз паэт піша з думкай пра народ, пра яго нялёгкую долю на сіберных паўстанках гісторыі.* А Марціновіч **2.** Вельмі моцны, рэзкі, люты (пра вецер, мароз і пад.). *Сіберны холад прабіраўся пад вынашаныя шынялі і разлезлыя ад поту гімнасцёркі* М Аўрамчык.

**Сібірскі.** Які мае адносіны да Сібіры, уласцівы ёй; які жыве ў Сібіры. *Пышна закусцілася на сібірскіх аблогах цёмна-зялёным дываном пшаніца.* А. Пальчэўскі.

**Сіверны.** *Разм.* Паўночны (пра вецер); халодны з рэзкім пранізлівым ветрам (пра пагоду) *Хоць быў сакавік, а яшчэ маразы даходзілі да трыццаці градусаў, бушавалі завеі і секлі сіверныя вятры.* С Грахоўскі.

**СІМПАТЫЧНЫ[1] / СІМПАТЫЧНЫ[2] — СІМПТАМАТЫЧНЫ**

**Сімпатычны[1].** Які выклікае сімпатыю, прывабны (пра чалавека).

*На незнаемым касцюм, гальштук, белы каўнерык былі вельмі акуратныя, а сам твар мужчыны — сімпатычны* А Карпюк

**Сімпатычны**². *Спец* Які мае адносіны да вегетатыўнай нервовай сістэмы *Сімпатычная нервовая сістэма Сімпатычны нерв*

**Сімптаматычны.** Які з'яўляецца знешняй прыкметаю чаго-н ; паказальны ў якіх-н адносінах *Зварот да рэальных жыццёвых фактаў быў з'явай глыбока сімптаматычнай і заканамернай.* М Мушынскі

**СІМУЛЯЦЫЯ — СТЫМУЛЯЦЫЯ — СТЫМУЛЯВАННЕ**

**Сімуляцыя.** Прытворства; стварэнне фальшывага ўражання, уяўлення пра што-н. — *Уставай і ты, Максім,— бадзёра гаварыў ен,— хопіць сімуляцыі. Нам у дарогу пара* М Машара.

**Стымуляцыя.** Выкарыстанне стымулятара — рэчыва, якое стымулюе развіццё раслін і жывёл ці лекавага прэпарата для павышэння працаздольнасці, вынослівасці, для паляпшэння самаадчування *Стварэнне дадатковых біялагічных крыніц стымуляцыі таго ці іншага ўнутранага органа чалавека можа ў недалекім будучымператварыцца з даўняй мары ўрачоў у рэальнасць.* «Звязда».

**Стымуляванне.** Стварэнне стымулаў да чаго-н , заахвочванне; паскарэнне ажыццяўлення чаго-н *Эканамічнае стымуляванне вытворчасці.*

**СІТАЎКА — СІТНІЦА — СІТНІК / СІТНЁГ / СІТНЯК**

**Сітаўка.** Невялічкая птушка шэра-белага колеру з доўгім хвастом, які пастаянна хістаецца. *Скачуць, нібы на спружынах, вёрткія шэрыя пліскі Тут называюць іх яшчэ сіткамі ці сітаўкамі.* В. Вольскі

**Сітніца**, *разм.* Белы хлеб, спечаны з прасеянай праз сіта мукі. С і н о н і м сітны хлеб. *Пах [булачкі] нагадваў волю, тую пару, калі можна было купіць пульхную сітніцу, батон, сайку ці свежую французскую булку.* С Грахоўскі

**Сітнік.** Травяністая расліна з мяцелчатым суквеццем, якая расце звычайна на сырых, балоцістых месцах *На берагах пасівеў няскошаны сітнік.* С Грахоўскі

**Сітнёг.** Тое, што і сітнік *То цень, то святло прабягаюць па моры сітнягоў. Ад рабізны і аблокаў вада здаецца глыбокай, бяздоннай, свінцова-сіняй.* У Караткевіч.

**Сітняк.** Тое, што і сітнік *І ўздоўж і ўпоперак луг перасякаўся вузкімі, доўгімі і глыбокімі тонямі, зарослымі аерам, сітняком, чаротамі і мяккімі ніцымі лозамі, дзе хаваліся розныя лугавыя птушкі.* Я. Колас.

**СКАРБНІЦА — СКАРБОНКА**

**Скарбніца.** Сукупнасць культурных, духоўных ці матэрыяльных каштоўнасцей; месца іх захоўвання, крыніца чаго-н. *Міхась Чарот напісаў добрыя паэмы і вершы, якія назаўсёды засталіся ў скарбніцы беларускай літаратуры.* М. Хведаровіч.

**Скарбонка. 1.** Невялікая скрыначка (гліняная пасудзіна рознай формы) з вузкай шчылінай для апускання манет з мэтай іх накаплення, захоўвання, зберажэння. *На камодзе яго ўвагу прыцягнула скарбонка, зробленая ў выглядзе прыгожага белага сабачкі з чырвоным банцікам на шыі.* Я Васілёнак. **2.** Бляшанка для збору ахвяраванняў (у царкве, на відовішчах і г. д.). *Поп да хвоі скарбонку прыбіў, пачалі людзі грошы кідаць багародзіцы, а хто палатно panёс, сала, збожжа.* П. Галавач.

**СОТНІК — СОЦКІ**

**Сотнік.** У дарэвалюцыйнай Расіі: афіцэрскі чын у казацкіх войсках, які адпавядаў чыну паручніка ў пяхоце. *Прыбег казацкі сотнік.* З. Бядуля.

**Соцкі.** У дарэвалюцыйнай Расіі выбарная асоба з сялян, якая дапамагала паліцыі падтрымліваць парадак у вёсках. *Ураднік, стражнік, соцкі і дзесяцкія ўзышлі на ганак папоўскага дома і пастукалі.* Я. Колас

**СТАНІЦА — СТАНЦЫЯ**

**Станіца.** Вялікае казацкае сяло на Доне, Кубані і ў некаторых іншых абласцях *Дзень, што перагарэў на вачах і асыпаўся попелам за станіцаю ў стэпе, выдаўся, можа, занадта ўжо спякотны і для поўдня краіны* І Чыгрынаў.

**Станцыя.** **1.** Пункт прыпынку чыгуначных паяздоў, якія курсіруюць па пэўнаму маршруту *Яны ішлі на станцыю, але не па дарозе, а праз сасновы лясок, што рос астраўком паміж мястэчкам і чыгункай.* І. Чыгрынаў. **2.** Спецыяльная ўстанова, якая абслугоўвае ў якіх-н. адносінах насельніцтва, арганізацыі раёна і інш. *Лодачная станцыя. Тэлефонная станцыя. Станцыя юных натуралістаў.*

**СТАРТЭР — СТАТАР**

**Стартэр.** **1.** Той, хто дае сігнал старту — пачатку спартыўных спаборніцтваў. *Грымнуў выстрал суддзі-стартэра, і група красменаў памкнулася наперад.* «Беларусь». **2.** Прыстасаванне для пуску ў ход рухавікоў унутранага згарання. *Асцярожным рухам нагі націснуў на стартэр. Матор загуў роўна, прыглушана.* А. Шашкоў.

**Статар.** *Спец.* Нерухомая частка электрычнай машыны (генератара, рухавіка і пад.). *На статары — нерухомай аснове генератара — у такіх жа пазах размешчана абмотка.* П Рунец.

**СТАРШЫНА — СТАРШЫНЯ**

**Старшына.** Старшае званне малодшага каманднага саставу былой Савецкай Арміі. *Заўжды абавязкова ёсць знаёмыя ў нас — ці то лекар, ці то повар, ці то ротны старшына.* П. Панчанка.

**Старшыня.** Кіраўнік пасяджэння, сходу, арганізацыі, установы і інш. *Калгасны старшыня чымсьці нагадваў былога вайсковага старшыну: таксама ўмеў прынукаць да працы.* А. Асіпенка.

**СТАТУС — СТАТУТ**

**Статус.** У міжнародным праве. становішча, стан. *Вілейка, якая атрымала статус павятовага горада ў 1796 годзе, на працягу ўсяго XIX стагоддзя была невялікім горадам са слаба развітой эканомікай.* «Звязда».

**Статут.** Звод палажэнняў, якія вызначаюць структуру, прынцыпы і парадак дзейнасці якой-н. арганізацыі, установы; парадак выканання, прымянення чаго-н. *У школьнікаў ёсць свой участак і свой статут, свой брыгадзір і свая зарплата. «Маладосць».*

**СТУПА — СТУПЕНЬ — СТУПНЯ**

**Ступа.** Тэмп руху пры хадзьбе, яздзе на кані. С і н о н і м ы: поступ, паходка. *Раман запрог каня, палажыў на драбінкі плуг і мерную ступою паехаў паўскрай яру.* Я. Колас.

**Ступень.** **1.** Гарызантальны выступ лесвіцы, на які ступаюць пры пад'ёме ці спуску. С і н о н і м ы: ступенька, прыступка. *Сесія ў самым разгары. Студэнты чытаюць як ніколі раней. Чытаюць усюды: дома, у бібліятэках, у аўдыторыях, на калідорах каля акон, нават на ступенях лесвіцы — перад заходам на экзамен.* «ЛіМ». **2.** *перан.* Этап у развіцці, здзяйсненні чаго-н. *Ступень развіцця грамадства не бывае аднолькавай для розных краін.*

**Ступня.** Ніжняя частка нагі ад шчыкалаткі ўніз. *Ён пераступіў з нагі на нагу: ступні балелі, саднелі, заходзіліся ад сцюжы, але цяпер ён не зважаў на іх.* В. Быкаў

**СУКЕНКА — СУКОНКА**

**Сукенка.** Жаночае адзенне, верх- няя частка якога, што адпавядае кофце, складае адзінае цэлае з ніжняй часткай, якая адпавядае спадніцы С і н о н і м: плацце. *На Лёдзі была новая, з залацістым зіхценнем муаравая сукенка.* У. Карпаў.

**Суконка.** **1.** Абрэзак сукна ці іншай шарсцяной тканіны для чысткі, націрання чаго-н *Свідзерскі знайшоў на кватэры начальніка станцыі*

*шчотку і доўга шоргаў ёю па чараўках, потым драіў яшчэ і суконкай.* В Хомчанка **2.** Суконнаяануча. *[Пракоп] рашуча падымаецца з пасцелі, запальвае газоўку. Абуваецца Накручвае на ногі суконкі, надзявае лепшыя боты* Я. Колас.

**СЫВАРАТКА — СЫРОВАТКА**

**Сываратка.** *Спец.* Лячэбны прэпарат вадкасць з крыві і лімфы. *Дзейнасць сэрца была падтрымана. Але ці надоўга? Ён увёў сываратку і пачаў чакаць.* І. Шамякін.

**Сыроватка.** Вадкі адстой кіслага малака ці адтопленага тварагу. *Старая яшчэ карміла парасят на двары, стаяла, трымаючы чыгунок у руках, і пакрысе падлівала ў карытца сыроваткі.* «Полымя».

**СЫРКОВЫ — СЫРНЫ — СЫРЦОВЫ**

**Сырковы.** Які мае адносіны да сырка. *Сырковая маса.*

**Сырны.** Які мае адносіны да сыру. *Сырны пах.*

**Сырцовы.** Які мае адносіны да сырцу — не да канца выробленага ці не ачышчанага прадукту. *Байніцы, прыступкі лесвіц, аркі — усё зроблена з сырцовай цэглы, пашчэрбленай ужо часам.* В. Іпатава.

**СЫЦЕЦЬ — СЫЦІЦЬ**

**Сыцець.** Станавіцца сытым — укормленым, тлустым. *А ў паўночных малых народаў, калі выбіралі сабе кіраўніка, то праз год узважвалі — пацяжэў хоць на кілаграм, здымалі: значыцца, думаць, клапаціцца пра іншых перастаў, таму і сыцее.* Б. Сачанка.

**Сыціць,** *што.* Падсалоджваць ваду, квас і інш. мёдам; разбаўляць мёд вадою; настойваць мёд на чым-н *Сыціць квас.*

**СЯДЗІБА — СЯЛІБА**

**Сядзіба.** Жылыя і гаспадарчыя пабудовы разам з садам, агародам (звычайна ў сельскай мясцовасці). *Тое, што яшчэ здаля звярнула на сябе іх увагу, зблізку аказалася нейкай будынінай — ускраіннай сядзібай вескі або якім хутарам.* В Быкаў Н я п р а в і л ь н а: *Каля вёскі Койтава Віцебскага раёна ёсць сядзіба (трэба· сяліба) Здраўнёва. Яна звязана з імем выдатнага рускага мастака Рэпіна. Тут, на маляўнічым беразе Заходняй Дзвіны, мастак жыў з 1892 па 1900 год.* «Полымя».

**Сяліба.** Невялікі населены пункт у сельскай мясцовасці *Яна сустрэла яго пад крайняю ад Вуглоў ліпай, у самым далёкім кутку сялібы.* Я. Брыль. Н я п р а в і л ь н а: *Калі герой намерваецца падпаліць сялібу (трэба: сядзібу) аб'ездчыка, у чытача ўзнікае ўяўленне аб ім як аб чалавеку, у якога стыхійныя інстынкты ў часы глыбокага ўзбуджэння могуць узяць верх над свядомасцю.* Д. Гальмакоў.

**СЯДОК — СЯДУН — СЯДУРА**

**Сядок. 1.** Коннік, верхавы; той, хто едзе на матацыкле, веласіпедзе. *Праз якую хвіліну два ці тры матацыклы ўжо кульнуліся ў канаву, адзін стаяў на сярэдзіне, пакінуты седакамі, толькі задні, спрытна завярнуўшыся, паімчаў па дарозе ўгору.* В. Быкаў. **2.** Той, хто едзе ў якой-н. павозцы, санях, карэце. *Карэта рушыла. Сядок усміхнуўся, прыкрыў ногі і адхінуў фіранку са слюдзянога акенца.* У. Караткевіч.

**Сядун.** *Разм.* Нерухавы, пасіўны, бяздзейны чалавек; дамасед. *Прырода быццам знарок імкнулася ва ўсім падкрэсліць непадобнасць Мішы да Гены. Калі Гена рухавы, імклівы, дык Міша сядун. Любіць чытаць і за кніжкай можа прабавіцца цэлы дзень.* А. Марціновіч.

**Сядура.** *Разм.* Тое, што і сядун. *Гэтае мясцовае слова «сядура», распаўсюджанае сярод насельніцтва Калінаўшчыны, Злобін нярэдка ўжываў, калі гаварыў пра якога-небудзь чалавека-маруду.* М. Ткачоў.

## Т

**ТАЕМНЫ — ТАЙНЫ — ТАЯМНІЧЫ**

**Таемны. 1.** Скрыты, невядомы, непрыкметны для іншых. *Калі б толькі Альміна ведала, што сваімі словамі ў каторы раз дакранаецца ў маёй душы да таго таемнага і балючага, пра што нікому не гаварыў і не мог сказаць.* В. Гігевіч. **2.** Загадкавы, акружаны тайнай; не зусім усвядомлены, няясны. *Насіліся па лесе нейкія таемныя гукі, пагрозліва шумелі верхавіны ялін, і абамшэлыя ствалы гудзелі працягла і сумна.* М. Лынькоў.

**Тайны. 1.** Які з'яўляецца тайнай, скрываецца ад іншых, вядомы нямногім. *І вось на тайную сходку ў ціхі лясок на Няве — жывая людская паводка на плошчу няспынна плыве.* М. Смагаровіч. **2.** Звязаны з сакрэтнасцю; прызначаны для вядзення сакрэтных спраў, для сакрэтнай службы. *На двары пан убачыў свайго цівуна, акружанага такімі ж тайнымі агентамі Пялякова.* А. Якімовіч.

**Таямнічы. 1.** Поўны таямніцы, непазнанага, невядомага; загадкавы, незразумелы. *Кожны раз, калі Яўген Іванавіч браўся ажывіць новы прыбор, ён адчуваў, што наперадзе шмат чаго загадкавага, таямнічага.* М. Гроднеў. **2.** Які сведчыць пра наяўнасць таямніцы, сакрэтнасці. *Пры сустрэчы з калегам ён надаваў свайму твару таямнічы выгляд і ціхенька апраўдваўся.* А. Пальчэўскі.

**ТАКТОЎНЫ — ТАКТЫЧНЫ**

**Тактоўны.** Які валодае тактам, захоўвае правілы прыстойнасці ў адносінах да каго-чаго-н. — *Цябе выратавала тое, што ты аказаўся надзіва тактоўным чалавекам.* Я. Рамановіч.

**Тактычны. 1.** Які мае адносіны да ваеннай тактыкі; які звязаны з вядзеннем бою. *Днём ён быў на тактычных занятках у першым батальёне.* К. Крапіва. **2.** Які мае адносіны да сродкаў і прыёмаў грамадскай і палітычнай барацьбы. *Але ў сітуацыі, калі СД размножыла яго фатаграфію, самае правільнае — знікнуць з горада на пэўны час. Гэта не ўцёкі — тактычнае адступленне, каб перагрупавацца.* І. Шамякін.

**ТАКСАЦЫЯ — ТАКСІЧНАСЦЬ**

**Таксацыя.** *Спец.* **1.** Устанаўленне таксы — дакладнай расцэнкі тавараў ці размеру платы за працу, паслугі. — *Адпачынку засталося тры дні,— кажу я. — А там работа. Адна таксацыя выматае дух.* І. Навуменка. **2.** Улік і матэрыяльная ацэнка лесу: вызначэнне запасаў драўніны, аб'ёму дрэў, прыросту і г. д. — *Учора таксама позна ішла, прыцемкам. Таксацыю піловачніку па кнігах шукала.* В. Карамазаў.

**Таксічнасць.** Здольнасць выклікаць атручванне; ядавітасць. *Трэба ўлічваць, што ў сонечныя дні таксічнасць некаторых ядахімікатаў значна зніжаецца.* «Звязда».

**ТАТАЛІТАРНЫ — ТАТАЛЬНЫ**

**Таталітарны.** *Кніжн.* З адкрыта тэрарыстычнай дыктатурай; фашысцкі. *Любы таталітарны рэжым трымаецца на хлусні, гэта яго афіцыйная ідэалогія, і любая праўда для яе небяспечная.* А. Лукашук.

**Татальны.** Усеагульны, усеабдымны. *Татальная мабілізацыя.*

**ТАФТА — ТАХТА**

**Тафта.** Грубая шаўковая ці баваўняная тканіна з папярочнымі дробнымі рубчыкамі. *З двара ў гэты час выйшла Ірачка, у клёшным вішнёвым плацці з тафты, з бліскучай брошкай — падарункам маладога, у туфліках на шпільках.* В. Дайліда.

**Тахта.** Шырокая і нізкая канапа без спінкі. *Даша ўселася на тахту, скінула туфлі і падкурчыла пад сябе ногі.* Я. Шарахоўскі.

**ТОЛ — ТОЛЬ**

**Тол.** Выбуховае рэчыва, якое выкарыстоўваецца ў артылерыі і

падрыўной справе. Сінонім: тратыл. *Мікола даставаў са снарадаў тол, складаў у кош і некуды адносіў.* І. Новікаў.

**Толь.** Дахавы і ізаляцыйны матэрыял з асобага кардону, насычанага воданепранікальным саставам. *На даху, накрытым толем, нацерушылася ігліца.* М. Даніленка.

**ТРАК — ТРАКТ — ТРАКТАТ**

**Трак.** Звяно гусеніцы ( у трактара, танка і пад.). *Карпенка не спускаў вачэй з калоны, якая ўсё расла і расла на дарозе, ужо чуваць было, як дрыжала зямля ад танкаў, як лескацелі іх цяжкія шырокія тракі.* В Быкаў.

**Тракт.** Шырокая праезная дарога. Сінонім: шлях. *Ад станцыі да бальніцы было з вярсту, і вёў да яе самы сапраўдны тракт — вымашчаны брусчаткаю, абсаджаны маладымі таполямі.* Л. Арабей.

**Трактат.** Навуковая праца, у якой разглядаецца асобнае пытанне, праблема; разважанне на спецыяльную тэму. *Газета застаецца газетай — не пацяшальнай чытанкай і не навуковым трактатам. а трыбунай мас і трыбунай для мас.* Б. Стральцоў.

**ТРАЛІЦЬ — ТРАЛЯВАЦЬ**

**Траліць.** *Спец.* **1.** Лавіць тралам — вялікай сеткай для лоўлі рыбы з суднаў. *Сёння першы выхад у мора Дзень быў урачысты, як святочны. Пачалі траліць таксама ўдала — ні адзін трал не падымалі на борт пустым, у кожным было поўна рыбы.* «Звязда». **2.** Вылоўліваць і знішчаць падводныя міны. *Траліць можна было толькі на сярэдняй і поўнай вадзе — пры адліве тралы чапляліся за грунт.* «Звязда».

**Траляваць.** *Спец.* Падцягваць, падвозіць спілаваны лес з месца нарыхтоўкі да дарогі ці да месца сплаву. *Быў бы жывы тата, ён даўно б новы дом збудаваў. Ён ужо тады пачаў траляваць бярвенне з лесу* А. Кудравец.

**ТРАМБІН — ТРАМБОЗ — ТРАМБОН — ТРОМБ**

**Трамбін.** Фермент, які выклікае згортванне крыві. *У крыві знаходзіцца некалькі розных ферментаў. Пры ўдзеле аднаго з іх — трамбіну — адбываецца згортванне крыві.* «Анатомія і фізіялогія чалавека».

**Трамбоз.** Працэс утварэння тромбаў у сасудах. *Яе [смерць] выклікала, мабыць, закупарка ныраччных вен альбо трамбоз ныраччных артэрыяў.* А. Савіцкі.

**Трамбон,** Духавы музычны інструмент. *Падвывалі трамбоны, раскаціста грымела піяніна, тоненькім ручайком ліўся голас скрыпкі.* М. Капыловіч.

**Тромб.** Згустак крыві, які ўтварыўся ў крывяносным сасудзе ці ў сэрцы. *Часам пры рэўматызме і некаторых іншых хваробах пашкоджваецца ўнутраная абалонка сэрца ці крывяноснага сасуда. На месцы пашкоджання кроў пачынае згортвацца і ўтвараюцца згусткі крыві, ці тромбы.* «Анатомія і фізіялогія чалавека».

**ТРАНЗІСТАРНЫ — ТРАНЗІТНЫ**

**Транзістарны.** Заснаваны на выкарыстанні транзістараў — паўправаднікоў, прызначаных для ўзмацнення, пераўтварэння электрычных сігналаў. *Радыё ўвайшло ў наш быт, і сёння немагчыма ўжо ўявіць кватэру без звычайнага сецявога ці транзістарнага прыёмніка або просценькага дынаміка.* «ЛіМ».

**Транзітны.** Які едзе да месца прызначэння з перасадкай у якім-н. пункце (пра пасажыраў); пры-значаны для такіх пасажыраў; які ідзе без перагрузкі на прамежкавых станцыях. *У транзітнага пасажыра ўражанне пра гарады звычайна складваецца па вакзалах.* Я. Сіпакоў.

**ТРАНСПАРЦЁР — ТРАНСПАРЦІР**

**Транспарцёр. 1.** Механічнае прыстасаванне для бесперапыннага перамяшчэння грузаў, асобных

дэталей. Сінонім: канвеер. *Узяліся мы дружна, стужка транспарцёра аж прагіналася, несучы ў вагон бясконцую плынь жытніх зяр-нят.* У. Дамашэвіч. **2.** Браніраваная машына для перавозкі пяхоты на поле бою і для разведкі. Сінонім: бронетранспарцёр. *Два танкі вельмі асцярожна, адзін па правым баку дарогі, другі па левым мінулі транспарцёры і набліжаліся да мастка.* В. Быкаў.

**Транспарцір.** Прыбор у выглядзе падзеленага на градусы паўкруга і лінейкі, прызначаны для пабудовы і вымярэння вуглоў на чарцяжах. *Для вымярэння вуглоў прымяняецца асобы прыбор — транспарцір.* «Геаметрыя».

**ТРАФЕЙНЫ — ТРАХЕЙНЫ**

**Трафейны.** Які з'яўляецца трафеем, захоплены як трафей. *Дачка Алеся ў цёмны бор пайшла з трафейным аўтаматам.* М. Аўрамчык.

**Трахейны.** *Спец.* Які мае адносіны да трахеі — дыхальнага горла. *Трахейная трубка.*

**ТРУМ — ТРУМО**

**Трум.** Унутранае памяшканне карабля паміж палубай і днішчам, прызначанае для розных грузаў. *Пагода была ціхая, агні відаць далёка, ну і паклалі мяшкі з мукою не ў трум, а перад рулявою рубкаю, каб лягчэй згружаць.* В. Карамазаў.

**Трумо.** *нескл.* Высокае стаячае люстра. *Сярожка, пакуль маці гаварыла з бацькам, насцярожана прыціх ля трумо, скруціў стружку і засунуў за канапу, абтрос на грудзях кашульку.* «Полымя».

**ТЫТАНАВЫ — ТЫТАНІЧНЫ**

**Тытанавы.** Які мае ў сваім саставе хімічны элемент тытан, мае адносіны да тытану. *Тытан і тытанавыя сплавы маюць вялікую трываласць, вязкасць, каразійную ўстойлівасць і шырока выкарыстоўваюцца ў турба- і караблебудаванні, ракетнай, авіяцыйнай тэхніцы і інш.* БелЭн.

**Тытанічны.** Незвычайны па фізічнай ці маральнай сіле, розуму, таленту; вельмі вялікі па сіле, размаху, напружанасці; грандыёзны. *Нельга не здзіўляцца яго [А. Я. Багдановіча] сапраўды тытанічнай працаздольнасці.* «Полымя».

## У

**УБРАНАСЦЬ — УБРАННЕ / УБРАНСТВА**

**Убранасць.** Упарадкаванасць, упрыгожанасць. *Святочная ўбранасць вуліцы.*

**Убранне.** Адзенне, убор; строі. *Побач — невялікая люстраная вітрына, поўная ўзораў жаночага ўбрання.* М. Машара. || Тое, што ўпрыгожвае сабой што-н. *І тут зусім нечакана паваліў снег. Ціхі такі, спорны. Неўзабаве ўся зямля была ў белым убранні.* Р. Ігнаценка.

**Убранства.** *Разм.* Тое, што і ўбранне. *І між усякага ўбранства відна і дзядзькава апратка, пільчак і шапачка-аладка.* Я. Колас.

**УВАЖЫЦЬ — УЗВАЖЫЦЬ**

**Уважыць. 1.** *каго-што.* Аказаць каму-н. павагу, праявіць увагу да каго-н. *Як ні ўпіралася Поля, а прысесці да стала прыйшлося — трэба было ўважыць гасцей.* М. Арочка. **2.** *каму.* Зрабіць уступку, прыняўшы пад увагу што-н.; уступіць. *Я ж цябе ведаю, ты яму не саступіш і ён табе не ўважыць.* І. Гурскі.

**Узважыць,** *каго-што.* **1.** Вызначыць вагу, цяжар каго-чаго-н. *Клара ўзяла скрутак, здзівілася яго лёгкасці, узважыла на руцэ і разгарнула.* В. Хомчанка. **2.** *перан.* Абдумаць, ацаніць што-н. *Тамара не спала ўсю ноч, усё перадумала, усё ўзважыла.* М. Гроднеў.

**УВАР — УЗВАР**

**Увар.** Колькасць, аб'ём, на які паменшала што-н. пры варцы. *Увар мяса невялікі.*

**Узвар.** Адвар з ягад, траў і інш. *Часам заходзіць да іх суседка, Вальчына матка, прынясе матцы якога ўзвару з зёлкаў, забярэ малых, накорміць* Л. Арабей.

**УВАХОД — УВАХОДЗІНЫ**

**Уваход.** Месца, праз якое ўваходзяць куды-н. *На шпітальным двары было цемна, гарэла некалькі ліхтароў толькі над уваходам у будынак.* К. Чорны.

**Уваходзіны,** *адз. няма. Разм.* Урачыстая гулянка з выпадку перасялення на новае месца, у новае жылое памяшканне. *Заўтра тут расставяць сталы і лаўкі, і напоўніцца хата шумам-гоманам вясёлых уваходзін.* А. Ус.

**УГОДДЗЕ — УГОДКІ**

**Угоддзе.** Участак зямлі, які мае гаспадарчае прызначэнне. *Васіліна забрала ў Люды аловак, прыхапіла з суседняга стала аркуш паперы і схілілася над картай, разглядаючы калгасныя ўгоддзі і іх межы.* Т. Хадкевіч.

**Угодкі.** *адз. няма.* Гадавіна з дня смерці; адзначэнне гэтай даты; наогул урачыстасць, прысвечаная гадавіне якой-н. падзеі. *Добра і тое, што кніга А. Лойкі ўбачыла свет іменна тады, калі наша грамадскасць адзначала 75-я ўгодкі з дня нараджэння Максіма Багдановіча.* У. Юрэвіч.

**УЕЗД — УЗ'ЕЗД**

**Уезд.** Месца, праз якое ўязджаюць куды-н.; заезд. *Пры ўездзе ў вёску на высокай маляўнічай арцы віселі лозунгі.* Л. Гаўрылкін.

**Уз'езд.** Месца, дарога, па якой уз'язджаюць на што-н., куды-н. *На паваротцы дарогі, дзе пачынаўся ўз'езд на бераг, Каваль заўважыў Паліну* А. Савіцкі.

**УЗМЕЖАК — УЗМЕЖЖА**

**Узмежак.** Край мяжы; мяжа. *На ўзмежках палеткаў чырванеюць буйныя ягады шыпшыны.* Я. Брыль.

**Узмежжа.** Неўзараная зямля паміж палеткамі. *А ў сад зайдзі ўзмежжам да рабін — гарацъ, ірдзеюць на марозе.* А. Пы. ін.

**УЗНЕСЕНЫ — УЗНЁСЛЫ**

**Узнесены.** Падняты, узняты ўвысь, угору. *Узнесены над высокім будынкам дзяржаўны сцяг.*

**Узнёслы.** Поўны вялікага значэння, глыбокага зместу, высакародных пачуццяў. Сінонімы: урачысты, прыўзняты. *Яшчэ ў пару Бондаравай маладосці пра звычайную ў сялянскай штодзённасці работу, як ворыва, сяўба, жніво, сталі гаварыць высокімі, узнёслымі словамі.* І. Навуменка.

**УЛАСНІЦКІ — УЛАСНЫ**

**Уласніцкі.** Уласцівы ўласніку — чалавеку, які прагне цалкам уладаць чым-н., не дзелячыся з іншымі. *Уласніцкая псіхалогія.*

**Уласны. 1.** Які належыць каму-чаму-н. як уласнасць. *Міхал памірае, не дасягнуўшы мэты, не пабачыўшы ўласнай зямлі.* В. Каваленка. **2.** Свой, асабісты. *Чалавек нарадзіўся, жыў, падрастаў. Нарэшце, на ўласныя ногі ён стаў.* П. Пранузa.

**УЛЮБЁНЫ — УЛЮБЛІВЫ**

**Улюбёны. 1.** Закаханы ў каго-н. *Калі салдаты пайшлі, Лёдзя, улюбёная на той момант у Пракопа, з нейкім асаблівым уздымам узялася за работу.* У. Карпаў. || Ачараваны, захоплены кім-чым-н. *Сіліч адразу не прызнаўся, што ён таксама настаўнік гісторыі. Але выклікала павагу хлопцава перакананне і падкупляла ягоная схільнасць да аблюбаванай прафесіі, у якую сам быў улюбёны змалку.* М. Аўрамчык. **2.** Такі, якому аддаецца перавага ў параўнанні з чым-н. іншым. Сінонім: аблюбаваны. *У ягоным хрысціянскім Навагародку свяшчэнным дрэвам, улюбёным дрэвам багародзіцы святары аб'явілі белую бярозу.* Л. Дайнека.

**Улюблівы.** Схільны лёгка і часта ўлюбляцца. *Па натуры я быў не ўлюблівы.* А. Карпюк.

**УПАДАЧНЫ — УПАДНІЦКІ**

**Упадачны.** Які бывае пры ўпадку ў якой-н. галіне грамадскага жыцця; які характарызуецца адсутнас-

цю актыўнасці ў чым-н., веры ў што-н. *Упадачны стан сельскай гаспадаркі. Упадачны настрой.*

**Упадніцкі.** Які мае адносіны да ўпадніцтва. *Матывы завядання, тугі, адзіноты, калі яны становяцца ўстойлівымі і выцясняюць усё астатняе,— гэта ўжо атрыбуты ўпадніцкай паэзіі.* Н. Перкін.

**УСКРАЕК — УСКРАІНА**

**Ускраек.** Крайняя частка якой-н. прасторы; край чаго-н. *Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песняляснога жаваранка.* Я. Колас.

**Ускраіна. 1.** Крайняя частка якой-н. мясцовасці, тэрыторыі; аддаленая ад цэнтра частка населенага пункта. *У генералавым доме жылі ўжо іншыя людзі. Яны сказалі, што цётка Антося перабралася на ўскраіну горада ў сваю хату.* А. Карпюк. **2.** Аддаленая, пагранічная тэрыторыя дзяржавы. *Ускраіна Расійскай імперыі.*

**УСТАНОВАЧНЫ — УСТАНОЎЧЫ**

**Установачны.** Які дае арыенціроўку, указанне на што-н.; прынцыпова важны. *Установачны артыкул Максіма Танка быў змешчаны ў 12-м нумары «Нашай волі», а на трынаццатым газета была закрыта.* У. Калеснік.

**Устаноўчы.** Які мае сваёй мэтай заснаванне, арганізацыю чаго-н. *У Маскве праходзіў устаноўчы кангрэс, у рабоце якога прынялі ўдзел дэлегацыі дзесяці краін, якія культывуюць спартыўную акрабатыку.* «Звязда».

## Ф

**ФАБРЫКАНТ — ФАБРЫКАТ**

**Фабрыкант.** Уладальнік фабрыкі.

**Фабрыкат.** Гатовы фабрычны выраб, закончаны прадукт вытворчасці. *Пры недахопе ўласнай сыравіннай базы, пры вялікай колькасці кваліфікаванай рабочай сілы, пры высокіх выдатках вытворчасці выпрацоўваць паўфабрыкат або танныя масавыя фабрыкаты робіцца нявыгадным.* «Эканамічная геаграфія зарубежных краін».

**ФАВАРЫТ — ФАВОР**

**Фаварыт.** Любімец важнай уплывовай асобы, пратэкцыю якой ён выкарыстоўвае для сваёй выгады.

**Фавор.** *Кніжн.* Прыхільныя адносіны знатнай асобы да каго-н. *Усіх дзівіла, што .. [Загорскі] нічога не атрымаў за той фавор.* У. Караткевіч.

**ФАКТ — ФАКТАР**

**Факт.** Сапраўдны, нявыдуманы выпадак, з'ява, здарэнне; тое, што сапраўды мела месца; рэальнасць. *І нічога добрага не было ў гэтых чутках, і горш за ўсё — яны пацвярджаліся фактамі.* Я. Колас.

**Фактар.** Момант, істотныя абставіны ў якім-н. працэсе, з'яве; рухаючая сіла, прычына якога-н. працэсу, з'явы. *Сярод прыродных фактараў найбольш магутны ў забеспячэнні большай працягласці жыцця чалавека — лес.* «Полымя».

**ФАКУЛЬТАТЫЎНЫ — ФАКУЛЬТЭЦКІ**

**Факультатыўны.** Неабавязковы; які выбіраецца па жаданню. *Спачатку выдавецтвы арыентаваліся выключна на зацверджаную школьную праграму, але пазней значна пашырылі свае планы і ўзяліся за выданне твораў, рэкамендаваных для пазакласнага чытання і факультатыўнага вывучэння.* «Полымя».

**Факультэцкі.** Які мае адносіны да факультэта. *Відаць, групу лічылі нядрэннай, і такі правал — катастрофа не толькі для саміх студэнтаў, але і для факультэцкага, а можа нават і для інстытуцкага начальства.* І. Шамякін.

**ФАНФАРОН — ФАНФАРЫСТ**

**Фанфарон.** Самахвал, хвалько, выхваляка. *Госць пакалыхваўся каля печы яшчэ больш свабодна і зверху вадзіў позіркам па ўсіх прысутных. Можа, так вось гарадскія*

*фанфароны выхваляюцца перад натоўпам у шынку сваёй высокай еўчонасцю, уменнем разбірацца ў сусветных падзеях.* «Полымя».

**Фанфарыст.** Трубач, які іграе на фанфары — духавым музычным інструменце, што служыць звычайна для падачы сігналаў урачыстага характару. *У 12 гадзін на стадыен «Дынама» выйшлі 16 фанфарыстаў.* «Беларусь».

**ФАРСУНКА — ФАРСУХА**

**Фарсунка.** *Спец.* Прыстасаванне для распыльвання якіх-н. вадкасцей або парашкападобных матэрыялаў. *Фарсунка для падачы паліва ў топку працуе надзейна.*

**Фарсуха.** *Разм.* Жанчына, якая любіць фарсіць. *Яе ўсе лічылі фарсухай.*

**ФАТАЛІЗМ — ФАТАЛЬНАСЦЬ**

**Фаталізм.** *Кніжн.* Вера ў непазбежны, немінучы лёс, у наканаваную долю. *Глыбокі песімізм і фаталізм быў характэрны для творчасці Л Андрэева.*

**Фатальнасць.** Непазбежнасць, немінучасць. С і н о н і м: наканаванасць. *Тэорыя «аўтагеннасці», што бытавала тады, па сутнасці фатальнасць.* Я. Скрыган.

**ФЕЕРВЕРК — ФЕЕРВЕРКЕР**

**Феерверк.** Каляровыя дэкаратыўныя агні ад спальвання розных парахавых сумесей у час урачыстасцей, свят і пад. *Стракатым феерверкам разляталіся па ўсім небе імклівыя агні.* М. Лынькоў.

**Феерверкер.** У дарэвалюцыйнай рускай арміі унтэр-афіцэр артылерыі. *Седзячы цэлы дзень у акопах, пад страшэнным абстрэлам. ... падпрапаршчык і старшы феерверкер пасылалі па розных справах пад кулі ніжніх чыноў.* М. Гарэцкі.

**ФЕРТ — ФЕТР**

**Ферт.** 1. Устарэлая назва літары Ф. 2. *Разм* Франтаваты, фарсісты, самаздаволены чалавек. *Як даўней. так і цяпер там паліцэйскі ходзіць фертам.* Я. Колас.

**Фетр.** Лепшы гатунак лямцу для вырабу капелюшоў, валёнак і пад. *Фетрам называецца лямцападобны матэрыял. атрыманы валкай пуху.* «Таваразнаўства».

**ФІГУРАЛЬНЫ — ФІГУРНЫ — ФІГУРЫСТЫ**

**Фігуральны.** Алегарычны, вобразны. *Думка гэта правільная не ў літаральным, а ў фігуральным яе сэнсе.* Н. Перкін.

**Фігурны. 1.** Які мае непрамалінейныя абрысы, контуры, які мае складаную форму. *Фігурныя дэталі і паверхні шліфуюцца ўручную звычайнай папяровай шкуркай.* П. Рунец. **2.** Які выконваецца з фігурамі, апісвае пры сваім руху фігуру. *Некалькі разоў ён спрабаваў арганізаваць гурток фігурнага катання, але гэта яго задума заўсёды сустракала з нечага боку перашкоду.* М. Лобан. **3.** *Разм.* Які мае прыгожую фігуру; фігурысты *(у 2 знач.). Захар Лемеш — фігурны чалавек* Я. Колас.

**Фігурысты.** *Разм.* **1.** Складаны па форме. *Вокны ў дамах — з фігурыстымі разнастайнымі ўзорамі.* І. Новікаў. **2.** Які мае прыгожую фігуру; фігурны *(у 3 знач.). Нічога дзяўчына, сакаўная і фігурыстая.* Я. Колас.

**ФІКСАЖ — ФІКСАТАР — ФІКСАТУАР — ФІКСАТЫЎ**

**Фіксаж.** Хімічны раствор, у якім апрацоўваюць фотаматэрыялы для замацавання здымка. *Замацавальнікі (фіксажы) замацоўваюць (фіксуюць) адлюстраванне на плёнцы.* «Таваразнаўства».

**Фіксатар. 1.** Прыбор, прыстасаванне для замацоўвання чаго-н. у патрэбным становішчы. *Фіксатары замаруджваюць выпарванне паху духоў і адэкалону.* «Таваразнаўства». **2.** Той, хто фіксуе, адзначае што-н. *Сучасны журналіст-эканаміст не проста фіксатар фактаў, ілюстратар пэўных пастулатаў, а тэарэтык, удумлівы аналітык, які, умела спалучаючы ў адной асобе майстэрства публіцыста з ведамі спецыяліста, можа сказаць чытачу нешта новае.* Б. Стральцоў.

**Фіксатуар.** Памада для валасоў, якая надае ім пэўную форму. *Прыемны пах фіксатуара.*

**Фіксатыў.** *Спец.* Раствор, якім пакрываюць карандашныя малюнкі, чарцяжы з мэтай захавання іх ад пашкоджання. *Чарцяжы замацаваны фіксатывам*

**ФУНДАМЕНТАЛЬНЫ — ФУНДАМЕНТНЫ**

**Фундаментальны. 1.** Трывалы, моцны, вялікі. Фундаментальнае збудаванне. || *перан.* Грунтоўны, глыбокі па зместу. *Фундаментальнае даследаванне.* **2.** Асноўны, галоўны. *Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь — наша галоўная фундаментальная бібліятэка.*

**Фундаментны.** Які мае адносіны да фундамента, прызначаны для яго. *Усе фундаментныя работы былі закончаны раней тэрміну, і што яшчэ не менш важна — да наступлення даждлівых дзён.* «Звязда».

## Х

**ХАДАВЫ — ХАДЖАЛЫ — ХАДЗЯЧЫ — ХОДЖАНЫ — ХОДКІ**

**Хадавы. 1.** Звязаны з ходам, перамяшчэннем; які можа рухацца, які на хаду, рухомы. *Такую машыну Дзмітрый вёў упершыню. І ўжо на першых кіламетрах ацаніў яе хадавыя якасці.* П. Беразняк. **2.** *Разм.* Які мае вялікі попыт, шырока вядомы, пашыраны. *Раней пра токараў ды слесараў адно чулі, а зараз на сяле гэта самыя хадавыя прафесіі.* «Звязда».

**Хаджалы.** *Разм.* Які шмат папахадзіў, пабыў дзе-н.; бывалы. *Ён нярэдка называў сябе чалавекам хаджалым і язджалым, і гэта сапраўды так — цяжка назваць які-небудзь куток нашай краіны, дзе ён не быў.* «ЛіМ».

**Хадзячы. 1.** Які можа хадзіць, перамяшчацца на сваіх нагах. *А ў першы дзень [вайны] выпісалі ўсіх хадзячых хворых.* С. Грахоўскі. **2.** Шырока распаўсюджаны, агульнапрыняты, усім вядомы. *За ўвесь вечар, апрача хадзячых анекдотаў, ён так нічога і не пачуў ад іх і вельмі пашкадаваў, што змарнаваў столькі часу* «ЛіМ».

**Ходжаны.** Такі, па якому часта ходзяць (пра сцежку, дарогу і інш.). *Ходжаныя і пераходжаныя сцежкі, знаёмыя на кожнай паваротцы.*

**Ходкі. 1.** Які хутка і лёгка рухаецца, лёгкі на хаду (на ногі). *Потым пакацілі ходкія гарматы, мінамёты. За імі — з той жа імклівасцю, але больш паважна, ракеты.* У. Карпаў. **2.** Які мае вялікі попыт (пра тавары, вырабы і пад.). *Такія боцікі — вельмі ходкі тавар, на прылаўках не залежваецца.* «Звязда».

**ХАЛЕРНЫ — ХАЛЕРЫЧНЫ**

**Халерны. 1.** Які мае адносіны да захворвання халерай. *І хвароба нейкая халерная падступілася: прастудзіў галаву, памарнеў з год — і няма чалавека.* М. Стральцоў. **2.** *Разм. груб.* Вельмі дрэнны, непрыемны. — *Ну дык чаго ты звягаеш... Што гэта за народ халерны!* К. Чорны.

**Халерычны.** Характэрны для халерыка — тэмпераментнага, неўраўнаважанага чалавека, які лёгка ўзбуджваецца пад уздзеяннем якіх-н. уражанняў. *Халерычнаму тэмпераменту характэрна рэзкая змена настрояў, парывістасць рухаў.* БелЭн.

**ХАНДРА — ХАНДРОМА — ХАНДРЫЛА**

**Хандра.** Маркотны, сумны настрой; туга. *Пад дзеяннем усё той жа хандры, якая яго выгнала з інтэрната, Міша ўстаў, апрануў паліто і пайшоў на вуліцу.* А. Карпюк.

**Хандрома.** *Спец.* Дабраякасная пухліна з храстковай тканкі.

**Хандрыла.** Травяністая расліна сямейства складанакветкавых, з млечнага соку якой здабываецца каўчук.

**ХВАТКІ — ХВАЦКІ — ХВОСТКІ**

**Хваткі.** *Разм.* Які спрытна, учэпіста хапае, хутка схоплівае і ўт-

рымлівае што-н., учэпісты; спрытны. *Кожны з нас бадзёры, упарты, хваткі. мы яшчэ не зведалі тугі.* П. Прануза.

**Хвацкі. 1.** Удалы, спрытны, маладзецкі. *Гэты стары салдат, хвацкі рубака, узнагароджаны трыма георгіеўскімі крыжамі, потым камандзір эскадрона ў будзёнаўскай конарміі* В. Хомчанка. **2.** *Разм.* Вельмі добры, слаўны. *Боты не надта хвацкія: да старых, абшарпаных халяў прышыў Адам галоўкі.* І. Навуменка.

**Хвосткі.** Які моцна, балюча сцябае. *Якраз пачаўся халодны хвосткі дождж Ужо не адзін раз клаўся на Новагарадок снег, але яму пакуль не хапала сілы, каб утрымацца на зямлі.* Л. Дайнека.

**ХВОРАСТ — ХВОРАСЦЬ**

**Хворост.** *зб* Сухія галінкі з дрэў ці хмызняку. *Агонь апошні хворост знішчыў.* А. Куляшоў.

**Хворасць.** *Разм.* Хвароба, недамаганне, хваравіты стан. *У Мікалаеўшчыне розныя рэўматычныя хворасці выганялі з дапамогай мясцовай гразі.* М. Лужанін.

**ХМАРНЫ — ХМУРНЫ / ХМУРЫ**

**Хмарны. 1.** Пакрыты хмарамі; з хмарамі. *Ноч была хмарная, і на невялікай адлегласці ўжо нельга было распазнаць чалавека.* І. Дуброўскі. **2.** *перан.* Пануры, сумны, невясёлы. *Хмарны настрой яшчэ быў у Антонавай душы.* А. Савіцкі.

**Хмурны. 1.** Пахмурны, воблачны (пра неба, надвор'е і пад.). З каміноў хат, вышэй падпіраючы хмурнае навіслае неба, угору ўздымаюцца гонкія слупы дыму. *М. Аўрамчык.* **2.** *перан.* Сумны, пануры (пра чалавека). *Голас у мамы добры, яна зусім не хмурная.* М. Лужанін.

**Хмуры.** *Разм.* Тое, што і хмурны. *Помню, хмуры ранак, ў росах канюшына, толькі птушкі посвіст ды шляхі, шляхі.* Н. Чарнушэвіч.|| *перан. Тым часам кіраўнік секцыі — яго завуць Антон Друк — немалады, хмурага выгляду мужчына — неяк надзвычай хутка робіць адбор.* І. Навуменка.

**ХМЕЛЕВЫ — ХМЕЛЬНЫ**

**Хмелевы.** Які мае адносіны да расліны хмелю, характэрны для яе. *У саўгасе значныя хмелевыя плантацыі, і сабраны на іх ураджай дае немалы прыбытак.* «Звязда».

**Хмельны. 1.** Які знаходзіцца ў стане ап'янення. Сінонімы: захмялелы, нецвярозы. *Грукоча машына. Маўчы, качагар, і дымам вугольным давіся!.. Хай з топкі тваёй не праб'ецца угар да містэраў хмельных і місіс.* А. Дудар. **2.** Які выклікае ап'яненне. *Заморскія віны, мясцовая медавуха, гарэлка і хмельнае піва ліліся ракой.* П. Ткачоў. || *перан. Які прыводзіць да ўзбуджэння, самазабыцця. Зноў над роднай зямлёй вее водарам хмельным вясновым.* Н. Гілевіч.

**ХУТАРАНСКІ — ХУТАРСКІ**

**Хутаранскі.** Які мае адносіны да хутараніна, належыць яму. *[Уладзя] тады наўмысля пайшоў упоперак цераз забаранаваную хутаранскую ярыну.* К. Чорны.

**Хутарскі.** Які мае адносіны да хутара, жыве на хутары. *На дварэ вусаты дзядзька — хутарскі гаспадар — ладзіў воз.* К. Чорны.

## Ц

**ЦАЛІК — ЦАЛІНА**

**Цалік.** Снежная прастора без дарог, без слядоў; наогул месца, па якім ніхто не хадзіў, не ездзіў. *Яны збочылі з дарогі і пайшлі па снегавым цаліку туды, дзе шырокім лапікам цьмеў уночы хмызняк.* В. Быкаў.

**Цаліна. 1.** Некранутая, ніколі не араная, але прыдатная для апрацоўкі зямля. *Вярнуўшыся праз некалькі дзён у Мінск, Лёня разам з іншымі студэнтамі паехаў на цаліну ў Казахстан.* В. Вольскі. **2.** *перан.* Недаследаваная, нявывучаная справа, галіна чаго-н. *Аўтар [У. Карпаў] узняў вельмі важ-*

*ную і некранутую ў беларускай літаратуры цаліну горадабудаўніцтва* Т. Хадкевіч.

**ЦАРСКІ — ЦАРСТВЕННЫ — ЦАРЫСЦКІ**

**Царскі. 1.** Які мае адносіны да цара, самадзяржаўны. Сінонім: манархічны. *Дужа там разбіраўся ў тых царскіх каронах Міколка.* М. Лынькоў. **2.** *перан.* Вельмі багаты, раскошны; як у цара. *А вінаграднік, ветрам абласканы, спяліў пад небам царскія плады.* Х. Чэрня.

**Царственны.** *перан. Кніжн.* Велічны, поўны годнасці; незвычайна велічнай і пышнай красы, харастава. *Я прапанаваў ахвяраваць гэты вечар мастацтву, і вы царственна дазволілі мне купіць білеты ў кіно.* Я. Васіленак.

**Царысцкі.** Які мае адносіны да царызму. *Царысцкая палітыка.*

**ЦАРЫЦА — ЦАРЭЎНА**

**Царыца.** Тытул жанчыны-манарха ў Расіі, Балгарыі і Сербіі; жонка цара. Сінонім: гасударыня. *Як сама царыца ў залатой кароне, йдзе яна [жняя] ў вяночку паміж спелых гоней.* Я. Купала.

**Царэўна.** Дачка цара. *Падышла царэўна да рыцара і ўбачыла на яго руцэ свой залаты пярсцёнак.* А. Якімовіч.

**ЦІКАВАЦЬ — ЦІКАВІЦЬ**

**Цікаваць.** Уважліва сачыць за кім-чым-н.; выглядваць, падпільноўваць, падсцерагаць каго-што-н. *Колева маці з натоўпу цікавала за тым, што адбываецца ля стала.* А. Асіпенка.

**Цікавіць.** Выклікаць цікавасць. імкненне даведацца пра каго-што-н. *Заўважыўшы, што Чэрапаў не збіраецца закідваць яго рознымі пытаннямі. ён пачаў выказваць тое, што яго асабліва цікавіла, хвалявала, а часам, напэўна, і мучыла.* А. Кулакоўскі.

**ЦІТЛА — ЦІТР**

**Цітла.** Надрадковы знак старажытнай пісьменнасці над скарочана напісаным словам ці над літарай, якая абазначае лічбу. *Цітлы — надрадковыя знакі ў выглядзе ламанай рыскі, якія ставіліся над скарочанымі словамі або літарамі, што мелі лічбавае значэнне* У. Арлоў.

**Цітр.** Надпіс на кадры ў кінафільме, які перадае словы дзеючых асоб ці тлумачальны тэкст. *Мы трохі спазніліся, на экране ўжо мільгаюць цітры. Білецёрша, падсвечваючы сабе ліхтарыкам, вядзе нас на месца.* І. Навуменка.

**ЦЫГАРА — ЦЫГАРКА — ЦЫГАРЭТА**

**Цыгара.** Туга скручанае ў трубачку тытунёвае лісце для курэння. *Выгладжаны і прылізаны, важна сядзіць ён у сваім кабінеце за багатым сталом, курыць дарагія цыгары.* Я. Колас.

**Цыгарка.** Самаробная папяроса. Сінонім: самакрутка. *Марцін выцягнуў з кішэні вышыты капшук, скруціў цыгарку.* І. Мележ.

**Цыгарэта.** Папяроса без муштука. *У машыне пахла бензінам і цыгарэтным дымам, і Алёшу вельмі захацелася закурыць, хоць наогул курыў ён мала і цыгарэты больш насіў з сабою для таго, каб частаваць каго трэба.* Л. Арабей.

**ЦЭЗУРА — ЦЭНЗУРА**

**Цэзура.** Паўза ўнутры вершаванага радка, абавязковая для пэўнага вершаванага размеру. *Трэцяе адрозненне паэзіі вялікага паэта Багдановіч звязваў з другаснымі сродкамі гарманізацыі вершаванай мовы: з унутранымі рыфмамі, алітэрацыямі, цэзурай і г. д.* А. Лойка.

**Цэнзура.** Прагляд твораў, якія прызначаюцца да друку, да пастаноўкі ў тэатры, або прагляд якой-н. карэспандэнцыі. што ажыццяўляецца дзяржаўнай установай. *Усе газеты і пісьмы, адрасаваныя палітычным вязням у Лукішках, праходзілі строгую пракурорскую цэнзуру.* М. Машара.

**ЦЯРПІМЫ — ЦЯРПЛІВЫ**

**Цярпімы.** Які можна цярпець, зносіць; з якім можна мірыцца.

*Заехаў я ў сваю вёску. Тут радыяцыя сапраўды не надта высокая, можна сказаць, цярпімая.* Б. Сачанка.

**Цярплівы.** Які мае вялікае цярпенне. *Чалавек цярплівы, прызвычаены да розных франтавых нягод, ен мог спаць на марозе, седзячы ў танку, сагнуўшыся ў крук.* І. Мележ.

## Ч

**ЧАПУРНЫ — ЧАПУРЫСТЫ**

**Чапурны.** *Разм.* Прыбраны, прыхарошаны. *Людзі бачаць, не дурныя, цешча-маці! Ходзяць дзеўкі чапурныя — не пазнаць іх.* С. Дзяргай.

**Чапурысты.** *Разм.* Які любіць прыбірацца, чапурыцца. *А Верка Федаскова, рыжанькая, жвавая, яшчэ чапурыстая маладуха, праздзінела тонкім галаском: — А я ўжо гэта лета з гасцямі пабуду.* М. Ракітны.

**ЧАРАМША — ЧАРОМХА / ЧАРЭМШЫНА — ЧАРЭШНЯ**

**Чарамша.** Дзікі часнок. *Чарамша і абляпіха, не забыць нам вашых чар.* М. Хведаровіч.

**Чаромха.** Дрэва ці кустарнік з белымі духмянымі кветкамі і чорнымі даўкімі ягадамі. *А далей віднелася вёска, акаймаваная з аднаго боку зараснікам алешніку ўздоўж ручая, уся ў прысадах, з зялёнымі шапкамі чаромхі, каштанаў ці клёнаў над кожнаю хатай.* «Маладосць».

**Чарэмшына.** Тое, што і чаромха. *Цвілі па чарзе: спачатку чарэмшына, потым бэз, потым язмін, потым шыпшына...* І. Грамовіч.

**Чарэшня.** Садовае дрэва з чырвонымі ці жоўтымі ягадамі. *Далей пачыналіся прыватныя, у адзін паверх, з верандамі і мансардамі, дамы, атуленыя белымі ад квецені садамі. У садах цвілі чарэшні.* В. Карамазаў.

**ЧАРАПКОВЫ —ЧАРАПНЫ**

**Чарапковы.** Які мае адносіны да чарапка — асколка разбітага глінянага ці фарфоравага вырабу. *Чарапковы друз.*

**Чарапны.** Які мае адносіны да чэрапа. *Чарапныя косці.*

**ЧАРАЎНІЦКІ — ЧАРАЎНІЧЫ**

**Чараўніцкі.** Які мае адносіны да дзеянняў чараўніка ці знахара. *Чараўніцкая замова.*

**Чараўнічы. 1.** Звязаны з чараўніцтвам, чарамі. С і н о н і м: чарадзейны. *Гаспадыня паспешна накрыла на стол, на ім, як па ўзмаху чараўнічай палачкі, з'явіліся талеркі з мясам, белым хлебам.* М. Пятніцкі. **2.** *перан.* Які зачароўвае, захапляе, прыносіць асалоду. С і н о н і м: чароўны. *Але той, хто наведаў хоць раз чараўнічыя нашы мясціны, не забудзе ніколі ён нас — край блакітны і нашу гасціннасць.* П. Пруднікаў.

**ЧЫГУНАЧНЫ — ЧЫГУННЫ**

**Чыгуначны.** Які мае адносіны да рэйкавай дарогі — чыгункі. *На шашы не відаць было ніякага руху, у гарадку аднаўлялі ўзарваны чыгуначны мост.* М. Лынькоў. Н я п р а в і л ь н а: *Яны [метрабудаўнікі] прымянілі арыгінальны спосаб абціскання тунеля чыгуначнымі (трэба: чыгуннымі) кольцамі, за якія затым запампоўваўся пад ціскам бетонны раствор.* «Звязда».

**Чыгунны.** Які мае адносіны да чыгуну, яго вытворчасці; зроблены, адліты з чыгуну. *Схіліўшы цяжкую галаву на ўзорыстую спінку чыгуннай лаўкі, Крысціна задрамала.* А. Васілевіч.

**ЧЫНА — ЧЫНАРА**

**Чына.** Травяністая кармавая балотная расліна сямейства бабовых. *Сухое паветра моцна настоена на тонкім водары ружовай смолкі, на мядовым паху чырвонай канюшыны, на мятным халадку лугавой чыны.* Р. Ігнаценка.

**Чынара.** Дрэва сямейства платанаў; усходні платан. *Ах, якая па-*

*года для купання, загару! Ні расы на чынарах, ні туману, ні хмары!* М. Танк.

**ЧЫТАЛЬНІЦКІ — ЧЫТАЛЬНЫ — ЧЫТАЦКІ — ЧЫТАБЕЛЬНЫ — ЧЫТЭЛЬНЫ**

**Чытальніцкі.** Які мае адносіны да чытальніка, дэкламатара. *Ужо ў школьныя гады ў яго ярка праявіліся чытальніцкія здольнасці.*

**Чытальны.** Прызначаны для чытання, заняткаў з кнігамі, часопісамі. *Абабітыя цыратай дзверы чытальнай залы грукалі глуха і мякка.* В. Адамчык.

**Чытацкі.** Які мае адносіны да чытача. *У артыкуле зусім няма канкрэтных фактаў, якія б ілюстравалі думкі аўтара, а гэта значыць, што ён не суадносіцца з практычным вопытам чытацкай аўдыторыі.* Б. Стральцоў.

**Чытабельны.** *Разм.* Тое, што і чытэльны. *Не заўсёды яны [вершы] былі якаснымі, але нейкае пачуццё, нейкая думка, нейкі асаблівы настрой таго часу былі злоўлены, падкрэслены, што і рабіла вершы, як гаворыцца, чытабельнымі.* П. Панчанка.

**Чытэльны.** Які лёгка чытаецца; які можна прачытаць. *У лепшым выпадку [Я. Колас] казаў: «глянь», — падсоўваў чыста перабелены цвёрдым чытэльным почыркам аркушык і адыходзіў убок.* М. Лужаніч.

## Ш

**ША́БАС — ША́БАШ — ШАБА́Ш**

**Ша́бас.** Суботні адпачынак, суботняе свята ў набожных яўрэяў. *Шабас быў якраз, субота,—грэх жа брацца за работу.* К. Крапіва.

**Ша́баш.** У сярэдневяковы павер'ях: начное зборышча ведзьмакоў і ведзьмаў, якія ўчынялі шалёны разгул. *Густая, рослая трава палегла, пераплялася, збыталася,— няйнакш як у ёй спраўлялі свой спрадвечны д'ябальскі шабаш тысячы маладых гуллівых чарцей.* Б. Сачанка. ‖ *перан.* Зверскі ўчынак; варожы разгул. *Астаўся толькі адзін няпоўны дыск кулямёта. Ды і што ты тут зробіш, калі карнікаў поўны лес і яны, відаць, вяртаюцца з чарговага крывавага шабашу, нават жывёлу гоняць з сабой?* Р. Няхай.

**Шаба́ш.** *Разм.* **1.** Заканчэнне работы; перапынак для адпачынку. *Працягла гуў гудок на шабаш.* Х. Шынклер. **2.** *у знач вык.* Скончана, даволі; канец. *Бесхарактарны я, брат Стары,— на тон самабічавання з'ехаў Садовіч,— але пераеду ў другую школу, тады, брат, шабаш.* Я. Колас.

**ШАРОН — ШЭРАНЬ**

**Шарон.** *Абл.* Абледзянелая скарынка на паверхні снегу. Сінонім: шарпак. *Кабыла прытка секла падковамі малады лядок на дарозе, а пад палазамі хрусцеў шарон.* І. Чыгрынаў.

**Шэрань.** **1.** Белыя рыхлыя крышталікі, формай падобныя на сняжынкі, якія нарастаюць пры значным марозе і тумане на галінах дрэў, траве, дроце і г. д. *Надышлі марозы, рэчкі закавалі, белыя бярозы шэранем убралі.* Я. Колас. **2.** *перан.* Сівізна. *Змізарнеў [Гаруноў], твар выцягнуўся, на скронях прабілася шэрань.* І. Дуброўскі. **3.** Змрок, цемра. *Пасярод двара, насупраць студні, над якой у перадранішняй шэрані чарнее высокі жураўель, стаяць калёсы.* І. Навуменка.

**ШАТКАВАЦЬ — ШАТРАВАЦЬ**

**Шаткаваць,** *што.* Рэзаць доўгімі вузкімі палоскамі (звычайна капусту). *Хтосьці шаткуе, гняце капусту таўкачом у бочцы, пасыпае белае шаткаванне жураўінамі, і яны блішчаць на ім, як на снезе.* М. Капыловіч.

**Шатраваць,** *што.* Ачышчаць зерне ад скуркі, абдзіраць перад тым, як малоць на муку ці пускаць на крупы. *Хлопец не бачыў дагэтуль,*

*не чуў. каб нехта шатраваў на каравай. звычайна людзі пытлююць.* Я Брыль

**ШАФЕР — ШАФЁР**

**Шафер.** Удзельнік вясельнага абраду, які выконвае даручэнні па распарадку вяселля і ў час вянчання трымае вянец над галавой у жаніха ці нявесты. *Вечарам Венька зноў дастаў з чамаданчыка пляшку. бляшанку трасковай кансервы, хлеб. яна паставіла на стол чыгунок бульбы, і яны спраўлялі вяселле. Не было толькі шафераў і шаферак, сватоў, сведак, гасцей.* Я. Пархута.

**Шафёр.** Вадзіцель аўтамашыны.

**ШВЕЙЦАР — ШВЕЙЦАРАЦ**

**Швейцар.** Вартаўнік ля знадворных дзвярэй у пад'ездах устаноў, рэстаранаў, гасцініц, жылых памяшканняў. *Я з абурэннем патрабую прапусціць матку, але швейцар і слухаць не хоча.* П. Мядзёлка.

**Швейцарац.** Жыхар Швейцарыі.

**ШЛЯК — ШЛЯХ**

**Шляк.** Палоска, абшыўка па краі тканіны іншага колеру ці ўзору. *Падмятаючы доўгаю бурачковаю ў чорных шляках спадніцаю высокі парог, з сеняў выкацілася невысокая з востранькім тварком старая кабета.* В. Адамчык.

**Шлях.** Шырокая дарога, бальшак, гасцінец. *За бярэзнікам быў лясок і ішоў шлях у горад і на грэблю.* М. Лупсякоў.

**ШТАБЕЛЬ — ШТАПЕЛЬ**

**Штабель.** Роўна складзеныя ў адзін рад дошкі, бярвенне, будаўнічыя матэрыялы і г. д. *У адным месцы ўзвышаліся клеткі цэглы, у другім — штабелі дошак.* А. Карпюк.

**Штапель.** Тканіна са штучнага валакна. *Дзяўчынцы вельмі падабалася новая сукенка са штапелю, які быў тады ў вялікай модзе.* «ЛіМ».

**ШЫФЕР— ШЫФР**

**Шыфер.** Дахавы матэрыял у выглядзе лістоў, плітак. *Цяпер што, цяпер іншая справа: пад шыфер ды гонту ўбраліся, а ці даўно яшчэ на стрэхах мох зелянеў!* В. Быкаў.

**Шыфр. 1.** Сістэма ўмоўных знакаў для сакрэтнага пісьма. *Кастусь быў старшым радыстам: усе сакрэтныя шыфры знаходзіліся ў яго.* М. Ваданосаў. **2.** Умоўнае абазначэнне на кнігах, якое выкарыстоўваецца пры расстаноўцы. захаванні і ўказвае на іх месцазнаходжанне. *Бібліятэкар глядзіць на шыфры кніг і ставіць іх на розныя стэлажы.* «ЛіМ».

## Э

**ЭБАНІТАВЫ — ЭБЕНАВЫ**

**Эбанітавы.** Які мае адносіны да эбаніту — цвёрдага матэрыялу з вулканізаваных каўчукавых сумесей, які выкарыстоўваецца для ізаляцыі ў электратэхніцы і для іншых мэт. *Шылкін узяў аловак з эбанітавай вазачкі, стукаў ім па пальцах, бы пералічваў іх.* А. Савіцкі.

**Эбенавы.** Які мае адносіны да эбена — чорнага дрэва; зроблены з гэтага дрэва. *Алекса, аднойчы прачнуўшыся раней, угледзеў пад яе худзенькім бокам свой нож.. Ён пацягнуў за цёплую, чорную, з эбенавага дрэва ручку — Апак ускочыла, няўцямна азіраючыся спалоханымі вачанятамі.* В. Іпатава.

**ЭКСКАВАТАР — ЭСКАЛАТАР**

**Экскаватар.** Самаходная землярыйная машына для вымання, перамяшчэння на іншае месца і пагрузкі на транспарт грунту, камення і г. д. *Скончыўшы пасля дзесяцігодкі курсы, ён цяпер працаваў механікам на экскаватары.* У. Краўчанка.

**Эскалатар.** Рухомая лесвіца для пад'ёму і спуску людзей. *На эскалатары, шырокай цудоўнай лесвіцы, якая рухаецца ўверх і ўніз, мы спускаемся ў падзямелле.* «ЛіМ».

**ЭКСКУРС — ЭКСКУРСІЯ**

**Экскурс.** Адхіленне, адступленне ад галоўнай тэмы з мэтай падра-

бязней высветліць пабочнае пытанне. *Разважанні падмацоўваюцца экскурсамі ў мінулае, параўнаннямі, аргументамі і пераходзяць у дакладна сфармуляваныя высновы* Б. Стральцоў.

**Экскурсія.** 1. Калектыўнае наведванне чаго-н., паездка, прагулка куды-н. з навуковай, адукацыйнай ці іншай мэтай. *Школьнікі пабывалі на экскурсіі ў весцы Люсіна, дзе настаўнічаў Якуб Колас.* «Настаўніцкая газета». 2. Група ўдзельнікаў такога наведвання, паездкі, прагулкі. *І вось аднойчы, ужо сярод лета, на Манін агарод прыйшла цэлая экскурсія: старшыня калгаса, брыгадзіры і Іван Навумавіч.* А. Якімовіч.

**ЭСКАДРА — ЭСКАДРЫЛЛЯ**

**Эскадра.** Буйное злучэнне ваенных караблёў ці самалётаў. *Цёмнай лістападаўскай ноччу эскадра мінаносцаў пакінула рэйд і пачала ў баявым парадку рухацца на подступы да Петраграда.* М. Хведаровіч.

**Эскадрылля.** Падраздзяленне ваеннай авіяцыі з некалькіх звёнаў самалетаў. *З наступленнем цемені зверху чуваць гул матораў. Нашы эскадрыллі ляцяць на заданне.* І. Навуменка.

**ЭСКАДРОН — ЭСПАДРОН**

**Эскадрон.** Падраздзяленне кавалерыйскага палка, якое адпавядае пяхотнай роце. *Конны эскадрон забяспечыў магчымасць хуткага акружэння працўніка.* М. Лынькоў.

**Эспадрон.** Вучэбная зброя, якой карыстаюцца ў фехтаванні; спартыўная барацьба з гэтай зброяй. *У фехтаванні на эспадронах маладыя майстры спорту атрымалі пераканаўчую перамогу* «Звязда»

# Ю

**ЮБІЛЕЙ — ЮБІЛЯР**

**Юбілей.** Гадавіна дзейнасці каго-н. ці існавання чаго-н., якая вылічваецца звычайна дзесяцігоддзямі, стагоддзямі і ўрачыста адзначаецца грамадскасцю. *Напярэдадні юбілею маёй творчасці мне хацелася ўспомніць свой шлях і ўсё сваё жыццё.* Я. Купала.

**Юбіляр.** Той, чый юбілей адзначаецца, святкуецца. *Першы юбілей... Яго прыход не сумны — як для самога юбіляра, так і для сяброў юбіляра, усіх блізкіх яму людзей, родзічаў, шматлікіх чытачоў.* А. Кулакоўскі.

**ЮНАЦКАСЦЬ — ЮНАЦТВА**

**Юнацкасць.** Сукупнасць якасцей, характэрных для юнака; маладосць. *Юнацкасць душы.*

**Юнацтва.** 1. Перыяд жыцця пасля малалецтва да сталасці; ранняя маладосць. *Гады юнацтва. Школьнае юнацтва.* 2. *зб.* юнакі; маладыя людзі абодвух полаў. *Юнацтва планеты ўсвядоміла, што сёння ствараецца будучыня і для яго* «Маладосць».

**ЮНАЦКІ / ЮНАЧЫ — ЮННАТАЎСКІ / ЮННАЦКІ — ЮНЫ**

**Юнацкі.** Які мае адносіны да юнака, юнацтва, уласцівы ім. *А працы многа, дзе ні глянь, прастор юнацкаму запалу.* М. Чарот.

**Юначы.** *Разм.* Тое, што і юнацкі. *Дай жа, сынку, наглядзецца на юначы воблік твой.* П. Прыходзька.

**Юннатаўскі.** Які мае адносіны да юнната — юнага натураліста, удзельніка гуртка па вывучэнню прыроды. *Юннатаўскі гурток.*

**Юннацкі.** *Разм* Тое, што і юннатаўскі. *Наш юннацкі дзённік таксама папоўніўся.* А. Якімовіч.

**Юны.** Вельмі малады, у маладых гадах (пра чалавека); малалетні. *Юныя сябры прыроды.*

# Я

## ЯБЛЫНЕВЫ — ЯБЛЫЧНЫ

**Яблыневы.** Які мае адносіны да яблыні, характэрны для яе. *Гэты водар настолькі моцны і жаданы, што, здаецца, прыносіць з сабою шолахі асенняга лісця ў яблыневым садзе, пад якія ў бульбоўнік падаюць важкія, налітыя антонаўкі.* В. Карамазаў.

**Яблычны.** Які мае адносіны да яблыка, характэрны для яго. *Аднак гэта была не проста вада і не расол, а нешта зусім іншае. Нібы ў ваду налілі яблычнага соку: кіславата-саладкаватая, з пахам свежага яблыка.* У. Караткевіч.

## ЯВАЧНЫ — ЯЎНЫ

**Явачны.** Які мае адносіны да канспіратыўных сустрэч — явак. *Праз гадзіну, а можа, і больш, па ціхай, парэзанай калдобінамі вуліцы яна падышла да адной з явачных кватэр.* І. Мележ.

**Яўны. 1.** Які не скрываюць, не тайны; адкрыты. *Ідзе зацятая, яўная і скрытая барацьба палярна супрацьлеглых сіл, барацьба, у якой немагчымы ні часовыя кампрамісы, ні замірэнне.* Д. Гальмакоў. **2.** Зусім відавочны, ясны для ўсіх, несумненны. *Нарэшце, усе ўпэўніліся ў тым, што гэта — яўная выдумка.* «ЛіМ».

## ЯГАДЗІЧНЫ — ЯГАДНІКАВЫ — ЯГАДНЫ

**Ягадзічны.** Які мае адносіны да ягадзіцы, сядалішча. *Ягадзічныя мышцы.*

**Ягаднікавы.** Які з'яўляецца ягаднікам — ягаднымі кустамі, ягаднымі раслінамі. *Ягаднікавы куст.*

**Ягадны.** Які мае адносіны да ягады; багаты на ягады; прыгатаваны з ягад. *І чым старэй ён станавіўся, тым мацней цягнула дамоў у росныя лугі, духмяныя ягадныя гусцяры, вільготныя восеньскія бары з дурманным пахам грыбоў і апалай лістоты.* А. Жалязоўскі.

## ЯДКІ — ЯДОМЫ — ЯДУЧЫ

**Ядкі.** *Разм* Які са смакам есца, ахвотна з'ядаецца, смачны, пажыўны. *Па краях сена абмылася дажджом, белаватае, а ўсярэдзіне зяленекае, пахучае, як чай, адным словам — ядкое, як у іх кажуць.* У. Рубанаў.

**Ядомы.** Прыдатны для спажывання, для скарыстання ў ежу. *Ядомыя грыбы. Ядомыя ягады.*

**Ядучы.** *Разм* Ядавіты, едкі. — *Ты не глядзі, што луг руды, ен ядучы. Бачыш, як параз'ядаў мае пальцы,— паказвае бабка ружовыя ранкі на пальцах.* К. Каліна.

## ЯЛАВЫ — ЯЛОВЫ

**Ялавы. 1.** Бясплодны, неаплодненны (пра самак свойскай жывелы). *Ялавая карова.* **2.** Зроблены са скуры каровы, якой больш за паўтара года. *Зміцрок кіўнуў галавой і пайшоў у канец сяла, важка, нібы прыціскаў нешта на дарозе, ступаючы вялікімі, у цяжкіх ялавых ботах нагамі.* А. Кудравец.

**Яловы.** Які мае адносіны да елкі, яліны. *Ладуцька ляжаў на разасланых на снезе яловых лапках побач са сваім першым нумарам Мясаедавым, спрытным белабрысым карантышом, і слухаў яго нетаропкі расказ.* У. Дамашэвіч.

## ЯРЫНА — ЯРЫЦА

**Ярына.** Аднагадовая сельскагаспадарчая культура, якая высяваецца і прарастае вясной і дае ўраджай восенню таго ж года. *А вакол прасціралася, як мора, поле. Аднаго году шумела каля нас жыта, другога — ярына, а на трэці прыпадаў папар.* М. Лынькоў.

**Ярыца.** Яравое жыта. *Відаць пад ярыцаю клін, зарэчны луг і цёмнае прылессе.* З. Астапенка.

## ЯСАК — ЯСАКАР

**Ясак.** Падатак у Рускай дзяржаве, які збіралі на карысць казны з народаў Паволжа і Сібіры. *Ясак пушнінай.*

**Ясакар.** Дрэва з цёмна-шэрай карой, разнавіднасць таполі; чор-

ная таполя. *Ля Стасевага сельбішча стаіць напалову ўсохлы ясакар з бусліным гняздом-кучомкай.* А. Асіпенка.

**ЯШЧАР — ЯШЧАРКА — ЯШЧУР**

**Яшчар. 1.** Млекакормячае з прадаўгаватым тулавам, пакрытым рагавой лускай, з невялікай галавой, доўгім хвастом і кароткімі лапамі з моцнымі кіпцюрамі; пашыраны ў Паўднёвай Афрыцы і Паўднёва-Усходняй Азіі. *Доўгі, з аблушчанай карою на сухаватых лапах, як нейкі страшны яшчар, выварацень перагарадзіў Міцю дарогу.* В. Адамчык. **2.** Устарэлая назва некаторых вымерлых паўзуноў і земнаводных. *Увесь жывёльны свет паходзіць ад старажытных яшчараў, якія ў далёкія ад нас гістарычныя эпохі былі адзінымі жывымі істотамі на зямлі.* «Звязда».

**Яшчарка.** Невялікі паўзун з доўгім хвастом і прадаўгаватым целам, пакрытым дробнай рагавой лускай. *Яшчаркі мяняюць летні колер — жоўтымі становяцца, як восень.* М. Калачынскі.

**Яшчур.** Вострая заразная хвароба буйной рагатай жывёлы і іншых парнакапытных. *Каранцін устанаўліваюць пры сібірскай язве, сапе, яшчуры, шаленстве, чуме і інш.* БелЭн.

# АМОГРАФЫ

# АМОГРАФЫ

Гэта словы, якія пішуцца аднолькава, але ў залежнасці ад націску маюць зусім розны сэнс. Класічны прыклад: мука́ — му́ка.

Амографы не звязаны прыналежнасцю да адной часціны мовы, адзіночны лік можа спалучацца з множным і г. д. (*зва́ны* — дзеепрыметнік адзіночнага ліку і *званы́* — назоўнік множнага ліку). Але найчасцей яны ўсё ж супадаюць па асноўных граматычных уласцівасцях: назоўнік — з назоўнікам, прыметнік — з прыметнікам, дзеяслоў — з дзеясловам.

Амографы не зблытаеш, калі яны пазначаны націскам. Але калі яго няма, адрозніць адно ад другога дапаможа толькі кантэкст, у якім ужыта «падазронае» слова.

Адна ўмова, каб два словы зваліся амографамі, павінна захоўвацца няўхільна: як і амонімам, ім трэба быць парай. Паасобку яны губляюць сваю амаграфічную ўласцівасць і робяцца звычайнымі словамі.

## А

**АБКА́ПАЦЬ** /ка́пацы/ — **АБКАПА́ЦЬ** /капа́цы/

**Абка́пацы.** Абкапаць кроплямі вадкасці што-небудзь. *Ён закапваў абрэзаны палец ёдам і незнарок умудрыўся абка́пацы крысо пінжака.*

**Абкапа́ць.** Капа́ючы, абкінуць, абгарнуць што-небудзь чым-небудзь. Звычайна зямлёю і рыдлёўкай. *Яблыню гаспадар зажадаў абкапа́ць увосень, а не ўвесну.*

**АБРА́ЗНЫ** /абра́з/ — **АБРАЗНЫ́** /абраза́ць/

**Абра́зны.** Ад слова «абраз», або «ікона». *Маці заўсёды ўпрыгожвала абра́зны куток у хаце.*

**Абразны́.** Такі прадмет, у якім абрэзаны краі, або прызначаны для абразання чаго-небудзь. *Сталярскі абразны́ станок робіць выдатныя абразны́я дошкі.*

**АДГУ́КАЦЬ** /гукацы/ — **АДГУКА́ЦЬ** /гука́цы/

**Адгу́кацы.** *(разм.)* Дзеяслоў, які паказвае, што свіння гатова быць пароснай. *Не паспела адгу́кацы — на табе, ужо свінаматка.*

**Адгука́ць.** Скончыць гукаць, клікаць. *Адгука́ць бы лета і вярнуць назад.*

**А́ТЛАС** —**АТЛА́С**

**А́тлас.** Зборнік наглядных дапаможнікаў /геаграфічных, гістарычных карт, малюнкаў, табліц, схем, чарцяжоў/. *Яго заўжды прыцягваў геаграфічны а́тлас: ён разглядаў краіны свету, гарады і, здавалася, сам пабываў там.*

**Атла́с.** Прыгожая тканіна з гладкім, бліскучым правым бокам. *Сукенка яе была на заглядзенне — вішнёвы атла́с.*

## Б

**БА́БКІ** — **БАБКІ́**

**Ба́бкі. 1.** Старыя жанчыны, бабулі. *Ба́бкі паселі на лаўцы ля дома.* **2.** У розных значэннях звычайна неадушаўлёныя прадметы: кавадла, страва, печыва, грыбы, снапы. *Узяўшы кавалак бульбяной ба́бкі з печы, яна пайшла ў грыбы: у лесе траплялся найбольш ба́бкі.*

**Бабкі́.** Плады лаўровага дрэва. *Лаўровыя бабкі́ добра ішлі на алей, які не горшы быў за аліўкавы.*

**БА́КАВЫ** /бак/ — **БАКАВЫ́** /бок/

**Ба́кавы.** Які мае адносіны да бака, а таксама правы вясляр па ходу судна. *Вёслы ба́кавага боку былі ўжо ў руках грабцоў.*

**Бакавы́.** Які размешчаны або дзейнічае збоку. *Бакавы́ пакой быў злева. Бакавы́м позіркам ён заўважыў яшчэ аднаго чалавека.*

**БА́РАК** — **БАРА́К**

**Ба́рак.** Ворчык. Прыстасаванне для прыпрэжкі каня ў параконным возе ці плузе. *Коні нацягнулі ба́рак, і плуг пайшоў араць.*

**Бара́к.** Збудаванне для часовага жылля. *Пасля вайны многія людзі ў гарадах жылі ў няўтульных, халодных бара́ках.*

**БА́ЯЦЦА** /баецца/ — **БАЯ́ЦЦА** /боязь/

**Ба́яцца.** Нешта казачнае, дзіўнае апавядаецца, расказваецца. *Доўга яшчэ будзе ба́яцца казка, пакуль дзеці заснуць.*

**Бая́цца.** Нечага страшыцца, палохацца, нясмела паводзіць сябе. *Ваўкоў бая́цца — у лес не хадзіць.* Прымаўка.

## В

**ВА́ГА — ВАГА́**

**Ва́га.** Тоўстая жэрдка, бервяно для падважвання цяжкіх прадметаў. *Шкада было сасонкі, але што зробіш трэба была ва́га, каб кола воза з сенам выбавіць з ямы ў гразі*

**Вага́.** Цяжар, маса. Уплыў. Сістэма мер для вызначэння цяжару. Прылада для ўзважвання. *Жывая вага́ каровы — гэта табе не забойная. Паставіш яе на вагу і думаеш: а колькі возьмуць скідкі?*

**ВА́ЛКІ** /валяць/ — **ВАЛКІ́** /валок/

**Ва́лкі.** Які добра ўвальваецца, збіваецца. *Ва́лкі матэрыял — шэрсць выкарыстоўваюць для біцця валёнкаў.*

**Валкі́.** Збітыя, падгрэбеныя пракосы сена, саломы ў доўгі рад. *Падсушанае на сонцы сена, якое зранку ў пракосах было сырое, апоўдні жанчыны зграбалі ў валкі́.*

**ВА́РАНЫ** /варыць/ — **ВАРАНЫ́** /воран/

**Ва́раны.** У кіпятку прыгатаваны, звараны для яды. *Хто што любіць; адзін — ва́раны гарох, другі — пражаны.*

**Вараны́.** Звычайна конь чорнай масці. *У каго быў вараны́ конь, той заўсёды ім ганарыўся.*

**ВЕКАВЫ́** /век/ — **ВЕ́КАВЫ** /века/

**Векавы́.** Які жыве вельмі доўга, стары, шматгадовы. *Векавы́ бор шумеў над галавой.*

**Ве́кавы.** Які мае адносіны да накрыўкі, вечка. *Апошні ве́кавы цвік быў забіты ў труну.*

**ВІ́ДНЫ** /від/ — **ВІДНЫ́** /відаць/

**Ві́дны.** Прыкметны, значны, важны, выдатны, вядомы, а таксама — рослы, статны, самавіты. *Сярод усіх вучоных ён выдзяляўся як асабліва ві́дны дзеяч.*

**Відны́.** Светлы, бачны, даступны зроку, ясны. *Дзень быў відны́ з самага ранку: ні воблачка на небе, ні смугі ўдалечыні.*

**ВІ́ННЫ** /віно/ — **ВІННЫ́** /вінаваты/

**Ві́нны.** Што мае стасункі з віном, спіртным напоем. *Ві́нны завод стаяў на ўскрайку горада. Адтуль даносіліся вінныя пахі.*

**Вінны́.** Які правініўся, учыніў нешта, зрабіў благое; які мае доўг. *У гэтым здарэнні несумненна вінны́ ён. Ён мне вінны́ пяць тысяч.*

**ВЫ́СЫПАЦЦА** /сыпаць/ — **ВЫСЫПА́ЦЦА** /спаць/

**Вы́сыпацца.** Пра сыпкае, дробнае, тое, што аднекуль з'явілася на паверхні. *Ен не мог зразумець: як мог вы́сыпацца цукар з мяшка... Здаецца, няма нідзе дзіркі...*

**Высыпа́цца.** Калі паўнацэнны сон, і чалавек добра адпачыў. *Яму не заўсёды ўдавалася высыпа́цца — часам позна прыходзіў дамоў, рана ўставаў на працу.*

## Г

**ГА́ДЗІНА — ГАДЗІ́НА**

**Га́дзіна** (*разм.*). **1.** Ядавітая змяя шэрага колеру з чорнай зігзагападобнай паласой уздоўж спіны. Тое, што і гадзюка. *Упоперак дарогі ў лесе ляжала забітая га́дзіна.* **2.** Пра вельмі дрэннага чалавека. *Так і трэба яму, га́дзіне, — наскочыў на сваё.*

**Гадзі́на. 1.** Адзінка вымярэння часу, роўная 60 хвілінам, або 3600 секундам. *Пайшла другая гадзі́на, як яго ўжо няма.* **2.** Час, які адлічваюць ад поўдня ці ночы, прамежак часу, які адводзіцца на ўрок, лекцыю, пара ў жыцці чалавека. *Ён браў нагрузку ў школе па трыццаць пяць гадзі́н у тыдзень: усе амаль да абеду, але некалькі гадзі́н былі і пасля абеду, у другую змену.*

**ГАЛІ́НА — ГАЛІНА́**

**Галі́на.** Бакавы адростак дрэва, сук з веццем. *Зялёная галі́на бярозы хвастанула яму па твары.*

**Галіна́.** Асобная вобласць ведаў, навукі, вытворчасці, пэўная сфера дзейнасці. *Ён быў спецыяліст у галіне́ матэматыкі.*

**ГА́ЛІЦЦА — ГАЛІ́ЦЦА**

**Га́ліцца.** *(разм.)* Квапіцца, мецъ жаданне завалодаць чым-небудзь. *Га́ліцца на чужое — заўсёды была дрэнная прыкмета ў народзе.*

**Галі́цца.** Тое самае, што брыцца. *Мужчынскі ранішні клопат — штодзень галіцца.*

**ГА́НЕЦ — ГАНЕ́Ц**

**Га́нец.** Жыхар афрыканскай краіны Гана. *Сярод эмігрантаў быў і адзін га́нец.*

**Гане́ц.** Пасыльны. Той, каго паслалі з тэрміновым данясеннем. *Гане́ц прыбыў у часць своечасова.*

**ГРАМА́ДА — ГРАМАДА́**

**Грама́да.** Нешта вельмі вялікае, масіўнае, мноства чаго-небудзь, сабранага ў адным месцы. *Цяпер што ні мікраразён у горадзе — то грама́да дамоў.*

**Грамада́.** Група людзей, натоўп, гурт. *Грамадо́й заўсёды лягчэй выконваць цяжкую работу.*

**ГУ́БА — ГУБА́**

**Гу́ба.** Тоўсты, падобны на капыт грыб, які расце на дрэве, інакш чага. *Гу́ба часцей бывае на бярозе.*

**Губа́.** Скурна-мускульная рухомая складка, якая ўтварае край рота. *Ён сціснуў зубамі ніжнюю губу́ — задумаўся .*

**ГУ́РБА — ГУРБА́**

**Гу́рба.** Куча снегу, намеценая ветрам. *Высокая гу́рба, з яе часта мы з'язджалі на лыжах.*

**Гурба́.** Група, гурт. *Гурба́ дзяцей ішла са школы.*

## Д

**ДА́РМА — ДАРМА́**

**Да́рма.** Бясплатна, за нішто. Дробязь,не мае значэння. *За да́рма і каза не скача.* Прымаўка.

**Дарма́.** Бескарысна, дарэмна, марна, беспрычынна. — *У яго ні адна хвіліна не прападае дарма́.* — *Дарма́ ты так думаеш...*

**ДРА́БЫ — ДРАБЫ́**

**Дра́бы.** Адны рэбры. Вельмі худы, няўкормлены. *У яго карова пасля зімы — адны дра́бы.*

**Драбы́.** Драбінкі, кавалачкі чаго-небудзь. *Цукар рафінад ён раскалваў на драбы́.*

## Ж

**ЖА́ХНУЦЦА** /жа́хнуць/ — **ЖАХНУ́ЦЦА** /жах/

**Жа́хнуцца.** *(разм.)* Ударыцца з усёй сілы, вельмі моцна. *Ён жа́хнуўся так, што ў бедалагі выскачыў сіні пісяг на скуры.*

**Жахну́цца.** Моцна спалохацца, выклікаць жах. *Відовішча было такое, што можна было жахну́цца.*

**ЖЫ́ЛЫ — ЖЫЛЫ́**

**Жы́лы.** Крывяносныя сасуды. Трэшчына ў зямной кары. Асобны провад кабелю. *Жы́лы ў яго напяліся аж да сінізны.*

**Жылы́.** Адведзены пад жыллё, там, дзе жывуць. Уласцівы жыллю. *Жылы́я дамы стаялі густа, адзін за адным.*

## З

**ЗГА́ДЗІЦЦА — ЗГАДЗІ́ЦЦА**

**Зга́дзіцца.** *(разм.)* Выклікаць агіду, брыдкасць. *Гэта ж да таго можа зга́дзіцца чалавек, што не хочацца бачыць яго.*

**Згадзі́цца.** Даць згоду, пацвердзіць, прызнаць правільным. *Нельга было з ім не згадзі́цца: ён казаў праўду.*

**ЗАГА́ДЗІЦЬ — ЗАГАДЗІ́ЦЬ**

**Зага́дзіць.** Забрудзіць нечыстотамі, запэцкаць. *Рабіў рамонт так, што зага́дзіў усю кватэру.*

**Загадзі́ць.** Задобрыць чым-небудзь, выклікаць прыхільнасць. *Яго спачатку трэба было загадзі́ць, каб ён зрабіў табе нешта добрае.*

**ЗАПЯ́КАЦЬ — ЗАПЯКА́ЦЬ**

**Запя́кацць** *(разм.)*. Саслаць, пасадзіць у турму, пазбавіцца. *На Калыму ў трыццатыя маглі запя́кацць ледзь не кожнага.*

**Запяка́ць.** Спячы да ўтварэння ружовай скарынкі Засохнуць, перасохнуць. *Яна любіла запяка́ць мяса ў фользе.*

**ЗА́РАЗ — ЗАРА́З**

**За́раз.** Цяпер, у гэты момант, час, неадкладна. *За́раз ён толькі і думаў, каб усё добра было з ёю.*

**Зара́з.** Адначасова, за адзін раз, адразу. *Ён мог з'есці зара́з ледзь не паўкабана — такі абжора быў.*

**ЗВА́НЫ — ЗВАНЫ́**

**Зва́ны.** Запрошаны, які атрымаў запрашэнне. *Зва́ны госць заўсёды жаданы.*

**Званы́.** Царкоўныя, на званіцы. Звоняць у час рэлігійных свят, царкоўных служэнняў. *Званы́ зазванілі царкоўныя — у душы нешта торгнула.*

## І

**І́КАЦЬ — ІКА́ЦЬ**

**І́кацць.** Гукі, якія падае асёл. *Асёл і́каў, упіраўся, не хацеў ісці.*

**Іка́ць.** Міжвольна ўтвараць адрывістыя гукі, якія выклікаюцца сутаргавым скарачэннем дыяфрагмы. *Пад'еўшы, ён тут жа пачынаў іка́ць.*

**І́КРА — ІКРА́**

**І́кра.** Галёнка, лытка ў чалавека. *Ікру схапіла сутарга — яна стала цвёрдай.*

**Ікра́.** Зернепадобныя слізістыя яечкі, якія адкладваюцца рыбамі, земнаводнымі, малюскамі. *Ішоў нераст — ікра́ рыб была відаць на надводных травах.*

## К

**КА́ПА — КАПА́**

**Ка́па.** Узорыстае пікейнае пакрывала на ложак. *Яна дастала з куфра ка́пу і накрыла ёю свой ложак.*

**Капа́.** Невялікі стог. Куча сена, саломы, складзеная конусам. *Капа́ сена стаяла на лузе.*

**КАРА́ЛІ — КАРАЛІ́**

**Кара́лі.** Упрыгожанне з каралавых або іншых каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю. Пацеркі. *Серабрыстыя кара́лі ёй вельмі былі да твару.*

**Каралі́.** Ад слова «кароль». Вышэйшы манархічны тытул. *«Усё могуць каралі...»*

**КА́СА — КАСА́**

**Ка́са.** Аддзяленне ва ўстановах, на прадпрыемствах для прыёму плацяжоў і выдачы грошай. *У ка́се яму выдалі ўсю зарплату за месяц.*

**Каса́. 1.** Доўгія заплеценыя валасы. *Русая каса́ спадала на плечы.* **2.** Прылада, якая служыць для зразання травы, збожжа і інш. *Касі, каса́, пакуль раса.* Прымаўка.

**КІ́ПЕЦЬ — КІПЕ́ЦЬ**

**Кі́пецць.** *(разм.)* Пазногаць. Ногаць. Кіпцюр. *У яе зламаўся кі́пецць на указальным пальцы.*

**Кіпе́ць.** Бурліць, клекатаць ад пары. Пра ваду, малако... *Суп у каструлі пачаў кіпе́ць.*

**КУ́ПАЛЬНЫ — КУПА́ЛЬНЫ**

**Ку́пальны.** Які мае адносіны да ку́пала. *Ку́пальны абрыс царквы яшчэ здалёк цешыў вока.*

**Купа́льны.** Што мае адносіны да купання. *Купа́льны сезон толькі пачынаўся.*

## Л

**ЛА́СІЦА — ЛАСІ́ЦА**

**Ла́сіца.** Тое, што і ласка, невялікая драпежная жывёліна сямейства куніцавых з гібкім целам. *Ла́сіца, як маланка, прамільгнула і схавалася ў хляве.*

**Ласíца.** Тое, што і ласіха, самка лася *Каля куста стаялі ласíца і двое ласянят.*

**ЛЮ́БЫ — ЛЮБЫ́**

**Лю́бы.** Блізкі, дарагі, мілы сэрцу, любімы *Мне лю́бы край мой дарагі.*

**Любы́.** Кожны, усякі, які хочаш. *Гэта зрабіў бы любы́.*

**ЛЮ́ДСКІ — ЛЮДСКÍ**

**Лю́дскі.** Чалавечны, прыстойны, добры, харошы. *Гэта быў лю́дскі чалавек: нікому нічога не зрабіў дрэннага.*

**Людскí.** Тое, што належыць людзям, які ствараецца людзьмі, чалавекам. *Людскí паток — бежанцы — нарастаў і нарастаў.*

**ЛЮСТРА́НЫ — ЛЮСТРАНЫ́**

**Люстра́ны.** Які мае адносіны да люстра, уласцівы люстру. *Люстра́ная вытворчасць давала добры прыбытак.*

**Люстраны́.** З бліскучай, гладкай паверхняй. *У возеры жылі і люстраны́я карпы.*

**ЛА́ЯЛЬНЫ — ЛАЯ́ЛЬНЫ**

**Ла́яльны** *(разм.).* Ад слова «лаяць». Сварыцца, брахаць. *Здалёк чуўся ла́яльны набор слоў.*

**Лая́льны.** Карэктна, паблажліва адносіцца да каго-небудзь. *Ён быў лая́льны да ўсіх — лепшы, горшы, гэтыя паняцці не прызнаваў.*

## М

**МА́РА — МАРА́**

**Ма́ра** *(разм.).* Уяўленне, фантазія, жаданне, імкненне. Нерэальнае, неіснуючае. *У кожнага чалавека ёсць запаветная ма́ра.*

**Мара́.** Прывід, здань, насланнё. *Быццам мара́, выскачыў з лесу воўк.*

**МУ́ЗЫКА — МУЗЫ́КА**

**Му́зыка.** Галіна мастацтва, якая адлюстроўвае рэчаіснасць у гукавых мастацкіх вобразах, выкананне твораў на інструментах. *Му́зыка захоплівала, несла нібы на крылах.*

**Музы́ка.** Музыкант Той, хто іграе на якім-небудзь музычным інструменце. *Музы́ка ён быў вельмі ўдалы, іграў на скрыпцы выдатна.*

**МУ́КА — МУКА́**

**Му́ка.** Фізічная або маральная пакута, здзек, катаванне. *Якая гэта му́ка была — жыць пад фашысцкай акупацыяй .*

**Мука́.** Прадукт размолу збожжа, з якога выпякаюць розныя хлебабулачныя вырабы. *На торт ідзе мука́ вышэйшага гатунку.*

## Н

**НАТЫ́КАЦЬ** /тыкаць/ — **НАТЫКА́ЦЬ** /ткаць/

**Наты́каць.** Уваткнуць, расставіць, накалоць. *Яна наты́кала вішні іголкай і паставіла варыць варэнне.*

**Натыка́ць.** *Натыка́ць столькі палатна за ноч магла толькі яна.*

**НУ́ДЗІЦЬ — НУДЗÍЦЬ**

**Ну́дзіць.** Ванітаваць; адчуваць агіду да каго-небудзь, чаго-небудзь. *Яго пачынала ну́дзіць, як толькі самалёт падняўся ўгору.*

**Нудзíць.** Пачуццё нуды, скрухі, самоты, тугі. *Жыццё яго так круціла ў апошні час, што ў душы пачынала нудзíць.*

## П

**ПА́ДАЦЬ** /упасці/ — **ПАДА́ЦЬ** /даць/

**Па́даць.** Валіцца на зямлю, трацячы раўнавагу, апору; ліцца, сцякаць зверху і г.д. *Па́даць зверху ўніз — жудасная доля. Снег па́даў на зямлю лёгкімі пушынкамі.*

**Пада́ць.** Аказваць паслугу, падносячы, даць, прынесці, паставіць, даставіць, паказаць, вывесці... *Яе роля была незайздросная: пада́ць на стол ежу і забраць аб'едкі.*

**ПАДСА́ЧЫЦЬ** /сачок/ — **ПАДСАЧЫ́ЦЬ** /сачыць/

**Падса́чыць.** Сачком выхапіць рыбу з вады. *Падса́чыць карася ў час яго нерасту ля берага — лёгкая справа.*

**Падсачы́ць. 1.** Тайком убачыць. *Ён падсачы́ў, калі яна выйшла з дому* **2.** Зрабіць надрэз на дрэве для атрымання соку. *Бярозу ў красавіку кожны можа падсачы́ць.*

**ПА́ЛІВА** /паліць/ — **ПАЛІ́ВА** /ліць/

**Па́ліва.** Гаручае рэчыва, якое пры спальванні ўтварае цеплавую энергію. *Вугаль застаецца яшчэ добрым па́лівам для народнай гаспадаркі.*

**Палі́ва.** Шклопадобная маса, якой пакрываюць керамічныя вырабы. *Збанок свяціўся жоўтай палі́вай.*

**ПА́ЛІЦА — ПАЛІ́ЦА**

**Па́ліца.** Цяжкая дубіна, якая ў старажытныя часы служыла зброяй. *Першабытныя людзі ішлі на паляванне звычайна з па́ліцай.*

**Палі́ца.** Дошка або некалькі дошак, прымацаваных да сцяны для размяшчэння посуду, кніг... *Ён зняў сваю любімую кнігу з палі́цы.*

**ПА́ЛКІ — ПАЛКІ́**

**Па́лкі. 1.** Пачуццёвы, страсны, гарачы. *У яго такі быў па́лкі позірк, што, здаецца, мог спапяліць цябе.* **2.** Ад слова «палка». Ачышчаны ствол або галіна. *Дзядуля быў старэнькі, з двух бакоў яго трымалі па́лкі.*

**Палкі́.** Ад слова «полк». Вайсковая адзінка, якая ўваходзіць у склад дывізіі або брыгады. *Стралковыя палкі́ рушылі ў бой.*

**ПА́РА — ПАРА́** .

**Па́ра. 1.** Два аднолькавыя прадметы, якія складаюць адно цэлае. Мужчына і жанчына. Самец і самка. Дзве штукі. Некалькі. *Боты, чаравікі заўсёды складаюць па́ру.* **2.** Газ, які ўтвараецца пры выпарэнні вады. *Па́ра валіла з чайніка.*

**Пара́.** Час, перыяд года, пэўны момант, частка сутак. *Летняя пара́ — цудоўны час!*

**ПРАСТА́ТА — ПРАСТАТА́**

**Праста́та.** Няпарная залоза мужчынскага палавога апарату. *У яго была хворая праста́та.*

**Прастата́.** Уласцівасць усяго простага. *Святая прастата́.*

**ПРЫ́КЛАД — ПРЫКЛА́Д**

**Пры́клад.** Учынак, паводзіны, якія служаць узорам. *Яго вучоба — пры́клад для іншых.*

**Прыкла́д.** Частка ружэйнага ложа, якая служыць для ўпору ў плячо пры стральбе. *Прыкла́д ён добра не прыціснуў да пляча, і яго балюча тарганула аддачай .*

**ПРЫ́МУС — ПРЫМУ́С**

**Пры́мус.** Награвальны прыбор з помпай, якая падае газу ў гарэлку. *На пры́мусе стаяў кацялок са стравай, сіні агеньчык яго падагравaў.*

**Прыму́с.** Прымушэнне. Прымусіць, дамагчыся выканання чаго-небудзь. *Пад прыму́сам не заўсёды ідзе добра справа, часцей — наадварот.*

## Р

**РА́БА — РАБА́**

**Ра́ба.** Курачка-раба. Адзін з казачных персанажаў. *Знесла курачка-ра́ба яечка, ды не простае, а залатое.*

**Раба́.** Прыгонная служанка ў рабаўладальніцкім грамадстве. Пакорны, падначалены, залежны чалавек. *Яна была паслухмяная раба́, выконвала ўсе прыхамаці свайго гаспадара.*

**РА́БІНКА — РАБІ́НКА**

**Ра́бінка.** Маршчынка на воднай паверхні ад лёгкага ветру. *Возера было спакойнае, ціхае, ніводнай ра́бінкі не было відаць на ім.*

**Рабі́нка.** Маладая тонкая рабіна. Адна ягада рабіны. *Як сіротка, прытулілася да тыну рабі́нка.*

**РА́ДЗІЦЬ** /рада/ — **РАДЗІ́ЦЬ** /роды/

**Ра́дзіць.** Даваць раду, прапаноўваць што-небудзь, меркаваць,

раіць. *Маці дачцэ заўсёды добра рáдзіць*

**Радзíць.** Тое, што і нарадзіць. Радзіця дзіця, добры ўраджай, даваць плады. *Сад пачаў радзíць на пятым годзе.*

**РÁІЦЦА** /раіць/ — **РАÍЦЦА** /рой/

**Рáіцца.** Прасіць парады, абменьвацца думкамі, рáдзіцца. *Рáіцца са сваімі блізкімі — была ў яго выдатная завядзёнка.*

**Раíцца.** Утвараць новы рой, збірацца роем. Пра пчол. *Сёлета пчолы сталі добра раíцца.*

**РÁСА — РАСÁ**

**Рáса.1.** Верхняе доўгае адзенне праваслаўнага духавенства. *Поп надзеў рáсу: рыхтаваўся да малебна.* **2.** Комплекс антрапалагічных уласцівасцей той ці іншай групы насельніцтва Зямлі. *Карэнныя жыхары Афрыкі — прадстаўнікі чорнай расы.*

**Расá.** Вадзяныя кроплі, якія збіраюцца ўлетку на раслінах і розных прадметах вечарам, ноччу і раніцай. *Буйная расá пакрыла ўвесь луг: ішло на ноч.*

## С

**СÁЛІСТЫ** /сала/ — **САЛÍСТЫ** /саліст/

**Сáлісты.** *(разм.)* Тлусты, укормлены. Падобны на сала. *Гаспадыня выгадавала сáлістага падсвінка.*

**Салíсты.** Спевакі, музыканты або танцоры, якія выконваюць сольную партыю. *У канцэрце ўдзельнічала некалькі салíстаў.*

**СМÁЛІЦЬ — СМАЛÍЦЬ**

**Смáліць** *(разм.).* Ісці хутка ў пэўным напрамку. *Ён смáліць дадому не азіраючыся.*

**Смалíць.** Мазаць смалой. Прыпякаць, пячы, абпальваць агнём, курыць і да т. п. *Прасмалíць лодку, смалíць вепрука, смалíць цыгарку...*

**СТÝПА — СТУПÁ**

**Стýпа.** Драўляная пасудзіна, у якой таўклі таўкачом зерне. *У стýпе — ячмень, са стýпы — панцак.*

**Ступá.** Крок, тэмп руху пры хадзьбе, паходка. *Ён лёгкай ступóю падышоў да яе.*

**СЫ́ТА — СЫТÁ**

**Сы́та.** Скарочаная форма ад «сытая». Тлустая, не худая. *У яе цёлка заўсёды сы́та.*

**Сытá.** Даўняя беларуская страва: мёд або цукар, разведзены вадой. *Мядовая сытá добра ішла на заканчэнне вячэры.*

## Т

**ТРАЯ́КІ — ТРАЯКÍ**

**Трая́кі.** Які мае адносіны да трох крыніц, праяўляецца ў трох відах. *Хлеб трая́кі: чорны, белы і ніякі.*

**Траякí** *(разм.).* Адзнакі, атрыманыя ў школе і да т. п. *Па матэматыцы ў яго былі адны траякí.*

**ТÝШЫЦЬ — ТУШЫ́ЦЬ**

**Тýшыць.** Гатаваць адпаведным спосабам, каб упрэла. *Маці ў печы тýшыць капусту з мясам.*

**Тушы́ць.** Гасіць, спыняць гарэнне чаго-небудзь. *Тушы́ць святло ў пакоі часцей даводзілася яму.*

## Ф

**ФÍСТУЛА — ФІСТУЛÁ**

**Фíстула.** У медыцыне — свішч або штучны канал ад хворага ачага на паверхню скуры. *Урач зрабіў фíстулу, і хвораму зрабілася лягчэй.*

**Фістулá.** **1.** Старая назва аднаствольных, а пазней шматствольных флейт. *Адзін з аркестрантаў іграў на фістулé.* **2.** Вельмі тонкі голас, фальцэт. *Быццам фістулá, засвістала за акном сцюжа.*

## Ц

**ЦЫ́РЫК — ЦЫРЫ́К**

**Цы́рык.** Мангольскі салдат. *Па плошчы Улан-Батара ішлі цы́рыкі, чаканілі крок.*

**Цыры́к.** Гукапераймальны выклічнік. *Вераб'інае «цыры́к» чуваць было з кустоў.*

## Ч

**ЧА́ПАЦЬ — ЧАПА́ЦЬ**

**Ча́паць** *(разм.).* Ісці павольнай хадой, не спяшаючыся. *Ён ціхенька ча́паў сабе па дарожцы.*

**Чапа́ць.** Дакранацца, датыкацца, браць, карыстацца, турбаваць, хваляваць, расчульваць, шкодзіць. *Не чапа́й нічога і не бойся нікога.* Прымаўка.

## Ш

**ША́БАШ — ШАБА́Ш**

**Ша́баш.** Міфічнае начное зборышча ведзьмакоў, шалёны разгул нячыстай сілы. Зверскі ўчынак, варожая гулянка. *Прырода так была панішчана, што, здавалася, тут спраўляла ша́баш мноства чарцей.*

**Шаба́ш.** Заканчэнне работы, перапынак для адпачынку. Вокліч, каманда канчаць работу. — *Шаба́ш, работнічкі! — гучна падаў голас брыгадзір.*

# АМАФОНЫ
# і
# АМАФОРМЫ

## АМАФОНЫ І АМАФОРМЫ

Словы, якія аднолькава гучаць, але пішуцца па-рознаму, называюцца амафонамі. Аднолькавае гучанне пры розным напісанні атрымліваецца з-за фанетычнай асаблівасці, уласцівай многім мовам, у тым ліку і беларускай. Размова ідзе аб аглушэнні некаторых зычных пры іх вымаўленні: **б** можа гучаць як **п** *(грыб — грып)*, **д** — як **т** *(плод — плот)*, **з** — як **с** *(казка — каска)* і г. д. Тое, што гэта — розныя словы, робіцца ясна толькі ў пісьмовым варыянце, а ў вусным паміж імі няма ніякай розніцы.

Іншы раз да амафонаў адносяць і словы, якія гучаць не аднолькава, а падобна: *падборка — падпорка, авал — абвал, граб — храп, вяз — вязь, дзень — цень* і да т. п. Але для такіх выпадкаў існуе сваё вызначэнне: амаформы.

Розніца паміж амафонамі і амаформамі хоць і невялікая, але ўсё ж такі ёсць, і заўважыць яе няцяжка. Сама назва — амаформы — нібы зазначае: падабенства ўяўнае, фармальнае, а словы лёгка адрозніць.

# А

**АБВАЛ — АВАЛ**

**Абвал. 1.** Падзенне часткі вялікай масы. *Абвал сцяны.* **2.** Глыбы камення, зямлі або лавіна, якія зрушыліся з гор. *Абвал такі быў у гарах, што загрувасціў усе дарогі.*

**Авал.** Выпуклая замкнутая крывая лінія без вуглавых пунктаў. *З дзяцінства не любіў авал, часцей ён вугал маляваў.*

**АЗ — АС**

**Аз. 1.** Старадаўняя назва літары «а». *Аз, букі, ведзі...* **2.** Самы пачатак. *Пачаць з азоў.*

**Ас.** Лётчык-знішчальнік, майстар паветранага бою. *Ён быў у авіяпалку сапраўдны ас.*

**АРАБ — АРАП**

**Араб.** Прадстаўнік групы народаў, якія насяляюць Пярэднюю Азію і Паўночную Афрыку. *Араб быў з Каіра.*

**Арап. 1.** Размоўная назва афрыканца ў ранейшыя часы. *Арап Пятра Вялікага.* **2.** У пераносным сэнсе. прайдзісвет, нахабнік. *З ім не варта мець справу -- гэта арап, якіх мала!*

# Б

**БАС — БАЦ**

**Бас. 1.** Самы нізкі мужчынскі голас. *Спявак меў густы бас.* **2.** Музычны інструмент нізкага рэгістра. *Бас-гітара.*

**Бац** *(абл.).* Пацук. *Пацук выбег з каморы.*

**БУНД — БУНТ**

**Бунд.** Яўрэйскі сацыял-дэмакратычны саюз. *Ён уваходзіў у вядомы Бунд.*

**Бунт.** Мяцеж. Стыхійнае паўстанне. *На караблі паднялі бунт.*

**БУГ — БУХ**

**Буг.** Рака, па якой праходзіць дзяржаўная мяжа Беларусі з Польшчай каля Брэста. *Фашысты перайшлі Буг і рынуліся на крэпасць.*

**Бух.** Гукапераймальны выклічнік. *— Бух! Бух! — чуліся гарматныя стрэлы.*

# В

**ВЯЗ — ВЯЗЬ**

**Вяз.** Лісцевае дрэва сямейства вязавых /ільмовых/. *Вяз стаяў каля плоту, шырока раскінуўшы голле.*

**Вязь.** Узор, створаны спляценнем ліній. *Старажытны рукапіс быў выкананы славянскай вяззю.*

**ВЫПАД — ВЫПАТ**

**Выпад.** Рэзкі рух уперад з апорай на выстаўленую нагу. Варожая выхадка. *Фехтавальшчык зрабіў выпад супраць свайго саперніка.*

**Выпат.** Вадкасць, якая прасочваецца праз сценкі сасудаў і збіраецца ва ўнутранай поласці цела. *Урач сказаў, што ў хворага выпат.*

## Г

**ГРАБ — ХРАП**

**Граб.** Лісцевае дрэва з гладкай шэрай карой. *Граб раскошна стаяў сярод лесу.*

**Храп.** Хрыплыя гукі ў час сну. *З-за сцяны чуўся гучны храп.*

**ГРАЗЬ — ХРАСЬ**

**Гразь.** Размяклая ад вады глеба, бруд. *Навокал была адна гразь.*

**Хрась.** Ад дзеяслова «храснуць». Выклічнік. *Сказаў ды – хрась яму па носе!*

**ГРОГ — ГРОХ**

**Грог.** Моцны напітак з рому з цукрам і гарачай вадой. *Ён упершыню тут паспрабаваў грог.*

**Грох.** Ад слова «грохат». Выклічнік. *Хістаўся, хістаўся ды — грох аб зямлю!*

**ГРУБКА — ГРУПКА**

**Грубка.** Печка для абагрэву. *Ён распаліў грубку, і ў бараку стала цяплей*

**Групка.** Ад слова «група». Малы гурт людзей. *Людзі падалі, гэта была ўжо не група, а групка.*

**ГРЫБ — ГРЫП**

**Грыб.** Бесхларафільная расліна ў выглядзе шапачкі на ножцы. *Грыб, падобны на баравік, можа быць і неядомым.*

**Грып.** Вострая вірусная хвароба, запаленне дыхальных шляхоў. *Яна перанесла грып і цяпер адчувала сябе дрэнна.*

## Д

**ДУЖКА — ДУШКА**

**Дужка.** Невялікая дуга. Парны знак прыпынку. *У акулярах зламалася дужка.*

**Душка.** Памяншальна-ласкальнае ад слова «душа». *Яна была такая прывабная, чыста душка*

## ДЗ

**ДЗІК — ЦІК**

**Дзік.** Дзікі кабан, парсюк. *Дзік сігануў у гушчар*

**Цік.** Нервовы стан, пры якім перасмыкаюцца мышцы твару. *Вока часта міргала, відаць, у чалавека быў цік.*

**ДЗЕНЬ — ЦЕНЬ**

**Дзень.** Частка сутак ад раніцы да вечара. *Вясновы дзень год корміць.* Прымаўка.

**Цень.** Прастора, заслоненая ад сонца. *Цень падаў злева ад яго.*

## ДЖ

**ДЖГАННЕ — ЧХАННЕ**

**Джганне.** Бегчы, імчацца вельмі хутка. *Здавалася бясконцай гонка сабак, гэтае джганне па белым абшары.*

**Чханне.** Выдыханне паветра носам і ротам, з адрывістымі шумнымі гукамі. *Яму надакучыла чханне: хутчэй бы праходзіла прастуда.*

## Ё

**ЁД — ЁТ**

**Ёд.** Хімічны элемент цёмна-карычневага колеру. Спіртавы раствор гэтага рэчыва. *Ён закапаў ёдам драпіну на пальцы.*

**Ёт.** Гук напаўзычны. У лацінскай мове абазкачаецца літарай «j», а ў беларускай «й». *Як пішацца па-іхняму «ёт», ён не ведаў.*

## Ж

**ЖМУД — ЖУТ**

**Жмуд.** Ад слова «жмудзь». Даўняя назва літоўскага племя жэмайты. «Жмуд» размоўнае ад «жмудзін». *Бабка казала: «Тут некалі жылі жмуды».*

**Жмут.** Невялікі скрутак. *Касец падняў жмут атавы, абцёр касу.*

## З

**ЗАДОР — ЗАТОР**

**Задор.** Запал, бадзёрасць. *Яго ніколі не пакідаў задор: такі быў характар.*

**Затор.** Спыненне з прычыны загрувашчвання крыгаходу, вулічнага руху і да т. п. *У канцы вуліцы яго спыніў затор машын.*

## І

**ІМЖА — ІМША**

**Імжа.** Ападкі ў выглядзе вельмі дробных кропель вільгаці. *Імжа вісела над полем з самага ранку.*

**Імша.** Каталіцкая абедня. *У касцёле ішла імша.*

## К

**КАЗКА — КАСКА**

**Казка.** Апавядальны твор з нерэальнай асновай, у якім звычайна дзейнічаюць жывёлы, рыбы, птушкі, казачныя асілкі, чараўнікі. *Казка пра залатую рыбку.*

**Каска.** Металічны шлем на галаве. *Каска ў байца з'ехала набок.*

**КАДР — КАТАР**

**Кадр.** Асобны здымак на фота- ці кінаплёнцы. *Гэты кадр фільма яму быў вельмі дарагі.*

**Катар.** Запаленне слізістай абалонкі якога-небудзь органа з выдзяленнем вадкасці. *У яе быў моцны катар: з носа цякло, як з трубы.*

**КАПОТ — КАПУТ**

**Капот.** Металічная адкідная накрыўка ў машыне. *Шафёр адкінуў капот, агледзеў матор.*

**Капут.** Канец па-нямецку. *«Гітлер капут!» — цяпер крычалі ўсе немцы.*

**КОРД — КОРТ**

**Корд.** Моцныя кручаныя ніткі з бавоўны. Сорт шарсцяной тканіны ў рубчык. *Корд ішоў добра на вяроўкі.*

**Корт. 1.** Тоўстая баваўняная тканіна. *Пашылі яму штаны з корту.* **2.** Пляцоўка для гульні ў тэніс. *На кортах ужо былі тэнісісты.*

**КОСКА — КОЗКА**

**Коска. 1.** Невялікая каса. *Хлапчук быў малы, і гэткая ж з ім коска, якою ён вадзіў па траве.* **2.** Знак прыпынку ў сказе. *Тут патрэбна коска, а не кропка.*

**Козка.** Памяншальна-ласкавае ад слова «каза». *Нарадзілася козка — маленькая, худзенькая.*

**КРАБ — КРАП**

**Краб.** Марскі рак. *У нерат трапіў вялікі краб.*

**Крап.** Крапіны. Дробныя плямкі іншага колеру на чым-небудзь. *На адвароце карт быў чырвоны крап.*

## Л

**ЛОГ — ЛОХ**

**Лог.** Шырокі, доўгі яр са схіламі. *Лог скрозь зарос арэшнікам.*

**Лох. 1.** Дзікая масліна. *Лох быў поўны спелых пладоў.* **2.** Кара дрэў: ліпы, вяза.

**ЛУБ — ЛУП**

**Луб.** Валокны лёну,канопляў. *Лапці з лубу.*

**Луп** *(разм.)* Ад «лупіць, адлупцаваць». *Гэты бацькаў луп ён запомніў на ўсё жыццё.*

## М

**МАГ — МАХ**

**Маг.** Чарадзей, чараўнік. *Ён быў, як той маг: усё мог, што ні задумае.*

**Мах.** Ад слова «махаць». Размоўнае. *Адзін мах — і ён ужо быў на другім беразе.*

**МАЗКА — МАСКА**

**Мазка** *(разм.)*. Ад слова «мазаць». Нешта вязкае. *Мазка сцен яшчэ была свежая.*

**Маска.** Накладка на твар з вобразам каго-небудзь. *Вакол ёлкі яна танцавала ў масцы лісы.*

## Н

**НОЖКА — НОШКА**

**Ножка.** Памяншальна-ласк. ад слова «нага». Апора, стойка. *Ножка грыба была чарвівая.*

**Ношка** *(разм.)*. Ад слова «ноша». Ахапак, вязка. *Занадта цяжкай была хлапчуку гэтая ношка.*

**НОРД — НОРТ**

**Норд.** Поўнач. Паўночны напрамак, паўночны вецер. *Норд дзьмуў з Барэнцава мора.*

**Норт.** Затон, завоіна, паглыбленае месца ля берага ракі. *У норце жыравалі язі, ляшчы.*

## О

**ОБЕР — ОПЕР**

**Обер.** Першая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае старшынства ў чыне, званні. *Разведчык Кузняцоў працаваў у тыле ворага ў званні обер-лейтэнанта.*

**Опер.** Скарочана-размоўная форма злучэння «аператыўны супрацоўнік». *Опер выехаў па заданню тут жа.*

## П

**ПАДБОРКА — ПАДПОРКА**

**Падборка.** Ад слова «падабраць». Нізка твораў. *Падборку яго вершаў заўважылі крытыкі.*

**Падпорка.** Слуп, падстаўка пад што-небудзь. *Падпорка трымала галіны з налітымі пладамі.*

**ПАСАД — ПАСАТ**

**Пасад. 1.** Прадмесце. **2.** Месца, куды садзілі нявесту на вяселлі. *Пасад быў для нявесты на дзяжы, пакрытай кажухом.*

**Пасат.** Устойлівы вецер, які дзьме на працягу года над акіянам у трапічных шыротах. *Моцны пасат гнаў паруснік да афрыканскага ўзбярэжжа.*

**ПАС — ПАЗ**

**Пас. 1.** Рэмень, які прыводзіць у рух механізмы. *Пас напяўся, кола пачало круціцца.* **2.** Перадача мяча, шайбы. *Іваноў даў пас Пятрову, а той забіў гол.* **3.** Адмаўленне ад якога-н. дзеяння. *Ён сказаў: «Годзе! Пас!»*

**Паз.** Выемка, канаўка, паглыбленне ў чым-небудзь. *Паз ішоў праз усё бервяно.*

**ПЛОД — ПЛОТ**

**Плод.** Тое, што выспявае на дрэве, кусце, у агародзе. *У грушы смачны, салодкі плод.*

**Плот.** Агароджа вакол чаго-небудзь. *Плот быў стары, пахілены.*

**ПОД — ПОТ**

**Под.** Паверхня ўнутры печы, на якую кладзецца паліва. *Падмяла под ад попелу і паставіла пячыся булкі.*

**Пот.** Вадкасць, якая выдзяляецца падскурнымі залозамі. *Пот цёк з яго ілба — гэтак выжыльваўся.*

**ПРЫЗ — ПРЫС**

**Прыз.** Узнагарода за ўдзел у конкурсе, спаборніцтве. *Ён атрымаў прыз як лепшы ігрок.*

**Прыс** *(разм.)*. Шост, якім кіруюць лодку, плыт. *Прыс быў доўгі, добра было гнаць ім човен.*

**ПУДРА — ПУТРА**

**Пудра**. Пахучы парашок, які прымяняюць як касметычны сродак. *Пудра проста ляжала на яе твары*

**Путра** *(разм.)*. Мучная страва, падобная на саладуху. *Ён еў путру і хваліў яе.*

**ПУЖКА — ПУШКА**

**Пужка**. Памяншальнае ад слова «пуга». Прадмет, якім сцябаюць. *Ён хвастануў пужкай карову.*

**Пушка. 1.** Гармата. *Пушка грымнула так, што ажно заклала вушы.* **2**. *(разм.)*. Карабок, пачак. *Пушка запалак.*

## Р

**РАДА — РАТА**

**Рада. 1.** Парада, навучанне, абмеркаванне. *Якую даць яму раду? Думалі ўсе.* **2.** Народны сход, савет. *Пераяслаўская Рада.*

**Рата** *(разм.)*. Частка агульнай платы, доўгу... *Ганарар выдавалі ў тры раты.*

**РОГ — РОХ**

**Рог. 1.** Касцяшны выраст на галаве некаторых жывёл. *Адзін рог у каровы быў зламаны.* **2.** Музычны, сігнальны інструмент. *Музыка ўзяў рог і заіграў.*

**Рох** (гукапераймальны выклічнік ад слова «рохкаць»). Гук, які выдае свіння. *«Рох-рох», — толькі і пачуеш ад свінні.*

**РОД — РОТ**

**Род**. Шэраг пакаленняў, якія паходзяць ад аднаго продка. *Гэта быў славуты род, з якога выйшлі многія музыканты.*

**Рот**. Поласць паміж верхняй і ніжняй сківіцамі. *Яму не давалі раскрыць рот, адно самі гаварылі.*

**РЫЗА — РЫСА**

**Рыза.** Адзенне, якое надзявае святар пры маленні. *Папоўская рыза заўсёды вісела асобна.*

**Рыса. 1.** Вузкая палоска, лінія, рубеж. *Ен правёў рысу на пяску, якая раздзяляла іх, нібы мяжа.* **2.** Прыкмета, якасць. *Дабрыня — рыса яго характару.*

## С

**САЛЬДА — САЛЬТА**

**Сальда.** Розніца паміж прыходам і расходам. *Сальда гандлёвага балансу.*

**Сальта.** Пераварот у паветры праз галаву. *Ён зрабіў двайное сальта.*

**СЕРБ — СЕРП**

**Серб.** Прадстаўнік народа, які жыве ў Сербіі. *Серб, македонец, харват, чарнагорац, славенец, басніец нядаўна жылі ў адной краіне -- Югаславіі.*

**Серп.** Ручная прылада ў выглядзе выгнутага назубленага нажа. *Колькі зжаў гэты серп, аднаму Богу вядома.*

**СКІД — СКІТ**

**Скід.** Перамяшчэнне горных парод па трэшчыне ў вертыкальным або нахільным кірунку. *Скід ішоў з самай вяршыні гары.*

**Скіт.** Аддаленае ад манастыра жыллё для манаха-пустэльніка. Стараверскі манастыр. *Манах прывёў яго ў свой скіт.*

**СНОБ — СНОП**

**Сноб.** Манерны чалавек, які прэтэндуе на вытанчаны густ, інтэлектуальнасць. *У кампаніі ён выглядаў снобам.*

**Сноп.** Звязаны пук сцёблаў збажыны, лёну. *Сноп жыта стаяў на покуці.*

**СТОЎБ — СТОЎП**

**Стоўб.** Слуп. *Кажуць, што Стоўбцы пайшлі ад слова «стоўб».*

**Стоўп. 1.** Сцірта, торп. *Стоўп саломы стаяў у полі.* **2.** Вежа або калона. *Александрыйскі стоўп.*

## Т

**ТАРБАН — ТАРПАН**

**Тарбан.** Струнны музычны інструмент, падобны да бандуры. *Ён іграў выдатна на тарбане.*

**Тарпан.** Дзікі конь, які вадзіўся ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі. *Тарпан*

*вынішчаны ў XIX стагоддзі.*

**ТРА́ВІЦА — ТРАВІ́ЦЦА**

**Тра́віца.** Памяншальна-ласк. ад слова «трава». *Пасля зімы зазелянела травіца.*

**Траві́цца.** Атручвацца, знішчацца, апрацоўвацца хіміяй. *Гэтае насенне будзе травіцца.*

**ТЭКС — ТЭКСТ**

**Тэкс.** Пазасістэмная адзінка лінейнай шчыльнасці для валокнаў і нітак. *Тэкс у нас выкарыстоўваецца з 1956 года.*

**Тэкст.** Тое, што напісана або надрукавана. Пісьмовы дакумент. Словы песні. *Перад ім ляжаў тэкст апавядання.*

## Ф

**ФОРД — ФОРТ**

**Форд.** Шырокавядомая марка амерыканскага аўтамабіля. *Ён купіў форд.*

**Форт.** Невялікая крэпасць, збудаванне. *Усходні форт Брэсцкай крэпасці не здаваўся да канца.*

## Х

**ХЛЕБ — ГЛЕБ**

**Хлеб.** Прадукт, які выпякаецца з мукі. *Хлеб траякі: чорны, белы ... і ніякі.*

**Глеб.** Мужчынскае імя. *Глеб пайшоў разам з Мішам.*

**ХОЛ — ГОЛ**

**Хол.** Зала ў санаторыях, гасцініцах і т.п. *Яна ўвайшла ў прасторны хол, спынілася, разгубілася.*

**Гол.** Мяч, шайба, забітыя ў вароты. *Гэта быў залаты гол, забіты ім саперніку.*

**ХОП — ГОП**

**Хоп.** Выклічнік, утвораны ад дзеяслова «хапаць». *Ён уцякаць пачаў, але я — хоп яго за каршэнь.*

**Гоп.** Выклічнік. Што-небудзь пераадолець, скочыць... *Ён са страхі – гоп на зямлю.*

## Ц

**ЦЁЗКА — ЦЁСКА**

**Цёзка.** Чалавек, які мае аднолькавае з кім-небудзь імя. — *Ты — Мікола і я — Мікола. Мы з табой цёзкі.*

**Цёска** *(разм.).* Трэска, шчэпка. *Вакол верстака валяліся цёскі.*

**ЦЯЛІЦА — ЦЯЛІЦЦА**

**Цяліца.** Цялушка, маладая карова. *У яе была пярэстая цяліца.*

**Цяліцца.** Нараджаць цяля. *Карова павінна была цяліцца пад Вялікдзень.*

## Ч

**ЧУДЗЬ — ЧУЦЬ**

**Чудзь.** Назва эстаў і некаторых іншых народнасцей угра-фінскай моўнай групы. *Ён недзе чуў пра чудзь, а дзе яны жывуць, не ведаў.*

**Чуць.** Прыслоўе, злучнік. Ледзь, трохі. *Ён чуць не загінуў у тым баі.*

## Ш

**ШАГ — ШАХ**

**Шаг.** Тое, што і крок. Пэўная адлегласць паміж суседнімі элементамі ( у механізмах, дэталях). *Шаг зубчастага кола.*

**Шах.** Тытул манарха ў некаторых краінах Усходу. У шахматнай гульні нападзенне фігуры на караля. *Гэта быў перадапошні шах каралю: затым — мат.*

**ШЛЯК — ШЛЯХ**

**Шляк.** Палоска па краі тканіны іншага колеру. *Уверсе па шпалерах яна наклеіла шляк.*

**Шлях.** Шырокая дарога, напрамак, праход, праезд. *Пры шляху стаяла ляснічая камора.*

**ШТАМБ — ШТАМП**

**Штамб.** Частка ствала пладовага дрэва ад кораня да кроны. *Калі штамб закіданы зямлёй, яблыня*

*не дае пладоў.*

**Штамп.** Форма для вытворчасці розных прадметаў шляхам штампоўкі, пячатка. *Яна паставіла штамп на дакуменце.*

## Э

### ЭКАНОМ — АКАНОМ

**Эканом.** Беражлівы, гаспадарлівы чалавек. Загадчык гаспадаркі. *Ён такі быў эканом — капейчыну дарэмна не растраціць,*

**Аканом.** Службовец у панскім маёнтку, які кіраваў гаспадаркай. *Ён некалі служыў тут аканомам.*

## Ю

### ЮЗ — ЮС

**Юз.** Заклінаванне колаў пры руху транспартных сродкаў. *У галалёд нельга рэзка тармазіць, каб машына не пайшла юзам.*

**Юс.** Назва дзвюх літар у стараславянскім алфавіце, якія абазначалі насавыя галосныя гукі. *Юс вялікі і юс малы.*

## Я

### ЯЗЬ — ЯСЬ

**Язь.** Рыба сямейства карпавых. *Язь трапіўся на вуду вялікі.*

**Ясь.** Мужчынскае імя, памяншальна-ласкальнае ад Янка, Іван. *Яго называлі дома — Ясь.*

# АСНОЎНЫЯ ПРАВІЛЫ ПРАВАПІСУ

## УЖЫВАННЕ ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ

§1. З вялікай літары пішацца першае слова тэксту, а таксама першае слова пасля кропкі, шматкроп'я, пытальніка і клічніка, якія стаяць у канцы сказа.

**Заўвага 1.** У вершах дапускаецца напісанне з вялікай літары першага слова кожнага радка незалежна ад папярэдніх знакаў прыпынку.

**Заўвага 2.** Пасля шматкроп'я, якое стаіць у сярэдзіне сказа і абазначае перапынак або замінку ў гутарцы, першае слова пішацца з малой літары: *А што вы скажаце на крытыка, Іван Ант... выбачайце, Мацвеевіч.* (Бядуля).

**Заўвага 3.** З малой літары пішуцца і словы аўтара, што ідуць услед за простай мовай і паказваюць, каму яна належыць: *«Самалёт!» — у захапленні крычаў Міколка.* (Самуйлёнак). *«Што ты хочаш рабіць?» — з жахам запытаў Мірон.* (Маўр).

§ 2. З вялікай літары пішацца першае слова пасля выклічніка або зваротка, якім пачынаецца сказ і пасля якога стаіць клічнік: *А-я-яй! Хто ж бы гэта мог падумаць! Гэтакі, здаецца, чалавек!..* (Крапіва). *О Нёман! Песня майго сэрца, краса палёў, краса нізін, люблю твой спеў, што ўдаль нясецца, люблю цябе, як родны сын!* (Русак).

**Заўвага.** Калі ж выклічнік стаіць у сярэдзіне сказа, тады першае слова пасля клічніка пішацца з малой літары: *Гляцім жа, браткі, э-эх! ляцім!.. Даганяй — не дагоніш...* (Лынькоў).

§ 3. З вялікай літары пішацца першае слова пасля двукроп'я ў наступных выпадках:

1. Калі гэта пачатак простай мовы: *Маці пыталася часамі: «Дзе ты ўсё ходзіш, Міша?»* (Крапіва).

2. Калі гэта пачатак цытаты, якая з'яўляецца самастойным сказам: *Звяртаючы ўвагу маладых пісьменнікаў на неабходнасць глыбокага вывучэння мовы, Аляксей Максімавіч Горкі гаварыў: «Сапраўдная прыгажосць мовы, што дзейнічае як сіла, ствараецца дакладнасцю, яснасцю, гучнасцю слоў, якія афармляюць малюнкі, характары, ідэі кнігі».*

**Заўвага.** Калі ж цытата ўваходзіць у сказ як яго арганічная частка, тады яна пачынаецца з малой літары: *Леў Талстой сцвярджаў, што «...у мастацтве простасць, сціласць і яснасць ёсць найвышэйшая форма дасканаласці мастацкай формы, якая дасягаецца толькі вялікім талентам і вялікай працай».*

§ 4. З вялікай літары пішуцца імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, псеўданімы, празванні: *Іван Дамінікавіч Луцэвіч (Янка Ку-*

*пала), Кастусь Каліноўскі, Бацька Мінай, Луі Арагон, Пётр Перцы, Рычард Ільвінае Сэрца.*

**Заўвага 1.** Індывідуальныя назвы людзей, якія страцілі значэнне ўласных імён і набылі значэнне агульнай назвы, пішуцца з малой літары: *донжуан, мецэнат.*

З малой літары пішуцца і назвы фізічных адзінак, відаў вопраткі, зброі і інш., якія паходзяць ад прозвішчаў і ўласных імён: *ампер, фрэнч, браўнінг, напалеон* (пірожнае).

Імёны і прозвішчы, якія ўжываюцца як агульныя назвы ў пагардлівым сэнсе, пішуцца з малой літары: *абломавы, хлестаковы, гарлахвацкія.*

**Заўвага 2.** Назвы народаў, плямён, а таксама назвы, якія паказваюць нацыянальную прыналежнасць людзей, іх месцапражыванне, пішуцца з малой літары: *беларус, кітаец, француз, араб; гамяльчанін, палачанін, масквіч.*

**Заўвага 3.** Агульныя назвы, утвораныя ад уласных імён, пішуцца з малой літары: *пушкініст, талстовец, суворавец.*

**Заўвага 4.** Назвы пасад, тытулаў, ганаровых званняў, навуковых ступеней пішуцца з малой літары: *старшыня, прэзідэнт, міністр, прафесар, маршал, герой, народны паэт, заслужаны дзеяч мастацтваў, кароль, шах.*

Але ў назвах асобных вышэйшых пасад і ганаровых званняў з вялікай літары пішацца кожнае слова: *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Герой Расіі, Старшыня Савета Міністраў.*

§ 5. З вялікай літары пішуцца індывідуальныя назвы, якія маюць дачыненне да міфалогіі і рэлігіі: *Антэй, Геркулес, Венера, Зеўс, Пярун, Малох.*

**Заўвага.** Індывідуальныя назвы міфалагічных істот, якія ператварыліся ў назвы агульныя, пішуцца з малой літары: *малох мілітарызму, пярун расшчапіў дрэва.* Таксама з малой літары пішуцца родавыя назвы міфалагічных істот: *дамавік, лясун, русалка, муза, німфа.*

§ 6. З вялікай літары пішуцца клічкі жывёл: *Халстамер* (конь), *Рагуля* (карова), *Лыска* (сабака), *Мурка* (кошка).

**Заўвага.** Калі ж клічкі ўжываюцца ў якасці назваў відаў жывёлы, тады яны пішуцца з малой літары: *шарак* (заяц), *мішка* (мядзведзь).

§ 7. З вялікай літары пішуцца ў байках, казках, драматычных творах назвы дзеючых асоб, выражаныя імёнамі, якія звычайна з'яўляюцца агульнымі назвамі: *Асёл, Сава, Дуб, Шчупак, Леў, Мароз (Дзед Мароз).*

§ 8. З вялікай літары пішуцца прыметнікі, утвораныя з дапамогай суфіксаў ***-ев- (-ёв-, -ёў-), -ов- (-ав-, -аў-), -ін- (-ын-)*** ад уласных імён людзей і клічак жывёл: *Коласавы творы, Міхасёвы кнігі, Мурчыны кацяняты.*

Аднак калі такія прыметнікі ўтвараюць навуковыя тэрміны або ўжываюцца ў выразах з пераносным значэннем, яны пішуцца з малой літары: *піфагорава тэарэма, берталетава соль, ахілесава пята.*

§ 9. З вялікай літары пішуцца прыметнікі, утвораныя з дапамогай суфіксаў ***-аўск-, -еўск-*** або ***-інск-***, калі яны ўваходзяць у склад назваў, роўных па сэнсу назвам са словамі «імя», «памяці»: *Нобелеўская прэмія* (прэмія фонда Нобеля), *Купалаўскія чытанні* (чытанні памяці Купалы).

Ва ўсіх астатніх выпадках такія прыметнікі пішуцца з малой літары: *купалаўскі стыль, эзопаўская мова, сувораўская тактыка, вольтава дуга* і г. д.

**Заўвага**. Прыслоўі, якія ўтвораны ад прозвішчаў і асабовых імён людзей, заўсёды пішуцца з малой літары: *па-хрысціянску, па-суворану.*

§ 10. З вялікай літары пішуцца:

1. Назвы планет, зорак, сузор'яў: *Венера, Марс, Казярог, Сатурн, Уран, Плутон, Сітца, Воз* і інш.

**Заўвага**. Словы *сонца, месяц, зямля* пішуцца з вялікай літары тады, калі яны ўжываюцца ў якасці астранамічных назваў: *Вакол Сонца абарачаюцца наступныя планеты: Меркурый, Венера, Зямля (са сваім спадарожнікам Месяцам), Марс, Юпітэр, Сатурн, Уран, Нептун і Плутон;* але: *апрацоўка зямлі, сонца слепіць вочы.*

2. Індывідуальныя геаграфічныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і іншыя назвы: *Беларусь, Каўказ, Азія, Грэнландыя, Сахара, Байкал, Мінск.*

Калі ж падобныя назвы складаюцца з некалькіх слоў, тады ўсе словы пішуцца з вялікай літары, апрача службовых слоў і родавых назваў (такіх як: *зорка, камета, сузор'е; востраў, мора, рака, заліў, мыс; вуліца, плошча,* а таксама парадкавых абазначэнняў свяціл — *альфа, бэта* і інш.): *Млечны Шлях, Новая Зямля, Старыя Дарогі, Злучаныя Штаты Амерыкі, возера Нарач, Балканскі паўвостраў, тропік Рака, Паўночны полюс, пік Перамогі, вуліца Багдановіча, Спаская вежа, Красная плошча, Вялікі Крамлёўскі палац, альфа Малой Мядзведзіцы* і інш.

У афіцыйных назвах дзяржаў усе словы пішуцца з вялікай літары (у тым ліку і слова *рэспубліка*): *Рэспубліка Беларусь, Расійская Федэрацыя, Каралеўства Швецыя, Дзяржава Ізраіль, Вялікае Герцагства Люксембург.*

З вялікай літары пішуцца і неафіцыйныя геаграфічныя назвы: *Беларусь, Татарстан, Закаўказзе, Случчына.*

**Заўвага**. Назвы чатырох галоўных кірункаў свету (*поўдзень, поўнач, захад, усход, паўднёвы захад, паўночны ўсход* і г. д.) пішуцца з малой літары: *Самалёт узяў кірунак на поўнач.*

Але калі гэтыя назвы ўжываюцца ў значэнні краін ці ў якасці тапанімічных найменняў, тады яны пішуцца з вялікай літары: *народы Усходу, мікрараён Паўднёвы Захад.*

§ 11. З вялікай літары пішуцца прыметнікі, утвораныя ад уласных геаграфічных назваў:

1. Калі яны ўваходзяць у састаў складаных геаграфічных назваў: *Мінская вобласць, Беларускі вакзал* (у Маскве), *Валдайскае ўзвышша.*

**Заўвага**. Калі ж прыметнікі, утвораныя ад уласных геаграфічных назваў, ужываюцца не як уласныя, а як агульныя назвы, тады яны пішуцца з малой літары: *асфальтуюцца мінскія вуліцы, разбудоўваюцца беларускія гарады.*

2. Калі яны ўваходзяць у састаў складаных індывідуальных назваў людзей у якасці іх прозвішчаў: *Сімяон Полацкі, Кірыла Тураўскі, Дзмітрый Данской.*

§ 12. У назвах гістарычных падзей, эпох, з'яў, гістарычных дакументаў, твораў мастацтва і іншых матэрыяльных помнікаў з вялікай літары пішацца першае слова, а таксама ўласныя імёны, якія ўваходзяць у іх састаў.

Сюды адносяцца:

1. Назвы, выражаныя адным назоўнікам: *Кастрычнік* (у значэнні Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя), *Адраджэнне, Рэнесанс, Рэфармацыя* і інш.

**Заўвага**. Гэтыя ж словы могуць ужывацца і ў якасці агульных назваў, тады іх трэба пісаць з малой літары: *стыль рэнесанс, адраджэнне гаспадаркі.*

2. Назвы, выражаныя спалучэннем прыметніка, утворанага ад уласнага імя, з назоўнікам: *Парыжская камуна, Версальскі мір, Баркалабаўскі летапіс, Літоўская метрыка.*

**Заўвага**. Калі ж у прыметніку, з якога пачынаецца такая назва, з'яўляецца прыстаўка, тады назва пішацца з малой літары: *дапятроўская эпоха, пераднапалеонаўскія войны.*

3. Назвы, выражаныя ўсякім іншым спалучэннем назоўніка з пачатковым прыметнікам або лічэбнікам: *Кулікоўская бітва, Вялікая Айчынная вайна, Доўгі парламент, Лютаўская рэвалюцыя, Сямігадовая вайна, Трэцяя рэспубліка* і інш.

**Заўвага**. Назвы гістарычных падзей, эпох, плыней, з'яў, якія не ўсведамляюцца як уласныя назвы, пішуцца з малой літары: *антычны свет, рэалізм, феадалізм* і інш.

§ 13. З вялікай літары пішацца першае слова ў назвах каляндарных святаў і знамянальных дат: *Вялікдзень, Радуніца, Новы год, Восьмае сакавіка, Дзень артылерыі.*

Калі пачатковы парадкавы лічэбнік у такой складанай назве перадаецца лічбай, тады з вялікай літары пішацца наступнае за ім слова: *9 Мая, 8 Сакавіка.*

**Заўвага**. Назвы дзён тыдня, месяцаў і інш. пішуцца з малой літары: *нядзеля, панядзелак, студзень, красавік.*

§ 14. З вялікай літары пішуцца ўсе словы ў поўных назвах ордэнаў, апрача слоў *ордэн* і *ступень: ордэн Мужнасці, ордэн Працоўнай Славы I ступені, ордэн Францыска Скарыны, ордэн Залатога Льва, ордэн Ганаровага Легіёна* і г. д.

**Заўвага**. У назвах знакаў узнагарод, знакаў вызначэння і прызоў, якія бяруцца ў двукоссе, з вялікай літары пішуцца першае слова, а таксама ўваходзячыя ў іх уласныя назвы: *ордэн «Мацярынская слава», «За абарону Масквы»* (медаль), *«За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.»* (медаль) і інш.

§ 15. З вялікай літары пішуцца ўсе словы, апрача службовых, у назвах некаторых міжнародных арганізацый: *Сусветны Савет Міру, Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Савет Бяспекі, Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца.*

§ 16. У назвах міністэрстваў і іншых дзяржаўных устаноў і арганізацый з вялікай літары пішацца першае слова. Калі ў іх састаў уваходзяць уласныя імёны або назвы іншых устаноў і арганізацый, гэтыя ўласныя імёны і назвы пішуцца так, як яны пішуцца пры самастойным ужыванні: *Нацыянальная акадэмія навук Рэспублікі Беларусь, Вярхоўны суд, Міністэрства замежных спраў.*

§ 17. У поўных афіцыйных назвах устаноў мясцовага значэння, вышэйшых навучальных устаноў, відовішчных прадпрыемстваў, прамысловых і гандлёвых арганізацый з вялікай літары пішуцца першае слова і ўсе ўласныя імёны, якія ўваходзяць у састаў такіх назваў: *Палац моладзі, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, Мінскі педагагічны універсітэт імя Максіма Танка, адміністрацыя Першамайскага раёна г. Віцебска, Палац Рэспублікі.*

**Заўвага**. Правіла гэтага параграфа мае дачыненне і да складаных назваў міжнародных і замежных цэнтральных устаноў, грамадскіх і прафесійных саюзаў: *Прэзідыум сейма Рэспублікі Польшча.*

§ 18. З вялікай літары пішацца першае слова ў афіцыйных назвах палітычных партый, калі назва не пачынаецца са слова *партыя: Ліберальна-дэмакратычная партыя, Расійская са-*

*цыял-дэмакратычная рабочая партыя, Саюз 17 кастрычніка;* але: *партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў.*

§ 19. У назвах літаратурных твораў, газет, часопісаў, устаноў, прадпрыемстваў, якія бяруцца ў двукоссе, з вялікай літары пішуцца першае слова і ўваходзячыя ў іх састаў уласныя імёны: *«Мінскі кур'ер», «Літаратура і мастацтва»* (газеты), *«Адукацыя і выхаванне», «Роднае слова»* (часопісы), *«Раскіданае гняздо»* (драма), *«Новая зямля»* (паэма), *«Векапомныя дні»* (раман), *«Смелыя людзі»* (фільм), *«Янка Купала»* (цеплаход), *«Мастацкая літаратура»* (выдавецтва), *«Серп і молат»* (завод) і інш.

**Заўвага**. У падвойных састаўных назвах з вялікай літары пішацца таксама і першае слова другой назвы: *«Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна».*

§ 20. У розных афіцыйных пасланнях, лістах з вялікай літары пішацца займеннік ***Вы*** *як* форма ветлівага звароту да адной асобы.

У асобым стылістычным ужыванні з вялікай літары пішуцца словы *Радзіма, Айчына, Чалавек, Мір, Свабода* і інш.

## ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

§ 21. Пасля ***ж, ч, ш, р, ц*** (не з ***т*** мяккага) і ***д, т*** пішуцца літары ***а, э, о, у, ы***, а літары ***я, е, ё, ю, і*** не пішуцца: *жар, табель, жэрдка, цэгла, човен, рука, шыба, дымець, тыдзень.*

Абмежавана ўжываюцца літары ***я, е, ё, ю*** і пасля зычных ***г, к, х***. Гэта пераважна словы іншамоўнага паходжання: *генерал, кеглі, Хельсінкі, гяур, Кяхта.*

### Літары *о, э, а*

§ 22. Літара ***о***, як правіла, пішацца толькі пад націскам. Не пад націскам на месцы ***о*** пішацца ***а***: *бор — бары́, го́ры — гара́, хо́лад — халады́, арганіза́цыя, Аста́п, Ашмя́ны, Адэ́са, по́зна, ху́тка, дына́ма, бру́та, лібрэ́та, Маладзе́чна.*

Не пад націскам ***о*** захоўваецца ў канцы слова (часцей за ўсё іншамоўнага паходжання) пасля галоснай: *трыо, Анто́ніо, Більба́о, Ватэрло́о, Мантэвідэ́о;* але: *радыё.*

У аднаскладовых словах *бо, мо, то, што* заўсёды пішацца ***о***.

§ 23. У невялікай групе слоў спалучэнні ***ро, ло*** не пад націскам пераходзяць у ***ры, лы:*** *кроў — крыві, дро́вы — дрыво́тня, кро́шка — крышы́ць, бро́вы — брыво́, гром — грыме́ць, брод —*

*брысці, скрогат — скрыгатаць, глотка — глытаць, блохі — блыха.*

§ 24. Літара **э**, як правіла, пішацца толькі пад націскам. Не пад націскам на месцы літары *э* пішацца ***а:*** *цэны — цана, жэрдка — жардзіна.*

Літара э не пераходзіць у ***а*** не пад націскам у словах іншамоўнага паходжання: *рэвалюцыя, рэзідэнцыя, дэманстрацыя,* а таксама ў першай частцы складаных слоў, напрыклад: *шэравокі, рэдказубы.*

§ 25. Літара *э* ці *е* у пачатку іншамоўных слоў пішацца ў залежнасці ад агульнапрынятага літаратурнага вымаўлення: *эра, эўрыка, эпас, этыка, Эзоп, Эзель;* але: *егер, ерась, Еўропа.*

Пасля шыпячых, ***р, ц*** (не з ***т*** мяккага) і ***д, т*** пішацца толькі *э; джэмпер, чэк, шэф, прагрэс, рэбус, цэгла, канцэрт, дэфіс, тэкст, тэхніка*; пасля астатніх зычных пішацца ***е***: *бензін, метал, бетон, ветэран, гейзер, кекс, легенда.*

Аднак ёсць шэраг слоў, у якіх пасля такіх зычных пішацца *э*: *асэсар, бэз, бэлька, бэра, бэсціць, бэта* (назва літары), *вэрхал, галіфэ, зэдаль, кафэ, капэла, камізэлька, маянэз, мэр, нэндзя, пэўна, пэндзаль, пэр, пенснэ, сэнс, сэр, сэрца, сурвэтка, турнэ, турнэпс, фэст, чвэртка.*

Пасля прыстаўнога *г* пішацца *э*: *гэты, гэтакі, гэтак, гэтулькі, адгэтуль, дагэтуль, гэй.*

## Літары *е, ё, я*

§ 26. На месцы літары ***е*** ў першым складзе перад націскам пішацца ***я:*** *лес — ляснік, снег — сняжок, сцены — сцяна, Нясвіж, Пячора, Яўціхіевіч, Ярмоленка.*

**Выключэнне:** *дзевяты, дзесяты, семнаццаць, васемнаццаць* і вытворныя ад іх.

Ва усіх астатніх складах як перад, так і пасля націску пішацца ***е:*** *верабей, восень, поезд.*

**Заўвага.** Ва ўласных імёнах, імёнах па бацьку і прозвішчах пачатковае ***я*** захоўваецца незалежна ад месца націску: *Яўтух — Яўтуха, Ярмак — Ярмака.*

У словах іншамоўнага паходжання ***е*** захоўваецца ва ўсіх складах: *дэлегат, легенда, калектыў.* Выключэнне складаюць даўно запазычаныя словы: *гандаль, каляндар, літаратура, рамонт, сяржант* і некаторыя іншыя, якія падпарадкоўваюцца агульным правілам акання.

§ 27. Літара *ё*, як правіла, бывае толькі пад націскам, калі ж націск пры змене слова пераходзіць на іншы склад, то ў першым складзе перад націскам на месцы ***ё*** пішацца ***я***, а ў астатніх складах як перад націскам, так і пасля націску на месцы ***ё*** пішацца ***е***: *сёлы — сяло́, вёдры — вядро́, сёстры — сястра́ — сестрыны́.*

## Літары *і, й, ы*

§ 28. Словы са збегам зычных, першай з якіх з'яўляецца плаўная *л* або ***р***, пішуцца з прыстаўным ***і*** або без яго: *іржа* і *ржа, іржышча* і *ржышча, ілгаць* і *лгаць, ільнавод* і *льнавод* і г. д. Каб не памыліцца пры напісанні, трэба помніць, што без прыстаўнога ***і*** гэтыя словы пішуцца толькі ў тым выпадку, калі папярэдняе слова канчаецца на галосную і яно не аддзелена знакам прыпынку. Ва ўсіх іншых выпадках, г. зн. пасля зычнай папярэдняга слова, пасля знака прыпынку або ў самым пачатку тэксту, у такіх словах пішацца прыстаўная літара ***і***: *іржой пакрылася жалеза;* але: *жалеза пакрылася ржой, на нараду сабраліся аграномы, заатэхнікі, ільнаводы;* але: *нарада льнаводаў; араць іржышча;* але: *заворанае ржышча.*

**Заўвага 1.** Словы *лоб, лёд, лён* могуць мець прыстаўную літару ***і*** ва ўсіх склонах, акрамя назоўнага і вінавальнага (а слова *леў* і ў вінавальным склоне) адзіночнага ліку: *лён, ільну (льну), ільну (льну), лён, ільном (льном), аб ільне (льне), ільны (льны), ільноў (льноў), ільнам (льнам), ільны (льны), ільнам (льнамі), аб ільнах (льнах).*

**Заўвага 2.** Словы са збегам зычных, першай з якіх з'яўляецца літара *м*, ва ўсіх выпадках пішуцца з прыстаўным ***і***: *імгла, імчаць, імшара.*

**Заўвага 3.** Прыстаўное ***і*** не пішацца пасля галоснай у сярэдзіне слова: *заржавець, памкнуцца, вокамгненна.*

§ 29. На месцы ***і*** пішацца ***ы***, калі прыстаўка канчаецца на зычную: *сыграць, сыскаць, абымшэлы, абыржавець, абысці, надышоў, узышоўшы, разысціся.*

Аднак галосная ***і*** захоўваецца пасля прыставак і часціц ***між-, звыш-, пан-, суб-, транс-, контр-***: *міжірыгацыйны, звышімклівы, панісламізм, субінспектар, контрігра.*

§ 30. Пасля прыставак, што канчаюцца на галосную, пачатковае карэннае ***і*** скарачаецца: *зайсці, знайсці, прыйсці, выйсці, увайсці, перайсці; зайшоў, знайшоў, прыйшоў, выйшаў, увайшоў, перайшоў* і г. д.; але: *заікацца, заіскрыцца, заінтрыгаваць, заінець.*

## Літары *у* і *ў*

§ 31. Літара *у* пішацца:

1. У пачатку слова, калі гэтым словам пачынаецца сказ: *Узмахам арлiным няма перашкоды* (Колас).

2. У пачатку слова, калі гэта слова стаіць пасля зычнай або знака прыпынку: *Ад ураджаю ломіцца гумно* (Панчанка); *Сякера, як маланка, узвілася ў дзедавых руках* (Колас).

3. У сярэдзіне або на канцы слова пасля зычнай: *жураві- ны, бульбянік, зарунець, дашчэнту.*

4. У пачатку ўласных імён: *Уладзімір, Уладзівасток, Урэчча, Унеча.*

5. У пачатку іншамоўных слоў: *універсітэт, універмаг, уверцюра.*

6. У сярэдзіне іншамоўных слоў, калі *у* утварае самастойны склад: *прэзідыум, калёквіум, фауна.*

§ 32. Літара *ў* пішацца:

1. У пачатку слова, калі папярэдняе слова канчаецца на галосную і паміж гэтымі словамі няма знака прыпынку: *Рака ўвайшла ў берагі.*

2. У сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі або літарамі ***е, ё, я, ю, і,*** калі апошнія вымаўляюцца раздзельна з папярэдняй часткай слова: *наўздагон, заўважыць, саўю, саўеш, салаўя, салаўі.*

3. У канцы слова пасля галосных: *пісаў, чытаў, зноў.*

4. Пачатковае *у* не скарачаецца ў асабовых імёнах людзей і ўласных геаграфічных назвах: *Марыя Ульянава, Уладзімір Маякоўскі; рака Урал, на Украіне.*

## Іншамоўныя злучэнні галосных

§ 33. Злучэнне ***іо*** ў пачатку слова пад націскам перадаецца праз ***іо,*** а не пад націскам праз ***іа:*** *іón, Іóсіф, іанізáцыя, Іанíчнае мóра, Іаáн.* Гэта ж злучэнне ў сярэдзіне слова пад націскам перадаецца праз ***іё (ыё),*** а не пад націскам праз ***ія (ыя):*** *аксіёма, біёлаг, патрыёт, рацыён, стадыён; бібліятэ́ка, піянéр, рацыяналізáцыя, патрыяты́зм,* у канцы слова — праз ***іо (ыо):*** *Тóкіо, Ры́о-дэ-Жанéйра, рáцыо,* але: *рáдыё.*

Калі злучэнне ***іо*** вымаўляецца як адзін склад, прычым раздзельна з папярэднім зычным, то яно перадаецца пад націскам і ў канцы слоў праз ***ьё:*** *мільён, трыльён, шампіньён, Эскамільё;* пасля ***б, п, в, ф, м, г, к, х, д, т, р*** і шыпячых — праз ***'ё:*** *Верóк'ё.*

У сярэдзіне слоў не пад націскам гэта злучэнне павінна перадавацца праз **'я**.

Злучэнне ***йо*** звычайна пад націскам і ў канцы слоў перадаецца праз ***ё***, а не пад націскам праз ***я***: *ёд, ёт, ёг, раён, Гюё, маянэз, раяніраванне, Áльварэс дэль Ваё, Агаё.* У пачатку ўласных імён і геаграфічных назваў злучэнне ***йо*** пад націскам захоўваецца: *Йóжэф, Нью-Йóрк,* не пад націскам перадаецца праз ***йа***: *Йагáнсен.*

§ 34. Злучэнне ***іа*** перадаецца праз ***ія (ыя)***: *авіяцыя, энтузіязм, піяніст, сацыялізм, дыяметр.*

Калі гэта злучэнне вымаўляецца як адзін склад, прычым раздзельна з папярэднім зычным, то яно перадаецца праз ***ья***: *мільярд,* а пасля ***б, п, в, ф, м, г, к, х, д, т, р*** і шыпячых — праз ***'я***: *Рэйк'явік.*

Злучэнне ***йа*** пасля галосных перадаецца праз ***я***: *Савóя, Малáя, Мáя.*

§ 35. Злучэнне ***іе*** перадаецца праз ***іе (ые)***: *гігіéна, абітурыéнт, ієрáрхія, Іерусалім.*

Злучэнне ***йе*** пасля галосных перадаецца праз ***е***: *праéкт, канвéер, траектóрыя, фаé, Феербáх;* пасля зычных — праз ***ье, 'е***: *рэльéф, ранцьé, канферансьé, Лавуазьé, п'éса, аб'éкт, прэм'éра, Альф'éры, Ваян-Куцюр'é, Буш'é.*

§ 36. Злучэнне ***йі*** ва ўсіх выпадках захоўваецца без змены: *Байі, Рэмійі.*

## Галосныя ў некаторых суфіксах

§ 37. Трэба адрозніваць суфіксы ***-ак, -очак (-ачак)*** ад суфіксаў ***-ык, -чык***. Галосная ***а*** ў суфіксах ***-ак, -очак (-ачак)*** пры скланенні назоўнікаў выпадае: *сшытак — сшытка, парадак— парадку, каласочак — каласочка, сшытачак — сшытачка,* галосная ж ***ы*** ў суфіксах ***-ык, -чык*** застаецца: *ножык — ножыка, дожджык — дожджыку, каменьчык — каменьчыка.*

§ 38. Суфікс ***-ічк-(-ычк-)*** трэба адрозніваць ад суфікса ***-ечк- (-ачк-)***. Суфікс ***-ічк- (-ычк-)*** пішацца ў назоўніках жаночага роду, якія ўтварыліся ад слоў з суфіксам ***-іц- (-ыц-)***: *сястрыца — сястрычка, мыльніца — мыльнічка.* У іншых выпадках пішацца суфікс ***-ечк- (-ачк-)***: *дзядзька — дзядзечка, Наташа — Наташачка.*

§ 39. Трэба помніць, што суфікс ***-ец (-ац)*** пішацца ў назоўніках мужчынскага роду *(пуцеец, гвардзеец)*, а суфікс ***-іц- (-ыц-)*** пішацца ў назоўніках жаночага роду *(лесвіца, лáсіца, старыца).*

§ 40. У суфіксе ***-еньк-*** пасля зацвярдзелых зычных на месцы ***е*** пішацца ***а***: *беленькі, цёпленькі; добранькі, харошанькі.*

§ 41. З дапамогай суфікса ***-ян-*** утвараюцца дзеепрыметнікі ад дзеясловаў на ***-яць:*** *сеяць — сеяны, веяць — веяны, страляць— страляны, згуляць — згуляны,* а з дапамогай суфікса ***-ен- (-ан-)*** — ад дзеясловаў на ***-іць, -ці:*** *зрабіць — зроблены, купіць — куплены, знасіць — зношаны, скасіць — скошаны, завесці — заведзены.*

§ 42. Дзеясловы, якія ў першай асобе адзіночнага ліку канчаюцца на ***-ую (-юю)***, у неазначальнай форме і форме прошлага часу маюць суфікс ***-ава- (-ява-):*** *галасую — галасаваць, галасаваў; камандую — камандаваць, камандаваў; пакутую — пакутаваць, пакутаваў; даследую — даследаваць, даследаваў; малюю — маляваць, маляваў.*

Калі ж дзеясловы ў першай асобе адзіночнага ліку канчаюцца на ***-ваю***, то ў неазначальнай форме і ў форме прошлага часу яны маюць суфікс ***-ва-:*** *адказваю — адказваць, адказваў; выконваю — выконваць, выконваў.*

У дзеясловах са збегам зычных перад суфіксам замест ***-ва-*** пішацца суфікс ***-іва- (-ыва-):*** *падтрымліваю — падтрымліваць, падтрымліваў; падкрэсліваю — падкрэсліваць, падкрэсліваў.*

§ 43. Калі дзеяслоў у закончаным трыванні канчаецца на ***-іць*** з папярэдняй галоснай, то ў незакончаным трыванні ***і*** пераходзіць у ***й***: *засвоіць — засвойваць, загаіць — загойваць.*

## ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ

§ 44. У прыстаўках **з-**, ***уз-***, ***раз- (роз-)***, ***без- (бяз-)***, ***цераз-*** перад глухімі зычнымі замест ***з*** пішацца ***с:*** *ссыпаць, ссадзіць, схапіць, усхваляваць, раскідаць, роспіс, беспераспанку, бясспрэчна, цераспалосіца.*

Прыстаўка ***з-*** перадаецца праз ***с-*** і перад галоснымі ***а***, ***о***, ***у:*** *сагнаць, садзьмуць, сослепу, сосмеху, суняць, сурочыць,* а таксама перад ненаціскным ***і***, якое пераходзіць пасля прыстаўкі ў ***ы:*** *сыгра́ць, сыска́ць, сыхо́дзіцца.*

**Заўвага**. У словах, утвораных ад дзеяслова *ісці,* прыстаўка ***з-*** або ***с-*** пішацца ў залежнасці ад значэння слова: *сышоў, сыходзіць* (з ганка); але: *зыходзіць* (з меркаванняў).

§ 45. Зычныя ***д***, ***т***, стаўшы перад галоснымі ***е***, ***ё***, ***і***, ***ю***, ***я*** і перад мяккім ***в***, пераходзяць у мяккія ***дз*** і ***ц***: *люд — людзі, лета — леце, мяту — мяцеш, выток — выцякаць, два — дзве, двухсот — дзвесце.*

Прыставачнае *д* і суфіксальнае *г* перад мяккім *в* захоўваюцца: *адвесці, адведаць, у таварыстве, у грамадстве, на брытве.*

§ 46. У словах іншамоўнага паходжання ***д, т*** захоўваюцца нязменна. Пры гэтым галосныя ***е, і, ю*** пасля ***д, т*** перадаюцца адпаведна галоснымі ***э, ы, у:*** *дэлегат, дырэктыва, матэрыял, тыраж, авантура.*

Аднак перад суфіксамі і злучэннямі суфіксальнага паходжання ***-ін-, -ір-, -ёр-, -еец-, -ейск-,*** а таксама перад памяншальным суфіксам ***-ік- д, т*** перадаюцца праз ***дз, ц:*** *карціна, плаціна, лацінскі, камандзір, камандзіроўка, білецёр, гвардзеец, індзейскі, білецік;* але: *латынь.*

**Заўвага.** Неабходна запомніць, як пішуцца словы *дзюна, дзюшэс, арцэль, бардзюр, эцюд, цюль, цітр, нацюрморт, уверцюра, накцюрн, цюркскі, цюльпан.*

§ 47. У імёнах уласных пішуцца ***д, т*** ці ***дз, ц*** у залежнасці ад таго, што чуецца ў вымаўленні: *Дзяніс, Дзюкло, Дзмітэрка, Гарыбальдзі, Дзясна, Дзвіна, Барадзіно, Уладзівасток, Градзянка, Плоўдзіў, Ціхан, Хрысціна, Цёркін, Ціханаў, Ціміразеў, Ціта, Вучэціч, Целяханы, Ціхвін, Быцень, Закарпацце, Церак, Цюмень, Цянь-Шань, Цяньцзінь, Цюрынгія, Поці, Таіці, Гаіці, Тэкля, Тэвасян, Тэкерэй, Тэльман, Атэла, Шаптыцкі, «Юманітэ», Дадэ, Дэфо, дэ Бальзак, Дэтройт, Літвінаў, Мардвінаў.*

§ 48. Падоўжанае вымаўленне зычных ***ж, з, л, н, с, ц, ч, ш*** паміж галоснымі перадаецца на пісьме падваеннем адпаведных літар: *збожжа, маззю, галлё, карэнне, двукоссе, смецце, ламачча, зацішша.* Падоўжанае вымаўленне ***дз*** на пісьме перадаецца праз ***ддз:*** *суддзя, разводдзе.*

§ 49. Падваенне зычных у словах іншамоўнага паходжання ў беларускай мове не перадаецца: *каса, група, калектыў, граматыка, карэспандэнт.* Выключэнне складаюць словы: *ванна, манна, бонна, панна, Мекка, мецца, дурра* (расліна), а таксама некаторыя імёны і прозвішчы.

§ 50. У агульных для рускай і беларускай моў словах са злучэннямі ***здн, рдц, стн, стл, лнц*** паводле норм беларускага літаратурнага вымаўлення зычныя ***д, т, л*** у гэтых злучэннях выпадаюць і на пісьме не адлюстроўваюцца: *позна, сэрца, міласэрны, косны* (мозг), *слаць* (пасцель), *сонца.*

**Заўвага.** У прыметніках, утвораных пры дапамозе суфікса ***-н-*** ад назоўнікаў іншамоўнага паходжання з канцавым ***ст,*** злучэнне ***стн*** захоўваецца без змены: *баласт — баластны, фарпост — фарпостны, аванпост — аванпостны, кампост — кампостны, кантраст — кантрастны.*

§ 51. Злучэнне ***дт*** на канцы слоў іншамоўнага паходжання перадаецца праз ***т***: *фарштат, Гумбальт, Кранштат.*

§ 52. Калі прыстаўка канчаецца той жа зычнай, якой пачынаецца корань слова, то гэта падваенне на пісьме захоўваецца: *аддаць, раззбраенне, рассыпаць, бяссонніца.*

**Выключэнне**: *расада, расол, расольнік.*

§ 53. Злучэнне ***сч*** на стыку прыстаўкі і кораня, як правіла, захоўваецца без змены: *расчыніць* (дзверы), *расчапіць* (кручкі), *усчаць* (гаворку). Трэба адрозніваць ***сч*** у гэтых словах ад ***сшч*** у словах *расшчапіць* (на дзве часткі), *расшчапленне* (ядра).

**Выключэнне**: *рошчына, шчасце, ушчуваць, нішчымны* і вытворныя ад іх.

§ 54. Калі корань слова канчаецца зычнай ***н***, а суфікс пачынаецца з ***н***, то на пісьме падваенне захоўваецца: *восень — асенні, корань — карэнны, перамена — пераменны, рэмень — раменны, дзень — дзённік.*

§ 55. У прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на ***-мя***, і вытворных ад гэтых прыметнікаў словах пішацца ***нн***: *племя — племянны — пляменнік, імя — імянны — займеннік, стрэмя — страмянны, цемя — цемянны;* але: *полымя — палымяны.*

§ 56. Злучэнні ***кс, тс, цс, чс***, якія ўтвараюцца на стыку кораня і суфікса або двух суфіксаў, перадаюцца праз ***ц***: *савет+скі — савецкі, мастак+скі — мастацкі, славак+скі — славацкі, кравец+скі — кравецкі, ткач+скі — ткацкі.*

**Заўвага**. У геаграфічных назвах іншамоўнага (неславянскага) паходжання і вытворных ад іх словах злучэнне ***кс*** захоўваецца: *узбекскі, таджыкскі.*

§ 57. Злучэнні ***сс, жс, шс*** на стыку кораня і суфікса перадаюцца праз адно ***с***: *беларус+скі — беларускі, таварыш+скі — таварыскі, множ+ства — мноства, пташ+ства — птаства.*

§ 58. У геаграфічных назвах і вытворных ад іх словах зычныя кораня ***з, ш, ж, г, х*** з суфіксальным ***с*** не зліваюцца у адно ***с***, а захоўваюцца: *каўказскі, нясвіжскі, латышскі, выбаргскі, казахскі.* Зычныя ***г, х*** пры гэтым часам могуць чаргавацца з ***ж, ш***: *старадарожскі* (Старыя Дарогі), *чэшскі* (чэх).

§ 59. Злучэнне ***дс*** на стыку кораня і суфікса на пісьме перадаецца нязменна: *грамадства, параходства, наўгародскі, гарадскі.*

§ 60. У назоўніках, утвораных ад назоўнікаў на ***-ск, -цк*** або ад прыметнікаў на ***-скі, -цкі*** пры дапамозе суфікса ***-ын***, пішацца ***шч*** або падвойнае ***ч***: *Віцебск — Віцебшчына, Слуцк — Случчына, лагойскі — Лагойшчына, турэцкі — Турэччына.* Калі ж прыметнік на ***-цкі*** ўтвараецца ад назоўніка з канцавым

зычным *г*, то ў назоўніках, утвораных ад такіх прыметнікаў, перад суфіксам ***-ын*** пішацца ***тч***: ***Брэст — брэсцкі — Брэстчына****, стары свет — старасвецкі — старасветчына.*

§ 61. У зваротнай форме інфінітываў і дзеясловаў трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку пішацца падвойнае ***ц***: *вучы́цца, ву́чыцца, ву́чацца.* Падвойнае ***ц*** пішацца таксама ў лічэбніках *адзінаццаць, дванаццаць, трынаццаць, чатырнаццаць, пятнаццаць, шаснаццаць, семнаццаць, васемнаццаць, дзевятнаццаць, дваццаць, трыццаць,* акрамя гэтага, на канцы асноў у формах творнага склону гэтых лічэбнікаў: *адзінаццаццю, дванаццаццю* і г. д.

§ 62. Пры дапамозе суфіксаў ***-чык, -чыц(а)*** і ***-шчык, -шчыц(а)*** утвараюцца назоўнікі, што абазначаюць асобу чалавека па роду дзейнасці. Суфіксы ***-чык, -чыц(а)*** пішуцца, калі корань слова канчаецца на ***д, т, з, с, ж, ч***: *дакладчык, лётчык, возчык, перапісчык, перабежчык.* Суфіксы ***-шчык, -шчыц(а)*** пішуцца, калі корань слова канчаецца на губныя ***б, п, ф, в (ў)*** або санорныя ***м, н, р, л*** і ***й***: *бетоншчык, зборшчык, забойшчык, мадэльшчык, перакупшчык.*

§ 63. Прыстаўное ***в*** пішацца:

1. Перад пачатковым карэнным ***у***: *вугал, вугаль, вуда, вудзільна, вуліца, вус, вусаты, вусны, вучань, вучыцца, вуха, вушанка:* перад карэнным ***у*** пасля прыстаўкі: *абвугліванне, вывудзіць, завулак, завуголле, навучанне, навушнікі, папрывучаць, невуцтва.*

**Заўвага**. Неабходна запомніць напісанне слоў *павук, павуцінне,* а таксама некаторых уласных імён: *Навум, Тадэвуш, Матэвуш.*

2. Перад пачатковым націскным ***о***: *во́зера, во́ка, во́пыт, во́крык, во́ддаль, во́бласць, во́льха, во́сень, во́спа, во́страў, во́браз, во́бземлю;* перад націскным ***о*** пасля прыстаўкі: *заво́чна, уво́сень, уво́гуле* (але: *нао́гул, о́каць),* у словах *вако́л, вако́ліца, навако́лле.*

Калі ж націск сыходзіць з ***у*** і на яго месцы становіцца ***а***, то прыстаўное ***в*** не пішацца: *во́кны — акно́, во́льха — альхо́вы, во́сень — асе́нні, во́страў — астравы́.* У словах *во́ка, во́стры* захоўваецца прыстаўное ***в*** ва ўсіх формах незалежна ад націску: *во́ка — вачэ́й, во́стры, — вастры́ць — навастры́ць.*

3. У сярэдзіне некаторых імён перад націскным ***о***: *Лявóн, Радзівóн, Селівóн.*

§ 64. Прыстаўное ***в*** не пішацца:

1. Перад пачатковым ***у*** ў словах іншамоўнага паходжання і ўласных імёнах: *універсітэт, універсальны, унікальны, урна; Ульяна, Ульянаў, Ула, Умань, Урал, Украіна.*

2. Перад *у* прыставачным або перад *у*, якое развілося з ***в:*** *увага, угнаенне, удвух, удзел, умова, урад, ураджай, участак, узгорак, узмор'е, улада, унук, уюн.*

3. Перад пачатковым націскным ***о*** ў словах іншамоўнага паходжання і ўласных імёнах (акрамя тых выпадкаў, калі беларускае слова — агульная назва выступае як імя ўласнае): *óда, óмуль, óнікс, óпера, óпіум, óптыка, óпус, óрган, óрдэн, óрдэр, Осла, Омск, Óрша;* але: *Во́зера* (назва вёскі), *Во́гненная Зямля.*

## ПРАВАПІС МЯККАГА ЗНАКА І АПОСТРАФА

### Змякчальны мяккі знак

§ 65. Мяккі знак пішацца:

1. На канцы слова пасля мяккага зычнага: *дзень, соль, мазь, восьь, глядзець, вудзіць, дзесяць, трыццаць.*

2. У сярэдзіне слова пасля мяккага зычнага перад цвёрдым: *бацька, дзядзька, пісьмо, Кузьма, вязьмо.*

3. У сярэдзіне слова пасля мяккага зычнага перад мяккім, які пры змене слова можа станавіцца цвёрдым: *барацьбе — барацьба, цьмяны — цьма, пісьменнік — пісьмо.*

§ 66. Мяккі знак пішацца пасля мяккага зычнага ў дзеясловах загаднага ладу:

1. На канцы ў другой асобе адзіночнага ліку: *стань, глянь, сядзь.*

2. Перад канчаткам ***-ма*** ў першай асобе множнага ліку: *станьма, гляньма, сядзьма.*

3. Перад канчаткам ***-це*** ў другой асобе множнага ліку: *станьце, гляньце, сядзьце.*

4. Перад зваротнай часціцай ***-ся*** ў другой асобе адзіночнага ліку: *кінься, агледзься.*

§ 67. Мяккі знак пішацца ў складаных лічэбніках *пяцьдзесят, шэсцьдзесят, пяцьсот, шэсцьсот, дзевяцьсот* і ў часціцы ***-сьці,*** якая ўваходзіць у састаў слоў: *хтосьці, штосьці, дзесьці, якісьці,* а таксама ў слове *ледзьве.*

§ 68. Мяккі знак таксама пішацца:

1. Пасля мяккага ***л*** перад зычным: *кольцы, пальцы, колькі, столькі, вельмі, сельскі, лепельскі.*

2. Пасля мяккага ***н*** перад суфіксам ***-к-;*** *песенька, вішанька.*

3. Пасля мяккага ***н*** перад суфіксам ***-чык,*** калі слова без суфікса ***-чык*** канчаецца мяккім знакам: *камень — каменьчык, прамень — праменьчык, агонь — агеньчык.*

4. Пасля мяккага ***н*** перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў: *студзеньскі, снежаньскі, чэрвеньскі.*

5. У суфіксах ***-еньк-, -аньк-, -эньк-:*** *маленькі, старэнькі, прыгожанькі.*

§ 69. Мяккі знак не пішацца:

1. Пасля ***ж, дж, ч, ш, р, ц*** (не з ***т*** мяккага), ***д, т,*** а таксама пасля ***б, п, м, в, ф.***

2. Пасля **з, *с, ц, дз*** перад мяккімі зычнымі, калі пры змене слова або пры замене яго другім словам таго ж кораня гэтыя мяккія зычныя не могуць стаць цвёрдымі: *звер, свет, дзверы;* але: *носьбіт.*

3. Паміж падоўжанымі зычнымі: *калоссе, ралля, насенне, Палессе, маззю.*

4. Перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на ***-нь:*** *конь — конскі, Казань — казанскі, Любань — любанскі;* але: *чэрвень — чэрвеньскі.*

## Раздзяляльныя апостраф і мяккі знак

§ 70. Апостраф пішацца:

1. Паміж прыстаўкай, якая канчаецца на зычную, і коранем, які пачынаецца з галоснай ***е, ё, ю, я*** або націскнога ***і:*** *ад'езд, пад'ём, раз'юшаны, аб'ява, аб'інець, між'ярусны,* а таксама пасля прыстаўкі ***з-*** у словах: *з'араць, з'імправізаваць, з'імшыць* і вытворных ад іх.

2. Губныя ***б, п, в, ф, м,*** глухія ***г, к, х,*** шыпячыя ***ж, дж, ч, ш,*** цвёрдыя ***д, т*** і ***р*** аддзяляюцца ад наступнай галоснай ***е, ё, ю, я*** і націскнога ***і*** апострафам: *сям'я, куп'ё, саф'ян, куп'істы, Лук'янаў, надвор'е, Буш'е, В'етнам.*

Мяккі знак пішацца:

3. Пасля зычных **з, *дз, л, н, с, ц*** (з мяккага ***т***) перад ***е, ё, ю, я, і*** ў словах іншамоўнага паходжання: *марсельеза, мільён, мільярд, мадзьяр, парцьеры, каньён, канферансье, Лавуазье, Цьер.*

4. Ва ўласных імёнах, утвораных ад імён на ***-ій,*** пасля зычных ***л, с, ц, дз, н, з*** перад суфіксальным ***-еў- (-ев-):*** *Васільеў, Васільевіч, Васільеўна, Арсеньеў, Арсеньевіч, Афанасьеў, Афанасьевіч, Кандрацьеў, Кандрацьевіч, Аркадзьеў, Аркадзьевіч.*

**Заўвага.** Пасля **г, *к, х*** і збегу зычных, акрамя ***нц,*** перад суфіксальным ***-еў- (-ев-)*** пішацца **і *(ы):*** *Георгіеў, Георгіевіч, Акакіевіч, Яўціхіеў, Іракліевіч, Яўлампіевіч, Ануфрыеў, Ануфрыевіч, Дзмітрыеў, Дзмітрыевіч;* але: *Вікенцьеў, Вікенцьевіч, Кліменцьеў, Кліменцьевіч.*

## ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ

§ 71. Назоўнікі першага скланення з цвёрдай асновай у давальным і месным склонах адзіночнага ліку маюць канчатак ***-е:*** *сцяна — сцяне, хата — хаце, вада — вадзе, губа — губе;* у тым ліку імёны жанчын: *Ганна — Ганне, Агата — Агаце,* а таксама прозвішчы, якія ўтварыліся ад агульных назоўнікаў жаночага роду: *Крапіва́ — Крапіве́, Скары́на — Скары́не.*

Назоўнікі гэтага ж скланення, што абазначаюць імёны мужчын, у давальным і месным склонах пад націскам маюць канчатак ***-е,*** а не пад націскам — ***-у:*** *Кузьма́ — Кузьме́, Фама́ — Фаме́, Міко́ла — Міко́лу, Мікі́та — Мікі́ту.*

Канчатак ***-е*** маюць назоўнікі з асновай на ***г, х:*** *нага — назе, страха — страсе.*

Назоўнікі ж з асновай на ***к*** маюць пад націскам канчатак ***-э:*** *рука́ — руцэ́, талака́ — талацэ́,* а не пад націскам — канчатак ***-ы:*** *лы́жка — лы́жцы, спартсменка — спартсменцы.*

**Заўвага.** Назоўнікі мужчынскага роду з асновай на ***к*** у давальным і месным склонах маюць канчатак ***-у:*** *ба́цька — ба́цьку, саба́ка — саба́ку.*

Назоўнікі з асновай на ***г, х,*** што абазначаюць імёны і прозвішчы, у давальным і месным склонах адзіночнага ліку маюць канчаткі ў жаночым родзе ***-е,*** у мужчынскім родзе ***-у:*** *Саладуха — Саладусе, Саладуху, Кніга — Кнізе, Кнігу.*

Такія ж назоўнікі з асновай на ***к*** у жаночым родзе маюць канчатак ***-ы,*** у мужчынскім родзе ***-у:*** *Мурашка — Мурашцы, Мурашку, Трапашка — Трапашцы, Трапашку.*

Прозвішчы, якія ўтварыліся ад агульных назоўнікаў ніякага роду або ад назоўнікаў, род якіх выразна не выступае, скланяюцца толькі ў тым выпадку, калі носьбітамі іх з'яўляюцца асобы мужчынскага полу. У давальным і месным склонах такія назоўнікі маюць канчатак ***-у:*** *Купала — Купалу, Пічэта — Пічэту, Глебка — Глебку, Сапега — Сапегу, Чабоха — Чабоху.*

§ 72. Назоўнікі першага скланення з асновай на шыпячыя і ***р*** у давальным і месным склонах адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ы:*** *сажа — сажы, круча — кручы, нара — нары,* а назоўнікі з мяккай асновай маюць канчатак ***-і:*** *зямля — зямлі, свіння — свінні.* Такія ж канчаткі маюць і прозвішчы, утвораныя ад агульных назоўнікаў першага скланення жаночага роду: *Гушча — Гушчы, Зязюля — Зязюлі.*

Прозвішчы на *-еня (-эня, -аня), -уня (-юня)* у давальным і месным склонах маюць канчатак *-і: Гальчэня — Гальчэні, Шабуня — Шабуні, Варвашэня — Варвашэні.*

§ 73. Назоўнікі жаночага роду з асновай на збег зычных, апошняя з якіх суфіксальнае *-к,* у родным склоне множнага ліку маюць чыстую аснову: *авечка — авечак, іголка — іголак, ножка — ножак, вешалка — вешалак.* Пры збегу іншых зычных у аснове назоўнікі гэтага роду маюць канчаткі *-аў, -яў: вярба — вербаў, коўдра — коўдраў, кафедра — кафедраў, торба — торбаў;* але: *форм, норм, ферм, фірм.*

Назоўнікі жаночага роду, якія ў назоўным склоне адзіночнага ліку маюць аснову на *й,* у родным склоне множнага ліку канчаюцца на *-ій (-ый), -ей (-эй): акадэмія — акадэмій, біяграфія — біяграфій, дэлегацыя — дэлегацый, рэвалюцыя — рэвалюцый, падзея — падзей, траншэя — траншэй.*

§ 74. Назоўнікі другога скланення мужчынскага роду ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак або *-а (-я)* або *-у (-ю).*

З канчаткам *-а (-я)* пішуцца:

1. Назоўнікі, што абазначаюць жывыя прадметы або што намі ўспрымаюцца як жывыя прадметы: *студэнта, арла, Івана, Апалона, д'ябла, канібала.*

2. Назоўнікі, што абазначаюць нежывыя, але непадзельныя прадметы, г. зн. такія, частка якіх не можа называцца імем цэлага прадмета: *дома, камбайна, пяра, кажуха, клёна* (у значэнні адзінкавай расліны), *каменя* (у значэнні адзінкавяга прадмета), *пальца.*

3. Назоўнікі, што абазначаюць назвы ўстаноў, грамадскіх і гаспадарчых арганізацый, прадпрыемстваў, населеных пунктаў, вайсковых падраздзяленняў і часцей: *атрада, калгаса, завода, Мінска, горада, палка, батальёна.*

4. Назоўнікі, што абазначаюць адзінкі розных вымярэнняў: *метра, грама, пуда, літра, гектара, рубля, франка, долара, года, века* (толькі ў значэнні "сто гадоў"), *месяца, верасня, тыдня, дня, ампера, вольта, кулона.*

5. Назоўнікі, што абазначаюць назвы танцаў, гульняў, геаметрычных цел і фігур, і ўсе іншыя назоўнікі, што абазначаюць непадзельныя паняцці навуковага, спартыўнага і іншага характару: *вальса, балета, футбола, куба, квадрата, круга, косінуса, азімута, батута, гола.*

§ 75. З канчаткам *-у (-ю)* пішуцца:

1. Назоўнікі, што абазначаюць зборныя прадметы, матэрыял, рэчывы і наогул прадметы, часткі якіх можна назваць імем цэлага прадмета: *лесу, дубу* (у значэнні зборнага прадмета або ў значэнні матэрыялу), *пяску, гіпсу, цэменту, азону, алюмінію, ангідрыду, туману, лёду, крупніку, гуляшу, ячменю.*

**Выключэнне**: *аўса, хлеба.*

2. Назоўнікі, што абазначаюць прасторавыя паняцці: *лугу, выгану, папару, лесастэпу.*

**Заўвага**. Назоўнікі з памяншальным значэннем, утвораныя ад зборных прасторавых і прасторавых, пішуцца з канчаткам ***-а:*** *садка, ляска, лужка, беражка; садочка, лясочка, лужочка, беражочка.*

3. Назоўнікі, што абазначаюць разумовыя паняцці, грамадскія фармацыі, навуковыя тэорыі, грамадскія і навуковыя плыні, розныя адчуванні, дзеянні, працэсы, стан, уласцівасці: *розуму, аб'ёму, поспеху, настрою, патрыятызму, матэрыялізму, капіталізму, імперыялізму, смаку, плачу, болю, жалю, бегу, смутку, смеху, страху, крыку, сну, спакою.*

4. Назоўнікі, што абазначаюць з'явы прыроды: *ветру, віхру, грому, марозу, змроку.*

§ 76. Назоўнікі другога скланення мужчынскага роду з цвёрдай асновай, што абазначаюць асобу чалавека, уласныя імёны і прозвішчы людзей, у месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-е:*** *партызан — аб партызане, брат — аб браце, Якуб — аб Якубе, Чэхаў — аб Чэхаве.*

§ 77. Назоўнікі другога скланення мужчынскага роду з мяккай асновай і асновай на ***й***, што абазначаюць асобу чалавека, уласныя імёны і прозвішчы, у месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ю:*** *каваль — аб кавалю, Міхась — аб Міхасю, Васіль — аб Васілю, Гогаль — аб Гогалю, Мікалай — аб Мікалаю.*

Канчатак ***-у*** маюць падобныя назоўнікі з асновай на ***г, к, х,*** шыпячыя і ***р, ц:*** *настаўнік — аб настаўніку, дзеяч — аб дзеячу, качагар — аб качагару, Алег — аб Алегу, Мележ — аб Мележу, Гайдар — аб Гайдару, Кобец — аб Кобецу.*

§ 78. Назоўнікі трэцяга скланення ў творным склоне адзіночнага ліку пры зацвярдзелай аснове маюць канчатак ***-у,*** пры мяккай аснове ***-ю.*** Пры гэтым апошні зычны асновы, калі ён стаіць пасля галоснага, падаўжаецца: *мышшу, ноччу, веліччу, граззю, арцеллю.*

Назоўнікі з асновай на ***р,*** губныя ***б, п, в, ф, м*** і ***ў*** у творным склоне маюць таксама канчатак ***-ю,*** але зычныя асновы не падвойваюцца: *глыб'ю, Об'ю, Свір'ю, кроўю.*

§ 79. У родным склоне множнага ліку назоўнікі трэцяга скланення маюць канчаткі ***-ей, -эй:*** *арцелей, пячэй, народнасцей.*

§ 80. У назоўнікаў тыпу *селянін, мінчанін* пры ўтварэнні множнага ліку ***-ін*** выпадае: *сяляне, мінчане, армяне, славяне, грамадзяне.*

§ 81. Прозвішчы на ***-аў (-оў), -еў (-ёў), -ін, -ын*** у творным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ым:*** *Куляшоў — Куляшовым, Лявонцьеў — Лявонцьевым, Селязнёў — Селязнёвым, Шамякін — Шамякіным.*

**Заўвага.** У іншамоўных прозвішчах на ***-ін, -ын, -аў, -оў*** у творным склоне адзіночнага ліку пішацца канчатак ***-ам:*** *Дарвін — Дарвінам, Чаплін — Чаплінам, Бюлаў — Бюлавам.*

Геаграфічныя назвы з гэтымі суфіксамі ў творным склоне маюць канчатак ***-ам, -ом:*** *пад Барысавам, за городам Жлобінам, пад Ціхвінам, Барадзіном.*

§ 82. Прыметнікі мужчынскага і ніякага роду з мяккай асновай у давальным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-яму:*** *летняму, асенняму.* Гэтыя ж прыметнікі ў творным склоне адзіночнага ліку жаночага роду маюць канчатак ***-яй (-яю):*** *летняй (летняю), асенняй (асенняю).*

§ 83. Лічэбнікі *дзве, абедзве* ва ўскосных склонах захоўваюць мяккую аснову: *дзвюх, абедзвюх; дзвюм, абедзвюм; дзвюма, абедзвюма; аб дзвюх, аб абедзвюх.*

§ 84. У колькасных састаўных лічэбніках скланенню падлягае кожнае слова: *дваццаць восем, дваццаці васьмі, дваццаці васьмі, дваццаць восем, дваццаццю васьмю, аб дваццаці васьмі; шэсцьсот пяцьдзесят сем, шасцісот пяцідзесяці сямі, шасцістам пяцідзесяці сямі, шэсцьсот пяцьдзесят сем, шасцюстамі пяцюдзесяццю сямю, аб шасцістах пяцідзесяці сямі.*

§ 85. Парадкавыя лічэбнікі жаночага роду ў родным склоне адзіночнага ліку пішуцца з канчаткамі ***-ай (-ае), -яй (-яе)*** не пад націскам і ***-ой (-ое)*** пад націскам: *во́сьмай (во́сьмае), друго́й (друго́е).*

§ 86. Займеннік *нечы* мае наступныя склонавыя формы:

| Адзіночны лік | | | Множны лік |
|---|---|---|---|
| Мужчынскі род | Ніякі род | Жаночы род | |
| Н. *нечы* | *нечае* | *нечая* | *нечыя* |
| Р. *нечага* | | *нечай (-ае)* | *нечых* |
| Д. *нечаму* | | *нечай* | *нечым* |
| В. *як* Н. *або* Р. | | *нечую* | *як* Н. *або* Р. |
| Т. *нечым* | | *нечай (-аю)* | *нечымі* |
| М. *(аб) нечым* | | *(аб) нечай* | *(аб) нечых* |

§ 87. Дзеясловы абвеснага ладу цяперашняга часу першага спражэння ў першай асобе множнага ліку пішуцца з канчаткамі ***-ем (-ам)*** не над націскам і ***-ём (-ом)*** пад націскам: *будўем, вывучáем, пішам; нясём, сцеражóм.*

У другой асобе множнага ліку, калі націск падае на апошні склад, пішуцца канчаткі ***-яцé (-ацé),*** а не пад націскам ***-еце (-аце):*** *ідзяцé, несяцé, берацé; чытáеце, пішаце.*

§ 88. Дзеясловы абвеснага ладу цяперашняга часу другога спражэння ў другой асобе множнага ліку пішуцца з канчаткамі ***-іце (-ыце)*** не пад націскам і ***-іцé (-ыцé)*** пад націскам: *хóдзіце, гавóрыце; седзіцé, бежыцé.*

### Канчаткі назоўнікаў у канструкцыях з прыназоўнікам *па*

§ 89. Назоўнікі мужчынскага і ніякага роду ў спалучэннях з прыназоўнікам ***па,*** як правіла, маюць канчатак ***-е*** *або* ***-і*** (у залежнасці ад асновы): *лазіць па дубе, блукаць па горадзе, хадзіць па пакоі, ісці па следзе, загад па універсітэце, звесткі па раёне, гаварыць па тэлефоне, выступаць па тэлебачанні, страляць па акопе, таварыш па атрадзе, плакаць па сыне.*

Канчатак ***-у (-ю)*** пішацца:

а) калі спалучэнне мае размеркавальнае ці вылучальнае значэнне: *па кілаграму на чалавека, па вядру малака, перабраць па каліву, насіць па гарбузу, падабраць голас па тэмбру, па хімічнаму саставу, стаць па росту, пераўзыходзіць па таленту, агент па збыту, калега па пяру, спаборніцтва па тэнісу, недакладны па сэнсу, вышэйшы па званню, розны па значэнню;*

б) калі спалучэнне мае значэнне адрэзка часу, на працягу якога адбываецца дзеянне: *па тыдню ў ад'ездзе, па месяцу ў камандзіроўцы, па году не бачыцца;*

в) калі спалучэнне мае значэнне параўнання чаго-небудзь па велічыні: *качаны па вядру, казлякі па рэшату, цыбуры па сажню;*

г) калі прыназоўнік ***па*** ў спалучэнні з назоўнікам адпавядае значэнню слоў **паводле, адпаведна:** *па загаду дырэктара, па сігналу трывогі, працаваць па плану.*

## АБ НАПІСАННІ РАЗАМ І ПРАЗ ЗЛУЧОК

### Агульныя правілы

§ 90. Пішуцца разам:

1. Словы з прыстаўкамі: *абход, выезд, заказ, націск, прырост, выпрабаваны, прамежны, прадугледзець, разгарнуць, задоўга, увогуле;*

у тым ліку і з прыстаўкамі ***звыш-, пасля-, анты-, архі-, інфра-, ультра-*** і інш.: *звыштэрміновы, пасляррэвалюцыйны, антыбіётык, архінебяспечны, інфрачырвоны, ультрафіялетавы.*

2. Складанаскарочаныя словы: *калгас, ваенкамат, педсавет, аўтарамонтны.*

§ 91. Пішуцца праз злучок:

1. Спалучэнні двух аднолькавых слоў: *ледзь-ледзь, ціха-ціха, чырвоны-чырвоны, чыталі-чыталі.*

2. Спалучэнні двух слоў з аднолькавай асновай, але з рознымі канчаткамі, суфіксамі ці прыстаўкамі: *адзін-адным, раз-пораз, як-ніяк, дзе-нідзе, калі-нікалі, сам-насам, крыж-накрыж;* але: *адзін на адзін, з вока на вока.*

3. Спалучэнні двух блізкіх па значэнню слоў: *жыў-быў, жыць-пажываць, бокам-скокам, сям-там, сяды-тады, шыта-крыта, паіць-карміць.*

4. Літарныя скарачэнні складаных слоў і слоў, якія пішуцца праз злучок, напрыклад: *с.-г.* — сельскагаспадарчы, *ст.-бел.— старажытнабеларускі, с.-д.— сацыял-дэмакрат.*

5. Складаныя словы, першай часткай якіх з'яўляюцца лічбы: *50-годдзе, 100-кіламетровы, 2-літровы.*

**Заўвага**. Злучок знакам прыпынку не з'яўляецца.

## Назоўнікі

§ 92. Пішуцца разам складаныя назоўнікі: *торфабрыкет, вадасховішча, землеробства, аэрафлот, авіябаза, веласпорт, кінача̀сопіс, аграбіялогія, гросмайстар, мікраклімат; Слаўгарад, Навапалацк, Ніжневартаўск, Старабельск.*

§ 93. Пішуцца праз злучок:

1. Складаныя назоўнікі, утвораныя з двух самастойных назоўнікаў, якія не звязаны злучальнай галоснай і ўсведамляюцца як адно слова: *жар-птушка, канёк-гарбунок, генерал-маёр, прэм'ер-міністр.*

2. Складаныя адзінкі вымярэння: *кілават-гадзіна, чалавека-дзень;* але: *працадзень.*

3. Іншамоўныя назвы прамежкавых кірункаў свету: *норд-ост, норд-вест, зюйд-ост, зюйд-вест.*

4. Састаўныя прозвішчы і імёны: *Бялыніцкі-Біруля, Мамін-Сібірак, Дунін-Марцінкевіч, Жаліо-Кюры.*

5. Складаныя назвы некаторых населеных пунктаў з першай часткай ***нова-, стара-, усць-, верх-:*** *Нова-Барысаў, Стара-Барысаў, Усць-Каменагорск, Верх-Ірмень.*

6. Састаўныя геаграфічныя назвы, утвораныя з назваў частак геаграфічнага аб'екта, напрыклад: *Кабардзіна-Балкарыя, Карачаева-Чаркесія.*

7. Частка ***паў-*** з уласнымі назвамі: *паў-Мінска, паў-Беларусі.*

**Заўвага.** З іншымі назоўнікамі ***паў-*** пішацца разам: *паўметра, паўгода, паўмільёна.*

8. Назоўнікі з аднаслоўным прыдаткам: *хлапчук-гарэза, дзяўчына-красуня.*

**Заўвага 1.** Пры адваротным становішчы назоўніка і аднаслоўнага прыдатка злучок не пішацца, напрыклад: *красуня дзяўчына.*

**Заўвага 2.** Злучок не пішацца таксама ў злучэнні агульнага назоўніка з уласнай назвай: *рака Свіслач;* але *Свіслач-рака.*

**Заўвага 3.** Злучок не пішацца і ў злучэннях назоўнікаў, з якіх першы азначае родавае паняцце, а другі відавое: *расліна чабор, кветка настурцыя.*

9. Графічныя скарачэнні назоўнікаў, якія складаюцца з пачатку і канца слова: *б-ка* (бібліятэка), *т-ва* (таварыства), *а-вы* (астравы), *д-р* (доктар).

## Прыметнікі

§ 94. Пішуцца разам:

1. Складаныя прыметнікі, утвораныя ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца ў адно слова: ***водаправодны*** (водаправод), ***навасібірскі*** (Навасібірск).

2. Складаныя прыметнікі, утвораныя са злучэння слоў, падпарадкаваных адно другому: ***народнагаспадарчы*** (народная гаспадарка), ***агульнанародны*** (агульны для народа), ***чарнаморскі*** (Чорнае мора), ***правабярэжны*** (правы бераг).

3. Складаныя прыметнікі, якія ўтвораны з прыслоўя і прыметніка і абазначаюць адзінае паняцце: *глыбокапаважаны, вечназялёны, доўгатрывалы.*

**Заўвага.** Складаныя прыметнікі, у састаў якіх уваходзяць прыслоўі, не трэба блытаць са словазлучэннямі, якія складаюцца з прыслоўяў і прыметнікаў, напрыклад: *дыяметральна процілеглы.*

§ 95. Пішуцца праз злучок:

1. Складаныя прыметнікі, утвораныя ад складаных назоўнікаў, якія маюць злучок: *дызель-маторны* (дызель-матор), *сацыял-дэмакратычны* (сацыял-дэмакрат), *буда-кашалёўскі* (Буда-Кашалёва), *іль-дэ-франскі* (Іль-дэ-Франс); але: *маскварэцкі.*

2. Прыметнікі, утвораныя ад імён і прозвішчаў: *леў-талстоўскі, рамэн-раланаўскі.*

**Заўвага**. Прыметнікі, утвораныя ад уласных імён са злучком, пры наяўнасці прыстаўкі пішуцца без злучка, у адно слова: *заісык-кульскі.*

3. Прыметнікі, утвораныя з дзвюх ці больш асноў, якія абазначаюць раўнапраўныя паняцці: *рабоча-сялянскі, руска-ўкраінскі, сіне-бела-чырвоны* (флаг).

4. Прыметнікі, утвораныя з дзвюх асноў, якія абазначаюць:

а) якасць з дадатковым адценнем, напрыклад: *горка-салёны;*

б) адценні колераў: *чырвона-малінавы, блакітна-сіні, шэра-карычневы, малочна-белы.*

5. Прыметнікі, якія ўваходзяць у састаў уласных геаграфічных назваў і пачынаюцца з ***усходне-, заходне-, паўднёва-, паўночна-:*** *Паўночна-Казахстанская вобласць, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка.*

**Заўвага**. Усе астатнія прыметнікі, якія ўтвораны з дзвюх ці больш асноў і не падыходзяць ні пад адно з пададзеных правіл, пішуцца праз злучок: *літаратурна-мастацкі, сасудзіста-валакністы, паўночна-заходні.*

## Лічэбнікі

§ 96. Пішуцца разам:

1. Колькасныя лічэбнікі, апошнім элементам якіх з'яўляецца ***-дзесят, -сце, -ста, -сот:*** *пяцьдзесят, дзвесце, трыста, васемсот.*

2. Парадкавыя лічэбнікі, апошнім элементам якіх з'яўляецца ***-дзесяты, -соты, -тысячны, -мільённы, -мільярдны*** і г. д.: *пяцідзесяты, трохсоты, дзевяцітысячны, васьмідзесяцімільённы.*

§ 97. Пішуцца праз злучок:

1. Складаныя парадкавыя лічэбнікі на ***-тысячны, -мільённы, -мільярдны*** і г. д., калі першая іх частка напісана лічбамі: *600-мільённы, 8 $^{1}/_{4}$ -тысячны.*

2. Напісаныя лічбамі парадкавыя лічэбнікі з граматычнымі канчаткамі або часткамі іх: *1-ы, 2-і, 5-ая, 8-ая, 20-га, 30-ая, 40-му.*

**Заўвага**. Поўнасцю граматычны канчатак пішацца, калі ён складаецца з адной або дзвюх літар: *6-ы, 8-ая, 10-ай, 40-ых, 50-ым.* Калі ж граматычны канчатак трохлітарны, то пры лічэбніку даюцца дзве апошнія: *9-га, 12-му, 40-му.*

3. Лічэбнікі, якія абазначаюць прыблізнасць, незалежна ад таго, напісаны яны лічбамі ці літарамі: *2-3 аркушы, праз 3-4 дні, хлопчык васьмі-дзевяці год, прайшоў год-другі* (у сэнсе "першы-другі").

**Заўвага**. Пры абазначэнні прыблізнасці паміж састаўнымі колькаснымі лічэбнікамі, якія напісаны словамі, замест злучка ўжываецца працяжнік: *праз трыццаць пяць — трыццаць сем год.*

## Прыслоўі

§ 98. Пішуцца разам:

1. Прыслоўі, утвораныя шляхам злучэння прыназоўнікаў з прыслоўямі: *напотым, назаўтра, назаўсёды, назаўжды, назусім, намнога, насупраць, удвайне, заўчора, пасляззаўтра, замнога.*

Ад такіх прыслоўяў трэба адрозніваць спалучэнні прыназоўнікаў з нязменнымі словамі, якія ўжываюцца ў падобных выпадках у значэнні назоўнікаў і з прыназоўнікамі пішуцца асобна: *падняць на ўра, адкласці на паслязаўтра, рабіць за дзякуй, да заўтра, бралася на відно, ад цямна.*

2. Прыслоўі, утвораныя шляхам злучэння прыназоўнікаў з рознымі склонавымі формамі кароткіх прыметнікаў: *дабяла, дачыста, здалёк, зрэдку, спярша, справа, злева, зноў, сослепу, змалку, улева, управа, насуха, зацемна.*

3. Прыслоўі, утвораныя шляхам злучэння прыназоўнікаў ***у*** і ***на*** з рознымі склонавымі формамі зборных і колькасных лічэбнікаў: *удвух, удзвюх, удваіх, удвая, утрох, утраіх, надвае, натрае.*

4. Прыслоўі, утвораныя шляхам злучэння прыназоўнікаў з рознымі склонавымі формамі поўных прыметнікаў і займеннікаў: *урассыпную, упустую, збольшага, нашто, навошта, нізашто, потым, надта, зусім, затым.*

5. Прыслоўі, утвораныя шляхам злучэння прыназоўнікаў з рознымі склонавымі формамі назоўнікаў, пішуцца разам у тым выпадку, калі:

а) назоўнік, з якога ўтварылася прыслоўе, самастойна не ўжываецца: *бесперастанку, дашчэнту, досыць, знячэўку, знянацку, наапашкі, напавал, напрост, наўцёк, неўдагад, неўспадзеў, паасобку, паблізу, удаўжкі, упярэмешку;*

б) паміж назоўнікам і прыназоўнікам, ад якіх утварылася прыслоўе, нельга без змены сэнсу дадаць азначэнне або да назоўніка нельга паставіць склонавае пытанне: *даволі, дадому, замужам, зроду, наадварот, наадрэз, накрыж, напаказ, напракат, напралом, углыб, усур'ёз;*

в) прыслоўі маюць у сваім саставе назоўнікі ***верх, ніз, перад, зад, бок, гара, век, пачатак, раз, ноч, вечар, ранак:*** *звер-*

*ху, наверх, уверх, уверсе; уніз, знізу, унізе; наперад, наперадзе, уперад; ззаду, назад, узад, узадзе; збоку, набок, убок; дагары, угары, угару; навек, навекі; зранку, увечар, нанач* і г. д. Аднак пры наяўнасці паясняльных слоў да адпаведных назоўнікаў адзначаныя словы пішуцца асобна: *на верх гары, на ніз шахты, з боку сяла, з самага ранку, у зімовы вечар* і г. д.

6. Разам пішуцца і прыслоўі *таксама, гэтаксама, штодзень, штотыдня, штогод, штоночы.*

§ 99. Пішуцца праз злучок словы *па-першае, па-другое, па-трэцяе* і г. д., а таксама ўтвораныя ад прыметнікаў і займеннікаў прыслоўі, якія пачынаюцца з ***па-*** і канчаюцца на ***-ку, -і (-ы), -аму (-яму), -ому (-ему, -йму): па-гаспадарску, па-свойску, па-руску, па-бацькоўску, па-латыні, па-чалавечы, па-добраму, па-ранейшаму, па-даўняму, па-веснавому, па-старому, па-свойму*** і пад.

§ 100. У прыслоўях з прыстаўкай ***па-***, утвораных ад складаных прыметнікаў, якія пішуцца праз злучок, злучок ставіцца толькі пасля ***па-***: *па-сацыялдэмакратычнаму.*

## Прыназоўнікі, злучнікі, часціцы, выклічнікі

§ 101. Пішуцца разам:

1. Прыназоўнікі, якія ўтварыліся шляхам зліцця прыназоўнікаў з назоўнікамі: *замест, наконт, накшталт, звыш.*

2. Прыназоўнікі, якія ўжываюцца і ў якасці прыслоўяў, утвораных шляхам зліцця прыназоўнікаў з назоўнікамі: *зверху, наперадзе, наперакор, уперад, услед* і пад.

3. Злучнікі, якія ўтварыліся шляхам зліцця прыназоўнікаў з займеннікамі ці словамі ***колькі, столькі:*** *затое, прычым, прытым, паколькі, пастолькі,* у адрозненне ад спалучэнняў прыназоўнікаў з адпаведнымі займеннікамі ці неазначальна-колькаснымі словамі, напрыклад: *паволі, затое, грунтоўна;* але: *Яму выказалі падзяку за тое, што ён добра працаваў.*

4. Займеннікі і прыслоўі:

а) з суфіксамі ***-сь, -ся, -сьці:*** *дзесь, хтось, чымся, кудысьці, якісьці;*

б) з прыстаўкай ***а-:*** *аніхто, анідзе, аніяк.*

§ 102. Пішуцца праз злучок:

1. Складаныя прыназоўнікі: ***з-за, з-пад, з-над, па-над, з-па-над, па-за.***

2. Складаныя выклічнікі, падзыўныя і гукапераймальныя словы: *о-го-го, ой-ой-ой, о-ё-ёй, а-я-яй, дзю-дзю-дзю, ха-ха-ха, дзын-дзын-дзын, ку-ку, трах-тарарах* і пад.

3. Словы з прыстаўкай ***абы-*** і суфіксамі ***-небудзь, -колечы:*** *абы-хто, абы-што, абы-як, абы-дзе, абы-адкуль, хто-небудзь, дзе-небудзь, куды-небудзь, як-колечы.*

**Заўвага 1**. Займеннікі ***абы-хто*** і ***абы-што*** пры спалучэнні з прыназоўнікамі пішуцца асобна (у тры словы): *абы у каго, абы да каго, абы з чым.* Займеннік ***абы-які*** пры спалучэнні з прыназоўнікамі пішацца ў тры словы *(абы з якімі)* або ў два *(з абы-якімі).* Словы, вытворныя ад прыслоўя ***абы-як,*** з прыстаўкай ***абы-*** пішуцца разам: *абыякавы, абыякава, неабыякава, абыякавасць, абыякаваты, абыякавата* і пад.

**Заўвага 2**. Часціца ***-такі*** пішацца праз злучок у складзе слоў ***даволі-такі, зноў-такі, так-такі, урэшце-такі*** і ***ўсё-такі,*** а таксама ў тых выпадках, калі яна стаіць пасля дзеяслова: *Прыйшоў-такі сёння.* Ва ўсіх астатніх выпадках часціца ***-такі*** пішацца асобна: *Ён такі думае прыйсці. Ён усё ж такі думае прыйсці.*

§ 103. Пішуцца асобна:

1. Часціцы ***бы (б), жа (ж):*** *прачытаў бы, узяла б, напісаў жа, угледзела ж.*

2. Усе іншыя часціцы, а таксама часціца ***што*** ў такіх спалучэннях, як *пакуль што, амаль што, толькі што, сама што, хіба што* і пад.

## Правапіс *не* і *ні*

§ 104. Часціца ***не*** пішацца разам:

1. Калі слова без ***не*** не ўжываецца: *непагадзь, нядоімка, нястача, нядзеля, непакоіць, ненавідзець, непахісны, няўлоўны, неўзабаве, няўхільна, нябось.*

2. З назоўнікамі, прыметнікамі і прыслоўямі, калі часціца ***не*** надае слову новае, процілеглае значэнне: *няшчасце* (бяда), *няпраўда* (хлусня), *непрыяцель* (вораг), *невысокі* (нізкі), *недалёкі* (блізкі), *нялёгка* (цяжка), *нямнога* (мала).

3. З дзеепрыметнікамі, пры якіх адсутнічаюць паясняльныя словы або супрацьпастаўленне: *неапаўшае лісце* (але: *не апаўшае да зімы лісце; не апаўшае, а абабітае лісце*), *незасеянае поле* (але: *не засеянае вясною поле; не засеянае, а заворанае поле*).

4. З прыметнікамі і дзеепрыметнікамі пры наяўнасці паясняльных слоў, што абазначаюць ступень якасці,— ***вельмі, зусім, амаль, часткова, выключна, у вышэйшай ступені:*** *ён вельмі няветлівы, зусім няздатны, часткова непрыгодны.*

5. З займеннікамі і прыслоўямі, калі на ***не*** падае націск: *нехта, нешта, неяк, неадкуль, некуды, некалі, недзе, некага, некаму, нечага, нечаму, некім, нечым, нехаця, нельга.*

6. З часціцамі, напрыклад: *няўжо, няхай.*

7. У дзеяслоўнай прыстаўцы ***неда-***, якая абазначае неадпаведнасць патрэбнай норме: *недалічваць, недамерваць, недацэньваць.* Гэту прыстаўку трэба адрозніваць ад дзеяслоўнай прыстаўкі ***да-*** з папярэднім адмоўем, якая абазначае не даведзенае да канца дзеянне: *не дапісаць пісьма, не дачытаць кнігі, не далічыць да ста.*

§ 105. Часціца ***не*** пішацца асобна:

1. Ад дзеясловаў і дзеепрыслоўяў: *не хадзіў, не рабіў, не пытаў, не гледзячы, не зрабіўшы.*

2. Ад кароткіх дзеепрыметнікаў: *сенажаць не ўбрана, работа не скончана.*

3. Ад поўных дзеепрыметнікаў, пры якіх ёсць паясняльныя словы: *не даворанае восенню поле, не прачытаная да канца кніга.*

4. Ад назоўнікаў, прыметнікаў, дзеепрыметнікаў і прыслоўяў, калі ёсць або маецца на ўвазе супрацьпастаўленне: *не прыяцель, а вораг; не праўда, а хлусня; перад намі была не высокая гара, а толькі ўзгорак; работа не скончаная, а толькі пачатая; на дварэ не цёпла, а холадна.*

5. Калі ***не*** ўваходзіць у састаў узмацняльных адмоўяў: *далёка не, зусім не, ніколькі не, нічуць не* і пад.: *сёлета ўраджай нічуць не горшы, чым летась; адказ быў далёка не бліскучы.*

6. Ад узмацняльных прыслоўяў, а таксама ад прыназоўнікаў і злучнікаў: *не вельмі, не зусім, не ад ...., не ў ... .*

7. Калі паміж займеннікам і адмоўем стаіць прыназоўнік: *не з чага, не за шта.*

8. Ад нязменных слоў, якія не ўтвораны ад прыметнікаў і выступаюць у сказе ў якасці выказніка: *не трэба, не варта, не супраць, не шкада;* але: *нельга, няможна.*

9. Ад усіх слоў, што пішуцца праз злучок: *зроблена не памойму, не па-таварыску.*

§ 106. Часціца ***ні*** пішацца разам:

1. З займеннікамі, калі яна не аддзелена ад займенніка прыназоўнікам: *ніхто, нішто, нікога, нічога, ніякі, нічый;* але: *ні з кім, ні ў кога, ні на што, ні да кога.*

2. З прыслоўямі: *ніколі, нідзе, нікуды, ніадкуль, ніяк, нізашто, ніколькі, нічуць, нізвання,* а таксама ў вытворных словах: *нічыйны, ніякава, ніякавата* і інш.

3. У словах *нібы, нібыта.*

§ 107. Ва ўсіх астатніх выпадках часціца ***ні*** пішацца асобна.

## СКЛАДАНЫЯ СЛОВЫ

§ 108. Правапіс складаных слоў грунтуецца на вымаўленні слоў з адным або з двума націскамі.

З адным, асноўным націскам, як правіла, вымаўляюцца словы, у якіх гэты націск падае на першы склад другой часткі. Такія словы пры напісанні разглядаюцца як простыя: *скараход, баяздольны, геаграфія.*

**Заўвага**. Прыметнікі *арфаграфічны, геаграфічны, манаграфічны, тапаграфічны* і пад. пішуцца так, як назоўнікі, ад якіх гэтыя прыметнікі ўтварыліся *(арфаграфія, геаграфія, манаграфія, тапаграфія).*

§ 109. Пабочны націск праяўляецца ў тых словах, у якіх асноўны націск падае не на першы склад другой часткі. У такіх словах пад пабочным націскам аднаўляецца этымалагічнае ***о (ё)***: *асновапалажэнне, вагонарамонтны, высокаідэйны, горнарабочы, жывёлагадоўля.*

**Заўвага 1**. У некаторых словах пабочны націск можа выразна праяўляцца і тады, калі асноўны націск падае на першы склад другой часткі. У гэтых выпадках пад пабочным націскам захоўваецца ***о (ё)***: *малочнакіслы, збожжаздача, вокамгненне, водналыжны, горнарудны* і некаторыя іншыя.

**Заўвага 2**. Словы ***фота, мота, процi, што*** ў складаных словах захоўваюць ***о***: *фотакартка, фотакопія, фотаздымак, фотасувязь; мотапоезд, моталодка, мотакрос, мотагонкі;* але: *матавоз, матацыкл* і вытворныя ад іх; *штодзённа, штомесячна, штогод, процілеглы, проціракавы.*

**Заўвага 3**. Захоўваецца **о *(ё)*** у першай частцы і тых складаных слоў, другая частка якіх пачынаецца з ***ў***: *марозаўстойлівы, торфаўборачны, збожжаўборка.*

**Заўвага 4**. У складаных словах, першай часткай якіх з'яўляецца слова ***кіно***, пабочны націск праяўляецца на першым складзе: *кінакарціна, кінаапарат, кінаэкран, кінафестываль.*

**Заўвага 5**. Слова ***радыё*** ў складаных словах не змяняе свайго напісання: *радыёхваля, радыёпрыёмнік, радыёкропка.*

**Заўвага 6**. Слова ***святло*** ў складаных словах не змяняе свайго напісання, калі націск у другой частцы падае не на першы склад: *святлоаддача, святлоадчуванне, святлолюбівы, святлоўстойлівы, святлоэкран, святловыпраменьванне, святловыпрамяненне, святлокапіраванне, святлолячэнне, святломаскіроўка, святлонепранікальны, святлорассеянне, святлосігналізацыя.*

Калі ж націск падае на першы склад другой часткі, тады першая частка пішацца ў форме ***святла***: *святлабоязь, святлалюб, святламер, святлафор, святланосны, святлатэхнік, святлацень, святлафільтр.*

§ 110. Ненаціскное *э* ў першай частцы складаных слоў захоўваецца: *мэтазгодна, рэдказубы, шэравокі, тэлебачанне, шэсцьсот;* але: *шасцісот, шасцістам* і г. д.

**Заўвага**. Слова *шаснаццаць*, як і ўсе іншыя падобнага ўтварэння словы (*адзінаццаць, дванаццаць, трынаццаць* і г. д.), пры напісанні разглядаецца як простае слова.

§ 111. У складаных словах, утвораных ад лічэбніка ў форме роднага склону і якога-небудзь іншага слова, першая частка пішацца так, як пішацца яна ў родным склоне лічэбніка, з'яўляючыся асобным словам: *трохдзённы, чатырохтонны, шасцістволыны, шасцісоты, сямігодка, васьмігадовы, васьмісоты, дзевяцігра́дусны, дзесяцікласнік, саракагоддзе, саракапяцітонны, двухсотметровы.*

**Заўвага 1**. Лічэбнікі ***сто*** і ***дзевяноста*** ў якасці першай часткі складаных слоў пішуцца без змены: *стодзённы, стотысячны, дзевяностагадовы, дзевяностарублёвы;* але: *стагоддзе, станожка.*

**Заўвага 2**. Складаныя словы, у якіх першай часткай з'яўляецца лічэбнік ***адна***, не маюць пабочнага націску і пішуцца як простыя словы: *аднагадовы, аднача́сова, аднаначны, аднаразовы, аднапавярховы*

**Заўвага 3**. Частка ***поў-*** пішацца з ***о*** толькі пад націскам, не пад націскам ***о*** пераходзіць у ***а:*** *поўнач, поўдзень, паўгоддзе, паўвостраў, напаўадчынены.*

**Заўвага 4**. Лічэбнік ***дзве***, калі ужываецца ў якасці першай часткі складаных слоў, уніфікуе родавую форму па аналогіі з лічэбнікам ***два:*** *двукоссе, двукроп'е, двухдольны, двухзменны, двухмоўны, двухтысячны* і пад.

§ 112. Калі складаныя словы маюць у сваім саставе больш за дзве часткі, то кожная частка пішацца як асобна ўзятае слова. Напрыклад, напісанне слова *авіяматорабудаванне* можна праверыць праз напісанне слоў: *авія, матор, будаванне; аэрафотапрыбор* — праз напісанне слоў: *аэра, фота, прыбор.*

**Заўвага**. У якасці асобнай часткі могуць выступаць складаныя словы, якія ўтварыліся самастойна: напрыклад, для слова *паравозавагонарамонтны* частка *паравоз* павінна разглядацца як самастойная.

§ 113. Злучальнымі галоснымі ў складаных словах могуць быць пры мяккай аснове першай часткі літары ***е, я,*** пры цвёрдай — ***а, о,*** прычым літара ***о*** можа быць толькі пад націскам: *дабрабыт, многатомны, чарнавокі; куродым, сыроватка, тэхнолаг; вуглездабыча, конегадоўля, насеннеачышчальны;* ***е*** ў першым складзе перад націскам перадаецца праз ***я:*** *Аленягорск, кулямёт, салякоп, верхнялужыцкі, сярэднярускі.*

## СКЛАДАНАСКАРОЧАНЫЯ СЛОВЫ

§ 114. Кожная састаўная частка складанаскарочанага слова пішацца так, як яна пісалася б у адпаведным асобна ўзятым поўным слове: *камсастаў, ваенурач, калгас.*

**Заўвага**. У апошняй частцы некаторых складанаскарочаных слоў пад націскам можа аднаўляцца этымалагічнае ***о***, якога ў поўным слове не бывае: *выканком* (выканаўчы камітэт), *наркóм* (народны камісар), *селькóр* (сельскі карэспандэнт) і інш.

§ 115. На мяжы састаўных частак раздзяляльныя апостраф і мяккі знак не пішуцца: *цэхячэйка;* але ***ь*** як знак мяккасці ў такіх выпадках пішацца: *косцьутыль.*

§ 116. У пачатку састаўных частак складанаскарочаных слоў ***і, е, ю, я*** не пераходзяць у ***ы, э, у, а:*** *дзяржінспекцыя, недінстытут, палітінфармацыя, Дзяржюрвыдавецтва* і інш.

§ 117. Складанаскарочаныя словы, якія абазначаюць уласныя назвы ўстаноў і арганізацый, пішуцца з вялікай літары: *Саўмін, Мінэнерга, БелаПАН, Белнафтахім* і інш.

## ЛІТАРНЫЯ АБРЭВІЯТУРЫ

§ 118. Абрэвіятуры пішуцца разам, без кропак, без злучкоў і без апострафаў.

**Заўвага**. Спалучэнні дзвюх абрэвіятур, якія маюць самастойнае значэнне, пішуцца асобна: *НДІ ЭВМ, НАН РБ* і інш.

§ 119. Вялікімі літарамі пішуцца:

1. Усе абрэвіятуры, якія чытаюцца па назвах літар: *ААН, ЗША, ЮНІСЕФ.*

2. Усе абрэвіятуры, якія чытаюцца па гуках і абазначаюць назвы такіх устаноў і арганізацый, у якіх першае слова пішацца з вялікай літары: *БАМ, РАН, МХАТ,* таксама *БЕЛТА.*

3. Абрэвіятуры, у якіх адна частка чытаецца па назвах літар, а другая па гуках, калі ў такіх абрэвіятурах ёсць хоць адно слова, якое пры поўным ужыванні пішацца з вялікай літары: *ЦСКА, ГСМ, СТА, ФСБ.*

**Заўвага**. Абрэвіятуры, якія пішуцца вялікімі літарамі, пераважна не скланяюцца. Калі ж некаторыя з такіх абрэвіятур набылі ўласцівасць скланяцца, тады адпаведныя склонавыя канчаткі дапісваюцца да іх малымі літарамі без апострафа: *МХАТа, МОПРа.*

§ 120. Абрэвіятуры, якія чытаюцца па гуках ці па гуках і літарах, калі яны абазначаюць агульныя назвы, пішуцца малымі літарамі: *нэп, цэц* і інш.

### Розныя графічныя скарачэнні

З літарнымі абрэвіятурамі не трэба змешваць умоўныя графічныя скарачэнні, якія ўжываюцца на пісьме, але заўсёды чытаюцца поўнасцю.

§ 121. Пры графічных скарачэннях ставіцца кропка і захоўваюцца тыя ж знакі і пачатковыя літары, якія ўласцівы поўнаму напісанню: *В.-Д. к.* (Волга-Данскі канал).

**Заўвага**. Стандартныя скарочаныя абазначэнні метрычных мер пішуцца без кропак: *га* (гектар), *см* (сантыметр), *кг* (кілаграм), *км* (кіламетр) і інш.

§ 122. Пры скарачэнні слоў трэба помніць, што нельга скарачаць на галосную і на ***ь***, на ***й*** і на ***ў***.

Пры спалучэнні дзвюх аднолькавых зычных скарачэнне робіцца пасля першай зычнай: *насен. фонд,* а не *насенн. фонд.*

Пры збегу дзвюх або некалькіх розных зычных скарачэнне робіцца пасля апошняй зычнай: *народн. творчасць,* а не *народ. творчасць, руск. мова.* а не *рус. мова.*

## ПРАВІЛЫ ПЕРАНОСУ

§ 123. З аднаго радка ў другі словы пераносяцца па складах. Але адну літару, хоць яна і ўтварае склад, нельга ні пакідаць, ні пераносіць у новы радок.

§ 124. Пры пераносе нельга:

1. Пакідаць у канцы радка або пераносіць у новы радок дзве аднолькавыя зычныя, якія стаяць паміж галоснымі.

| Правільна: | Няправільна |
|---|---|
| *дваццацць* | *дваццаць, два-ццаць* |
| *насен-не* | *насе-нне* |
| *збож-жа* | *збо-жжа* |

2. Аддзяляць зычную ад наступнай галоснай.

| Правільна: | Няправільна |
|---|---|
| *вя-нок* | *вян-ок* |
| *кані-кулы* | *канік-улы* |

3. Аддзяляць ***й, ў*** ад папярэдняй галоснай.

| Правільна | Няправільна |
|---|---|
| *май-скі* | *ма-йскі* |
| *праў-да* | *пра-ўда* |

Але пры пераносе складаных слоў, у якіх другая частка пачынаецца на ***ў***, гэта ***ў*** пры першай частцы не пакідаецца.

| Правільна | Няправільна |
|---|---|
| *сена-ўборка* | *сенаў-борка* |

4. Аддзяляць **ь** і '(апостраф) ад папярэдняй зычнай.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| буль-ба | бул-ьба |
| бур'-ян | бур-'ян |

5. Раздзяляць ***дж, дз,*** калі яны абазначаюць адзін гук.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| *даж-джы* | *дажд-жы* |
| *ура-джай* | *урад-жай* |
| *радзі-ма* | *рад-зіма* |
| *на-дзея* | *над-зея, надз-ея* |

**Заўвага**. Калі ***дж, дз*** не складаюць аднаго гука, а з'яўляюцца звычайным спалучэннем прыставачнай ***д*** з карэннымі ***ж, з,*** тады пры пераносе такія спалучэнні раздзяляюцца: *пад-жары, ад-значыць, пад-земны.* Тое ж можна сказаць і ў дачыненні спалучэння ***шч:*** *раш-чыняць, уш-ча-міць.*

§ 125. Пры пераносе складаных слоў нельга пакідаць у канцы радка адну пачатковую літару другой асновы.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| *пяці-працэнтны* | *пяцін-рацэнтны* |

§ 126. Пры пераносе слоў з прыстаўкамі і часціцамі ***не, ні*** нельга разбіваць аднаскладовую прыстаўку (часціцу), калі за ёй ідзе зычная.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| *раз-мах* | *ра-змах* |
| *ня-стомны* | *няс-томны* |

Аднаскладовыя прыстаўкі на зычную, за якімі ідуць галосныя (апрача ***ы***), могуць разбівацца пераносам: *без-аварыйны* і *бе-заварыйны; без-умоўна* і *бе-зумоўна; пад-аконнік* і *па-даконнік.*

Калі ж пасля такіх прыставак стаіць літара ***ы,*** тады частку слова, якая пачынаецца з ***ы,*** пераносіць не дазваляецца.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| *па-дыход, пады-ход* | *пад-ыход* |
| *ра-зыграць, разы-граць* | *раз-ыграць* |

Двухскладовыя прыстаўкі пераносяцца па складах: *пера-бегчы* і *пе-рабегчы; пада-браць* і *па-дабраць.*

§ 127. Пры пераносе слоў з прыстаўкамі нельга пакідаць у канцы радка пры прыстаўцы пачатковую частку кораня, калі яна не з'яўляецца складам: *на-браць,* а не *наб-раць.*

**Заўвага**. Выключэнне з гэтага правіла складаюць словы, у якіх пасля прыставак ідуць ***й, ў.*** У такіх словах літары ***й, ў*** застаюцца пры прыстаўцы: *дай-сці, дайс-ці; заў-тра, заўт-ра.*

§ 128. У складанаскарочаных словах аднаскладовыя часткі пры пераносе не разбіваюцца.

| Правільна | Няправільна |
| --- | --- |
| *выкан-ком* | *выка-нком* |

§ 129. Абрэвіятуры, якія складаюцца з адных пачатковых літар або са спалучэння літар і лічбаў, пераносам не разбіваюцца: *Ту-154, МАЗ-530.*

**Заўвага**. У папярэдніх параграфах разгледжаны ў асноўным тыповыя выпадкі пераносу частак слоў у новы радок. Але трэба мець на ўвазе тое, што на практыцы могуць сустрэцца як зусім не падлягаючыя пераносу словы *(Азія, фае, авёс, асот, асецъ)*, так і словы, якія можна пераносіць некалькімі спосабамі *(ся-стра, сяс-тра, сяст-ра, тавары-ства, тварыс-тва, тварыст-ва)*. Да ліку апошніх звычайна будуць адносіцца словы са збегам зычных у суфіксальнай частцы.

§ 130. Не дазваляецца пераносіць прозвішчы, пакідаючы на канцы папярэдняга радка ініцыялы або іншыя ўмоўныя скарачэнні, якія адносяцца да прозвішчаў, напрыклад нельга пераносіць *Я.* | *Купала; К. М.* | *Міцкевіч; акад.* | *Карскі; праф.* | *Пічэта; сп.* | *Грыгор'еў; гр.* | *Шаплыка; ван* | *Бетховен.*

§ 131. Пры пераносе няможна адрываць скарочаныя назвы мер ад тых лічбаў, да якіх яны адносяцца: *1917* | *г.; XX* | *ст.; 330* | *га; 75* | *км; 20* | *см²; 16* | *кг.*

§ 132. Пры пераносе нельга адрываць ад лічбаў звязаныя з імі злучком граматычныя канчаткі: *1* | *-е; 5* | *-га; 10* | *-му.*

§ 133. Пры пераносе нельга разбіваць умоўныя графічныя скарачэнні тыпу *і г. д., і інш., г. зн., т-ва.*

# НАЗВЫ ДЗЯРЖАЎ, ІХ СТАЛІЦ І НАЙБОЛЬШ ЗНАЧНЫХ ГЕАГРАФІЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ

## А

Абака́н, абака́нскі
Абісі́нія, абісі́нскі
Абра́ў-Дзюрсо́
Абу́-Да́бі *(ст. Аб'ядн. Араб. Эміратаў)*
Абха́зія
Аб'ядна́ная Рэспу́бліка Танза́нія
Аб'ядна́ныя Ара́бскія Эміра́ты
Ага́ё, ага́йскі
Аге́нскае
Аджа́рыя
А́длер, а́длерскі
Адрыяно́паль, адрыяно́пальскі
Адрыяты́чнае мо́ра
Адыге́я
Ады́с-Абе́ба, ады́с-абе́бскі *(ст. Эфіопіі)*
А́дэн *(ст. Нар. Дэм. Рэсп. Йемен)*
Адэ́са, адэ́скі
Аза́рычы, аза́рыцкі
Азербайджа́н
А́зія, азія́цкі
Азо́рскія астравы́
Азо́ў
Азо́ўскае мо́ра
Ай-Пе́тры, *нязм.*
Ака́, о́кскі
А́кра, акры́нскі *(ст. Ганы)*
Акцю́бінск, акцю́бінскі
Алаверды́, алаве́рдскі
Ала́ндскія астравы́
Алата́у, алата́ўскі
Алаты́р, алаты́рскі
Алба́нія, алба́нскі
Алда́н, алда́нскі
Александры́я, александры́йскі
Аленяго́рск, аленяго́рскі
Алеу́цкія астравы́
Алжы́р *(ст. Алжырск. Нар. Дэм. Рэсп.)*
Алжы́рская Наро́дная Дэмакраты́чная Рэспу́бліка
Алта́й, алта́йскі
Алта́йскія го́ры
А́льпы, альпі́йскі
Аляксандра-Не́ўская ла́ўра
Аля́ска, аля́скінскі
Амазо́нка, амазо́нскі
Амарылье́, *нязм.*
Аме́рыка, амерыка́нскі
Амма́н, амма́нскі *(ст. Іярданіі)*
Амстэрда́м, амстэрда́мскі *(ст. Нідэрландаў)*
Амудар'я́, амудар'і́нскі
Аму́р, аму́рскі
Анады́р, анады́рскі
Ангара́, анга́рскі
А́нглія, англі́йскі
Анго́ла, анго́льскі
Андалу́сія, андалу́скі
Андама́нскае мо́ра
Андо́ра, андо́рскі
Андо́ра-ла-В'е́ха *(ст. Андоры)*
Андыжа́н, андыжа́нскі
Ане́га, ане́жскі
Анкара́, анка́рскі *(ст. Турцыі)*
Антананары́ву, антананары́ўскі *(ст. Мадагаскара)*
Антаркты́да
Антаркты́ка, антаркты́чны
Анта́рыо, *нязм.*
Антве́рпен, антве́рпенскі
Анто́паль, анто́пальскі
Анты́льскія астравы́
Апені́ны, апені́нскі
А́піа, а́пійскі *(ст. Заходняга Самоа)*
Апо́чка, апо́чацкі
Апшэро́нскі паўво́страў
Ара́бская Рэспу́бліка Егіпет
Ара́вія, араві́йскі
Ара́гві, арагві́йскі
Араго́н, араго́нскі
Ара́льскае мо́ра
Арара́т, арара́цкі
Аргенці́на
Аргенці́нская Рэспу́бліка
Аргу́нь, аргу́нскі
Ардэ́ны, ардэ́нскі
Арзама́с, арзама́скі

Арктыка, арктычны
Арлеан, арлеанскі
Армавір, армавірскі
Арменія, армянскі
Арол, арлоўскі
Артэк, артэкаўскі
Архангельск, архангельскі
Арынока, арынокскі
Арэнбург, арэнбургскі
Арэса, арэскі
Арэхава-Зуева, арэхава-зуеўскі
Асвенцім, асвенцімскі
Асвея, асвейскі
Асіповічы, асіповіцкі
Асірыя, асірыйскі
Астана, астанінскі *(ст. Рэспублікі Казахстан)*
Астравец, астравецкі
Астрахань, астраханскі
Астэндэ, астэндскі
Асуан, асуанскі
Асунсьён *(ст Парагвая)*
Асцёр, асцёрскі
Атабаска, атабаскінскі
Атава, атаўскі *(ст Канады)*
Атлантычны акіян
Аўеда
Аўстралійскі Саюз
Аўстралія
Аўстрыйская Рэспубліка
Аўстрыя
Аўстэрліц, аўстэрліцкі
Афганістан, афганскі
Афіны, афінскі *(ст. Грэцыі)*
Афрыка, афрыканскі
Ахоцкае мора
Ашмяны, ашмянскі
Ашгабат *(ст Рэспублікі Туркменістан)*
Аюдаг, аюдагскі

## Б

Бабруйск, бабруйскі
Баб-эль-Мандэбскі праліў
Багамскія астравы
Багата, багацінскі *(ст Калумбіі)*
Багдад, багдадскі *(ст Ірака)*
Багушэўск, багушэўскі
Бадэн, бадэнскі
Базель, базельскі
Байкал, байкальскі
Байкала-Амурская магістраль (БАМ)
Байканур, байканурскі
Баку, бакінскі *(ст Рэспублікі Азербайджан)*
Балагое, балагоўскі
Балатон, балатонскі
Балгарыя, балгарскі
Балеарскія астравы
Балівія, балівійскі
Балканы, балканскі
Балтыйскае мора
Балхаш, балхашскі
Бамако, бамакоўскі *(ст. Малі)*
Бамбей, бамбейскі
Бангі, бангійскі *(ст. Цэнтральнаафрыканскай Рэсп )*
Бангкок *(ст. Тайланда)*
Бангладэш, бангладэшскі
Бандар-Серы-Бегаван *(ст. Брунея)*
Банджул, банджульскі *(ст. Гамбіі)*
Бандунг, бандунгскі
Барадзіно, барадзінскі
Баранавічы, баранавіцкі
Баранцава мора
Барбадас, барбадаскі
Бардо, бардоскі
Баржомі, баржомскі
Баркалабава, баркалабаўскі
Барнаул, барнаульскі
Барселона, барселонскі
Барысаў, барысаўскі
Баскунчак, баскунчакскі
Бас-Тэр, бас-тэрскі *(ст Гвадэлупы)*
Басфор, басфорскі
Батнічны заліў
Батсвана, батсванскі
Батумі, батумскі *(ст. Аджарыі)*
Батэрст, батэрсцкі
Бафінава Зямля
Бахрэйн, бахрэйнскі
Бахчысарай, бахчысарайскі
Башкартастан, башкартастанскі (але: башкірская мова)
Бейрут, бейруцкі *(ст Лівана)*
Белавежская пушча
Белае мора, беламорскі

Беламорска-Балтыйскі канал
Беларусь, беларускі
Беласток, беластоцкі
Беласточчына
Бёлгарад, белгародскі
Беліз, белізскі
Белуджыстан, белуджыстанскі
Бельгія, бельгійскі
Бельмапан *(ст Беліза)*
Бельцы, бельцкі
Бенгазі, бенгазійскі
Бенгалія, бенгальскі
Бендэры, бендэрскі
Бенін, бенінскі
Беразіно, беразінскі
Бераставіца, бераставіцкі
Берлін, берлінскі *(ст ФРГ)*
Бермудскія астравы
Берн, бернскі *(ст Швейцарыі)*
Берынгаў праліў
Беседзь, беседскі
Бешанковічы, бешанковіцкі
Більбао, більбаўскі
Бірабіджан *(цэнтр Яўр. аўт. вобл.)*
Бірмінгем, бірмінгемскі
Бісау *(ст. Гвінеі-Бісау)*
Біскайскі заліў
Благавешчанск, благавешчанскі
Блізкі Усход, блізкаўсходні
Бон, бонскі
Боснія, баснійскі
Бразавіль, бразавільскі *(ст. Конга)*
Бразіліа *(ст Бразіліі)*
Бразілія, бразільскі
Брандэнбург, брандэнбургскі
Бранск, бранскі
Браслаў, браслаўскі
Браўншвейг, браўншвейгскі
Браціслава, браціслаўскі *(сталіца Славакіі)*
Брацк, брацкі
Брно, брненскі
Брунеі, брунейскі
Брусель, брусельскі *(ст. Бельгіі)*
Брыджтаун, брыджтаунскі *(ст Барбадаса)*
Брысталь, брыстольскі
Брэст, брэсцкі
Брэстчына
Брэтань, брэтаньскі
Буг, бугскі
Буда-Кашалёва, буда-кашалёўскі
Будапешт, будапешцкі *(ст Венгрыі)*
Бужумбура *(ст. Рэсп. Бурундзі)*
Бузулук, бузулукскі
Булаваё
Булонь, булонскі
Бурація, бурацкі
Бургундыя, бургундскі
Буркіна-Фасо
Бурундзі, бурундзійскі
Бутан, бутанскі
Бухара, бухарскі
Бухарэст *(ст. Румыніі)*
Буэнас-Айрэс *(ст. Аргенціны)*
Быхаў, быхаўскі
Быцень, быценьскі
Бягомль, бягомльскі
Бяла-Падляска, бяла-падляскі
Бялград, бялградскі *(ст. Сербіі)*
Бялынічы, бялыніцкі
Бярдзічаў, бярдзічаўскі
Бяроза, бярозаўскі
Бярэзіна, бярэзінскі

## В

Вавілон, вавілонскі
Вадуц, вадуцкі *(ст. Ліхтэнштэйна)*
Вайгач, вайгацкі
Валгаград, валгаградскі
Валгадонск, валгадонскі
Валета *(ст. Мальты)*
Валожын, валожынскі
Валынская вобласць
Вандэя, вандэйскі
Вануату, вануацкі
Варна, варненскі
Варонеж, варонежскі
Варшава, варшаўскі *(ст. Польшчы)*
Васілевічы, васілевіцкі
Васілішкі, васілішкаўскі
Ватыкан, ватыканскі
Ватэрлоо, ватэрлоўскі
Ваўкавыск, ваўкавыскі
Вашынгтон *(ст. ЗША)*
Везувій
Велінгтан *(ст. Новай Зеландыі)*
Вена, венскі *(ст. Аўстрыі)*

Венгерская Рэспубліка
Венгрыя
Венесуэла, венесуэльскі
Венецыя, венецыянскі
Вентспілс, вентспілскі
В'енцьян, в'енцьянскі
*(ст Лаоса)*
Вердэн, вердэнскі
Версаль, версальскі
Верхнядзвінск, верхнядзвінскі
Вест-Індыя, вест-індскі
Вестфалія, вестфальскі
Ветка, веткаўскі
В'етнам, в'етнамскі
Ветранка, ветранкаўскі
Ветрына, ветрынскі
Відзы, відзскі
Візантыя, візантыйскі
Вікторыя, віктарыйскі
*(ст Сейшэльскіх Астравоў)*
Віла *(ст. Вануату)*
Вілейка, вілейскі
Вілія, вілійскі
Вільнюс, вільнюскі
*(ст Літоўскай Рэспублікі)*
Віндхук, віндхукскі
*(ст Намібіі)*
Вініпег, вініпегскі
Вінніца, вінніцкі
Віргінскія астравы
Вісла, віслінскі
Віцебск, віцебскі
Віцебшчына
Влтава, влтаўскі
Вогненная Зямля, вогнезямельскі
Волагда, валагодскі
Волга, волжскі
Волга-Данскі суднаходны канал
Воранава, воранаўскі
Высачаны, высачанскі
Высокае, высокаўскі
Вычагда, вычагодскі
Вышні Валачок, вышневалоцкі
Вязынка, вязынскі
Вязьма, вяземскі
Вялікабрытанія
Вялікае Герцагства Люксембург
Вялікае Мядзведжае *(возера)*, вялікамядзведжанскі
Вялікае Нявольніцкае *(возера)*, вялікан яволь ніцкі
Вялікія Дольцы, вялікадалецкі
Вятлуга, вятлужскі

Г

Гаага, гаагскі
Габаронэ, габаронскі
*(ст. Батсваны)*
Габон
Габонская Рэспубліка
Гавана, гаванскі *(ст. Кубы)*
Гагрскі хрыбет
Галандыя, галандскі
Галіцыя, галіцыйскі
Галія, гальскі
Гальфстрым
Гамбія, гамбійскі
Гамбург, гамбургскі
Гамільтан *(ст. Бермудскіх а-воў)*
Гана, ганскі
Ганалулу, ганалульскі
Ганг, гангскі
Гандурас, гандураскі
Гановер, гановерскі
Ганцавічы, ганцавіцкі
Гарадзішча, гарадзішчанскі
Гарадок, гарадоцкі
Гарона, гаронскі
Гарынь, гарынскі
Гасконь, гасконскі
Гаўр, гаўрскі
Гаўрызанкар, гаўрызанкарскі
Гаяна, гаянскі
Гвадалквівір, гвадалквівірскі
Гвадэлупа, гвадэлупскі
Гватэмала *(ст. Рэсп. Гватэмала)*
Гвінея, гвінейскі
Гвінейская Рэспубліка
Гвінея-Бісаў
Гвіяна, гвіянскі
Гвіяна Французская
Гданьск, гданьскі
Геленджык, геленджыкскі
Гент, генцкі
Генуя, генуэзскі
Герцагавіна, герцагавінскі
Гжацк, гжацкі
Гібралтар, гібралтарскі
Гімалаі, гімалайскі
Гіндукуш, гіндукушскі
Глазга, глазгаўскі
Глуск, глускі
Глыбокае, глыбоцкі
Гобі, габійскі
Гомель, гомельскі

**Гóмельшчына**
**Гóркі** *(раённы цэнтр)*, **гóрацкі**
**Гóрна-Алтáйск**
**Гóтхаб** *(ст. Грэнландыі)*
**Градзя́нка, градзя́нкаўскі**
**Гранáда** *(горад)*
**Грóдзеншчына**
**Грóдна, грóдзенскі**
**Грóзны, грóзненскі**
**Грýзія, грузíнскі**
**Грэнáда** *(дзяржава)*
**Грэнлáндыя, грэнлáндскі**
**Грэск, грэ́скі**
**Грэ́цыя**
**Грэ́чаская Рэспýбліка**
**Гудзóнаў пралíў**
**Гулістáн, гулістáнскі**
**Гýр'еў, гýр'еўскі**
**Гусь-Хрустáльны**

## Д

**Давы́д-Гарадóк, давы́д-гарадóцкі**
**Дагестáн, дагестáнскі**
**Дáка, дáкскі** *(ст Бангладэш)*
**Дакáр, дакáрскі** *(ст Сенегала)*
**Далёкі Усхóд, далёкаўсхóдні**
**Далмáцыя, далмáцкі**
**Дамáнавічы, дамáнавіцкі**
**Дамáск, дамáскі** *(ст. Сірыі)*
**Дамачóва, дамачóўскі**
**Дамініка**
**Дамінікáнская Рэспýбліка**
**Данбáс, данбáскі**
**Данéц, данéцкі**
**Данéцк, данéцкі**
**Дáнія, дáцкі**
**Дарданéлы, дарданéльскі**
**Дар-эс-Салáм, дар-эс-салáмскі**
*(ст. Танзаніі)*
**Даýрыя, даýрскі**
**Дáўгава, дáўгаўскі**
**Дáўгаўпілс, даўгаўпíлскі**
**Даўгíнава, даўгíнаўскі**
**Джакáрта** *(ст. Інданезіі)*
**Джалалабáд, джалала-**
**бáдскі**
**Джамалýнгма** (Эверэ́ст)
**Джамбýл, джамбýльскі**
**Джóрджтаўн** *(ст Гаяны)*
**Джыбýці** *(ст Рэсп. Джыбуці)*
**Дзвінá, дзвінскі**
**Дзвінск, дзвíнскі**
**Дзíвін, дзíвінскі**
**Дзіснá, дзíсенскі**
**Дзюсельдóрф, дзюсельдóрфскі**
**Дзяржáва Бахрэ́йн**
**Дзяржáва-гóрад Ватыкáн**
**Дзяржáва Ізрáіль**
**Дзяржáва Камбóджа**
**Дзяржáва Кáтар**
**Дзяржáва Кувéйт**
**Дзяржáва Маўры́кій**
**Дзяржы́нск, дзяржы́нскі**
**Дзя́тлава, дзя́тлаўскі**
**Днепр, дняпрóўскі**
**Днепрагэ́с, днепрагэ́саўскі**
**Днепрапятрóўск, днепрапятрóўскі**
**Днестр, днястрóўскі**
**Дóбруш, дóбрушскі**
**Дóкшыцы, дóкшыцкі**
**Дон, данскí**
**Дóха, дóхскі** *(ст. Катара)*
**Драгíчын, драгíчынскі**
**Драгóбыч, драгóбыцкі**
**Друскíнінкай, друскінінкáйскі**
**Друць, дрýцкі**
**Дрýя, дрýйскі**
**Дры́бін, дры́бінскі**
**Дрывя́ты, дрывя́цкі**
**Дрысвя́ты, дрысвя́цкі**
**Дрэ́здэн, дрэ́здэнскі**
**Дýблін, дýблінскі** *(ст. Ірландыі)*
**Дубнá, дубнíнскі**
**Дубрóўна, дубрóвенскі**
**Дубрóўнік, дубрóўніцкі**
**Дýбулты, дýбултаўскі**
**Дýдзінка, дýдзінскі**
**Дунáй, дунáйскі**
**Дунíлавічы, дунíлавіцкі**
**Дуýр, дуýрскі**
**Душанбé, душанбíнскі**
*(ст. Рэспублікі Таджыкістан)*
**Ды́лі** *(ст. Усх. Тымора)*
**Дэ́лі, дэлíйскі** *(ст. Індыі)*
**Дэмакраты́чная Рэспýбліка Сан-**
**Тамэ́ і Пры́нсіпі**
**Дэмакраты́чная Рэспýбліка Судáн**
**Дэмакраты́чная Сацыялісты́чная**
**Рэспýбліка Шры-Ланкá**
**Дэтрóйт, дэтрóйцкі**

## Е

Егіпет, егіпецкі
Езярышча, езярышчанскі
Елгава, елгаўскі
Ельск, ельскі
Енісей, енісейскі
Епіфань, епіфаньскі
Ерэван, ерэванскі
Есентукі, есентукскі
Еўпаторыя, еўпатарыйскі
Еўразія, еўразійскі
Еўропа, еўрапейскі
Еўфраг, еўфрацкі

## Ж

Жабінка, жабінкаўскі
Жабчыцы, жабчыцкі
Жалезнаводск, жалезнаводскі
Жалудок, жалудоцкі
Жлобін, жлобінскі
Жоўтае мора
Журавічы, журавіцкі
Жыгулі, жыгулёўскі
Жыткавічы, жыткавіцкі
Житомір, жытомірскі
Жэмайтэ, жэмайцкі
Жэнева, жэнеўскі

## З

Забайкалле, забайкальскі
Заблудаў, заблудаўскі
Заволжа, заволжскі
Загрэб, загрэбскі
Заір, заірскі
Закарпацце, закарпацкі
Закаўказзе, закаўказскі
Замбія, замбійскі
Запаляр'е, запалярны
Запарожжа, запарожскі
Заслаўе, заслаўскі
Заўралле, заўральскі
Заходні Ірыян, заходнеірыянскі
Заходняе Самоа
Заходняя Дзвіна
Заходняя Сахара
Зеландыя, зеландскі
Зеленаградск, зеленаградскі
Зімбабве, зімбабвійскі
Златапаль, златапальскі
Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі
Злучаныя Штаты Амерыкі (ЗША)
Зомба, зомбінскі
Зондскія астравы
Зэльва, зэльвенскі
Зямля Франца-Іосіфа

## І

Іберыя, іберыйскі
Іванава, іванаўскі
Івана-Франкоўск, івана-франкоўскі
Іваца́вічы, івацэвіцкі
Івянец, івянецкі
Іерусалім, іерусалімскі
Іжэўск, іжэўскі *(ст. Рэспублікі Удмурція)*
Ізмаіл, ізмаільскі
Ізраіль, ізраільскі
Ізяслаў, ізяслаўскі
Ільмень, ільменскі
Ілья, ільянскі
Індакітай, індакітайскі
Інданезія, інданезійскі
Індастан, індастанскі
Індыя, індыйскі
Іпуць, іпуцкі
Ірак, іракскі
Іракская Рэспубліка
Іран, іранскі
Іркуцк, іркуцкі
Ірландская Рэспубліка
Ірландыя, ірландскі
Іртыш, іртышскі
Ісламабад *(ст. Пакістана)*
Ісламская Рэспубліка Іран
Ісламская Рэспубліка Маўрытанія
Ісламская Рэспубліка Пакістан
Ісландыя, ісландскі
Іспанія, іспанскі
Ісык-Куль, ісык-кульскі
Італія
Італьянская Рэспубліка
Іўе, іўеўскі
Іянічнае мора
Іярданія
Іярданскае Хашыміцкае Каралеўства

## Й

**Йакаіці**
**Йакагама, йакагамскі**
**Йаханесбург, йаханесбургскі**
**Йашкар-Ала** *(ст. Рэспублікі Мары Эл)*
**Йемен** (Народная Дэмакратычная Рэспубліка Йемен)
**Йеменская Арабская Рэспубліка**
**Йена, йенскі**
**Йіглава, йіглаўскі**
**Йорк, йоркскі**
**Йоркшыр, йоркшырскі**

## К

**Кааператыўная Рэспубліка Гаяна**
**Каба-Вэрдэ**
**Кабарда, кабардзінскі**
**Кабардзіна-Балкарыя**
**Кабул, кабульскі** *(ст. Рэсп. Афганістан)*
**Каена** *(ст. Франц. Гвіяны)*
**Казань, казанскі**
**Казахстан, казахстанскі**
**Казбек, казбекскі**
**Казлоўшчына, казлоўшчынскі**
**Каір, каірскі** *(ст. Егіпта)*
**Каканд, какандскі**
**Какчэтаў, какчэтаўскі**
**Каларада, каларадскі**
**Калгуеў, калгуеўскі**
**Калімантан, калімантанскі**
**Калінін, калінінскі**
**Калінінград, калінінградскі**
**Калінкавічы, калінкавіцкі**
**Каліфорнія, каліфарнійскі**
**Калмыкія, калмыцкі**
**Каломба** *(ст. Шры-Ланкі)*
**Калуга, калужскі**
**Калумбія, калумбійскі**
**Калхіда, калхідскі**
**Калькута, калькуцкі**
**Кама, камскі**
**Камарын, камарынскі**
**Камбоджа, камбаджыйскі**
**Камень-на-Обі**
**Камерун, камерунскі**
**Каморскія Астравы** (дзяржава)
**Кампала, кампальскі** *(ст. Уганды)*
**Камчатка, камчацкі**
**Камянец, камянецкі**
**Камянец-Падольскі**
**Канада, канадскі**
**Канарскія астравы**
**Канбера, канберскі** *(ст. Аўстралійск. Саюза)*
**Канстанцінопаль**
**Капаткевічы, капаткевіцкі**
**Капенгаген** *(ст. Даніі)*
**Капетдаг, капетдагскі**
**Капры, капрыйскі**
**Капыль, капыльскі**
**Кара-Багаз-Гол**
**Караганда, карагандзінскі**
**Карадар'я, карадар'інскі**
**Каракалпакія, каракалпакскі**
**Каракас, каракаскі** *(ст. Венесуэлы)*
**Каракумы, каракумскі**
**Каралеўства Бельгія**
**Каралеўства Бутан**
**Каралеўства Данія**
**Каралеўства Лесота**
**Каралеўства Марока**
**Каралеўства Нарвегія**
**Каралеўства Непал**
**Каралеўства Нідэрланды**
**Каралеўства Саўдаўская Аравія**
**Каралеўства Свазіленд**
**Каралеўства Тайланд**
**Каралеўства Тонга**
**Каралеўства Швецыя**
**Карачаева-Чаркесія**
**Кардыльеры, кардыльерскі**
**Карлавы Вары, карлаварскі**
**Карма, кармінскі**
**Карпаты, карпацкі**
**Карскія Вароты**
**Карфаген, карфагенскі**
**Карціна-д'Ампеца**
**Каршы, каршынскі**
**Карыбскае мора**
**Карынф, карынфскі**
**Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка**
**Карэлічы, карэліцкі**
**Карэлія, карэльскі**
**Карэя, карэйскі**
**Кастры** *(ст. Сент-Люсіі)*
**Каспійскае мора**

Кастрамá, кастрамскí
Касты́лія, касты́льскі
Касцюкóвічы, касцюкóвіцкі
Касцюкóўка, касцюкóўскі
Катавíцэ, катавíцкі
Каталóнія, каталóнскі
Кáтар, кáтарскі
Катмандý *(ст. Непала)*
Каўкáз, каўкáзскі
Кáўнас, кáўнаскі
Кахéтыя, кахецінскі
Кахінхíна, кахінхíнскі
Кашкадар'я́, кашкадар'інскі
Кейптáўн, кейптáўнскі
Кéмбрыдж, кéмбрыджскі
Кéмерава, кéмераўскі
Кéнія, кенíйскі
Керч, кéрчанскі
Кёльн, кёльнскі
Кзыл-Ардá, кзыл-ардзінскі
Кігáлі, кігáльскі *(ст. Руанды)*
Кíеў, кíеўскі
Кінгісéп, кінгісéпскі
Кінгстан *(ст. Ямайкі)*
Кінгстаун *(ст. Сент-Вінсент і Грэнадзіны)*
Кінешма, кіняшэ́мскі
Кіншáса, кіншáскі *(ст. Заіра)*
Кіпр, кíпрскі
Кіравабáд, кіравабáдскі*
Кіраваград, кіравагрáдскі
Кíраў, кíраўскі
Кíраўск, кíраўскі
Кірыбáці
Кісlавóдск, кісlавóдскі
Кíта *(ст. Эквадора)*
Кітáй, кітáйскі
Кітáйская Нарóдная Рэспýбліка (КНР)
Кішынёў, кішынёўскі *(ст. Рэспублікі Малдова)*
Клáйпеда, клáйпедскі
Клецк, клéцкі
Клíмавічы, клíмавіцкі
Клíчаў, клíчаўскі
Ключаўская сóпка
Княства Ліхтэнштэ́йн
Кóбрын, кóбрынскі
Козьмадзям'янск
Кóльскі паўвóстраў
Кóмі-Пярмяцкая аўтанóмная акрýга
Кóнакры *(ст. Гвінеі)*
Кóнга, кангалéзскі
Кóпысь, кóпыскі
Кóрсіка, карсікáнскі
Кóста-Ры́ка, кóста-рыкáнскі
Кот-д'Івуáр
Кóханава, кóханаўскі
Крамянчýг, крамянчýгскі
Краншта́т, кранштáцкі
Краснавóдск, краснавóдскі
Краснадáр, краснадáрскі
Краснапóлле, краснапóльскі
Краснаярск, краснаярскі
Крýглае, круглянскі
Крýпкі, крýпскі
Крыварóжжа
Кры́вічы, кры́віцкі
Кры́вы Рог, крыварóжскі
Крым, кры́мскі
Крыт, кры́цкі
Кры́чаў, кры́чаўскі
Куáла-Лýмпур *(ст. Малайзіі)*
Кýба, кубінскі
Кубáнь, кубáнскі
Кувéйт, кувéйцкі
Кудымкáр, кудымкáрскі
Кузбáс, кузбáскі
Кузнéцк, кузнéцкі
Кукунóр, кукунóрскі
Куля́б, куля́бскі
Куньлýнь, куньлýньскі
Курá, кýры́нскі
Куранéц, куранéцкі
Курасíо, *нязм.*, курасíўскі
Курга́н, курга́нскі
Курдыстáн, курдыстáнскі
Курляндыя, курляндскі
Курск, кýрскі
Кýршчына
Куры́льскія астравы́
Кустанáй, кустанáйскі
Кутаíсі, кутаíскі
Кызы́л, кызы́льскі *(ст. Рэспублікі Тува)*
Кыргызстáн, кыргызстáнскі
Кя́хта, кя́хцінскі

Л

**Ла-Валéта**, ла-валéцкі
**Лáгас**, лáгаскі *(ст. Нігерыі)*
**Лагішын**, лагішынскі
**Лагóйск**, лагóйскі
**Лáдажскае вóзера**
**Лазáна**, лазáнскі
**Лакáрна**, лакáрнскі
**Ла-Мáнш**, ла-мáншскі
**Ламбáрдыя**, ламбáрдскі
**Ламэ́**, ламэ́йскі *(ст. Тога)*
**Лангедóк**, лангедóкскі
**Лань**, лáнскі
**Лаóс**, лаóскі
**Лаóская Нарóдна-Дэмакрaтычная Рэспýбліка**
**Лаперýза пралíў**
**Лаплáндыя**, лаплáндскі
**Ла-Плáта**, ла-плáцкі
**Латарынгія**, латарынгскі
**Лáтвія**, латвíйскі (але: латышская мова)
**Лéйпцыг**, лéйпцыгскі
**Лéльчыцы**, лéльчыцкі
**Лéна**, лéнскі
**Лéніна**, лéнінскі
**Лéпель**, лéпельскі
**Лесóта**, лесóтаўскі
**Лёзна**, лёзненскі
**Лётцы**, лятчáнскі
**Лібéрыя**, ліберыйскі
**Лібрэвíль**, лібрэвíльскі *(ст. Габона)*
**Лівáдзія**, лівадзíйскі
**Лівáн**, лівáнскі
**Лівáнская Рэспýбліка**
**Ліверпýль**, ліверпýльскі
**Лівія**, лівíйскі
**Ліда**, лíдскі
**Лідзіцэ**, лíдзіцкі
**Ліепая**, ліепайскі
**Ліён**, ліёнскі
**Лілóнгве** *(ст. Малаві)*
**Ліль**, лíльскі
**Ліма**, лíмскі *(ст. Перу)*
**Лімóж**, лімóжскі
**Ліпецк**, ліпецкі
**Лісабóн**, лісабóнскі *(ст. Партугаліі)*
**Літвá**, літóўскі
**Ліхтэнштэйн**, ліхтэнштэ́йнскі
**Лóвацьь**, лóвацкі
**Лодзь**, лóдзінскі
**Лóеў**, лóеўскі
**Лóмжа**, лóмжынскі
**Лóндан**, лóнданскі
**Лос-Áнджэлес**, лос-áнджэлескі
**Лóсвіда**, лóсвідскі
**Луáнда**, луáндскі *(ст. Анголы)*
**Лугáнск**, лугáнскі
**Лужнікí**, лужнікóўскі
**Лукóмль**, лукóмльскі
**Лунінéц**, лунінéцкі
**Лусáка**, лусáкскі *(ст. Замбіі)*
**Лусóн**, лусóнскі
**Луцк**, лýцкі
**Львóў**, львóўскі
**Любань**, лю́банскі
**Люблянa**, люблянскі
**Лю́бча**, любчáнскі
**Люксембýрг** *(ст. Герц. Люксембург)*
**Люцэ́рн**, люцэ́рнскі
**Ля́хавічы**, ля́хавіцкі

М

**Маáс**, маáскі
**Магадáн**, магадáнскі
**Магадыша**, магадышскі *(ст. Самалі)*
**Магелáнаў пралíў**
**Магілёў**, магілёўскі
**Магілёў-Падóльскі**
**Магілёўшчына**
**Магнітагóрск**, магнітагóрскі
**Мадагаскáр**, мадагаскáрскі
**Мадрыд**, мадрыдскі *(ст. Іспаніі)*
**Мазамбíк**, мазамбíкскі
**Мазыр**, мазырскі
**Майдáнак**, майдáнкаўскі
**Майкóп**, майкóпскі
**Майнц**, мáйнцкі
**Македóнія**, македóнскі
**Макéнзі**, макéнзінскі
**Малáба** *(ст. Экватар. Гвінеі)*
**Малáві**, малавíйскі
**Маладзéчна**, маладзéчанскі
**Малáйзія**, малайзíйскі
**Малáйскі архіпелáг**
**Маларыта**, маларыцкі
**Малáя**, малáйскі

Малая Азія, малаазіяцкі
Малдавія, малдаўскі
Мале, малейскі (ст. Мальдываў)
Малі, малійскі
Мальдывы, мальдыўскі
Мальдыўская Рэспубліка
Мальта, мальтыйскі
Манагуа, манагуанскі (ст. Нікарагуа)
Манака, манакскі (ст. княства Манака)
Манама, манамскі (ст. Бахрэйна)
Манблан, манбланскі
Манголія, мангольскі
Маніла, манільскі (ст. Філіпін)
Манпельё, манпельескі
Манровія, манравійскі (ст. Ліберыі)
Манрэаль, манрэальскі
Мантэвідэо (ст. Уругвая)
Маньчжурыя, маньчжурскі
Манчэстэр, манчэстэрскі
Мапуту (ст. Мазамбіка)
Маравія, мараўскі
Мардовія, мардоўскі
Мар'іна Горка, мар'інагорскі
Мармуровае мора
Марока, мараканскі
Мароні (ст. Каморскіх Астравоў)
Марсель, марсельскі
Марцініка, марцінікскі
Марыінская водная сістэма
Марыйская Рэспубліка
Масандра, масандраўскі
Масеру (ст. Лесота)
Маскат (ст. Амана)
Масква, маскоўскі
Масква-рака, масквароцкі
Масква-Таварная
Масты, мастоўскі
Матачкін Шар (праліў)
Маўрыкій, маўрыкійскі
Маўрытанія, маўрытанскі
Махачкала (ст. Дагестана)
Мбабане, мбабанскі (ст. Свазіленда)
Медэо, нязм.
Мекка
Меконг, меконгскі
Мексіка
Мексіканскія Злучаныя Штаты
Меланезія, меланезійскі
Мельбурн, мельбурнскі
Мененг (ст. Науру)
Месапатамія, месапатамскі
Месінскі праліў
Мехіка, мехіканскі (ст. Мексікі)
Мётча, мётчанскі
Міёры, міёрскі
Міжземнае мора, міжземнаморскі
Мікалаеўшчына, мікалаеўшчынскі
Мікашэвічы, мікашэвіцкі
Мілан, міланскі
Мілас, міласкі
Мінгрэлія, мінгрэльскі
Мінданао, мінданаўскі
Мінск, мінскі
Міншчына
Мір, мірскі
Міргарад, міргарадскі
Місісіпі, місісіпскі
Місуры, місурыйскі
Мічыган, мічыганскі
Монтэ-Карла, монтэ-карлінскі
Мора Лапцевых
Морані
Мсціслаў, мсціслаўскі
Мукдэн, мукдэнскі
Мурманск, мурманскі
Мюнхен, мюнхенскі
Мядзведжагорск, мядзведжагорскі
Мядзел, мядзельскі
Мязень, мязенскі
М'янма

## Н

Навагрудак, навагрудскі
Навадзвінск, навадзвінскі
Наваельня, наваельнінскі
Навапола цк, навапол ацкі
Нагорны Карабах, нагорнакарабахскі
Нагоя, нагойскі
Найробі, найробскі (ст. Кеніі)
Нальчык (ст. Кабардзіна-Балкарыі)
Наманган, наманганскі
Намібія, намібійскі
Нанкін, нанкінскі
Нансі, нансійскі

Нант, нанцкі
Нара-Фамінск, нара-фамінскі
Нарач, нарачанскі
Нарва, нарвскі
Нарвегія, нарвежскі
Нармандыя, нармандскі
Народная Дэмакратычная Рэспубліка Йемен
Народная Дэмакратычная Рэспубліка Эфіопія
Народная Рэспубліка Ангола
Народная Рэспубліка Бангладэш
Народная Рэспубліка Бенін
Народная Рэспубліка Конга
Народная Рэспубліка Мазамбік
Народная Сацыялістычная Рэспубліка Албанія
Нароўля, нараўлянскі
Нарымскі край
Нарын, нарынскі
Нар'ян-Мар, нар'ян-марскі
Наса, насаўскі *(ст. Багамскіх Астравоў)*
Наўру, наўрскі
Нахічэвань, нахічэванскі
Нджамена *(ст Рэспублікі Чад)*
Неапалітанскі заліў
Неапаль, неапалітанскі
Негарэлае, негарэльскі
Ненецкая аўтаномная акруга
Непал, непальскі
Нерчынск, нерчынскі
Нёман, нёманскі
Нігер, нігерскі
Нігерыя, нігерыйскі
Нідэрланды, нідэрландскі
Ніжні Тагіл, ніжнетагільскі
Нізок, нізаўскі
Нікалаеў, нікалаеўскі
Нікалаеўск-на-Амуры
Нікарагуа, нікарагуанскі
Нікасія, нікасійскі *(ст. Кіпра)*
Ніл, нільскі
Ніцца, ніцкі
Ніягара, ніягарскі
Ніямей, ніямейскі *(ст. Нігера)*
Новарасійск, новарасійскі
Новасібірск, новасібірскі
Новая Гвінея, новагвінейскі
Новая Зеландыя, новазеландскі
Новая Зямля, новазямельскі
Новая Каледонія, новакаледонскі
Новая Мыш, навамышскі
Ноўгарад, наўгародскі
Ноўка, ноўскі
Нуакшот, нуакшоцкі *(ст. Маўрытаніі)*
Нукуалофа *(ст. Тонга)*
Нумеа *(ст Новай Каледоніі)*
Нью-Йорк, нью-йоркскі
Ньюфаўндленд, ньюфаўндлендскі
Ньяса, ньяскі
Нясвіж, нясвіжскі
Няшчэрда, няшчэрдзінскі

## О

Об, обскі
Обаль, обальскі
Одра, одрынскі (у Польшчы і Чэхіі)
Одэр, одэрскі (у Германіі)
Оксфард, аксфордскі
Омск, омскі
Оржыца, оржыцкі
Орша, аршанскі
Осака, осакскі
Осла, ослаўскі *(ст. Нарвегіі)*
Ост-Індыя, ост-індскі
Охрыд, охрыдскі
Ош, ошскі
Оя, ойскі

## П

Паволжа, паволжскі
Пага-Пага *(ст. Усходняга Самоа)*
Падмаскоўе, падмаскоўны
Падсвілле, падсвільскі
Падуя, падуанскі
Па-дэ-Кале
Пакістан, пакістанскі
Паланга, палангскі
Палата (рака)
Палессе, палескі
Палесціна, палесцінскі
Палех, палехскі
Палінезія, палінезійскі
Палтава, палтаўскі
Памір, памірскі
Памор'е, паморскі

Пампéі, пампéйскі
Панáма, панáмскі *(ст Рэсп. Панама)*
Папакатэпетль
Папеэтэ *(ст Франц. Палінезіі)*
Пáпуа — Нóвая Гвінéя
Парагвáй, парагвáйскі
Парамарыба *(ст Сурынама)*
Партугáлія, партугáльскі
Парыж, парыжскі
Пáрычы, пáрыцкі
Пастáвы, пастáўскі
Патсдáм, патсдáмскі
Паўднёвая Асéція
Паўднёва-Афрыкáнская Рэспýбліка
Паўднёва-Кітáйскае мóра
Паўднёвая Карэя
Паўладáр, паўладáрскі
Паўнóчнае мóра
Паўнóчна-Казахстáнская вóбласць
Паўнóчная Амéрыка, паўнóчнаамерыкáнскі
Паўнóчная Асéція
Паўнóчная Букавіна
Паўнóчная Дзвінá
Паўнóчны Каўкáз, паўночнакаўкáзскі
Паўнóчны Ледавіты акіян
Пекін, пекінскі
П'емóнт, п'емóнцкі
Пéнза, пéнзенскі
Пенсільвáнія, пенсільвáнскі
Перакóп, перакóпскі
Перамышль, перамышльскі
Пераслáўль, пераслáўскі
Перм, пéрмскі
Пéрсія, персідскі
Перý, перуáнскі
Першамáйск, першамáйскі
Петразавóдск *(ст Рэспублікі Карэлія)*
Петрапáўлаўск, петрапáўлаўскі
Петрапáўлаўск-Камчáцкі
Пéтрыкаў, пéтрыкаўскі
Пецярбýрг, пецярбýргскі
Пéчанга, пéчангскі
Пікардыя, пікардыйскі
Пінск, пінскі
Піншчына
Пірэнéі, пірэнéйскі
Пітсбург, пітсбургскі
Пітэрсбург, пітэрсбургскі
Плаéшці, плаéшцінскі
Плéшчаніцы, плéшчаніцкі
Пліса, плiскі
Пльзень, пльзéньскі
Пнампéнь *(ст. Камбоджы)*
Пóзнань, пазнáнскі
Пóлацк, пóлацкі
Пóлаччына
Пóльская Рэспýбліка
Пóльшча
Пóразава, пóразаўскі
Пóрта-Нóва *(ст Беніна)*
Порт-Артýр, порт-артýрскі
Порт-Луі, порт-луіскі *(ст. Маўрыкія)*
Порт-Мóрсбі *(ст. Папуа — Новай Гвінеі)*
Порт-о-Прэнс *(ст. Гаіці)*
Порт-оф-Спéйн *(ст. Трынідада і Табага)*
Порт-Саід, порт-саідскі
Правáнс, правáнскі
Прáга, прáжскі *(ст Чэхіі)*
Прáя *(ст Каба-Вэрдэ)*
Пржавáльск, пржавáльскі
Прóня, прóнскі
Пружáны, пружáнскі
Прýсія, прýскі
Прут, прýцкі
Прыамýр'е, прыамýрскі
Прыбайкáлле, прыбайкáльскі
Прыбáлтыка, прыбалтыйскі
Прымóрскі край
Прыпяць, прыпяцкі
Прэсня, прэсненскі
Прэтóрыя *(ст. Паўдн.-Афрык. Рэсп.)*
Пскоў, пскóўскі
Пуацьé, *нязм*
Пýхавічы, пýхавіцкі
Пуціўль, пуціўльскі
Пуэрта-Рыка, пуэрта-рыкáнскі
Пхеньян, пхеньянскі *(ст КНДР)*
Пціч, пцічанскі
Пярну, пярнускі
Пяцігóрск, пяцігóрскі
Пячóра, пячóрскі

## Р

Раба́т, раба́цкі *(ст. Марока)*
Рагачо́ў, рагачо́ўскі
Радашко́вічы, радашко́віцкі
Ра́дунь, ра́дунскі
Разо́ *(ст. Дамінікі)*
Ра́каў, ра́каўскі
Расі́я, расі́йскі
Раска́зава, раска́заўскі
Расо́ны, расо́нскі
Расо́ха *(рака)*, расо́хінскі
Растоў-на-До́не
Ратэрда́м, ратэрда́мскі
Ра́ўбічы, ра́ўбіцкі
Ржэў, ржэ́ўскі
Ро́на, ро́нскі
Ро́слаўль, ро́слаўльскі
Ру́дзенск, ру́дзенскі
Ру́дня, рудня́нскі
Ружа́ны, ружа́нскі
Румы́нія, румы́нскі
Русь, ру́скі
Ры́га *(ст. Латвіі)*
Ры́жскае ўзмо́р'е
Рым, ры́мскі
Ры́о-дэ-Жане́йра, ры́о-дэ-жане́йрскі
Рыўе́ра, рыўе́рскі
Рэ́йк'явік, рэйк'я́вікскі *(ст. Ісландыі)*
Рэймс, рэ́ймскі
Рэйн, рэ́йнскі
Рэспу́бліка Балі́вія
Рэспу́бліка Батсва́на
Рэспу́бліка Буру́ндзі
Рэспу́бліка Вануа́ту
Рэспу́бліка Венесуэ́ла
Рэспу́бліка Гаі́ці
Рэспу́бліка Га́мбія
Рэспу́бліка Га́на
Рэспу́бліка Гандура́с
Рэспу́бліка Гватэма́ла
Рэспу́бліка Гвіне́я-Біса́у
Рэспу́бліка Джыбу́ці
Рэспу́бліка Заі́р
Рэспу́бліка За́мбія
Рэспу́бліка Зімба́бве
Рэспу́бліка Інданэ́зія
Рэспу́бліка І́ндыя
Рэспу́бліка Ісла́ндыя
Рэспу́бліка Ка́ба-Вэ́рдэ
Рэспу́бліка Калу́мбія
Рэспу́бліка Камеру́н
Рэспу́бліка Ке́нія
Рэспу́бліка Кіпр
Рэспу́бліка Кірыба́ці
Рэспу́бліка Ко́ста-Ры́ка
Рэспу́бліка Кот-д'Івуа́р
Рэспу́бліка Ку́ба
Рэспу́бліка Лібе́рыя
Рэспу́бліка Мала́ві
Рэспу́бліка Малі́
Рэспу́бліка Ма́льта
Рэспу́бліка Ні́гер
Рэспу́бліка Ніка́рагуа
Рэспу́бліка Пана́ма
Рэспу́бліка Парагва́й
Рэспу́бліка Перу́
Рэспу́бліка Сан-Мары́на
Рэспу́бліка Сейшэ́льскія Астравы́
Рэспу́бліка Сенега́л
Рэспу́бліка Сінгапу́р
Рэспу́бліка Суда́н
Рэспу́бліка Сурына́м
Рэспу́бліка Сьера-Лео́нэ
Рэспу́бліка Трыніда́д і Таба́га
Рэспу́бліка Уга́нда
Рэспу́бліка Філіпі́ны
Рэспу́бліка Чад
Рэспу́бліка Чы́лі
Рэспу́бліка Эквадо́р
Рэспу́бліка Экватарыя́льная Гвіне́я
Рэспу́бліка Эль-Сальвадо́р
Рэ́чыца, рэ́чыцкі
Рэюньён, рэюньёнскі

## С

Саа́рская во́бласць
Саво́я, саво́йскі
Садру́жнасць Бага́мскіх Астраво́ў
Садру́жнасць Дамі́нікі
Като́льнікі, сако́льніцкі
Саксо́нія, саксо́нскі
Салаве́цкія астравы́
Саламо́навы астравы́
Салаўкі́, салаве́цкі
Салеха́рд, салеха́рдскі
Салігорск, салігорскі
Саліка́мск, саліка́мскі
Сало́нікі, сало́нікскі

Сальвадор, сальвадорскі
Самалі, самалійскі
Самалійская Дэмакратычная Рэспубліка
Самарканд, самаркандскі
Самур-Апшэронскі канал
Сана, санінскі *(ст. Йемен Араб Рэсп.)*
Санга, сангінскі
Сангарскі праліў
Санкт-Пецярбург, санкт-пецярбургскі
Сан-Марына *(ст. Рэсп. Сан-Марына)*
Сан-Паулу, сан-паульскі
Сан-Сальвадор *(ст. Эль-Сальвадора)*
Санта-Дамінга *(ст. Дамініканскай Рэсп.)*
Сан-Тамэ *(ст. Сан-Тамэ і Прынсіпі)*
Сант'яга, сант'ягскі *(ст. Чылі)*
Сан-Францыска, сан-францыскі
Сан-Хасэ, *нязм. (ст. Коста-Рыкі)*
Сан-Хуан *(ст. Пуэрта-Рыка)*
Сапоцкін, сапоцкінскі
Сараева, сараеўскі
Саранск *(ст. Мардовіі)*
Саратаў, саратаўскі
Сарбона, сарбонскі
Сардзінія, сардзінскі
Сарэнга, сарэнцкі
Саўдаўская Аравія
Сафія, сафійскі *(ст. Балгарыі)*
Сахалін, сахалінскі
Сахара, сахарскі
Сацыялістычная Народная Лівійская Арабская Джамахірыя
Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам (СРВ)
Свазіленд, свазілендскі
Сванетыя, сванецкі
Свержань, свержанскі
Светлагорск, светлагорскі
Свір, свірскі
Свіслач, свіслацкі
Свіцязь, свіцязьскі
Свяцілавічы, свяцілавіцкі
Севастопаль, севастопальскі
Севілья, севільскі
Седан, седанскі
Сейшэльскія астравы
Сена, сенскі
Сен-Дэні, сен-дэнійскі *(ст. Рэюньёна)*
Сенегал, сенегальскі
Сент-Вінсент і Грэнадзіны
Сент-Джорджэс *(ст. Грэнады)*
Сент-Люсія
Сербія, сербскі
Серпухаў, серпухаўскі
Сеул, сеульскі *(ст. Паўдн. Карэі)*
Сібір, сібірскі
Сідней, сіднейскі
Сілезія, сілезскі
Сімферопаль, сімферопальскі
Сінгапур, сінгапурскі *(ст. Рэсп. Сінгапур)*
Сіроціна, сіроцінскі
Сірыйская Арабская Рэспубліка
Сірыя
Сіхатэ-Алінь, сіхатэ-алінскі
Сіцылія, сіцылійскі
Сіянь, сіяньскі
Скандынавія, скандынаўскі
Скідаль, скідальскі
Скоп'е, скоп'еўскі
Славенія, славенскі
Слаўгарад, слаўгарадскі
Слонім, слонімскі
Слуцк, слуцкі
Случ, случанскі
Случчына
Смаленск, смаленскі
Смаленшчына
Смалявічы, смалявіцкі
Смаргонь, смаргонскі
Снуды, снудзенскі
Сож, сожскі
Сольвычагодск, сольвычагодскі
Соль-Ілецк, соль-ілецкі
Сонечнагорск, сонечнагорскі
Сочы, сочынскі
Спарта, спартанскі
Спаскае-Лутавінава
Стакгольм, стакгольмскі *(ст. Швецыі)*
Стамбул, стамбульскі
Старая Руса, старарусаўскі
Старобін, старобінскі
Старыя Дарогі, старадарожскі
Стаўрапаль, стаўрапольскі
Столін, столінскі

Стóўбцы, стаўбцóўскі
Стрáсбург, стрáсбургскі
Стрэ́шын, стрэ́шынскі
Стыр, сты́рскі
Сýва, сувíйскі (ст. Фíджы)
Судáн, судáнскі
Судзéты, судзéцкі
Судзісла́ўль, судзісла́ўскі
Сýздаль, сýздальскі
Сýкрэ, нязм (ст. Балівіі)
Султанáт Амáн
Сумáтра, сумáтрынскі
Сýмы, сумскí
Сýраж, сýражскі
Сурхандар'я́, сурхандар'і́нскі
Сурынáм, сурынáмскі
Сухýмі, сухýмскі (ст. Абхазіі)
Суэ́ц, суэ́цкі
Сцепанакéрт, сцепанакéрцкі
Сы́зрань, сы́зранскі
Сыктыўкáр (ст. Рэспублікі Комі)
Сырдар'я́, сырдар'і́нскі
Сьéра-Леóнэ, сьéра-леóнскі
Сяля́ва, сяля́ўскі
Сяміпалáцінск, сяміпалáцінскі
Сяннó, сéнненскі

## Т

Тагалéзская Рэспýбліка
Таганрóг, таганрóгскі
Таджыкістáн, таджыкістáнскі
(але: таджыкская мова)
Тайвáнь, тайвáньскі
Тайлáнд, тайлáндскі
Таймы́р, таймы́рскі
Талáс, талáскі
Талачы́н, талачы́нскі
Талды́-Кургáн, талды́-кургáнскі
Тáлін, тáлінскі (ст. Эстоніі)
Тамáнь, тамáнскі
Тамашóўка, тамашóўскі
Тамбóў, тамбóўскі
Танжэ́р, танжэ́рскі
Танзáнія, танзанíйскі
Тарáва, тарáўскі (ст. Кірыбаці)
Тáрту, тáртускі
Тасмáнія, тасмáнскі
Татáрыя, татáрскі
Тáтры, татрáнскі
Ташаýз, ташаýзскі
Ташкéнт (ст. Узбекістана)
Тбілíсі (ст. Грузіі)
Тóга, тагалéзскі
Тóкіо, такíйскі (ст. Японіі)
Томск, тóмскі
Тóнга, тангáнскі
Трабзóн, трабзóнскі
Трóя, траянскі
Трускавéц, трускавéцкі
Трыéст, трыéсцкі
Трынідáд і Табáга
Тры́палі, трыпалíйскі
(ст. Лівіі)
Туапсэ́, туапсíнскі
Тувá, тувінскі
Тувáлу, нязм
Тýла, тýльскі
Тулóн, тулóнскі
Тунíс, тунíскі
Тур, тýрскі
Турá, туры́нскі
Тýраў, тýраўскі
Тургáй, тургáйскі
Туркменістáн, туркменістáнскі
(але: туркменская мова)
Тýрцыя, турэ́цкі
Тхімпхý (ст. Бутана)
Тыбéт, тыбéцкі
Тыбр, ты́брскі
Тыгр, ты́грскі
Тымóр, тымóрскі
Тырáна, тырáнскі (ст. Албаніі)
Ты́рнава, ты́рнаўскі
Тырэ́нскае мóра
Тэгерáн, тэгерáнскі
(ст. Ірана)
Тэгусігáльпа (ст. Гандураса)
Тэль-Авíў, тэль-авíўскі
Тэ́мза, тэ́мзенскі
Тэрмéз, тэрмéзскі

## У

Уагадýгу, уагадýгскі
(ст. Буркіна-Фасо)
Уáза, уáзскі
Ýбарць, убарця́нскі
Увáравічы, увáравіцкі
Угáнда, угандыйскі
Удмýрція, удмýрцкі
Ýжгарад, ýжгарадскі
Узбекістáн, узбекістáнскі (але: узбекская мова)

Уздá, уздзéнскі
Украíна, украíнскі
Ýла, ýльскі
Уладзівастóк, уладзівастóцкі
Уладзíмір, уладзíмірскі
Улáн-Бáтар *(ст. Манголіі)*
Улáн-Удэ́ *(ст. Бурацыі)*
Ульянаўск, ульянаўскі
Ýмань, умáнскі
Унéча, унéцкі
Урáл, урáльскі
Урáльск, урáльскі
Урáнгеля вóстраў
Ургéнч, ургéнцкі
Уругвáй, уругвáйскі
Урэ́чча, урэ́цкі
Усýры, усурыйскі
Усхóдне-Казахстáнская вóбласць
Усхóдне-Кітáйскае мóра
Усхóдне-Сібíрскае мóра
Усхóдні Тымóр
Усхóдняя Рэспýбліка Уругвáй
Усць-Абакáн, усць-абакáнскі
Усць-Ардынская Бурáцкая аўтанóмная акрýга
Усць-Ардынскі
Усць-Каменагóрск, усць-каменагóрскі
Уфá, уфíмскі *(ст. Рэспублікі Башкартастан)*
Ушáча *(рака)*
Ушáчы, ушáцкі
Уэлéн, уэлéнскі
Уэ́льс, уэ́льскі

## Ф

Фарынава, фарынаўскі
Феадóсія, феадасíйскі
Федэрáльная Ісламская Рэспýбліка Камóрскія Астравы
Федэратыўная Рэспýбліка Бразілія
Федэратыўная Рэспýбліка Германіі (ФРГ)
Федэратыўная Рэспýбліка Нігéрыя
Федэрáцыя Малáйзія
Ферганá, фергáнскі
Фермапілы, фермапільскі
Фíджы, фіджыйскі
Філадэ́льфія, філадэльфíйскі
Філіпíны, філіпíнскі
Фінляндская Рэспýбліка
Фінляндыя
Фларэ́нцыя, фларэнцíйскі
Фор-дэ-Фрáнс *(ст. Марцінікі)*
Фрáнкфурт-на-Мáйне
Фрáнкфурт-на-Óдэры
Францýзская Рэспýбліка
Фрытаун, фрытáўнскі *(ст. Сьера-Леонэ)*
Фунафýці *(ст. Тувалу)*

## Х

Хабáраўск, хабáраўскі
Хакáсія, хакáскі
Халóпенічы, халóпеніцкі
Халхíн-Гол, халхін-гóльскі
Ханіяра, ханіярскі *(ст. Саламон. Астравоў)*
Хáнка *(возера)*, хáнкінскі
Ханóй, ханóйскі *(ст. В'етнама)*
Хáнты-Мансíйск, хáнты-мансíйскі
Харáрэ *(ст. Зімбабве)*
Харвáтыя, харвáцкі
Хáркаў, хáркаўскі
Харóг, харóгскі
Хартýм, хартýмскі *(ст. Судана)*
Харэ́змская вóбласць
Хатынь, хатынскі
Хахламá, хахламскі
Хашымíн, хашымíнскі
Хéльсінкі, хéльсінскі *(ст. Фінляндыі)*
Херсóн, херсóнскі
Хібíны, хібíнскі
Хірасíма, хірасíмскі
Хмяльніцкая вóбласць
Хóйнікі, хóйніцкі
Хóцімск, хóцімскі
Хуанхэ́, хуанхэ́йскі

## Ц

Цалінаград, цалінагрáдскі
Целяхáны, целяхáнскі
Цéрак, цéрскі
Церахóўка, церахóўскі
Цірáспаль, цірáспальскі
Цірóль, цірóльскі
Цíса, цíскі
Цíхвін, ціхвíнскі
Цíхі акіян, ціхаакіянскі
Цусíмскі пралíў

Цхалтуба, цхалтубскі
Цхінвалі, цхінвальскі
Цымервальд, цымервальдскі
Цэйлон, цэйлонскі
Цэлебескае мора
Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка
Цюмень, цюменскі
Цюрынгія, цюрынгскі
Цюрых, цюрыхскі
Цяньцзінь, цяньцзіньскі
Цянь-Шань, цянь-шаньскі
Цярнопаль, цярнопальскі

Ч

Чавусы, чавускі
Чад, чадскі
Чанстахова, чанстахоўскі
Чарапавец, чарапавецкі
Чарджоў, чарджоўскі
Чаркасы, чаркаскі
Чарнагорыя, чарнагорскі
Чарнаўцы, чарнавіцкі
Чарнігаў, чарнігаўскі
Чарнобыль, чарнобыльскі
Чачэрск, чачэрскі
Чашнікі, чашніцкі
Чорнае мора, чарнаморскі
Чувашыя, чувашскі
Чудское возера
Чукотка, чукоцкі
Чыкага, чыкагскі
Чылі, чылійскі
Чымкент, чымкенцкі
Чырвонае мора
Чыта, чыцінскі
Чэбаксары *(ст. Чувашыі)*
Чэлябінск, чэлябінскі
Чэрвень, чэрвенскі
Чэркеск, чэркескі
Чэрыкаў, чэрыкаўскі

Ш

Шанхай, шанхайскі
Шарамецьева, шарамецьеўскі
Шарашова, шарашоўскі
Шаркоўшчына, шаркоўшчынскі
Шатландыя, шатландскі
Швейцарская Канфедэрацыя
Швейцарыя
Швецыя, шведскі
Шклоў, шклоўскі
Шпіцберген, шпіцбергенскі
Шпрэ, шпрэйскі
Шры-Ланка, шры-ланкійскі
Штутгарт, штутгарцкі
Шуміліна, шумілінскі
Шчара, шчарынскі
Шчучын, шчучынскі

Э

Эвенкія, эвенкійскі
Эгейскае мора
Эквадор, эквадорскі
Экватарыяльная Гвінея
Эліста, элісцінскі *(ст. Калмыкіі)*
Эль-Аюн *(ст. Зах. Сахары)*
Эльба, эльбінскі
Эльбрус, эльбрускі
Эль-Кувейт *(ст. Кувейта)*
Эр-Рыяд *(ст. Саудаўскай Аравіі)*
Эфіопія, эфіопскі

Ю

Юкан, юканскі
Юкатан, юкатанскі
Юлійская Крайна
Юра, юрскі
Юрацішкі, юрацішкаўскі
Юрмала, юрмальскі
Ютландыя, ютландскі

Я

Ява, яванскі
Якуція, якуцкі
Ялта, ялцінскі
Ямайка, ямайскі
Ямал, ямальскі
Ямала-Ненецкая аўтаномная акруга
Ямусукра *(ст. Кот-д'Івуара)*
Янавічы, янавіцкі
Янгіер, янгіерскі
Янгон *(ст. Саюза М'янма)*
Яраслаўль, яраслаўскі
Ясельда, ясельдзінскі
Ясень, ясеньскі
Ясная Паляна, яснапалянскі
Яўндэ, яўндскі *(ст. Камеруна)*
Яя, яйскі

# ПРОЗВІШЧЫ*

Абразцоў
Абухаў
Авагадра
Авенарыус
Аверчанка, *дав., месн* -ку
Авіцэна
Авяр'янаў
Агароў
Адоеўскі
Ады Эндрэ, *нязм.*
Ажэшка Эліза
Альбіноні Тамаза, *нязм.*
Альмінскі
Аляб'еў
Амаду Жоржы
Аменхатэп
Андрэа дэль Сарта
Андэрсен-Нэксе Марцін
Аненкаў
Антыкайнен
Арбелі, *нязм.*
Арбузаў
Арджанікідзе Сярго, *нязм.*
Аркадзьеў
Арнольдзі
Арсеньеў
Арыёста, *нязм.*
Арыстаў
Арыстафан
Арыстоцель, *аб* Арыстоцелю
Асаф'еў
Асіпенка
Астравіцянаў
Астравумаў
Астраглазаў
Астраградскі
Астроўскі
Астужаў
Асцье дэ ля Віжэры
Аўэзаў
Афанасьеў
Ахлопкаў

Багалепаў
Багалюбаў
Багамолец
Багародскі
Багдановіч
Баграціён
Бадуэн дэ Куртэнэ
Байран, *аб* Байране
Бакачо Джавані
Балакіраў
Бальмонт, *аб* Бальмонце
Баляслаўскі
Бамаршэ П'ер Агюстэн Карон
Барадзін
Барадуля, *дав., месн.*-лю
Баратынскі
Барб'е, *нязм.*
Барклай дэ Толі
Баўэр, *аб* Баўэру
Бацвіннік
Бацюшкаў
Безыменскі
Белавусаў
Бенуа, *нязм.*
Бергольц
Берліёз Гектор
Бернал
Бетховен
Бехцераў
Бёрбанк
Біешу, *нязм.*
Біе-Варэн Жан Нікала
Бізэ, *нязм.*
Бікчэнтаеў
Бічэр-Стоу
Бію Франсуа
Біянкі, *нязм.*
Благанраваў
Благой
Богаяўленскі
Божыдар Лаўрыч
Бонч-Бруевіч
Боцеў Хрыста
Брадзіхін
Брант
Браун
Бржазоўскі
Брулоў
Бруна Джардана
Брусаў
Брыль, *аб* Брылю
Брэдэль
Брэхт Бертальт

* У слоўнік уключаны прозвішчы, якія выклікаюць пэўныя цяжкасці пры напісанні.

**Буало́ Ніка́ла**
**Бу́бнаў**
**Бубянно́ў**
**Будзённы**
**Бу́дны Сымо́н**
**Буйло́ Канста́нцыя**
**Бурдэ́нка**
**Бу́тлераў**
**Буш'е́**, *нязм*
**Бушы́ла**, Бушы́лу
**Бэ́кан**
**Бю́лаў**
**Бюфо́н**
**Бяда́**, Бядзе́
**Бяду́ля**, Бяду́лю
**Бялі́нскі**
**Бяло́ў**
**Бялыні́цкі-Біруля́**
**Бяля́еў**

**Вадап'я́наў**
**Вааздзві́жанскі**
**Вазнясе́нскі**
**Ва́йнанен**
**Вайцяхо́ўскі**
**Валко́нскі**
**Валчэ́цкая Алёна**
**Вальга́ Святасла́віч** і **Святасла́вавіч**
**Вальтэ́р**
**Ван Го́г**
**Ван Дэ́йк**
**Ван дэр Ме́йлен**
**Ван Э́йк**
**Ва́рэс**
**Васі́льеў**
**Васі́льчанка**
**Ва́ска да Га́ма**
**Васкрасе́нскі**
**Васняцо́ў**
**Вату́цін**
**Ваўчо́к Ма́рка**
**Вашчы́ла**, Вашчы́лу
**Вашынгто́н Джордж**
**Вая́н-Куцюр'е́**, *нязм.*
**Ведзяне́еў**
**Венецыя́наў**
**Ве́нцлава Анта́нас**
**Веняві́цінаў**
**Вераб'ёў**
**Верасა́еў**
**Верашча́гін**
**Ве́рдзі Джузе́пе**, *нязм*
**Веро́к'ё**, *нязм*
**Веспу́чы Аме́рыга**
**Весяло́ўскі**
**Віва́льдзі**
**Віке́нцьеў**
**Ві́льямс**
**Віярдо́ Палі́на**
**Во́лкаў**
**Воўк-Левано́віч**
**Вунт**
**Вучэ́ціч**
**Высо́цкі**
**Вышале́скі**
**Вышасла́ўскі**
**Вя́земскі**
**Вярна́дскі**
**Вярсто́ўскі**
**Вяршы́гара**
**Вяры́га-Дарэ́ўскі**
**Вярэ́йскі**
**Вясні́н**

**Габрыеля́н**
**Гайдн**
**Галакціёнаў**
**Галаўня́**, Галаўні́
**Галіле́й Галіле́о**
**Гальдэнве́йзер**
**Галяні́шчаў-Куту́заў**
**Гаме́р**, *аб* **Гаме́ру**
**Га́ндзі Раджы́ў**
**Гарагля́д**
**Гарлахва́цкі**
**Га́рсія**, *нязм.*
**Га́ртны Ці́шка**
**Гарыба́льдзі**
**Гастэ́ла Мікала́й**, Гастэ́лу Мікала́ю
**Га́ўптман**
**Га́ўс**
**Гацье́**
**Га́шак**
**Геарга́дзе**, *нязм*
**Геаргі́у-Дэж**
**Гедымі́н**
**Гей-Люса́к**
**Ге́йнэ**
**Ге́кель**
**Гельве́цый**
**Гельмго́льц**
**Ге́ндэль**

**Гео́ргіеўскі**
**Гера́кл**
**Гера́сімаў**
**Ге́рцэн**
**Гесіёд**
**Гётэ Ісяга́н Во́льфганг**
**Гі дэ Мапаса́н**
**Гільдэбра́нт**
**Гірланда́йо Даме́ніка**
**Гіяцы́нтаў**
**Гле́бка**, Гле́бку
**Гліе́р**
**Гне́дзіч**
**Го́лсуарсі**, *нязм*
**Го́йя Франсі́ска**
**Гра́фціо**, *нязм*
**Грыго́р'еў**
**Гу́мбальт**
**Гурые́лі**
**Гу́тэнберг**
**Гюё Раймо́н**

**Дабралю́баў**
**Дабранра́ваў**
**Давідэ́нка**
**Давы́даў**
**Давыдзе́нка**
**Дадыя́ні**
**Дадэ́ Альфо́нс**
**Далгару́каў**
**Далі́х**, *нязм*
**Дальто́н**
**Дамаскі́н Ісія́н**
**Да́нтэ Аліг'е́ры**, *нязм.*
**Даргамы́жскі**
**Джаваньёлі**, *нязм.*
**Джо́ўль**
**Дзегцяро́ў**
**Дзідро́ Дэні**, *нязм*
**Дзі́кенс**
**Дзімі́траў**
**Дзмітэ́рка**
**Дзью́і**, *нязм*
**Дзю́ба**, Дзю́бе
**Дзюкло́**, *нязм*
**Дзю́рынг**
**Дзядзю́шка**, Дзядзю́шку
**Дзя́каў**
**Дзяме́нцьеў**
**Дзям'я́наў**
**Дзяржа́він**
**Дзяржы́нскі**

**До́ўнар-Запо́льскі**
**Дро́жджын**
**Ду́ндзіч Але́ка**
**Ду́нін-Марцінке́віч**
**Дурнаво́**, *нязм.*
**Дыяге́н**
**Дэбюсі́**, *нязм*
**Дэка́рт**
**Дэ Кастэ́р Шарль**
**Дэмакры́т**
**Дэ́ніс**
**Дэфо́ Даніе́ль**

**Еліза́р'еў**
**Елісе́еў**
**Е́льцын**
**Ельяшэ́віч**
**Емелья́наў**
**Ермала́еў**
**Ераме́еў**
**Ерафе́еў**
**Еўдакі́маў**
**Еўсцігне́еў**
**Еўтушэ́нка**
**Еўфрасі́ння По́лацкая**

**Жаліо́-Кюры́**, *нязм.*
**Жалто́ўскі**
**Жаля́баў**
**Жалязно́ў**
**Жамчу́жнікаў**
**Жарэ́с**
**Жо́лудзеў**
**Жуль Верн**, Жу́ля Ве́рна
**Журба́**, **Журбе́**
**Жусье́**, *нязм.*
**Жыска́р д'Эстэ́н Валеры́**

**Заўя́лаў**
**Захарыя́дыс**
**Звя́гінцаў**
**Зіза́ній Лаўрэ́нцій**
**Златаву́ст**
**Зэ́герс**
**Зялі́нскі**

**Ібару́ры Дало́рэс**
**Ібн Сі́на**
**І́бсен Ге́нрык**
**Іва́наў Усе́валад**
**Івано́ў**
**Ільі́н-Жэне́ўскі**

**Ільі́нскі**
**Ілья́ Му́рамец**
**Іо́фэ**, *нязм*
**Іра́сек Ало́іс**
**Ісаакя́н**
**Іяггансо́н**

**Йакубо́ніс**
**Йаме́лі**, *нязм*
**Йо́жэф Аці́ла**
**Йо́рданс**
**Йо́туні**, *нязм*
**Йо́ўкаў Йарда́н**
**Йо́хані**, *нязм.*

**Каваленак**, *аб* **Каваленку**
**Кавенья́к**
**Кажаду́б**, *аб* **Кажаду́бе**
**Казьма́ Пруткоў**
**Кайгаро́даў**
**Акіна́кі**, *нязм*
**Каме́йша**, Каме́йшу
**Кампане́ла Тама́за**
**Канабе́еўскі**
**Канапля́**, Канаплі́
**Кандра́т Крапіва́**, Кандра́ту
Крапіве́
**Кандра́цьеў**
**Караленка**
**Карвала́н Луі́с**
**Карнаву́хаў**
**Карняйчу́к**
**Карпе́нка-Ка́ры**
**Каста́ньё Андрэ́а**
**Ка́стра Рус Фідэ́ль**
**Касцю́шка**
**Ка́уцкі**
**Кацюбі́нскі**
**Кашаво́й**
**Квінтыля́н**
**Ке́нэдзі**, *нязм.*
**Ке́рэс**
**Кетлі́нская**
**Кім Ір Се́н**
**Кіры́лаў**
**Кла́ўзевіц**, *аб* **Кла́ўзевіцу**
**Кле́пча**, *дав.* **Кле́пчу**
**Кліме́нцьеў**
**Клімук**, *аб* **Клімуку́**
**Ключэ́ўскі**
**Кляўчэ́ня**, Кляўчэ́ні
**Ко́йвіста Ма́ўна**, *нязм.*
**Ко́нан До́йл Арту́р**
**Космадзям'я́нская**
**Ко́стычаў**
**Крамско́й**
**Крашані́ннікаў**
**Кржыжано́ўскі**
**Крупе́ня**, Крупе́ні
**Крывашэ́еў**
**Кузьма́ Чо́рны**, Кузьме́
Чо́рнаму
**Куі́нджы**, *нязм.*
**Ку́йбышаў**
**Кукрыні́ксы**, -саў
**Ку́пер Джэймс Феніма́р**
**Куу́сінен**
**Куцы́н**, Куцыну́
**Кушчэ́ўскі**
**Кюўе́**, *нязм.*
**Кюхельбе́кер**

**Лаўазье́**, *нязм*
**Лажэ́чнікаў**
**Ла́зараў**
**Ланаво́й**
**Ланда́у**, *нязм*
**Лаўрэ́нцьеў**
**Лафантэ́н**
**Леана́рда да Ві́нчы**, *нязм.*
**Леані́даў**
**Ле́бедзеў**
**Ле Карбюзье́**, *нязм*
**Ле́мешаў**
**Лепяшы́нскі**
**Ліне́й Карл**
**Ліліента́ль**
**Літві́наў**
**Ло́пэ дэ Ве́га**, *нязм.*
**Лугаўско́й**
**Лукрэ́цый**
**Луму́мба Патры́с**
**Ляві́цкі**
**Лаво́нцьеў**
**Ляско́ў**

**Ма́ерава**
**Маза́ччa**, *нязм*
**Ма́йбарада**, *дав.* Ма́йбарадзе
**Мака́ранка**
**Макраву́саў**
**Малча́наў**
**Ма́лышаў**
**Мальер Жан Баці́ст**
**Ма́мін-Сібіра́к**
**Ма́нізер**

Мантэвэрдзі, *нязм*
Мантэск'е, *нязм*
Мардвінаў
Мартынаў
Марцінкявічус
Марэсьеў
Матэйка
Мдывані, *нязм*
Медавараў
Меерхольд
Межалайціс Эдуардас
Мележ, *аб* Мележу
Мендзялееў
Меражкоўскі
Мерацкоў
Мерымэ Праспер
Метрэвелі, *нязм.*
Мешчанінаў
Мешчаракоў
Мікеланджэла
Міклуха-Маклай
Мікула Селянінавіч
Міхоэлс
Морзэ, *нязм*
Моцарт Вольфганг Амадэй
Мусаргскі
Мюнхгаузен
Мюнцэр
Мянжынскі

Наваі Алішэр
Навасільцаў
Навуменка
Нагнібеда
Надзеждзін
Налбандзян
Нансен Фрыцьёф
Напалеон
Насэр Гамаль Абдэль
Наўгародцаў
Невяльской
Нееллы Здэнак
Немірові-Данчанка
Неру Джавахарлал
Несмяянаў
Несцераў
Нідэрле, *нязм.*
Нікіцін
Новапалянскі
Новікаў-Прыбой
Ньютан
Нэні П'етра

Нэруда Пабла
Няжданава
Някрасаў

Обручаў
Ожагаў
Озераў
Осіпаў
Оуэн Роберт

Паладзін
Палзуноў
Палтарацкі
Палявой
Панцялееў
Пападдзін, Пападдзіну
Парахня, Парахні
Пастэр Луі
Патабня
Паустоўскі
Паравёрзеў
Паравошчыкаў
Персіянінаў
Песталоццы
Пестэль
Петрашэўскі
Пецёфі Шандар
Пікасо Пабла
Піятроўскі
Піятуховіч
Плаціні, *нязм.*
Пляханаў
Праабражэнскі
Пракоф'еў
Пржавальскі
Пятрусь Броўка, Петрусю Броўку

Рабесп'ер
Рагойша, Рагоўшу
Радзішчаў
Раждзественскі
Разенцвейг, *аб* Разенцвейгу
Ракасоўскі
Ралан Рамэн
Расіні, *нязм.*
Рассохін
Расстрыгін
Растрэлі, *нязм.*
Рафаэль Санці
Робсан Поль
Русо Жан Жак
Руставелі Шата

**Рыка́рда**
**Ры́мскі-Ко́рсакаў**
**Ры́хтар Святасла́ў**
**Рэ́мбрант**
**Рэнтге́н**
**Рэфарма́цкі**

**Са́віных**
**Сакало́ў**
**Салаўхін**
**Салаўёў-Сядо́й**
**Салтыко́ў-Шчадры́н**
**Саракале́таў**
**Сартр Жан Поль**
**Сар'я́н Марціро́с**
**Саўра́саў**
**Свярдло́ў**
**Севя́ргін**
**Сен-Сімо́н**
**Серва́нтэс**
**Се́чанаў**
**Скабяльцы́н**
**Скары́на Францы́ск,** Скары́не Францы́ску
**Скі́ба, Скі́бе**
**Скорабага́таў**
**Сме́тана Бе́држых**
**Со́нцаў**
**Спе́нсер Ге́рберт**
**Сразне́ўскі**
**Стале́таў**
**Страдыва́ры,** *нязм.*
**Стру́вэ,** *нязм.*
**Сту́руа,** *нязм.*
**Стшале́цкі**
**Стыль Андрэ́**
**Стэнда́ль**
**Стэ́фенсан**
**Су́драбкалн**
**Сунь Ятсе́н**
**Сухаво́-Кабы́лін**
**Су́хэ-Ба́тар**
**Сцю́арт**
**Сяды́х,** *нязм.*
**Сямёнаў-Цян-Ша́нскі**
**Сярге́еў-Цэ́нскі**

**Табі́дзе,** *нязм*
**Тактагу́л Сатылга́наў**
**Талсто́й**
**Тальёні,** *нязм.*
**Талья́ці,** *нязм*
**Та́рле,** *нязм.*
**Тарычэ́лі,** *нязм*
**Тарэ́з Мары́с**
**Таці́шчаў**
**Твэн Марк**
**Традзьяко́ўскі**
**Трацяко́ў**
**Траяку́раў**
**Траяпо́льскі**
**Трубяцко́й**
**Трыгу́баў**
**Тыцыя́н**

**Уа́йльд Аска́р**
**Уа́т Э́двард**
**Уа́т Джэймс**
**Увядзе́нскі**
**Уі́тмен Уо́лт**
**Уладамі́рскі**
**Уладзімі́рскі**
**Уладзісла́ўскі**
**Ула́саў**
**Уленшпі́гель Тыль**
**Улья́наў**
**Ура́нгель,** *аб* **Ура́нгелю**
**Уру́бель**
**Урублеўскі**
**Усе́валажскі**
**Усясвя́цкі**
**Уэ́лс Ге́рберт**

**Фадзе́еў**
**Фальканэ́ Эцье́н**
**Фарадэ́й,** *аб* **Фарадэ́ю**
**Феерба́х,** *аб* **Фееба́ху**
**Фейхтва́нгер Ліён**
**Феру́чы,** *нязм.*
**Філі́п Жэра́р**
**Фірдаусі́ Абулькасі́м**
**Флабэ́р Гюстаў**
**Фліе́р**
**Фукідзі́д**
**Фур'е́ Шарль**

**Хаджа́ Насрэдзі́н**
**Хаджы́-Мура́т**
**Ха́кслі,** *нязм*
**Хасэ́ Марці,** *нязм.*
**Хая́м Ама́р**
**Хе́ердал**
**Хемінгуэ́й Эрнэ́ст**
**Хемні́цэр**
**Хітраво́,** *нязм*

Хмяльніцкі
Хо Шы Мін
Хрысціяновіч
Хрэннікаў

Цвэйг Стэфан
Ціміразеў
Ціта, Іосіп Броз
Ціхаміраў
Цыцэрон
Цыялкоўскі
Цэдэбал
Цэрэтэлі, *нязм*
Цютчаў
Цюцюннік
Цяпінскі Васіль
Цярэнцьеў
Цярэшчанка

Чаадаеў
Чантурыя, -рыі
Чарвоненка
Чарвякоў
Чаркасаў
Чарных, *нязм*
Чарнышоў
Чарнышэўскі
Чарняхоўскі
Чурлёніс
Чыбурданідзе
Чынгісхан
Чычэрын
Чэбышаў
Чэхаў

Шалаўраў
Шалгуноў
Шаляпін, *аб* Шаляпіне
Шамякін, *аб* Шамякіне
Шапенгаўэр
Шапэн Фрыдэрык
Шарамецьеў
Шарстабітаў
Шастаковіч
Шастапалаў
Шатабрыян
Шаўмян
Шаўчэнка
Шахаўской

Шміт
Шолам-Алейхем
Шоу
Штраус
Шчадрын
Шчакаціхін
Шчарбіна, Шчарбіне
Шчасліўцаў
Шчасны
Шчогалеў
Шчукін
Шчэрба, *аб* Шчэрбе
Шырма Рыгор, Шырме Рыгору
Шэварднадзе, *нязм.*
Шэкспір Вільям
Шэлі, *нязм.*
Шэнгелія, -ліі
Шэнье, *нязм.*

Эдысан
Эйве Макс
Эйнштэйн
Энгельгарт
Эндзэлін
Эндыкат
Эпімах-Шыпіла
Эразм Ратэрдамскі
Эрнесакс Густаў
Эрэнбург
Эўклід
Эўрыпід

Юр'еў

Яблачкаў
Якабсан Аўгуст
Якобі, *нязм.*
Якуб Колас
Янка Купала, Янку Купалу
Ярмолава
Ярмоленка
Яроменка
Ярўгін
Ярузельскі Войцах
Яршоў
Ясенін
Ясенскі Бруна
Яфімаў
Яшчарыцын

## АСНОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ СЛОЎНІКА

**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы.** Тт 1 5 Мінск. БелСЭ. 1977 1984

**Слоўнік беларускай мовы.** Пад рэдакцыяй акадэміка М В Бірылы Мінск. БелСЭ. 1987

А Я Баханькоў. I М Гайдукевіч П II Шуба. **Тлумачальны слоўнік беларускай мовы.** Мінск. «Народная асвета». 1996

М К Клышка **Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў.** Мінск. «Вышэйшая школа». 1976

С М Грабчыкаў **Слоўнік паронімаў беларускай мовы.** Мінск. «Народная асвета». 1994

В Д Старычонак **Слоўнік амонімаў беларускай мовы.** Мінск. «Вышэйшая школа». 1991.

В. У Лазоўскі **Слоўнік антонімаў беларускай мовы.** Мінск. «Універсітэцкае», 1994

## ЗМЕСТ

СІНОНІМЫ . . . 5
АМОНІМЫ . . . 137
АНТОНІМЫ . . . 185
ПАРОНІМЫ . . . 265
АМОГРАФЫ . . . 339
АМАФОНЫ і АМАФОРМЫ . . . 349
ДАДАТАК . . . 358

Даведачнае выданне

*«Эрудыт»*

Укладальнікі *ХВАЛЕЙ Яўген Іванавіч*
*ШАРПІЛА Уладзімір Васільевіч*

**СЛОЎНІК ЛЕКСІЧНЫХ ФОРМАЎ**
**(СІНОНІМЫ, АМОНІМЫ, АНТОНІМЫ, ПАРОНІМЫ, АМОГРАФЫ, АМАФОНЫ)**

Рэдактар *А.С. Бржазоўскі*
Тэхнічны рэдактар *А.П. Дзядзюля*
Камп'ютэрны дызайн *Т.А. Кныш*
Адказны за выпуск *У.В. Шарпіла*

Падпісана да друку з гатовых дыяпазітываў 20.12.2003 г.
Фармат 84×108 $^1/_{32}$. Папера газетная. Гарнітура Таймс. Афсетны друк.
Умоўн. друк. арк. 21.84. Ул.-выд. арк. 26.5. Тыраж 3 100 экз. Заказ 2660.

**ТАА «ПАРАДОКС»**
Ліцэнзія ЛВ № 121 ад 31.12.2002 г.
220030 Мінск. вул. К. Маркса. 21 к. 25.
Тэл./факс 227-36-57: тэл. 227-67-73.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013 Мінск. пр. Ф. Скарыны. 79.

«ПАРАДОКС» выпусціў:




**ПІШАМ
БЕЗ
ПАМЫЛАК**

*Серыя «**ЭРУДЫТ**»*

*Як вызначыць, калі складанае слова ці словазлучэнне трэба пісаць злітна, а калі – асобна? Менавіта на гэтай праблеме часцей за ўсё «спатыкаюцца» не толькі навучэнцы, але і тыя, хто лічыць сябе дасведчаным знаўцам граматычных правілаў. Бо адно і тое ж словазлучэнне можа быць напісана па-рознаму, у залежнасці ад кантэксту:* ***вечназялёны*** *і* ***вечна зялёны, высокапастаўлены*** *і* ***высока пастаўлены, вельмішаноўны*** *і* ***вельмі шаноўны...***

Слоўнік-даведнік, складзены доктарам філалагічных навук М. Р. Прыгодзічам, дапаможа вам пазбегнуць памылак пры выбары таго ці іншага варыянта напісання складаных слоў.

6900





«ПАРАДОКС» выпустил:

# СЛОВАРЬ

**БЕЛОРУССКО-РУССКИЙ**
**РУССКО-БЕЛОРУССКИЙ**

Серия «**ЭРУДИТ**»

***В большой семье славянских языков русский и белорусский, пожалуй, больше других напоминают братьев-близнецов. Внешнее сходство, однако, не означает сходства характеров, и того, кто игнорирует подобные истины, может ожидать курьезная «ловушка»...***

Многие слова, которые в обоих языках пишутся и произносятся совершенно одинаково, нередко обозначают разные, а иногда и противоположные понятия. Примеров сколько угодно: *качка, узор, склон, сказ, плот, трус, люстра, вар...*

**Популярный словарь С. М. Грабчикова, рассчитанный прежде всего на школьников и студентов, поможет каждому, кто хотел бы избежать ошибок при переводе с одного языка на другой. Он пригодится вам и в качестве орфографического словаря.**

# СЛОЎНІК
## лексічных формаў

Такога выдання яшчэ не было на айчынным кніжным рынку.

Слоўнікі сінонімаў, амонімаў, антонімаў і паронімаў у розны час выходзілі паасобку, але ў пашыраным варыянце і пад адной вокладкай кніга падобнага кшталту выходзіць упершыню.

У адрозненне ад звычайнага, найбольш вядомага слоўніка беларускай мовы – арфаграфічнага, які дае нарматыўнае напісанне асобных слоў, гэты дапаможнік з'яўляецца лексікаграфічным і тлумачыць суадносіны паміж рознымі словамі, якія бываюць блізнятамі сапраўднымі і ўяўнымі.

PARADOX

ISBN 985-451-134-0
9789854511344